ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

КРУПСКІ РАЁН

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
1999

УДК 947.62
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

Рэдакцыйная калегія:

Г.П.ПАШКОЎ (галоўны рэдактар), Дз.Дз.КАРАНЬ, В.Ц.ОСІПАЎ, П.Ц.ПЕТРЫКАЎ, С.П.САМУЭЛЬ, Б.В.УЛЬЯНКА, Г.А.ФАТЫХАВА, А.К.ФЯДОСАЎ.

РАЁННАЯ КАМІСІЯ
па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі:

Дз.Дз. КАРАНЬ (старшыня камісіі з 1995 г.),
Т.М. РАБКЕВІЧ (старшыня камісіі ў 1991—1995 гг.),

члены камісіі:

М.А. БАРАВУЛЯ, Т.Дз. БАРАНЧЫК, А.А. ЗАЙЦАЎ, У.Б. МАТУСЕВІЧ, М.М. НАВАХРОСТ, Т.І. НАВАХРОСТ, А.А. САПЕГІН, А.А. ТАБАЛІН, ДЗ.М. ХРОМЧАНКА, Ю.І. ЯЎСЕВІЦКІ.

Арганізацыйна-метадычны цэнтр па выданні гісторыка-дакументальных Хронік Памяці Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку:

Б.В. УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар), М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар).

Рэдакцыя гісторыка-дакументальных хронік «Памяць»:

С.П.САМУЭЛЬ (заг. рэдакцыі), навуковыя рэдактары: М.І. АЎСЯНАЯ, Р.Р. БЛАШКО, В.В.ГЕТАЎ, В.В.ГУСЕВА, Н.П. РАКІЦКАЯ, А.В.СКАРАХОД, Л.У. ЯЗЫКОВІЧ.

Складальнік і навуковы рэдактар Дз.М. ХРОМЧАНКА.

Мастак Э.Э.ЖАКЕВІЧ.

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА.

ISBN 985-11-0143-5

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1999
© Э.Э.Жакевіч. Афармленне, 1999

Наваколле Крупак

Мяжа 3-га і 2-га тысячагоддзяў да нашай эры, перыяд бронзавага веку	Сляды дзейнасці чалавека на тэрыторыі сучаснага Крупскага раёна (знойдзены каменныя прылады працы)
2 стагоддзе нашай эры	Гэтым часам датуецца жалезны выраб, упершыню знойдзены на Крупскай зямлі
12—14 стагоддзі нашай эры	Тэрыторыя Крупшчыны ўваходзіла ў склад Друцкага і Лукомскага княстваў
Сярэдзіна 14 стагоддзя	Першае пісьмовае ўпамінанне Худава, паселішча на Крупшчыне

Возера Сялява

1451 г.	Першыя звесткі аб паселішчы Халопенічы
1566 г.	Крупічына ўвайшла ў Аршанскі павет Віцебскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага
1588 г., 1 мая	Прывілей караля Польшчы і вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Жыгімонта Аўгуста аб заснаванні мястэчка Бобр
1613 г.	Упершыню на карце Вялікага княства Літоўскага, выдадзенай у Аметэрдаме, згадваецца паселішча Крупкі

Сядзібны дом пачатку 20 стагоддзя ў Крупках

1762 г.	**Мястэчка Бобр атрымала ўласны герб**
1773 г.	**У мястэчку Халопенічы па ініцыятыве падканцлера літоўскага Іаахіма Храптовіча адкрыта адна з першых на Беларусі свецкіх школ**
1773—1793 гг.	**Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай мястэчка Халопенічы становіцца цэнтрам павета**
1793 г.	**Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793) тэрыторыя сучаснага Крупскага раёна ўвайшла ў склад Расійскай імперыі, часткова ў Барысаўскі, часткова ў Сенненскі паветы**

Бюст А.Я.Багдановіча

1812 г., 5—6 ліпеня — лістапад	**У час Айчыннай вайны 1812 г. Крупшчына акупіравана французскімі войскамі**
1862 г., 20 сакавіка	**У мястэчку Халопенічы нарадзіўся вядомы беларускі краязнавец і фальклярыст А.Я.Багдановіч (памёр у 1940)**

Царква Багародзіцы ў в. Худаўцы

1862 г., 2 мая	**Хваляванні сялян у в. Худаўцы**
1863 г., 7 мая	**Бой паміж паўстанцамі і царскімі войскамі каля в. Падбярэззе — адзін са значных момантаў у гісторыі паўстання 1863 г. ў Польшчы, Літве і Беларусі**
1905 г., 18 ліпеня	**Забастоўка рабочых на запалкавай фабрыцы і лесапільным заводзе ў мястэчку Крупкі**

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму ў Крупках

1917 г., чэрвень	**Створаны Крупскі местачковы Савет**
1917 г., лістапад	**У мястэчку Крупкі і навакольных вёсках устаноўлена Савецкая ўлада**
1918 г., 24 лютага	**Тэрыторыя сучаснага Крупскага раёна часткова акупіравана нямецкімі войскамі**
1918 г., 22—23 лістапада	**Крупшчына вызвалена ад нямецкіх войск**

Помнік А.Ф.Колесавай у Крупках

1921 г., 13 чэрвеня	Крупская і Бобрская воласці ўвайшлі ў склад БССР
1924 г., 17 ліпеня	Утвораны Крупскі і Халопеніцкі раёны ў складзе Барысаўскай, з 1927 г. — часткова Аршанскай акруг

Помнік землякам у в. Малая Слабада

1931—1935 гг.	**Частка Халопеніцкага раёна ўваходзіла ў Крупскі раён**
1938 г., 27 верасня	**Мястэчка Крупкі атрымала статус гарадскога пасёлка**
1938 г., верасень	**Крупскі і Халопеніцкі раёны ўвайшлі ў Мінскую вобласць**

Будынак Крупскага райвыканкома — помнік архітэктуры 1960-х гадоў

1941 г., 5—9 ліпеня	**Крупскі раён акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі**
1942 г., 10 кастрычніка	**Створаны Халопеніцкі падпольны райком КП(б)Б**
1942 г., 30 лістапада	**Створаны Халопеніцкі падпольны райком ЛКСМБ**

Народны этнаграфічны ансамбль «Крупчанка»

1943 г., 10 мая	**Створаны Крупскі падпольны райком КП(б)Б і Крупскі падпольны райком ЛКСМБ**
1944 г., 27—28 ліпеня	**Крупскі раён вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**
1960 г., 21 студзеня	**Расфарміраваны Халопеніцкі раён. Тэрыторыя 5 сельсаветаў адышла да Крупскага раёна**

Фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Крупках

1977 г., 9 кастрычніка	**Здзейсніў свой першы касмічны палёт ураджэнец Крупскага раёна двойчы Герой Савецкага Саюза У.В.Кавалёнак**
1990 г., май	**Гарадскі пасёлак Крупкі атрымаў статус горада**



Бюст касманаўта У.В.Кавалёнка

1993 г. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі Крупскага раёна ўтвораны дзяржаўны ландшафтны заказнік «Сялява» рэспубліканскага значэння

1996 г. К.А.Хадатовіч стала першай у раёне алімпійскай чэмпіёнкай

ДА ЧЫТАЧА

Ва ўсходняй частцы Беларусі, на мяжы Мінскай і Віцебскай абласцей, па абодвух баках р. Бобр (прыток Бярэзіны), сярод лясоў і палёў раскінуўся Крупскі раён. На першы погляд, нічым ён знешне не вылучаецца. Але за гэтай непрыкметнасцю хаваецца багатая гісторыя Крупшчыны, як любоўна называюць яе жыхары.

Крупскі раён знаходзіцца нібыта на раздарожжы часоў і зносін. Праз яго праходзяць галоўная аўтамагістраль і чыгунка рэспублікі. Раён умоўна падзелены агульнаеўрапейскім водападзелам паміж Чорным і Балтыйскім морамі, не адзін раз разрываўся дзяржаўнымі межамі. За доўгі час мала хто з чужынцаў абмінуў гэту тэрыторыю. Тут адбылося шмат гістарычных падзей, якія ў той ці іншай ступені пакінулі свой след на Крупшчыне. Можа вось гэта асаблівасць і вызначыла галоўныя рысы крупчан: уменне пераадольваць цяжкасці, спагада да чужога гора, добразычлівасць да тых, хто прыйшоў з дабром, непрымірымасць да захопнікаў. Можа, і назву сваю Крупшчына мае таму, што літаральна па крупінцы збіралі жыхары растрачанае ў ліхалеццях, разбуранае, разрабаванае чужынцамі, назапашвалі і клапатліва захоўвалі матэрыяльную і духоўную спадчыну, якая стваралася папярэднімі пакаленнямі.

Каб адлюстраваць багатую гістарычную і культурную спадчыну розных пакаленняў крупчан, расказаць пра людзей — яе стваральнікаў, людзей-працаўнікоў, ушанаваць памяць тых, каго ўжо няма з намі, і выходзіць кніга «Памяць», прысвечаная Крупскаму раёну. На старонках кнігі змешчаны дакументальныя матэрыялы пра даўніну і сучаснасць Крупак. У кнізе выкарыстаны матэрыялы з манаграфій, мемуарнай літаратуры, перыядычнага друку, археалагічных даследаванняў, архіваў гарадоў Мінска, Масквы, Вільнюса, Віцебска, Магілёва, фондаў музеяў, а таксама асабістых архіваў і ўспамінаў удзельнікаў падзей.

У падрыхтоўцы кнігі прымалі ўдзел навуковыя супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і іншых навуковых устаноў, мясцовыя краязнаўцы, работнікі сельскіх Саветаў, устаноў адукацыі, культуры і інш.

Праведзеная вялікая пошукавая работа дазволіла адлюстраваць гісторыю Крупшчыны ад старажытных часоў да нашых дзён. На старонках кнігі можна знайсці звесткі пра падзеі, якія адбыліся ў гэтай мясцовасці ў сярэдневякоўі або ў часы, калі тэрыторыя раёна ўваходзіла ў склад Расійскай імперыі. Ёсць матэрыялы аб развіцці эканомікі, культуры, адукацыі ў гады савецкай улады. У кнізе пайменна ўвекавечаны тыя людзі, якія былі беспадстаўна рэпрэсіраваны ў 1920—30-я гады.

Значнае месца ў хроніцы адведзена падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Тут змешчаны шматлікія дакументы, успаміны ўдзельнікаў падзей пра подзвігі землякоў на франтах, нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым, партызанскі рух на Крупшчыне, а таксама спісы загінуўшых воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў. На старонках кнігі можна таксама знайсці звесткі пра асобныя вёскі, біяграфіі знакамітых землякоў і інш.

Стваральнікі кнігі, выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі ўдзячны прадстаўнікам грамадскасці, супрацоўнікам архіваў, музеяў, бібліятэк, арганізацыям і прыватным асобам — усім, хто прымаў удзел у пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў, садзейнічаў выданню гэтай кнігі. Прозвішчы прадстаўнікоў грамадскасці раёна, якія займаліся зборам матэрыялаў для хронікі «Памяць», змешчаны ў канцы кнігі.


КРУПСКІ РАЁН
Маштаб 1:400 000
Цэнтр раёна
Цэнтры сельсаветаў
ЛЕПЕЛЬСКІ Р-Н
Кашчына
29°
Ч А Ш Н І Ц К І Р Н
В І Ц Е Б С К А Я В О Б Л.
воз.Лукомскае
НАВАЛУКОМЛЬ
Стражавічы
Стаўбцы
Заессе
Латыголічы
Красналукі
Вял.Хальнявічы
Чарэя
Нізкі Гарадзец
Касянічы
Кругліца
Янаўшчына
Слабада
Майсееўшчына
воз.Сялява
Калодніца
Валосава
Траянаўка
Дубраўка
Забор'е
Халопенічы
Харлінцы
Капачоўка
54°30' пн.ш.
Якімаўка
Прошыка
Абчуга
Навасёлкі
Тапарышча
Козкі
Вял.Восава
Стар.Пярэсіка
Узнацк
Запуткі
Слабада
Двор-Пярэсіка
Крынічкі
Падбярэззе
Хацюхова
Асінаўка
Плоскае
Самаседаўка
Ротань
Сінічанка
Прудзіны
Нов.Будаўка
Стар.Шчаўры
М І Н С К А Я В О Б Л.
Ігрушка
Ламское
Навінка
Зачысце
Худаўцы
Мал.Жаберычы
Старасёлле
Гапонавічы
Шэйка
Пліса
Раннае
Мужанка
Радзіца
Бобр
Маляўка
Славені
Трасцянка
Навасёлкі
Дакудава
КРУПКІ
Крупскі
Красноўка
Ільяні
Слаўнае
Лошніца
Нача
Прыяміна
Сакалавічы
Баяры
Новасады
Еленка
Круча
Вял.Негнавічы
Зорычы
Шынкі
Можа
Нов.Мётча
Нов.Дзянісавічы
Выдрыца
Вяляцічы
Бярозка
Стаі
Бобр
Аздзяцічы
Стар.Слабада
Шапялевічы
Ухвала
Матошка
Гумны
Сяменькавічы
Бярэзіна
Сомры
Заазер'е
Чэрнеўка
Чарневічы
Навасёлле
Манча
Бялавічы
Знаменская
Клява
Арэшкавічы
Дзевяніца
Эсьмоны
Б Я Р Э З І Н С К І Р Н
Б Я Л Ы Н І Ц К І Р Н
29°30'
Б А Р Ы С А Ў С К І Р Н
К Р У Г Л Я Н С К І Р Н
Т А Л А Ч Ы Н С К І Р Н
М А Г І Л Е Ў С К А Я В О Б Л.

Крупскі раён размешчаны на паўночным усходзе Мінскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. ў Барысаўскай акрузе. З 20.2.1938 г. ў складзе Мінскай вобласці. Плошча 2,1 тыс. м^2. Насельніцтва 34,7 тыс. чал. (1998). Населеных пунктаў — 232, у т. л. горад Крупкі (цэнтр раёна), гарадскія пасёлкі Бобр і Халопенічы, пасёлкі Крупскі і Лянок, 11 сельсаветаў: Абчугскі, Выдрыцкі, Дакудаўскі, Дзянісавіцкі, Ігрушкаўскі, Кастрычніцкі, Крупскі, Нацкі, Ухвальскі, Хацюхоўскі, Янаўшчынскі.

Размешчаны ў межах Цэнтральнабярэзінскай нізіны, невялікая частка — у межах Аршанскага і Мінскага ўзвышшаў. Карысныя выкапні: торф, пясчана-жвіровы матэрыял, гліна. Сярэдняя тэмпература студзеня -7,2 °С, ліпеня 17,9 °С. Ападкаў 653 мм за год. Вегетацыйны перыяд 184 дні. На тэрыторыі раёна працякаюць рэкі: Бобр з правым прытокам Нача і левымі Можа, Еленка, Пліса; верхняе цячэнне р. Эса. Азёры: Сялява, Абіда, Радамля, Нерыб. Пад лесам занята 45% тэрыторыі раёна, на паўночным усходзе ландшафтны заказнік «Сялява» рэспубліканскага значэння. Праходзяць чыгунка Мінск—Орша, аўтадарогі на Барысаў, Орпу, Чашнікі, Беразіно. У раёне філіял Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава, масласырзавод, хлебапякарні ў г.п. Халопенічы і г.Крупкі, Крупскі дрэваапрацоўчы камбінат, асфальтавы завод, завод музычных дэталей (філіял Барысаўскага вытворчага аб'яднання музычных інструментаў) у г.п.Бобр, лясгас у пасёлку Крупскі, торфабрыкетны завод «Туршоўка» у в. Ухвала, ільнозавод у пас. Лянок, ТАА «Амкадор-Можа», пладова-агароднінны камбінат у г. Крупкі. На 1.1.1998 г. ў раёне 21 калгас, 3 саўгасы, эксперыментальная база «Эса» рэспубліканскага трэста па насенняводстве бульбы (в.Слабада), 25 сярэдніх, 6 базавых, 6 пачатковых, 2 музычныя школы, 29 дашкольных устаноў, вучэбна-вытворчы камбінат, цэнтр дзіцячай творчасці, сіроцкі дом, дзіцячая турысцкая і спартыўная базы, фізкультурна-аздараўленчы комплекс, 2 стадыёны, 26 спартыўных залаў, цэнтр гігіены і эпідэміялогіі, 4 бальніцы, 27 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 2 паліклінікі, 3 амбулаторыі, 10 дамоў культуры, 23 клубныя ўстановы, 42 бібліятэкі, 13 кінаўстановак, гістарычна-краязнаўчы музей. Выдаецца газета «Ленінскім курсам». Помнікі архітэктуры — Праабражэнская царква 18 ст. ў в.Грыцкавічы, цэрквы 19 ст. ў в.Калодніца і Багародзіцкая ў в.Худаўцы. Сядзібны дом пачатку 20 ст. ў г.Крупкі.

Населеныя пункты Крупскага раёна

Горад Крупкі, пасёлак Крупскі, веска Новае Жыццё.

Абчугскі сельсавет: Абчуга (цэнтр сельсавета), Асечана, Астроўкі, Бобрык, Дзяньгубка, Журавы, Забор'е, Калыбанава, Кастрычнік (да 1918 Л а м с к о е), Касянічы, пасёлак Кірава (да 1918 Р ы к а ў к а), Кіявец, Клубынічы, Краснавінка, Кутавец, Лагі, Ламское, Луцішча, Прудзіны, Слабада, Смародзінка, Хватынка, Шарнева, пасёлак Шарнева, Шарпілаўка, Шкорнеўка.

Бобрскі пасялковы савет: Альшанікі, Баравец, гарадскі пасёлак Бобр (цэнтр сельсавета), Віктоліна, Восава, Вялікі Лес, Дворышча, Доўгае, Еленка, Забалоцкае, Замкі, Кляновічы, Колас, Красноўка, Куты, Ліпавец, Мачулішча, Мірэцкі Двор, Навасёлкі, Навесы, Падсосенка, Пліса, Сакалавічы, Сінічанка, Скакоўка, Стаі, Стары Бобр, Чарняўка, Шацькі, Ярашоўка.

Выдрыцкі сельсавет: Выдрыца (цэнтр сельсавета), Вялікае Горадна, Малое Горадна, Прудок.

Дакудаўскі сельсавет: Брышча, Вялікае Восава, Вялікія Жаберычы, Дакудава (цэнтр сельсавета), Клён, Крыштопаўшчына, Малыя Жаберычы, Нявераўшчына, Прыклёнак, Шыялоўка.

Дзянісавіцкі сельсавет: Вялікі Вязок, Дубавое, Забалоцце, Малы Вязок, Новы Сакол, Новыя Дзянісавічы (цэнтр сельсавета), Папарнае, Стары Сакол, Старыя Дзянісавічы, Шынкі, Яджар.

Ігрушкаўскі сельсавет: Актавія, Батуры, Ваўкавыск, Вострава, Гута, Двор-Пярэсіка, Ігрушка (цэнтр сельсавета), Каменка, Каралёва, Кругліца, Лашанцы, Лужа, Радзіца, Самаседаўка, Стараселле, Старая Пярэсіка, Узнацк.

Кастрычніцкі сельсавет: Высокае, Вялікі Камянец, Гузовіна, Дакучыно, Дубраўка, Дубы, Забарочча, Запуткі, Калодніца, Лютыя, Малінаўка, Малыя Хальнявічы, Прошыка (цэнтр сельсавета), Старожышча, Тапарышча, Харытанцы, Худава, Чараёўка, Язбы, пасёлак Язбы.

Крупскі сельсавет: Асінаўка, Баравыя, Буда, Бярозаўка, Вялікая Слабада, Гапонавічы, Зароўе, Карпаўка (да 1978 А с і н а ў к а), Карпушоўка, Крупскі (цэнтр сельсавета), Лазоўка, Лебедзева, Леванова, Ляды, Майск (да 1964 П а н с к а е), Малая Слабада, Маслёнка, Навахросты, Новая Крупка, Новы Засценак (да 1956 М а р х л е ў с к а е), Ротань, Скарадзіца, Студзёнка, Сяліцкае, Усохі, Усцінаўка, Худаўцы, Шэйка.

Нацкі сельсавет: Барок, Вострава, Дубешня, Заполле, Кладзі, Колас (да 1962 К а ў п ы н і ц а), пасёлак Лянок, Малое Восава, Нача (цэнтр сельсавета), Плавучае Галае, Прыяміна.

Ухвальскі сельсавет: Бярозка, Гумны, Забянькова, Захараўка, Знаменская (да 1964 Гібайлавічы), Красны Пахар, Купленка, Лажкі, Мажаны, Матошка, Машчаніца, Мікалаеўка, Новая Ніва, Новая Слабада, Новы Шлях, Новыя Пышачы, Прусаўшчына, Свірыдаўка, Селішча, Сомры, Старая Слабада, Старыя Пышачы, пасёлак Трудавік, Узнаж, Ухвала (цэнтр сельсавета), Чарнавосава.

Халопеніцкі пасялковы савет: Бабарыка, Баркі, Буда, Версанка, Весялова, Вяршоўка, Галькі, Ганкаўка, Гарадзішча, Гользберг, Грыцкавічы, Дудзінка, Зараслі, Калінаўка, Красноўка, Мачулішча, Мхерына-1, Мхерына-2, Падалец, Прудзец, Слабада, Струга, гарадскі пасёлак Халопенічы (цэнтр сельсавета), Шамкі, Якімаўка.

Хацюхоўскі сельсавет: Асавец, Белае, Вялікае Восава, Запруддзе, Ігрышча, Казубец, Малое Хацюхова, Новыя Шчаўры, Падбярэззе, Старыя Шчаўры, Хацюхова.

Янаўшчынскі сельсавет: Баркі, Барсукі, Вялікія Хальнявічы, Глінаўка, Дудары, Клішана, Лісічына, Малы Камянец, Мялешкавічы, Падбярэззе, Пасёмкавічы (да 1958 Гавенавічы), Хальнявічы, Янаўшчына (цэнтр сельсавета).

Населеныя пункты Крупскага раёна, якія не існуюць

Абчугскі сельсавет: Бяляны, Валошнік, Ільінка, Плюгаўка, Рыкаўка, Слепцы.

Бобрскі пасялковы савет: Аляксееўка, Апенкавічы, Аўхуты, Жаўняк, Камароўка, Копішча, Ліцвінка, Манастыры, Міхайлаўка, Навасёлкі, Панькавічы, Рэпішча, Селішча, Серп, Туманова, Целішча.

Выдрыцкі сельсавет: Гаць, Маладзілава, Мігаўшчына, Слоўч.

Дакудаўскі сельсавет: Гарнач, Гарошава, Граніт, Заначча, Зарэчча, Ярашоўка, Кушняроўка, Плянтоўка, Пятроўка, Шыя.

Ігрушкаўскі сельсавет: Навінка, Сейнаўка, Ушакоўка.

Кастрычніцкі сельсавет: Баяры, Другавік, Ліпкі, Мальцы, Стральцы.

Крупскі сельсавет: Атракдана, Барсучына, Блатаполле, Брадок, Бярозавая Пушча, Гапонавічы (хутар), Вална, Вялікі Рум, Гумнішча, Замошша, Іскра, Камнішча, Маласаі, Малінаўка, Мілеры, Сасновіцы, Селішча, Чырвоная Горка, Чырвоны Усход, Шырневічы, Юзуфова.

Нацкі сельсавет: Вейніца, Забалацце, Каса, Куток, Чырвоная Ніва, Чырвоны Куток, Язвіны, Ярацкое.

Ухвальскі сельсавет: Асавок, Гарадзішча, Геранёны, Задні Бор, Літомля, Стараселле, Чулінда.

Халопеніцкі пасялковы савет: Валасачы, Валоба, Каменны Лог, Культурнік, Старына.

Хацюхоўскі сельсавет: Верацэя, Камень, Малае Восава, Пахар, Чавінкі.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Старажытная Крупшчына вачыма гісторыкаў

Можна сцвярджаць, што на тэрыторыі Крупшчыны прадстаўлены ўсе археалагічныя эпохі. Тут адкрыты стаянкі каменнага веку, вядомы месцазнаходжанні прылад эпохі бронзы, гарадзішчы жалезнага веку, раннесярэдневяковыя і познасярэдневяковыя курганныя могільнікі. Адкрыты познасярэдневяковы аб'ект, т. зв. найдан. Каля пас. Ільнозавод ёсць колападобны вал, які ахоплівае нібы варонку дыяметрам 2,5 м. Грунт унутры вала моцна абпалены. Відаць, гэта былі рэшткі пабудовы для вытворчасці смалы ці драўлянага вугалю, якія на Беларусі называліся найданамі. Старажытнасці ў Крупскім раёне размеркаваны неаднолькава адносна розных эпох. Больш за ўсё захавалася курганных могільнікаў. Некаторыя складаюцца з 2—4 курганных насыпаў, але ёсць і даволі буйныя. Напрыклад, каля вёсак Асінаўка і Стары Бобр даследчыкі адзначаюць могільнікі з некалькіх дзесяткаў курганоў. Неаднастайна размеркаваны археалагічныя помнікі і ў прасторы. На тэрыторыі раёна іх канцэнтрацыя назіраецца каля возера Сялява.

Знаёмства з археалагічнымі помнікамі Крупшчыны адбылося даўно. Напачатку стагоддзя выдатны краязнавец К.Т.Анікіевіч запісаў недзе ў гэтых мясцінах народную версію паходжання такіх археалагічных знаходак, як крамянёвыя прылады працы. На думку нашага сялянства, іх паходжанне ўвогуле не было звязана з чалавечай дзейнасцю. Мяркуюць, перадае К.Т.Анікіевіч, што пасля ўдару грому нейкая страла ўваходзіць у глебу, адкуль, паступова падымаючыся, гады праз 3 ці 7 выходзіць на паверхню. Як бачым, узрост крамянёвых прылад змяншаўся прыблізна ў тысячу разоў. Увогуле, гэтыя выпадкова знойдзеныя прылады сяляне не лічылі за крэмень. Страла не камень, перадаваў краязнаўца народнае меркаванне, а нейкі нябесны сплаў. Знойдзеныя на Крупшчыне каменныя прылады прыцягнулі ўвагу навукоўцаў. У прыватнасці, знаходка з Крупшчыны адзначана ў фундаментальнай працы аднаго з пачынальнікаў вывучэння каменнага веку графа А.С.Уварава. Апрача маскоўскіх даследчыкаў старажытнасці навакольля Крупак прыцягнулі ўвагу таксама тутэйшых энтузіястаў вывучэння гісторыі бацькаўшчыны. Вядома, напрыклад, што ў 1836 г. каля в. Стары Бобр адзін з курганоў раскапаў К.П.Тышкевіч. Захаваліся звесткі аб наяўнасці ў гэтым кургане некалькіх пахаванняў, падобных да славутых раннесярэдневяковых курганоў з навакольля Чарнігава. У былым Сенненскім павеце, паўднёва-заходняй часткай якога з'яўлялася сённяшняя Крупшчына, пачынаў даследаванні беларускі навуковец-энцыклапедыст Е.Р.Раманаў. У 1886 г. Е.Р.Раманаў, тады штатны наглядчык Сенненскага павятовага вучылішча, паведамляў Маскоўскаму археалагічнаму таварыству, што ім складзены першы варыянт археалагічнай карты гэтага павета. Пазней даследчык ажыццявіў і раскопкі курганоў у шэрагу пунктаў Сенненскага павета — каля Лукомля, Талачына, Чарэі, г. зн. у навакольлі Крупшчыны. У савецкі час даследы Е.Р.Раманава атрымалі працяг у працах А.Дз.Кавалені. У 1930-я гады ён абследаваў

некалькі помнікаў на Крупшчыне, у прыватнасці курганныя могільнікі на беразе воз. Сялява. У даваенны і пасляваенны час даследаванні старажытнасцей Крупскага раёна абмяжоўваліся галоўным чынам пошукам невядомых помнікаў ці проста аглядам раней адкрытых і ўдакладненнем іх апісання.

Г.В.Штыхаў у 1968 г. адкрыў буйны курганны могільнік з 37 насыпаў каля пасёлка Лянок у Нацкім сельсавеце. Разведкі шурфоўкай асобных помнікаў праводзілі таксама Л.Д.Побаль, Е.Г.Калечыц, Э.М.Зайкоўскі, В.Л.Насевіч. Але ў наваколлі Крупшчыны раскопвалася шмат помнікаў, на якіх былі атрыманы матэрыялы, што добра ілюструюць развіццё культуры ў цэнтральнай частцы Беларусі з 5 ст. да 13 ст. н. э. Так, вядомы археолаг А.Р.Мітрафанаў ажыццявіў раскопкі Гарадзішчаў Аўгустова ў Лепельскім, Дзядзілавічы, Аздзяцічы, Кімія і Навасёлкі ў Барысаўскім раёне. Мусіць, на суседняй Крупшчыне гарадзішчы таксама павінны ўтрымліваць напластаванні тых жа культур — днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі ранняга жалезнага веку і банцараўскай культуры пачатку сярэдневякоўя. Г.В.Штыхаў вывучаў цікавыя сярэдневяковыя старажытнасці Лукомля і Барысава. Грунтуючыся на тым, што тэрыторыя сучаснай Крупшчыны ўваходзіла ў тыя ж самыя, што і гэтыя цэнтры, сярэдневяковыя дзяржаўныя ўтварэнні, а раней належала адной усходнеславянскай племянной групоўцы, зробленыя даследчыкам высновы таксама магчыма распаўсюдзіць і на яе. Што датычыць найстаражытнейшай эпохі, падобных аналагаў паблізу няма. Давядзецца карыстацца фрагментарнымі звесткамі і зыходзіць з больш агульных палажэнняў.

Як вядома, 10—12 тысячагоддзяў назад скончыўся ледавіковы перыяд. Вызваленыя ад ледавіка абшары паступова засяляліся першабытнымі паляўнічымі. Мяркуецца, што ў сярэднекаменным веку (мезаліце) у Цэнтральную Беларусь з поўдня прыйшло насельніцтва, якое валодала тэхнікай вытворчасці вельмі дробных крамянёвых прылад ці іх частак, т. зв. мікралітаў. Каля 8—6 тыс. да н.э. вобласць мікралітычнай індустрыі ахапіла Беларускае Падняпроўе да Заходняй Дзвіны, г. зн. у яе павінна была ўваходзіць тэрыторыя сучаснай Крупшчыны. У наступную новакаменную (неалітычную) эпоху на базе мікралітычных традыцый склалася і існавала таксама ў басейне Бярэзіны днепра-данецкая археалагічная культура (3-е тыс. да н.э.). Адно з вынаходніцтваў эпохі неаліту — вытворчасць ляпнога глінянага посуду. Посуд днепра-данецкай культуры ўпрыгожвалі адбіткі грэбеня і наколы, ці грабеньчата-накольчаты арнамент. Сляды паселішчаў каменнага веку зафіксаваны каля вёсак Выдрыца, Хальневічы, Шырневічы. Ніводнае з паселішчаў не даследавалася шляхам раскопак. Е.Р.Раманаў лічыў жыхароў тэрыторыі Магілёўскай губерні ў эпоху каменнага веку старажытнымі фінамі па мове. Цікава, што ягоная здагадка атрымала падмацаванне ў даследаваннях сучасных мовазнаўцаў. На паўночным усходзе Беларусі выдзелены вельмі старажытны пласт фіна-угорскіх назваў вадаёмаў, якія можна суаднесці з насельніцтвам эпохі неаліту. У наступную эпоху, што прынята адлічваць з 3-га тысячагоддзя да н.э., таксама і на тэрыторыю Беларусі распаўсюдзілася іншае насельніцтва, якое належала да вялікай сям'і індаеўрапейцаў. Да індаеўрапейскай моўнай сям'і належаць сучасныя славянскія мовы. На Крупшчыне выяўлены сляды прысутнасці індаеўрапейцаў бронзавага веку. Напэўна, адкрытае ў 1936 г. каля в. Выдрыца паселішча належала да эпохі бронзы. Увогуле, галоўнай рысай эпохі бронзы з'яўляецца не карыстанне прыладамі з бронзы, а той пераварот, які адбыўся тады ў эканоміцы і ў сацыяльнай арганізацыі грамадства. Запанавалі вытворчыя галіны гаспадаркі: жывёлагадоўля і земляробства. Прычынай рассялення індаеўрапейцаў лічаць патрэбу ў новых і новых пашах для ўзросшых статкаў жывёлы. Адначасова матрыярхальны лад саступае месца патрыярхату. Уладальнікі статкаў былі, мусіць, вельмі ваяўнічымі. Іх зброяй і прыладамі працы з'яўляліся своеасаблівыя каменныя тамагаўкі — шліфаваныя ці свідраваныя каменныя сякеры. Яшчэ ў мінулым стагоддзі 3 такія сякеры былі знойдзены на беразе р. Нача, каля вёсак Сокал і Дзянісавічы. К.Т.Анікіевіч паведамляў таксама пра знаходкі каменных прылад «з арнаментам у выглядзе галавы чалавека, ці з птушынай галавой». Магчыма, гэта былі выпадкова знойдзеныя ў Сенненскім павеце старажытныя знакі ўлады. Пры пракладцы канавы каля в. Маляўка ў 1929 г. знойдзена старажытнае пахаванне па абраду трупаспалення, рэшткі якога былі змешчаны ў нечым накшталт склепу з 3 каменных пліт. На Беларусі вядомы і больш багатыя магілы эпохі бронзы. Напрыклад, каля в. Ходасавічы Рагачоўскага раёна даследаваны курганы бронзавага веку, у адным з якіх (№ 11) быў пахаваны, напэўна, нейкі правадыр ваяўні



Каменныя прылады працы, знойдзеныя каля в. Ігрушка.

чых індаеўрапейцаў. Пахавальны інвентар: багата аздоблены гаршчок, некалькі бурштынавых і бронзавых упрыгожанняў, крамянёвыя наканечнікі стрэл, літаранаканечнікі дзід, металічныя і каменныя сякеры. Не выключана, што нейкі з недаследаваных курганоў на Крупшчыне таксама ўтрымоўвае пахаванне эпохі бронзы.

Наступная эпоха атрымала назву «жалезны век» ад таго матэрыялу, які здолеў перамагчы камень, што, між іншым, на нашай тэрыторыі медзь ці бронза не зрабілі. Жалезны век у Паўднёвай Беларусі пачаўся каля 8 ст. да н.э., у Сярэдняй і Паўночнай крыху пазней. Самы характэрны від помнікаў жалезнага веку на Крупшчыне — гарадзішчы. Анікіевіч паведамляе аб народным паданні, якое сцвярджала, што «у гарадках некалі жылі асілкі-волаты, якія падчас бясконцых бітваў шпулялі з гарадка ў гарадок ці вялізныя камяні (што пакрываюць бакавыя схілы гарадкоў), ці каменныя сякеры, г. зн. баявыя молаты». Увогуле, народная інтэрпрэтацыя гарадзішчаў не будзе здавацца надта недарэчнай, калі мы згадаем, што ў мінулым стагоддзі нават вядучыя навукоўцы разглядалі іх як «святыя аградцы», дзе старажытныя славяне спраўлялі свае паганскія абрады. Дарэчы, Е.Р.Раманаў, не пагаджаючыся, настойваў на тым, што «гарадкі» выкарыстоўваліся як «сховішчы для сям'і ці родку дзікуна падчас непрыяцельскіх стасункаў паміж родамі». Такім чынам, яго разуменне функцыі гарадзішчаў набліжалася да сучаснага, але Раманаў усё ж істотна памыляўся, калі адносіў гарадзішчы да помнікаў каменнага веку. Раскопкі А.Р.Мітрафанава паказалі, што першапачатковыя гарадзішчы эпохі жалеза былі ці ўвогуле пазбаўлены земляных умацаванняў, як Аўгустоўскае, ці мелі вал і роў толькі з боку плато, як Навасёлкаўскае. Але паступова на гарадзішчах узнікаюць больш грунтоўныя ўмацаванні, мусіць, вал з драўляным палісадам і ровам ва ўзножжы. Гарадзішчы Крупшчыны не даследаваліся, таму дакладна ўявіць іх канструкцыю цяжка. Але ўжо знешні выгляд абарончых збудаванняў сведчыць аб тым, што яны былі добра ўмацаваныя. На некаторых гарадзішчах Крупшчыны (Вялікае Городна, Клішана) даследчыкамі адзначалася наяўнасць фрагментаў кладкай і штрыхаванай керамікі. Даследы А.Р.Мітрафанава на гарадзішчы Навасёлкі Барысаўскага раёна выявілі, што самыя раннія пласты тут утрымоўвалі кавалкі посуду без штрыхоўкі. Яна з'явілася пазней; яшчэ пазней, недзе каля 1 ст. да н.э., распаўсюджваецца посуд формы, якая і з'яўляецца тыповай для культуры штрыхаванай керамікі. Гаршкі формаю падобныя да вядра, але рэзка загнутыя ўнутр у верхняй частцы. Там утваралася рабро, якое нярэдка аздаблялася зашчыпамі. Іх наносілі

пальцамі, а штрыхоўку, мусіць, пучком травы ці саломы. Для культуры штрыхаванай керамікі былі характэрны т.зв. «доўгія» дамы. Яны ўтвараліся з асобных пакояў — секцый, далучаных адзін да аднаго. У асяроддзі мясцовага насельніцтва Сярэдняй Беларусі каля сярэдзіны 1-га тысячагоддзя н.э. адбыліся змены, якія дазваляюць даследчыкам гаварыць аб трансфармацыі культуры штрыхаванай керамікі ў новую, банцараўскую, культуру. Банцараўскія матэрыялы, дарэчы, выяўлены на згаданых вышэй гарадзішчах у Крупскім раёне (вёскі Вялікае Горадна, Клішана, Кіявец). Ці былі адзначаныя змены вынікам унутранага развіцця, ці іх выклікалі ўплывы звонку, пакуль што канчаткова не вырашана. Але адрозненні ад папярэдняй эпохі відавочныя. Не толькі знікла штрыхоўка на посудзе, але і апрача «доўгіх» дамоў з'явіўся другі тып жытлаў. Каля в. Дзядзілавічы Барысаўскага раёна А.Р.Мітрафанаў даследаваў «аднапакаёвыя» малыя жытлы. Апрача гарадзішча ў Дзядзілавічах ёсць таксама і паселішча без умацаванняў. Гэтакіх селішчаў класічная культура штрыхаванай керамікі не ведае. Банцараўскія селішчы адкрыты паблізу ад гарадзішча Клішана, каля вёсак Выдрыца, Шырневічы. Мусіць, стан «вайна ўсіх супраць усіх», які панаваў у асяроддзі носьбітаў класічнай культуры штрыхаванай керамікі і прымушаў кожнае іх паселішча мець нейкія ўмацаванні, змяніўся. Напэўна, склалася больш высокая форма грамадскай арганізацыі, якая гарантавала абарону нават на неўмацаваных селішчах. Частка гарадзішчаў у банцараўскі час (3-я чвэрць 1-га тысячагоддзя н.э.) пачала выконваць новую функцыю часовых сховішчаў для жыхароў навакольных селішчаў. Некаторыя гарадзішчы Крупшчыны выкарыстоўваліся працяглы час. Напрыклад, па звестках Л.Д.Побаля, у зробленых ім у 1956 г. шурфах на пляцоўцы гарадзішча Клішана разам з штрыхаванай і банцараўскай керамікай траплялася познасярэдневяковая кафля.

Пытанне аб этнічнай прыналежнасці насельніцтва Крупскага раёна ў эпоху жалеза не распрацавана. Е.Р.Раманаў, спасылаючыся на наяўнасць у Сенненскім павеце назваў накшталт «Нямойта», «Нярэйша», «Курэйшава» і інш., сцвярджаў, што насельніцтва ў «дакурганную» эпоху тут было літоўскім, г. зн. балтамоўным. Балтамоўнасць мяркуецца для носьбітаў культуры штрыхаванай керамікі. Калі для культуры штрыхаванай керамікі пахаванні ўвогуле невядомыя (напэўна, звычай не прадугледжваў змяшчэння нябожчыкаў у зямлю), то для наступнай, славянскай, эпохі курганы з'явіліся самым шматлікім відам старажытнасцей. Як і ў іншых частках усходняй палавіны Беларусі, насельніцтва Крупшчыны звязвала з'яўленне гэтых помнікаў археалогіі з падзеямі Паўночнай вайны ці Айчыннай вайны 1812 г. і называла, адпаведна, «шведскімі» або «французскімі» магіламі. Выклікае цікавасць назва мясцовасці каля в. Маляўка, дзе знойдзены 4 курганныя насыпы. Тая мясцовасць называецца «Капішча», г зн. месца правядзення язычніцкіх абрадаў у славян, язычніцкі храм. Такім чынам, на Крупшчыне «мова зямлі» тапанімія захавала звесткі аб сапраўдным узросце курганоў — 10—13 ст. У межах Крупскага раёна курганы не даследаваліся, калі не лічыць згаданага выпадку раскопак К.П.Тышкевічам. Дакументацыя ад тых раскопак не захавалася. Абрад трупаспалення ў кургане каля в. Стары Бобр сведчыць, што ён належаў яшчэ да ранняга курганнага перыяду. Пасля хрышчэння Русі пры Уладзіміры Святаславічу трупаспаленне паступова змяняецца трупапалажэннем, потым распаўсюджваюцца падкурганныя ямы і ўрэшце знікае сам звычай насыпаць курганы.

Вядома, што курганы кожнага з усходнеславянскіх плямён можна пэўным чынам вызначыць. Напрыклад, дрыгавічы вызначаюцца з дапамогай характэрных упрыгожанняў — бочачкападобных зярнёных пацерак. Крывічам, асабліва на пачатку сярэдневякоўя былі ўласцівы насыпы падоўжанай формы, т. зв. «доўгія» курганы. Да якога племені належалі раннесярэдневяковыя славяне сённяшняй Крупшчыны? Дрыгавічы, згодна з «Аповесцю мінулых часоў», «...седоша межѣ Пріпятью, Двіной і нарекошася дреговічі». Выходзіць, што басейн верхняй Бярэзіны — дрыгавіцкая зямля. Але, калі пад 1092 г. Лаўрэнцеўскі летапіс гаворыць пра дзівосны выпадак збівання палачан прывідамі, там падкрэсліваецца: «Се же знаменье поча быті от Дрютьска». Палачане-крывічы, атрымоўваецца, рассяляліся ажно за Друцк, які знаходзіцца недалёка ад Крупшчыны. У заходнееўрапейскага аўтара, географа Баварскага, згаданы яшчэ нейкія «лякамляны»... Сапраўды, могільнікі з дрыгавіцкімі пацеркамі выяўлены на левым беразе Бярэзіны каля Барысава. У «Павучанні» Уладзіміра Манамаха, дзе ён распавядае аб сваёй вайне з Полацкай зямлёй, гаворыцца, як Манамах ішоў на Дрютьск, ваюючы, г. зн. ужо ад Друцка па-

чыналася ўладанне полацкага князя. Г.В.Штыхаў выказаў думку, што ў 9—10 ст. на гарадзішчы Лукомля, магчыма, знаходзіўся родавы старэйшына са сваімі дамачадцамі, правадыр «лукамлян». В.В.Сядоў адзначыў, што ў раёне водападзелу Друці і Бярэзіны назіралася змяшэнне дрыгавічоў з крывічамі. Побач размяшчаліся паселішчы і могільнікі адных і другіх, але ўся гэтая зямля лічылася «отчынай» — законным уладаннем полацкага князя. Яго асобу ў Лукомлі мог прадстаўляць мясцовы пасаднік. Такім чынам, курганы Крупшчыны маглі быць насыпаны дрыгавічамі па паходжанні, але палачанамі па дзяржаўнай прыналежнасці і лукамлянамі па адміністрацыйнай. Роля Лукомля была абумоўлена яго выгадным палажэннем на выключна важным для Полацка шляху. А.М.Насонаў згадвае знаходкі сярэбраных арабскіх дырхемаў і сцвярджае: «З Дняпра быў водны шлях у Заходнюю Дзвіну праз Лукомль, як паказвае тапаграфія кладаў манет». Урэшце, нешта падобнае выказаў Е.Р.Раманаў яшчэ ў пачатку стагоддзя ці нават трохі раней. Ён гаварыў аб лукомскіх кладах і адзначаў лукомскі кавалак шляху «з варагаў у грэкі»: «З Балтыйскага мора ў Дзвіну, потым у Улу, адсюль па Лукамцы ў возера Сялява, далей волакам да Бабра, а потым па Бярэзіне і Дняпры ў Чорнае мора». Як доказ наведвання наваколля скандынавамі, Раманаў спасылаўся на тое, што ў адным з лукомскіх курганоў быў знойдзены жалезны молат — зброя, на яго думку, выключна нарманская.

С.Я.Рассадзін.

Старажытнасці Крупшчыны

Яшчэ ў канцы 19 ст. выдатны беларускі даследчык і этнограф А.Кіркор сцвярджаў, што «Беларусь — гэта край магіл, курганоў, гарадзішчаў, край, дзе ледзь не на кожным кроку вы сустракаеце сляды мінулага ў помніках, сказаннях, песнях». Гэтыя словы можна ў поўнай меры аднесці і да Крупшчыны. Але, на жаль, старажытны перыяд гісторыі гэтага краю даследчыкамі амаль не вывучаны, за выключэннем асобных даследаванняў археолагаў К.П.Тышкевіча, К.Т.Анікіевіча, А.Дз.Кавалені, І.М.Ціханенкава, А.Г.Калечыц, Л.Д.Побаль. Аўтар праводзіў пошукавыя археалагічныя работы з 1955 па 1990 г. Было выяўлена шмат курганоў, гарадзішчаў. Гэтыя даныя і пакладзены ў аснову артыкула. Выяўленыя ў раёне помнікі старажытнасці адносяцца да прыкладна 200 пакаленняў жыцця людзей ад эпохі неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў, ранняга сярэдневякоўя да часу фарміравання старажытнарускіх княстваў.

Як сведчыць аналіз выяўленых археалагічных (старажытнаэтнаграфічных) рэчавых крыніц, тэрыторыя Крупскага раёна была заселена калектывамі людзей, якія з'яўляліся часткай вялікай славянскай галіны індаеўрапейцаў па сучаснай умоўна вылучанай археалагічнай класіфікацыі яшчэ ў эпоху неаліту і бронзы. Гэтыя працэсы адбываліся, прыкладна, у 3—2-м тысячагоддзях да н.э. Басейн р. Бобр і прылеглыя тэрыторыі, у т.л. і забалочаныя лясныя масівы, засяліла адносна невялікая частка славян.

Пры пераходзе да аселасці ўсе індаеўрапейцы, маючы развітую жывёлагадоўлю, паступова пачалі займацца земляробствам, агародніцтвам і іншымі галінамі гаспадарчай дзейнасці. З гэтым перыядам звязаны адпаведныя старажытныя паселішчы, якія археолагі ўмоўна называюць помнікі—стаянкі эпох неаліту і бронзы. Археалагічныя паселішчы і адпаведныя крамянёвыя, каменныя, касцяныя прылады працы тых часоў знойдзены на тэрыторыі раёна. З жалезным векам, які храналагічна датуецца ад 6—5 ст. да н.э. да пачатку ранняга феадалізму (9—11 ст. н.э.), звязаны земляныя ўмацаванні, якія археолагі называюць гарадзішчамі. Кожны такі помнік сярод мясцовага насельніцтва мае свой вясковы мікратапонім. Усяго ў раёне вядома 9 гарадзішчаў. Аўтар прыйшоў да высновы, што ўсе такія гарадзішчы жалезнага веку з'яўляліся родаабшчыннымі цэнтрамі, месцамі галоўных язычніцкіх культаў. Родаабшчынны старшыня адначасова з'яўляўся адпаведным язычніцкім жрацом (звестуном, чараўніком). Родаабшчынная структура славянскага грамадства склалася на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У індаеўрапейскім грамадстве асноўнымі структурамі былі племянныя фарміраванні. Уся еўрапейская цывілізацыя ў постіндаеўрапейскі перыяд першабытнаабшчыннага ладу прайшла стадыю родааб-



Аўтар Л.Д.Побаль

1. Верхняможанскі родаабшчынны археалагічны комплекс: 1 — гарадзішча каля в. Новы Шлях; 2 — геалагічныя адкладанні вялікіх камянёў на плошчы 1 км^2 на захад ад гарадзішча; 3 — курганны некропаль каля в. Новы Шлях; 4 — курган каля в. Новы Шлях; 5 — два курганы каля в. Новы Шлях; 6 — курганны могільнік каля в. Бярозка; 7 — курганы каля в. Машчаніца; 8—9 — курганны могільнік і культавы камень каля в. Старая Слабада; 10 — дзве ямы каля в. Селішча, дзе з бярозавай кары атрымлівалі дзёгаць; 11 — курганы каля в. Папарнае; 12 — курганы каля в. Яджар; 13—16 — курганы каля в. Шынкі.

2. Ніжняможанскі родаабшчынны археалагічны комплекс: 1 — гарадзішча каля в. Ухвала; 2—5 — курганы каля гарадзішча Ухвала; 6 — знаходка каменнай сякеры каля в. Стары Сокал; 7—10 — курганы, могільнік і селішча каля в. Мікалаеўка; 11 — рэшткі курганнага некропаля каля в. Прусаўшчына; 12—15 — старажытнасці ў наваколлях вёсак Старыя і Новыя Пышачы; 16—22 — археалагічныя помнікі ў наваколлях в. Купленка; 23—29 — археалагічныя помнікі паміж вёскамі Знаменскае і Сомры; 23 — курганы каля в. Знаменка; 24 — культавы камень «Мядзведзь»; 25 — курганы каля дарогі на в. Новыя Пышачы; 26 — курган каля в. Новыя Пышачы; 27 — курган каля в. Сомры; 28 — курганны могільнік каля в. Сомры; 29 — могільнік каля в. Сомры; 30 — могільнік каля в. Свірыдаўка; 31 — каменныя сякеры, знойдзеныя каля в. Новыя Дзянісавічы; 32 — месца выпальвання вугалю каля пас. Вялікі Вязок.

3. Ніжнябобрскі родаабшчынны археалагічны комплекс: 1,2 — гарадзішчы каля в. Вялікае Горадна; 3 — курганы; 4 — курганы ва ўрочышчы Ляхаўка; 5 — культавы камень каля в. Выдрыца; 6—7 — каля в. Шырнавічы выяўлены матэрыялы жалезнага веку; 8 — могільнік каля пас. Прудок; 9 — каменны крыж каля пас. Прудок; 10—19 — археалагічныя помнікі каля в. Гумны; 20 — курганы каля в. Узнаж.

4. Верхнянацкі родаабшчынны археалагічны комплекс: 1 — гарадзішча каля пас. Радзіца; 2—4, 8, 10, 12—16 — курганы; 9 — месца выпальвання вугалю каля в. Лянок; 11 — могільнік каля пас. Малое Хацюхова.

5. Сярэднябобрскі родаабшчынны археалагічны комплекс: 1 — гарадзішча каля пас. Бобр; 2—5 — курганы; 6 — месца знаходкі каменнай сякеры каля в. Чарняўка.

6. Сярэднябобрска-Пліскі родаабшчынны археалагічны комплекс: 1 — гарадзішча ў в. Пліса; 2 — курганы каля в. Пліса; 3 — курганы каля в. Куты.

7. Верхнябобрскі родаабшчынны археалагічны комплекс: 1 — гарадзішча паміж вёскамі Кіявец і Абчуга; 2 — селішча каля гарадзішча.

8. Сяляўскі родаабшчынны археалагічны комплекс: 1 — гарадзішча каля в. Клішына; 3, 4, 8, 9—11, 14, 16 — курганы; 2,5 — селішчы каля в. Клішына; 12, 14, 15 — каменныя крыжы; 7, 17 — стаянкі каменнага веку; 6 — могільнік каля в. Клішына.

9. Родаабшчынны археалагічны комплекс верхняй часткі р. Эса: 1 — гарадзішча каля в. Грыцкавічы; 2, 4 — курганы; 3 — каменны крыж каля царквы в. Грыцкавічы.

шчынных структур. У беларускіх вёсках да нашых дзён захаваліся элементы гэтых фарміраванняў: калектыўныя вясковыя выпасы для жывёлы і лясныя масівы, адзіныя вясковыя могілкі, узаемадапамога ў будаўніцтве жытлаў, правядзенне народных вясковых свят і інш. Да нашых часоў захаваліся і курганныя некропалі. Яны былі распаўсюджаны ў эпоху бронзы, у перыяд ранняга жалезнага веку (праўда, такія курганы даследаваны толькі ў сярэдняй частцы Беларускага Палесся), з сярэдзіны 1-га тысячагоддзя н.э. да 13—15 ст. па ўсёй Беларусі, у т.л. на Крупскай зямлі. Пахавальны абрад у дахрысціянскі перыяд (у Старажытнай Русі да 988 г.) быў звязаны з індаеўрапейскім звычаем крэмацыі памёршых, з 10 ст. і пазней усталяваўся абрад інгумацыі. Колькасць такіх помнікаў адносна вялікая, захаванасць насыпаў розная. Звесткі аб кожным з помнікаў, а таксама знойдзеныя мясціны паселішчаў абшчыннікаў, прыводзяцца пры аналізе родаабшчынных фарміраванняў.

У старажытныя часы людзі сяліліся па берагах рэк. Межы Крупскага раёна знаходзяцца ў левабярэжнай частцы вадазбору Бярэзіны — у басейне яе левага прытоку Бобр. У сваю чаргу прытокамі апошняй з'яўляюцца левыя: рэкі Можа, Еленка, Пліса, Аксака. Правы прыток ракі Бобр — р. Нача. У паўночнай частцы раёна знаходзіцца возера Сялява, у якое ўпадаюць рэкі Сухая, Высокая, Ракітаўка. З возера выцякае р. Югна, прыток р. Лукомкі. Раён мяжуе з паўднёвай часткай Лукомльскага возера, якое ў сваю чаргу звязана воднымі артэрыямі з Заходняй Дзвіной. У паўночна-заходняй частцы раёна бярэ свой пачатак і на адносна вялікай адлегласці працякае р. Эса, якая ўпадае ў Лепельскае возера. На тэрыторыі паўночнай часткі раёна праходзіць агульнаеўрапейскі водападзел паміж Чорным і Балтыйскім морамі. Многія з сучасных балот у мінулым з'яўляліся азёрамі, цяпер ператварыліся ў балотна-тарфяныя масівы, маюць свае назвы. Менавіта на берагах

вадаёмаў са старажытных часоў лакалізаваліся славянскія родаабшчынныя фарміраванні.

На тэрыторыі Крупскага раёна ў пачатку жалезнага веку (7—5 ст. да н.э.) на берагах вадаёмаў узнікалі родавыя цэнтры — гарадзішчы, земляныя ўмацаванні, якія ў той ці іншай ступені захаваліся да нашага часу. На берагах вадаёмаў захаваліся стаянкі, селішчы розных часоў, якія знаходзіліся ў месцах, зручных для пражывання людзей. Тэрыторыя кожнага родаабшчыннага археалагічнага комплекса залежала ад многіх фізіка-геаграфічных фактараў. У сярэднім кожны комплекс у старажытныя часы меў тэрыторыю не менш 200 км ^{2}. У цэнтральнай частцы знаходзілася гарадзішча, на рознай адлегласці ад яго лакалізаваліся паселішчы абшчыннікаў («старажытныя вёскі»). Каля паселішчаў узнікалі могільнікі. Гарадзішчы ўзводзіліся непасрэдна абшчыннікамі, імі ахоўваліся, з'яўляліся адпаведнымі адміністрацыйнымі, культава-абрадавымі цэнтрамі. Па сутнасці, кожнае з родаабшчынных фарміраванняў з'яўлялася першабытнаабшчыннай «мініДзяржавай». Ніжэй прыводзяцца звесткі пра археалагічныя помнікі ў межах кожнай з дзевяці ўмоўна выдзеленых родаабшчынных тэрыторый. На карце гэтыя межы схематычна акрэслены ў адпаведных басейнах рэк. Нумар кожнага помніка пэўнай родаабшчыннай структуры адпавядае яго графічнаму пазначэнню на карце.

ВЕРХНЯМОЖАНСКІ РОДААБШЧЫННЫ АРХЕАЛАГІЧНЫ КОМПЛЕКС-1 знаходзіўся ў басейне вярхоўяў р. Можа і яе прытокаў. Да нашага часу захавалася гарадзішча за 1—1,5 км на паўночны ўсход ад пас. Новы Шлях Ухвальскага сельсавета. Захаваліся пахавальныя помнікі — курганы. Размешчана земляное ўмацаванне на больш высокім левым беразе ракі. Вышыня пляцоўкі над летнім межанным узроўнем вады ў рацэ 10 м, памеры пляцоўкі з поўначы на поўдзень — 65 × 60 м, з трох бакоў захаваўся дугападобны вал, ніжэй — роў. Недалёка ад паўночнай часткі гарадзішча ў р. Можа ўпадае р. Казлянка. У паўночнай, усходняй і паўднёвай частках гарадзішча знаходзіцца моцна забалочаная тэрыторыя шырынёй да 400 м, нагадвае пойму рэчышча названага вадаёма. У цэлым захаванасць гарадзішча добрая.

Курганны могільнік добрай захаванасці знаходзіцца за 1,5—2 км на паўднёвы захад ад гарадзішча і 1 км на паўднёвы ўсход ад пас. Новы Шлях. У лясным масіве на плошчы памерамі 350 × 100 м выяўлена 110 курганоў дыяметрам 5—15 м, вышынёй 0,9—2,1 м, помнік выцягнуты з захаду на ўсход. Далей у двух месцах захаваліся асобныя курганы — рэшткі колішніх помнікаў. Адзін курган за 2 км на поўдзень ад пас. Новы Шлях на краю забалочанай тэрыторыі (абследаваны ў 1986 г.). Два курганы размешчаны за 0,3 км на паўднёвы захад ад могільніка, каля дарогі з урочышча Чудніца ў в. Заазер'е. Курганы лакалізуюцца таксама каля пас. Бярозка Ухвальскага сельсавета, паміж правым берагам р. Можа і палявой дарогай. Яны моцна разараны, да 1960-х гадоў тут было поле. Мясцовыя жыхары сведчаць, што падчас земляных работ выворвалася шмат касцей. Захаваліся рэшткі 6 насыпаў дыяметрам 5—7 м, вышынёй 0,4—1,6 м. Недалёка ад курганоў памятны знак, што ў 1942 г. тут быў створаны падпольны Крупскі райком КП(б)Б.

Курганы каля в. Машчаніца Ухвальскага сельсавета знаходзяцца ва ўрочышчы Загарадкі на ўсходняй ускраіне своеасаблівага «востраваа», плошча якога каля 4 га. У гады Айчыннай вайны вясковае насельніцтва хавала ад немцаў на востраве свойскую жывёлу, таму многія курганы растаптаны і зледзь відаць. Захавалася 18 насыпаў дыяметрам 4—8 м, вышынёй 0,2—0,5 м, займаюць плошчу памерамі 60 × 50 м.



Жалезная фібула, знойдзеная на гарадзішчы каля в. Ухвала.



Культавы камень каля в. Старая Слабада.

Курганы каля в. Старая Слабада Ухвальскага сельсавета захаваліся дрэнна, да 1930-х гадоў тут былі хутары і зямля ў наваколлі разворвалася, многія насыпы знішчаны. Засталося 8 курганоў дыяметрам 8—11 м, вышынёй 1,2—1,7 м, многія з іх моцна пашкоджаны скарбашукальнікамі. На адлегласці каля 50 м ад самага крайняга кургана паўночна-заходняй часткі могільніка знойдзены плоскі культавы камень памерам каля 3 × 2,4 м. Зверху на ім і наўкола было шмат вуголля. Курганы каля в. Папарнае Дзянісавіцкага сельсавета знаходзяцца ў басейне верхняй часткі р. Можа, за 2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Горы. Іх дыяметр 4—8 м, вышыня — 0,4—1,4 м. Захавалася 9 насыпаў. Каля курганоў у час Айчыннай вайны вясковымі жыхарамі была выкапана зямлянка, у якой захоўвалі хатнія рэчы.

Курганы каля в. Яджар Дзянісавіцкага сельсавета знаходзяцца недалёка ад вытокаў р. Можа. Захаваліся 3 насыпы, 2 з іх размешчаны ўздоўж існаваўшага некалі возера, цяпер забалочанага масіва Дзянісавіцкага журавіннага заказніка. Адзін з курганоў мае дыяметр 12 м, вышыню 1,5 м, захаванасць яго добрая, другі адпаведна 5 і 0,5 м. Трэці курган знаходзіцца за 150 м на ўсход ад заказніка, каля дарогі Яджар—Шынкі, яго дыяметр 12 м, вышыня — 0,6 м.

Ёсць курганы таксама ў наваколлях вёскі Шынкі Дзянісавіцкага сельсавета, у чатырох месцах. Рэшткі курганоў пашкоджаныя. Адзін курган знаходзіцца за 4 км на захад ад вёскі, каля старой дарогі ў Дзянісавічы. Мае дыяметр 18 м, вышыню 3 м, зверху разбураны скарбашукальніцкай ямай. На адлегласці 2 км ад папярэдняга захавалася 6 курганоў, размешчаных кампактнай групай (дыяметры 3—6 м, вышыня 0,3—0,7 м). Трэцяя група з 2 курганоў знаходзіцца каля другой старой дарогі, за 4 км ад в. Шынкі ў напрамку да г.п. Крупкі. Адзін з курганоў дыяметрам 13 м, вышынёй 2,5 м, часткова пашкоджаны скарбашукальнікамі. Чацвёртая група знаходзіцца на левым беразе р. Можа, ва ўрочышчы Казялец (звесткі ад мясцовага краязнаўца Івана Аляксандравіча Глінскага). Усяго ў родаабшчынным комплексе захаваліся 163 курганы ў 12 мясцінах.

НІЖНЯМОЖАНСКІ РОДААБШЧЫННЫ АРХЕАЛАГІЧНЫ КОМПЛЕКС-2 умоўна выдзелены ў басейне ніжняга цячэння р. Можа.

Гарадзішча было ўзведзена на правым беразе ракі, за 1 км на ўсход ад в. Ухвала, за 12—15 км уніз па цячэнні ад папярэдняга верхняможанскага родаабшчыннага ўмацавання. Як сведчаць мясцовыя жыхары, тэрыторыя земляного ўмацавання раней разворвалася. Тут і да сённяшняга часу апрацоўваецца зямля (амаль што да вала гарадзішча — на адлегласці 25 м). Побач праходзіць палявая дарога. З усходняга боку знаходзіцца шырокі забалочаны роў. У цэлым помнік захаваўся добра. Ва ўсходняй, паўночна-ўсходняй і паўночна-заходняй яго частках захаваўся вал вышынёй 2—3 м, шырынёй 7—8 м. Пляцоўка ў плане мае форму, блізкую да трохвугольніка з закругленымі вугламі, максімальныя яе памеры па лініях поўнач—поўдзень — каля 57 м, усход—захад — 60 м. Верхняя частка помніка ўзвышаецца над поплавам ракі на 4—6 м. У профілях сценак таўшчыня старажытнага слоя дасягае 1—1,5 м, мае чорны колер з уключэннямі абпаленай

гліны. У розных месцах сценак знойдзены фрагменты ляпных гліняных старажытных пасудзін, якія можна аднесці да мілаградскай і зарубінецкай археалагічных культур. Частка фрагментаў на паверхні мае штрыхі. Абшчыннікі ў старажытныя часы займаліся вытворчасцю жалеза сырадутным спосабам з мясцовых балотных руд. Знойдзены таксама вялікі фрагмент жалезнай фібулы «з падвязанай ножкай», якая адносіцца да 2 ст. н.э.

Курганы ў наваколлях в. Ухвала вядомы ў чатырох мясцінах. Адзін з могільнікаў знаходзіўся каля гарадзішча, за 0,3—0,4 км ад земляного ўмацавання, знішчаны пры разворванні. Па даных 1870-х гадоў у той час было 9 курганоў. Другі курганны могільнік часткова захаваўся на тэрыторыі вясковых могілак, разбураны сучаснымі пахаваннямі. Шэсць курганоў, размешчаных кампактнай групай, знойдзены ў паўночна-заходняй частцы сучасных могілак, іх дыяметр 6—12 м, вышыня 1—2 м. Сёмы курган захаваўся ў лесе, каля лясной дарогі ў пас. Стары Сокал, яго дыяметр 8 м, вышыня 0,6 м, захаванасць добрая.



Каменныя прылады працы бронзавага веку, знойдзеныя каля в. Пышачы.

У 19 ст. каля населенага пункта Стары Сокал была знойдзена каменная сякера. Трэці курганны могільнік знаходзіўся за 1—1,5 км на паўночны ўсход ад Ухвалы (разбураны), чацвёрты — за 1 км на паўднёвы ўсход ад Ухвалы. Захаваўся 1 насып дыяметрам каля 10 м. У наваколлі населенага пункта Мікалаеўка Ухвальскага сельсавета выяўлены курганы ў двух месцах, сярэдневяковы могільнік, селішча. Тут сярод поля ёсць узвышша пад назвай Старыя могілкі, дзе ў кампактнай групе захавалася 5 курганоў дыяметрам 4—9 м, вышынёй 0,5—1,4 м, некаторыя моцна пашкоджаны. Маецца вялікая колькасць познасярэдневяковых пахаванняў. Значная частка помніка пры разворванні знішчана. За некалькі сотняў метраў на ўсход ад могільніка адкрыта вялікае селішча. Яно знаходзіцца ў нізіне, якая таксама разворваецца. Знойдзена вялікая колькасць фрагментаў глінянага посуду, у асноўным познасярэдневяковага часу. Помнік займае тэрыторыю ў некалькі гектараў. За 1—1,5 км на ўсход ад Мікалаеўкі, ва ўрочышчы Вялікае Селішча, захаваліся 2 курганы на адлегласці адзін ад другога каля 15 м. Пералічаныя помнікі знаходзяцца ў розных напрамках ад родавага цэнтра — гарадзішча каля в. Ухвала — ад некалькіх сотняў метраў да 2—3 км. Акрамя таго, каля в. Прусаўшчына за 2—3 км на захад ад гарадзішча маюцца таксама рэшткі курганнага некропаля. У асобных мясцінах захавалася да 20 курганоў.

Рэшткі курганнага могільніка захаваліся каля вёсак Старыя і Новыя Пышачы на захад ад населеных пунктаў ва ўрочышчы Лядзіна-Прыстань на берагах р. Можа. Раней гэтая тэрыторыя разворвалася. Каля лясной дарогі захаваліся 3 курганы дыяметрам 7—12 м, вышынёй 0,5—1 м і 1 курган на правабярэжжы р. Можа, каля дарогі з Ухвалы ў Слабодку.

Курганы ў чатырох месцах, познасярэдневяковы могільнік і культавы знак знаходзяцца ў наваколлі в. Купленка Ухвальскага сельсавета. Ад курганных могільнікаў захаваліся асобныя насыпы, помнікі былі разараны. Адзін курган знаходзіцца каля дарогі за 2 км ад Купленкі і 1,5 км ад левага берага р. Можа. Яго дыяметр 14 м, вышыня 1,8 м, зверху маецца вялікая скарбашукальніцкая яма. Другі курганны могільнік знаходзіцца на захад ад вёскі, за 0,4 км ад вясковых могілак, недалёка ад урочышча Свяцец. Дыяметр кургана 12 м, вышыня 1,3 м, трэці курган захаваўся ва ўрочышчы Дубрава, яго дыяметр 10 м, вышыня 1,8 м. Верхняя частка пашкоджа-

на скарбашукальніцкай ямай. Паміж вёскамі Купленка і Знаменка выяўлены могільнік 13—14 ст. Яго плошча 0,5 га, захавалася больш за 100 пахаванняў. Над адным з пахаванняў высечана выява з каменя — чалавек-крыж. Ёсць таксама камень з выбітым на ім крыжам. Побач з пазнейшым захаваўся адзін больш старадаўні курган. Па звестках 1879 г. ў межах мясцовага прыхода, каля сучаснай Купленкі, былі 2 стаячыя «каменныя пліты», якім прыдавалася рэлігійнае значэнне: побач знаходзілі пярсцёнкі, прывескі.

Курганы, познасярэдневяковы могільнік, культавы камень знаходзяцца паміж двума населенымі пунктамі — Знаменка і Сомры Ухвальскага сельсавета. Калісьці на поўдзень ад гэтых вёсак было вялікае возера. На яго берагах знаходзіліся паселішчы, ад якіх да нашага часу захаваліся рэшткі курганных помнікаў, усе яны былі разараны. Два курганы захаваліся за 4 км на ўсход ад Знаменкі, іх дыяметры 9 і 10 м, вышыня — 1,2 і 1,6 м. Бліжэй да населенага пункта маецца культавы камень пад назвай «Мядзведзь». Другое месца знаходжання двух курганоў — за 0,5 км на ўсход ад папярэдніх у напрамку да в. Сомры, іх дыяметр 2,5 і 12 м, вышыня 0,5 і 1 м. Яшчэ 1 курган ёсць каля дарогі са Знаменкі ў Новыя Пышачы і 1 каля в. Сомры ва ўрочышчы «Гарадзішча», яны моцна пашкоджаны. Паводле звестак, атрыманых ад мясцовых жыхароў, курганы ёсць таксама недалёка ад в. Сомры ва ўрочышчы «Шведскія магілы», на паўднёвы захад ад яе, у напрамку да в. Дзевяніца Бярэзінскага раёна. Далей, за 0,4 км на поўнач ад Сомраў, знаходзіцца познасярэдневяковы могільнік з камянямі зверху над пахаваннямі, які змяшчае больш за сотню пахаванняў. Плошча помніка каля 0,7 га.

Познасярэдневяковы могільнік каля в. Свірыдаўка Ухвальскага сельсавета крыху меншы, яго плошча 0,2 га; захавалася вялікая колькасць пахаванняў з камянямі зверху. Непадалёку ад в. Новыя Дзянісавічы, на беразе р. Можа ў 19 ст. знойдзены 4 каменныя сякеры.

Помнік старажытнага промыслу — месца выпальвання драўнянага вугалю — знаходзіцца каля пас. Вялікі Вязок Дзянісавіцкага сельсавета, на правым беразе р. Можа, за 1 км на ўсход, за 8 км на паўночны захад ад гарадзішча Ухвала, побач з дарогай у г. Крупкі. Мае круглую «гарадзішчападобную» форму дыяметрам 27 м, вышынёй каля 3 м; паўднёвая частка разбурана пры будаўніцтве дарогі. На высокім беразе р. Можа і ўздоўж вясковай вуліцы пас. Малы Вязок захавалася 6 курганоў дыяметрам 7—10 м, вышынёй да 1 м, пашкоджаных у час пракладкі вуліцы і сялянскімі пабудовамі. У навуковай літаратуры ёсць звесткі аб існаванні гарадзішча каля былога пас. Восава, што за 6—7 км ад в. Ухвала, у верхнім цячэнні р. Брусяты, левага прытока Бярэзіны. Пры археалагічных пошуках помнік не выяўлены. У родаабшчынным комплексе ў 12 мясцінах захаваліся 163 курганы.

НІЖНЯБОБРСКІ РОДААБШЧЫННЫ АРХЕАЛАГІЧНЫ КОМПЛЕКС-3 — умоўна выдзелены ў паўднёва-заходняй частцы Крупскага раёна ў басейне р. Бобр. Захаваліся 2 земляныя ўмацаванні недалёка адзін ад аднаго. Першае з іх, вядомае з навуковай літаратуры, знаходзіцца за 0,5 км ад в. Вялікае Горадна Выдрыцкага сельсавета на высокім правым беразе р. Бобр. Другое выяўлена аўтарам у 1987 г. Першы помнік сярод мясцовага насельніцтва мае назву «Акоп». Па краі пляцоўкі з боку поля захаваўся дугападобны вал вышынёй 2—5 м, шырынёй 10—12 м. З трох бакоў умацаваны ровам шырынёй 10—12 м, глыбінёй 2—4 м. З паўночнага боку маецца вялікіх памераў роў, які часткова размыў вялікі ўчастак берага ракі. Памеры помніка каля 150 × 120 м, у тым ліку пляцоўкі — 120 × 100 м.

У закладзеным шурфе ва ўсходняй, каля вала, частцы помніка (таўшчыня культурнага слоя 0,4 м), знойдзена абпаленая гліняная абмазка і больш за дзесятак абломкаў гладкасценных і са штрыхоўкай ляпных пасудзін



Культавы камень каля в. Выдрыца.

мілаградскай і зарубінецкай археалагічных культур. Па свайму тыпу гэты помнік аналагічны гарадзішчу каля в. Ухвала. Другое гарадзішча мае памеры каля 75 × 45 м, пляцоўка памерамі 50 × 35 м; дугападобны вал з боку поля вышынёй да 5 м, шырынёй 2—2,5 м. У пасляваенныя гады пашкоджаны вал і засыпаны роў: часткова па тэрыторыі помніка была пракладзена дарога. Паўночная частка пляцоўкі ў параўнанні з паўднёвай паніжана на 7—8 м. На пляцоўцы каля вала закладзены шурф памерамі 1 × 1 м; культурны слой да 0,6 м, у ім меліся попел і вугаль, знаходкі не выяўлены. Можна меркаваць, што асноўным гарадзішчам з'яўлялася першае, а другое ўмацаванне выконвала функцыю сховішча. Курганны некропаль лакалізаваўся каля вясковых могілак, ён поўнасцю разбураны. Пры абследаванні А.Г.Калечыц гэтага помніка ў 1979 г. тут меліся яшчэ 2 курганы дыяметрам 6 м, вышынёй каля 1,5 м. Каля в. Выдрыца, ва ўрочышчы Ляхаўка, выяўлены 6 курганоў, культавы камень, які знаходзіцца на полі, на паўночны ўсход ад вёскі, памерамі на ўзроўні паверхні зямлі каля 3 × 3 м, вышынёй каля 1,4 м.

Стаянку каменнага веку і селішча на левым беразе р. Бобр каля былой в. Шырневічы ў 1936 г. выявіў беларускі археолаг А.Дз.Каваленя. Курганы знойдзены таксама на правабярэжжы р. Бобр каля былога населенага пункта Слоўч.

Познасярэдневяковы могільнік каля пас. Прудок Выдрыцкага сельсавета знаходзіцца ва ўрочышчы Дзяцінная Гара, займае плошчу каля 1 га. Пры пасадцы маладога хваёвага лесу былі моцна пашкоджаны многія пахаванні, зверху абкладзеныя камянямі. На паверхні таксама выяўлены каменны крыж памерамі 0,75 × 0,6 м.

Знаходкі каменнага веку, курганы выяўлены ў розных месцах у наваколлі в. Гумны Ухвальскага сельсавета. Звесткі аб некаторых з гэтых курганоў ёсць у архіве Мінскага губернатара. Таксама знойдзены 5 каменных і 1 крамянёвая сякеры бронзавага веку. Асобныя курганы і рэшткі могільнікаў вядомы ў сямі мясцінах. Адзін з іх маецца ва ўрочышчы Рукаш, непадалёку ад левага берага р. Манча, левага прытоку Бярэзіны. У лесе захаваліся 3 насыпы дыяметрам каля 3 м, вышынёй да 0,5 м. Другі могільнік лакалізуецца ў лясным масіве ўрочышча Асавок, за 7 км на паўночны захад ад в. Гумны. Захавалася 6 курганоў дыяметрам 5—11 м, вышынёй 0,2—3 м. Трэцяе месца знаходзіцца за 3 км на поўдзень ад



Гарадзішча каля в. Радзіца.



Каменны крыж на курганным могільніку каля в. Лужа.

Курганы каля в. Лянок.



усходняй ускраіны в. Гумны, на ўскрайку балота пад назвай Паша. Астатнія курганы размешчаны на поўнач і захад ад в. Гумны. У в. Гумны ёсць селішча. Курганы знаходзяцца таксама каля в. Узнаж Ухвальскага сельсавета, ва ўрочышчы Салдацкія надзелы. Захаваліся 4 насыпы дыяметрам 5—9 м, вышынёй 0,8—1,6 м. Ёсць звесткі, што гарадзішча і курганны могільнік былі каля былога пасёлка Гаць. У родаабшчынным комплексе рэшткі курганных могільнікаў выяўлены ў 11 месцах, на якіх захаваўся 21 насып.

Ахоўны знак каля групы курганоў паблізу в. Лянок.

ВЕРХНЯНАЦКІ РОДААБШЧЫННЫ АРХЕАЛАГІЧНЫ КОМПЛЕКС-4 знаходзіцца ў верхнім цячэнні р. Нача (правы прыток р. Бобр). Родавым цэнтрам тут з'яўлялася гарадзішча каля в. Радзіца Ігрушкаўскага сельсавета. Помнік выяўлены Л.Д.Побалем у 1990 г. Земляное ўмацаванне, амаль што авальнае ў плане, знаходзіцца ва ўрочышчы Акоп, на адносна высокім правым беразе р. Блудная (Блудыня, Блудня). Пляцоўка памерамі 72 × 60 м доўгі час разворвалася. З аднаго боку на пляцоўцы насыпаны вал, ва ўсходняй частцы ёсць перамычка шырынёй 5 м. Ад яе ў абодва бакі пралягае роў. Паўночна-заходняя частка пляцоўкі пашкоджана, а роў на даўжыню каля 12 м засыпаны. У шурфе, закладзеным у цэнтральнай частцы гарадзішча, культурны слой таўшчынёй 0,4 м, там знойдзены 2 абломкі шлака і некалькі фрагментаў ляпных пасудзін, якія адносяцца да ранняга жалезнага веку. Захавалася частка курганнага могільніка з 8 насыпаў на правым беразе ракі, за 1,5 км ад гарадзішча.

Курганны могільнік каля в. Стараселле Ігрушкаўскага сельсавета знаходзіцца на месцы вясковых могілак. Захаваліся 3 курганы дыяметрам 9—10 м, вышынёй 1,8—2 м. Шмат курганоў было разбурана пазнейшымі пахаваннямі. Курганы, каменны крыж, сярэдневяковы могільнік і фундамент культавай пабудовы выяўлены ў лясным масіве, недалёка ад в. Лужа Ігрушкаўскага сельсавета. Яны размяшчаюцца на ўзвышшы, на плошчы памерамі 130 × 110 м. Значная частка могільніка разбурана пры разворванні. Захаваліся 34 курганы (часткова моцна разбураны) дыяметрам 2—15 м, вышынёй 0,4—2 м. На тэрыторыі некропаля пазней размяшчаліся могіл-

кі. На адным з пахаванняў захаваўся каменны крыж. У заходняй частцы ўзвышша маюцца рэшткі культавай пабудовы памерамі 37 × 16 м. Можна меркаваць, што гэта фундамент мураванай капліцы, якую збіраліся ўзвесці на гэтым месцы.

Курганы і помнік старажытнага промыслу знаходзяцца каля пас. Лянок Нацкага сельсавета. На правым і левым берагах р. Дубешні маецца адзін з найбольшых у раёне і адносна добра захаваўшыхся помнікаў — курганны могільнік і месца выпальвання драўнянага вугалю. На правабярэжжы рэчкі, у лесе, на плошчы каля 10 га маецца 80 насыпаў, у левабярэжнай забудаванай частцы захаваліся 3 насыпы сярод пабудоў. Дыяметр курганоў 3—10 м, вышыня 0,2—3 м. На тэрыторыі могільніка ўстаноўлены ахоўны знак. Месца выпальвання вугалю знаходзіцца за 200 м ад могільніка, паміж чыгункай і старой шашой. Гарадзішчападобнае земляное збудаванне ў плане круглай формы, дыяметрам па вонкавым краі 42 м, па грэбені вала 32 м, вышыня не менш за 4 м. З паўднёва-ўсходняга боку захаваўся ўваход на пляцоўку «роў» шырынёй да 3—4 м. Па форме яно нагадвае гарадзішча падобных форм «балотнага» тыпу, хоць і не мае да апошніх непасрэдных адносін. Мяркуецца, што атрыманы вугаль грузілі ў ладдзі, якія заходзілі ў р. Дубешня, і сплаўлялі да майстэрняў, дзе ён быў патрэбен для вытворчасці жалеза з балотных руд і іншых гаспадарчых патрэб, а таксама ў бязлесную зону сярэдняга і ніжняга Падняпроўя сучаснай тэрыторыі Украіны.

Адзін вялікі курган вядомы каля населенага пункта Прудзец Халопеніцкага сельсавета ў вярхоўях р. Нача. Грунтавы могільнік знаходзіцца каля пас. Малое Хацюхова Хацюхоўскага сельсавета. Курганныя могільнікі адкрыты ў двух месцах каля в. Вялікія Жаберычы Дакудаўскага сельсавета на адлегласці 0,8 км адзін ад аднаго ў левабярэжнай частцы р. Нача. Першы з іх знаходзіцца ва ўрочышчы Дубавіца, непасрэдна на беразе ракі непадалёку ад населенага пункта Шавяловка. У лесе на плошчы каля 5 га выяўлена 17 насыпаў дыяметрам 7—12 м, вышынёй 0,5—3 м. Другі могільнік знаходзіцца ва ўрочышчы Прыстань, за 3 км ад вёсак Вялікія Жаберычы і Радзіца. У лясным масіве на плошчы памерамі 240 × 60 м выяўлена 11 насыпаў дыяметрам 8—14 м, вышынёй 1,5—2,4 м. Група курганоў на плошчы 2,5 га знаходзіцца каля в. Клён Дакудаўскага сельсавета. Захавалася 36 насыпаў дыяметрам 3—11 м, вышынёй 0,3—2,4 м. У апісанні цэркваў і прыходаў Мінскай епархіі ў 1879 г. ёсць звесткі, што ў в. Ігрышча Хацюхоўскага сельсавета каля царквы знаходзіліся курганы. Пры абследаванні ўстаноўлена, што на месцы курганоў цяпер знаходзяцца вясковыя могілкі. Яны абгароджаны і займаюць плошчу каля 1 га. У самай паўночна-заходняй частцы іх захаваліся 2 курганы дыяметрам 5 і 9 м, вышынёй 0,6 і 2 м, таксама пашкоджаныя. Познасярэдневяковыя пахаванні на паверхні маюць скопішчы каменняў. Прылеглыя лясныя масівы — водападзел паміж верхняй часткай правабярэжжа рэк Нача і Сха, левым прытокам Бярэзіны (упадае каля Барысава). Гэты ўчастак водападзела з'яўляецца адміністрацыйнай граніцай паміж Крупскім і Барысаўскім раёнамі. У старажытнасці ён быў мяжой зямель родаабшчынных фарміраванняў басейна верхняй Начы і другой такой структуры ў басейне верхняй часткі р. Сха. Курганы каля п. Буда Халопеніцкага сельсавета таксама моцна пашкоджаны, захавалася некалькі насыпаў ва ўрочышчы Валатоўка. Каля в. Нача ў 19 ст. былі выяўлены 3 каменныя сякеры. Усяго вядома 193 насыпы ў 10 курганных могільніках.

СЯРЭДНЯБОБРСКІ РОДААБШЧЫННЫ АРХЕАЛАГІЧНЫ КОМПЛЕКС-5 умоўна выдзелены ў басейне сярэдняга цячэння р. Бобр і яе левага і правага прытокаў (цэнтральная частка Крупскага раёна). На жаль, тут вядома адносна мала старажытных помнікаў. Родавы цэнтр — старажытнае гарадзішча каля г.п. Бобр — ва ўрочышчы Замкі разбурана. Звесткі аб ім вядомы з гістарычных дакументаў 1882 г. У 1856 г. археолаг К.П.Тышкевіч каля в. Стары Бобр Бобрскага пассавета даследаваў адзін курган, які адносіўся да перыяду язычніцтва. Насып высокі, камянямі раздзелены на 3 гарызонты, нябожчык быў крэміраваны па індаеўрапейскаму звычаю. Група з 27 курганоў выяўлена ва ўрочышчы Царковішча, за 1,5 км на поўдзень ад в. Стары Бобр. Курганны комплекс каля в. Красноўка выяўлены аўтарам у 1989 г., займае тэрыторыю памерамі каля 150 × 100 м, змяшчае 53 насыпы дыяметрам 5—8 м, вышынёй 0,4—1,5 м; многія пашкоджаны скарбашукальніцкімі ямамі. Каля населенага пункта Шэйка ёсць 2 курганы.

Каменная шліфаваная клінападобная сякера ў 1983 г. выяўлена паміж вёскамі Чарняўка і Восава Бобрскага сельсавета, на беразе р. Елінка, за 8 км на поўдзень ад гарадзішча Бобр. Не выключана, што тут існавала

ідпаведнае паселішча бронзавага веку. Усяго вядома 86 насыпаў у 4 курганных могільніках.

СЯРЭДНЯБОБРСКА-ПЛІСКІ РОДААБШЧЫННЫ АРХЕАЛАГІЧНЫ КОМПЛЕКС-6. Ахоплівае сярэдняе цячэнне р. Бобр з прылеглым басейнам р. Пліса і яе левым прытокам Іллянка. Гэта тэрыторыя мала даследавана. Умацаваны родавы цэнтр — гарадзішча знаходзіцца ў в. Пліса Бобрскага пассавета на беразе рэчкі Пліса. Земляное ўмацаванне ўзвышаецца над акружаючай мясцовасцю на 6 м, памеры пляцоўкі 50 × 45 м. У паўднёва-ўсходняй яго частцы захаваўся вал вышынёй 0,5 м. Каля вёскі маюцца 3 курганы. Рэшткі курганнага могільніка знойдзены таксама каля населенага пункта Куты Бобрскага пассавета.

ВЕРХНЯБОБРСКІ РОДААБШЧЫННЫ АРХЕАЛАГІЧНЫ КОМПЛЕКС-7, займае басейн верхняга цячэння р. Бобр і яе прытокаў, паўночна-ўсходнюю частку раёна. Дадзеная тэрыторыя археолагамі практычна не вывучалася. Гарадзішча і селішча знаходзяцца паміж вёскамі Кіявец і Абчуга Абчугскага сельсавета, лакалізуюцца ў лясным масіве, пляцоўка гарадзішча мае памеры 40 × 30 м, умацавана валам.

СЯЛЯЎСКІ РОДААБШЧЫННЫ АРХЕАЛАГІЧНЫ КОМПЛЕКС-8, уключае паўночную частку раёна, басейны рэчак Ракітоўка, Высокая, Сухая, Югна і інш., якія ўпадаюць у воз. Сялява. Гарадзішча і селішча, якія выяўлены і даследаваны Л.Д.Побалем у 1955 г., знаходзяцца ва ўрочышчы Выспянская Гара на беразе воз. Сялява, каля сучаснага могільніка в. Клішына. Земляное ўмацаванне складаецца з 2 пляцовак: большая (асноўная) памерамі 65 × 28 м узвышаецца на 9 м над узроўнем вады ў возеры. З усходняга боку захаваўся невысокі вал. Культурны слой да 0,8 м, у шурфах у розных месцах пляцоўкі знойдзены шлак, абпаленыя камяні, косці жывёл, абломкі ляпных пасудзін жалезнага веку, сярэдневяковая кафля. Памеры другой пляцоўкі — 60 × 20 м. На селішчы сярод знаходак кераміка банцараўскай культуры. Каля в. Прошыка Акцябрскага сельсавета выяўлены 2 курганы дыяметрам 10 і 15 м, вышынёй 1,5 і 2,5 м. У 1979 г. А.Г.Калечыц выявіла ў гэтай мясціне каля 10 курганоў. Селішча жалезнага веку існуе на захад ад в. Клішына. На вясковым могільніку в. Клішына познасярэдневяковыя пахаванні. Стаянка каменнага веку выяўлена аў-

Доўгія курганы ў паўночнай частцы Крупскага раёна.



Курганы з каменнай абкладкай каля в. Язбы.

тарам каля пас. Старожышча, на заходнім беразе воз. Сялява. Тут знойдзена шмат апрацаванага крэменю. 4 курганы маюцца каля пас. Высокае Акцябрскага сельсавета, на паўднёва-ўсходнім беразе воз. Сялява. Курганы ў трох месцах выяўлены каля в. Дубы Акцябрскага сельсавета: 7 насыпаў на паўднёва-ўсходнім беразе воз. Сялява (тут ёсць каменныя крыжы); за 1 км ад берага возера, у лесе, 5 насыпаў дыяметрам 6—8 м, вышынёй 0,5—1,5 м; за 2 км на паўночны ўсход ад в. Дубы, у напрамку в. Калодніца — 2 насыпы дыяметрам 6 м, вышынёй 1,2 і 1,5 м; каля в. Язбы Акцябрскага сельсавета — 4 курганы і 2 каменныя крыжы. Група курганоў ёсць каля в. Асінаўка Крупскага сельсавета. Яна складаецца з 30 насыпаў у вярхоўях р. Высокай. 6 курганоў выяўлена каля в. Гузовіна, іх дыяметр да 12 м, вышыня 0,8—2,5 м. Стаянка каменнага веку ёсць таксама каля в. Вялікія Хальнявічы на паўночна-заходнім беразе воз. Сялява, ва ўрочышчы Ліпавец, каля вытока р. Югна. У комплексе ў 6 курганных некропалях 28 насыпаў.

Ахоўны знак, устаноўлены на гарадзішчы на беразе возера Сялява.

РОДААБШЧЫННЫ АРХЕАЛАГІЧНЫ КОМПЛЕКС ВЕРХНЯЙ ЧАСТКІ р. ЭСА-9 знаходзіцца ў Балтыйскім вадазборы. Родавы цэнтр — гарадзішча — размешчана каля в. Грыцкавічы Халопеніцкага сельсавета. У курганным могільніку захаваліся 4 насыпы. Каля царквы ёсць познасярэдневяковы каменны крыж. Курганы каля в. Дудзінка Халопеніцкага сельсавета знаходзяцца ва ўрочышчы Расцяроб. За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі раней было 11 насыпаў, захавалася 7 дыяметрам 6—18 м, вышынёй 1,2—1,3 м.

У заключэнне неабходна падкрэсліць, што прыведзеныя помнікі старажытнасці адносяц

Каменны крыж у в. Грыцкавічы.

ца да розных храналагічных перыядаў, пачынаючы з 3-га тысячагоддзя да н. э. Паселішчы каменнага і бронзавага вякоў выяўлены каля вёсак Клішана, Вялікія Хальнявічы, на правым беразе р. Бобр, каля былой в. Шырневічы, у межах Выдрыцкага сельсавета. Земляробчыя прылады працы, у першую чаргу каменныя сякеры, знойдзеныя каля вёсак Новыя Пышачы, Гумны, Буда, Чарняўка і ў іншых мясцінах, сведчаць пра тое, што чалавек пасяліўся тут многа тысячагоддзяў назад.

У 8—5 ст. да н.э. па сутнасці сфарміраваліся прымітыўныя першабытнаабшчынныя «дзяржавы». У кожным з такіх утварэнняў у адпаведных басейнах рэк былі ўзведзены земляныя ўмацаванні — гарадзішчы плошчай 0,3—0,6 га. Не менш дзевяці такіх утварэнняў мелася ў межах сучаснага Крупскага раёна. Зямельныя масівы па сутнасці былі падзелены сярод такіх цэнтраў-«дзяржаў». Іх перадзел прыводзіў да канфліктаў паміж асобнымі родамі. Навокал кожнага з гарадзішчаў утвараліся «старажытныя вёскі». Апошнія складаліся з асобных абшчыннікаў, іх сямей, якія вялі ў асноўным земляробча-жывёлагадоўчы ўклад жыцця. Развіваліся іншыя хатнія промыслы. Жыхары 2800—2500 гадоў таму назад з балотнай руды сыradутным спосабам атрымлівалі жалеза, з якога выраблялі розныя прылады працы, культава-міфалагічныя атрыбуты. Менавіта адзін з такіх вырабаў — фібула «з падвязанай ножкай» 2-га ст. н.э. — знойдзена на гарадзішчы Ухвала, якой не менш як 1800 гадоў. Насельнікі «старажытных вёсак» жылі ў адным калектыве, захоўвалі культава-міфалагічныя светапогляды і традыцыі сваіх далёкіх родзічаў славянскай галіны індаеўрапейцаў, якія ў пэўных гістарычна-эканамічных і фізіка-геаграфічных фактарах перайшлі да аселага ладу жыцця ў лясных і лесастэпавых абшарах Еўропы. Пэўныя элементы культуры ад тых далёкіх часоў, іх агульныя карані захаваліся да нашых дзён у фальклоры, этнаграфіі, народных звычаях, матэрыяльнай культуры.

Месцы лакалізацый «старажытных вёсак», паселішчаў, абшчын жалезнага веку і пазнейшых часоў выяўлены ў радзе пунктаў Крупскага раёна. Пры далейшых пошукавых работах селішчы могуць быць знойдзены недалёка ад курганных могільнікаў, якія вядомы ў 66 месцах. Агульная колькасць пахавальных насыпаў складае 550. Яны маюць храналагічныя межы ад сярэдзіны 1-га тысячагоддзя н.э. да 12—14 ст. і нават пазней. У многіх мясцінах вядомы познасярэдневяковыя могільнікі 14—17 ст. На асобных з іх сустракаюцца каменныя крыжы. Захаваліся культавыя камяні язычніцкіх часоў.

Л.Д.Побаль.

У СКЛАДЗЕ ПОЛАЦКАГА КНЯСТВА

Напачатку пісьмовай гісторыі Крупшчына ўваходзіла, верагодна, у склад Полацкага княства, на чале якога ў сярэдзіне 10 ст. стаяў князь Рагвалод. Каля 980 г. сын кіеўскага князя Святаслава наўгародскі князь Уладзімір заваяваў Полацкае княства, забіў Рагвалода і 2 яго сыноў, а дачку Рагнеду прымусіў стаць сваёй жонкай. Ён заваяваў таксама і Кіеў, дзе княжыў яго старэйшы брат Яраполк. З гэтага часу Крупшчына разам з усім Полацкім княствам уваходзіла ў склад усходнеславянскай дзяржавы — Кіеўскай Русі.

Род нашчадкаў Уладзіміра хутка размножыўся, падзяліўся на некалькі асобных галін. Яны раздзялілі паміж сабой тэрыторыю дзяржавы, утварыўшы паўсамастойныя княс-



Друцкае княства ў 14—16 стагоддзях.

твы. Князі фармальна прызнавалі старшынство таго, хто княжыў у Кіеве, але на справе мала лічыліся з ім. Больш трывала княствы аб'ядноўвалі агульная рэлігія і звязаныя з ёй пісьменнасць і летапісанне.

Полацкае княства (або Полацкая зямля) адасобілася раней за іншыя і, верагодна, у тых самых межах, якія мела пры Рагвалодзе. Яго ўзначалілі нашчадкі старэйшага сына Уладзіміра і Рагнеды — Ізяслава, які памёр раней за бацьку. Па мацярынскай лініі Ізяслаў і яго нашчадкі былі пераемнікамі папярэдняй полацкай дынастыі, таму летапісец назваў іх «Рагваложымі ўнукамі». Род іх працягваў драбіцца, у 12 ст. са складу Полацкага княства вылучыліся Віцебскае, Друцкае, Мінскае, пазней іх стала яшчэ больш.

Звестак, якія б тычыліся ў гэты час непасрэдна сучаснай Крупшчыны, у летапісах няма. Можна толькі і меркаваць, што большая частка яе тэрыторыі ўвайшла ў склад Друцкага княства. Цэнтрам яго быў старажытны горад Друцк (зараз вёска ў Талачынскім раёне), які ўзнік недалёка ад волаку паміж рэкамі Друць і Усвейка. Магчыма, друцкія князі кантралявалі і заходні, бярэзінскі водны шлях. Ва ўсякім выпадку, горад Барысаў быў заснаваны праўнукам Ізяслава Барысам Усяславічам — родапачынальнікам друцкай галіны «Рагваложых унукаў».

Іншым гарадскім цэнтрам паблізу ад Крупшчыны быў Лукомль (зараз вёска ў Чашніцкім раёне). Гэта быў вельмі старажытны і, паводле археалагічных звестак, квітнеючы ў 11—13 ст. горад, але ў летапісах няма звестак пра асобнае Лукомльскае княства. Можа, яно і існавала тады, але не было ўпамянута, а магчыма, Лукомль уваходзіў у Полацкае княства, у складзе якога быў цэнтрам асобнай акругі. Яна павінна была ахопліваць басейны рэк Усвейкі, Лукомкі і Улы. Мяжа Друцкай і Лукомльскай валасцей, напэўна, праходзіла недзе ў паўночнай частцы сённяшняга Крупскага раёна, перасякаючы або абмінаючы з поўдня воз. Сялява.

На Крупшчыне ў той час не было значных паселішчаў. Сведкамі тагачасных падзей з'яўляюцца толькі курганныя могільнікі. Яны раскіданы па ўсім раёне, але большасць іх захавалася ў глухіх лясных абшарах.

Колькасць насыпаў у могільніках невялікая — ад некалькіх штук да некалькіх дзе-

сяткаў. Гэта сведчыць пра тое, што паселішчы былі невялікімі і існавалі нядоўга.

Пра лад жыцця ў часы Кіеўскай Русі можна меркаваць, зыходзячы пераважна з агульных разважанняў. Напачатку існавання гэтай дзяржавы, у 9—10 ст., большасць вясковага насельніцтва была асабіста свабоднай. Людзі жылі ў невялікіх паселішчах і карміліся як з расчышчаных ляд, так і не ў меншай ступені з дароў лесу: палявалі, збіралі грыбы, ягады, лавілі ў рэках рыбу. Адным з важнейшых промыслаў было бортніцтва: на дрэвах падвешвалі калоды-борці, у якіх вяліся пчолы. Сяляне мелі зямельныя надзелы, атрыманыя ў спадчыну ад продкаў або распрацаваныя ўласнымі рукамі. Галоўнымі іх абавязкамі былі вайсковая павіннасць і выплата штогадовай даніны.

Тэрыторыя Крупшчыны з яе тагачасным насельніцтвам у некалькі тысяч чалавек была адной з вобласцей старажытнай дзяржавы і часткай яе гаспадарчага механізму. Мёд, воск, футра, здабытыя ў яе пушчах, звозіліся ў гарады і пагосты, адтуль на шматлікіх драўляных чоўнах іх сплаўлялі па рэках за мяжу. Частка даходу ад рэалізацыі даніны вярталася да сялян ускосна праз агульнае павышэнне культуры, якое адбывалася спачатку ў княжацка-баярскіх дварах, потым у асяроддзі гараджан і паступова распаўсюджвалася на сялянскае навакольле.

У 11—12 ст. старажытнаруская дзяржава, а разам з ёй і Полацкае княства, уступаюць у новы этап свайго развіцця. Адбылося першапачатковае назапашванне сродкаў у руках пануючага кола, і баярска-княжацкія вярхі пачалі абзаводзіцца ўласнай гаспадаркай. Вакол гарадоў з'явіліся асабістыя маёнткі князёў і буйнейшых баяр. Працавалі ў такіх дварах спачатку выключна рабы («чэлядзь нявольная»), набытыя ў ваенных паходах або на рынку. Паступова ўладальнікі маёнткаў пачалі пераходзіць да эксплуатацыі навакольнага вясковага насельніцтва. Яна адбывалася звычайна ў форме закладніцтва: збяднелы селянін атрымліваў грашовую пазыку, якую павінен быў адпрацоўваць у княжацкай гаспадарцы. Такія часова залежныя людзі называліся закупамі.

Смерды-вяскоўцы аб'ядноўваліся ў абшчыны, якія называліся «вервямі» або «мірамі». Насельніцтва несла калектыўную адказнасць за невыкрытае злачынства на сваёй тэрыторыі, рэгулявала тыя старонкі дзейнасці, якія тычыліся ўсіх: калектыўны выпас скаціны, лоўля рыбы з дапамогай драўляных загонаў (ёзаў) і г.д. Абшчына прымала ўдзел і ў размеркаванні («разрубе») падаткаў паміж асобнымі дварамі, яе прадстаўнікі прымалі ўдзел у судзе.

Надзел ворыва, скаціна і прылады працы былі асабістай уласнасцю сялян. Ужо з пачатку 12 ст. дзейнічаў зафіксаваны ў «Рускай праўдзе» (зборы законаў пачатку 12 ст.) прынцып, паводле якога надзел, уладальнік якога не пакінуў пасля сябе сыноў або зяця, адыходзіў у распараджэнне не абшчыны, а дзяржавы ў асобе князя. Князь мог аддаць такі вымарачны надзел іншаму селяніну (выхадцу са шматдзетнай сям'і або прышламу) на пэўных умовах, напрыклад з патрабаваннем аддаваць частку ўраджаю ці адпрацоўваць штогод пэўны тэрмін у княжацкай гаспадарцы.

У выніку сяляне пачалі падзяляцца на вольных (тых, хто жыў на бацькоўскай і дзедаўскай зямлі і быў абавязаны выплачваць толькі традыцыйную даніну) і феадальна-залежных (тых, хто асеў на княжацкай зямлі і выконваў дадатковыя павіннасці). Паколькі ў кожным пакаленні частка вольных сялян не пакідала пасля сябе сыноў, колькасць княжацкай зямлі няўхільна павялічвалася. Асабліва актыўна гэты працэс ішоў, напэўна, вакол гарадоў і ў тых месцах, дзе існавалі прыватныя двары князя і баяр.

Але тэрыторыю Крупшчыны, хутчэй за ўсё, адзначаныя працэсы закранулі адносна слаба. Тут няма ніводнага археалагічнага помніка, які можна было б лічыць княжацкім або баярскім дваром 11—18 ст. Галоўным абавязкам мясцовых сялян заставалася даніна натуральнымі прадуктамі. Паступова губляла сваё значэнне вайсковая павіннасць, бо войска рабілася ўсё больш прафесійным. На першы план у ім выходзіла цяжкаўзброеная рыцарская конніца, у якую набіраліся баяры-дружыннікі. Сялянам жа, апрача даніны, заставалася выконваць перыядычныя работы на будаўніцтве гарадскіх умацаванняў, дарог для праходу войска, пастаўляць транспарт для перавозкі ваенных і дзяржаўных грузаў.

В.Л.Насевіч.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

У 14 ст. тэрыторыя Крупскага раёна ўвайшла ў склад новай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ). На жаль, ад гэтых часоў захаваліся толькі ўрывачныя, адзінкавыя звесткі. Значная частка Крупшчыны тады па-ранейшаму ўваходзіла ў склад Друцкага княства і падзяляла яго лёс. Князі Друцкія, якія пасля амаль двухсотгадовага перапынку пачынаюць згадвацца ў крыніцах сярэдзіны 14 ст., былі ўжо васаламі вялікіх князёў літоўскіх, хоць яшчэ захоўвалі рэшткі былой самастойнасці. Вядома, што вялікі князь Гедзімін, а затым яго сын Альгерд праводзілі палітыку аб'яднання княстваў, якія некалі ўваходзілі ў склад разбуранай татарскім нашэсцем Кіеўскай Русі. У русле гэтай палітыкі іх верхавенства распаўсюдзілася і на Друцкае княства. Захад і поўдзень сучаснага раёна, верагодна, у 14 ст. ўжо належалі да іншага цэнтра — Барысава, які перайшоў у непасрэдную ўласнасць вялікага князя. Магчыма, гэта адбылося ў сувязі з падзеямі, пра якія паведамляе адзін з беларуска-літоўскіх летапісаў — Хроніка Быхаўца.

У 1392 г. вялікім князем літоўскім у выніку жорсткай барацьбы з сапернікамі стаў Вітаўт Кейстутавіч. Неўзабаве, каля 1394 г., памёрла ўдава былога вялікага князя Альгерда Ульяна Цвярская, якая пажыццёва валодала Віцебскім княствам. Вітаўт ператварыў гэта княства ў дзяржаўную ўласнасць і накіраваў туды намеснікам свайго набліжанага баярына, сакольнічага Фёдара Вясну. Аднак малодшы сын Альгерда і Ульяны, князь Свідрыгайла, не пагадзіўся з гэтым рашэннем і ўзняў мяцеж супраць Вітаўта. Віцябляне падтрымалі яго, да мяцяжу далучыліся Друцк і Орша.

Падтрымку Вітаўту аказаў старэйшы брат Свідрыгайлы, кароль Польшчы Уладзіслаў Ягайла. З вялікім войскам Вітаўт рушыў на падаўленне мяцяжу і спачатку прыйшоў да Друцка. Мясцовыя князі выказалі пакорлівасць, за што Вітаўт дараваў ім удзел у мяцяжы і нанава пажалаваў Друцкае княства са сваіх рук, але ўжо не як спрадвечную вотчыну, а як наданне на ўмовах бездакорнай службы. Орша ж і Віцебск былі ўзяты пасля аблогі, яны ў далейшым ператварыліся ў велікакняжацкую ўласнасць і кіраваліся намеснікамі. Падобным шляхам мог трапіць да вялікага князя і Барысаў.

Цікава, што яшчэ ў 19 ст. ў народзе захоўвалася паданне пра паход Вітаўта праз Барысаўскую і Друцкую воласці. Гэта паданне згадвае Павел Шпілеўскі ў сваім «Падарожжы па Палессі і беларускаму краю». У прыватнасці, ён пазначае, што стары шлях праз Начу і Крупкі мясцовае насельніцтва звала «Вітаўкай», а недалёка ад в. Маласаі, што знаходзілася за 5 км на паўднёвы захад ад Крупак, быў «Вітаў калодзезь», выкладзены каменнем. Яго нібыта выкапалі па загаду князя «Віта» ў час яго паходу. Тады ж быццам бы продкі маласаеўцаў ахвяравалі на пракорм войска некалькі валоў, за што князь даў ім прывілей аб вызваленні ад усіх падаткаў. Апошняе малаверагодна: звесткі пра Маласаі з'яўляюцца ў інвентарах Барысаўскай воласці толькі ў 18 ст., прычым насельнікамі вёскі былі не вольныя, а цяглыя сяляне. Аднак сам факт, што ў гэтых мясцінах існавала тапаніміка, звязаная з імем Віта (Вітаўта), нельга лічыць выпадковым. Напэўна, войска Вітаўта сапраўды прайшло праз гэтыя лясістыя мясціны з захаду на ўсход, пакідаючы пасля сябе прасекі, масты, грэблі і калодзежы, якія яшчэ доўга выкарыстоўвалі потым мясцовыя жыхары. Ва ўсякім выпадку, у канцы 14 ст. Барысаўская воласць падпарадкоўвалася непасрэдна Вітаўту. Апошні ў 1396 г. выдаў яе насельнікам («борысовцам») спецыяльны прывілей, у якім вызначаў парадак прыёмкі і ўліку мядовай даніны. З прывілея вынікае, што сяляне самі прывозілі мёд у Барысаў, дзе яго ўзважваў велікакняжацкі цівун. Для прадухілення злоўжыванняў Вітаўт забараніў цівуну карыстацца ўласным бязменам. Мернай адзінкай павінен быў быць «вялікі камень меньскі», а працэс узважвання належала ажыццяўляць «па старыне» прадстаўніку сялян у прысутнасці цівуна і сведкаў. З'яўленне прывілея, напэўна, тлумачыцца хадайніцтвам сялян і іх скаргамі на абважванні з боку цівуна.

На жаль, пры ўпамінаннях Барысаўскай воласці, неаднаразовых у 14—16 ст., практычна не называюцца паселішчы, з якіх яна складалася. Таму мы не ведаем, якія з іх (у тым ліку на абшарах Крупшчыны) ужо існавалі ў гэты час. Захавалася толькі ўпамінанне пра сяло Горадна, і то выпадкова — дзякуючы нямецкаму дыпламату і падарожніку Сігізмунду Герберштэйну. Апошні двойчы ездзіў з пасольствам у Маскву, прычым абодва

Герб князёў Друцкіх.

разы, у 1517 і 1526 гг., на зваротным шляху праз Оршу і Друцк на Барысаў праязджаў праз Горадна (якое ён у сваім дзённіку называе «Гродна»). Маршрут Герберштэйна, дарэчы, сведчыць, што ў той час сучасны шлях праз Талачын на Бобр і Крупкі яшчэ не ўсталяваўся. Пасольства ехала, забіраючы больш на поўдзень. Дзякуючы Герберштэйну, «Запіскі аб маскоўскіх справах» якога былі надрукаваны ў 1549 г. і карысталіся папулярнасцю ў Заходняй Еўропе, нічым не знамянальнае Горадна трапіла на карты Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, выдадзеныя Вацлавам Градзецкім у 1558 г. і Якубам Гаштальдзі ў 1567 г. Такім чынам, гэта першы населены пункт Крупшчыны, які набыў еўрапейскую вядомасць.

Больш звестак захавалася пра тыя паселішчы, якія ўваходзілі ва ўладанні князёў Друцкіх. Яны не былі так вядомы ў Еўропе, затое трапілі на старонкі дакументаў так званай Літоўскай метрыкі — архіва велікакняжацкай канцылярыі.

Прыкладна ў сярэдзіне 14 ст. жыў князь Васіль Міхайлавіч Друцкі, з імем якога звязана першае непасрэднае ўпамінанне тэрыторыі Крупшчыны ў гісторыі. Гэты князь разам з жонкай Васілісай падараваў друцкай царкве пэўную маёмасць, аб чым зрабіў запіс на старонцы евангелля, якое ён жа перадаў у царкву. У ліку гэтага дару вызначана «на Худове полулуконье» — гэта значыць, даніна мёдам у памеры палавіны лукна, лукно — старажытная мера аб'ёму, вялікі кош прыкладна ў 25 кг, якую выплачвалі жыхары паселішча Худава. Такім чынам, Худава з'яўляецца найбольш старажытным з вядомых паселішчаў Крупшчыны. Знаходзілася яно не на месцы сучаснай в. Худава, што на беразе воз. Сялява. Як паказалі археалагічныя росшукі аўтара гэтых радкоў, там няма культурнага слою 14-га і нават 2 наступных стагоддзяў. Напэўна, на сённяшняе месца Худава было перанесена пазней, а спачатку яно знаходзілася недзе на беразе Худаўскага возера, за 2 км на захад, і было цэнтрам для навакольнай акругі. Аб гэтым сведчыць і тое, што на паўднёва-заходнім беразе Худаўскага возера, на ўсход ад сучаснай в. Дакучын, знойдзены старажытны могільнік. У ім маюцца як звычайныя курганы, так і вельмі рэдкія на Беларусі курганы з каменнай абкладкай, больш познія грунтовыя пахаванні з каменнай стэлай у галавах, пераход да якіх адбыўся ў 13 ст. На могільніку маюцца таксама два грубыя каменныя крыжы. Два вялікія курганы да нядаўняга часу захоўваліся і на ўсходнім беразе возера. Не выключана, што ў старажытнасці Худава было цэнтрам асобнай воласці Друцкага княства, якая ахоплівала ўсю цэнтральную частку Крупшчыны.

Род Друцкіх ужо ў канцы 14 ст. быў даволі разгалінаваным, але не ўсе яго прадстаўнікі пакінулі нашчадкаў. Напачатку наступнага стагоддзя вядомы князь Сямён Дзмітрыевіч Друцкі, які ўпамінаецца з 1401 г. па 1422 г. Ён пакінуў 6 сыноў, ад якіх у далейшым пайшлі некалькі галін роду. Дакладныя звесткі пра іх землеўладанне захаваліся ў асноўным з пачатку 16 ст., але кантэкст гэтых звестак дазваляе прасачыць папярэднюю гісторыю большасці маёнткаў. Адным з уладанняў Сямёна Дзмітрыевіча і яго сыноў было Худава. Гэта паселішча ляжала далёка ад цэнтральнай часткі Друцкага княства, не менш чым за 45—50 км ад Друцка. Магчыма таму ўладальнікі княства не вялі там сваёй гаспадаркі, задавальняючыся данінай. Калі сыны князя Сямёна дзялілі паміж сабой бацькоўскія ўладанні, то Худава яны дзяліць не сталі, а толькі падзялілі даніну, якая паступала з яго. Дарэчы, у гэты час род князёў Друцкіх падзяліўся на некалькі галін, дадаўшы да прозвішча Друцкі другое ў залежнасці ад назвы маёнтка: Друцкія-Любецкія, Друцкія-Азярэцкія, Друцкія-Саколінскія і інш. Такое сумеснае валоданне Худавам прасочваецца і пазней. Так, у 1536 г. праўнукі аднаго

з сыноў Сямёна Дзмітрыевіча, князі Дзмітрый, Багдан, Іван і Януш Друцкія-Любецкія, дзялілі маёнткі свайго памёршага бацькі Рамана Васілевіча. Сярод гэтых маёнткаў згадваецца і Худава. Нашчадкі іншых сыноў Сямёна Дзмітрыевіча таксама мелі долю ў Худаўскім маёнтку. У 1546 г. адбыўся суд паміж адным з чатырох згаданых вышэй Друцкіх-Любецкіх, Дзмітрыем, і прадстаўніком іншай галіны — Андрэем Іванавічам Друцкім-Азярэцкім. Андрэй абвінавацiў Дзмітрыя ў тым, што той незаконна захапіў Перасецкую і Худаўскую землі — спадчыну Андрэя па яго прадзеду Івану Сямёнавічу Бабе. Дзмітрый, аднак, сцвярджаў, што разам з іншымі родзічамі мае сумесныя, дагэтуль яшчэ не падзеленыя ўладанні ў азначаных маёнтках. Разбіраўшы справу, вялікі князь загадаў Андрэю і Дзмітрыю палюбоўна падзяліць і размежаваць спрэчныя землі. Частка гэтай спадчыны належала пазней Васілю Юр'евічу Друцкаму-Талачынскаму, які памёр у 1546 г. У 1551 г. спадкаемцы апошняга прыгадвалі, што маёнтак Худава разам з часткай Друцкага замка і Коханавам (зараз у Талачынскім раёне) князь Талачынскі набыў у якасці «спадку Васілеўскага» — напэўна, пры падзеле вымарачнай спадчыны Васіля і Івана Друцкіх-Красных. Крыху раней, у 1547 г., удава Васіля Талачынскага скардзілася на Івана Раманавіча Друцкага-Любецкага за крыўды, якія ён чыніў ёй у сумесным маёнтку Худава.

Паводле звычаю, які дзейнічаў у той час, феадальныя вотчыны разглядаліся не як прыватная, а як родавая маёмасць. Уладальнік мог вольна распараджацца не больш чым трэцяй часткай такіх маёнткаў, астатнія павінны былі адысці ў спадчыну родзічам, што і адбывалася ў вышэйзгаданых выпадках. Гэты звычай быў скасаваны толькі Статутам Вялікага княства Літоўскага 1566 г.

Тую трэць вотчыны, якою князь Іван Васілевіч Красны мог распараджацца без абмежаванняў, склалі сёлы Бобр, Сакалавічы і Недахудава (магчыма, нейкая частка таго ж Худава). У 1516 г. Іван завяшчаў іх сваёй жонцы Марыне Іванаўне з роду князёў Заслаўскіх. У далейшым сярод уладанняў князёў Друцкіх гэтыя паселішчы не згадваюцца. Напэўна, удава князя Краснага прадала ці завяшчала іх некаму. Праз некалькі дзесяцігоддзяў, у 1559 г., уладальнікам Бабра з'яўляўся вядомы дзяржаўны дзеяч, віленскі кашталян (дзяржаўная пасада ў ВКЛ) Ераніім Аляксандравіч Хадкевіч. Як ён набыў гэты маёнтак — дакладна невядома.

Астатняя частка Худаўскай воласці ў далейшым таксама выйшла з уладанняў князёў Друцкіх. Тая доля, што належала Дзмітрыю Друцкаму-Любецкаму (а магчыма, і долі яго братоў), перайшла да яго пасынка — князя Рыгора Іванавіча Сенскага, а затым — да дзяцей сястры апошняга Багдана ад шлюбу з Васілём Міхайлавічам Корсакам. У 1562 г. іншы саўладальнік Худава, князь Багдан Андрэевіч Друцкі-Азярэцкі, прызнаў за дзяцьмі Багданы Сенскай права карыстацца часткай гэтага маёнтка з некалькімі сёламі ў сучасных Талачынскім і Крупскім раёнах.

Тая ж частка Худава, што пасля князёў Красных належала Васілю Друцкаму-Талачынскаму, у 1551 г. стала аб'ектам спрэчкі паміж яго ўдавой Марыяй Багданаўнай Заслаўскай, якая аднавіла шлюб з новагародскім (навагрудскім) ваяводам Іванам Гарнастаем, і сёстрамі памёршага — Людмілай і Настассяй. Пры разглядзе справы высветлілася, што адну трэць маёнткаў Васіль Талачынскі падарыў сваёй жонцы, а астатнія дзве трэці аддаў ёй жа ў заклад за суму ў 500 коп. літоўскіх грошаў (грош — асноўная грашовая адзінка ў ВКЛ 14—16 ст.). Таму і гэтыя дзве трэці былі пакінуты ва ўладанні Марыі і яе новага мужа да таго часу, пакуль кроўныя родзічы Васіля не выкупяць іх за азначаную суму. Фактычна большасць спадчыны князя Талачынскага заставалася ў руках Марыі да яе смерці ў 1559 г., а затым перайшла да яе пасынкаў. Да гэтай спадчыны адносілася не толькі доля ў Худаве, але і сяло Кіявец, прыпісанае да маёнтка Коханава. Яно ўпершыню згадваецца ў 1562 г. сярод іншых гарнастаеўскіх уладанняў.

Як ужо згадвалася вышэй, доля ў Худаве належала таксама князям Друцкім-Азярэцкім — нашчадкам Івана Сямёнавіча Бабы. Праўнук апошняга Андрэй Іванавіч Азярэцкі ў 1546 г. меў гэтую долю яшчэ не размежаванай з доляй князёў Любецкіх. Перад смерцю ў 1557 г. Андрэй пакінуў завяшчанне. З яго вынікае, што князям Азярэцкім на Крупшчыне належала, апрача Худава, частка Грушкі (сучасная Ігрушка).

Грушка, як і Худава, належала адначасова некалькім прадстаўнікам роду Друцкіх. Бацька Андрэя Азярэцкага, Іван Фёдаравіч, быў адным з чатырох сыноў Фёдара Іванавіча Бабіча. Нашчадкі іншых сыноў апошняга, у прыватнасці Сямёна Саколінскага і Фёдара Каноплі, таксама мелі долю ў Грушцы. Іван

Сямёнавіч Друцкі-Саколінскі ў 1-й чвэрці 16 ст. завяшчаў сваю долю «даннікаў на Грушцы» аднаму з буйнейшых праваслаўных цэнтраў ВКЛ — Кіева-Пячэрскаму манастыру. Іншыя саўладальнікі, аднак, не вельмі паважліва ставіліся да яго волі і раз-пораз накіроўвалі манастырскую частку даніны ў сваю кішэнь. Манахі, натуральна, скардзіліся вялікаму князю. Да нас дайшлі дзве судовыя пастановы наконт Грушкі. Адна з іх (1524 г.) забараняла ўступаць у манастырскую даніну братам Івана Сямёнавіча, а другая (1530 г.) — унуку Фёдара Каноплі Канстанціну Фёдаравічу.

Шматлікія князі Друцкія не былі адзінымі ўладальнікамі абшараў у цэнтральнай частцы Крупскага раёна. Ужо ў пачатку 15 ст. частка Друцкага княства разам з даннікамі ў гэтым абшары знаходзілася ў руках іншага рода — князёў Адзінцэвічаў.

Першыя больш-менш падрабязныя звесткі пра князёў Адзінцэвічаў адносяцца да часоў панавання Свідрыгайлы Альгердавіча (1430—32) і Жыгімонта Кейстутавіча (1432—40), паміж якімі пасля смерці Вітаўта разгарэлася жорсткая барацьба за ўладу. Паводле радаводу, тады жылі праўнукі заснавальніка роду Івана Адзінца — Аляксандр і Фёдар Андрэевічы. Сястра іх нібыта была жонкай Жыгімонта Кейстутавіча, што не перашкодзіла братам стаць на бок Свідрыгайлы. Пасля паражэння апошняга ў бітве пад Вількамірам у 1435 г. князь Аляксандр Адзінцэвіч (названы Рэпухаўскім па назве маёнтка Рэпухаў у Талачынскім раёне) з'ехаў у Маскву разам з адзіным сынам. Уладанні яго былі канфіскаваны Жыгімонтам і перададзены літоўскаму пану Юшку (Юрыю) Гайцавічу. Апошні завяшчаў сваю «выслугу на вялікім князе Жыгімонце» — маёнтак Рэпухаў з сялом Воўкавічы і даннікамі ў Шырневічах — жонцы Ганне Даўгірдаўне. Тая пасля яго смерці выйшла замуж за Івана Іллініча і ў 1481 г. падаравала яму спадчыну першага мужа.

Са згаданых пунктаў на тэрыторыі Крупшчыны знаходзіліся Шырневічы, якія размяшчаліся на правым беразе р. Бобр за 6 км ніжэй райцэнтра (зараз не існуюць). Пазней Іван Іллініч набыў у нашчадкаў князя Івана Сямёнавіча Пуцяты Друцкага (роднага брата Івана Бабы) маёнтак Варанцэвічы недалёка ад Талачына. Магчыма, і да гэтага маёнтка адносілася частка даннікаў з Шырневіч, або пазней Іллініч перапісаў на Варанцэвічы тых сялян, што належалі да Рэпухаўскага маёнтка. Ва ўсякім выпадку, калі ў 1559 г. Варанцэвіцкая воласць часова трапіла да вялікага князя і была прыпісана да дзяржаўнага Аршанскага замка, у яе складзе былі сёлы Шырневічы (19 дымоў, 5 служб), Грушка (20 дымоў, 4 службы), Сакалавічы (12 дымоў, 4 службы) і Яльняне (пазнейшыя Ільяны ў Талачынскім раёне каля мяжы Крупскага), якія згадваюцца ў інвентары замкавай воласці ў 1560 г.

У Аляксандра Рэпухаўскага застаўся брат Фёдар, які ўпамінаецца на працягу 1432—42 гг. Ён пакінуў трох сыноў-ад даволі позняга шлюбу. З іх старэйшы, Дзмітрый Фёдаравіч, памёр прыкладна напачатку 16 ст., а яго сыны прынялі ўдзел у мяцяжы Міхаіла Глінскага і разам з ім у 1508 г. з'ехалі ў Расію. Іх маёнткі былі перададзены братам Дзмітрыя Івану, Багдану і Рыгору Фёдаравічам Адзінцэвічам, але ў Дзмітрыя засталася дачка Ганна, якая ў 1510 г. дамагалася сваіх правоў на бацькоўскія ўладанні: Гальцова (паблізу Рэпухава), Крывую (паблізу Друцка) і Шыйку на Крупшчыне. Ганна атрымала судовае рашэнне на сваю карысць, але фактычна азначаныя маёнткі заставаліся ў руках яе дзядзькаў і сыноў, якія згадваюцца як іх уладальнікі ў 1527 г.

Уладанні князёў Адзінцэвічаў мелі тую ж структуру, што і ўладанні князёў Друцкіх. Яны ўключалі двары і сёлы ў цэнтральнай частцы княства, паблізу Друцка, да якіх належалі даннікі з глухой ускраіны — Шырневічы і Шыйка. З больш позніх дакументаў вынікае, што разам з Шыйкай Адзінцэвічы валодалі і часткай Грушкі.

Яшчэ адна частка Друцкага княства ў 1-й палавіне 16 ст. належала літоўскаму князю Сямёну Ямантовічу Падбярэзскаму (ад маёнтка Падбярэззе каля Талачына). Якім чынам яна трапіла да яго, невядома. Не выключана, што раней гэта была ўласнасць аднаго з сыноў Івана Пуцяты Друцкага. Сямён Падбярэзскі памёр у 1540 г. бяздзетным, а за яго ўладанні судзіліся пазней удава Фядора Заслаўская і сястра Ульяна Ямантаўна з двума сынамі.

Карыстаючыся правам кроўных родзічаў, Ульяна адсудзіла маёнткі свайго брата ў яго ўдавы на карысць сваіх сыноў — Рыгора і Івана. Пры падзеле гэтых маёнткаў у 1542 г. Рыгор атрымаў Падбярэззе і ў далейшым даў пачатак шляхецкаму роду Падбярэзскіх. Пры гэтым да Падбярэззя адносіліся даннікі ў розных паселішчах, у тым ліку ў Яльнянах і на Грушцы. Такім чынам, і ўладальнікі гэтага

маёнтка мелі дачыненне да тэрыторыі Крупшчыны.

Іншым быў лёс паўночнай часткі Крупскага раёна, якая першапачаткова ўваходзіла не ў Друцкае, а ў Лукомльскае княства. Апошняе напачатку 15 ст. належала князям Лукомскім, паходжанне якіх дакладна не высветлена. Яны маглі належаць, падобна князям Друцкім, да аднаго з адгалінаванняў старажытных полацкіх князёў. Упамінанні аб князях Лукомскіх з'яўляюцца ў крыніцах 2-й палавіны 15 ст., але да гэтага часу частка іх вотчыны ўжо адышла ў рукі іншых уладальнікаў.

Так, часткай Лукомльскага княства да сваёй смерці каля 1450 г. валодаў літоўскі князь Федка Даўгоўдавіч, а затым у 1451 г. вялікі князь перадаў яе аднаму з найбольш уплывовых паноў, віленскаму ваяводзе і канцлеру Міхаілу Кезгайлу. Гэты маёнтак уключаў 12 чалавек (дакладней — сямей) у самым Лукомлі, а таксама 10 сямей даннікаў і 11 служылых людзей у вярхоўях р. Эсы, у сёлах Хлопавічы, Астапкавічы і Літовічы. З іх Хлопавічы, верагодна, азначаюць назву сяла Халопенічы, якое пазней, пасля згасання роду Кезгайлаў у сярэдзіне 16 ст., згадваецца як уладанне іх спадкаемцаў.

Воласць у вярхоўях Эсы знаходзілася ў руках паноў Кезгайлаў на працягу стагоддзя, але не захавалася ніякіх падрабязнасцей пра яе жыццё ў гэты час. Так адбылося таму, што прадстаўнікі гэтага рода валодалі шматлікімі маёнткамі ў розных канцах дзяржавы, сярод якіх нешматлюдныя ў той час паселішчы лукомльскіх даннікаў не мелі істотнага значэння.

Паўночна-ўсходні кут Крупшчыны адносіўся да маёнтка Чарэя, які ў сярэдзіне 15 ст. вылучыўся са складу Лукомльскага княства. Гэтым маёнткам валодаў баярын Іван — верагодна, выхадзец з віцебскага баярства, бо ён меў яшчэ маёнткі пад самым Віцебскам. Іван Чарэйскі пакінуў 5 сыноў. Адзін з іх, Місаіл, зрабіў выдатную царкоўную кар'еру — ён стаў смаленскім епіскапам, а незадоўга да смерці, у 1475 г. — праваслаўным мітрапалітам Кіеўскім і ўсея Русі. У 1454 г. Місаіл заснаваў недалёка ад Чарэі манастыр у гонар Святой Тройцы. Сыны яго рана памёршага брата Дашкі — Іван, Васіль, Алехна і Сенька Дашкавічы — каля 1475 г. ахвяравалі на гэты манастыр частку Чарэйскага маёнтка з ворыўнай зямлёй ва ўрочышчы Клубынічы.

Сенька Дашкавіч пры гэтым захаваў частку Чарэі з зямлёй ва ўрочышчы Асечня, якую пазней яго сын Васька Сенькавіч адпісаў у дар князю Багдану Фёдаравічу Адзінцэвічу. Гэта вынікае з пацвярджэння, якое ў 1524 г. Б.Ф.Адзінцэвіч разам з сынам Сямёнам атрымаў на набытыя ім маёнткі, у тым ліку і азначаную зямлю. Іншыя часткі Чарэйскага маёнтка належалі братам Місаіла Сямёну (Сеньку) і Мікіту Іванавічам. З іх доля Мікіты ў далейшым адышла да яго нашчадкаў. Сямён не меў сыноў, таму пасля яго смерці ў 1457 г. яго доля трапіла да дачкі Марыі, жонкі князя Фёдара Фёдаравіча Друцкага-Саколінскага. Яна мела сына Фёдара і дачку Федку, якая выйшла замуж за смаленскага баярына, велікакняжацкага пісара Багдана Сямёнавіча Сапегу. Апошні пазычыў цешчы пэўную суму грошай пад заклад Чарэйскага маёнтка, а калі яна не вярнула своечасова доўг, уступіў ва ўладанне гэтым маёнткам. У далейшым, нягледзячы на шэраг судовых працэсаў з боку Марыі і яе сына Фёдара, Чарэя так і засталася ў руках Сапегі. Больш таго, ён набыў і права апекі над манастыром, спасылаючыся на тое, што гэта права ў 1475 г. завяшчаў яму епіскап Місаіл. Напачатку 16 ст., калі смаленскія вотчыны Сапегаў былі захоплены Маскоўскай дзяржавай, Чарэя зрабілася адным з галоўных маёнткаў для дзяцей і ўнукаў Багдана Сапегі.

Самая поўнач Крупшчыны, паміж азёрамі Сялява і Лукомскае, з даўняй пары заставалася ўласнасцю князёў Лукомскіх. Адзін з іх, Андрэй Андрэевіч Меляшкоўскі (ад назвы маёнтка Меляшковічы ў Чашніцкім раёне), у 1554 г. валодаў сялом Халаневічы (сучасныя Вялікія Хальневічы). З больш позніх крыніц вынікае, што ўладанні князёў Лукомскіх цягнуліся да правабярэжжа Эсы, але звестак пра населеныя пункты 16 ст. на гэтым абшары няма.

У параўнанні з папярэднімі стагоддзямі ў часы ВКЛ характар землеўладання на тэрыторыі Крупшчыны істотна змяніўся. Вялікія паўсамастойныя княствы (Друцкае, Лукомльскае) распаліся, а на іх месцы ўтварыўся шэраг асобных маёнткаў. Характэрнай рысай Крупшчыны была адначасовая прыналежнасць яе паселішчаў некалькім землеўласнікам. Так, Худаўская воласць, прыпісаная спачатку да Друцка, а затым да Сянна, была ўласнасцю розных галін князёў Друцкіх, пазней — Друцкіх-Азярэцкіх сумесна з панамі Корсакамі. Грушка належала часткова ўладальнікам Варанцэвіч і Падбярэззя, часткова Кіева-Пячэрскаму манастыру і некаторым з

князёў Друцкіх (магчыма, таксама і Адзінцэвічаў). Частка Сакалавічаў адносілася да Бабра, частка — да Варанцэвіч. На Крупшчыне не ўзнікла ніводнага самастойнага маёнтка, які не быў бы часткай больш значных уладанняў.

Тэрыторыю Барысаўскай воласці, якая часткова ахоплівала Крупшчыну, гэты працэс увогуле не закрануў. Яна захавала, напэўна, тую ж структуру (сялянскія абшчыны на чале з выбарнымі старцамі ды княжы цівун, што кантраляваў збор падаткаў), толькі замест аднаго з паўсамастойных князёў перайшла ў падпарадкаванне да вялікага князя літоўскага. Галоўнай праблемай для тамашніх сялян заставалася ліхаімства намеснікаў, якія імкнуліся хутчэй узбагаціцца за іх кошт. Намеснікамі ў Барысаў прызначаліся традыцыйна вельмі багатыя і ўплывовыя людзі (доўгі час воласць «па пасадзе» належала віленскім ваяводам), таму знайсці на іх управу было не так проста.

У 1522 г. віленскім ваяводам, канцлерам і адначасова барысаўскім намеснікам («дзяржаўцам») стаў заможны літоўскі пан Альбрэхт Гаштольд. Пра памеры яго багацця сведчыць тое, што паводле перапісу войска ВКЛ у 1528 г. ён павінен быў выстаўляць са сваіх маёнткаў 466 конных воінаў. Адзін коннік ставіўся з 8 служб (прыкладна з 16 сялянскіх двароў), такім чынам Гаштольду належала каля 7,5 тысячы сямей, прыкладна 40—50 тысяч падданых — цэлая дзяржава ў дзяржаве.

Нягледзячы на такую колькасць уласных падданых, Гаштольд адразу прыняўся жорстка эксплуатаваць дзяржаўных сялян Барысаўскай воласці — абклаў іх разавым паборам («віншчынай») нібыта за нейкую павіннасць, устанавіў нечуваны дагэтуль памер «пуцёўшчыны» (падатку на выкананне кур'ерскай і падводнай павіннасцей). Калі ваявода выязджаў у воласць для размеркавання падаткаў па абшчынах, ён браў за гэта 30 коп. грошаў, яго намеснік за такую ж «паслугу» патрабаваў 20 коп. Калі ж сяляне збіраліся, каб паводле старога звычаю абраць старца, то ваявода і за гэта ажыццяўленне іх спрадвечных правоў браў з іх 5 коп. грошаў. Патрабаваў ён грошы нават за дазвол распачаць вясной сельскагаспадарчыя работы. Тагачасныя сяляне не былі настолькі зацюканымі, каб моўчкі ўсё гэта цярпець. Яны, як і некалі пры Вітаўце, падалі скаргу вялікаму князю Жыгімонту II, і той вымушаны быў разгледзець справу простых сялян супраць вышэйшай службовай асобы ў дзяржаве, крыху суцешыць апетыты намесніка.

Паколькі віленскі ваявода быў чалавекам занятым, непасрэднае кіраванне Барысаўскай воласцю ажыццяўляў яго намеснік, звычайна асабісты васал ваяводы. Пры Гаштольдзе ім быў Каспар Кунцэвіч, які ў 1524 г. прыкупіў да воласці кавалак зямлі ў суседняга пана. Гэта ўгода была зацверджана затым спецыяльным актам вялікага князя, звесткі пра што захаваліся ў больш познім дакуменце.

Пасля Гаштольда воласць была пажалавана новаму віленскаму ваяводзе — Яну Юр'евічу Глябовічу. У прывілеі, выдадзеным з гэтай нагоды ў 1542 г., вялікі князь палічыў неабходным агаварыць, што дае Глябовічу Барысаў (і адначасова Бабруйск) «не в обычай к воеводству Виленскому, але з особливое ласки нашое господарское». Наступны віленскі ваявода, славуты Мікалай Янавіч Радзівіл Чорны, зноў пакарыстаўся ў 1551 г. той жа традыцыйнай «ласкай» і стаў адначасова барысаўскім намеснікам.

Пры Радзівіле воласцю непасрэдна кіраваў шляхціч Лукаш Бескі. У 1552 г. ён зацвердзіў і ўпісаў у актавую кнігу Барысаўскага замка акт палюбоўнага размежавання, якое ўчынілі валашчане з падданымі суседняга сяла Хацюхова, што адносілася да маёнтка Халопенічы (тагачаснай уласнасці Кезгайлаў).

Прыціск з боку намеснікаў, які адчувалі падданыя Барысаўскай воласці, быў толькі часткай агульнага наступу на правы сялян, які адбываўся ў дзяржаўных маёнтках. Захаваўся цэлы шэраг скарг на свавольства намеснікаў, пададзеных на імя вялікага князя ў 1-й палавіне — сярэдзіне 16 ст. Тлумачыцца гэта тым, што велікакняжацкая ўлада ў гэты час знаходзілася ў пэўным крызісе. Дзяржаўная казна была пустая, урад фактычна згубіў кантроль за дзейнасцю службовых асоб і земляўладальнікаў-магнатаў.

Адзінай супрацьвагай ім было дробнае і сярэдняе шляхецтва, якое сфарміравалася ў якасці замкнутага саслоўя на працягу 15 — пачатку 16 ст. Яно складалася пераважна з нашчадкаў мясцовага («земскага») баярства — як літоўскага, так і беларуска-ўкраінскага. Паны Чарэйскія, Падбярэзскія, Сапегі былі характэрнымі прадстаўнікамі гэтага саслоўя, у назве якога старажытны тэрмін «баярства» паступова быў выцеснены запазычанымі з Польшчы тэрмінамі «зямяне», «баяры-шляхта» ці проста «шляхта». Папаўнялася гэта саслоўе і здрабнелымі князямі — такі-

мі, як Друцкія, Адзінцэвічы, Лукомскія. Частка шляхты служыла ўдзельным князям і магнатам (з яе складаўся, у прыватнасці, той атрад з 466 коннікаў, што выстаўляў пан Гаштольд). Але паўнапраўнымі шляхцічамі лічыліся толькі тыя, што былі васаламі непасрэдна вялікага князя і выходзілі на вайну ў складзе павятовых харугваў. Кожны з іх паасобку ўяўляў нязначную сілу (хоць некаторыя, як Сапегі, паступова ўзняліся да ўзроўню сапраўдных магнатаў), рэальнай сілай была ўся шляхецкая маса цалкам, калі яна адчувала свае агульныя інтарэсы.

Бурны рост шляхецкага землеўладання прывёў да запрыгоньвання сялянства — забароны пераходаў сялян з аднаго маёнтка ў другі. Пакуль асноўнымі ўласнікамі былі князі і дзяржаўная ўлада, якім належалі сотні і тысячы сялянскіх сямей, выхад падданых з пэўнай воласці ў сярэднім кампенсаваўся прыходам іншых, інтарэсам гаспадароў гэта міграцыя не пагражала. Калі ж масавымі сталі невялікія маёнткі, дзе колькасць падданых вымяралася дзесяткамі сямей ці ўвогуле асобнымі сем'ямі, выхад адразу некалькіх сялян у маёнтак суседа мог стаць для іх уладальніка вельмі балючай з'явай. Да таго ж права на пераход перашкаджала панам павялічваць памеры падаткаў, бо гэты працэс не мог ісці адналькава ва ўсіх маёнтках. Той пан, у якога павіннасці былі менш жорсткімі (а такое мог сабе дазволіць звычайна больш багаты гаспадар), набываў магчымасць пераманьваць сялян з іншых маёнткаў. Таму ў інтарэсах пераважна дробнага шляхецтва свабода сялянскіх пераходаў паступова змяншалася. Былі забаронены пераходы з дзяржаўных маёнткаў у прыватныя і наадварот.

У інтарэсах шляхты было і змяншэнне свавольства магнатаў, набліжэнне сацыяльнага ладу да ўзораў суседняй Польшчы, дзе ўсе землеўладальнікі лічыліся фармальна роўнымі ў палітычных і сацыяльных правах. Таму шляхта, у адрозненне ад магнатаў, была прыхільніцай больш шчыльнага злучэння ВКЛ і Польшчы.

Абапіраючыся на шляхецтва, велікакняжацкая ўлада ў сярэдзіне 16 ст. распачала пэўныя захады для выйсця з крызісу. У дзяржаўных маёнтках («староствах») цэнтральнай часткі ВКЛ адбылася аграрная рэформа, у выніку якой рэшткі ўнутрыабшчыннага размеркавання падаткаў і павіннасцей скасоўваліся. Уся ворыўная зямля перамяралася на стандартныя кавалкі — валокі (21,36 га), якія падзяляліся на 30 моргаў ці 9000 прутоў. З кожнай валокі ў залежнасці ад якасці глебы вызначаўся стандартны памер павіннасцей. Сялянская сям'я ў залежнасці ад колькасці працаздольных і рабочай скаціны магла ўзяць цэлую валоку ці яе частку ($^2/_3$, $^1/_2$ ці $^1/_3$), адпаведна вызначаліся і яе павіннасці. Найбольш тыповым стаў надзел у паўвалокі, хоць індывідуальныя ваганні былі вельмі вялікімі. Па ўзоры дзяржаўнай улады валокі ўводзілі і некаторыя паны.

На ўсходзе ВКЛ, у тым ліку і на Крупшчыне, дзе традыцыі спадчыннасці сялянскіх надзелаў захаваліся лепш і вялікай была доля неземляробчых заняткаў (бортніцтва і лясных промыслаў), валочная памера адбывалася пазней і больш павольна. Дзяржаўныя воласці (у тым ліку, напэўна, і Барысаўская, хоць непасрэдных звестак пра гэта няма) у 1560 г. былі перамераны не на валокі, а на службы, у якіх памер павіннасцей не быў так жорстка звязаны з плошчай ворыўнай зямлі. Кожную службу маглі выконваць ад адной да некалькіх сялянскіх сямей. Гэта значна звузіла магчымасці свавольства намеснікаў, скаргі сялян амаль зніклі. Былі праведзены пэўныя рэформы ў галіне дзяржаўнага кіравання. Замацаваныя ў Статуце ВКЛ 1566 г., яны значна павялічылі правы шляхты. Тэрыторыя дзяржавы была падзелена на паветы. У кожным з іх мясцовая шляхта атрымала права праводзіць сеймікі, на якіх вырашала свае праблемы і выбірала дэлегатаў на вальны сейм. Уводзіліся павятовыя службовыя пасады, найбольш ганаровымі з іх былі пасады маршалка і падкаморыя. На ўсю тэрыторыю павета распаўсюджвалася дзейнасць гродскага (замкавага) суда, які раней разглядаў справы горада — павятовага цэнтра — і навакольнай воласці. Гродскі суд узначальваў староста (яго замяшчаў падстароста), у яго склад уваходзілі суддзя гродскі і пісар. Нанава ўводзіўся таксама земскі суд для разгляду спраў паміж шляхцічамі. У яго ўваходзілі суддзя земскі з падсудкам і пісарам. На ўсе гэтыя пасады, а таксама на пасады павятовага харунжага, стольніка, падстолія і інш. прызначаліся шляхцічы, якія мелі маёнткі на тэрыторыі павета.

У выніку гэтай рэформы ўся тэрыторыя Крупшчыны ўвайшла ў склад Аршанскага павета. Спынілася дзейнасць Барысаўскага замкавага суда, а ўся тэрыторыя Барысаўскай воласці на ўсход ад Бярэзіны стала падлягаць юрысдыкцыі Аршанскага гродскага суда. Землеўладальнікі Крупшчыны (і заможныя паны, і дробная шляхта) апынуліся таксама пад прысудам земскага суда. *В.Л.Насевіч.*

У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Новы этап у гісторыі Беларусі звязаны з комплексам рэформ, якія былі праведзены ў 1550—60-я гады і істотна змянілі аблічча ВКЛ. Дзяржаўны лад наблізіўся да ўзораў суседняй Польшчы, а ў 1569 г. паміж Польшчай і ВКЛ была заключана т.зв. Люблінская унія. Яна прадугледжвала аб'яднанне абедзвюх краін у «Рэч Паспалітую абодвух народаў». На чале дзяржавы быў кароль (ён жа вялікі князь літоўскі). З гэтага часу забаранялася абранне вялікіх князёў літоўскіх, якія б не былі адначасова польскімі каралямі, і наадварот. Вышэйшым органам станавіўся аб'яднаны вальны сейм, які складаўся з 2 палат: Сената і Пасольскай ізбы. У Сенат па пасадзе ўваходзілі вышэйшыя службовыя асобы Польшчы і ВКЛ, у Пасольскую ізбу выбіраліся па 2 паслы ад кожнага павета.

Люблінская унія не азначала, аднак, скасавання Вялікага княства. Яно захоўвала ўласныя фінансы, войска, законы (сабраныя ў Статуце 1566 г., пазней — у больш дасканалым Статуце 1588 г., які дзейнічаў да канца існавання Рэчы Паспалітай). Ад ВКЛ былі адлучаны і перададзены ў склад Польшчы («Кароны») падляшскія і ўкраінскія землі, з гэтага часу тэрыторыя ВКЛ амаль дакладна супадала з сучаснымі тэрыторыямі Літвы і Беларусі.

Люблінская унія была не першай спробай аб'яднаць ВКЛ і Польшчу ў агульнай дзяржаве. Падобныя уніі заключаліся і раней, але на гэты раз аб'яднанне аказалася вельмі трывалым, бо яго галоўным «рухавіком» выступала шляхецтва. Рэформы, замацаваныя Статутам 1566 г., істотна павялічылі яго правы. Уладальнікі маёнткаў атрымлівалі права прымаць і асаджваць у новазакладзеных мястэчках прышлых людзей — вольных сялян і мяшчан. На Крупшчыне ў гэты час усё больш выдзяляецца род паноў Хадкевічаў. Еранім Аляксандравіч Хадкевіч атрымаў ад вялікага



Крупшчына на карце Макоўскага. 1613 г.

князя дазвол заснаваць мястэчка — паселішча Бобр.

Пасля смерці Ераніма (1561 г.) Бобрскі маёнтак перайшоў у спадчыну да яго адзінага сына Яна Ераніма — выдатнага военачальніка часоў Лівонскай вайны, які ў 1564 г. быў прызначаны адміністратарам далучанай да ВКЛ тэрыторыі былога Лівонскага ордэна (так званых Інфлянтаў), а ў 1568 г. атрымаў ад імператара «Свяшчэннай Рымскай імперыі» Фердынанда графскі тытул. Паводле перапісу войска ВКЛ у 1567 г. ён павінен быў ставіць у войска са сваіх маёнткаў 360 конных воінаў. Атрымаўшы ад бацькі вялізныя маёнткі, Ян Еранім Хадкевіч павінен быў выплаціць грашовы пасаг тым сваім сёстрам, якія выходзілі замуж пасля смерці бацькі (у Ераніма Хадкевіча было 6 дачок). Гэта было, відаць, адчувана нават для такога багатага чалавека. Напэўна, маючы недахоп наяўных грошай, Ян Еранім у студзені 1573 г. аддаў у заклад адной са сваіх сясцёр, Крысціне, і яе мужу Станіславу Пацу маёнтак Бобр. З гэтай нагоды быў складзены інвентар мястэчка Бобр і навакольных вёсак. З інвентара можна даведацца, што мястэчка Бобр мела 71 дом, гасціны двор. У маёнтак таксама ўваходзілі сёлы Забабroўе (20 двароў), Сакалавічы (9 двароў), Панькавічы (4 двары) і Манастыровічы (12 двароў).

Інвентар сведчыць, што сялянскія землі ў маёнтку былі ўжо падзелены на валокі, і гэта — адно з самых ранніх сведчанняў правядзення валочнай памеры ва ўсходняй частцы ВКЛ. Кожная валока абкладалася грашовымі павіннасцямі, а таксама дзяклом, якое бралася натурай (жытам, аўсом, ільном і мёдам). Збожжа вымяралі т.зв. салянкамі — дзежкамі ёмкасцю каля 100 літраў.

Прозвішчы баброўскіх мяшчан дазваляюць прасачыць, з якіх мясцін набіралі Хадкевічы насельнікаў новага мястэчка. Сярод іх былі выхадцы з Польшчы (Шчасны Лях), з Расіі (Іван Маскалёнак), ураджэнцы Лукомля (Іван, Грын і Парфен Лукамляніны), Полацка (Атрошка Палачанін) і інш. Пры заснаванні мястэчка ўсе яго насельнікі атрымалі слабаду — вызваленне ад падаткаў на першы, самы цяжкі, перыяд жыцця на новым месцы. Увосень 1572 г., на дзень Святога Міхаіла, тэрмін слабады выйшаў, і з гэтага моманту мяшчане павінны былі плаціць пэўную суму з можнага зямельнага надзела (пляца). Вызначыць памеры платы належала ўжо новаму гаспадару Бабра — Станіславу Пацу.

Цікава тое, што інвентар быў напісаны на польскай мове, што сведчыць, як далёка зайшоў працэс паланізацыі беларуска-літоўскай шляхты. Польская мова была натуральнай як для пана Хадкевіча, так і для закладатрымальніка Паца (які таксама паходзіў са старога літоўскага баярства).

Віцебскі ваявода Станіслаў Пац трымаў, напэўна, Бобр у закладзе да сваёй смерці ў 1588 г. За гэты час Ян Еранім Хадкевіч паспеў памерці (1579 г.), а спадчыннае права на Бобр перайшло да аднаго з яго сыноў — Аляксандра, пазнейшага троцкага ваяводы. Апошні пасля смерці Паца перадаў закладнае права на суму ў 2400 коп грошаў падканцлеру (пазней канцлеру ВКЛ) Льву Сапегу, які быў, верагодна, адным з крэдытораў Хадкевіча. Затым апошні пазычыў у Сапегі яшчэ 1600 коп пад заклад таго ж маёнтка, давёўшы агульную суму закладу да 4 тыс. коп.

Леў Сапега у сваю чаргу перазаклаў Бобр за тую ж суму свайму слузе Станіславу Галінскаму. Галінскі чамусьці не пажадаў карыстацца маёнткам, а перазаклаў яго шляхцічу Крыштафу Ярашавічу Камару. Папярэдне Галінскі заснаваў на тэрыторыі маёнтка новае паселішча — Прудзенскую Слабаду (сённяшнія Прудзіны).

Аляксандр Хадкевіч не стаў выкупляць абцяжараны даўгамі маёнтак. У 1614 г. ён канчаткова прадаў Бобр тагачаснаму закладатрымальніку Камару, узяўшы ў яго ў дадатак да сумы закладу яшчэ 3 тыс. коп (агульны кошт маёнтка склаў, такім чынам, 7 тыс. коп).

Усё вышэйзгаданае высвятляецца дзякуючы інвентару, які быў складзены пры афармленні продажу Бобрскага маёнтка ў 1614 г. За 41 год, што мінуў пасля стварэння папярэдняга інвентару, насельніцтва мястэчка Бобр значна выросла. У ім знаходзілася 180 аселых мяшчанскіх двароў (пляцаў) на абодвух берагах р. Бобр. Апрача таго, мяшчанам належала 90 надзелаў ворыўнай зямлі, вымеранай у валоках і моргах, і 16 т.зв. «гуменных» пляцаў пад гаспадарчымі пабудовамі. Сярод уладальнікаў валок і гуменных пляцаў сустракаюцца прозвішчы яшчэ прыкладна 44 мяшчан, не пазначаных у ліку ўладальнікаў мяшчанскіх пляцаў. (Часам імёны і прозвішчы прыводзяцца са скажэннямі, што не заўсёды дазваляе надзейна ідэнтыфікаваць уладальнікаў пляцаў і валок). Такім чынам, агульная колькасць двароў у Бабры складала каля 224, што больш чым утрая перавышае іх колькасць у 1573 г.

У Бабры існавала царква, святару якой

КРУПШЧЫНА ў другой палове XVI– першай палове XVII ст.



Межы маёнткаў

Бобр Цэнтры маёнткаў

Мястэчкі

Вёскі

Гандлёвы шлях

Сучасная мяжа Крупскага раёна

Лічбамі пазначаны тэрыторыі, якія належаць да маёнткаў: 1-Лукомскага княства; 2-Чарэйскага манастыра; 3-Шыйна; 4-Падбярэззе; 5-Варанцэвічы; 6-Талачын

Аўтар В.Л.Насевіч

айцу Фёдару належалі пляц і валока, вольныя ад усіх падаткаў. Згадваюцца таксама карчма на рынкавай плошчы, вадзяны млын з двума коламі і мост, якія здаваліся ў арэнду.

Сярод мяшчанскіх прозвішчаў сустракаюцца знаёмыя па папярэднім інвентары (Буры, Курапатка, Лукамлянін, Шычэнін), але большасць — новыя. Частка з іх зноў сведчыць пра мясціны, адкуль, верагодна, прыбылі іх уладальнікі: Арцём, Амяльян і Макар Друцкія, Ахрэм і Сцяпан Літвіны, Амяльян і Якаў Маскалі.

У воласць Бобрскага маёнтка ўваходзіла сяло Стары Бобр (пры гэтым пазначана, што раней, «з даўніх часоў», яно мела назву Забаброўе) з 19 дварамі. У 1 мілі ад яго (каля 7,7 км) ляжала Прудзенская Слабада, заснаваная Галінскім. Да маёнтка належалі яшчэ Сакалавічы (9 двароў) і два сялы з засценкам у сучасным Талачынскім раёне.

Характар сялянскіх павіннасцей істотна не змяніўся: калі ў 1573 г. з валокі плацілі 61 грош і 2 пенязі, то ў 1614 г. — 75 грошаў у Старым Бабры і 74 грошы у Сакалавічах. Паранейшаму належала даваць і дзякло ў памеры 1 дзежкі жыта, 1,5 дзежак аўсу (у 1573 г. — толькі дзежку), калку і лёну коштам у 8 грошаў і 1 медніцы мёду (ёмістасць медніцы была прыкладна 15—20 літраў). У параўнанні з папярэднім інвентаром з'явіўся абавязак пастаўляць на панскі двор па адной курыцы («кокашы») у год. Мяшчане таксама павінны былі плаціць з ворыўнай валокі (тыя, хто яе меў) па 75 грошаў, а з кожнага прута (0,0025 га) сядзібнай і агароднай зямлі — па 1 грошу. Памеры сядзіб вагаліся ад 3 да 28 прутоў, у сярэднім — каля 7.

Сялянскія зямельныя надзелы ў Бобрскім маёнтку былі даволі значнымі — большасць сямей мела па поўнай валоцы, толькі зрэдку валоку трымалі 2 сям'і. Праўда, сем'і былі вялікімі, звычайна ў іх уваходзілі бацька з дарослымі сынамі, часам — некалькі братоў ці дзядзька з пляменнікамі. Разам з жанчынамі і дзецьмі ў такіх сем'ях было ў сярэднім па 7—8 чалавек. Гэта было тыповым для Беларусі таго часу.

Каб ацаніць памеры павіннасцей, што выконвалі бобрскія падданыя, трэба ўлічваць, што пры надзеле ў 1 валоку яравым і азімым збожжам штогод засявалася 20 моргаў (каля 14 га). Высявалася звычайна па 150-літровай дзежцы на морг (блізка да 1,5 ц/га), звычайны ўраджай быў у памерах сам-3 — сам-4 (не больш за 5—6 ц/га). З валокі можна было сабраць блізка да 60—80 ц, з якіх за вылікам насення заставалася каля 40—60. На харчаванне сям'і з 8 чалавек патрабавалася не менш палавіны ад гэтай колькасці. Статут 1588 г. (раздзел 13, артыкул 9) вызначае кошт 1 бочкі (напэўна, 7 віленскай, або т.зв. кадзі, у якую ўваходзіла блізка да 2,5—3 ц жыта) у 24 грошы. Такім чынам, чысты даход сялянскай гаспадаркі ў добры год толькі за кошт збожжа мог дасягаць парадку 170—280 грошаў. Для параўнання: конь у той час каштаваў каля 120 грошаў, карова — 100, адгадаваны парсюк — 60, баран — 20, авечка — 15, курыца — 3, кажух — 60—70, сярмяга — 20, сякера — 6, каса — 6, серп —2, калёсы — 6, сані — 2 грошы. На гэтым фоне чынш у памеры 75 грошаў не выглядае празмерным. Трэба дадаць, што ў Бабры не было фальварка з панскім ворывам і сяляне не ведалі паншчыны.

Інвентар 1614 г. быў таксама складзены па-польску. Вернемся да гісторыі маёнтка Бобр. Крыштаф Камар быў яго ўладальнікам да сваёй смерці ў 1636 г. За гэты час яго імя некалькі разоў трапіла на старонкі дакументаў, што дайшлі да нас. У 1624 г. ён вымушаны быў трымаць у аршанскім земскім судзе адказ за ўчынак сваіх бобрскіх падданых, якія збілі і абрабавалі праязджага яўрэя-гандляра з Магілёва Арона Якубовіча. За гэтае злачынства на маёнтак Камара быў накладзены штраф у памеры 300 коп і 10 грошаў (усяго 18 010 грошаў) на карысць пацярпеўшага. Не пагадзіўшыся з гэтым рашэннем, Камар звярнуўся ў вышэйшую судовую інстанцыю — Галоўны літоўскі трыбунал. Але апошні пакінуў прыгавор у сіле, а Камара за «няслушную апеляцыю» абклаў дадатковым паборам у памеры 12 коп грошаў, палавіна з якіх павінна была ісці суду, палавіна — Якубовічу.

У канцы жыцця Крыштафа Камара пачаўся памежны канфлікт паміж яго падданымі і жыхарамі суседніх вёсак Шырневічы і Мачулішча, што адносіліся да маёнтка Варанцэвічы.

На захадзе Бобрскі маёнтак межаваў з маёнткам Шыйка, які напачатку 16 ст. належаў князям Адзінцэвічам. Затым яго след губляецца на некалькі дзесяцігоддзяў. Між тым недзе ў другой палавіне 16 ст. ў гэтым маёнтку было заснавана мястэчка Крупка, якое дало пачатак сённяшняму райцэнтру. Упершыню яно з'яўляецца на карце Вялікага княства Літоўскага, якую па ініцыятыве віленскага ваяводы Мікалая Крыштафа Радзівіла стварыў у Нясвіжы вядомы мастак і гравёр Тамаш Ма-

коўскі. Карта была складзена ў асноўным у канцы 1590-х гадоў і надрукавана ў Амстэрдаме ў 1613 г. Сярод паселішчаў Крупшчыны, апрача самой Крупкі, на карце пазначаны мястэчкі Бобр, Худава, Нача, Красны Стаў і двор Грушка. Пры гэтым Худава залічана Макоўскім у лік мястэчкаў памылкова, бо ўсе іншыя крыніцы ведаюць яго як сяло. Магчыма, ужо ў канцы 16 ст. Шыйка разам з Крупкай належалі славутаму роду князёў Сангушкаў. Упершыню Грушка і Крупка выступаюць як уласнасць Сангушкаў у дакуменце, які быў складзены ў 1639 г. У ім пазначаецца, што ў маі 1627 г. Сымон Самуэль Сангушка вызначыў на забеспячэнне сваёй другой жонкі, Гелены Корвін-Гасеўскай, 70 тыс. злотых (1 злоты быў роўны 30 грошам), з якіх 30 тыс. былі забяспечаны яго маёнткамі Багрынава, Крупка і Грушка ў Аршанскім павеце, а 40 тыс. — маёнткам Горваль. Гэты запіс азначаў, што ў выпадку смерці князя Сангушкі яго ўдава мае права карыстацца гэтымі маёнткамі да таго часу, пакуль спадкаемцы мужа (яго дзеці ад першай жонкі, Ганны Юр'еўны Завішы, што памерла ў 1619 г.) не выплацяць ёй азначаную суму. Аднак Гелена памерла раней за мужа, а сваё права на гэтыя маёнткі завяшчала братам Крыштафу і Вінцэнту Корвін-Гасеўскім і сястры Ганне, манашцы Берасцейскага кляштара.

У 1638 г. памёр сам Сымон Самуэль Сангушка. Яго сынамі ад першага шлюбу былі Казімір, Ян Уладзіслаў і Еранім. Апошні пайшоў па духоўнай лініі і стаў у далейшым каталіцкім смаленскім біскупам (памёр у 1657 г.). Двое астатніх, каб уступіць у валоданне бацькоўскім маёнткамі, склалі ў 1639 г. пагадненне з Корвін-Гасеўскімі, дзякуючы якому і можна даведацца пра папярэднія падзеі.

У 1649 г. сярод уладанняў Сангушкаў яшчэ раз згадваецца Старая Грушка. Ян Уладзіслаў, які займаў пасаду суражскага старосты, памёр у 1652 г., яго брат Казімір — у 1655 г. Адзіным уласнікам сангушкаўскіх маёнткаў застаўся малалетні сын Яна Уладзіслава Еранім (1651—1684), які пасля смерці ў 1659 г. сваёй маці Ганны Радзівіл застаўся поўным сіратой і быў пад апекай дальніх родзічаў.

Размешчаныя побач з Бабром і Крупкай паселішчы ў канцы 16—1-й палавіне 17 ст., як і ў папярэдні перыяд, адносіліся да маёнткаў, цэнтры якіх знаходзіліся па-за межамі Крупшчыны. Вышэй у сувязі з Бабром ужо згадваліся Шырневічы і Мачулішча, якія разам з часткай Грушкі належалі да маёнтка Варанцэвічы ў Талачынскім раёне і падзялялі яго лёс пры пераходзе ад уладальніка да ўладальніка.

Варанцэвічы ў 1584 г. належалі аднаму з буйнейшых магнатаў, віленскаму ваяводзе Мікалаю Юр'евічу Радзівілу Рудаму. У тым жа годзе ён абмяняў з віленскім кашталянам і канцлерам ВКЛ Астафіем Багданавічам Валовічам на яго частку ў маёнтках, якімі абодва яны валодалі сумесна пасля згасання роду князёў Гальшанскіх (Станькава і Жыцін у Менскім павеце). Пасля Астафія Валовіча (памёр у 1587 г.) Варанцэвічы належалі віцебскаму кашталяну Мацею Стравінскаму, ад якога перайшлі да яго дачкі Соф'і і зяця Рыгора Іванавіча Сапегі, потым да іх сына Аляксандра Багдана Сапегі (1585—1633).

Спадчыну А.Б.Сапегі атрымалі затым яго непаўналетнія дочкі Ганна і Кацярына. Іх апекуны, паны Крыштаф Хадкевіч і Казімір Леан Сапега, у 1637 г. аддалі Варанцэвічы разам з Шырневічамі і інш. у заклад Станіславу Нарушэвічу, які ў тым жа годзе ажаніўся са старэйшай з сясцёр — Ганнай. Крысціна ў 1641 г. выйшла замуж за Яна Самуэля Паца, пасля чаго адбыўся падзел іх спадчыны. Пры гэтым Варанцэвічы з усімі прыналежнасцямі дасталіся Крысціне. У 1649 г. яна падарыла іх свайму мужу. Уводны ліст, які быў складзены пры перадачы Я.С.Пацу маёнтка, згадвае ў яго складзе фальварак Альшанік, да якога належалі «сёлы палескія» (змешчаныя ў лясістай мясцовасці): Альшанік, Мачулішча, што празываецца Сакалавічы, Грушка, што празываецца Панскае і Шырневічы. З гэтага вынікае, што Мачулішчы ўзніклі як асобнае паселішча тых варанцэвіцкіх падданых, якія папярэдне ўваходзілі ў абшчыну сяла Сакалавічы, гэтак жа як Панскае ўзнікла на землях варанцэвіцкай часткі сяла Грушка.

Аналагічным быў лёс іншай часткі Грушкі, якая разам з вёскай Еленка (на аднайменнай рэчцы) належала да маёнтка Падбярэззе. Падбярэззе ў 1-й палавіне 16 ст., пасля смерці князя Сямёна Ямантовіча перайшло да сына яго сястры Рыгора Яцкавіча, які адгэтуль пачаў ужываць прозвішча Падбярэзкі. Ён быў, відаць, даволі ўплывовай асобай сярод шляхты Аршанскага павета, бо займаў пасаду падкаморыя, а ў 1585 годзе, незадоўга да смерці, стаў аршанскім маршалкам. Яго сыны Станіслаў і Мікалай не пакінулі выразных слядоў у пісьмовых крыніцах, затое пакінулі 5 нашчадкаў: Аляксандра, Яна, Альбіна, Ба-

зыля і Абрама Падбярэзкіх, якія падзялілі Падбярэззе і іншыя свае маёнткі на невялікія долі. У наступным пакаленні вёска Еленка ці яе частка (9 двароў, 5 валок) належала Рафалу Падбярэзкаму. Яго ўдава Ганна Баратынская другім шлюбам выйшла за Сцяпана Залескага, а ў 1641 г. аддала ў заклад Еленку разам з Яльнянамі і інш. родзічу свайго першага мужа — Рыгору Абрамавічу Падбярэзскаму. Самуэль Падбярэзскі валодаў 5 валокамі зямлі ў сяле Грушка Галонаўская (сучасныя Гапонавічы), якія ён у 1650 г. за 600 злотых аддаў у заклад на 3 гады Крыштафу Валяноўскаму.

На поўначы ад усіх згаданых вышэй паселішчаў у канцы 16 — 1-й трэці 17 ст. склаўся вялізны маёнткавы комплекс, узнікненне якога звязана з дзейнасцю Льва Сапегі — адной з найбольш выдатных асоб у гісторыі ВКЛ.

У 2-й палавіне 15 ст. велікакняжацкі пісар Багдан Сямёнавіч Сапега праз шлюб з князёўнай Федкай Друцкай-Саколінскай набыў частку маёнтка Чарэя і права апекі над Чарэйскім манастыром з вёскай Клубынічы. Пазней адным з уладальнікаў гэтага маёнтка быў яго старэйшы сын Іван Багданавіч, ваявода віцебскі, затым падляшскі. Сын апошняга Іван Іванавіч у сярэдзіне 16 ст. ажаніўся з князёўнай Багданай Канстанцінаўнай Друцкай-Канопляй, якая па мацярынскай лініі была пляменніцай Васіля Друцкага-Талачынскага і спадчыннiцай згаслага роду князёў Талачынскіх. Ад гэтага шлюбу і нарадзіўся славуты Леў Сапега (1557—1633), які з маладосці вызначаўся вялікімі здольнасцямі.

Пасля смерці маці ў 1585 г. Леў разам з братамі атрымаў частку спадчыны князёў Канопляў і Талачынскіх (маёнткі Тараселле і Коханава ў Талачынскім раёне, частку Басеі і Шышава ў Горацкім і інш.), а таксама права на выкуп той часткі гэтай спадчыны, што знаходзілася ў руках паноў Гарнастаяў. У 1590 г. ён здзейсніў гэтае права, купіўшы ў Ераніма Габрыелавіча Гарнастая частку Друцкага замка, маёнткі Талачын, Славені, Ябланка, частку Тараселля, Коханава і інш. Сярод гэтых набыццяў быў і двор Кіявец на тэрыторыі Крупшчыны, непадалёку ад Чарэйскага маёнтка.

У наступным 1591 г. канцлер Сапега ажыццявіў канчатковы падзел бацькоўскай спадчыны з братамі: Рыгорам, падкаморым аршанскім (ён ужо згадваўся вышэй як бацька Аляксандра Багдана Сапегі) і Андрэем, старостам аршанскім. Паводле гэтага падзелу Льву дасталася частка Чарэі з манастыром і вёскамі Клубінічы, Касінічы і іншымі (у сучасным Чашніцкім раёне), а таксама маёнткі Лемніца (на стыку Талачынскага і Сенненскага раёнаў) і Белая (сучасны Лепель). У гэты час саўладальнікам Чарэі з'яўляўся дзядзька Льва — кухмістр ВКЛ Міхаіл Іванавіч Сапега. Па дамоўленасці з пляменнікам у 1592 г. ён саступіў апошняму сваю долю маёнтка. З цягам часу Леў Сапега стаў аднаасобным уладальнікам Чарэйскага маёнтка.

Разам са спадчынай маці Леў Сапега атрымаў, напэўна, і тую частку маёнтка Худава, што некалі належала Васілю Талачынскаму. Большая ж частка гэтага маёнтка ў канцы 16 ст. знаходзілася ў руках дзяцей Васіля Міхайлавіча Корсака і князёўны Багданы Іванаўны Сенскай. З іх Палонія Корсак унесла ў 1567 г. сваю долю ў якасці шлюбнага пасагу мужу — Марціну Курчу. Апошні ў 1594 г. прыгадваў Худава сярод сваіх маёнткаў. Хутка затым Леў Сапега скупіў у саўладальнікаў і часткі Худаўскага маёнтка, як ён зрабіў гэта з Чарэяй. Вынікі гэтай руплівай дзейнасці канцлера фіксуе дакумент 1602 г., у якім ураднік Льва Сапегі Крыштаф Свідла атрымлівае пацвярджэнне таго, што ён здаў у дзяржаўны скарб усе належачыя падаткі з Чарэйскага маёнтка. Пры гэтым згадваюцца часткі Чарэі, набытыя Сапегам як у спадчыну ад бацькі, так і ад кухмістра Міхаіла Сапегі, Пятра Стаброўскага, Лявона Жданавіча і іншых асоб. У гэтых частках разам было 6 баярскіх і 66 сялянскіх дымоў, а таксама 30 агароднікаў (сялян, якія не мелі ворыўнай зямлі). З кожнага баярскага двара ішоў дзяржаўны падатак у памеры 30 польскіх грошаў, з сялянскага — 15, з агароднікаў — па 6 грошаў.

Асобна ў гэтым жа дакуменце названа мястэчка Красны Стан, якое на карце Т.Макоўскага і ў іншых крыніцах мае назву Красны Стаў, што больш дакладна. Гэтае мястэчка знаходзілася на месцы сучаснай вёскі Абчуга і было заснавана, напэўна, на землях сяла Кіявец, набытага Сапегам у Гарнастая. У 1602 г. для большасці мяшчан ужо скончыўся тэрмін слабады. Такія мяшчане валодалі 6 рынкавымі і 40 вулічнымі пляцамі, з якіх плацілі адпаведна па 6 і 4 грошы, а таксама 30 валокамі ворыва, з якіх ішоў падатак у памеры 30 грошаў. У Красным Ставе існаваў таксама вадзяны млын а двух колах, ад якога мястэчка, напэўна, і атрымала сваю назву.

Там жа згадваецца і Худаўская воласць, набытая Сапегам у саўладальнікаў і далуча-

ная да Чарэйскага маёнтка. Разам з сялом Карэвічы (Чашніцкі раён), набытым ад князёў Лукомскіх, гэтая воласць налічвала 88 дымоў, кожны з якіх выплочваў у скарб па 15 грошаў.

Крыху пазней, у 1604 г., канцлер далучыў да Чарэі сёлы Камянец (сучасная Вялікая Каменка) і Халневічы, якія яму прадаў князь Іван Барысавіч Лукомскі. Раней гэтыя сёлы адносіліся да Лукомльскага княства.

Больш падрабязную карціну Чарэйскага маёнтка дае рэестр чыншу, які быў складзены каля 1624 г. З населеных пунктаў Крупшчыны ў ім згадваюцца мястэчка Красны Стаў (плаціла чынш у памеры 183 коп і 17 грошаў), вёскі Лютыя (16 валок, з іх 40 коп і 17 гр.), Лагі (12 валок, 32 капы 46 гар.), Калыбанава (14 валок, 31 капа 36 гр.), Забор'е (23 вал., 49 коп 15 гр.), Кіявец (8 вал., 9 коп 36 гр.), Халневічы (30 вал., 50 коп 37 гр.). Асобна паказана Худаўская воласць, у складзе якой Худава (30 валок, 55 коп 58 гр.), Калодніца (26 вал., 55 коп 58 гар.), Дакучын (20 вал., 45 коп 20 гр.), Камень (вышэйзгаданы Камянец, 8 вал., 20 коп.), Перасека (16 вал., 34 капы 4 гр.), Старажышча (5 вал., 13 коп). Памёр Леў Сапега у 1633 г., падзяліўшы маёнткі паміж сынамі Янам Станіславам і Казімірам Леанам, якому дасталася Чарэя.

З захаду да Чарэйскага маёнтка прымыкала тэрыторыя Халопеніцкай воласці. Яна належала панам Кезгайлам да згасання гэтага роду ў 1554 г., калі памёр яго апошні мужчынскі прадстаўнік — Станіслаў Мікалаевіч. Частка яго маёнткаў засталася ў пажыццёвым валоданні ўдавы Соф'і Хадкевіч, якая пазней аднавіла шлюб з палякам Ярашам Карыцкім, рэшта адышла да стрыечных братоў і сясцёр па жаночай лініі. Дакументы, якія тычыліся падзелу кезгайлаўскай спадчыны, да нас не дайшлі. Але з больш позніх звестак вынікае, што сяляне-даннікі з былога Лукомльскага княства, пазнейшага маёнтка Халопенічы, былі падзелены паміж Янам Андрэевічам Завішам, яго сястрой Даротай з мужам Войцахам Шэметам, а таксама Станіславам Станіслававічам Шэметам.

Прынамсі, у 1610 г. адным з саўладальнікаў Халопеніцкай воласці быў Войцах Манівід Дарагастайскі, які папярэдне аддаў сяло Астапкавічы ад Халопеніцкага маёнтка ў заклад аддаленай родзічцы Льва Сапегі — Багдане Міхайлаўне, жонцы аршанскага земскага суддзі Андрэя Варапая, а ў 1610 г. выкупіў яго.

Крыху пазней адна частка маёнтка належала пану Валадкевічу, другая — сумесна віленскаму гараднічаму Пятру Нонгарту і Давыду Нароўніку. У 1620 г. вёсцы Галькі Валадкевічу належала 13 двароў, Нонгарту — 14, у Хацюхове адпаведна 16 і 6.

Гэтыя звесткі захаваліся ў сшытку, які належаў наступнаму ўладальніку Халопеніцкага маёнтка аршанскаму харунжаму Міхаілу Млечку. Ён набыў абедзве часткі маёнтка, меў у Халопенічах сваю сялібу і на працягу 1621—35 гадоў вёў там свой дзённік. У ім маецца інвентар за 1620 год, план панскага дома, апісанне кухоннага начыння, скаціны, гаспадарчых прылад, спіс рэчаў, падараваных Млечкам Халопеніцкай царкве, лекарскія і кулінарныя рэцэпты 17 ст. і іншыя звесткі. Сшытак пазней трапіў у славутую Шчорсаўскую бібліятэку Храптовічаў і зараз захоўваецца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі АН Украіны ў Кіеве.

Частка абшару былога Лукомльскага княства ў вярхоўях р. Эса ў 17 ст. заставалася ва ўладанні князёў Лукомскіх. Вышэй згацвалася, што князь Іван Барысавіч з меляшкоўскай галіны гэтага роду ў 1604 г. прадаў канцлеру Льву Сапегу сёлы Камянец і Халневічы. Яшчэ раней бацька Льва, Іван Іванавіч Сапега, набыў у кагосьці з Лукомскіх маёнтак Пачаевічы, асноўны абшар якога знаходзіўся ў Чашніцкім раёне. Як і выпадку з Друцкім княствам, да гэтага маёнтка належаў ізаляваны «дадатак», у які ўваходзіла частка сяла Грыцкавічы непадалёку ад Халопеніч і Гальковў. Пры падзеле спадчыны ў 1591 г. гэты маёнтак атрымаў брат Льва Сапегі, аршанскі староста Андрэй. Пазней ён належаў сыну Льва, Казіміру Леану Сапегу. У складзе гэтага маёнтка Грыцкавічы згадваюцца ў 1649 г. У 1655 г. Казімір Леан падарыў Пачаевічы з усімі прыналежнасцямі Віленскаму езуіцкаму калегіуму. Тады і частка Грыцкавіч стала належаць езуітам. Іншая частка гэтага сяла ў 1641 г. належала да Халопеніцкага маёнтка М.Млечкі. У Грыцкавічах была і трэцяя доля, што адносілася да маёнтка Руднае Сяло ніжэй па Эсе. У 1621 г. гэты маёнтак належаў князю Раману Балтазаравічу з галіны Лукомскіх. Гэты князь заснаваў у Рудным Сяле каталіцкую капліцу ў гонар панны Марыі, на карысць якой ахвяраваў свой маёнтак з вёскай Лужкі (паблізу Руднага Сяла) і часткай Грыцкавіч. У наступным годзе яго аддалены родзіч, аршанскі земскі суддзя Іван Барысавіч Лукомскі, выконваў волю ўжо памёршага Рамана і перадаў ксяндзам Грыцкаўскую Слабаду з 8 сялянскімі дварамі, а таксама Ка-

лечую Слабаду (зараз — Калечанка ў Чашніцкім раёне).

На землях Халопеніцкай воласці ўзнікла і сяло Мхерына (Амхерына). Яно ўпершыню згадваецца ў 1642 г. як уладанне Ераніма Альбрэхта Друцкага-Саколінскага. У 1649 г. Еранім Друцкі-Саколінскі аддаў Мхерына ў шасцігадовы заклад за 1800 коп грошаў Самуілу Лыскоўскаму. Іншая ж частка Мхерына ў далейшым заставалася ў складзе маёнтка Халопенічы. Еранім Друцкі-Саколінскі ў 1648 г. набыў у дробнага шляхціча Мікалая Вадашынскага за 1000 коп сяло Шамкі ў Грыцкавіцкай воласці.

На поўдні ад зямель халопеніцкага сяла Хацюхова пачыналіся землі Барысаўскага староства, якія цягнуліся на захад і поўдзень да ракі Бярэзіны, а на паўднёвы ўсход — праз увесь Крупскі раён, займаючы сумежныя ўскрайкі Круглянскага, Бялыніцкага і Бярэзінскага раёнаў. Гэтую вялізную воласць у 1567 г. атрымаў віленскі ваявода Мікалай Юр'евіч Радзівіл Руды (1512—1584), і з гэтага часу звыш паўстагоддзя яна заставалася ў руках рода Радзівілаў. Мікалай Руды ў 1579 г. з дазволу вялікага князя перадаў староства свайму сыну Крыштафу па мянушцы Пярун (1547—1603). У 1586 г. апошні заснаваў на землях Барысаўскага староства, на бойкім тракце Барысаў—Орша, новае мястэчка на беразе р. Начы, якому надаў назву Радзівілаўская Воля. Пазней, аднак, за мястэчкам замацавалася назва Нача, пад якой яно выступае на карце Т.Макоўскага і ў іншых крыніцах. Пасля смерці Крыштафа Пяруна Барысаўскае староства, дзяржаўная ўласнасць, па сутнасці перайшло ў спадчыну да яго сына Януша Радзівіла (1579—1620).

Магчыма, Барысаўскае староства надалей засталося б «сямейнай уласнасцю» Радзівілаў, але пасля смерці Януша ў 1620 г. застаўся яго адзіны непаўналетні сын Багуслаў і кароль Жыгімонт Ваза ў 1621 г. перадаў староства троцкаму ваяводзе Аляксандру Хадкевічу (былому ўласніку Бабра). Хадкевіч памёр у 1626 г., а ў 1629 староства было перададзена прадстаўніку іншай галіны Радзівілаў — канцлеру Альбрэхту Станіславу (1595—1656). Праз некалькі гадоў яно перайшло да Адама Казаноўскага — паляка, які ў парушэнне норм Статута 1588 г. займаў пасады і набываў маёнткі ў ВКЛ (у прыватнасці, у 1633 г. купіў у Льва Сапегі маёнтак Чашнікі). Казаноўскі ўпершыню упамінаецца ў якасці барысаўскага старосты ў 1635 г. Ён займаў гэту пасаду да сваёй смерці ў 1649 г.

У гэты час старосты не толькі перадавалі пасады ў спадчыну сваім дзецям, але і амаль бескантрольна гаспадарылі ў дзяржаўных валасцях, бо кантроль дзяржавы за іх дзейнасцю стаў мінімальным. Так, у 1639 г. Адам Казаноўскі вылучыў са складу староства вёску Агібайлавічы (Гібайлавічы, сучасная Знаменка) з 16 валокамі зямлі і аддаў яе ў пажыццёвае трыманне Марцымільяну Крахоўскаму, які ўжо валодаў суседнім маёнткам Бялавічы (зараз у Бярэзінскім раёне). У дакументе аб гэтай нагодзе ўпамінаюцца межы суседніх вёсак Пышачы, Мараны (пазнейшыя Мажаны) і Сомры, якія заставаліся ў складзе староства. Хутка, аднак, Мажаны і Пышачы адасобіліся ў якасці самастойных дзяржаўных маёнткаў (старостваў). Яны, як і Гібайлавічы, у далейшым мянялі ўладальнікаў незалежна ад астатняй часткі Барысаўскай воласці.

У 1641 г. пры вышэйзгаданым размежаванні Халопеніцкай і Барысаўскай валасцей упершыню ўпамінаюцца яшчэ некалькі паселішчаў у складзе апошняй: Заберычы (сучасныя Вялікія Жаберычы), Клёнкі (Клён) і Ігрышча, якое названа «слабадой барысаўскай», што сведчыць пра яго нядаўняе заснаванне.

Падсумоўваючы змены, якія адбыліся на тэрыторыі Крупшчыны да сярэдзіны 17 ст., перш за ўсё трэба адзначыць з'яўленне мястэчак. Тры з іх — Нача, Крупкі і Бобр — абавязаны сваім узнікненнем вялікай гандлёвай магістралі, якая канчаткова сфарміравалася да гэтага часу і вяла з усходу, з Маскоўскай дзяржавы, праз Смаленск (ён з 1611 г. знаходзіўся ў складзе ВКЛ) і Оршу на Барысаў. Адтуль адзін шлях ішоў праз Лагойск і Маладзечна ў сталіцу дзяржавы Вільна і ў Літву, а другі — праз Менск у заходнія раёны Беларусі (якія на той час таксама называліся «Літвой») і ў Польшчу. Названыя тры мястэчкі занялі сваё месца ў ланцугу прывалачных пунктаў, што асядалі гэты шлях на адлегласці 10—15 км адзін ад аднаго. Працяг ланцугу на захадзе стварала Лошніца, на ўсходзе — Славені, Талачын, Коханава.

Красны Стаў узнік на гандлёвым шляху мясцовага значэння, які вёў з Бешанковіч праз Чашнікі, Лукомль і Чарэю на Славені, адтуль на Круглае, Цяцерын, Бялынічы. Гэты шлях на працягу прыкладна 125 км ішоў амаль непарыўна па ўладаннях Льва Сапегі, выконваючы ролю іх унутранай магістралі. Іншае адгалінаванне вяло з Круглага на Галоўчын, Княжыцы і Магілёў, які ў гэты час

імкліва ператвараўся ў адзін з буйнейшых гарадоў Беларусі.

Увогуле 2-я палавіна 16 — 1-я палавіна 17 ст. былі часам бадай што найбольшага эканамічнага ўздыму за ўсю гісторыю ВКЛ. Паўсюдна ўзнікалі новыя мястэчкі і вёскі, шчыльнасць насельніцтва дасягнула, напэўна, максімальнай для тагачаснага ўзроўню гаспадаркі велічыні. Працэс узнікнення новых вёсак (слабод) добра прасочваецца на Крупшчыне. У Бобрскім маёнтку з'яўляецца Прудзенская Слабада, у Барысаўскім старостве — Ігрышча. Вышэйзгаданы рэестр чыншу Чарэйскага маёнтка таксама ўпамінае некалькі слабод. З іх на Крупшчыне мясціліся Барсукі і Харытонцы, у кожным з якіх было па 3 двары, а тэрмін слабады канчаўся ў 1625 г. У гэты перыяд таксама ўзніклі шмат іншых паселішчаў Крупшчыны.

У цэлым па дзяржаве гэты ўздым суправаджаўся ўзмацненнем эксплуатацыі сялянства, бо панам, каб жыць паводле польскіх і заходнееўрапейскіх узораў, патрабавалася шмат грошай. Але на Крупшчыне мы не маем выразных прыкладаў гэтага працэсу. Як у дзяржаўным Барысаўскім маёнтку, так і ў прыватных (Чарэя, Бобр) не было паншчыны, а памеры чыншу былі ў цэлым памяркоўнымі. Адзіны фальварак (двор з панскім ворывам, заснаваны на працы прыгонных сялян) фіксуецца ў гэты час у Альшаніку, што адносіўся да Варанцэвіцкага маёнтка.

У гэты час амаль цалкам быў забаронены пераход сялян з маёнтка ў маёнтак, але для тых буйных валасцей, што ахоплівалі большасць Крупшчыны, гэта было неістотна, бо заставаліся вялікія магчымасці для пошуку лепшых умоў у межах аднаго маёнтка: можна было перасяліцца, напрыклад, з Сомраў у Ігрышча ці з Халневіч альбо Шчаўраў у Калыбанава, застаючыся на тэрыторыі аднаго ўладання. Хапала, нарэшце, і вольных людзей (многія з іх некалі ўдала ўцяклі ад свайго пана), каб засяляць узнікаючыя мястэчкі.

Праўда, уздым аказаўся нетрывалым. Адначасова назіраліся і негатыўныя тэндэнцыі ў эканоміцы — у прыватнасці, абвальная інфляцыя на працягу 1-й чвэрці 17 ст. Сярэбранае напаўненне (і, адпаведна, кошт) польскага гроша з канца 16 ст. знізілася больш як у 3 разы. Шляхецкая вольніца, якая панавала ў Рэчы Паспалітай, практычна паралізавала здольнасць урада да цэнтралізаванага кіравання, усеўладдзе ж магнатаў у параўнанні з пачаткам 16 ст. не толькі не знізілася, але і ўзрасло.

Узмацніліся рэлігійныя супярэчнасці. Рэфармацыя, што вельмі пашырылася пры Жыгімонце Аўгусту, з прыходам да ўлады Стафана Баторыя (1575 г.) і асабліва Жыгімонта Вазы (1587 г.) змянілася Контррэфармацыяй — аднаўленнем пазіцый каталіцтва. Кароль Стафан заклікаў у Рэч Паспалітую езуітаў. У каталіцтва пачалі пераходзіць буйнейшыя магнаты-пратэстанты, у тым ліку Леў Сапега, князі Сангушкі і інш. Вышэй згадвалася, што менавіта Сапегі падарылі езуітам некалькіх сялян з Грыцкавіч, а іх аднасяльчане паводле волі князя Лукомскага, што таксама стаў католікам, перайшлі ва ўласнасць Руднасельскага касцёла. Вёска ж Клён стала належаць ксяндзам Барысаўскага касцёла. Пры Міхаіле Млечку ў Халопенічах з'явіўся першы касцёл непасрэдна на тэрыторыі Крупшчыны. Адначасова ўзмацніўся націск на праваслаўную царкву Рэчы Паспалітай.

У 1596 г. адбылася Берасцейская царкоўная унія. Далёка не ўсе праваслаўныя з гэтым пагадзіліся, успыхнула вострая барацьба паміж прыхільнікамі і ворагамі уніі. Праўда, мы не маем сведчанняў таго, што гэтая барацьба неяк закранула тэрыторыю Крупшчыны. Тут не было выразных цэнтраў супраціўлення уніяцтву. Вядома, што абарачэнне Львом Сапегам ва ўніяцтва Чарэйскага манастыра (да якога адносілася в. Клубынічы) прайшло даволі мірна, бо манастыр раней быў у глыбокім заняпадзе і Сапега па сутнасці стварыў яго нанава.

У гэты ж час назіралася значная паланізацыя шляхецкага саслоўя. Асабліва масавай яна стала пасля смерці Льва Сапегі, які моцна працівіўся гэтаму працэсу і карыстаўся вялікім аўтарытэтам. У выніку сацыяльная мяжа паміж панамі і іх падданымі пачала набываць яшчэ і этнічныя рысы: сялянства і мяшчанства практычна не былі закрануты працэсам паланізацыі, таму польскамоўны пан (хай сабе і мясцовага паходжання) пачаў выглядаць у іх вачах чужынцам.

Усё сказанае вышэй прывяло да таго, што ў сярэдзіне 17 ст. Рэч Паспалітая ўступіла ў паласу жорсткага крызісу, з якога, па сутнасці, ужо не выйшла. Цяжкім выпрабаваннем для Беларусі стала вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. Праз Крупшчыну рухаліся войскі, непазбежна спусташаючы навакольле. Вясной 1664 г. харугвы польнага гетмана ВКЛ Міхала Паца пасля цяжкай зімовай кампаніі адышлі з-пад Старадуба на адпачынак у міжрэчча Дняпра і Бярэзіны. Натуральна, што карміліся яны і тымі прыпа-

самі, якія маглі знайсці ў мясцовых маёнтках ды сялянскіх хатах.

З лета 1664 г. нарэшце настала замірэнне, якое было замацавана Андрусаўскім пагадненнем 1667 г. Паводле яго ўмоў ВКЛ страціла Смаленшчыну, але Аршанскі павет у поўным складзе застаўся ў княстве. Вайна прынесла дзяржаве вялізныя спусташэнні. Многія гарады і вёскі былі спалены. Шмат сялян і мяшчан загінулі ад ваенных дзеянняў ці рабаўнічых наездаў. Іншыя проста разбегліся. Увогуле, паводле падлікаў польскага даследчыка Е.Можы, Аршанскі павет за час вайны страціў кожныя два населеныя дымы з трох, а шчыльнасць насельніцтва ў ім знізілася з 20,2 да 6,2 чалавека на 1 кв. км.

Гэтую карціну добра ілюструе тарыф падымнага падатку Аршанскага павета за 1667 г., які пазначае колькасць населеных дымоў у асобных маёнтках. Так, у маёнтку Бобр, уласнасці аршанскага земскага суддзі Еранімa Камара, налічвалася 94 дымы, і яшчэ 11 — у Прудзінах, што былі ў закладзе ў Антонія Сіпайлы. Нагадаем, што напачатку 17 ст. толькі ў мястэчку Бобр было больш за 200 двароў. Звыш паловы іх за час вайны апусцела, а насельнікі загінулі альбо разбегліся.

У іншых маёнтках становішча было такім жа. У Крупках, аддадзеных князем Еранімам Сангушкам у заклад Пятру Швабу Шванскаму, тарыф вызначае ўсяго 60 дымоў, а ў Нацкім войтаўстве Барысаўскага староства — 143. Гэта войтаўства, змешчанае на сутыку сучасных Крупскага і Барысаўскага раёнаў, знаходзілася ў той час у пажыццёвым карыстанні ўдавы колішняга барысаўскага старосты Казаноўскага. Асноўная частка староства, у тым ліку паўднёвы ўскраек Крупшчыны, была ва ўладанні надворнага падскарбія Казіміра Яна Сапегі і налічвала 412 дымоў, а вылучанае з яго Гібайлавіцкае староства было нададзена полацкаму падстолію Ераніму Ліпскаму і мела 16 дымоў.

Захаваўся блізкі па часе інвентар Барысаўскага староства за 1670 г., у якім колькасць дымоў пазначана ў кожнай вёсцы паасобку. На тэрыторыі Крупшчыны да староства адносіліся 20 паселішчаў, якія разам налічвалі 119 дымоў. Буйнейшымі з іх былі мястэчка Нача з 27 цяглымі і 5 вольнымі дварамі (у ім згадваецца царква Святой Тройцы) і сяло Выдрыца з 17 дварамі. Статус мястэчка мелі таксама Ухвала і Радзіца, хаця кожнае з іх мела ўсяго па 5 двароў.

Тарыф 1667 г. дазваляе вызначыць памеры і іншых маёнткаў. Маёнтак Халопенічы налічваў 260 дымоў (частка з іх была ў паселішчах сучасных Барысаўскага і Чашніцкага раёнаў), яшчэ 65 дымоў адносілася да Хацюхова, якое было аддадзена ў заклад аршанскаму гродскаму пісару Станіславу Богушу.

Суседнія Лісічына, Барсукі і Поснікавічы, альбо Пасёмкавічы, налічвалі разам 34 дымы і належалі князю Самуэлю Лукомскаму. Напэўна, яны ўтваралі рэштку старажытнага Лукомльскага княства, якое належала з даўніх часоў продкам князя Самуэля.

У паўночна-усходнім куту Крупшчыны знаходзіўся маёнтак Гаворы з сялом Касінічы (107 дымоў), які ў 1667 г. належаў князю Міхалу Друцкаму-Саколінскаму. Крыху пазней, у 1669 г., уладальнікам гэтых паселішчаў і суседняга двара Стэфанава выступае Стэфан Гланіскі, войскі аршанскі.

Больш сціплымі па памерах былі ўладанні паноў Падбярэзскіх. Адна іх галіна валодала маёнткам Гапонавічы (колішняя Грушка Гапонаўская). Паводле тарыфу 1667 г. 15 дымоў у ім належала Самуэлю Падбярэзскаму, які трымаў яшчэ 9 дымоў у якасці апекуна кагосьці са сваіх родзічаў. У тарыфе падымнага за 1703 г. Гапонавічы згадваюцца падзеленымі на 3 часткі.

Іншая галіна Падбярэзскіх валодала ўласна Падбярэззем у Талачынскім раёне, ад якога і ўтварылася родавае прозвішча, а таксама фальваркам Навесы на самай усходняй мяжы Крупшчыны, які спярша зваўся Казлова Мяжа.

Вельмі буйным маёнткам быў Чарэйскі. Нават пасля ваенных разбурэнняў ён налічваў 2687 дымоў і быў другім па памерах ва ўсім Аршанскім павеце (пасля Магілёўскага староства). Да 1652 г. Чарэя знаходзілася ва ўладанні Казіміра Леана Сапегі — сына і апошняга прамога нашчадка славутага Льва Сапегі. Паміраючы бяздзетным, ён адпісаў свае шматлікія ўладанні блізкім і далёкім родзічам. Чарэя дасталася тагачаснаму віцебскаму ваяводу Паўлу Яну Сапегу, родзічу Казіміра Леана ў трэцім калене. Павел Сапега памёр у 1665 г., займаючы вышэйшыя дзяржаўныя пасады віленскага ваяводы і вялікага гетмана. З 4 яго сыноў 2 старэйшых валодалі затым большай часткай Крупшчыны: Казімір Ян — у якасці барысаўскага старосты, а Бенедыкт — у якасці спадчынніка бацькоўскай Чарэі, якая дасталася яму пры падзеле. У 1672 Бенедыкт Сапега заклаў Чарэйскі маёнтак за 87 тыс. злотых смаленскаму ваяводзе Рыгору Казіміру Падбярэзскаму, але пазней выкупіў назад. У канцы 17 ст. Бе-

Кафля, знойдзеная на сярэдневяковым паселішчы каля в. Гапонавічы. На адным з фрагментаў герб уладальніка маёнтка Гапонавічы.

недыкт Сапега далучыў да Чарэі суседні маёнтак Бобр. Захавалася кніга прыходу і расходу збожжа ў Бабруйскім маёнтку ў 1699 г. У складзе маёнтка ў той час былі вёскі Стары Бобр, Пліса, Куты, Прудзіны, Красная Слабада (назва «Красная» ў тагачаснай беларускай мове азначала, як і ў сучаснай рускай, «прыгожая»; таму пераклад гэтай гістарычнай назвы як «Чырвоная Слабада», які трапіў нават на шыльду дарожнага паказальніка, з'яўляецца, відавочна, памылковым), Ламское, Шацькі і Ярашоўка.

У 1703 г., якраз напярэдадні актыўных баявых дзеянняў паміж рускімі і шведамі ў час Паўночнай вайны 1700—1721 гг. на тэрыторыі Беларусі быў створаны новы тарыф падымнага падатку Аршанскага павета. Ён фіксуе памяншэнне колькасці дымоў у Чарэйскім маёнтку, нават у параўнанні з пасляваенным 1667 г. У 1703 г. ў карыстанні закладатрымальніка Міхала Пярота разам з Бабром было 2222 дымы.

Інвентар часткі Чарэйскага маёнтка, які быў створаны ў 1713 г., паказвае выразную карціну жудаснага запусцення. У інвентары апісваюцца мястэчка Чарэя і 3 войтаўствы: Меляшковіцкае, Кіявецкае і Худавецкае. З іх 2 апошнія цалкам знаходзіліся на Крупшчыне.

Кіявецкае войтаўства ўключала 19 паселішчаў (мястэчка Абчуга, вёскі Дзяньгубка, Запрудкі, Каменка, Кіявец, Лагі, Ламское, Ліпкі, Луцішча, Лютыя, Мальцы, Сакалянка, Сераёўка, Смародзінка, Стральцы, Тапарышча, Шарпілаўка, Шкорнеўка, Язвы) і мела 175 цэлых і $^{1}/_{4}$ валокі ворыўнай зямлі, але пераважная большасць з іх (161 і $^{3}/_{4}$) ляжалі пустымі. У карыстанні прыгонных сялян было ўсяго 5 і $^{3}/_{4}$ цяглых валокі і яшчэ 3 $^{1}/_{2}$ дадатковых (так званых «прыемных», з якіх павіннасці былі меншымі). Сяляне-кунічнікі, абавязаныя выплочваць толькі грашовы падатак («куніцу»), карысталіся 1,5 кунічнымі валокамі і такой жа колькасцю прыёмных. Прадстаўнікам сацыяльнай групы зямян, займаючых прамежкавае становішча паміж сялянамі і дробнай шляхтай, належала таксама 1,5 валокі. Напрыклад, у вёсцы Смародзінка мелася 10 валок і значылася 29 сялянскіх двароў, але толькі 8 існавалі ў наяўнасці. Пры гэтым 4 двары не мелі ніякай скаціны, а ў 4 астатніх было разам 5 коней і 2 каровы. У суседняй вёсцы Шарпілаўка (6 валок) з 9 двароў пуставала 7, а ў 2 жылых не было зусім ніякай скаціны. У Шкорнеўцы (3 валокі) з 15 двароў сяляне заставаліся ў 2 і толькі 1 меў каня, а ў Луцішчы (10 валок) засталося 7 двароў з 20, прычым толькі 2 двары мелі па каню і карове, а 1 — толькі карову. Вёска Мальцы з 9 валокамі і 19 дварамі пуставала цалкам.

Крыху лепшае становішча было ў Худавецкім войтаўстве, якое ахоплівала 14 паселішчаў (вёскі Асінаўка, Белыя Баркі, Буда, Вал, Дубраўка, Камень Стары, Камень Но-

вы, Ротань, Скарадзіца, Сцюдзёнка, Худаўцы, Шацькі, засценкі Красная Навалока і Напрасніца). З прыкладна 110,5 валок пуставала 42,5, але і тут вёска Асінаўка з 6 дварамі стаяла зусім пустая, гэтак жа пуставаў і адзіны двор у засценку Красная Навалока.

У складзе Чарэйскага маёнтка гэты інвентар называе вёскі Ломск (Ламское) і Шацькі, якія ў 1699 г. адносіліся да маёнтка Бобр. Напэўна, пасля аб'яднання абодвух маёнткаў у сваіх руках Бенедыкт Сапега часткова пераразмеркаваў паселішчы паміж імі.

У далейшым спадчыннае права на Чарэю захаваў за сабой сын Бенедыкта, Міхал Юзаф Сапега, які ў 1710 г. пасля прымірэння свайго дзядзькі Казіміра Яна з каралём Аўгустам вярнуўся на радзіму. Аднак доўгі час у яго не было магчымасці выкупіць маёнтак з закладу. Да 1718 г. ён заставаўся ў руках удавы Міхала Пярота.

Карыстаючыся безуладдзем, суседнія землеўладальнікі захапілі некаторыя ўкраінныя вёскі (Новы Камень, Сакалянку і інш.).

У 1729 г. ў складзе Чарэйскага маёнтка упамінаюцца 12 войтаўстваў: Вячорскае, Рыдамльскае, Горскае, Слідчанскае, Меляшкоўскае (усе ў Чашніцкім і Талачынскім раёнах), Балуцкае, Хальневіцкае, Камянецкае, Калодніцкае, Кіявецкае, Калыбанаўскае і Худавецкае (цалкам ці большай часткай на Крупшчыне).

Багацці і магутнасць Сапегаў у гэты час ужо моцна пахіснуліся. Адчуваючы пастаянную нястачу грошай, Міхаіл Сапега каля 1730 г. аддаў у заклад пану Бекельману Шчаўроўскае і Дакучынскае войтаўствы, а ў 1731 г. рэшту Чарэйскага маёнтка заклаў на 3 гады Леану Валадковічу. Перажыўшы двух сыноў, Міхаіл у 1733 г. завяшчаў свае правы на закладзены Чарэйскі маёнтак родзічу Казіміру Леану (унуку Казіміра Яна Сапегі), які ў сваю чаргу памёр у 1738 г. У яго засталіся малалетнія сыны Аляксандр і Міхал, апеку над якімі абраў брат Казіміра Леана Юзаф, біскуп-суфраган (намеснік) віленскага біскупа. Юзаф выкупіў некаторыя войтаўствы з закладу, але ў 1741 г. зноў заклаў падскарбію Яну Салагубу. Сын апошняга Юзаф Салагуб у 1745 г. дадаткова ўзяў у заклад у Юзафа Сапегі фальваркі Балюта, Каменка, Калодніца і Язвы, а ў 1748 г. — яшчэ і фальварк Калыбанава.

Маёнтак Бобр быў закладзены Сапегамі Яну Лендарфу, ды так і застаўся ў яго ўладанні. Пасля смерці Лендарфа яго ўдава Крысціна Абрамовіч у 1733 г. паўторна выйшла замуж за князя Марцыяна Міхала Агінскага, і праз гэты шлюб Бобр перайшоў да апошняга. Магчыма, пры Марцыяне Агінскім Бобр першым і адзіным з мястэчак Крупшчыны атрымаў магдэбургскае права, якое дазваляла яго жыхарам выбіраць органы самакіравання, мець пячатку і герб. У 1913 г. была апублікавана пячатка мяст. Бобр з надпісам «пячатка места магдэбурыі яго каралеўскай міласці Баброўскай» і датай 1735. Калі дата на гэтай пячатцы дакладная, то яна супярэчыць іншым паведамленням, паводле якіх магдэбургскае права было нададзена Бабру толькі ў 1762 г., калі ён належаў сыну Марцыяна Ігнацыю Агінскаму. Пытанне аб даце атрымання Бабром магдэбургскага права патрабуе далейшага вывучэння.

Змяніў уласнікаў у канцы 17 ст. яшчэ адзін буйны маёнтак Крупшчыны — Халопенічы. Яго спадчынніца Яўхімія Млечкаўна пасля смерці ў 1672 г. свайго мужа Міхала Цеханавецкага, мсціслаўскага ваяводы, паўторна выйшла замуж за Гедэона Аляксандра Халецкага. Апошні разам з жонкай у 1690 г. зрабіў дароўны (фундацыйны) запіс на Халопеніцкі касцёл, заснаваны некалі Міхалам Млечкам. У 1705 г. сын Гедэона і Яўхіміі Марцыян Дамінік Халецкі са сваёй жонкай Канстанцыяй Сакалоўскай пацвердзілі і пашырылі гэты запіс, падараваўшы касцёлу і кляштару дамініканаў у Халопенічах пляцы з ворыўнай зямлёй, фальварак і в. Мхерын (дакладней, частку яе, бо іншай часткай валодаў князь Караль Друцкі-Саколінскі), фальваркі Еліяшаўка і Пагарэлае (два апошніх — у сучасным Барысаўскім раёне).

Марцыян Халецкі, перажыўшы першую жонку, пазней ажаніўся з Фяліцыяй Кярсноўскай, удавой Міхала Храптовіча. Ад гэтага шлюбу ён меў дзвюх дачок. Адна з іх, Яўхімія, ў 1729 г. выйшла замуж за свайго аддаленага родзіча Антонія Халецкага, за якім запісала частку бацькоўскага маёнтка. Яе сястра была жонкай князя Масальскага і таксама атрымала частку Халопенічаў. Трэцюю частку Марцыян паводле завяшчання пакінуў сваёй жонцы Фяліцыі, а тая ў сваю чаргу падарыла яе свайму сыну ад першага шлюбу Марцыяну Храптовічу. У далейшым маёнтак працягваў драбіцца.

Частка тэрыторыі маёнтка перайшла ў царкоўную ўласнасць. Апрача Мхерына, падараванага Халецкімі дамініканскаму кляштару, частка сяла Грыцкавічы разам з маёнткам Пачаевічы была падаравана Сапегамі Віленскаму езуіцкаму калегіуму, а фальварк

КРУПШЧЫНА ў першай палове–сярэдзіне XVIIIст.


Заессе
Пасёмкавічы
Дудары
Барсукі
Лісіцына
Чарэя
Хальнявічы
Стафанаў
Касянічы
Гаворы
Клубынічы
Дзяньгубка
Лагі
Забор'е
Калодніца
Баркі
Каменкі
Дубраўка
Дакучын
Язвы
Абчуга
Кіявец
Бобр
Люты
Шарнева
Сакалянка
Луцішча
Смародзінка
Калыбанаў
Пруднікі
Шацькі
Кутыі
Ламескае
Ярашоўка
Стары Бобр
Пліса
Славені
Альшанікі
Мачулішча
Навесы
Еленка
Сакаловічы
Скакоўкі
Шырневічы
Крупка
Усохі
Славада
Пінскае
Шыйка
Ротань
Буда
Скарадзіца
Стральцы
Краёная Слабада
Перасека
Грушка
Худаўцы
Гапонавічы
Малыя Жаберычы
Вал Жаберычы
Радзіца
Дакудаў
Ратуцічы
Кляк
Казубец
Шчаўры
Хацюхова
Іржышча
Нача
Лошніца
Каўпеніца
Сморкі
Вялiцічы
Паўлаў Барок
Можа
Дзянісавічы
Забалоцце
Городна Вышняе
Городна Ніжняе
Выдрыца
Сакол
Узнаж
Ухвала
Пышачы
Можаны
Сомры
Гіваўлавічы
Халопеничы
Шамкі
Грыцкавічы
Калечанка
Галькі
Мхерына
Вал Лукомскае
Возера Салхаў
Чарэйскае возера
Бобр
Нача
Можа
Бярэзіна
Ваўкавіна
Чарэйскае возера
Сасноўка
Вал
Возера Салхаў
Возера Лукомскае
Возера Чарэйскае
Возера Сасноўка
Возера

Шамкі належаў Барысаўскаму касцёлу. У 1728 г. паміж Шамкамі і езуіцкімі ўладаннямі ў Грыцкавічах адбылося размежаванне.

Па-ранейшаму мала звестак пра Крупкі, якія заставаліся адным са шматлікіх уладанняў князёў Сангушкаў. Еранім Сангушка памёр у 1684 г. ва ўзросце 33 гадоў, пакінуўшы двух сыноў: сямігадовага Казіміра і двухгадовага Паўла. Крупкі, напэўна, у далейшым дасталіся Казіміру, надворнаму маршалку ВКЛ, памёршаму ў 1734 г. Тарыф падымнага Аршанскага павета за 1743 г. называе ўласніцай маёнткаў Крупкі, Грушка і Шыйка з 55 дымамі яго ўдаву, княгіню Сангушкаву. Пазней гэтыя маёнткі атрымаў у спадчыну малодшы брат Казіміра Павел, для якога яны былі дадаткам да галоўных латыфундый на Украіне.

Той жа тарыф 1743 г. дазваляе параўнаць памеры іншых маёнткаў Крупшчыны. У Бабры тады было 60 дымоў, у Халопеніцкім маёнтку — 116, у Чарэйскім — 1595. Іншыя ўладанні былі значна больш дробнымі: Гаворы пана Галінскага налічвалі 25 дымоў, Дудары, Барсукі, Лісічын і Пасёмкавічы князя Лукомскага — 18 (у гэты лік уваходзіць і частка мяст. Лукомль). Гапонавічы належалі пяці ўласнікам: Самсону Падбярэзскаму (2 дымы), Рыгору Падбярэзскаму (таксама 2), пану Мікульскаму (1) і яшчэ 1 дым — сумесна Забжыдоўскаму і Дулевічу. Маёнтак Панскае з 1 дымам быў уласнасцю Арцішэўскага, Мачулішча з 2 дымамі і Сакалавічы з 6 — Барэйшы. Упершыню выступаюць у якасці самастойнага маёнтка Прудзіны (7 дымоў) — уласнасць Багдановіча. Згадваюцца ў тарыфе таксама плябаніі Бобрскай, Грушацкай, Халопеніцкай, Худавецкай, Шэйкаўскай і Шчаўраўскай цэркваў, кожнай з якіх належала па 1 дыму.

Нават калі ўлічваць, што кожны з такіх дымоў адпавядаў некалькім дварам, усё роўна колькасць насельніцтва Крупшчыны ў сярэдзіне 18 ст. трэба прызнаць не вельмі высокай. Магчыма, яна нават не дасягнула ўзроўню мінулага «залатога века». Прычынай таму былі дзве спусташальныя вайны і агульны эканамічны заняпад, які перажывала Рэч Паспалітая. Новыя мястэчкі практычна не ўзнікалі, ды і ў старых жыццё не вельмі бурліла. Затое паўсюднае пашырэнне набыла паншчына: паны імкнуліся больш інтэнсіўна эксплуатаваць сваіх нешматлікіх падданых. Фальваркі, разлічаныя на працу прыгонных сялян, існавалі ў гэты час у Шамках, Мхерыне, Мачулішчах, Панскім. Можна меркаваць, што былі і іншыя, не названыя ў крыніцах. Інвентар Чарэйскага маёнтка за 1713 г. пазначае, напрыклад, што жыхары вёскі Кіявец раней былі толькі кунічнікамі, а потым былі пераведзены ў катэгорыю цяглых сялян з абавязкам адпрацоўваць паншчыну. Падобныя працэсы адбываліся і ў іншых паселішчах.

Больш жорсткая эксплуатацыя не вельмі ўзбагачала і саміх паноў, якія марнавалі свае даходы на раскошу і зусім не выкарыстоўвалі іх дзеля пераўсталявання гаспадаркі і развіцця вытворчасці. Не выпадкова большасць маёнткаў пастаянна закладвалася і перазакладвалася, а калі яны і выкупляліся ўласнікамі, то толькі дзеля таго, каб хутка зноў трапіць у заклад ці арэнду. Закладатрымальнікі, маючы да гэтых маёнткаў часовае дачыненне, таксама не былі зацікаўлены ў развіцці гаспадаркі. Яны імкнуліся высмактаць як мага болей даходаў, а што будзе потым — іх не турбавала.

На такім фоне ўзмацняўся і палітычны заняпад Рэчы Паспалітай. Яна ўсё больш трапляла пад уплыў суседніх дзяржаў, у першую чаргу Расійскай імперыі. Унутры дзяржавы роля яе складовых частак таксама была вельмі неаднароднай. Бясспрэчна дамініравала Польшча, культурны ўплыў якой амаль цалкам паглынуў асаблівасці беларускай і літоўскай шляхты. Старабеларуская мова канчаткова выйшла з афіцыйнага ўжытку, усе дакументы пісаліся выключна па-польску. Паміж панамі і сялянамі, пазбаўленымі ўсякіх правоў, існаваў не толькі сацыяльны, але і моўны бар'ер.

Ажыўленне ў сферы гаспадарчага жыцця пачало крыху адчувацца толькі ў апошнія дзесяцігоддзі існавання Рэчы Паспалітай, у 2-й палавіне 18 ст. Некаторыя ўладанні, паспытаўшыя драбленне, зноў збіраліся ў адно цэлае, як гэта адбылося з Халопеніцкім маёнткам пасля пераходу яго да адукаваных і энергічных уласнікаў — паноў Храптовічаў.

Частка маёнтка была завешчана ўдавой Марцыяна Халецкага яе сыну ад першага шлюбу, Марціну Храптовічу. Апошні быў руплівым гаспадаром, па кавалках збіраў раскіданыя маёнткі і імкнуўся ператварыць іх у дасканалыя па тым часе сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. У сярэдзіне стагоддзя ён набыў іншыя часткі Халопенічаў у саўладальнікаў — Казіміра Халецкага і сваёй сястры княгіні Масальскай. Яшчэ адна частка засталася ўласнасцю аршанскага стольніка Баратынскага, але Марцін Храптовіч трымаў яе ў закладзе. У 1755 г. ён жа набыў у Яна

Доўбара частку в. Мхерына — напэўна, тую, што некалі належала князям Друцкім-Саколінскім. Пасля смерці Марціна Храптовіча ў 1766 г. ўладальнікам Халопенічаў стаў яго адзіны сын Іахім (1729—1812), маршалак На. агрудскага павета, з 1773 г. — падканцле ı ВКЛ. Іахім Храптовіч значна ўзняў гаспад рку ў Халопеніцкім маёнтку, які ў гэты час пачынае называцца Халопеніцкім графствам. Яго межы пашырыліся пасля таго, як у 1773 г. быў скасаваны ордэн езуітаў, частку маёнткаў якога набыў Храптовіч. Сярод іх быў маёнтак Пачаевічы з часткай сяла Грыцкавічы. Як сведчыць інвентар за 1777 г., ва ўсім Халопеніцкім графстве было 1102 двары чыншавых сялян, а ў мястэчку Халопенічы — 25 хрысціянскіх і 77 яўрэйскіх двароў (яшчэ 27 пуставалі). Паншчына мела месца толькі ў новадалучанай частцы маёнтка, якая папярэдне належала езуітам (107 двароў).

На тэрыторыі Крупшчыны знаходзіліся 12 вёсак Халопеніцкага графства. Цікава параўнаць колькасць двароў, пазначаную ў іх інвентаром 1777 г., з амаль адначасовымі звесткамі, прадстаўленымі Храптовічам для парафіяльнага перапісу 1772 г. і падымнага тарыфу 1775 г. У абодвух афіцыйных крыніцах колькасць двароў амаль ва ўсіх вёсках значна ніжэйшая, чым у інвентары, створаным для ўласнай патрэбы гаспадара. Відаць, Храптовіч свядома ўтойваў частку сваіх падданых, каб плаціць за іх менш дзяржаўных падаткаў. Адзначым, што гэта рабіў падканцлер — асоба, якая павінна была асабліва клапаціцца аб інтарэсах дзяржавы.

Пэўны ўздым назіраўся і ў маёнтку Бобр, які ў 1750 г. перайшоў ад князя Марцыяна Агінскага да яго старэйшага сына Ігнацыя. Абодва па чарзе валодалі і Барысаўскім староствам, якое ў 18 ст. ператварылася ў такую ж амаль сямейную ўласнасць Агінскіх, якой некалі была для Радзівілаў. Марцыян з каралеўскага дазволу перадаў староства сыну яшчэ пры сваім жыцці ў 1744 г.

Жонкай Ігнацыя Агінскага была яго траюрадная сястра Алена, дачка віленскага ваяводы Казіміра Дамініка Агінскага. Гэта таксама была вельмі адукаваная асоба, якая мела шчыльныя сувязі з дваром расійскай імператрыцы Кацярыны, была добра знаёма з Кацярынай Дашкавай і іншымі дзеячамі рускага асветніцтва. Ігнацый і Алена Агінскія заснавалі ў Бабры касцёл, які пачаў дзейнічаць у 1760 г. Мястэчка мела тады каля 100 двароў і было буйнейшым з усіх паселішчаў Крупшчыны. Як ужо адзначалася, яно было і адзіным мястэчкам, якое карысталася магдэбургскім правам.

Пасля смерці ў 1775 г. бяздзетнага Ігнацыя Агінскага яго ўдава захавала за сабой пажыццёвае права на Барысаўскае староства, а Бобр падаравала свайму пляменніку Міхалу Казіміру Агінскаму — будучаму віленскаму ваяводзе, гетману ВКЛ, кампазітару і заснавальніку славутага тэатра ў Слоніме. Паводле падымнага тарыфу 1790 г., маёнтак знаходзіўся ў арэндзе ў Францішка Друцкага-Любецкага і меў 228 дымоў у мястэчку, 130 — у навакольных вёсках.

Па-іншаму складваўся лёс Чарэйскага графства, якое належала братам Аляксандру і Міхалу Сапегам, але практычна цалкам знаходзілася ў закладзе. У 1756 г. Міхал выкупіў частку маёнтка, але ў 1760 г. зноў вымушаны быў закласці. Каб разлічыцца з адным крэдыторам, ён пазычаў грошы ў другога. У 1761 г., каб выкупіць у мінскага ваяводы Гільзена частку графства, Сапега ўзяў у свайго суседа Ігнацыя Агінскага 9200 чырвоных злотых і 7500 талераў пад заклад Калыбанаўскага, Худаўскага, Дакучынскага, Язвінскага і Кіявецкага войтаўстваў.

У сваю чаргу яго брат Аляксандр у 1771 г. на гады заклаў Юзафу Салагубу фальварак Горы, да якога адносілася вёска Вялікія Хальневічы. З гэтай нагоды быў складзены інвентар, які апісвае ўсе 36 двароў гэтай вёскі. У іх жыло 170 чалавек мужчынскага полу (у тым ліку 49 малалетніх), мелася 59 коней. Сяляне трымалі 24 валокі ворыўнай зямлі, з якіх павінны былі адпрацоўваць штотыдзень 71 дзень паншчыны і выплочваць штогадовы чынш у памеры 328 злотых і 27 грошаў. Такім чынам, на двор у сярэднім прыходзілася па $^2/_3$ валокі, а павіннасці з іх складалі 2 дні паншчыны і каля 9 злотых чыншу. Адзначым, што па сваёй пакупніцкай здольнасці тагачасны злоты (30 польскіх грошаў) быў роўны прыкладна 3 літоўскім грошам часоў прыняцця Статута 1588 г.

У 1766 г. Аляксандр Сапега стаў аднаасобным уласнікам Чарэі, атрымаўшы частку яе ў спадчыну пасля памёршага брата Міхала. У 1770-я гады на тэрыторыі Крупшчыны знаходзілася 45 паселішчаў Чарэйскага графства, прычым 16 з іх знаходзіліся ў закладзе ў Ігнацыя Агінскага, а 28 — у віцебскага ваяводы Юзафа Салагуба.

Аляксандр Сапега быў прыкметнай асобай. Спярша ён займаў пасаду полацкага ваяводы, а ў 1775 г. стаў канцлерам (апошнім на

гэтай пасадзе ў гісторыі ВКЛ). Галоўныя яго маёнткі: Дзярэчын, Зэльва, Ружаны — ляжалі на Берасцейшчыне і Гродзеншчыне. У параўнанні з імі абцяжараная даўгамі Чарэя мела для яго меншую каштоўнасць. Да таго ж у 1772 г. адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай, пасля якога дзяржаўная мяжа Расіі наблізілася да самай Крупшчыны. Яна прайшла за 4 км на ўсход ад Касінічаў і далей на Талачын. Чарэйскі маёнтак апынуўся ў якасці прыгранічнага.

Пасля гэтых падзей Сапега пачынае ўжо не закладваць, а распрадаваць Чарэйскае графства. У 1778 г. ён вылучыў з графства вёскі Смародзінка, Шкорнеўка, Луцішча і засценак Шарпілаўка, якія прадаў польскаму шляхцічу з Падляшша Ераніму Пшасмыцкаму. Было складзена падрабязнае апісанне межаў новаўтворанага маёнтка. У тым жа 1778 г. Сапега прадаў Томашу Гзоўскаму мястэчка Прошыка з вёскамі Ляды, Скарадзіца, Стральцы, Дубы, Запуткі і засценкам Асінаўка, а Ануфрыю Рашкоўскаму — фальварак Шчаўры, які быў ацэнены ў 4633 злотых. Пры гэтым Шчаўры былі ў закладзе ў Ю.Салагуба, Рашкоўскаму ж было прададзена толькі права на іх выкуп. Аднак Салагуб добраахвотна адмовіўся браць у Рашкоўскага грошы і перадаў яму маёнтак без выкупу. Напэўна, разам са Шчаўрамі тады змянілі ўласніка вёскі Гута, Лошанцы і Лужа, якія ў ходзе справы не ўпамінаюцца, але пазней увахадзілі ў склад маёнтка Шчаўры.

У наступным 1779 г. Сапега прадаў Францішку Мірацкаму в. Шацькі з засценкамі Краснае (былая Красная Навалока) і Напрасніца, ацэненыя ў 18 тыс. злотых. У не дайшоўшай да нас актавай кнізе за 1784 г. быў таксама запіс аб продажы Сапегам фальварка Дзяньгубка з вёскамі Лагі, Дзяньгубка і Сыраеўка, які ўпамінаецца ў геаграфічным паказальніку да кніг Віленскага архіва, створаным у канцы 19 ст. Іванам Спрогісам. Апошні падымны тарыф Аршанскага павета, створаны ў 1790 г., фіксуе вынікі гэтай распрадажы. У якасці самастойных маёнткаў выступаюць Міхалін Міхала Еранімавіча Пшасмыцкага з 40 дварамі (цэнтрам маёнтка быў двор, названы ў гонар заснавальніка, які знаходзіўся побач з тагачаснай вёскай Смародзінка, на месцы сучаснай Смародзінскай школы), Блатаполь Яна Мірацкага з 16 дымамі (гэты двор быў заснаваны за 1,5 км ад Шацькоў па дарозе на Крупкі), Лясаполь Томаша Гзоўскага з 83 дымамі (панская сяліба была ля вёскі Асінаўка, пазней яна змясцілася ў Гзовін па паўночна-усходнім ускрайку Прошыкі), Шчаўры і фальварак Вострый (у 5 км на поўдзень ад Шчаўраў) Рашкоўскага з 163 дымамі.

Рэшткі Чарэйскага графства заставаліся ў руках канцлера Сапегі. У тым жа 1790 г. ён выкупіў з закладу ў Гіяцынта Косці мяст. Абчуга з вёскамі Кіявец, Люты, Калыбанава, Ломск і засценкам Мальцы, якія тут жа перазаклаў за 200 тыс. злотых Віленскаму кляштару піяраў. Пазней і гэты абшар быў прададзены, аднак непасрэдных дакументаў аб гэтым пакуль не знойдзена. Больш познія звесткі дазваляюць толькі прасачыць, на якія часткі распалася рэшта сапежынскіх уладанняў. Так, Абчуга, Кіявец, Люты разам з Калодніцай, Язвамі, Тапарышчам і змешчаным на супрацьлеглым беразе воз. Сялява Худавам апынуліся ва ўласнасці паноў Нітаслаўскіх, Ломск і Калабанава — у пана Камінскага, ад якога потым перайшлі да Гардзялкоўскага. Белыя Баркі, Вялікая і Малая Каменка, Дубраўка ўвайшлі ў склад маёнтка Старажышча, які разам са Шчаўрамі належаў Рашкоўскаму. Што да Асечні, Бобрыка і Забор'я, то яны захавалі сувязь з Чарэяй, разам з якой былі набыты ў Сапегі панам Мілашам. Буда і Ротыня ў пачатку 19 ст. адносіліся да маёнтка Юзэфаў, заснаванага Юзафам Дышлеўскім за 2 км на поўдзень ад Худаўцоў, а самі Худаўцы — да маёнтка Карольполь Караля Гадзіцкага.

Часовае драбленне ў 2-й палавіне 18 ст. назіралася ва ўладаннях князёў Сангушкаў. Аднаасобны іх уласнік, вялікі маршалак ВКЛ Павел Сангушка памёр у 1750 г., частку маёнткаў запісаўшы жонцы Барбары з роду Дунінаў, а рэшту сынам Юзафу Паўліну, Ераніму і Янушу. Сярод іншых быў падзелены паміж імі і маёнтак Крупка, альбо Крупскае графства, з фальваркам Стараселле, дваром і сялом Шыйка, мяст. Крупка, а таксама суседнія Талачынскае графства і Смалянскае княства, якія разам утваралі так званыя «беларускія маёнткі» Сангушкаў. Фактычна маёнткамі распараджалася Барбара, бо яе сыны на момант смерці бацькі былі зусім юнымі. Юзаф Паўлін ажаніўся з Ганнай Цэнцер і са згоды маці ў 1774 г. запісаў жонцы грашовае забеспячэнне на частцы Крупскага і Талачынскага графстваў. Калі ж у 1781 г. ён памёр, яго ўдава ўступіла ў пажыццёвае валоданне гэтай часткай. Між тым старая Барбара ў 1790 г. здала свае маёнткі на 4 гады ў арэнду Крыштафу Мяскоўскаму, а ў наступным годзе памерла. Ганна Цэнцер, другім шлюбам

замужняя за графам Каятанам Патоцкім, пацвердзіла Мяскоўскаму яго арэнднае права.

Аднак сыны Барбары, Еранім і Януш Сангушкі, настолькі прагнулі ўступіць нарэшце ва ўладанне маёнткамі, што не пажадалі лічыцца з правамі іншых асоб. З дапамогай сяброў яны захапілі Крупку і Шыйку, выгнаўшы адтуль арандатара, апячаталі склады ў Талачыне сваімі пячаткамі, падбухторвалі сялян да непадпарадкавання Мяскоўскаму і ўчынілі іншыя гвалты. Гэта стала падставай да доўгага судовага працэсу, у выніку якога правы графіні Патоцкай і Мяскоўскага былі пацверджаны. Браты Сангушкі маглі ўступіць ва ўладанне маёнткамі толькі пасля таго, як скончыцца тэрмін арэнды Мяскоўскага, а Ганна Цэнцер атрымае грашовую суму, на якую мела запіс ад першага мужа.

Пра больш дробныя маёнткі Крупшчыны захаваліся ўрывачныя звесткі. Двор Гаворы з Касінічамі, Стэфанавам і суседняй Белай Дубровай быў прададзены ў 1790 г. Феліксам і Юзафам Галінскімі Юзафу Ваньковічу. У 1791 г. адбылося размежаванне (дакладней, пацверджанне старой мяжы) паміж маёнткамі Мачулішча і Апенкавічы Юзафа Замбжыцкага з аднаго боку, Навесы і Яленка Юзафа Арцішэўскага і Тадэвуша Барташэвіча з другога. Пры гэтым прыгадваецца, што на працягу папярэдніх 15 гадоў Мачулішча заставалася ў закладзе ў Казіміра Хацятоўскага.

Невялікі маёнтак Гапонавічы ў самым цэнтры Крупшчыны па-ранейшаму належаў панам Падбярэзскім і іх шматлікім родзічам па жаночай лініі. Долю ў Гапонавічах мела яшчэ жонка ашмянскага чашніка Козела Вікторыя Падбярэзская, якая набыла яе ў спадчыну пасля бяздзетных братоў Рыгора і Мацея. У тарыфе 1775 г. названы яшчэ адзін саўладальнік Гапонавічаў пан Тарнаўскі, якому належалі таксама вёскі Малая і Вялікая Слабада. Верагодна, гэтая частка была набыта ім праз шлюб. У 1780 г. яго сыны Францішак і Ян падзялілі бацькоўскую спадчыну ў Гапонавічах і абодвух Слабодах, а ў 1792 г. Ян прадаў 3 сялянскія сям'і з 3 валокамі зямлі ў вёсцы Гапонавічы, ацэненыя ў 6 тыс. злотых, Ігнацыю Вержбалоўскаму. Такімі ж змізарнелымі былі ўладальнікі маёнткаў Шарнева і Красная Слабада, з трох бакоў аточаных землямі Чарэйскага графства. Калі Сапегі і іншыя магнаты аддавалі ў заклад і прадавалі цэлыя абшары з дзесяткамі вёсак і сотнямі падданых, то іх мізэрным суседзям даводзілася дзейнічаць на больш сціплым узроўні.



Аркуш з актавай кнігі Аршанскага земскага суда з запісам ад 16.12.1791 г. аб маёмаснай справе паміж князямі Сангушкамі наконт маёнтка Шыйка з мястэчкам Крупка.

Вельмі моцная палярызацыя, калі з аднаго боку ўзвышаліся магнаты накшталт Агінскіх, Сангушкаў і Сапегаў, а з другога цяснілася дробная шляхта накшталт Рагоўскіх і Сідароўскіх, была тыповай для Рэчы Паспалітай. Разам з тым яшчэ глыбейшая бездань пралягала паміж самым мізэрным з паноў і яго падданымі, прыгоннымі сялянамі, якіх ён прадаваў разам з зямлёй. Фармальна і канцлер Сапега, і яго сусед Сідароўскі былі раўнапраўнымі прадстаўнікамі шляхецкага роду Рэчы Паспалітай, маглі побач засядаць на павятовых сеймiках і абіраць дэлегатаў на агульнадзяржаўны сейм. На сялян жа нават паняцце «народ» у тагачасным сэнсе не распаўсюджвалася.

Адарваная ад народнага жыцця шляхта з непазбежнасцю зведала агульную хваробу любога замкнутага сацыяльнага слоя — духоўны застой і заняпад. Апошні перыяд існавання Рэчы Паспалітай прайшоў пад знакам шляхецкай анархіі і безуладдзя, усё мацнеючай залежнасці ад больш моцных дзяржаў. Магнаты адкрыта гандлявалі дзяржаўнымі інтарэсамі, дробная шляхта часта ўвогуле не жадала ведаць нічога далей межаў свайго маёнтка альбо збівалася ў паслухмяныя зграі на службе ў тых жа магнатаў.

Спробы рэформаў, якія неаднаразова прадпрымаліся ў канцы 18 ст., не прывялі да поспеху. У 1793 г. адбыўся 2-гі падзел Рэчы Паспалітай, у выніку якога ўся Крупшчына ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. Першапачаткова яна была ўключана ў Барысаўскі павет новаўтворанай Мінскай губерні, але ў хуткім часе ў Барысаўскім павеце засталіся толькі тэрыторыі Халопеніцкага графства і Барысаўскага староства (з анклавамі царкоўных земляў), а рэшта Крупшчыны была перададзена ў Магілёўскую губерню. Пры гэтым паўночная частка, якая ўключала Дакучын, Калодніцу, Язвы, Тапарышча і тэрыторыю далей да Забор'я і Клубініч, апынулася ў Сенненскім павеце, а цэнтральная (з маёнткамі Шчаўры, Прошыка, Крупкі, Бобр, Абчуга і іншымі) у Капыскім і Барысаўскім. Пачаўся новы этап у гісторыі Крупшчыны і ўсёй Беларусі.

В.Л.Насевіч.

Дакументы сведчаць

З ХРОНІКІ ЛІТОЎСКАЙ І ЖАМОЙЦКАЙ

ПРА ВАЙНУ З ЦАРОМ МАСКОЎСКІМ

1499 г.

Александер, великий князь Литовский, забравши войско литовское, послал с ним гетмана своего, князя Константина Ивановича Острозского, и з ним княжат, панов и бояр литовских и русских много, а сам за ним тягнул до Минска, а з Минска до Борисова, и там час немалый стоял... А гды ж тая новина, же поражено войско Литовское, Александра, великого князя Литовского, дошла и же Константина Острозского гетмана его и инших панов радных поимано и посажено до вязеня, велми засмутився и до Литвы вернулся, а найдено его з войском стоячего на р. Бобры.

Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 17. С. 100.

БІТВА НА БАБРЫ

Лета Божага Нар 1514, месяца мая 6 дня за тыдзень па святым Міколе па вясне ў ваўторак, прыйшоў князь вялікі Маскоўскі пад Смаленск, і стаў пад горадам, дабываючы і б'ючы з дзел, 12 нядзель.

Кароль Жыгімонт, услышаўшы тое, пайшоў бараніці Смаленска і выехаў з Вільні месяца іюля 22 дня, ў суботу, за нядзелю перад Спасавымі запустамі...

І мала на тэм маючы, Маскоўскі паслаў людзей і войска вялікае к Воршы і к Друцку, разказаўшы ім глыбока ваяваці зямлю Літоўскую, а кароль Жыгімонт пайшоў з Менску к Барысаву, а з Барысава паслаў процію войска Маскоўскага гетмана свайго князя Канстанціна Іванавіча Астроскага з войскам.

І старажавыя палкі Літоўскага войска з старажавымі палкамі Маскоўскімі спаткаліся на Бабры рацэ, і там усю Маскоўскую старожжу пабілі і многа жывых паімалі.

Полное собрание русских летописей. М., 19... Т. 17. С. 346—348, 289—290.

СУДОВАЯ СПРАВА ПАМІЖ КНЯЗЯМІ АНДРЭЕМ ІВАНАВІЧАМ АЗЯРЭЦКІМ І ДЗМІТРЫЕМ РАМАНАВІЧАМ ВІДЗІНІЦКІМ, ЯКАЯ РАЗГЛЯДАЛАСЯ ВІЛЕНСКІМ ВАЯВОДАМ ЯНАМ ЮР'ЕВІЧАМ ГЛЯБОВІЧАМ У ВІЛЕНСКІМ ЗАМКАВЫМ СУДЗЕ

1546 г.

Лета Божего нароженя 1546, месяца октября 7 день, индикта 5, в понеделок. Смотрел пан его милость того дела. Стояли у права очевисто.

Жаловал за позвы гродскими князь Андрей Иванович Озерецкий на князя Дмитра Романовича Видиницкого и на жону его Фенну, и на пасынка его князя Григорья Сенского тым

обычаем: «Земель моих властных на имя Артемовское и Куриловское немало на себе позабирал, и теперь на собе держить, и от колька лет в тех землях моих бобри гонить, мед з бору и иншие всякие пожитки на себе береть, и земли мои власные Пересецкие и Худовские имения моего Озерецкого во властных обрубах моих на себе позабирал, и поля пахати, и сеножати косити, и пчолы драти на себе кажеть. Якож в тых землях моих, котории он на себе держить, люди его дерева моего властного бортного з пчолами о колько сот попысали, и пчолы подрали, а иншое дерево пожгли. К тому зверь завжды у посполитои земли, лоси, медведи и свиньи дикие бьеть, и с того сам один уживает. За тым, жаловал, старец его Степан з ыншими людьми его мои властныи бобровыи гоны погонили, и бобры побили, и зеремена бобровыи пороскопали. И иншие многие кривды и шкоды мне самому и подданным моим от его самого, и от жонки, и от пасынка его, и от подданых их именья Худовского и Докучинского деются в кгвалтах, в наездах, боех и грабежох, в забрании земли, перекраньи меж, покаженьи древа бортного, в подраньи пчел, в засеяньи земли во властных обрубах именья моего Озерецкого и на Пересеце земли Пруское, которая прислухает к тому именью моему Озерецкому, и в ыныих многих речах». Коих кривд и шкод своих реестр на праве оказывал.

От князя Дмитрея и от жоны его, и от пасынка его князя Григорья Сенского, служебник их Ян Осецкий, постановившися у права з моцю зупольною, которую перед судом на листе оказывал, на жалобу отпираючи, мовил: «О которые земли князь Ондрей жалуеть, некоторые с тых земель спольныи, князем моим з ним неделеные. А што он маеть в одделе земли Кориловскую и Артемовскую, в то князь мой и подданые их не вступають».

Князь Ондрей поведал: «Тыи земли Артемовская и Кориловская спадком мне пришли з делу по князи Васильи Красном, а Пересецкая и Худовская по деде моем, по князи Бабе в одделе пришла. Он на властных землях моих пересецких люди свои пасадил».

А Осецкий мовил: «На Худове и на Пересеце земли спольные недельные, и не одним моим князем, але многие князи заровно вольности в тых землях мають».

Князь Озерецкий ставил шапку и на довод слался, же тыи земли на Худове и Пересеце в одделе маеть. А Осецкий на довод слатися не хотел, и мовил: «Я земли панов моих протягивати не могу».

Пан его милость, бачечи, иж то, де торч земленая заочне точитися и росправы приняти не може, казал его милость там на землю судей вывести. И рок они, обе стороны, приняли о семой суботе свята придучого в сем индикте пятом. И взял на то судью з руки своее князь Озерецкий князя Василия Багриновского, а князь Дмитр и жона и пасынок его также з руки своее одного судью взяти мають, ровного князю Василию. И на тот рок, на день семое суботы, мають они судей своих там на тые земли, где князь Озерецкий кривду собе быти менить, вывести. И там же перед оными судьями маеть князь Озерецкий оказати тые земли, которыи в отделе держал, и делу маеть доводити.

Естли при земли справа застанеть, маеть князь Дмитрей сам, и жона, и пасынок его, и подданыи их во всем князю Озерецкому на той же рок перед оными судьями усправедливитися. А естли бы тот судья князя Озерецкого, выше именем менованый, за которою причиною быти не мог, тогды князь Озерецкий кого иного, ему ровного, на тую справу свою взяти маеть. А оный, кого он на то возьметь, будеть мети моц, яко и оный именем тот описанный, справовати, и обираем права то кончити и, згодившися с судьею князя Дмитровым и пасынка его, кого они на то возьмуть. И в том никоторого принуждения не чинечи и далей не откладываючи, бо тот рок они, стороны, под страченем права приняли и зложили.

А при том был державца каменецкий князь Кузьма Жославский, а пан Миколай Станиславович, воеводич полоцкий.

Писан в Вильни.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. кмф-18, воп. 1, адз. зах. 234, арк. 71 адв. 73.

Падрыхтаваў да друку В.Л.Насевіч.

ВЕЛІКАКНЯЖАСКІ ПРЫВІЛЕЙ ТРОЦКАМУ ПАНУ (КАШТАЛЯНУ) ЕРАНІМУ ХАДКЕВІЧУ НА ЗАСНАВАННЕ МЯСТЭЧКА НА ЗЕМЛЯХ СЯЛА ЗАБАБРОЎЕ, НА МЕСЦЫ СУЧАСНАЙ ВЁСКІ БОБР

1 мая 1559 г.

Привилей пану Ерониму Ходкевичу. Позволенье ему в именью его милости Шкловском, в селе Забобровью место садити, корчмы и торг мети.

Жигимонт Август, Божю милостью король польский, великий князь литовский, руский, пруский, жомойтский, мазовецкий, иных.

Чиним знаменито сим нашим листом всим посполите и кому будеть потреб того ведати, нынешним и напотом будучим. Писал и присылал до нас пан троцкий, староста жомойтский, державца плотельский, вилькийский и тельшовский, пан Ероним Александрович Ходкевича,

просечы, абыхмо ласку нашу господарьскую вчинили и дозволили ему в ыменью его милости Шкловском, в селе Забобровью, на реце Бобре место садити, а корчмы и торг в нем дали и допустили его милости мети. А тое де место и торг там не будеть на жадной шкоде и переказе местом и корчмам нашим, бо одаль от всих мест наших.

А так кгды ж тое место и торг в селе Забобровью на реце Бобре, яко пан троцкий нам справу дал, не будеть ку шкоде и переказе местом и торгом нашим, мы з ласки нашое господарьское на просьбу пана троцкого то есмо вчинили: в том именью его Шкловском на реце Бобре, в селе Забобровью, на властном кгрунте его милости место садити и в нем корчмы и торг мети ему даем и дозволяем сим нашим листом.

Маеть его милость в том именью своем вышей помененом, на реце Бобре, в селе Забобровью, оное место свое людьми вольными похожими, а не отчичами нашыми господарьскими, а ни теж князьскими и паньскими, добровольне садити, корчмы с капщизною на себе мети и по одному дню торговом на кождую неделю встановити, который день его милость сам собе обереть и похочеть. Ведь же то все таковым обычаем чинити и день торговый встановляти маеть, якобы тое место и день в нем торговый, через него обраный и встановленный, не был ку жадное шкоде и переказе местом, торгом и пожитком нашим господарьским.

А осадивши пан троцкий за сим дозволеньем и привилеем нашим тое место, маеть сам, жона, дети, и потомки, и наследки его милости того вечне вживати, и пожиток собе в торгох и капщизнах мети, оттоли привлащати, а дня торгового судити, радити во всем по тому, яко иншые князи, панове в панстве нашом отчизном, Великом Князьстве Литовском, за привилеями нашими з мест своих пажиток, а дней торговых и в судех вольность водле права и статуту земского мають. Нижли мыто головное так, яко и в ыншых местех князьских и паньских, при нас и потомках наших, великих литовских, заставует, до того пан троцкий сам и его потомки не мають мети ничого.

И на то даем пану троцкому сей наш лист, до которого и печать нашу привесити есмо казали.

Писан у Кракове лета Божего нароженя 1559, месяца мая 1 дня.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, КМФ-18, воп. 1, адз. зах. 38, арк. 203, 203 адв.

Падрыхтаваў да друку В.Л.Насевіч.

ІНВЕНТАР, ЯКІ БЫЎ СКЛАДЗЕНЫ ПРЫ ПЕРАДАЧЫ МАЁНТКА БОБР У ЗАКЛАД АД ЯНА ХАДКЕВІЧА СТАНІСЛАВУ ПАЦУ

Пераклад з польскай мовы, са скарачэннямі

16 студзеня 1573 г.

Рэестр перадачы места Бабра і ўсёй воласці Баброўскай з людзьмі і ўсякімі даходамі і павіннасцямі, што з іх належаць, паводле распараджэння вяльможнага пана Яна Хадкевіча графа на Шклове і Мышы, старосты жамойцкага, маршалка найвышшага Вялікага княства Літоўскага, адміністратара і гетмана зямлі Ліфляндскай, старосты ровенскага, дзяржаўцы плоцельскага і тэльшоўскага у трыманне і карыстанне вяльможнаму пану Станіславу Пацу, ваяводзе віцебскаму і г.д., праз мяне, Ежы Юндзіла, падкаморага ваўкавыскага, урадніка шклоўскага, які азначаны маёнтак ва ўладанне яго міласці 16 студзеня 1573 г. надаў, так, як сам у сабе маёнтак Баброўскі пажыткі чыніць, дакладна апісаны.

Месца Бобр. У ім мяшчане ўсе новаседлыя, якім воля выйшла ў дзень Святога Міхаіла 1572 г. З аніводнага з іх яшчэ ніякай платы не бралі і не ставілі.

(1) Кузьма Мельнік з агародам Бурага дым 1, пляц 1;
(2) Шчасны Лях з агародам Бурага дым 1, пляц 1;
(3) Іван Смаршчанін, (4) Хама Прыхожы дымоў 2, пляц 1;
(5) Максім Барысавіч дым 1, пляца $^1/_2$, таго ж пляца другая палова пустая;
(6) Цімка Пашкавіч, (7) Шэмет дымы 2, пляц 1;
(8) Мішка Пятровіч, (9) Бучка дымы 2, пляц 1;
(10) Міна Іванавіч дым 1, пляца $^1/_2$, таго ж пляца другая палова пустая;
(11) Масей Кузнячонак дым 1, пляц 1;
(12) Абрам Беліковіч дым 1, пляц 1;
(13) Іван Лукамлянін, (14) Барыс Сцяпурыніч дымы 2, пляц 1;
(15) Улас дым 1, пляц 1;
(16) Цішка Паўлавіч дым 1, пляц 1;
(17) Анчута дым 1, пляц 1;
(18) Юхна Шчарэвіч, (19) Ярмак Кузнец, (20) Ходар Гічула дымы 3, пляц 1;
(21) Сцяпань Гузень,
(22) Мікіта Чабатар — дымы 2, пляц 1;
(23) Сямён Храловіч, (24) Кот Яскавіч дымы 2, пляц 1;

(25) Грышка Спікур, (26) Іван Каскевіч дымы 2, пляц 1;
(27) Пётр Іванавіч дым 1, пляц 1;
(28) Несцер Ганьковіч, (29) Санька дымы 2, пляц 1;
(30) Лаўрын Іванавіч, (31) Іван Шапач дымы 2, пляц 1;
(32) Ярмак Суднік дым 1, пляц 1;
(33) Стась Скамарох дым 1, пляц 1;
(34) Суета Ёськавіч дым 1, пляц 1;
(35) Осіп Бары дым 1, пляц 1;
(36) Осіп Суеціч, (37) Грын Лукамлянін дымы 2, пляц 1;
(38) Супрун Худавец, (39) Іван Скамарох дымы 2, пляц 1;
(40) Антух Ігнатавіч, (41) Пётр Яновіч, (42) Аладдзя дымы 3, пляц 1;
(43) Грычка Ходавец, Аладдзя пляц 1;
(44) Уласаў дом дым 1, пляц 1;
(45) Юрка Стасюковіч, (46) Масей, (47) Іван Маскалёнак дымы 3, пляц 1;
(48) Парфен Лукамлянін дым 1, пляца $^1/_2$, на другой палове дом Анчуцін, які ён пакінуў, ад таго пусты застаўся.

За ракой Бабром:
(49) Федка Каваль, (50) Анікей Гаповіч дымы 2, пляц 1;
(51) Андрэй Мошніч дым 1, пляц 1;
(52) Атрошка Палачанін дым 1, пляц 1;
(53) Хама Папірыніч, (54) Максім Буры дымы 2, пляц 1;
(55) Пётр Машнаковіч дым 1, пляц 1;
(56) Акула Гапонавіч дым 1, пляц 1;
(57) Грыцка Шычыніч дым 1, пляц 1;
(58) Антон Казінец дым 1, пляц 1;
(59) Хама Федкавіч дым 1, пляц 1;
(60) Мішка Старац дым 1, пляц 1;
(61) Бадак Касцініч дым 1, пляц 1;
(62) Мітка Шычэнін дым 1, пляц 1;
(63) Мірон дым 1, пляц 1;
(64) Ісак Шычыніч дым 1, пляц 1;
(65) Сцяпан Панамарэвіч дым 1, пляц 1;
(66) Грыдка Курапатка дым 1, пляца $^1/_2$, таго ж пляца другая палова пустая;
(67) Ігнатава ўдава дым 1, пляца $^1/_2$.

Там жа ў месцы Бабры пустых дамоў, у якіх людзі асядаць могуць, 26. Дом гасцінны ўяздны ў месце, э млынам на рацэ Бобр, у якім кола 2, і з маставым, запрададзены на год за 50 коп.

Воласць, якая прыслухоўвае да Бабра:

Сяло Забаброўе. Служба Чарняковіч дымоў 4, у ёй валок 10, моргаў 11, прутоў 10, грунт сярэдні і подлы: Кузьма Апанасавіч, Макей Грыдкевіч, Супрун, сын яго, Агей Кручко чыншу плацяць з 3 валок, да таго даніны мядовай 1 пуд. У той службе, як паведаміў старац, падданыя разабралі паміж сабой да іншых служб 5 валок, 11 моргаў і 10 прутоў, якімі карыстаюцца больш за 10 год і павінны плату з іх даваць. Той жа службы пустых валок 2.

Служба Селіхонавіч дымоў 3, у ёй валок 6: Кандрат Мацвяёвіч, Якім Баласовіч, Іван Маскалёвіч плацяць з 2 валок, 15 моргаў, даніны мядовай 1 $^1/_2$ пуда. Той жа службы Андрэй Амільяновіч прыняў 15 моргаў, павінен пачаць плаціць у 73 годзе. А пустых валок 3 засталося.

Служба Шавялёвіч дымоў 4, у ёй валок 3, моргаў 25, прутоў 24: Хрол, Гапон Ігнатовіч, Іван Далгачонак, Антон Аўсянік плацяць з 2 валок 15 моргаў, даніны мядовай 1 пуд $^3/_4$ бязмена. Той жа службы пустых валок 1, моргаў 10, прутоў 24.

Служба Зубовіч пустая, у ёй валок 2, моргаў 15.

Служба Барысавіч дымоў 5, у ёй валок 6, моргаў 15, прутоў 18: Сцяпан Марціновіч, Несцер Макаровіч, Сідар Ахрановіч, Іван Налозка, Бакун плацяць з 4 валок, даніны мядовай 1 $^1/_2$ пуда. Той жа службы пустых 2 валокі, 15 моргаў, 18 прутоў.

Служба Грыцкава дымоў 3, у ёй валок 6: Андрэй Сідаровіч, Лук'ян Прыхожы, Лук'ян, Прохараў унук плацяць з валок 3, моргаў 7, прутоў 15, даніны мядовай 1 $^1/_2$ пуда. Той жа службы пустых валок 2, моргаў 22, прутоў 15.

Служба Ананьіна дым 1, у ёй валок 3, моргаў 18, прутоў 12: старац Іван Асіповіч плаціць з валокі 1, даніны мядовай $^1/_2$ пуда. Той жа службы пустых валок 2, моргаў 18, прутоў 12.

Служба Шапецькава пустая, у ёй валок 2, моргаў 16, прутоў 24.

Павіннасць сяла Забаброўя. Плацяць чынш з асёдлай валокі па 50 грошаў, бірчага 5 гр.,

вепраўшчыны 4 гр., клікоўшчыны 14 пенязей, папоўскі 1 грош, жыта 1 салянку, аўсу 1 салянку, альбо за жыта і авёс 20 грошаў, льну па калку і даніна мядовая.

Сяло Сакаловічы. Служба Акова дымоў 3, у ёй валок: Мацвей Аковіч, Пратас Раковіч, Лявон Грышкевіч плацяць з 6 валок, даніны мядовай 3 пуды.

Служба Дзянісовіч дымоў 6, у ёй валок 6: Дзімітр Маляёвіч, Панкрат Козел, Мікіта Аўхвераў, Іван Бычковіч, Івашка Бычковіч, Амброс Аўхвяровіч плацяць з валок 5 моргаў 15, даніны мядовай пуд 1 $^{2}/_{3}$ бязмена. Той жа службы, што Самойла пакінуў, пустых 15 моргаў.

Павіннасці сяла Сакаловічаў. Плацяць чыншу з асёдлай валокі па 50 грошаў, бірчага 5 гр., вепраўшчыны 4 гр., клікоўшчыны $^{1}/_{4}$ гроша, папоўскі 1 грош, жыта 1 салянку, аўсу 1 салянку, альбо за жыта і авёс 20 грошаў, льну па кальцу і даніна мядовая.

(Апушчаны звесткі пра сяло Панькавічы з 2 службамі, 4 дварамі, сяло Манасцяровічы з 4 службамі, 12 дварамі, зямлю на Араве з 2 дымамі, якія на тэрыторыі сучаснага Талачынскага раёна).

Ва ўсёй воласці Баброўскай падданыя разбіраюць пустоўскія валокі, на якіх хто якое збожжа пасее. З усяго таго на ягамосць пана з агародаў трэці, а з поля чацверты сноп усялякага збожжа даць павінны. Сенажаці косяць сумесна. З зямель бортных пустых мёд увесь бяруць на ягамосць пана.

Да таго ж тая ўся воласць Баброўская праз ліст ягомосці пана старосты жамойцкага мае тыя вольнасці, што на ягомосць пана баброў з усіх гонаў баброўскіх не гоняць, адзінае толькі самі падданыя гоняць. Але ёсць такі звычай, што хто ўгоніць бабра, тады тое з ягомосцю панам разлічыўшы, дзеляць, што прыпадае на пусташы. А рэшту ім паводле расцэнкі грашыма выплочваюць, і яны баброў, хто з іх угоніць, сплаціўшы іх частку, на ягамосць пана даюць.

За тым жа лістом ягамосці панскім вепраў даваць не павінны, але калі 6 ліст ад яго мосці для ўласнай патрэбы яго мосці на тое быў выдадзены, у той час павінны даць іх. Дому гасцінага, які з млынам і маставым ёсць у арэндзе, чысціць паводле таго ж лісту яго мосці панскім не павінны. Але жолабы, драбіны і што б у ім адарвалася, папраўляць і падбіваць павінны. Мост, грэблю, млын на рацэ Бабрэ папраўляць і, калі будзе патрэба, зноў будаваць павінны.

Работы і падвод ніякіх не павінны, адзінае чыншавае жыта і авёс і ўсялякае збожжа, што прыходзіць з пустоўшчын, у час трымання ягамосці пана старосты жамойцкага, калі ім было загадана, да Шклова вазілі.

І на тое я, упамянуты Ежы Юндзіл, падкаморы ваўкавыскі, ураднік шклоўскі, даў яго мосці вяльможнаму пану, пану Станіславу Пацу, пры адданні ягамосці маёнтку Баброўскага, той рэестр, пад маёй пячаткай і з подпісам маёй уласнай рукі.

Дадзены ў Бабры, дня і году вышэй пісанага.

Ежы Юндзіл, падкаморы ваўкавыскі, намеснік шклоўскі, рукой уласнай.

Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. Вильна, 1887. Т. 14. С. 175—180.

Падрыхтаваў да друку В.Л.Насевіч.

РАСПАРАДЖЭННЕ БАРЫСАЎСКАГА СТАРОСТЫ КРЫШТАФА РАДЗІВІЛА АБ ЗАСНАВАННІ МЯСТЭЧКА Ў БАРЫСАЎСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ВОЛАСЦІ, НА МЕСЦЫ СУЧАСНАЙ ВЁСКІ НАЧА

Пераклад з польскай мовы

30 красавіка 1586 г.

Крыштаф Радзівіл, князь на Біржах і Дубінках, ваявода віленскі, гетман польны В.К.Л., пшэдаўскі, солецкі, барысаўскі староста.

... Даём ведаць гэтым лістом нашым усім увогуле і кождаму асобна, каму бы таго была ведаць патрэба, што мы ўглядаем з пэўных прычын патрэбу таго, каб на гасцінцы, з Барысава да Оршы ідучым, для праезжых і купецкіх людзей, на зямлі караля яго міласці дзяржавы нашай Барысаўскай, у пушчы над ракой Начай, магло засесці мястэчка, якое мае быць названа Радзівілаўскай Воляй. Тады дазволілі мы і гэтым лістом нашым дазваляем кожнаму, хто б там, у тым мястэчку згаданым на Радзівілаўскай Волі, сядзеў альбо сесці хацеў, волю альбо слабаду да дваццаці год ад гэтага году. Кожны мае на цэнтральнай плошчы ў рынку, дзе яму пакажа падстаросці наш барысаўскі, будаваць дамы на падрубах з ізбамі, а таксама раскапваць раллю і агароды, дзе яму будзе паказана тым жа падстаросцім, без пакрыўджання сельскай зямлі.

З таго ніякай грашовай платы і ніякай іншай павіннасці да скарбу нашага не павінны яны даваць да дваццаці гадоў. Толькі пакідаем мы сабе вольную карчму, якую загадалі збудаваць нашым уласным коштам для нашага пажытку. А ніякая іншая ўяздная стадола ў рынку нікім

не можа быць пабудавана. Да ласкі нашай усяляк мае вольнасць карыстацца півам, мёдам і гарэлкай ва ўласных дамах.

А калі тыя людзі, што ў тым мястэчку аселі, выседзяць волю ў дваццаць гадоў поўных паводле таго лісту нашага, павінны яны выконваць усе павіннасці нам да скарбу нашага. З валок і з дамоў сваіх, гэтак жа і з карчом піўных і гарэлачных, і з іншых пажыткаў сваіх будуць яны павінны даваць такія ж павіннасці, якія вызначаны з іншых мястэчкаў караля яго міласці, што не маюць магдэбургскага права.

Гарантуем гэтым лістом нашым тамашнім мяшчанам, што кожнаму з іх вольна будзе дом яго ўласны, які ён там, на Радзівілаўскай Волі, сам пабудаваў, прадаць, даць, дараваць і запісаць каму пажадае, каб той у тым мястэчку жыў і выконваў нам усе павіннасці з таго дому.

І на тым далі ўсім, хто б хацеў там асесці і будавацца, гэты наш ліст з подпісам рукі нашай і з прыкладаннем да яго пячаткі нашай.

Пісаны ў Барысаве 30 красавіка 1586 году.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 694, 7, адз. зах. 764, арк. 41.

Падрыхтаваў да друку В.Л.Насевіч.

ДАРАВАЛЬНАЯ ПАЦВЯРДЖАЛЬНАЯ ГРАМАТА ЛІТОЎСКАГА КАНЦЛЕРА ЛЬВА САПЕГІ ЧАРЭЙСКАМУ ТРОІЦКАМУ МАНАСТЫРУ НА ЎЛАДАННЕ ВОТЧЫННЫМІ ЛЮДЗЬМІ, УГОДДЗЯМІ І ДАХОДАМІ З ТЫМ, КАБ МАНАСТЫР ЗАСТАВАЎСЯ НАЗАЎСЁДЫ ПРАВАСЛАЎНЫМ

20 студзеня 1599 г.

«... тагды я наданне продкаў маіх папраўляючы і зацвярджаючы манастыру Святыя Тройцы на Галоўлі, які... знову направіці кацячы, усе... людзі і кгрунты, з даўнішніх часоў да таго манастыра належачыя і ад продкаў маіх наданыя, пры ... есьмі, а менавіта, сяло пры тым жа манастыры, названае атчына-манастыр, у якім вымерана волах адзінаццаць, іншае сяло Будзілава, дзе вымерана валох осьмнадцаць, трэцяе сяло нямеранае, названае Плескачы, чацвертае сяло Клубынічы, пятае сяло Рыдомль, ад міласці князёў Друцкіх-Саколінскіх на той манастыр здаўна наданос.... А да таго, фальварак манастырскі з пашняю фальваркаваю, і звышпамянёных селы атчына-манастыр, Будзілава, Плескачы, Клубынічы, Рыдомле, што адно да таго манастыра належыць з усімі іх да грунты, сенажацямі, лясамі і дубравамі, з дрэвам бортным, з азёрамі чарэйскімі, названымі Галоўлем і Залаціным, з рэкамі і з рэчкамі, з гоны бабровымі і з усім на ўсё.

Акты, относящиеся к истории Западной Росии, собранные и изданные Археографической комиссией. СПб., 1851. Т. 14. С. 190.

Падрыхтаваў да друку В.Л.Насевіч.

З БАРКУЛАБАЎСКАЙ ХРОНІКІ

Того же року 1601, месяца октобра десятого дня, целую неделю снег сильный и кгвалтовный ишол, выпал др вполголени, также и буря сильная была. Тогды пшеницы ярицы, овес, гречиху, горохи и все овощи, великое множество ярицы на полях несжатые, также и копы жатые снегом позаметала метелица... А так потом много множества людей убогих с голоду на низ с жонами и детками и з семьею, што иж страшно было не толко видети, але трудно было и выписати, што ест з верху з волости Шкловское, з Друцка, з Дубровны, з Круглы, з Бобра, з Витебска, с-под Менска, с-под Полоцка и з многих украин. А коли веж была весна в року 1602, тот находи людей множество почати мерти: по пятеру, по тридцати у яму хоронити.

Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32. С. 188.

ВЫПІСКА З КВІТАНЦЫІ КАРАЛЕЎСКАГА ЗБОРШЧЫКА І.Б.ЛУКАМСКАГА Ў АТРЫМАННІ АД ХРЫСТАФОРА СВІДЛА, УРАДНІКА МАЁНТКА ЧАРЭЙСКАГА, УСІХ ПАДАТКАЎ, ЗГОДНА З ПАСТАНОВАЙ ВАРШАЎСКАГА СЕЙМА 1601 Г.

25 мая 1602 г.

Маёнтак Чарэйскі складаўся з 3 валасцей: Чарэйскай, Худаўскай і Каравіцкай, у якіх падаткі пакладзены на 6 баяр, 30 агароднікаў, 15 наймітаў, 154 сялян подданых, а таксама з мястэчка Красны Стан, у якім мяшчане валодалі 30 валокамі зямлі і займалі 6 рынкавых плацаў і 40 вулічных.

Я, Іван Барысавіч Лукамскі, паборца его королевское милосты земски павету Оршанского, ознаймую сим моим квитом: іж за волею и розназаніем ясне вельможного пана его милості Льва Сапеги, канцлера великого княства Литовского, старосты Слонимского, Пернавского и Могилевского, урадник его милости имения Черейского, пан Крыштоф Свидло з волостей, з сёл, з бояр, з подданых и з местечка до того имения принадлежачего... отдал до рук моих побор водлуг универсалу сейму валного Варшавского постановленного в року прошлом 161, а на з'ездзе головном Виленском на оборону земли Инфлянское на року теперстнем 1602 стверженом, То ест: з имения Черейского: з бояр шести по грошей трытцаты польских и, подданых з дымов шестидесят шести по грошей пятнатцать польских; а з огородников трыццати по грошей шести польских. З местечка, названного Красного Стану: з мещан, которым вже водлуг универсалу слобода вышла, з волок трытцаци по грошей трытцати польских и з плацов рынкавых шести по грошей шести польских, а уличных сорока по грошей чотыры польских; а з млына ад двух кол по злотому польскому.

Друкуецца па кн.: Могилевская старина. Сборник статей. Могилевские губернские ведомости, вып. 2, 1900 г. и 1901 г. С. 25—27.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Далучэнне да Расійскай імперыі ў 1793 г. пацягнула за сабой пэўныя змены ў жыцці насельніцтва Крупшчыны. Імператрыца Кацярына II разглядала Беларусь як тэрыторыю, што павінна цалкам зліцца з Расіяй, і для гэтага павінен быць прыпынены польскі заходнееўрапейскі рэвалюцыйны уплыў. Указам ад 22 красавіка 1794 г. была скасавана царкоўная унія, а ўсім уніятам было прапанавана перайсці альбо ў праваслаўе, альбо ў каталіцтва. Як гэты ўказ ажыццяўляўся на практыцы, сведчаць падзеі, што адбыліся ў сяле Нача на Крупшчыне. Гісторыю гэтых падзей у 1927 г. вывучыў і апісаў беларускі гісторык Дз.І.Даўгяла ў працы «Урадавыя адносіны да уніятаў на Меншчыне ў часы Паўла І». У Начу 23 чэрвеня 1795 г. прыехала камісія для апытання прыхажан мясцовай уніяцкай царквы, ці жадаюць яны перайсці ў праваслаўе. Такое рашэнне было прынята аднагалосна. У той жа дзень адзін са святароў нанава асвяціў царкву. Між тым папярэдні уніяцкі святар Аляксандр Самовіч не пажадаў адмаўляцца ад уніі. Употай ён працягваў спраўляць свае набажэнствы. Праз год з Барысава прыехаў страпчы, застаў айца Самовіча на месцы «злачынства» і данясенне аб гэтым накіраваў ў Мінскае губернскае праўленне. 26 кастрычніка 1796 г. ў Начы пачалася выязная сесія павятовага суда. Невядома, што чакала б святара і некаторых сялян, але іх выратавала змена ўлады ў сталіцы. 6 лістапада 1796 г. памерла Кацярына II і на пасад узышоў яе сын Павел I, які не падзяляў многіх матчыных поглядаў. Святар Самовіч вырашыў скарыстаць момант. Ён склаў прашэнне на імя новага імператара, у якім прасіў аднавіць уніяцкі прыход у Начы. У красавіку 1797 г. ў Начу прыехала новая камісія. Яна прыйшла да высновы, што мяняць папярэдняе рашэнне няма падстаў. Усіх ахрышчаных Самовічам дзяцей нанава ахрысцілі ў праваслаўе.

Тым часам імператар Павел I пачаў паездку па далучаных беларускіх землях. Па дарозе з Оршы на Мінск ён павінен быў праехаць праз Начу. Цар выехаў з Оршы 8 мая 1797 г. і ўвечары таго ж дня прыбыў у Начу. Калі ён наведваў царкву, яму паспрабавалі перадаць петыцыю. Для «спынення беспарадкаў» Павел загадаў увесці ў Начу роту грэнадзёраў. Сялян прымусілі прынесці прысягу на вернасць цару. Айца Самовіча адпусцілі, а трох арыштантаў адвезлі ў Барысаў, дзе ўжо 12 мая павятовы суд прыгаварыў іх да 31 удара бізуном і высылцы на катаржныя работы ў Адэсу. Так адбылося знаёмства сялян Нацкага прыхода з новым імператарам. Праўда, у тым жа годзе Павел I усё ж аднавіў унію.

Для памешчыкаў, якія прынялі прысягу новай уладзе, асаблівых змен не адбылося. Яны захавалі свае маёнткі, а некаторыя нават набылі новыя. Так, вялізнае Барысаўскае староства ў 1798 г. было падаравана царом магнату Міхалу Радзівілу. З гэтага часу былыя дзяржаўныя сяляне сталі прыватнаўласніцкімі. У 1831 г. маёнтак перайшоў у спадчыну да ўнука Міхала—Льва Людвігавіча Радзівіла. Паводле звестак інвентару 1845 г. гэта ўладанне ахоплівала 126 населеных пунктаў, з якіх 31 знаходзіўся на тэрыторыі Крупшчыны. У тым жа інвентары маюцца цікавыя падрабязнасці пра гаспадарчае жыццё маёнтка. Сярэдні ўраджай складаў усяго сам-3. Гэта азначала, што пры норме высеву ў 6

чацвярыкоў (каля 157,4 л, ці прыблізна 110 кг) жыта ці пшаніцы на 1 дзесяціну сяляне атрымлівалі з яе ў тры разы больш. У сучасных мерах гэта азначае ўраджайнасць усяго ў 3,3 ц/га. Такая ўраджайнасць была вельмі нізкай нават у той час, калі без угнаення ўраджаі былі нізкімі амаль паўсюдна. Толькі на самых лепшых глебах збіралі да 8 ц/га. Землі ж маёнтка Барысаўшчына (як ён называўся пасля пераходу да Радзівілаў) былі пераважна пясчанымі, малаўрадлівымі. Не выпадкова ў інвентары пазначана, што сяляне мала займаюцца земляробствам, звяртаючы асноўныя намаганні на лясныя промыслы: нарыхтоўку грыбоў, ягад, смалы, дзёгцю, мёду і інш. Тым не менш частка збожжа ішла на продаж у навакольныя мястэчкі: Бобр, Барысаў, Бялынічы, Халопенічы, Беразіно і Зэмбін. У 1857 г. Барысаўшчына была набыта ў Льва Радзівіла членам імператарскай сям'і, вялікім князем Мікалаем Мікалаевічам (братам новага цара Аляксандра II).

Другі буйны маёнтак, Халопенічы, які ў канцы 18 ст. належаў графу Храптовічу, пасля яго смерці быў падзелены паміж яго дзвюма дочкамі, якія выйшлі замуж за расійскіх дваран Буцянёва і Цітова. Пры гэтым тая частка маёнтка, што ахоплівала Крупшчыну, у асноўным дасталася пані Цітовай і яе мужу. Частка маёнтка з вёскамі Хацюхова, Мачулішча, Узнацк, засценкамі Калодзя і Запруддзе была ў 1844 г. прададзена на аукцыёне. Яе набыў пан Вікенці Гарноўскі, пры якім у студзені 1846 г. быў складзены інвентар гэтага маёнтка. Захаваліся і тры інвентары Халопеніцкага маёнтка пані Цітовай за 1844, 1845 і 1847 гг.

Астатнія маёнткі былі невялікімі, ахоплівалі ад адной да некалькіх вёсак. У склад трох невялікіх маёнткаў уваходзіла і па аднаму мястэчку. Гэта былі Крупкі (уласнасць паноў Свяцкіх), Бобр (уласнасць графа І.Тышкевіча, а затым яго сына М.І.Балтарамея-Тышкевіча) і Абчуга, якая здаўна знаходзілася у руках паноў Нітаслаўскіх.

Мала што змяніў пераход у праваслаўе і ў штодзённым жыцці сялян. Як і раней, яны выконвалі розныя павіннасці на карысць памешчыкаў і дзяржавы. Па-першае, сяляне плацілі падушны падатак у памеры 2 руб. 18 кап. штогод. Калі яны не маглі выплаціць такую суму, за іх плаціў пан, а сяляне павінны былі адпрацоўваць. Яшчэ адной дзяржаўнай павіннасцю была рэкрутчына. Рэкруцкія наборы абвяшчаліся перыядычна, у сярэднім раз у год, пры гэтым кожны раз вызначалася квота (часцей за ўсё па 8—10 чалавек на 1000 душ). Сяляне самі павінны былі ўстанаўліваць чаргу, але за кепскія паводзіны можна было трапіць у рэкруты і без чаргі. Можна было і наймаць рэкрута замест сябе, калі былі грошы. Гэта павіннасць была новай справай для Беларусі, бо ў Рэчы Паспалітай рэгулярных рэкруцкіх набораў не было. Апрача дзяржаўных павіннасцей, сяляне абавязаны былі працаваць на свайго пана. Адзінкай абкладання, як і ў мінулыя часы, заставалася валока — 20 дзесяцін ворыва і каля 5 $^{1}/_{3}$ дзесяціны сенакосу. З такой валокі трэба было выконваць паншчыну у памеры 3 мужчынскіх і 3 жаночых дзён у тыдзень. Апрача таго, у лік павіннасцей уваходзілі праца на сенакосах і іншыя масавыя работы (4 разы ў год з кожнай душы) і шарваркі для будаўнічых работ (вываз лесу, рамонт і будаўніцтва гаспадарчых пабудоў — 3 мужчынскіх і 3 жаночых дні ў год з валокі). Уладальнік маёнтка мог па свойму жаданню не патрабаваць адпрацоўкі паншчыны, а браць яе грашыма. У такім выпадку 1 мужчынскі (альбо конны) дзень лічыўся за 15 капеек, а жаночы (пешы) — за 10. Былі і натуральныя павіннасці збожжам (у залежнасці ад якасці глебы яны вагаліся ад 92 да 177 л жыта, ад 46 да 92 л ячменю і аўсу з кожнай валокі). Трэба ўлічваць, што ў карыстанні сялянскага двара рэдка знаходзілася цэлая валока. У маёнтку Барысаўшчына было некалькі тыповых варыянтаў надзелаў, якія выдзяляліся сялянам у залежнасці ад колькасці рабочых рук. Так, напрыклад, у сяле Ухвала з 36 двароў 3 карысталіся надзеламі ў цэлую валоку, 1 — у $^{3}/_{4}$ валокі, 11 — у $^{1}/_{2}$ валокі, 15 — у $^{1}/_{4}$ валокі і 6 двароў увогуле не мелі worыўнай зямлі (былі агароднікамі). У сярэднім па маёнтку на 1 валоку прыходзілася па 2 двары, прычым на двор, таксама ў сярэднім, прыходзілася па 7,8 чалавек (з іх 4 — непрацаздольныя). Прыблізна кожная дзесятая сям'я мела толькі агарод. У тыповым двары было звычайна па 2 кані, 2 каровы, 3—4 авечкі, 2—3 свінні. Пчол трымалі далёка не ўсе (1 вулей прыходзіўся на 2 двары).

У іншых маёнтках становішча магло адрозніваццца, але нязначна. Так, у невялікім маёнтку Старожышча на беразе воз. Сялява, які належаў панам Рашкоўскім і ахоплівaў вёскі Дубраўка, Белыя Баркі, Вялікі і Малы Каменец, паводле інвентару 1847 г. мелася 53 цяглыя двары, у якіх жыло 448 чалавек. Такім чынам, на двор прыходзілася па 8,45 чалавек. Ураджайнасць тут была вышэй, чым у

Барысаўшчыне — сам-4. Адзінкай абкладання лічылася не валока, а цягло, якое ўтваралі адзін работнік мужчынскага і адзін— жаночага полу. Такім чынам, адзін двор мог лічыцца за палову цягла ці, наадварот, за два і болей. На цягло выдзялялася па 6 дзесяцін ворыва, а таксама па $^1/_2$ дзесяціны агароду і сенакосу. Павіннасці складалі 2 мужчынскіх (конных) і 2 жаночых (пешых) дні ў тыдзень, а таксама 8 згонаў у год, у якіх павінна было прымаць удзел усё працаздольнае насельніцтва (толькі аднаго чалавека дазвалялася пакінуць для нагляду за ўласнай гаспадаркай). За права карыстання лесам і іншымі пажыткамі належала адпрацаваць яшчэ па 28 конных і пешых дзён у год.

У цэлым жыццё сялян пасля далучэння на Расійскай імперыі не стала лепшым, бо і ў самой Расіі выразна адчуваліся цяжкасці, выкліканыя бюракратызацыяй улады і састарэлым прыгонным правам. Войны імперыі патрабавалі шмат рэкрутаў, што лягло новым і нязвыклым цяжарам на сялянства.

Беларускія памешчыкі яшчэ з часоў Рэчы Паспалітай былі паланізаваны. Пры імператарах Паўле I [1796—1801] і яго сыне Аляксандры I [1801—1825] польская культура мясцовага пануючага класа не адчувала ўціску з боку ўлады. Павел I нават дазволіў карыстацца ў юрыдычнай практыцы Статутам ВКЛ 1588 г., які быў афіцыйным зборам законаў у часы Рэчы Паспалітай. Большасць паноў вызнавала каталіцкую веру, а амаль усе сяляне вярнуліся да адноўленага уніяцтва. У панскіх маёнтках гучала польская мова, на вёсцы — беларуская. Значную частку насельніцтва мястэчкаў складалі яўрэі, якія жылі адасобленымі абшчынамі—кагаламі.

Нягледзячы на пэўны лібералізм царскіх улад, частка памешчыкаў была настроена апазіцыйна да іх, марыла аб аднаўленні Рэчы Паспалітай. У Польшчы і на захадзе Беларусі многія паны прынялі ўдзел у антырасійскім паўстанні, якое адбылося ў 1830—31 гг. Пасля гэтага адносіны царызму да мясцовай самабытнасці пачалі змяняцца. У 1839 г. на Полацкім царкоўным саборы зноў была скасавана унія, а ў 1840 г. спынена дзеянне Статута ВКЛ 1588 г., замест якога ў поўнай меры ўводзіліся расійскія законы. Хоць Крупшчына амаль не была закранута падзеямі польскага паўстання, змена дзяржаўнай палітыкі адбілася і на ёй, перш за ўсё ў рэлігійнай сферы.

Пасля паўстання канфіскоўваліся зямельныя ўладанні ўдзельнікаў паўстання і каталіцкай царквы. На Крупшчыне гэта тычылася ўскраінных частак маёнтка Ратуцічы, што раней належаў плябаніі Барысаўскага касцёла (з вёскамі Клён і Восаў), а таксама маёнтка Мхерына (Амхерына), былой уласнасці Халопеніцкага дамініканскага кляштара. У яго склад на тэрыторыі Крупшчыны ўваходзілі в. Падалец і некалькі двароў у в. Грыцкавічы, Гарадзішча і Галькі. Абодва гэтыя маёнткі перайшлі ў дзяржаўную ўласнасць. Каталіцкія касцёлы ў мястэчках Халопенічы і Бобр, аднак, не былі пакуль зачынены. Гэта адбылося пасля паўстання 1863—64 гг. У многіх сёлах замест спарахнелых цэркваў, унаследаваных ад уніяцкіх часоў, пачалося будаўніцтва новых. Урад прадпісаў ажыццяўляць гэтае будаўніцтва за кошт мясцовых памешчыкаў, што, зразумела, не магло іх узрадаваць. Так, у мяст. Крупка, дзе старая царква згарэла ў чэрвені 1843 г., было вырашана будаваць новую. Цікава, што магілёўскі епіскап Ісідар у пісьме да губернатара тлумачыў тэрміновую неабходнасць аднаўлення царквы тым, што мястэчка ляжыць на вялікай паштовай дарозе і там існуе этапная каманда для перапраўкі злачынцаў, якіх высылаюць у Сібір. Крупскі святар павінен быў, як сцвярджаў епіскап, настаўляць і суцяшаць арыштантаў.

Губернатар даручыў памешчыкам Міхаілу Свяцкаму (які незадоўга да таго часу набыў ад князёў Сангушкаў маёнтак Крупка) і Ганне Замбжыцкай (спадчынніцы суседняга маёнтка Панскае) прафінансаваць будаўніцтва царквы, паколькі іх падданыя належалі да яе прыходу. Свяцкі выдзеліў 300 рублёў, Замбжыцкая паспрабавала ўхіліцца. Яна з'ехала са свайго маёнтка ў Мінск, але яе знайшлі і там праз мясцовую паліцыю. Тады яна падала прашэнне, каб яе сялян перавялі з Крупскага прыходу ў які-небудзь суседні (Гапонавіцкі альбо Шыецкі). Але магілёўскі епіскап адмовіў ёй, і пані Замбжыцкай давялося ўсё ж унесці грошы.

Падобная гісторыя адбывалася з панамі, маёнткі якіх уваходзілі ў прыход Праабражэнскай царквы ў мяст. Абчуга. У 1847 г. епіскап дамогся ад губернатара прадпісання на будаўніцтва ў Абчузе новага царкоўнага будынку. Мясцовыя памешчыкі вымушаны былі пагадзіцца, толькі пані Юзэфа Гадзіцкая (уладальніца маёнтка Ламское) здолела адмовіцца, спасылаючыся на неўраджай. Губернатар даручыў павятоваму спраўніку ажыццяўляць «жорсткае прымушэнне» памешчыкаў, а той у сваю чаргу прадпісаў кан-

троль за выкананнем рашэння паліцэйскаму прыставу. Тым не менш пан Нітаслаўскі, уладальнік маёнтка Абчуга, паспрабаваў абысціся мінімальнымі выдаткамі. Ён паведаміў спраўніку, што атрымаў ад епіскапа дазвол зрабіць толькі прыбудову да старой царквы. Улады звярнуліся да епіскапа з запытам, а той паведаміў, што размова ішла не аб перабудове, а аб новай пабудове. Тым не менш справа з будаўніцтвам царквы вялася вельмі марудна, з 1851 па 1855 г., а аздабленне іканастасу скончылася толькі ў 1861 г.

З будаўніцтвам новай царквы ў мяст. Бобр, якое ў тыя часы належала графу Іосіфу Тышкевічу, таксама адбыўся характэрны для новай палітыкі эпізод. Сама царква, здаецца, была пабудавана без асаблівых цяжкасцей у 1842 г. Але епіскап Ісідар, наведаўшы Бобр, прыйшоў да высновы, што фасад царквы загароджаны дзвюма нязграбнымі яўрэйскімі хатамі. Епіскап прапанаваў аканому Бобрскага маёнтка перанесці гэтыя хаты на іншае месца. Аканом выказаў прынцыповую згоду, але папрасіў Ісідара атрымаць дазвол ад цывільных улад, «каб яўрэі не маглі выказаць упартасці». Епіскап звярнуўся да губернатара, а той даручыў павятоваму спраўніку на месцы вызначыць, ці сапраўды тыя яўрэйскія дамы загароджваюць царкву. Спраўнік прыехаў, пагадзіўся з думкай епіскапа і даў загад на разбурэнне дамоў і пабудову новых у іншым месцы, даручыўшы аканому «даць яўрэям лесу і рабочых па магчымасці».

Той уціск, які адчулі некаторыя памешчыкі з боку царкоўных і цывільных улад, не закранаў іх жыццёвыя інтарэсы. Яны захавалі поўную магчымасць распараджацца сваімі маёнткамі і атрымліваць з іх даходы. Увогуле аблічча Крупшчыны ў першае паўстагоддзе пасля ўваходу ў склад Расійскай імперыі захоўвала свой традыцыйны выгляд.

В.Л.Насевіч.

Дакументы сведчаць

ПРАДПІСАННЕ ПАЎЛА І МІНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ АБ ПРЫЦЯГНЕННІ ДА СУДА СЯЛЯН в. НАЧА ЗА СПРОБУ ПАДАЦЬ ІМПЕРАТАРУ СКАРГУ

8 мая 1797 г.

Г-н действительный статский советник и минский губернатор Корнеев. Во время, когда я остановился для ночлегу в д. Наче, жители оной во многом числе мужска и женска пола, собравшись скопом и заговором, в противность законов подавали мне какую-то бумагу в собственные руки. 3 чел. из сего зборища я велел взять капитану-исправнику под караул и отослать к суду, а вам предписываю наблюсти, дабы дело ними немедленно решено было и виновные в страх другим наказаны были на месте преступления.

Подлинный подписан собственною е.и.в. рукою тако:

Павел

Игнатенко *А. П.*, Сидорцов *В. Н. Хрестоматия по истории Белоруссии: С древнейших времен до 1917 г. Мн., 1977. С. 183.*

РАШЭННЕ БАРЫСАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА СУДА АБ ПАКАРАННІ СЯЛЯН в. НАЧА

12 мая 1797 г.

По указу е.и.в. Борисовский земский повятовый суд, слушав рапорт борисовского же земского комиссара Винцентия Свентицкого, последовавший по имянному е.и.в. повелению, данному сего мая 8-го дня во время высочайшего шествия в д. Начи, лежащей в Борисовском у., с препровождением крестьян 1-го д. Видрицы Силу Авсеева, 2-го д. Городка Трахима Асташкова да д. Начи Михайлы Иванова к суждению за учиненный ими противу высочайшего е.и.в. персоны скоп и заговор, коим явственно видно в последовавшем от его превосходительства г-на действительного статского советника минского губернатора и кавалера Захара Яковлевича Карнеева предложении с приложением высочайшего имянного е.и.в. Указа с і 812 от 9-го текущего месяца, предписывающего в согласность того же высочайшего Указа за учиненный скоп и заговор вышеупомянутыми крестьянами судить их по законам и наказать на месте, в страх другим, вследствие которого высочайшего е.и.в. имянного Указа в Борисовском земском повятовом суде определено, не имея надобности впавшим в преступление скопом и заговором, Силе Авсееву, Трахиму Асташкову и Михаилу Иванову чинить допросов, а полагаясь на точной силе высочайшего е.и.в. имянного Указа за смелость, что кресть-

яне вышеупомянутые дерзнули е.и.в. зделать оскорбление скопом и заговором и оскорбить святейшую е.в. персону и противу последовавшего от начальства запрещения дерзнули подавать е.и.в. какую-то бумагу, за таковое преступление в силу Уложения 2, главы 18 и 19 отделений воинских 3-й главы 19-го артикула Указа 1722 г. апреля 16-го дня должны быть лишены жизни, но вместо того в силу Указа 1754 г. сентября 30-го дня в согласность высочайшего е.и.в. Указа от 8 мая 1797 г., последовавшего на месте преступления Борисовского повета в д. Начи, наказать их кнутом, дав всякому по 31 удар, не вырезав ноздри и не ставя указанные знаки, сослать на каторжную работу в Одессу, чиня по сему исполнения при сем мнении с отписанием, как примет открытой подорожной от сего суда отправить с делом через земскую полицию Минского главного суда в 1-й департамент.

Игнатенко А. П., Сидорцов В. Н. *Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917г. Мн., 1977. С. 183—184.*

З ПІСЬМА ЕПІСКАПА МІНСКАГА І ТУРАЎСКАГА ВАРЛАМА МІНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ

Ваша Правасхадзіцельства, міласцівы гасудар.

Халопеніцкі касцёл устроены па размяшчэнню свайму ў самым цэнтры праваслаўнага насельніцтва і дзякуючы ўплыву ксёндзаў, якія маюць месца жыхарства ў м. Халопенічы надзвычайна шкодны для праваслаўнай веры — рускай народнасці і праваслаўных прыхаджан Халопеніцкай царквы, якія, як ізноў уэ'яднаныя часта наведваюць у нядзельныя і святочныя дні Халопеніцкі касцёл і гэтым самым заражаюцца духам, шкодным інтарэсам праваслаўя. Прычым царкоўнапрыходскае апекаванне Халопеніцкай царквы просіць майго хадайніцтва аб закрыцці і ліквідавання назаўсёды Рымска-Каталіцкага Халопеніцкага касцёла, які знаходзіцца ў цэнтры самога праваслаўнага насельніцтва і маючага надзвычайна шкодны ўплыў на праваслаўную веру, рускую мову і рускую народнасць, прымаючы за ўвагу і тыя абставіны, што праваслаўныя прыхаджане Халопеніцкай царквы, акрамя католікаў, акружаны яшчэ раскольнікамі, людзьмі не менш шкоднымі для праваслаўнай царквы.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 295, воп. 1, спр. 4093.

Вайна 1812 года на Крупшчыне ў дакументах і матэрыялах

Галоўнай прычынай вайны 1812 г. з'явілася барацьба паміж Расіяй і Францыяй за сферы ўплыву. 12(24) чэрвеня 1812 г. 420-тысячная армія Напалеона пераправілася праз раку Нёман у раёне Коўна і ўступіла на тэрыторыю Беларусі.

Паколькі руская армія была значна меншай па колькасці і падзялялася на 3 часткі, галоўнакамандуючы М.Б.Барклай дэ Толі прыняў рашэнне адступаць, каб выйграць час да падыходу рэзерваў і злучыць разрозненыя карпусы (1-я армія Барклая дэ Толі адыходзіла праз Свянцяны і Полацк на Віцебск, а 2-я армія П.І.Баграціёна — праз Нясвіж, Слуцк на Бабруйск). Галоўнай мэтай іх было злучэнне ў раёне Смаленска. Такім чынам, цэнтральная частка Беларусі, у тым ліку і Крупскі раён аказалася як бы ў сярэдзіне абцугоў, і ваенныя дзеянні не закранулі гэтую мясцовасць. Да 5 ліпеня французскія атрады з корпуса Л.Н.Даву без бою занялі Барысаў, а затым і Крупкі. Адразу ж пасля акупацыі французы ўстанавілі тут органы ўлады на ўзор дзяржаўнага кіравання Францыі. Губерні былі перайменаваны ў дэпартаменты, а на месцах былі створаны падпрэфектуры, якія ў сваю чаргу падзяляліся на кантоны. Частка сучаснага Крупскага раёна ўвайшла ў Барысаўскую, астатняя тэрыторыя — у Бобрскую падпрэфектуры. Акрамя таго, у гэтых падпрэфектурах генерал Грушы ўстанавіў выканаўчыя органы ўлады: камісіі і пасады падкамісараў у кантонах. На ўсім напрамку руху напалеонаўскіх войск былі створаны харчовыя магазіны. На іх склады пад кантролем чыноўнікаў падпрэфектур насельніцтва павінна было прывозіць пэўную колькасць мукі, крупы, мяса і г.д. Для тых, хто не выканае гэтыя указы, як адзначыў, напрыклад, 11 жніўня ў Барысаве генерал Барбанегр, ён накіруе ў кожную хату «по 4 солдата для экзекуцыи и прикажет платить им каждому по 12 злотых в день».

Велікім цяжарам для сялян вёсак, размешчаных каля вялікіх дарог, стала таксама конная павіннасць. Кожны дзень яны вымушаны былі пастаўляць сотні фурманак для французскіх салдат, прычым часта іх не вяр-

талі гаспадарам. 30 жніўня пісар графа Храпповіча паведамляў, што з мястэчка Халопеніч накіравана «более тысячы падвод в разное время, возвращения таковых до сих пор не видно». Да гэтага трэба дадаць рэквізіцыі фуражка, правіянта, якія праводзілі французы, дзеянні марадзёраў. Усё гэта прыводзіла да збяднення краю. Але больш жорсткае апусташэнне напалеонаўская армія зрабіла ў час адступлення.

У час жорсткіх баёў пад Смаленскам, на Барадзінскім полі, каля в. Таруціна і Малаяраслаўца непадалёк ад Масквы французы панеслі вялікія страты, а руская армія, наадварот, пастаянна папаўнялася рэзервамі. У гэтых умовах Напалеон вымушаны быў 12(24) кастрычніка аддаць загад аб адступленні. На ўсім шляху адыхода на французаў пастаянна нападалі перадавыя атрады праследаваўшай яе рускай арміі, якой камандаваў фельдмаршал М.І.Кутузаў, партызаны Давыдава, Сеславіна і інш. Да гэтага трэба дадаць, што ў той час ударылі ранніе маразы. Напалеонаўскія салдаты адчувалі востры недахоп у цёплым адзенні, ежы. У пачатку лістапада, калі армія Напалеона падышла зноў да межаў Беларусі, яе палкі і дывізіі за выключэннем, бадай гвардыі, ужо значна страцілі сваю баяздольнасць. Яны займаліся марадзёрствам, рабавалі мясцовае насельніцтва, спальвалі пры адступленні мястэчкі, вёскі.

Французскія карпусы генералаў Л.Гув'ён Сен-Сіра і К.Віктора, якіх цяснілі войскі генерала П.Х.Вітгенштэйна, адступалі праз мястэчкі Сянно, Чарэю ў напрамку Халопеніч і Барысава. 8(20) лістапада Вітгенштэйн з авангардам падышоў да Халопеніч, а 11(23) лістапада разграміў некалькі французскіх палкоў непадалёку ад в.Узнацк. Адначасова 12(24) лістапада ген. Гарпе нанёс значныя страты французскай дывізіі каля в.Батуры, якая імкнулася злучыцца з арміяй каля мяст. Бобр.

У гэты ж час Напалеон з асноўнымі сіламі рухаўся па старой смаленскай дарозе праз Талочын і 11 (23) лістапада ўступіў у мяст. Бобр, якое знаходзіцца на граніцы сучаснага Крупскага раёна. Услед за ім рухаліся казакі атамана Платава, а паралельна — галоўныя сілы рускай арміі на чале з Кутузавым.

У Бабры Напалеон зрабіў прыпынак, каб высветліць абстаноўку. Справа ў тым, што наперадзе рускія войскі, якімі камандаваў П.В.Чычагоў, занялі г. Барысаў і такім чынам напалеонаўская армія, верагодна, аказалася на тэрыторыі Крупшчыны ў акружэнні. Але ў гэты час імператар атрымаў вестку ад камандуючага авангардам маршала Н.Ш.Удзіно аб тым, што яго войскі зноў занялі г. Барысаў. Таму Напалеон 12(24) лістапада аддаў загад арміі пакінуць Бобр, узяць кірунак на мяст. Лошніца і г. Барысаў. Войскі рухаліся некалькі дзён і толькі 15(27) лістапада іх ар'ергард выйшаў за межы сучаснага Крупскага раёна. Пасля сябе яны пакінулі разрабаваную мясцовасць. Масты праз р. Бобр, Нача былі спалены, часткова ці поўнасцю спалены і разрабаваны каля 40 вёсак. «Проедешь Оршу, Дубровну, Борисов, Минск — пісаў у сваіх «Письмах русского офицера» Ф.Глінка, — ничего не заметишь, кроме бедности в народе и повсеместного разрушения — неминуемого последствия войны. В деревне Натче (Нача) было 200 дворов, теперь нет колов, так обработали её французы».

Спатрэбілася нямала часу, каб людзі на шляху адступлення напалеонаўскай арміі перасталі паміраць ад голаду і эпідэмій і аднавілі сваю гаспадарку. *Дз.М.Хромчанка.*

Паданне аб мінулай вайне

Пра курган ці, як кажуць у народзе, «французскую магілу» каля в. Гумны існуе паданне, у якім сцвярджаецца, што быццам бы адна жанчына аднойчы паспрабавала ва ўрочышчы Белыя Лужы раскапаць адзін такі могільнік. Выкапала яна нібыта там крамянёвае ружжо і шаблю і прынесла іх дадому. Але аднойчы ноччу, а яна была надзвычай месячнай, пачула стук у шыбу. Глянула і жахнулася: стаіць за акном французскі салдат пры поўнай амуніцыі і патрабуе: «Аддавай, маладзічка, маю зброю». І з'яўляўся нібыта гэты мярцвяк да яе яшчэ два ці тры разы. Перапалоханая кабета мусіла пайсці і закапаць зброю там, дзе ўзяла. Толькі пасля гэтага здань перастала з'яўляцца ёй. І апавядальніца заўсёды ў канцы павучала, каб ніхто не капаў капцы, бо гэта вялікі грэх — трывожыць пакой мёртвых.

Мабыць, такое паданне-забарона, паданне-табу ставіла сваёй мэтай прадухіліць руйнаванне курганных могільнікаў, сапраўднае паходжанне якіх старыя людзі добра ведалі.

Вельмі падобнае паданне-табу прыйшлося

мне чуць і ў вёсцы Шынкі ад старога настаўніка Глінскага: «У свабоду, пры нэпе, сялянам дазвалялася распрацоўваць лес пад пашню ў любым месцы. І вось адзін з вяскоўцаў вырашыў распрацаваць сабе поле паміж Яджарам і Шынкамі, недалёка ад Дзянісавіцкага журавіннага заказніка. Высек лес, выкарчаваў пні, спаліў ламачча. Вясною цэлы дзень араў, а калі пачало цямнець, то пачаў разворваць і курганы. Правёў адну баразну, другую, старанна налягаючы на плужок, ды бача: конь захроп, задрыжаў, вушамі затрос. Араты каня пугай, але чуе, нехта яго каўнер халоднай-халоднай рукой трымае. Павярнуўся: мярцвяк! Сіні ўвесь, вочы гараць. І нейкім глухім загробным голасам пытае:

— А навошта ж ты маю ніўку пачаў араць, няўжо табе сваёй мала?

Ірвануўся гэты чалавек, што ёсць сілы, вырваўся з рук здані і, кінуўшы каня з плугам, пусціўся дадому. Прыбег у вёску збялеўшы, зуб на зуб ад страху не пападаў, і расказаў людзям пра здарэнне ў лесе. А каня толькі на трэція суткі знайшоў далёка ад таго месца». *М.Баравуля.*

З кнігі К.Ц.Анікіевіча «Сенненскі павет Магілёўскай губерні»

Наполеон продолжал отступать к Борисову. 8 ноября он выступил из Орши; главная квартира его находилась в Каменце близ Коханова. Переночевав затем в Толочине, он поспешил 11 ноября в Бобр, куда прибыл того же числа. На пути из Орши в Бобр Наполеон приказал между прочим сжечь лишний обоз, понтоны, все экипажи и повозки, наполненные имуществом, награбленным в русских городах. Но приказ этот при отсутствии дисциплины исполнен был только отчасти и многие награбленное добро продолжали тащить, бросая его по пути в минуту критических обстоятельств.

Сохранилось предание, что французы, сняв в Москве с колокольни Ивана Великого крест, бросили его на обратном пути в мест. Крупки в озеро. По-видимому, предание унесенные французами из Москвы драгоценности переименовало в крест, так как снятый с колокольни Ивана Великого крест французы бросили в Москве же, когда узнали, что он не золотой. В 1870-х годах, действ., Крупковский помещик спускал озеро с целью найти брошенные французами под натиском казаков драгоценности, о чем помещик узнал из французского журнала. Но поиски, произведенные поверхностно, оказались тщетными...

Для прикрытия с фронта и с тыла главной французской армии маршалы Удино и Виктор должны были выйти на большую Оршанскую дорогу. Первый из них 9 ноября был у Бобра, откуда направился к Борисову, второй, оставив 10 ноября Черею, отступил за Холопеничи. Преследование Виктора Витгенштейн поручил авангардам Властова и Гарпе. В 7 верстах от дороги, у посёлка Волковыск (Бобрская вол.) авангарды атаковали французский арьергард, который, чтобы пропустить главную армию, должен был удерживать это селение до последней крайности. Наши авангарды были оттеснены до Узнацка (Борисовский уезд). Получив подкрепление, наш отряд завязал жаркое дело. Русская кавалерия опрокинула французских стрелков и конницу, врубилась в пехоту и взяла около 1500 пленных. 12 ноября ген. Гарпе настиг у Батур

Возера Лясное, у якім, згодна падання, у 1812 г. Напалеон Банапарт захаваў свой скарб.

французскую дивизию и заставил ее отступать к Бобру с потерею.

12-го же ноября утром, после ночлега среди дремучего леса, Наполеон выступил из Бобра через Лошницу к Борисову. Неприятель оставил пределы Сенненского уезда, находясь в безвыходном положении. Только случайность помогла Наполеону, окруженному со всех сторон русскими армиями, переправиться через Березину у дер. Студенки...

Нашествие французов было очень разорительно для Сенненского уезда. Беспрерывные переходы войск, грабежи со стороны беглых и мародеров, убийства, пожары — все это было тогда обычным явлением. Жители удалились в леса с частью своих пожитков, зарыв в землю или уничтожив остальную часть своего добра, дабы им не мог воспользоваться неприятель. С оставшихся жителей взимался налог хлебом, съестными припасами и деньгами.

Особенное же разорение претерпели селения, лежащие вблизи так называвшихся больших столбовых и купеческих дорог, по которым в многочисленных силах проходил неприятель. В Сенненском уезде в то время между прочим были большие дороги: 1) из Орши через Толочин, Бобр и Крупку на Борисов, Минск и 2) из Орши через Сенно на Полоцк. Сильнее пострадала южная часть уезда, дважды пропустившая через себя Наполеоновскую армию.

В Бобрской волости подверглись разорению между прочим следующие селения: дер. Мочулище, Ольшанки, Молявка (сожжена), Куты, Дворище, Ярошевка, Соколовичи, Панские (сож.), Ширневичи, Гапоновичи, заст. Комаровка, ф. Михаловка, село Плиса (частью сож. и разорено), д. Щавры, Лужа, Лошанцы, Гута (последние 4 селения во время «ретирады» неприятеля приведены в разорение), Батуры и Волковыск (часть сож. и разорены), село Тростянка, дер. Химица (приведены в совершенное разорение), Заровье, Лебедево, Шейка (были сож. и разорены), и др. В Обчугской вол.: село Апчуга, д. Головорушки, Соколянка, Новоселки, Логи, Денгубка, Киевца, Люты, Язвы, Слепцы (здесь было сражение), заст. Скопеть, Смородянка, Скорнявка, Шарпиловка, Плюговка, Хватынка, Шарнево и Журавы...

Друкуецца па кн.: Аникиевич К.Т. Сенненский уезд Могилевской губернии. Могилев, 1907. С. 74—75.

Дакументы сведчаць

РАПАРТ Ф.ЛАЗЕЎСКАГА АД 2 ЛІПЕНЯ 1812 Г.

Июля 2 числа прибыли в местечко Крупки квартирмейстеры от армии французской и забрали на почте овса 15 четвертей, горячего вина 15 вёдер и приказали мне, чтобы на завтрашний день доставлено было овса 20 четвертей, горячего вина 20 ведер, кормленого борова, пива две бочки и сена столько, чтобы довольно было, и сказали, что если того не будет завтра по утру доставлено, то жизнь моя окончится и местечко истреблено будет, а мы уже не имеем ни пива, ни боровов. Ещё на первый раз все им доставили по их требованию, а более не знаю где брать и требовать, и сие будет через несколько дней, пока армия французская не придет, а то наперед идёт конница. Извините меня, г. комиссар, что я худо пишу, ибо самому весьма трудно, а ожидаю вскорости благосклонной резолюции.

Друкуецца па кн.: Отечественная война 1812 г. Отд. 1. СПб., 1910. Т. XIV. С. 65.

АДСТУПЛЕННЕ НАПАЛЕОНА НА БАРЫСАЎ

Решившись идти из Орши на Борисов, Наполеон надеялся обезопасить движение своей главной армии корпусами Удино и Виктора, стоявшими в Черее против гр. Витгенштейна. Маршал Удино, по распоряжению Наполеона, двинулся для прикрытия главной армии из Череи на большую Оршанскую дорогу к Бобру, чтобы поспешить оттуда к Борисову, а Виктор 8-го ноября отступил от Череи к Холопеничам, чтобы быть ближе к главной армии, вышедшей того же дня из Барани к Коханову и Толочину. По следам Наполеона из Орши двигался за ним граф Платов, генерал-адъютант Кутузов со своим отрядом шел в это время из Бабиновичей на Сенно...

11 ноября, после ночевки в Толочине, Наполеон поспешил в Бобр, опасаясь, чтобы, с одной стороны, не настиг его граф Платов, а с другой, нападения со стороны графа Витгенштейна.

Когда же 9 ноября вечером Удино двинулся к Бобру, а Виктор отступил из Череи к То-

лочину, то граф Витгенштейн приказал Властову и Гарпе с их авангардами следовать за Виктором и препятствовать отступлению Наполеона на Лепель. 10 ноября Властов дошел до Коложничей, а Гарпе был около Батур (Наполеон в это время был в Толочине), а 11 ноября, когда Наполеон совершал переход из Толочина в Бобр, граф Витгенштейн двинулся из Лукомля к Черее. В этот день расположение преследовавших Наполеона наших войск было следующее: граф Платов придвинулся к Толочину, тесня французский арьергард и забрав на пути от Орши более 5000 пленных французов, Ермолов вступил в Погост, а Милорадович переправился в Копыси, где ему пришлось задержаться для наведения мостов. В Бобре Наполеон, когда его армия пришла в уныние, получил от Удино неожиданное, но радостное известие, что Борисов опять взят, и авангард Чичагова разбит... 12 ноября Наполеон выступил из Бобра через Лошницу к Борисову...

Во время движения Наполеона из Бобра в Борисов граф Витгенштейн 12 ноября был уже в Черее, а когда авангарды его вытеснили Виктора из Батур, выступил из Череи в Холопеничи, а оттуда через Барань в Борисов.

Памятная книжка Минской губернии на 1912 год. Мн., 1911.

ДАНЯСЕННЕ ГЕНЕРАЛА ВЛАСТАВА ГРАФУ ВІТГЕНШТЭЙНУ

Атрымана 12 лістапада

Халопенічы, 11 лістапада, № 326.

Сего ноября 11 числа храбрые войска вверенного мне авангарда имели случай вновь оказать известное их мужество и неустрашимость. Сего числа неприятель, идущий из Череи, около полудня напал на аванпосты мои, стоявшие в д. Вилковишках (Ваўкавыск —Д.Х.), в 2-х верстах к югу от д. Узнацк, сбил оные и оттеснил за д. Узнацк, о чём командовавший аванпостами, полковник Гернгрос, тотчас дал мне знать. Тогда, взяв я два конных орудия и батальон 23 егерского полка, поспешил прибыть туда и в 3 часа пополудни, осмотрев неприятельское расположение и заметя, что неприятель подкрепил фланкеров своих стрелкового и колонного из 9-ти рот пехоты 126 и 44 полков и Бергского легкоколонного полка приказал тотчас казачьим полком Лощилина и Пантелеева броситься на тех стрелков. Но неприятельская кавалерия, построясь тотчас, встретила нашу, но была опрокинута и прогнана, пехота же неприятельская тотчас же построилась в каре. Тогда, продвинув два конного орудия, приказал оным действовать. Но неприятель, усилив кавалерию свою, бросился на казаков и, сбив их, стремился прямо на орудия, которые прикрываемы были 2-мя эскадронами Елизаветграфского гусарского полка и одним эскадроном изюмского полка, как тотчас подвинулись вперёд, а из артиллерии приказал я дать несколько выстрелов картечью, что расстроило неприятеля, а в то же время упомянутые эскадроны бросились на неприятеля, опрокинули и совершенно разбили, которая и скрылась в лесе, причём множество побито и ранено. Тогда пехота неприятельская, построившаяся в каре, была со всех сторон окружена нашей кавалерией, ей кричали, дабы она сдалась, но они, видя, бригада генерала барона Белиарта приближается, вознамерились сопротивляться. Тогда, сделав полных два залпа картечью, приказал я вдруг броситься кавалерии нашей со всех сторон, и, не взирая на отчаянный отпор неприятеля, каре в виду целой неприятельской дивизии было смято и совершенно истреблено, которое состояло из 500 человек (по показанию командира оного 126 полка подполковника де-ля-Плянс-Сент-Гилера, который и взят). В сем случае взято в плен: капитанов — 10, поручиков — 14, подпоручиков — 2, нижних чинов, унтер-офицеров и рядовых — 305, из коих ранено легко 26, тяжело 40. На месте положено: 2 капитана, 1 поручик и около 2-х сот человек. Приближавшаяся же вышеупомянутая бригада, увидя, что уже подоспели поздно, остановилась, устроилась в боевой порядок, но наступившая уже ночь принудила меня прекратить действие, и я, оставя у д. Узнацка авангард под командного полковника Гернгроса, составленный из двух казачьих полков, 3 эскадронов гусар, одного батальона 23 егерского полка и 2 конных орудий № 23, сам возвратился в м. Холопеничи. По показанию пленного корпуса маршала Виктора тянутся по сей дороге, другая часть по большой дороге к Бобру...

Друкуецца па кн.: Харкевич В. Березина, 1812 г.: Военно-историческое исследование. СПб., 1893. С. 65—66.

З ДАНЯСЕННЯ ГРАФА ВІТГЕНШТЭЙНА АДМІРАЛУ ЧЫЧАГОВУ

12 лістапада. Чарэя. № 498.

...Я предупредил желание Вашего Высочества и еще до получения письма вашего от 11 ноября переменил направление марша моего на Холопеничи, где сего числа с корпусом буду

ночевать и авангард пошлю еще как можно далее. По дошедшим до меня сведениям о неприятеле, оной идет двумя колоннами, из коих первая, т.е. корпус Удино, поворотил к Борисову, и я полагаю, что вчерашнего числа Ваше Высочество имели дело с его авангардом. Второй же корпус, под начальством Виктора, ночевал с 11 на 12 число в Щаврах, я тесню его арьергард, отбил много обозу и взял вчера до 800 пленных. Впрочем, согласно с предположением вашим, не премину поспешить к Березине дабы сильно содействовать вверенной Вашему Высочеству армии.

Друкуецца па кн.: Харкевич В. Березина, 1812 г.: Военно-историческое исследование. СПб, 1893. С. 102.

№ 108 ГЕНЕРАЛ ВЛАСТАЎ — ГРАФУ ВІТГЕНШТЭЙНУ

Атрымана 13 лістапада

13 лістапада

в. Батуры, № 337

Посланной мною сего числа для открытия сообщения с генералом графом Платовым поручик Икскуль был у него в д. Шайках (д. Шайки в 4 верстах от большой дороги между Бобром и Крупками) и привёз прилагаемый у сего конверт на имя В.С. Граф Платов словесно приказал доложить, что он завтрашнего числа надеется быть перед Борисовом, и что он имеет направление своего марша параллельно с правой стороны неприятеля таким образом, что передовые его войска беспокоят даже голову неприятельской колонны, армия неприятельская разделена на две части, из коей императорская гвардия составляет голову, а всё прочее хвост колонны. Граф Платов з начатия ретирады отнял у неприятеля 400 пушек и взято большое количество пленных. Увидал из сих обстоятельств, что здесь не предстоит ни малейшей опасности, и услыша, что партия Кутузова уже вблизи, я решился до прибытия его самого выступить из Батур и следовать по данному мне направлению. Буде же В.С. за нужное почтете меня остановить для прикрытия левого вашего фланга, то прошу прислать мне повеление в Холопеничи, где я на несколько часов делаю привал. Посланный мною полковник Геригрос до сих пор преследует неприятеля. Император Наполеон ночевал в Бобре с 12 по 13 числа и должен быть теперь уже в 30 верстах за оными.

Друкуецца па кн.: Харкевич В. Березина, 1812 г.: Военно-историческое исследование. СПб., 1893. С. 114—115.

З ДАНЯСЕННЯ ГРАФА ПЛАТАВА КНЯЗЮ КУТУЗАВУ

15 лістапада Каўпеніца, № 205

Неприятельский арьергард перед ночью вчерашнего числа оставил Начу и сжёг за собою все мосты, но я ночевал в виду с его аванпостами. Вступив в лесные места, я должен был оставить личное моё преследование во фланг неприятелю, ограничась отрядами моих партий направо и налево поражать части неприятельския, за городом сворачивающие с большой дороги, которые берут множество в плен и истребляют.

За прошлую ночь попытался было я с правой стороны перейти через большую дорогу налево и для того ударами очистил себе дорогу и, хотя перешел между неприятеля, между Крупками и Начею ночевавшего, но как я докладываю Вам, должен бы стать я опять на большой дороге.

По медленному отступлению арьергарда неприятельского должно судить, что он сожидает все свои войска, как тянущиеся по большой дороге частями, так и те, которые от нижней части Днепра поспешно к большому тракту бежали из коих на часть Г.М.Греков один напал и разбил, но за всем тем около пяти тысяч успели присоединиться к арьергарду. Маршал Виктор с 12 на 13 число, преследуемый графом Витгенштейном, ночевал в Чеврове (в Щаврах), теперь думаю ближе уже находится к большой дороге и арьергарду неприятельскому. Теперь отряжаю я полковника Кайсарава с сильного партией влево от большой дороге для нолета на марше неприятельской армии и для соединения с адмиралом Чичаговым; сам следовать буду по большой дороге до обстоятельств. Г.М.-ж Бороздину предоставил очищать левую сторону.

Друкуецца па кн.: Харкевич В. Березина, 1812 г.: Военно-историческое исследование. СПб., 1893. С. 114—115.

ПРАДПІСАННЕ КУТУЗАВА ГРАФУ ВІТГЕНШТЭЙНУ

15 лістапада 1812 г., Круглае

Главный мой авангард под командою Милорадовича сего числа в Бобре, часть донских казаков при местечке Крупках, а большая часть оных с генералом Платовым влево от большой дороги наблюдают движение неприятеля: главная армия завтрашнего числа имеет быть в окрестности деревни Ухвалы, что на дороге от Бобра к местечку Березине.

Сборник исторических материалов, извлеченных из архива первого отделения собственной его императорского величества канцелярии. СПб., 1876. Вып. 1. С. 123.

З УСПАМІНАЎ А.БУРГОНЯ

Настало 13-е ноября, было часов семь утра, и еще не совсем рассвело. Я сидел, погруженный в черные думы, но вдруг увидел вдали голову колонны и указал на нее Пинару.

Первое, кого мы увидели, были генералы, некоторые ехали верхом, но большинство шли пешком, как и многие другие высшие офицеры... Они плелись с трудом, у всех почти были отморожены ноги и завернуты в тряпье или куски овчины; все умирали с голоду. Затем шел император, тоже пеший, с палкой в руках. Он был закутан в длинный плащ, подбитый мехом, а на голове у него была шапка малинового бархата, отороченная кругом чернобурой лисицей. По правую руку от него шел, тоже пешком, король Мюрат, по левую — принц Евгений, вице-король Италии, далее маршалы Бертье, принц Нефшательский, Ней, Мортье, Лефевр и другие маршалы, чьи корпуса большей частью были истреблены.

Миновав нас, император сел на коня, как и часть сопровождавшей его свиты, у большинства генералов уже не было лошадей. За императорской группой следовали семь или восемь сот офицеров и унтер-офицеров, двигавшихся в глубочайшем безмолвии со значками полков, к которым они принадлежали и которых столько раз водили в победоносные сражения. То были остатки от шестидесятитысячной с лишним армии. Далее шла пешая императорская гвардия в образцовом порядке — впереди егеря, а за ними старые гренадеры.

Друкуецца па кн.: Бургонь А. Пожар Москвы и отступление французов 1812 г. СПб, 1898. С. 265.

З УСПАМІНАЎ АРМАНА ДЭ КАЛЕНКУРА

Из Толочина мы переехали в Бобр, куда прибыли 13-го. На дороге попадалось ещё больше издохших лошадей, чем при наших прежних переходах. Встречались и человеческие трупы: очень много их мы находили на всех бивуаках; это были трупы людей, задохшихся от дыма костров, так как, продрогшие и почти окончательно замерэшие, они жались слишком близко к кострам. Живые стонали и не могли тащиться дальше, одни от слабости, другие — потому что у них были обморожены руки и ноги. Это ужасное зрелище произвело глубокое впечатление на всех. Несчастных окоченевших людей нельзя было убедить в том, что огонь грозит им смертью и что единственное лекарство — это двигаться и растирать конечности чем-то сухим, а ещё лучше снегом. Когда император проезжал среди этой толпы несчастных, там не раздавалось ни единого слова ропота, ни единого стона. Как они были благородны в своих страданиях, эти французы. Они обвиняли стихии, но не упрекали славу!

Друкуецца па кн.: Коленкур Арман де. Мемуары: Поход Наполеона в Россию: Пер. с фр. М., 1943. С. 256—257.

АБ РАБАВАННІ МЯСЦОВАСЦІ ПРЫ АДСТУПЛЕННІ ФРАНЦУЗСКАЙ АРМІІ

Промещичьи имения, до прихода французов полные еще жизни и довольства, представляли теперь полную картину разорения. Целый ряд имений, особенно лежавших по трактам, оказался разоренным до тла. Вот перечень этих имений: Холопеничи — графа Хрептовича, имение Свяды—Яна Жабы... Подкомиссар Ухвальского контона Беликович 22 сентября доносил, что его контон в полном обнищании, взять с него нечего, военные эзкекуции бесполезны, потому что крестьянам самим есть нечего, поля не вспаханы, так как засевать их нечем...

В Борисовском уезде было сожжено или окончательно разорено восемь церквей: Выдрицкая Космодемьянская, Нацкая Троицкая. Окрестности Борисова и той части уезда, через которые проходила отступившая французская армия, подверглись такому опустошению и разорению, что население почти поголовно разбежалось по лесам... Многие из них так и не вернулись домой, всюду по дорогам, на полях и в лесах а в селениях по улицам, огородам и в опустелых домах валялись мертвые тела и некому было хоронить их.

Положение крестьян было поистине ужасным, разорение полное, а тут еще повальные болезни, развившиеся на почве продолжительной голодовки и других лишений, и новые поборы на военные надобности.

Краснянский В.Г. Г. Борисов и Борисовский уезд в Отечественную войну 1812 г. Гродно, 1913. С. 11—59.

ДАНЯСЕННЕ КОПЫСКАГА ПАВЯТОВАГА ПРАДВАДЗІЦЕЛЯ ДВАРАНСТВА АД 29 КАСТРЫЧНІКА 1813 Г. № 972

Могилёвской губернии Копыский уезд, от границы Минской губернии до г. Орши, имеет положение своё в длину до 100 вёрст, а потому военную чрез весь уезд в 1812 г. дорогу, на которой находилось пять почтовых станций от Минской границы, а именно: Крупка, Малявка, Толочин, Коханово и Тулиничи...

Напоследок, когда бегством спасался неприятель... всякого сословия жители уезда по местечкам, селениям и деревням не токмо лишались всего достояния, но ещё сожжены: м. Бобр со всеми улицами, почти вновь выстроенными лавками, церквами Грекоуниатскими, одной в самом местечке, с домом священника, а другой по дороге, Крупка называемой, с мельницами, плотинами и многими в господском дворе строениями: м. Крупку тоже почти со всеми домами, корчмами, мельницами, платинами и мостами, грекоуниатская церковь с домами священника и почтовый дом со всеми принадлежностями...

Того ж числа ноября Наполеон перешёл м. Бобр, где имел квартиру в тамошней плебании, призывал находившихся в тамошней комиссии помещиков Онуфрия Заморецкого и Шалховского, у которых о чём спрашивал, за смертью оных, сведения не имеется. В м. Бобр 12-го ноября, следуя через Крупку, Наполеон перешёл в Минскую губернию Борисовского уезда в деревню «Начу». Генерал же Милорадовіч с Орши, через м. Толочин в Бобр, где имел ночлеги, выступив в Борисовский уезд, ген. Платов — по правой стороне почтовой дороги, около Толочина в Бобр и Борисовский уезд.

Но как от самого г. Орша до границы Борисовского уезда преследован был неприятель нашими войсками, то на самой большой дороге в местечках, селениях и деревнях собранных неприятельских человеческих тел, погибших при преследовании российскими войсками от голода и недостатка пищи, до 13000 сожжено и закопано в землю, скотских же трупов, бесчетно валявшихся по дороге, также зарыто много по распоряжению начальства, для чего особо были назначены депутаты. В м. Крупке, укрытых в озере и оставленных по дороге, отыскано 9 орудий неприятельских.

Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года, собранные и изданные по поручению великого кн. Михаила Александровича. Т. 3, Белоруссия в 1812 году. СПб., 1912. С. 32—36.

Крупшчына ў перыяд капіталізму

З 1861 г. па 1917 г. тэрыторыя сучаснага Крупскага раёна ўваходзіла часткова ў склад Сенненскага павета Магілёўскай губерні, часткова — у Барысаўскі павет Мінскай губерні. На ўсёй гэтай тэрыторыі ў канцы 19 ст. налічвалася 253 населеныя пункты, у якіх пражывала больш за 48 тыс. чалавек. Сярод іх было 4 мястэчкі (Абчуга, Бобр, Крупка, Халопенічы), 17 сёл (Вялікія Хальнявічы, Выдрыца, Грыцкавічы, Ігрушка, Калодніца, Касянічы, Лісічана, Мхерына, Нача, Пліса, Пышачы, Смародзінка, Худаўцы, Худава, Шэйка, Шчаўры, Ухвала), 133 вёскі, 6 засценкаў, 12 пасёлкаў, 22 хутары, 22 фальваркі і інш. Паводле перапісу 1897 г. ў Барысаўскім павеце пражывала ўсяго 238 231 чалавек, з іх: дваран 8579 (3,6%), духавенства 447 (0,18%), купцоў — 200 (0,08%), мяшчан — 46 620 (19,5%), сялян — 181 659 (72,2%), іншых — 726; у Сенненскім павеце пражывала 161 652 чалавекі, з іх: дваран — 3369 (2,0%), духавенства — 466 (0,28%), купцоў — 117 (0,07%), мяшчан — 23 470 (14,5%), сялян — 133 754 (82,7%), іншых — 476.

У гэты час на тэрыторыі раёна для праваслаўнага насельніцтва дзейнічалі цэрквы (прыходскія або прыпісныя) і капліцы ў 27 населеных пунктах (Абчуга, Бобр, Нача, Шчаўры, Халопенічы, Ухвала, Выдрыца, Крупка, Мхерына, Сомры, Радзіца, Пышачы, Грыцкавічы, Гапонавічы, Вялікія Хальнявічы, Касянічы, Калодніца, Лісічана, Шэйка, Худава, Пліса, Ігрушка, Клішана, Смародзінка, Прошыка, Хацюхова, Худаўцы). У большасці сваёй гэта былі невялікія драўляныя цэрквы, пабудаваныя ў 1860-я гады, калі

пасля паўстання 1863 г. царскі ўрад пачаў актыўна праводзіць палітыку русіфікацыі на беларускіх землях. Але былі сярод іх і больш старажытныя. Вядома, што царква ў Шчаўрах была пабудавана ў 1787 г., Свята-Троіцкая царква ў Начы — у 1817 г., Успенская царква ва Ухвале — у 1825 г., царква ў Бобры — у 1842 г., Праабражэнская царква ў Абчузе — у 1854—55 г.

Найбольш заможнай была прыходская Успенская царква ў Халопенічах, пабудаваная ў 1863 г. з цэглы. Халопеніцкі прыход уключаў акрамя мястэчка Халопенічы яшчэ 14 вёсак і меў больш за 3,7 тыс. прыхаджан. Царкве належала 99 дзесяцін зямлі. У 1901 г. прыходскім святаром тут быў Іосіф Вержбаловіч, які скончыў Мінскую духоўную семінарыю і нават меў узнагароды (ордэн Святой Ганны III ступені). Крыху меншым быў Ухвальскі прыход. Ён складаўся з сяла Ухвала і 11 вёсак, меў 3,3 тыс. прыхаджан. Ухвальскай царкве належала 33 дзесяціны ворнай зямлі, 18 дзесяцін сенажаці, 30 дзесяцін лесу. Больш 5 дзесяцін займала сядзіба.

Для насельніцтва каталіцкага веравызнання ў Барысаўскім павеце існавала 10 парафій, у Сенненскім — 5. Дзве з іх, Бобрская і Халопеніцкая, знаходзіліся на тэрыторыі сучаснага Крупскага раёна. У Бобры быў невялікі мураваны касцёл, пабудаваны ў 1862 г. замест драўлянага, які існаваў з 1760 г. Бобрская парафія налічвала больш за 2,5 тыс. вернікаў, сярод якіх пераважала засцянковая шляхта і сяляне. Раней парафія была заможнай, пра што сведчыла тое, што настаяцелямі касцёла прызначаліся звычайна члены капітулу. У канцы ж 19 — пачатку 20 ст. ксяндзоў матэрыяльна падтрымлівалі толькі паны Ліпскія, уладальнікі маёнтку Чачэрын. Другіх заможных каталіцкіх сямей ў парафіі ўжо не было: адны маёнткі былі канфіскаваны пасля паўстання 1863—64 гг., другія згубілі сваю маёмасць па нейкіх іншых прычынах.

Гісторыя Халопеніцкага касцёла наступная: у 1703 г. Мартын Даменік Халецкі і Канстанцыя Сакалоўская заснавалі ў Халопенічах дамініканскі кляштар. Пры ім быў пабудаваны драўляны касцёл. Для іх утрымання Халецкі завяшчаў 3 фальваркі (Мхерына, Еліяшаўка, Магілёўка) з 300 рэвізскімі душамі. У 1839 г. кляштар быў скасаваны, а фальваркі перададзены ў ведамства Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. У 1844 г. намаганнямі ксяндза Яцэвіча быў адноўлены каталіцкі касцёл. У той час Халопеніцкая парафія налічвала 1580 душ. Паступова яна таксама, як і Бобрская, прыйшла ў заняпад. Пасля паўстання 1863—64 гг. Халопенічы перасталі быць уласніцкім мястэчкам (раней яны належалі Халецкім, потым Храптовічам, Лапам) і матэрыяльнай падтрымкі касцёл ужо не меў. Беднасць парафіі прымусіла святароў здаць у арэнду землі, якія належалі касцёлу (33 дзесяціны). Кантракт быў заключаны ў 1879 г. паміж ксяндзом Лазарэвічам і мяшчанамі г. Барысава і Лепеля Злоткіным і Рапапортам тэрмінам на 12 гадоў.

Перавод каталікаў у праваслаўе скараціў колькасць парафіян у Халопеніцкай парафіі, як і наогул колькасць каталіцкіх вернікаў у беларускіх губернях. Халопеніцкі касцёл аказаўся як бы невялікім астраўком сярод амаль што цалкам праваслаўных пасяленняў. Гэта непакоіла праваслаўнае духавенства. У 1885 г. епіскап Мінскі і Тураўскі ўзбудзіў хадайніцтва аб яго скасаванні. Ён пісаў, што Халопеніцкі касцёл «вельмі небяспечны для праваслаўнай веры, рускай народнасці і праваслаўных прыхаджан Халопеніцкай праваслаўнай царквы, якія, як ізноў уз'яднаныя, нярэдка наведваюць у нядзелю і святочныя дні Халопеніцкі касцёл і тым самым заражаюцца духам, небяспечным для праваслаўя...». Але гэта ўжо былі не 1860-я гады, і таму справа зацягнулася.

На тэрыторыі Крупшчыны ў Бобрскай, Лісічанскай, Халопеніцкай, Лошніцкай валасцях жылі стараверы. Пасяліліся яны тут яшчэ з часоў Ніканаўскіх ганенняў. Належалі ў асноўным да беспапоўскай плыні федасееўскага кірунку, а таксама да папоўскай плыні Белакрыніцкай іерархіі. Былі і штундзісты. Жылі або асобнымі пасяленнямі, або разам з праваслаўнымі беларусамі. Найбольш буйнымі пасяленнямі стараверaў на тэрыторыі Крупшчыны былі Бабарыка ў Халопеніцкай і Ваўкавыск у Бобрскай валасцях, у якіх знаходзіліся і малітоўныя дамы стараверaў.

Для яўрэйскага насельніцтва ў мястэчках дзейнічалі яўрэйскія малітоўныя школы: у Бобры, Крупках і Халопенічах — па 3, у Абчузе — 1.

Людзі розных веравызнанняў і нацыянальнасцей жылі побач, дружна. Гэта было абумоўлена добразычлівым характарам мясцовых жыхароў. «Тутэйшы беларус, — адзначаў К.Ц.Анікіевіч у кнізе «Сенненский уезд Могилевской губернии» (1907), — адрозніваецца многімі сімпатычнымі рысамі ў характары. Ён праўдзівы, смірны, добразычлівы, працалюбівы, з вялікім цярпеннем пераносіць усе нягоды жыцця..., сялянскія дзе-

ці ў школах паказваюць добрыя поспехі, нягледзячы на неспрыяльныя хатнія ўмовы. Да адмоўных бакоў характару некаторых сялян адносіцца схільнасць да п'янства... Яно даўно тут ўкаранілася».

Мясцовасць раёна была даволі маляўнічай. Кажуць, калі ў 1780 г. імператрыца Кацярына II праязджала праз Сенненскі павет, дык параўнала яго наваколле з англійскім паркам. Але не толькі сваёй прыгажосцю славілася гэтая зямля, але і сваімі прыроднымі багаццямі. У 1860 — 70-я гг. на тэрыторыі Сенненскага павета была знойдзена жалезная руда. Што тычыцца той часткі, што зараз у складзе Крупскага раёна, дык і тут руда была знойдзена: каля мястэчка Бобр, на лугах, што называліся Люшына і Балюга. Былі зроблены хімічныя аналізы адкрытага мінерала, але да практычнай распрацоўкі справа не дайшла. Тут жа, у Бобрскай воласці, знаходзілася шмат крыніц з мінеральнаю вадою, якая мела лекавыя ўласцівасці: тутэйшыя жыхары выкарыстоўвалі яе для лячэння вачэй. Лічылася таксама, што гэтая з вельмі прыемным смакам вада ўзбуджала апетыт, мела танізіруючыя ўласцівасці і наогул садзейнічала ўмацаванню чалавечага арганізма. Праўда, усе гэтыя багацці, дарэчы, як і іншыя (гліны, торф, каменні і г.д.) не былі добра даследаваны і не выкарыстоўваліся ў належных мэтах.

Своеасаблівым багаццем Крупшчыны з'яўляліся таксама рэкі і азёры. Амаль на 120 вёрст (у тым ліку 50 вёрст у межах Бобрскай і Абчугскай валасцей) працягнулася рака Бобр. Шырыня гэтай рэчкі на пачатак бягучага стагоддзя даходзіла да 12 сажняў. На яе берагах утульна размясціліся мястэчкі Бобр і Крупкі, сяло Выдрыца, вёскі Стары Бобр, Шарнева і інш. Бобр — рака сплаўная. Сплаў лесу, галоўным чынам сасновага і яловага, праводзіўся вясною, пасля першай паводкі, калі вада спадала напалову — «глейнамі», «лавамі» і самасплавам уніз у Бярэзіну і Дняпро. «Глейнамі» і «лавамі» сплаўлялі лес па запрашэнні лесапрамыслоўцаў-яўрэяў плытаўшчыкі, ці, як іх тут называлі, «вадзянікі» з сяла Вяляцічы Мінскай губерні. Лес даўжынёю 1, 2 і 3 сажні сплаўлялі мясцовыя сяляне.

Каля самага вялікага возера Магілёўскай губерні — Лукомскага — прытуліліся вёскі Пасёмкавічы і Мялешкавічы. Мясцовыя жыхары лавілі ў ім шчупакоў, акунёў, плотку, уклейку, лінёў, карасёў, ляшчоў, вугроў. Зрэдку пападаліся ракі. Напачатку 20 ст. сяляне ўспаміналі, што яшчэ з дзесятак гадоў таму назад удавалася выцягнуць невадам нядрэнны ўлоў. А статыстыка сведчыла, што ў 1880-я гады у Лукомскім возеры гадавы ўлоў быў самым вялікім па Магілёўскай губерні, у дзесяткі разоў перавышаючы ўлоў амаль кожнага возера. Складаў ён больш за 2600 пудоў. Аднак драпежныя спосабы лоўлі з боку яўрэяў-арандатараў (Лукомскае возера разам з Чарэйскім арандавалі чарэйскія яўрэі за 2200 руб. у год) прывялі да таго, што рыбы ў возеры стала значна менш.

Славілася мясцовасць Крупскага раёна (асабліва Бобрская, Лісічанская, Абчугская воласці) сваімі лясамі. Тут вадзіліся мядзведзі, ваўкі, барсукі, лісы, рысі, гарнастаі, норкі, выдры, куніцы, дзікі, ласі, касулі, зайцы, вавёркі. Зрэдку яшчэ трапляліся бабры. Бывала, што мядзведзі выходзілі з лесу і знішчалі на палях авёс, нападалі на свойскіх жывёл. Але яшчэ большую шкоду прыносілі гаспадарам ваўкі: за 1901—03 гг. ў Сенненскім павеце яны знішчылі коней, кароў, жа-

Памятны знак у Халопенічах, устаноўлены ў 1861 г. ў гонар адмены прыгоннага права.

рабят, цялят і іншых жывёл амаль на 40 тыс. рублёў.

19 лютага 1861 г. быў абнародаваны царскі маніфест аб адмене прыгоннага права. У Беларусі рэформа ажыццяўлялася на аснове Агульнага і двух мясцовых палажэнняў. На Магілёўскую губерню, у якой знаходзілася большая частка сучаснага Крупскага раёна, распаўсюджвалася «Мясцовае палажэнне для вялікарасійскіх, новарасійскіх і беларускіх губерняў». Устанаўліваліся вышэйшыя і ніжэйшыя памеры надзелаў. Вышэйшы надзел вагаўся ад 4 да 5,5 дзесяцін, ніжэйшы — ад 1 да 2 дзесяцін на душу мужчынскага полу. Калі дарэформенны сялянскі надзел быў большы, чым вышэйшы, памешчык меў права адрэзаць лішак на сваю карысць. Устанаўлівалася паншчына ў памеры 40 мужчынскіх і 30 жаночых дзён у год з надзела на душу, захоўвалася абшчыннае землекарыстанне, уводзілася кругавая парука.

У той частцы раёна, што належала да Мінскай губерні, рэформа ажыццяўлялася паводле «Мясцовага палажэння для Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і часткі Віцебскай губерняў». Вылучэнне гэтых губерняў у асобную групу было выклікана тым, што ў іх панавала падворнае землекарыстанне, былі ўведзены інвентары, налічвалася вялікая колькасць абеззямеленых сялян. Палажэнне захоўвала правы на дарэформенны надзел. Адрэзкі ад сялянскіх надзелаў дазвалялася рабіць у выпадках, калі памер сялянскага надзелу перавышаў інвентары, або калі ў памешчыка пасля рэформы заставалася менш $^1/_3$ зямлі, якая яму належала. Памешчык лічыўся ўласнікам сваёй зямлі, якая належала яму да рэформы. Тая частка зямлі, якая вылучалася сялянам для надзелу, давалася ім толькі ў карыстанне. На працягу дзевяці гадоў сяляне былі абавязаны трымаць адведзены ім надзел і выконваць павіннасці. Да заключэння выкупной здзелкі яны лічыліся часоваабавязанымі і маглі адыходзіць ад памешчыка толькі з яго дазволу. У гэтых губернях устанаўліваўся максімальны аброк — 3 руб. з дзесяціны, паншчына — не больш 23 дзён з дзесяціны ў год.

Рэформа не задаволіла сялян. Ім цяжка было ўсвядоміць паняцце аб асабістай свабодзе ў спалучэнні з абавязковымі павіннасцямі на карысць памешчыка. Незадаволенасць спараджала чуткі аб фальшывасці маніфеста і Палажэнняў. Сялянскі рух ахапіў усе беларускія губерні. Адбываліся хваляванні і ў Сенненскім і Барысаўскім паветах, хоць яны і лічыліся адносна спакойнымі раёнамі. Даводзячы да ведама Аляксандра II становішча спраў у Магілёўскай губерні ў лютым 1861 г., магілёўскі губернатар пісаў: «Вышадкаў ... непаслухмянасці сялян у Магілёўскай губ. было больш 50... Больш спакойнымі паветамі былі: Сенненскі, Чавускі, Чэрыкаўскі; у паветах жа Рагачоўскім, Гомельскім і Аршанскім хваляванне было больш моцным...»

Напачатку мая 1861 адбылося хваляванне сялян у сяле Худаўцы. Яны адмовіліся выконваць свае павіннасці ў адносінах да памешчыка Газдзіцкага. Як відаць з данясення магілёўскага губернатара міністру ўнутраных спраў, меры, якія прыняла паліцыя, каб навесці парадак, «засталіся беспаспяховымі, і сяляне працягвалі адмаўляцца ад выканання свайго абавязку; пры гэтым выказалі непавагу да ўлад, а арыштаваных галоўных зачыншчыкаў спрабавалі вызваліць сілай». Пры гэтым губернатар дадаў, што прычынай беспарадкаў быў адзін з раскольнікаў, які праходзіў праз вёску і пераканаў сялян у тым, што памешчык утаіў 6 лістоў Палажэння, у якіх змяшчалася поўнае азначэнне сялянскай свабоды. Парадак быў адноўлены паліцыяй з дапамогай вайскоўцаў.

У 1863 г. ўспыхнула паўстанне на тэрыторыі Польшчы, Беларусі і Літвы. Не абмінулі гэтыя падзеі Мінскую і Магілёўскую губерні і непасрэдна тыя іх часткі, што складаюць сёння Крупскі раён. Актыўныя дзеянні на Міншчыне, у тым ліку і ў Барысаўскім павеце, пачаліся з красавіка 1863 г., і ўжо пачатак узброенай барацьбы паказаў, што масавае паўстанне не ўдалося. Сяляне яго не падтрымалі. І атрады гінулі адзін за адным пры сутычках з царскімі войскамі. 7 мая 1863 г. адбылася сутычка каля в. Падбярэззе. У ёй удзельнічалі 2 роты Крамянчугскага палка пад камандаваннем капітана Журомскага. Атрад інсургентаў, якім камандаваў Дыбоўскі (Зарэмба), налічваў 300—400 чалавек, у тым ліку 60 коннікаў. У выніку ваенных дзеянняў атраду паўстанцаў было нанесена паражэнне. У гістарычных крыніцах існуюць супярэчлівыя звесткі аб усіх стратах паўстанцаў у гэтай сутычцы. Таму можна толькі адзначыць, што паўстанцы згубілі частку свайго атрада і абоз са зброяй, у тым ліку і невялікую пушку. У той жа дзень рота капітана Францэвіча разбіла ў лесе пад назвай Валоўя Гара, паміж Халопенічамі і Шчаўрамі, яшчэ адзін паўстанцкі атрад пад камандаваннем Шлягера, які базіраваўся ва ўладаннях Томаша Хмуровіча. Паўстанцы страцілі 5 чалавек, а неўза-

баве сяляне схапілі яшчэ 24 чалавекі, у тым ліку кадэта полацкага корпуса Нітаслаўскага і Хмуровіча.

Асаблівае значэнне надавалася паўстанню ў Магілёўскай губерні. Меркавалася, што адсюль рэвалюцыйныя падзеі распаўсюдзяцца і на ўнутраныя расійскія губерні. У пачатку красавіка 1863 г. сюды быў накіраваны Л.М.Звяждоўскі (псеўд. Тапор), якому было даручана кіраўніцтва ўсімі дзеяннямі паўстанцаў на ўсходзе. Да гэтага ў губерню прыбылі афіцэры К.А.Жаброўскі, А.В.Алендскі, І.М.Будзіловіч, Я.А.В. Жукоўскі, якія пачалі фарміраваць паўстанцкія атрады ў Аршанскім, Сенненскім і Чэрыкаўскім паветах. Атрад Сенненскага павета пад кіраўніцтвам Жаброўскага (паводле планаў Звяждоўскага) павінен быў зацвердзіцца каля Лукомля, сярод тамашніх лясоў, азёр і балот, і дзейнічаць на поўнач ад Магілёва. Але калі Жаброўскі прыбыў у азначанае месца, замест 150 чалавек там сабралася толькі 23. Не падтрымалі паўстанцаў і мясцовыя сяляне. У Сенненскім павеце, на які яны так разлічвалі, да іх прымкнула толькі некалькі дзесяткаў чалавек. У выніку атрад Жаброўскага, які лукомскі ксёндз прывёў да прысягі, не налічваў і 100 чалавек. Зразумела, што ісці з такімі сіламі на Сянно, дзе стаялі тры роты рэзервовых батальёнаў (у кожнай ад 50 да 100 салдат) было немагчыма. Жаброўскі накіраваў свой атрад у Мінскую губерню, дзе злучылася некалькі паўстанцкіх груп. Гэты аб'яднаны атрад інсургентаў быў разбіты ў вышэйзгаданай сутычцы каля в. Падбярэззе. Жаброўскі трапіў у палон, пазней паводле прысуду расстраляны ў Барысаве.

Каб адцягнуць ад удзелу ў паўстанні шырокія масы сялян, пры правядзенні рэформы ў беларускіх губернях былі зроблены некаторыя ўступкі: 1 сакавіка 1863 г. выдадзены ўказ, паводле якога ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і частцы Віцебскай губерняў з 1 мая 1863 г. спыняліся часоваабавязаныя адносіны паміж памешчыкамі і сялянамі, апошнія пераводзіліся ў разрад уласнікаў, а выкупныя плацяжы змяншаліся на 20% (гэтыя правілы былі пашыраны дадатковым цыркулярам ад 2 лістапада 1863 г. на Магілёўскую губерню, а выкупныя плацяжы зніжаны на 23,8%). Аднак працягвала захоўвацца буйное памешчыцкае землеўладанне. У 1877 г. дваранам належала 50,3% усёй зямельнай плошчы, надзельная сялянская зямля складала 33,4%, землі царквы, казны, розных устаноў — 11,2%. Пры гэтым буйным уладальнікам (звыш 500 дзесяцін) належала больш 7,7 млн. дзесяцін, або 46,7%. Што тычыцца Сенненскага павета, дык там зямельныя ўгоддзі былі размеркаваны наступным чынам: у пачатку 20 ст. прыватныя ўладанні складалі 61,2% (258 579 дзесяцін); надзельныя сялянскія землі — 35% (147 942 дзесяціны); землі царквы, казны, розных устаноў — 3,8% (15 892 дзесяціны). Прыватная ўласнасць падзялялася на 2 віды: асабістую і ўласнасць грамадстваў. І калі першая за 1877—1905 гг. зменшылася больш чым на 17 тыс. дзесяцін, дык другая павялічылася амаль на 28 тыс. дзесяцін. У 1905 г. дваранам належала 180 732 дзесяціны ў 322 уладаннях, у тым ліку ў Бобрскай воласці 12 744 дзесяціны, Лісічанскай — 13 269, Абчугскай — 12 876, Чарэйскай — 15 337 і г.д. Буйнымі зямельнымі ўладальнікамі былі шляхцічы Барталамей і Свяцкі. Звыш 2,5 тыс. дзесяцін меў А.Л.Брадоўскі (Хацюхова, Гарадзішча), каля 500 дзесяцін — У.А.Беземан (Белае), звыш 300 дзесяцін — М.М.Бальшоў і інш. Сяляне ў Сенненскім павеце ў час рэформы атрымалі каля 5 дзесяцін зямлі на адну рэвізскую душу. Некалькі большую норму атрымалі былыя дзяржаўныя сяляне. У выніку ў 1906 г. былым уласніцкім сялянам, меўшым 16 592 двары (90,4%), належала 130 942 дзесяціны, былым дзяржаўным — 17 тыс. дзесяцін пры 1770 дварах (9,6%). Такім чынам, у першых на адзін двор прыходзілася 7,9 дзесяцін, у другіх — 9,6.

Галоўным заняткам насельніцтва раёна было земляробства. Тут сеялі жыта, пшаніцу, авёс, ячмень, грэчку. Не апошняе месца займала і бульба, якая вырошчвалася як на асабістыя патрэбнасці, так і для вінакурства. Ураджайнасць была невысокай. І гэта не дзіўна. Буйных памешчыцкіх уладанняў з інтэнсіўнай гаспадаркай на тэрыторыі раёна не было. Дробныя ўладальнікі і сяляне ўводзілі новае марудна. Таму і ў пачатку 20 ст. галоўнай прыладай для апрацоўкі зямлі ў сялян была саха з двума жалезнымі лемяшамі і драўляная барана. І толькі заможныя сяляне абзаводзіліся плугамі, пачыналі выкарыстоўваць тук у якасці ўгнаення.

Нізкі ўзровень тэхналогіі сельскагаспадарчай вытворчасці, не вельмі ўрадлівыя землі садзейнічалі і таму, што сяляне жылі вельмі бедна, ледзь задавальняючы свае патрэбы ў самым неабходным. Недахоп хлеба звычайна папаўнялі бульбай, ячменем, гароднінай. Пры гэтым сяляне так сябе абмяжоўвалі ў спажыванні, што ўмудраліся нават прада-

ваць хлеб дзеля гаспадарчых патрэб. Аб нездавальняючым стане сельскай гаспадаркі ў Барысаўскім павеце гаварылася на адным з пасяджэнняў (1902 г.) мясцовага камітэта аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці. Адзначалася, што рэштка хлеба на душу сялянскага насельніцтва разам з другімі кармавымі харчовымі сурагатамі складала непасрэдна на харчаванне 45% усяго хлеба, які атрымоўвалі на сялянскую душу. Астатнія 55% ішлі на пакрыццё гаспадарчых расходаў. І хоць за апошнія 10 гадоў пасяўная плошча павялічылася за кошт вырубкі лесу, аднак адбывалася гэта непрапарцыянальна росту колькасці насельніцтва і пры паступовым зніжэнні ўраджайнасці зямлі.

Лён і канопля разводзіліся сялянамі ў абмежаванай колькасці для ўласных гаспадарчых патрэб. Ільнаводства мела прамысловы характар толькі ў гаспадарках стараверaў. Агародніцтва і садаводства ў сялян не было развіта. Сады разводзілі памешчыкі і потым часта здавалі іх у арэнду. У 2-й палове 19 ст. прыходзіць у заняпад некалі даходная, добра тут развітая галіна сельскай гаспадаркі — пчалярства. Перапіс 1897 г. зарэгістраваў на ўвесь Сенненскі павет толькі 129 чалавек, для якіх пчалярства з'яўлялася дадатковым заняткам. Дарэчы, гэтым тлумачыцца заняпад Бобрскіх ярмарак, дзе мёд быў асноўным таварам. У нездавальняючым стане знаходзілася і жывёлагадоўля. Адной з прычын гэтага была нястача выганаў.

Рост прамысловасці, гарадоў, пракладка чыгунак — усё, чым характарызавалася развіццё капіталістычных адносін у Расіі, выклікала змяненні і ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. І хоць тэрыторыя сучаснага Крупскага раёна не адносілася да тых раёнаў, дзе гэтыя працэсы адбываліся вельмі бурна, але нейкія змены былі і тут. Імкнучыся прыстасавацца да капіталістычнага ладу, памешчыкі пачалі будаваць у сваіх маёнтках невялікія фабрыкі і заводы. Перш за ўсё гэта былі заводы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны, а таксама дрэваапрацоўчыя. На тэрыторыі раёна ўсе больш-менш значныя прадпрыемствы з'явіліся ў 1880—90-я гады. Праўда, яшчэ ў дарэформенны перыяд у Крупках была заснавана сукнавальная вытворчасць. На фабрыцы, якая пачала дзейнічаць з 1859 г., працавалі 17 рабочых, якія ў 1861 г. выпрацавалі прадукцыі на 27 тыс. руб. Гэта даволі значны паказчык па тым часе.

Распаўсюджанай галіной прамысловасці было вінакурства. Галоўнай сыравінай для вытворчасці спірту была ў асноўным бульба, менш выкарыстоўваліся жыта і ячмень. Уладальнікамі невялікіх вінакурняў былі памешчыкі. Часам яны здавалі свае прадпрыемствы ў арэнду. Старэйшым вінакурным заводам на тэрыторыі раёна, быў, відаць, завод у Халопенічах. Ён існаваў з 1840 г., у 1884 г. была праведзена яго рэканструкцыя і ўстаноўлены паравы рухавік магутнасцю 24 конскія сілы. На заводзе працавала 7 рабочых, якія выраблялі да 2 тыс. вёдзер спірту ў год. Меншым па сваёй магутнасці быў вінакурны завод у фальварку Абчуга. Ён быў заснаваны ў 1885 г., у 1890 г. тут устаноўлены паравы рухавік магутнасцю 8 конскіх сіл. На вінакурні працавала 7 рабочых, якія ў 1890 г. выраблі 1 тыс. вёдзер спірту. У 1886 г. дваранка Зембінская заснавала вінакурню ў сяле Худаўцы. У 1900 г. тут працавала 6 рабочых, якія выраблі прадукцыі на суму 5400 руб., а ў 1906 г. 9 рабочых выпрацавалі 16 712 вёдзер на суму 11 698 руб. Акрамя таго, вінакурні працавалі ў фальварку Ламское, маёнтку Заполле. У Бобры дзейнічаў завод па вытворчасці піва, а таксама прадпрыемства па вытворчасці фруктовых вод, якое належала яўрэю Брэйгеру.

Рабочымі гэтых прадпрыемстваў былі ў асноўным сяляне з навакольных вёсак. Умовы працы былі даволі цяжкімі. Працавалі з 2—3 гадзін ночы і да 3—6 гадзін вечара. У любое надвор'е дзверы заставаліся адчыненымі, шыбы былі разбітыя. У выніку рабочых абдзімала з аднаго боку гарачыня ад паравых катлоў, з другога — халодны вецер, што прыводзіла да частых захворванняў. Заводы працавалі ў перыяд з 15 кастрычніка да 15 мая, і ўвесь гэты час рабочыя не мелі аніводнага дня адпачынку, акрамя Вялікадня і калядаў.

Важнае месца ў прамысловым развіцці Беларусі ў 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст. займалі заводы па перапрацоўцы драўніны — асноўнага багацця края. Атрымалі яны развіццё і ў Крупскім раёне. Заводы выпрацоўвалі прасцейшую мэблю, дошкі, гонт, пастаўлялі сыравіну для фанернай і запалкавай прамысловасці. У 1882 г. быў заснаваны лесапільны завод у фальварку Вяршоўка. У 1884 г. тут быў устаноўлены паравы рухавік. На заводзе працавала 11 рабочых, якія выпрацоўвалі прадукцыю на 5 тыс. руб. у год. У 1888 г. ў маёнтку Хацюхова памешчык Брадоўскі заснаваў даволі буйную па тым часе запалкавую фабрыку. У 1890 г. на ёй было занята 20

рабочых, якія выпускалі прадукцыю на суму 25 тыс. руб. Праўда, у далейшым магутнасць гэтага прадпрыемства зменшылася, і перад пачаткам першай сусветнай вайны (у 1913 г.) тут працавала толькі 7 рабочых.

Асобнай гаворкі заслугоўвае мястэчка Крупкі. Тое, што праз яго праходзіла Маскоўска-Брэсцкая чыгунка, абумовіла яго развіццё як прамысловага вузла. Тут было заснавана некалькі прадпрыемстваў розных галін. З 1859 г. працуе мукамольна-крупяное прадпрыемства. У 1870-я гады яно належала дваранам Марыі і Карлу Свяцкім. У 1881 г. на фабрыцы працавала 10 рабочых, валавы даход складаў 10,7 тыс. руб. Праз 10 гадоў колькасць рабочых знізілася да 5, а валавы даход склаў 7 тыс. руб. З 1896 г. ў мястэчку пачынае працаваць фабрыка запалкавай саломкі К.Свяцкага. Прадпрыемства гэта было, бадай, самым буйным на тэрыторыі раёна. У 1900 г. тут працавала 52 рабочых, а сума вытворчасці склала 31 700 руб., у 1913 г. гэтыя паказчыкі павялічыліся: 55 рабочых выпрацавалі прадукцыі на суму 35 тыс. руб. Значная частка прадукцыі вывозілася ў Амерыку. У 1900 г. ў Крупках заснаваны лесапільны завод. На ім было занята 16 рабочых, а сума вытворчасці складала амаль 18 тыс. руб.

Прадпрыемствы па перапрацоўцы лёну працавалі ў маёнтку Халопенічы, сяле Мхерына; сукнавальня — у сяле Прошыка; смалакурні — пры вёсках Вязок, Дзянісавічы і г.д. Многія прадпрыемствы былі вельмі маленькія, колькасць іх амаль штогод мянялася: адны зачыняліся, другія ўзнікалі. Здаралася, што перастаўлялі дзейнічаць і даволі буйныя заводы. Так здарылася ў 1890-я гады з добра вядомым хімічным заводам, які быў заснаваны ў 1872 г. ў фальварку Востава. Завод належаў да таварыства «Лесапрамысловік». У 1879 г. на прадпрыемстве было занята 24 рабочых, а сума вытворчасці складала 10,7 тыс. руб. У 1884 г. валавы даход павялічыўся да 15 тыс., колькасць рабочых да 40 чалавек. Але ў далейшым пачаўся спад. У 1890 г. на заводзе ўжо працавала толькі 6 рабочых, а потым ён зусім перастаў існаваць.

Побыт сялянства ў той час быў звязаны з сельскагаспадарчым календаром. У вольны ад палявых работ час сяляне займаліся саматужнымі промысламі. У асноўным гэта былі промыслы, звязаныя з працай па дрэву. Вырабам бочак, балей для мыцця бялізны, вёдзер, кадак, вулляў займаліся сяляне вёсак Пасёмкавічы, Лагі, Забор'е, Глінаўка. Майстры вырабаў з лыка і кары жылі ў вёсцы Шарнева. Былі таксама свае шаўцы абутку і адзення, кавалі, кушняры, ганчары і інш. Аднак з цягам часу саматужныя промыслы пачалі прыходзіць у заняпад. І калі ў пачатку 1880-х гадоў у Сенненскім павеце амаль 5 тыс. чалавек займаліся саматужнымі промысламі, дык перапіс 1897 г. зарэгістраваў толькі 2100 такіх чалавек. Прычынай заняпаду промыслаў была дарагавізна ляснога і іншага матэрыялаў, адсутнасць прафесійных школ і крэдыту для саматужнікаў, якія ў выніку беднасці сваёй не мелі ўласных абаротных сродкаў. Вось і вымушаны былі сяляне ўсю зіму сядзець без працы, у той час, як на мясцовыя ярмаркі і базары завозілі свае тавары саматужнікі з Калужскай губерні, дзе промыслы былі добра развіты.

Цяжкія жыццёвыя ўмовы вымушалі сялян час ад часу ўступаць у барацьбу за лепшы лёс. Выступленні гэтыя ў 2-й палавіне 19 ст. не вызначаліся масавасцю, упартасцю і наступальнасцю. Яны больш паходзілі на ўсплескі адчаю, якія хутка заціхалі і зноў усё ішло як і раней. Так, у сакавіку 1870 г. супраць валаснога старшыні выступілі сяляне с. Восава. У сакавіку 1876 г. сяляне в. Узнацк адмовіліся плаціць штраф за самавольнае карыстанне зямлёй памешчыка Брадоўскага і аказалі супраціўленне пры апісанні маёмасці.

Толькі ў канцы 19 — пачатку 20 ст., калі да сялянскага руху далучыўся пралетарскі рух і стаў дамінуючым, ён набыў арганізаванасць і масавасць. Асабліва бурны характар прынялі народныя хваляванні ў пачатку 20 ст. У красавіку 1905 г. сяляне (больш за тысячу чалавек) вёсак Худава, Хальнявічы, Калодніца разбурылі плаціну і млын на рацэ Лукомка ў маёнтку Хальнявічы. У гэтым жа месяцы ў Халопенічах стараверы пабілі ўрадніка, разграмілі кватэру пристава. У ліпені адбыліся масавыя хваляванні, якія суправаджаліся захопам памешчыцкай маёмасці ў шэрагу вёсак Абчугскай воласці, а таксама ізноў у в. Калодніца.

Развіццю рэвалюцыйных падзей садзейнічала агітацыйная работа, якую разгарнулі ў беларускіх вёсках сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Масавая агітацыя праводзілася шляхам распаўсюджвання лістовак, праклямацый. 27 лістапада 1905 г. ў Бобры адбылася нелегальная сацыял-дэмакратычная сходка, на якой сялянам раздаваліся праклямацыі «Да ўсіх» (з нагоды Маніфеста 17 кастрычніка). У лютым 1906 г. ў вёсцы Дудары селянін Хромчанкаў з сынам чыталі для сваіх адна-

вяскоўцаў пракламацыі РСДРП «Што патрэбна цяпер селяніну», «Салдацкая доля».

Шырокі размах прыняў сялянскі рух летам 1906 г. ў Лісічанскай воласці. Жыхары вёсак Дудары, Пасёмкавічы, Мялешкавічы, Глінаўка неаднаразова адмаўляліся працаваць у маёнтках Камянец, Барсукі, Дудары, патрабуючы павысіць аплату за працу. Наогул, у Сенненскім павеце сялянскі рух набыў масавы характар. У друку таго часу неаднаразова паведамлялася, што сяляне Сенненскага павета адмаўляліся даваць рэкрутаў і выконваць натуральныя дарожныя павіннасці. У ліпені 1906 г. сяляне 9 валасцей павета (з 15) адмовіліся ад упаўнаважаных з павятовай землеўпарадкавальнай камісіі. Газета «Могилевский голос» паведамляла: «На барацьбу супраць забастовачнага руху ў Сенненскім павеце ўлады сцягнулі значныя сілы... Падаўленне руху суправаджалася бязлітаснымі сутычкамі».

Цэнтрам рабочага руху ў раёне былі Крупкі. Найбольшага ўздыму ён дасягнуў летам 1905 г.: у ліпені на фабрыцы запалкавай саломкі Хаціневера баставала 60 рабочых. Яны патрабавалі павышэння заработнай платы. Аднак трымацель фабрыкі ў прысутнасці станавога прыстава заявіў, што ён не можа гэтага зрабіць у выніку нізкай даходнасці прадпрыемства. У той жа час пачалася забастоўка і на суседняй фабрыцы запалкавай саломкі Свяцкага. Тут баставала 65 рабочых (40 мужчын, 16 жанчын, 9 падлеткаў). Забастоўшчыкі патрабавалі павысіць заработную плату і палепшыць умовы працы. Працягвалася яна 3,5 дні і скончылася тым, што гаспадар вымушаны быў пайсці на ўступкі. Была павышана заработная плата на 10%, прыняты некаторыя меры па паляпшэнні медыцынскай дапамогі і ўмоў працы. У знак салідарнасці з рабочымі гэтых фабрык баставалі і рабочыя лесапільнага завода Свяцкага і Крыля. У забастоўцы прынялі ўдзел усе 26 рабочых гэтага прадпрыемства.

Пасля падаўлення першай расійскай рэвалюцыі пачаўся перыяд наступлення рэакцыі. Рэвалюцыйны рух пайшоў на спад, але поўнасцю не спыніўся. Час ад часу ўзнікалі асобныя ўспышкі народнага гневу, якія ў 1916 г. з пачаткам новага рэвалюцыйнага ўздыму станавіліся ўсё больш частымі і моцнымі. Народная барацьба за зямлю і волю працягвалася.

Да 1917 г. на тэрыторыі сучаснага Крупскага раёна не існавала ніводнай сярэдняй навучальнай установы. Няшмат было і школ, якія давалі пачатковую адукацыю: так званыя народныя вучылішчы, царкоўнаприходскія школы, школы граматы.

Працэс заснавання народных вучылішчаў ішоў марудна. Выяўлялася няхватка настаўніцкіх кадраў, беднасць мясцовых жыхароў. На тэрыторыі раёна ў 1860—70-я гады было адчынена не больш дзесяці вучылішчаў. Адным з першых пачало працаваць Халопеніцкае народнае вучылішча, якое было заснавана ў 1863 г. У 1892/93 навучальным годзе тут вучылася 56 хлопчыкаў і 14 дзяўчынак. У 1869 г. былі адкрыты народныя вучылішчы ў мястэчках Бобр і Абчуга, сяле Ігрушка, у 1871 г. — у сяле Лісічана, у 1875 г. — у сяле Нача, недзе ў той жа час — у сёлах Ухвала і Пышачы. Вучэбны год у гэтых навучальных установах, згодна інструкцыі 1871 г., пачынаўся 1 верасня і завяршаўся 1 мая. На самой жа справе пачатак навучальнага года заўсёды адцягваўся, і нават у кастрычніку яшчэ палова дзяцей не прыступала да вучобы, таму што яны былі заняты з бацькамі на гаспадарцы. Тэрмін навучання складаў у аднакласных вучылішчах 3 гады, двухкласных — 5 гадоў. Аналіз праграм для народных вучылішчаў, якія былі складзены толькі ў 1871 г. (да гэтага часу дзейнічалі часовыя правілы, зацверджаныя для народных школ у губернях Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай) паказвае, што дзеці павінны былі вывучаць Закон Божы, царкоўнаславянскую мову, рускую мову, арыфметыку, чыстапісанне і спевы. Прадмет «руская мова» разумеўся ў шырокім сэнсе. Ён уключаў у сябе вывучэнне вершаў і апавяданняў рускіх пісьменнікаў, знаёміў з адметнымі гістарычнымі асобамі і падзеямі рускай гісторыі. У гэты раздзел уваходзілі артыкулы «О просветителях славян Кирилле и Мефодии», «О первых русских князьях Рюрике, Олеге, Ольге и Святославе», «О Владимире Мономахе», «Об Александре Невском», «О Даниле Галицком», «О Дмитрии Донском», «О покорении Казани и Сибири» і іншыя ў тым жа плане. Пра гісторыю беларускага народа, падзеі, што адбываліся на беларускай зямлі, змяшчаліся звесткі ў артыкулах «О Брестской церковной унии», «О воссоединении униатов при Николае II», «О благодеяниях народу и государству Государя Императора Александра II».

У пачатку 20 ст. колькасць народных вучылішчаў павялічылася. У 1907 г. яны былі адкрыты ў вёсках Вялікія Хальнявічы і Стараселле, у 1909 г. — у Сакалавічах, Забор'і,

Бялянах, Смародзінцы, Шчаўрах, у 1912 г. — у Хацюхове, Клёне, Узнажы, Гібайлавічах, Новым Саколе, Старой Слабадзе, Матошцы. Усяго ж на тэрыторыі раёна дзейнічалі 22 народныя вучылішчы.

Важнай праблемай для народных вучылішчаў была падрыхтоўка настаўнікаў. Праваслаўныя святары, занятыя сваімі непасрэднымі абавязкамі, усё больш адыходзілі ад справы народнай адукацыі. Стаўка на семінарыстаў з унутраных Расійскіх губерняў, якіх Мураўёў запрасіў у беларускія губерні, істотных змен не прынесла. Таму настаўніцкія семінарыі рыхтавалі кадры з мясцовых ураджэнцаў. Адзін з такіх педагогаў, якога заўсёды будзе памятаць наша Бацькаўшчына, нарадзіўся ў мястэчку Халопенічы. Гэта этнограф, фалькларыст Адам Ягоравіч Багдановіч (глядзі асобны артыкул).

З пачатку 1880-х гадоў пачынаюць адраджацца царкоўныя школы. Штуршком для гэтага паслужылі новыя правілы для царкоўнапрыходскіх школ, якія былі зацверджаны ў 1884 г. Працэс стварэння царкоўных школ у беларускіх губернях ішоў больш інтэнсіўна, чым ва ўсіх другіх губернях Расіі. Усе епархіі, у склад якіх уваходзілі беларускія губерні (Магілёўская, Літоўская, Полацкая, Мінская), знаходзіліся ў ліку пяці першых па колькасці школ у разліку на 100 цэркваў. На тэрыторыі Крупшчыны было створана 16 царкоўнапрыходскіх школ і 14 школ граматы. Гэта не так ужо і многа, каб народная асвета развівалася на належным узроўні. Тым больш, што трэба ўлічваць і такі факт: амаль усе царкоўныя школы былі малалюдныя, вучэбны працэс у іх вёўся на невысокім узроўні. Беднасцю сялян тлумачылася тое, што некаторыя школы, утвораныя як царкоўнапрыходскія, з цягам часу пераходзілі ў разрад больш нізкі — школы граматы. Гэтыя школы пераходзілі з вёскі ў вёску і не патрабавалі ад сялян значных грашовых і іншых матэрыяльных затрат. Праўда, і веды яны давалі адпаведныя — нізкія. Мусіць, таму і займала Магілёўская губерня, нягледзячы на сваё першае месца сярод епархій Расіі па колькасці царкоўных школ, апошняе месца па пісьменнасці нават сярод беларускіх губерняў. Працэнт пісьменных тут складаў 16,9, у Мінскай губерні — 17,8. У Сенненскім павеце пісьменнае насельніцтва згодна перапісу 1897 г. склала ўсяго 11,9%, у Барысаўскім — 14,4%.

Яшчэ горш, чым з асветай, абстаялі справы з медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва. Як у Мінскай, так і ў Магілёўскай губернях лютавалі брушны і сыпны тыф, воспа халера, малярыя, шкарлятына, сухоты і іншыя хваробы. Бывалі выпадкі, калі эпідэміі ахоплівалі да 30% населеных пунктаў, як, напрыклад, брушны тыф у 1905 г. Прычынай такога становішча быў нізкі ўзровень медыцынскага абслугоўвання і цяжкія бытавыя ўмовы, у якіх жылі сяляне. Сельская медыцына ўзнікла толькі ў канцы 1860-х гадоў на аснове «Палажэння аб наладжванні сельскай урачэбнай медыцыны ў губернях, дзе не ўведзена ў дзеянне Палажэнне аб земскіх установах» (ад 24 снежня 1868 г.). На павет прыходзілася ўсяго па 1 урачу, не хапала лячэбніц, медыцынскага персаналу, аптэк. Так, у канцы 19 — пачатку 20 ст. ў Барысаўскім павеце існавалі толькі 2 сельскія бальніцы (у Лошніцы і Мсціне, кожная на 10 ложкаў) і 5 сельскіх аптэк, адна з якіх знаходзілася ў Халопенічах (уласніка Ліхтэнблюма). Была аптэка і ў Бобры, яна належала купцу Лейбе. У выніку такога становішча працягласць жыцця была невысокай. Калі мы зноў звернемся да перапісу 1897 г., то ўбачым, што насельніцтва, узрост якога перавышаў 60 гадоў, складала ў Сенненскім павеце крыху больш за 6%. Асноўная маса насельніцтва — гэта людзі ва ўзросце да 40 гадоў (80,5%).

З пачаткам першай сусветнай вайны беларускія губерні былі аб'яўлены на ваенным становішчы. Напярэдадні ўсеагульнай мабілізацыі былі прыведзены ў баявую гатоўнасць паліцыя і жандармерыя. І недарэмна: у перыяд мабілізацыі паўсюдна адбываліся сялянскія хваляванні. Грамілі маёнткі, харчовыя і вінныя лаўкі, то там, то сям успыхвалі пажары. Вось як апісваў гэтыя падзеі магілёўскі губернатар Пільц: «Запасныя ніжнія чыны ўчынілі беспарадкі: абрабавалі вінныя і бакалейныя лаўкі і маёмасць у дамах некаторых маёнткаў. Беспарадкі гэтыя прынялі сур'ёзны абарот у Сенненскім павеце...» Найбольш небяспечным месцам, дзе адбываліся сялянскія хваляванні, аказаўся Бобр. Сяляне заявіліся ў маёнтак памешчыка, уварваліся ў самы дом, пагражалі ўсё спаліць. Як толькі Пільц атрымаў весткі аб гэтых дзеяннях, ён асабіста з 20 коннымі стражнікамі і чыноўнікам асобых даручэнняў Дзічканцам памчаўся ў Бобр, каб расправіцца з мяцежнікамі. Па словах самога губернатара, расправа чынілася «вельмі хутка, рашуча», з мэтай нагнаць «крутымі мерамі страх на буянаў».

З лета 1915 г. частка Беларусі стала арэнай баявых дзеянняў, другая, у тым ліку Крупшчына, — прыфрантавой паласой. На

У акопах 1-й сусветнай вайны.

ўсход хлынуў паток бежанцаў. З цэнтральных паветаў Мінскай губерні яны разыходзіліся па чатырох гужавых шляхах, адзін з якіх (Мінск—Барысаў—Орша—Ельня) праходзіў праз тэрыторыю сучаснага Крупскага раёна. Значная колькасць бежанцаў накіроўвалася ў цэнтральныя губерні Расіі, частка асядала на незанятай ворагам тэрыторыі Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў. Становішча гэтых людзей было цяжкае. Меры, што прымаў царскі ўрад, ініцыятывы мясцовых грамадскіх арганізацый не маглі забяспечыць іх нават самым неабходным. Многія жылі пад адкрытым небам, існуючы ў асноўным за кошт жабрацтва.

Цяжкім было становішча і жыхароў раёнаў прыфрантавой паласы. Цяжарам лягло на іх масавыя рэквізіцыі жывёлы, прадуктаў харчавання, фуражу. Вось што паведамляў у кастрычніку 1915 г. прадвадзіцель дваранства Барысаўскага павета мінскаму губернатару: «...у Барысаўскім павеце адначасова з грамадзянскімі рэквізіцыйнымі камісіямі дзейнічаюць ваенныя камісіі, якія... рэквізіруюць фураж, нічога не пакідаючы насельніцтву для кармлення пакінутай яму жывёлы, што цяжка адлюстроўваецца на становішчы насельніцтва і яго настроі». З-за сістэматычных рэквізіцый колькасць бескароўных гаспадарак у пяці паветах Мінскай губерні павялічылася да 1917 г. ў 3,7 разы.

У лютым 1917 г. было звергнута самаўладдзе, улада перайшла да Часовага ўрада. У Барысаўскім і Сенненскім паветах, як і паўсюдна ў Беларусі, былі створаны павятовыя выканаўчыя камітэты. На чале новых органаў улады станавіліся ў асноўным памешчыкі. Бальшавіцкія аратары, выступаючы на сялянскіх сходах, прызывалі не падпарадкоўвацца ім, заклікалі да падзелу памешчыцкай зямлі, стварэння новых органаў улады. Пачалі ствараццa камітэты ў воінскіх часцях, валасныя і сялянскія камітэты, якія дзялілі памешчыцкую зямлю і маёмасць, праводзілі арышты, вобыскі, змяшчалі з пасад. Падзеі працягвалі развівацца далей, бо Часовы ўрад не вырашыў вузлавыя праблемы: не ліквідаваў памешчыцкае землеўладанне, не скончыў вайну. Голад і разруха ўсё глыбей ахоплівалі краіну.

В.В.Грыгор'ева.

Дакументы сведчаць

УСТАЎНАЯ ГРАМАТА МАЁНТКА ХАЛОПЕНІЧЫ БАРЫСАЎСКАГА ПАВЕТА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ

20 лютага 1862 г.

1. Всей земли состояло в пользование крестьян до обнародования Положения о крестьянах 7230,94 дес.

2. Из них собственно под крестьянской оседлости 386,16 дес.

Общества	Крестьян	Огородников	Батраков	Итого
Холопеничского:				
м. Холопеничи	38	17	7	62
д. Городыще	6	3	—	9
застенок Городыще				
Итого:	46	20	7	73
Якимовского:				
д. Подузнацк	9			9
Якимовка	21	3	2	26
Итого:	30	3	2	35
Прудецкого:				
д. Прудец	27		4	31
Итого:	27		4	31
Голькевского:				
д. Гальки	40	2	6	48
Итого:				
Борковского:				
д. Борки	22	4	5	31
Итого:	22	4	5	31
Слободского:				
д. Слобода	26	4	2	32
Адамово	1		1	2
Итого:	27	4	3	34
Грицковского:				
д. Грицковичи	25	5		30
д. Дудинка	8			8
д. Струга	10	1	1	12
Итого:	43	6	1	50
Хруловского:				
д. Хруловка	17	2	3	22
Волосачи	11	1	1	13
Итого:	28	3	4	35
Копачевского:				
д. Копачевка	35	3	4	42
Шопа	9		4	13
застенок Мхеран	1			1
д. Цеханово	4			4
Итого:	49	3	8	60
Максимовского:				
застенок Атрашовка	3		2	5
д. Максимовка	20	3	3	26
застенок Могильно	1		1	2
Итого:	24	3	6	43
Осовского:				
д. Селище	5			5
застенок Кравцова Нива	4	1		5
д. Осов	17	1	4	22
Итого:	26	1	5	32

3. Вышепоказанное состоящее ныне в пользовании крестьян количество земли, средним числом на один двор 15,92 дес., представляется им в постоянное пользование за определённые Положением повинности.

1. Находящиеся при селениях и в деревнях, населенных временнообязанными лишь крестьянскими, водопои представляются в исключительное их пользование, находящиеся же в селениях, где вместе с крестьянами проживают на дворовой земле другие вольные земледельцы, водопои остаются в общем пользовании владельца и крестьян...

3. Пастбища, сверх выгонов, состоят в обрубах деревень в пользовании крестьян и вольных людей, с ними проживающих, но не обложены особою платою. Поросшее ж болото в м. Холопеничи 8,87 дес. служит общему пользованию помещика с крестьянами.

4. Находящаяся в м. Холопеничах торговая площадь и рыбная ловля на р. Эссе остаётся в распоряжении помещика, как равно леса и болота, среди крестьянских угодий стоящие.

5. По инвентарю определено издельной повинности с крестьянского участка, заключающего 12,60 дес. пригона в год мужских 104 и женских 104 дня, с участка от 12,60 до 20 дес. и пригона мужских 104 и женских 156 дней, с участка же, заключающего более 20 дес. пригона в год мужских 156 и женских 156 дней, с больших же участков соразмерно сему...

При переходе крестьян на оброк принимаются согласно инвентарю общая ценность повинности со всякого участка (§128 Местного положения)... Сроки для перехода крестьян с барщины на оброк назначаются согласно обоюдному добровольному согласию и на основании постановления Борисовского съезда 1 января всякого года, в каковой срок, а также 1 июля. Два раза на год назначается и срок платежа оброка на полгода вперёд. Из числа поземельного оброка относится на усадьбу за десятину 7 р. 20 к., так как она причисляется к 1-му разряду, за исключением в м. Холопеничи пляцов, содержащих огородниками в числе 8,68 дес. по 10 р. 80 к. оброку за десятину, каковы усадьбы причисляются ко 2-му разряду, потому что они расположены среди самого местечка, представляют выгодный сбыт и мастерские заработка для мастеровых пляцовиков. Вследствие чего повинность за пользование всеми усадебными оседлостями крестьян имения составляет в год 2873 р. 86 к., а выкупная сумма за всю оседлость 97 896 р. 66 к.

Денежных общественных капиталов за крестьянами сего имения не имеется.

Друкуецца па кн.: Белоруссия в эпоху капитализма: сборник документов и материалов. Мн., 1983. Т. 1. С. 42—44.

ЖУРНАЛ МИНСКОГО ГУБЕРНСКОГО ПО КРЕСТЬЯНСКИМ ДЕЛАМ ПРИСУТСТВИЯ

Марта 12 дня 1866 года.

Решение составлялось единогласно.

Слушали: Выкупное производство первой Борисовской Проверочной Комиссии по имению Холопеничи помещика Александра Доминиковича Лаппы.

Борисовского уезда, 1 мирового участка Холопеничской волости, Холопеничского, Якимовского, Прудецкого, Гальского, Максимовского, Осовского и Бельского сельских обществ, селений м-ка Холопеничи, сел. Городище, зал. Городище, сел. Подузнацк, Якимовка, Прудец, Гальки, Барки, Слобода, Грицковичи, Дудинка, Струга, Хроловка, Волосачи, Копачевка, Шопа, заст. Мхерено, сел. Цеханово, Астрашкова, Максимовка, Подберезье.

Из выкупного дела видно:

Выкупной акт составлен Октября 1 дня 1865 г. и 2 ноября 1865 года объявлен крестьянам и повереному Доминику Александровичу Лаппо.

В имении по выкупному акту приобретают землю в собственность 1728 ревизских мужского пола душ, в том числе записанных по ревизии в крестьянах 1728, в дворовых
Дворов; домохозяев, владеющих полевыми участками 446 и огородников 89, итого 535; в том числе вновь наделенных: из крестьян 46, батраков, огородов 37 в дар.

Выкупается крестьянами согласно их желанию полный надел, а именно 7450 дес. 135 саж. обложенной платежом земли; сверх того необложенной платежом 1591 дес. 1976 саж.

Кроме того отведено помещиком в дар в 1862 год и под Волостное правление в количестве 1 дес. 419 саж.

По определенным существенным признакам Проверочной Комиссией установлены основные разряды крестьянских участков.

Что по капитализации из 60% составит Выкупной ссуды 92246 руб. 86 коп.

Цэнтральны гістарычны архіў Беларусі, ф. 242, воп. 2, арк. 178.

ДАНЯСЕННЕ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА МІНІСТРУ УНУТРАНЫХ СПРАЎ ПРА АДМОВУ ВЫКОНВАЦЬ ПАВІННАСЦЬ І НЕПАДПАРАДКАВАННЕ ЎЛАДАМ СЯЛЯН В. ХУДАЎЦЫ СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА.

2 мая 1862 г.

Сеннеский предводитель дворянства обще с земским исправником уведомили меня, что вследствие уклонности крестьян им. Худовцы помещика Гоздицкого от выслуги дня изделной повинности были принимаемы полицией должные меры к восстановлению порядка, но все эти меры остались безуспешными, и крестьяне упорно отказались от исполнения своей обязанности, притом выказали дерзость и неуважение к властям, а арестованных главных виновников неповиновения силой пытались освободить. Поэтому предводитель и исправник просили моего распоряжения о командировании в означенное имение воинской команды для восстановления спокойствия.

Вследствие чего и в предупреждение подобных беспорядков в других соседних имениях, командировав в означенное имение 120 человек солдат Могилёвского батальона внутренней стражи, имею честь донести о вышеизложенным в. в.п. и присовокупить, что вместе с сим отправляется в означенное имение и штаб-офицер корпуса жандармов в Могилёвской губернии для принятия нужных мер и водворению там порядка и спокойствия.

Долгом считаю присовокупить, что крестьяне с. Худовцы, в котором числится 30 дворов, вышли из повиновения, как доходят до меня сведения, потому, что один прохожий раскольник убедил их, будто помещиком вырвано из Положения 6 л., в которых и заключалось действительное определение их свободы.

Гражданский губернатор Беклемишев.

Друкуецца па кн.: Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861—1862 гг.): Документы и материалы. Мн., 1959. С. 419.

РАПАРТ ШТАБ-АФІЦЭРА КОРПУСА ЖАНДАРМАЎ У МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ НАЧАЛЬНІКУ З АДДЗЯЛЕННЯ ПРА ЗАДУШЭННЕ ХВАЛЯВАННЯЎ СЯЛЯН У В. ХУДАЎЦЫ СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА

10 мая 1862 г.

По предложению начальника Могилёвской губ. я съездил в Сенненский у. в имение помещика Гоздицкого, заключающееся в 150 душах обязанных крестьян, которые отказались от отрабатывания 3-го дня помещику и про съезд туда уездного предводителя дворянства, мирового посредника и земской полиции для разъяснения их обязанностей оказали неповиновение и даже буйство. По прибытию моем в это имение одновременно с воинской командой и земской полицией собраны мною были крестьяне, которым я объяснил непременную их обязанность отбывать положенное число рабочих дней для помещика и нести повинности, указанные высочайше утвержденным Положением, убедил их в этом, и они вполне сознали неправильность своих убеждений и вину свою в непослушании, несколько человек крестьян, зачинщиков этих беспорядков, наказал полицейскими мерами, и послушание, и порядок в имении совершенно восстановлены.

О чём имею честь донести вашему сиятельству.

Полковник Соколов.

Друкуецца па кн.: Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861—1862 гг.): Документы и материалы. Мн., 1959. С. 420.

ПАВЕДАМЛЕННЕ МІРАВОГА ПАСРЭДНІКА 2-ГА ЎЧАСТКА СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА М.М.КАРАЛЬКО А.П.БЕКЛЕМІШАВУ ПРА АДМОВУ СЯЛЯН ВЫКОНВАЦЬ ПАВІННАСЦІ ПАД УПЛЫВАМ АБ'ЯЎЛЕННАГА ІМ ПАЎСТАНЦАМІ МАНІФЕСТА

7 мая 1863 г.

Имею честь уведомить в.п. что, вызванные мною старшины вверенного мне мирового участка для получения от меня в гор. Сенно нужных наставлений показали, что в местах, через которые прошли шайки мятежников, крестьяне, устрашенные ими угрозою смерти, перестали исполнять возложенную на них за землю повинность, лисичинский старшина показал, что из шайки мятежников, проходившей от Столбнов на Сторожищё и прибывшей в с. Лисичино, несколько человек вошли в церковь во время литургии 5 числа сего месяца и прочли возмутительный манифест, объявив крестьянам, что отведенную землю они им дарят

вместе с полной свободой, а старшине угрожали виселицей, если он будет отдавать какие-либо приказания. Некоторые крестьяне благодарили мятежников и целовали им руки. Потом шайка эта отправилась, по показанию старшины, через Шавры на Крупку.

Временный мировой посредник М.Королько.

Друкуецца па кн.: Восстание в Литве и Белоруссии 1863—1864 гг. М., 1965. С. 475.

РАПАРТ КАМАНДЗІРА КРАМЯНЧУГСКАГА ПАЛКА АД 10 МАЯ 1863 ГОДА ЗА № 1403 АБ ПАРАЖЭННІ МЯЦЕЖНІКАЎ ПРЫ ВЁСЦЫ ПАДБЯРЭЗЗЕ БАРЫСАЎСКАГА ПАВЕТА

Пасля данясення маего ад 6-га сяго месяца за № - , атрад з двух рот 14-й і 15-й камандай капітана Журомскага, 6 чысла вяртаўся ад сялібы Валасовічы да Барысава. Я атрымаў паведамленне ад жыхароў, што ў гэты ж дзень паявілася шайка мяцежнікаў у вёрстах 25 ад Барысава, непадалёку ад вёскі Ратучы і следуе на Халопенічы, чаму неадкладна аб гэтым паведаміў капітану Журомскаму, прадпісаў яму ў той час рухацца гэты бок. 7 чысла, на світанку, ён выступіў з ротамі з сяла Барані на Халопенічы, але не дахадзя 12 вёрст да гэтай апошняй сялібы, па указанні жыхароў, павярнуў ўправа і праходзячы каля 10 і 12 вёрст, адкрыў шайку ад 300—400 чалавек, у тым ліку да 60 конных, каля самой вёскі Падбярэззе. Інсургенты былі размешчаны бівуакам, на ўзвышаным і пакатым да лесу месцы агароджаным з фронта палісадам з плятня. Калі атрад падыйшоў даволі блізка, будучы укрытым густым лесам, то капітан Журомскі, пастроіў роты ў ротныя калоны, вылучыў уперад 30 стралкоў пад камандай прапаршчыка Троцкага-Сянітовіча, сам жа, падайдзя да агароджы і махая белай хустачкай, прапанаваў здацца. Інсургенты, прыкмецілі нязначнасць стралковай цэпі, зрабілі некалькі выстралаў і кінуліся на стралкоў, але ў той час высунуліся з лесу ротныя калоны і з крыкам «ура!» напалі на атакуючых.

Мяцежнікі ўбачылі гэтыя калоны, у той час павярнулі кругом, ратуючыся бегствам. Атрад праследаваў іх на працягу 2-х вёрст, але стомленасць людзей і наступіўшы вечар вынудзілі спыніць праследванне.

Загінула 9 чалавек мяцежнікаў. Яны былі знойдзены на полі; паранена 12 (з іх 2 памерлі), 11 узяты у палон. Звыш таго, дасканала здаровымі ўзята ў палон 5 чалавек.

З нашага боку ні забітых, ні параненых не было. Пры паражэнні мяцежнікаў адбіты іх увесь абоз, які складаўся з 46 коней, 15 падвод, 54 ружжаў, 11 пісталетаў, 1-й пушкі малога памеру (не болей 10 вяршкоў дліны), 24 сякеры, 16 сабляў, 63 касы, 17 штыкоў, каля 30 фунтаў пораху, адзін пуд свінцу (у картэчных кулях і дробі), 110 штук рознага адзення і 1 кузнечны мех.

Пасля такога паражэння, ратуючыся бегствам, рассыпаліся па лясах і цяпер знаходзяцца ў самым цяжкім стане. Сяляне блізляжачых вёсак забіраюць іх па аднаму і дастаўляюць да мяне ў Барысаў. Шайка ж аказалася тая ж самая, якую капітан Журомскі праследаваў пры Валасовічах, адкуль яна абмінула сюды праз Магілёўскую губерню.

Учарашняга чысла, атрымаў данясенне з Настанавіцкага сельскага ўпраўлення аб з'яўленні новай шайкі на граніцы Вілейскага павета, я адразу ж прадпісаў накіравацца з Лагойску да вёскі Завішынь камандзіру 14-й роты, але аб руху і дзеяннях гэтай роты данясення яшчэ не атрымана.

Падпісаў камандзір палка палкоўнік Дамброўскі

Сашчапіў: Палкоўнік, ад'ютант, прапаршчык Гранко.

Виленский временник. Архивные материалы Муравьевского музея. Книга 6. Часть вторая. Вильно. 1915. С. 54.

Падрыхтавала да друку В.В.Грыгор'ева.

У БАРЫСАЎСКІМ ПАВЕЦЕ

Па атрыманых звестках аб тым, што астаткі шайкі, разбітай пры в. Падбярэззе, збіраюцца ў лясах памеснічыка Ціханавіцкага, ва ўрочышчы Быкаўка пад начальнікам Кучэўскага, 16-я і 20-я роты Крамянчугскага рэзервнага палка выступілі з Халопеніч і накіраваліся ў фальварк Валавая Гара. 28 мая прыйшлі да дому лесніка, які жыве сярод непраходзімых балот і лясоў, салдаты прыкмецілі некалькі чалавек, якія кінуліся ратавацца бегствам. Пры праследванні адзін мяцежнік паранены і узяты ў палон. Узята таксама 3 ружжы, пісталеты і баявыя прыпасы. Адзін з палонных паказаў, што кіраўнік шайкі Кучэўскі забіты. Атрад вяртаўся ў Халопенічы 30 мая.

Журнал военных действий в Минской губернии с 21 мая по 18 июня (1863 г.).

Падрыхтавала да друку В.В. Грыгор'ева.

ВОПІС МАЁМАСЦІ, ЯКАЯ НАЛЕЖЫЦЬ ДВАРАНІНУ РАМАНУ МАЦВЕЕВУ РАГОЎСКАМУ, МАЁНТАК ХУДАЎЦЫ ЗА ЎДЗЕЛ ЯГО Ў ПАЎСТАННІ 1863 ГОДА

1. Два сурдута старых чорных, без гузікаў, у адным з іх атарваны частка палы.
2. Адзін чорны сурдут новы на падкладцы.
3. Двое панталонаў старых, адны пяньковага колеру шэрага, а другія колеру шэрага шэрсцянога.
4. Адна камзэлька пяньковая колеру шэрага, паношаная.
5. Адна — шаўковая старая.
6. Шынэль шэрага сукна, старая, без рукава, на ваце, падшыта каленкорам.
7. Дзве сарочкі палатняныя, адна новая, а другая старая.
8. Двое споднікаў белых палатняных і паношаных.

Вопісь гэту склаў камандзіраваны чыноўнік калежскі сакратар Фёдараў.

Пры гэтым сведкамі былі: в. Вялікая Слабада часова абавязаны Іван Якаўлеў і с. Гапонавічы Мікалай Сцяпанаў Сіротка.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2003, воп. 1, спр. 279, л. 3, 4.

Падрыхтаваў да друку Хромчанка Дз.М.

ЗАКЛЮЧЭННЕ МАГІЛЁЎСКАЙ СЛЕДЧАЙ КАМІССІІ ПА ЎДЗЕЛУ СЕЛЯНІНА В. ДУБЫ ВОСІПА ІВАНАВІЧА ПАШКЕВІЧА Ў ПАЎСТАННІ 1863 Г.

По рассмотрению следственного дела о незаконнорожденном сыне солдатки Леси Лаврентьевой по замужеству Пашкевич Осипе Ивановиче Пашкевиче, бывшем в мятежной шайке, оказывается, что Пашкевич взят был в мятежную шайку насильно и по разбитию оной 7 мая 1863 г. у д. Подберезье Борисовского уезда возвратился в дом матери, откуда тотчас же был доставлен крестьянами к приставу 4 Стана Сенненского уезда. При допросах и во время следствия Пашкевич не сознался в участии в перестрелке, происшедшей при встрече шайки с отрядом русских войск при д. Подберезье, но в том уличается присяжными показаниями доставивших его в стан крестьян, которым говорил сам, что убил лошадь под казаком, а потому я определяю: Осипа Ивановича Пашкевича, 20 лет, вероисповедования римскокатолического, отправить в Москву...

Могилевский гражданский губернатор
подпись

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2001, воп. 2, спр. 101.

СА СПРАВЫ ПРА ПЕРАДАЧУ НА ПАРУКІ ПАМЕШЧЫКАМ ПАД НАГЛЯД БЫЛОГА ПІСАРА АБЧУГСКАЙ ВОЛАСЦІ МАГІЛЁЎСКАГА ПАВЕТА МІХАІЛА ДРАЗДОЎСКАГА ЗА АКАЗАННЕ ДАПАМОГІ ПАЎСТАНЦАМ...

По рассмотрению представленному Оршанской следственной комиссией дела о бывшем Обчугском волостном писаре однодворце Могилёвской губернии и уезда Дроздовском я нахожу, что он обвиняется в участии в бывшем польском восстании; приготовлении партий оружия и съестных припасов для мятежников и в снабжении их оружием, ... признавая его как не вполне благонадежным в политическом отношении, а потому определить его на прежнее место жительства с отдачей на благонадежное поручительство и с учреждением над ним полицейского надзора.

Губернатор (подпись)

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2001, воп. 2, спр. 101.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка

У КАНЦЫЛЯРЫЮ НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

24 мая 1964 г.

Следственная комиссия имеет честь препроводить при сем дознание с волостного писаря Дроздовского

1864 г. апреля 29 дня Помощник Сенненского уездного исправника в следствие дошедших до него сведений о существовании в прошлом году перед восстанием тесной дружбы между управляющим имением Обчуга Хморовичем, волосным писарем Дроздовским и стар-

шиною Обчугской волости Евменом Моисеевым в приготовлении к бывшему мятежу нижеименованных допрашивал:

1. Леон Дмитриевич Богданов, 45 лет, вольноотпущенный из дворовых имения Обчуга, проживавший в прошлом году в местечке и 24 марта показал: В мае месяце прошлого года по прибытии в Обчугу роты солдат с крестьянином Сидором Алексеевым пришедшие в корчму, увидев в окно общее гулянье и зная об участии в том Хморовича Евмена и Шарневских, крестьян, увидел я в последней комнате пьяного Хморовича и тоже несколько выпившего старшину. Причем услышал слова старшины, прохаживавшегося по комнате и обнявшего Хморовича: «Да, другое правление и другие порядки будут, не бойся пана, когда вместе будем, то никто ничего не сделает». В протяжении двух месяцев перед мятежом постоянно проживали в волостном правлении Францкевич, Андрушкевич, отправившийся 23 апреля в шайку. С 10 марта проходила постоянная пальба в Слепцах, в которой каждый день участвовали Дроздовский, старшина Францкевич и Андрушкевич...

Крестьянин Иван показывал мне, что будучи в Слепцах, видел, как из комнаты выносили свинец. Деревни Прудины, крестьянин Герасим мне говорил, что видел, как лили пули и он помогал им.

Я, Иван Аксенович Тюгла, 48 лет, показал, что в день, когда услышали, что под (неразборчиво) разбита шайка, говорил я бывшему старшине Евмену: не следует ли взять проезжавших в это время по местечку двух незнакомых лиц, так как слышно было, будто в других имениях берут подобных лиц. Но Евмен, вышедши на крыльцо, ответил мне, что: «Не Ваше дело, ваше сторона дело, когда я велю, тогда возьмете». После того эти проезжие выехали в д. Киевец и там пытались дороги в Язбы, сказав, что им нужно к полковнику. Там Никифор Дмитриев и другие крестьяне хотели их взять, но не взяли. За неделю перед мятежом Евмен передал лекарю Самуйло жалованье от крестьян, 50 рублей, и бочку жита, бочку овса. Иван Аксенов. Тюгла.

Я, Иван Иванов, 35 лет, показываю:

В самый Юрьев день прошлого года утром носил я больного ребенка в Слепцы к лекарю Самуйло. Дожидали во дворе лекарства, видел я, как ловчий Кучинский и Сафронов из дому выносили кусок так около пуда олова в кожаном мешке. Видел я также во дворе молодого Шебеко, Хморовича, лакея Давыда, кучера Павлюка и прочих не знаю, их было много. Иван Иванов.

Я, Герасим Якимов, 30 лет д. Прудины, веры православной показал: дней за 5 до Юрьева дня прошлого года пришел я в Слепцы к доктору, чтобы зуб мне вырвал. Вошедши в комнату, застал там лекаря Самуйло и фельдшера его Кучанского, которые растапливали олово. Но для чего растапливали, не знаю, потому что зуб весьма мне болел и потому не обращал на то большого внимания.

Показания отбирал помощник исправника армии подполковник Лейшнер.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2001, воп. 2, спр. 93, ліст 51—52.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.

З гісторыі міжканфесійных адносін на Крупшчыне

У 10—13 ст. Крупшчына ўваходзіла ў склад Полацкага княства. Яе жыхары прытрымліваліся агульнай для гэтага рэгіёна канфесіі — праваслаўя. Палажэнне ўскладнілася пасля ўваходжання гэтых зямель у склад Вялікага княства Літоўскага. Пасля Крэўскай уніі 1385 г., калі князь Ягайла заключыў дынастычны саюз з Польшчай, у 1387 г. ён выдаў прывілей, у якім абавязваў жыхароў княства перайсці ў каталіцызм. Затым у цэлым радзе дзяржаўных актаў пацвярджаліся прывілеі тым, хто гэта зрабіў. Але ў сувязі з тым, што структура Вялікага княства Літоўскага доўгі час была неаднароднай і яно дзялілася на цэнтральныя землі (ядро) і землі, якія «прыслухоўваліся», гэта значыць, увайшлі ў княства на пэўных умовах і мелі адносную самастойнасць. Такой зямлёй была перш за ўсё ўсходняя частка Беларусі, куды ўваходзіла і Крупшчына. Таму і акаталічванне тут праходзіла не так жорстка, як на захадзе. Трэба мець таксама на ўвазе, што на працягу амаль усёй сваёй гісторыі Вялікае княства Літоўскае перыядычна вяло войны з Маскоўскай дзяржавай за валоданне сумежнай тэрыторыяй, таму ўлады княства больш лагодна адносіліся да праваслаўных магнатаў і шляхты, якія жылі на прыгранічных землях, каб мець ад іх падтрымку. Звесткі пра колькасць праваслаўных цэркваў і прыходаў на тэрыторыі раёна ў час уваходжання Беларусі ў склад Вялікага княства Літоўскага не заха-

валіся. Вядома толькі аб пабудове цэркваў у 1614 г. ў Бабры, у 1650 г. ў Ігрушцы, у 1669 г. ў Касянічах.

Пасля заключэння ў 1596 г. ў Брэсце пагаднення паміж каталіцкай і праваслаўнай канфесіямі (Брэсцкай царкоўнай уніі) паўсюдна пачаўся перавод насельніцтва ва уніяцкую веру. Абрады пры гэтым заставаліся ранейшымі, але царква перападпарадкоўвалася папу рымскаму. У Сенненскім і Барысаўскім паветах, куды ўваходзіла Крупшчына, былі пабудаваны альбо пераўтвораны ва уніяцкія Бобрская, Худаўская, Нацкая, Ротаньская, Заборская, Халопеніцкая, Смародзінская цэрквы.

Адначасова на землях, дзе пераважала праваслаўнае насельніцтва, актывізаваў сваю дзейнасць ордэн езуітаў, які быў створаны для абароны каталіцызму. У Беларусі езуіты перш за ўсё абаснаваліся ў Оршы, Віцебску, Полацку, г.зн. на ўсходнім пыграніччы княства, і адсюль пачалі пашыраць свой уплыў. Ордэн езуітаў стварыў свае навучальныя ўстановы, усімі сродкамі пранікаў у органы ўлады, але, галоўнае, імкнуўся ўмацавацца эканамічна шляхам набыцця маёнткаў, сёл, зямель. У 1665 г. магнаты Фама і Еліслава Улоўскія падарылі ордэну маёнтак Нача і 5000 злотых. У грамаце агаварвалася, што гэта дарэнне прызначалася для хутчэйшага аднаўлення маёнткаў езуітаў, якія пацярпелі ў ходзе руска-польскай вайны. У 1817 г. магнат Самуіл Прасевіч падарыў езуітам вёску і фальварак Шамкі. Паступова ордэн набыў на Крупшчыне таксама вёскі Грыцкавічы, Стругa. У 1703 г. ўладальнік мяст. Халопенічы Марцін Халецкі пабудаваў тут касцёл і пры ім заснаваў дамініканскі манастыр, якому былі перададзены маёнткі Гарадзішча, Мхерын. У сярэдзіне 18 ст. да ўладанняў Барысаўскага касцёла адышлі вёскі Клён, Восава. На ўсходзе сучаснага Крупскага раёна асяродкам каталіцызма стала мяст. Бобр, дзе ў 1760 г. быў пабудаваны касцёл. На астатняй частцы раёна да канца 18 ст. пераважалі ўніяцкія прыходы.

У канцы 18 ст. пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай рэлігійная абстаноўка на тэрыторыі раёна змянілася. Дзяржаўнай рэлігіяй стала праваслаўе. Каталіцызм не забараняўся, але касцёл быў пазбаўлены непасрэднай падтрымкі ўлад. Уніяты згодна з ўказам Імператрыцы Кацярыны II ад 22 красавіка 1794 г. аўтаматычна пераводзіліся ў праваслаўную веру. Перавод уніятаў у праваслаўе праходзіў без асаблівых ускладненняў. Звычайна ў вёску прыязджала камісія, якая праводзіла растлумачальную работу сярод насельніцтва. Затым вернікі падавалі калектыўную заяву з просьбай перавесці ў праваслаўе. Такім чынам, у раёне ўсе уніяцкія цэрквы паступова былі ператвораны ў праваслаўныя храмы.

У час вайны 1812 г. на тэрыторыі Беларусі Напалеон стварыў Часовы ўрад Вялікага княства Літоўскага. Частка палякаў, якая спадзявалася на ўзнаўленне Польшчы ў межах 1772 г., падтрымала французскіх акупантаў. Уніяцкія святары разгарнулі актыўную дзейнасць па пераводзе насельніцтва ў каталіцызм. Зноў пачалося пераўтварэнне праваслаўных цэркваў ва уніяцкія. Так, была пераведзена ва уніяцкую царква ў в. Выдрыца і ў іншых месцах. Значную колькасць цэркваў напалеонаўская адміністрацыя заняла пад склады правіянта і іншай ваеннай маёмасці. У час адступлення Напалеона частка цэркваў была спалена ці разрабавана. Сярод іх Бобрская, Выдрыцкая, Крупская, Нацкая.

Пасля польскага паўстання 1830—31 гг. царскі ўрад пачаў праводзіць актыўную антыпольскую палітыку. З гэтай нагоды шырока разгарнулася будаўніцтва праваслаўных храмаў. Мясцовыя памешчыкі абавязваліся за свае грошы ўзводзіць будынкі, што не заўсёды знаходзіла сярод іх паразуменне. У 1828 г. граф Храптовіч пабудаваў у Халопенічах драўляную Свята-Успенскую царкву. У 1862 г. на яе перабудову было выдзелена дзяржавай 17 805 руб. За гэтыя грошы ў 1863 г. быў пабудаваны новы цагляны храм. З 1825 г. ўпамінаецца ў дакументах драўляная Спаса-Праабражэнская царква ў Грыцкавічах (захавалася да нашых дзён). Сярод тых, хто ахвяраваў грошы і кіраваў будаўніцтвам цэркваў, сустракаюцца прозвішчы памешчыкаў Тышкевіча, Сангушкі, Пржасецкага, Нітаслаўскага, Рашкоўскага, Пржамыцкага.

Адначасова з пашырэннем праваслаўнай веры ва ўсходняй частцы Беларусі значны ўплыў мелі старавабрадцы. З сярэдзіны 17 ст., калі ў Расіі пачалі праводзіцца царкоўныя рэформы, тыя, хто не пагадзіўся з імі, пачалі прыцясняцца і ўцякалі за межы дзяржавы. Нямала такіх старавабрадцаў, ці раскольнікаў, з'явілася ў Вялікім княстве Літоўскім. Тут у гэты час праходзіла насаджэнне уніі, таму ўлады не перашкаджалі перасяленню старавабрадцаў, бачачы ў іх саюзнікаў у барацьбе з праваслаўем. У 19 ст. адносіны царскага ўрада да іх змяніліся, але старавабрадцы

паспелі ўжо абжыцца на новым месцы. У Беларусі найбольшая колькасць іх рассялілася ў Гомельскім і Сенненскім паветах. У Крупскім раёне, які ў той час уваходзіў у склад Сенненскага і Барысаўскага паветаў, большасць з іх пражывала ў ваколіцах мястэчак Абчуга і Халопенічы. У в. Валоба Халопеніцкай воласці іх налічвалася 75 чалавек, Мхерына — 40, Белае — 85, Бабарыка — 120. Амаль усе жыхары гэтых вёсак прытрымліваліся старой веры. *Дз.М.Хромчанка.*

Запіскі работніка верхняга земскага суда ў Магілёве Г.І.Дабрыніна

1893 г.

По приезде в Сенно взял я с собою земского исправника и с духовной грекороссийской стороны депутата по силе данного ему от команды предписания.

Всех церквей униатских во всем Сенненским уезде тридцать три, которых все мы посетили. Ко всякой церкви собирали прихожан — упредительно через земского исправника, дабы по приезде не тратить времени, при каждой церкви читали им повеления, предписания, спрашивали о свободном расположении их к перемене веры духовного депутата и не обрели ни единой души, желающей отстать от униатской и пристать к грекороссийской церкви.

Губернатор вскоре получает от генерал-губернатора предложение следующего содержания: «Для единообразного же действия, прилагаю вам копию распоряжения полоцкого господина губернатора, из которой ваше превосходительство усмотрите, между прочего, что посланные по делам униатским снабдены пригонами и каждый тремя солдатами».

Уже проходит обращению униатов 5 и 6 месяцев, уже оканчивается год, уже наступил и другой, а посланные из уездов не возвращаются как между тем, настоящие их должности терпят остановку. Иной доносит: обратил церковь, две, три. И, лишь только губернское правление получит такое донесение, как вдруг с противной стороны получает другие — от униатского духовенства, от прихожан, а побочными дорогами и от помещиков — что униаты принуждены побоями, что церковь отбита насильно и проч., и проч. И в наместническом правлении сделалось целое наводнение униатских дел. Тогда все заговорили: какой дальновидный человек Добрынин из того уезда, где он был, нет ни одного дела!

Друкуецца па кн.: Истинное повествование или жизнь Гавриила Добрынина, им самим писаная в Могилеве и Витебске.

Царква ў Худаўцах

Ёсць у Крупскім раёне Мінскай вобласці невялікая вёсачка, што завецца Худаўцы. Знешне мала чым прыкметная, яна вызначаецца даволі прыгожай царквою, якая стаіць на краю вёскі. Царква тая, названая ў імя Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, пабудавана з дрэва, упрыгожана 7 купаламі. Гісторыя яе пабудовы звязана з падзеямі, якія калісьці ўскалыхнулі шмат каго ў дарэвалюцыйнай Расіі, а разам з тым данесліся да Беларусі.

Было гэта ў 1888 годзе.

У кастрычніку, пасля вандроўкі па Каўказе, цар Аляксандр III і ўся яго сям'я вярталіся ў Санкт-Пецярбург. Раптам, невядома чаму, цягнік увесь здрыгануўся, і тыя, хто ехаў у ім, адчулі страшэнны ўдар, потым другі, трэці... Цягнік сарваўся з рэек і праз некалькі хвілін яго вагоны ператварыліся ў нешта жахлівае...

У выніку аварыі загінула 19 чалавек, 37 былі цяжка паранены. Сярод тых, хто ўцалеў (а такіх было няшмат), нейкім цудам засталіся ў жывых цар і яго сям'я. Яны не атрымалі нават ніводнай сур'ёзнай раны, хаця іх вагон быў пашкоджаны не меней за іншыя.

Мінула некалькі гадоў, але тое здарэнне засталося ў памяці людзей. Пра катастрофу на чыгункі яшчэ доўга ўспаміналі. У розных мясцінах Расіі ў памяць аб уратаванні цара служылі адпаведныя малебны.

Праз 6 гадоў у часопісе «Церковные ведомости» з'явілася цікавая заметка.

У ёй апавядалася, што жыхары з вёскі Худаўцы Віцебскай губерні на асабістыя сродкі вырашылі пабудаваць у сябе царкву, якая б нагадвала пра падзеі 1888 г. Мясцовыя сяляне не вызначаліся асаблівай заможнасцю, але гэта не стала для іх перашкодай. Як паведам-

лялася ў «Церковных ведомостях», «...при общей бедности крестьян постройка церкви единственно на их личные средства стоила им немалых лишений. Однако отрадно было смотреть, с какой любовью и преданностью к делу она производилась. По общему обсуждению и одобрению закупили материал, наняли рабочих. В постройку храма крестьяне вложили, можно сказать, всю свою душу; занятые ею, часто забывали свои неотложные хозяйские дела... Новоустроенная Худовецкая церковь была возведена в русском стиле, покрыта железной крышей и расположена на возвышенном месте».

У 1894 г. ўсе работы скончыліся і царкву ў Худаўцах высвецілі ў гонар Нараджэння Багародзіцы.

У сувязі з візітам у Худаўцы Місаіла, епіскапа Магілеўскага і Мсціслаўскага, епархіяльныя ведамасці змясцілі кароткую даведку, якая дае ўяўленне пра стан прыходскага жыцця на той час.

З даведкі бачым, што ў канцы мінулага стагоддзя за царквою лічылася каля 2000 прыхаджан; яе прычт меў ва ўладанні 38 дзесяцін зямлі; у Худаўцах дзейнічала царкоўнапрыходская школа, дзе мясцовыя хлапчукі ды дзяўчынкі навучаліся грамаце і спасцігалі Закон Божы. Настаяцелем храма быў святар Пётр Чарнагорцаў.

У 1930-я гады царква нейкі час не дзейнічала. Паводле ўспамінаў людзей, яна зноў была адчынена ў 1942 г. З таго часу яна дзейнічае бесперапынна. У 1994 г. ёй споўнілася роўна 100 гадоў.

Фёдар Крыванос, свяшчэннік Свята-Духавага кафедральнага сабора г. Мінска. Зрок. 1994. № 3.

Вытокі

У пачатку 20 ст. паўночна-ўсходняя частка раёна, уключаючы Крупкі, Бобр, Абчугу, Касянічы, уваходзіла ў Сенненскі павет Віцебскай губерні, заходняя адносілася да Барысаўскага павета Мінскай губерні. Гэта быў у асноўным сельскагаспадарчы рэгіён. Дробныя прамысловыя прадпрыемствы, пераважна па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны, лесу, існавалі толькі ў Крупках, Бабры, Халопенічах і Абчузе. Як параўнальна развіты прамысловы цэнтр выдзялялася мяст. Бобр. У 1904 г. тут дзейнічалі завод па вырабу цэглы братоў Лазінскіх (на ім працавала 62 рабочых), завод па вырабу цэглы братоў Пружынскіх (53 рабочых). Два разы на год у Бабры праводзіўся кірмаш.

Неўрадлівая, пераважна пясчаная або гліністая глеба, вялікая колькасць лясоў і няўдобіца былі адной з прычын малазямелля і ў цэлым даволі нізкага ўзроўню жыцця сялян. Сярэдні памер надзелаў складаў — 8—10 дзесяцін зямлі, з іх палавіна прыпадала на няўдобіцы і сенажаці. Па падліках, зробленых у 1907 г. ўраджэнцам раёна К.Т.Анікіевічам, селянін з апрацоўваемай зямлі меў гадавы прыбытак 56 руб. Анікіевіч палічыў, што самыя неабходныя затраты на сям'ю ў год складалі 50 руб. Такім чынам, чысты гадавы



Бобр у пачатку 20 стагоддзя.

прыбытак на сялянскую гаспадарку складаў прыкладна 6 руб., гэта без уліку непрадбачаных выдаткаў, стыхійных бедстваў, якія адразу прыводзілі да разарэння. Дарэчы, перад пачаткам 1-й сусветнай вайны за 6 руб. можна было купіць пуд мяса або пуд цукру. У Сенненскім, Барысаўскім і суседніх з імі паветах буйных землеўладальнікаў не было, за выключэннем уладальнікаў маёнткаў Бобр і Крупкі А.Ф.Барталамея і К.О.Свяцкага, якія мелі па 11—12 тыс. дзесяцін зямлі. Астатнія памешчыкі мелі ад 500 да 2 тыс. дзесяцін і параўнальна невялікі даход. Таму многія з іх займаліся падсобнымі промысламі, трымалі корчмы, млыны, невялікія вінакурныя заводы. Памешчыкі і заможныя сяляне валодалі 70% зямлі, а 5 тыс. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак — 30%.

Цяжкае эканамічнае становішча сялян прыводзіла да вострых сацыяльных канфліктаў. Каб знізіць накал сялянскіх і рабочых хваляванняў, якія выліліся у рэвалюцыю 1905—07 гадоў, царскі урад пачаў праводзіць некаторыя эканамічныя і сацыяльныя рэформы.

3 лістапада 1905 г. быў выдадзены маніфест аб адмене выкупных плацяжоў сялян. Гэта азначала, што зямля, якой яны былі надзелены ў 1861 г. ў выніку адмены прыгоннага права, пераходзіла ва ўласнасць. Але ў Расіі і ва ўсходніх раёнах Беларусі, да якіх адносілася і Крупшчына, уласнікам зямлі юрыдычна станавілася абшчына.

9 лістапада 1906 г. Мікалай II выдаў указ «Аб дапаўненні некаторых пастаноў дзеючага закона, які тычыцца сялянскага землеўладкавання і землекарыстання». Гэты ўказ пасля зацверджання Думай і Дзяржаўным Саветам з 14 чэрвеня 1910 г. стаў называцца законам і увайшоў у гісторыю як «Сталыпінская аграрная рэформа».

Сутнасць яе заключалася ў разбурэнні сялянскай абшчыны, перадачы зямлі ва ўласнасць сялян і пераводу іх гаспадарак на хутары ці водрубы, а таксама перасяленні беззямельных сялян на казённыя землі ў Сібір, на Паўночны Каўказ, у Сярэднюю Азію.

У час гэтых пераўтварэнняў каля 30% сялянскіх гаспадарак на Крупшчыне замацавалі зямлю ў прыватную ўласнасць. Але ў цэлым істотных вынікаў гэтая рэформа не прынесла. Яна тычылася перадзелу толькі сялянскіх зямель, не закранаючы ўгоддзяў памешчыкаў. Ва ўмовах малазямелля і дрэннай урадлівасці зямель Барысаўскага і Сенненскага паветаў асноўная маса жыхароў не палепшыла свайго эканамічнага становішча. Рэформа была выгадна больш заможным сялянам, якія атрымалі магчымасць скупляць землі, але такіх на Крупшчыне было няшмат.

Яшчэ адной спробай хоць часткова вырашыць сацыяльныя праблемы, у першую чаргу ў сельскай мясцовасці, стала ўвядзенне ў беларускіх губернях земстваў. Яны складаліся з кіраўнічага органа — сходу, і выканаўчага — управы, і займаліся пытаннямі мясцовага самакіравання: рамонтам дарог, добраўпарадкаваннем сёл, арганізацыяй паштовай сувязі, а таксама кіраўніцтвам установамі адукацыі, прытутамі для старых і хворых, лячэбніцамі.

У Расіі земствы былі створаны яшчэ ў 1864 г., але ў заходніх губернях, дзе быў моцны польскі ўплыў, іх адкрываць спачатку баяліся. Толькі ў красавіку 1903 г. ўлады прынялі рашэнне аб увядзенні мясцовага самакіравання ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях, у тым ліку і на Крупшчыне, а канчаткова яно было зацверджана 14 сакавіка 1911 года. Прычым, у гэтыя ўстановы службовыя асобы не выбіраліся, а назначаліся.

Трэба адзначыць, што земствы зрабілі нямала, асабліва ў сацыяльна-культурнай сферы. Добрую памяць у народзе пакінулі адкрытыя ў гэты час земскія бальніцы, школы, людзі, якія працавалі ў іх.

У мястэчку Халопенічы, напрыклад, земскім урачом працаваў Міхаіл Навумавіч Берман, выпускнік Юр'еўскага універсітэта. Калі ён вяртаўся ў Халопенічы пасля рускаяпонскай вайны, насустрач яму была выслана дэлегацыя, а насельніцтва мястэчка выйшла на вуліцы для сустрэчы. У ўручаным яму прывітальным адрасе было напісана: «Вы увесь час прадстаўлялі сабой прыклад ідэала ўрача-чалавека. Ваша імя благаслаўляюць усе ад мала да вяліка». М.Н. Берман памёр у маі 1908 г. на працы ад сыпнога тыфу, заразіўшыся ад хворых, якіх ён лячыў. У некралогу ад грамадства мінскіх урачоў было адзначана: «Ён не ведаў пакоя ні днём, ні ноччу, заўсёды з'яўляўся, калі яго клікалі хворыя, не разбіраючы ні бедных, ні багатых, часта адмаўляўся ад усякага ганарару і нярэдка аказваў хвораму бедняку матэрыяльную дапамогу».

У пачатку 20 ст. ў населеных пунктах Бобр, Ухвала, Халопенічы былі адкрыты ўрачэбныя ўчасткі. У 1906 г. ў Бабры адкрылася амбулаторыя, праз год у ёй былі пастаўлены 4 ложкі для аказання стацыянарнай ме-

дыцынскай дапамогі. У 1908 г. пачалі працаваць Абчугскі і Лісічанскі фельдшарскія пункты, у 1912 г. ў в. Ухвала, у 1913 г. ў мяст. Халопенічы адкрыліся земскія бальніцы на 6 ложкаў.

У 1908—13 гг. былі адкрыты таксама земскія школы і народныя вучылішчы ў в. Гібайлавічы, Новы Сокал, Стары Бобр, Узнацк, Хацюхова, Нача, Ухвала, Забалацце, Гумны, Клён, Старая Слабада, Вялікія Хальнявічы, Буда, Ваўкавыск, Каменка, Клубынічы, Клішана, Лютыя, Асінаўка, Харытанцы, Шырневічы, Язбы, Мачулішча, Шынкі, Шкорнеўка.

Але ж гэтая работа не магла вырашыць праблему народнай адукацыі, медыцынскай і іншай дапамогі сялянам. З-за цяжкіх умоў жыцця і працы высокай заставалася смяротнасць сярод насельніцтва, у тым ліку і дзіцячая. На тэрыторыі сучаснага Крупскага раёна ў той час працаваў толькі адзін акушэрскі пункт у в. Ухвала. Створаныя школы былі малакамплектныя, асноўная ж маса насельніцтва заставалася непісьменнай.

Сацыяльна-эканамічнае становішча насельніцтва яшчэ больш пагоршылася з пачаткам 1-й сусветнай вайны. Да канца 1915 г. германскія войскі захапілі Брэст, Гродна, дайшлі да Навагрудка, Баранавіч, Пінска. На гэтым лінія фронту стабілізавалася, але на ўсход, у тым ліку на тэрыторыю Крупшчыны, рынуліся бежанцы.

У 1914—17 гг. пачасціліся выпадкі самавольных парубак памешчыцкага лесу, канфлікты паміж памешчыкамі і сялянамі з-за сервітутаў (агульных выганаў для жывёлы). На гэта звернута ўвага ў данясенні магілёўскага губернатара міністру ўнутраных спраў, дзе адзначалася, што сялянскія хваляванні «прынялі асабліва востры характар у Сенненскім павеце, дзе пры садзейнічанні сялян быў разрабаваны шэраг памешчыцкіх маёнткаў і эканоміі. Настрой запасных і ўсяго насельніцтва Сенненскага павета неспакойны...»

Вясной і летам 1915 г. масавыя патравы і парубкі былі зроблены сялянамі вёсак Клубынічы, Мальцы, Лютыя і інш. У Барысаўскім павеце па скаргах памешчыкаў у 1915 г. земскімі начальнікамі было разгледжана 456 спраў. Да канца 1915 г. ў прыфрантавых мясцовасцях, у лік якіх уваходзілі Барысаўскі і Сенненскі паветы, вельмі востра стала праблема харчавання. Згодна з паведамленнем ўпаўнаважанага па нарыхтоўках, у Барысаўскім павеце «невялікія і без таго запасы ўжо забраны пастаяннымі рэквізіцыямі і ў далей-



Бобрская валасная земская ўправа.

А.Ільюшын.

Пасведчанне старшыні палкавога камітэта А.Ільюшына. 1917 г.

шым разлічваць на павет нельга... У сялян кармоў ужо няма, яны прадаюць апошніх кароў». У снежні 1915 г. маса сялянскага насельніцтва Барысаўскага павета, не маючы ніякіх сродкаў да існавання, вымушана была карміцца на харчовых пунктах. Усё гэта прыводзіла да таго, што і ў 1916 г., нягледзячы на жорсткі ваенны рэжым, хваляванні сярод сялян не спыняліся. Паступова мяняўся настрой у вёсцы. Сяляне сталі паводзіць сябе ў адносінах да памешчыкаў і чыноўнікаў больш рашуча і дзёрзка, патрабуючы раздзела памешчыцкіх зямель. Земскі начальнік 8-га ўчастка Барысаўскага павета паведаміў, напрыклад, што ў сялян цалкам памяняўся погляд на панскую ўласнасць, што ў даны час яны ўпэўнены «калі не ў законнасці парубак і патраў, то, ва ўсякім выпадку, у праваце сваёй». Але да Лютаўскай рэвалюцыі гэты рух яшчэ быў стыхійным, неарганізаваным, не дасягнуў шырокага размаху.

Пасля пераходу ўлады да Часовага ўрада стварыліся спрыяльныя ўмовы для агітацыйнай работы. Пачалі выдавацца газеты, у вёскі часцей сталі паступаць лістоўкі і іншыя прапагандысцкія матэрыялы. Вярталіся з фронту дадому салдаты, якія часта бралі на сябе функцыі арганізатараў сялянскіх мас. Адным з такіх агітатараў быў, напрыклад, ураджэнец в. Ухвала А.Ільюшын. *Дз.М.Хромчанка.*

Пра паншчыну

Как-то случилось мне ехать из деревни на станцию ж.д. Дело было осенью. Дорога, помнится, была скверная, грязная, местами грязь по ступицу доходила, лошадёнка еле-еле тащилась. В таких местах мой подводчик и земляк, Кузьма Сколубович, слезал с телеги для облегчения лошади и плёлся рядом с нею, выбирая места посуше. Шёл он, тяжело дыша и согнувшись в крюк...

— Отчего ты, Кузьма, так гнёшься на ходу? Болезнь это у тебя такая, что ли?

Он посмотрел на меня с грустной улыбкой и после некоторого молчания ответил:

— Воз лозы тащу... Нелёгкое это дело, оттого и согнулся... Была и моя шкурка в работе, места живого не осталось.., — сказал он вздохнувши и стал взбираться на облучок.

— За что же тебя так секли? — спросил я, чтобы побудить его продолжить свой рассказ.

— С сахарного завода бежал, так за то. Два раза бегал, два раза и секли...

Были мы тогда графские, графа Хрептовича. Хороший был пан. Только мы его редко видели: не жил он в имении. Ну, комиссары, что хотели, то и делали. Немцы все были: говоришь ему, говоришь, просишь, а он не разумеет по-нашему. Сколько моя мать в ногах повалялась у Фиша, всё просила, чтоб не посылал меня на завод, — ничего не помогло.

Что ему, бывало, наговорят эконом Подгурский да войт Павла, так и будет.

Ну, так записали меня... Много народа гнали тогда на завод: с одного нашего имения человек 100. Боже мой, Боже! Сколько было слёз, причитаний... Идти в чужую сторону. Бог знает куда... Долго ли продержат — неизвестно...

Ходил я просить и войта Павла, и эконома Подгурского — ничего не помогло. Повалился я в ноги Подгурскому... а он меня ногой этак как толкнёт, «вон, говорит, хам ты! Издохни, говорит, быдло, вместе с ними!» Та-

кая жалость меня взяла — так клубом к сердцу и подкатило... Встал я и говорю: «А где же правда, паночек? Есть же бог на небе». А он меня как гвозданёт в зубы: «Вот тебе, говорит, правда». Тяжёл был на руку...

Рассказчик запыхался, говорил прерывающимся голосом, но не от волнения, как можно бы подумать, а просто от удушья.

— Пошёл я с плачем домой, — продолжал он, откашлявшись.

Как рассказал я дома, что и как, заголосили мои бабы. Ну, делать нечего: панская воля... Стали собираться мы в дорогу — мужчины и женщины. Плач был в селе — вот как в рекрутский набор. Просил я, чтоб и мою Дарку со мной послали... Войт Павла хотел было отпустить, да эконом не согласился: в «дворе», говорит, нужна. Я тогда молод был, ничего ещё не понимал, а потом оказалось, что это он к ней, Дарке-то моей, подбирался... Да что поделаешь — неволя наша была. Разве тогда кто-нибудь думал, что будет так, как теперь? Никому и в голову не приходило. Потом уже пошли слухи про волю.

Он остановился, чтобы передохнуть, или, может быть, собирался с мыслями...

— А что, Кузьма, ты говоришь, — спросил я, — что, «воли» не ждали?

— Как сказать? — настоящей надежды не было... А так «подголоски» (слухи) разные ходили. Говорили разное, но мало кому верили. Помню только, ещё перед «Севастополем» было... Клали мы фундамент под пивоварню... Много было народу: кто камень возил, кто известь размешивал, кто ямы рыл... И комиссар, пан Сысолка, тут сидел и другие паны были.

Вот тут Семён из Городища (может быть, знаете?) и спросил у комиссара: «Правда ли, паночку, что мужик скоро «вольным» будет?» Комиссар даже затрясся, так рассердился. «Бери, — кричит, — мужик, каменю!» Тот берёт. «Кидай его в воду!» (Дело было около озера.) Тот кидает, а сам дрожит, чует, что прогневал пана. Тогда и говорит комиссар: «Вот когда этот камень будет плавать, тогда мужик будет вольным. Ожидай. А чтоб ты, собачья кровь, был умнее, вперёд не брехал пустых речей, так получишь «в скуру». Дай ему 50 горячих тут же», — сказал он тиуну и сам ушёл с панами. Однако же не по-панскому вышло...

— Ну что ж, Кузьма? Что было дальше? Рассказывай, брат, коли начал.

— Что было дальше? — переспросил он, — известно что: погнали нас. Как теперь помню, — около Николы весеннего было дело: уже ярицу почитай что все посеяли. Душ 50 нас в первой партии, а провожали нас и того больше: матери, сёстры, братья...

До самой Якимовки шли с нами — вёрст 5 будет. В якимовском березняке стали мы прощаться: так Олемпа, приказчик наш, приказал.

Сам не знаю: вернусь или нет? А что, если там поселят? Прощайся, значит, с батьковщиной и со всей роднёй... Заскребли кошки на сердце... Но тут услышал я, что приказчик Олемпа уже стал ругаться, что так долго мы прощаемся.

Ну, отплакали мы своё и пустились в дорогу. А за нами всё ещё слышались причитания: это некоторые из родни провожали нас издали.

Идём мы день, другой, третий... Вёрст по 40 в сутки ухаживали. Прошло с неделю времени — стало легче идти: ноги так одеревенели, как чужие стали. Привычка. Переставляешь их, бывало, как столбы как столбы какие-то. Зато тоска стала одолевать... И чем дальше, тем хуже.

Как подумал я, что, может быть, здесь всегда жить придётся (на всё ведь панская воля) — прямо человек стал сам не свой. Даже разум помутился. «Убегу, — думаю, что будет, то будет, — а убегу».

Выбрал я ночь потемнее и, когда все заснули, взвалил свой узел на плечи и «дал тягу». Прыть такая взялась, что по 60 вёрст в сутки ухаживал. А как добрался до своей стороны — весёлый такой стал... Иду лесами, «гукаю», ног под собою не чую.

Пришёл я домой ночью. Постучал в окно: «Пустите, говорю, переночевать». Окликнула меня мать, как узнала мой голос. Так и обомлела. Отворила она дверь, кинулась мне на шею, дрожит: «Сыночек мой дороженький, что же это будет!?» И я плакал, но ничего не боялся, рад, что своих увидал...

«А где же Дарка?» — спрашиваю я у матери. «Взяли у двор экономy, пану Подгурскому служить. Плохо ей там», — говорит мать.

Назавтра, чуть свет, мать дала знать Дарке, что я вернулся. Прибежала она ночью на гумно ко мне, плачет, заливается слезами, говорит, что ей житья нет от Подгурского — шибко пристаёт к ней.

Вижу я, что дело плохо, а помочь ничем не могу. Дале сам заплакал. Сижу и сам не знаю, что мне с собой делать. Но не долго пришлось посидеть: письмо пришло от Олем-

пы и явился за мной пан Подгурский с дворней. Я зарылся в солому и не дышу... Раскопали, разрыли — нашли меня. Первым делом Подгурский оплеух с десяток влепил мне. Я стою, только голова кружится... Повели меня на суд к комиссару. Суд короткий был: сказал 300 лоз влепить — и повели на конюшню.

Долго ли, коротко сидел, не помню, сознание потерял, но как услышал, что мать с Даркой голосят под дверьми, а их отгоняют прочь — тут я пришёл в себя, опомнился. Снял я пояс, накинул петлю на шею, хотел повеситься... Услышали сторожа, отворили дверь и кинулись на меня. Послали за Подгурским. Пришёл он и началась расправа... Сергей Сердулец, кат наш дворовый, стал резать моё мясо. Такая проклятая рука была, что сразу до крови добирался, он и правой, и левой рукой одинаково больно сек...

Ну, ссекли мне шкуру на капусту, взвалили на телегу как мёртвое тело и повезли в больницу отлеживаться... Недели три я там на животе пролежал, пока спина поджила.

Вылежался, и прямо из больницы меня погнали со второй партией на тот же сахарный завод, чтоб он провалился... А меня вот как бы обухом пришибло: иду, ни о чём не думаю и ничего мне не жаль. Но уже за мной присматривали, чтобы я снова не сбежал, и даже на ночь колодки на ноги набивали... Помню, как пришли на завод и стал Олемпа меня по морде лупить, что сбежал...

Завод этот был чистое пекло: работа каторжная, непривычная: сек Олемпа часто, однако люди терпели...

К весне, однако, я пришёл в себя... Солнышко засветило, трава зазеленела — вновь домой захотелось. Расспрашиваю я у своих земляков, что недавно пришли, как мать живёт, жена, как хозяйство?.. Так и так, говорят, мать, говорят, коня продала, корову «на прокорм» отдала, на батьковщину другого посадили, а Дарка твоя, говорят, с экономом, с Подгурским, «спозналася»...

Та-ак. Заныло тут у меня на сердце, закручинился я: жаль батьковщины... Снова подмывает меня бежать. Как вспомнил я, что моя мать без хлеба сидит — тут и сам не знаю, что сделалось со мной — вот будто в меня нечистый дух вселился: бежать и бежать. Не утерпел. Собрал я свои пожитки и пустился в путь. Всего в дороге натерпелся, но пришёл-таки домой. Обхватила меня мать за шею, залилась горькими слезами... Только слышу я — в два голоса плачут. Я думал сначала, что мне почудилось, однако нет, голос Даркин... Плачет она, о землю бьётся, за ноги меня хватает. «Согрешила я, говорит, присилил он меня... Прости ты меня, говорит, окаянную...»

— Ну, что ж, — обратился рассказчик ко мне, — тут греха нет. Не воля её. Я так и сказал ей.

— Однако некогда было плакать, — продолжал Кузьма далее. Летняя ночь коротка. А бабы мои сказали мне, что во дворе давно знают, что я сбежал, ищут меня. Значит, нет мне, горемычному, батьковой хаты...

Надумали, что некуда мне больше идти, как в Макарьевскую пущу. Лес большой, спрятаться можно. Дали мне на дорогу краюшку хлеба (последнюю) и выпроводили меня со слезами... Но скоро выследили-таки меня... приехал пан Подгубский с лесниками, с дворовыми, с собаками и взяли меня. Закрутили мне руки назад и ведут на верёвке, как зверя... Повели меня на конюшню, к Сердульцу, в «катние» руки... Уж и потешился надо мной, зверюга! Били «души послухиваючи». А когда не подавал голоса — водой обливали. Привели меня в больницу совсем без души. Месяца четыре и больше пролежал я там. Так-сяк выкарабкался, однако...

Так вот сколько сладости принёс мне сахарный завод! — сострил, под конец, рассказчик, грустно улыбаясь.

Друкуецца па кн.: Богданович А. Про панщину: Рассказы из белорусской жизни времен крепостного права. Гродно, 1894.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.

Дакументы сведчаць

ДАНЯСЕННЕ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРМСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ АБ СХОДЦЫ Ў МЯСТЭЧКУ БОБР СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА

28 лістапада 1905 г.

Маю гонар данесці Дэпартаменту, што ў мястэчку Бобр Сенненскага павета 27 лістапада ўвечары адбылася сходка ў яўрэйскай школе без ведама паліцыі. На сходцы прысутнічалі

маладыя сяляне і яўрэі, мужчыны і дзяўчаты. Гаварыў прамову невядомы прамоўца на тэму аб свабодзе асобы, слова і друку, аб вызваленні сялян ад прыгоннай залежнасці, аб падзеях у Пецярбургу 9 студзеня гг. і, нарэшце, прасіў сялян далучыцца да рабочых, каб завяршыць перамогу.

На гэтай жа сходцы сялянам раздаваліся пракламацыі пад назвай «Да ўсіх» Магілёўскай раённай арганізацыі РСДРП па поваду высачэйшага маніфеста 17 кастрычніка 1905 года. На пракламацыях маецца адбітак штэмпеля «Талачынская арганізацыя РСДРП».

Ротмістр подпіс.

Друкуецца па кн.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг.: Документы и материалы. Мн., 1955. С. 343.

ДАНЯСЕННЕ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРМСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ АБ ЗАБАСТОЎЦЫ РАБОЧЫХ НА ЗАПАЛКАВАЙ ФАБРЫЦЫ І ЛЕСАПІЛЬНЫМ ЗАВОДЗЕ Ў МЯСТЭЧКУ КРУПКІ СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА

25 ліпеня 1905 г.

У мястэчку Крупках Сенненскага павета на фабрыцы па вытворчасці саломкі для запалак мешчаніна Сімхі Лейзерава Хоціневера і лесапільным заводзе купца Арона Гіршава Курніка рабочыя колькасцю па першай 60, па другой 30 чалавек 18 сего ліпеня прыпынілі працу і прадставілі да ўладальнікаў названых заводаў патрабаванні аб павелічэнні заработнай платы, аб чым уладальнікамі гэтых заводаў паведамлена было па тэлеграфу прыставу 4-га стану названага павета, па прыбыцці якога на месца для расследавання справы рабочыя двух заводаў катэгарычна заявілі станавому прыставу, што яны прыпынілі працу з-за таго, што іх гаспадары, нягледзячы на іх просьбы аб павелічэнні заробку, патрабаванні не выканалі, таму яны і вырашылі зусім спыніць работы. Акрамя таго, рабочыя выказвалі незадавальненне супраць гаспадароў і некаторых дапушчальных у адносінах да іх прыгнечаных, асабліва выказваючых у накладанні на іх рознага роду штрафаў за ўсялякія недахопы ў выкананні работ. Так як па разліку прыбаўка павінна быць у суме каля 200 рублёў у месяц, уладальнікі заводаў у прысутнасці станавога прыстава заявілі рабочым, што дабаўку да заробка яны не могуць зрабіць з-за кепскай даходнасці з гэтых прадпрыемстваў. І што яны думаюць лепш зусім спыніць дзеянні заводаў.

Склад рабочых месны і настрой іх самы мірны. Забастоўка іх адбылася па прычыне скудасці сродкаў, і што ў гэтай забастоўцы не праглядваецца другога матыву.

Аб выкладзеным маю гонар данесці
Дэпартаменту
Ротмістр подпіс

Друкуецца па кн.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг.: Документы и материалы. Мн., 1955. С. 206.

З РАПАРТА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА А.ПІЛЬЦА МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ М.А.МАКЛАКАВУ

8 верасня 1914 г.

«...20 ліпеня з розных крыніц як ад пасадных, так і ўласных асоб, я стаў атрымліваць трывожныя весткі аб беспарадках, якія пачаліся ў Сенненскім павеце: запасныя (пры ўдзеле маладых сялян) разбівалі казённыя вінныя лаўкі, склады, секлі чужы лес, бясчынствавалі ў маёнтках. Хаця я быў нездаровы, але з прычынай сур'ёзных вестак у той жа дзень вечарам узяў 20 конных стражнікаў і чыноўніка асобных пры мне даручэнняў Дічкана, выехаў на уласным кані ў Сенненскі павет, дзе па ўказанню спраўніка, у той час адправіўся ў м. Бобр, як у найбольш апасны раён. Становішча стварылася надзвычайна цяжкае, войск не было, усе мясцовыя стражнікі размеркаваны па 2—3 чалавекі на воласць, выконвалі розныя даручэнні, звязаныя з мабілізацыяй, і толькі ў г. Сянно знаходзілася 10 стражнікаў, але выкарыстацца імі для павета з прычынай прабывання хвалюючых запасных у горадзе было (нельга) рыскована. Беспарадкі ахоплівалі ўсё вялікую і вялікую тэрыторыю павета, узнікалі адначасова ў розных месцах... Пры падобных, дасканала выключных умовах, прыходзілася дзейнічаць вельмі хутка, рашуча і наганяць крутымі мерамі страх на буянаў».

Друкуецца па кн.: Кернажыцкі К.І. Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной. Мн., 1932. С. 94.

ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА ГУБЕРНСКАГА КАМІТЭТА ЯЕ ІМПЕРАТАРСКАЙ ВЯЛІКАСЦІ ВЯЛІКАЙ КНЯГІНІ ТАЦЦЯНЫ МІКАЛАЕЎНЫ.

17 кастрычніка 1915 г.

По допросу вдовы погибшего солдата Титовец Софии Фёдоровны, 27 лет, с д. Ухвала.

В октябре 1914 г., после призыва на военную службу мужа свидетельница осталась в казённом доме одна з двумя малыми детьми. В тоже время по распоряжению начальства была эвакуирована, однако она не смогла вырваться вместе с жителями.

Не помнит, какого числа явились на квартиру 12 человек немцев, которые по очереди её насиловали, а затем ограбив её, ушли из дома. По прибытию русских войск Титовец, будучи сильно больной, отправилась с детьми в г. Варшаву, где до выселения лечилась и в настоящее время больна. О чем постановили написать настоящий протокол.

Подпись опрашиваемого: София Титовец объявила себя неграмотной.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2611, воп. 1, спр. 2, л. 33.

Падрыхтаваў да друку Д.М.Хромчанка.

Система народного образрвания в Борисовском уезде по состоянию на 12 ноября 1912 г.

Наименование школы	Название волости	Год основания школы	В чьём здании находится школа
Однокомплектные земские народные училища			
Гибайловичское	Дмитровская	1908	наемное
Новосокольское	Ухвальская	1910	наемное
Старослободское	Ухвальская	1911	наемное
Узвацкое	Холопеничская	1910	наемное
Хотюховское	Холопеничская	1908	наемное
Заболотское	Ухвальская	1912	наемное
Гумновское	Дмитровичская	1912	наемное
Двухкомплектные, открытые за счет земства при министерских училищах			
Начское	Лошницкая	1910	собственн.
Ухвальское	Ухвальская	1911	собственн.
Министерские народные училища			
Начское	Лошницкая	1875	наемное
Пышацкое	Эсьмонская	1865	собственн.
Ухвальское	Ухвальская	1879	собственн.
Холопеничское	Холопеничская	1863	собственн.
Церковноприходские школы			
Выдрицкая двухкомплектная			
Грицковичская			
Денисовичская			
Мхеринская			

З Журнала второго очередного Борисовского уездного земского собрания 10—18 ноября 1912 г. Борисов, 1913. С. 31, 54, 74. *Падрыхтаваў да друку А.П.Аляхновіч*

Школа ў Халопенічах

З успамінаў А.Багдановіча

Когда мне исполнилось шесть лет, осенью 1868 года пошел в школу. Школа была близко..., помещалась она в большом больничном здании времён графа Хрептовича. Тут я был сдан с рук на руки Ивану Баранку (так его звали за кучерявые волосы). Звали его собственно Иван Игнатьевич Борковский. Это был мой первый и самый важный учитель, ибо в его помощи и в его указаниях я, несом-

ненно, нуждался и начальной грамотой ему всецело обязан. Ивану Баранку тогда было 29 лет. Он был одним из крестьянских школьных пионеров в Холопеничах — учеником первого крестьянского призыва. Диакон Тимошевский считался нашим учителем. Вся черновая работа лежала на Иване Баранке.

Педагогический прием Ивана Баранка был много мягче, чем предшествующий дьячка Хруцкого. Работал тогда и дьякон Пигульский. В этой школе учился и Иван Баранок.

Писали все перьями гусиными, а о стальных не имели понятия.

Самым слабым местом «старой школы» были арифметика. Не знали, как ее учить.

В 1870 г. отец переехал в Минск, а в 1871 г. забрал к себе и семью.

Вышэйшая навучальная ўстанова на Крупшчыне

У першым дзесяцігоддзі нашага стагоддзя маёнтак Востраў, што размяшчаўся непадалёк ад Малых Жаберыч, перайшоў ва ўладанне Аляксандру Іванавічу Сіманаву, генералу ў адстаўцы, удзельніку Крымскай вайны. У яго ўладанні ўваходзілі каля 700 дзесяцін ворнай зямлі і зямлі, занятай лесам і балотам (зараз яно асушана). Гаспадарка была ў запушчаным стане. Прыйшла ў заняпад і былая веліч панскіх пабудоў.

Генерал Сіманаў і яго сям'я не цураліся зносін з сялянамі, спачувалі іх цяжкаму жыццю, бясплатна лячылі хворых. Асабліва былі заклапочаны непісьменнасцю простага насельніцтва. Часта наведвалі школу, запрашалі да сябе настаўнікаў і вучняў.

Да генерала часта прыязджаў яго сябар па Крымскай вайне — начальнік Віленскай вучэбнай акругі.

У той час наспела пытанне адкрыць у Беларусі сельскагаспадарчую навучальную ўстанову. Начальніку Віленскай вучэбнай акругі трэба было знайсці зручнае месца яе заснавання і афарміць дакументальна. Разам з Сіманавым ён дабіўся дазволу ўлады на адкрыццё акадэміі ў маёнтку Востраў. Толькі вось грошай ад міністэрства асветы для гэтай мэты атрымаць не змаглі.

Генерал Сіманаў выдзеліў 60 дзесяцін прыгоднай для карыстання зямлі і столькі ж забалочанай. Аддаваў вялізны дом і іншыя жылыя і гаспадарчыя пабудовы.

Трэба сказаць, што ўся збудаваная маёмасць была досыць старой і патрабавала неадкладнага рамонту. Грошай на гэта не было. Генерал Сіманаў не мог выдзеліць грошы для гэтай навучальнай установы, нягледзячы на ўсю яго прыхільнасць.

Добраўпарадкаванне будынкаў трэба было зрабіць сваімі сіламі (сялян вёскі Малыя Жаберычы) і за іх грошы. Акрамя таго, сяляне павінны былі забяспечваць вялізныя будынкі палівам, плата настаўнікам таксама ўваходзіла ў іх абавязак.

Сяляне Малых Жаберыч былі сабраны ў двары Сіманава. Генерал аб'явіў аб сваім жаданні адкрыць у гэтым цёмным кутку Беларусі сельскагаспадарчую акадэмію. З натоўпу было зададзена пытанне:

— Хто будзе вучыцца ў гэтай акадэміі? Адказаў начальнік вучэбнай акругі:

— Вучыцца будуць вашы дзеці і ўнукі. Яны стануць аграномамі, землямерамі, ветэрынарамі. Для таго, каб адкрыць акадэмію, патрэбна ваша згода, бо частка клопатаў аб яе адкрыцці і існаванні ляжа на вас. З натоўпу пачуліся незадаволеныя галасы, але былі і выкрыкі, выказваючыя згоду. Начальнік вучэбнай акругі прапанаваў абмеркаваць гэта пытанне і ў наступную нядзелю вынесці рашэнне. У наступную нядзелю староста Старадубец катэгарычна заявіў: «Не згодны! Мы не зможам выконваць ускладзеныя на нас абавязкі. Мы самі ледзь зводзім канцы з канцамі. У нас нізкія ўраджаі. Мы не можам добра апрацоўваць нават свае маленькія надзелы». Жонка генерала Марыя Іванаўна са слязьмі на вачах спрабуе угаварваць сялян, каб яны не лічыліся з цяжкасцямі, бо акадэмія будзе служыць дзеля іх асветы, дзеля паляпшэння іх жыцця.

Але сяляне, маючы шматвяковы вопыт, што панскія прапановы заўсёды абарочваліся шкодай супраць іх дабрабыту, з асцярогай успрынялі прапановы і ўгаворы, бо абавязацельствы вялізным цяжарам сагнуць іх і без таго прыгнутыя спіны.

Так і не суджана было збыцца мары і добрай надзеі сям'і Сіманавых.

Друкуецца па кн.: Краткое жизнеописание протоиерея Туманова (Тумар) Гавриила Ивановича.

Падрыхтаваў да друку Л.І.Філіповіч.

Аб адкрыцці ў бягучым годзе новых народных вучылішчаў

10—18 лістапада 1912 г.

Согласно плана школьной сети по осуществлению проекта всеобщего обучения в Борисовском уезде, а также в зависимости от ассигнований по смете текущего года на нужды народного образования в уезде Уездною Управою, по рассмотрении в присутствии инспектора народных училищ Борисовского уезда, поступивших в Управу ходатайств крестьянских обществ, должностных и других лиц об открытии в первую очередь за счет земства народных училищ, были намечены к открытию с первого сентября текущего года в следующих пунктах однокомплектные народные училища: дер. Заболотье Ухвальской волости, д. Гумнах Дмитровской волости... По получению отзыва Борисовского уездного училищного совета (от 21 июня с.г., № 46) о согласии совета на открытие в вышеперечисленных пунктах 23 школьных комплектов, Уездною Управой было приступлено к оборудованию училищ необходимой мебелью и другими хозяйственными принадлежностями...

Друкуецца па : Журнал второго очередного Борисовского уездного земского собрания. 1912. С. 31.

Падрыхтаваў да друку А.П.Аляхновіч

З успамінаў А.В.Яшэвіча

Бобрскае двухкласнае вучылішча размяшчалася ў асобным будынку на вуліцы Зарэчча, над ракой Бобр. Вучыўся я там з 1904 г. па 1910 г. Школа складалася з 1-га класа з трыма аддзяленнямі, другога і трэцяга класаў. У першым класе асноўнай дысцыплінай быў Закон божы. Выкладаў яго мясцовы святар Сава Еленеўскі. Вывучалі таксама старославянскую мову, трэба было навучыцца перакладаць са слоўнікам на рускую мову «Псалтыр». Вывучалі таксама арыфметыку па задачніку Гольдберга, рускую мову, шмат увагі ўдзялялася чыстапісанню. У другім класе працягвалі вывучаць арыфметыку па задачніку Малініна—Бурэніна, рускую мову, а таксама былі ўрокі па геаграфіі, геаметрыі, трыганаметрыі, гісторыі і алгебры. У трэцім класе вывучалі тыя ж прадметы, толькі больш грунтоўна. Акрамя таго, трэццякласнікі ўжо дапамагалі настаўніку вучыць вучняў 1-га класа.

З успамінаў Кацярыны Савічны Енашэўскай

Е.С.Енашэўская.

Я працавала ў Бобрскай школе з 1905 года. Яна знаходзілася ў драўляным будынку па вуліцы Зарэчча. Педагагічны калектыў складаўся з аднаго настаўніка, стоража і закона-настаўніка. У трох класах займалася 90 вучняў, у асноўным з м. Бобр і в. Стары Бобр. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі школа была перайменавана ў школу II ступені.

З успамінаў Мікалая Карпавіча Кіслякова

У 1910 г. я пайшоў у Бобрскае народнае вучылішча. Першай маёй настаўніцай была Кацярына Савічна Енашэўская. Памятаю, як разам з ёй і з усёй школай першакласнікі хадзілі на траурную паніхіду ў сувязі са смерцю Льва Мікалаевіча Талстога. У народным вучылішчы вялікае месца ў час заняткаў займаў Закон божы. Два разы на тыдзень прыходзіў да нас святар і выкладаў гэты прадмет. Урок абавязкова пачынаўся малітвай «Царю небесный», а заканчваўся «Достойно есть». Па заканчэнні школы трымалі экзамен па рускай мове (вусна і пісьмова), па арыфметыцы (вусна і пісьмова), гісторыі, геаграфіі і Закону Божаму. Экзамен прымала камісія ў складзе настаўніка, святара і чыноўніка з павета.

Вучобу заканчваў ужо пасля 1-й сусветнай вайны. Школа насіла назву «адзіная працоўная школа 2-й ступені».

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Устанаўленне Савецкай улады

Да Лютаўскай рэвалюцыі і ў першыя месяцы пасля яе ўплыў бальшавікоў у Беларусі, асабліва ў правінцыі, быў нязначны з-за малалікасці і разрозненасці іх арганізацый. Значную ролю ў грамадскім жыцці адыгрывалі эсэры, з прадстаўнікоў якіх у большасці і фарміраваліся мясцовыя органы ўлады.

Але паступова сяляне пачалі ўсё больш актыўна выражаць сваё незадавальненне нерашучасцю Часовага ўрада ў вырашэнні сялянскага пытання, захаваннем старых парадкаў у дзейнасці адміністрацыі на месцах. Тэрыторыя сучаснага Крупскага раёна ў той час уваходзіла ў склад Сенненскага павета Магілёўскай губерні і Барысаўскага павета Мінскай губерні. 16 сакавіка Сенненскі павятовы камісар паведамляў Часоваму ўраду, што нельга не адзначыць амаль паўсюднае ўзбуджэнне сялянскага насельніцтва супраць службовых асоб валаснога праўлення (старшын і пісараў). У красавіку—маі па патрабаванні сялян былі зняты з займаемых пасад камісары Барысаўскага і Сенненскага паветаў. Як адзначала газета «Могилевская жизнь», у Сенненскім павеце ўсюды ажыццяўляліся масавыя самавольныя пакосы сялянамі панскіх лугоў. Члены валасных камітэтаў спрабавалі ўгаварыць сялян-«захопнікаў», але безвынікова. Нярэдкімі былі выпадкі, калі такіх «добразычліўцаў» сяляне звязвалі і закрывалі ў хатах. Такая нерашучая палітыка мясцовых органаў улады Часовага ўрада і адначасова заклікі бальшавікоў да неадкладнага перадзелу памешчыцкіх зямель прыводзілі да паступовага росту ўплыву апошніх. Сенненскі павятовы камісар вымушаны быў прызнаць, што захопы панскіх зямель у павеце пачаліся «пад уплывам бальшавіцкай агітацыі. Для барацьбы з бальшавікамі мабілізаваны ўсе сілы».

У час выбараў ва Устаноўчы сход, якія пачаліся ў лістападзе 1917 г., бальшавікі атрымалі большасць галасоў: па Мінскай выбарчай акрузе 63,2%, Віцебскай выбарчай акрузе 51%, а ў цэлым па Беларусі і Заходнім фронце 47%. 25 кастрычніка (па старому стылю) 1917 г. ў Петраградзе ў выніку ўзброенага паўстання была ўстаноўлена Савецкая ўлада. Паўсюдна пачалі стварацца новыя органы кіравання — Саветы сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў. 26 лістапада сялянскі савет Сенненскага павета прыняў рэзалюцыю, у якой адзначалася, што ўся ўлада ў Сенненскім павеце пераходзіць да Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў і Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. У гэты час Крупшчына як частка Сенненскага павета ўваходзіла ў склад Расійскай Федэрацыі. 5—8 снежня ў Барысаве таксама прайшоў павятовы сялянскі з'езд па пытанні аб'яднання Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Савета сялянскіх дэпутатаў у адзіны орган улады — Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

Станаўленне Савецкай улады на Крупшчыне ў першыя гады пасля рэвалюцыі праходзіла ў складаных умовах. Кастрычнік 1917 г. тут быў спакойны: узброеныя выступленні прайшлі толькі ў буйных гарадах Беларусі. У глыбінцы ж народ, ды і мясцовыя ўлады, успрынялі звяржэнне Часовага ўрада як здзейснены факт, тым больш, што простыя людзі звязвалі з сацыяльнымі зменамі надзеі на паляпшэнне свайго жыцця. Пераходу ўлады ў рукі народа садзейнічала і тое, што ўжо

з лета 1917 г. ў Крупках побач з мясцовымі органамі Часовага ўрада дзейнічаў і местачковы Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Цяжкасці заключаліся ў іншым. У Беларусі, найбольш у сельскай мясцовасці, быў моцны ўплыў эсэраў. Адным з такіх цэнтраў эсэраўскага руху быў, напрыклад, горад Сянно, які знаходзіцца побач з Крупкамі. Паміж эсэрамі і бальшавікамі пачалася барацьба за ўладу, што прывяло да фактычнага безуладдзя і негатыўна адбілася на кіраванні эканомікай і ўзроўні жыцця насельніцтва. Ваеннае ліхалецце і безуладдзе прывялі да голаду ў пачатку 1918 г. Цяжкасці заключаліся і ў тым, што пасля ліквідацыі Часовага ўрада захапіць уладу хацелі спачатку палякі, а затым немцы. У студзені 1918 г. часці польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі, пачалі адкрытае выступленне супраць Савецкай улады. Быў заняты г. Рагачоў Гомельскай губерні. Адначасова пачаліся іх выступленні ў Сенненскім павеце Магілёўскай губерні, у склад якога ўваходзіла і Крупшчына. Польскі штаб у г. Рагачоў заявіў аб анексіі Магілёўскай губерні на карысць Польшчы. Але выступленне польскага корпуса было хутка ліквідавана савецкімі войскамі.

Нямецкая акупацыя. Амаль адначасова з выступленнем палякаў у лютым 1918 г. пачаўся наступленне нямецкіх войск, якія парушылі фронт у раёне Баранавіч і Пінска і пачалі імклівa рухацца на ўсход. Крупшчына апынулася ў акупацыйнай нямецкай зоне, а фронт стабілізаваўся па лініі Полацк—Сянно—Орша. Поўнасцю свабоднымі ад акупантаў засталіся 6 паветаў, часткова — 8, да ліку апошніх адносіўся і Сенненскі. Але становішча германскіх часцей было таксама няўстойлівым. Пад уплывам рэвалюцыйнай агітацыі сярод нямецкіх салдат пачалося браджэнне. Рабаўніцтва, здзекі над сялянамі з боку нямецкіх улад, агульны рэвалюцыйны ўздым, агітацыя і ваенная дапамога з савецкага боку садзейнічалі актывізацыі партызанскага руху на акупіраванай тэрыторыі. Пачалі стварацца партызанскія атрады і на Крупшчыне. Некаторыя з іх узначальвалі бальшавікі, некаторыя эсэры.

Паўстанцкія эсэраўскія групы былі створаны ў мястэчках Абчуга, Бобр, Ігрушка і інш. Недалёка ад в. Барсукі на хутары жылі Кірыл Жук і яго браты Ісак і Васіль, якія ўваходзілі ў эсэраўскую арганізацыю. Яны сталі арганізатарамі партызанскага атрада. Пад іх камандаваннем партызаны ў чэрвені 1918 г. рушылі на в. Хальнявічы, дзе ў гэты час на пастоі ў пана Шпінгера стаяў нямецкі атрад. Партызаны замацаваліся на могілках і пачалі бой. Пасля перастрэлкі, страціўшы некалькі чалавек забітымі і параненымі, немцы адступілі. Эсэры рыхтавалі паўстанне. Яны чакалі зброю, але яна не была своечасова дастаўлена з мяст. Сянно. Нямецкія войскі разгромілі паўстанцаў, спалілі вёскі Худава і Калодніца.

На захадзе сучаснага раёна дзейнічалі атрады, якімі кіравалі бальшавікі. Адным з кіраўнікоў партызанскага руху тут быў ураджэнец Крупскага раёна, былы матрос Балтыйскага флоту Уладзімір Захарэвіч. Ён арганізаваў партызанскі атрад з жыхароў вёсак Восава, Хацюхова, які наносіў адчувальныя ўдары па акупантах. Падобныя выступленні адбыліся паўсюдна. Такая абстаноўка прымусіла нямецкія ўлады пачаць паступовы вывад войск з Беларусі. Гэтага ж патрабавалі і ўмовы дадатковага да Брэсцкага мірнага дагавора пагаднення, заключанага паміж Германіяй і РСФСР у жніўні 1918 г. Тэрыторыю Крупшчыны з восені 1918 г. сталі займаць часці Чырвонай Арміі. 21 лістапада немцы без бою пакінулі Крупкі. Вось што ўспамінала аб гэтых падзеях жыхарка г. Крупкі Ю.Ф.Каралькова: «У 1918 г. ў Крупках былі немцы. Камендантам горада быў немец Гаверман. Яго штаб знаходзіўся ў былым панскім доме, а я там працавала пакаёўкай. Памятаю, калі прыйшло паведамленне аб вывадзе нямецкіх войск, у дом пана прыйшоў старшыня местачковага Савета Абмейка і сказаў нам: «Чаго чакаеце, спорвайце пагоны ў Гавемана». Мы так і зрабілі». Насельніцтва ў цэлым прыязна сустрэла вызваленне ад германскіх часцей. Характэрнай, у духу таго часу, бачыцца ў сувязі з гэтым рэзалюцыя сходу сялян в. Шырневічы (каля мяст. Крупкі). У ёй адлюстраваны добразычлівыя адносіны да чырвонаармейцаў. Сход накіраваў сваё прывітанне «адзінаму абаронцу сялян-батракоў — Савету рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў». Але былі і іншыя выпадкі. Амаль адначасова з выступленнем супраць немцаў у жніўні 1918 г. эсэры спрабавалі падняць паўстанне ў Сенненскім павеце супраць Савецкай улады. На яго падаўленне быў пасланы атрад на чале з В.П.Даубе.

Адміністрацыйна-дзяржаўныя пераўтварэнні. Пасля ўтварэння 1 студзеня 1919 г. Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) Крупкі ўвайшлі ў яе склад. Але хутка пачалося наступленне польскіх войск.

Лінія фронта падышла да Барысава, і Крупшчына зноў апынулася ў зоне баявых дзеянняў. Дзейнасць ССРБ была фактычна прыпынена. Тым не менш пачалі фарміравацца новыя органы ўлады. У кастрычніку 1919 г. быў створаны Барысаўскі павятовы рэўком, у лістападзе — Сенненскі. Старшынёй Барысаўскага рэўкома выбраны Хадасевіч, але ў сярэдзіне 1920 г. ён быў вызвалены ад займаемай пасады і на яго месца прызначаны загадчык аддзела рэўкомаў 16-й арміі П.Ф.Равінскі. На тэрыторыі павета вяліся ваенныя дзеянні, і таму ўся паўната ўлады, у тым ліку і грамадзянскай, была сканцэнтравана ў руках ваенных. Старшынёй Сенненскага выканкома працаваў у той час ураджэнец в. Малінаўка Крупскага раёна, будучы нарком земляробства Беларусі Д.Ф.Прышчэпаў. Паколькі ў Барысаве ішлі баі, а заходняя частка павета была занята польскімі войскамі, Барысаўскі павятовы рэўком значны час знаходзіўся і дзейнічаў у мяст. Крупкі. Калі ж улічыць і тыя абставіны, што кіраваў ён неакупіраванай ўсходняй часткай павета, якая зараз уваходзіць у Крупскі раён, то атрымліваецца, што, нягледзячы на назву, гэта быў фактычна Крупскі павятовы рэўком.

На месцах пачалі фарміравацца валасныя рэўкомы і сельсаветы. У вёсках рэўкомы складаліся з 3 чалавек: загадчыка, намесніка і члена. Акрамя таго, у штаты ўваходзілі 2 загадчыкі аддзелаў: зямельнага і народнай асветы. Пры валасных рэўкомах ствараліся камісіі па працы, па аказанню дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў, па барацьбе з дэзерцірамі. Адзін з членаў валрэўкома адначасова выконваў функцыі валаснога ваеннага камісара, адзін з загадчыкаў аддзелаў — абавязкі загадчыка аддзела запісаў актаў грамадзянскага стану. Сельскія саветы выбіраліся з разліку 1 дэлегат на 100 чалавек. З ліку дэлегатаў вызначаўся прэзідыум з 2 штатных работнікаў. На месцах пачалі стварацца партыйныя і камсамольскія ячэйкі. Адбылася 1-я Сенненская павятовая канферэнцыя РКП(б) (1—3.3.1919 г.), сфарміраваны павятовы камітэт, пачала выдавацца газета «Факел».

У сярэдзіне 1920 г., калі Беларусь была вызвалена ад акупантаў, зноў паўстала пытанне аб беларускай дзяржаўнасці. 31 ліпеня 1920 г. у Мінску на сумесным сходзе прадстаўнікоў савецкіх і партыйных органаў і грамадскасці была прынята «Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь». Усходняя мяжа была вызначана згодна з межамі былой Мінскай губерні, але не ўсюды. У прыватнасці, дзяржаўная граніца прайшла пасярэдзіне сучаснай тэрыторыі Крупскага раёна. На баку ССРБ засталіся Халопеніч і заходняя частка раёна. Крупкі і ўсходняя частка аказаліся ў складзе Расійскай Федэрацыі. Такое палажэнне існавала да канца 1920 г., пакуль ва ўрад ССРБ не паступіла заява з боку Крупскай воласці аб жаданні далучыцца да Беларусі. Такое ж жаданне было выказана і 7 студзеня 1920 г. ў хадайніцтве валаснога павета Бобрскай воласці. Супраць выступіў Сенненскі выканком, які матываваў свой пратэст тым, што Бобр — адзін з буйнейшых фабрычна-заводскіх цэнтраў павета. Было вырашана Бобрскую воласць уключыць у склад Беларусі, але абсталяванне некаторых майстэрань Бобра пры неабходнасці вывезці ў іншыя воласці Віцебскай губерні РСФСР. Такім чынам, да 1924 г., да першага ўзбуйнення БССР, юрыдычна мяжа паміж РСФСР і Беларуссю праходзіла па мяжы Крупскага раёна. У Абчузе, Бабры, Ухвале стаялі пагранічныя часці, дзейнічалі распараджэнні ваеннага каменданта.

Пасля спынення ваенных дзеянняў узброеная барацьба на тэрыторыі Беларусі заціхла не адразу. У лясах хаваліся ўзброеныя групы, якія часта нападалі на сельскіх актывістаў, кааператывы. Сярод іх былі і палітычныя ворагі Савецкай улады, і проста дэзерціры, бандыты, якія займаліся больш рабаўніцтвам. Да першых можна аднесці ўзброены атрад былога афіцэра царскай арміі Моніча, які дзейнічаў у 1920—24 гады. Яны спынялі пасажырскія паязды, аказвалі супраціўленне органам Савецкай улады. У 1924 г. гэта група была ліквідавана, 7 чалавек арыштаваны, частка збегла за мяжу. У адрозненне ад першай банда Курты насіла ярка выражаны крымінальны характар. У яе склад увайшлі 6 жыхароў з вёсак Пярэсіка, Кругліца. Бандыты займаліся рабаўніцтвам пераважна на тэрыторыі Крупскага, Ігрушкаўскага, Узнацкага сельсаветаў. Ліквідавана банда ў 1924 г. На тэрыторыі раёна дзейнічала таксама банда Грабянцова, якая складалася з 15 чалавек, выхадцаў з в. Каралёва, Усцінаўка, Ігрушка; каля Халопеніч дзейнічала банда Букаткіна.

У канцы 1919 — пачатку 1920 гг. у Красналуцкай, Халопеніцкай і Валасевіцкай валасцях існавала банда Семенюка колькасцю да 130 чалавек. Для барацьбы з імі, акрамя ўмацавання павятовых надзвычайных камісій у валасцях пагранічнай паласы, былі створа-

ны асобыя раённыя аддзелы і атрады міліцыі. Камандаванне войскамі ўнутранай службы Заходняй акругі выдзеліла з 50-й брыгады атрад і накіравала яго ў Барысаўскі павет, атрад з 352-й брыгады — у Сенненскі. Дапамогу аказвалі і вайсковыя часці. Калі, напрыклад, у снежні 1919 г. абвастрылася абстаноўка ў Халопеніцкай воласці, туды выступілі падраздзяленні 17-й стралковай дывізіі.

З ліку партыйнага і савецкага актыву ствараліся атрады самаабароны. Для барацьбы з бандытамі прыцягвалася мясцовае насельніцтва. Так, у Халопеніцкай воласці для прадухілення бандыцкіх налётаў сяляне ў начны час выстаўлялі па вёсках варту. Пры Халопеніцкім выканкоме быў арганізаваны і дзейнічаў конны атрад добраахвотнікаў, створаны з мясцовых жыхароў. Барацьба працягвалася да сярэдзіны 1920-х гадоў. Для барацьбы з бандытызмам на тэрыторыі Барысаўскай акругі, куды ўваходзіла і тэрыторыя сучаснага раёна, з ліку партыйнага і савецкага актыву быў сфарміраваны полк. Кіравала ім камісія па баявым яднанні камунараў, створаная пры акружкоме партыі. Такія камісіі, дарэчы, былі створаны і пры іншых акружкомах і губкомах рэспублікі. На месцах фарміраваліся роты, на Крупшчыне, напрыклад, дзейнічалі 8-я і 9-я роты 3-га батальёна. Роты дзяліліся на ўзводы, у кожным па 50—60 чалавек. Гэтыя меры садзейнічалі паступовай нармалізацыі абстаноўкі ў раёнах і ў цэлым па рэспубліцы.

Пасля ўваходжання ў 1922 г. Беларусі ў склад СССР стварыліся новыя ўмовы ў міждзяржаўных адносінах паміж БССР і РСФСР. Гэта дазволіла правесці ў 1924 г. ўзбуйненне рэспублікі. Да Беларусі адышлі шэраг раёнаў Віцебшчыны і Магілёўшчыны. Улічваючы, што Заходняя Беларусь у гэты час уваходзіла ў склад Польшчы, Крупшчына такім чынам апынулася ў цэнтры рэспублікі. Адначасова з узбуйненнем Беларусі была праведзена адміністрацыйная рэформа. Згодна з рашэннем 2-й сесіі ЦВК БССР 6-га склікання ад 17 ліпеня 1924 г. «Аб адміністрацыйна-гаспадарчым падзеле БССР» былі створаны раёны і акругі. 17 ліпеня 1924 г. былі створаны Халопеніцкі і Крупскі раёны, якія ўвайшлі ў склад Барысаўскай акругі. Частка вёсак адышла да Аршанскай акругі.

Крупскі раён Барысаўскай акругі складаўся з 11 сельсаветаў і 174 населеных пунктаў, ён ахопліваў толькі ўсходнюю частку сучаснай яго тэрыторыі. Паўночная яго частка (66 вёсак) адышла да Чарэйскага раёна. З іх ліку былі створаны 5 сельсаветаў; яшчэ 5 сельсаветаў, якія складаліся з 48 вёсак, адышлі да Халопеніцкага раёна Барысаўскай акругі. 9 чэрвеня 1927 г. Крупскі і Халопеніцкі раёны былі далучаны да Мінскай акругі, Чарэйскі застаўся ў Аршанскай, 16 чэрвеня Крупскі раён адышоў да Аршанскай акругі, праз некаторы час Халопеніцкі раён — да Барысаўскай акругі. У 1931—35 гг. частка Халопеніцкага раёна была ў Крупскім раёне, затым зноў створаны Халопеніцкі раён. Такое становішча праіснавала да чарговай рэформы, калі 15 студзеня 1938 г. замест акруг былі створаны вобласці. Тады ж было праведзена і ўзбуйненне раёнаў, у выніку чаго частка вёсак адышла да Крупскага раёна.

Дз.М.Хромчанка.

Пачатак нямецкай акупацыі

24 лютага на станцыі Крупкі сабралася каля дзесяці розных саставаў з чырвонагвардзейскімі атрадамі. Неўзабаве з заходняга боку ў Крупкі прыбыла ў чатырох цяплушках каманда падрыўнікоў. Яны расказалі, што выконвалі спецыяльнае заданне галоўнакамандуючага Заходнім фронтам таварыша Мяснікова — у Барысаве ўзарвалі чыгуначны мост цераз Бярэзіну, а на станцыі Прыяміна падпалілі артсклад з рэшткамі боепрыпасаў, якія не паспелі вывезці ў глыб рэспублікі.

Вырашылі звязацца са Смаленскам, куды ўжо з Мінска перабраўся штаб Заходняга фронту... Праз паўгадзіны дробна застукаў тэлеграфны апарат. Смаленск даваў указанне: пакуль немцы заняты наладжваннем маста цераз Бярэзіну, сабраць сілы рэвалюцыі ў кулак і нанесці па ворагу знішчальны ўдар.

На ціхай лясной станцыі пачаліся мітынгі, нарады. Большасць прамоўцаў рашуча заяўляла, што не можа быць гаворкі пра адраджэнне старой арміі, але выказваліся за аб'яднанне аўтаномных атрадаў у чырвоныя палкі. Пасля гарачых спрэчак і перагавораў у адзін з такіх палкоў рашылі зліцца чырвоная дружына аршанскіх чыгуначнікаў, якой камандаваў матрос Павел Гуроўскі, каменданцкі ўзвод Гарбачова з той жа Оршы і піцерскі чырвонагвардзейскі атрад Захарэвіча. Палку прысвоілі імя Сусветнай Рэвалюцыі. Акрамя іхняга было створана яшчэ два палкі.

Не больш як праз паўгадзіны ўсе тры палкі занялі пазіцыі ўздоўж чыгуначнага палатна на бліжніх подступах да станцыі. Пад вечар узрывы заціхлі, і неўзабаве з захаду, з-пад Прыяміна, паказаліся клубы дыму над

паравознымі трубамі, а затым і самі браніраваныя паравозы. Іх было два. Яны паўзлі паціху і бок у бок адначасова па абедзвюх каляінах. Услед за бронепаяздамі цягнуліся эшалоны з цяплушкамі і класнымі вагонамі. Немцы наступалі па ўсіх нямецкіх правілах.

Але вось браняпоезды ізноў спыніліся: пуці перад імі былі разабраны, рэйкі скінуты пад адхон...

Захарэвіч ляжаў тады са сваімі піцерцамі ў гушчары і бачыў, як нямецкія салдаты пужліва азіраюцца на бакі. Ён цярпліва чакаў. І калі немцы аддзяліліся ад сваіх саставаў, рассыпаліся на пашкоджаным участку пуці і прыняліся ўсцягваць рэйкі на насып, з ельніку, з-за пнёў і ствалоў дрэў грымнулі вінтовачныя залпы, затахкалі кулямёты ўсіх трох палкоў.

Немцы кінуліся назад, да вагонаў. Самыя кемлівыя і спрактыкаваныя рынуліся з насыпу ў кюветы і ўзнялі галовы толькі тады, калі абодва браняпоезды адкрылі агонь са сваіх гармат. Лес уздоўж чыгункі яны літаральна выкошвалі. Білі па ім, пакуль не звечарэла. Нямала скасілі і чырвоных байцоў. Прыбраўшы параненых, усе тры палкі пагрузіліся ў эшалоны, якія чакалі на станцыі ў Крупках і адышлі ноччу на ўсход.

Хоць і ненадоўга — усяго на суткі, але прасоўванне праціўніка ў глыб Савецкай рэспублікі было прыпынена.

Друкуецца па кн.: Хацкевіч Р. Хмара над лесам. Мн., 1980. С. 8—9.

Устанаўленне Савецкай улады: па старонках перыядычнага друку

Газетная справаздача аб I з'ездзе Саветаў Магілёўскай губерні

18 снежня 1917 г.

З выступлення старшыні Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў мястэчка Крупкі на 1-м з'ездзе Саветаў Магілёўскай губерні.

«Мы сустрэлі на шляху многа перашкод, але мала-памалу пераадолелі іх. На першым плане мы паставілі адну з сваіх задач — барацьбу са спекуляцыяй, прыняўшай было ў нас грамаднейшыя памеры, прычым вывозілі хлеб, цэлыя запасы спірта і іншыя рэчы. І зараз мы дасягнулі таго, што вось ужо 3 месяцы як насельніцтва нашага мястэчка не ведае харчовых ужасаў. Што датычыцца затым нашага гарнізона, то ён раскалоўся: частка прымкнула да партыі эсэраў, частка да бальшавікоў, і сутычкі паміж імі — з'ява частая. Неабходны для работы ў нашым раёне агітатары, і я вельмі прашу аб гэтым Магілёўскі Савет. Ёсць яшчэ адно зло, якое ляжыць на шляху нашай работы і тармозіць яе. Гэта — польскія легіёны... Яны не ставяць нас ў грош, і нядаўна, калі мы засядалі ў адным памешчыцкім доме, прыйшло ад іх распараджэнне нават «ачысціць нямедля памяшканне пад пагрозаю разгона».

Революционная ставка. 1917. 21 декабря.

Аб сходцы сялян у в. Шырневічы Сенненскага павета Магілёўскай губерні

Нам паведамляюць аб сходах сялян, якія адбыліся ў апошні час у в. Шырневічы Сенненскага павета Магілёўскай губерні і в. Вялікія Негнавічы Барысаўскага павета Мінскай губерні. На гэтых сходах пасля дакладаў аб сучасным моманце прыняты аднагалосна рэзалюцыі, у якіх выражаецца радаснае пачуццё пры сустрэчы першых з'явіўшыхся пасля ачышчэння ад немцаў нашай Радзімы абаронцаў Савецкай Расіі і просьба перадаць Савету народных камісараў, што мы, сялянебеднякі вышэйадзначанай вёскі, сабраўшыся для выбару першага камітэта беднаты на сходку, шлём прывітанне адзінаму абаронцу сялян-батракоў — Савету рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і выражаем цвёрдую надзею, што сацыялістычная рэвалюцыя хутка пераможа на ўсіх франтах сусветнага капіталізма.

Известия Витебского губернского Совета... 1918 г. 10 декабря.

З пратакола пасяджэння Сенненскай павятовай канферэнцыі РКП(б)

1—3 сакавіка 1924 г.

Лісічанская воласць. Ячэйка арганізавана 23 снежня. Склад з 15 чалавек. Непатрэбныя элементы выкінуты. Старшыня выканкома — кулак і злоўжывае сваім званнем. Ячэйка ўзялася за кантроль. У выканкоме адсутнічаюць канцылярскія работнікі. Раскладка надзвычайнага падатку зроблена няправільна. Ды яго яшчэ ніхто не ўнёс. Ячэйка ўжо звяртала ўвагу павятовага парткамісара на Лісічанскую воласць, як самую закінутую. Культасветніцкая работа адсутнічае, вучыцельства сабаціруе. З ячэйкі выключаны старшыня вы-

канкома — кулак, ваенны камісар — карыстałюбівы і разбэшчаны чалавек, школьная работніца — дачка памешчыка.

Факел. 1919. 7 марта.

Обязательное постановление по Сенненскому уезду

Ввиду замеченных со стороны деревенских кулацких элементов сокрытий продовольственных продуктов, хлеба и фуража, а также отказов в даче подвод для перевозки продуктов, что лишает возможности производить заготовку продуктов для населения и Красной Армии, предупреждается, что в случае обнаружения таких преступных и явно контрреволюционных явлений виновные будут предаваться суду Военно-революционного трибунала по законам военного времени, а скрытые излишки будут конфисковаться.

Предс. Сенненской уездной особой продовольственной комиссии по снабжению Красной Армии Рубин.

Предс. Сенненского исполкома Д.Прищепов.

Уездный комиссар продовольствия Мурашевич. *Факел. 1919. 4 мая.*

Сообщение о действиях партизан в Борисовском и Игуменском уездах

5 июня 1920 г.

Красноармеец 32-го органа 16-й армии сообщает: «Около ст. Жодино Борисовского уезда крестьяне-партизаны взорвали 2 эшелона с боеприпасами. Вся местность на правом берегу Березины горит в огне крестьянских восстаний.

Перебежчик из Игуменского уезда передает, что поляками объявлена мобилизация за 6 лет. Польские жандармы уводят мобилизованных силой, но скоро отпускают».

Известия ВЦИК. 1920. 8 июня.

Вести из уезда

8 августа 1920 г. состоялось собрание представителей всех деревень волости, на котором присутствовало около 200 крестьян. Принята следующая резолюция.

«Мы, граждане Холопеницкой волости, собравшись на митинге 8 августа и заслушав доклад т. Мохова о сущности Советской власти и её строительстве, постановили: напрячь все силы к тому, чтобы оказывать Советской власти всемерное содействие в её борьбе с буржуем, помещиком и кулаком, напрячь все силы по всеместному осуществлению и закреплению Советской власти как единственной защитницы рабочих и крестьян».

Рабоче-крестьянский путь. 1920. 25 августа.

По уезду

18 ноября состоялось общее собрание представителей Осовской волости. После речей тт. Каропус и Корпуш о текущем моменте собрание вынесло резолюцию, в которой указывается, что момент требует найвысшего напряжения энергии и сил для укрепления завоеваний пролетарской Республики. Резолюция призывает к борьбе с разгильдяйством и к напряженному труду и заканчивается словами: да здравствует напряженный труд землеробов! Да здравствует III Коммунистический Интернационал!

Бедняк. 1920. 1 декабря.

Вот вам всем пример

Учащаяся молодежь села Осово Лошницкой волости прислала ходоков в Лошницкую организацию КСМ с просьбой помочь им организоваться. Долгое время не получая никакого ответа, осовцы сами организовали нечто вроде Коммунистического Союза Молодёжи, но школьный учитель (по-видимому беспартийный) запретил им собираться в школе. Они, невзирая на запрет, продолжают и по сию пору тайком собираться в школе.

Бедняк. 1920. 11 декабря.

Дневник Союза

В д. Осово крестьянская молодёжь, втянутая в союзную работу, довольно ревностно и энергично принялась за дело, но некоторые «граждане» д. Осово всячески насмехаются над комсомольцами и даже угрожают разорить их клуб.

Возмущённая подобным поведением своих старших, осовская молодёжь вынесла резолюцию: «Несмотря ни на какие преграды, продолжать свою работу для достижения намеченных идеалов».

Осовский волком

Бедняк. 1921. 1 января.

Крестьяне проснулись

В д. Хотюхово Холопеничской волости и Богранове Краснолукской волости организовали ячейки коммунистической партии. Крестьяне проявляют большой интерес ко всем вопросам текущего момента и хотят широко поставить работу ячеек.

Бедняк. 1921. 16 апреля.

Сами организовались

В д. Ухвала молодёжь сама организовала ячейку нашего Союза. Для инструктажа этой ячейки и постановки её на должную высоту выехал ответственный руководитель по работе в деревне тов. Лавренович.

Бедняк. 1921. 13 мая.

Митинг-спектакль

15 мая Хатюховским культпросветом был поставлен под открытым небом в саду имения митинг-спектакль. На митинге были сделаны членами местной ячейки КПБ доклады: «КСМ и его задачи», «О политической жизни». Присутствовало 200 человек с окрестных деревень. В общем впечатление от местного культпросвета и театра остается самое лучшее. Все играющие были крестьяне. Артисты и публика чувствовали себя одной большой семьей, жаль, что театр беден, недостает грима, париков, декораций.

Звезда. 1921. 31 мая.

Голос крестьян

На перевыборах Грицковического Совета была вынесена резолюция, составленная под руководством самого населения и ярко выразившая отношение деревенского пролетариата к советскому строительству. «Мы, крестьяне Грицковичей, собравшись на перевыборы сельсовета в момент, когда Советская республика, находясь на мирном положении, углубляет завоевания революции путём восстановления хозяйства, разрушенного долголетней войной, своими мозолистыми руками работая на ниве труда, приложим все усилия к обеспечению страны продовольствием. Единственное дело настоящего момента — бандитизм, отражающийся на внутреннем строительстве, мы будем всеми силами искоренять, оказывая властям самое широкое содействие в уничтожении этого бедствия. Да здравствует объединенный пролетариат деревни и города.

Звезда. 1921. 29 июня.

Работа бандитов

23 сего июня в д. Игрище Зачистской волости в 7 часов вечера к гражданину лесному объездчику Сорочинскому явились три вооруженных человека и назвав себя красноармейцами потребовали выдачи бандитов, которых он якобы скрывает. Когда получили отрицательный ответ, они с грубыми ругательствами потащили несчастного старика Сорочинского в квартиру и потребовали деньги, начали наносить старику палочные удары, затем оставили его в покое и начали собирать его имущество. В это время из леса прибыло еще 4—5 человек и несчастный старик, еле живой и ограбленный, был заперт в амбар.

Бедняк, 1921 июль.

Съезд сельсовета

(Ухвальская волость)

Состоялся волостной съезд председателей сельских Советов Ухвальской волости, где обсуждались вопросы о продналоге, о бандитизме и проч. По продналогу волинспектором Сыркиным был сделан обстоятельный доклад. Председатели отнеслись к его объяснениям весьма сочувственно, находя продналог лучше государственной разверстки. Принята резолюция о принятии всех мер к успешному проведению продналогов. По вопросу о бандитизме принята резолюция, в которой население в лице председателей обещает принять все меры к борьбе с бандитами и дезертирами.

Бедняк. 1921. 1 сентября.

У мястэчку Крупкі на агульным сходзе рабочых і служачых Крупскай дзяржаўнай фабрыкі «Саломка» імя Халтурына 25 мая 1924 г. пастаноўлена ўзбудзіць хадайніцтва аб перанясенні цэнтра раёна з мястэчка Бобр у м. Крупкі, як больш прамысловы вытворчы цэнтр. Мястэчка Крупкі мае перавагу ў адносінах чыгуначных зносін, бо знаходзіцца за паўвярсты ад чыгуначнай дарогі і ў 4-х вярстах ад станцыі Крупкі. У мястэчку Крупкі акрамя фабрык маюцца і іншыя прамысловыя прадпрыемствы: ганчарна-пасудны і смалакурны заводы, вадзяны млын. Насельніцтва мястэчка ў большасці складаецца з рабочых, сялян, кустароў і нязначнай часткі дробных гандляроў. У мястэчку дзейнічае каапэрацыя.

Звезда. 1924. 17 января.

Матэрыялы перыядычнага друку падрыхтаваў Дз.М.Хромчанка

Дакументы сведчаць

З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ РАДЫЁГРАМЫ РЭЎВАЕНСАВЕТА РЭСПУБЛІКІ МЯСЦОВЫМ САВЕТАМ АБ ВЫСТУПЛЕННЯХ СЯЛЯН СЕННЕНСКАГА ПАВЕТА СУПРАЦЬ ГЕРМАНСКІХ ЗАХОПНІКАЎ

21 жніўня 1918 г.

Из Смоленска сообщают, что в оккупированной части Сенненского уезда и дальше на запад крестьянское восстание всё разрастается. Происходят бои с участием артиллерии. За демаркационной линией видно зарево горящих деревень. Беженцы отмечают ожесточение крес-

тьян и большие потери германцев. «Революционная зараза» распространяется и среди немецких солдат. Смена частей всё учащается. Тюрьмы наполняются крестьянами и рабочими, но уже через несколько дней отравленные «русской заразой» солдаты выходят из повиновения и освобождают арестованных.

Постоянно повторяющиеся вспышки крестьян подавляются с трудом.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 56, воп. 1, л. 17.

ПАГАДНЕННЕ РУСКА-ГЕРМАНСКАЙ КАМІСІІ АБ ПАРАДКУ ВЫВАДУ ГЕРМАНСКІХ ВОЙСК З ТЭРЫТОРЫІ ЛЕПЕЛЬСКАГА І СЕННЕНСКАГА ПАВЕТАЎ

12 верасня 1918 г.

12 сентября 1918 г. в г. Орша. Русско-германская комиссия, созванная вследствие предположения германского командования в Минске о передаче оккупированных германскими войсками частей Лепельского и Сенненского уезда постановила: германские войска очищают Сенненский уезд, за исключением Обчугской и Бобрской волостей. Новая демаркационная линия вполне совпадает с северной границей Оршанского уезда от нынешней демаркационной линии у Сержца (русская) к западу, с северной границей Обчугской и Бобрской волостей и с восточной границей Борисовского уезда 7 км северо-восточнее Ушачи и южной границей Полоцкого уезда. Отход войск производится по участкам в период времени с 20 сентября по 22 сентября с.г. Передовые части русских войск достигают 22-го Черею—Лисичино—Лукомль—Лепель.

С.Каменев, Г.Марголин, Д.Пржеволоцкий, Берсон, Шредер, Сервес, Поллемс, Кром.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 56, воп. 1, спр. 6, л. 511.

З ТЭЛЕГРАМЫ ШТАБА ВАЕНСАВЕТА СМАЛЕНСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАМУ ГУБЕРНСКАМУ ВЫКАНКОМУ

29 верасня 1918 г.

Наши части войск, продолжая выполнять приказ о занятии Лепельского и Сенненского уездов, очищаемых немцами, к вечеру 28 сентября заняли линию: д. Завичелье — м. Пышно — м. Лукомль — Лисичино — м. Черея.

и.д. начштаба военсовета Баранов

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 56, воп. 1, спр. 17, л. 233.

З ЗАГАДА ВОЙСКАМ ЗАХОДНЯЙ АРМІІ АБ ЗАНЯЦЦІ ТЭРЫТОРЫІ НА ЎСХОД р. БЕРАЗІНА

Смаленск **22 лістапада 1918 г.**

Германское командование сообщало, 22 ноября немецкие войска приступают к очищению местностей восточнее р. Березины, согласно следующему: 22 ноября в 12 ч. по немецкому времени будет очищена местность восточнее линии течение р. Берента-Эсса — дер. Латыголичи Лупски, Михеевка—Кошюки, течение р. Нача — д. Нача—Выдрица—Узнаж—Гумны, Михеевичи—Рудня.

Начдиву 17-й стрелковой дивизии немедленно отдать соответствующий приказ о занятии освобождаемой немцами территории.

Командарм Слесарев

Член Реввоенсовета Алигбеков

Начштармэаг Новиков

Друкуецца па кн.: Борьба за Советскую власть в Белоруссии: Сборник документов. Мн., 1968. Т. 1. С. 321—322.

З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА АПЕРАТЫЎНАГА ЎПРАЎЛЕННЯ ЗАХОДНЯЙ АРМІІ А.Н. ДЭ ЛАЗАРЫ Ў ПАЛЯВЫ ШТАБ РЭЎВАЕНСАВЕТА РЭСПУБЛІКІ АБ ЗАНЯЦЦІ ЧАСЦЯМІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ г. ПОЛАЦКА, ЖЛОБІНА І м. КРУПКІ

Смаленск **23 лістапада 1918 г.**

Немцы очистили Полоцк, который в 13 ч. 20 м. и 20 ноября заняли 146-й стрелковый полк, совместно с частями 4-го района пограничной охраны. Того же числа немцы оставили Крупки и уходят к Борисову.

Нач оперупра де Лазара.

Друкуецца па кн.: Борьба за Советскую власть в Белоруссии: Сборник документов. Мн., 1968. Т. 1. С. 321.

АДНОСІНЫ ЎПАЎНАВАЖАНАГА ПА БАРЫСАЎСКАМУ ПАВЕТУ НАРОДНАМУ КАМІСАРЫЯТУ ХАРЧАВАННЯ ССР Л І Б АБ АКАЗАННІ ДАПАМОГІ ГАЛАДАЮЧАМУ НАСЕЛЬНІЦТВУ УХВАЛЬСКАЙ І ДЗМІТРЫЕЎСКАЙ ВОЛАСЦІ

1 ліпеня 1919 г.

У адказ на адносіны арганізацыйнага аддзела ад 25 чэрвеня аб няшчасным становішчы жыхароў Ухвальскай і Дзмітрыеўскай воласці, дзе голад і цынга прынялі страшэнныя памеры, — паведамляю — што намі пасланы туды для абследавання і ўрэгулявання харчовага пытання супрацоўнік Барысаўскага упрадкама тав. Кошкін, каторы выявіў наступнае. Голад і суправаджаючая яго эпідэмія ўсё больш і больш павялічваюцца, і насельніцтва ўжо даўно спажывае ў яду лісце, кару і карані. Кулакоў, аб якіх упамінаецца ў вашых адносінах, у воласці няма, так што аб спагнанні лішкаў не можа быць і мовы. Патрэбна дапамога знадворку, такую можа аказаць ляжачы побач Ігуменскі павет, дзе дзякуючы вялікай колькасці хутароў, становішча значна лепшае. Калі можна будзе кое-што уварваць з цэнтра для вызначаных двух валасцей — гэта будзе, канечне, шчасце для няшчасных хворых сялян, якія даўно не бачылі куска хлеба.

Да ведама паведамляю: колькасць жыхароў ва Ухвальскай воласці 7208 чалавек, у Дзмітрыеўскай воласці — 5900 чалавек. З іх больш палавіны маюць патрэбу ў безадкладнай дапамозе, астатнія як бы прабіваюцца рознымі сурагатамі.

За асобаўпаўнаважанага наркамхарчу Літбела А.Разэнталь, камісар харчавання Аўсеевіч

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 806, воп. 1, спр. 8, л. 65.

ДАКЛАД АБ РАБОЦЕ ЎХВАЛЬСКАГА РЭЎКОМА

28 мая 1920 г.

З 26.12.1919 г. старшыня Георгій Афанасьевіч Вусік, знаёмы з савецкім будаўніцтвам, з'яўляецца прадстаўніком ад насельніцтва, прадстаўнік ад воінскай часці 153 стр. палка 17 стр. дывізіі назначан намеснікам старшыні — камуніст.

Праведзены 3 сходы ў 1920 годзе па эканамічных, харчовых пытаннях і арганізацыі кааператыва.

Валасная міліцыя мае на сваім узбраенні малую колькасць зброі. З-за адсутнічання насення пасяўная плошча крайне зменшылася, аб аказанні харчовай дапамогі паведамлялася ў павятовым і губернскім харчкамітэце. Бяднейшаму насельніцтву выдадзена па 100 рублёў на дарослых і 50 рублёў на дзяцей.

Школ у воласці адкрыта 15, навучаецца 560 чалавек.

Была маса самавольных парубак лесу пры знаходжанні воласці ў нейтральнай паласе. У сувязі з акупацыяй і ваеннымі дзеяннямі сельская гаспадарка ў заняпадзе.

Гужавая павіннасць праводзілася і праводзіцца добра, усе грамадзяне займаліся вывазкай лясных матэрыялаў і дроў да чыгункі, а ў апошні час перавозкай ваенных грузаў, харчавання да пазіцый. У кожнай вёсцы маецца сельсавет, які праводзіць у жыццё пастановы і загады Савецкай улады. Кустарная прамысловасць знаходзіцца ў вельмі смутным стане. Культурна-асветніцкая работа знаходзіцца ў пачатковым стане з прычыны прыфрантавога месцазнаходжання воласці. Культурна-асветніцкі гурток з прычыны налёта белых распушчаны. Быў пастаўлен 1 спектакль мясцовай моладзі. Была ўстаноўлена ёлка для дзяцей і праведзены вечар для дарослых. З прыходам воінскіх часцей становішча палепшылася. Бібліятэка была разгромлена белымі. Да працаўніка насельніцтва адносіцца з крайнім негадаваннем, вітае дзеянні Чырвонай Арміі. 21 мая быў назначаны мітынг у с. Ухвала.

Аргінструктар (подпіс)

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 1693, воп. 1, спр. 1, л. 5.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ АДМІНІСТРАЦЫЙНАЙ КАМІСІІ ПРЫ ЦВК ССРБ АД 10 КРАСАВІКА 1921 г.

Комиссия от 10 апреля 1921 г.

предс. т. Масен

Повестка дня:

1. Присоединение Бобрской волости Сенненского уезда Витебской губернии к Борисовскому уезду Минской губернии.

Слушали:

1. Тов. Масен оглашает материал по переходу Бобрской волости к Борисовскому уезду Минской губернии; состоит из следующих данных:

1. Выписка из протокола волостного съезда Бобрской волости от 7 декабря 1920 г., на котором все делегаты едино постановили: ходатайствовать о присоединении данной волости к Борисовскому уезду Минской губернии.

2. Выписка из протокола заседания Борисовского уисполкома от 10 января 1921 г., на котором постановлено возбудить ходатайство перед Совнаркомом Белоруссии о присоединении вышесозданной волости к Борисовскому уезду.

3. Прошение уполномоченной комиссии от Бобрского волостного съезда, на котором детально изложены все мотивы, по которым переход волости является во всех отношениях желательным и необходимым.

4. Отношение Наркомвнутдела ССРБ с просьбой высказать своё мнение по данному делу.

5. Отношение Сенненского исполкома, в котором указывается на нежелательность перехода ввиду того, что Бобрская волость является самым крупным фабрично-заводским центром Сенненского уезда.

Постановили:

1. Признавая мотивы уполномоченной комиссии вполне правильными, административная комиссия соглашается с переходом Бобрской волости к Борисовскому уезду Минской губернии.

2. В случае необходимости некоторые фабрично-заводские предприятия Бобрской волости оставить в пределах Витебской губернии путём переноса их на другую территорию Витебской губернии.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 34, воп. 1, с. 285, л. 20—24.

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА КРУПСКАГА РАЁННАГА ПРАКУРОРА КРУПСКАМУ РАЙВЫКАНКОМУ І РАЙКОМУ ПАРТЫІ

22 мая 1932 г.

Становішча настаўнікаў, працуючых па вёсках і не прымацаваных да калгасаў, надзвычайна цяжкае, асабліва ў сэнсе харчавання і вопраткі. Атрымліваемы паёк з кааперацыі 10 кг мукі і 400 гр. цукру ў месяц нельга лічыць забяспечваючым харчам настаўніка. Іншых прадуктаў настаўнікі не атрымліваюць, купіць няма дзе, а там, дзе ёсць, то надта вялікія грошы каштуе, таму настаўніку, які атрымлівае 74—85 руб. у месяц разлічваць на пакупку чаго-небудзь з рынку не прыходзіцца. Такім чынам, шэраг настаўнікаў харчуецца ў месяц 10 кг мукі і 400 гр. цукру, атрыманага ад сельпо і то гэта атрымліваецца ў канцы месяца, а не ў пачатку, і нават бываюць выпадкі, калі і гэты скудны паёк выдаецца нерэгулярна. Акрамя таго, шэраг настаўнікаў у Ухвальскім, Дубаўскім, Заборскім, Ігрушскім, Хацюхоўскім, Выдрыцкім і інш. с/с не маюць абутку і вопраткі. Шэраг школ як належыць не адрамантавана, не абсталявана ў Ухвальскім, Ст. Слабодскім с/с. Замест шкла на вокнах дошкі, фанера (Купленка, Захараўка, Ст. Слабада). Выплата зарплаты настаўнікам надта зацягваецца ў Бобрскім, Ухвальскім, Халопеніцкім і Крупскім с/с. Такое становішча ставіць пад яўную пагрозу пытанне аб адукацыі па Крупскаму раёну. Нездарма з шэрагу вёсак Ухвальскага і другіх с/с настаўнікі бягуць. Такое становішча надалей не можа быць цярпімым і патрабуе карэннага паляпшэння. Паведамляючы Вас аб гэтым, прашу зараз жа намеціць шэраг мерапрыемстваў па паляпшэнню снабжэння настаўнікаў харчаваннем, вопраткай і абуткам, патрабаваць ад РайАНА спісак настаўнікаў, не прымацаваных да калгасаў і прыняць меры да паляпшэння іх снабжэння. Абавязаць с/с і арганізацыі на месцах змяніць адносіны да настаўнікаў, чула адносіцца да іх законных патрабаванняў, ведая, што на іх ускладзена цяжкая задача і работа.

Аб выніках і прынятых мерах Вамі прашу паведаміць у дэкадны тэрмін.

Крупскі раённы пракурор

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 293, воп. 1, спр. 41, л. 12. 22.05.1932

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ПРЭЗІДЫУМА ЦВК САВЕТАЎ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ

г. Мінск **10 чэрвеня 1921 г.**

Председательствовал т. Червяков

Слушали: О присоединении Крупской волости Витебской губ. к Борисовскому уезду.

Постановили:
Предложить Наркомвнутделу оформить присоединение волости Чарвякоў

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 34, воп. 1, спр. 285, л. 18.

ЗАГАД

ПО ГОРНИЗОНУ м. ОБЧУГА, д. ЛЮТЫ, КИЕВЕЦ, ЛОГИ, ЖУРАВЫ, ДЕНЬГУБКА, ШАРНЕВА, СЛОБОДА

м. Обчуга № 1 **2 студзеня 1922 г.**

§1
Сего числа я вступил в исполнение обязанностей начальника гарнизона. За всеми справками обращаться в штаб 1-го Смокавполка.

§2
Приказываю: всем гражданам, имеющим приблудных лошадей, немедленно зарегистрировать таковых в Управлении Начгара (штаб 1-го Смокавполка м. Обчуга). Незнанием настоящего приказа никто отговариваться не может. За неисполнение такового виновные будут привлекаться к ответственности.

§3
Ввиду разных эпидемических заболеваний и в целях борьбы с таковыми, приказываю: всем гражданам имеющим бани привести таковые в самом непродолжительном времени в надлежащий порядок.

Наблюдение за сим возлагаю на Советы м. Обчуга и окрестных деревень, упомянутых выше, неисполнение настоящего приказа будет рассматриваться как умышленный тормоз в целях борьбы с эпидемией и виновные будут предаваться мною суду ревтрибунала.

§4
Мною уже замечено, что частями вверенного мне гарнизона часто производятся бесцельные выстрелы. Приказываю: командирам частей обратить самое серьёзное внимание на прекращение подобного явления.

Замеченные мною в стрельбе из винтовки немедленно будут арестованы и преданы суду ревтрибунала.

§5
Все нелегальные собрания и вечеринки без моего разрешения производить категорически запрещаю, за таковым разрешением обращаться ко мне в штаб 1-го Смоковполка в часы занятий.

Начальник гарнизона
Военком
(Комполка)
Адьютант:

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 2484, воп. 1, с. 1, л. 7.

ЗАГАД № 6 НАДЗВЫЧАЙНАЙ ТРОЙКІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ АДЗІНАГА НАТУРАЛЬНАГА ПАДАТКУ Ў СЕННЕНСКІМ ПАВЕЦЕ

12 сентября 1922 г.

1) На основании телеграммы Губпродкома и Губисполкома за №№ 251 и 2545 в связи с необходимостью снабжения заводов и удовлетворения потребностей Красной Армии, лечебных санитарных учреждений картофелем, 20-го сентября ОБЪЯВЛЯЕТСЯ окончательным сроком сдачи картофеля.

2) По отдельным волостям устанавливаются следующие предельные сроки сдачи:

а) Мошканская, Замочская, Ульяновичская, Ряснянская, Латыговская, Каковичинская, Пустынская к 3-му октября.

б) Черейская, Обчугская, Лисичинская, Лукомльская и Бобрская и В. Городецкая к 5-му октября.

в) Совхозы, Колхозы, Военхозы всех волостей обязаны весь причитающийся с них по налогу картофель сдать не позже 5-го октября.

3) Волпредтройкам предлагается установить для каждого селения волости отдельные сроки сдачи в пределах срока установленного для волости настоящим приказом.

4) На основании телеграфного распоряжения Губпродкома № 2456 установить следующие пункты сдачи для волостей:

а) Черейской, Обчугской, В. Городецкой и Замочской имение Оболь Пустынской волости (Винзавод).

б) Ульяновичской, Латыговской, Мошканской, Каковичинской, Пустынской и Ряснянской, также колхозов всех волостей в крахмальный завод Ходцы Латыговской волости.

в) Бобрской волости Заготконтора Бобр.

г) Лисичинской и Лукомльской волости в Заготконтору Сенно (имение Михалполье).

5) Указанные пункты сдачи картофеля основаны на телеграмме Губпродкома, изменению не подлежат и никакие хадатайства в этом отношении рассматриваться не будут.

6) Сдаваемый картофель должен быть вполне здоровым, сухим, не вялым, не промороженным, не захваченным мокрой гнилью, не мелким, если картофель не будет удовлетворять перечисленным требованиям, то таковой приниматься на пунктах не будет.

Примечание: В мокрую погоду плательщики обязаны сохранять привезенный на пункт картофель и в случае надобности укрывать его соломой и проч.

7) Волтройкам и райсоветам в случаях, когда с того или иного плательщика причитается незначительное количество картофеля предлагается обязывать плательщиков сдавать картофель коллективно в целях экономии подвод.

8) Вол и Райтройкам и сборщикам по отдельным деревням и селениям принять меры к сдаче картофеля в установленные сроки.

9) Всех уклоняющихся от сдачи, агитирующих против таковой, а равно проявляющих халатность или бездействие, в порядке приказа Губисполкома № 1 задерживать и направлять при актах в продком на предмет привлечения к ответственности в судебном или административном порядке.

Начальнику Уездной милиции вменяется в обязанность сделать распоряжение подведомственным ему органам об оказании содействия и представлении вооруженной силы в случае надобности — волтройкам, волпродинспекторам и ударным группам Упродкома.

Настоящий приказ проводится в боевом порядке под личной ответственностью предволисполкома, волпропинспектора и предрайсоветов и подлежит широкому распространению среди населения.

Председатель Чрезв. Тройки Предуисполкома — Звергздин,

Член Тройки Упродкомиссар — Носовский.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 176, воп. 1, спр. 13, л. 32.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.

Крупскі раён у даваенны час

Сельская гаспадарка. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны эканамічнае становішча насельніцтва было вельмі цяжкім. Гаспадарка прыйшла ў заняпад, жыццёвы ўзровень насельніцтва значна знізіўся, прычым асабліва відавочна гэта было ў эканамічна адсталых раёнах і ў тых, якія больш пацярпелі ад ваенных дзеянняў. Заробак селяніна Ухвальскай воласці, напрыклад, быў у паўтара раза ніжэйшым, чым у Ігуменскім павеце, 46% яго складаў прыбытак ад земляробства, 27% — ад падсобных промыслаў. З усяго прыбытку 87% ішло на спажыванне, 4% — на падатак і толькі 9% — на розныя расходы. Харчаванне складала не болей 1 пуда ўсіх прадуктаў земляробства на чалавека ў месяц. Ва Ухвальскай воласці пачаўся голад, насельніцтва ўжывала ў ежу розныя сурагаты (кару, карані, лісце).

З першых гадоў усталявання Савецкай улады на Крупшчыне пачаліся сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, перш за ўсё перазмеркаванне зямлі. Перадачы ў карыстанне сялянам падлягалі і дзяржаўныя землі. Згодна з інструкцыяй Сенненскага павятовага зямельнага аддзела «сялянскія надзельныя землі дробных гаспадароў часоваму размеркаванню не падлягалі і ніякія прэтэнзіі на такія землі не дапускаліся». Не пераразмяркоўваліся і т.зв. «культурныя гаспадаркі».

Частка былых панскіх маёнткаў з будынкамі, сельскагаспадарчымі прыладамі з'явілася базай для «савецкіх маёнткаў» і камун. У маі 1919 г. была створана камуна маёнтка Дудары Лісічанскай воласці, саўгас маёнтка Вялікія Хальнявічы Чарэйскай воласці, саўгас маёнтка Абчуга Абчугскай воласці, саўгас маёнтка Бобр, саўгас маёнтка Крупкі Бобрскай воласці. Але адначасова з надзяленнем сялян зямлёй пачала праводзіцца палітыка т.зв. «ваеннага камунізму». Незадавальненне сялян выклікала харчразвёрстка, згодна з якой

у час вайны рэквізіраваліся амаль усе запасы, на харчаванне заставалася толькі самае неабходнае, а часам і таго не пакідалі. З 1921 г. ў краіне пачала ажыццяўляцца новая эканамічная палітыка, згодна з якой харчразвёрстка была заменена натуральным падаткам, дапускалася нейкая самастойнасць для прамысловых прадпрыемстваў і нават у пэўных рамках прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці. У студзені 1921 г. СНК Беларусі прыняў дэкрэт «Аб свабодным выбары форм землекарыстання», згодна з якім сялянам дазвалялася займацца прыватнай гаспадаркай ці аб'ядноўвацца ў тую ці іншую форму кааперацыі. Таму ў першыя гады Савецкай улады часта ў вёсках адначасова існавалі адразу некалькі форм гаспадарання.

Напрыклад, у в. Нача дзейнічалі камуна «Зара свабоды», сельскагаспадарчая арцель і сельскагаспадарчае таварыства. Лепш за ўсё сялянскім інтарэсам адпавядалі таварыствы (па апрацоўцы глебы, машынныя, жывёлагадоўчыя і інш.). Але з самага пачатку новая эканамічная палітыка праводзілася супярэчліва. З аднаго боку, дапускаліся дэмакратызацыя эканомікі, таварна-грашовыя адносіны, самастойнасць гаспадарання, з другога — эканамічная рэформа праводзілася ва ўмовах станаўлення камандна-адміністрацыйнай сістэмы, кіраўніцтва гаспадарчым жыццём ажыццяўлялася жорсткімі адміністрацыйнымі метадамі. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, практыка стварэння надзвычайных троек па арганізацыі збору падатку, прымяненне рэпрэсіўных мер, аж да ўзброенай сілы, да тых, хто своечасова не здаваў яго. Прадаўжала навязвацца залішняя рэгламентацыя сельскагаспадарчых работ.

Вясной 1921 г. ва ўсіх вёсках раёна былі арганізаваны камітэты па сяўбе, з гэтага часу было ўведзена ў практыку правядзенне т.зв. тыдня чырвонага аратага. Нейкую карысць такія мерапрыемствы ўсё ж прыносілі. У Халопеніцкай воласці ў час «тыдня чырвонага аратага» сялянам была аказана дапамога ў ворыве, арганізаваны рамонт сельгасінвентару. Халопеніцкі выканком выдзеліў для бяднейшага сялянства 800 пудоў насення. У в. Ухвала ўсіх кавалёў накіравалі для работы ў кузнях, аплата працы вялася харчамі.

Паступова адноўлялася разбураная ў час войн гаспадарка. Да сярэдзіны 1920-х гадоў яна дасягнула даваеннага ўзроўню. Але трэба мець на ўвазе, што гэта быў узровень адсталай ускраіны Расійскай імперыі.

У 1906 г. на душу насельніцтва ў Сеннен-скім павеце прыпадала ў сярэднім па 0,56 дзесяціны ворыўнай зямлі. Але калі ўлічыць, што 43% зямлі належыла дваранам і купцам, якія складалі 2% насельніцтва, то на долю сялянства (77,8% насельніцтва) заставалася 48% зямлі, або ў сярэднім па 0,29 дзесяціны ворыўнай зямлі на чалавека. Да земляробаў у той час адносілі і памешчыкаў недваранскага саслоўя, якія валодалі значнымі зямельнымі надзеламі.

Пасля рэвалюцыі ўся зямля была раздадзена сялянам, за выключэннем асобных маёнткаў, на базе якіх былі створаны камуны або саўгасы. Да 1925 г. на душу насельніцтва ўжо прыходзілася ў сярэднім па 0,64 дзесяціны ворыўнай зямлі, гэта значыць больш чым удвая ў параўнанні з дарэвалюцыйным узроўнем. І тым не менш больш паловы сялянскіх гаспадарак адносілася да бядняцкіх. У сярэднім на адну сям'ю прыпадала 3,3 дзесяціны зямлі, што з улікам невысокай якасці глебы было недастаткова для пражыцця. Таму многія займаліся промысламі, у першую чаргу лесанарыхтоўкамі і сплавам лесу.

Магчымасць продажу зямлі, атрыманая ў выніку сталыпінскай рэформы і паслякастрычніцкага перадзелу, прывяла да значнага расслаення ў вёсцы. У часы нэпа павялічыліся плошчы пад ворывам, забяспечанасць рабочай жывёлай. Калі, напрыклад, у 1925 г. 1185 гаспадарак не мелі коней, то да 1929 г іх колькасць зменшылася да 797. З 746 да 922 павялічылася колькасць сялянскіх гаспадарак, якія мелі 2 кані, з 41 да 292 — 3 кані. Такое ж прыкладна становішча было і з каровамі. У той жа час рэзка (з 159 да 282) павялічылася колькасць беззямельных гаспадарак, 2892 (у 1925 г. 1722) мелі 1—3 дзесяціны зямлі. Да 1929 г. 733 гаспадаркі мелі 5—10 дзесяцін, 135 — 10—15 дзесяцін, 76 — 16 дзесяцін. Эфектыўнаму вядзенню гаспадаркі таксама перашкаджала цераспалосіца. Малазямелле, здрабненне гаспадарак, нізкая якасць глебы падштурхоўвалі сялян, асабліва беднату, да пошуку новых форм гаспадарання. 232 сям'і пачалі гаспадарыць на хутарах, 147 выдзеліліся на адрубы. Другая частка сялянства пайшла па шляху стварэння кааператыўных аб'яднанняў. Тым больш, што ўлады заахвочвалі такія формы землекарыстання. Ствараліся групы беднаты і праз іх праводзілася новая аграрная палітыка. У 1926 г. былі створаны 4 групы пры Ігрушкаўскім, Начскім, Бобрскім сельсаветах, у 1927 г. — пры Ухвальскім і Крупскім сельскагаспадарчых таварыствах, Бобрскім і Крупскім

таварыствах спажыўцоў, пры Бобрскім і Шэйскім сельсаветах — усяго 11 груп, 112 чалавек. У 1928 г. да іх далучыліся яшчэ 4. У 1926 г. было праведзена 98 сходаў беднаты, у 1927 г. — 240, у 1928 г. — 397. На іх разглядаліся, акрамя сельскагаспадарчых, пытанні перавыбараў мясцовых органаў улады, палітычнага становішча і інш. Аднак недахопамі ў іх правядзенні была недастатковая актыўнасць насельніцтва, дэкларатыўнасць і неканкрэтнасць прымаемых рашэнняў.

13.3.1928 г. была праведзена 1-я раённая канферэнцыя груп беднаты, на якой падведзены вынікі работы на працягу 2 гадоў. З удзелам галоўным чынам беднаты і часткова серадняком у 1926 г. было створана меліярацыйнае таварыства, 3 такіх аб'яднанні арганізаваліся ў 1927 г. Пачало работу садова-агародніцкае таварыства, члены якога ўзялі ў арэнду 2 сады плошчай 16 дзесяцін. Дзейнічалі 2 жывёлагадоўчыя таварыствы, 1 па вытворчасці вогнетрывалай цэглы. У 1928 г. створана таварыства на сумеснай апрацоўцы зямлі, машыннае, птушкагадоўчае, 3 меліярацыйныя, 2 пасялковыя, усяго 15 таварыстваў, у іх уваходзіла 313 гаспадарак. Меліся таксама 4 спажывецкія кааперацыі з 17 гандлёвымі аддзяленнямі. У 1926 г. 13 гаспадарак, пераважна яўрэйскіх, аб'ядналіся ў першыя калгасы — «Новае жыццё» каля Крупак (140 дзесяцін зямлі) і «Чырвоная ніва» каля Бабра (128 дзесяцін зямлі).

У 1928 г. была няўдалая спроба стварыць камуну і 2 арцелі ў в. Нача. Арцелі адразу ж вясною развaліліся, камуна спыніла існаванне некалькі пазней. Справа ў тым, што пры арганізацыі арцелей у іх статут быў уключаны наступны пункт: зямля пасля ліквідацыі арцелі не будзе аддадзена зноў былому гаспадару, а паступіць у дзяржаўны зямельны фонд. Сяляне з гэтым не пагадзіліся і выйшлі з арцеляў. У 1928 г. было створана 6 калгасаў, куды ўвайшлі 45 гаспадарак, большасць бядняцкіх. Часта ініцыятарамі стварэння калектыўных аб'яднанняў выступалі камуністы і камсамольцы, якіх у гэты час у раёне налічвалася 140 чалавек. Яны ўваходзілі ў 8 ячэек. Газета «Чырвоная змена» 16.3.1928 г. пісала: «У час вывучэння пастаноў 15 партз'езда па пытанні аб працы ў вёсцы Хацюхоўская і Траянаўская партыйная і камсамольская арганізацыі ўхвалілі прапанову аб арганізацыі сельскагаспадарчага калектыву. У Хацюхоўскую ячэйку пададзена 2 заявы. Усе ўступіўшыя ў калектыў аддаюць увесь свой сельскагаспадарчы інвентар, жывёлу і будынкі для агульнага карыстання. Беднякі мелі сваіх 27 дзесяцін зямлі, і ім яшчэ далі 40 дзесяцін. Крэдытная кааперацыя выдала пазыку ў памеры 2 тысячы рублёў. Больш заможныя гаспадары глядзяць на гэты пачын коса і прарочаць яму гібель, але калектывісты горача прыняліся за працу». Але першыя сельгасарцелі сутыкнуліся са значнымі цяжкасцямі з-за недахопаў у іх арганізацыі. Па-першае, яны былі вельмі невялікія, у сярэднім 5—6 двароў, слаба аснашчаны сельгаспрыладамі, не кажучы ўжо аб тэхніцы. Нярэдка для іх адводзіліся не лепшыя землі. Таму эфектыўнасць аб'яднанняў была невысокай. Гэта прызнаў і пленум Крупскага РК КП(б)Б у канцы 1927 г. Ён прапанаваў пераарыентаваць сельгасарцелі на жывёлагадоўчую спецыялізацыю.

Былі выпадкі, калі заможныя сяляне, каб выкарыстаць у сваіх мэтах падтрымку дзяржавы ў стварэнні новых форм кааперацыі, арганізоўвалі ўяўныя калгасы. Такія факты вядомы ў в. Ігрушка. Але ў цэлым сялянства раёна прытрымлівалася традыцыйных індывідуальных форм гаспадарання. У канцы 20-х гадоў нэп паступова пачаў згортвацца, уступіўшы месца камандна-адміністрацыйнаму спосабу кіраўніцтва. Гэта было выклікана знешнімі і ўнутранымі прычынамі. У гэты час абвастрыліся адносіны СССР з Англіяй, якія ледзь не прывялі да разрыву дыпламатычных адносін і пачатку ваеннага канфлікта. Ваенная пагроза падштурхнула ўлады да больш жорсткіх мер. Да таго ж яны не здолелі ў поўнай меры ажыццяўляць кіраўніцтва гаспадарчым комплексам у гады нэпа эканамічнымі метадамі, ды і сама гэтая палітыка, акрамя дадатных, мела і адмоўныя бакі. Пачалося расслаенне насельніцтва на багатых і бедных, пачасціліся эканамічныя крызісы, вырасла беспрацоўе. Становішча абвастрылі і 2 неўрадлівыя гады — 1927 і 1928. Зноў з'явіліся цяжкасці і перабоі з хлебанарыхтоўкамі. Працэсы, характэрныя для ўсёй краіны, не абышлі і Крупскі раён. Каля 40% жыхароў складала беднота, і засуха перш за ўсё адбілася на іх жыцці. Кожны дзень летам 1928 г. ў мяст. Крупкі збіралася больш за 200 чалавек з патрабаваннем знізіць цэны на хлеб і спыніць спекуляцыю ім.

Пачаліся перабоі ў рабоце прадпрыемстваў. Спыніўся завод імя Вароўскага, на фабрыцы «Саломка» працавала толькі лесапільнае аддзяленне. Да таго ж па раёну папаўзлі чуткі аб блізкай вайне. Насельніцтва пачало назапашваць прадукты, што таксама

адмоўна адбілася на стане эканомікі. Было ліквідавана прадпрымальніцтва, пашырыўся дзяржаўны сектар эканомікі, ліквідаваны ўсе формы кааперацыі, адбываўся пераход да суцэльнай калектывізацыі.

28.6.1929 г. ЦК КП(б)Б разаслаў у райкомы партыі, партячэйкі пісьмо, у якім фактычна адмянялася раней прынятая пастанова аб свабодным выбары форм землекарыстання, у прыватнасці, катэгарычна забаранялася стварэнне хутарскіх і адрубных гаспадарак, быў аб'яўлены курс на арганізацыю калгасаў. Адначасова пачаўся паварот у палітыцы да заможных сялян. Замест эканамічных мер па абмежаванні іх дзейнасці (падатковая палітыка і г.д.) пачалося «выцясненне кулака як класа» адміністрацыйнымі і рэпрэсіўнымі мерамі. Характэрны ў гэтым плане наказ выбаршчыкаў Крупскага раёна да дэпутатаў, якія выбіраліся ў Саветы розных узроўняў у 1929 г. У ім, у прыватнасці, адзначалася: «узросшая варожасць кулацкіх і антысавецкіх элементаў у вёсцы з прычыны перажываемых дзяржавай цяжкасцей патрабуе ад дэпутатаў, якіх выбіраюць, яшчэ больш рашучай барацьбы з варожымі элементамі на вёсцы, якая павінна выказвацца не толькі ў абароне, а галоўным чынам у наступленні на кулака і знішчэнні варожасці антысавецкіх элементаў». У адказ пачасціліся выпадкі адкрытага супраціўлення часткі заможных сялян палітыцы ўлад. Так, быў забіты брыгадзір у в. Язбы Дубаўскага сельсавета, у в. Дзянісавічы Шынкаўскага сельсавета ноччу быў зроблены напад на актывіста Сямёна Кляшчонка.

Рэзкая змена ўкладу жыцця адбілася на лёсе ўсіх сялян. Гэта не магло пакінуць іх абыякавымі. Бяднейшыя бачылі ў калгасах выйсце з гаротнага становішча і таму з ахвотай падавалі заявы аб уступленні. Гэтыя слаі насельніцтва карысталіся падтрымкай з боку дзяржавы, якая матэрыяльна і маральна заахвочвала калектыўныя гаспадаркі. Больш складанымі былі адносіны да новых форм гаспадарання сераднякоў, а тым больш заможных сялян. Апошнія ўсімі спосабамі супраціўляліся насаджэнню калгасаў, і да іх часта прымяняліся прымусовыя меры. Гэта быў гераічны і трагічны час у жыцці вёскі, дзе разам з энтузіязмам і верай у лепшае будучае адных, іх імкненнем да гэтага лепшага жыцця назіралася асабістая трагедыя іншых, якія не маглі ўспрыняць карэнную ломку свайго жыцця, працівіліся гэтаму, а ў выніку часта страчвалі не толькі маёмасць, але і асабістую свабоду, прымусова высылаліся за межы раёна.

Як ужо адзначалася, пачатак суцэльнай калектывізацыі адносіцца да 1929 г. Да канца года ў раёне было створана 17 калгасаў. 5.1.1930 г. ЦК ВКП(б) прыняў пастанову «Аб тэмпах калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву», у якой перасцерагаў ад празмернага фарсіравання гэтай кампаніі. Для Беларусі не вызначаліся канкрэтныя тэрміны заканчэння калектывізацыі, хоць у цэлым пастанова заахвочвала масавае стварэнне калгасаў. Дваякі сэнс пастановы і імкненне мясцовых кадраў «выслужыцца» перад начальствам прывялі да фактычнага ігнаравання гэтага дакумента. Партыйнае і савецкае кіраўніцтва Беларусі абвясціла рэспубліку зонай суцэльнай калектывізацыі і выступіла з прапановай завяршыць гэту работу ўжо ў 1930 г. у Крупскім раёне, хоць ён і лічыўся адным з найбольш эканамічна адсталых. Шэйскі, Ігрушкаўскі і 4 іншых сельсаветы былі аб'яўлены тэрыторыяй суцэльнай калектывізацыі. Была пастаўлена мэта ўжо вясной 1930 г. калектывізаваць большасць гаспадарак раёна.

У ажыццяўленні гэтай задачы ўлады абапіраліся перш за ўсё на бяднейшую частку насельніцтва, якая з ахвотай ішла ў калгасы, а таксама на партыйныя і камсамольскія ячэйкі, якія ў шэрагу месц выступілі ініцыятарамі стварэння новых форм гаспадарання. У адносінах да сераднякоў і кулакоў месцамі пачала праводзіцца палітыка прамога прымусу. Прымяняліся такія адміністрацыйныя меры, як перасяленне не жадаючых уступаць у калгасы на горшыя землі і ў іншыя сельсаветы, нявыдачы хлеба тым, хто не ўступіў у калгас. Справа даходзіла да арыштаў. Так, у Сакалавічах сакратар РВК Яцук арыштаваў серадняка, які адмовіўся ўступіць у калгас. Да

Сяўба ў калгасе в. Грыцкавічы. 1930-я гады.

красавіка 1930 г. ў раёне быў створаны 51 калгас. У гэты час выйшаў у свет вядомы артыкул І.В.Сталіна «Галавакружэнне ад поспехаў», і мясцовыя ўлады некалькі скарэкціравалі свае дзеянні ў бок паслаблення адміністрацыйнага націску. Гэта адразу адбілася на ходзе калектывізацыі. Літаральна за месяц палова (24) створаных «бумажных» калгасаў распалася. Нягледзячы на несумненныя пралікі, 13 з'езд КП(б) Беларусі прызнаў работу, што праводзілася, правільнай, было прынята рашэнне прадоўжыць палітыку фарсіравання калектывізацыі.

У Крупскім раёне да канца 1930 г. было 30 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 658 гаспадарак або 11,6% ад агульнай колькасці двароў. Ім належала 16% зямельных плошчаў. Усяго ў раёне ў гэты час было 1337 калгаснікаў, з іх 633 беднякі і батракі, 687 сераднякоў. Да красавіка 1931 г. іх было 202, яны аб'ядноўвалі 4867 гаспадарак (42,4%). Да студзеня 1932 г. створана 228 калгасаў, 4 саўгасы, у іх аб'яднана 5961 гаспадарка (52,4%). Было аб'яўлена, што калектывізацыя ў асноўным завершана ў Стараслабодскім і Халопеніцкім сельсаветах.

Большасць створаных калектыўных гаспадарак былі невялікія, слаба забяспечаны тэхнікай і сельскагаспадарчым інвентаром. 45 калгасаў аб'ядноўвалі ў сярэднім кожны да 10 гаспадарак, як правіла, сваякоў і па сутнасці з'яўляліся сямейнымі калектывамі. Толькі 18 калгасаў мелі па 50 і больш гаспадарак. Нярэдкімі былі выпадкі безгаспадарчасці і нізкай працоўнай дысцыпліны. Напрыклад, у калгасе «Знамя працы» Ігрушкаўскага сельсавета, як адзначалася ў запісцы ЦК КП(б)Б, снапы з поля расцягваюцца, інвентар раскіданы і псуецца, у калгасе імя Леніна Халопеніцкага сельсавета з 65 бароն засталося толькі 35, астатнія пакралі.

У калгасе «Пуцілавец», што ў в. Асечана, з-за дрэннай арганізацыі працы частка ворыўных зямель засталася незасеянай. У некаторых гаспадарках не быў наладжаны дакладны ўлік працы. У калгасе «Прагрэс» Ухвальскага сельсавета ўлік працадзён не вёўся, а заробак размяркоўваўся не па фактычна выкананай працы, а, як кажуць, «на вока». Да гэтага трэба дадаць злоўжыванне сваім службовым становішчам з боку асобных кіраўнікоў гаспадарак, абыякавыя адносіны іх да патрэб калгаснікаў, адміністрыраванне, бюракратызм. Усё гэта, ды і многае іншае прывяло да таго, што ідэя калектыўнага гаспадарання была ў значнай ступені дыскрэдытавана. З 1932 г. пачаўся новы выхад насельніцтва з калгасаў, прычым у Крупскім раёне гэты працэс атрымаў больш шырокае распаўсюджанне ў параўнанні з іншымі раёнамі рэспублікі. Распаліся гаспадаркі «Чараёўка», «Асечана», «Касянічы» Заборскага сельсавета, «Глінаўка», «Хальнявічы» Хальнявіцкага, «Кутавец» Смародзінскага, «Прудзец», «Малыя Хальнявічы» Хацюхоўскага сельсавета і іншыя. Усяго ў 1932 г. было ліквідавана 40 калгасаў, з іх выйшла больш 900 сем'яў.

Гэта праблема з'явілася тэмай для абмеркавання на прэзідыуме Крупскага райвыканкома і бюро Крупскага райкома партыі ў красавіку—маі 1932 г. Былі намечаны меры па арганізацыйным ўмацаванні калгасаў. Галоўная ўвага ўдзялялася ўзмацненню барацьбы з «кулацка-варожымі элементамі». Быў пацверджаны курс на далейшае развіццё калгаснага будаўніцтва, прынята рашэнне неадкладна аднавіць калгасы і на аснове штодзённай масавай работы дабіцца вяртання ў іх беднякоў і сераднякоў.

У 1932 г. пачала працаваць Крупская МТС. Яна размяшчалася ў в. Самаседаўка і абслугоўвала 5 сельсаветаў. МТС мела 11 трактараў, да канца 1933 г. іх колькасць павялічылася да 20. Пабудавана майстэрня, працавала 37 чалавек.

У гэты час пачалі дзейнічаць жорсткія пакаранні. На працягу года былі заменены 12 старшынь сельсаветаў і 16 сакратароў, шэраг старшынь калгасаў. За нязначныя парушэнні кіраўнікоў і радавых калгаснікаў прыцягвалі да судовай адказнасці. Старшыня Стараслабодскага сельсавета В.Булыга, Заборскага П.Патапаў былі зняты з работы і прыцягнуты да суда за тое, што іх сельсаветы не выканалі план хлебанарыхтовак. На старшыню калгаса «Ударнік» Шынкаўскага сельсавета І.Труса паступіў матэрыял у НКУС толькі за тое, што пасля выканання плана нарыхтовак лёну ён каля 40 пудоў падзяліў сярод калгаснікаў. Згодна з т.зв. «Законам аб трох каласках», як яго называлі ў народзе, на 7 гадоў была пазбаўлена волі А.А.Лазарэвіч з Малажаберыцкага сельсавета за тое, што ўкрала з калгаснага поля 30 кг бульбы. Старшыня калгаса «Радзіца» Міцкевіч разам са старшынёй рэўкамісіі гэтай гаспадаркі Усошыным за тое, што ўкралі каля 3 т збожжа, рашэннем выязной сесіі Вярхоўнага суда рэспублікі былі прыгавораны да расстрэлу. Працэс калектывізацыі з самага пачатку суправаджаўся скрытай і адкрытай барацьбой супраць яе з

боку заможных сялян. Формы пратэсту былі розныя: адказ ад уплаты падаткаў, распаўсюджанне розных чутак, скрытая агітацыя супраць стварэння калгасаў і г.д. Як адзначалася, напрыклад, у інфармацыі аб ходзе збору падаткаў у сакавіку 1928 г., «адказалася плаціць заможная частка в. Лужа, але пасля складвання вопісей маёмасці грошы ўнесла». Пад уплывам агітацыі «заможнікаў» пачаўся масавы забой жывёлы. 6.12.1930 г. ЦК КП(б)Б накіраваў у райкомы пісьмо, дзе прапаноўвалася прымаць самыя жорсткія меры, аж да прыцягнення да адказнасці, у адносінах да тых, хто прадаваў або знішчаў сваю жывёлу, але гэта не дапамагло. У цэлым пагалоўе жывёлы за 1931—34 гг. скарацілася: коней — з 12 636 да 9159, кароў — з 21 534 да 19 168, авечак — з 32 519 да 13 118, свіней — з 16 507 да 13 281.

Агітацыя супраць уступлення ў калгасы прымала розныя формы. На канферэнцыі груп беднаты вясной 1930 г. жыхар в. Бобр Макарэвіч прызнаўся: «Мне, як бедняку, кулакі і заможнікі складваюцца па 5 рублёў і купляюць каня, кажучы, каб толькі я не ішоў у калгас». Ва Ухвальскім сельсавеце ў в. Захараўка, Узнаж, Стары Сакол, Ухвала перад сялянамі выступалі прыезджыя агітатары, раней судзімыя М.І.Лявуха і І.Цэхавы. Яны зачытвалі вытрымкі з Бібліі, з Кнігі прароцтваў і растлумачвалі іх такім чынам, што ўсе беды з калгасаў, агітавалі таксама, каб бацькі не аддавалі дачок замуж за калгаснікаў. У вёсках Ігрушка, Выдрыца агітацыйную работу супраць калектывізацыі ўзначальвалі мясцовыя святары. Быў выпадак, калі заможныя сяляне в. Ігрушка стварылі лжэкалгас. Разам з пасіўнымі адкрытыя формы супраціўлення.

У 1928 г. ў в. Лазоўка 9 бядняцкіх гаспадарак аб'ядналіся ў калгас «Іскра». За гэта іх хаты былі спалены. «Оршанский окружной суд приговорил к 5 годам заключения 4 кулаков дер. Лазовка Крупского района за поджог нового колхоза «Искра» и уничтожение 9 дворов колхозников», — пісала аб гэтым выпадку газета «Правда». Далей карэспандэнт газеты крытыкаваў суд за разгледжанне гэтай справы толькі як крымінальнай, хоць, на яго погляд, гэтае злачынства мела дакладна вызначаны палітычны характар. У 1930 г. быў забіты заможнымі сялянамі старшыня калгаса «Гарадзішча» Радзівон Рубец. У в. Язбы браты Барсуковы, з заможных сялян, па-зверску забілі ўпаўнаважанага сельсавета. У в. Пліса пад уплывам агітацыі супраць калгасаў натоўп жанчын з віламі сілаю прагнаў калгаснікаў з поля, гэтак жа жанчыны паступілі з калгаснікамі ў вёсках Свірыдаўка, Малыя Жаберычы. У в. Клён Фёдар Кур'ян з ружжа параніў сельскага актывіста. У калгасах імя Варашылава, «Нача» ў в. Харытанцы былі падпалены калгасныя будынкі. У в. Дзянісавічы быў зроблены пагром у доме камсамольца С.Кляшчонка, які не захацеў выйсці з калгаса у сакавіку 1930 г. ў в. Узнацк была падпалена хата бедняка за тое, што гаспадар дапамагаў у правядзенні калектывізацыі. У адказ пачаліся рэпрэсіі супраць заможных сялян. У 30-я гады ў раёне былі высланы ў Сібір або на Далёкі Усход 14 сем'яў.

Да сярэдзіны 30-х гадоў калектывізацыя была ў асноўным завершана. Арганізаваны

Работнікі Крупскага раённага зямельнага аддзела. 1934 г.

М.І.Філіповіч, удзельнік 1-га з'езда калгаснікаў.

221 калгас, 5 саўгасаў, аб'яднана каля 85% гаспадарак. Умацавалася грамадская жывёлагадоўчая база. У 1932 г. ў раёне было 25 ферм (1900 галоў жывёлы), у 1933 — 96 ферм (5690 галоў жывёлы). Умацоўвалася матэрыяльная база калгасаў. Працаўнікі раёна ў 1933 г. ўдзельнічалі ў рабоце І Усебеларускага з'езда калгаснікаў. Сярод іх быў і ўраджэнец раёна М.І.Філіповіч. Павялічваўся трактарны парк. Акрамя Крупскай МТС, з 1938 г. на калгасных палях працавалі трактары, камбайны і іншыя сельскагаспадарчыя машыны Ігрушкаўскай МТС, якая адразу ўвайшла ў лік перадавых МТС вобласці. У МТС налічвалася 78 трактароў, 9 аўтамашын. Працавалі таксама Халопеніцкая і Янаўшчынская МТС, якія ўвайшлі ў склад створанага ў 1935 г. Халопеніцкага раёна. Эканамічнае становішча калгасаў і саўгасаў умацоўвалася. *Дз.М.Хромчанка.*

Прамысловасць

Першыя крокі па аднаўленні прамысловасці былі зроблены ў 1918 г., але гэты працэс быў спынены ў сувязі з акупацыяй раёна нямецкімі войскамі. Пасля вызвалення гэтая работа была прадоўжана. Да канца 1919 г. аднавіў вытворчасць пасудна-ганчарны завод у Крупках. На ім працавала 20 рабочых. Хаця з-за недахопу матэрыялаў, глазуры, волава, адсутнасці кваліфікаваных рабочых яго магутнасць была значна ніжэйшай у параўнанні з даваеннай, усё ж завод выпускаў кожны месяц каля 5 тыс. штук рознай пасуды. У Крупках пачаў працаваць шкіпінарны смалакурны завод. Ён выпрацоўваў каля 1000 кг смалы і 500 кг шкіпінару ў месяц.

У чэрвені — ліпені 1919 г. быў зроблены рамонт вадзяных млыноў. У Крупках былі падрыхтаваны да пуску запалкавая фабрыка і маслабойны завод, але работу не пачалі таму, што блізка быў фронт. Яны пачалі працаваць пазней, у 1920-я гады, у час нэпа. Трэба адзначыць, што ў гады новай эканамічнай палітыкі значна развіўся прыватны сектар у прамысловасці. Частка прадпрыемстваў перайшла да прыватных асоб, напрыклад, завод па вырабу драўляных цвікоў у в. Абчуга і пасудна-ганчарны ў Крупках. У гэты час у раёне працавалі 10 кааператыўных, 33 прыватных і 7 дзяржаўных гандлёвых устаноў. Найбольш буйнымі прадпрыемствамі былі завод па вырабу драўляных цвікоў у в. Абчуга 1926 г. ў в. Ухвала (падпарадкоўваўся Управаленню лесу), завод імя Вароўскага чыгуначнага ведамства. Працавалі 3 млыны ў Крупках, Бабры і в. Гаць (уваходзілі ў раённы камбінат), млыны ў вёсках Навінка і Нача. З пачаткам індустрыялізацыі характар прамысловасці ў раёне істотна не змяніўся, павялічылася колькасць прадпрыемстваў, і ўсе яны перайшлі ў дзяржаўны сектар.

Да сярэдзіны 1930-х гадоў стала больш разнастайнай структура прамысловасці: дзейнічалі льнозаводы ў Крупках, у вёсках Абчуга і Хацюхова (належалі Белльнотрэсту), і пасудна-ганчарны ў Крупках. Дзейнічалі 11 смолзаводаў, 11 млыноў, 3 шавецкія, 2 кравецкія, кавальская і інш. арцелі. У гады нэпа дзяржава аказвала ім пэўную дапамогу: былі паменшаны падаткі, выдзяляліся льготныя крэдыты.

У цэлым у прамысловасці пераважаў дзяржаўны сектар. У сярэдзіне 1920-х гадоў былі развіты дрэваапрацоўчая і харчовая прамысловасць. Дзейнічалі Крупская фабрыка «Саломка» (належала аб'яднанню «Галоўзапалка»), лесапільны завод, пабудаваны ў верасні ганчарны завод, фабрыка «Саломка» Белтрэста, слясарныя майстэрні ў МТС, сталярныя, шорныя, ганчарныя, стальмашныя майстэрні, млыны, якія належалі калгасам, рознымі рамесніцкія арцелі ў Крупках, Бабры, Ігрушцы, Альшаніках, Халопенічах, спіртзаводы ў мяст. Бобр, в. Старая Слабада, смолзаводы ў вёсках Сомры, Харытанцы, Дубы, Дзянісавічы, Знаменка, Ухвала, Гумны, Вязок, Бобр, Слабада, якія належалі розным ведамствам. Усяго ў гэты час у прамысловым сектары працавала каля 900 чалавек, або 3% усіх жыхароў раёна. *Дз.М.Хромчанка.*

Дакументы сведчаць

Спіс прамысловых прадпрыемстваў крупскага раёна па стану на верасень 1934 года

Назва прадпрыемства	Месца знаходжання	Каму належыць	Від прадукцыі	Колькасць рабочых і служ.	Колькасць прадукцыі, выпушчанай у 1933 г. (тыс. руб.)
1	2	3	4	5	6
Льнозавод № 66	Абчуга		льнов	21	2288
—"— № 21	Хацюхова	—"—	—"—	13	
—"— № 8	Крупкі	—"—	—"—	36	28485
Лесацвікавы з-д	Крупкі	Белтрэст	рас. леса	20	
Ганчарны з-д	—	—	ганчарны посуд	18	34273
		МЯСЦОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ			
Сляс. майстэрня «Ударнік»	м. Бобр		бочкі, клей	117	95073
Цэглавая арцель «Чырвоная цэгла»	Альшанікі		цэгла	25	20448
Кузнечная арцель «Металіст»	Бобр		с/г. інвентар, сякеры, вілы	12	49076
Кузнечная арцель «Чырвоны молат»	Крупкі	—	—	24	133018
Швейная арцель «Перамога»	Крупкі	Белпром	пашыў абутку	31	137399
Швейная арцель «Прагрэс»	—	—	пашыў адзення	31	129065
Швейная арцель «Свабодная праца»	Халопенічы	—	пашыў абутку	21	31908
Швейная арцель «Новы шлях»	—	—	пашыў адзення	15	91040
Цэглавая арцель «Інтэрнацыяналіст»	Ігрушка		цэглу	23	12240

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф.119, воп.2, спр.76, л.353—354.

		ПРАМЫСЛОВАСЦЬ КАЛГАСНАГА СЕКТАРУ			
Калгасныя кузні	па р-ну	калгасам	рамонт с/г інвент.	175	
Сталярная майстэрня	Халопенічы	саўгас	мэбля	2	
Шорная майстэрня	—	—	рамонт	1	
майстэрня	Шчаўры	калг.	рам. дроб. мэблі	2	
Ганчарная майстэрня	Траянаўка	—	выраб посуду	2	
Колавая майстэрня	Узнацк	—	колы	2	
Цэглавая арцель	Шэйка	калгасу	цэгла	8	
Млын	Гібайлавічы	—	памол мукі	1	1728
—	Ухвала	—	—	3	3734
—	Радзіца	—	—	2	1730
		ІНШЫЯ ПРАМЫСЛОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ			
Хлебапякарня	Крупкі	Крупскі п/а	выпечка хлеба	4	17660
Маслазавод	па раёну		масла і тварог	33	2489600
Спіртзавод	Старая Слабада	Беллесхім	спірт	102	417900
Смолзавод «Варашылава»	Сомры				

Працяг табліцы

1	2	3	4	5	6
—	Нацк				
—	Харытанцы				
—	Дубава				
—	Дзянісавічы				
—	Гібайлавічы				
—	Ухвала				
—	Гумны				
—	Вяжок				
—	Бобр				
—	Слабада				
Смолзавод «Варашылава»	Бярозка				
Кравецкая арцель 14 кастр. рэвалюц.	Крупкі	Белкаапсаюз	пашыў адзення	16	36386
Шавецкая арцель	Крупкі	—	пашыў абутку	5	10706
Квасавая арцель	Крупкі	—	вытворчасць кваса	5	

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф.119, воп.2, спр.76, л.353.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.

Крупскі раён

Размяшчаецца паміж 54°01′—54°39′ паўночнай шырыні, 28°46′—29°30′ усходняй даўжыні ад Грынвіча. Раённы цэнтр — мяст. Крупкі. Бліжэйшая чыгуначная станцыя — Крупкі. Знаходзіцца на Маскоўскай Беларуска-Балтыйскай чыгункі. Раён падзяляецца на 23 сельсаветы. Мяжуе з раёнамі: на поўначы з Чашніцкім і Лепельскім, на захадзе з Барысаўскім, на поўдні — з Бярэзінскім, на паўднёвым усходзе — з Бялыніцкім і на ўсходзе — з Талачынскім. Агульная тэрыторыя раёна роўная 215 715 га. У тым ліку зямель сельскагаспадарчага прызначэння 66%, лясоў 33,4%. З зямель сельскагаспадарчага прызначэння ўжыткоўнай — 80% і няўжыткоўнай — 20%. Усяго насельніцтва ў раёне — 73 575 чалавек, з іх беларусаў — 90,27%, яўрэяў — 1,60%, палякаў — 2,24%, расійцаў — 5,06%, літоўцаў — 0,59%, латышоў — 0,05%, іншых — 0,19%.

Па тытульнаму спісу 1931 г. ў раёне налічвалася 53 прадпрыемствы з агульнай колькасцю рабочых на 1.10.31 г. — 750. Сярод прадпрыемстваў налічвалася: электрастанцый — 1, кавальскіх арцеляў — 3, смалакураных заводаў — 13, цагельны завод — 1, цагельных арцеляў — 4, чарапічных — 2, лесазаводаў — 2, цвіковых заводаў — 1, сталярная арцель — 1, льнозавод — 1, абуткових арцеляў — 3, кравецкіх арцеляў — 2, ганчарных заводаў — 1, вадзяных млыноў — 5, паравых млыноў — 2, маслазаводаў — 11.

У 1932 г. па раёне існавала: дзяржаўных — 6, кааператыўных — 53, а ўсяго прамысловых прадпрыемстваў — 59. З іх знаходзілася ў падпарадкаванні: Наркамзему — 2, РВК і гарсавету — 4, прамкааперацыі — 15, калгасаў — 34, іншых прамыслова-кааперацыйных — 4. Персанал усіх гэтых прадпрыемстваў на 1.12.32 г. раўняецца 553 адзінкам, у гэтым ліку рабочых (без вучняў і МАП) 492, служачых — 50, апрача таго працуе па хатах 8 асоб. Сярэдняя колькасць рабочых за першае паўгоддзе 1932 г. складала 518 асоб. Сума асноўных фондаў была роўна 156 491 руб. Калі валавая прадукцыя ў аптова-адпускных цэнах адпаведнага году за 1931 г. складала 982 978 руб., то толькі за першае паўгоддзе 1932 г. яна ўжо складала 401 772 руб. 2 прадпрыемствы мелі рухавікі.

Асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі раёна з'яўляюцца: лесапільны завод у мяст. Крупкі з лікам рабочых у сярэднім за 1-е паўгоддзе 1932 г. — 24 і валавой прадукцыяй за гэты час у цэнах 1926 і 1927 гг. 12,96 тыс. руб., фабрыка па вырабу сапожных драўляных цвікоў у сяле Абчуга з лікам рабочых — 46 і валавой прадукцыяй — 34,67 тыс. руб., тарфяная арцель з лікам рабочых — 30 і валавой прадукцыяй — 3,58 тыс.

руб., цагельная арцель у вёсцы Альшанкі, з лікам рабочых — 40 і валавой прадукцыяй — 11,12 тыс. руб., швейная арцель у мяст. Крупкі з лікам рабочых — 37 і валавой прадукцыяй — 24,11 тыс. руб.

Спажыўкааперацыя раёна мае 18 сельпо з гандлёвай сеткай у 53 адзінкі. Пайнікаў спажыўкааперацыі — 19 584.

Карысныя выкапні ў раёне яшчэ не выяўлены. У раёне маецца 22 502 га балот. Сельская гаспадарка раёна спецыялізуецца ў ільно-малочным напрамку. Саўгасаў у раёне 6, з іх 4 свінаводчай спецыялізацыі. «Халопенічы» з плошчай сенапахаці 1254 га і 77 рабочых; «Каменка» з плошчай сенапахаці — 1263 га і 69 рабочых; «Крупкі» з плошчай сенапахаці — 1160,12 га і 50 рабочых; «Граніт» з плошчай сенапахаці — 607,35 га і 37 рабочых, 1 саўгас з кролікаводчай спецыялізацыяй; Янаўшчына з плошчай сенапахаці — 500,93 га і 21 рабочы і 1 прыгарадны саўгас РСТ з плошчай сенапахаці — 45,94 га. У раёне маецца 11 322 гаспадаркі, з іх на 1.1.33 г. калектывізавана 5194, што складае 45,9%.

Усяго калгасаў у раёне — 207.

У калгасах раёна маюцца наступныя фермы: свінаводчых — 19, з агульнай колькасцю пагалоўя на 1.1.33 г. 590, малочна-таварных — 33, з пагалоўем на гэта чысло — 2386; па вырошчванні цялят, з пагалоўем на 1.1.33 г. — 1841 і дзве каняводныя фермы з агульным пагалоўем — 24.

Раённая МТС мае 11 трактараў, складаных малатарняў 11 і 2 сеялкі 24-радковых.

У калгасах раёна маецца наступная колькасць складаных сельскагаспадарчых машын: сенакасілак — 28, конных грабляў — 81, жняярак-самаскідак — 45, снопавязалак — 5, бульбакапалак — 9, сеялак радковых — 61. Пасяўная плошча раёна ў 1932 г. складала 58 633 га, у тым ліку: зерневых культур — 68,1%, бульбы — 14,2%, тэхнічных культур — 11,7%, траў — 4,4%, іншых — 6%.

Нарыхтоўкі ў 1932 г. на 1.11.33 г. характарызуюцца наступнымі лічбамі ў тонах: ільновалакно — 474, пянька — 5, ільносемя — 440, канопля — 6, салома — 807.

План веснавой сяўбы па раёну на 1933 г. наступны:

Назва сектараў	Яравы клін у 1933 г., га	Збожжа-яравыя культуры, га	Тэхнічныя		бульба, га
			Агульная плошча, га	у тым ліку лёну, га	
Саўгасы	2393	1104	—	—	483
Калгасы	20 300	10 000	4 305	4 200	3 800
Адна-асобнікі	18 407	9 896	2 195	29 500	4 467
Разам	41 100	21 000	6 500	6 300	8 700

У раёне на 1.1.33 г. існавала наступная сетка навучальных устаноў: ветэрынарны тэхнікум — 1, у ім настаўнікаў — 9, студэнтаў — 115, ФЗС — 1, у іх настаўнікаў — 8, вучняў — 314; ШКМ — 18, у іх настаўнікаў — 117, вучняў — 4140, 4-х годак — 107, у іх настаўнікаў — 160, вучняў — 4790. Працэнт пісьменнасці ў раёне — 94.

Партарганізацыя раёна складаецца з 37 ячэек, з агульнай колькасцю камуністаў — 432, з іх членаў КП(б)Б — 246, кандыдатаў — 186. Камсамольская арганізацыя раёна складаецца з 50 ячэек, з агульнай колькасцю камсамольцаў — 756.

У раёне выдаецца газета «Камуністычны шлях».

Друкуецца па кн.: Усе раёны БССР. Мн., 1934. С. 187—189.

Народная асвета. Культурнае развіццё.

Адначасова з эканамічнымі пераўтварэннямі і стварэннем новай палітычнай сістэмы дзяржаўнага кіравання ўлады пачалі шырокамаштабную работу па вырашэнні сацыяльных праблем.

Напачатку 1920-х гадоў у сярэднім на 100 чалавек налічвалася 46 непісьменных, 32 малапісьменных і толькі 22 пісьменных. Бальніца на 10 ложкаў з амбулаторыяй дзейнічала ў Крупках, урачэбны ўчастак — у в. Ухвала і фельчарска-акушэрскі пункт — у Бабры. У іх працавалі 1 урач, 3 фельчары і 3 акушэркі; на 38 тыс. насельніцтва гэта было вельмі мала.

Пасля грамадзянскай вайны пачалася мэтанакіраваная дзейнасць савецкіх устаноў, партыйных, камсамольскіх і іншых грамадскіх арганізацый па сацыяльнай абароне насельніцтва, развіцці сеткі ўстаноў аховы здароўя, па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослых і адкрыцці шырокай сеткі навучальных устаноў для дзяцей.

У 1919 г. адкрыты дзіцячыя сталовыя ў

Сакратары камсамольскіх ячэек Крупскага раёна. 1934 г.

Бабры, Абчузе, Халопенічах, узяты пад ахову лясныя багацці. У маёнтку Хацюхова быў арганізаваны дзіцячы дом для дзяцей-сірат. У в. Пліса і Ігрушка, якія былі выбраны як самыя бедныя, адкрыліся яслі, дзіцячыя пляцоўкі. Для пацярпелых ад акупантаў на ст. Крупкі быў наладжаны харчовы пункт. 11 снежня 1920 г. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт ССРБ выдаў загад аб ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. У ім, у прыватнасці, адзначалася неабходнасць безумоўнага выканання дэкрэта Саветаў Народных Камісараў ССРБ ад 26.12.1919 г. аб ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт дазволіў залічваць час, праведзены на занятках, як працоўны. Адначасова вызначаліся меры пакарання, накшталт пазбаўлення харчовага пайка, для тых, хто не хацеў займацца самаадукацыяй. Згодна з гэтым загадам на месцах, у тым ліку і на Крупшчыне, сталі адкрывацца пункты ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, школы. У 1921 г. тут працавала 32 школы. Не хапала настаўнікаў. Таму па магчымасці ў глыбінку накіроўвалі педработнікаў з гарадоў. Сярод першых такіх настаўнікаў на Крупшчыне былі, напрыклад, муж і жонка Усачовы, Васіль Ціханавіч і Аляксандра Іванаўна, якія прыехалі ў мяст. Бобр з Масквы. Яны арганізавалі тут вучэбную ўстанову, якая называлася Бобрская савецкая працоўная школа II ступені. З дапамогай бацькоў зрабілі парты, рамонт будынка. Не хапала літаратуры, падручнікаў, пазней па просьбе педагогаў і вучняў у Бобр накіраваў невялікую кніжную бібліятэчку нарком асветы Луначарскі. Такія энтузіясты-педагогі, як Усачовы, шмат зрабілі для народнай асветы. Яны не толькі давалі веды, але і вучылі любіць родны край, яго прыроду. Усачова Аляксандра Іванаўна нават выдавала з дзецьмі літаратурны часопіс «Наш журнал». Паступова ў раёне складвалася сетка навучальных устаноў.

Будынак Бобрскай школы. 1920-я гады. Малюнак настаўніцы.

Да 1924 г. ў Крупскім раёне працавалі 37 школ, з іх: сямігадовая ў в. Бобр, чатырохгадовая ў мяст. Крупкі, астатнія пачатковыя. У гэтых школах працавалі 60 настаўнікаў, з іх 3 мелі вышэйшую адукацыю, 4 — няпоўную вышэйшую, 23 — сярэднюю спецыяльную і

Піянерскія работнікі Крупскага раёна. 1926 г.

35 — сярэднюю. З-за адсутнасці матэрыяльнай базы 60% школ працавалі ў наёмных памяшканнях. У гэты час вучобай было ахоплена каля 70% дзяцей. Акрамя таго, у раёне дзейнічалі 16 пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці для дарослых, 2 школы для малапісьменных, вячэрняя школа рабочай моладзі, вячэрняя школа сялянскай моладзі. У 1927 г. пункты па ліквідацыі непісьменнасці былі адкрыты пры ўсіх школах, акрамя таго, яшчэ дзве школы для малапісьменных у в. Гапонавічы і Стары Бобр..

У Халопеніцкім раёне ў гэты час існавала таксама 37 школ. У 1925 г. ў Халопенічах была пабудавана сямігодка і яўрэйская школа. Лікпункты дзейнічалі ў 17 школах. Да 1928—29 навучальнага года колькасць агульнаадукацыйных школ у Крупскім раёне ўзрасла да 44, у іх працавалі 80 настаўнікаў, навучаліся 3846 хлопчыкаў і дзяўчынак. У раёне ў гэты час дзейнічаў 21 пункт па ліквідацыі непісьменнасці, у іх навучалася 854 чалавекі, у Крупках дзейнічалі школы рабочай і сялянскай моладзі.

У 1930 г. працавалі 52 агульнаадукацыйныя школы, 69 агітпунктаў, 5 школ для мала-

Выпускнікі Крупскай школы дарослых. 1926 г.

Настаўнікі Крупскага раёна. 1928 г.

пісьменных. У іх займалася 9121 дзіця і 1880 дарослых. Толькі 16 школ мелі ўласныя памяшканні, 36 знаходзіліся ў наёмных дамах.

З пачатку 1930-х гадоў згодна з пастановай СНК БССР ад 6 жніўня 1932 г. пачынаецца паступовы пераход ад усеагульнага пачатковага да ўсеагульнага няпоўнага сярэдняга навучання. У раёне ў 1931 г. адкрылася 7 сямігодак, у 1932 г. колькасць сямігадовых школ узрасла да 19, а ўсяго налічвалася 118 навучальных устаноў, у іх працавала 260 настаўнікаў і навучалася 10 916 дзяцей (98,4%). За перыяд 1931—33 гг. пабудавана 6 сямігадовых і 5 пачатковых школ. Адначасова актывізавалася работа па павышэнні адукацыі дарослага насельніцтва. 17.2.1932 г. пытанне «Аб ходзе ліквідацыі непісьменнасці» ў раёне было вынесена на разгляд райвыканкома. Адзначыўшы важнасць выканання пастаўленай партыяй і ўрадам задачы ператварэння БССР да 1 мая 1932 г. ў краіну суцэльнай пісьменнасці, райвыканком намеціў шэраг мер па фарміраванні ўсевобуча. З гэтай мэтай у раёне быў створаны штаб па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, на месцах былі вызначаны адказныя за выкананне гэтага рашэння. Сельсаветам даручалася не пазней 1 сакавіка 1932 г. заслухаць справаздачы адказных аб стане ліквідацыі непісьменнасці, асабліва сярод дапрызыўнікоў. Пры Бобрскай школе былі адкрыты яшчэ раней шасцімесячныя настаўніцкія курсы. Вядома, у пагоне за лічбамі і працэнтамі гэта работа праводзілася нярэдка фармальна, але тым не менш у 1932 г. з 6810 чалавек непісьменных у гэты час вучылася ужо 5583 (82,7% агульнай

Будынак Бобрскай школы. 1930-я гады.

Камсамольская ячэйка пры Крупскай школе калгаснай моладзі. 1932 г.

колькасці). З 5385 малапісьменных павышалі свой агульнаадукацыйны ўзровень 3108 (58,3%).

У 1920-я гады былі зроблены першыя крокі па арганізацыі культурна-масавай работы сярод насельніцтва. У 1925 г. ў Крупках пачаў працаваць народны дом, на раёне адкрыліся 9 хат-чытален. У Халопеніцкім раёне ў гэты час былі адкрыты народны дом з бібліятэкай у Халопенічах, а таксама 2 хаты-чытальні ў сельскай мясцовасці. У мяст. Халопенічы па ініцыятыве камсамольцаў быў таксама адкрыты маладзёжны клуб, пры якім працаваў тэатр.

Гэтыя ўстановы, а таксама школы і пункты ліквідацыі непісьменнасці сталі асноўнымі цэнтрамі культурнай работы ў сельскай мясцовасці. Пры іх ствараліся бібліятэкі, там чыталіся лекцыі, працавалі розныя гурткі, грамадскія аб'яднанні.

Згодна справаздачы, у 1926 г. ў бібліятэках Халопеніцкага нардома было 1259 кніг (з іх 168 на беларускай мове, 111 на яўрэйскай, 10 на польскай), Крупскага — 725. У бібліятэках хат-чытален Халопеніцкага раёна ў гэты час налічвалася 1045 кніг, з іх 169 на беларускай мове і 68 на польскай і яўрэйскай, Крупскага раёна — 2089 кніг, з іх 419 на беларускай і 172 на яўрэйскай мовах. Гэта была ў асноўным прапагандысцкая літаратура і кнігі сельскагаспадарчай тэматыкі.

У 1926—27 гадах пры ўстановах культуры Халопеніцкага раёна былі створаны і дзейнічалі 2 сельскагаспадарчыя гурткі, 2 палітыч-

Агульнаадукацыйныя курсы пры Бобрскай школе. 1925 г.

Хата-чытальня ў г.п. Бобр. 1919 г.

ныя, 2 драматычныя, 2 антырэлігійныя, 1 ваенны, пры ўстановах культуры Крупскага раёна — 5 сельскагаспадарчых, 6 палітычных, 3 антырэлігійных, 1 ваенны і 3 арганізацыі МОПРа (міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам). Члены гуртkоў ставілі спектаклі, выступалі з дакладамі і ў цэлым мелі поспех сярод насельніцтва.

Такая структура захавалася і ў 30-я гады. Павялічыўся фонд бібліятэк. У кастрычніку 1930 г. была адкрыта Крупская раённая бібліятэка, у ёй тады налічвалася 5 тыс. кніг. Побач з хатамі-чытальнямі на сяле адкрываліся дамы сацыялістычнай культуры, да 1935 г. ў раёне было 13. У гэтым жа годзе ў Крупках быў уведзены ў эксплуатацыю дом сувязі, што дазволіла радыёфікаваць значную колькасць вёсак. Да канца 30-х гадоў у Крупскім раёне дзейнічалі раённы дом культуры, дом культуры ў Халопенічах, 27 дамоў сацыялістычнай культуры і хат-чытален, 41 калгасны клуб, раённая бібліятэка, 33 сельскія і 3 прафсаюзныя бібліятэкі, іх кніжны фонд да 1939 г. складаў 25 689 кніг.

З 1933 г. ў раёне пачаліся дэманстравацца кінафільмы, з 1938 г. з'явілася гукавое кіно. У Крупках працаваў кінатэатр, пры ім школа па падрыхтоўцы кінамеханікаў, у сельскай мясцовасці дзейнічалі 3 кінаперасоўкі.

Выдавалася раённая газета «Голас калгасніка». А ўвогуле да 1939 г. ў раёне насельніцтва выпісвала і чытала 713 газет і часопісаў.

Гэты працэс, які затым атрымаў назву «культурная рэвалюцыя», супаў з палітыкай беларусізацыі, якая пачала праводзіцца з сярэдзіны 1920-х гадоў. Сутнасць яе заключалася ў нацыянальна-культурным адраджэнні, пераводзе школ і дзяржаўных устаноў на беларускую мову навучання і справаводства, паглыбленым вывучэнні беларускай гісторыі і культуры. За кароткі тэрмін у школах раёна пераважнай формай навучання і зносін стала беларуская мова. У раёне было створана краязнаўчае таварыства, у якім разам з вывучэннем роднага краю нярэдка рабіліся даклады і выступленні вучоных-краязнаўцаў, пісьменнікаў і г.д. Вядома, што ў раёне пабываў і выступаў з лекцыяй перад краязнаўцамі вядомы сатырык К.Крапіва. Пачалася кампанія па ўвядзенні беларускай мовы ў справаводства, але праводзілася яна фарсіравана, прымусовымі мерамі.

Гэту работу планавалася ажыццявіць за кароткі тэрмін — 3 гады. Для гэтага двойчы ў год праводзіліся месячнікі па праверцы ўкаранення беларускай мовы. Камісіі па праверцы праводзілі гутаркі з кожным работнікам дзяржустаноў, якія ператварыліся ў сапраўдныя экзамены, бо правяраючыя мелі правы прыцягваць да адказнасці, аж да звальнення з работы, тых работнікаў, хто не валодаў беларускай мовай. Такія месячнікі праводзіліся ў раёне ў снежні 1930 г., двойчы ў 1931 г. У ліпені 1931 г. быў праведзены месячнік так званай «генеральнай праверкі беларусізацыі» па ўсім Крупскім раёне. Як адзначалася ў справаздачы камісіі, хаця ў асноўным беларусізацыя апарата кіравання і закончана, многія яшчэ слаба карыстаюцца беларускай мовай у паўсядзённых зносінах, камісіяй выне-

Удзельнікі раённай медыцынскай канферэнцыі. Халопенічы. 1937 г.

сены пакаранні і прапановы па замацаванні беларусізацыі па кожнай установе і кожным працаўніку. 8.8.1931 г. справаздача аб ходзе беларусізацыі ў Крупскім раёне была разгледжана на пасяджэнні нацыянальнай камісіі ЦВК БССР. Але, нягледзячы на жорсткія адміністрацыйныя меры, а, магчыма, насуперак ім, беларусізацыя далей вядзення справаводства не пайшла. У 1930-я гады асаблівасцю работы па беларускім адраджэнні было тое, што адначасова значная ўвага ўдзялялася нацыянальным меншасцям. Сярод насельніцтва раёна пераважалі беларусы, але былі і палякі (1052), яўрэі (2867), літоўцы (296), рускія (216), а таксама ўкраінцы, латышы, немцы і г.д. Яны жылі галоўным чынам кампактна, асобнымі вёскамі. Палякі жылі ў асноўным у в. Кляновічы, яўрэі — у в. Шамкі, мяст. Бобр, Крупкі, Халопенічы, літоўцы — у в. Ліцвінка, Асінаўка, засценках Жаўняк, Чырвоная Слабада, Рыкаўка. У названых і іншых вёсках працавалі 2 літоўскія школы, 1 польская, 3 яўрэйскія, 5 рускіх. У 1930 г. ў нацыянальных школах навучалася 728 дзяцей. Акрамя таго, дзейнічалі вячэрнія курсы па ліквідацыі непісьменнасці для нацменшасцей. У раёне выдаваліся газеты не толькі на беларускай і рускай мовах, але і на мовах іншых нацыянальнасцей. У 1931 г., напрыклад, 41 чалавек выпісвалі «Юнгер Арбайтэр», 135 — «Юнгер ленінец», 65 — «Дэр Амес», 55 — «Орка», 45 — «Трыбуна Радзецка», 32 — «Раудэпасіс Атрояс». У гэтым жа годзе ў час калектывізацыі ў раёне былі створаны 5 нацыянальных калгасаў, а ўсяго за гады калектывізацыі было створана 16 нацыянальных калгасаў.

Хаця ў цэлым беларускамоўная палітыка не прынесла жаданых вынікаў, і ў пачатку 40-х гадоў фактычна ўкаранілася двухмоўе, тым не менш нацыянальныя калгасы, нацыянальныя школы праіснавалі да самай вайны.

У перадваенныя гады значна пашырылася сетка медыцынскіх устаноў. Да 1939 г. ў раёне працавалі 2 бальніцы на 70 ложкаў, 7 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 5 акушэрскіх пунктаў, 1 радзільны дом, у іх працавалі 8 урачоў, 13 фельчараў, 22 акушэркі, 11 медсясцёр. У гэты час працавалі 63 сезонныя яслі для дзяцей на 2181 месца, 5 сярэдніх, 9 няпоўных сярэдніх, 55 пачатковых школ. У мяст. Крупкі адкрыўся ветэрынарны тэхнікум. За гады 2-й пяцігодкі былі пабудаваны дзіцячы дом у мяст. Бобр, школа ў Крупках, шэраг школ. *Дз.М.Хромчанка.*

Дакументы сведчаць

Звесткі аб ходзе ліквідацыі непісьменнасці і ўсеабучу па Крупскаму раёну на 1.4.1932 г

с/ саветы	лік непісьмен.	Ахоплена	%	лік малапісьмен.	Ахоплена	%	лік дзяцей 9—11 год	Ахоплена	%
Бобрскі с/с	246	221	90	521	220	41	498	493	99
Сакалавіцкі	287	219	86,8	217	126	73	231	231	100
Шэйскі	219	209	95	227	126	60	390	386	99
Шынкаўскі	328	292	89	108	88	31	225	221	98
Стара-Слабадскі	451	303	67	101	93	92	340	324	95
Ухвальскі	530	479	90	500	352	7	432	432	100
Выдрыцкі	250	234	93,6	471	160	93,5	232	230	99
М.Жаберыцкі	335	332	98	342	302	88	410	410	100
Ігрушскі	290	272	94	243	154	63	304	298	98
Нацкі	287	244	85	120	61	50	267	250	93
Узнацкі	297	269	90	391	142	36	322	320	97
Хацюхоўскі	517	458	87	430	215	50	493	482	98
Халопеніцкі	388	312	80	375	123	33	523	507	96
Грыцкаўскі	410	335	87,5	150	56	32	313	311	98
Абчутскі	240	145	70	216	181	70	405	201	99
Смародзінскі	249	216	86	347	279	70	267	263	99
Заборскі	285	202	71	246	121	65	395	391	99
Дубаўскі	373	223	62	191	191	100	351	349	99
Хальнявіцкі	346	225	65	198	29	11	340	323	94
Крупскі	339	272	80,2	284	91	32	667	659	98
Бобрскі м/с	80	70	87,5						
Крупскі м/с	92	77	87						
	6810	5583	82,7	5385	3108	58,3	7403	7273	98,4

Загадчык Крупскага раёна Чэпель

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф.293, воп.1, спр.25, л.1.

АБ ВЫНІКАХ МЕСЯЧНІКА ПА ПРАВЯДЗЕННЮ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ Ў 1931 г.

Пры правядзенні непасрэднай праверкі камісіямі правяраліся вядзенне спраў, адказы наведвальнікам праз пытанні да кожнага супрацоўніка ўстановы, члена і кандыдата партыі, пасля чаго праводзіліся падагульняючыя сходы па гэтай установе.

Праверка высветліла, што ў асноўным беларусізацыя апарата замацоўваецца, і пасля зімовай праверкі маецца некаторы зрух. Але ж шэраг апаратаў (сувязь, чыгунка, Белсельбуд, 6-я дыстанцыя) зусім дрэнна беларусізіраваны. Слаба беларусізіраваны апарат дзяржбанку, недастаткова валодае беларускай мовай і нацыянальнымі пытаннямі шэраг працаўнікоў іншых устаноў (камбінат, бальніца, каапсаюз).

Камісіяй вынесены пакаранні і прапановы па замацаванню беларусізацыі ў кожнай установе і кожным працаўніком.

Партыйна-масавая работа на прадпрыемствах і ў калгасах праводзіцца на беларускай мове. Ёсць наяўнасць шэрагу сяброў і кандыдатаў у КП(б)Б, якія недастаткова ўжываюць беларускую мову, а таксама шмат камуністаў зусім слаба разбіраюцца ў сутнасці пытання.

На ячэйках пры абмеркаванні вынікаў вынесены пакаранні членам і кандыдатам партыі і прапановы па замацаванню беларусізацыі і нацыянальнай палітыкі. У раёне маюцца наступныя нацыянальнасці: беларусы — 29 857, яўрэі — 2867, палякі — 1052, літоўцы —

296, украінцы — 46, латышоў — 29, рускіх — 216, немцаў — 3. Усе гэтыя нацыянальнасці раскіданы па ўсяму раёну, за выключэннем літоўцаў, якія жывуць у дзвюх вёсках Літвінка і Асінаўка і адна вёска Кляновічы. Нацыянальных калгасаў у раёне 5, інтэрнацыянальных — 7. Праца па абслугоўванню нацыянальных меншасцяў на роднай мове з боку партыі, КСМ, прафсавецкіх, кааператыўных і гаспадарчых арганізацый пастаўлена зусім дрэнна (за выключэннем яўрэяў) і праводзіцца выпадкова.

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 293, воп. 1, спр. 5, л. 2.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.

Восаўскія камунары

З успамінаў Аўдакеі Данілаўны Бурай

«У вёсцы Восава Лошніцкай воласці арганізавана ячэйка, у якую запісаліся 21 чалавек». З газеты «Известия Борисовского уездного Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов», 1919 г., 10 ліпеня.

Што мы рабілі? Па нядзелях збіраліся ў новай хаце Халімона Тоўсціка, там быў наш клуб, ім загадваў Валодзя — старэйшы сын Змітра Мікітавіча Тоўсціка, нашага кіраўніка. Збяромся і слухаем, як адзін ці другі чытае газету, бо не толькі мы, дзяўчаты, але і многія мужчыны ў ячэйцы былі непісьменныя. І не дзіва, што былі непісьменныя: школы ў Восава не было, нашы вучні хадзілі вучыцца грамаце аж за тры вярсты ў Ратуцічы. І задумала тады наша ячэйка адкрыць школу ў сваёй вёсцы. Сабралі на сходку ўсіх жыхароў. Усім восаўцам ўпадабалася прапанова ячэйкі. Якім Хацкевіч згадзіўся аддаць пад клас лепшую палову сваёй хаты. Свае ж, восаўскія майстры, узяліся зрабіць парты, стол і табурэтку для настаўніка. Аб'явіўся і настаўнік — сам Змітра Мікітавіч. Як радаваліся ў Восаве, калі ўсе дзеці пайшлі ў сваю школу! А недалёка ж, у Барысаве, стаяў фронт. А побач, у Красналуцкай воласці, арудавала банда «зялёнадубоўцаў» Семенюка. Але мы не баяліся іх! Усе хлопцы і мужчыны з ячэйкі аб'явілі сябе мабілізаванымі, атрымалі ў Лошніцы, у рэўкоме, вінтоўкі і патроны і кожную ноч ахоўвалі сваё Восава — двое патрульных хадзілі ў адным канцы вёскі, а двое — у другім.

Часта ў наш клуб прыходзілі хлопцы і дзяўчаты з суседняга Дакудава, з Клёна, з Ратуціч пачытаць газеты і паслухаць грамафон, які Лошніцкі рэўком рэквізаваў у ратуціцкага пана і перадаў нам. І паводзілі яны сябе ў клубе прыстойна, бо ім добры прыклад падавалі члены ячэйкі. Гарэлкі ніхто ў ячэйцы і ў рот не браў. А каб хто ўзяў, дык мы б яго адразу выключылі!

Ленінскім курсам, 1978. 4 крас.

Настаўніца Бобрскай школы А.І.Ісачова. 1930-я гады.

З успамінаў А.І.Усачовай (працавала настаўніцай у Бобрскай школе ў 1918—1923 гг.)

Я нарадзілася ў Мінску. У Бобр прыехала з мужам Васілём Ціханавічам у 1918 г. па запрашэнню Любові Іванаўны Вячэрскай, якая працавала тут у школе. У мяне была педагагічная адукацыя, а Васіль Ціханавіч яшчэ вучыўся завочна. Згодна перапісу ў мястэчку Бобр было больш за 400 дзяцей школьнага ўзросту.

У Бабры тады былі немцы, але нам удалося дамовіцца з іх начальнікам, што яны не будуць перашкаджаць у арганізацыі школы. З чаго пачаць? Сродкаў, памяшкання, падручнікаў і школьных прылад не было.

На бацькоўскім сходзе вырашылі, што кожная сям'я, дзе ёсць вучань, зробіць парту для школы. Заможныя жыхары мястэчка ўнеслі по 50 руб. Дзве яўрэйскія сям'і (прозвішча не помню) унеслі па 500 руб.

Знайшлі дошкі, зрабілі сталы і лаўкі. Пачалі заняткі ў памяшканні былога двухкласнага вучылішча. Кніг не было, настаўнікі дыктавалі, а дзеці запісвалі. Нас, настаўнікаў, было трое: я, Васіль Ціханавіч, Л.І.Вячэрская. Праграм таксама не было. Класы адкрылі з 1-га па 9-ы. Я выкладала рускую мову і літаратуру, геаграфію, псіхалогію,

маляванне; Васіль Ціханавіч — прадметы фізіка-матэматычнага цыкла, гісторыю, хімію.

У 1918 г. немцы пакінулі Бобр. Збег са свайго маёнтка палкоўнік Барталамей. Яго вялікі дом застаўся пустым, і мы атрымалі яго для школы. Усё каштоўнае было вывезена, засталіся толькі кветкі на вокнах. З мэблі засталіся пісьмовы стол, адно крэсла, піяніна і паламаная канапа.

Паўгода я была дырэктарам, потым, калі ў мяне нарадзіўся сын, дырэктарам выбралі Васіля Ціханавіча. Былі запрошаны ў школу настаўнікі. Арганізавалі бібліятэку. Спачатку дзеці прыносілі кнігі з дому. Кнігі былі парваныя, без пераплёту, мы рамантавалі іх. Потым Васіль Ціханавіч стаў прывозіць кнігі з Мінска і Масквы. У школе былі парадак і дысцыпліна. У Сенненскім павеце яна была лепшай, многія навучэнцы паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

ВЕРНУТЫЯ ІМЁНЫ

Складаныя абставіны склаліся на Беларусі, у тым ліку і на Крупшчыне ў 1930-я гады. З аднаго боку, упартая, самаадданая праца па наладжванні новага жыцця, пераўтварэнні краіны, з другога — трагічны лёс многіх несправядліва абвінавачаных людзей ва ўдзеле ў антысавецкіх дыверсійна-тэрарыстычных, контррэвалюцыйных арганізацыях, у шпіянажы на карысць Польшчы, антысавецкай прапагандзе, распаўсюджванні контррэвалюцыйных чутак, агітацыі супраць калгасаў, шкодніцтве і г.д.

Не проста было тады разабрацца ў тым, што адбывалася. Толькі праз гады стала вядома праўда пра тых, хто без прычыны загінуў у турмах і лагерах.

Ніжэй прыводзіцца спіс ураджэнцаў і жыхароў г. Крупкі і Крупскага раёна, якія сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій.

Многія з рэпрэсіраваных былі рэабілітаваны ў 1950—60-я гады і пазней. Іх чэсныя імёны сталі вядомы ў працэсе работы над кнігай «Памяць». Але застаецца нямала людзей, чый лёс яшчэ не высветлены да гэтага часу. Таму пошукавая работа ў архівах працягваецца.

У.І.Лемяшонак.

Ураджэнцы Крупскага раёна, якія падверглiся палітычным рэпрэсіям і пазней былі рэабілітаваны

АБЧУГСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АКУЛІЧ Канстанцін Аляксеевіч, н. ў 1891 у в. Абчуга, настаўнік. Асуджаны 9.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 23.10.1958.

БАЧКАР Акім Мінавіч, н. ў 1894 у в. Клубынічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 24.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.4.1989.

ГАМАНЬКОЎ Фёдар Сафонавіч, н. ў 1873 у в. Бяляны. Асуджаны 9.8.1932 на 3 гады высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 5.12.1989.

ДЗЕРНАКОЎ Данііл Кірылавіч, н. ў 1898 у в. Асечана, жыў у г. Тушына Маскоўскай вобл., чырвонаармеец. Асуджаны 5.10.1942 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 26.1.1994.

ЛАХМОТКА Іларыён Тарасавіч, н. ў 1926 у в. Краснавінка. У 1943 вывезены ў Германію. Асуджаны 7.9.1945 на 15 гадоў зняволення. Рэабілітаваны 18.12.1953.

МАЗУРЫН Іван Сямёнавіч, н. ў 1902 у в. Астроўкі, земляроб. Асуджаны 19.6.1932 на 3 гады з пазбаўленнем права пражывання ў пэўных населеных пунктах СССР. Рэабілітаваны 21.7.1989.

ПЯТРОВІЧ Рыгор Паўлавіч, н. ў 1897 у в. Касянічы, працаваў у калгасе. Асуджаны 8.10.1938 на 8 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 10.4.1989.

РАБЕЕЎ Леанід Васілевіч, н. ў 1919 у в. Шарпілаўка, курсант ваеннай часці № 211. Асуджаны 12.2.1943 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.3.1994.

РАБЦАЎ Гаўрыла Ігнатавіч, н. ў 1894 у в. Ламское, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 22.6.1935 на 8 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 22.12.1989.

РЭВУЦКІ Арсеній Сямёнавіч, н. ў 1893 у в. Прудзіны. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Памёр у 1941. Рэабілітаваны ў 1989.

СВІДЗЕРСКІ Анісім Васілевіч, н. ў 1872 у в. Лагі, цясляр. Асуджаны 14.8.1937 на 10 гадоў зня-

волення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.12.1989.

СЦІГНЕЕЎ Максім Іванавіч, н. ў 1881 у в. Забор'е, жыў у в. Асечана, працаваў у калгасе «Пуцілавец». Асуджаны 9.8.1932 на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 5.12.1989.

ФАНДО Ігнат Іванавіч, н. ў 1886 у в. Краснавінка, працаваў у калгасе «Новы шлях». Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 2.11.1937. Рэабілітаваны 13.6.1959.

ХРЫПАЧ Ананій Сазонавіч, н. ў 1894 у в. Астроўкі, жыў у в. Асечана, працаваў у калгасе «Пуцілавец». Асуджаны 9.8.1932 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 5.12.1989.

ХРЫПАЧ Усцін Сазонавіч, н. ў 1895 у в. Астроўкі, жыў у в. Асечана, працаваў у калгасе «Пуцілавец». Зняволены 9.8.1932 на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ЧАЧОТКІН Сафрон Мінавіч, н. ў 1884 у в. Хватынка. Асуджаны 28.9.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.10.1937 у Оршы. Рэабілітаваны ў 1959.

БОБРСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

БАРАНОЎСКІ Пётр Вікенцьевіч, н. ў 1915 у мяст. Бобр, дзяжурны на ст. Прыяміна Заходняй чыгункі. Асуджаны 29.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.12.1937. Рэабілітаваны 14.4.1989.

БУРЫ Пётр Іванавіч, н. ў 1892 у в. Восава, жыў на хутары Паўторышчына, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 30.5.1989.

ГАГАЛІНСКІ Вітольд Міхайлавіч, н. ў 1899 у в. Віктоліна, жыў у пас. Крупскі, загадчык ларка інваліднай арцелі. Асуджаны 22.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ГАРДЗІЕЎСКІ Юрый Гаўрылавіч, н. ў 1898 у в. Кляновічы, працаваў у калгасе імя Дзяржынскага. Асуджаны двойчы: у 1933 да высылкі на 5 гадоў у г. Мурманск і 29.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 11.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.3.1962.

ГІЛЕЎСКАЯ Яўфалія Пятроўна, н. ў 1923 у мяст. Бобр, навучэнка педагагічных курсаў. Асуджана 2.8.1946 на 4 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітавана 22.4.1983.

ДАНЬКОЎ Антон Максімавіч, н. ў 1902 у в. Красноўка, жыў на ст. Трацылава Заходняй чыгункі, пуцявы абходчык. Асуджаны 24.3.1937 на 4 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ЗАКРЭЎСКІ Ігнацій Антонавіч, н. ў 1905 на ст. Бобр, пуцявы абходчык ст. Бобр—Крупкі Заходняй чыгункі. Асуджаны 28.9.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ІВАНОЎ Максім Андрэевіч, н. ў 1895 у в. Падсосенка, служыў у Чырв. Арміі. Асуджаны 27.5.1943 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.12.1993.

КЕЙЗА Іван Юльянавіч, н. ў 1894 у в. Ліцвінка, працаваў у калгасе «Чырвоная Зорка». Асуджаны 19.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 5.11.1958.

КНАЦЬКО Іван Андрэевіч, н. ў 1896 у в. Сакалавічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 21.3.1933 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 19.5.1989.

КРУЦЬКО Пётр Дзмітрыевіч, н. ў 1922 у мяст. Бобр. Асуджаны 2.2.1943 на 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 18.9.1992.

МАКАРЭВІЧ Іван Тафілевіч, н. ў 1893 у в. Еленка, жыў у в. Ліцвінка, працаваў у калгасе «Чырвоная Зорка». Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.4.1989.

МАКАРЭВІЧ Мікалай Міронавіч, н. ў 1903 у в. Еленка, жыў у в. Ліцвінка, працаваў у калгасе «Чырвоная Зорка». Асуджаны 13.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 5.11.1958.

МАКРЫЦА Іван Сямёнавіч, н. ў 1897 у в. Мачулішча, жыў у мяст. Халопенічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 11.2.1931 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 1.8.1962.

МАРОЗАЎ Павел Мікалаевіч, н. ў 1892 у в. Шацькі, рабочы. Асуджаны ў жніўні 1937 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1989.

СЛАВІНСКІ Мікалай Антонавіч, н. ў 1886 у в. Кляновічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

СЛАДКОЎСКІ Рыгор Мікалаевіч, н. ў 1888 у в. Стаі, жыў у в. Кладзі, брыгадзір на Заходняй чыгунцы. Асуджаны 18.10.1944 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 4.8.1993.

СЯЛІЦКІ Антон Феліксавіч, н. ў 1865 у в. Сінічанка, жыў у в. Кляновічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ШКАРУБА Аляксей Фёдаравіч, н. ў 1870 у в. Пліса, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 28.9.1927 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.10.1937. Рэабілітаваны 28.3.1989.

ВЫДРЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БЕСПАЯСКА Фама Раманавіч, н. ў 1899 у в. Малое Горадна, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 24.5.1989.

ГАРА Лаўрын Ермалаевіч, н. ў 1863 у в. Малое Горадна, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 24.5.1989.

ІГНАТОВІЧ Кірыл Рыгоравіч, н. ў 1895 у в. Слоўч, жыў у в. Прудок, вартаўнік Крупскага лясгаса. Асуджаны 22.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.4.1989.

КАВАЛЕНКА Іван Дзям'янавіч, н. ў 1890 у в. Гаць, рабочы саўгаса «Перадавы». Асуджаны 15.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 31.3.1967.

КАРАНЬ Васіль Дзямідавіч, н. ў 1885 у в. Выдрыца, працаваў у калгасе. Асуджаны 19.5.1945 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.7.1993.

КАРАНЬ Емяльян Фёдаравіч, н. ў 1902 у в. Выдрыца, жыў у в. Прудок, працаваў у калгасе «Трактар». Асуджаны 20.1.1941 на 6 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, дзе памёр 3.4.1942. Рэабілітаваны 28.9.1993.

КАРАНЬ Кузьма Нічыпаравіч, н. ў 1870 у в. Выдрыца, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930, пасля з-пад варты вызвалены. Рэабілітаваны 24.5.1989.

МІКУЛЬСКІ Сяргей Савіч, н. ў 1883 у в. Выдрыца, жыў у в. Малыя Жаберычы, настаўнік нямецкай сярэдняй школы. Асуджаны 29.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 11.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

СІНЯК Макар Пятровіч, н. ў 1905 у в. Слоўч, жыў у в. Радзіца, працаваў у калгасе «Чырвоны барацьбіт». Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ДАКУДАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АКАЛОВІЧ Андрэй Васілевіч, н. ў 1910 у в. Малыя Жаберычы, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 19.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

АКУНЕВІЧ Ілья Рыгоравіч, н. ў 1912 у в. Малыя Жаберычы, трактарыст Крупскай МТС. Асуджаны 25.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

АКУНЕВІЧ Фёдар Рыгоравіч, н. ў 1893 у в. Жаберычы, рабочы «Белдрэўхімсаюза». Асуджаны 22.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.1.1958.

БЫКАЎ Іван Паўлавіч, н. ў 1899 у в. Клён, жыў у в. Малыя Жаберычы, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 5.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 8.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

БЫКАЎ Мікіта Фядосавіч (Фёдаравіч), н. ў 1899 у в. Клён, працаваў у калгасе імя Сталіна. Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 21.5.1968.

ГОРБАЧ Уладзімір Арэставіч, н. ў 1888 у в. Крыштопаўшчына, працаваў у калгасе імя Сталіна. Асуджаны 14.6.1940 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.3.1960.

ДРАНІЦА Іван Паўлавіч, н. ў 1870 у в. Вялікія Жаберычы, жыў у в. Радзіца, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 3.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 11.5.1989.

ЗАРОЎСКІ Сцяпан Апалінаравіч, н. ў 1898 у в. Крыштопаўшчына, працаваў на нафтабазе ст. Крупкі. Асуджаны 28.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 22.1.1959.

КАЗЛОЎСКІ Міхаіл Станіслававіч, н. ў 1896 у в. Гарошава, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

КАПТУР Уладзімір Тарасавіч, н. ў 1897 у в. Прыклёнак, рабочы барысаўскай фабрыкі «Камінтэрн». У кастрычніку 1937 асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны ў 1958.

КРУЧОК Іван Іосіфавіч, н. ў 1899 у в. Прыклёнак, вартаўнік лясгаса. Асуджаны 19.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

КРУЧОК Майсей Сідаравіч, н. ў 1876 у в. Клён, працаваў у калгасе імя Сталіна. Асуджаны 6.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 21.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 23.6.1989.

КРУЧОК Цімафей Рыгоравіч, н. ў 1903 у в. Прыклёнак, шавец. Асуджаны 9.5.1935 да зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 26.6.1989.

ЛАЗАРЭВІЧ Аляксандр Адамавіч, н. ў 1896 у в. Вялікія Жаберычы, рабочы Крупскага ўчастка «Белхімлесу». Асуджаны 25.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

ЛАЗАРЭВІЧ Сямён Канстанцінавіч, н. ў 1894 у в. Вялікія Жаберычы, цясляр. Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ЛАПАРЭВІЧ Максім Іванавіч, н. ў 1895 у в. Малыя Жаберычы, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 25.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

ЛАПАРЭВІЧ Пётр Іванавіч, н. ў 1900 у в. Малыя Жаберычы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 25.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ЛЫЦІН Лявон Зіноўевіч, н. ў 1887 у в. Малыя Жаберычы, рабочы саўгаса «Перадавы». Асуджа-

ны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

ЛЫЦІН Уладзімір Аксёнавіч, н. ў 1907 у в. Малыя Жаберычы, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

МАРЦІНКЕВІЧ Віталь Іванавіч, н. ў 1908 у в. Крыштопаўшчына, працаваў у калгасе імя Сталіна. Асуджаны 9.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 23.6.1989.

МАРЦІНКЕВІЧ Казімір Іванавіч, н. ў 1900 у в. Крыштопаўшчына, працаваў у калгасе імя Сталіна. Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

МАРЦІНКЕВІЧ Юльян Іванавіч, н. ў 1906 у в. Крыштопаўшчына, дырэктар школы ў в. Клён. Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

МОНІЧ Андрэй Марцінавіч, н. ў 1891 у в. Вялікія Жаберычы, старшыня калгаса імя Урыцкага. Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

МОНІЧ Васіль Емяльянавіч, н. ў 1874 у в. Малыя Жаберычы, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 25.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

МОНІЧ Ціт Ільіч, н. ў 1895 у в. Вялікія Жаберычы, працаваў у калгасе імя Урыцкага. Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

ОШКЕР Міхаіл Самуілавіч, н. ў 1906 у в. Малыя Жаберычы, бухгалтар Ігрушкаўскага сельпо. Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ОШКЕР Надзея Самуілаўна, н. ў 1907 у в. Малыя Жаберычы, працавала ў калгасе «Перамога». Асуджана 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляна 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітавана 7.7.1958.

ОШКЕР Самуіл Сямёнавіч, н. ў 1870 у в. Малыя Жаберычы, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

РАЛЕЙНА Сяргей Аксёнавіч, н. ў 1905 у в. Вялікія Жаберычы, электраманцёр. Асуджаны 25.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

СІДЛЯРОНАК Марцін Дзмітрыевіч, н. ў 1910 у в. Малыя Жаберычы, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 21.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 5.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

Г.І.Туманаў.

СІДЛЯРОНАК Міхаіл Мікітавіч, н. ў 1895 у в. Малыя Жаберычы. Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

СІДЛЯРОНАК Ягор Дзмітрыевіч, н. ў 1913 у в. Малыя Жаберычы, трактарыст Халопеніцкай МТС. Асуджаны 17.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

СМАЛЯГА Пётр Барысавіч, н. ў 1877 у в. Малыя Жаберычы, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

СМАЛЯГА Уладзімір Пятровіч, н. ў 1908 у в. Малыя Жаберычы, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 6.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 17.9.1957.

СТАРАДУБЕЦ Іосіф Паўлавіч, н. ў 1886 у в. Малыя Жаберычы, цясляр калгаса «Перамога». Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

ТУМАНАЎ (Тумар) Гаўрыіл Іванавіч, н. ў 1882 у в. Малыя Жаберычы, протаіерэй. Асуджаны ў лістападзе 1929 на 3 гады зняволення з высылкай на Поўнач. Памёр у 1975. Рэабілітаваны.

З артыкула Гаўрыіла Туманава «Свой крыж», які быў надрукаваны ў часопісе «Полымя» (1994, № 1).

...16 кастрычніка 1929 г. каля адзінаццаці гадзін ночы да мяне пастукаліся. У хату ўвайшлі трое — мясцовы ізбач, міліцыянер і ў цывільным упаўнаважаны АДПУ. Апошні намагаўся паказаць мне нейкую паперу, але я не стаў глядзець і пярэчыць супраць вобыску. Вобыск цягнуўся тры гадзіны, пасля чаго мне было прапанавана пайсці з імі. Калі мы

прыйшлі ў сельсавет, там было ўжо чалавек дзесяць арыштаваных і членаў іх сем'яў. У 5 гадзін раніцы пад аховай міліцыянера нас усіх, усяго 7 чалавек, завезлі ў Шклоў і пасадзілі ў арыштанцкую. На чацвёрты дзень пачаліся допыты, пасля якіх некаторых выпусцілі, на што спадзяваўся і я.

На пяты дзень пайшоў на допыт. Допыт праводзіў упаўнаважаны АДПУ з дзевяці гадзін вечара да трох гадзін ночы. Гэты допыт быў падобны на звычайную гаворку, асабліва шмат мы гаварылі пра рэлігію. Час ад часу мой субяседнік нешта запісваў на лісце, які і быў пратаколам допыту. Мне прапанавалі падпісаць яго. Я заўважыў, што да майго звароту да веруючых збіраць грошы на рамонт храма ў пратаколе было дададзена: «Падаткаў не плаціць, замест падаткаў дзяржаве прыносьце грошы ў царкву». А гэтага я не гаварыў. Праз тыдзень пад вялікай аховай нас перавялі ў магілёўскую турму. У той час, у канцы 1929 года ў магілёўскай турме знаходзілася больш як тры тысячы арыштантаў. Гэта была ўжо сталінская эпоха.

У асобныя дні вадзілі нас па аднаму і цэлымі групамі кудысьці, дзе ў падвале дапытвалі, фатаграфавалі і злавесна здымалі адбіткі пальцаў.

Аднойчы, як толькі мы ўладкаваліся на сон, забразгалі ключы, нехта зайшоў у адчыненыя дзверы і пачаў выклікаць нас па спіску. Было загадана названым ісці з рэчамі на выхад.

Турэмны двор быў запоўнены коннай і пешай міліцыяй з сабакамі. Канвою хапіла, каб акружыць нас, пастроеных па пяць у шарэнзе. Рэчы пагружаны на падводы, грошы і каштоўнасці таксама, было аб'яўлена, што іх павязуць з намі.

Было ўжо дзве гадзіны ночы, калі нас яшчэ раз праверылі, папярэдзілі не выходзіць са строю і не азірацца, не адставаць, рукі ў кішэнях не трымаць. За парушэнне гэтых правіл будуць страляць без папярэджання.

Вароты расчыніліся насцеж, і мы ў акружэнні конных і пешых канваіраў, а таксама сабак, выйшлі.

Па дарозе да вакзала нас гналі амаль што бягом, хто адставаў, падганялі прыкладамі.

На станцыі Магілёў на запасных пуцях нас чакаў спецыяльны вагон з закратаванымі вокнамі, у які нас пагрузілі па восем чалавек у купэ на чатырох.

Праз нейкі час вагон рушыў невядома куды... На станцыі Орша перад пасадкаю ў спецыяльны вагон, прысланы з Поўначы з аховаю, пры перадачы нас, нашых рэчаў і каштоўнасцей паўночнаму канвою нам было аб'яўлена ўпершыню:

«Пастановаю Тройкі вы высылаецеся на Поўнач тэрмінам на тры гады. А хто будзе добра працаваць і добра паводзіць сябе, тэрмін можа быць скарочаны. Старайцеся дзеля сябе».

Зноў нас па восем чалавек пагрузілі ў чатырохмеснае купэ. Адчыняць дзверы і выходзіць дазвалялася толькі ў туалет.

У дарозе мы былі тыдні тры.

Выпусцілі нас на свет божы толькі на станцыі Пінюга. Праз тыдзень... ужо з меншаю аховаю перавезлі ў горад Котлас, на Паўночнай Дзвіне, ля вытоку Сухоны і Вычагды. Размясцілі ў чыгуначнай казарме і прапанавалі самім шукаць кватэры. Я і яшчэ два бацюшкі ўладкаваліся да ўдавы чыгуначніка.

На наступны дзень нам прапанавалі назваць сваю спецыяльнасць і ісці працаваць на астравок Макарыха за 3 км.

Я і іншыя, хто не валодаў канкрэтнай спецыяльнасцю, засталіся. Вечарам тыя, хто працаваў, былі накормлены, а мы засталіся галоднымі. На наступны дзень мы ўсе выйшлі на работу.

З павагі да мяне як да бацюшкі група землякоў, якая арганізавалася ў брыгаду, прапанавала мне быць брыгадзірам. І мы прыступілі да работы.

Брыгада атрымалася добрая, дванаццаць чалавек, усе вопытныя, працавітыя будаўнікі. Мне заставалася толькі забяспечваць іх сякерамі, піламі, цвікамі... Работа ішла паспяхова. Брыгада лічылася адной з лепшых.

На Макарысе працавала 12 брыгад. Будаваліся баракі 20 × 10 метраў. Мая брыгада будавала такі барак за 3—4 дні, узнагародай нам быў большы хлебны паёк — па 500 грамаў, а астатнія атрымлівалі па 400. Калі астатнія пачалі крыўдзіцца і паёк усім зрабілі па 500 грамаў, то мая брыгада атрымлівала па 600.

Калі з Архангельска прыехаў высокі начальнік правяраць будаўніцтва і падышоў да маёй брыгады, прараб паказаў на мяне і сказаў:

— Гэта поп, брыгадзір самай лепшай брыгады, за 3 дні будуюць барак.

Начальнік адобрыў і сказаў:

— Як закончыцца будоўля, будзеце вызвалены.

Бязлюдны астравок сярод балота за два месяцы быў забудаваны баракамі, вырас цэ-

лы гарадок. Ніхто не здагадваўся — навошта.

Сакавік 1930 года быў суровы, марозны. У гэтую пару і пачуліся гудкі паравозаў, і пайшлі натоўпы жывога тавару да нашага будаўніцтва.

Мы, будаўнікі гэтага гаротнага гарадка, замест абяцанага датэрміновага вызвалення былі пераведзены на будаўніцтва порта ў горадзе Котлас на беразе вялікай ракі Дзвіны.

А потым мне была даверана нафтаналіўная баржа. Гэтым я, палітычна асуджаны, ганарыўся. Мне зайздросцілі. На трэці год Поўначводбуд атрымаў новую баржу, і яе таксама даверылі мне. На ёй я і праплаваў да канца свайго тэрміну і пакуль былі афармлены дакументы.

У цэлым мая высылка была даволі ўдалая ў параўнанні з іншымі, бо насельніцтва адносілася да нас вельмі насцярожана і варожа. А я нават меў на кватэры ў гаспадароў уласны вулей з пчоламі. Мае сябры сабралі рой, які ўцёк, і падарылі мне.

Тэрмін майго зняволення па рашэнні «тройкі» заканчваўся 16 кастрычніка 1932 года.

На той час, калі мяне забралі, у мяне было два сыны і тры дачкі, з намі жыла і мая маці.

Але сям'і дома я не знайшоў. Мая сям'я была выкінута з памяшкання, дом перададзены сельсавету.

У Крупках мяне папярэдзілі, што з'яўляцца мне небяспечна, але я спадзяваўся на савецкі пашпарт і накіраваўся ў сваю родную вёску Малыя Жаберычы да брата.

Сустрэча была радасная, але са слязьмі.

На наступны дзень мне загадана было з'явіцца ў міліцыю. Там мне растлумачылі, што пашпарт мой будзе адасланы ў Котлас, бо ён выдадзены з падманам, — я не «рабочы», а поп. А мне было прапанавана за 24 гадзіны пакінуць раён, бо ён адносіцца да прыгранічнай зоны. Я прасіў вярнуць мне пашпарт, але ў адказ толькі прыгразілі арыштаваць.

Я ўсё ж адважыўся, наведаў сваіх родных у вёсках Лужа, Казубец і Радзіца і знік з раёна. Тым часам я ўжо меў трохмесячнае права на жыхарства. З гэтым дакументам я і рушыў на поўдзень.

У Сімферопалі ў пчалярскай канторы мяне накіравалі працаваць на матачнік — хутар Усцінаўка. Працу я хутка асвоіў, працаваў з ахвотаю, замест часовага пасведчання атрымаў пашпарт і з ім пайшоў у чарговы адпачынак дадому. Накупляў падарункаў родным, але ў Харкаве ў мяне ўкралі і чамадан, і мяшок.

Дабраўся да родных сваіх Малых Жаберыч, да дома брата. Але там усё паўтарылася, як і раней: выклік у сельсавет, міліцыя, у выніку чаго я зноў застаўся без пашпарта і на працягу 24 гадзін павінен быў пакінуць раён.

Забягаючы наперад, скажу, што родныя Жаберычы я наведаў яшчэ і ў 1936 годзе, адкуль зноў быў выкінуты без пашпарта, а наведванне ў 1937 годзе ледзь не каштавала мне волі, а, магчыма, і самога жыцця.

ТУМАР Васіль Іванавіч, н. ў 1895 у в. Малыя Жаберычы, загадчык фермы калгаса «Перамога». Асуджаны 21.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 5.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 11.2.1958.

ХАДАСЕВІЧ Марцін Міхайлавіч, н. ў 1907 у в. Дакудава, старшыня калгаса «Новы быт». Асуджаны 13.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ХАДАСЕВІЧ Фёдар Рыгоравіч, н. ў 1896 у в. Дакудава, працаваў у калгасе «Новы быт». Асуджаны 28.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

ЦЯЦЕРСКІ Пётр Іпалітавіч, н. ў 1897 у в. Шыя, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 22.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ЦЯЦЕРСКІ Серафім Іванавіч, н. ў 1891 у в. Дакудава, працаваў у калгасе «Новы быт». Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ДЗЯНІСАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БУЛЫГА Васіль Платонавіч, н. ў 1912 у в. Папарнае, чырвонаармеец. Асуджаны 15.6.1942 да зняволення ў папраўча-працоўны лагер на перыяд вайны. Рэабілітаваны 31.7.1958.

КЛЯШЧОНАК Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1887 у в. Дзянісавічы, жыў у в. Шынкі, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 15.12.1929 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 26.3.1992.

КЛЯШЧОНАК Дзяменцій Кузьміч, н. ў 1882, працаваў у Крупскім леспрамгасе. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Загінуў 14.7.1943. Рэабілітаваны ў 1964.

МАКАРЭВІЧ Іван Андрэевіч, н. ў 1880 у в. Дзянісавічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 20.5.1933 на 3 гады да высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 26.12.1989.

ЮБКО Дзмітрый Елісеевіч, н. ў 1900 у в. Стары Сакол, працаваў у калгасе «Іскра». Асуджаны

30.11.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 17.2.1939.

ЮБКО Елісей Савіч, н. ў 1865 у в. Стары Сакол, працаваў у калгасе «Іскра». Асуджаны 30.11.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 17.2.1939.

ІГРУШКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АСІПОВІЧ Васіль Макаравіч, н. ў в. Радзіца.

АСІПОВІЧ Савелій Маркавіч, н. ў 1891 у в. Радзіца, працаваў на чыг. ст. Крупкі. Асуджаны 25.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

АСІПОВІЧ Яфім Якаўлевіч, н. ў 1908 у в. Радзіца, працаваў у калгасе «Чырвоны барацьбіт». Асуджаны 5.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

БАРЭЙКА Уладзімір Феліксавіч, н. ў 1902 у в. Батуры, настаўнік Малажаберыцкай няпоўнай сярэдняй школы. Асуджаны 24.11.1945 на 5 гадоў высылкі ў Цюменскую вобласць. Рэабілітаваны 20.11.1989.

БЕЛЬСКІ Міхаіл Іванавіч, н. ў 1901 у в. Радзіца, працаваў у калгасе «Чырвоны барацьбіт». Асуджаны 25.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ГАРБАЧОЎ Іван Рыгоравіч, н. ў 1899 у в. Вострава, працаваў у калгасе. Асуджаны 26.5.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 28.12.1960.

ГЛІННІК Ігнат Паўлавіч, н. ў 1868 у в. Самаседаўка, хлебароб. Асуджаны 3.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 30.5.1989.

ГРАБЯНЦОЎ Аляксей Лукіч, н. ў 1874 у в. Каралёва, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 3.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 17.11.1989.

ДЗЯНІСАЎ Іван Васілевіч, н. ў 1908 у в. Узнацк, працаваў у калгасе «Новы шлях». Асуджаны 15.10.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, дзе памёр 12.5.1944. Рэабілітаваны 24.11.1958.

ДЗЯНІСАЎ Міхаіл Якаўлевіч, н. ў в. Узнацк, працаваў у калгасе «Новы шлях». Асуджаны двойчы: 11.10.1938 на 8 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер і 2.6.1951 да высылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 24.11.1958.

ЗАКРЭЎСКІ Іосіф Ігнатавіч, н. ў 1888 у в. Гута, працаваў у калгасе. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 15.6.1989.

ЗАКРЭЎСКІ Франц Іосіфавіч, н. ў 1911 у в. Гута, працаваў у калгасе. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер, дзе памёр 25.8.1942. Рэабілітаваны 15.6.1989.

КАНАШЭВІЧ Андрэй Сямёнавіч, н. ў 1900 у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

КАНАШЭВІЧ Мікалай Іосіфавіч, н. ў 1906 у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

КАРПОВІЧ Якаў Антонавіч, н. ў 1894 у в. Вострава, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 3.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 6.1.1961.

ЛАПАРЭВІЧ Антон Адамавіч, н. ў 1888 у в. Радзіца, грузчык нарыхтоўчай канторы на ст. Крупкі. Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ЛАПАРЭВІЧ Даніла Лаўрэнцьевіч, н. ў 1868 у в. Радзіца, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 3.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 11.5.1989.

ЛАПАРЭВІЧ Мікалай Адамавіч, н. ў 1896 у в. Радзіца, працаваў у калгасе «Чырвоны барацьбіт». Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

ЛАПАРЭВІЧ Сцяпан Ільіч, н. ў 1909 у в. Радзіца, пажарнік Крупскай нафтабазы. Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

МАЗО Залман Ісаравіч, н. ў 1894 у в. Радзіца, рабочы чыг. ст. Крупкі. Асуджаны 19.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

МАКАРАЎ Павел Клімавіч, н. ў 1894 у в. Ваўкавыск, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

МІЦКЕВІЧ Апанас Рыгоравіч, н. ў 1907 у в. Радзіца, працаваў у калгасе «Чырвоны барацьбіт». Асуджаны 5.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

МІЦКЕВІЧ Нічыпар Якаўлевіч, н. ў 1895 у в. Радзіца, працаваў у калгасе «Чырвоны барацьбіт». Асуджаны 29.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.4.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 14.7.1958.

НЯЧАЕЎ Ягор Навумавіч, н. ў 1899 у в. Кругліца, працаваў у калгасе. Асуджаны 22.4.1947 на 15 гадоў катаргі. Рэабілітаваны 11.2.1960.

ПЛІСКО Гаўрыла Нічыпаравіч, н. ў 1897 у в. Узнацк, жыў на хутары Яловік, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 10.5.1989 і 14.5.1992.

ПЛІСКО Іван Нічыпаравіч, н. ў 1905 у в. Узнацк, жыў на хутары Яловік, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны двойчы: 28.4.1989 і 14.5.1992.

ПЛІСКО Іван Рыгоравіч, н. ў 1911 у в. Узнацк, працаваў у калгасе «Новы шлях». Асуджаны 26.9.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.11.1958.

ПЛІСКО Макар Рыгоравіч, н. ў 1902 у в. Батуры, трактарыст Халопеніцкай МТС. Асуджаны 25.5.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.7.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 24.11.1958.

ПЛІСКО Нічыпар Фёдаравіч, н. ў 1860 у в. Узнацк, жыў на хутары Яловік, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны двойчы: 10.5.1989 і 14.5.1992.

ПЯТРОВІЧ Гаўрыла Аляксандравіч, н. ў 1885 у в. Радзіца, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 3.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 11.5.1989.

РАДЗІШЭЎСКІ Аляксей Сямёнавіч, н. ў 1907 у в. Каралёва, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 5.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 18.10.1989.

РАДЗІШЭЎСКІ Вячаслаў Сямёнавіч, н. ў 1905 у в. Каралёва, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 5.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 18.10.1989.

РОГАВА Таццяна Фамінічна, н. ў 1902 у в. Радзіца, сялянка-аднаасобніца. Асуджана 3.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітавана 11.5.1989.

РОГАЎ Міхей Сцяпанавіч, н. ў 1862 у в. Узнацк, жыў у в. Батуры, хлебароб. Асуджаны 5.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 13.6.1989.

РУХЛІНСКІ Аляксей Сямёнавіч, н. ў 1908 у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

РУХЛІНСКІ Дзмітрый Усцінавіч, н. ў 1886 у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

РУХЛІНСКІ Нічыпар Сямёнавіч, н. ў 1903 у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

РУХЛІНСКІ Сямён Цімафеевіч, н. ў 1873 у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.5.1989.

САДОЎСКІ Мікалай Іларыёнавіч, н. ў 1897 у в. Вострава, жыў на хутары Ізобкі, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 24.4.1930 да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 28.12.1989.

СМАЛЯГА Дзямід Раманавіч, н. ў 1893 у в. Самаседаўка, хлебароб. Асуджаны 3.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 30.5.1989.

СМАЛЯГА Рыгор Прохаравіч, н. ў 1880 у в. Самаседаўка, хлебароб. Асуджаны 3.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 30.5.1989.

СМАНЦАР Пётр Міхайлавіч, н. ў 1892 у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.5.1989.

СМАНЦАР Сяргей Цімафеевіч, н. ў 1896 у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

СМАНЦАР Цімафей Раманавіч, н. ў 1875 у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.5.1989.

СТАСЕВІЧ Аляксандр Андрэевіч, н. ў 1895 у в. Самаседаўка, хлебароб. Асуджаны 3.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 30.5.1989.

ТАЎКАЧ Іосіф Фаміч, н. ў 1902 у в. Узнацк, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ТАЎКАЧ Фама Ільіч, н. ў 1874 у в. Узнацк, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

УСОШЫН Іван Трафімавіч, н. ў 1906 у в. Радзіца, брыгадзір калгаса «Чырвоны барацьбіт». Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

УСОШЫН Трафім Еўтухавіч, н. ў 1898 у в. Радзіца, працаваў у калгасе «Чырвоны барацьбіт». Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 14.7.1958.

ШАПЛОЎ Алімп Алімпавіч, н. ў 1882 у в. Вострава, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 3.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 6.1.1961.

ШАПЛОЎ Андрэй Мікітавіч, н. ў 1885 у в. Вострава, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 3.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 6.1.1961.

ШАПЛОЎ Васіль Якаўлевіч, н. ў 1896 у в. Вострава, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 3.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 6.1.1961.

ШАПЛОЎ Лявон Мікітавіч, н. ў 1893 у в. Вострава, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 3.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 6.1.1961.

ЯКАЎЛЕЎ Мікалай Ягоравіч, н. ў 1875 у в. Ігрушка, жыў у в. Гапонавічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1983.

ЯШЧАНКА Пракоп Самсонавіч, н. ў 1907 у в. Ваўкавыск, жыў у в. Гапонавічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 8.7.1931 на 10 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 23.9.1989.

КАСТРЫЧНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БЯДРЫЦКІ Дзмітрый Трыфанавіч, н. ў 1909 у в. Тапарышча, працаваў у калгасе «Полымя рэвалюцыі». Асуджаны 24.11.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, памёр 23.9.1943. Рэабілітаваны 11.6.1960.

КОСТАЧКА Стафан Дзямідавіч, н. ў 1885 у в. Дакучыно, працаваў у калгасе. Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 2.11.1937. Рэабілітаваны 3.8.1963.

КРЫВІЦКІ Іосіф Паўлавіч, н. ў 1885 у в. Дубраўка, жыў у в. Ляды, рабочы нарыхтоўчай канторы. Асуджаны 29.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 5.2.1959.

МАСКАЛЁЎ Віктар Ільіч, н. ў 1907 у в. Тапарышча, старшыня калгаса «Полымя рэвалюцыі». Асуджаны ў 1939 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер у г. Вяцк Архангельскай вобл. У 1942 прызваны ў. Чырв. Армію, прапаў без вестак у верасні 1944.

НЯЧАЕЎ Міхаіл Васілевіч, н. ў 1899 у в. Язбы, брыгадзір торфазавода «Асінторф» Аршанскага р-на. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 26.3.1960.

ПАЛІТЫКА Радзівон Ільіч, н. ў 1891 у в. Лютыя, працаваў у калгасе «Ударнік». Асуджаны 15.11.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Знаходзіўся ў турме г. Барысаў, потым прапаў без вестак. Рэабілітаваны 30.11.1955.

ПАЛІТЫКА Уладзімір Ільіч, н. ў 1903 у в. Лютыя, працаваў у калгасе «Ударнік». Асуджаны 15.11.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Знаходзіўся ў турме г. Барысаў, потым прапаў без вестак. Рэабілітаваны 30.11.1955.

Дз.Ф.Прышчэпаў.

ПРЫШЧЭПАЎ Дзмітрый Філімонавіч, н. ў 1896 у в. Малінаўка. У 1924—25 народны камісар земляробства Беларусі, з 1929 намеснік старшыні Дзяржплана Беларусі. Асуджаны ў 1937 да вышэйшай меры пакарання. Памёр 31.1.1940 у турме. Рэабілітаваны.

ПРЫШЧЭПАЎ Піліп Васілевіч, н. ў 1888 у в. Калодніца, жыў у в. Малінаўка, працаваў у калгасе «Іскра». Асуджаны 24.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 24.6.1961.

СТАЛЯРОЎ Фама Гаўрылавіч, н. ў 1890 у в. Дубраўка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 30.6.1989.

ШКІНДЭРАЎ Іван Кандратавіч, н. ў 1887 у в. Малыя Хальнявічы, працаваў у калгасе «Чырвоны земляроб». Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, дзе памёр 16.2.1938. Рэабілітаваны 24.12.1960.

ШКУПІЛА Ілья Карнеевіч, н. ў 1901 у в. Калодніца. Рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1946.

ЮРКЕВІЧ Андрэй Міхеевіч, н. ў 1903 у в. Дакучыно, працаваў у калгасе «Прамень Леніна». Асуджаны 16.11.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК КРУПКІ

КАРАЛЬКОЎ Мікалай Марцьянавіч, н. ў 1898 у мяст. Крупкі, жыў у Ленінградзе, ваеннаслужачы. Асуджаны 31.10.1941 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.12.1993.

МІЛЕНЦЬЕЎ Уладзімір Данілавіч, н. ў 1925 у мяст. Крупкі, ваеннаслужачы. Асуджаны 4.11.1949 на 25 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.10.1954.

ПЫЖЫК Іван Кандратавіч, н. ў 1904 у Крупках, дырэктар падсобнай гаспадаркі саўгаса «Сыркцы» Талачынскага р-на. Асуджаны 2.12.1936 на 20 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.11.1957.

З архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь:

«...Произведенным следствием по делу установлено, что факты контрреволюционных троцкистских выступлений Пыжика подтверждаются, как-то:

16 июля с.г. Пыжик, находясь в квартире Звиняцковского, отрицательно высказался о работе т. Сталина в период гражданской войны.

Свидетели... характеризуют Пыжика как антисемита, проводящего антисемитскую работу в форме разных анекдотов, как человека

грубого и издевательски относящегося к рабочим...»

Суд прысудзіў І.К.Пыжыка да турэмнага зняволення. Спатрэбілася больш дваццаці гадоў, каб следчым органам стала зразумела, што «суд неправильно расценил высказывания Пыжика, которые по своему содержанию не подпадают под ст. 72 УК БССР». 20 лістапада 1957 г. Пленум Вярхоўнага Суда СССР згодна з пратэстам Генеральнага Пракурора СССР адмяніў прыгавор Мінскага суда Заходняй чыгункі ад 2 снежня 1936 г. і вырашыў судовую справу на І.К.Пыжыка адмяніць за адсутнасцю саставу злачынства.

Ленінскім курсам. 1992, 22 ліпеня.

Г.Грыгор'еў, В.Грыгор'ева

КРУПСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРАДАЧ Якаў Клімавіч, н. ў 1882 у в. Бярозаўка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 19.6.1932 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер і высланы на Поўнач. Рэабілітаваны 10.5.1989.

БАРАНОЎСКІ Антон Вікенцьевіч, н. ў 1893 у в. Брадок, жыў у мяст. Крупкі, прыватны рамізнік. Асуджаны 11.11.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.3.1989.

БЕЛЬСКІ Нічыпар Пятровіч, н. ў 1863 у в. Гапонавічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

ВІШНЕЎСКІ Іван Ульянавіч, н. ў 1898 у в. Шырневічы, жыў у пас. Крупскі, дзяжурны на чыг. ст. Крупкі Беларускай чыгункі. Асуджаны 28.9.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, памёр 24.5.1944. Рэабілітаваны 29.1.1959.

ВЯРЦІНСКІ Міхаіл Емяльянавіч, н. ў 1884 у в. Зароўе, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 27.2.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 10.1.1959.

ГЕДРОЙЦ Міхаіл Антонавіч, н. ў 1887 у в. Сяліцкае, арцельны староста на чыг. ст. Крупкі. Асуджаны 26.1.1931 на 6 месяцаў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 27.12.1989.

ДРАЗДОЎСКІ Адольф Іванавіч, н. ў 1893 у в. Маласаі, жыў у в. Сяліцкае, рабочы на чыгунцы. Асуджаны 22.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.5.1989.

ЖУКАЎ Павел Міхайлавіч, н. ў 1927 у в. Селішча, ваеннаслужачы. Асуджаны 5.6.1950 на 25 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 30.12.1965.

ЖЫЛІНСКІ Максім Паўлавіч, н. ў 1912 у в. Селішча, працаваў у калгасе «Чырвоная ніва». Асуджаны 30.12.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 21.3.1989.

ЗАКРЭЎСКІ Людвіг Антонавіч, н. ў 1900 у в. Студзёнка, працаваў у калгасе. Асуджаны 10.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 28.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 17.9.1992.

КАБАНАЎ Лука Васілевіч, н. ў 1908 у в. Шырневічы, жыў у в. Радзіца, працаваў у калгасе «Чырвоны барацьбіт». Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 6.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.4.1989.

КАЗЛОЎ Фёдар Іванавіч, н. ў 1892 у в. Ротань, жыў у в. Ляды, старшыня калгаса «Прамень свабоды». Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 5.2.1959.

КАНДРАЦЕНКА Ягор Дзмітрыевіч, н. ў 1902 у в. Лазоўка, жыў у в. Кругліца, працаваў у калгасе. Асуджаны 22.4.1947 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.5.1955.

КАПЕЙКІН Прохар Сямёнавіч, н. ў 1881 у в. Худаўцы, цясляр калгаса «Бальшавік». Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.5.1989.

КАПЕЙКІНА Настасся Іванаўна, н. ў 1887 у в. Худаўцы, працавала ў калгасе «Бальшавік». Асуджана 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляна 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітавана 31.3.1989.

КАРАСЬ Адам Міхайлавіч, н. ў 1907 у в. Ляды, трактарыст калгаса «Прамень свабоды». Асуджаны 9.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 5.2.1992.

КАРАСЬ Пётр Алімпавіч, н. ў 1893 у в. Ляды, працаваў у калгасе «Прамень свабоды». Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 28.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.3.1962.

КАРАСЬ Рыгор Сямёнавіч, н. ў 1870 у в. Ляды, працаваў у калгасе. Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 5.2.1959.

КАТОЎСКІ Васіль Міхайлавіч, н. ў 1893 у в. Шырневічы, жыў у в. Малыя Жаберычы, дырэктар няпоўнай сярэдняй школы. Асуджаны 25.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 7.7.1958.

КОШАЛЁЎ Васіль Паўлавіч, н. ў 1880 у в. Худаўцы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 15.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, дзе памёр 23.11.1937. Рэабілітаваны 6.4.1989.

КОШАЛЁЎ Марцін Мікалаевіч, н. ў 1872 у в. Худаўцы, рабочы Крупскай хлебапякарні. Асуджаны 15.9.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 30.9.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 6.5.1989.

КОШАЛЁЎ Трафім Мікалаевіч, н. ў 1888 у в. Худаўцы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 15.9.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 30.9.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 6.5.1989.

КРАСОЎСКІ Карп Марцінавіч, н. ў 1905 у в. Ляды, працаваў у калгасе «Прамень свабоды».

Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 9.5.1962.

КРАСОЎСКІ Якаў Пракопавіч, н. ў 1909 у в. Ляды, працаваў у калгасе «Прамень свабоды». Асуджаны 9.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.11.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 23.6.1989.

КСЯНЗОЎ Іван Васілевіч, н. ў 1909 у в. Баравыя, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

КСЯНЗОЎ Рыгор Васілевіч, н. ў 1900 у в. Баравыя, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.5.1989.

МАКОЎКА Цімафей Іванавіч, н. ў 1885 у в. Ляды, працаваў у калгасе «Прамень свабоды». Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 5.2.1959.

РАБАЎ Аляксей Лук'янавіч, н. ў 1881 у в. Худаўцы, працаваў у калгасе «Бальшавік». Асуджаны 15.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 6.5.1989.

РАБАЎ Васіль Савельевіч, н. ў 1902 у в. Худаўцы, працаваў у калгасе «Бальшавік». Асуджаны 15.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 6.5.1989.

РАДУШКЕВІЧ Сцяпан Мікалаевіч, н. ў 1884 у в. Ляды, працаваў у калгасе «Прамень свабоды». Асуджаны 9.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 23.6.1989.

РАПІЦКІ Кандрат Васілевіч, н. ў 1892 у в. Ляды, працаваў у калгасе «Прамень свабоды». Асуджаны 25.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 5.2.1959.

РАПІЦКІ Стафан Кандратавіч, н. ў 1894 у в. Ляды, працаваў у калгасе «Прамень свабоды». Асуджаны 28.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 9.5.1962.

РАТНІЦКІ Гіля Янкелевіч, н. ў 1869 у в. Худаўцы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

РАУЛА Карп Макаравіч, н. ў 1890 у в. Ляды, працаваў у калгасе «Прамень свабоды». Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 6.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 5.2.1959.

РЖЭУЦКІ Іосіф Францавіч, н. ў 1895 у в. Гапонавічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

РУХЛІНСКІ Іван Усцінавіч, н. ў 1875 у в. Навахросты, жыў у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.5.1989.

РУХЛІНСКІ Павел Пятровіч, н. ў 1897 у в. Навахросты, жыў у в. Каменка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

СМАНЦАР Антон Ігнатавіч, н. ў 1880 у в. Вялікая Слабада, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.5.1989.

СМАНЦАР Віктар Іванавіч, н. ў 1881 у в. Вялікая Слабада, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

СМАНЦАР Мікіта Іванавіч, н. ў 1887 у в. Вялікая Слабада, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.5.1989.

СМАНЦАР Міхаіл Ігнатавіч, н. ў 1888 у в. Вялікая Слабада, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

СЕРМЯЖКА Мікіта Антонавіч, н. ў 1904 у в. Асінаўка, жыў у в. Ляды, старшыня калгаса «Прамень свабоды». Асуджаны 17.5.1933 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ФРАНСКЕВІЧ (ФРАНЦКЕВІЧ) Віктар Пятровіч, н. ў 1875 у в. Новы Засценак, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ХАЗАН Пётр Захаравіч, н. ў 1929 у в. Худаўцы, працаваў у калгасе «Маяк». Асуджаны 15.2.1951 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, 27.3.1953 вызвалены з-пад варты са зняццем судзімасці. Рэабілітаваны 8.10.1993.

ШАПЧЫЦ Апалінарый Браніслававіч, н. ў 1894 у в. Маласаі, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 8.7.1931 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.9.1989.

НАЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГАЙДУК Фёдар Раманавіч, н. ў 1919 у в. Нача, чырвонаармеец. Асуджаны 28.6.1942 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 18.7.1989.

ДРАНІЦА Фёдар Мікітавіч, н. ў 1894 у в. Дубешня, жыў у мяст. Крупкі, грузчык чыг. ст. Крупкі. Асуджаны 28.9.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, дзе памёр 26.5.1942. Рэабілітаваны 29.1.1959.

ЗЛАТКЕВІЧ Уладзімір Сцяпанавіч, н. ў 1908 у в. Нача, бухгалтар смалакурнай арцелі імя Варашылава. Асуджаны 28.9.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 16.10.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 22.3.1989.

КАЗЛОЎ Міхаіл Рыгоравіч, н. ў 1897 у в. Нача. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, потым працаваў у органах НКУС. У 1934 закончыў ваенную акадэмію, генерал-лейтэнант, памочнік каменданта Крамля. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1940.

М.Р.Казлоў.

З успамінаў Н.А.Канашэвіч

Мая матуля, Занімонец Таццяна Ананьеўна, была сваячкай М.Р.Казлова. Аднойчы, калі мы жылі ў в. Каўпыніца, да нас зайшоў ваенны ў вялікім чыне. У руках у яго быў чамадан. Мы, дзеці, схаваліся, але мама сказала, што гэта дзядзька Міхаіл з Масквы. У час гутаркі ён дастаў некалькі фотаздымкаў, дзе быў сфатаграфаваны разам са Сталіным.

Потым, калі мы вучыліся ў школе, бацька неяк пачуў, як дзеці гаварылі пра дзядзьку, што працуе ў Крамлі. Але ён нам тады строга сказаў, што мама ўсё выдумала і нікога з нашых сваякоў у Крамлі няма. Толькі тады, калі я выпадкова даведалася, што Казлова расстралялі як «ворага народа», усё стала зразумелым.

ПАЦЫНА Казімір Раманавіч, н. ў 1888 у в. Каўпыніца, працаваў у калгасе «1-я пяцігодка». Асуджаны 17.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.6.1989.

ПРЫСТАЎКА Сяргей Яфімавіч, н. ў 1876 у в. Барок, працаваў у калгасе імя Леніна. Асуджаны 30.12.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 10.4.1989.

ЯРОЦКІ Міхаіл Фаміч, н. ў 1883 у в. Каўпыніца, працаваў у калгасе «1-я пяцігодка». Асуджаны 28.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937. Рэабілітаваны 30.4.1989.

УХВАЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЎХІМОВІЧ Васіль Лазаравіч, н. ў 1903 у в. Гібайлавічы, працаваў у калгасе імя Куйбышава. Асуджаны 15.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, дзе памёр 8.1.1942. Рэабілітаваны 9.7.1965.

АРЦЯМЁНАК Сямён Іванавіч, н. ў 1879 у в. Узнаж, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 27.3.1989.

ВАРАНОВІЧ Іосіф Сямёнавіч, н. ў 1897 у в. Чарнавосава, працаваў у калгасе імя Будзённага. Асуджаны 28.9.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.10.1937. Рэабілітаваны 22.3.1989.

ВЕРНІКОЎСКІ Гвідон Гвідонавіч, н. ў 1907 у в. Матошка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ВЕРНІКОЎСКІ Ігнат Гвідонавіч, н. ў 1895 у в. Матошка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ВЕРНІКОЎСКІ Людвіг Гвідонавіч, н. ў 1910 у в. Матошка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ВЕРНІКОЎСКІ Станіслаў Гвідонавіч, н. ў 1903 у в. Матошка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ГАЙДУК Сцяпан Рыгоравіч, н. ў 1889 у в. Узнаж, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 27.3.1989.

ГАНЧАРОЎ Пётр Арцёмавіч, н. ў 1906 у в. Забянькова, ваеннаслужачы. Асуджаны 21.4.1945 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 21.3.1969.

ГАРЭЦКІ Вікенцій Міхайлавіч, н. ў 1874 у в. Матошка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ГАРЭЦКІ Сігізмунд Вікенцьевіч, н. ў 1908 у в. Матошка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

КАЛЕНЦЫЁНАК Уладзімір Харытонавіч, н. ў 1904 у в. Новая Ніва, працаваў у калгасе імя Леніна. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 15.12.1964.

КРАСОЎСКІ Станіслаў Вікенцьевіч, н. ў 1901 у в. Матошка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЛЯЙКОЎСКІ Іван Ермалаевіч, н. ў 1911 у в. Матошка, чырвонаармеец. Асуджаны 15.6.1942 да пазбаўлення волі ў папраўча-працоўны лагер на перыяд вайны. Рэабілітаваны 17.7.1958.

МАКАРЭВІЧ Мірон Пятровіч, н. ў 1875 у в. Гібайлавічы, жыў у в. Ліцвінка, працаваў у калгасе «Чырвоная зорка». Асуджаны 15.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 5.11.1937

МЕЛЬНІК Пётр Андрэевіч, н. ў 1875 у в. Гумны, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 15.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 15.6.1989.

МЕЛЬНІКАВА Вольга Панкратаўна, н. ў 1913

у в. Гумны, працавала ў калгасе «Пралетарская перамога». Асуджана 15.7.1945 на 6 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітавана 13.7.1993.

САКАВЕЦ Панкрат Лявонавіч, н. ў 1886 у в. Узнаж, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 27.3.1989.

ЦІТАВЕЦ Харытон Тарасавіч, н. ў 1884 у в. Мікалаеўка, працаваў у калгасе «Новае жыццё». Асуджаны 28.9.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13.10.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 23.3.1989.

ЮБКО Аляксандр Фёдаравіч, н. ў 1906 у в. Матошка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЮРГУЛЬСКАЯ Дар'я Фёдараўна, н. ў 1904 у в. Матошка, жыла ў в. Ухвала, хатняя гаспадыня. Асуджана 12.1.1946 на 8 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітавана 22.8.1969.

ХАЛОПЕНІЦКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

БУЙВІДОВІЧ Сямён Мінавіч, н. ў 1892 у в. Версанка, працаваў у калгасе «Гігант». Асуджаны 28.7.1938 на 7 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ВАЛАСАЧ Канстанцін Міхайлавіч, н. ў 1860 у в. Валасачы, жыў у в. Калечанка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 20.7.1992.

ВІНАГРАДАЎ Давыд Аляксеевіч, н. ў 1903 у в. Красноўка, жыў у в. Каменка, земляроб. Асуджаны 11.1.1931 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 17.7.1989.

ГРЫГАРОВІЧ Радзівон Казіміравіч, н. ў 1870 у мяст. Халопенічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 5.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 29.8.1989.

ГРЫГАРОВІЧ Фёдар Радзівонавіч, н. ў 1895 у мяст. Халопенічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 11.2.1931 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 1.8.1962.

ЖУК Фёдар Мікітавіч, н. ў 1905 у в. Прудзец, інструктар-бухгалтар Халопеніцкага райсельгасаддзела. Асуджаны 8.9.1951 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 9.5.1956.

ЗАГАЛОВІЧ Харытон Яфімавіч, н. ў 1877 у в. Слабада, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 5.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 10.10.1989.

ЗУЕЎ Абрам Мікітавіч, н. ў 1906 у в. Баркі, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 25.4.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны двойчы: 28.12.1989 і 19.5.1992.

ЗУЁНАК Іосіф Фядотавіч, н. ў 1890 у в. Галькі, праараб-будаўнік. Асуджаны 25.5.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.6.1938. Рэабілітаваны 24.8.1960.

ІВАНОЎ Авяр'ян Фаміч, н. ў 1902 у в. Валоба, селянін. Асуджаны 26.10.1930 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 10.8.1965.

КАМЯНКОВІЧ Іта Нісанаўна, н. ў 1872 у мяст. Халопенічы, без пэўных заняткаў. Асуджана 9.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляна 19.1.1938 у Оршы. Рэабілітавана 30.4.1989.

КРАСНЯКОЎ Венядзікт Фёдаравіч, н. ў 1870 у в. Бабарыка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 5.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 29.8.1989.

МАЗАНІК Пракоп Васілевіч, н. ў 1888 у в. Грыцкавічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 25.4.1930 да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны двойчы: 28.12.1989 і 19.5.1992.

МАКРЫЦА Васіль Сямёнавіч, н. ў 1906 у в. Мачулішча, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

МАКРЫЦА Іван Сямёнавіч, н. ў 1897 у в. Мачулішча, жыў у мяст. Халопенічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 11.2.1931 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 1.8.1962.

МАКРЫЦА Сямён Харытонавіч, н. ў 1862 у в. Мачулішча, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

МУРАВІЦКІ Дзмітрый Фокіч, н. ў 1896 у в. Гарадзішча, жыў у пас. Дзеражын, працаваў у калгасе імя Будзённага. Асуджаны 11.9.1936 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.2.1963.

ПРАКУДЗІН Назар Савельевіч, н. ў 1867 у в. Гарадзішча, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 23.6.1989.

ПРАКУДЗІН Самсон Назаравіч, н. ў 1907 у в. Гарадзішча, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 23.6.1989.

РАБЕЦ Іван Ігнатавіч, н. ў 1894 у в. Гарадзішча, працаваў у калгасе «Звязда». Асуджаны 24.11.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.3.1989.

РАДЗЮК Васіль Аляксеевіч, н. ў 1896 у в. Заессе, жыў у в. Баркі Халопеніцкага р-на, брыгадзір калгаса імя Леніна. Асуджаны 10.10.1946 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.12.1955.

САДОЎСКІ Кузьма Міхайлавіч, н. ў 1889 у в. Баркі, жыў у в. Дакудава, грузчык леспрамгаса. Асуджаны 31.10.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, дзе памёр у 1939. Рэабілітаваны 22.9.1958.

САМУЛЬЦОЎ Антон Авяр'янавіч, н. ў 1894 у в. Мачулішча, жыў у в. Ваўкавыск, працаваў у калгасе «Новы шлях». Асуджаны 9.12.1937 да вы-

шэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 30.10.1958.

СЕМЯНЦОЎ Міхаіл Фаміч, н. ў 1885 у в. Мхерына, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.8.1960.

СКАЛУБОВІЧ Усцін Фёдаравіч, н. ў 1881 у мяст. Халопенічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 5.3.1930 да вышэйшай меры пакарання (звестак аб пакаранні няма). Рэабілітаваны двойчы: 28.12.1989 і 19.5.1992.

ФРЫДМАН Залман Мендэлевіч, н. ў 1911 у в. Шамкі, чырвонаармеец. Асуджаны 16.7.1942 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 2.9.1993.

ХАЦЮХОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГАНЧАРОНАК Іван Міронавіч, н. ў 1894 у в. Падбярэззе, жыў у в. Запруддзе, працаваў у калгасе. Асуджаны 30.12.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 18.10.1958.

ДЗЕДЗЯНОК Іван Ермалаевіч, н. ў 1889 у в. Запруддзе, жыў у в. Траянаўка Барысаўскага р-на, працаваў у калгасе «Іскра». Асуджаны 11.4.1934 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 22.5.1989.

ДЗЯГА Кузьма Дзмітрыевіч, н. ў 1895 у в. Хацюхова. Асуджаны 16.10.1933 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 25.12.1989.

ЗАЛЯШЧОНАК Аляксандр Рыгоравіч, н. ў 1922 у в. Белае, чырвонаармеец. Асуджаны 4.2.1945 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 3.3.1994.

КРЫНА Фядот Васілевіч, н. ў 1885 у в. Малое Хацюхова, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 11.2.1931 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 1.8.1962.

КУХТА Пракоп Іванавіч, н. ў 1902 у в. Малое Хацюхова, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 11.2.1931 да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 1.8.1962.

КУХТА Сцяпан Нічыпаравіч, н. ў 1852 у в. Малое Хацюхова, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да вышэйшай меры пакарання (звестак аб пакаранні няма). Рэабілітаваны 6.5.1992.

КУХТА Сямён Сцяпанавіч, н. ў 1896 у в. Малое Хацюхова, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 6.3.1930 да вышэйшай меры пакарання (звестак аб пакаранні няма). Рэабілітаваны 6.5.1992.

КУХТА Усцін Усцінавіч, н. ў 1905 у в. Малое Хацюхова, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 24.4.1930 да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 8.5.1992.

КУХТА Цімафей Рыгоравіч, н. ў 1905 у в. Малое Хацюхова, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 24.4.1930 да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 8.5.1992.

ОШКЕР Софія Ермалаеўна, н. ў 1877 у в. Шчаўры, жыла ў в. Малыя Жаберычы, працавала ў калгасе «Перамога». Асуджана 22.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляна 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітавана 14.7.1958.

ПЕТРАШКЕВІЧ Марцін Аляксеевіч, н. ў 1900 у в. Падбярэззе, працаваў у калгасе. Асуджаны ў 1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 20.5.1961.

СТРАШАНОВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. ў 1861 у в. Шчаўры, святар. Асуджаны 19.9.1938 на 8 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 26.6.1990.

ЯНАЎШЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

КАЗЛОЎ Іван Андрэевіч, н. ў 1909 у в. Барсукі, чырвонаармеец. Асуджаны 13.12.1943 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.11.1993.

КАЗЛОЎСКІ Іосіф Еўдакімавіч, н. ў 1891 у в. Залессе, жыў у в. Хальнявічы, загадчык магазіна. Асуджаны 11.9.1936 на 3 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.2.1963.

МАЛЯЎЦАЎ Сільвестр Цімафеевіч, н. ў 1899 у в. Хальнявічы, жыў на хутары Хвашчы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 19.6.1932 на 3 гады да высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 22.12.1989.

РАДЗІШЭЎСКІ Сямён Нічыпаравіч, н. ў 1855 у в. Дудары, жыў у в. Каралёва, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 5.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 18.4.1989.

Ураджэнцы Крупскага раёна, якія былі раскулачаны і высланы на спецпасяленне ў 1930-я гады

АСТАШКА Міхаіл Ісакавіч, н. ў 1900. Раскулачаны ў 1930 і высланы ў пас. Майскі Амурскай вобл.

АСТАШКА Таццяна Ісакаўна, н. ў 1902. Раскулачана ў 1930 і выслана ў пас. Майскі Амурскай вобл.

ГЛІННІК Варвара Сямёнаўна, жонка М.М.Глінніка, рэабілітавана ў лістападзе 1948.

ГЛІННІК Ганна Максімаўна, н. ў 1915, дачка М.М.Глінніка, выехала з месца высылкі на вучобу.

ГЛІННІК Захар Максімавіч, н. ў 1908, сын М.М.Глінніка, памёр па дарозе на высылку.

ГЛІННІК Максім Маркавіч, н. ў 1872 у в. Самаседаўка. У 1931 высланы ў пас. Спорны Ніжнеамурскай вобл. Хабараўскага краю, памёр у жніўні 1947.

ГЛІННІК Марыя Максімаўна, н. ў 1906, дачка М.М.Глінніка. Рэабілітавана ў лістападзе 1948.

ГРАБЯНЦОВА Ефрасіння Ізотаўна, н. ў 1916.

ГРАБЯНЦОВА Матрона Галацееўна, н. ў 1880 у в. Каралёва, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1930 і выслана ў пас. Ірбіт Свярдлоўскай вобл. Памерла ў 1935. Рэабілітавана 21.12.1992.

ГРАБЯНЦОЎ Антон Ізотавіч.

ГРАБЯНЦОЎ Ізот Барысавіч, н. ў 1878 у в. Каралёва, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў 1930 і высланы ў пас. Тузім Пермскай вобл. Памёр у 1933. Рэабілітаваны 21.12.1992.

ГРАБЯНЦОЎ Савелій Ізотавіч.

ГРАБЯНЦОЎ Яўціхій Ізотавіч.

ГРЫГАРОВІЧ Радзівон Казіміравіч, раскулачаны ў 1930, высланы ў Свярдлоўскую вобл., вярнуўся ў Халопенічы ў 1937.

ГРЫГАРОВІЧ Фёкла Вітольдаўна, раскулачана ў 1930, выслана ў Свярдлоўскую вобл., вярнулася ў Халопенічы ў 1937.

МАКРЫЦА Антанін Сямёнавіч, н. ў 1907 у в. Мачулішча, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў 1930 і высланы ў в. Герасімаўка Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны 23.7.1992.

МАКРЫЦА Ганна Сямёнаўна, н. ў 1912 у в. Мачулішча, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1930 і выслана ў в. Герасімаўка Свярдлоўскай вобл. Рэабілітавана 23.7.1992.

МАКРЫЦА Еўдакія Антонаўна, н. ў 1910 у в. Мачулішча, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1930 і выслана ў в. Герасімаўка Свярдлоўскай вобл. Рэабілітавана 23.7.1992.

МАКРЫЦА Лізавета Кліменцьеўна, н. ў 1906 у в. Мачулішча, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1930 і выслана ў в. Герасімаўка Свярдлоўскай вобл. Рэабілітавана 23.7.1992.

МАКРЫЦА Марыя Сямёнаўна, н. ў 1915 у в. Мачулішча. Раскулачана ў 1930 і выслана ў в. Герасімаўка Свярдлоўскай вобл. Рэабілітавана 23.7.1992.

МАКРЫЦА Міхаіл Сяргеевіч, н. ў 1930 у в. Мачулішча.

МАКРЫЦА Сямён Харытонавіч, н. ў 1861 у в. Мачулішча, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны 5.10.1930 і высланы ў в. Герасімаўка Свярдлоўскай вобл. Памёр у 1932. Рэабілітаваны 23.7.1992.

МАКРЫЦА Сяргей Сямёнавіч, н. ў 1902 у в. Мачулішча, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны 5.10.1930 і высланы ў в. Герасімаўка Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны 23.7.1992.

МАКРЫЦА Цімафей Сяргеевіч, н. ў 1928 у в. Мачулішча.

РУХЛІНСКАЯ Вольга Паўлаўна, н. ў 1922 у в. Каменка.

РУХЛІНСКАЯ Ефрасіння Кліменцьеўна, н. ў 1898, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1930 і выслана ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітавана 24.8.1992.

РУХЛІНСКАЯ Клаўдзія Паўлаўна, н. ў 1924 у в. Каменка.

РУХЛІНСКАЯ Марыя Паўлаўна, н. ў 1929 у в. Каменка.

РУХЛІНСКІ Павел Пятровіч, н. ў 1897, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў 1930 і высланы ў Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны 24.8.1992.

САЛАЎЁВА Домна Емяльянаўна, н. ў 1902 у в. Каменка, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1930 і выслана ў г. Кіраўск Мурманскай вобл. Рэабілітавана 30.12.1992.

САЛАЎЁВА Таццяна Антонаўна, н. ў 1929 у в. Каменка.

САЛАЎЁЎ Міхаіл Антонавіч, н. ў 1927 у в. Каменка.

СВІДЗЕРСКАЯ Кацярына Іванаўна, н. ў 1921 у в. Лагі.

СВІДЗЕРСКАЯ Марыя Іванаўна, н. ў 1921 у в. Лагі.

СВІДЗЕРСКАЯ Марыя Федасееўна, н. ў 1900 у в. Лагі, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1931 і выслана ў в. Трох-Ямка Пермскай вобл. Рэабілітавана 15.11.1993.

СВІДЗЕРСКАЯ Надзея Іванаўна, н. ў 1919 у в. Лагі.

СВІДЗЕРСКІ Іван Анісімавіч, н. ў 1897 у в. Лагі, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў 1931 і высланы ў в. Трох-Ямка Пермскай вобл. Рэабілітаваны 15.11.1993.

СВІДЗЕРСКІ Іван Іванавіч, н. ў 1928 у в. Лагі.

СТАНКЕВІЧ Леакадзія Станіславаўна, н. ў 1923 у в. Янаўшчына.

СТАНКЕВІЧ Раіса Станіславаўна, н. ў 1928 у в. Янаўшчына.

СТАНКЕВІЧ Станіслава Станіславаўна, н. ў 1926 у в. Янаўшчына.

СТАНКЕВІЧ Станіслаў Ігнатавіч, н. ў 1889 у в. Янаўшчына, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў 1929 і высланы ў пас. Палавінка Пермскай вобл. Рэабілітаваны 24.2.1993.

СЯЛІЦКАЯ Юзэфа Іосіфаўна, н. ў 1875 у в. Кляновічы, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1930 і выслана ў с. Куранева Свярдлоўскай вобл. Рэабілітавана 16.11.1992.

СЯЛІЦКІ Станіслаў Антонавіч, н. ў 1922 у в. Кляновічы.

СЯЛІЦКІ Эдуард Антонавіч, н. ў 1921 у в. Кляновічы.

ХАЕЦКАЯ Софія Дамінікаўна, н. ў 1907 у в. Вострава, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1930 і выслана ў г. Ніжні Тагіл Свярдлоўскай вобл. Рэабілітавана 17.11.1992.

ХАЕЦКІ Франц Дамінікавіч, н. ў 1911 у в. Вострава, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў 1930

і высланы ў г. Ніжні Тагіл Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны 17.11.1992.

ХРУШЧОЎСКІ Антон Францавіч, раскулачаны ў 1930 і высланы ў Ленскі р-н Архангельскай вобл. Разам з ім былі раскулачаны жонка, Хрушчоўская Вера Захараўна, н. ў 1882; сыны — Антон, Іван і Уладзімір, дачка Ала. У 1933 сям'і было дазволена вярнуцца ў Беларусь, але ў 1937 А.Ф.Хрушчоўскі быў зноў арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

ЧЫРЫКАВА Аляксандра Давыдаўна, н. ў 1921 у в. Мачулішча.

ЧЫРЫКАВА Кацярына Давыдаўна, н. ў 1920 у в. Мачулішча.

ЧЫРЫКАВА Хрысціна Максімаўна, н. ў 1871 у в. Мачулішча, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1930 і выслана ў пас. Юрці Свярдлоўскай вобл. Рэабілітавана 27.11.1992.

ЧЫРЫКАЎ Астап Давыдавіч, н. ў 1908 у в. Мачулішча, працаваў на гаспадарцы бацькоў. Раскулачаны ў 1930 і высланы ў пас. Юрці Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны 27.11.1992.

ЧЫРЫКАЎ Давыд Данілавіч, н. ў 1864 у в. Мачулішча, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў 1930 і высланы ў пас. Юрці Свярдлоўскай вобл.

ЧЫРЫКАЎ Мікалай Давыдавіч, н. ў 1914 у в. Мачулішча.

ЧЫРЫКАЎ Пётр Давыдавіч, н. ў 1902 у в. Мачулішча. Раскулачаны ў 1930 і высланы ў пас. Юрці Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны 27.11.1992.

ШАЎЧЭНКА Лідзія Паўлаўна, н. ў 1930 у в. Копішча.

ШАЎЧЭНКА Марына Мікалаеўна, н. ў 1896 у в. Копішча, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў лютым 1933 і выслана ў пас. Ганошыха Алтайскага краю. Рэабілітавана 24.8.1992.

ШАЎЧЭНКА Павел Мікалаевіч, н. ў 1897 у в. Копішча, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў лютым 1933 і высланы ў пас. Ганошыха Алтайскага краю. Рэабілітаваны 24.8.1992.

ШЫШАНОЎСКАЯ Ганна Ігнатаўна, н. ў 1920 у в. Красноўка.

ШЫШАНОЎСКАЯ Марыя Іванаўна, н. ў 1885 у в. Красноўка, сялянка-аднаасобніца. Раскулачана ў 1930 і выслана ў пас. Каралькоўскі Свярдлоўскай вобл. Рэабілітавана 25.9.1992.

ШЫШАНОЎСКАЯ Надзея Ігнатаўна, н. ў 1914 у в. Красноўка.

ШЫШАНОЎСКІ Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1879 у в. Красноўка, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў 1930 і высланы ў пас. Каралькоўскі Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны 25.9.1992.

ШЫШАНОЎСКІ Дзмітрый Ігнатавіч, н. ў 1914 у в. Красноўка.

ШЫШАНОЎСКІ Ігнат Іванавіч, н. ў 1869 у в. Красноўка, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў 1930 і высланы ў пас. Каралькоўскі Свярдлоўскай вобл. Памёр у 1934. Рэабілітаваны 25.9.1992.

ШЫШАНОЎСКІ Фёдар Іванавіч, н. ў 1875 у в. Красноўка, селянін-аднаасобнік. Раскулачаны ў 1930 і высланы ў пас. Каралькоўскі Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны 25.9.1992.

Жыхары Крупскага раёна, ураджэнцы іншых мясцовасцей, якія былі рэпрэсіраваны і пазней рэабілітаваны

АЗІМАЎ Елісей Елісеевіч, н. ў 1883 у в. Рафагліва Магілёўскага р-на, жыў у в. Баравуха, працаваў у калгасе «Чырвоны пахар». Асуджаны 26.5.1939 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 4.8.1992.

АНДРАСЮК Максім Нічыпаравіч, н. ў 1884 у в. Белкі Бельскага пав., жыў у мяст. Халопенічы, возчык Халопеніцкага райсаюза. Асуджаны 21.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 9.12.1982.

АНТАНЕВІЧ Лявон Лявонавіч, н. ў 1911 у в. Ялоўка Бярэзінскага р-на Мінскай вобл., жыў у Крупскім р-не, каваль у калгасе. Асуджаны 25.3.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 27.4.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 30.12.1958.

БАБІЦКІ Іван Іосіфавіч, н. ў 1894 у в. Завілы Барысаўскага р-на Мінскай вобл., жыў у в. Гапонавічы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 9.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 28.5.1989.

БАРАДЗІН Іван Кандратавіч, н. ў 1901 у в. Пасынок-Гразны Горкаўскай вобл., жыў у мяст. Крупкі, рабочы чыг. станцыі. Асуджаны 15.8.1938 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 26.1.1990.

ВАЙТКЕВІЧ Іраіда Іванаўна, н. ў 1906 у в. Шумілаўка Клінцоўскай акругі, Расія, жыла ў мяст. Крупкі, настаўніца Крупскай школы. Асуджана 8.7.1931 на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітавана 23.9.1989.

ВАСІЛЕВІЧ Канстанцін Іванавіч, н. ў 1916 у г. Харбін, жыў у мяст. Крупкі, рабочы Крупскай хлебапякарні. Асуджаны 22.11.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, дзе памёр 9.10.1938. Рэабілітаваны 31.3.1989.

ВЕРАМЕЙ Іван Фёдаравіч, н. ў 1906 у в. Асонава Плешчаніцкага р-на Мінскай вобл., жыў у в. Ухвала, пажарнік Ухвальскага мехпункта. Асуджаны 26.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Рас-

страляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 23.6.1989.

ГАЙДУК Мікалай Фядотавіч, н. ў 1914 на ст. Хайлор (Маньчжурыя), рабочы рамонтнага пуці чыг. ст. Крупкі. Асуджаны 21.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 1.10.1957.

ДЗЕМ'ЯНОВІЧ Мікалай Мацвеевіч, н. ў 1905 у Ленінградзе, жыў у мяст. Крупкі, настаўнік Крупскай сярэдняй школы. Асуджаны 22.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 23.6.1989.

ДЗЯЙКО Якаў Гаўрылавіч, н. ў 1869 у в. Драздоўка Віленскай губ., жыў у в. Гольэберг, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 5.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 26.12.1989.

ДОЎГАРТ (ДОЎГЕРТ) Ягор Іосіфавіч, н. ў 1877 у в. Гайдуканы Віленскай губ., жыў у в. Ліцвінка, працаваў у калгасе «Чырвоная зорка». Асуджаны 15.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ЖАБКО Зянон Мікалаевіч, н. ў 1878 у в. Лядаўшчына Плешчаніцкага р-на Мінскай вобл., загадчык буфета на чыг. ст. Крупкі. Асуджаны 28.9.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.10.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 29.1.1959.

ЗАЙЦАЎ Фёдар Аляксеевіч, н. ў 1897 у в. Мала-Іўлава Горкаўскай вобл., жыў у в. Старая Слабада, майстар спіртапарашковага завода. Асуджаны 22.11.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 14.2.1940.

ЗАРАМБОЎСКАЯ Людміла Фульгенцьеўна, н. ў 1899 у Уздзенскім р-не Мінскай вобл., жыла ў мяст. Бобр, настаўніца Бобрскай сярэдняй школы. Асуджана 21.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляна 20.2.1938 у Мінску. Рэабілітавана 12.4.1963.

ЗАРАМБОЎСКІ Дзмітрый Хрысанфавіч, н. ў 1889 у в. Пясочнае Капыльскага р-на Мінскай вобл., жыў у мяст. Бобр, настаўнік Бобрскай сярэдняй школы. Асуджаны 21.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 12.4.1963.

ЗЕЛЯПУГА Яфім Мікалаевіч, н. ў 1870 у в. Вяцера Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., жыў у в. Асечана, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 24.11.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 14.4.1989.

ІВАНОЎ Міхаіл Канстанцінавіч, н. ў 1915 у в. Паташня Горацкага р-на, жыў у в. Узнацк, дырэктар Узнацкай няпоўнай сярэдняй школы. Асуджаны 11.3.1938 на 8 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер, дзе памёр 7.6.1943. Рэабілітаваны 22.8.1974.

ІГНАЦЬЕЎ Канстанцін Кандратавіч, н. ў 1896 у в. Какшанава, Чувашыя, жыў у в. Куты, працаваў у калгасе «Перамога». Асуджаны 14.5.1945 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.7.1993.

КАВАЛЕНКА Сцепаніда Антонаўна, н. ў 1895 у в. Горна-Рутковічы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл., рабочая саўгаса «Перадавы». Асуджана 17.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляна 17.12.1937 у Оршы. Рэабілітавана 31.3.1967.

КАЗІМІРЧЫК Уладзімір Лук'янавіч, н. ў 1907 у в. Талкачэвічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл., дзяжурны на чыг. ст. Крупкі. Асуджаны 16.10.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.4.1961.

КАМАНДУЛІС Баніфат Якаўлевіч, н. ў 1879 у в. Букоўшчыкі Віленскай губ., жыў у в. Ліцвінка, загадчык магазіна Бобрскага сельскага спажывецкага таварыства. Асуджаны 17.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 5.11.1958.

КАНАШЭВІЧ Павел Рыгоравіч, н. ў 1894 у в. Паўлава Гродзенскай губ., жыў у в. Дубраўка, працаваў у калгасе «Чырвоны земляроб». Асуджаны 4.7.1931 на 2 гады зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 12.12.1989.

КАРАЛЁЎ Уладзімір Канстанцінавіч, н. ў 1887 у в. Навазенава Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., жыў у в. Асечана Халопеніцкага р-на, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 24.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.12.1937. Рэабілітаваны 14.4.1989.

КОЙФМАН Ісак Якаўлевіч, н. ў 1906 у г. Жмерынка Вінніцкай вобл., жыў у пас. Крупкі, начальнік будаўнічай пляцоўкі «Нафтаправодбуд». Асуджаны 6.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 5.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 30.3.1989.

КРАСОЎСКАЯ Вікторыя Станіслававўна, н. ў 1869 у в. Жукавец Барысаўскага р-на Мінскай вобл., жыла ў в. Матошка, сялянка-аднаасобніца. Асуджана 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітавана 31.5.1989.

КРАСОЎСКІ Антон Іванавіч, н. ў 1860 у в. Жукавец Барысаўскага р-на Мінскай вобл., жыў у в. Матошка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

КРУЧКОЎ Васіль Раманавіч, н. ў 1911 на ст. Пярхушкава Маскоўскай вобл., жыў у в. Гарадзішча, працаваў у калгасе «Звязда». Асуджаны 7.5.1946 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. У 1947 тэрмін пакарання быў зменшаны на 5 гадоў, у 1950 высланы ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны двойчы: 22.3.1955 і 10.6.1955.

МАЛЕЖ Сцяпан Фёдаравіч, н. ў 1894 у в. Вялікая Ліпа Нясвіжскага р-на Мінскай вобл., жыў у в. Бобр, сталяр саматужнай арцелі «Ударнік». Асуджаны 22.2.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 30.4.1989.

МІЦКЕВІЧ Іосіф Аляксандравіч, н. ў 1892 на ст. Койданава Мінскай вобл., жыў у в. Бобр, да-

рожны майстар. Асуджаны 25.2.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Оршы. Рэабілітаваны 28.9.1959.

«...З-ЗА АДСУТНАСЦІ СКЛАДУ ЗЛАЧЫНСТВА»

Аб тым, што Іосіф Аляксандравіч Міцкевіч з'яўляецца членам шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі на Заходняй чыгунцы, следчыя органы «даведаліся» ў лютым 1938 г. Думаецца, гэтая навіна іх не вельмі здзівіла: сцэнарыі, па якіх ужо каторы год ішлі масавыя арышты, стваралі самі.

25 лютага 1938 г. Іосіф Аляксандравіч быў арыштаваны. У тым, што менавіта ён апынуўся ў турме, нічога дзіўнага не было, бо ў той час там мог апынуцца кожны, нават у каго, здавалася, была крыштальна чыстая біяграфія. А ў Іосіфа Аляксандравіча ўскосных падстаў для таго, каб апынуцца за кратамі, было вельмі шмат: паляк па нацыянальнасці, пад час белапольскай акупацыі знаходзіўся на занятай тэрыторыі, у Барысаве быў арыштаваны яго родны брат (праўда, арыштаваны ён быў за нейкія там спекулятыўныя махінацыі, што следчым органам было вядома, ды ім зручней было лічыць яго ворагам народа). І прафесія для дыверсійных работ у Іосіфа Аляксандравіча была зручная: ён працаваў дарожным майстрам 5-га акалотка 7-й дыстанцыі, пражываў разам з сям'ёй (жонкай і двума дзецьмі) на станцыі Бобр.

Ужо праз два тыдні пасля арышту Іосіф Аляксандравіч зразумеў усю безвыходнасць свайго становішча. Вынікам гэтага з'явілася яго заява ад 10 сакавіка 1938 года:

«Работал на станции Негорелое бригадиром пути в 1924 году, в это время был дорожным мастером данного 8-го околотка 8-й дистанции пути Третьяк Василий Степанович, который сильно пьянствовал. И вот однажды ранней весной 1924 года, месяца не помню, за выпивкой он меня завербовал агентом польской разведки: вредить транспорту, вести пути к ухудшению, заниматься шпионажем и диверсией, в чём признаю себя виновным и хочу дать следствию правдивые и откровенные показания».

Магчымасць даць «шчырыя» паказанні трапілася хутка. На наступны дзень 11 сакавіка на допыце ён пацвердзіў свае паказанні, што з'яўляецца польскім шпіёнам. Гэта было галоўнае, чаго ад яго хацеў следчы: прызнанне віны ў той час згодна тэорыі Вышынскага лічылася вяршыняй доказу, дастатковым, каб асудзіць чалавека за любое злачынства. 12 сакавіка І.А.Міцкевічу было прад'яўлена абвінаваўчае заключэнне. Следчы, трэба аддаць яму належнае, меў вялікую фантазію і, відаць, вопыт — заключэнне атрымалася грунтоўным:

«...установлено, что Мицкевич Иосиф Александрович в 1924 г. был завербован агентом польской разведки Третьяком Василием Степановичем для шпионско-диверсионной и вредительской работы на территории СССР в пользу Польши.

По заданию польского агента Третьяка В.С. Мицкевич И.А. с 1924 г. занимался вредительством по разрушению полотна железной дороги, а также с 1924 г. собрал и передал через Третьяка для польской разведки сведения о настроении масс и сообщил ему список лиц, высказывающих недовольство Советской властью.

С целью сохранения себя для шпионско-вредительской работы в военное время Мицкевич по заданию польских разведывательных органов пролез в ряды ВКП(б).

В конце 1924 г. Мицкевич по заданию польской разведки принял от Третьяка шпионско-диверсионное задание на военное время — во время войны Польши с СССР разрушать железнодорожное полотно, организовывать крушение воинских поездов и собирать сведения о продвижении воинских поездов в сторону границы.

Допрошенный по данному делу обвиняемый Мицкевич Иосиф Александрович виновным себя признал...»

Пастановай НКУС СССР і Пракурора СССР ад 15 мая 1938 г. (пратакол № 1141) І.А.Міцкевіч быў асуджаны да вышэйшай меры пакарання.

Зразумеўшы, што трапіў у пастку, якую сам дапамог захлопнуць следчым органам, Іосіф Аляксандравіч 31 мая 1938 г. піша скаргу, у якой просіць перагледзець яго справу, сцвярджаючы, што яго паказанні былі складзены следчым Ракіцкім і што ён прымусіў падпісаць іх шляхам насілля. Але нічога ўжо не магло дапамагчы гэтаму чалавеку. 17 ліпеня 1938 г. І.А.Міцкевіч быў расстраляны.

У снежні 1940 г. ў парадку пракурорскага нагляду справа І.А.Міцкевіча была зноў разгледжана. Як здзек (на гэты раз ужо над мёртвым) гучыць заключэнне юрыста:

«...Принимая во внимание, что показания Мицкевича Иосифа Александровича частично подтверждаются показаниями обвиняемого Третьяка Василия Степановича, что им лично написано заявление, в котором он признал

свое преступление, что ряд его родственников также репрессированы за контрреволюционную деятельность, — оснований к постановке вопроса о пересмотре решения по его делу не нахожу...

Помощник Военного прокурора Зап. ОВО Военный юрист 3-го ранга Новиков».

Няўжо не ведаў памочнік Ваеннага Пракурора, што В.С.Трацяк адмовіўся ад сваіх паказанняў, што «прызнанне» І.А.Міцкевіча было зроблена пад прымусам, што брат яго быў арыштаваны не за контррэвалюцыйную дзейнасць. Зразумела, ведаў. Але існаваўшая сістэма прымушала яго пацвердзіць прыгавор: на гэты раз асуджаўся ўжо не сам чалавек (бо яго ўжо амаль два гады не было ў жывых), асуджалася яго добрае імя.

Толькі ў 1959 г. следчыя органы зноў вярнуліся да справы І.А.Міцкевіча. Юлія Феліцыянаўна Міцкевіч (жонка рэпрэсіраванага) звярнулася да старшыні Ваеннага трыбунала Беларускай ваеннай акругі з лістом. Вось аб чым яна пісала:

«25 февраля 1938 г. был арестован мой муж, Мицкевич Иосиф Александрович, 1892 года рождения, уроженец ст. Койданово Минской области. Вскоре он был осуждён и сослан в места заключения. Дальше мне судьба его неизвестна. Мною получено из Оршанского Горбюро ЗАГС свидетельство о смерти моего мужа № 026410, актовая запись № 4 от 18-1-1958 г., в котором указано, что Мицкевич Иосиф Александрович умер 28 декабря 1941 г. от эндокардита, место смерти не указано.

...Мне уже много лет... Сын мой погиб на фронте. В живых у меня есть ещё дочь. И я, и дочь хотим сбросить ярмо, которое тяготит нас с 1938 года. Наш отец и муж был честный член партии, и мы просим его реабилитировать».

28 верасня 1959 г. Ваенны трыбунал Беларускай ваеннай акругі адмяніў пастанову камісіі НКУС СССР і пракурора СССР ад 15 мая 1938 г. ў адносінах да Іосіфа Аляксандравіча Міцкевіча. Справа была спынена з-за адсутнасці складу злачынства.

Г.Грыгор'еў, В.Грыгор'ева.

МУРАШЭВІЧ Пётр Мікітавіч, н. ў 1903 у в. Шылькі Сенненскага р-на Віцебскай вобл., жыў у в. Асечана, шавец арцелі «Іскра». Асуджаны 26.9.1938 і высланы ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 18.9.1956.

НОВІК Іван Феліксавіч, н. ў 1886 у в. Шпакоўцы Навагрудскага пав., жыў на ст. Крупкі, рабочы на чыг. ст. Крупкі. Асуджаны 28.9.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.10.1938. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ПАПКОВІЧ Аляксандр Ігнатавіч, н. ў 1901 у в. Чарніцы Смалявіцкага р-на Мінскай вобл., жыў на ст. Бобр, механік мехлеспункта. Асуджаны 22.3.1938 на 8 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 18.7.1957.

ПАРХОМЕНКА Павел Сяргеевіч, н. ў 1894 у в. О рлікаўка Чарнігаўскай вобл., Украіна, жыў у в. Сомры, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 2.4.1940 на 8 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.7.1993.

ПАЎЛЮКЕВІЧ Мікалай Аляксеевіч, н. ў 1897 у в. Бярозаўцы Віленскай губ., жыў у Крупскім р-не, механік Крупскага мехпункта. Асуджаны 6.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 20.12.1937 у О ршы. Рэабілітаваны 31.12.1957.

ПРАЛОЎСКІ Васіль Васілевіч, н. ў 1908 у в. Слабоды Архангельскай вобл., жыў у мяст. Халопенічы, участковы інспектар Халопеніцкага аддзялення НКУС. Асуджаны 30.1.1945 на 15 гадоў катаргі. Рэабілітаваны 18.10.1954.

ПРАНІКАЎ Рыгор Рыгоравіч, н. ў 1899 у в. Пранікі Ушацкага р-на Віцебскай вобл., жыў у в. Новая Слабада, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 28.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 5.12.1989.

РЫМДЗЁНАК Канстанцін Фёдаравіч, н. ў 1886 у в. Боўкалы Ігуменскай вол., жыў у мяст. Бобр, дырэктар Бобрскай сярэдняй школы. Асуджаны 14.11.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.11.1938. Рэабілітаваны 18.2.1958.

З успамінаў В.Івановай

У 30-я гады я вучылася ў школе калгаснай моладзі ў пас. Бобр і жыла ў школьным інтэрнаце на поўным дзяржаўным забеспячэнні, бо мой бацька загінуў у грамадзянскую вайну, а маці атрымлівала пенсію толькі 8 рублёў. Дырэктарам школы быў Рымдзёнак Канстанцін Фёдаравіч. Памятаю выпадак, які застаўся ў памяці на ўсё жыццё.

Гэта было зімою. Я ішла з Крупак, дзе жыла мая маці, і вельмі прамачыла ногі. Калі прыйшла ў інтэрнат, паставіла ля печы сушыць боты, але адзін з іх за ноч згарэў. Назаўтра не змагла пайсці ў школу. Пра гэта даведаўся дырэктар і прынёс свае боты. Я вельмі ганарылася і тыдзень хадзіла ў вялізных ботах, пакуль школа зноў не купіла мне абутак. А колькі разоў Канстанцін Фёдаравіч прыносіў нам свой хлеб (у той час на хлеб былі картачкі). Гэта быў надзвычай добры і чулы чалавек.

САРАПАС Канстанцін Канстанцінавіч, н. ў 1888 у в. Саконцы Ковенскай губ., жыў у в. Ма-

К.Ф.Рымдзёнак.

Г.А.Фрэйндорф.

тошка, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 12.3.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 31.5.1989.

САСНОВІЧ Фама Васілевіч, н. ў 1905 у в. Баліта Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., жыў у в. Асечана, настаўнік пачатковай школы. Арыштаваны 17.7.1938, 21.4.1939 памёр у час следства ў турэмнай бальніцы г. Барысаў. Рэабілітаваны 22.10.1957.

СЕМЯНЦОЎ Міхаіл Тамашавіч (Фаміч), н. ў 1885, месца нараджэння невядома, жыў у в. Мхерына, селянін-аднаасобнік. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.8.1960.

СІКОРСКІ Яўстафій Уладзіміравіч, н. ў 1880 у в. Алесіна Барысаўскага р-на Мінскай вобл., жыў на ст. Крупкі, прыёмшчык грузаў на ст. Крупкі. Асуджаны 19.12.1938 на 8 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. 2.2.1935 тэрмін пакарання зменшаны на 3 гады, пасля датэрмінова вызвалены. Рэабілітаваны 18.7.1989.

СІНЬКЕВІЧ Вікенцій Іосіфавіч, н. ў 1880 у в. Заламанка Вілёнскага пав., жыў на хут. Навесы Крупскага р-на, бондар арцелі «Бондар». Асуджаны 26.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 30.4.1989.

СЛАВЕЦКІ Іосіф Сцяпанавіч, н. ў 1913 у в. Ліпск Бягомльскага р-на Віцебскай вобл., жыў у в. Дакучыно, настаўнік школы. Асуджаны 10.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 28.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 18.6.1959.

СЯРМЯЖКА Гаўрыла Антонавіч, н. ў 1900 у в. Логі Бярэзінскага р-на Мінскай вобл., жыў у в. Асінаўка, працаваў у калгасе «1 Мая». Асуджаны 8.1.1938 на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 27.9.1968.

ТАМАШЭВІЧ Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1887 у в. Белуны Віленскага пав., жыў у пас. Крупскі, вартаўнік чыг. ст. Крупкі. Асуджаны 28.9.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14.10.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 29.1.1959.

ТРУШКІН Міхаіл Сцяпанавіч, н. ў 1893 у в. Сасноўка Маскоўскай вобл., жыў у пас. Крупскі, рабочы на ст. Крупкі. Асуджаны 22.3.1938 на 6 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 18.7.1957.

ФРЭЙНДОРФ Георгій Адамавіч, н. ў 1895 у Мінску, рабочы саўгаса «Перадавы». Асуджаны 6.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 21.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 20.8.1957.

КРУГІ ПА ВАДЗЕ

Перад намі лёс аднаго з тых людзей, якія трапілі пад кола рэпрэсіўнай машыны. Георгій Адамавіч Фрэйндорф. У змрочныя 30-я гады ён жыў і працаваў у Крупскім раёне, спачатку ў саўгасе «Крупскі», потым у саўгасе «Перадавы» — дырэктарам. Тут жа настаўніцай працавала і яго жонка. Гадавалі трох дзяцей. Малодшаму, Уладзіміру, на час арышту бацькі было ўсяго толькі пяць месяцаў.

Чаму Г.А.Фрэйндорф з'явіўся ахвярай рэпрэсій? Калі знаёмішся з яго біяграфіяй, то здаецца, што нічога такога, за што можна было б учапіцца, у яго жыцці не было: з малых гадоў (яшчэ ў дарэвалюцыйны час) працаваў слесарам у г. Барысаў, у 1925 г. ўступіў у камуністычную партыю, дзесьці ў 1926 г. назначаны дырэктарам Барысаўскай макароннай фабрыкі, а пасля заканчэння аднагадовых курсаў у Маскве — дырэктарам Бабруйскай цукерачнай фабрыкі. У пачатку 1930-х гадоў партыя накіравала Фрэйндорфа ў Крупскі раён: трэба было ўмацоўваць сельскую гаспадарку. Звычайны для таго часу лёс камуніста, які не меў спецыяльнай адукацыі, але валодаў арганізатарскімі здольнасцямі, меў неабходнае сацыяльнае паходжанне і старанна працаваў усюды, куды накіроўвала партыя.

І вось абставіны склаліся так, што ў 1937 г. ў Крупскім раёне пачаўся падзеж жывёлы. У выніку хваробы. Здавалася, трэба было б усё кінуць на барацьбу з эпідэміяй. Але не той быў час. Пачалі шукаць «вінаватага». І не аднаго. Звычайна ў падобных абставінах «выкрывалася» цэлая арганізацыя, дзеяннямі якой кіраваў хтосьці «зверху». Так было і на гэты раз. Нітачка пацягнулася з Мінска, дзе ў ветупраўленні Наркамзема БССР працаваў «адзін з кіраўнікоў польскай дыверсійна-шпіёнскай арганізацыі» Гурскі. Пайшлі хвалі арыштаў, як кругі па вадзе. Тут вось і ўспомнілася, што яшчэ ў 1936 г. ў адрас Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б прыйшоў ліст, у якім сцвярджалася, што Г.А.Фрэйндорф — троцкіст. Трэба аддаць належнае Крупскаму раённаму камітэту партыі і яго тагачаснаму сакратару М.Новікаву: не паверылі яны даносу на

свайго таварыша па партыі. Правялі дэталёвую праверку і вынеслі наступнае рашэнне:

«Произведенной проверкой с показаниями членов ВКП(б) Грыфа, Минькова, Марцынкевича, Белявина, Плавника (Борисовская парторганизация) установлено, что материал гражданина Могниновича, адресованный на имя ЦК КП(б)Б, о прошедшей троцкистской деятельности члена ВКП(б) тов. Фрэйндорфа, работающего директором совхоза «Передовой», не подтверждается.

О чём сообщить ЦК КП(б)Б».

(З пратакола № 27 пасяджэння Крупскага раённага камітэта КП(б)Б ад 23 снежня 1936 г.).

Дададзім яшчэ, што праверку праводзіў інструктар райкома Гурэвіч.

Але рызыка, якой падвяргаўся раённы камітэт, і ў першую чаргу яго сакратар, абараняючы «ворага народа», ненадоўга дапамагла Георгію Адамавічу. Не магло падобнае «сысці з рук» у той час. Можна толькі здагадвацца, якому ўздзеянню падвергнулася раённае партыйнае кіраўніцтва. А вось вынік яго вядомы. Праз 8 месяцаў той жа камітэт вынес такую пастанову:

«За идеализацию троцкизма, опошление, за грубые бюрократические отношения к рабочим совхоза члена партии с 1925 г., партбилет № 0865425, Фрэйндорфа Георгия Адамовича из рядов партии исключить».

(З пратакола № 8 пасяджэння Крупскага раённага камітэта КП(б)Б ад 3 жніўня 1937 г.).

«Ідэалізацыя трацкізму» з боку Фрэйндорфа заключалася ў тым, што ў прыватнай размове з рабочым друкарні саўгаса Лускіным Георгій Адамавіч заўважыў, што Троцкі ў свой час быў нядрэнным агітатарам, але трымаў камень за пазухай супраць партыі. Успомніліся і іншыя «грахі», у тым ліку і сувязь з начальнікам авіяатрада Плешаковым, які быў ужо «выкрыты» як вораг народа (сувязь заключалася ў тым, што Фрэйндорф выдаў яму двух свіней на патрэбы авіяатрада). У верасні 1937 г. Г.А.Фрэйндорф быў арыштаваны.

28 лістапада 1937 г. Георгію Адамавічу, які знаходзіўся ў той час у аршанскай турме, было прад'яўлена абвінавачванне заключэнне.

З архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь:

«Фрэйндорф является агентом разведывательных органов Польши. Завербован в 1935 г. польским агентом Федуловым, через которого от польских разведорганов получил задание для шпионско-диверсионной работы на территории СССР в пользу Польши.

В 1936 г. по заданию разведорганов Польши уничтожил 1790 голов племенных свиней, что составляет 64 процента всего свиного поголовья совхоза.

В 1936 г. сельскохозяйственный инвентарь не отремонтировал по заданию польской разведки, благодаря чему сорвал уборочную кампанию.

По заданию разведорганов Польши систематически задерживал выплату зарплаты рабочим, тем самым вызывал недовольство среди рабочих.

Передал шпионские сведения польской разведке о состоянии совхоза «Передовой» и о мощности такового.

Виновным себя в шпионско-диверсионной деятельности признал...».

Так, прызнаў. Зламаўся чалавек, не вытрымаў здзекаў. Але, прызнаўшы сябе вінаватым у такім страшэнным злачынстве — здрадзе Радзіме, — на вераломнае пытанне следчага: «Каго Вы самі завербавалі?» адказаў: «Я нікога не завербаваў». Не пацягнулася далей нітачка. Абарвалася. Як абарвалася і жыццё Георгія Адамавіча. Выконваючы пастанову Народнага камісара ўнутраных спраў Саюза ССР і пракурора Саюза ССР ад 6 снежня 1937 г. (пратакол № 478), Г.А.Фрэйндорфа расстралялі 21 снежня 1937 г. ў г. Оршы.

Доўга яшчэ сям'я нябожчыка не ведала, што з ім.

Амаль праз 20 гадоў, калі пасля XX з'езда камуністычнай партыі пачаліся масавыя рэабілітацыі, жонка Г.А.Фрэйндорфа, Наталля Міхайлаўна, накіравала пісьмо на імя пракурора БССР:

«Мой муж, Фрэйндорф Георгий Адамович, 1885 г. рождения, уроженец г. Минска, член партии с 1925 г., работал директором совхоза «Передовой» Крупского района Минской области. В сентябре м-це 1937 г. он был арестован как враг народа. Мне было объявлено, что ему дали 10 лет без права переписки, но до сих пор от него нет никаких известий. Я до настоящего времени остаюсь при своём мнении, что мой муж никогда не был врагом народа. Сам он рабочий, с детства работал рабочим-слесарем на фабрике им. Кирова в Ново-Борисове. После него осталось трое детей, которые уже взрослые люди.

Прошу направить, куда следует, моё заяв-

ление, чтобы рассмотрели дело моего мужа и реабилитировали его.

2 июня 1956 г.»

У 1957 г. справа Г.А.Фрэйндорфа была перагледжана. У судовай справе захаваліся паказанні людзей, якія працавалі з Георгіем Адамавічам у саўгасе «Перадавы» ў тыя страшэнныя гады. Прыводзім выдрукоўкі з гэтых паказанняў:

Старадубец Барыс Дзям'янавіч: «До начала Великой Отечественной войны я с 1932 по 1937 г. работал бухгалтером в совхозе «Передовой» Крупского района, который размещался в д. Каменка. В конце 1937 г. совхоз был ликвидирован и на его базе была создана МТС. Совхоз в основном был свиноводческий.

...Падёж свиней был не только в совхозе «Передовой» в 1936—1937 гг., но и в других совхозах района. Рабочие не говорили, что они падали по вине Фрэйндорфа.

Случаи задержки зарплаты рабочим были как при Фрэйндорфе, так и до него. Совхоз был на хозрасчете и в случае не сдачи мяса рабочим зарплату не выдавали. А в те времена был установлен карантин ввиду болезни свиней и поэтому мясо не сдавалось...»

На пытанне: «Имел ли место факт плохого ремонта сельскохозяйственного инвентаря в 1936—1937 гг?.» Барыс Дзям'янавіч адказаў: «Я не помню, чтобы в совхозе когда-либо плохо отремонтировали сельскохозяйственный инвентарь, в результате чего срывалась бы уборочная кампания».

Крываротава Марыя Ягораўна (у 1932—1937 гг. працавала ў саўгасе «Перадавы» брыгадзірам адкормачнай брыгады):

«Об антисоветской вредительской деятельности Фрэйндорфа мне не известно, антисоветских разговоров от него не слышала.

...Свиньи падали от «чумы» и «рожи». Падёж был очень большой. Ходили разговоры, что умирали от сыворотки. Случаев раздачи свиней не было».

Садоўскі Уладзімір Канстанцінавіч (працаваў у той час у саўгасе трактарыстам):

«...Об антисоветской вредительской деятельности Фрэйндорфа не известно. Рабочие его уважали, хотя по характеру Фрэйндорф был вспыльчив, иногда грубил.

Факта плохого ремонта сельскохозяйственной техники не было. В то время было 6 тракторов и другая техника. Они всегда были отремонтированы и никогда не простаивали. Уборочная кампания никогда не срывалась».

Кулакоўскі Ілья Герасімавіч (рабочы саўгаса «Перадавы»):

«...Фрэйндорфа знали только с положительной стороны. О вредительской деятельности не известно. Плохого ремонта техники не было. Свиньи падали от «рожи» и «чумы».

Такім чынам, высветлілася, што ніякай шкодніцкай дзейнасці, накіраванай супраць Савецкай дзяржавы, Г.А.Фрэйндорф не вёў, а таксама тое, што асуджаны ён быў толькі на падставе «собственноручного признания». Ніякіх іншых матэрыялаў, сцвярджаючых аб яго вінаватасці (у тым ліку і па справе П.Д.Фядулава), не было. 20 жніўня 1957 г. пастановай Ваеннага трыбунала Беларускай ваеннай акругі Георгій Адамавіч Фрэйндорф быў рэабілітаваны. Пасмяротна.

Ленінскім курсам, 1992, 17 чэрвеня.

Г.Грыгор'еў, В.Грыгор'ева.

ХАХЛОЎСКІ Павел Канстанцінавіч, н. ў 1877 у в. Папарнае Лепельскага р-на Віцебскай вобл., жыў у в. Студзёнка. Асуджаны 10.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 28.1.1938 у Оршы. Рэабілітаваны 10.3.1960.

ХАЦКЕВІЧ Рыгор, н. ў 1911 у в. Ратуцічы Барысаўскага р-на Мінскай вобл., жыў у мяст. Крупкі, настаўнік Крупскай сярэдняй школы. Асуджаны 28.5.1938 на 5 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 10.6.1957.

ХІТРО Віктар Іосіфавіч, н. ў 1907 у в. Зянеўшчына Навагрудскага р-на, жыў у пас. Крупскі, эканаміст-планавік Крупскага леспрамгаса. Асуджаны 20.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.11.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ЦЫГАНКОЎ Андрэй Іванавіч, н. ў 1890 у в. Морач Нясвіжскага р-на Мінскай вобл., жыў у пас. Халопенічы, адвакат пры Халопеніцкім нарсудзе. Асуджаны 1.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 4.11.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 30.11.1965.

ЧАРНАМОРДЗІК Аляксандр Вікенцьевіч, н. ў 1911 у в. Камайск Віленскай губ., жыў у пас. Крупскі, тынкоўшчык «Нафтаправодбуда». Асуджаны 22.10.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.4.1989.

ШВАБ Андрэй Кандратавіч, н. ў 1903 у в. Швабы Лагойскага р-на Мінскай вобл., жыў у в. Пышачы, настаўнік няпоўнай сярэдняй школы. Асуджаны 9.11.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 30.5.1989.

ШУТМАН Навум Нахімавіч, н. ў 1906 у г. Мазыр Гомельскай вобл., жыў у пас. Крупскі, таксатар леспрамгаса. Асуджаны 8.12.1937 да вышэйшай

меры пакарання. Расстраляны 21.12.1937 у Оршы. Рэабілітаваны 9.10.1958.

ШЫРКО Пахом Паўлавіч, н. ў 1865 у в. Шарынцы Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., жыў у в. Чараёўка, вартаўнік у калгасе. Асуджаны 8.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 5.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 29.4.1989.

ФЯДУЛАЎ Павел Дзмітрыевіч, працаваў галоўным урачом ветэрынарнай лячэбніцы ў Крупках. Рэпрэсіраваны.

ПРА ЛЁС БАЦЬКІ ЗВЕСТАК НЕ МАЮ

У 1988 г. ва ўпраўленне ўнутраных спраў Маскоўскага абласнога выканкома прыйшло пісьмо ад грамадзянкі Ж.П.Коўлерт (Фядулавай). Вось што яна пісала: «Прашу паведаміць звесткі пра лёс майго бацькі — Фядулава Паўла Дзмітрыевіча, 1901 г. нараджэння, рускага. Да 1937 г. працаваў галоўным урачом ветэрынарнай лячэбніцы ў мястэчку Крупкі... У снежні 1937 г., калі знаходзіўся на курсах павышэння кваліфікацыі ў Маскве, быў арыштаваны як вораг народа. Пра далейшы лёс бацькі звестак не маю».

На жаль, не змаглі і мы падрабязна пазнаёміцца з лёсам гэтага чалавека: архіўная крымінальная справа на П.Дз.Фядулава не захавалася. Ёсць невялікія даныя ў архіве Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, якія сведчаць, што ён быў арыштаваны як польскі шпіён, удзельнік дыверсійнай шпіёнскай арганізацыі, адным з кіраўнікоў якой быў Гурскі, супрацоўнік Ветэрынарнага ўпраўлення Наркамзема БССР. Фядулаў абвінавачваўся ў тым, што па заданні Гурскага праводзіў шкодніцкую работу ў Крупскім раёне: заражаў жывёлу інфекцыйнымі хваробамі.

П.Дз.Фядулаў сваю віну прызнаў, і 21 студзеня 1938 г. пастановай НКУС СССР і пракурора СССР (пратакол № 287) ён быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Мінску 20 лютага 1938 г. У адпаведнасці з Указам Вярхоўнага Савета СССР ад 16 студзеня 1989 г. П.Дз.Фядулаў быў рэабілітаваны. Гэта адбылося праз паўстагоддзе пасля яго смерці — 30 сакавіка 1989 г. *В.В.Грыгор'ева.*

Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у савецка-фінляндскую вайну 1939—1940 гг. і ў час вызвалення Заходняй Беларусі ў верасні 1939 г.

АБЧУГСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АБЧУГА

МАРОЗАЎ Мікалай Іванавіч, рад., загінуў у 1939.

СВІДЗЕРСКІ Купрыян Сцяпанавіч, н. ў 1908, загінуў.

СІМАНОВІЧ Макар Кірылавіч, н. ў 1920, прапаў без вестак.

ВЁСКА БЯЛЯНЫ

ЛУГАЎЦОЎ Аляксандр Дзям'янавіч, н. ў 1912, да вайны жыў у Маскве, працаваў шафёрам. У Чырв. Арміі з верасня 1939, загінуў у лютым 1940.

ВЁСКА КАСЯНІЧЫ

БАРАВІК Архіп Пятровіч, н. ў 1908, у Чырв. Арміі з верасня 1939, загінуў у лютым 1940, пахаваны ў Карэліі.

БАРАВІК Лявон Іосіфавіч, н. ў 1908, у Чырв. Арміі з верасня 1939, загінуў у лютым 1940, пахаваны ў Карэліі.

ПУЛЬКАЧ Сямён Пракопавіч, н. ў 1918, у Чырв. Арміі з мая 1939, загінуў у Карэліі ў лютым 1940.

ПАСЁЛАК КІРАВА

КРУПАДЗЁРАЎ Мітрафан Сцяпанавіч, н. ў 1906, рад., загінуў 9.3.1940 на фронце.

ВЁСКА ЛУЦІШЧА

СЯРГЕЕЎ Фёдар Ульянавіч, н. ў 1918, загінуў.

ВЁСКА ПРУДЗІНЫ

САС Піліп Барысавіч, н. ў 1910, рад., загінуў.

ВЁСКА СЛАБАДА

ШПАКОЎСКІ Фёдар Аляксеевіч, н. ў 1903, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў.

ВЁСКА ШАРНЕВА

КРУПАДЗЁРАЎ Дзмітрый Сцяпанавіч, н. ў 1906, сярж., загінуў 9.3.1940.

БОБРСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА БАРАВЕЦ

ДАНІЛАЎ Ігнат Ананьевіч, загінуў 20.1.1940.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК БОБР

КАЛІНОЎСКІ Іосіф Іванавіч, н. ў 1911, загінуў 8.2.1940.

ЛЯНКОЎСКІ Іван Ермалаевіч, н. ў 1911, загінуў.

ШАЙТАНАЎ Васіль Фёдаравіч, лётчык, загінуў.

ЮДЗІНЕЦ Васіль Мікітавіч, загінуў 12.3.1939.

ВЁСКА ЕЛЕНКА

МАКАРЭВІЧ Сяргей Дзямідавіч, да вайны працаваў у Лепельскім лясгасе, рад., загінуў у 1939.

ВЁСКА КУТЫ

ЛІПАВЫ Аляксандр Андрэевіч, загінуў.

ВЁСКА САКАЛАВІЧЫ

ДАНІЛАЎ Ігнат Ананьевіч, загінуў.
КНОЦЬКА Іван Міхайлавіч.

ВЫДРЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКАЕ ГОРАДНА

ЛУЧЫНА Уладзімір Яўменавіч, н. ў 1909, да вайны працаваў у г. Орша ў органах унутраных спраў, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1940.

ХВАШЧЭЎСКІ Іван Ананьевіч, н. ў 1902, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў 10.2.1940, пахаваны на поўдзень ад в. Мар'янемі.

ХВАШЧЭЎСКІ Кузьма Мікітавіч, н. ў 1915, у Чырв. Арміі з 1939, рад., памёр ад ран 6.3.1940, пахаваны ў мяст. Пілпула, Фінляндыя.

ДАКУДАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ ЖАБЕРЫЧЫ

БУДНІК Віктар Аўдзеевіч, н. ў 1913, рад., загінуў 17.2.1940, пахаваны на полі бою.

СІНЯК Іван Сямёнавіч, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў.

ВЁСКА КЛЁН

БАЧЫШЧА Мікіта Захаравіч, н. ў 1911, рад., прапаў без вестак у лютым 1940.

ДЗЯНІСАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯЗОК

САКАВЕЦ Еўдакім Ігнатавіч, загінуў у снежні 1940.

ВЁСКА ДЗЯНІСАВІЧЫ

КНОЦЬКА Фёдар Селіванавіч, загінуў у 1940.

ВЁСКА НОВЫ САКОЛ

ДОЎГІ Кірыла Маркіянавіч, н. ў 1911, загінуў у 1940.

ВЁСКА ПАПАРНАЕ

НЕВЯДОМСКІ Уладзімір Навумавіч, загінуў 12.3.1940 у с. Мітаміякі, Фінляндыя.

ІГРУШКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАТУРЫ

ГЛІННІК Майсей Іванавіч, загінуў 5.2.1940 каля мяст. Бабошына, Фінляндыя.

ВЁСКА ІГРУШКА

МУРАШКА Давыд Мікалаевіч, загінуў у 1939.

ВЁСКА РАДЗІЦА

АСІПОВІЧ Васіль Макаравіч, загінуў у 1939.

ШЭК Мікалай Сафронавіч, н. ў 1910, у Чырв. Арміі з 1937, загінуў у 1940.

ВЁСКА СТАРАЯ ПЯРЭСІКА

МАЗАНІК Дзмітрый Андрэевіч, загінуў.

ВЁСКА УЗНАЦК

ТОЛКАЧ Аляксей Іванавіч, загінуў у 1940.

ТОЛКАЧ Сяргей Іосіфавіч, н. ў 1915, лейт., загінуў.

КАСТРЫЧНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКІ КАМЯНЕЦ

ДАРОШКА Іван Цімафеевіч, загінуў 13.2.1940.

ВЁСКА ДУБРАЎКА

МАЕЎСКІ Пётр Давыдавіч, загінуў у 1939.

ВЁСКА ЗАБАРОЧЧА

ХАЛЯЎКІН Павел Мікалаевіч, н. ў 1911, рад., загінуў у студзені 1940.

ВЁСКА МАЛЫЯ ХАЛЬНЯВІЧЫ

СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл, загінуў у 1939.

ЮРКЕВІЧ Пётр Дзмітрыевіч, н. ў 1906, загінуў.

ВЁСКА МАЛЬЦЫ

АГЕЕНКА Міхаіл Аляксандравіч, рад., прапаў без вестак.

ВЁСКА ТАПАРЫШЧА

ЮРКЕВІЧ Еўдакім Раманавіч, н. ў 1908, прапаў без вестак у снежні 1939.

ВЁСКА ПРОШЫКА

АГЕЕНКА Міхаіл Аляксандравіч, рад., загінуў.

ГОРАД КРУПКІ

ГАЙДУК Рыгор Сцяпанавіч, н. ў 1909, прапаў без вестак у лютым 1940.

ІГНАТОВІЧ Уладзімір Фёдаравіч, рад., загінуў у 1939.

КУХЛЕЎСКІ Аляксандр Кузьміч, рад., загінуў у 1939.

ЛУГАЎЦОЎ Аляксандр Дзям'янавіч, загінуў у 1939.

МАКАРЭВІЧ Дзяменцій Гаўрылавіч, рад., загінуў у 1939.

СЯДНЁЎ Якаў Данілавіч, н. ў 1911, рад., загінуў 21.9.1939, пахаваны ў г. Гродна.

ПАСЁЛАК КРУПСКІ

КАВАЛЁЎ Аляксандр Ермалаевіч, загінуў у 1940.

ТАРКУНОЎ Аляксандр Нічыпаравіч, загінуў у 1939.

ШКРОБАТ Сяргей Яўхімавіч, н. ў 1918, у Чырв. Арміі з 1938, прапаў без вестак у 1939.

КРУПСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЯРОЗАЎКА

ІВАНОЎ Пётр Пятровіч, н. ў 1915, мал. лейт., прапаў без вестак.

ВЁСКА ЛЕБЕДЗЕВА

БАРЫСАЎ Аляксандр Рыгоравіч, загінуў у 1939.

ВЁСКА НАВАХРОСТЫ

БУРКО Мікалай Іванавіч, н. ў 1908, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

М.І.Бурко.

ВЁСКА РОТАНЬ

БАРАВІК Іларыён Дзянісавіч, н. ў 1911, загінуў.

ВЁСКА ХУДАЎЦЫ

БУДНІК Віктар Аўдзеевіч, да вайны працаваў у лясгасе, у Чырв. Арміі з 23.8.1934, рад., загінуў 17.2.1940.

ПРУДНІКАЎ Міхаіл Ціханавіч, да вайны працаваў у арцелі «Ударнік», у Чырв. Арміі з 30.6.1938, мал. камандзір, загінуў 20.2.1940.

НАЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА НАЧА

ТРАЦЦЯКОЎ Марк Піліпавіч, н. ў 1914, у Чырв. Арміі з 1938, загінуў у 1940.

УХВАЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЯРОЗКА

ДРЫЛА Антон Сяргеевіч, н. ў 1922, загінуў у 1940.

ВЁСКА МАТОШКА

ЛЯЙКОЎСКІ Іван Ермалаевіч, загінуў у 1940.

РАДКЕВІЧ Васіль Карнеевіч, загінуў у 1940.

ВЁСКА МАШЧАНІЦА

САКАЛОЎ Кірыла Трыфанавіч, н. ў 1912, загінуў у 1940.

ВЁСКА СТАРАЯ СЛАБАДА

РЫБАЧОНАК Фядос Васілевіч, загінуў у 1940.

ВЁСКА УХВАЛА

ПРАТАСЕВІЧ Іларыён Іванавіч, да вайны працаваў у арцелі «Ударнік», у Чырв. Арміі з верасня 1939, рад., загінуў 10.2.1940.

ХАЛОПЕНІЦКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА БАРКІ

ХРАМЧАНКА Рыгор Міхайлавіч, прапаў без вестак у лютым 1940.

ВЁСКА ВЕРСАНКА

БУЙВІДОВІЧ Іван Іванавіч, н. ў 1913, загінуў 12.3.1940.

БУЙВІДОВІЧ Іван Пятровіч, н. ў 1920, загінуў у 1940.

ВЁСКА ГАЛЬКІ

ДЗЕРАВЯГА Аляксей Фаміч, н. ў 1917, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЁСКА ГАРАДЗІШЧА

Рабец Емяльян Васілевіч, н. ў 1903, загінуў у 1940.

ВЁСКА ГОЛЬЗБЕРГ

БЯЛЯЕЎ Сяргей Вакулавіч, загінуў у 1940.

ВЁСКА ГРЫЦКАВІЧЫ

КАЗАК Уладзімір Рыгоравіч, н. ў 1910, у Чырв. Арміі з 1939, лейт., загінуў у 1940.

ВЁСКА МХЕРЫНА

ПАСТУШКОЎ Мікіта Цімафеевіч, загінуў 23.12.1939.

ВЁСКА СЛАБАДА

АСІНСКІ Піліп Гаўрылавіч, загінуў 22.2.1940, пахаваны ў мяст. Хумола, Фінляндыя.

ЗАГАЛАВЕЦ Лука Аляксеевіч, загінуў у 1940.

ШПАКОЎСКІ Фёдар Аляксеевіч, н. ў 1903, загінуў у 1940.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК ХАЛОПЕНІЧЫ

БАРКОЎСКІ Сцяпан Васілевіч, н. ў 1909, да вайны працаваў інспектарам Халопеніцкага райана, у Чырв. Арміі з 1939, рад., загінуў 13.2.1940 на Карэльскім перашыйку, пахаваны ў с. Бабоціна каля г. Выбарг Ленінградскай вобл.

З пісьма С.В.Баркоўскага родным

1 снежня 1939 г.

Добры дзень, дарагая і шматпаважаная мая сям'я. У першых радках майго пісьма спяшаюся паведаміць, што я жывы і здаровы... Нічога не зробіш, раз выпадае ваяваць, значыць, так трэба. Хутка разаб'ём усіх ворагаў, даб'ём Польшчу, Фінляндыю зусім

С.В.Баркоўскі.

І.Ф.Гласоўскі.

разгромім, а хто яшчэ паспяшаецца ўцягнуць нас у вайну, таму будзе гора, і на гэтым закончыцца вайна, і прыйдзем дадому і зажывём добра і мірна. Але я апісваць не стану, што цяпер робіцца ў Фінляндыі, бо вам вядома, што Чырвоная Армія пераможа, і вы прасіце бога, каб яна перамагла гэтых нягоднікаў і агрэсараў, падпальшчыкаў сусветнай вайны.

А іншыя весткі дрэнныя: паведамілі, што забілі Івана Гурэцкага. Гэта дрэнна, шкада і вельмі шкада хлопца. Але затое краіна ўшануе героя і лепш быць жонкай героя і жыць удавой, чым жыць з баязліўцам...

Насця, паведамі, хто цяпер працуе загадчыкам райана і хто працуе на маім месцы, цікава ведаць.

Бывай. Паціскаю руку і моцна цалую.

ГЛАСОЎСКІ Іван Фаміч, н. ў 1918, у Чырв. Арміі з 1939, рад., загінуў у студзені 1940.

КАЗАК Васіль Сідаравіч, н. ў 1913, рад., прапаў без вестак у лютым 1940.

ЛІТВІН Сяргей Васілевіч, н. ў 1917, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА ЯКІМАЎКА

МАЗАНІК Савасцей Яўменавіч, загінуў 24.2.1940.

НОВІК Аляксандр Раманавіч, загінуў 5.2.1940.

ХАЦЮХОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ІГРЫШЧА

БАЦЯНОЎСКІ Цімафей Цімафеевіч, н. ў 1902, загінуў у 1939.

ТОЎСЦІК Іван Ільіч, н. ў 1911, загінуў 12.2.1940.

ЯНАЎШЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРКІ

БЛІЗНЕЦ Мікалай Сцяпанавіч, да вайны працаваў лесніком, рад., прапаў без вестак.

БЛІЗНЕЦ Міхаіл Харытонавіч, н. ў 1918, да вайны працаваў у калгасе імя Варашылава, рад., прапаў без вестак у студзені 1939.

БЛІЗНЕЦ Якаў Кандратавіч, н. ў 1910, загінуў.

ВЁСКА БАРСУКІ

КЛЯЦКО Дамітрый Трафімавіч, н. ў 1911, да вайны працаваў старшынёй калгаса «Чырвоны сцяг», загінуў у 1940.

ВЁСКА ДУДАРЫ

ЖУК Цярэнцій Уласавіч, н. ў 1901, да вайны працаваў брыгадзірам у калгасе «Вольная праца», у Чырв. Арміі з 1939, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЁСКА ЛІСІЧЫНА

БУКАТКІН Канстанцін Сцяпанавіч, загінуў.

БУКАТКІН Ягор Іванавіч, загінуў у 1940.

ЖУК Уладзімір Якаўлевіч, н. ў 1908, загінуў 9.3.1940, пахаваны ў в. Бабачана пад г. Выбарг Ленінградскай вобл.

КАЛАЧЫНСКІ Пётр Канстанцінавіч, н. ў 1915, загінуў на фронце.

МАЦКЕВІЧ Сяргей Максімавіч, загінуў у 1940.

ШАРПІЛА Рыгор Кузьміч, загінуў у 1940.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Так пачалася вайна

22.6.1941 г. савецкую краіну скаланула жудасная вестка аб пачатку вайны з фашысцкай Германіяй. У Крупках у гэты дзень павінен быў адбыцца сход партыйна-гаспадарчага актыву па надзённых пытаннях правядзення касавіцы, але пытанні на ім стаялі ўжо іншыя: пра становішча ў раёне ва ўмовах ваеннага часу. Тады яшчэ не думалі, што фашысцкая навала ў хуткім часе дойдзе і да Крупскага раёна, таму аб эвакуацыі гаворкі не было. А праз некалькі дзён шмат каму з прысутных на гэтым актыве ў складзе груп знішчальнікаў давялося ўступіць у барацьбу з варожымі дыверсантамі, якія былі выкінуты на парашутах у раён аўтамагістралі і чыгункі. 27.6.1941 г. нямецкія дыверсанты праніклі ў райцэнтр. Апалчэнцы з ліку партыйных і савецкіх актывістаў уступілі з імі ў бой. У час перастрэлкі адзін з дыверсантаў быў паранены. На наступны дзень яго расстралялі на цэнтральнай плошчы пасёлка. Эвакуацыю прамысловых прадпрыемстваў, сельскагаспадарчай тэхнікі і жывёлы амаль не правялі, таму што да 27 чэрвеня фронт наблізіўся да граніц раёна. Частку тэхнікі разабралі на часткі і закапалі, жывёлу раздалі па дварах калгаснікаў, што можна было і паспелі — знішчылі, але шмат чаго засталося ворагу. Насельніцтва, ды і частка раённага кіраўніцтва, не ведалі, што рабіць у складанай сітуацыі. Частка пачала спешна эвакуіравацца, не абышлося і без панікі, некаторыя, бачачы, што шмат чаго засталося без нагляду, пачалі назапашваць сабе харчаванне і адзенне.

Дз. М. Хромчанка.

У ліпені 1941 г.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны па шэрагу прычын аказаўся вельмі неспрыяльным для Чырвонай Арміі і ў цэлым для савецкага народа. Нямецкія войскі, якія ўваходзілі ў групу армій «Цэнтр», ужо за першы тыдзень баявых дзеянняў акупіравалі практычна ўсю Заходнюю і Цэнтральную Беларусь. 28 чэрвеня пасля жорсткіх баёў быў заняты г. Мінск. Камандаванне Чырвонай Арміі спрабавала стварыць вузлы абароны па рэках Дняпро і Бярэзіна. Моцныя баі разгарнуліся каля гарадоў Магілёва, Барысава, але абарончая лінія каля Барысава была хутка прарвана. Часці Чырвонай Арміі адступілі, ведучы баі з праціўнікам і спрабуючы спыніць яго на прамежкавых рубяжах. Не маючы ў дастатковай меры боепрыпасаў, тэхнікі, падвяргаючыся няспынным авіяцыйным налётам, яны неслі вялікія страты. Вось што адзначалася ў журнале баявых дзеянняў 50-й стралковай дывізіі, якая 1—3 ліпеня трымала абарону каля Барысава: «Снарады цалкам выйшлі. Папоўніць было немагчыма з-за таго, што праціўнік дзейнічаў з трох бакоў ва ўзаемадзеянні з авіяцыяй. Не маючы боепрыпасаў і знаходзячыся перад колькасна перавышаючым праціўнікам, дывізія пачала адыход па маршруту Зембін, Сялец, Халопенічы, Чарэя». Затым у

журнале баявых дзеянняў прапушчана некалькі дзён. Наступны запіс быў зроблены 7 ліпеня ў лесе каля г. Віцебска аб спробе перафарміравання дывізіі па ініцыятыве палкоўніка Баршко, узяўшага на сябе камандаванне. З гэтага можна зрабіць выснову аб разгроме дывізіі прыкладна паміж 3 і 6 ліпеня.

Больш арганізавана дзейнічала 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія, якая 26 чэрвеня была перакінута з-пад Масквы да Барысава, дзе заняла абарону. На працягу трох дзён, нават калі іншыя чырвонаармейскія часці ўжо адышлі, яна працягвала змагацца. За гэты час было знішчана каля 3000 салдат і афіцэраў праціўніка, 60 танкаў, 145 аўтамашын, 1 артдывізіён і 2 мінамётныя батарэі. У ноч з 3 на 4 ліпеня дывізія атрымала загад адысці па аўтамагістралі і замацавацца на рубяжы р. Нача. Гітлераўцы спрабавалі прарваць абарону, але пасля контрудара павінны былі адысці, страціўшы пры гэтым 12 танкаў, больш 200 салдат і афіцэраў. Бой працягваўся ўвесь дзень. У гэты час здзейсніў подзвіг малодшы палітрук 175-га стралковага палка Павел Людвігавіч Кузняцоў. Калі нямецкія танкі прарваліся да лініі абароны, Кузняцоў кінуў бутэльку з гаручай сумессю на першы танк. Ён загарэўся. Але другі танк, страляючы на хаду, рухаўся на акоп воіна. Кузняцоў кінуў на яго звязку гранат. Цяжка паранены, ён на хвіліну страціў прытомнасць. Калі ж адкрыў вочы, то ўбачыў трэцюю варожую машыну, якая ўжо амаль накрыла акоп. Сабраўшы апошнія сілы, П.Л.Кузняцоў кінуў апошнюю звязку гранат. Танк спыніўся. Кузняцоў загінуў. 22 ліпеня 1941 г. ён пасмяротна быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Вечарам 4 ліпеня, атрымаўшы загад адыйсці на наступны рубеж абароны па лініі вёсак Абчуга—Трасцянка—Круча, дывізія пачала адступаць. 5 ліпеня райцэнтр Крупкі быў заняты ворагам.

Для прыкрыцця асноўных сіл на рубяжы р.Бобр каля г.п.Бобр быў пакінуты батальён капітана Д.Т.Шэпелева. Некалькі разоў фашысты пры падтрымцы танкаў і авіяцыі спрабавалі збіць гэты заслон, але беспаспяхова. Знішчыўшы каля роты гітлераўцаў і некалькі танкаў, байцы здолелі вырвацца з акружэння, але сам камбат быў паранены. За гэты бой 22 ліпеня 1941 г. ён быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Але на паўночна-ўсходнім напрамку, у забалочана-лясной частцы раёна, яшчэ працягвалі баявыя дзеянні чырвонаармейцы 100-й і 161-й стралковых дывізій. 6 ліпеня штаб 161-й дывізіі выдаў загад, у якім падкрэслівалася, што праціўнік працягвае наступаць на Барысаўскім і Магілёўскім напрамках. Справа нікога няма. Злева адыходзіць 100-я стралковая дывізія. Граніца з ёю — Гібайлавічы, Сомры, Смілавічы, Цяцерын. Перад дывізіяй ставілася мэта да 7.00 7 ліпеня адыходзіць на новы абарончы рубеж у напрамку вёсак Дзянісавічы—Пышачы — Церахаўка — Забалоцце. 477-му стралковаму палку з 628-м артпалком вызначаўся маршрут: Лаўніца—Ліпа—Выдрыца—Калінін—Ухвала—Мікалаеўшчына і ставілася задача да 7.00 заняць участак для абароны па лініі Старыя Сомры—Пышачы—Старая Слабада, 542-му стралковаму палку з 632-м артылерыйскім палком маршрут: Арэшкавічы—Гумны—Узнаж—Выдрыца—Калінін—Канстанцінаўка і да 7.00 7 ліпеня заняць участак для абароны каля вёсак Дзянісавічы — Стары Сакол — Забалоцце, 603-му стралковаму палку з 692-м артпалком маршрут: Міхеевічы—Белавічы—Ухвала—Селішча і да 7.00 7 ліпеня 1941 г. заняць участак для абароны каля вёсак — Новая Слабада—Машчаніца.

З цяжкімі баямі адступалі часці 100-й і 161-й стралковых дывізій. Пад вечар 6 ліпеня яны дасягнулі тэрыторыі Крупскага раёна. Ноччу пры падыходзе да в. Выдрыца разведка 477-га стралковага палка ўстанавіла, што вёска ўжо занята праціўнікам. Палкоўнік Рыгор Ільіч Асятроў вырашыў прабівацца з боем. У пяць гадзін раніцы 7 ліпеня чырвонаармейцы атакавалі ворага. Пачуўшы бой, камандзір 161-й дывізіі палкоўнік А. У. Міхайлаў загадаў памяняць маршрут руху на Гумны—Міхеевічы—Бялавічы—Купленку. На дапамогу 477-му палку ён накіраваў мотастралковую роту 145-га асобнага разведвальнага батальёна на чале з малодшым лейтэнантам І. Т. Гурманавым і намеснікам камандзіра па палітычнай частцы малодшым палітруком У. М. Гаўрылавым. Рота з двума браневікамі і дзвюма 45-мм пушкамі ў раёне в. Вязок сутыкнулася з фашыстамі. Яна адразу ўступіла ў бой, байцы падбілі 2 нямецкія танкі, знішчылі некалькі дзесяткаў варожых салдат, але прабіцца да 477-га палка не змаглі.

Адначасова з 477-м палком у напрамку вёсак Выдрыца—Ухвала адступалі байцы 542-га стралковага палка і артылерысты 628-га артпалка. Пачуўшы перастрэлку, камандзір 542-га палка маёр Павел Іванавіч Шумееў загадаў змяніць маршрут у напрамку да вёсак Узнаж—Гумны—Міхеевічы. Але каля в. Узнаж наляцела фашысцкая авіяцыя, паказаліся

П.І.Шумееў.

танкі. Амаль уся артылерыя была знішчана, другі і трэці батальёны вымушаны былі заняць кругавую абарону. Першы батальён 542-га стралковага палка змог адарвацца ад ворага, але 7 ліпеня ў 11 гадзін раніцы зноў сутыкнуўся з праціўнікам у раёне в. Новы Сакол. У час няроўнага бою байцы капітана Барыса Антонавіча Глазунова падпалілі бутэлькамі з бензінам 3 танкі, але, не падтрыманыя суседзямі, разам са штабам палка былі вымушаны адступіць праз вёскі Ухвала і Мікалаеўка ў напрамку вёсак Старая Слабада і Матошка. Ухвалу і Бялавічы захапілі немцы. Такім чынам, 7 ліпеня 2 батальёны 542-га стралковага палка, увесь 477-ы стралковы полк, 628-ы лёгкі артылерыйскі і 2 дывізіёны 632-га гаўбічнага артылерыйскага палка трапілі ў акружэнне ў раёне вёсак Выдрыца—Узнаж—Гумны—Міхеевічы.

Камандзір 477-га стралковага палка Р. І. Асятроў, зразумеўшы, што полк трапіў у акружэнне, даў каманду заняць кругавую абарону ў раёне в. Выдрыца і потым прабівацца ў напрамку вёсак Дзянісавічы—Папарнае—Шынкі. У раёне Папарнага і Шынкоў полк зноў сутыкнуўся з наступаючымі варожымі войскамі, некалькі дзён байцы змагаліся ў акружэнні. Зразумеўшы, што сувязь з дывізіяй канчаткова страчана, Р.І. Асятроў загадаў групе камандзіраў і салдат вынесці палкавы сцяг.

Байцы і камандзіры 628-га артылерыйскага палка, не здолеўшы прарвацца з акружэння, стварылі партызанскі атрад на чале з камандзірам палка палкоўнікам Аляксандрам Міхайлавічам Лапшыным (партызанскі атрад «Макара»). Восенню 1941 г. частка партызан атрада выйшла за лінію фронту, частка далучылася да клічаўскіх партызан, а група старшага лейтэнанта Сямёна Сысоева ўлілася ў партызанскі атрад імя Варашылава брыгады імя Шчорса, якая дзейнічала на тэрыторыі Крупскага раёна. Восенню 1942 г. С. Сысоеў загінуў каля в. Заполле.

Камандзір 542-га стралковага палка Павел Іванавіч Шумееў разам з групай камандзіраў быў узяты ў палон каля в. Сомры, але потым уцёк у час расстрэлу, трапіў у партызанскі атрад НКУС маёра А. Я. Васілеўскага, разам з групай байцоў гэтага атрада восенню 1941 г. выйшаў за лінію фронту. Пазней, калі быў ужо камандзірам дывізіі, загінуў 1.5.1945 г. ў Польшчы.

Асноўная частка дывізіі выйшла з акружэння, але з вялікімі стратамі. 18.9.1941 г. 161-я дывізія атрымала назву 4-й гвардзейскай.

На поўдзень ад 161-й дывізіі адступала 100-я дывізія генерала І. М. Русіянава. Яна рухалася па маршруту: вёскі Міхеевічы—Бялавічы—Гібайлавічы (цяпер Знаменка)—Сомры— Заазер'е. У авангардзе ішоў 85-ы стралковы полк, прыкрываў адыход 355-ы стралковы полк.

Раніцай 7 ліпеня ў раёне в. Сомры ар'егард дывізіі ў складзе разведвальнага батальёна, батальёна 355-га стралковага палка і дывізіёна 46-га гаўбічнага артылерыйскага палка атакавалі немцы. Завязаўся бой. Агнём гармат былі падбіты 6 варожых танкаў, яшчэ адзін падбіты байцамі на чале з начальнікам штаба батальёна старшым лейтэнантам Швяцовым. Сам Швяцоў загінуў, перарэзаны кулямётнай чаргой з «Юнкерса» на ўскрайку Сомраў. Гітлераўцы ўвялі ў бой пяхоту і бронетранспарцёры. За паўгадзіны было адбіта некалькі атак праціўніка. Пры падтрымцы гаўбіц карпуснога артылерыйскага дывізіёна стралковы батальён капітана А. У. Алясеева падняўся ў контратаку. Шлях на в. Заазер'е быў адкрыты.

Гітлераўцаў не пакідала жаданне расчляніць дывізію на часткі. Чарговы ўдар быў зроблены імі ў напрамку вёсак Дзевяніца — Новыя Пышачы. Тут, на перакрыжаванні дарог паміж вёскамі Новыя Пышачы, Сомры і Гібайлавічы, зноў разгарэўся бой. На дапамогу пяхоце 315-га стралковага палка была накіравана бронемашына старшага сяржанта Я. Д. Бяляева і танк Т-26 лейтэнанта П. С. Цімашчука. Агнём з кулямёта экіпаж бронемашыны прымусіў залегчы пяхоту ворага, але ў гэты час у бранявік трапіў варожы снарад. Члены экіпажа былі забіты, а Я. Д. Бяляеў паранены. Але ён працягваў страляць, пакуль не загінуў. 31.8.1941 г. яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Улічваючы пагрозу акружэння, генерал І.

М. Русіянаў аддаў загад адыходзіць і заняць абарону па р. Ослік каля в. Заазер'е. Частка дывізіі, у тым ліку 331-ы стралковы полк, 34-ы і 46-ы артылерыйскія палкі, здолела адарвацца ад праціўніка. Але 85-ы стралковы полк быў акружаны каля вёсак Сомры і Заазер'е. Як расказваў потым у кнізе «Гадзіна пераклічкі» адзін з удзельнікаў баёў А. П. Кузьмічоў, цэлы дзень 9 ліпеня полк адбіваў атакі праціўніка. Асабліва жорсткі бой разгарэўся ў распалажэнні 2-га батальёна пад камандаваннем капітана Пятра Грыгор'ева. Сам камбат некалькі разоў падымаў байцоў у контратаку. Грыгор'еў і многія іншыя байцы і камандзіры загінулі, але і вораг пацярпеў вялікія страты і быў адкінуты. Мужна абаранялі ся байцы 3-га батальёна на чале з капітанам Фёдарам Піліпавічам Каўрыжкай. Яны таксама адбілі ўсе атакі, а група байцоў пад камандаваннем сакратара камсамольскага бюро Аляксандра Шнэйфрмана прабралася на пазіцыі варожай артылерыйскай батарэі, захапіла 2 супрацьтанкавыя гарматы і трайнымі стрэламі спаліла 3 варожыя танкі.

Вечарам 9 ліпеня камандзір палка палкоўнік М. В. Якімовіч аддаў загад прарывацца на ўсход. Прыкрываць адыход застаўся 3-і батальён Ф. П. Каўрыжкі. Батальён адбіваўся ад ворага, пакуль не скончыліся боепрыпасы, а потым батальённы камісар Ф. В. Зыкаў падняў байцоў у контратаку. У час бою загінулі капітан Каўрыжка, камандзір мінамётнай роты лейтэнант Сердзюкоў, сотні байцоў і камандзіраў. На полі і ў лясах паміж Заазер'ем і Гібайлавічамі засталося навечна ляжаць каля 500 салдат і афіцэраў дывізіі. Дзесяткі байцоў сталі партызанамі. Але каля 1500 чалавек усё ж вырваліся з акружэння і вынеслі баявыя сцягі сваіх вайсковых падраздзяленняў. 18 верасня, пасля баёў пад Ельняй, 100-я дывізія стала 1-й гвардзейскай.

9.7.1941 г. тэрыторыя Крупскага раёна была поўнасцю захоплена ворагам.

Дз. М. Хромчанка, М. А. Баравуля.

Абарончыя баі

Найбольш напружаныя баі з часцямі 47-га нямецкага матарызаванага корпуса разгарнуліся на рубяжах: рака Нача, Крупкі, рака Бобр, Талачын, Коханава.

Раніцай 4 ліпеня дывізія, расцягнуўшыся на 25 км, займала абарону па ўсходнім беразе р. Нача. Да гэтага часу мотастралковыя палкі масквічоў значна парадзелі, а пушачны і танкавы — панеслі значныя страты ў баявой тэхніцы. Былі паранены камбаты Шэпелаў і Шчаглоў, выбыла з шарэнгі шмат іншых камандзіраў і палітработнікаў.

Пасля палудня варожыя танкі і бронетранспарцёры з пяхотай абышлі флангі дывізіі і, прарваўшыся да яе ў тыл, з'явіліся ў раёне Крупак. Яны наступалі трыма эшалонамі. У першым было 85 машын.

Для адбіцця танкавай атакі Крайзер вылучыў 12-ы танкавы полк і частку дывізіённай артылерыі. Танкавы бой цягнуўся больш за дзве гадзіны.

Адважныя танкісты змагаліся да апошніх сіл і стрымалі ворага. Па сведках відавочцаў, усё поле бою пад Крупкамі было ўслана абломкамі згарэлых і разбітых варожных і нашых машын.

Адвагу і мужнасць праявіў у гэтым баі камандзір танкавага батальёна капітан Сямён Восіпавіч Пронін. Пад вечар, калі зямлю ахутаў туман, Пронін для зручнасці кіравання боем адкрыў люк сваёй машыны і камандаваў, стоячы ва ўвесь рост. Жыццё капітана абарваў варожы снарад. З наступленнем цемры часці дывізіі пачалі адыходзіць на новы абарончы рубеж па ўсходнім беразе ракі Бобр. Герой-камандзір пасмяротна быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Друкуецца па кн.: Кузнецов П. Г. Пролетарская московско-минская. М., 1975. С. 104—105.

Стаялі насмерць

Ноччу 4 ліпеня 1941 г. часці Маскоўскай пралетарскай мотастралковай дывізіі адышлі за раку Нача. Увесь дзень яны адбівалі атакі ворага. І тут, калі стала зразумела, што фашысцкія танкі вось-вось прарвуцца да моста, сапёрам было загадана ўзарваць мост.

Радавыя першай роты 20-га сапёрнага батальёна Ткач і Бандарэнка, схапіўшы ўзрыў-

чатку, бягом кінуліся да моста. Нямецкія танкі ўжо зусім блізка, бачны іх шэра-зялёныя сілуэты з чорнымі крыжамі на брані...

Калі галоўны фашысцкі танк уз'ехаў на мост, раздаўся страшэнны выбух. У неба ўскінуліся бярвёны, зямля і танк разам з абломкамі моста звалiліся ў ваду. Так цаной уласнага жыцця камсамольцы Ткач і Бандарэнка падарвалі мост і затрымалі рух фашысцкіх войск па Маскоўска-Мінскай шашы.

А. Белавусаў, гв. палкоўнік.

У тыя гады

Як пачалася ў 1941 г. вайна, магазін у в. Каменка адразу разрабавалі і закрылі.

У нашай мясцовасці каля в. Баравыя быў аэрадром, дык нямецкія самалёты прыляцелі, пачалі яго бамбіць, а нашым лётчыкам ніхто не аддае загаду ўзлятаць. Былі такія, што ўзляталі самастойна, уступалі ў бой з ворагам, але амаль усе загінулі, як і тыя, хто заставаўся на зямлі.

Як немцы прыйшлі, нас з цёткай і дзецьмі выгналі з хаты, у якой мы жылі. Яна спатрэбілася варожым салдатам для пастою. А нас выселілі ў старую закінутую хату, дзе не было ні печы, ні шыб у вокнах.

Была нам яшчэ напасць, калі на халопеніцкім шляху падарвалася на міне варожая аўтамашына. Пасля гэтага нас кожную раніцу сталі выганяць на шлях і весці шарэнгамі да Ігрушкі. Называлі гэта «дарогу таптаць». Ідзеш і мурашкі па целе — хто ведае, пад чыімі нагамі выбухне міна.

Цыбулька, вёска Каменка.

Так пачыналася вайна

З успамінаў У.І.Маласая.

У першыя тры дні пасля пачатку вайны яе рэха амаль не далятала да нашай вёскі Нача, калі не лічыць рух воінскіх эшалонаў у бок Мінска.

На чацвёрты дзень, 26 чэрвеня, з'явіліся варожыя бамбардзіроўшчыкі з крыжамі на фюзеляжах. Накіроўваючыся на ўсход, яны скінулі першыя бомбы на чыгуначны мост цераз р.Нача, які знаходзіўся ў кіламетры ад вёскі. Аднак бомбы не трапілі на яго, але дом чыгуначніка, размешчаны непадалёку, быў разбураны. На шчасце, чалавечых ахвяр не было, бо жыхары дома, пачуўшы гул самалёта, своечасова схаваліся ва ўкрыцці.

Нямецкія самалёты з'явіліся і на наступны дзень. На гэты раз яны скінулі бомбы на чыгуначнае палатно каля пасёлка Брышча.

У гэтыя дні нам давялося ўбачыць і першыя ахвяры вайны. Каля чыгуначнага пераезду, непадалёку ад пасёлка Кладзі, спыніўся санітарны цягнік, які накіроўваўся на ўсход з параненымі воінамі. У гэты час памёр малады афіцэр, у якога была ампутавана нага вышэй калена. Мы забралі яго і на павозцы даставілі ў Нацкі клуб, потым арганізавалі пахаванне. На мітынг сабраліся ўсе жыхары вёскі. Мужнага воіна, які аддаў сваё жыццё за Радзіму, пахавалі на нацкіх могілках каля дарогі.

На ўсход усё рухаліся і рухаліся ў адзіночку, групамі, а то і калонамі бежанцы, сярод якіх было многа старых, жанчын, малых дзяцей. Змучаныя, галодныя, бежанцы мелі патрэбу ў дапамозе, і мы рабілі ўсё, што маглі, што было ў нашых сілах і магчымасцях: паілі малаком, давалі прадукты харчавання.

Тым часам фронт з кожным днём набліжаўся да нашай вёскі. Ужо данесілася водгулле кананады баёў на рубяжы р.Бярэзіны ў раёне г. Барысава. На шашы Мінск—Масква, на прасёлкавых дарогах і ў лясных урочышчах усё больш збіраліся нашы войскі. Гэта былі падраздзяленні і часці 1-й Маскоўскай мотастралковай дывізіі, якая вяла бой на р.Бярэзіна і адыходзіла на новы рубеж р.Нача.

З самай раніцы 2 ліпеня ў паветры над вёскай Дакудава і аэрадромам, які быў там размешчаны, пачалі завязвацца паветраныя баі паміж самалётамі праціўніка і нашымі знішчальнікамі. Помніцца, у гэты дзень была скінута вялікая колькасць нямецкіх лістовак на рускай мове, якія заклікалі нашых воінаў спыніць супраціўленне і здацца ў палон. Пры гэтым ім абяцалі розныя даброты. Мірнае на-

сельніцтва ў гэтых лістоўках заклікалася да дружалюбнай сустрэчы «нямецкіх вызваліцеляў».

У другой палове дня 2 ліпеня па тэлефоне мы атрымалі ўказанне райвыканкома і райваенкамата аб накіраванні працаздольных мужчын і жанчын з падводамі і інструментамі да р.Бобр для будаўніцтва абарончага рубяжа. Нам жа, некалькім камсамольцам, было загадана заставацца ў вёсцы да асобага распараджэння і прымаць меры па падтрыманні парадку. Да вечара вёска амаль апусцела і з наступленнем цемры тут запанавала глыбокая і трывожная цішыня.

Усю ноч я і мой таварыш Антон правялі ў памяшканні мясцовага паштовага аддзялення, дзе дзяжурылі тэлефаністкі, якія трымалі сувязь з кіраўніцтвам раёна і інфармавалі яго пра абстаноўку ў вёсцы. А раніцай 3 ліпеня ў паветры і на зямлі ўсё загрукатала. Хутка была перарвана тэлефонная сувязь з райцэнтрам. У той жа дзень па партатыўнаму радыёприёмніку нам удалося паслухаць прамову І.В.Сталіна. Пасля гэтага мы канчаткова вырашылі добраахвотна пайсці на фронт. У сярэдзіне дня я і Антон паспрабавалі далучыцца да воінаў Маскоўскай пралетарскай дывізіі, але гэта нам не ўдалося і мы пайшлі да сваёй вёскі. У небе з'явіліся самалёты, пачалася артылерыйска-зенітная стральба. У гэты час каля памяшкання сельсавета старшыня сельсавета А.І.Буйвідовіч і сакратар сельсавета А.М.Гайдук разам з участковым міліцыянерам рыхтавалі да эвакуацыі дакументы, некаторыя з іх закопвалі ў зямлю, а некаторыя палілі.

Гул самалётаў у паветры з кожнай хвілінай нарастаў, узмацняўся артылерыйскі абстрэл, удалечыні пачуўся гул танкаў.

У гэты момант да памяшкання сельсавета падышла група воінаў на чале з лейтэнантам, які паведаміў, што непадалёку ад вёскі прарваліся нямецкія танкі, якія рухаюцца ў напрамку пасёлка Баркі. Мае таварышы Антон, Леанід, Іван і я папрасілі дазволу далучыцца да групы лейтэнанта. Часу на роздум зусім не было, і мы разам з чырвонаармейцамі накіраваліся ад сельсавета ўніз да моста. Хутка на кані, запрэжаным у падводу, нас дагналі старшыня Нацкага сельсавета А.І.Буйвідовіч, сакратар сельсавета А.М.Гайдук і дырэктар Нацкай няпоўнай сярэдняй школы М.А.Суперфін.

З боку нашай вёскі даносіліся глухія гукі гарматных стрэлаў і разрываў снарадаў. На захадзе ад станцыі Крупкі ўспыхнула вялізнае полымя пажару. Гэта, напэўна, гарэлі склады нафтабазы.

Так на зыходзе 3 ліпеня 1941 г. мы, чатыры камсамольцы з вёскі Нача, не развітаўшыся з бацькамі, пайшлі на ўсход і апынуліся ў вогненнай віхуры вайны, якая цягнулася некалькі гадоў. Ніхто з маіх сяброў, якія пайшлі са мной абараняць Радзіму, не застаўся ў жывых. Я ніколі не забуду сваіх сяброў-аднавяскоўцаў, з якімі пачынаў вайну, — хлопцаў з Начы.

Ленінскім курсам, 1991, 18 чэрвеня.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.

Паданне

21 чэрвеня 1941 г. ноч выдалася надзвычай цёплай і ціхай. Пад покрывам начнога змроку спала ўсё: і людзі, і дрэвы, і травы, яшчэ не паспеўшыя схіліцца пад буйной расой.

Не спалася толькі двум сябрукам, што сядзелі на прызбе хаты, якая стаяла якраз супраць павароту дарогі на Заазер'е. Яны дымілі самакруткамі і зрэдку перакідваліся словамі. Стаяла пара сенажаці. Заўтра трэба было падымацца як мага раней і ісці ўпраўляцца са скошаным сенам. Раптам яны ўстрапянуліся ад дружнага сабачага брэху. З суседняга двара выскачыў рослы ганчак, у нейкім утрапенні ўставіўся на захад і жаласна і трывожна завыў. Хлопцы, як па камандзе, ускочылі на ногі і кінуліся да вугла хаты: што ж там, на захадзе?

Незвычайнае відовішча, раней ніколі не бачанае, заставіла іх апаланець ад жаху. Па дарозе з Дзевяніцы павольна ішла да вёскі вельмі высокая, вышэй прыдарожных дрэў, белая жанчына з касою ў руках. Не чуваць было ні яе крокаў, не варушыліся яе густыя, спадаючыя амаль да пояса, валасы. Жанчына не ішла, не рухалася, яна насоўвалася на вёску, як насоўваецца чорная хмара на навакольле. Там, дзе дарога паварочвае направа, у бок Свірыдаўкі, яна збочыла со шляху і паплыла прама на хлопцаў, кіруючыся напрасткі на заазерскую дарогу. Паплыла прама па жыце, і рассцілалася яно перад белай жанчынай, не

калыхалася і не шапацела яго калоссе. Калі жанчына-прывід наблізілася, хлопцы заўважылі, што слёзы льюцца па яе твары, які, здавалася, асвятляўся раз-пораз сполахамі далёкай бліскавіцы ці пажарышчаў.

Хлопцы, як па камандзе, кінуліся пад плот у крапіву, сабака адразу ж змоўк і хуценька шмыгнуў у падваротню. Жанчына нібыта прасачылася праз высокі паркан у двух метрах ад спужаных дружбакоў, абдаўшы іх страшэнным холадам і непакоем, спынілася на перакрыжаванні дарог, там, дзе цяпер стаіць помнік загінуўшым, з нейкім невыносным болем аглядзела гэтае месца і павольна пасунулася праз мосцік на Заазер'е. І здалося хлопцам, што плыў за ёй енк і плач дзяцей і жанчын, лясканне металу, свіст бомбаў і трупны смурод.

Калі хлопцы раніцай расказалі сваім бацькам пра гэты прывід, тыя запэўнілі іх, што набліжаецца вайна, а белая жанчына з касой — гэта смерць, якая аглядала мясціны свайго будучага жніва.

У поўдзень даведаліся, што вайна пачалася на самой справе. А ў лістападзе 1942 г. якраз пад той хатай, дзе сядзелі хлопцы, было расстраляна 180 жыхароў вёскі Сомры.

Паданне запісаў ад Івана Міхайлавіча Алексіевіча М. А. Баравуля.

Дакументы сведчаць

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА № 17 НАЧАЛЬНІКА ШТАБА 161-й ДЫВІЗІІ

д. Николаевка 18.00. 7 ліпеня 1941 г.

1. Части 161 сд, кроме 477.сп, 628 гап, 2 и 1 542 сп к 17 ч. 30 мин. сосредоточились в районах обороны согласно приказа штадива № 4 от 6.7.1941 г.

2. 477 сп и 628 гап... к указанному времени в новый район обороны не прибыли. В районе Выдрицы с 6 ч. 30 мин. утра в течение 2 часов шел бой... Их место нахождения неизвестно.

3. Около 11.00 из района д. Новый Сокол противник в составе 7 танков и нескольких мотоциклистов внезапно открыл артиллерийский, минометный и пулеметный огонь по разведуправлению 542 сп и разведбатальону дивизии. Первый стрелковый батальон 542 сп в районе Новый Сокол завязал бой с передовыми частями.

В результате небольшого боя уничтожено 3 танка противника, из них 1 танк сгорел.

Потери выясняются.

4. В 16.00 со стороны д. Заболотье противник внезапно открыл минометный огонь (тяжелого калибра) по расположению командного пункта штадива д. Николаевка. В результате обстрела ранен 1 человек.

Начштадив 161 м-р Мурашев

Архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 1052, воп. 1, спр. 8, л. 82, 88, 93.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА № 20 НАЧАЛЬНІКА ШТАБА 161-й ДЫВІЗІІ

лес 2 км от д. Новый Двор

8 ліпеня 1941 г.

1. 603 сп — резерв

2. 542 сп (без 2 и 3 стрелковых батальонов с батареей 2 июля 1941 г. 632 гап) установлен последней разведкой в д. Павловичи. Место нахождения 2 и 3 стрелковых батальонов не выяснено.

3. 477 сп и 628 лап не найдены. Последняя разведка из поиска еще не вернулась.

Начштадив 161 м-р Мурашев

Архіў міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 1052, воп. 1, спр. 8, л. 82, 88, 93.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым, які быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, дэталёва распрацоўваўся яшчэ задоўга да нападу на Савецкі Саюз. Асноўныя яго палажэнні былі выкладзены кіраўніком СС Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з мясцовым насельніцтвам усходніх абласцей» ад 25 мая 1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі неабходна разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Важнейшай задачай акупацыйнай палітыкі з'яўлялася недапушчэнне аб'яднання і павелічэння народаў на гэтых тэрыторыях, прывіцця ім нацыянальнай свядомасці і развіцця нацыянальнай культуры. Найбольш актыўную масу «не нямецкага насельніцтва» меркавалася ператварыць у напаўпісьменных рабоў.

Падрабязныя планы, інструкцыі, загады на акупіраванай тэрыторыі выкладзены і ў шэрагу іншых сумна вядомых дакументаў, у тым ліку ў плане «Барбароса» (канчатковы варыянт яго дадзены ў дырэктыве № 21 вярхоўнага камандавання германскай арміі ад 18.12.1940 г.), які вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР; генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі, «Інструкцыі пра асобыя вобласці» да дырэктывы № 21 плана «Барбароса» (13.3.1941 г.); дырэктыве па кіраўніцтве эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях і інш. Гэтыя дакументы прадугледжвалі практычныя мерапрыемствы па ўстанаўленні акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі, якая падлягала захопу. У далейшым яны дапаўняліся новымі загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванні, гвалтаванне і забойствы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны. Гэтыя дакументы поўнасцю развязвалі рукі гітлераўскім катам і забойцам, мелі намер вызваліць іх ад усякай адказнасці за здзейсненыя злачынствы. Але, нягледзячы на гэта, вялікі фактычны матэрыял, які ўтрымліваўся ў іх, бясспрэчна выкрываў злачынную сутнасць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Нацысцкія верхаводы яшчэ да агрэсіі адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам план падзелу захопленай тэрыторыі. Восенню 1941 г. падзел часова акупіраванай Беларусі быў у асноўным завершаны. Яе этнаграфічную цэласную тэрыторыю захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым супольнасць тэрыторыі, мовы, культуры беларускага народа, якая гістарычна склалася. Тэрыторыя рэспублікі на лініі Полацк—Барысаў на ўсходзе, Старыя Дарогі — воз. Чырвонае на поўдні, па р. Зальвянка і ўсходнім узлессі Белавежскай Пушчы на захадзе была вылучана ў генеральную акругу і атрымала назву «Беларутэнія». Плошча акругі па стану на 4 снежня 1941 г. складала толькі чвэрць тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3 138 256 чалавек. Паўднёвыя раёны Гомельскай і Палескай абласцей, частка Брэсцкай вобласці далучаліся да рэйхскамісарыята «Украіна». Беластоцкая вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі да акругі «Беласток» і ўвайшлі ў склад Усходняй Прусіі. Частку Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў гітлераўцы аднеслі да генеральнай акругі «Літва», а Віцебскую, Магілёўскую, усходнія раёны Мінскай, а таксама большую частку Гомельскай вобласці — да зоны армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

На тэрыторыі створаных генеральных акругоў дзейнічаў велізарны ваенны і паліцэйскі апарат. Агульнае кіраўніцтва акупіраванымі тэрыторыямі ажыццяўляла міністэрства па справах акупіраваных абласцей на Усходзе.

У. І. Лемяшонак.

* * *

Крупскі раён знаходзіўся ў зоне армейскага тылу групы армій «Цэнтр», у якім уся ўлада належала камандаванню армейскіх часцей, ваенна-палявым і мясцовым камендатурам. Каб узмацніць уплыў на мясцовае насельніцтва, былі створаны мясцовыя дапаможныя ўстановы—управы на чале з бургамістрамі. У вёсках гітлераўцамі прызначаліся старасты, солтысы, войты. 18 ліпеня 1941 г. была створана Крупская раённая ўправа як вышэйшы мясцовы адміністрацыйны орган. Райуправа складалася з 10 аддзелаў, дзе працавалі 38

чалавек. Гэта аддзелы: агульны, беларускай самадапамогі, аховы здароўя, адукацыі, дарожна-будаўнічы, мясцовай прамысловасці, забеспячэння і гандлю, ветэрынарны, фінаддзел, прымірыцельная камера. Дзейнічала таксама нямецкая сельгаскамендатура на чале з ваенным камендантам, у распараджэнні якога знаходзіўся «карны ўзвод».

На месцах замест сельсаветаў ствараліся валасныя ўправы на чале з бургамістрамі валасцей, а ў вёсках адміністрацыйныя пасады занялі старасты. Усяго ў раёне налічвалася 14 валасцей: Ухвальская, Выдрыцкая, Сакалавіцкая, Бобрская, Смародзінская, Абчугская, Шэйская, Ігрушкаўская, Малажабярыцкая, Крупская, Станцыйная, Нацкая, Стараслабадская, Шынкаўская. У 1944 г. дзве апошнія воласці былі ліквідаваны. Стараслабадская воласць улілася ва Ухвальскую, а Шынкаўская — у Сакалавіцкую з прычыны, як указвалася ў нямецкіх дакументах, лютавання банд ва ўказаных дзвюх валасцях.

Узброенай апорай акупацыйнага рэжыму сталі гарнізоны і паліцэйскі апарат, а таксама войскі СС. Гарнізоны размяшчаліся ў першую чаргу каля стратэгічных дарог і магістраляў, а таксама і ў іншых вёсках. Яны былі ў Дакудаве, Навахростах, Радзіцы, Ігрушцы, Хацюхове, Узнацку, Версанцы, Шэйцы, Выдрыцы, Дзянісавічах, Ухвале, Абчузе, Халопенічах, Бабры, Крупках, Забор'і, Прудзінах, Майскім, Дворышчы, Ламскім, Лютым, Асінаўцы, Худаўцах, Калыбанаве, Плісе, Зароўі. Акрамя немцаў, гарнізоны часткова складаліся з французаў, паліцэйскіх. Звычайна іх колькасць не перавышала ў сярэднім 100 чалавек, але былі і больш буйныя гарнізоны. Напрыклад, у Крупках — 400, Бабры — 120 чалавек.

Паліцэйскі апарат складаўся з начальніка паліцыі, памочніка, паліцэйскія размяркоўваліся па ротах, аддзяленнях. Яны атрымлівалі заробак — 600—700 рублёў у месяц, кожны дзень харчовы паёк — 400—600 г хлеба, гарэлку, масла і інш. У Халопенічах дзейнічалі курсы па навучанні паліцэйскіх. Карныя сілы складалі атрады СС, а таксама гестапа, СД. Акрамя таго, дзейнічала так званая служба парадку. Яна складалася з 5—6 атрадаў па 50 чалавек у апорных пунктах, раённы апарат складаўся з 4 аддзелаў: 1-ы аддзел вёў крымінальныя справы, 2-і — палітычныя справы, 3-і займаўся пытаннямі аховы грамадскага парадку і 4-ы — асобы аддзел па барацьбе з партызанамі.

У ліку іншых узброеных сіл Крупскі раён кантралявала 286-я ахоўная дывізія вермахта, 237-ы асобны батальён 4-й арміі, часці СС. У Крупках, Халопенічах знаходзіліся ўстановы гестапа, артскамендатура, былі абсталяваны турмы, за 2 км ад Крупак знаходзіўся канцэнтрацыйны лагер, дзе быў устаноўлены вагон-душагубка. За гады акупацыі ў гэтым лагеры было знішчана больш за 2 тысячы чалавек. У Крупках таксама працавала школа па падрыхтоўцы агентаў гестапа. За злоўленага партызана салдатам абяцалі месячны водпуск, камандзіру атрада — двухмесячны. Паліцэйскім за злоўленага партызана была абяцана ўзнагарода — 13 пудоў солі, за выяўленне асоб, звязаных з партызанамі, — 5 пудоў солі.

Нягледзячы на бачнасць мясцовай цывільнай адміністрацыі, фактычна ўся паўната ўлады належала нямецкаму ваеннаму камандаванню. Ужо ў першыя месяцы акупацыі было праведзена масавае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва. 18 верасня 1941 г. каля в. Лебедзева было знішчана 1975 жыхароў Крупак, у лесе каля в. Стары Бобр 961 жыхар Бабра, ва ўрочышчы Каменны Лог каля Халопенічаў — 2700 жыхароў пас. Халопенічы і в. Шамкі.

З першых дзён акупацыі германскія ўлады правялі ўлік жывёлы, у насельніцтва былі ўзяты захоўныя граматы. Да бургамістраў валасцей былі даведзены планы здачы насельніцтвам воўны, сельгаспрадуктаў, малака, яек і г. д. Насельніцтва павінна было выплачваць падаткі: у год 150 л малака на карову, або 6 кг масла, па 2 курыцы і 30 яек з двара, па 10 пудоў зерня з гектара і па 40 рублёў з чалавека. Была ўведзена ўсеагульная працоўная павіннасць. Як сведчыць перапіска райуправы з бургамістрамі валасцей раёна, у цэнтры ўвагі ўлад, асабліва ў 1943 і 1944 г. былі ў асноўным 2 пытанні: накіраванне насельніцтва, і перш за ўсё моладзі, на працу ў Германію, а таксама на розныя гаспадарчыя работы ўнутры раёна і, па-другое, лесанарыхтоўкі. Нямецкія інструктары ставілі дакладную задачу, каб усе мужчыны і жанчыны, якія могуць быць выкарыстаны ў якой-небудзь форме ў якасці працоўнай сілы, былі прымусова мабілізаваны для выкарыстання іх на працы ў тылавых кантраліруемых раёнах ці ў Германіі. Згодна з гэтым у Крупскім, Халопеніцкім і іншых раёнах была праведзена мабілізацыя працаздольнага насельніцтва. З Крупскага раёна ў гады акупацыі вывезена ў Германію шмат моладзі, акрамя таго, вялікая

колькасць жыхароў выкарыстоўвалася на прымусовых работах на месцы, галоўным чынам на лесанарыхтоўках. У гэты час вырубка і вываз лесу праводзіліся ў надзвычай шырокіх памерах. У час мабілізацыі, напрыклад у 1942 г., крупская жандармерыя ў вёсках Абчуга, Лагі і інш. захапіла каля 500 чалавек і пагнала на працу за р. Беразіну.

У 1941 г. нямецкія ўлады яшчэ захоўвалі калектыўныя гаспадаркі. Але з 16 лютага 1942 г. пачала праводзіцца аграрная рэформа, якая атрымала назву «новы парадак землекарыстання». На землях калгасаў ствараліся абшчынныя гаспадаркі, а на месцы саўгасаў — дзяржаўныя маёнткі. МТС былі ператвораны ў сельскагаспадарчыя базы. У абшчынах уводзілася кругавая парука. Землі раздаваліся сялянам, але не ва ўладанне, а ў карыстанне, прычым гэтая мера выкарыстоўвалася як форма заахвочвання. Тым, хто вылучыўся ў барацьбе з партызанамі або на службе «новаму парадку», надзелы выдзяляліся ў першую чаргу і ў павялічаным памеры. Напрыклад, загадам Крупскай райуправы 4 верасня 1942 г. за заслугі і адвагу, праяўленыя ў час баёў з партызанамі 31 жніўня каля вёсак Выдрыца і Ухвала, 9 вартаўнікам і служачым артскамендатуры была аб'яўлена падзяка і яны былі залічаны першымі ў спіс «на атрыманне індывідуальнай гаспадаркі хутарской сістэмы».

Пытаннямі кіраўніцтва прамысловасцю займаўся аддзел мясцовай прамысловасці райуправы. Яму падпарадкоўваліся ганчарны і цагельны заводы, электрастанцыі, а таксама рамесніцкія арцелі. Рамеснікам было дадзена права выкупа памяшканняў і абсталявання ў асабістую маёмасць, але ўсе яны падвяргаліся абавязковай рэгістрацыі ў райуправе.

У час акупацыі працягвала функцыяніраваць сістэма аховы здароўя, якой кіраваў адпаведны аддзел райуправы. Працавалі Крупская бальніца на 30 ложкаў і Абчугская бальніца на 25 ложкаў з амбулаторыямі, 5 урачэбных участкаў, 4 медпункты. Абслугоўваючы персанал складаўся з 14 урачоў, 11 фельчараў, 6 акушэрак, 19 медсясцёр.

Акупацыйныя ўлады ўдзялялі пэўную ўвагу школьнай справе. Згодна з часовымі інструкцыямі, выдадзенымі гаўляйтэрам Кубэ 10 верасня 1941 г., была ўведзена абавязковая пачатковая адукацыя дзяцей ад 7 да 14 гадоў у чатырохкласных школах па спецыяльна распрацаваных праграмах. У Крупскім раёне былі адкрыты 44 школы, разлічаныя на 4000 вучняў, у іх працавалі 152 настаўнікі. Галоўны акцэнт часовыя інструкцыі ставілі на выхаванне моладзі ў духу гітлераўскай «Новай Еўропы». Характэрна ў гэтым плане пісьмо Крупскай райуправы, накіраванае на месцы 1 красавіка 1943 г., дзе нагадвалася аб раней дасланых распараджэннях арганізаваць пры кожнай школе гучныя чыткі газет і іншай прапагандысцкай літаратуры. На ідэалагічную апрацоўку моладзі былі накіраваны і вучэбныя планы і дапаможнікі. У гэтым плане спрабаваў выкарыстаць школы і аддзел прапаганды артскамендатуры. У студзені 1944 г. ў Халопенічах, Хацюхове, Слабадзе з вучняў былі створаны арганізацыі Саюза беларускай моладзі. У іх запісваліся падлеткі ад 10 да 16 гадоў, пры гэтым ім гаварылі, што саюз ствараецца з мэтай культурнага развіцця юнакоў і дзяўчат, абяцалі, што той, хто запішацца ў СБМ, не будзе накіраваны ў Германію. У сярэдзіне студзеня частка ўвайшоўшых у саюз была накіравана на прапагандысцкія курсы ў Слонім, частка ў Навагрудак. У маі на курсы былі зноў накіраваны 8 чалавек.

Акупацыйная адміністрацыйна-гаспадарчая сістэма яшчэ дзейнічала да 1943 г. Але насельніцтва ў цэлым непрыязна сустрэла акупантаў, тым больш, што нямецкія ваенныя ўлады больш займаліся рабаўніцтвам, чым гаспадарчай дзейнасцю. Таму многія распараджэнні мясцовых улад сабаціраваліся. Калі ж з 1942 г. пачаўся шырокі партызанскі рух, стварыліся партызанскія зоны, а з 1943 г. савецкі фронт падышоў да граніц Беларусі, гаспадарчыя сувязі былі зусім разладжаны. Улады адкрыта заняліся бессістэмнай рэквізіцыяй, пачасціліся карныя аперацыі, ад якіх перш за ўсё пакутавала мірнае насельніцтва. За гады акупацыі поўнасцю ці часткова былі спалены 63 вёскі раёна. Жыхарам забаранялася падыходзіць бліжэй 100 м да чыгункі, уваходзіць у чыгуначны вакзал, збірацца на вечарынкі, хадзіць з вёскі ў вёску, быў устаноўлены каменданцкі час з 18 гадзін 30 хвілін да 5 гадзін раніцы. За яго парушэнне расстрэльвалі.

Дз. М. Хромчанка.

Вырашэнне яўрэйскага пытання

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Антысемітызм гітлераўцы зрабілі асноўным пунктам сваёй прапаганды, якая была накіравана на насельніцтва Беларусі. Акупацыя падавалася імі як выратаванне жыхароў рэспублікі ад «яўрэйскага бальшавізму».

Паводле ўказання Гітлера фашысцкія верхаводы загадзя пачалі распрацоўваць план «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання», што азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў. Паводле звестак начальніка 4-га аддзела гестапа Эйхмана, якому Гітлер даручыў правядзенне ў жыццё гэтай праграмы, было забіта 6 мільёнаў яўрэяў, што складала $^1/_3$ частку яўрэяў усяго свету. (Приговор Международного Военного трибунала. Сборник «Нюрнбергский процесс». М., 1961. Т. 7. С. 401—402.)

Звярыную палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з бяспрыкладнай жорсткасцю ажыццяўлялі на ўсёй часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Крупшчыне. Сюды ўслед за войскамі вермахта прыбылі айнзацкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, артскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы, у абавязкі якіх разам з вермахтам уваходзіла і вырашэнне «яўрэйскага пытання». Усе гэтыя органы і часці былі ўкамплектаваны спецыяльна падабранымі асобамі, якія былі выхаваны ў духу нацызма і вызначаліся асаблівай жорсткасцю ў адносінах да людзей іншых нацыянальнасцей. Менавіта яны адразу ж аддзялілі яўрэяў ад мясцовых жыхароў, загналі іх у гета.

Загады палявых і мясцовых камендатур па стварэнні гета выдаваліся ўсюды: у Бабруйску, Баранавічах, Брэсце, Мазыры, Лідзе, Мінску і іншых гарадах Беларусі. Усяго на тэрыторыі Беларусі ў той час дзейнічала не менш як 70 лагераў гета. У асноўным яны былі закрытага тыпу. Іх тэрыторыі абносіліся некалькімі радамі калючага дроту, ахоўваліся гітлераўскімі салдатамі і паліцыяй. Ствараючы такія лагеры, нацысты ўдасканальвалі пачварныя метады сваіх катаванняў. Пасля пакутлівых здзекаў гітлераўцы расстрэльвалі людзей, а іх каштоўную маёмасць забіралі сабе. Яўрэям забаранялася самавольна пакідаць гета, мяняць месца жыхарства і кватэры ў гета, карыстацца тратуарамі, грамадскім транспартам, паркамі і грамадскімі ўстановамі, наведваць школы.

Для яўрэяў было ўведзена абавязковае нашэнне апазнавальных знакаў — акруглыя латы і шасціканечныя зоркі жоўтага колеру, нарукаўныя павязкі з шасціканечнымі зоркамі.

Вязняў гета выкарыстоўвалі на самых цяжкіх і шкодных для здароўя работах. Многія з іх паміралі з-за нечалавечых умоў жыцця і працы, з-за адсутнасці медыцынскай дапамогі.

У. І. Лемяшонак.

Населеныя пункты Крупскага раёна, якія былі поўнасцю ці часткова знішчаны разам з жыхарамі

Назва населенага пункта	Колькасць перад вайной		Колькасць знішчаных		Час знішчэння
	двароў	жыхароў	двароў	жыхароў	
Абчугскі сельсавет					
Абчуга	153	728	52	159	чэрвень 1944
Асечана	78	360	40	16	чэрвень 1944
Астроўкі	40	170	5	4	чэрвень 1944
Бобрык	55	195	6	7	чэрвень 1944
Забор'е	72	310	29	2	чэрвень 1944
Калыбанава	38	149	14	1	чэрвень 1944
Касянічы	243	814	18	21	чэрвень 1944
Кіявец	78	92	5	10	чэрвень 1944
Лагі	72	228	5	10	чэрвень 1944
Слабада	54	286	6	8	чэрвень 1944
Хватынка	33	137	24	—	чэрвень 1944
Шкорнеўка	27	209	25	25	красавік 1944

Працяг табліцы

Назва населенага пункта	Колькасць перад вайной		Колькасць знішчаных		Час знішчэння
	двароў	жыхароў	двароў	жыхароў	
Бобрскі сельсавет					
Еленка	17	70	16	—	кастрычнік 1943
Куты	46	138	16	—	чэрвень 1944
Скакоўка	43	202	12	—	верасень 1943
Выдрыцкі сельсавет					
Выдрыца	114	586	111	10	чэрвень 1944
Вялікае Горадна	79	457	73	2	чэрвень 1944
Гаць	28	86	6	16	чэрвень 1944
Маладзілава	6	35	6	8	кастрычнік 1942
Мігаўшчына	17	80	17	8	лістапад 1942
Дакудаўскі сельсавет					
Дакудава	84	453	83	18	чэрвень 1944
Дзянісавіцкі сельсавет					
Дубавое	40	199	37	1	жнівень 1943
Новыя Дзянісавічы	129	698	16	31	кастрычнік 1944
Старыя Дзянісавічы	49	283	24	—	кастрычнік 1944
Ігрушкаўскі сельсавет					
Батуры	16	112	13	4	сакавік 1944
Гута	34	139	28	5	чэрвень 1943
Ігрушка	180	712	60	3	май 1944
Самаседаўка	51	168	44	—	чэрвень 1943
Стараселле	47	195	5	3	чэрвень 1943
Старая Пярэсіка	96	354	8	12	сакавік 1944
Кастрычніцкі сельсавет					
Гузовіна	18	86	2	3	красавік 1943
Дакучыно	64	321	25	34	ліпень 1943
Дубраўка	60	271	34	7	ліпень 1943
Дубы	22	97	10	4	верасень 1943
Забарочча	42	215	37	—	верасень 1943
Запуткі	40	158	4	—	лістапад 1943
Калодніца	103	512	12	8	май 1944
Лютыя	96	402	14	11	красавік 1944
Малыя Хальнявічы	64	272	18	2	май 1944
Харытанцы	57	288	22	—	лістапад 1943
Худава	45	175	4	—	красавік 1944
Чараёўка	32	93	28	—	лістапад 1943
Ухвальскі сельсавет					
Бярозка	19	102	13	80	кастрычнік 1943
Гумны	86	452	26	115	май 1944
Знаменская	70	268	13	13	май 1944
Купленка	50	187	50	68	кастрычнік 1943
Машчаніца	22	127	19	2	кастрычнік 1943
Новая Ніва	28	131	27	1	кастрычнік 1943
Новая Слабада	46	233	43	80	верасень 1942
Свірыдаўка	33	150	29	5	кастрычнік 1943
Селішча	31	153	23	20	май 1944
Сомры	65	322	65	132	лістапад 1942
Старая Слабада	77	321	46	7	верасень 1942
Узнаж	68	378	68	361	кастрычнік 1943
Ухвала	154	762	17	135	кастрычнік 1942
Халопеніцкі сельсавет					
Шамкі	22	87	8	31	верасень 1942

Працяг табліцы

Назва населенага пункта	Колькасць перад вайной		Колькасць знішчаных		Час знішчэння
	двароў	жыхароў	двароў	жыхароў	
Хацюхоўскі сельсавет					
Вялікае Восава	49	244	39	12	май 1944
Янаўшчынскі сельсавет					
Барсукі	60	247	9	9	май 1944
Вялікія Хальнявічы	29	147	8	3	чэрвень 1943
Глінаўка	20	85	20	—	сакавік 1944
Дудары	34	148	31	5	сакавік 1944
Лісічына	72	425	2	8	ліпень 1943
Малы Камянец	21	92	3	—	ліпень 1943
Мялешкавічы	29	165	18	3	чэрвень 1944
Пасёмкавічы	34	188	27	5	чэрвень 1944

Друкуецца па кн.: Нацистская политика геноцида и «выжженной земли» в Белоруссии. Мн., 1984, і матэрыялах філіяла дзяржархіва Мінскай вобласці ў г. Барысаў, ф. 6, воп. 2, спр. 294, л. 1—596. Заўвага раённай камісіі: колькасць знішчаных жыхароў акрамя архіўных звестак дадаткова ўдакладнялася.

Дз. М. Хромчанка.

Расправа ў Крупках

КАК ПО ПРИКАЗУ ХОЙЗИНГЕРА БЫЛИ РАССТРЕЛЯНЫ СТО МИРНЫХ ЖИТЕЛЕЙ

Тревожным было утро 2 сентября 1942 года в городе Крупки Минской области. Комендант гитлеровского гарнизона приказал через старост, чтобы всё мужское население города и окрестных деревень Нача, Большая и Малая Слобода, Малые Жаберичи, Панское, Худовцы и других собралось в 10 часов на площади перед зданием комендатуры. Город был в тревоге, потому что почти в каждой семье были родственники партизан, воевавших в соседних лесах.

На площади толпился народ. Мужчин построили в колонны, по четыре в ряд, и под конвоем повели по Старомосковской дороге, по направлению к кладбищу на другой стороне реки Бобр. Женщин и детей отогнали в сторону.

Никто не знал, что задумали фашистские власти. Плач и причитания раздавались над толпой женщин, задержанных цепью солдат и полицейских. Полуторатысячная колонна уже перевалила через мост, когда все увидели густую цепь гитлеровских солдат, окруживших пустырь позади кладбища. Через каждые тридцать-сорок метров стояли пулемёты.

Тут колонна остановилась, и люди увидели большую яму со свежей песчаной насыпью слева у самой дороги. Недалеко от нее на обочине стояли военные грузовики, крытые брезентом. Там находились люди, приговоренные Хойзингером к смерти.

Комендант вышел вперёд и через переводчика объявил: «Сейчас будут расстреляны 100 партизан, напавших на Славное».

Он подал команду, и расправа началась. Женщин и стариков вытаскивали из грузовиков, бросали в яму и там расстреливали, не объявляя ни фамилии, ни имени. Среди них были три сестры — Татьяна Андреевна, Елизавета Андреевна и Надежда Андреевна Норчук. Солдаты приказали им раздеваться. Они отказались. Гитлеровцы сорвали с них платья, бросили в яму...

Вслед за ними выволокли и убили двух стариков и несколько пожилых женщин. По толпе пронёсся шум: «Какие это партизаны, одни старики и женщины!»

Все были потрясены увиденным. Очевидцы рассказывают, что в яму бросали не только женщин и стариков, но и детей. Расстреляли тогда и двух девочек лет по 10—11.

Ропот в толпе усилился, когда из машины вытащили женщину с грудным ребенком — Федору Степановну Мошкареву с шестимесячной дочкой Верочкой. Жена офицера Со-

ветской Армии, депутат поселкового Совета, с ребёнком на руках, она мужественно встретила свой последний час. Солдаты подтащили ее к яме, сорвали платье и пытались отнять девочку. Завязалась неравная борьба. Наконец, девочку вырвали из рук обессилевшей женщины, бросили в яму. Затем бросили в яму и Федору Степановну. Раздались выстрелы.

В числе приговоренных к расстрелу был мальчик лет десяти. Он плакал и кричал, когда его подводили к яме. Одной из последних жертв была Нина Григорьевна Рябцева, комсомолка.

Несколько часов длилась расправа над невинными людьми.

После окончания побоища комендант под страхом расстрела приказал всем согнанным к месту казни пройти мимо ямы и смотреть в нее... Из ямы доносились еле слышные стоны...

Так расправились с советскими людьми по приказу Адольфа Хойзингера. Жители Крупок и многих белорусских поселков и деревень, с которыми нам довелось беседовать, единодушно заявляли: «Мы этого не забыли!», «Судить нужно палача Хойзингера!»

Правда, 1961. 14 декабря.

ПА СЛЯДАХ ЭСЭСАЎСКАЙ ДЫВІЗІІ

Мора крыві, рэкі слёз, голад, холад і здзекі прынеслі сялянам Крупскага раёна салдаты і афіцэры 44-й эсэсаўскай дывізіі. З дні бесперапынна вывозілі накрадзенае ў сялян дабро ў Бобр і Крупкі. Яны да ніткі абрабавалі сялян вёсак Шамкі, Забалоцце, Гаенка, Сомры, Новая Слабодка і інш.

У вёсцы Сомры было больш за 130 дамоў. Цяпер на месцы гэтай квітнеючай вёскі груды папялішча, а з жыхароў у жывых застаўся толькі адзін 63-гадовы калгаснік. З усіх жыхароў вёскі Гаенка засталіся жывымі толькі 14, астатнія забіты. У Новай Слабадзе фашысцкія людаеды расстралялі 69 чалавек. На многіх трупах выяўлены па 14—20 куль. У в. Новае Палессе засталося толькі 3 хаты. 71 чалавека фашысты расстралялі. Дзесяткі юнакоў і дзяўчат, мужчын і жанчын з вёсак Бярозка, Асецішча, Матошка і інш. фашысты прымусова адправілі ў Германію.

У Асецішчах, Матошцы і Машчаніцы фашысцкія бандыты пад пагрозай расправы і расстрэлу згвалтавалі некалькіх дзяўчат.

Больш за тысячу чалавек крупскіх калгаснікаў сталі ахвярай некалькіх дзён фашысцкага разгулу ў раёне.

Народны мсціўца, 1943. 16 студзеня.

Дакументы сведчаць

ЗАГАД № 67

па Крупскай райуправе
ад 19 чэрвеня 1942 г. гор. Крупка

На падставе распараджэньня мясцовай камендатуры ў гор. Крупка ўсяму насельніцтву Крупскага раёна і гор. Крупка ЗАГАДЫВАЮ:

§1. Спыніць усякае начное хаджэньне з 9 гадзін вечара да 4 гадзін раніцы.

Асобы, ня маючыя адпаведных прапускоў і парушаючыя гэта, будуць затрымлівацца.

§2. Забараняецца ўсякае хаджэньне па палатну жалезнай дарогі (чыгункі) днём і ноччу без выключэньня. Пераход праз чыгунку дазваляецца толькі ў дазволеных і ўказаных месцах, парушаючыя гэта будуць застрэляны на месцы.

§ 3. Ва ўсіх населеных пунктах раёна на кожным доме павінны быць табліцы з указаньнем паіменнай колькасьці жыхароў у доме і іх узрост. Выкананьне гэтага ў гор. Крупка ўскладаецца на бургомістра гор. НАРКО, а ў валасьцях на валасных бургомістраў.

Той, хто будзе даваць прытулак і начлег невядомым асобам без дазволу мясцовых улад, будзе застрэляны.

§4. Забараняецца хаджэньне без прапускоў, без пашпартаў або «удостоверений личности». Асобы без указаных дакументаў затрымліваюцца.

§5. Хто будзе даваць прытулак і харчаваньне партызанам або, ведаючы месцазнаходжаньне партызан, не даложыць своечасова аб гэтым нямецкім уладам, будзе расстраляны.

§6. За выкананьнем гэтага загаду павінна наглядаць раённая і валасная паліцыя.

Начальнік раёна Альбаум.

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 686, воп. 1, спр. 1, л. 217.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

ПРИКАЗ № 73 ПО КРУПСКОМУ РАЙОННОМУ УПРАВЛЕНИЮ

8 июля 1942 г. г. Крупка.

Согласно распоряжения гос. коменданта комендатуры в гор. Крупка запрещается хождение населения около полотна железной дороги. Все, кто будет находиться ближе 100 метров от полотна жел. дороги, будет обстрелян (независимо от времени).

Животные, находящиеся в этой полосе, будут убиты. Переезды и переходы через полотно жел. дороги разрешаются в указанных местах.

Этот приказ вступает в силу с 12 часов ночи 10-го июля 1942 г.

Начальник района Альбаум.

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 686, воп. 1, спр. 1, л. 247.

ПРИКАЗ ПО КРУПСКОМУ РАЙОННОМУ УПРАВЛЕНИЮ

Бургомистру волости
Крупская райуправа

г. Крупки
18 ноября 42 г.

Из вашей волости необходимо выделить на работу в Германию 20 человек мужчин и женщин... Отправка людей будет происходить 23.11.42 г. (в понедельник), а поэтому из вашей волости люди должны прибыть в г. Крупки 22.11.42 г. (в воскресенье) в 4 часа вечера. Каждый с собой должен иметь хорошую обувь, выходную и теплую рабочую одежду, а также продукты на шесть дней. Для помощи организации используйте полицию. Ответственный за отправку должен представить людей к комендатуре, копию списков дать райуправлению.

Начальник района Барковский.
Ответств. секретарь Макаревич.

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 686, воп. 1, спр. 1, л. 12.

ПРИКАЗ № 117

па Крупскаму райуправлению

г. Крупки
30 июня 1943 г.

На основании распоряжения ортскомендатуры г. Крупки приказываю:

§1 Запретить хождение около полотна ж. д. на 100 м, у входа в здание вокзала и хождение вокруг вокзалов на 100 м запрещено. Все часовые при вокзалах и на ж. дороге имеют приказ стрелять без предупреждения во всех тех, кто подойдёт к зданию вокзала или полотну ж. д. ближе чем на 100 м.

То лицо, которому необходимо войти в здание вокзала или подойти к полотну ж. д., должно поднять свой пропуск или документ, не доходя до указанного места, и ожидать, пока не подойдёт часовой для сопровождения. Те, кто будет нарушать это правило, будут застрелены.

Нач. р-на Н. Барковский.

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 686, воп. 1, спр. 13, л. 264.

ПРИКАЗ ПО КРУПСКОМУ РАЙУПРАВЛЕНИЮ

Крупское Районное Управление
Бургомистрам Бобрской, Смородинской и Обчугской волости
25.8.1943 г.
№ 7

г. Крупка

В соответствии с распоряжением Ортскомендатуры г. Крупка предлагается ежедневно производить очистку дороги Крупка—Бобр—Холопеничи от мин. Для этого разбить дорогу на участки, и каждый участок прикрепите для очистки к прилегающей общине, староста общины (деревни) обязан ежедневно с 5-ти часов утра пробороновать дорогу на отведенном ему участке в два следа (в одну сторону один след и обратно один след). Кроме того из прилегающих деревень должна быть выделена охрана 1—2 человека, которые на указанном им участке должны следить, чтобы после того, как будет пробороновано дорога, никто не заклал мину. В случае мина будет обнаружена, немедленно докладывайте ближайшему воинскому отряду или полиции. Дорога должна быть пробороновано на ширину автомашины ежедневно,

дежурства выставлять такие ежедневно. В случае невыполнения данного распоряжения или миной будет взорвана воинская машина или транспорт, в первую очередь староста деревни (общины) понесет самое строгое наказание по закону военного времени. Также будут наказаны сторожа участка и общинники, на чьей территории это случится.

Начальник района
Секретарь

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 686, воп. 1, спр. 6, л. 38.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка

З ДАКУМЕНТАЎ СЛУЖБЫ БЯСПЕКІ

Стража Бяспекі
Крупскага раёна
кастрычнік 1943 г.
Зацвярджаю:
шэф СД — унтэрштурмфюрэр
кастрычнік 1943 г.
Заключэнне

Следчым 2-га аддзела СБ Крупскага раёна Вінаградавым разгледжаны следчы матэрыял па справе знаходзячыхся пад вартай з 22.10.43 г. 12 грамадзян, якія абвінавачваюцца ў прыналежнасці да камуністычнай партыі.

Устаноўлена:

1. Дашкоў Іван, 1898 года нараджэння, беларус, малапісьменны, мае 3 дзяцей, у 1940 г. судзімы за растрату. У бытнасць Савецкай улады працаваў старшынёй калгаса. З прыходам нямецкай арміі займаецца сялянствам. У камуністычную партыю ўступіў у 1941 годзе, пражывае ў в. Пліса. Пры ім выяўлена кандыдацкая картка.

2. Яўсееў Іван, 1909 года нараджэння, беларус, малапісьменны, жанаты, мае 3 дзяцей, раней не судзімы. У бытнасць Савецкай улады працаваў старшынёй сельсавета. З прыходам нямецкай арміі займаецца сялянствам. У камуністычную партыю ўступіў у 1938 г. Пражывае ў в. Навесы.

3. Шынкароў Ілья, 1905 года нараджэння, беларус, малапісьменны, жанаты, мае 4 дзяцей, раней судзімы. У бытнасць Савецкай улады працаваў старшынёй калгаса. З прыходам нямецкай арміі займаўся сялянствам. У камуністычную партыю ўступіў у 1940 г. Пражывае ў в. Навесы.

4. Бязмозгі Прохар, 1913 года нараджэння, беларус, пісьменны, жанаты, мае 4 дзяцей, раней не судзімы. У бытнасць Савецкай улады працаваў брыгадзірам у калгасе. З прыходам нямецкай арміі працуе на чыгунцы ў якасці чорнарабочага. У камуністычную партыю ўступіў у 1941 г. Пражывае ў в. Красноўка.

5. Рухлінская Аляксандра, 1906 года нараджэння, беларуска, пісьменная, замужняя, мае дзіця, раней не судзімая. Жыве ў в. Навахросты.

6. Дашкоў Пётр, 1905 года нараджэння, жанаты, мае 2 дзяцей.

7. Бялаўскі Іван, 1905 года нараджэння, жанаты, мае 2 дзяцей.

8. Бялаўскі Мікалай, 1907 года нараджэння, беларус, пісьменны, мае 4 дзяцей, раней не судзімы. У бытнасць Савецкай улады працаваў у МТС трактарыстам. З прыходам нямецкай арміі працуе таксама трактарыстам МТС. У камуністычную партыю ўступіў у 1941 г. Пражывае ў в. Пліса.

9. Драніца Фама, 1904 года нараджэння, беларус, малапісьменны, жанаты, мае 2 дзяцей, раней не судзімы. У бытнасць Савецкай улады працаваў у МТС трактарыстам. З прыходам нямецкай арміі працуе кавалём у МТС. У камуністычную партыю ўступіў у..., пражывае ў в. Вострава.

10. Калеснікаў Дзмітрый, 1908 года нараджэння, беларус, малапісьменны, жанаты, мае 3 дзяцей, раней не судзімы. У бытнасць Савецкай улады працаваў старшынёй калгаса. З прыходам нямецкай арміі займаўся сялянствам. У камуністычную партыю ўступіў... Пражывае ў в. Мачулішча.

11. Зобс Мікалай, 1902 года нараджэння, беларус, малапісьменны, жанаты, мае 4 дзяцей, раней судзімы. У бытнасць Савецкай улады працаваў старшынёй калгаса. З прыходам нямецкай арміі займаўся сялянствам. У камуністычную партыю ўступіў у 1938 г. Пражывае ў в. Крыштопаўшчына. У час вобыску выяўлена кандыдацкая картка.

12. Лапарэвіч Іван, 1910 года нараджэння, беларус, пісьменны, жанаты, мае 3 дзяцей, раней не судзімы. У бытнасць Савецкай улады працаваў старшым рамонтным рабочым пуцявой брыгады. З прыходам нямецкай арміі працуе брыгадзірам пуцявой рамонтнай брыгады.

У камуністычную партыю ўступіў у 1939 г. Пражывае ў чыгуначнай будцы № 414 (Нацкая воласць).

Усе пералічаныя грамадзяне прыналежнасць сваю да камуністычнай партыі не адмаўляюць. На падставе вышэйвыкладзенага меркаваў бы увесь абвінаваўчы матэрыял па справе ўказаных асоб перадаць на рашэнне асобай каманды СД.

Следчы 2-га аддзела СБ
штэльфцуг-фюрэр Вінаградаў.
Згодны: нач. 2-га аддзела СБ
групен-фюрэр Карась.
Нач. стражы бяспекі
цуг-фюрэр Іваноў.

Падрыхтаваў да друку А. Літвін.

ПРИКАЗ

для гражданского населения Крупского района

12 ноября 1943 г.

Гражданскому населению воспрещается с 15 ч до 6 ч находиться на автомагистрали или на подъездных путях к ней на расстоянии менее чем в 300 м по обе стороны от магистрали. Это расстояние является запретной зоной и в течение указанного времени каждое гражданское лицо, замеченное в пределах этой запретной зоны, будет обстреляно без предупреждения.

Ортскомендант

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 686, воп. 1, спр. 13, л. 389.

ПРИКАЗ ПО КРУПСКОМУ РАЙУПРАВЛЕНИЮ

Крупское райуправление
6.11.1943 г.

Бургомистру
Господину

Для очистки дорог от мин, заложенных бандитами, вам предлагается проводить следующие мероприятия.

1. Большаки дорог, находятся на территории вашей волости, очищать от мин следующим образом — впрягать лошадь в борону и протягивать по большаку дороги. Борону привязывать на длинных постромках, в случае мина взорвётся, то не поразит лошадь.

2. Дороги разбейте на участки, каждый участок дороги прикрепите к общине и объясните старосту деревни выделять ежедневно требуемое количество лошадей с боронами. Дороги должны бороноваться тщательно и ежедневно с утра.

Нач. р-на Н. Барковский
Отв. секретарь А. Макаревич

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 686, воп. 1, спр. 13, л. 212.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З РАСПАРАДЖЭННЯЎ АКУПАЦЫЙНЫХ УЛАД

Крупское райуправление

27.11.1943 г.
Бургомистру
Вторично напоминается

Запретить всякие вечеринки и личные сборищи как днем, так и ночью. В случае это обнаружится или об этом будет доложено, в 1-ю очередь наказание понесут староста деревень и те, кто даст (помещение) место для этих сборищ.

Нач. р-на Н. Барковский.
Отв. секр. А. Макаревич.

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 686, воп. 1, спр. 14, л. 29.

З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДЗІРА ФАШЫСЦКАГА АТРАДА «КРУПКІ» АСОБАЙ КАМАНДЗЕ 7 Б У БАРЫСАВЕ ПРА ХОД І ВЫНІКІ КАРНАЙ АПЕРАЦЫІ «СТРАКАТЫ ДЗЯЦЕЛ» СУПРАЦЬ ПАРТЫЗАН І МІРНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА КРУПСКАГА РАЁНА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ 24—25 МАЯ 1944 г.

27—31 мая 1944 г.

ДАНЯСЕННЕ АБ ВЫНІКАХ КАРНАЙ АПЕРАЦЫІ «СТРАКАТЫ ДЗЯЦЕЛ»

27 мая 1944 г.

24 мая 1944 г. была проведена давно запланированная операция «Пестрый дятел». Нужно было очистить лесной массив в 3 км юго-западнее Радицы (9557) от бандитов и разрушить находящиеся там предположительно базы бандитов. Операция началась под руководством 825-го батальона ополчения и при поддержке авиачасти из Докудова, зенитной части из Дубешни, 559-го армейского конного парка, истребительного взвода местной комендатуры и местного отряда. Подробный доклад представится возможным дать лишь через 1—2 дня, так как после окончания операции совещание не проводилось и ход всей операции не известен. Необходимо подождать доклад 825-го батальона ополчения.

Предварительные результаты: убито 7 чел. противника, 1 пленный, 6 лагерей бандитов разрушено, захвачено 3 лошади и 3 жеребенка, а также 4 винтовки, 1 автоматическая винтовка, 2 пистолета-автомата и 1 пистолет. Во время прочески дер. Радица были захвачены 64 трудоспособных лица и переданы на биржу труда в Крупки.

Командир отряда обершарфюрер СС
(подпись неразборчива)

Друкуецца па кн.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. Мн., 1965. С. 174—175.

ДАНЯСЕННЕ АБ ХОДЗЕ КАРНАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ «СТРАКАТЫ ДЗЯЦЕЛ»

31 мая 1944 г.

В качестве приложения направляю боевое донесение об операции «Пестрый дятел», которая была проведена 25 мая 1944 г. 825-м батальоном ополчения при поддержке авиасоединения из Докудова, зенитной части из Дубешни, 559-го армейского конного парка, а также истребительных взводов оберквартирмейстера, местной комендатуры (мест.) Крупки и отряда «Крупки».

В дополнение сообщается:

После состоявшегося 24 мая 1944 г. совещания участвующие в операции части, а также 38 местных охранников выехали на грузовых автомашинах в мест. Боровые (9554) и оставались там до 1 час. 15 мин., когда был получен приказ о выступлении. Так как в мест. Боровые часто наведываются бандиты, возникла необходимость усиленной охраны. Отряд и охранники охраняли северный выход. Около 22 час. 40 мин. передовой пост сообщил о приближении нескольких повозок, которые остановились на опушке леса. Немецкие части в этом районе не располагались и, таким образом, речь могла идти только о бандитах. Обойти незаметно обоз и захватить его врасплох было невозможно, тем более, что лес был очень густой и ночь ограничивала видимость до 100 м. Возникла опасность, что свои люди обстреляют друг друга. На окраине деревни, на дороге, ведущей в лес, было установлено зенитное орудие калибром 2 см и 2 гранатомета. Местность была освещена ракетами, и зенитное орудие обстреляло лес. Бандиты ответили редкими винтовочными выстрелами и побежали. Несколько залпов из гранатометов было послано им вслед. В 1 час. 15 мин. около 20 чел. из гражданского населения мест. Боровые были сведены в отряд и как команда миноискателей должны были идти впереди подразделений, так как надо было ожидать, что дорога могла быть заминирована.

Исходные позиции были заняты без каких-либо препятствий в 2 час. 45 мин. В 3 час. 15 мин. началась проческа лесного массива в 3 км юго-западнее Радицы (9557). Дальнейший ход операции описан в приложенном донесении 825-го батальона ополчения.

После окончания операции местный отряд и охранники прочесали дер. Радицу, при этом были захвачены, кроме 64 трудоспособных лиц, 2 разыскиваемых отрядом пособника бандитов.

В 12 час. 00 мин. прибыли в свои помещения. Боевая готовность и степень участия в операции всех военнослужащих и охранников были одинаковыми.

Командир отряда обершарфюрер СС
(подпись неразборчива).

Друкуецца па кн.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. Мн., 1965. С. 174—176.

З ПРАТАКОЛА КАМІСІІ ПА РАССЛЕДАВАННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У БЕЛАРУСІ

Паказанні сведкі Івана Іванавіча Дзеравягі, жыхара мяст. Крупкі.

Крупская нямецкая камендатура аддала загад: мужчынам ва ўзросце да 60 гадоў з'явіцца ў камендатуру. Калі яны сабраліся, пагналі за мястэчка. Туды ж прывезлі на чатырох машынах 100 чалавек, у тым ліку некалькі жанчын. На нашых вачах з машын выводзілі да ямы па два чалавекі, якія былі ў адной нацельнай бялізне. Іх прымушалі лажыцца ў яму і потым расстрэльвалі з аўтаматаў. У гэты час было расстраляна 100 чалавек. Калі ўсіх з гэтых чатырох машын расстралялі, нас адпусцілі дадому.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 7021, воп. 87, спр 11, л. 83.

З МАТЭРЫЯЛАЎ КАМІСІІ ПА РАССЛЕДАВАННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ НА БЕЛАРУСІ

Паказанні сведкі Фёдара Агеевіча Малашкевіча, ураджэнца вёскі Ухвала.

У кастрычніку 1942 г. ў вёсцы Ухвала немцы разам з паліцэйскімі расстралялі і кінулі ў калодзеж 120 чалавек за сувязь з партызанамі. З ліку расстраляных большасць былі жанчыны і дзеці — сваякі пайшоўшых у партызаны. У дзень расстрэлу ўсіх жыхароў в. Ухвала выгналі з хат і пагналі па дарогах і палях вакол вёскі, каб такім чынам узарваць міны, якія заклалі партызаны. Пасля таго, як мін не было выяўлена, усіх сагналі ў вёску да кватэры бургамістра. Бургамістр Паўловіч і паліцэйскія Трус і Рыжскі аддзялілі з натопу людзей, якіх яны ведалі як сваякоў партызан. Такім чынам было выдзелена 120 чалавек. Гэтыя ж паліцэйскія ўдзельнічалі і ў расстрэле. Да калодзежа падводзілі па 1—2 чалавекі, расстрэльвалі і скідвалі ўніз. Дзяцей не стралялі, а кідалі ў калодзеж жывымі.

На другі дзень пасля гэтага выпадку ў в. Купленка зарубілі лапатамі 47 чалавек, сярод якіх былі жанчыны, дзеці і старыя, а ў вёсцы Узнаж спалілі жывымі чалавек 60—70, спачатку сагнаўшы іх у адну хату. А праз месяц немцы і паліцэйскія спалілі датла і ўсю вёску. Усяго з гэтай вёскі засталося жыць каля 15—17 чалавек.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 7021, воп. 87, спр. 11, л. 18.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.

З ПАКАЗАННЯЎ СВЕДКІ В. А. БАРАНЧЫКА АБ РАССТРЭЛЕ ГІТЛЕРАЎСКІМІ ЗАХОПНІКАМІ 100 МІРНЫХ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН У РАЁНЕ КРУПАК У ЖНІЎНІ 1942 г.

16 студзеня 1946 г.

... Я расскажу, как в 1942 г., в конце августа или в начале сентября было расстреляно 100 чел. в районе мест. Крупки. Это было в воскресенье утром. Немцы с полицией пришли в дом ко мне и с применением силы предложили выйти на улицу. Всех жителей нашего поселка под конвоем повели с площади в ближайший лес, где было согнано около 5 тыс. чел. из Крупок и окрестных деревень. В лесу была выкопана яма, и около нее стояли 4 автомашины, крытые брезентом. Когда население было собрано, комендант произнес речь, в которой он заявил, что сейчас на наших глазах будут расстреляны 100 чел. со ст. Славное. Затем выступил начальник крупской полиции. Он также сказал нам, что сейчас будет расстреляно 100 чел. и что каждый стоящий здесь должен запомнить и не думать о связях с партизанами или уходить к партизанам, а тот, кто будет замечен в этом, будет подвергнут смертной казни. После этого по команде коменданта открыли брезент, которы1 были закрыты машины. Мы увидели, что в машинах сидят наши советские люди. Их начинают по 5 чел. брать из машин, приказывают раздеваться тут же около машины и подводят к могиле, укладывают в нее, а потом расстреливают. В числе 100 чел. были также дети в возрасте от 12 лет и младше. В числе находившихся в машине была женщина с грудным ребенком на руках, которую немцы раздели, ребенка у нее вырвали, ее бросили в яму, а вслед за ней бросили ее ребенка и застрелили обоих.

После казни нас построили и заставили пройти возле могилы. В это время нам вторично было сказано: смотрите, что ждет каждого, кто будет связан с партизанами. Кроме этого, в июне 1944 г. было заживо сожжено 400 чел. в лагере, в 1,5 км от Крупок, в лесу. В этот лагерь сажали за всякие мелкие преступления, за невыполнение поставок, невыход на работу по вывозке леса. Однажды всех этих заключенных, в том числе женщин и подростков, вывели и погнали в мест. Крупки, в тюрьму, где всех их посадить не могли, и поэтому разместили

по трем домам, которые подожгли, и, таким образом, все заключенные, которые находились в них, были сожжены.

17 сентября 1941 г. в 3 км от торфяных разработок было расстреляно около 2 тыс. евреев...

Друкуецца па кн.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944. Мн., 1965. С. 333—334.

АКТ МЯСТ. КРУПКІ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

26 верасня 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся, представитель Минской областной чрезвычайной комиссии по расследованию немецких злодеяний лейтенант Гос. безопасности Калашин, члены районной чрезвычайной комиссии нач. РО НКВД младший лейтенант госбезопасности Малявко, нач. РО НКРБ майор госбезопасности Зуйков, оперуполномоченный РО НКВД Выборнов сего числа провели расследование фактов массовых злодеяний немецко-фашистских захватчиков в м. Крупки и районе и на основании полученных свидетельских показаний установили, что в период 1941—1942 гг. хозяйниченья в районе немецко-фашистские оккупанты и их пособники производили массовое истребление населения района и издевательства над мирными советскими гражданами, расстреливали, вешали и живьем сжигали ни в чем не повинных стариков, женщин и детей. 18 сентября 1941 г. все еврейское население м. Крупки в количестве 1900 человек, в том числе старики, женщины и дети, были согнаны в район торфоразработок, расположенный в 1,5—2 километрах от райцентра по речке Старожница за автомагистралью Минск—Москва и расстреляли в двух торфяных ямах, после чего ямы засыпали мобилизованными для этого гражданами местечка. Осенью 1942 г. за кладбищем в яме публично в присутствии граждан четырех волостей расстреляно 100 человек, заподозренных в связи с партизанами. По этим же причинам в октябре 1942 г. в д. Ухвала расстреляно и брошено в колодец 120 человек, в большинстве женщин и детей, причем детей бросали в колодец живыми, после чего он был засыпан землей. В тот же период 1942 г. в д. Купленка немцы зарубили лопатами и зарыли в яме 47 человек, а 70 жителей д. Узнаж заперли в доме и сожгли живьем.

Указанные факты подтверждены свидетельскими показаниями очевидцев: Крюковского А. И., Деревяго И. И., Малашкевича Ф. А. и бежавшей из-под расстрела Шпунт М. Т., а также другими материалами, имеющимися в распоряжении НКВД, НКГБ. О чем и составили настоящий акт.

Предст. Минской обл. чрезвыч. комиссии
лейтенант г/б подпись
Нач. РО НКВД мл. лейтенант г/б подпись
Нач. РО НКГБ майор г/б подпись
Оперуполномоченный РО НКВД подпись.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 7021, воп. 87, спр. 11, л. 206.

АКТ

1944 года кастрычніка месяца 17 дня м. Халопенічы.

Мы, ніжэй падпісаныя, раённая надзвычайная дзяржаўная камісія па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Халопеніцкага раёна Мінскай вобласці ў складзе: старшыня раённай надзвычайнай дзяржаўнай камісіі — сакратар РК КП (б)Б Пасікаў Міхаіл Аляксеевіч, старшыня раённага Савета дэпутатаў працоўных Шаркоў Васіль Антонавіч, начальнік РА НКУС Мілаванаў, начальнік РА НКДБ Іван Міхайлавіч Рахаеў, загадчык раённага аддзела аховы здароўя Дробат Васіль Фёдаравіч шляхам апытвання сведак і дакументальных даных сельсаветаў пра нямецка-фашысцкія злачынствы ўстанавілі:

За час знаходжання нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Халопеніцкім раёне Мінскай вобласці з 5 ліпеня 1941 года на дзень вызвалення войскамі Чырвонай Арміі, гэта значыць 26 чэрвеня 1944 года, было закатавана і расстраляна савецкіх грамадзян, ваеннапалонных камандзіраў і чырвонаармейцаў РККА 2925 чалавек, з іх мужчын і жанчын — 2484 чалавекі, дзяцей да 14-гадовага ўзросту па недакладных даных 227 чалавек, ваеннапалонных камандзіраў і чырвонаармейцаў РККА 184 чалавекі.

Фашысцкія каты ў першыя дні свайго з'яўлення на тэрыторыі раёна ў верасні 1941 года ў м. Халопенічы і в. Шамкі расстралялі яўрэйскага насельніцтва, як дарослых, так і грудных дзяцей, 1600 чалавек.

Старшыня раённай надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, сакратар РКП(б)Б ПАСІКАЎ.
Старшыня раённага Савета дэпутатаў працоўных ШАРКОЎ.
Нач. РА НКУС, старшы лейтэнант дзяржбяспекі МІЛАВАНАЎ.
Нач. РА НКДБ, старшы лейтэнант дзяржбяспекі РАХАЕЎ.
Загадчык раённага аддзела аховы здароўя ДРОБАТ.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 7021, воп. 87, спр. 11, л. 26.

З ПРАТАКОЛА НАДЗВЫЧАЙНАЙ КАМІСІІ ПА РАССЛЕДАВАННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ, ЯКІЯ ЗДЗЕЙСНІЛІ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІЯ ЗАХОПНІКІ Ў КРУПСКІМ РАЁНЕ

Сведка: Шчунт Марыя Тарасаўна, 1915 г. нараджэння, жыхарка м. Крупкі.

Я сама па нацыянальнасці яўрэйка. З прыходам у м. Крупкі немцаў для яўрэяў быў устаноўлены строгі рэжым. Усім былі нашыты апазнавальныя знакі. Акрамя як на працу, нідзе больш не дазвалялася хадзіць.

18 верасня 1941 года ўсіх яўрэяў з сем'ямі немцы сабралі на рынку ў гарадской управе. Перад гэтым мястэчка было акружана. Прычыны збору не растлумачвалі, толькі, заходзячы ў кватэру, загадвалі забраць грошы, каштоўнасці, кватэру закрыць на замок і разам з дзецьмі ісці да гаруправы.

Калі людзі сабраліся на рынку, немцы зрабілі пераклічку па спісе. Усяго сабралася каля 1900 чалавек, не з'явіліся толькі 5—7 старых.

Пасля праверкі ўсіх бягом пагналі за магістраль, за фабрычны пасёлак, у лясок каля рэчкі Старожніца да тарфяных распрацовак. Нам загадалі па дарозе не размаўляць і нікуды не адыходзіць ад калоны. Разам са мной былі двое дзяцей, трэцяга я несла на руках. Маці маю і свякроў я страціла адразу, магчыма, яны адсталі. Я толькі чула частыя выстралы, гэта, магчыма, дабівалі старых і дзяцей. Аглядвацца нам не дазвалялі. Калі нас прыгналі да месца, то пасадзілі ўсіх на зямлю крокаў за 25 ад ям. Калі хто пачынаў размаўляць, білі палкамі, дзяцей, якія плакалі, адбіралі ў маці і кудысьці адцягвалі. Потым пачалі адбіраць па 12 чалавек з задніх радоў, падводзілі да ямы і расстрэльвалі. Перад гэтым забіралі каштоўныя рэчы і прымушалі раздзявацца да ніжняй бялізны. Хутка дайшла чарга і да нашага рада. Да нас падышоў немец, загадаў устаць і ісці да ямы. Паколькі я была з дзіцём, то крыху затрымалася, астатнія ўжо пайшлі. Я пачала ўгаворваць немца, кажучы, што я не яўрэйка. У гэты час аднаго рускага чалавека з нашага рада расстралялі. Немец падвёў мяне да ямы і загадаў легчы. Я з дзіцём легла на яшчэ паўжывыя целы, якія шавяліліся, а немец пайшоў, каб прывесці наступны рад людзей. Калі ён адышоў, я паціху з дзіцём вылезла з ямы і кінулася бегчы. Мяне заўважылі і пачалі страляць, але я дабегла да кустоў і кінулася ў рэчку. Так я здолела збегчы з-пад расстрэлу. Потым я перабралася ў другі раён.

З ПАКАЗАННЯЎ СВЕДКІ А. В. КРУКОЎСКАГА, ЖЫХАРА М. КРУПКІ.

Пасля расстрэлу яўрэяў каля р. Старожніца немцы сабралі чалавек 70 мужчын з пасёлка і павялі, каб закапаць ямы. У іх ліку быў і я. Трупы былі ўкладзены радамі ў двух ямах, памеры адной прыблізна 60 на 3 метры, другога — 15 на 3 м, глыбіні ад 1 да 2 метраў. Ямы былі запоўнены целамі загінуўшых амаль да краёў. Калі мы пачалі закопваць, у адной яме заўважылі яшчэ жывых людзей: мужчыну, жанчыну і хлопчыка каля 6 гадоў. Іх немец прыстрэліў з пісталета. Бургамістр мястэчка, які быў там, загадаў зрабіць насып над закапанымі ямамі вышынёй каля 1 метра, пасля чаго нас адпусцілі дадому.

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў, ф. 3331, воп. 1, спр. 248, л. 17—18.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

Мы памятаем ўсё...

З успамінаў М. Д. Аўцюшкова, жыхара г. Крупкі

Ішоў другі год страшэннай вайны. Фашысты бясчынствавалі на Крупшчыне на ўсю моц: палілі, расстрэльвалі, катавалі... Мне на тую пару было каля 16 гадоў. Я і цяпер добра памятаю 2 верасня 1942 г., калі былі расстраляны бязвінныя людзі. Дзень выдаўся цёплы і прыгожы і зусім не вязаўся з трагедыяй. Сярод жыхароў панавала трывога, бо з самай раніцы стараста перадаў загад каменданта гітлераўскага гарнізона, каб мужчыны сабраліся ў 10 гадзін раніцы на цэнтральнай плошчы

Крупак. Для чаго — ніхто не ведаў, але не выканаць загад было б яшчэ горш. Жанчыны плакалі. Гурт мужчын накіраваўся ў Крупкі. На плошчы ўжо быў натоўп людзей. Як аказалася, мужчын сабралі з усёй акругі. Горад быў усхваляваны. Кожны разумеў, што гэта нейкая расправа, але за што? Нас пастроілі ў калоны (толькі адных мужчын) і пад аўтаматамі павялі цераз мост у бок урочышча Лебартова. Услед нам даносіўся плач жанчын і дзяцей. Мы перайшлі ўжо мост, як убачылі шмат гітлераўцаў і паліцаяў, якія акружылі мясцовасць за могілкамі, дзе цяпер стадыён.

— Усё, нас будуць страляць, — чулася сярод натоўпу.

Нам, юнакам, у гэта не верылася, але было жудасна ад такой думкі, і мы ішлі невядома куды... Раптам калона спынілася, і нам паказалі вялікі пясчаны насып каля выкапанай ямы, памеры якой і цяпер страшна ўявіць. Хто і калі капаў яе, я не ведаю, але гэта была магіла. Непадалёку стаялі тры грузавікі, накрытыя брызентам. З іх даносіліся плач і стогны. Мы зразумелі, што гэта і ёсць чарговыя ахвяры. Так яно і было. Там знаходзіліся заложнікі, які прыгаварылі да смерці. Паводле загаду каменданта пачаўся расстрэл. З грузавікоў выцягвалі «партызан» — у асноўным жанчын і дзяцей, і нават старых людзей. Па два чалавекі падводзілі да ямы і стралялі ў патыліцу з пісталета. Расправу чынілі гітлераўцы з эмблемамі чэрапа на мундзірах, а паліцаі стаялі ў ачапленні. Ад страху ў нас «мурашкі бегалі» па целе, усё траслося. З некаторых жанчын зрывалі адзенне і жывымі кідалі ў яму на тых людзей, многія з якіх яшчэ дыхалі, а потым стралялі і ў іх. Памятаю, сярод ахвяр былі дзве дзяўчынкі, прыкладна майго ўзросту: ні просьбы, ні плач іх не дайшлі да сэрцаў катаў.

Мне да таго часу не даводзілася яшчэ сустракацца вось так, твар у твар, са смерцю. Параўноўваў з боем, у якім выйсця няма: ці ты ворага, ці ён цябе, але каб так бязлітасна страляць у бездапаможнага чалавека?.. Злыдні, інакш не назавеш.

На працягу некалькіх гадзін натоўп, быццам прыкаваны, стаяў і глядзеў... А глядзець ужо не было сілы, вочы самі апускаліся ўніз, і з іх ліліся слёзы, а сэрца поўнілася і болем, і страхам, і адначасова нянавісцю. Ахвяры ішлі на смерць мужна. Некаторыя мужчыны крычалі астатнім: «Дзейнічайце, як мы, не здавайцеся» і ўзнімалі галовы ўверх. Жанчыны старэйшага ўзросту ціха хрысціліся, а маладзейшыя закрывалі вочы хусцінкамі. У ліку прыгавораных да расстрэлу быў хлопчык гадоў дзесяці. Ён плакаў і крычаў, калі яго падводзілі да ямы. Асабліва запомнілася мне, як з грузавіка выцягнулі жанчыну з грудным дзіцем. Маці змагалася з усіх сіл, не адпускала ад сябе немаўлятку. Але яго вырвалі з рук, а ёй адразу выстралілі ў патыліцу. Потым немец, што трымаў дзіця, паслаў кулю і яму і кінуў услед за маці.

Расстрэл закончыўся, і нас пад аўтаматамі абвялі вакол магілы. Жах, што ў ёй тварылася! Людзі ляжалі адзін на адным: хто стагнаў, хто проста дыхаў. Здавалася, што зямля вакол хадзіла хадуном. Потым натоўп распусцілі, і ўжо, калі мы ішлі назад, на дамах і агароджах, на плошчы віселі аб'явы, што за сувязь з партызанамі, якія напалі на станцыю Слаўнае, расстраляна 100 заложнікаў, і што так будзе з іншымі, хто акажа супраціўленне нямецкім уладам.

Пра ўсё гэта жудасна ўспамінаць. Не забываюцца і злыя, нечалавечыя позіркі гітлераўцаў...

Падрыхтавалі да друку Т. Варановіч, Т. Дудко.

З успамінаў К. Ф. Дарапейкі, жыхаркі в. Мігаўшчына

Немцы прыйшлі ў вёску нечакана. Стаяла глыбокая зімовая ноч. Усе спалі, і раптам хтосьці пастукаў у шыбу. Мой дзед устаў, каб адчыніць дзверы. Немцы ўварваліся ў дом як звяры, выгналі ўсіх голых і босых на вуліцу і пагналі ў хлеў. У хляве ўжо было шмат вясковых жыхароў. Тых, хто супраціўляўся немцам, расстрэльвалі на месцы. Яны не шкадавалі ні старых, ні дзяцей. Потым фашысты аблілі хлеў газаю, але некаторым жыхарам удалося збегчы, у тым ліку майму дзеду. Стралялі ўслед. Усе, хто застаўся ў хляве, былі спалены.

Тыя, каму ўдалося ўцячы, пайшлі ў суседнія вёскі. Людзі сустрэлі іх па-рознаму. Адны адразу ўзялі да сябе, другія не бралі, баяліся, каб за гэта іх саміх не расстралялі. Калі немцы пайшлі з вёскі, людзі сталі вяртацца ў свае хаты, але тыя вёску не пакінулі ў спакоі, часта рабілі свае нечаканыя візіты. Калі яны абыходзілі ўсе хаты, то выводзілі аднаго чалавека, ставілі каля сцяны і расстрэльвалі. У Мігаўшчыне была размешчана нямецкая камендатура. Немцы лавілі дзяцей, якім было гадоў 10—11, вялі ў камендатуру, ставілі скрыні з цукеркамі, пячэннем і гаварылі, што ўсё гэта будзе ім, калі яны скажуць, дзе знаходзяцца партызаны. Але ніхто з дзяцей не

гаварыў, хаця многія з іх ведалі. Тады немцы білі дзяцей і выкідвалі на вуліцу.

Мужчын жа, якія заставаліся ў вёсцы, прымушалі служыць у камендатуры паліцэйскімі і давалі заданні, каб яны дакладвалі прозвішчы тых сем'яў, у якіх хто-небудзь пайшоў у партызаны ці войска. Многія з такіх сем'яў былі расстраляны. Вось, напрыклад, у вёсцы жыла сям'я па прозвішчу Хватык. Маці і дачка Ніна жылі адны на ўскрайку вёскі. Бацька і брат Ніны былі партызанамі. Хутка бацьку Ніны немцы ўзялі ў палон і ўсяляк здзекваліся над ім, каб ён прызнаўся, дзе знаходзяцца партызаны. Але ні біццём, ні іншымі здзекамі нічога ад яго не дабіліся. Пасля прыганялі Ніну і загадвалі мыць падлогу, на якой была кроў бацькі. Яго па-зверску закатавалі. Аднойчы немцы прыйшлі, схапілі Ніну і павялі ў камендатуру. Там над ёю здзекваліся. Але ноччу яна ўцякла ў лес да партызан.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў К. Н. Казловай, ураджэнкі в. Буда

У гады вайны з нашай вёскі нямала вяскоўцаў пайшлі ў партызанскія атрады або падтрымлівалі з імі сувязь. З сакавіка 1944 г. ў в. Буда прыехалі карнікі. Арыштавалі 12 чалавек, у тым ліку маю маці, Агаф'ю Фёдараўну Казлову, і мяне. Маці потым загінула ў Мінскім канцлагеры. Мяне ж трымалі спачатку ў крупскай турме, пасля разам з іншымі пасадзілі ў таварныя вагоны і адправілі ў Мінск. Там пратрымалі да 10 сакавіка. Праз некаторы час нас зноў пасадзілі ў перапоўненыя вагоны і павезлі на Захад. Вязням не давалі ні ежы, ні вады. Каля г. Стоўбцы некалькі чалавек узламалі дошкі ў падлозе і збеглі, а нас хутка прывезлі ў канцлагер Асвенцім.

— Выходзьце, рэчы не браць! — прагучала каманда.

Выйшлі, бачым — нейкія доўгія будынкі. Над некаторымі з іх віднеліся трубы, адкуль на два метры ўверх падымаўся агонь, а яшчэ вышэй — чорны дым. У памяці рэзка адбілася: навокал груды рознай маёмасці, адзенне, абутак, посуд, а побач трупы, шмат трупаў голых людзей.

— Цяпер вы пойдзеце ў лазню, — сказалі нам.

Людзі ішлі без асаблівай трывогі, бо мы яшчэ нічога не ведалі пра гэты лагер. Нас прымусілі распрануцца. Разам тут былі мужчыны, жанчыны і дзеці. Потым далі рагожныя мяшкі, туды мы склалі адзенне і падпісалі свае прозвішчы.

К. Н. Казлова.

Нас прывялі ў памяшканне і загадалі замачыць ногі ў нейкай вадкасці. Адтуль мы трапілі ў пакой без вокнаў. Але гэта была не лазня. Крыху пратрымаўшы там, нам раптам загадалі выйсці назад, а туды завялі другую партыю людзей.

Толькі пазней мы даведаліся, што гэта быў крэматорый, дзе спальвалі людзей. Нас выратавала тое, што ў гэты ж дзень прыбыў эшалон з яўрэямі, і іх вырашылі знішчыць у першую чаргу.

Мы ж неўзабаве апынуліся ў бараках — доўгім памяшканні чалавек на 1000, з трохпавярховымі нарамі. Дзяцей адабралі і змясцілі ў асобны дзіцячы барак, да якога нікога не падпускалі. Я была ў зоне «А», блок № 21, першым аддзяленні (штабе). Прозвішчаў у вязняў не было, толькі нумары. Мне выкалалі на левай руцэ № 79781. Выклікалі па нумарах і білі на кожным кроку.

Нам усім выдалі адзенне, тым, хто працаваў — паласатае. На спіне і грудзях адзення фарбай малявалі крыж. Пастаянна было холадна, таму вязні, якія працавалі каля крэматорыя, кралі адзенне, прыносілі ў блок, давалі іншым. Мы апраналі па 2—3 сукенкі, але калі гэта выяўлялі наглядчыкі, білі. Абутак быў з драўляных калодак, якія маглі быць падбітыя ўнутры скурай, а маглі і не быць.

Адзін раз за 10 дзён нам дазвалялася памыцца халоднай вадой, а адзенне прапякалася. Мы стаялі на скразняку голыя і каля 2—3 гадзін яго чакалі. Спалі на нарах без падушак, коўдра была адна на 7 чалавек. У нашым бараку былі італьянкі, французанкі і рускія. Прозвішчаў наглядчыкаў я не памятаю. «Блокавыя» хадзілі з плёткамі ці шлангам і білі ім па галаве і па целе. Харчаванне складалася з кавалка хлеба (каля 100 г) і баланды з паўразваранага жыта ці буракоў. Ба-

ланду прыносілі ў драўляных баках з ручкамі — іх называлі «кібел». На 7 чалавек давалі кружку вады. Памятаю, што ў канцлагеры мяне заўсёды мучыла смага... Кармілі адзін раз у дзень. Многія памерлі ад голаду і хвароб. Трупы складвалі штабялямі каля барака і крэматорыя, вечарам іх забіралі і адвозілі на машыне або спальвалі на двары ў яме на вялікім агні. Я чула, як людзі крычалі каля гэтых вогнішчаў. Магчыма, іх і жывымі кідалі ў вогненную яму. Тры разы ў дзень, а то і болей, нас выводзілі на «опель» — паверку, ставілі на калені і прымушалі трымаць рукі ўгары, а часам і з цаглінай у руках. Аднойчы я бачыла, як на драцяную агароджу, дзе быў прапушчаны электрычны ток, кінулася маладая дзяўчына. Дагэтуль яна шукала на сметніку ежу, яе заўважылі і загадалі стаяць на пляцоўцы з міскай над галавой увесь дзень. Вось яна і не вытрымала.

Але і ў гэтых жудасных умовах гучалі песні. У адной дзяўчыны быў губны гармонік. Яна іграла, мы спявалі, нават танцавалі, пакуль не прыходзілі наглядчыкі і не білі плёткамі тых, хто не паспеў легчы.

18 жніўня 1944 г. нас сабралі, пасадзілі на поезд і павезлі ў другі канцлагер — Равенсбрук. Пакуль нам знайшлі барак, мы чацвёра сутак начавалі на зямлі. Кармілі, як і ў Асвенціме, але давалі ўволю вады. Акрамя выкалатага нумара на руцэ нашылі яшчэ адзін нумар на кавалку матэрыі. Але ў Равенсбруку былі нядоўга. У верасні нас перавялі ў невялікі канцлагер Эберсвальдзе. Распарадак дня у гэтым канцлагеры быў такі ж, як і ў папярэдніх, але тут нас вадзілі на завод, дзе мы працавалі ад цямна да цямна. Я трапіла ў фарбавальны цэх, фарбавала снарады. Умовы працы былі дрэннымі: пыл, куродым. Захварэўшых адпраўлялі ў крэматорый канцлагера Равенсбрук. Зімой нам нічога з цёплага адзення не давалі, дык мы з ануч, якімі на заводзе абціралі снарады, рабілі сабе нешта накшталт яго.

Памятаю выпадак у Эберсвальдзе. Хтосьці на кухні ўкраў пудзінг. Прыйшла наглядчыца нашага блоку і заявіла: «Хто ўкажа на таго, хто ўкраў пудзінг, атрымае міску «зупэ». Усе маўчалі, але фашысты ўсё ж даведаліся, і аднойчы прыгожую дзяўчыну з доўгімі косамі прымусілі спачатку распрануцца (а гэта было зімой), потым моцна білі і пакінулі стаяць каля сцяны на кучы цэглы, дзе яна і замерзла.

Некалькі разоў завод бамбілі. Мы, калі бачылі самалёты, крычалі ад радасці і скакалі, а немкі плакалі...

Фронт набліжаўся. Немак і палячак вывезлі на машынах, а нас пагналі пешшу ад лагера да лагера. Так мы ішлі каля 10 дзён, харчаваліся сырой бульбай ці буракамі з буртоў на палях. Тых, хто адставаў ці падаў, ахова прыстрэльвала. Так мы дайшлі да г. Мальхаў і заўважылі, што канвой раптам некуды знік. Толькі на наступны дзень мы сустрэлі рускіх салдат. Гэта было 2 мая 1945 г. Нас пачалі карміць, але многія не маглі есці, бо атруціліся сырой бульбай. Калі ў наш лагер прыйшлі савецкія афіцэры, яны нас распытвалі, нешта запісвалі, потым пасадзілі на машыны і адвезлі ў г. Брандэнбург, у фільтрацыйны лагер № 84. Нас было каля 18 тысяч. Толькі 18 ліпеня 1945 г. я змагла выехаць з Германіі. У сваёй вёсцы Буда, куды я вярнулася, нічога не засталося: хату немцы спалілі, маці загінула ў турме. Жыла ў чужых людзей, працавала спачатку ў в. Жаберычы, потым у в. Ігрушка, пакуль не пайшла на пенсію.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў С. М. Каральковай, жыхаркі г. Крупкі

Адносіны мясцовых жыхароў да немцаў былі, безумоўна, асцярожнымі. На іх глядзелі са страхам, бо сіла была на баку захопнікаў. Немец мог зайсці ў любы двор і забраць у гаспадароў курыцу ці яйкі, ці што іншае. Немцы вельмі строга сачылі, каб ніхто з Крупак не меў сувязі з партызанамі. Нават калі было нешта, што паказвала на гэтую сувязь, чалавека маглі пабіць альбо забіць. Адну жанчыну арыштавалі і білі за тое, што ў яе двары былі сляды раніцай на снезе.

Не ўсе, праўда, немцы былі аднолькавыя садысты. Адна з жыхарак Крупак расказвала мне, што ў час вайны ў іх хату пасялілі на некалькі тыдняў чатырох афіцэраў. Яны, напрыклад, разлічваліся нямецкімі маркамі за прыгатаванне ежы, сцірку, частавалі дзяцей салодкім. Дарэчы, пра вайну Германіі і СССР гэтыя немцы выказваліся вельмі адмоўна.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў Н. К. Краўчанкі, жыхаркі г.п. Бобр

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў г.п. Бобр было шмат немцаў і паліцэйскіх, прычым больш лютавалі паліцэйскія. Восенню

1941 г., прыкладна ў верасні, немцы сагналі палову жыхароў вёскі да моста і аб'явілі, што калі знойдуць у вёсцы партызан, жыхары будуць расстраляны... Мы прастаялі пад вартай да вечара. У гэты час немцы прывезлі з Крупак дваіх параненых. Іх спыталі, з кім яны мелі сувязь у Бабры. Тыя адказалі, што ні з кім. Параненых хутка расстралялі. Адзін з іх крыкнуў перад расстрэлам: «Усіх не расстраляеце. Памятайце, за нас адпомсцяць!» Я ад шкадавання апусціла галаву. Немец заўважыў гэта і стукнуў мяне кулаком у твар. Пасля расстраляных пахавалі каля дзіцячага дома.

З успамінаў М. Мацура, жыхаркі в. Новая Слабада

В 1942 году в нашей деревне появились фашисты. Привел их полицай, указал хаты, где жили коммунисты и комсомольцы. Всех стали выводить на улицу. Повели на расстрел и мою маму, отца, братьев и сестер. Я была самая маленькая. Нас вывели в поле. Помню, как мама тихонько толкала меня за свою спину. Потом раздались автоматные очереди. Все стали падать. Упала и я. Так и лежала до вечера, пока на это место не пришли партизаны. Потом меня отправили в деревню, где жили мои больные бабушка и дедушка.

7 дней, 1995. 1 апреля.

З успамінаў Н. Парэцкай, ураджэнкі в. Капачоўка

Што я бачыла ўласнымі вачыма? Памятаю, як цяпер гэта было. У адзін з чэрвеньскіх дзён надвячоркам прыехалі ў нашу вёску Капачоўку дзікія звяры ў постаці чалавека. Калі яны вылезлі з «хапуна» (так звалі нашы людзі чорную машыну), адразу пачалі аблаву. Гітлераўцы забралі мяне, маю маці і старэйшую сястру Тэклю. Павезлі на машыне ў напрамку Крупак. Мы не ведалі, для чаго і куды нас вязуць. Потым высадзілі ўсіх забраных і пачалі гнаць пяшком. Людзей назбіралі з навакольных вёсак каля шасці дзесяткаў. Канваіры суправаджалі нас палкамі, білі, колькі ім хацелася. Ноччу нас прыгналі да нейкага памяшкання, абнесенага калючым дротам. Адчыніліся дзверы... Нас штурхнулі ў цемру. Зняволеных тут было набіта бітком, але цішыня, цяжкае маўчанне... Есці нам не давалі. Ды, па праўдзе кажучы, тады было і не да ежы. Людзі з прытоеным дыханнем аблізвалі языком пасмяглыя губы, чакалі апошняй хвіліны — развітання з белым светам...

А пасля шасцідзённага тамлення ў памяшканне прыйшлі крывавыя людаеды і пачалі расстрэльваць людзей. Кроў ручаём паплыла па падлозе. Маю сястру адразу ж забілі, а маці цяжка паранілі. Я ляжала паміж забітымі, падплыўшая кроў афарбавала маю вопратку і твар. Прыціснуўшы нос да падлогі, старалася не шавяльнуцца. Памятаю, вельмі хацелася кашлянуць. І калі гітлераўцы выйшлі з памяшкання, я крыху падняла галаву, азірнулася наўкол. Цяжкія стогны паміраючых людзей аддаліся мне ў сэрцы. Я ўпаўголаса сказала: «Мамачка, дзе ты?» Слабеючым голасам маці паспела прагаварыць: «Піць хачу». І тут жа памерла.

Тады я выпаўзла на двор. Навокал стаяла цішыня, толькі доўгай чарадой на водшыбе магістралі рухаліся аўтамашыны. Нямецкія войскі ўцякалі на захад. Мне было вельмі боязна, таму што ісці трэба было цераз магістраль. А вопратка мая ўся ў крыві, убачаць фашысты і расстраляюць. Але выпала хвіліна, і на магістралі нікога не стала. Я, колькі мела сілы, перабегла магістраль і накіравалася на Халопенічы. А тут, бачу, едуць нашы чырвонаармейцы. Не хапае слоў, каб выказаць маю радасць ад сустрэчы. І так я прыйшла ў сваю вёску і засталася жывой.

Чырвоны сцяг, 1944. 26 ліпеня.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.

З успамінаў Г. Я. Сакавец, жыхаркі в. Лажкі

...І прыйшлі мы ў гэты дзень, калі немцы Узнаж ацапілі, вот у гэта балота, пад самы бераг, у журавіны. Утраёх: дзве дзеўкі і жанчына. З Лажкоў мы, зусім з другое ж дзярэўні.

Слышым — ужо немцы гіргочуць на беразе. Пайшлі ўжо яны па лесе кругом. А ў лесе зямлянкі былі тут во, на берагу. Там сядзелі з дзецьмі. Узнацкія. Гэты самы... (Паказвае на мужа). Бацька яго — дзевяць дзяцей было, і ўсіх прывёў у зямлянку. Вот мы слышым — немцы гіргочуць. Мы тады — ходу дамоў.

Толькі мы прыбеглі туды дамоў... З кіламетр мы беглі туды па балоце. І так гэтыя пацаны сыплюць ужо за намі, бягуць. Вот гэты Пеця, Ганна і там была яшчэ адна... Кажуць:

— Ужо немцы ацапілі Узнаж, і не знаем што. Будуць біць...

Гэта было вечарам, часоў каля пяці. Патом ноч пераначавалі, чуем урана — крык тут,

каровы равуць. Баба адна была, Макарыха, — крычыць нешта... Ну, што ж такое? Трэба ж падпаўзці людзям, паслухаць. Мужчыны, старэйшыя ў Лажках, папаўзлі па балоце, па багульніку. Паслухалі. Кажуць:

— Расстрэльваюць!

Крык, плач — усё кіпіць там.

Пачакалі мы гэты дзень, суткі гэтыя. Усё гэта ўспакоілася — нада ж схадзіць, падгледзець, што там такое. Падышлі мужчыны сюды, паглядзелі. Ціха, толькі лётаюць чорныя гракі стадам, крычаць... Нікога нет. І каровы ходзяць яшчэ. Некалькі кароў...

Вот. І ўжо тады мальчуганы тыя былі дома, пабеглі сюды паглядзець: ужо нікога не было. Выехалі ўсе. Валяліся тут яшчэ...

Партызан убіты быў, каля зямлянкі ляжаў, казалі.

Патом к гэтай магіле падышлі. Пуня тут была калхозная. Яны іх зачынялі... К яме гэтай вялі... Да ямы вялі, раздзявалі, голых, бедных!.. І кажушкі ляжаць во. Хто ў чым хадзіў, тое валяецца. У яму лажылі і ўбівалі. І нямножачка зямлёй прыкідалі. Зямля гэтая раскяпілася.

Вот лічна быў мой брат, прыходзіў глядзець сюды. Дык кажа:

— Лучыначкай пастукаеш — сантыметры на два зямлі толькі было на іх. Прама яшчэ шавялілася гэтая зямля...

Гэта на другі дзень толькі хадзілі яны. Нікога не было.

Каты толькі каўкаюць, кароў некалькі хадзіла...

А потым праз некалькі дзён запалілі гэтую дзярэўню. Яна гарэла...

Друкуецца па кн.: Адамовіч А., Брыль Я., Калеснік У. Я з вогненнай вёскі... Мн., 1975. С. 293.

З успамінаў П. М. Сляшцова, жыхара в. Старыя Шчаўры

У час акупацыі, калі праводзіліся аблавы, мы хаваліся па лясах. Але ў пачатку сакавіка 1944 г. я атрымаў павестку, што трэба з'явіцца ў в. Хацюхова. Разам са мною туды з'явіліся Іван Нішчанка, Уладзімір Кулік, Леанід Ждановіч і Уладзімір Цяглік. Ужо ў в. Хацюхова да нас далучыліся брат і сястра падпольшчыка Пятра Кісялёва — Клім Лявонцьевіч і Ганна Лявонцьеўна Кісялёвы. Яны знаходзіліся да гэтага ў СД.

Адтуль нас адправілі ў г.п. Халопенічы. Там было многа моладзі з раёна. Трымалі ў памяшканні былой сінагогі, пакуль не прыйшлі машыны. З Халопеніч павезлі ў Барысаў, дзе на тэрыторыі асфальтавага завода быў размешчаны канцэнтрацыйны лагер. Пасля нас павезлі ў таварных вагонах далей. У час руху эшалона многія ўцякалі. Нас не кармілі. У г. Лейпцыг, куды мы прыехалі, пратрымалі двое сутак. Некаторыя з маіх таварышаў засталіся там, а нас павезлі далей ў г. Лангавізен, дзе мы сталі працаваць на заводзе тэрмасаў.

Я фарбаваў тэрмасы. Аднойчы незнарок скінуў банку з фарбай, дык майстар гаечным ключом так разбіў мне падбародак, што і цяпер відаць шрам.

Спачатку нас не пускалі з лагера. Потым, калі пачаліся бамбёжкі, дазволілі выходзіць. Рабочы дзень цягнуўся з 7 гадзін да 19-ці. У дзень давалі 200 г хлеба і міску баланды. Зняволеныя былі вельмі слабыя, хадзілі, трымаючыся за сценку.

Вясной 1945 нас вызвалілі саюзніцкія войскі. Пасля вызвалення я вярнуўся дадому, вярнуліся і мае таварышы. Хутка нас прызвалі ў армію.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў В. Г. Тарашкевіч, жыхаркі в. Нача

У гады акупацыі фашысты здзекваліся з мясцовага насельніцтва, абкладвалі рознымі паборамі і павіннасцямі. Напрыклад, жыхарам вёскі трэба было здаць немцам пэўную колькасць яек, сала, мяса, хлеба і г.д. Самім жа прыходзілася есці стравы з крапівы, лебяды, хадзіць у лапцях. Паліцэйскія выконвалі даручэнні гітлераўцаў пры дапамозе зброі. Збожжа, якое ўдавалася выратаваць, малацілі ланцугамі, малолі на жорнах. Жывёлы ў вайну заставалася мала. Яе можна было пералічыць на пальцах. Наогул, пра вайну ва ўсіх нашых вяскоўцаў горкія ўспаміны. Але фашысцкія захопнікі атрымалі па заслугах. Як гавораць, адкуль прыйшлі, туды і вярнуліся.

З успамінаў А. Цітаўца, партызана

Осенью 1942 года карателями была уничтожена деревня Новая Слобода Старослободского сельсовета Крупского района. Около 70 человек расстреляли фашисты. В тот день я выполнял задание командования партизанского отряда. Ехал верхом на лошади и, увидев пожарище, завернул туда. Среди убитых

обнаружил уцелевшую девочку 5—6 лет — Маню Мацуру. Она была ранена в руку и истекала кровью. Что было делать? Я слез с коня, перевязал девчушку, а затем отнес ее в стог сена. Здесь мы провели двое суток — голодные и холодные. Только на третий день удалось мне отправить ее в соседнюю деревню.

7 дней, 1995. 1 апреля.

З успамінаў С. Я. Шалавумавай, жыхаркі г. Крупкі

Восеньскім днём 1941 г. нас, жыхароў Крупак, немцы пачалі зганяць да цэнтра. У другой палове дня там сабраўся натоўп людзей дзесьці каля дзвюх тысяч. Хутка ўсіх пад канвоем павялі па бруку Савецкай вуліцы ў напрамку да аўтамагістралі. Куды, чаго — ніхто не ведаў. Зразумелі толькі тады, калі нас прывялі да вялікай лагчыны каля в. Панскае. Лагчына незадоўга да гэтага была яшчэ больш паглыблена, так што атрымалася вялізная яма. Праз яе былі перакінуты некалькі дошак. Вось на гэтыя дошкі па чарзе выводзілі па некалькі чалавек, часцей за ўсё сем'і. Ім дазвалялася коратка развітацца паміж сабой, і тут жа гучалі стрэлы. Ахвяры падалі з дошак на дно ямы. Мясцовасць акружалі канвойныя, у большасці паліцэйскія, уцячы было нельга.

Жудасная чарга прадзвігалася надта марудна, і калі пачалі падводзіць да ямы апошніх, у тым ліку і мяне, пачало ўжо змяркацца.

Я ступіла на дошкі і адчула, як яны гойдаліся пад намі. Так атрымалася, што за імгненне да выстралаў я сарвалася з гэтых дошак і ўпала ў яму. Ляжу, чую, як пада мной яшчэ варушыцца чалавечая нага, і чакаю выстралаў зверху. Вось упалі апошнія, прагучала некалькі адзіночных стрэлаў, і сціхла. Я прытварылася мёртвай і чакала, што будзе далей. Амаль нада мной пачуліся галасы мужчын, якіх яшчэ раней немцы прыгналі закопваць яму. Адзін з іх пачаў прасіць карніка: «Пан, ужо цямнее, мы не паспеем, можа, заўтра закапаем?» Тыя нешта незразумела пагаргаталі паміж сабой і пайшлі разам з рабочымі ад ямы. Я яшчэ крыху паляжала, а потым ціхенька запыталася: «Ці ёсць хто-небудзь жывы?» Мне адклікнулася знаёмая жанчына, звалі яе Марыяй Шпунт. Мы разам выбраліся з ямы і хуценька пабеглі да лесу. Такім чынам, мы з Марыяй з той тысячы расстраляных засталіся жывымі.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў І. Ц. Шуцько, ураджэнца в. Гаць Крупскага раёна, беларускага пісьменніка

Я хачу расказаць пра расправу з жыхарамі в. Маладзілава. Па дарозе Выдрыца — Дзянісавічы вельмі часта ездзіў атрад французаў у складзе 20 чалавек за поштай. Паблізу в. Маладзілава ва ўрочышчы Забалотнае на лясной паляне партызаны ўчынілі засаду.

Калі французы выехалі з лесу на поле, партызаны адкрылі агонь. 19 чалавек было забіта, аднаму ўдалося ўцячы. Ён прыбег у Выдрыцкі гарнізон. Неўзабаве атрад карнікаў акружыў в. Маладзілава. У ёй да вайны жыло 8 сем'яў. Паліцэйскі па прозвішчы Шэлепень з в. Вялікае Гародна, якога ў гады калектывізацыі раскулачылі, вырашыў адпомсціць былому старшыні калгаса Якаву Яфімавічу Шуцько, і хутка таго і аднавяскоўца Пятра Іосіфавіча Шуцько фашысты расстралялі на полі за вёскай, астатніх жыхароў пагналі ў в. Выдрыца і там знішчылі. Дамы ж і пабудовы спалілі. У гэты час па дарозе ішоў чалавек з в. Захараўка. Яго таксама расстралялі. Засталіся толькі дзве сям'і, паколькі ў адной з іх была сястра паліцэйскага, а ў другой — яго цесць.

Пасля гэтага ў Маладзілаве ўжо ніхто не сяліўся, у ім стала, як і ў Хатыні.

* * *

У пачатку вайны немцы замест калгасаў стваралі абшчыны. Усё заставалася па-старому. Разам касілі, аралі, паслі жывёлу. Потым мы вырашылі выдаць з калгаснага статка кароў тым, у каго іх не было. Пра гэта было паведамлена выдрыцкаму бургамістру. Той загадаў вярнуць кароў у агульны статак. Вярнулі. Хутка прыехалі немцы і ўсіх кароў забралі.

Тое ж атрымалася і з авечкамі. Гэты статак існаваў да восені 1942. Калгаснікі не раз давалі авечак дэсантнікам, а таксама партызанскай групе Колесавай. Але восенню прыехалі немцы, авечак парэзалі, пагрузілі на машыны і паехалі.

Падрыхтавалі да друку М. А. Баравуля, Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў В. Ф. Шэршня, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

Шэршань Віктар Фаміч, нарадзіўся 4.11.1910 г. ў в. Печы Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Пасля сканчэння Аршан-

В.Ф.Шэршань.

скага ФЗВ працаваў машыністам на чыгунцы, супрацоўнічаў у Полацкім акружным НКУС і працягваў вучобу ў Полацкім лясным тэхнікуме. У пачатку вайны інжынер Крупскага лясгаса. Быў арыштаваны Смаленскім СД за сувязь з партызанамі, уцёк з-пад расстрэлу і стаў партызанам. Пасля вызвалення Беларусі інспектар па кадрах на Барысаўскай чыгункі, пазней старшы аграмеліяратар Крупскага раёна. Памёр у 1996 г.

Калі пачалася вайна, я працаваў у Бобрскім лясніцтве. Галоўным лясніцтвам раёна і грамадзянскім камендантам з прыходам немцаў быў Мерта Арношт Арноштавіч, чэх па нацыянальнасці (раней ён працаваў лясніцтвам Крупскага лясніцтва). Акрамя іншых правоў і абавязкаў Мерта меў магчымасць выпісваць пасведчанні — «аўсвайсы», якія потым завяраліся нямецкім ваенным камендантам. Паколькі я меў добры почырк і быў раней знаёмы з Мертам, ён прыцягнуў мяне да выпіскі «аўсвайсаў». Гэта адкрыла мне доступ да чыстых бланкаў і дало магчымасць дапамагаць дакументамі нашым людзям.

Аднак хутка я аказаўся пад падазрэннем. Аднойчы ў час вобыску ў маім доме паліцыя знайшла 37 чыстых бланкаў і 5 запоўненых «аўсвайсаў». Я быў арыштаваны і трапіў у турму. Следства вёў следчы Смаленскага СД Андрэй Мікульскі, які да вайны працаваў у Смаленскім абласным судзе. Ён дабіваўся ад мяне, ці з'яўляюся я камуністам і каму перадаваў «аўсвайсы». Пачуўшы адмоўны адказ, Мікульскі выклікаў двух паліцэйскіх. Тыя спрытна распранулі мяне, заткнулі рот анучай і перагнулі праз стул. Першыя пятнаццаць удараў нанёс мне следчы. Не пачуўшы ад мяне ні слова, каты зноў пачалі сваю справу.

На трэці раз болю я амаль не адчуў, скуры на спіне ўжо амаль не было, непрытомнасць агарнула мяне...

Праз нейкі час маю справу перадалі ў ваенна-палявы суд. Праўда, там не білі, але прыгаварылі да расстрэлу.

У пакутах прайшоў тыдзень. На зыходзе яго, увечары, прыгавораных пачалі выводзіць па адным і звязваць рукі. Зразумеў, што настаў апошні час жыцця, побач многія пачалі маліцца.

Адабралі 16 чалавек, праверылі па спісе і на машыне адвезлі ў лес, дзе была ўжо выкапана яміна. Чатыры ўкормленыя эсэсаўцы выводзілі па чарзе людзей, прымушалі распранацца дагала, ставілі на край яміны, а потым стралялі ў патыліцу.

Пятым ішоў Рыгор Якаўлевіч Багамолаў з в. Заполле Нацкага сельсавета. Пасля афіцэр сцягнуў з машыны мяне. Салдаты разрэзалі вяроўкі на руках і загадалі распранацца. Побач стаялі двое: афіцэр з аўтаматам на плячы і салдат з вінтоўкай.

Раздумваць не было часу. Я ўскочыў і кінуўся да блізкага лесу. Ззаду раздаліся аўтаматныя чэргі, стрэлы з вінтоўкі. Кулі свісцелі то злева, то справа, адна з іх апаліла мне спіну...

Двое сутак блукаў я па лесе, раздзеты і разуты, пакуль нарэшце не выйшаў да в. Забалоцце. Там мне далі лапці і верхнюю вопратку. Вяскоўцы звялі мяне з партызанамі атрада імя Варашылава брыгады імя Шчорса.

Тры тыдні праляжаў я ў партызанскім шпіталі (у мяне былі абмарожаны ногі і частка цела), потым перавялі ў сапёрны ўзвод. Пасля блакады разам з часткай партызан увайшоў у брыгаду імя Кірава, дзе ваяваў да вызвалення Беларусі.

Ужо пасля вайны я даведаўся, што ў дзень расстрэлу фашысты арыштавалі ўсю маю сям'ю: бацьку, маці, сястру з сынам. Спачатку яны знаходзіліся ў крупскай, потым у барысаўскай і мінскай турмах. Незадоўга да вызвалення Мінска бацьку расстралялі, маці задушылі ў газавай камеры, сястру вывезлі ў канцлагер Асвенцім, адкуль яна вярнулася псіхічна хворая...

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

Партызанскі рух

У першыя месяцы пасля акупацыі насельніцтва сустрэла нямецкія войскі насцярожана, але адкрытага супраціўлення не аказвала. Партыйныя і савецкія органы, якія хутка эвакуіраваліся, не паспелі закласці базы са зброяй і харчаваннем, пакінуць кіраўнікоў антыфашысцкага руху і стварыць сетку падпольных арганізацый. Тым не менш стыхійнае супраціўленне акупантам нарастала. Ствараліся партызанскія атрады. Арганізатарамі іх былі акружэнцы і мясцовыя жыхары. Адным з першых такіх атрадаў стала група акружэнцаў на чале з С. Г. Жуніным, якая пасля цяжкіх баёў пад Слонімам прабіралася да лініі фронта. У пачатку ліпеня яны спыніліся каля в. Папарнае і вырашылі перайсці да партызанскіх метадаў барацьбы. Праз некаторы час да іх далучылася група чырвонаармейцаў на чале з палітруком Старавойтавым, а таксама мясцовыя жыхары з вёсак Старая Слабада, Матошка, Папарнае. Так быў створаны атрад «Сяргея». Некалькі пазней па суседству ўзніклі і пачалі дзейнічаць групы Кулікова, Мажэйкі, А. А. Гурскага. Пасля яны сталі ядром 8-й Круглянскай партызанскай брыгады. На тэрыторыі Талачынскага раёна ў ліпені 1941 г. пачаў дзейнічаць арганізаваны з ліку камандзіраў і чырвонаармейцаў партызанскі атрад В. С. Лявонава. Ён паклаў пачатак Сенненскай брыгадзе. У красавіку 1942 г. група жыхароў в. Выдрыца стварыла атрад імя Варашылава. Яго камандзірам выбралі Ф. В. Юданава.

А. А. Гурскі.

Партызанскія атрады ствараліся таксама на базе груп з ліку работнікаў НКУС, якія накіроўваліся ў варожы тыл для дыверсійнай работы. Часта такія групы папаўняліся акружэнцамі і мясцовымі жыхарамі, набіралі моц і станавіліся пастаянна дзейнымі баявымі падраздзяленнямі. Другія ўліваліся ў раней створаныя і ўжо дзейнічаўшыя партызанскія групы. Некаторыя ж, не здолеўшы прыстасавацца да складаных умоў партызанскай барацьбы, гінулі. Адну з такіх груп узначаліў начальнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення НКУС А. Я. Васілеўскі. Сфарміраваная ў спешцы, дрэнна ўзброеная і падрыхтаваная, яна 5 ліпеня была накіравана ў тыл ворага ў раён вёсак Сомры—Гібайлавічы. Не здолеўшы наладзіць сувязь з мясцовымі патрыётамі, група не змагла разгарнуць шырокую дзейнасць і ўжо ў пачатку ліпеня 1941 г. была

Камандзір асобна дзеючага атрада «Мсціўец» К. В. Сідзякін (у цэнтры) ставіць задачу.

акружана карнікамі і панесла значныя страты. Загінуў і сам Васілеўскі. Спецатрад «Мсціўца» пад камандаваннем К. В. Сідзякіна дзейнічаў больш рэзультатыўна. Перакінутая праз лінію фронту ў раёне Смаленска ў ліпені 1941 г. група адразу ж уключылася ў актыўную барацьбу. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчаць вытрымкі з дакладной запіскі Сідзякіна Мінскаму падпольнаму абкому партыі: «1 верасня 1941 г. ў 23 гадзіны 30 хвілін на перагоне Крупкі—Бобр узарваны цягнік, разбіты 6 вагонаў з боепрыпасамі. Рух спынены на 20 гадзін. Сапсавана 100 метраў пуці. 6 верасня 1941 г. ў 2 гадзіны на перагоне Слаўнае—Бобр узрывам на чыгункы ўзарваны цягнік, разбіты 4 вагоны, 19 пашкоджаны. Рух спыніўся на 47 гадзін, пашкоджаны 200 м чыгуначнага палатна. 14 верасня 1941 г. ў 22 гадзіны на перагоне Крупкі—Прыяміна ў в. Нача ўзарваны паравоз, разбіты 10 пасажырскіх вагонаў з салдатамі, пашкоджана 150 м чыгуначнага палатна. Рух затрыманы на 48 гадзін».

У кастрычніку 1941 г. атрад Сідзякіна перабазіраваўся ў раён Барысава, назад у Крупскі раён вярнуўся ў чэрвені 1942 г. На базе дыверсійнай групы Р. М. Лінькова, у якую ўліліся атрады Ц. Я. Ермаковіча, В. Шчарбіны, А. Мядзведзева, І. А. Яраша, В. Папова, быў сфарміраваны партызанскі атрад асобага прызначэння. Да канца вайны са злучэння Р. М. Лінькова, або, як яго звалі, «Баці», выраслі 3 буйныя партызанскія злучэнні. Разведвальна-дыверсійны атрад Баці дзейнічаў на поўначы Крупшчыны да 1943 г., да перадыслакацыі ў Заходнюю Беларусь. Але частка злучэння засталася на месцы і аб'ядналася са злучэннем К. Заслонава, якое ў гэты час перабазіравалася з-пад Оршы бліжэй да Халопеніч.

Г.Я.Сарока.

А.К.Спрогіс.

Некалькі пазней на тэрыторыі раёна былі выкінуты на парашутах дыверсійныя групы Б. Н. Вацлаўскага, Г. Я. Сарокі, Бараноўскага, А. Ф. Бухава. Яны наладжвалі сувязі з мясцовым насельніцтвам, падбіралі агентуру, праводзілі прапагандысцкую работу, але галоўную ўвагу, безумоўна, удзялялі дыверсійнай рабоце. Група А. Ф. Колесавай, якая складалася з дзяўчат, за кароткі тэрмін з мая па верасень 1942 г. ўзарвала чыгуначны мост, 4 варожыя эшалоны і 7 эшалонаў разам з іншымі дыверсійнымі групамі, 3 аўтамашыны, удзельнічала ў разгроме 6 гарнізонаў. 11 верасня 1942 г. ў час разгрому Выдрыцкага гарнізона Алена Колесава загінула. Пасмяротна ёй было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Дыверсійная група А.Ф.Колесавай. 1942 г.

У адрозненне ад дыверсійных груп, галоўнай мэтай якіх была баявая дзейнасць, ствараліся таксама атрады, перад якімі стаяла перш за ўсё задача арганізацыі партызанскага руху на акупіраванай ворагам тэрыторыі. Менавіта такімі былі атрады «Гвардзеец» і імя Кірава. Яны фарміраваліся ў савецкім тыле пераважна з моладзі тых мясцін, куды планавалася высадка. 20 чэрвеня 1942 г. атрад «Гвардзеец» перайшоў лінію фронту, а некалькі пазней, у жніўні, гэта зрабіў і атрад імя Кірава, які затым з'явіўся асновай стварэння брыгады імя Кірава. За гады вайны атрад «Гвардзеец» павялічыўся з 46 да 266 чалавек, атрад імя Кірава з 38 чалавек вырас у аднайменую брыгаду колькасцю 939 партызан.

Але ў цэлым у пачатковы перыяд вайны партызанскі рух меў у асноўным стыхійны характар, першыя атрады былі слаба забяспечаны зброяй, харчаваннем, не было сувязі з «Вялікай зямлёй». Таму і актыўнасць партызан у гэты час была яшчэ невялікай. Пасля паражэння немцаў пад Масквой у снежні 1941 г., калі, з аднаго боку, узмацнілася вера ў Чырвоную Армію і надзея на вызваленне, а з другога, пачаліся рэпрэсіі сярод мірных жыхароў з боку фашыстаў, партызанскі і падпольны рух стаў набываць больш масавы і арганізаваны характар.

Да гэтага трэба дадаць, што ў выніку контрнаступлення Чырвонай Арміі пад Масквой адзін з выступаў лініі фронта дасягнуў паўночна-ўсходняй мяжы Беларусі. Гэта адкрыла магчымасць аператыўнага ўзаемадзеяння партызан з камандаваннем Чырвонай Арміі. Тэрыторыя Беларусі, якая знаходзілася ў аператыўным тыле цэнтральнай групы нямецкіх войск, стала разглядацца як важны стратэгічны і палітычны плацдарм. Да таго ж партызанскі рух станавіўся ўсё больш масавым.

Улічваючы ўсе гэтыя абставіны, савецкі ўрад прадпрыняў шэраг мер, каб надаць партызанскай барацьбе больш арганізаваны характар, скаардынаваць дзеянні партызан з камандаваннем Чырвонай Арміі. З гэтай мэтаю ў тыл ворага была перакінута значная колькасць аператыўных работнікаў, афіцэраў сувязі, радыстаў для аб'яднання разрозненых груп і атрадаў і ўстанаўлення сувязі з фронтам. Былі створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху і Беларускі штаб партызанскага руху. У дапамогу партызанам былі накіраваны спецыялісты для абсталявання палявых партызанскіх аэрадромаў. Пры дапамозе авіяцыі атрады сталі забяспечвацца зброяй, узрыўчаткай, медыкаментамі. Дарэчы, партызан, якія дзейнічалі ў Крупскім і суседніх раёнах, абслугоўвалі аэрадромы, якія былі створаны каля Лукомльскага возера і возера Палік. Да партызан сталі адносіцца як да рэгулярных войск, часткі Чырвонай Арміі, якая дзейнічала ў тыле ворага.

У сярэдзіне 1942 г. для каардынацыі дзеянняў дыверсійных груп і атрадаў на тэрыторыі Крупскага раёна быў накіраваны прадстаўнік Беларускага штаба партызанскага руху падпалкоўнік А. К. Спрогіс. Пад яго кіраўніцтвам 12 верасня 1942 г. дыверсійныя групы Вацлаўскага, Сарокі, атрады імя Варашылава, 277-ы, 128-ы разгромілі даволі буйны гарнізон праціўніка ў в. Выдрыца.

Некалькі пазней у гэтую ж зону быў накіраваны афіцэр сувязі штаба Заходняга фронту і штаба партызанскага руху С. Н. Лявонцьеў.

7 чэрвеня 1942 г. ў раёне в. Дзянісавічы прызямлілася на парашутах група камандзіраў і палітработнікаў. Узначальвалі яе старшы лейтэнант А. А. Маршчынін і батальённы камісар Д. А. Смагін. Звязаўшыся з партыза-

Група партызан 8-й Круглянскай партызанскай брыгады. У цэнтры — камандзір брыгады С.Г.Жунін.

намі, Маршчынін і Смагін прыступілі да фарміравання злучэння. Аснову яго склалі атрады Жуніна, Кулікова, Місніка, Машчыцкага. У брыгадзе, якая спачатку называлася «Аб'яднанне атрадаў «Дзядзькі Сашы», затым «Аб'яднаныя атрады Барысаўскага аператыўнага цэнтра» (атрады БАЦ) і, нарэшце, «8-я Круглянская партызанская брыгада», на момант стварэння налічвалася 150 чалавек. Да верасня 1942 г., калі было закончана фарміраванне, колькасць партызан павялічылася ужо да 612, яны мелі на ўзбраенні 45-міліметровую пушку, 12 мінамётаў, 6 станковых і 54 ручныя кулямёты, 45 аўтаматаў, вінтоўкі. Камандзірам стаў А. А. Маршчынін, камісарам — Д. А. Смагін, начальнікам штаба — старшы лейтэнант І. Г. Ільін. Пазней, у пачатку кастрычніка 1942 г., пасля адклікання ў распараджэнне Масквы Маршчыніна, камандзірам 8-й брыгады стаў С. Г. Жунін. Брыгада ўвайшла ў склад ваенна-аператыўнай групы. Як дакладваў 29 верасня 1942 г. камандуючы нямецкімі ахоўнымі войскамі камандуючаму тылам групы «Цэнтр», «па пацверджаных агентурных даных у раёне в. Ухвала (45 км паўднёва-заходней Талачына) пачалі фарміравацца буйныя партызанскія сілы. Колькасць партызан каля 8500 чалавек».

Прыкладна ў гэты ж час закончылася арганізацыйнае афармленне брыгады імя Кірава. Узначаліў яе капітан Ф. Ц. Пуставіт, камісарам стаў М. А. Пасекаў, начальнікам штаба — В. А. Шаркоў. Гэта была таксама даволі моцная баявая адзінка, якая мела на ўзбраенні 2 мінамёты, 2 супрацьтанкавых ружжа, 61 аўтамат, 11 кулямётаў, вінтоўкі.

На базе атрадаў «Гвардзеец», імя Ватуціна і «За Радзіму» была створана брыгада імя Панамарэнкі.

Улічваючы важнасць актывізацыі падрыўных дзеянняў у раёнах, дзе праходзяць стратэгічныя камунікацыі, чыгуначная і аўтамагістралі, Беларускі штаб партызанскага руху перадыслацыраваў з Усакінскіх лясоў 277-ы атрад (камандзір Мазур, камісар Ізох), з-пад Беразіно — 128-ы атрад пад камандаваннем Свістунова з 14-й партызанскай брыгады.

Увогуле, да 1943 г. на тэрыторыі Крупскага і былога Халопеніцкага раёнаў пастаянна дзейнічалі 4 брыгады: 8-я Круглянская, імя Кірава, імя Панамарэнкі і Лявонава. Перыядычна тут дыслацыраваліся яшчэ 5 брыгад: 1-я імя К. С. Заслонава, 2-я Беларуская імя П. К. Панамарэнкі, Дубава, Гудкова. Акрамя названых, тэрыторыя раёна знаходзілася ў зоне дзеянняў 1-й Смаленскай, 2-й імя К. С. Заслонава, 3, 5, 14, 760-й імя М. Беразоўскага, Багушэўскай, імя М. А. Шчорса, Лёзненскай брыгад, якія або праходзілі рэйдамі, або асобныя групы ці атрады гэтых злучэнняў праводзілі баявыя аперацыі на тэрыторыі раёна. З ліпеня 1942 г. тэрыторыю ад Крупак да Беразіно фактычна кантралявалі партызаны Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны.

У гады вайны атрады брыгад, якія дзейнічалі на Крупшчыне, разграмілі гарнізоны ў вёсках Хацюхова, Дзянісавічы, Хальнявічы, Сакалавічы, Выдрыцы, Шэйцы, Слоўчы, На-

Партызаны брыгады імя С.М.Кірава.

чы, Слабада, зрабілі напад на гарнізоны ў вёсках Дубы, Ухвала, Старая Пярэсіка, Чараёўка. Падпольшчыкі ўзарвалі ў Халопенічах кабінет начальніка паліцыі, лесапільны завод, хлебапякарню, ільнозавод у в. Абчуга. Найбольш буйнымі са знішчаных гарнізонаў былі Выдрыцкі, Дзянісавіцкі і Шэйцаўскі. Выдрыцкі гарнізон быў захоплены ў час сумеснай аперацыі некалькіх атрадаў — 177-га, 128-га і дыверсійных груп. Праціўнік страціў забітымі каля 40 салдат і паліцэйскіх, быў спалены мост цераз р. Бобр. У час бою ў Выдрыцы загінула Герой Савецкага Саюза камандзір дыверсійнай групы А. Колесава. Але ў час бою ў вёсцы згарэла каля 150 пабудоў. Акрамя таго, па загаду Свістунова былі расстраляны некалькі жыхароў вёскі «як пасобнікі ворага». Былі выпадкі, калі байцы яго атрада займаліся марадзёрствам. У далейшым В. П. Свістуноў быў вызвалены ад камандавання атрадам і адпраўлены ў распараджэнне БШПР для прыцягнення да адказнасці.

Дзянісавіцкі гарнізон налічваў каля 120 чалавек, меў на ўзбраенні 15 кулямётаў, 4 пушкі, 5 мінамётаў. Партызаны 8-й брыгады здолелі ўстанавіць сувязь з начальнікам дзянісавіцкай паліцыі Сакаловым. Было дамоўлена, што частка паліцэйскіх, што згодны перайсці да партызан, дапаможа ў разгроме гарнізона. У вызначаны час, у ноч на 20 верасня 1942 г., атрады «Гвардзеец» брыгады імя Панамарэнкі, 8-ы і 30-ы 8-й брыгады пад камандаваннем Машчынскага акружылі вёску. Паліцэйскія, якіх Сакалоў паставіў на варту, пакінулі свае пасты і далучыліся да партызан. Казарма паліцэйскіх была хутка захоплена, але немцы падняліся па трывозе і зрабілі спробу прарвацца ў бок Крупак. Партызанскія засады іх прыпынілі. Акупанты страцілі каля 80 чалавек, трафеі склалі 150 вінтовак, 5 кулямётаў, гранаты і інш. 14 паліцэйскіх на чале з М. А. Сакаловым уліліся ў 8-ю брыгаду і ўтварылі асобны ўзвод.

Мемарыяльны знак на месцы гібелі А.Ф.Колесавай у в. Выдрыца.

Значнай аперацыяй была таксама дыверсія, праведзеная 277-м атрадам пад камандаваннем С. А. Мазура і І. З. Ізоха 9 верасня 1942 г. Партызаны знішчылі чыгуначны мост цераз р. Нача, разгромілі варожы гарнізон у в. Нача. У сувязі з гэтым Клічаўскі аператыўны цэнтр, якому падпарадкоўваўся атрад, выдаў загад, у якім, у прыватнасці, адзначалася, што сваімі дзеяннямі атрад паралізаваў рух эшалонаў да фронта на 6 сутак. 177-му атраду была аб'яўлена падзяка.

Занепакоеныя размахам партызанскага руху, гітлераўцы прадпрынялі шэраг карных экспедыцый. З 11 па 23 кастрычніка 1942 г. супраць партызанскіх атрадаў, якія дзейнічалі ў Круглянскім, Барысаўскім, Крупскім і Бярэзінскім раёнах, была праведзена карная аперацыя пад кодавай назвай «Карлсбад». У ёй прынялі ўдзел дывізія рэгулярных войск і батальён Дзірлевангера.

277-му і 128-му атрадам, брыгадзе імя Кірава, удалося выйсці без бою. У акружэнне трапілі 8-я брыгада, атрад «Гвардзеец» брыгады імя Панамарэнкі і атрад імя Варашылава брыгады імя Шчорса. Абарончыя баі разгарнуліся ў раёне в. Папарнае і Сомры, пакуль брыгада Жуніна не прарвалася да в. Дулебы, Бярэзінскага раёна. Толькі 30-ы атрад гэтай брыгады і «Гвардзеец» яшчэ вялі бой у в. Дубавое, але і яны затым змаглі праз Талачынскі раён выйсці ў Барысаўскі раён да возера Палік. Атрад імя Варашылава ў ноч з 20 на 21 кастрычніка 1942 г. пераправіўся цераз рэкі Бобр і Нача і выйшаў да в. Гумны, дзе злучыўся з 277-м і 128-м атрадамі і дыверсійнай групай Сарокі. Аднак выбрацца з акружэння партызаны не здолелі і таму да 10 лістапада яны трымалі абарону ў лясным масіве паміж в. Гумны і Гаць. Толькі праз месяц партызаны здолелі адарвацца ад ворага і перайсці на правы бераг р. Беразіна, дзе злучы-

ліся з брыгадай імя Шчорса. У адплату фашысты правялі масавыя расстрэлы мірных жыхароў у в. Забалацце, Сомры, Купленка, Ухвала.

Пасля заканчэння блакады да лета 1943 г. значная частка атрадаў і брыгад, сярод якіх брыгада імя Панамарэнкі, імя Кірава, Лявонава, 8-я, зноў перамясцілася на тэрыторыю Крупскага і сумежных з ім раёнаў.

Да канца 1942 г. на тэрыторыі Крупскага раёна ўжо дзейнічалі партызанскія атрады і брыгады агульнай колькасцю 1100 чалавек. Па няпоўных даных, на тэрыторыі раёна за год было знішчана каля 15 тыс. акупантаў, узарвана 47 аўтамашын, разгромлены 3 гарнізоны. У 1943 г. партызаны кантралявалі значную частку раёна. У гэты час на тэрыторыі раёна дзейнічалі брыгада імя Панамарэнкі, імя Кірава, Сенненская 8-я, Круглянская. Акрамя таго, тут праходзілі рэйдамі альбо спыняліся на пэўны тэрмін для правядзення баявых дзеянняў атрады і брыгады, якія пастаянна дыслацыраваліся ў іншых раёнах. Сярод іх брыгады Н. П. Гудкова, Чашніцкая брыгада «Дубава», Лёзненская брыгада, 1-я Смаленская, брыгада імя Шчорса, 277-ы партызанскі атрад і іншыя. Да гэтага часу партызаны ўяўлялі сабой значную сілу. Яны наносілі вялікі ўрон праціўніку.

На працягу 1943 г. рады байцоў партызанскіх атрадаў пастаянна растуць. Да канца 1943 г. ў партызанскіх атрадах і брыгадах, якія дзейнічалі на тэрыторыі раёна, налічвалася наступная колькасць партызан: брыгада Жуніна — 1328 чалавек, мела на ўзбраенні 3 мінамёты, 4 станковыя, 47 ручных кулямётаў, 63 аўтаматы, 743 вінтоўкі; брыгада імя Кірава — 731 чалавек, узбраенне: 1 гармата, 3 мінамёты, 2 супрацьтанкавыя вінтоўкі, 1 станковы, 2 ручныя кулямёты, 60 аўтаматаў, 396 вінтовак; 2-я брыгада імя Панамарэнкі — 741 баец, узбраенне: 2 гарматы, 2 мінамёты, 2 гранатамёты, 3 станковыя, 22 ручныя кулямёты, 83 аўтаматы, 379 вінтовак; брыгада Лявонава — каля 2 тыс. чалавек.

Партызаны Чашніцкай брыгады ў засадзе.

У партызанскіх атрадах былі створаны і актыўна дзейнічалі партыйныя і камсамольскія арганізацыі. Партыйная арганізацыя раёна павялічылася на 62 чалавекі, акрамя таго, у падпольных арганізацыях прыняты кандыдатамі ў члены партыі 62 чалавекі. Колькасць падпольных камсамольскіх арганізацый да канца года ўзрасла да 22, пры гэтым былі прыняты ў камсамол 53 чалавекі.

На працягу 1943 г. было праведзена 1672 сходы, на іх прысутнічалі 10 440 чалавек мясцовага насельніцтва, распаўсюджана 11 тыс. экзэмпляраў раённай газеты «Красное знамя», 21 тыс. лістовак, 169 тыс. зводак Саўінфармбюро.

У цэлым партызаны Барысаўска-Бягомльскай зоны да сярэдзіны 1943 г. кантралявалі значную частку Мінскай і Віцебскай абласцей. Таму па ўказанні «ўпаўнаважанага Гімлера па барацьбе з партызанамі на Усходзе» начальніка СС і паліцыі групы армій «Цэнтр» обергрупенфюрэра СС Баха-Залеўскага супраць партызан у маі—чэрвені 1943 г. была праведзена буйнамаштабная карная аперацыя пад кодавай назвай «Котбус». У ходзе яе ў Халопеніцкі і Крупскі раёны былі накіраваны асобныя часці 3-й і 4-й нямецкіх армій, карныя часці СС, паліцыя, ахоўныя войскі, авіяцыя і танкі.

5 чэрвеня гітлераўцы пачалі наступленне, каб паступова адцясніць партызан у раёне Дамжарыцкіх і Паліцкіх балот. У акружэнне трапілі брыгады імя Кірава, «Дзядзькі Колі», імя Панамарэнкі, «Жалязняк» і інш., усяго каля 9 тыс. чалавек. У ноч з 18 на 19 чэрвеня паміж хутарам Магільнае і в. Пастрэжжа Барысаўскага раёна партызанскія атрады пайшлі на прарыў. Для гэтага быў сфарміраваны штурмавы атрад з кулямётчыкаў і аўтаматчыкаў у колькасці 600 чалавек, за імі шлі асноўныя сілы. Пасля працяглага бою партызаны здолелі прарваць акружэнне і выйшлі з блакады. Да 21 чэрвеня нямецкае камандаванне, не дасягнуўшы галоўнай мэты, спыніла аперацыю. Партызаны актыўна разгарнулі баявыя дзеянні. За год яны правялі каля 40 дыверсій на чыгункі, узарвалі 58 аўтамашын, зрабілі налёты на гарнізоны ў в. Хальнявічы, Шэйка, Дубавое, Слоўча, Слабада, Пярэсіка, узарвалі льнозавод у в. Абчуга, смалакурны завод у в. Радзіца і г.д. Дастаткова моцны гарнізон паліцэйскіх стаяў у в.

Самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі карнікаў на аўтадарозе Барысаў—Крупкі ў час карнай аперацыі «Котбус».

Вялікія Хальнявічы. Атраду Захарава брыгады Лявонава было даручана блакіраваць, а затым і разграміць яго. Дапамогу у атрыманні разведданых аказаў мясцовы жыхар Фёдар Дарожкін. У выніку бою атрад паліцэйскіх пакінуў гарнізон і адступіў.

У разгроме гарнізона ў в. Шэйка ўдзельнічалі некалькі атрадаў брыгады М. П. Гудкова і 2-й Беларускай брыгады імя П. К. Панамарэнкі з 245-міліметровымі пушкамі, 10 кулямётамі, 1 мінамётам. Разведкай было ўстаноўлена, што гарнізон у в. Шэйка складаўся з 80 чалавек, на ўзбраенні былі 1 мінамёт, 8 кулямётаў, 10 аўтаматаў, вінтоўкі. Але небяспека заключалася ў тым, што на адлегласці некалькіх кіламетраў знаходзіўся буйны гарнізон у Крупках, адкуль у любы момант магла падысці дапамога. 5 снежня 1943 г. ноччу асноўныя сілы партызан падышлі да вёскі з поўначы праз балота, дзе праціўнік не чакаў нападу. На працягу 20 хвілін усё было скончана. Гітлераўцы страцілі 36 чалавек забітымі, 13 параненымі, 10 трапілі ў палон. Партызаны захапілі таксама 2 кулямёты, 4 аўтаматы, 10 вінтовак.

Але галоўную ўвагу ўсіх партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп прыцягвала чыгуначная магістраль Мінск—Масква. За тры гады акупацыі на кароткім 30-кіламетровым адрэзку шляху паміж населенымі пунктамі раёна Красноўка—Прыяміна згодна справаздач атрадаў і брыгад БШПР было здзейснена 159 дыверсій. Дарэчы, аналіз справаздач розных атрадаў дазваляе зрабіць вывад, што некаторыя камандзіры атрадаў дапускалі прыпіскі. Гэта датычыцца перш за ўсё колькасці загінуўшых ворагаў. Нейкія сумненні наконт гэтага, магчыма, былі і ў работнікаў штаба партызанскага руху. З гэтай нагоды выклікае цікавасць прыпіска да адной са справаздач камандзіра 2-й Беларускай брыгады, у якой ён запэўніваў, што ўсе даныя, якія ён даваў, не перабольшаны. Увогуле, недакладнасці могуць адносіцца да дэталей, якія тым не менш не зніжаюць значэння і аб'ёма таго ўкладу, які ўнеслі партызаны ў разгром ворага. Урон фашыстам, асабліва на чыгунцы, партызаны рабілі вялізны. Участак шляху паміж Оршай і Барысавам лічыўся самым небяспечным. На адлегласці 200 м вакол чыгункі быў высечаны лес, подступы замініраваны. На адлегласці 1—2 км былі пастаўлены дзоты, між імі агнявыя кропкі. Паміж чыгуначнай і аўтамагістраллю на адлегласці 1,5—2 км пабудаваны вышкі, на якіх былі ўстаноўлены пражэктары і зенітныя кулямёты. Чыгунка патруліравалася групамі па 4—8 чалавек, па ёй перыядычна курсіраваў браняпоезд.

Тым не менш, як адзначалася ў паведамленні гітлераўскай службы бяспекі ў ліпені 1942 г., «дыверсіі на чыгункі Мінск—Орша сталі такімі частымі, што кожную з іх ў асобку не апішаш. Не праходзіць і дня, на працягу якога не было б здзейснена адной ці некалькіх дыверсій. Пастаянна растучая колькасць дыверсій прывяла да таго, што рух на чыгункі ноччу быў спынены».

У час рэйкавай вайны атрадам, якія дыслацыраваліся на тэрыторыі Крупскага і суседніх раёнаў, быў вызначаны ўчастак чыгункі паміж станцыямі Бобр—Прыяміна. 5-я

партызанская брыгада, створаная на базе палка «Трынаццаць», падарвала каля ст. Бобр 400 рэек, брыгада імя Шчорса на ўчастках Мінск—Смалявічы, Прыяміна—Крупкі — каля 950 рэек, брыгада імя Кірава — 300 рэек, брыгада Жуніна на ўчастку Бобр—Слаўнае — 1028 рэек, брыгада імя Панамарэнкі — 300 рэек. Акрамя таго, брыгады імя Кірава, 8-я Круглянская зрабілі шэраг дыверсій уздоўж чыгункі, каб падарваць падземны кабель, які злучаў фронт са стаўкай Гітлера.

У баявых аперацыях на чыгунцы асабліва вызначыўся ўраджэнец в. Чарнавосава Крупскага раёна А. С. Лукашэвіч. З красавіка 1942 г. ён быў разведчыкам і падрыўніком 28-га атрада брыгады Жуніна. Лукашэвіч пусціў пад адхон 9 эшалонаў, двойчы падрываў падземны кабель. 13 лістапада 1943 г. ён трапіў у засаду і, будучы цяжка параненым, узарваў сябе і ворагаў гранатай. 15.8.1944 г. А. С. Лукашэвічу пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У снежні 1943 г. БШПР вырашыў стварыць на базе брыгады Жуніна новую брыгаду і накіраваць яе ў Брэсцкую вобласць. У яе

Партызаны Сенненскай брыгады пасля бою.

ўвайшлі 12-ы і 36-ы атрады 8-й брыгады і 15-ы і 40-ы атрады Шклоўскай ваенна-аператыўнай групы. Камандзірам створанай брыгады стаў С. Г. Жунін, камісарам — В. А. Пятроў, начальнікам штаба — К. І. Мацеж.

У Крупскім раёне засталіся 8, 24, 28 і 30-ы партызанскія атрады 8-й Круглянскай брыгады, а таксама атрады брыгад імя Кірава, імя Панамарэнкі, Лявонава і інш. За першую палавіну 1944 г. партызаны правялі на Крупшчыне 190 аперацый, у тым ліку дыверсіі на чыгунцы, мініраванне дарог, засады, налёты на гарнізоны праціўніка. Быў зроблены налёт на гарнізон у в. Хацюхова, падарвана 12 аўтамашын, брыгада Лявонава за гэты час узарвала 22 эшалоны, 46 аўтамашын.

Складаную аперацыю па знішчэнні маста цераз р. Эса правялі партызаны Багушэўскай брыгады 11.3.1944 г. Мост быў умацаваны 4 дзотамі, гарнізон узброены 3 кулямётамі, 2 аўтаматамі, 10 вінтоўкамі. Подступы да маста прастрэльваліся таксама з суседняга гарнізона ў в. Слабада. Звычайна днём цераз мост праходзіла нямала жанчын у в. Слабада для абмену харчоў на соль. Група партызан пад камандаваннем Лізунова, пераапрануўшыся ў жаночыя сукенкі, узброеная гранатамі і пісталетамі, рушыла да казармы. Узышоўшы на мост, партызаны знішчылі вартавога і пачалі закідваць гранатамі казарму. Адначасова на мост уварвалася другая група. Гарнізон пачаў адстрэльвацца. Падрыўнік Галушка кінуў у акно сямікілаграмовы зарад толу, але няўдала, пасля другой спробы раздаўся ўзрыў. Пад абломкамі загінула 15 гітлераўцаў і паліцэйскіх. Страты партызан склалі 2 забітых і 6 параненых. Каб адпомсціць, немцы арыштавалі ў в. Слабада некалькі дзесяткаў жанчын, якія прыйшлі за соллю. Іх адправілі ў Халопенічы.

Разумеючы небяспечнасць актывізацыі партызанскага руху ў непасрэднай блізкасці да лініі фронту, нямецкае камандаванне рашыла правесці супраць партызан у маі 1944 г. яшчэ адну карную аперацыю пад кодавай назвай «Стракаты дзяцел». 19 мая пачалося наступленне. Асноўныя сілы карнікаў дзейнічалі з боку Чашнікаў, Сянно і Талачына. Брыгады Лявонава, «Граза», Дзячкова былі адцеснены і занялі абарону каля воз. Сялява. 21 мая гітлераўцы паспрабавалі прарваць абарону партызан каля вёсак Язбы і Харытанцы, але былі адкінуты, страціўшы да 45 чалавек забітымі і 20 параненымі. Тады нямецкае камандаванне пачало сцягваць сілы да в. Калодніца, каб перакрыць выхад паміж вёскамі

Сялява і Барсукі. Але ноччу партызаны зрабілі пераправу праз возера і адышлі да воз. Палік. Няўдачай закончылася карная аперацыя супраць партызан і каля Халопеніч, у якой удзельнічалі асобы атрад «Крупкі», 825-ы пяхотны батальён, часці СС. Партызаны брыгады імя Кірава, атрада «Гвардзеец» і іншыя таксама адышлі да воз. Палік.

Лакальная аперацыя «Стракаты дзяцел» супала з больш буйной пад назвай «Баклан», якая праводзілася супраць партызан Барысаўска-Бягомльскай зоны. На працягу месяца каля 35 тыс. партызан трымалі абарону ў Паліцкіх балотах, пакуль не былі вызвалены наступаючымі часцямі Чырвонай Арміі, якія ў чэрвені 1944 г. пачалі аперацыю «Багратыён» па вызваленні Беларусі.

Такім чынам, у гады акупацыі на тэрыторыі раёна дзейнічалі 6 тыс. партызан. Імі было ўзарвана за 3 гады 134 эшалоны ворага, 89 аўтамашын, 9 мастоў, разгромлена 8 гарнізонаў. Па даных, якія накіроўваліся ў БШПР, на тэрыторыі раёна было забіта ці паранена каля 10 тыс. фашыстаў і іх прыслужнікаў.

Дз. М. Хромчанка.

Падпольны рух

Ужо ў пачатку вайны партыйныя органы рэспублікі зрабілі пэўныя захады для стварэння груп супраціўлення на займаемай ворагам тэрыторыі.

30 чэрвеня 1941 г. ЦК КП(б)Б разаслаў райкомам партыі «Дырэктыву № 1» «Аб пераходзе на падпольную работу партыйных арганізацый раёнаў, занятых ворагам». 1 ліпеня была разаслана «Дырэктыва № 2» партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям «Аб разгортванні партызанскай барацьбы ў тыле ворага». Але ў радзе выпадкаў гэтыя распараджэнні ўжо не маглі быць выкананы, бо падзеі развіваліся вельмі імкліва. У прыватнасці, у гэты час фашысты ўжо падышлі да тэрыторыі Крупскага раёна, ішлі баі, пачасціліся налёты варожай авіяцыі. Установы спешна эвакуіраваліся. Пакінуты для арганізацыі падпольнага руху сакратар райкома партыі Якаў Рыгоравіч Камароў спрабаваў наладзіць пэўныя сувязі з надзейнымі людзьмі ў вёсках Бярозка, Асяцішчы, Ухвала і інш., але хутка пасля пачатку акупацыі ён быў схоплены фашыстамі і расстраляны. Невядома, пры якіх абставінах гэта адбылося, звестак аб першых днях акупацыі амаль не захавалася, але зразумела адно: гэта была першая спроба арганізацыі супраціўлення ворагу, і Я. Р. Камароў быў адным з першых патрыётаў, якія загінулі ў гэтай цяжкай барацьбе.

6—8 ліпеня 1941 г. ЦК КП(б)Б накіраваў для арганізацыі падпольнага руху на тэрыторыю Барысаўскага і Крупскага раёнаў групу партыйных і камсамольскіх работнікаў на чале з І. А. Ярашам. Іх задачай было аднавіць у падполлі дзейнасць партыйных і савецкіх органаў, арганізаваць сетку партыйных і камсамольскіх груп на месцах, праводзіць разведвальную і дыверсійную работу. У складзе групы былі сакратары будучага Халопеніцкага райкома партыі І. Ц. Ламінскі, Крупскага райкома партыі Аляксандр Мядзведзеў, Халопеніцкага райкома камсамола Кацярына Трыпуцень, Крупскага райкома камсамола Канстанцін Серабракоў. Усе яны ўваходзілі ў Барысаўскі міжраённы камітэт партыі. Да канца 1941 г. ўдалося наладзіць сувязі з актывістамі з г.п. Халопенічы, Бобр, Крупкі. Была праведзена дыверсія ў г.п. Халопенічы. Але ў лютым 1942 г. група Яраша панесла вялікія страты, загінуў і сам Яраш. Пазней, у сакавіку 1942 г., была разгромлена і група А. Мядзведзева. З сакратароў райкома партыі і камсамола пасля гэтага бою ў жывых застаўся толькі І. Ц. Ламінскі.

Наступная спроба стварыць падпольныя цэнтры супраціўлення была зроблена ў сярэдзіне 1942 г. Да гэтага часу партызанскі рух набыў больш арганізаваны характар, дзейнічала сетка партызанскіх атрадаў і груп, пачалося аб'яднанне іх у брыгады.

У жніўні 1942 г. па рашэнні Мінскага абласнога падпольнага камітэта КП(б)Б быў створаны Барысаўскі міжраённы партыйны цэнтр і Барысаўскі міжрайком ЛКСМБ. На месцах арганізатарамі падпольнага руху супраціўлення сталі партызанскія атрады, у прыватнасці, у Халопеніцкім і Крупскім раёнах атрады імя С. М. Кірава і «Гвардзеец», якія затым увайшлі ў склад партызанскіх брыгад імя С. М. Кірава і П. К. Панамарэнкі. Да гэтага часу партызаны ўжо наладзілі сувязь з мясцовымі жыхарамі з некаторых вёсак.

М.А.Пасекаў.

І.С.Пыскін.

Б.А.Пятроўскі.

П.С.Шалак.

У кастрычніку 1942 г. па рашэнні ЦК КП(б)Б быў створаны Халопеніцкі райком партыі на чале з Міхаілам Аляксандравічам Пасекавым, які дзейнічаў на базе брыгады імя С. М. Кірава. У склад райкома ўвайшлі партыйныя актывісты, партызаны М. І. Купчэня, П. А. Ціхановіч і мясцовыя камуністы В. А. Захарэвіч, В. Ф. Стаін, М. Заварскі. На чале Халопеніцкага райкома камсамола стаў партызан брыгады імя С. М. Кірава І. С. Пыскін, у склад райкома камсамола ўвайшлі Б. А. Пятроўскі, Е. І. Зінькевіч, Е. І. Еўневіч, П. С. Шалак, І. Ю. Зярноў. Адначасова з Халапеніцкім райкомам партыі ў кастрычніку 1942 г. быў створаны Крупскі райком партыі, які дзейнічаў на базе атрада «Гвардзеец». Яго ўзначаліў Аляксей Васілевіч Шчарбакоў, у склад райкома ўвайшлі І. Ф. Ісачанка, Р. А. Буевіч, Ф. Р. Коршун. Крупскі падпольны райком камсамола ўзначаліў І. В. Букач. Члены райкомаў былі замацаваны па зонах, дзе яны вялі арганізацыйную і растлумачальную работу з насельніцтвам. Паўночны ўсход раёна ў гэты час кантралявала 8-я Круглянская партызанская брыгада на чале з С. Г. Жуніным. На базе гэтай жа брыгады дзейнічалі Круглянскі райком партыі і райком камсамола, якія таксама працавалі сярод насельніцтва Крупшчыны.

Да канца 1942 г. ў партызанскіх атрадах былі створаны партыйныя і камсамольскія арганізацыі. Да пачатку 1943 г. партыйная арганізацыя раёна налічвала каля 50 членаў і кандыдатаў у члены партыі. Нягледзячы на тое, што членства ў партыі ў гады акупацыі пагражала смерцю, партыйныя і камсамольскія арганізацыі папаўняліся. Аб гэтым сведчаць даныя аб прыёме ў партыю і камсамол. Халопеніцкі райком партыі, напрыклад, прыняў у члены партыі за 1943 г. і 1-ю палову 1944 г. 63 чалавекі, райком камсамола — 99 чалавек.

Да канца 1943 г. ў брыгадзе імя Кірава налічвалася 106 камуністаў, 8-й Круглянскай — 70, у атрадзе «Гвардзеец» брыгады імя Панамарэнка — 60. У г.п. Халопенічы, в. Вялікае Восава, Запруддзе, Шчаўры, Старая Слабада, Шынкі, Якімаўка і іншых існавалі падпольныя партыйныя і камсамольскія групы. Члены падпольных груп праводзілі растлумачальную работу, распаўсюджвалі лістоўкі, збіралі для партызан зброю, разведданыя, арганізоўвалі дыверсіі. Толькі вясной 1943 г. членамі райкомаў партыі і камсамола, падпольных груп, згодна з інфармацыяй у Беларускі штаб партызанскага руху, на тэрыторыі раёна праведзена 113 сходаў у 35 вёсках, распаўсюджана каля 4 тыс. лістовак і зваротаў, зводак Саўінфармбюро. 20 лютага 1943 г. быў створаны друкаваны орган Халопеніцкага падпольнага райкома партыі і партызанскай брыгады імя Кірава — газета «Красное

УДОСТОВЕРЕНИЕ

Выдано Шалаку Петру Савельевичу

в том, что он (она) действительно является членом бюро Халопенического подпольного РК ЛКСМБ. Что и удостоверяется.

Халопенический подпольный РК ЛКСМБ

1 марта 1944 г.

Секретарь Халопенического подпольного РК ЛКСМБ (ПЫСКИН).

Пасведчанне члена бюро Халопеніцкага падпольнага РК ЛКСМБ П.С.Шалака.

І. В. Букач.

В. А. Захарэвіч

знамя». Шрыфты для падпольнай друкарні даставілі члены падпольнай групы г.п. Халопенічы, якой кіраваў С. Пласконны. Яны сабралі шрыфты на месцы разгромленай фашыстамі раённай друкарні. Рэдактарам газеты быў спачатку Міхаіл Прохаравіч Петухоў, а затым Васіль Аляксандравіч Захарэвіч.

Была зроблена спроба выпускаць газету «Камуністычны шлях» — орган Крупскага райкома партыі, якую рэдагаваў сакратар падпольнага райкома камсамола Іван Букач. Але выйшлі толькі некалькі асобных нумароў, бо ўласнай друкарні не было, а выпускалася газета то ў брыгадзе «Стары», якая дзейнічала ў Барысаўскім раёне, то ў брыгадзе «Чэкіст» Г. А. Кірпіча.

Выходзіла таксама газета «Партызанскі шлях» — орган Круглянскага райкома партыі. Яна распаўсюджвалася сярод жыхароў раёна і, апрача звестак з Вялікай зямлі, асвятляла таксама падзеі барацьбы супраць акупантаў на месцы, у тым ліку і ў Крупскім раёне. Цяжкай і небяспечнай была дзейнасць падпольшчыкаў. Шмат хто загінуў у гэтай барацьбе, не скарыўся ворагу, не выдаў таварышаў.

Глыбокай пашаны і ўдзячнасці, вечнай памяці заслугоўвае дзейнасць соцень сувязных, якія рызыкуючы сваім жыццём, падтрымлівалі непасрэдную сувязь з партызанамі, выконвалі іх даручэнні. У спалучэнні дзейнасці партызанскіх атрадаў, партыйных і камсамольскіх груп і шматлікай арміі партызанскага рэзерву і памочнікаў разгаралася полымя барацьбы на Крупшчыне.

Да сённяшняга часу яшчэ не адноўлена карціна дзейнасці падполля ў г.п. Крупкі, бо амаль усе члены гэтай арганізацыі былі расстраляны. Вядома (гэта адзначаецца таксама і ў нямецкіх архівах), што ўзначальвалі Крупскае падполле Р. Пятрайціс, былы настаўнік Асінаўскай школы, і Імшанецкі, якія працавалі ў раённай управе. Актыўна дзейнічала група медыцынскіх работнікаў, якой кіраваў загадчык райздраўаддзела ўправы Арсен Андрэевіч Чайкін. У яе ўваходзілі С. Д. Філонаў, Георгій Буракоў, М. Шаўчэнка, В. Шчамялёва. Яны забяспечвалі партызан медыкаментамі, лячылі хворых і параненых. Сувязнымі паміж Крупскім падполлем і партызанамі былі браты Мікалай і Іосіф Ясінскія. Яны былі арыштаваны ў чэрвені 1942 г. і загінулі ў Крупскай турме. А праз год зверскі замучана і жонка Мікалая Еўдакія. На яе была спушчана аўчарка, якая загрызла жанчыну.

У групу Пятрайціса ўваходзілі таксама Міхаіл Ізмайлоўіч, які працаваў намеснікам раённага бургамістра, Пётр Васілевіч Ціханаў (да вайны старшыня Крупскага мястэчкавага

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

Смерть немецким оккупантам!

Выходит с 1 мая 1942 г.

Орган Холопеничского РК КП(б)Б и 11-ской партизанской бригады

№ 21

26 Мая 1943 г.

КРАСНОЕ ЗНАМЯ

НОВЫЙ ОБВИНИТЕЛЬНЫЙ АКТ

(Из ноты Народного Комиссара Иностранных Дел т-ща В. М. Молотова)

Народный Комиссар Иностранных Дел товарищ В. М. Молотов направил 22 мая сего года всем послам и посланникам стран, с которыми СССР имеет дипломатические

Захваченные Красной армией в штабах разгромленных немецко-фашистских войск документы, в числе рассказы и письма советских людей,

следует использовать для Германии...". Это является ли они соответствующих властей и тайной полиции" (Продолжение нот-ры с к-рой можно ознакомиться в газете № 4 (274) 41 колхозе

Смерть немецким оккупантам!

ПАРТИЗАНСКИЙ ПУТЬ

Орган Круглянского подпольного РК КПБ(б)

№ 4 | Подпольное 21 ноября 1943 г.

ВО-ЗЕТИК, СОВЕТСКОЙ БЕЛОРУССИИ

НА ФРОНТАХ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

Смерть немецким оккупантам!

Народный МСТИТЕЛЬ

Еженедельная газета Белорусского партизан

№ 8(10) | Вторник, 2 февраля 1943 года | Год издания 2-й

ВЕЛИЧАЙШАЯ ПОБЕДА

НА ФРОНТАХ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

Газеты, якія распаўсюджваліся ў гады Айчыннай вайны на тэрыторыі Крупскага раёна.

В. Ф. Дробат.

Савета), Фёдар Сяднёў (былы старшыня калгаса), Ф. Цюхлоў, П. В. Вашчанка з в. Бярозка і інш. Як адзначалася ў пратаколе допыту, «Вашчанка меў добрыя ўзаемаадносіны з былым начальнікам сельскагаспадарчай камендатуры Імшанецкім, які затым быў выкрыты як кіраўнік бальшавіцкай падпольнай арганізацыі. Разам з былым бургамістрам Стараслабадской воласці Сяргеем Цітаўцом ён аказаў бандытам «усямерную дапамогу». Як бачна з гэтага нямецкага дакумента, карыстаючыся службовым становішчам, Імшанецкі мог свабодна перамяшчацца па раёне, дзякуючы гэтаму ён стварыў разгалінаваную сетку падполля. Фёдар Цюхлоў па даручэнні падполля ў пачатку 1942 г. арганізаваў дыверсію на лесапільным заводзе ў Крупках, у выніку чаго быў поўнасцю спалены цэх. У 1943 г. пры паўторнай спробе правесці дыверсію ён быў схоплены з узрыўчаткай і расстраляны. Былі таксама арыштаваны і расстраляны Пятрайціс, Імшанецкі, Чайкін, Ціханаў, Буракоў і іншыя члены падпольнай арганізацыі.

Як адзначалася ў нямецкіх дакументах, сувязь з партызанамі меў Іван Будкін, паліцэйскі з г.п. Крупкі. Потым ён пайшоў у лес, захапіўшы з сабой кулямёт. На чыгуначнай станцыі Бобр дзейнічала група на чале з Георгіем Якублеевічам. У яе склад ўваходзілі таксама Юліян Кржачкоўскі і Васіль Данілаў. Такая ж група дзейнічала на чыгуначнай станцыі Крупкі. У в. Скакоўка сувязным быў Г. А. Чэркас, у в. Красноўка — В. Р. Бязмозгая, сакратар сельскагаспадарчай абшчыны і М. Гармазінская, паспартыстка, у в. Малы Вязок — Ф. В. Кляшчонак, у в. Еленка — Бараўцоў.

У г.п. Халопенічы падпольную групу ўзначальваў С. Пласконны. У яе ўваходзілі Багданоў, Раманаў, Масько, а таксама В. Дробат і Пётр Кісялёў з Халопеніцкай бальніцы. Падпольшчыкі праводзілі значную работу па зборы разведданых для партызан. Акрамя таго, яны ўзарвалі ў Халопенічах кабінет начальніка паліцыі, хлебапякарню. Урачы В. Ф. Дробат, С. Шэўка, П. Кісялёў, якія працавалі ў Халопеніцкай бальніцы, забяспечвалі партызан медыкаментамі. 30 кастрычніка 1943 г. С. Пласконны быў арыштаваны, але па дарозе ў Мінск уцёк і далей працягваў барацьбу ў партызанскім атрадзе. Сакратаром падпольнай арганізацыі стаў Рыгор Рыгоравіч Ткачэнка.

Паднольныя групы дзейнічалі таксама ў в. Вялікае Восава, Шчаўры і інш. У в. Хацюхова, Версанка, Якімаўка, Запруддзе, Абчуга, Лютыя, Падбярэззе, Прудок, Старая Слабада і інш. дзейнічалі маладзёжныя групы.

Акрамя збору разведданых, агітацыйнай і дыверсійнай работы падпольшчыкі і сувязныя нямала зрабілі для пераводу часткі паліцэйскіх гарнізонаў на бок партызан. Такім чынам праз начальніка дзянісавіцкай паліцыі М. Сокалава была наладжана сувязь з паліцэйскімі ў в. Дзянісавічы, у выніку чаго затым быў створаны асобны партызанскі атрад на чале з М. Сокалавым. З дапамогай былога паліцэйскага С. Толкача ў партызанскі атрад была выведзена група паліцэйскіх з в. Пярэсіка. Таксама былі выведзены групы паліцэйскіх з в. Неманіца, часткова — з в. Хацюхова. Яны затым уключыліся ў партызанскую барацьбу. Паліцэйскія апорнага пункта Сакалавічы на чале са сваім камандзірам А. Ігнатовічам, перш чым перайсці да партызан, 20.8.1943 г. ўзарвалі артскамендатуру ў г.п. Крупкі. Растлумачальная і падрыхтоўчая работа была праведзена сярод паліцэйскіх у в. Радзіца. Але фашысты даведаліся аб плануемым пераходзе іх на бок партызан і 25 чэрвеня 1943 г. расстралялі 19 чалавек. Была выкрыта фашыстамі і аперацыя па пераходзе на бок партызан паліцэйскіх апорнага пункта ў в. Ухвала. Яе рыхтавалі падпольшчыкі в. Старая Слабада на чале з іх кіраўніком К. Рыбачонкам. Праз паліцэйскіх В. Дзеравянка, М. Мазынскага, М. Мацуру, Ф. Іванова была наладжана сувязь. Было вырашана знішчыць немцаў і начальніка апорнага пункта і затым перайсці да партызан. Але немцы даведаліся аб гэтым і 20.7.1943 г. перавялі гарнізон в. Ухвала ў Крупкі, дзе паліцэйскія былі перададзены ў гестапа. Таксама была схоплена і адпраўлена ў гестапа жыхарка в. Ухвала А. Супрукова, якая была сувязной паміж К. Рыбачонкам і паліцэйскімі Ухвальскага апорнага пункта.

Актыўную работу па зборы разведданых, распаўсюджванні зводак Саўінфармбюро праводзіла падпольная маладзёжная група з в. Тапарышча і Лютыя на чале з Н. Н. Бераснёвай. Патрыёты таксама працавалі сярод паліцэйскіх лютаўскага апорнага пункта. Праз камандзіра атрада паліцэйскіх М. І. Лазарэвіча, агранома Абчугскай воласці Хмялеўскага, сувязную з в. Лагі А. Б. Мазурыну яны рыхтавалі пераход паліцэйскіх на бок партызан. Усе ўдзельнікі аперацыі былі расстраляны. Пазней былі схоплены і адпраўлены ў гестапа і члены падпольнай групы Н. Н. Бераснёвай з в. Лютыя, Ніна Савельеўна Лазарэвіч з в. Харытанцы, Міхаіл Антонавіч Папоў з в. Лютыя, Марыя Васілеўна Маскалёва, Ганна Дзям'янаўна Маскалёва, Ганна Ісакаўна Барсукова з в. Тапарышча.

Многія з патрыётаў не дажылі да Дня перамогі. Зажыва спалены ў Крупках кіраўнік падпольнай групы Надзея Апет з в. Запруддзе, Пётр Кісялёў з г.п. Халопенічы, сувязныя з в. Скакоўка М.М. Ладзік, У.С. Храмы. Разарваны сабакамі падпольшчыкі з Крупак Р.П. Цюхло і яго жонка С. П. Цюхло.

Дз. М. Хромчанка.

* * *

У самым пачатку Вялікай Айчыннай вайны пачыналі баявую дзейнасць у крупскіх лясах Героі Савецкага Саюза А.П. Брынскі, Р.М. Лінькоў, В.В. Шчарбіна.

Атрад А.П. Брынскага быў створаны ў чэрвені 1941 г. з ліку байцоў аператыўнай групы генерала І.В. Болдзіна, у той час намесніка камандуючага войскамі Заходняй асобай ваеннай акругі. Вось што ўспамінае пра тыя дні сам А. Брынскі: «Вечарам мяне вызвалі ў штаб, які знаходзіўся ў лесе паміж в. Белае і Навасёлкі, каля Мінска.

А.П.Брынскі.

В.В.Шчарбіна.

У размяшчэнні штаба — палаткі, наспех выкапаныя бамбасховішчы, сталы проста пад адкрытым небам, каля іх афіцэры з нейкімі паперамі, пасыльныя, строгія вартавыя, крыху збоку — канавязь, а ў глыбіні — замаскіраваны галінкамі асабісты танк генерала Болдзіна...

Выклікалі па аднаму. Вось нарэшце і я падыходжу да стала, за якім сядзіць знаёмы ўжо мне палкоўнік са штаба акругі. Перад ім палявая сумка, паперы. Строга паглядзеў на мяне і, бьщцам настаўнік, спытаў:

— Як вы адносіцеся да нашай прапановы — перайсці да партызанскіх метадаў барацьбы?

Я збянтэжыўся. А ён працягваў:

— Вы павінны будзеце падабраць сабе 15—20 чалавек, надзейных, вы ведаеце, каго — і выйсці ў раён... Ён загляну ў свае паперы і закончыў — на паўночны захад ад Мінска».

Па дарозе да месца дыслакацыі (каля воз. Сялява) 12 ліпеня да групы А. П. Брынскага

Група падрыўнікоў атрада А.П.Брынскага.

далучылася другая група на чале з Куліковым. Недзе ў жніўні да атрада далучылася група, арганізаваная былым старшынёй калгаса Ц. Я. Ермаловічам, а неўзабаве адбылася сустрэча з разведчыкам Галоўнага разведупраўлення Генеральнага штаба Чырвонай Арміі В. В. Шчарбінай.

Адной з першых буйных аперацый аб'яднаных партызанскіх атрадаў і груп з'явілася нападзенне на нямецкі гарнізон у мястэчку Халопенічы. Па некаторых звестках, акрамя названых, у аперацыі ўдзельнічала партызанская група У.А. Яраша.

Фашысты не пакінулі беспакарана дзёрзкія дзеянні партызан. Для ліквідацыі атрадаў, якія дзейнічалі каля Халопеніч і Чашнікаў, былі накіраваны трэці батальён 345-га палка 286-й ахоўнай дывізіі, 317-ы паліцэйскі полк, падраздзяленні тайнай палявой паліцыі, якія ў час так званай аперацыі расстралялі 185 чалавек, у большасці мірных жыхароў навакольных вёсак. Гэта была першая карная экспедыцыя гітлераўцаў на тэрыторыі Крупскага раёна.

А. П. Брынскі ў гэты час знаходзіўся на заданні ў Сенненскім раёне. Калі ён разам з папаўненнем прыбыў да месца былога размяшчэння атрада, то даведаўся, што асноўная частка партызан на чале з В. В. Шчарбінай выйшла з акружэння і працягвала барацьбу, другая накіравалася на ўсход з надзеяй перайсці лінію фронту і далучыцца да Чырвонай Арміі. Некаторыя разбрыліся па вёсках. На месцы засталіся невялікая група Кулікова, значна парадзеўшы ўзвод Немава.

Праз нейкі час атрад А. П. Брынскага далучыўся да разведвальна-дыверсійнай групы штаба Заходняга фронту Р. М. Лінькова, або, як яго называлі партызаны, — Баці.

Калі партызаны А. Брынскага з'явіліся ў лагеры дэсантнікаў, яны былі прыемна ўражаны наладжанай, нібы ў вайсковым падраздзяленні, дысцыплінай.

Баця ў самым пачатку размовы спытаў:

— Што ў вас за людзі? Такія ж, як у Шчарбіны?

Я зразумеў, што гэта пытанне датычыцца дысцыпліны і некалькі збянтэжыўся.

— Такія ж, але і лепшыя ёсць.

Тады ён расказаў пра сустрэчу з байцамі Шчарбіны. Баця быў адзін, і партызаны палічылі яго за шпіёна, хацелі расстраляць без загаду камандзіра, адабралі маўзер і наогул вялі сябе недапушчальна.

Адразу ж пасля зліцця атрадаў былі размеркаваны абавязкі. Р. М. Лінькоў стаў камандзірам першага беларускага партызанскага атрада асобага прызначэння, А. П. Брынскі — яго намеснікам, Дзмітрый Клімах — камісарам, Архіпаў — начальнікам штаба.

Неардынарнымі, на думку партызанаў, былі першыя дзеянні новага партызанскага камандзіра. У вёсках, спачатку Халопеніцкага, потым і суседніх з ім раёнаў, Баця пачаў ствараць атрады народнага апалчэння. Пра гэта сведчаць першыя загады штаба атрада.

Адначасова са стварэннем атрадаў народнага апалчэння пачаў стварацца і «ваенкамат» пры атрадзе, які займаўся ўлікам акружэнцаў, ваеннаабавязаных, прыцягненнем іх да падпольнай і партызанскай дзейнасці. Вялікае значэнне надаваў Р. М. Лінькоў аб'яднанню ўжо існаваўшых партызанскіх атрадаў у больш буйныя баявыя адзінкі і падпарадкаванню іх агульнаму камандаванню.

З цягам часу да атрада Баці далучыліся таксама групы Басманава, Кузіна, Воранава, А. Мядзведзева, В. Папова. Некаторыя з іх мелі ўжо на сваім разліку ўдала праведзеныя баявыя аперацыі. Так, група Ермаловіча да аб'яднання з атрадам Лінькова 28 жніўня 1941 г. зрабіла засаду на дарозе Халопеніч—Лісічына. У час бою былі знішчаны 2 аўтамашыны, забіта 6 гітлераўцаў, захоплена зброя і іншыя трафеі. Праўда, праз некалькі дзён група панесла значныя страты. З 25 партызан у жывых засталося толькі 12, баявая дзейнасць яе значна аслабла. Але пасля злучэння з атрадам Баці актыўнасць партызан зноў узрасла. У пачатку 1942 г. група Ермаловіча здолела ўзарваць мост цераз р. Эса паміж мяст. Халопенічы і в. Лісічына, разграміла маслазавод, правяла некалькі дыверсій на чыгункі Масква—Мінск.

Пасля аб'яднання атрадаў асаблівую ўвагу Лінькоў звярнуў на стварэнне сеткі падпольных груп у сваёй зоне дзейнасці, устанаўленню сувязей з падпольнымі арганізацыямі Оршы, Талачына, Крупак, Барысава. З гэтай мэтай 5 студзеня, 11 і 29 сакавіка ім былі праведзены нарады прадстаўнікоў падпольных груп і камандзіраў народнага апалчэння Чашніцкага, Крупскага, Халопеніцкага і Лепельскага раёнаў. Вядома, што такія нарады праводзіліся ў в. Ліпавец.

Дзейнасць партызан была б значна большай, лічыў Р. М. Лінькоў, калі б мелася пастаянная сувязь з Масквой. Справа ў тым, што пры дэсантаванні дзесьці ў раёне воз. Сялява загінуў радыст, у якога быў шыфр для сувязі з цэнтрам. У выніку партызаны маглі толькі прымаць звесткі з Вялікай Зямлі, перадаваць разведданыя было нельга.

Для ўстанаўлення сувязі са штабам Заходняга фронту Лінькоў пасылаў адну за другой тры групы партызан, але дабрацца да Масквы ўдалося толькі маёру Дзіканаву і В. В. Шчарбіну.

25 сакавіка 1942 г. В. В. Шчарбіна на чале групы з 5 чалавек быў дэсантаваны ў раён дзеяння атрадаў Лінькова. У групе быў радыст, дэсантнікі мелі з сабой рацыю, 400 кг толу. Акрамя таго, пасланцы прывезлі загад аб перадыслакацыі разведвальна-дыверсійных атрадаў Баці ў Заходнюю Беларусь. На месцы дыслакацыі заставаўся падышоўшы ў гэты час атрад Канстанціна Заслонава. Яму перадаваліся ў падпарадкаванне атрады Ермаловіча, Бутэнкі, а таксама ўся гаспадарчая база, падпольная сетка, атрады народнага апалчэння.

Потым з атрадаў Р. М. Лінькова выраслі тры буйныя партызанскія злучэнні. Напрыклад, злучэнне партызанскіх атрадаў пад камандаваннем В. В. Шчарбіны, якое дзейнічала ў раёне Налібоцкай пушчы, да верасня 1942 г. знішчыла 11 мастоў, самалёт, правяла 25 дыверсій на чыгункі. 23 верасня 1942 г. пры правядзенні заняткаў з падрыўнікамі ў руках камандзіра злучэння Шчарбіны ўзарвалася міна. *М. А. Баравуля.*

Яны былі першымі

Памятаю, у дзяцінстве нас, хлапчукоў, вельмі вабілі шматлікія легендарныя апавяданні пра вайну, якія мы чулі ад дарослых. Адна з такіх гісторый засталася ў памяці назаўсёды. Пачуў я яе ад былога партызана Івана Іванавіча Сіняка, свайго дзядзькі. Вось яна:

«Немцы ў пачатку вайны на пасаду лесніковай бралі толькі тых людзей, якія пры савецкай уладзе не хацелі ісці ў калгасы. Гэтыя людзі павінны былі не толькі назіраць за нарыхтоўкай лесу, але і даносіць пра з'яўленне незнаёмых людзей у абходзе.

Снег у 1941 г. выпаў вельмі рана, яшчэ перад восеньскімі Дзядамі. Аднойчы ляснік з в. Бялавічы ўзяў стрэльбу, спусціў сабаку і вырашыў прайсціся па лесе, там, дзе ляжалі складні дроў, якія не паспелі вывезці перад вайной. Ужо на падыходзе да іх ён пачуў пах дыму, а пасля ўбачыў і чалавечыя сляды. Асцярожна пайшоў па іх, але яго выдаў брэх сабакі. Так ён трапіў у рукі партызан. Калі партызаны даведаліся, хто ён, хацелі адразу расстраляць, але пашкадавалі. Ляснік кляўся, што нікому на раскажа пра іх, абяцаў дапамагаць. Партызаны паверылі, адпусцілі, але ляснік дома расказаў пра сустрэчу свайму брату, старасце з в. Бялавічы, пасля чутка разнеслася далей...

На восеньскія Дзяды немцы і мясцовыя паліцэйскія вырашылі зрабіць аблаву на партызан. У напрамку да в. Гібайлавічы (зараз в. Знаменская) накіраваліся дзве машыны карнікаў, такія ж атрады зайшлі і з боку в. Харчычы, Дзевяніца. Бой працягваўся амаль цэлы дзень, бо партызаны са штабялёў дроў на ўсялякі выпадак выклалі байніцы, атрымалася нешта накшталт крэпасці.

Але да цемры ўсё было скончана. Назад паліцэйскія і немцы вярталіся не зусім вясёлыя, яны везлі з сабою два трупы: старасты і паліцэйскага, а таксама дзяўчыну ў ваеннай форме, якую ўзялі ў палон. Пасля допытаў дзяўчыну расстралялі на дарозе Міхеевічы—Рудня, на ўзвышшы. Расказвалі, што ў баі загінулі тры партызаны, у тым ліку камандзір. Паліцэйскія хваліліся, што гэта быў сам маршал Кулік. Гаварылі таксама, што старасту з в. Бабінічы забіў у час бою нехта са сваіх, бо разрыўная куля трапіла яму ў спіну. Называлі і імя мсціўцы: бургамістр з в. Дзмітравічы, які да вайны працаваў міліцыянерам».

Магчыма, з цягам часу я забыў бы гэты эпізод, калі б не стаў працаваць настаўнікам. У 1971 г. ў Гумнаўскай васьмігодцы быў створаны гурток чырвоных следапытаў. У асобным сшытку я пачаў запісваць успаміны сваіх землякоў пра вайну. У той час упершыню пачуў, што першы партызанскі атрад у нашай мясцовасці быў створаны з групы, якой кіраваў чэкіст Васілеўскі. Аднак амаль 10 гадоў мне не ўдавалася «напасці на след» былых партызан, якія асабіста ведалі б гэтага чалавека, хаця б яго імя ці імя па бацьку.

У 1979 г., калі я ўжо працаваў дырэктарам школы ў в. Старая Слабада, мне пазваніў па тэлефоне настаўнік Ухвальскай сярэдняй школы В. А. Радкевіч і паведаміў, што ў школу прыязджаў былы партызан з атрада Васілеўскага і хацеў даведацца пра лёс сваіх таварышаў. Гэта быў Іван Восіпавіч Бранавіцкі, жыхар г. Барысаў.

Летам наступнага года мы сустрэліся з ім у г. Барысаў. Вось што ён расказаў: «У пачатку ліпеня 1941 г. пачалося фарміраванне партызанскіх груп для адпраўкі іх за лінію фронту. У гэтыя групы бралі толькі добраахвотнікаў. Адну з груп даручалася сфарміраваць начальніку абласнога ўпраўлення НКУС Арцёму Яўгенавічу Васілеўскаму, якога я добра ведаў па сумеснай рабоце.

Узброена група была дрэнна, бо фарміравалася ў спешцы. Нас накіравалі ў тыл ворага нават з партыйнымі дакументамі, у чэкісцкай форме, мы не мелі ніякага ўяўлення аб метадах вядзення партызанскай вайны.

Калі мы дабраліся да месца дыслакацыі — в. Дзевяніца, Сомры, Гібайлавічы, пачалі наладжваць сувязь з мясцовымі партыйнымі і савецкімі актывістамі. Памятаю, вельмі доўга шукалі старшыню Ухвальскага сельсавета, але так і не знайшлі.

Людзі, асабліва ў Гібайлавічах, адносіліся да нас з недаверам, а некаторыя нават і варожа. Мы нярэдка галадалі, але праводзіць рэквізіцыі прадуктаў у насельніцтва камандзір нам строга забараніў. Калі адмаўлялі, ішлі далей...

Спачатку баявых дзеянняў не вялі, займаліся толькі разведкай і стварэннем падпольных груп у зоне дыслакацыі. Мы настойліва звярталіся да Васілеўскага з просьбай даць дазвол на правядзенне баявой аперацыі, а ён адказваў: «Рана яшчэ. Мы знаходзімся ў прыфрантавой зоне. Скажам сваё слова потым».

Мы і ўявіць сабе тады не маглі, на якім аддаленні знаходзіўся фронт. Хутка высветлілася, што наша разведка з-за адсутнасці рацыі і радыста карысці не прыносіла. Таму вырашылі ў першую чаргу наладзіць сувязь з Масквой. Васілеўскі накіраваў за лінію фронту мяне, як аднаго з найбольш надзейных, на яго погляд, людзей. Каля Невеля мяне схапілі і адправілі ў лагер для ваеннапалонных».

На гэтым перарвем успаміны І. В. Бранавіцкага. Спытаўшы на сабе ўсе лагерныя жахі, ён уцёк з палону, перайшоў лінію фронту, а потым зноў быў накіраваны ў тыл начальнікам асобнага аддзела брыгады «Стары».

У канцы гутаркі Бранавіцкі адзначыў, што дачка і жонка Васілеўскага жывуць у Мінску, але дакладнага адраса не паведаміў...

Разам са школьнікамі, чырвонымі следапытамі, мы вырашылі правесці паход па мясцінах, дзе мясцовыя жыхары маглі што-небудзь успомніць пра Васілеўскага. Але акрамя таго, што каля в. Сомры фашысты расстралялі камуністаў Сцяпана Антонавіча і Барыса Сцяпанавіча Алексіевічаў, якія падазраваліся ў сувязі з партызанамі, ад тутэйшых жыхароў мы больш нічога не даведаліся. Як потым высветлілася, усіх жыхароў вёскі старэйшага пакалення — 180 чалавек — карнікі расстралялі 18 лістапада 1942 г., некаторыя загінулі ў партызанах.

Жыхар жа в. Міхеевічы Барыс Уладзіміравіч Мельнік запэўніў нас, што ў баі каля в. Гібайлавічы не ўсе партызаны загінулі, частка выратавалася. «Акружылі дэсантнікаў. Начальніка іх забілі, а партызаны вырваліся з акружэння... І вось увечары, калі добра сцямнела, у дзверы пастукалі. Адзін зайшоў у хату, другі застаўся на вуліцы за вартавога. Аказваецца, іх прыйшло ў в. Міхеевічы каля 20 чалавек. Ва ўсіх рэмні цераз плечы. Абсушыліся, а раніцай я завёў іх на астравы. Вось гэта група і арганізоўвала партызанскі рух у 1942 г.»

Неўзабаве прыйшло пісьмо ад былога кіраўніка партызанскага руху на Міншчыне Героя Савецкага Саюза Р. Н. Мачульскага з адрасам сям'і Васілеўскага, а восенню 1982 г. да нас прыехала і сама дачка. Перад гэтым пасля шматлікіх запытаў прыйшоў адказ з архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі, дзе захаваліся пэўныя звесткі пра Васілеўскага. Вось вытрымкі з яго:

«У пачатку Вялікай Айчыннай вайны Васілеўскі А. Я. з групай супрацоўнікаў у колькасці 21 чалавек быў пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці. Да 18 ліпеня 1941 г. ў сувязі з неспрыяльнымі абставінамі, якія склаліся ў той час у тыле ворага, 17 чалавек з гэтай групы былі ім накіраваны за лінію фронту ў тыл Чырвонай Арміі.

Васілеўскі А. Я. і тры яго супрацоўнікі ў той час заставаліся на тэрыторыі Крупскага і Бярэзінскага раёнаў. Абставіны смерці Васілеўскага А. Я., месца яго пахавання і прозвішчы супрацоўнікаў, што знаходзіліся з ім, у нас адсутнічаюць...

Начальнік аддзела КДБ БССР
подпіс »

Праз некалькі дзён пасля атрымання гэтых звестак мне давялося быць па службовых справах у в. Ухвала, дзе я сустрэўся з Віктарам Ульянавічам Фуфтам, даглядчыкам жывёлы мясцовай фермы, які расказаў наступнае:

«У 1941 г. мой бацька быў звязаны з дзвюма групамі партызан. Адна з іх размяшчалася

ва ўрочышчы Пухаўшчына, што паміж Гібайлавічамі і Бялавічамі, а другая — ва ўрочышчы Даўжэц (паміж вёскамі Гібайлавічы і Дзевяніца).

Партызан з першай групы я не бачыў. Ведаю толькі, што перад святам Кастрычніка загінуў іх камандзір і два байцы, астатнія адышлі ў невядомым напрамку. Паліцэйскія з Бярэзінскага р-на захапілі ў гэтым баі радыстку з рацыяй, але і самі панеслі страты. Труп камандзіра карнікі павезлі з сабою, а байцы так і засталіся ляжаць на полі бою, у складнях дроў.

Пра другую групу, што стаяла каля в. Даўжэц, ведаю значна больш, нават быў знаёмы з адным партызанам — Дзмітрыем Міхайлавічам Чыгіным, ураджэнцам Пензенскай вобл., былым начальнікам НКДБ Заходняй Беларусі. Пад псеўданімам Міхаіл Дзмітрыевіч Каласноў ён быў пакінуты ў в. Гібайлавічы сувязным пад выглядам акружэнца, які прыстаў у прымы да мясцовай жанчыны. Чыгін адпусціў бараду, апранаўся, як сельскі жыхар, у лапці, ва ўсё даматканае, і майстар быў на ўсе рукі. Ад яго цягнуліся нітачкі да лесу і Ухвальскага гарнізона».

Пазней Чыгін кіраваў асобным аддзелам 8-й Круглянскай брыгады. Загінуў ён у канцы ліпеня 1943 г. ў час няўдалага налёту на Дубаўскі гарнізон.

Крыху больш звестак пра групу Васілеўскага мы атрымалі з выпіскі аднаго дакумента, з якой пазнаёміла нас дачка Васілеўскага:

«1 ліпеня 1941 г. ў г. Чэрвень прыбыў капітан дзяржаўнай бяспекі Васілеўскі з атрадам, які налічваў 100 чалавек... Асабовы склад атрада быў расстаўлены на шасэ Чэрвень—Беразіно з мэтай падтрымання парадку, а таксама ў раёне, які прылягаў да яго. Аказваў таксама дапамогу камандаванню 100-й дывізіі і корпусу генерала Нікіціна.

2 ліпеня атрад Васілеўскага прыняў бой на р. Бярэзіна (мяст. Беразіно) сумесна з часцямі 100-й стралковай дывізіі супраць танкавага дэсанта праціўніка, які прарваўся ў гэтым напрамку. 4 ліпеня Васілеўскі пакінуў з сабою 19 чалавек для вядзення партызанскай барацьбы. 5 ліпеня 1941 г. атрад Васілеўскага і атрад Зайцава на дзвюх аўтамашынах выехалі на захад ад мяст. Бялынічы, у лес, што каля в. Дзевяніца, Буднікі, Сомры, Забалоцце, Заазер'е... Дзякуючы мясцовым жыхарам змянілі форму на цывільнае адзенне, пачалі весці разведку мясцовасці, падбіраць месца для лагера. 10 ліпеня (магчыма, жніўня. — М. Б.) Васілеўскі накіраваў для сувязі з Наркаматам групу з 7 чалавек, праз тыдзень з гэтай мэтай яшчэ 7 чалавек. Група Васілеўскага сумесна з групай Зайцава стварыла за гэты час 7 партызанскіх груп, якія былі ўзброены за кошт знойдзенай на месцах баёў зброі. У жніўні і верасні не адзін раз праводзіліся карныя аперацыі супраць партызан, але яны паспявалі пакідаць небяспечныя зоны, бо іх заўсёды своечасова папярэджвала насельніцтва. 10 верасня група Васілеўскага пакінула лагер. 14 верасня разведка партызанскага атрада Зайцава ўстанавіла, што група прарвала акружэнне, і толькі адзін чалавек быў лёгка паранены ў руку. Было гэта каля в. Барсукі...»

М. А. Баравуля.

А.Я.Васілеўскі.

Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Круглянскага раёна

8-я КРУГЛЯНСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА

Створана ў сярэдзіне чэрвеня 1942 г.

Складвалася ў ходзе сумесных баёў партызанскіх атрадаў С. Г. Жуніна (Сяргея), Д. А. Кулікова, Г. С. Місніка і асобных груп, якія дзейнічалі ў Круглянскім і сумежных з ім раёнах з вясны 1942 г. Летам 1942 г. штабам Заходняга фронту ў раён базіравання атрадаў дэсантавана арганізатарская група на чале з А. А. Маршчыніным (Дзядзя Саша), якая аб'яднала іх у чэрвені 1942 г. пад сваім

І.Г.Ільін.

кіраўніцтвам. Створаная групоўка называлася па-рознаму: «Аб'яднанне атрадаў Дзядзі Сашы» з чэрвеня 1942 г «Аб'яднаныя атрады Барысаўскага аператыўнага цэнтра» (з кастрычніка). Пастановай Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б у красавіку 1943 г. яна ўключана ў склад Магілёўскай (абласной) ваенна-аператыўнай групы як 8-я Круглянская брыгада.

У ліпені 1942 г. ў склад 8-й Круглянскай брыгады («Аб'яднання») уключаны атрад Гая (ён жа Антона), у жніўні — А. А. Цярноўскага (Сашкі); у кастрычніку ўліліся атрады А. С. Нікітчанкі, П. А. Красякова, якія адсталі ад асноўных сіл брыгады «Чэкіст» у час яе выхаду з блакады праціўніка, і асобны атрад А. А. Гурскага. Атрад А. А. Гурскага арганізаваны ў жніўні 1942 г. з ініцыятыўнай групы, выдзеленай атрадам Антона. У лістападзе 1942 г. расфарміраваны, а яго асабовы склад вернуты атраду Антона. Камандзір атрада — Гурскі Андрэй Антонавіч, камісар — Каўрыга Георгій Максімавіч, начальнік штаба — Каўрыга Аляксей Максімавіч.

31 кастрычніка 1942 г. ўсім атрадам брыгады прысвоены нумарныя абазначэнні: С. Г. Жуніна — 36-ы, Д. А. Кулікова — 8-ы, Г. С. Місніка — 24-ы, Антона Машчыцкага — 30-ы, А. А. Цярноўскага — 28-ы, А. С. Нікітчанкі — 12-ы, П. А. Красякова — 40-ы. У ліпені 1943 г. 40-ы атрад вернуты брыгадзе «Чэкіст».

Брыгада дзейнічала у Круглянскім, Шклоўскім, Бялыніцкім раёнах Магілёўскай і Крупскім раёне Мінскай абласцей. Загадам Магілёўскай (абласной) ваенна-аператыўнай групы 8-я Круглянская брыгада ў жніўні 1943 г. расфарміравана, а яе атрады перададзены Круглянскай ваенна-аператыўнай групе. На дзень расфарміравання брыгада складалася з 6 атрадаў агульнай колькасцю больш за 900 партызан.

Камандзіры брыгады: Маршчынін Аляксандр Аляксеевіч чэрвень 1942—кастрычнік 1942
Жунін Сяргей Георгіевіч
кастрычнік 1942 — жнівень 1943
Камісары: Смагін Дзмітрый Анісімавіч
чэрвень 1942 — чэрвень 1943
Сушкоў Мікалай Каліставіч
чэрвень 1943 — жнівень 1943
Начальнік штаба — Ільін Іван Гаўрылавіч
чэрвень 1942 — жнівень 1943

8-ы асобны атрад

Утвораны ў маі 1942 г. на базе групы І. В. Дзмітрыева — Д..А. Кулікова, якая дзейнічала з сакавіка ў Круглянскім раёне. З чэрвеня 1942 г. да жніўня 1943 г. ўваходзіў у склад 8-й Круглянскай брыгады, 11 жніўня 1943 г. перададзены Круглянскай Ваенна-аператыўнай групе (ВАГ). Да кастрычніка 1942 г. называўся атрад Д. А. Кулікова. Атрад дзейнічаў у Круглянскім раёне Магілёўскай, Талачынскім Віцебскай і Крупскім Мінскай абласцей. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі (29 чэрвеня 1944 г.) налічваў 565 партызан.

Камандзіры атрада: Кулікоў Дзмітрый Андрэевіч май 1942 — верасень 1943
Ільін Іван Гаўрылавіч
верасень 1943 — снежань 1943
Сакалоў Міхаіл Аляксеевіч
снежань 1943 — чэрвень 1944.
Камісары: Мацеж Канстанцін Іванавіч
май 1942 — жнівень 1942
Кавецкі Цімафей Нікітавіч
жнівень 1942 — верасень 1943
Навоеў Міхаіл Фёдаравіч
верасень 1943 — май 1944, загінуў
Старавойтаў Фёдар Савельевіч
май 1944 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Мацеж Канстанцін Іванавіч
жнівень 1942 — жнівень 1943
Пратасевіч Аляксандр Мікалаевіч
верасень 1943 — чэрвень 1944

24-ы асобны атрад

Створаны ў маі 1942 г. Спачатку дзейнічаў самастойна, з чэрвеня 1942 г. да жніўня 1943 г. — у складзе 8-й Круглянскай брыгады, затым перададзены Круглянскай ВАГ. Да 31 кастрычніка 1942 г. называўся атрадам Г. С. Місніка. Атрад дзейнічаў у Круглянскім раёне Магілёўскай, Крупскім Мінскай і Талачынскім Віцебскай абласцей. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі (29 чэрвеня 1944 г.) налічваў 313 партызан.

Камандзіры атрада: Міснік Георгій Сцяпанавіч май 1942 — жнівень 1943
Кадышаў Васіль Уладзіміравіч
жнівень 1943 — сакавік 1944
Зямкоў Пётр Васілевіч
сакавік 1944 — чэрвень 1944
Камісары: Старавойтаў Фёдар Савельевіч
чэрвень 1942 — жнівень 1942
Садоф'еў Мікалай Сцяпанавіч
жнівень 1942 — лістапад 1942, загінуў
Сушкоў Мікалай Каліставіч
снежань 1942 — ліпень 1943
Лупека Цімафей Міхайлавіч
ліпень 1943 — снежань 1943
Прыстромаў Іван Андрэевіч
снежань 1943 — сакавік 1944
Канавалаў Кандзід Фёдаравіч
сакавік 1944 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Лупека Цімафей Міхайлавіч
чэрвень 1942 — чэрвень 1943
Гарбуноў Анатоль Міхайлавіч
чэрвень 1943 — чэрвень 1944

28-ы асобны атрад

Сфарміраваны ў жніўні 1942 г. ў 8-й Круглянскай брыгадзе на базе ўзвода разведкі. З 11 жніўня 1943 г. ў складзе Круглянскай ВАГ. Да 31 кастрычніка 1942 г. называўся «Атрад Сашкі». Атрад дзейнічаў у Круглянскім раёне Магілёўскай, Крупскім Мінскай, Талачынскім Віцебскай абласцей. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі (29 чэрвеня 1944 г.) налічваў 502 партызаны.

Камандзіры атрада: Цярноўскі Аляксандр Аляксеевіч жнівень 1942 — ліпень 1943
Аляксандраў Ігар Пятровіч
ліпень 1943 — сакавік 1944, загінуў
Інякін Аляксей Андрэевіч
сакавік 1944 — чэрвень 1944
Камісары: Старавойтаў Фёдар Савельевіч
жнівень 1942 — май 1944
Кулікоў Дзмітрый Андрэевіч
май 1944 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Якаўлеў Аляксандр Максімавіч
жнівень 1942 — верасень 1942
Зямкоў Пётр Васілевіч
верасень 1942 — сакавік 1944
Кадышаў Васіль Уладзіміравіч
сакавік 1944 — чэрвень 1944

30-ы асобны атрад

У лютым 1942 г. ў воўкавіцкім лесе Талачынскага раёна Віцебскай вобласці пачалі дзейнічаць групы М. В. Дудкевіча, М. К. Сушкова, Г. М. Каўрыга. У маі 1942 г. яны аб'ядналіся ў атрад «Гая». У ліпені 1942 г. атрад перабазіраваўся ў Круглянскі раён і быў уключаны ў склад 8-й Круглянскай брыгады, 11 жніўня 1943 г. перададзены Круглянскай ВАГ. Да 31 кастрычніка 1942 г. называўся «Атрад Антона», затым — 30-ы. Атрад дзейнічаў у Круглянскім раёне Магілёўскай, Крупскім Мінскай і Талачынскім Віцебскай абласцей. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі (29 чэрвеня 1944 г.) налічваў 353 партызана.

Камандзіры атрада: Дудкевіч Мікалай Уладзіміравіч

Камандзір 28-га атрада 8-й Круглянскай брыгады А.А. Цярноўскі (першы рад, другі злева) сярод таварышаў.

май 1942 — жнівень 1942
Машчыцкі Антон Іванавіч
жнівень 1942 — ліпень 1944
Камісары: Сушкоў Мікалай Каліставіч
май 1942 — снежань 1942
Гурскі Андрэй Антонавіч
снежань 1942 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Каўрыга Георгій Максімавіч
май 1942 — жнівень 1942
Дудкевіч Мікалай Уладзіміравіч
жнівень 1942 — сакавік 1943
Травін Мікалай Мікалаевіч
красавік 1943 — верасень 1943
Стрыжэўскі Рыгор Аляксандравіч
верасень 1943 — студзень 1944
Поснікаў Дзмітрый Платонавіч
студзень 1944 — чэрвень 1944

Партызаны дзейнічалі на тэрыторыі раёна, наносілі ўдары па чыгункі Орша—Барысаў. 20.9.1942 г. разгромілі гарнізон у в. Дзянісавічы, у час карнай аперацыі «Карлсбад» вялі абарончы бой каля в. Сомры (16.11.1942).

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ С. М. КІРАВА

Створана ў снежні 1942 г. згодна рашэння міжпартцэнтра Барысаўскай зоны як камсамольска-маладзёжная брыгада на базе асобнага атрада імя С. М. Кірава. У складзе брыгады арганізаваны атрады імя М. В. Фрунзе, «За перамогу» і 4-ы. З красавіка 1943 г. ёй прысвоена імя С. М. Кірава. Брыгада дзейнічала ў Халопеніцкім і Барысаўскім раёнах.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. ў складзе 4 атрадаў агульнай колькасцю 771 партызан.

Камандзір брыгады: Пуставіт Фёдар Цярэнцьевіч
снежань 1942 — чэрвень 1944
Камісары: Панкевіч Ігнат Ігнатавіч
снежань 1942 — чэрвень 1943
Пасекаў Міхаіл Аляксеевіч
чэрвень 1943 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Сівакоў Павел Рыгоравіч
снежань 1942 — чэрвень 1943, в. а.
Шаркоў Васіль Антонавіч
чэрвень 1943 — сакавік 1944
Гамеза Аляксей Міхайлавіч
сакавік 1944 — чэрвень 1944

Атрад імя С. М. Кірава

Створаны ў жніўні 1942 г. па рашэнні ЦК КП(б)Б у савецкім тыле (47 чал.) і накіраваны ў Барысаўскі раён. Да 17 снежня 1942 г.

Ф.Ц.Пуставіт.

І.І.Панкевіч.

В.А.Шаркоў.

дзейнічаў самастойна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 233 партызаны.

Камандзіры атрада: Гамеза Аляксей Міхайлавіч
жнівень 1942 — сакавік 1944
Шаркоў Васіль Антонавіч
сакавік 1944 — чэрвень 1944
Камісары: Петухоў Міхаіл Прохаравіч
жнівень 1942 — сакавік 1943
Германаў Іван Пракопавіч
ліпень 1943 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Шаркоў Васіль Антонавіч
жнівень 1942 — чэрвень 1943
Трухан Іван Фёдаравіч
чэрвень 1943 — чэрвень 1944

Атрад імя М. В. Фрунзе

Створаны ў студзені 1943 г. з партызан, выдзеленых атрадам імя С. М. Кірава, і мясцовых жыхароў. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 208 партызан.

Камандзір атрада: Курсевіч Мікалай Мікалаевіч
студзень 1943 — чэрвень 1944

Камісары: Пасекаў Міхаіл Аляксеевіч
студзень 1943 — чэрвень 1943
Панкевіч Ігнат Ігнатавіч
чэрвень 1943 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Трухан Іван Фёдаравіч
студзень 1943 — сакавік 1943
Пераходзька Андрэй Канстанцінавіч
сакавік 1943 — красавік 1944, загінуў
Лапкоўскі Міхаіл Рыгоравіч
красавік 1944 — чэрвень 1944

Атрад «За перамогу»

Створаны 23 сакавіка 1943 г. на базе групы партызан (25 чал.), выдзеленай атрадам імя С. М. Кірава. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 152 партызаны.

Камандзір атрада: Краўчанка Аляксей Кірылавіч
сакавік 1943 — чэрвень 1944
Камісар: Галышаў Васіль Канстанцінавіч
чэрвень 1943 — чэрвень 1944
Начальнік штаба: Падабаеў Пётр Кузьміч
сакавік 1943 — чэрвень 1944

4-ы атрад

Створаны 16 кастрычніка 1943 г. з групы партызан (55 чал.), вылучанай атрадам імя С. М. Кірава. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 118 партызан.

Камандзір атрада: Грэнадзёр Пётр Ізраілевіч
кастрычнік 1943 — чэрвень 1944
Камісары: Курыловіч Канстанцін Іванавіч
кастрычнік 1943 — сакавік 1944
Дземіх Любоў Данілаўна
сакавік 1944 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Шутко Міхаіл Мікалаевіч
кастрычнік 1943 — красавік 1944
Шульга Віктар Захаравіч
красавік 1944 — чэрвень 1944

Партызаны дзейнічалі ў асноўным на тэрыторыі Крупскага раёна. Праводзілі дыверсіі на чыгункі Барысаў—Крупкі, аўтамагістралі Мінск—Масква, дарозе Халопенічы—Крупкі.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ П. К. ПАНАМАРЭНКІ

Створана ў студзені 1944 г. загадам упаўнаважанага ЦК КП(б)Б і БШПР па Барысаўска-Бягомльскай зоне на базе асобных атрадаў «За Радзіму», «Гвардзеец», імя К. Я. Варашылава. Пазней арганізаваны атрад імя М. Ф. Ватуціна. Брыгада дзейнічала ў Барысаўскім, Халопеніцкім і Крупскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 1 ліпеня 1944 г. ў складзе 4 атрадаў агульнай колькасцю 935 партызан.

Камандзір брыгады: Харланаў Фёдар Сямёнавіч
студзень 1944 — ліпень 1944
Камісар: Ісачанка Іван Фёдаравіч
студзень 1944 — ліпень 1944
Начальнік штаба: Баранаў Ілья Савельевіч
студзень 1944 — ліпень 1944

Атрад «За Радзіму»

Арганізаваны ў чэрвені 1942 г. ў савецкім тыле з партызан, вылучаных 1-й і 2-й Бела-

Камандны склад партызанскай брыгады імя П.К.Панамарэнкі.

рускімі брыгадамі па заданні ЦК КП(б)Б, і накіраваны ў Барысаўскі раён. Тут папоўніўся мясцовымі жыхарамі. Спачатку атрад дзейнічаў самастойна. У жніўні 1942 г. ўвайшоў у склад брыгады «Стары», у маі 1943 г. зноў вылучыўся ў самастойны. Да 15 верасня 1942 г. атрад называўся «Стары», потым «За Радзіму». На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 254 партызаны.

Камандзіры атрада: Пыжыкаў Васіль Сямёнавіч («Стары»)

чэрвень 1942 — жнівень 1942
Патапенка Кузьма Канстанцінавіч
жнівень 1942 — студзень 1943
Харланаў Фёдар Сямёнавіч
студзень 1943 — студзень 1944
Бяссмертны Іван Арцёмавіч
студзень 1944 — ліпень 1944

Камісары: Патапенка Кузьма Канстанцінавіч

чэрвень 1942 — жнівень 1942
Хараводнікаў Мікалай Мікітавіч
жнівень 1942 — кастрычнік 1942
Пасекаў Міхаіл Аляксеевіч
кастрычнік 1942 — студзень 1943
Бяссмертны Іван Арцёмавіч
студзень 1943 — студзень 1944
Курыцын Аляксей Андрэевіч
студзень 1944 — ліпень 1944

Начальнікі штаба: Растаргуеў Мікалай Пятровіч

чэрвень 1942 — ліпень 1942
Гнатко Міхаіл Сцяпанавіч
студзень 1943 — чэрвень 1943, загінуў
Баранаў Ілья Савельевіч
чэрвень 1943 — студзень 1944
Данькоў Павел Дзмітрыевіч
студзень 1944 — ліпень 1944

Атрад «Гвардзеец»

Арганізаваны ў чэрвені 1942 г. ў савецкім тыле па рашэнні ЦК КП(б)Б і накіраваны ў Крупскі раён (39 чал.), дзе папоўніўся жыхарамі Барысаўскага і Мінскага раёнаў. Да 22 студзеня 1944 г. дзейнічаў самастойна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 286 партызан.

Камандзір атрада: Сянькоў Андрэй Іванавіч

чэрвень 1942 — ліпень 1944

Камісары: Ісачанка Іван Фёдаравіч
чэрвень 1942 — студзень 1944
Ламінскі Іван Ціханавіч
студзень 1944 — ліпень 1944

Начальнікі штаба: Кабаў Мікалай Пятровіч

А.І.Сянькоў.

В.С.Лявонаў.

чэрвень 1942 — жнівень 1942
Шандаровіч Уладзімір Яфімавіч
жнівень 1942 — кастрычнік 1942
Падалінскі Іван Уласавіч
кастрычнік 1942 — снежань 1943
Ламінскі Іван Ціханавіч
снежань 1943 — студзень 1944
Шындзель Рыгор Кірылавіч
студзень 1944 — ліпень 1944

Атрад імя К. Я. Варашылава

Створаны ў красавіку 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы (8 чал.), вылучанай брыгадай «Стары», і з жыхароў в. Палік Барысаўскага раёна. Да сярэдзіны мая 1943 г. дзейнічаў у складзе брыгады «Стары», затым вылучаны ў самастойны атрад. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 242 партызаны.

Камандзіры атрада: Папоў Васіль Мікалаевіч

красавік 1943 — студзень 1944
Савельеў Павел Цімафеевіч
студзень 1944 — ліпень 1944

Камісар: Шчадрын Яўген Канстанцінавіч

красавік 1943 — ліпень 1944

Начальнікі штаба: Савельеў Павел Цімафеевіч

красавік 1943 — студзень 1944
Рылаў Пётр Сцяпанавіч
студзень 1944 — май 1944
Чарнявін Міхаіл Васілевіч
май 1944 — ліпень 1944

Атрад імя М. Ф. Ватуціна

Арганізаваны 22 красавіка 1944 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 126 партызан.

Камандзір атрада: Рыжкоў Анатоль Васілевіч

красавік 1944 — ліпень 1944
Камісар: Кісялёў Іван Іосіфавіч
красавік 1944 — ліпень 1944
Начальнік штаба: Дабаркоў Сцяпан Аляксандравіч
красавік 1944 — ліпень 1944
Брыгада дзейнічала ў асноўным на тэрыторыі Барысаўскага і Крупскага раёнаў, праводзіла дыверсіі на чыгункі Барысаў—Бобр, шашэйных і грунтавых дарогах.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ М. А. ШЧОРСА

Створана 13 кастрычніка 1942 г. на падставе рашэння міжраённага партыйнага цэнтра Барысаўскай зоны з асобных атрадаў «Бальшавік», «Перамога», пазней ў склад брыгады ўвайшлі атрады «Камуніст», імя К. Я. Варашылава, і ўтворацы атрады імя В. І. Чапаева, імя С. М. Кірава, імя М. А. Шчорса.

Брыгада дзейнічала ў Бярэзінскім, Барысаўскім, Крупскім і Чэрвеньскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 2 ліпеня 1944 г. ў складзе 6 атрадаў агульнай колькасцю 1885 партызан.

Камандзіры брыгады: Дзербан Мікалай Лявонцьевіч
кастрычнік 1942 — сакавік 1944
Дзяруга Васіль Карпавіч
сакавік 1944 — ліпень 1944
Камісар: Прусак Маісей Пейсахавіч
кастрычнік 1942 — ліпень 1944
Начальнікі штаба: Драздоўскі Віктар Паўлавіч
кастрычнік 1942 — верасень 1943
Гаўрусёў Антон Захаравіч
верасень 1943 — ліпень 1944
Бардзін Васіль Іванавіч
чэрвень 1944 — ліпень 1944
Галоўныя баявыя аперацыі праводзіла на чыгункі Барысаў—Крупкі, 20.6.1944 г. каля ст. Пряміна партызаны ўзарвалі каля 90 рэек.

СЕННЕНСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА

Створана ў кастрычніку 1942 г. У кастрычніку 1941 г. ў Халопеніцкім раёне Мінскай вобласці ўтварылася група з ваеннаслужачых пад камандаваннем батальённага камісара В.С. Лявонава. Вясной 1942 г. яна перадыслацыравалася ў Сенненскі раён, дзе папоўнілася мясцовымі патрыётамі і аформілася ў атрад. У ліпені 1942 г. ён аб'яднаўся з атрадам В.А. Захарчанкі, які дзейнічаў на гэтай тэрыторыі.

Камандзір атрада: Лявонаў Васіль Сяргеевіч
Камісар: Захарчанка Васіль Афанасьевіч
Начальнік штаба: Пашчанка Іван Кузьміч

Па ўказанні Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б ў жніўні 1942 г. на базе асобных атрадаў М.П. Гудкова (дзейнічаў у Талочынскім раёне) і В.С. Лявонава ўтворана брыгада пад камандаваннем М.П. Гудкова. У баях з карнікамі ў пачатку кастрычніка яна раздзялілася. Частка партызан (больш 200 чал.) на чале з камісарам брыгады В.С. Лявонавым выйшла ў Сенненскі раён, папоўнілася мясцовымі жыхарамі і аформілася ў Сенненскую брыгаду. Да лістапада 1942 г. ў яе складзе налічвалася 6 атрадаў. Пазней арганізаваны атрады «За Радзіму», імя Аляксандра Неўскага, «Смерць фашызму», Ф.Ф. Гарбачова, імя

Падрыўнікі на заданні.

Бой вядуць партызаны Сенненскай брыгады.

Багдана Хмяльніцкага, імя М.І. Кутузава, разведвальны.

Брыгада дзейнічала ў Сенненскім, Чашніцкім, Лепельскім і Крупскім раёнах. Партызаны праводзілі дывэрсіі на дарогах Халопенічы—Барысаў, Абчуга—Бобр. У 1944 г. ў час карнай аперацыі трымалі абарону ў раёне в. Калодніца—Дубы—Прошыка каля воз. Сялява.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА 1-я ІМЯ К. С. ЗАСЛОНАВА

Створана 15 ліпеня 1942 г. У верасні 1941 г. ў Маскве па ініцыятыве начальніка паравознага дэпо ст. Орша К.С. Заслонава з добраахвотнікаў, былых чыгуначнікаў станцый Орша, Смаленск і Вязьма створаны 18-ы дывэрсійны атрад. На шляху накіравання частка байцоў атрада загінула, іншыя з-за хваробы накіраваны ў савецкі тыл. Група на чале з К.С. Заслонавым у сярэдзіне лістапада 1941 г. прыбыла ў Оршу, дзе пачала дзейнічаць падпольна. 25 лютага 1942 г. яна выйшла ў лес і аформілася ў атрад.

Камандзір атрада: Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч («Дзядзя Косця»)
верасень 1941 — кастрычнік 1941, люты 1942 — ліпень 1942
Камісары: Якушаў Фёдар Мікітавіч
верасень 1941 — кастрычнік 1941
Андрэеў Анатоль Яўгенавіч
люты 1942 — чэрвень 1942

Брыгада дзейнічала ў Аршанскім, Сенненскім, Багушэўскім, Чашніцкім, Талачынскім раёнах Віцебскай вобласці і Халопеніцкім раёне Мінскай вобласці. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. ў складзе 13 атрадаў. За ўвесь перыяд дзейнасці брыгады ў ёй налічвалася 2476 партызан.

Камандзіры брыгады: Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч
ліпень 1942 — лістапад 1942, загінуў
Сяліцкі Людвіг Іванавіч
лістапад 1942 — красавік 1944
Іваноў Барыс Канстанцінавіч
красавік 1944 — чэрвень 1944
Камісары: Сяліцкі Людвіг Іванавіч
ліпень 1942 — красавік 1943
Любімцаў Міхаіл Ціханавіч
красавік 1943 — чэрвень 1943
Іваноў Барыс Канстанцінавіч
чэрвень 1943 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Лімаев Пётр Пятровіч
ліпень 1942 — лістапад 1942
Палажэнцаў Васіль Радзівонавіч
лістапад 1942 — красавік 1943
Смірноў Віктар Нікандравіч
красавік 1943 — чэрвень 1944

На тэрыторыі раёна праведзены дывэрсіі на аўтамагістралі Орша—Мінск, на дарозе Чарэя—Халопенічы. У студзені — красавіку 1943 г. ў час баявога рэйду правялі некалькі баёў з праціўнікам. У лютым 1944 г. разам з Сенненскай брыгадай вялі баі за прарыў варожай блакады і прарыў абароны праціўніка ў раёне воз. Сялява каля в. Баркі.

К.С.Заслонаў.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА 2-я ІМЯ К. С. ЗАСЛОНАВА

Створана 25 верасня 1943 г. ў адпаведнасці з загадам БШПР і Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б на базе атрадаў імя В.І. Чапаева, імя С.Г. Лазо, імя П.К. Панамарэнкі, «Малады бальшавік», «Мсціўца» і В.П. Комлева, вылучаных 1-й брыгадай імя К.С. Заслонава. Пазней арганізаваны атрад «Кастрычнік». Брыгадзе прысвоена імя Героя Савецкага Саюза К.С. Заслонава (загінуў 14 лістапада 1942 г.).

Брыгада дзейнічала ў Аршанскім, Сенненскім, Талачынскім, Чашніцкім, Лепельскім раёнах Віцебскай і Халопеніцкім раёне Мінскай абласцей. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 27 чэрвеня 1944 г. ў складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 905 партызан.

Камандзір брыгады: Комлеў Васіль Паўлавіч

верасень 1943 — чэрвень 1944

Камісар: Бяляеў Валянцін Емяльянавіч

верасень 1943 — чэрвень 1944

Начальнікі штаба: Палажэнцаў Васіль Радзівонавіч

верасень 1943 — снежань 1943

Бальшуноў Міхаіл Максімавіч

студзень 1944 — чэрвень 1944, загінуў

Загер Міхаіл Сахновіч чэрвень 1944

У чэрвені 1944 г. партызаны брыгады разгромілі гарнізон у в. Слабада.

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА М.П. ГУДКОВА

Створана ў верасні 1942 г. Вясной 1942 г. ў Талачынскім раёне пачаў дзейнічаць атрад пад камандаваннем ст. лейтэнанта М.П. Гудкова, створаны з ваеннаслужачых, якія трапілі ў акружэнне, мясцовых патрыётаў в. Сельцы, Замошша, Азярцы, Заднева, Обальцы, Прудзец і жыхароў Сенненскага і Халопеніцкага раёнаў.

Камандзір атрада: Гудкоў Мікалай Пятровіч

Камісар: Грудзінін Міхаіл Аляксандравіч

Начальнік штаба: Сяргееў Аляксей Андрэевіч

У той жа час у Сенненскім раёне арганізаваўся атрад В.С. Лявонава. Па ўказанні Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б атрады ў жніўні 1942 г. аб'ядналіся ў брыгаду М.П. Гудкова, у складзе якой да канца верасня налічвалася 6 атрадаў. У кастрычніку ў баях з карнікамі брыгада раздзялілася. Група партызан на чале з камісарам В.С. Лявонавым выйшла ў Сенненскі раён і прыступіла да арганізацыі Сенненскай брыгады. З пакінутых партызан і жыхароў Талачынскага раёна ў лістападзе 1942 г. брыгада М.П. Гудкова была адноўлена. У яе склад увайшлі атрады 1-ы імя М.І. Кутузава і 2-і імя М.А. Шчорса. Пазней створаны 3-і («Ураган»), 4-ы, 5, 6 і 7-ы атрады. Брыгада дзейнічала ў Талачынскім, Сенненскім, Чашніцкім, Лепельскім раёнах Віцебскай, Халопеніцкім і Крупскім раёнах Мінскай абласцей. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 26 чэрвеня 1944 г. ў складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 632 партызаны.

Камандзір брыгады: Гудкоў Мікалай Пятровіч

жнівень 1942 — чэрвень 1944

Камісары: Лявонаў Васіль Сяргеевіч

жнівень 1942 — кастрычнік 1942

Фінагееў Ілья Рыгоравіч

люты 1943 — чэрвень 1943

Ігнатовіч Фёдар Пятровіч

чэрвень 1943 — чэрвень 1944

Начальнікі штаба: Сыценка Васіль Дзмітрыевіч

жнівень 1942 — кастрычнік 1942

Арэшыч Рыгор Сцяпанавіч

ліпень 1943 — жнівень 1943, в. а.

Рукаль Якаў Фёдаравіч

жнівень 1943 — чэрвень 1944

Партызаны праводзілі дывэрсіі на чыгункі Слаўнае—Бобр. У красавіку 1943 г. ўдзельнічалі ў разгроме гарнізона ў в. Шэйка. У 1944 г. ў час блакады вялі абарончыя баі каля воз. Сялява на рубяжы вёсак Болюта—Калодніца.

ЧАШНІЦКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА «ДУБАВА»

Утворана 28 жніўня 1942 г. па указанні Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б на базе вылучаных з брыгады «Смерць фашызму» (пазней імя В.І. Чапаева (9-га) каман-

дзір Ф.Ф. Дуброўскі) і асобнага 68-га (камандзір У.Е. Лабанок) атрадаў. Пры фарміраванні брыгады 9-ы атрад перайменаваны ў 1-ы, з групы яго партызан створаны 2-і атрад, 68-ы атрад перайменаваны ў 3-і. Пазней арганізаваны атрады 4-ы, 6, 7, 8, 9, 12, 13-ы, кавалерыйскі эскадрон і артылерыйскі дывізіён.

Згодна распараджэння БШПР і ўказання Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б 1 ліпеня 1943 г. брыгада разбуйнена. Атрады 3-і, 4, 8, 9, 13-ы і частка асабовага састава артдывізіёна ўключаны ў Лепельскую брыгаду імя І.В. Сталіна. Пазней у Чашніцкай брыгадзе «Дубава» створаны новыя атрады: 2-і (былы 2-і атрад перайменаваны ў 3-і, 4, 5, 8, 9, 13, 14-ы. Былі перайменаваны кавэскадрон у 10-ы атрад, артдывізіён у 15-ы атрад. Камандзіру брыгады Ф.Ф. Дуброўскаму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Брыгада дзейнічала ва Ушацкім, Чашніцкім, Бешанковіцкім раёнах Віцебскай, Халопеніцкім і Бягомльскім раёнах Мінскай абласцей. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. ў складзе 15 атрадаў агульнай колькасцю 1808 партызан.

Камандзір брыгады: Дуброўскі Фёдар Фаміч («Дубаў»)

жнівень 1942 — чэрвень 1944

Камісары: Лабанок Уладзімір Елісеевіч

жнівень 1942 — чэрвень 1943

Старынскі Мікалай Васілевіч

ліпень 1943 — люты 1944

Барадаўкін Сцяпан Якаўлевіч

красавік 1944 — чэрвень 1944

Начальнікі штаба: Барадаўкін Сцяпан Якаўлевіч

жнівень 1942 — май 1943

Шарко Пётр Кірылавіч

май 1943 — чэрвень 1944

Партызаны праводзілі дыверсіі па дарозе Лукомль—Абчуга, правялі некалькі баёў у чэрвені 1944 г.

ЛЁЗНЕНСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА

Утворана ў маі 1943 г. згодна ўказання БШПР і Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б на базе атрадаў «Граза», імя В.І. Чапаева, «Буравеснік», вылучаных з брыгады Аляксея (брыгада імя А.Ф. Данукалава). Пры яе арганізацыі атрадам прысвоены адпаведна нумарныя абазначэнні — 1, 2, 3-і. Пазней утворaны атрады 5-ы, 6, 7, 8, 9, 10, 11, 12, 13, 14-ы і ўключаны асобны 4-ы. У жніўні — кастрычніку 1943 г. атрады аб'ядналіся ў 4 батальёны. Брыгада дзейнічала ў Лёзненскім, Сенненскім, Чашніцкім, Бешанковіцкім, Багушэўскім, Лепельскім раёнах Віцебскай, Ільянскім раёне Вілейскай, Халопеніцкім, Крупскім раёнах Мінскай абласцей. Злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. ў складзе 13 атрадаў агульнай колькасцю 604 партызаны.

Камандзір брыгады: Кірылаў Пётр Іванавіч

май 1943 — чэрвень 1944

Камісары: Шчарбакоў Афанасій Цімафеевіч

май 1943 — жнівень 1943

Шакінка Ціхан Пятровіч

жнівень 1943 — студзень 1944

Комлеў Мікалай Васілевіч

люты 1944 — красавік 1944, в. а.

Кірылаў Кузьма Маркавіч

Група партызан Лёзненскай партызанскай брыгады.

красавік 1944 — чэрвень 1944, загінуў
Начальнік штаба: Крупін Іван Дзмітрыевіч
май 1943 — чэрвень 1944
Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгункі Орша—Мінск, грунтавых дарогах.

1-я КЛІЧАЎСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА

Створана ў лістападзе 1942 г. загадам Клічаўскага аператыўнага цэнтра на базе 208-га атрада імя І.В. Сталіна. У красавіку 1943 г. са складу брыгады выдзелена 4-я рота і разгорнута ў асобны 15-ы атрад (пазней 1-ы полк). Брыгада дзейнічала ў Клічаўскім, Бялыніцкім, Кіраўскім, Барысаўскім і Крупскім раёнах да красавіка 1943 г. ў складзе Клічаўскага аператыўнага цэнтра, затым — Магілёўскай (абласной) ВАГ. 20 мая 1943 г. на падставе пастановы Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б зноў пераўтворана ў асобны 208-ы атрад імя І.В. Сталіна. Колькасны склад на дзень расфарміравання — больш 500 партызан.

Камандзіры брыгады: Яхантаў Пётр Валяр'янавіч
лістапад 1942 — красавік 1943
Беспаясаў Яўлампій Мікалаевіч
красавік 1943 — май 1943
Камісары: Іваноў Іван Рыгоравіч
лістапад 1942 — люты 1943
Шчарбакоў Раман Іванавіч
люты 1943 — май 1943
Начальнікі штаба: Арцюшын Канстанцін Аляксандравіч
лістапад 1942 — красавік 1943
Крук Цімафей Карнеевіч
красавік 1943 — май 1943

277-ы ПАРТЫЗАНСКІ ПОЛК

Створаны ў верасні 1943 г. 5 ліпеня 1941 г. ў Клічаўскім раёне пачала дзейнічаць падпольная група камуністаў, пакінутая ў тыле ворага па заданні ЦК(б)Б. У яе склад увахадзілі Я.І. Заяц, П.М. Вікторчык, Вінаградаў, пазней уліліся І.З. Ізох, Т.А. Піменаў, Бай, Букаты, Г.К. Вітоль, Чарнікевіч і група ваеннаслужачых, якія аказаліся ў акружэнні. У сярэдзіне ліпеня 1941 г. на базе гэтых груп утварыўся Клінаўскі партызанскі атрад. Дзейнічаў самастойна. У красавіку 1942 г. ўвайшоў у склад Клічаўскага аператыўнага цэнтра як 277-ы атрад. З лістапада 1942 г. да мая 1943 г. дзейнічаў у складзе 2-й Клічаўскай брыгады, затым — самастойна, у ліпені 1943 г. падпарадкаваны Клічаўскай ВАГ.

Камандзіры атрада: Бародзін
ліпень 1941 — жнівень 1941
Ізох Ігнат Зіноўевіч
верасень 1941 — люты 1942
Юракаўцоў Андрэй Сцяпанавіч
люты 1942 — красавік 1942
Рудаў Іван Фёдаравіч
красавік 1942 — май 1942
Мазур Сяргей Акімавіч
май 1942 — кастрычнік 1942
Токараў Савелій Ціханавіч
кастрычнік 1942 — снежань 1942
Ізох Ігнат Зіноўевіч
снежань 1942 — верасень 1943
Камісары: Тайчэр
ліпень 1941 — жнівень 1941
Заяц Якаў Іванавіч
лістапад 1941 — люты 1942
Ізоў Ігнат Зіноўевіч
люты 1942 — снежань 1942
Шчыслёнак Аляксандр Якаўлевіч
снежань 1942 — красавік 1943
Канавалаў Кандыд Фёдаравіч
май 1943 — жнівень 1943
Гершавіч Ісак Майсеевіч
жнівень 1943 — верасень 1943
Начальнікі штаба: Ізох Ігнат Зіноўевіч
ліпень 1941 — лістапад 1941
Рудаў Іван Фёдаравіч
люты 1942 — красавік 1942
Ананіч Іван Іванавіч
красавік 1942 — чэрвень 1942
Палубінскі Сяргей Аляксеевіч
чэрвень 1942 — жнівень 1942, загінуў
Мароз Іван Мікалаевіч
жнівень 1942 — снежань 1942
Токараў Савелій Ціханавіч
снежань 1942 — верасень 1943

На падставе пастановы Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б і загада абласной ВАГ ад 3 верасня 1943 г. атрад перафарміраваны ў полк. Пры яго разгортванні роты пераўтвораны ў 1, 2, 3-і батальёны. Полк дзейнічаў у складзе Клічаўскай ВАГ у Клічаўскім, Бялыніцкім, Бярэзінскім, Магілёўскім, Кіраўскім, Шклоўскім раёнах Магілёўскай і Крупскім раёне Мінскай абласцей. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. ў складзе 3 батальёнаў агульнай колькасцю 1257 партызан.

Камандзіры палка: Ізох Ігнат Зіноўевіч
верасень 1943 — май 1944
Коканцаў Міхаіл Паўлавіч
чэрвень 1944
Камісары: Гяршовіч Ісак Майсеевіч
верасень 1943 — люты 1944

Кніга Мікалай Іванавіч
люты 1944 — чэрвень 1944
Радзюк Арсеній Максімавіч
чэрвень 1944
Начальнік штаба: Токараў Савелій Ціханавіч
верасень 1943 — чэрвень 1944

У Крупскім раёне разам з партызанскім атрадам 257-м зрабілі налёты на гарнізоны ў вёсках Ухвала, Выдрыца, узарвалі мост цераз р. Нача на чыгунцы Барысаў—Крупкі.

1-я БЕЛАРУСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА (ДРУГОГА СКЛАДУ)

Створана ў верасні 1943 г. на базе атрада А.Д. Гурко, выдзеленага 1-й Беларускай брыгадай. У сярэдзіне ліпеня 1941 г. на шклозаводзе «Ноўка» Суражскага раёна арганізавана партызанская група, у якую ўвайшлі В.А. Ліпскі (загінуў), А.А. Ліпскі (загінуў), П.А. Бурунаў, Н.А. Бурунаў, А.П. Дзік. Да лютага 1942 г. яна вырасла ў атрад, які да красавіка 1942 г. дзейнічаў самастойна, затым у складзе 1-й Беларускай брыгады. Называўся па прозвішчы свайго камандзіра.

Камандзіры атрада: Дзік Аляксей Пятровіч
люты 1942 — май 1942
Гурко Аляксей Дзямідавіч
май 1942 — верасень 1943
Камісары — Бурунаў Пётр Аляксандравіч
люты 1942 — красавік 1942
Касасёў Уладзімір Якімавіч
май 1942 — чэрвень 1943
Булахаў Фядот Паўлавіч
чэрвень 1943 — верасень 1943
Начальнікі штаба: Бруеў Антон Міхайлавіч
люты 1942 — жнівень 1942
Бальшакоў Мікалай Міхайлавіч
жнівень 1942 — верасень 1943

У ліпені 1943 г. атрад выдзелены з 1-й Беларускай брыгады, перадыслацыраваны ў Сенненскі раён, дзе 25 верасня 1943 г. рашэннем Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б разгорнуты ў 1-ю Беларускую брыгаду другога складу. Пры яе арганізацыі былі створаны атрады 1-ы і 2-і, пазней, у красавіку 1944 г., — 3-і. Брыгада дзейнічала ў Сенненскім, Лепельскім раёнах Віцебскай і Халопеніцкім раёне Мінскай абласцей. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. ў складзе 3 атрадаў агульнай колькасцю 538 партызан.

Камандзіры брыгады: Гурко Аляксей Дзямідавіч
верасень 1943 — люты 1944
Шкрэда Рычард Уладзіслававіч
люты 1944 — чэрвень 1944
Камісар: Шкрэда Рычард Уладзіслававіч верасень 1943 — чэрвень 1944
Начальнік штаба: Бальшакоў Мікалай Міхайлавіч
верасень 1943 — чэрвень 1944

Партызаны праводзілі дыверсіі на шашы і грунтавых дарогах Халопенічы—Лепель, Халопенічы—Сянно, Халопенічы—Крупкі. У сакавіку 1944 г. знішчылі варожы ахоўны пункт, мост цераз р. Эса каля Халопеніч. У маі 1944 г. захапілі мост цераз р. Эса і ўтрымлівалі яго да падыходу Чырвонай Арміі.

2-я БЕЛАРУСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ П.К. ПАНАМАРЭНКІ (ДРУГОГА СКЛАДУ)

Створана ў верасні 1943 г. Па ўказанні ЦК КП(б)Б і БШПР у жніўні 1943 г. ў Бешанковіцкі раён прыбыла ініцыятыўная група (10 чал.) на чале з М.І. Дзячковым. З яе створаны 3 ініцыятыўныя групы, якія ў верасні гэтага ж года за кошт мясцовых жыхароў выраслі ў атрады 1, 2, 3-і. На яе базе была ўтворана брыгада. Пазней арганізаваны атрады 4-ы і 5-ы. Брыгада дзейнічала ў Бешанковіцкім, Талачынскім, Чашніцкім раёнах Віцебскай і Крупскім раёне Мінскай абласцей. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 27 чэрвеня 1944 г. ў складзе 5 атрадаў агульнай колькасцю 394 партызаны.

Камандзір брыгады: Дзячкоў Міхаіл Іванавіч
верасень 1943 — чэрвень 1944
Начальнік штаба: Махоткін Рыгор Андрэевіч
верасень 1943 — чэрвень 1944

Партызаны праводзілі дыверсіі на дарозе Абчуга—Бобр. У сакавіку 1944 г. разграмілі варожы гарнізон у в. Шэйка.

Атрады, якія не ўваходзілі ў склад партызанскіх злучэнняў Мінскай вобласці

Асобны атрад А.Я. Васілеўскага

Арганізаваны ў чэрвені 1941 г. на тэрыторыі Барысаўскага раёна з партыйна-савецкага актыву (каля 60 чал.). Дзейнічаў сумесна з часцямі Чырвонай Арміі ў Барысаўскім, Бярэзінскім, Крупскім раёнах. 29 чэрвеня 1941 г. атрад у баі пад г.п. Беразіно панёс вялікія страты, партызаны, якія засталіся, выйшлі ў Чэрвеньскі раён і дзейнічалі да канца лета. Далейшы лёс атрада не ўстаноўлены.

Камандзір атрада: Васілеўскі Арцемій Яўгенавіч

чэрвень 1941, загінуў.

Асобны атрад «Артур»

Пачаў арганізоўвацца ў красавіку 1942 г. на базе дыверсійна-разведвальнай групы (9 чал.) І.Ф. Залатара, якая прыбыла з савецкага тылу. Атрад дзейнічаў у Барысаўскім, Смалявіцкім, Крупскім, Талачынскім, Аршанскім раёнах і ў Мінску. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 2 ліпеня 1944 г. агульнай колькасцю больш за 300 чалавек.

Камандзір атрада: Залатар Іван Фёдаравіч («Артур»)

красавік 1942 — ліпень 1944

Асобны атрад І.А. Яраша

Створаны ў ліпені 1941 г. з групы сакратара Барысаўскага райкома КП(б)Б І.А. Яраша, якая прыбыла з савецкага тылу, з партыйна-савецкага актыву раёна і ваеннаслужачых, якія трапілі ў акружэнне. Дзейнічаў у Барысаўскім і Крупскім раёнах. У лютым 1942 г. ў баях з карнікамі панёс вялікія страты і перастаў існаваць.

Камандзір атрада: Яраш Іван Афанасьевіч

ліпень 1941 — 26 лютага 1942, загінуў.

128-ы атрад

Арганізаваны ў снежні 1941 г. ў Клічаўскім раёне на базе групы М.Ф. Спяранскага, якая пачала дзейнічаць у жніўні 1941 г. У студзені 1942 г. ў яго ўлілася група В.П. Свістунова. Спачатку атрад называўся па прозвішчах камандзіраў М.Ф. Спяранскага, В.П. Свістунова. У красавіку 1942 г. ўключаны ў склад Клічаўскага аператыўнага цэнтра як 128-ы атрад. З лістапада 1942 г. да красавіка 1943 г. ўваходзіў у 3-ю Бярэзінскую брыгаду.

Да ўключэння ў красавіку 1943 г. ў склад 14-й Цёмналескай брыгады атрад дзейнічаў у Клічаўскім, Асіповіцкім, Бялыніцкім, Крупскім і Барысаўскім раёнах Мінскай вобласці. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі атрад налічваў 397 партызан.

Камандзіры атрада: Спяранскі Міхаіл Фёдаравіч

снежань 1941 — студзень 1942

Свістуноў Васіль Паўлавіч

студзень 1942 — кастрычнік 1942

Ялецкі Сцяпан Рыгоравіч

кастрычнік 1942 — чэрвень 1943

Чарноў Мікалай Іванавіч

чэрвень 1943 — кастрычнік 1943

Камісары: Спяранскі Міхаіл Фёдаравіч

студзень 1942 — чэрвень 1943

Серадзюк Міхаіл Спірыдонавіч

чэрвень 1943 — кастрычнік 1943

Начальнікі штаба: Ялецкі Сцяпан Рыгоравіч

студзень 1942 — кастрычнік 1942

Чарноў Мікалай Іванавіч

кастрычнік 1942 — чэрвень 1943

Грабянюк Мікалай Аркадзевіч

чэрвень 1943 — кастрычнік 1943

Партызанскае злучэнне «Трынаццаць»

Сфарміравана 1 чэрвеня 1944 г. ў Бялыніцкім раёне Магілёўскай вобласці ў адпаведнасці з распараджэннем БШПР на базе асобнага смаленскага палка «Трынаццаць». Пры арганізацыі злучэння ўпраўленне палка было ліквідавана, а яго баявыя падраздзяленні — 1, 3 і 5-ы батальёны — разгорнуты ў брыгады пад той жа назвай, 2-і і 6-ы батальёны і атрад «Перамога» пераўтвораны ў асобныя атрады 11, 12, 13-ы. Злучэнне «Трынаццаць» дзейнічала ў Бялыніцкім, Бярэзінскім, Шклоўскім раёнах Магілёўскай і Крупскім раёне Мінскай абласцей. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 29—30 чэрвеня 1944 г. Колькасны склад на дзень злучэння не ўстаноўлены.

Камандзіры злучэння: Грышын Сяргей Уладзіміравіч

чэрвень 1944

Пахомаў Серафім Васілевіч

чэрвень 1944, в. а.

Камісар: Стралкоў Іван Арсенцьевіч

чэрвень 1944

Начальнік штаба: Скварцоў Сяргей Пятровіч
чэрвень 1944

Партызанскі полк «Трынаццаць»

У лістападзе 1941 г. ў в. Фаміна Дарагабужскага раёна Смаленскай вобласці на базе групы ваеннаслужачых, якія не выйшлі з варожага тылу, і з мясцовых жыхароў пачаў арганізоўвацца атрад. Спачатку ён называўся па прозвішчы камандзіра, з красавіка 1942 г. — атрадам «Трынаццаць» (камандзір Сяргей Уладзіміравіч Грышын, камісар Мікалай Іванавіч Вельмесаў, начальнік штаба Іларыён Васілевіч Узлоў). Да лета 1942 г. атрад колькасна вырас, устанавіў сувязь са штабам партызанскага руху пры Ваенным савеце Заходняга фронта (пазней Заходні штаб партызанскага руху) і па яго распараджэнні ў чэрвені 1942 г. разгарнуўся ў полк «Трынаццаць» у складзе 1, 2 і 3-га батальёнаў. Полк спачатку знаходзіўся ў непасрэдным падпарадкаванні Заходняга штаба партызанскага руху.

Дзейнічаў у Дарагабужскім, Касплянскім, Руднянскім, Прачысценскім, Слабодскім і Дзямідаўскім раёнах Смаленскай вобласці. У канцы красавіка 1943 г. перайшоў на тэрыторыю Беларусі, дзе загадам начальніка ЦШПР ад 23 кастрычніка быў перападпарадкаваны БШПР. У Беларусі полк спачатку дзейнічаў у Чавускім, Прапойскім і Быхаўскім раёнах Магілёўскай вобласці. У канцы кастрычніка — пачатку лістапада 1943 г. перабазіраваўся ў Бялыніцкі раён, адкуль распаўсюджваў свае баявыя дзеянні на Бялыніцкі, Брэзінскі, Шклоўскі раёны Магілёўскай і Крупскі раён Мінскай абласцей.

Камандзіру палка С.У. Грышыну і партызану атрада «Перамога» П.А.Галецкаму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

1 чэрвеня 1944 г. полк у складзе 1, 2, 3, 5, 6-га батальёнаў і атрада «Перамога» разгорнуты ў партызанскае злучэнне «Трынаццаць». Колькасны склад палка на 1 кастрычніка 1943 г. налічваў больш за 2,4 тыс. партызан.

Камандзіры палка: Грышын Сяргей Уладзіміравіч
чэрвень 1942 — май 1944
Пахомаў Серафім Васілевіч
красавік 1944 — май 1944, в.а.
Камісар: Стралкоў Іван Арсенцьевіч
ліпень 1942 — май 1944
Начальнікі штаба: Узлоў Іларыён Васілевіч
чэрвень 1942 — кастрычнік 1943, загінуў
Скварцоў Сяргей Пятровіч
снежань 1943 — май 1944

1-я Смаленская партызанская брыгада

Створана ў сакавіку 1942 г. У жніўні 1941 г. на тэрыторыі Духаўшчынскага, Слабодскага і Дзямідаўскага раёнаў Смаленскай вобласці з ваеннаслужачых, якія трапілі ў акружэнне, пачалі арганізоўвацца партызанскія групы і атрады. Першыя з іх — Т.Г. Давыдкіна і А.С. Тураўскага. Да вясны 1942 г. ўтвораны атрады П.М. Анісімава, Р.К. Лугавога, П.Кукавякіна, Маскалёва, Ф.Я. Кавалёва, А.І. Яўстратава, А.Р. Багдановіча і інш. 26 сакавіка 1942 г. на нарадзе камандзіраў гэтых атрадаў і груп прынята рашэнне сфарміраваць 1-ы партызанскі батальён пад камандаваннем Ф.Я. Апрэтава ў складзе трох атрадаў: 1, 2, 3-і. У красавіку ў яго ўліліся атрады П.М. Анісімава і Д.І. Анісімава. У маі 1942 г. батальён вызначаны як 1-я партызанская брыгада, у якую ў чэрвені 1942 г. ўваходзілі атрады 1, 2, 3, 4, 5, 6-ы. 12 чэрвеня 1942 г. брыгада колькасцю да 1400 чалавек разузбуйніла. Атрады 1, 3, 6-ы выдзеліліся для арганізацыі 3-й брыгады Смаленскай вобласці. Пакінутыя 2, 4, 5-ы атрады атрымалі адпаведна новыя нумарныя абазначэнні: 1, 2, 3-і. Адначасова створаны новы 4-ы атрад. У пачатку кастрычніка 1942 г. брыгада выйшла ў савецкі тыл, была экіпіравана і зноў вярнулася ў раён баявых дзеянняў. У баях з карнікамі ў лістападзе некаторыя яе атрады былі рассеяны, іншыя выйшлі ў савецкі тыл. Паводле загаду штаба партызанскага руху Калінінскага фронту брыгада зноў была сфарміравана з ліку партызан, якія выйшлі ў тыл і 7 лютага 1943 г. ў складзе 134 чалавек прыбыла на акупіраваную тэрыторыю Смаленскай вобласці. У жніўні 1943 г. яна перадыслацыравалася ў Віцебскую вобласць у падпарадкаванне БШПР. Брыгада дзейнічала ў Духаўшчынскім, Руднянскім раёнах Смаленскай, Сенненскім, Талачынскім, Чашніцкім, Лепельскім Віцебскай, Халопеніцкім і Крупскім раёнах Мінскай абласцей. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 26 чэрвеня 1944 г. ў складзе 5 атрадаў агульнай колькасцю 390 партызан.

Камандзіры брыгады: Апрэтаў Фёдар Якаўлевіч
сакавік 1942 — лістапад 1942, загінуў
Яўстратаў Анісім Іларыёнавіч
лістапад 1942 — жнівень 1943
Пятровічаў Мікіта Пятровіч
жнівень 1943 — май 1944

Цэлішчэўскі Уладзімір Іванавіч
чэрвень 1944
Камісары: Багдановіч Анатоль Рыгоравіч
сакавік 1942 — чэрвень 1942
Пятровічаў Мікіта Пятровіч
чэрвень 1942 — жнівень 1943
Вайзулін Ікрам Халімавіч
жнівень 1943 — чэрвень 1944
Начальнікі штаба: Яўстратаў Анісім Іларыёнавіч
красавік 1942 — лістапад 1942
Несцераў Дзмітрый Мацвеевіч
красавік 1943, в. а.
Прусакоў Андрэй Васілевіч
жнівень 1943, в. а.
Жылін Сямён Дзмітрыевіч
жнівень 1943 — чэрвень 1944

Партызаны праводзілі дывэрсіі на чыгункі Барысаў—Орша, на дарогах Бобр—Абчуга, Халопенічы—Узнацк. Удзельнічалі ў адкрытых і засадных баях з праціўнікам каля в. Старая Пярэсіка (лістапад 1943 г.), Чараёўка (сакавік 1944 г.), Забор'е (люты 1944 г.). Перад наступленнем Чырвонай Арміі аднавілі 6 мастоў на дарозе Лукомль—Вялікія Хальнявічы, зрабілі засаду на дарозе Абчуга—Чарэя. *Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.*

Хроніка баявых дзеянняў партызан на тэрыторыі Крупскага раёна ў 1941—44 гадах

Час	Від дывэрсіі	Месца правядзення	Вынік (страты ворага)	Хто ажыццявіў	Кіраўнік
1	2	3	4	5	6
		1941 г.			
Ліпень	Налёт на калону	в. Ухвала	Забіта і паранена 32 чал.	Атрад Сяргея	Жунін
28 жніўня	Засада	Халопенічы — Лісічына	2 машыны, забіта 6 чал.	Атрад Ермаловіча	Ермаловіч
6 верасня	Налёт	Халопенічы	Забіта 10 немцаў і паліцэйскіх, узарвана электрастанцыя	Група Яраша	Яраш
6 верасня	Дывэрсія на чыгункі	Бобр—Слаўнае	Разбіта 4, пашкоджана 19 вагонаў	Спецатрад «Мсціўец»	Сідзякін
11 верасня	Дывэрсія на чыгункі	Крупкі—Бобр	Узарваны паравоз, разбіты 6 вагонаў з боепрыпасамі	Спецатрад «Мсціўец»	Сідзякін
13 верасня	Дывэрсія на чыгункі	в. Красноўка	Узарваны паравоз, разбіты 3 вагоны з боепрыпасамі	Атрад Сяргея	Жунін, Кавецкі
14 верасня	Дывэрсія на чыгункі	Крупкі—Прыяміна, каля в. Нача	Узарваны паравоз, разбіты 40 вагонаў з жывой сілай	Спецатрад «Мсціўец»	Сідзякін
1 кастрычніка	Засада	в. Дакучыно	Забіты 4 чал.		Н. Ясінскі, Д. Костачка, Мядзведзеў
Кастрычнік	Дывэрсія на чыгункі	Крупкі—Слаўнае	Знішчаны паравоз, 20 аўтамашын, 8 гармат	Атрад Сяргея	Кавецкі
1 лістапада	Знішчана тэлефонная сувязь	Сомры—Заазер'е		Атрад Жуніна	Жунін
26 лістапада	Бой з групай фашыстаў	в. Папарнае	10 забітых і параненых	Атрад Сяргея	Жунін

Працяг табліцы

1	2	3	4	5	6
		1942 г.			
Студзень	Дыверсія	Халопенічы—Лісічына	Узарваны мост на р. Эса	Атрад Ермаловіча	Ермаловіч
1 мая	Дыверсія на чыгунцы	У раёне ст. Бобр	Знішчаны эшалон з боепрыпасамі	Група Вацлаўскага	
в) дастаўляла міны для ўзрыву шэрагу аб'ектаў грамадзянскага і ваеннага значэння;

г) сем разоў была ў распалажэнні партызанскага штаба, дзе атрымлівала інструктаж і заданні па разлажэнню атрадаў ОД і адказных супрацоўнікаў рускіх управленняў, вярбоўцы іх на бок партызан і стварэнню падпольных тэрарыстычных груп;

д) вяла вярбоўку работнікаў ОД і адказных служачых грамадзянскіх управленняў. Так, асабіста ёй быў завербаваны начальнік ОП Лютыя, служачая Крупскага райуправлення Савіна Вольга і многа іншых асоб;

е) рыхтавала замах на адказных работнікаў ЗИВА у м. Крупкі. Прад'яўленае абвінавачванне прызнае поўнасцю.

2) Савіна Вольга, завербавана на карысць партызан у лістападзе месяцы 1943 года праз Хмялеўскага, у партызанскі штаб перадавала звесткі аб настаўніцкім саставе раёна, а таксама атрымлівала заданне ад партызан па здымцы тапаграфічнай карты м. Крупкі, але выканаць апошняе на змагла, бо была арыштавана.

Прад'яўленае абвінавачванне прызнае поўнасцю.

3) Папоў Міхаіл, завербаваны для работы на карысць партызан у жніўні месяцы 1943 года. Меў заданне ад Хмялеўскага прыгнаць трактар у партызанскую вёску Шарнева, дзе павінны былі сустрэць яго партызаны і атрымаць ад яго трактар...

4) Лаўчыноўскі Міхаіл, завербаваны для работы на карысць партызан у лістападзе месяцы 1943 г. Хацеў пайсці ў банду, але баяўся рэпрэсій сям'і, бо брат яго Лаўчыноўскі Канстанцін пайшоў у банду.

Прад'яўленае абвінавачванне прызнае поўнасцю.

5) Кіслякоў Мікалай, завербаваны для работы на карысць партызан у лістападзе месяцы 1943 г. Ад партызан праз Берасневу Надзею атрымаў заданне па ўзрыву млына, для чаго са штаба партызан праз стражніка Хрыпача (які ў снежні 1943 г. пайшоў у банду) і Берасневу Надзею атрымаў пяць мін.

На допыце прад'яўленае абвінавачванне Кіслякоў адмаўляў,нягледзячы на поўныя улікі і вочную стаўку з Берасневаў Надзеяй. Другі раз дапытаць не было магчымасці з-за хваробы апошняга на тыф.

6) Бераснева Людміла завербавана для работы на карысць партызан у кастрычніку месяцы 1943 г. начальнікам партызанскага штаба Чарэя—Жыліным. Раней ведала аб сувязі з партызанамі сваёй сястры Берасневаў Надзеі. На працягу усёй сваей работы таксама праяўляла актыўнасць. 5 разоў была ў размяшчэнні партызанскага штаба Чарэя, дзе атрымлівала аналагічныя заданні з сястрой, але для работы ў іншай частцы раёна.

Прад'яўленае абвінавачванне прызнае.

7) Балотнікава Марыя, завербавана для работы на карысць партызан у лістападзе 1943 года сваім стрыечным братам, які знаходзіцца ў бандзе...

8) Кавалёва Зінаіда, завербавана на работу на карысць партызан у канцы лістапада месяца 1943 г., атрымлівала заданне ад партызан перадаць пісьмо Берасневаў Надзеі, што і выканала.

Прад'яўленае абвінавачванне прызнае поўнасцю.

9) Бароўскі Павел, добраахвотна ў кастрычніку 1943 года даў згоду для работы на бок партызан. На працягу ўсёй сваёй падрыўной работы супраць нямецкай арміі праяўляў актыўнасць і з'яўляўся першым памочнікам Хмялеўскага па вярбоўцы і стварэнню дыверсійнай групы на лесазаводзе Абчуга. Практычна для партызан зрабіў наступнае:

а) склаў і перадаў партызанам ваенную тапаграфічную карту паўночна-ўсходняй часткі Крупскага раёна з нанясеннем умацаванняў воінскіх часцей і атрадаў ОД;

б) рыхтаваў узрыў лесазавода, для чаго атрымаў міны і тол. Першая спроба ўзрыву 10 лістапада гэтага года закончылася няўдачай.

в) распаўсюджваў савецкую агітацыйную літаратуру і заклікаў насельніцтва ў выпадку адступлення нямецкай арміі хавацца ў лясах і далучацца да партызан.

Прад'яўленае абвінавачванне прызнае.

10) Барэйка Віктар, маючы артылерыйскія снарады, пакінутыя чырвонымі пры іх адступленні ў 1941 г., перадаваў іх партызанам, якія мініравалі дарогі, што пацвярджаецца агентурна-асведамляльным матэрыялам і трыма паказаннямі сведкаў.

Прад'яўленыя абвінавачванні прызнае часткова.

11) Юркевіч Емяльян, меў сувязь з партызанамі, прадастаўляў сваю кватэру апошнім для вярбоўкі грамадзянскага насельніцтва ў банду. У яго кватэры ўпершыню была завербавана на работу на карысць партызан Бераснева Надзея.

Прад'яўленае абвінавачванне прызнае.

12) Шкупіла Аляксандр, завербаваны на пераход у банду восенню 1943 г. Хмялеўскім, а таксама трымаў цесную сувязь з партызанамі праз сваіх бацькоў...

Прад'яўленае абвінавачванне адмаўляе.

13) Палітыка Герасім, завербаваны на пераход у банду ў кастрычніку месяцы 1943 г. Хмялеўскім, на што даў сваю згоду.

Прад'яўленае абвінавачванне прызнае поўнасцю.

IV. Зыходзячы з вышэйвыкладзенага я прапаноўваю:

Берасневу Надзею, Папова Міхаіла, Лаўчыноўскага Міхаіла, Берасневу Людмілу, Балотнікаву Марыю, Бароўскага Паўла, Кавалёву Зінаіду за ўчыненыя імі злачынствы падвергнуць вышэйшай меры пакарання — расстрэлу.

Савіну Вольгу, Кіслякова Мікалая, Барэйку Віктара, Юркевіча Емяльяна, Шкупілу Аляксандра і Палітыку Герасіма накіраваць у палітычныя лагеры тэрмінам да заканчэння вайны.

Увесь абвінаваўчы матэрыял перадаецца шэфу СД на вырашэнне.

Ст. следчы 2-га аддз. ЗИВА
штэльфцуг-фюрэр (Вінаградаў)
Начальнік 2-га аддзела ЗИВА
цуг-фюрэр (Карась)
Начальнік упраўлення ЗИВА
кампаніе-фюрэр (Іваноў)

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 634, воп. 1, спр. 3, л.106.

СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМАНДАВАННЯ ЛЁЗНЕНСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ ВІЦЕБСКАМУ ПАДПОЛЬНАМУ АБКОМУ КП(б)Б АБ БАЯВОЙ І ПАРТЫЙНА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОЦЕ БРЫГАДЫ ЗА САКАВІК 1944 г.

2 красавіка 1944 г.

За прошедший месяц бригадой боевые действия проводились в Сенненском, Чашникском, Бешенковичском, Крупском, Холопеничском, Лепельском районах.

Основой боевой деятельности бригады являлось действие отрядов и диверсионных групп по основным коммуникациям противника и разгром гарнизонов.

Работа среди населения

В течение марта в 36 н[аселенных] п[унктах] проведены беседы на следующие темы: проработан приказ тов. Сталина, посвященный 26-й годовщине Красной Армии, сделан доклад о международном положении, сделан доклад о Международном женском дне, о советско-финляндских отношениях.

Беседы проводились в н[аселенных] п[унктах] Бол[ьшие] Хольневичи, Барсуки, Борки, Сторожище Холопеничского района, Лукомль, Рудница, Ротница, Парщевщина, Замочек, Железки, Жучки, Большие Трухоновичи, Мелешковичи, Пуськи, Мал[ое] Озерецкое, Бол[ьшое] Озерецкое, Бол[ьшие] Ульяновичи, Мал[ые] Ульяновичи, Замошье, Фольварак, Русиново, Городец, Углы, Застаринье Чашникского и Сенненского районов.

На проводимых беседах присутствовало от 40 до 120 чел. ...

Проводилась работа по разложению «народников» и полиции путем засылки советской литературы, листовок и писем. Получали ответы, которые прилагаю (обкому).

В течение марта противник предпринимал бомбежку населенных пунктов Холопеничского и Чашникского районов, в результате чего сжег дер. Вал, Мелешковичи, Кисели, Обузерье, Симоновичи и др.

Командир бригады майор Кириллов
Комиссар бригады Комлев
Нач. штаба бригады капитан Крупин

Друкуецца па кн.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941—июль 1944). Документы и материалы в трех томах. Т. 3. Мн., 1967.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ КАМАНДЗІРА БРЫГАДЫ ІМЯ КІРАВА ПРАДСТАЎНІКУ БШПР ПА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ ГЕРОЮ САВЕЦКАГА САЮЗА ПАЛКОЎНІКУ Р. Н. МАЧУЛЬСКАМУ

Гарнизоны расположены в основном вдоль стратегических дорог...

Сами гарнизоны в большинстве своем в деревнях не расположены, а расположены в местах, удобных для обороны. Вокруг расположения гарнизонов как правило построены деревянно-земляные стены высотой до 2 метров и толщиной 1 метр. С наружной стороны имеются рвы и проволочные заграждения. В центре огороженного участка имеются 1—2 вышки, на которых установлены пулеметы.

	Численный состав			Тяжелые орудия	
	немцев	«народных» полицейских	итого	пушек	минометов
Холопеничи	600	350	950	7	—
Пересика	75	—	75	—	4
Хотюхово	19	43	62	—	2
Узнацк	12	30	42	—	—
Грицковичи	120	—	120	—	—
Слобода	19	45	64	—	3

Партизанская разведка имеет семь агентурных разведчиков. Есть полицейские в м Холопеничи и др., которые дают партизанам разведданные.

Командир бригады им. Кирова Пустовит

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 9051, воп. 1, спр. 6, лісты 61, 64.

Спіс сувязных Халопеніцкага падпольнага РК КПБ

1. Корзун Лидия Александровна д. Симанович
2. Беркутова Вера Сергеевна д. Гурец
3. Барашко Сидор Павлович д. Кащино
4. Коваленко Максим Яковлевич д. Кащино
5. Щупаков Сергей Сидорович д. Заровье
6. Шутько Николай Ефимович пос. Ясеневичи
7. Коваленко Ефим Павлович д. Загатье
8. Гуц (или Гуд) Валентина д.Вирни
9. Войтовская Мария д. Гоголевна
10. Кухаренко Павел д. Столбцы
11. Мазаник Надежда д. Изгородище
12. Гуц Григорий д. Колтки
13. Бернерова Вера д. Гулец
14. Наркевич Владимир Захарович д. Ст. Щавры
15. Будник Мария П. д. Ст. Щавры
16. Толкач Мария А. д. Ст. Щавры
17. Сыцик Иван д. М. Холопеничи
18. Глинская Мария д. М. Холопеничи
19. Голубовский Вячеслав А. д. М. Холопеничи
20. Беляев Константин А. д. М. Холопеничи
21. Кузюткина Вера Т. д. М. Холопеничи
22. Сливончик Иван Н. д. М. Холопеничи
23. Сливончик Федор д. М. Холопеничи
24. Маркович Анастасия д. М. Холопеничи
25. Жилинский Микель д. Якимовка
26. Жилинская Мария д. Якимовка
27. Чичин Мария Васильевна д. Сташное
28. Загорский Петр Владимирович д. Сташное
29. Мяделец Павел Ф. д. Сташное
30. Чорный Василий А. д. Сташное
31. Насевич Иосиф Иг. д. Капачевка
32. Асташко Иван Егорович д. Капачевка
33. Деревяго Василий Данилович д. Капачевка
34. Шульга Егор Семенович д. Максимовка
35. Макрицкий Николай д. Подберезье
36. Макрицкая София Николаевна д. Подберезье
37. Недбайло П. А. д. Осово
38. Коваленок Парфен Ал. д. Осово
39. Жук Мария Петровна д. Осово
40. Петревский Михаил Анатольевич д. Осово
41. Зинькевич Анна Ивановна д. Осово
42. Петровская Виктория д. Осово
43. Скуратович Таисия Владимировна д. Осово
44. Макрицкая Тамара Дл. д. Хотюхово
45. Макрицкий Алексей д. Хотюхово
46. Апет Иосиф Макарович д. Запрудье
47. Довгань Ольга Васильевна д. Осово
48. Круков Вакула д. Долгий Помет
49. Ляпеня Анатолий Иг. д. Жортайка
50. Зайцековская Мария д. Гоголевка
51. Волосович С. д. Дудинка
52. Лопеко Даша д. Жортайка
53. Трипутень Тарас д. Малое Осово
54. Скумс Гелена д. Липовец
55. Булай Прокоп М. д. Липовец
56. Скумс Владимир Николаевич д. Липовец
57. Амсос Матрена С. д. Таравки
58. Дирко Анастасия д. Липовец
59. Шедло Константин д. Липовец
60. Трипутень Лизавета д. Малое Осово

61. Рябцевич Тихон Анатольевич д. Старая Утеха
62. Стаин Елена Кондратовна д. Старая Утеха
63. Стаин Авдотья Григорьевна д. Старая Утеха
64. Апет Тимофей Романович д. Утеха
65. Камоско Андрей Иванович д. Ефимовка
66. Пурвин Назар д. Долгий Помет
67. Алей Федор Федорович д. Обоз
68. Шалак Алексей Панкратович д. Бараны
69. Шалак Пимен д. Загатье (расстрелян)
70. Кондратович Иван д. Обоз
71. Шустовский Митрофан д. Обоз
72. Бабарик К. д. С ?
73. Альхимович д. Бараука
74. Апет Тимофей д. Малая Утеха
75. Кудравец Илларион д. Корповица ?
76. Парабкович Данил д. Корповица
77. Плашконная Мария д. М. Холопеничи
78. Камоска Иван Иванович д. Якимовка
79. Дубина Илья д. Прудец
80. Крина Иван д. М. Хотюхово
81. Курьянова Надежда д. М. Хотюхово
82. Чарцуха Иван д. Барауха ?
83. Даниленко Кондрат д. Копачевка
84. Меделец Иосиф д. Бешенковка
85. Казыра Матрена д. Сивый Камень
86. Соловьева Дуня д. Глубоченцы ?
87. Сковородин Алистрат д. Гута
88. Лапеко Йозеф д. Жортайка
89. Нескевич Алексей Ст. д. Узнацк
90. Дубина Захар Григорьевич д. Волкалыск (бургомистр Узнацкой волости, арестован)
91. Протопович д. Волкалыск
92. Князев Петр Яковлевич д. Пересика
93. Плиско Иван д. Сивый Камень
94. Мазарновский д. Жертайка
95. Измайлович Мария д. Сивый Камень
96. Максимович Д-р д. Глубочица
97. Стаин Виктор Т. д. Жертайка
98. Николаенок Мария д. Якимовка
99. Орленок Владимир д. Подберезье
100. Макрицкий Бронислав д. Подберезье
101. Макрицкая Лида д. Подберезье
102. Батура Владимир д. Подберезье
103. Макрицкий Александр д. Подберезье
104. Макрицкий Павел д. Подберезье
105. Стребень Григорий П. д. Погорелое
106. Лапека Миля Григорьевна д. Романовщина
107. Крюков Алексей К. д. Максимовка
108. Кондратович Тоня д. Трояновка
109. Баровик Анна д. Барань
110. Соловьева Феня д. Глубочица
111. Жук Адам д. Селец
112. Авкимович Владимир д. Обоз
113. Пожилко Мария д. Утеха
114. Пугач Мария д. Хотюхово
115. Барейковская Михалина д. Бешанковка
116. Мядел Мария д. Бешанковка
117. Кульга Надежда д. Жертайка
118. Дирко Иван д. Липовец
119. Трипутень Степан д. Малое Осово
120. Мытько Александр д. Игрище
121. Федоров А. д. Вершевка
122. Шалак Анна А. д. Романовщина
123. Мартинкевич Адам
124. Завацкий Михаил д. Б. Осово
125. Апет Петр Федорович д. Запруды
126. Прадед Дорофей д. Бешанковка
127. Камоска Иван д. Якимовка
128. Пузавин Назар д. Помет
129. Никифоров Анисий д. Вершовка
130. Зуенок Григорий д. Осовец
131. Трипутень А. д. М. Осово

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3972, воп. 1, спр. 14.

Падрыхтаваў да друку М. А. Багушэвіч.

Партызаны ўспамінаюць былыя баі...

З успамінаў І. А. Алексіевіча, сувязнога 8-й Круглянскай партызанскай брыгады

Калі пачалася акупацыя, мне было 16 гадоў. З красавіка 1942 г. да чэрвеня 1944 г. я быў сувязным партызанскага атрада 8-й Круглянскай брыгады. Мне дапамагала тое, што мой дзед, Ігнат Сцяпанавіч Алексіевіч, і бацька, Аляксей Ігнатавіч Алексіевіч, у 1934 г. былі раскулачаны. Мясцовае насельніцтва і немцы пра гэта ведалі.

Дзед пасля размовы з партызанамі ў сакавіку 1942 г. пайшоў са мною ў в. Ухвала, дзе ўзяў нямецкі дакумент у бургамістра Дудкі, які быў добра яму знаёмы. Калі дзед прынёс дакументы на маё імя, нас наведалі тры партызаны. Яны гаварылі з ім і бацькам, пра што — не ведаю. Пасля адыходу партызан бацька мне сказаў, што я буду наведваць нямецкія гарнізоны Крупскага, Круглянскага, Бялыніцкага і Бярэзінскага раёнаў (наша в. Сомры размешчана на мяжы 4 раёнаў).

Першыя месяцы мяне суправаджаў бацька, пасля ў Дзянісавічы і Крупкі — бабуля, Маўра Янаўна Алексіевіч, яна была родам з в. Забалоцце Дзянісавіцкага сельсавета. У Бялыніцкі раён вазіла мама, Вера Міронаўна Алексіевіч. Наведваць партызанскія атрады мне не дазвалялася. Усе звесткі пра ворагаў, якія я збіраў, трымаў у памяці і перадаваў праз Івана Паўлавіча Алексіевіча, камісара 8-га партызанскага атрада па камсамольскай

рабоце. Часта даваў мне даручэнні Міхаіл Аляксеевіч Сокалаў.

Аднойчы ў жніўні 1943 г. была блакада ў в. Сомры, і мяне паслалі ў в. Свірыдаўка, што недалёка каля яе. Па дарозе я наведаў сваю добрую знаёмую Варвару Сямёнаўну Каленцыёнак, там і затрымаў мяне нямецкі перакладчык (хтосьці яму падказаў).

Карнікі доўга дапытвалі, білі. Цётка Варвара перадала майму бацьку, што здарылася бяда. Многа разоў прыходзілі дзед з бабуляй, бацька, цётка Ганна, прыносілі падарункі, прасілі, каб мяне не білі. Падарункі бралі, але мяне не адпускалі.

Выратавала мяне Каленцыёнак у той момант, калі моладзь вывозілі ў Германію. Яна ноччу вывела мяне з вёскі, і я пайшоў да бабулі з дзедам. Маці хутка памерла. Пасля яе смерці і здзекаў гітлераўцаў моцна балела галава. Я цяжка захварэў, здароўя няма і цяпер. *Падрыхтаваў да друку Дз.М. Хромчанка.*

З успамінаў К. І. Акуліча, намесніка камандзіра дыверсійнай групы, члена Барысаўскага падпольнага райкома партыі

У пачатку ліпеня 1941 г. ЦК КП(б)Б накіраваў у Крупскі раён дыверсійную групу на чале з былым сакратаром Барысаўскага РК КПБ І. А. Ярашам. У гэту групу ўвайшоў я, як член райкома партыі, А. Г. Хадаркевіч, былы пракурор раёна, А. М. Сляпцоў, сакратар РК ЛКСМБ, І. М. Кудзіновіч, старшыня Барысаўскага гарвыканкома, яшчэ 13 камсамольцаў Віцебскай абласной арганізацыі: Маханоўскі, Ханін, Гарадзецкі і інш.

У верасні 1941 г. атрад зрабіў налёт на Халопенічы, у выніку чаго было знішчана 40 немцаў і паліцэйскіх, адабрана прадукцыя маслазавода, падарваны электрастанцыя і воданапорная станцыя, здабыта зброя, пішучая машынка для друкавання баявога лістка «Смерць фашызму». Пасля гэтага атрад папоўніўся групай моладзі, сярод якой запомнілася Каця Трыпуцень, якая стала баявой сяброўкай малодшага лейтэнанта Аляксандра Мядзведзева. Сіламі атрада былі знішчаны нямецкія гарнізоны ў в. Чырвоныя Лукі, Каменка і інш. Тады ж каля аэрадрома в. Дакудава лейтэнант Мядзведзеў з ручнога кулямёта збіў варожы транспартны самалёт, які ішоў на пасадку. У агні згарэлі дзесяткі фашыстаў. Наш атрад спрабаваў правесці дыверсію на чыгункі каля станцыі Бобр, але яго напаткала няўдача. Атрад трапіў на нямецкую засаду, калі пераходзіў аўтамагістраль Масква—Мінск, на ўскрайку г. п. Бобр каля лесу. У гэтым баі загінулі Марыя Максімаўна Шчуцкая, ураджэнка Крупскага раёна, Сяргей Васілевіч Абрамовіч, былы сакратар партарганізацыі калгаса імя Камінтэрна, Ласкін, былы дырэктар Дома адпачынку «Блонь», старшы лейтэнант Марозаў з Растоўскай вобласці і інш., усяго 6 чалавек.

С.В.Абрамовіч.

У кастрычніку 1941 г. ў гонар 24-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі на ўчастку станцыі Навасады—Крупкі былі спушчаны пад адхон два варожыя эшалоны.

Неўзабаве наш атрад сустрэўся ў лесе з невялікай групай ваенных разведчыкаў пад камандаваннем старшага лейтэнанта Васіля Васілевіча Шчарбіны, а ў лістападзе 1941 г. — з групай дэсантнікаў (камандзір — маёр Мацвей Рыгоравіч Лінькоў), якія былі выкінуты на парашутах з самалёта. Наша група сустрэла спачатку Лінькова як нямецкага агента і абязброіла. Калі ўсё высветлілася, папрасілі ў яго прабачэння і вярнулі зброю. З дапамогай радыста групы дэсантнікаў з'явілася магчымасць слухаць радыёперадачы з Масквы. Нейкі час нашы дыверсійныя групы сумесна выступалі супраць невялікіх варожых гарнізонаў у раёне «Лосеў перасмык», што каля лясных масіваў. У другой палове лістапада 1941 г. група Лінькова, а потым і група старшага лейтэнанта Шчарбіны былі накіраваны ў заходнія вобласці Беларусі для выканання заданняў.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў Ф. П. Астроўскай, жыхаркі г. Крупкі

Ціхім і мірным было жыццё ў в. Ліцвінка да вайны. Старшынёй калгаса «Чырвоная зорка» ў той час працаваў Рыгор Шахрай.

Яго жонка, Галіна Фамінічна, узначальвала паляводчую брыгаду. За добрасумленную працу, чулыя адносіны да людзей аднавяскоўцы не адзін раз выбіралі яе сваім дэпутатам.

Але вось наступіла вясна. Вёску Ліцвінка з усіх бакоў акружаў лес, таму немцы, калі пачалася вайна, не адразу прыйшлі сюды. Сям'я Шахраяў чым магла дапамагала спачатку чырвонаармейцам, якія выходзілі з акружэння, а потым звязалася з групай супраціўлення на чале з Дзмітрыем Лебедзевым, што дзейнічала ў г. Барысаў і Барысаўскім р-не. Калі немцы натрапілі на след гэтай групы, падпольшчыкі, а іх было 7 мужчын і 2 жанчыны, пайшлі ў лес і размясціліся паблізу в. Ліцвінка. Шахраі былі іх сувязнымі. Аднойчы, калі група Лебедзева зрабіла дыверсію на чыгунцы каля в. Слаўнае, карнікі пачалі іх праследаваць. След прывёў да дома Шахраяў, дзе група спынялася на начоўку. Рыгор Шахрай, яго жонка Галіна Фамінічна і дачка Рэгіна былі схоплены і расстраляны. Пахаваны яны ў брацкай магіле ў Крупках, а група Лебедзева перабазіравалася пад Магілёў і там працягвала барацьбу. Толькі амаль ніхто з іх не дажыў да перамогі.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў В. Бабровіча, партызана 31-га атрада 15-й брыгады

Пасля разгрому партызанамі 3 жніўня 1942 г. станцыі Слаўнае ў гэтыя мясціны быў дадаткова перакінуты з Францыі 206-ы стралковы полк. Полк выгрузіўся на станцыях Крупкі, Бобр, Слаўнае. Адным з апорных пунктаў французаў стала вёска Новае Палессе на мяжы Крупскага і Круглянскага раёнаў.

Камадзіру дыверсійнай групы 31-га атрада Магілёўскага партызанскага злучэння Уладзіміру Мікітавічу Драбкову родам з в. Гапонавічы Крупскага раёна было загадана ў трохдзённы тэрмін разведаць аб прыбыўшым у партызанскую зону праціўніку.

Хутка сувязь была наладжана. Выяўлена, што французы не хочуць ваяваць, але і пераходзіць на бок партызан не могуць: у Францыі пацерпяць іх сем'і. Яшчэ праз некаторы час з дапамогай сяльчан Драбкову ўдалося наладзіць, як цяпер кажуць, бартэрны абмен: салдаты атрымлівалі свежае мяса, гародніну, фрукты, а партызаны зброю, боепрыпасы, соль, цукар, цыгарэты, галеты і шакалад на святы. У справаздачах начальству Драбкоў і камандзір атрада Назараў падкрэслівалі, што ў данай мясцовасці фактычна адноўлена Савецкая ўлада, а французы рапартавалі аб бліскучых перамогах над партызанамі і патрабавалі больш зброі і медыкаментаў. Немцы нешта западозрылі і вырашылі замяніць склад гарнізона на ўзмоцненую каманду на чале з нямецкімі афіцэрамі. Новапалескіх французаў падобнае рашэнне ніяк не задавальняла. Яны тэрмінова патрабавалі сустрэчы з Драбковым, якая адбылася ў кар'еры за 200 м ад вёскі. Аказалася, што 8 чэрвеня 1944 г. ў 10 гадзін раніцы са станцыі Слаўнае прыбываюць зменшчыкі. Было прынята рашэнне сустрэць іх так, як і патрабуецца ў такіх выпадках...

Вынікі ўдалай засады разбіраліся каля в. Любішча. Тут жа была аказана першая дапамога чатыром параненым французам. А тым часам танкісты, якія прымчаліся са Слаўнага і Бабра, ужо акружалі вёску і пачалі абстрэлы. Да першых двух цяжка параненых французаў лёс аднёсся жорстка: іх прыйшлося застрэліць. Двое іншых, нікім не ахоўваемых, далучыліся да нястройных радоў партызан і хутка зніклі ў напрамку в. Задні Бор, што побач з Ухвалай.

Раніцай у спісачны састаў 31-га партызанскага атрада рукой Уладзіміра Драбкова былі занесены наступныя даныя: Дэсертынет Клімо, 1907 года нараджэння, камуніст Францыі, з Ліёна; Пенель Альберт, 1915 года нараджэння, камуніст Францыі, 10 класаў, з рабочых, радавы з г. Бруаез. 11 чэрвеня 1944 г. камандаванне 206-га палка паспрабавала яшчэ раз прарвацца да Новага Палесся. І зноў партызаны былі папярэджаны.

13 чэрвеня таго ж года наш новы сувязны Клімо Дэсертынет далажыў камандзіру атрада Назараву аб атрыманым новапалескім гарнізонам загада адступаць разам з нямецкімі часцямі ў напрамку станцыі Бобр.

У той жа дзень гарнізон французаў прыняў нашу групу на чале з У. Драбковым, дапамог пагрузіць на падводы ўсю сваю зброю, а сам строем і з песняй «Марсельеза» адправіўся ў штаб 15-й партызанскай брыгады.

Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі палонных французаў перадалі тылавым часцям. Што ж датычыцца нашых сувязных Дэсертынета і Пенеля, якія мелі пасведчанні партызан Беларусі, дык было загадана даставіць іх у ваенную місію Дэ Голя ў Маскве, што і было мною зроблена.

Ленінскім курсам, 1991. 13 студзеня.

З успамінаў Л. К. Белай (Рапіцкай), партызанкі атрада імя Чапаева

Памятаю, як прызямлілася група дэсантнікаў. Гэта было вясной 1942 г. Мой бацька, Белы Канстанцін, з сынам Мікалаем у той час былі ў лесе. Да іх падышлі дзве дзяўчыны. Гэта былі Лёля Колесава (камандзір групы) і Ніна Іосіфаўна Шынкарэнка. Яны папрасілі, каб бацька ўзяў у іх хворую Зіну, якая ў час прызямлення пашкодзіла пазваночнік. Бацька з Мікалаем прывезлі яе да дому. Была яна ў нас ўсяго 5 дзён. Мама яе выходжвала. Аднак неўзабаве данеслі ў паліцыю, што ў нас партызанка. Зіну паспелі адвезці ў лес. Назаўтра раніцай наш дом акружылі фашысты. Нас усіх білі, маму, Белую Марыю Мікалаеўну, павезлі ў г. Барысаў. Два тыдні здзекваліся, потым яе расстралялі, хату нашу спалілі. Нас было сямёра. Брат Мікалай з Лёляй Колесавай хадзіў на заданне, яны падарвалі поезд каля в. Прыяміна. У пачатку кастрычніка 1942 г. Мікалая злавілі і павезлі ў крупскую турму, дзе і расстралялі. Праз некаторы час да нас зайшлі камандзір дэсантнай групы В. Бухаў і Мікалай Дзянісавіч Івашкевіч, яны ўзялі мяне ў атрад, там быў і мой бацька, меншыя дзеці засталіся дома. Я працавала на кухні. У чэрвені 1942 г. быў сфарміраваны партызанскі атрад імя К. Я. Варашылава (камісар — Феадосій Вавілавіч Юданоў). Д. і М. Белыя, В. Шугаеў, В. Нішчанка, В. Арлоў і іншыя арганізавалі атрад імя В. І. Чапаева, бацьку прызначылі камандзірам аддзялення. Я папрасілася ў гэты атрад у групу падрыўнікоў. Нашы атрады дзейнічалі ў лясах Чэрвеньскага і Бярэзінскага раёнаў. Аднойчы хадзілі ў Барысаўскі раён на заданне «на жалезку», пусцілі пад адхон варожы эшалон пад Стаямі, у наступны раз — ледзь не ўвесь састаў праціўніка. Праз тыдзень атрымалі заданне: узрываць чыгунку па ўсёй Беларусі. Я таксама пайшла на гэта заданне. Ішлі дзве ночы і дзень. Калі прыйшлі да месца, камандзір раздаў бікфордавыя шнуры, шашкі, толу, капсулы і запалкі. Адышлі адзін ад другога на 6 метраў. Далі каманду: «Уперад!» Па чыгунцы рухалася браніраваная дрызіна, на якой фашысты везлі рабочых. Яна спынілася каля нас. У гэтай аперацыі загінулі некалькі партызан, мой бацька быў паранены. Я вымушана была з дапамогай партызан перавесці бацьку ў вёску, і там яго даглядала. Пасля вызвалення Беларусі бацьку адправілі на самалёце ў Маскву на лячэнне.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

В. М. Брыжэўскі.

І. А. Яраш.

І. Ц. Ламінскі.

З успамінаў В. М. Брыжэўскага, члена Барысаўскага рэгіянальнага падпольнага камітэта

У верасні 1941 г. Іван Апанасавіч Яраш, кіраўнік Барысаўскага падпольнага райкома партыі, пры сустрэчы сказаў, што для лепшай канспірацыі і кіраўніцтва падпольнай работай у раёне куставы падпольны камітэт падзяліўся на некалькі падпольных камітэтаў. Былі арганізаваны падпольныя камітэты ў Халопеніцкім (кіраўнік — палітрук Чырвонай Арміі Ламінскі пад мянушкай «Сіротка»), Крупскім (кіраўнік — камандзір Чырвонай Арміі Аляксандр Мядзведзеў пад мянушкай «Лясных»), Смалявіцкім (кіраўнік — камуніст Пятровіч пад мянушкай «Паравозаў»), Бягомльскім (кіраўнік — мой стары знаёмы Маньковіч) раёнах. У Плешчаніцкім раёне кіраўніка яшчэ не было. Рашэннем бюро райкома партыі начальнікам асобнага аддзела куставога падпольнага камітэта зацверджаны Хадаркевіч, а я — яго намеснікам.

З майго боку было прапанавана, каб падпольны камітэт разам з партызанскім атрадам перабраліся далей у лес, бліжэй да возера Палік, або аб'ядналіся з падпольнай групоўкай Віцебскай вобласці дзеля захавання ў зімовы перыяд падпольных кадраў.

На хутары Будзішча былога Баранскага сельсавета, дзе я жыў з сям'ёй, знаходзілася яўка членаў Барысаўскага куставога падпольнага камітэта, а таксама кіраўнікоў і членаў падпольных арганізацый Халопеніцкага і Крупскага раёнаў. У маю адсутнасць членаў падполля прымалі Адам Юльянавіч Рашэўскі або Леаніда Стафанаўна Марцінкевіч. Усе прынятыя звесткі ад падпольных арганізацый і камітэтаў я перадаваў праз паштовую скрынку раённаму падпольнаму камітэту або асабіста пры сустрэчы Яражу. Паступова рады падпольных арганізацый у былым Халопеніцкім раёне папоўніліся.

Падпольныя арганізацыі былі створаны ў г. п. Крупкі, на чыгуначнай станцыі Крупкі, у пасёлку Бобр, Абчугскім сельсавеце і інш., дзейнічалі пад кіраўніцтвам Барысаўскага куставога гаркома партыі на чале з І. А. Яршам і арганізаванага падпольнага камітэта Крупскага раёна на чале з Мядзведзевым.

За снежань 1941 і студзень 1942 г. я, Мядзведзеў, Ламінскі і К. Н. Трыпуцень, сакратар райкома камсамола Халопеніцкага падпольнага камітэта, склалі спісы ўліку падпольных кадраў, у тым ліку актыўных сувязных Крупскага, Халопеніцкага, Барысаўскага раёнаў і горада Барысава, узялі таксама на ўлік зброю з боепрыпасамі ўсіх відаў. 26 лютага 1942 г. каля в. Зачысце была акружана і амаль поўнасцю знішчана група Яраша. Загінуў і сам Яраш, а крыху пазней, 28 сакавіка, ва ўрочышчы Пеністы Ручай каля хутара Будзішча быў разгромлены і атрад Мядзведзева. У няроўным баі загінулі Мядзведзеў і падпольшчыкі Аляксандр Чэрапаў, Абдул Мухамедаў, Барыс Паднос, Кацярына Нічыпараўна Трыпуцень, Соня Левіна. Цяжка былі паранены Канстанцін Серабракоў, сакратар падпольнага камітэта Крупскага райкома камсамола, камандзір Чырвонай Арміі, і Паліна Левіна, камсамолка. Нямецкія карнікі захапілі іх у палон і пасля катаванняў на допытах расстралялі ў г. п. Халопенічы. Жывым з бою выйшаў адзін І. Ц. Ламінскі, бо ён у той час знаходзіўся ў аддаленасці на варце ў лесе. Ворагі страцілі ў тым баі 17 салдат, аднаго афіцэра, шмат нямецкіх салдат было паранена, і таму вопытнага падпольшчыка праследаваць не сталі.

У жніўні 1942 г. да мяне на хутар Будзішча з'явіўся чалавек, якога я не ведаў, з вінтоўкай. Невядомы не назваў пароль яўкі, а толькі сваё прозвішча — Купчэня, прад'явіў дакументы для пацвярджэння. Калі я азнаёміўся з імі, даведаўся, што Міхаіл Купрыянавіч Купчэня прыбыў з-за лініі фронту для арганізацыі падпольнай сеткі. Я расказаў яму, дзе жыў, працаваў да вайны, а таксама пра работу Барысаўскага куставога падпольнага камітэта, пра арышты кіраўнікоў падпольных арганізацый, пра цяжкія ўмовы падпольнай работы.

Пасля стварэння партызанскага атрада імя С. М. Кірава брыгады імя С. М. Кірава я з іншымі членамі падпольнай арганізацыі «Маладзёжная» хацеў скласці свае паўнамоцтвы, але члены бюро падпольнага камітэта Халопеніцкага раёна не згадзіліся з гэтым, бо «Маладзёжная» пад маім кіраўніцтвам была асноўным звяном загінуўшага Барысаўскага падпольнага камітэта, мела вопыт барацьбы, сувязі па горадзе і раёнам. У партызанскі атрад мы трапілі пазней.

Падрыхтаваў да друку М. А. Баравуля.

З успамінаў С. М. Валасач, сувязной Халопеніцкага падпольнага РК ЛКСМБ

Сувязной падпольнага РК ЛКСМБ і партызанскай брыгады імя С. М. Кірава, якая дзейнічала на тэрыторыі Халопеніцкага раёна, я была са снежня 1942 да 28 чэрвеня 1944 г. Забяспечвала падпольны РК ЛКСМБ і брыгаду імя Кірава паперай, медыкаментамі, распаўсюджвала сярод насельніцтва савецкія газеты і лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро. Медыкаменты і перавязачны матэрыял прыносіла з Халопеніцкай бальніцы, дзе ў час вайны працаваў мой муж Уладзімір Фёдаровіч Паўлоўскі. Дапамагаў мне таксама аптэкар Пётр Лявонцьевіч Кісялёў. У сакавіку 1944 г. Паўлоўскі і Кісялёў былі арыштаваны нямецкімі захопнікамі і знаходзіліся ў турме г. п. Халопенічы.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў Б. Н. Вацлаўскага, камандзіра групы дэсантнікаў

Наша група дэсантнікаў у складзе 14 чалавек, у тым ліку дзяўчына Маша Галаўцюкова, ў ноч з 22 на 23 сакавіка 1942 г. прызямлілася на лясную паляну каля в. Дзянісавічы.

Б.Н.Вацлаўскі.

Свята 1 Мая мы адзначылі падрывам фашысцкага эшалона з боепрыпасамі паблізу Крупак. 10 мая пусцілі пад адхон эшалон з жывой сілай праціўніка. У гэты ж дзень я атрымаў радыёграму аб прызямленні 10 дзяўчат-дэсантнікаў на чале з Аленай Колесавай. Які лёс пасціг групу пасля прызямлення, вы ведаеце. Скажу толькі, што ў выніку цяжкага ранення Зіначкі Марозавай я выклікаў з Масквы яшчэ адну групу, лейтэнанта Сарокі, у складзе якой быў фельчар, дарэчы, сябар Зіначкі. Звалі яго Валерый. Прызямленне групы Сарокі адбылося ў месячную ноч і на вачах гарнізона Крупак. Хутка мы выйшлі з лесу і сталі дзейнічаць больш адкрыта.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў Д. Х. Гафштэйна, камандзіра разведгрупы Заходняга фронту асобнага партызанскага атрада І. А. Яраша

11 ліпеня 1941 г. нашу групу разведчыкаў Заходняга фронту накіравалі за лінію фронту на тэрыторыю Крупскага і Барысаўскага раёнаў для вядзення разведработы і арганізацыі партызанскага руху. Калі мы выйшлі ў той дзень з Дуброўна, нас было чалавек 80—90, у тым ліку ваенных 40—50.

У канцы ліпеня мы сустрэліся з групай І. А. Яраша і вырашылі аб'яднацца. Базай стаў лес каля в. Зачысце Барысаўскага і в. Клён Крупскага раёнаў. Побач з в. Зачысце зрабілі буданы, накрылі іх карою ад елак. Свае дзеянні пачалі з дыверсіі на чыгунцы. Зайшлі ў мяст. Бобр з боку моста. У Бабры была ўжо паліцыя. Мы падышлі да могілак і доўга там чакалі, бо з-за вялікай колькасці машын немагчыма было перайсці цераз магістраль. Калі рух супакоіўся, хуценька перабеглі групамі. Але каля станцыі Бобр нам зрабілі засаду. Яраш загадаў: «Толькі наступаць!» Мы пярэчылі, бо лічылі, што слаба ўзброеныя. Ён пагадзіўся, і мы вырашылі адысці. Зноў рассыпаліся па Бабры, адкуль накіраваліся да лесу. Па нас пачалі ўжо страляць з кулямётаў і аўтаматаў. Многія з вялікімі цяжкасцямі, але ўсё ж дайшлі да лесу. Я і яшчэ адзін баец кінуліся да ракі, схаваліся каля абрыву. Доўга ляжалі. Раніцай і мы дабраліся да лесу, дзе сустрэлі выпадкова свайго вартавога.

У Бабры загінулі 9 нашых таварышаў. Сярод іх Ласкін, Каплан, Абрамовіч, Шуцкая, лейтэнант Кавалёў (або Кузняцоў), якіх немцы спалілі ў хляве.

Пасля адышлі да в. Пярэсіка, дзе быў смяротна паранены наш баец Васіль Красікаў (пахаваны на паляне каля рачулкі ў в. Каменка). Спыніліся каля хутарка. Там параніла ў плячо Аляксандра Мядзведзева. Ён памёр. Пасля па нашай групе ўдарылі з усіх бакоў кулямёты і аўтаматы. Мы вымушаны былі накіравацца ў бок балота. Там мы рассыпаліся. Гэта было 30 кастрычніка 1941 г. У в. Каменка К. І. Акуліч з групай адарваліся і трапілі пазней у палон. Разам з імі быў Сляпцоў — сакратар райкома камсамола, а таксама Баброў, Кучынскі і інш.

Падрыхтаваў да друку М. А. Баравуля.

З успамінаў І. М. Гяршовіча, камісара 277-га партызанскага палка

Наступленне на мост каля в. Нача ў верасні 1942 г. павінна было весціся ўздоўж чыгункі, з поўдня ад Барысава на Крупкі. Разам з намі ў аперацыі ўдзельнічалі спецатрад і 115-ы атрад. Злева ад чыгункі ішоў узвод Коўрыка, справа — Дарыенкі і Камарова, а таксама камандаванне рот. Камандаваў наступленнем А. І. Анцюх. Асноўны ўдар меркавалася нанесці з правага боку чыгункі, дзе два ўзводы былі ўзмоцнены кулямётамі (напрыклад, адзін узвод Камарова меў шэсць ручных кулямётаў).

Для паспяховага наступлення разгром аховы моста на шашы, мініраванне шашы з боку Крупак, а таксама арганізацыя засады на немцаў, якія маглі з'явіцца для падмацавання, былі даручаны ўзводу Сіліна. З боку Барысава павінен быў дзейнічаць узвод Коканцава. Гэтыя два ўзводы былі звязаны паміж сабою. Узводу Яўстратава даручалася падарваць рэйкі на чыгунцы з боку станцыі Прыяміна. Разам з узводам Яўстратава ішоў 115-ы атрад. Участак чыгункі ад станцыі

Крупкі мініраваў і арганізоўваў засаду каля яго 278-ы спецатрад. Каля драўлянага моста на Кацярынінскім шляху дзейнічаў узвод Русецкага.

8 верасня ўсе рыхтаваліся да аперацыі. Атрады размеркаваліся ў лесе, паблізу месца дзеяння. Каля нас праходзілі розныя людзі. Каб не выдаваць свайго месцазнаходжання, усіх, хто праходзіў, затрымлівалі. Час для кожнага падраздзялення быў распісаны па гадзінах і хвілінах. Першымі накіраваліся падраздзяленні, што арганізоўвалі засады на чыгункі і шашы. Гэта 278-ы спецатрад пад камандаваннем М. І. Кнігі і ўзвод Русецкага. За спецатрадам выступіў узвод Яўстратава і 115-ы атрад. Апошнімі адышлі ўзводы Сіліна і Коканцава.

22 гадзіны 30 хвілін. Амаль адначасова былі чуваць невялікія ўзрывы. Гэта партызаны прыступілі да выканання задання. Зноў цішыня. 23 гадзіны. На мост з 13 кулямётамі пайшлі тры ўзводы. Я ішоў ціха, каб не прыцягнуць увагу аховы моста. Мы дайшлі да завалу са зрубленых кустоў. У самага палатна чыгункі апынуўся Анцюх з узводам Дарыенкі, за імі Судакоў з аддзяленнем падрыўнікоў, справа наша рота.

Мы вельмі асцярожна прабіраліся па завале, пераадолелі амаль палову шляху. Нас пакуль яшчэ не выявілі. Анцюх з узводам Дарыенкі быў ужо за дваццаць метраў ад моста, як раптам нехта зачапіўся за сук і паваліўся, за ім другі.

Вартаўнік моста па-нямецку загадаў спыніцца. Усе сталіся. Тады з моста немцы адкрылі агонь. Камандзір нашай роты Токараў падрыхтаваў кулямёты да бою. Я перадаў Анцюху, што і мы адкрываем агонь. Ён загадаў як мага бліжэй падысці да моста і пакуль не страляць. Анцюх быў ужо каля апоры моста, калі пачалі паліць яшчэ два кулямёты. Ён быў смяротна паранены доўгай чаргою. Сем куль літаральна перарэзалі яго жывот і грудзі. Потым загінула і Галя з санчасці, быў смяротна паранены Нечыпурэнка, моцна паранены Лысенка, які нёс з падрыўнікамі тол. Радзюк забраў у яго тол.

Мы разумелі, што калі не вывесці са строю кулямёт, могуць рэзка ўзрасці нашы страты, падымецца ахова моста, і аперацыя сарвецца. Кулямёт прымусіў прыпасці да зямлі. Рух да моста спыніўся, але нельга губляць час. У гэты крытычны момант, не звяртаючы ўвагі на смяротную небяспеку, апрануўшы нямецкую форму, з чэшскім кулямётам на палатно чыгункі смела выскачыў малады камсамолец Валодзя Шалай. Ён расстраляў нямецкага кулямётчыка і адкрыў дарогу на мост. Адначасова Токараў даў каманду сваім кулямётчыкам пачаць агонь па моце. Пад прыкрыццем гэтага агню Дарыенка з групай байцоў і Валодзя Шалай, што знаходзіўся на насыпе чыгункі, першымі ўварваліся на мост і збілі ахову, за імі мы з узводам Камарова, з другога боку дарогі — Коўрык. Яны ўтраіх пабеглі цераз мост да вартавога памяшкання. Гітлераўцы ўжо ўскочылі з ложкаў, але яшчэ не апамяталіся. У акно памяшкання адна за другой паляцелі тры гранаты. Тыя гітлераўцы, што адстрэльваліся з акна, хутка сціхлі, астатнія ўцякалі праз дзверы казармы, дзе іх касілі кулямётчыкі першай роты. Мост быў захоплены. На ім пачалі гаспадарыць падрыўнікі. З пачаткам наступлення на чыгуначны мост ахову моста на шашы знішчылі ўзводы Сіліна і Коканцава, але яна, відаць, паспела паведаміць у Крупкі, Прыяміна і Барысаў пра напад партызан.

Нямецкае камандаванне адрэагавала на паведамленне адразу. Па шашы з Крупак прыбыло падмацаванне на трох машынах. Рухаліся яны на вялікай хуткасці. Першая машына падарвалася на міне, другая на яе наскочыла, трэцяя завярнула назад, аднак узводы Сіліна і Коканцава сваю справу зрабілі. Частка падмацавання была знішчана, другая збегла.

Было накіравана нямецкае падмацаванне і па чыгункі са станцыі Прыяміна, дзе ў гэты час рыхтаваўся да адпраўкі цягнік з жывою сілай. Састаў, які складаўся з паравоза і 17 вагонаў, таксама спяшаўся на дапамогу гарнізону моста. Калі паравоз падарваўся на партызанскай міне, катастрофа здавалася немінучай. Вагоны набягалі адзін на другі, выгнуліся дугою і паваліліся. Яўстратаў і 115-ы атрад абстралялі састаў.

У гэты час на месце хутка дзейнічалі падрыўнікі. Судакоў і Радзюк прывязалі тол да самых напружаных вузлоў моста. Судакоў-сапёр рабіў гэта з веданнем справы.

— Дзе яшчэ 14 кілаграмаў толу? — пытаўся ён у падрыўнікоў. — Усе прынеслі тол?

— Усе, — адказалі тыя.

— Але не хапае 14 кілаграмаў і адсутнічае Якавенка з толам.

Судакоў абураўся, патрабаваў знайсці Якавенку, які, як потым высветлілася, затрымаўся ў гэты момант каля забітага Анцюха.

Нарэшце Судакоў гучна, на ўвесь голас аддаў каманду:

— Усім пакінуць мост! Спусціцца і схавацца. У час выбуху рот трымаць адкрытым, каб не лопнулі барабанныя перапонкі.

Там засталіся толькі Судакоў і Якавенка, якія падпальвалі бікфордавыя шнуры. Хутка і яны пакінулі мост.

Усе чакалі выбуху. Прайшла хвіліна, другая, а ўсім здавалася, што значна больш. І раптам нечакана грымнула. Вакол моста мясцовасць стала светлай. Нам здавалася, што мост падняло ўверх. Але выбух не зрабіў на партызан патрэбнага ўражання. Усе чакалі большага. Пасля выявілася, што гукі ад выбуху адчулі па-сапраўднаму на адлегласці 10—12 км ад месца. Сяляне потым расказвалі: «Так трахнула, аж шыбы вылецелі».

Мост цераз р. Нача на чыгунцы Барысаў—Орша быў падарваны, урадавае заданне выканана. Былі знішчаны 13 немцаў і 11 здраднікаў, падабраны трафеі: адзін кулямёт, адзін аўтамат, 18 вінтовак, 5150 патронаў. Пры адыходзе ад моста ўзнікла думка разбіць паліцэйскі гарнізон у в. Нача. Штаб атрада згадзіўся, і воіны рушылі ў напрамку в. Нача. Кіраўніцтва аперацыяй па разгроме гарнізона даручалася камандаванню першай роты. Вёў жа да вёскі паліцэйскі таго ж гарнізона. Як толькі пачалося наступленне на мост, ён адразу пакінуў вёску і накіраваўся ў яго бок, каб сустрэць партызан. Яго затрымалі вартавыя і прывялі ў штаб. Аказалася, што ён вайсковец, знаходзіўся на акупіраванай тэрыторыі і ў паліцыю ўзяты прымусова. Цяпер ён рады быў выканаць любое заданне, бо даўно шукаў сустрэчы з партызанамі. Такі выпадак надарыўся толькі цяпер.

Паліцэйскі вёў нас упэўнена, гаварыў, дзе казарма, дзе жыве начальнік паліцыі і яго памочнік, пра ўзбраенне гарнізона.

Удар мы нанеслі нечаканы, моцны і імклівы. Гарнізон быў знішчаны ўвесь: забіты 26 паліцэйскіх на чале з начальнікам паліцыі, узяты адзін кулямёт, адзін аўтамат, 21 вінтоўка, знішчана апаратура маслазавода, якая выкарыстоўвалася для нямецкіх патрэб.

Раніцай на палянцы ў лесе мы пахавалі нашых баявых сяброў. Прагучаў трохразовы залп і клятва: «Справа, за якую вы аддалі свае жыцці, мы давядзем да канца. Вораг будзе разбіты і выгнаны з нашай Савецкай Радзімы». Астанкі Анцюха былі перанесены пасля ў в. Бацэвічы Клічаўскага р-на, адкуль ён родам.

Падрыхтаваў да друку М. А. Баравуля.

З успамінаў С. М. Дубіны, сувязнога брыгады імя Кірава

Цяжкім каменем легла на сэрцы маё і маіх таварышаў паведамленне ўрада, што пачалася вайна. Здарылася так, што райваенкамат не паспеў мабілізаваць усіх ваеннаабавязаных для адпраўкі на фронт.

Большасць ваеннаабавязаных засталася па месцы жыхарства ў вёсках, якія хутка акупіравалі фашысты. Я тады жыў у в. Прудзец Халопеніцкага сельсавета. З першых дзён акупацыі фашысты праявілі ўсе свае зверствы і нянавісць да нашага народа. Трэба было шукаць шляхі барацьбы з імі. Калі мы пачулі па радыё зварот Сталіна да народаў, якія аказаліся на акупіраванай тэрыторыі, з заклікам весці рашучую барацьбу з фашыстамі, не даваць ім спакою ні днём, ні ноччу, хаваць жывёлу, харчы, хавацца ад угону ў германскае рабства, гэта натхніла нас. У час акупацыі ваеннаабавязаныя мужчыны пад кіраўніцтвам мясцовых камуністаў, такіх, як мой старэйшы брат Ілья Макаравіч Дубіна, Андрэй Антонавіч і Іван Антонавіч Камоскія збіралі дарослае насельніцтва па вёсках, знаёмілі са зваротам нашага ўрада. У той нялёгкі час мы былі заняты вельмі цяжкай справаю. Спачатку выходзілі групамі па некалькі чалавек на дарогі, рабілі перакопы, лясныя завалы, разбуралі масты, рэзалі тэлефонныя слупы, ламалі дрот, прабіраліся на месцы былых баёў, падбіралі зброю, неслі да сябе.

Восенню мой брат Ілья, браты Камоскія і Іван Гаўрылавіч Дзеравяга з суседняй в. Якімаўка ўзялі зброю і пайшлі ў партызаны. Мне яны параілі застацца ў вёсцы для падтрымлівання сувязі, але ў студзені 1943 г. я і мой брат Пётр былі арыштаваны Халопеніц-

П.С.Шалак (справа) і С.М.Дубіна.

кім СД. Трымалі нас у Халопенічах, Крупках, потым павезлі некуды праз Радашковічы, але да месца не даехалі. Ноччу мы з таварышамі праламалі ў вагоне дзверы і выскачылі, пры гэтым моцна пабіліся. Перасільваючы боль, пайшлі ў лес. Я вельмі прастудзіўся. Таварышы вырашылі прабірацца на фронт, а мне як хвораму параілі вярнуцца дадому і лячыцца. Дабіраўся я доўга, да сакавіка 1943 г. У раёне скрозь стаялі нямецкія гарнізоны. Вакол дзейнічалі партызанскія атрады імя Кірава, імя Фрунзе, «За Перамогу» брыгады імя С. М. Кірава. У атрадзе імя Кірава быў мой брат Ілья з сябрамі. Калі я ўжо пачаў папраўляцца, браты наведалі мяне. Хутка я сустрэўся з разведчыкам атрада «За Перамогу» Пятром Савельевічам Шалаком (са жніўня 1943 г. ён працаваў членам бюро і інструктарам падпольнага Халопеніцкага РК ЛКСМБ). Часта да нас заходзілі Іван Сідаравіч Пыскін, сакратар падпольнага Халопеніцкага РК ЛКСМБ, інструктары РК КПБ Павел Лукіч Цехановіч і Уладзімір Фёдаравіч Стаін. Яны ведалі пра падзеі на фронце, расказвалі і чыталі пра поспехі Чырвонай Арміі, выкрывалі падман акупантаў. Нам пакідалі лістоўкі і газеты, якія былі надрукаваны ў брыгаднай друкарні, для распаўсюджвання ў суседнія населеныя пункты, галоўным чынам туды, куды не маглі дайсці партызаны.

Мы здабывалі для брыгады звесткі пра планы ворагаў, выкрывалі здраднікаў, аказвалі дапамогу ў зборы харчоў і адзення. Нярэдка да нас у вёску заходзілі Ігнат Агеевіч Чарнуха, Мікалай Антонавіч Бур'як. З нашай дапамогай іх узводы заўсёды дабіраліся да суседніх вёсак, дзе сяляне дапамагалі партызанам харчамі, адзеннем і абуткам.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў С. Г. Жуніна

РАЗГРОМ ГАРНІЗОНА Ў ДЗЯНІСАВІЧАХ

Ночью 20 сентября партизаны 30-го и 8-го отрядов подошли к деревне Денисовичи. Окружили гарнизон со всех сторон. Часовые из подпольной группы Соколова покинули посты и перешли к партизанам.

Был второй час ночи. По команде ударили пулемёты, раздались короткие автоматные очереди, полетели гранаты. Те, кто пытался бежать, попадали под меткий огонь автоматчиков Ивана Корецкого, Александра Турзанова, Егора Лесуна, Михаила Ваденеева, Владимира Конопелько, Николая, Михаила

С.Г.Жунін.

М.А.Сакалоў.

и Виктора Жебуртовичей, пулемётчиков Ивана Камнева, Яши Капенкина, Николая Дудкевича, Анатолия Кузняева, Караева, Авсиевича и других. Фашисты не ожидали нападения. Многие выскочили в нательном белье, бросились бежать в сторону Крупок и Бобра, но путь им преградили засады партизан. Подрывники взрывали дзоты. Горело помещение бывшей школы. Вокруг него лежало более 60 трупов противника. Но вдруг из-за горящего здания раздалось несколько выстрелов. Пулеметчик Иван Камнев осел на колено, а потом упал, широко раскинув руки.

Подан сигнал к отходу. Партизаны захватили много трофейных винтовок и автоматов, четыре ручных пулемёта, ящики с патронами. На опушке леса остановились, еще раз проверили свои ряды. Пополнение состояло из 14 человек во главе с Михаилом Алексеевичем Соколовым. Двинулись в район деревни Попарное. На одной из повозок ехала Ульяна Исаковна, мать Ани Козловской. Возле нее сидел младший сын Михаил, а Николай и Дмитрий шагали рядом. С этой ночи они стали партизанами.

22 сентября 1942 г. на кладбище возле деревни Осетище хоронили погибшего при разгроме денисовичского гарнизона смелого партизана пулеметчика Ивана Артемовича Камнева.

Группа Соколова влилась в 30-й отряд. Михаил Алексеевич был назначен командиром взвода. Он мужественно сражался с врагом. После разгрома гарнизона в д. Денисовичи прибыло 200 немецких солдат и офицеров, на вооружении которых имелось 3 батальонных миномета, 2 пушки и бронетранспортер. На домах ближайших деревень, а также в райцентре были вывешены объявления, в которых за живого или мертвого Соко-

лова обещалось в награду 25 гектаров земли и 50 тысяч марок.

* * *

При выполнении боевого задания недалеко от станции Бобр погиб наш связной Михаил Мицкевич. Тогда второй связной Степан Войтехович, который считался самым находчивым, решил сам провести диверсию на железной дороге, но возле д. Молявки был схвачен. На допросах держался мужественно. Никто из группы не пострадал.

Я уже много рассказывал о связных. Они выполняли большую и опасную работу. Хочу еще раз воздать им по заслугам. Подпольщики вели организованную работу с врагом. Приведем одно донесение Георгия Якублевича: «Т. Антонов (Машицкий. — С. Ж.). Я просил вас помочь оформить для моих работников какие-нибудь документы. Ребята заняты в разных местах и очень многое делают. Но в случае внезапного ухода я их собрать к себе не могу. А без документов в другой отряд не примут. В свой же могут не попасть. Нужно сделать такие документы, чтобы мои работники, если будет такая необходимость, смогли присоединиться к любому партизанскому отряду».

Как видите, речь идет об организованной группе, в которой есть свой руководитель. На этой же станции Бобр жил Юлиан Кржачковский, который хорошо разбирался в чертежах, мог воспроизвести любую схему. С ним подружился Георгий Якублевич. Юлиан составил подробную схему станции с указанием интересующих нас объектов. Схема была использована при очередных налетах партизан на станцию Бобр.

Тесно сотрудничал с партизанами Федос Васильевич Клещенок из Малого Вязка, который до войны работал председателем колхоза. В первое время он снабжал нас хлебом и другими продуктами, передавал оружие и боеприпасы. По его донесениям часто устраивались засады на участке Ухвала—Денисовичи. Но вот пришла тревожная весть: арестован Федос. Аким Айсаев с группой партизан-кавалеристов помчался наперерез врагу. Клещенок был освобожден, а сопровождавшие его гитлеровцы расстреляны. Враги сожгли дом, в котором сгорели отец и мать Федоса Клещенка. Его жену и детей мы успели спасти и отправить в партизанскую деревню Осетище. Федос Васильевич стал отважным подрывником в 8-м отряде.

Друкуецца па кн.: Жунин С. Г. От Днепра до Буга. Мн., 1974.

З артыкула В. М. Залескага пра партызанскую сястру міласэрнасці Я. М. Шаўчэнка

... У Крупскай бальніцы засталося шмат параненых байцоў, камандзіраў, многія размяшчаліся ў хатах мясцовых жыхароў. Медыкі і жыхары пасёлка рабілі ўсё, каб яны хутчэй выздаравелі. Потым, забяспечыўшы неабходнымі харчамі, адпраўлялі іх на фронт. Дні і ночы праводзіла Жэня (Яўгенія Максімаўна Шаўчэнка. — М.Б.) каля хворых... Перавязвала, карміла, збірала ў дарогу. Але ёй хацелася далучыцца да больш актыўнай барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ліпеньскім вечарам 1941 г. яна падзялілася сваімі думкамі з фельдшарам бальніцы, камуністам Аркадзем Сцяпанавічам Філонавым (трэба Сцяпанам Давыдавічам. — М.Б.).

— Не кіпяціся, Жэня. — сказаў ён. — Я камуніст, ты камсамолка. Нам трэба разам думаць, як будзем змагацца. Неабходна ўстанавіць сувязь з партызанамі. Гэта вельмі патрэбная, але небяспечная справа.

А. С. Філонаў пазнаёміў Жэню яшчэ з адной падпольшчыцай-медсястрой дзіцячай кансультацыі Варварай Шчамялёвай. Праз яе Жэня атрымала сваё першае заданне. Неабходна было тэрмінова перадаць у в. Новая Крупка звесткі пра ворагаў, марлю і медыкаменты. Усё гэта Жэня надзейна схавала, прывязала вялікай хусткай да грудзей маленькага Валодзю (сына. — М.Б.) і пайшла. Ці было ёй страшна? Цяпер, калі прайшло столькі часу, гэта першае заданне здаецца ёй асабліва памятным. Страшна было не за сябе — за сына. Бо калі б зрабілі вобыск і знайшлі ўсё тое, што яна несла, яе расстралялі б разам з сынам. Каб пазбегнуць правалаў, сувязь з лесам ажыццяўлялася эстафетна, па ланцужку. Кожны сувязны ведаў толькі таго, ад каго атрымліваў даручэнне і таго, каму гэтае заданне трэба было перадаць. Так ішло паведамленне ад аднаго сувязнога да другога за дзесяткі кіламетраў.

Шмат разоў хадзіла Жэня па знаёмых ёй сцяжынках і перадавала партызанам патрэбную інфармацыю, медыкаменты, зброю. Так было да 13 верасня 1941 г.

У гэты дзень яна, як звычайна, працавала ў амбулаторыі, ставіла банкі, рабіла ўколы. Уварваліся фашысты. Яе арыштавалі і кінулі ў турму. Нехта паведаміў акупантам, што яна звязана з партызанамі. Як кашмарны сон успамінае Жэня доўгія ночы і дні, што правяла ў фашысцкіх засценках. Яе пыталі, 5 сутак

не давалі ні есці, ні піць, у каленны і іншыя суставы рабілі нейкія ўколы, пасля чаго падымалася тэмпература і пачыналася трызненне. І тады ў Жэні пыталіся:

— Дзе партызаны?

Але, нягледзячы на нечалавечыя пакуты, яна выстаяла, нікога не выдаўшы. Так нічога не дамагліся фашысты ад яе, з-за адсутнасці ўлік праз два з паловай месяцы выпусцілі. Гэта адбылося ў 3 гадзіны дня 28 снежня 1941 г.

Увечары таго ж дня да яе дома прабраліся 2 партызаны. Яны пастукалі ў замёрзлае акно.

— Збірайся, Жэня, табе тут заставацца нельга, за табой сочаць, трэба ўцякаць.

Апранулі яе ў цёплы кажух і разам з сынам адвезлі ў в. Бобр, што за некалькі кіламетраў ад Крупак, да другой патрыёткі Ганны Казырэўскай. Пасля былі Абчуга, Чэрвень, потым партызанскі атрад.

Даведка:

Яўгенія Максімаўна Шаўчэнка працавала санітаркай у партызанскім шпіталі брыгады імя С. М. Кірава. За 2 гады і 7 месяцаў акупацыі Яўгенія Максімаўна вынесла з поля бою і выратавала гэтым самым жыццё 139 параненым партызанам. А наогул праз санітарную часць брыгады, у тым ліку і праз рукі Я. Шаўчэнка, прайшло 686 параненых і хворых сыпным тыфам. Яўгенія Максімаўна Шаўчэнка ўзнагароджана ордэнам Леніна, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны 1-й ступені» і інш.

Акрамя таго, Я. М. Шаўчэнка ўдастоена адной з самых высокіх міжнародных узнагарод медыкаў за іх самаадданую працу — медалём імя Найцінгейл Флорэнс.

Здравоохранение Белоруссии, 1985. № 3.
Да друку падрыхтаваў М. А. Баравуля.

З успамінаў І. Ф. Ісачанкі, камісара партызанскай брыгады імя Панамарэнкі

ІСАЧАНКА Іван Фёдаравіч, нарадзіўся 9 мая 1907 г. ў в. Новае Жыццё Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Працаваў пастухом, рабочым на будаўніцтве ў Віцебску, Ленінградзе, шахцёрам. Пасля службы ў Чырвонай Арміі вярнуўся на радзіму. Арганізатар партызанскага руху ў Крупскім раёне, камісар партызанскай брыгады імя Панамарэнкі. Пасля вайны скончыў экстэрнам сярэднюю школу, потым вучыўся ў тэхнікуме, вышэйшай партыйнай школе. Доўгі час працаваў на партыйнай і гаспадарчай рабоце. Памёр у 1998 г.

Чорны дзень 22 чэрвеня 1941 г. перакрэсліў наша мірнае жыццё. У першыя дні вайны давялося стаць у рады абаронцаў Радзімы. Страшны гэта быў час. Дома засталася сям'я, чацвёра дзяцей. Ці ж думалася тады, што вельмі хутка яны акажуцца пад акупацыяй!?

Што такое нямецкі фашызм, я адчуў, як кажуць, на сваёй скуры. Каля в. Прылукі ў час бамбёжкі быў паранены ў нагу, кантужаны і трапіў у палон. На наступны дзень нашу групу палонных (каля 3000 чалавек) немцы падзялілі. Камандзіраў і палітработнікаў загадалі расстраляць, а нас пад канвоем павялі далей. Больш двух дзён не кармілі. Калі хтосьці з жыхароў паспрабаваў кінуць нам кавалак ежы, канваір ударыў таго штыком, астатнія разбегліся хто куды.

Аднойчы, калі праходзілі цераз адну вёску, я выбраў момант і кінуўся паміж дварамі наўцёкі. Доўга блукаў, пакуль на станцыі Ахтырка не сустрэўся з нашымі часцямі, якія выйшлі з акружэння.

У час знаходжання ў запасным палку прыйшло распараджэнне адкамандзіраваць у Маскву трох беларусаў. Так я трапіў на прыём да першага сакратара ЦК КПБ П. К. Панамарэнкі. Ад яго я даведаўся, што ішла падрыхтоўка байцоў для адпраўкі ў тыл ворага, каб паднімаць народ на барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Пасля адпаведнай падрыхтоўкі наша група ў складзе 50 чалавек прайшла з баямі каля 1000 кіламетраў, потым пераправілася цераз Заходнюю Дзвіну і выйшла да воз. Палік. Там мы сустрэліся з партызанамі пад камандаваннем Сідзякіна.

Тры гады мы ваявалі разам з імі ў тыле ворага, у асноўным у Крупскім раёне. За гэты час атрад з 48 чалавек вырас у брыгаду колькасцю каля дзвюх тысяч чалавек. Праведзена нямала баёў, праўда, былі і страты.

Памятаю некалькі найбольш яркіх эпізодаў. Ранняй вясной камандзір атрада І.І. Пазднякоў з групай партызан вяртаўся з задання. Іх заўважылі фашысты і пачалі праследаваць. Партызаны раздзяліліся. Двух чалавек, Пазднякова і Авечкіна, гітлераўцы прыціснулі да р. Бобр. Рака ў гэты час разлілася, бо толькі што вызвалілася ад ільду. Авечкін адкрыў агонь, але нечакана немцы ўдваіх наваліліся на Пазднякова. З крыкам «Косця, уцякай!» той схапіў фашыстаў і кінуўся з імі ў раку. Сваёй гібеллю ён выратаваў жыццё таварыша.

Або другі прыклад. Калі праходзілі цераз в. Ігрышча, я з групай партызан трапіў у за-

саду. Наш камсорг Вася Крачкоўскі першым заўважыў яе і з крыкам «Адыходзьце, таварышы, я прыкрыю!» адкрыў агонь. Ён параніў 7 паліцэйскіх, але сам загінуў.

Чаму я ўспомніў пра іх? Сярод партызан было вельмі моцна развіта пачуццё таварыства, самаахвяравання дзеля агульнай справы.

Часам даводзіцца чуць, як асобныя людзі называюць нямецкіх фашыстаў культурнай нацыяй, амаль што збавіцелямі, і гэта тых, хто спаліў тысячы населеных пунктаў разам з мірнымі жыхарамі, хто чыніў масавыя расстрэлы. Я бачыў выразаныя зоркі на грудзях нашых людзей. У мяне самога фашысты знішчылі ўсю сям'ю: у 1943 г. спалілі жонку і чатырох дзяцей, у 1944 г. загінулі бацька, маці і сын сястры, на фронце — брат-дэсантнік. Я застаўся адзін і вытрымаў толькі таму, што жыў і працаваў усё жыццё сярод сапраўдных людзей, не выбіраючы лёгкіх шляхоў.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў Ф. П. Крыгінай, жыхаркі в. Ваўкавыск

Здарылася гэта ў пачатку красавіка 1944 г. У в. Ваўкавыск зайшлі тры дэсантнікі: адзін мужчына і дзве жанчыны. Яны звярнуліся да Хоўры Акімаўны Макаравай з просьбай паказаць дарогу да в. Мачулішча. Тая расказала пра гэта Захару Рыгоравічу Дубіне, які меў сувязь з партызанамі, але дарогу не паказала.

Дэсантнікі пайшлі з вёскі. Раніцай двое мясцовых жыхароў шукалі коней за вёскай, а дэсантнікам з-за туману здалося, што гэта паліцэйскія праводзяць аблаву, і яны выстралілі. Выстрал дэсантнікаў прыцягнуў увагу паліцэйскіх гарнізона в. Узнацк. Дэсантнікі спрабавалі вырвацца ў напрамку в. Батуры, але завязалася перастрэлка, у час якой была забіта адна з жанчын. На падмацаванне паліцэйскім з'явіўся атрад немцаў гарнізона в. Хацюхова. У час бою была забіта другая дэсантніца, а трэці дэсантнік адстрэльваўся яшчэ каля гадзіны і апошняй гранатай узарваў сябе. Пасля бою мясцовыя жыхары пахавалі дэсантнікаў на вясковых могілках. Дакументаў пры іх не было, таму і прозвішчы засталіся невядомымі.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў Д. С. Майсеенкі, сувязной Халопеніцкага падпольнага РК ЛКСМБ

У час вайны пасля няўдалай спробы эвакуіравацца з дзецьмі з лістапада 1941 г. я жыла ў в. Пагарэлае Траянаўскага сельсавета былога Халопеніцкага раёна.

Д.С.Майсеенка.

Са снежня 1942 г. ў раёне пачалі ствараць падпольныя маладзёжныя групы пад кіраўніцтвам сакратара Халопеніцкага РК ЛКСМБ Івана Сідаравіча Пыскіна і іншых членаў падпольнага райкома. Такія групы былі ў кожнай вёсцы, іх называлі камсамольскімі арганізацыямі. У нашу арганізацыю ўваходзілі настаўнікі Таццяна Рыгораў-

Помнік на брацкай магіле невядомых савецкіх воінаў каля в. Ваўкавыск.

В. Ф. Шкурко.

С. Р. Русецкі.

на Лапо, Яўгенія Парфёнаўна Грэбень, фельчар Вера Фёдараўна Шкурко, Надзея Іванаўна Апет і я. Па даручэнні РК ЛКСМБ мы здабывалі паперу, соль, тытунь, лекі, патроны. Паперу я брала ў магазіне ў Халопенічах, прыносіла ў в. Пагарэлае, а Лапо перадавала партызанам. Адтуль яна дастаўляла лістоўкі, якія мы распаўсюджвалі далей. Праз Лапо я перадала ў атрад імя Кірава свой радыёпрыёмнік. Хутка ў атрад пайшлі Грэбень і Шкурко. Сувязнымі засталіся толькі я і Апет. 10 лютага з-за даносу мяне арыштавалі. На наступны дзень у маёй камеры апынулася і Апет. Мы дамовіліся не выдаваць адна адну і іншых. Я ж з яе дапамогай пераправіла ў партызаны 11 чалавек. На допыце ў Надзі пыталіся, хто прыводзіў да яе людзей. Яна адказвала, што тая настаўніца ўжо ў партызанскім атрадзе.

На Вялікдзень Надзю, Пятра Кісялёва, фельчара з Халопеніч, яго сястру Надзею з в. Шчаўры, Макрыцкага з сынам з в. Шопы, Пятра Апета з в. Гарадзішча вывезлі з турмы і расстралялі. Праз тыдзень мяне з іншымі вяскоўцамі адправілі ў Германію, дзе я знаходзілася ў лагеры да 10 мая 1945 г.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка

З успамінаў В. В. Мальчэўскай, жыхаркі пас. Крупскі

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, я з двума малымі дзецьмі жыла ў бацькоў свайго мужа ў пас. Крупскі каля чыгункі. Мой свёкар, Міхаіл Апалінаравіч Бейнаровіч, патомны чыгуначнік, працаваў аглядчыкам вагонаў у час стаянкі паяздоў на ст. Крупкі. Наш двухпакаёвы домік ушчыльную прымыкаў да рэзервуара, дзе паравозы набіралі ваду. Менавіта таму ўжо з вясны 1942 г., калі партызанскі рух на Беларусі пачаў шырыцца, усе дарослыя члены нашай сям'і збіралі для партызан звесткі пра жывую сілу і тэхніку праціўніка, што перакідваліся па чыгункі на фронт.

Міхаілу Апалінаравічу было каля 64 гадоў. Ён яшчэ да вайны выйшаў на пенсію, але, каб без падазрэнняў назіраць за ворагам, працаваў прыбіральшчыкам на пероне, а мы з маці Евай Піліпаўнай і залоўкай Нінай імкнуліся сачыць як мага больш за кожным варожым эшалонам з акон дома, на дварэ і запамінаць, што і колькі везлі фашысты. Часцей груз быў закрытым, але па апазнавальных знаках мы ўсё ж яго вызначалі. Дапамагалі таксама збіраць звесткі і перадаваць іх праз сувязных у партызанскі атрад Каэтан Палікарпавіч Адзінец, сем'і Гаеўскіх, Плескачовых і іншыя.

Мы адчувалі, што дапамагаць партызанам — справа вельмі важная і неабходная і ў той жа час рызыкоўная, цяжкая. Я, напрыклад, прасілася непасрэдна ў атрад. Мне здавалася, што там я прынясу большую карысць, бо да вайны скончыла ў Магілёве фельчарска-акушэрскую школу. Аднак мне адмовілі. У партызанскім атрадзе з малымі дзецьмі было б яшчэ цяжэй, таму мы былі партызанскімі сувязнымі да самага вызвалення Беларусі.

Неяк фашысты даведаліся, што сын майго свёкра, Мечыслаў, які жыў у Барысаве, падаўся ў лес да партызан. Тады яны прыехалі за яго бацькам, арыштавалі за работай на пероне і павезлі ў Барысаўскае гестапа. У турме яго трымалі ўвесь лістапад, снежань 1943 г. і студзень 1944 г. Часам дазвалялі прыносіць перадачы.

Бацьку доўга дапытвалі (пра гэта ўдалося даведацца з адзінай яго запіскі), але ён нікога не выдаў з тых, хто яшчэ дапамагаў партызанам, інакш загінулі б і мы. Там ён быў расстраляны.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў С. Р. Русецкага, начальніка штаба 277-га атрада

РУСЕЦКІ Сцяпан Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1911 г., ураджэнец г. Клічаў Магілёўскай вобласці. З верасня 1939 г. служыў у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у вызваленні Зах. Беларусі. У 1941 г. служыў у Беластоку, трапіў у акружэнне. Калі вярнуўся ў г. Клічаў, знаходзіўся на падпольнай рабоце, потым пайшоў у партызаны. Быў начальнікам штаба 277-га партызанскага атрада.

24 верасня 1942 г. я ўзначальваў ударную групу ў складзе стралковага ўзвода, якую ўзмацняла аддзяленне падрыўнікоў, усяго 55 байцоў. Нашай групе даручылі правесці дыверсію на чыгунцы. Напярэдадні я сабраў групу, растлумачыў задачу, якая стаяла перад намі, і прапанаваў адмовіцца тым, хто не можа ўдзельнічаць. Такіх не знайшлося. У 21 гадзіну мы выйшлі. За ноч фарсіравалі р. Бобр (100 м ад гарнізона Выдрыца) і раніцай падышлі да чыгункі. Спыніліся ў лесе, за 2 км на поўдзень ад станцыі Крупкі, занялі кругавую абарону. Небяспека была вялікая, бо мы знаходзіліся ў цэнтры фашысцкіх гарнізонаў. Да таго ж лес быў разбіты прасекамі на квадраты, што таксама ўскладняла нашу задачу.

25 верасня каля 15 гадзін разведчыкі данеслі, што фашысты сагналі насельніцтва на высечку лесу каля чыгункі. Работа працягвалася да 20 гадзін, потым сялян адпусцілі дадому, а нямецкія салдаты пайшлі на нафтабазу адпачываць. Хутка з Крупскага гарнізона павінна была прыбыць ахова для патруляванння ноччу. Кароткі прамежак часу магістраль заставалася без аховы. Гэта выкарысталі падрыўнікі. На адлегласці 100 м ад нафтабазы яны хутка заклалі пад рэйкі 5 кг узрыўчаткі. Неўзабаве з'явілася ахова і размясцілася на паўночным баку чыгункі, мы — на паўднёвым. У 21.30 пад шум цягнікоў партызаны перамясціліся на зыходную пазіцыю, прапусцілі некалькі эшалонаў з параненымі з фронту. Нарэшце, праз гадзіну з захаду паказаўся эшалон з палівам. Я даў каманду падрыхтавацца. Калі першы паравоз наехаў на ўзрыўчатку, камандзір аддзялення Якавенка ірвануў за шнур. Прагрымеў выбух. Састаў спыніўся, група адкрыла па эшалоне агонь. У выніку аперацыі была поўнасцю знішчана каманда эсэсаўцаў, 48 цыстэрнаў з бензінам. Цыстэрны ўзрываліся ўсю ноч. Для аднаўлення чыгункі гітлераўцам спатрэбілася каля трох сутак.

Падрыхтаваў да друку М. А. Баравуля.

З успамінаў К. У. Сіняк (Крышталь), сувязной партызанскага атрада імя Варашылава

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна і фашысты акупіравалі нашу родную Беларусь, для барацьбы з імі на тэрыторыі Крупскага раёна і ў нашай маленькай вёсцы Прудок неўзабаве з'явіліся дэсантная група мас-

Помнік Ю. К. Азолу на Новадзявочых могілках у Маскве.

квічоў, якою камандаваў Рыгор Якаўлевіч Сарока, група А. Колесавай і інш. З першых дзён сустрэчы з дэсантнікамі мне і маёй стрыечнай сястры Ніне Крышталь давялося весці падпольную работу. Мне тады было 19 гадоў. Паводле загаду камандзіра дэсантнай групы Сарокі была арганізавана падпольная група моладзі з вёсак Прудок і Выдрыца (8 чалавек), у якую увайшлі К. У., Н. А. і Е. П. Крышталі, Д. В. і Н. П. Сіняк, В. І. Чыбірак, Л. І. Прысь, В. В. Шынкевіч. Мы дапамагалі дэсантнікам чым маглі: паведамлялі пра колькасць нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, іх умацаванні, забяспечвалі харчамі, медыкаментамі, трафейнай зброяй і боепрыпасамі. Група з кожным днём павялічвалася. Была наладжана сувязь праз Д. В. Сіняк з падпольнымі групамі вёсак Забароддзе, Вяляцічы, Сморкі і інш. Барысаўскага раёна. У чэрвені 1942 г. на базе гэтых груп быў створаны партызанскі атрад імя Варашылава, якім камандаваў Ф. В. Юданаў. Група дзяўчат з в. Прудок выконвала баявыя заданні камандзіраў і начальнікаў партызанскага атрада імя Варашылава і дэсантных груп. Я была сувязной і таксама выконвала розныя заданні, не шкадавала свайго жыцця.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў І. М. Сокалава, камандзіра групы дэсантнікаў

Падзеі адбываліся 13 кастрычніка 1942 г. Разведчыкі дыверсійнай групы, дзе быў і лейтэнант Юрый Азол, сутыкнуліся ў в. Прудок з баявой аховай нямецкай часці. Пры падыходзе асноўных сіл праціўніка дэсантнікі, адстрэльваючыся, сталі адыходзіць. Ю. Азол быў паранены ў нагу і схоплены фашыстамі. Доўгі час яго пыталі. Юрый нічога не сказаў пра месцазнаходжанне дэсантнікаў. У в. Чар-

няўка, непадалёк ад в. Прудок, Ю. Азол быў закатаваны. Узнагароджаны ордэнам Леніна пасмяротна. Пахаваны ў Маскве.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў А. С. Філонава, былога падпольшчыка

Перад вайной я працаваў дырэктарам Сакалавіцкай няпоўнай сярэдняй школы. З кастрычніка 1941 г. быў сувязным партызанскага атрада.

Для арганізацыі падпольнай работы райкам партыі пакінуў у в. Тапарышча Паўла Іларыёнавіча Юркевіча. Спачатку ў нашу групу ўваходзілі Мікалай Антонавіч Ясінскі з братам Восіпам, я, настаўніца Еўдакія Барсукова, Антон Іванавіч Сазонаў, пазней — Сцяпан Давыдавіч Філіпаў. Мы павінны былі праводзіць растлумачальную работу сярод насельніцтва, дапамагаць харчаваннем, боепрыпасамі групам разбітых воінскіх часцей, якія апынуліся ў акружэнні.

У канцы лістапада 1941 г. праз камісара батальёна Дворніка, ураджэнца в. Слабада Абчугскага сельсавета, я звязаўся з групай партызан і чырвонаармейцаў воінскай часці пад кіраўніцтвам палкоўніка Сімакова, пазней з партызанамі 8-й Круглянскай брыгады, дзе камандзірам быў Жунін. З «жунінцамі» я падтрымліваў сувязь да самага канца вайны. Дапамагала мне ў гэтым Ефрасіння Восіпаўна Якублевіч. На станцыі Бобр працавала цэлая група сувязных, у якую ўваходзілі Міхаіл Міцкевіч, Станіслаў Ігнатавіч Васілеўскі, Міхаіл Іванавіч Барысаў.

Звесткі пра ўмацаванні гарнізонаў каля Крупак, Бабра, Старога Бабра, Прудзін і інш., перамяшчэнні воінскіх часцей, колькасць эшалонаў, якія праходзілі цераз станцыю Бобр, сувязныя перадавалі партызанам. Такімі сувязнымі былі Антон Маркавіч Ліпецкі, Садчыкаў, бацька і дачка Сіпачовы, якія жылі ў той час у в. Асечына.

Што датычыцца Пятрайціса, настаўніка Крупскай школы, Сяліцкага, Імшанецкага, Шчарбіны, то яны працавалі ў Крупскай зямельнай управе, дапамагалі партызанам харчаваннем (даставалі муку з млына, масла з маслабойні і г. д.). Усе яны пасля былі расстраляны.

Яны мелі радыёпрыёмнік. З імі трымаў сувязь Мікалай Ясінскі.

Падрыхтаваў да друку М. А. Баравуля.

Ф.С.Харланаў.

З успамінаў Ф. С. Харланава, камандзіра брыгады імя Панамарэнкі

ХАРЛАНАЎ Фёдар Сямёнавіч, нарадзіўся 6.5.1913 г. ў в. Крэпасць-Уздзень Навауздзенскага пав. Самарскай губ. Удзельнік савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў. З 1942 г. партызан, спачатку камандзір узвода, потым атрада, брыгады.

Неяк разведчыкі паведамілі мне, што паводле звестак, якія атрыманы з месца прызначэння, на чыгункі Мінск—Орша з'явіліся польскія гарнізоны для нясення ўнутранай аховы на захопленай тэрыторыі. Палякі не хацелі ваяваць супраць партызан.

Пасля атрымання такіх звестак мы сталі шукаць шляхі для ўстанаўлення сувязі з палякамі, якія знаходзіліся ў Крупках. У гэтай справе нам вельмі пашчасціла. Наш партызанскі пост у Робску затрымаў жанчыну з нямецкімі дакументамі, яе прывялі да нас у штаб атрада «За Радзіму». З дакументаў стала вядома, што жанчына — палячка, звалі яе Анэляй. Яна ішла па заданні сваіх гаспадароў, у якіх была служанкай, з г. Вільнюс у в. Сівы Камень Халопеніцкага раёна за іх дачкой. Бацькі ў час рэвалюцыі эмігрыравалі, а дачка яшчэ дзіцем засталася чамусьці ў хаце адна. Прайшло шмат часу, але бацькі не гублялі надзею адшукаць яе. Анэля не вельмі разбіралася ў палітыцы і абстаноўцы. Мы з камісарам Бяссмертным растлумачылі ёй, хто такія немцы, іх адносіны да палякаў, расказалі таксама, хто такія партызаны, чаму яны ваююць з акупантамі, папрасілі зайсці ў Крупкі і сустрэцца з палякамі. Нам неабходна было перадаць ім пісьмо ад камандавання атрада «За Радзіму» з прапановай перайсці на бок партызан і сумесна весці барацьбу з гітлераўцамі. Анэлю папярэдзілі, каб была асцярожнай. «Дайце грошай, — заявіла яна, — я не баюся. Я — полька і палякі мяне зразумеюць».

На чацвёртыя суткі Анэля з'явілася ў атрадзе, усё абышлося добра, пакет быў уручаны старэйшаму групы палякаў Каралю Лесеку. Ён уважліва прачытаў наша пісьмо, паглядзеў на Анэлю і спытаў: «А вы ведаеце, што за такія справы трэба назначыць смяротную кару?» «Ведаю, — адказала Анэля. — Але я ведаю яшчэ тое, што і вы, і я — палякі, што наша Польшча знаходзіцца пад нямецкім ботам і льецца кроў нявінных людзей. Я павінна занесці адказ тым, хто мяне паслаў». Лесек перадаў праз яе, што па партызанах страляць не будуць і пры першай магчымасці са зброяй прыйдуць да іх.

Праз некалькі дзён з'явіўся сувязны ад палякаў — Раман Пятрушка, які сказаў, што ў бліжэйшую ноч усе палякі будуць выведзены з гарнізона ў партызанскую зону.

Фашысты даведаліся пра намеры палякаў, і аперацыя магла праваліцца. Але ў той самы вечар 10 чалавек самых надзейных на чале з Лесекам прыйшлі да нас са зброяй. Мы сустрэлі іх па-брацку.

Анэлю аддзякавалі і адпусцілі хутка ў в. Сівы Камень за дачкой яе гаспадароў. На базе групы польскіх патрыётаў быў створаны баявы ўзвод першай роты атрада «За Радзіму», камандаваў ім Лесек.

У чэрвені 1943 г. ў час блакады асабліва вызначыліся ў баях Раман Пятрушка, Генрых Габіч, Станіслаў Шыдла, Антон Высотны, Андрэй Каваленка, Багуслаў Мадэй, Уладзіслаў Пятроўскі, Уладзіслаў Смерціха і іх камандзір Караль Лесек. Пры прарыве блакады Лесек загінуў.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў Н. Хвацік, партызанкі атрада імя Варашылава брыгады імя Шчорса

Наша сям'я жыла ў невялікай в. Мігаўшчына, гэта непадалёку ад в. Выдрыца. Бацька, Іван Цітавіч Рашэтнік, удзельнік вайны з белапалякамі, доўгі час працаваў лесніком, у Вялікую Айчынную вайну быў партызанскім сувязным. Да вайны я паспела скончыць толькі 5 класаў, брат Міша быў ужо камсамольцам.

... 1 мая 1942 г. мы прачнуліся ад гулу самалёта. Ноч была відная, мы прыпалі да вокнаў. Самалёт зрабіў тры кругі ў небе, мы ўбачылі над полем і над лесам парашуты. Бацька сказаў: «Ну, сынок, нашы не забыліся пра нас». Мы ўзрадаваліся — вось і першамайскае свята. Раніцай, калі мы прыбеглі да месца прызямлення парашутыстаў, радасць наша прапала. У лесе метраў за 500 адна ад другой, нерухома ляжалі дзве дзяўчыны. Мясцовыя жыхары пахавалі іх у той жа дзень на ўзлеску непадалёку ад вёскі. На другі дзень, калі я панесла кветкі на могілкі, убачыла на двух тонкіх слупах надпісы на рускай мове: «Тамара, рыбачка! Ты ж была баявая, вясёлая сяброўка і Таня» — далей не памятаю. Гэта былі дзяўчаты з дыверсійнай групы Алены Колесавай — Тамара Маханько і Таццяна Вашчук.

Аднойчы, летнім днём таго ж года, да Мігаўшчыны з гарнізона в. Вяляцічы ішлі немцы і паліцаі. У гэты час група партызан (было іх чатыры чалавекі) вярталася з задання. Яны сустрэліся тварам у твар з ворагам. Партызаны першыя адкрылі агонь, забілі паліцая па клічцы Воўк і па агародах сталі адступаць у лес. Я ўбачыла, як дзяўчына спрытна пераскочыла цераз агароджу на наш агарод і, павярнуўшыся, выпусціла аўтаматную чаргу. Гэта была Алена Колесава. Немцы ўварваліся на наш двор. Усю сям'ю паставілі да агароджы і пагражалі расстраляць. А праз некаторы час арыштавалі бацьку за тое, што ў яго лесніковым абходзе былі партызаны. Спачатку яго павезлі ў Выдрыцу, потым (аб гэтым мы даведаліся пазней) — у Крупкі, Барысаў, дзе ён і загінуў. Дзяўчаты з групы Лёлі Колесавай (так называлі яе сяброўкі) часта наведваліся ў нашу вёску. Брат Міша таксама дапамагаў ім.

У канцы чэрвеня зноў за нашым полем прызямліліся парашутысты. А назаўтра ў хату зайшлі два хлопцы (гэта былі, як пасля высветлілася, камандзір групы Аляксей Букаў і радыст Віктар Бунін), яны папрасілі на некаторы час сякеру. Міша павёў іх да воз. Глухое, дзе непадалёку базіравалася група Колесавай, і сказаў: «Тут зрабіце шалаш, а партызан знойдзеце.»

Міша часта хадзіў у лес да Аляксея Букава. Да іх прыходзілі дзяўчаты з групы Алены Колесавай, разам слухалі звесткі з Масквы.

Калі 11 верасня пачаўся Выдрыцкі бой, мы ў Мігаўшчыне яго пачулі. Маці сказала: «Вось цяпер нашага бацьку вызваляць». Не ведалі мы, што фашысты ўжо перавезлі яго ў Крупкі.

Апоўдні на лясную базу вярталіся партызаны. Чорная вестка, што Лёлю забілі, абляцела ўсіх. Многія не маглі стрымаць слёзы. Суседка наша, Сцепаніда Мажэйка, плачучы, расказвала: «Як жа яна маю Танечку сёння падкідвала на руках, сама смяялася — можа

дзяцей любіла, можа ад радасці, што ў бой ідзе». Яе везлі на павозцы з Выдрыцы да партызанскіх могілак каля Мігаўшчыны, дзе былі пахаваны Тамара Маханько, Таццяна Вашчук і іншыя народныя мсціўцы. Труну зрабіў мой дзядзька, яе пакрылі белым парашутам. Баявыя сяброўкі Колесавай з аўтаматаў тройчы залпам салютавалі гераіне.

У 1943 г. разам з маці мы былі ў партызанскім атрадзе імя Варашылава брыгады імя Шчорса. Партызанам-падрыўніком гэтага атрада быў і мой брат Міша. Ён, як і Лёля, падрываў варожыя эшалоны. У 1944 г., пасля вызвалення нашай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пайшоў на фронт. Міхаіл загінуў у баях за Літву.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў Н.І.Шынкарэнка, намесніка А. Ф. Колесавай

У 1942 г. нас, 12 дзяўчат пасадзілі ў машыну, потым у самалёт — і вось мы ўжо над Масквой, ляцім на захад, бліжэй да фронту. Перад вылетам я была ў звальненні, калі вярнулася, усе члены нашай групы сядзелі ў машыне і развітваліся з таварышамі. Я толькі паспела ўзяць свой рэчавы мяшок, парашут і сесці ў машыну, як мы паехалі на аэрадром.

Вылецелі яшчэ завідна. Пераляцелі ўдачна цераз лінію фронту, калі ўжо сцямнела. Каля часа ночы пачалі прыгаць з парашутамі, першай выпрыгнула Лена Колесава, камандзір. За ёй павінны былі прыгаць астатнія, я была апошняй. У час прызямлення мой парашут зачапіўся за вяршыню высокай сасны. Я ўдачна спуцілася па ствале сасны ўніз. Зіна Марозава, падаючы, пашкодзіла пазваночнік.

Была ноч, цішыня, лес густы, высокі, кругом балота. Падаваючы ўмоўныя знакі, я прахадзіла ўсю ноч, потым стала світаць, выглянула сонца, стала цяплей. Непадалёку размяшчаўся населены пункт, гэта была в. Мігаўшчына. Зайсці ў яе я не рызыкнула. Па дарозе ў лес убачыла двух членаў нашай групы: Лену Колесаву і Сашу Лісіцыну. Яны стаялі каля загінуўшай Тасі Аляксеевай. У яе быў раскрыты парашут, але стропы не выцягнуліся (мабыць, позна выцягнула кальцо парашута). Капаць магілу не было чым. Мы знайшлі яму, дзе быў вывернуты корань дрэва, завярнулі Тасю ў плашч-палатку і прысыпалі зямлёй. Пахавалі каля в. Мігаўшчына.

Н.І.Шынкарэнка, член дыверсійнай групы А.Ф.Колесавай.

Дзяўчаты Вера і Аня былі з вывіхамі і расцяжэннямі. Астатніх дзяўчат, Ніну Флягіну, Надзю Белую, Таню Вашчук, Тамару Маханько я так і не ўбачыла. Рацыі ў нас не было. Пасля прызямлення нам трэба было звязацца з групай Вацлаўскага. Нас заставалася толькі трое: Лёля, Саша і я.

Першы раз на сустрэчу пайшлі Саша і Лёля. Я засталася з параненымі. Дайшлі яны толькі да в. Выдрыца. На наступны дзень Лёля паслала мяне на гэту сустрэчу. Гэта было 6 мая. Памятаю, раніцай ішоў дождж са снегам, мы былі стомленыя, ноч не спалі. Калі я і Саша Лісіцына падышлі бліжэй да моста, пачуліся выстралы. Мяне гэта насцярожыла, але мы пайшлі далей. Спыніліся перад мостам, усё было спакойна. Але як толькі мы перайшлі мост і павярнулі налева, з-за вугла выскачыла група людзей, мне нанеслі ўдар па галаве. Нас звязалі і павезлі ў Крупкі. Там перадалі немцам, за што на нашых вачах ім выдалі па пачцы махоркі і нешта яшчэ. Калі везлі ў Крупкі, я пацікавілася, хто яны, чаму так з намі паступаюць. У адказ я пачула: «Мы таксама павінны жыць». Як я потым даведалася, адзін з гэтых мужыкоў да вайны выкладаў гісторыю ў школе. Пасля мы апынуліся ў Барысаўскай турме. Сашу я больш не сустракала. У чэрвені мяне пасля цяжкіх пабояў забраў да сябе нямецкі афіцэр, потым мяне адправілі ў Германію. Так я папала ў Берлін, у лагер, дзе былі дзяўчаты з Крупак і іншых вёсак. 4 мая 1945 г. нас вызвалілі. Дзяўчат пасля гэтага, акрамя Ніны Флягінай, я не сустракала. Зіна Марозава была родам з-пад Курска. Астатнія дзяўчаты — усе масквічкі. Сёстры Зоя і Ніна Суворавы прапалі без вестак пад Сухінічамі.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў Е. В. Якублевіч, сувязной 36-га партызанскага атрада 8-й Круглянскай брыгады

Я вельмі хутка звязалася з 8-й Круглянскай партызанскай брыгадай у Крупскім раёне, дзе камандзірам 30-га асобнага атрада быў Машчыцкі, камандзірам асобага аддзела — Яўгенія Міронаўна Аўсіевіч, начальнікам разведкі — Фёдар Назімцоў. Перадавала хлеб, тол, зброю, распаўсюджвала лістоўкі сярод насельніцтва раёна, наладжвала сувязь з камсамольцамі. Так, камсамольцы Мікалай Макарэвіч, Міхаіл Барысаў, Стась Васілеўскі, Сцяпан Зінькевіч перадалі партызанам 10 вінтовак дзесяцізарадных, тры кулямёты сістэмы Дзегцярова і 6 дыскаў да іх. Дзякуючы агітацыі сярод ваеннапалонных, удалося вывесці ў партызанскі атрад 30 чалавек, хоць за гэта пагражаў расстрэл. Для сувязі з разведкай даводзілася праходзіць па 30 км, каб занесці туды звесткі і атрымаць зводку пра становішча на фронце, а таксама новае заданне. Пры сустрэчы разведчыкі называлі мяне «сястрой».

У 1944 г. мяне выдала гестапа адна дзяўчына, і я была арыштавана разам з мужам, з Міхаілам Барысавым і Станіславам Васілеўскім. Мяне адну з першых выклікалі на допыт і доўга катавалі, але пра сувязь з партызанамі я нічога не сказала. Калі я страціла прытомнасць, мяне ўпіхнулі ў камеру крупскай турмы, і там жанчыны з в. Касянічы ратавалі мяне, чым маглі, на працягу месяца.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

Успаміны

... Внимательно рассматриваю так неожиданно попавшего к нам в руки «языка». Среднего роста, коренастый, рыжеволосый. Лицо чисто выбрито, на крупном носу мелкие крапинки веснушек.

Мы обыскали немца, отобрали у него оружие, разрешили сесть за стол. «Язык» оказался весьма разговорчивым, но понять его было очень трудно. С грехом пополам удалось выяснить, что он немецкий коммунист Франц Питч.

Хочется рассказать об одном боевом эпизоде, о котором мне поведал бывший комиссар пятого отряда Ильич.

— Помню одну операцию, — говорил он. — Это было где-то под Холопеничами в апреле 1944 года. Мы с Николаем Агапоненко решили сделать засаду на фашистов, которые часто передвигались небольшими группами от одного гарнизона к другому.

Партизаны в этом месте появлялись редко, и гитлеровцы были еще «непугаными». Для организации засады выбрали деревушку, расположенную у небольшого лесочка. Рядом проходил большак, который хорошо просматривался от крайнего дома. На чердаке этого дома и разместились мы втроем — Агапоненко, Франц и я. У слухового окна приладили пулемет. Остальные наши товарищи залегли в кустарнике недалеко от дороги. Нам повезло. Вскоре заметили на большаке две доверху нагруженные каким-то имуществом повозки. Они двигались в нашу сторону. Следом шло около десятка немцев. По команде Агапоненко открыли огонь по ним. Меткими очередями наших товарищей несколько гитлеровцев было сражено наповал, а трое успели скрыться за деревьями. Мы за ними — решили взять живьем. Продираюсь между молодыми елочками, гляжу туда-сюда — никого. Вижу только идущего метрах в пяти от меня Франца. Вдруг он бросился в мою сторону. Что такое? Оказывается, за кочкой притаился гитлеровец, в меня целился. Франц ногой выбил из его рук карабин.

Франца очень уважали и любили не только партизаны нашего отряда, но и вся бригада.

Р. П. Игнатов.

Друкуецца па кн.: В лесах Белоруссии. Мн., 1986, с.197.

Вызваленне Крупскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

БАІ НЕМЯСЦОВАГА ЗНАЧЭННЯ

(Хроніка трох дзён вызвалення Крупскага раёна)

Дзень першы

Са зводкі Саўінфармбюро за 27 чэрвеня 1944 г.: «На мінскім напрамку нашы войскі, развіваючы паспяховае наступленне, з баямі занялі больш за 350 населеных пунктаў, у тым ліку ... Клубынічы, Забор'е, Абчугу, Бобр і чыгуначную станцыю Бобр...».

Да канца чэрвеня 1944 г. аперацыя «Баграціён» уступіла ў сваю рашаючую фазу. Разграміўшы віцебска-аршанскую групоўку во-

рага, часці 5-й гвардзейскай танкавай і 11-й гвардзейскай арміі 3-га Беларускага фронту імкліва наступалі ўздоўж аўтамагістралі Масква—Мінск. У авангардзе рухаліся гвардзейцы 3-й і 19-й танкавых брыгад.

Фашысты, адступаючы, імкнуліся выкарыстаць выгадныя рубяжы для арганізацыі вузлоў абароны. Асабліва ўпарта яны абаранялі аўтамагістраль і чыгунку. Адным з такіх вузлоў абароны стала пераправа цераз р. Бобр у раёне пас. Бобр. Умацаваўшы высокі заходні бераг ракі, замініраваўшы падыходы да пераправы і падцягнуўшы тэхніку, гітлераўцы разлічвалі затрымаць тут Чырвоную Армію, каб выйграць час для стварэння глыбока эшаланіраванай абароны на рубяжы р. Бярэзіны каля Барысава.

Яшчэ 26 чэрвеня перадавы атрад 19-й танкавай брыгады, якая вырвалася ўперад астатніх часцей Чырвонай Арміі, завязаў бой на подступах да пас. Бобр. Услед за 19-й рухаліся 3-я танкавая брыгада і 83-я гвардзейская стралковая дывізія. Справа ад іх наступалі падраздзяленні 18-й танкавай брыгады і 5-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Яшчэ правей, у напрамку Халопеніч, рухаліся войскі 35-й гвардзейскай танкавай брыгады коннамеханізаванай групы генерала М. С. Аслікоўскага. Злева ад аўтамагістралі Масква—Мінск дзейнічалі батальёны 2-й гвардзейскай мотастралковай брыгады.

З журнала баявых дзеянняў 3-й гвардзейскай танкавай брыгады: «У 23.00 26.6.1944 г. брыгада атрымала задачу: рухаючыся за перадавымі атрадамі 19-й гвардзейскай танкавай брыгады, развіць поспех у напрамку Нова-Барысава. Выконваючы пастаўленую задачу, брыгада выступіла па ўказаным маршруце і да 6 гадзін раніцы 1944 г. выйшла на ўсход за 1 км ад м. Бобр. Брыгадзе пастаўлена задача: змяніць перадавы атрад 19-й гвардзейскай танкавай брыгады і авалодаць м. Бобр».

Раніца 27 чэрвеня. Над Бабром яшчэ стаяла перадсвітальная цішыня. Але ў лесе каля вёсак Маляўка і Пліса ўжо пачаўся рух. Часці ўдарных груп Чырвонай Арміі рыхтаваліся да штурму. Праграваліся маторы танкаў, увіхаліся каля гармат разлікі. У 7 гадзін пачалося наступленне. Першым да пасёлка прарваўся перадавы атрад з трох танкаў на чале з камандзірам галоўнай машыны малодшым лейтэнантам Васілём Андрыянавічам Быкавым, ураджэнцам г. Глазаў (Удмурція). Танкісты завязалі бой на ўсходняй ускраіне пас. Бобр. За перадавой групай рухаліся танкісты 1-га танкавага батальёна, а за імі — уся брыгада. Першымі ў пасёлак уварваліся экіпажы машын у складзе камандзіра Каўторава, радыста-кулямётчыка В. І. Новікава са Смаленскай вобласці, механіка-вадзіцеля сяржанта Леаніда Міхайлавіча Сцяпанава з Іванаўскай вобласці і камандзіра танка сяржанта Пятра Антонавіча Саляніна з Палтаўшчыны. Наступова бой перамясціўся на вуліцы. Аднак праціўнік сіламі палка пяхоты, маючы на ўзбраенні 5 цяжкіх танкаў і 7 гармат, працягваў утрымліваць заходнюю частку Бабра.

М.С.Аслікоўскі.

Тры танкі 3-га танкавага батальёна імкліва вырваліся па аўтамагістралі да пераправы, але наскочылі на міны. Усе тры экіпажы загінулі. Група з трох машын на чале з камандзірам танкавай роты старшым лейтэнантам Кузняцовым, пераадолеўшы надоўбы і эскарпы, здолела пад агнём праціўніка праскочыць пераправу, аднак наткнулася на моцнае супраціўленне і завязала бой. Два танкі былі падбіты. Застаўшыся з адным танкам, Кузняцоў на працягу сутак вёў бой у тыле варожай абароны.

Нягледзячы на няспынны абстрэл, санітар 2-га танкавага батальёна старшына Арцём Якаўлевіч Білер з Харкава кінуўся на дапамогу таварышам. Пад моцным агнём ён вынес з поля бою цяжка параненых танкістаў з падбітых машын. За гэты подзвіг А. Я. Білер быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Экіпаж аднаго са спаленых танкаў складаўся з сяржанта Уладзіміра Дзмітрыевіча Зайцава з Курскай вобласці, радавога Уладзіміра Сяргеевіча Траскова, а таксама рускага па нацыянальнасці і камандзіра танка (прозвішчы невядомыя). У выніку прамога трапляння снарада камандзір быў забіты, астатнія члены экіпажа параненыя. Нягледзячы на раненне, радавы Траскоў змог вынесці з поля бою забітага камандзіра і таварышаў.

Не авалодаўшы з ходу пераправай, танкісты 3-й танкавай брыгады разам з пехацінцамі на працягу дня вялі вулічныя баі. Аднак асноўныя падзеі разгортваліся каля моста цераз р. Бобр. Увесь дзень грукатала канапада і працягваліся атакі. Гітлераўцы жорстка супраціўляліся. На дапамогу яны выклікалі авіяцыю. За два дні праціўнік зрабіў 150 самалётавылетаў на баявыя парадкі савецкіх часцей. У час аднаго з налётаў камандзір разліку зенітна-кулямётнай роты Дзмітрый Сямёнавіч Ашыхмін з Кіраўскай вобласці агнём з буйнакалібернага кулямёта збіў «Фоке-Вульф 190». Калі пры трэцім заходзе варожай авіяцыі адзін з наводчыкаў зенітнай гарматы быў цяжка паранены, яго замяніў шафёр зенітна-кулямётнай роты сібірак Мікалай Міхайлавіч Котчанка. Яго гармата збіла «Месершміт».

Прыкладаў мужнасці можна прывесці нямала.

Узвод аўтаматчыкаў мотабатальёна пад камандаваннем лейтэнанта Паўла Васілевіча Бярэзіна з Горкаўскай вобласці адным з першых уварваўся ў траншэі праціўніка, знішчыў 35 варожых салдат і афіцэраў. Падраздзяленне аўтаматчыкаў, якім камандаваў старшына Ягор Сяргеевіч Бабкін з Курскай вобласці, у час бою знішчыла 3 бронетранспарцёры, 8 аўтамашын. Узвод ПТРаўцаў на чале з лейтэнантам Філатам Мацвеевічам Плотнікавым, ураджэнцам г. Чэлябінск, у ходзе прарыву абароны падбіў 4 бронетранспарцёры і 2 бронемашыны, пры гэтым 1 бронетранспарцёр спаліў сам Плотнікаў.

Калі ў баі быў паранены кулямётчык, яго замяніў аўтаматчык Мікалай Іванавіч Папоў з г. Чкалаў, каб падтрымаць наступленне пехацінцаў. Фашысты двойчы спрабавалі перайсці ў контратаку, але агонь кулямёта прымушаў іх адкочвацца назад. У гэтым баі Папоў знішчыў каля 20 салдат праціўніка. Аўтаматчык мотабатальёна сібірак Іван Арцёмавіч Ёлкін уварваўся ў варожую траншэю, агнём з аўтамата і ручнымі гранатамі знішчыў 11 салдат і афіцэраў. Камандзір аддзялення аўтаматчыкаў сяржант ленінградзец Аляксандр Іванавіч Пракоф'еў скрытна дабраўся да траншэй праціўніка і закідаў гранатамі кулямётны разлік, што дало магчымасць роце прасунуцца наперад...

Да 16 гадзін Бобр быў ачышчаны ад ворага, але фашысты яшчэ змагаліся ў лесе на паўночны захад ад пасёлка і ўтрымлівалі пераправу.

Услед за танкістамі ўступілі ў бой пехацінцы 2-й гвардзейскай мотастралковай брыгады. У 17.30 пасля 10-хвіліннай артпадрыхтоўкі яны пачалі наступленне на чыг. ст. Бобр. Хутка авалодаўшы станцыяй, пехацінцы наткнуліся на моцную абарончую лінію на р. Бобр, якую беспаспяхова спрабавалі пераадолець да канца дня. У гэтым баі вызначыўся кулямётчык 1-га батальёна ўзбек Назар Ібрагімаў. Ён адным з першых уплаў пераправіўся цераз раку на заняты праціўнікам бераг, замаскіраваўся ў кустах і адкрыў агонь з ручнога кулямёта. Ібрагімаў падавіў 2 варожыя кулямётныя кропкі, чым аблегчыў пераправу свайго падраздзялення. Камандзір супрацьтанкавай батарэі Мікалай Сямёнавіч Суслаў з Омскай вобласці загадаў выкаціць гармату на прамую наводку, каб прыкрыць пераправу пяхоты. Замяніўшы наводчыка, ён

Танкісты 35-й танкавай брыгады пасля вызвалення Халопеніч.

з адкрытай агнявой пазіцыі знішчыў 2 міна-мёты і бронетранспарцёр.

Паспяхова дзейнічалі часці 35-й гвардзейскай танкавай брыгады ў напрамку Халопеніч, якім супрацьстаялі ў асноўным мясцовыя гарнізоны і падраздзяленні 197-й нямецкай пяхотнай дывізіі. Яны аказвалі нязначнае супраціўленне на прамежкавых рубяжах і адыходзілі групамі на захад.

З журнала баявых дзеянняў 35-й гвардзейскай танкавай брыгады: « З раніцы 27 чэрвеня брыгада выступіла па маршруту Чарэя—В. Хальнявічы—Барсукі—М. Хальнявічы, раздзяліўшыся на батальённыя эшалоны, маючы па аднаму танкаваму батальёну з ротай аўтаматчыкаў.

Выконваючы пастаўленую задачу, перадавы атрад у выніку абходнага манеўра на паўднёвы ўсход атакаваў праціўніка ў напрамку В. Хальнявічы—Баркі—Дакучына—Старая Пярэсіка—Узнацк і авалодаў м. Халопенічы. Знішчыў да роты пяхоты, 2 гарматы ў раёне в. Узнацк і 2 артбатарэі ў раёне в. Версанка.

2-і танкавы батальён на маршы ў раёне в. Баркі знішчыў 100 салдат і афіцэраў і каля 200 рассеяў па лесе. У час авіяцыйнага налёту зенітнымі кулямётамі збіты 2 самалёты тыпу «МЕ-109».

Мотабатальён аўтаматчыкаў з-за адсутнасці пераправы цераз р. Югна каля в. Малыя Хальнявічы прымкнуў да асноўных сіл толькі каля 9 гадзін вечара.

Страты брыгады: падарваны на міне адзін танк.»

Заканчваўся першы дзень штурму. Над Бабром нізка слаўся дым ад пажараў у пасёлку. Бой паступова затухаў. Войскі адводзіліся на адпачынак. Толькі на пераправе было неспакойна: гітлераўцаў не ўдалося выбіць з займаемага рубяжа. Зрэдку ўспыхвала перастрэлка. Чуліся глухія ўдары, шум матораў. Праціўнік хутка ўмацаваў пазіцыі. Вечарам да фашыстаў прыбыло падмацаванне: 15 цяжкіх танкаў тыпу «Тыгр» і «Пантэра», да 2 палкоў пяхоты, іншыя падраздзяленні 95-й нямецкай пяхотнай дывізіі.

Нарошчвалі баявую магутнасць і перадавыя часці Чырвонай Арміі. З другога эшалона ў дапамогу 3-й гвардзейскай танкавай брыгадзе дадаткова былі прыдадзены 18-я гвардзейская танкавая брыгада і 83-я стралковая дывізія. Рашаючы этап у вызваленні Крупскага раёна наступіў 28 чэрвеня 1944 года.

Дзень другі

Са зводкі Саўінфармбюро за 28 чэрвеня 1944 г.: «На мінскім напрамку нашы войскі, развіваючы паспяховае наступленне, авалодалі раённымі цэнтрамі Мінскай вобласці — горадам Халопенічы, горадам і чыгуначнай станцыяй Крупкі..., а таксама з баямі занялі больш за 400 іншых населеных пунктаў, сярод якіх Стараселле, Латыголічы, Ігрушка, Славені, Коханава».

Нядоўгім быў салдацкі адпачынак. Як толькі стала віднець, войскі прыйшлі ў рух. З самай раніцы пачалі баявыя дзеянні пехацінцы 2-й гвардзейскай мотастралковай брыгады. Ноччу камандаваннем было вырашана правесці абходны манеўр улева і выйсці ў раён Крупскага канцэнтрацыйнага лагера (тэрыторыя сучаснага палігона). Выкарыстаўшы фактар нечаканасці, гвардзейцы імклівым кідком уварваліся ў траншэі праціўніка. Да 7 гадзін раніцы бой перамясціўся ў лес на заходнім беразе ракі. У 4 гадзіны раніцы з лесу каля в. Маляўка пачала рух да пярэдняга краю 18-я гвардзейская танкавая брыгада. У 6 гадзін яна выйшла на паўночна-заходнюю ўскраіну пас. Бобр і завязала бой, які доўжыся да 13 гадзін. У ходзе артперасґрэлкі з танкамі і артылерыяй праціўніка 4 машыны Т-34 былі падбіты. Разам з танкістамі змагаліся і пехацінцы 83-й стралковай дывізіі.

Разгарэўся бой і ў раёне пераправы. 3-і танкавы батальён, які дзейнічаў у першым эшалоне 3-й гвардзейскай танкавай брыгады, страціў 5 машын. Паступова ў бой уцягваліся іншыя батальёны. Экіпаж Т-34 2-га батальёна ў складзе камандзіра Васіля Герасімавіча Сімакова з Разанскай вобласці, наводчыка-радыста Паўла Іванавіча Сцебліта, ураджэнца Курскай вобласці, адным з першых уварваўся на пераправу, знішчыў гармату, 2 аўтамашыны з зенітнымі ўстаноўкамі, да 30 чалавек пяхоты. На наступны дзень танк В. Г. Сімакова быў спалены, частка экіпажа загінула. П. І. Сцебліт атрымаў моцныя апёкі. Экіпаж танка Т-34, у які ўваходзілі камандзір малодшы лейтэнант Валянцін Іванавіч Навумаў, механік-вадзіцель Павел Іванавіч Кужалёў з г. Джамбул (Казахстан), камандзір вежы сяржант Мікалай Васілевіч Гагарынаў, ураджэнец г. Кіраў, у баі за пераправу знішчыў 2 гарматы, каля 30 салдат і афіцэраў. Аўтаматчык харкаўчанін Аляксей Пятровіч Шара-

фан скрытна прабраўся ў варожы тыл і агнём з аўтамата знішчыў 11 салдат непрыяцеля.

Гэтыя прыклады часткова адлюстроўваюць накал бою на берагах р. Бобр 27 і 28 чэрвеня 1944 г. Калі, напрыклад, 27 чэрвеня разам з наступаючым батальёнам у тыл ворага прарваўся лейтэнант Васіль Міхайлавіч Чабатароў, на яго накінулася група фашыстаў. В. М. Чабатароў знішчыў 10 гітлераўцаў, узяў у палон афіцэра.

У ходзе бою ён быў цяжка паранены, акружаны ворагамі, узяты ў палон і закатаваны. В. М. Чабатарову пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Да сярэдзіны дня ў раён баёў прыбыў камандуючы 5-й гвардзейскай танкавай арміяй маршал П. А. Ротмістраў. На месцы было прынята рашэнне правесці абходны манеўр. У 13 гадзін 3-я і 18-я гвардзейскія танкавыя брыгады, 83-я стралковая дывізія пачалі абыходзіць умацаваны раён праціўніка справа, праз в. Зароўе. Гітлераўцы, не маючы магчымасці адбіць флангавы ўдар, пакінулі заслон з 7 цяжкіх танкаў, 4 гармат і батальёна пяхоты і рушылі ў бок Крупак. Да 18 гадзін Бобр быў поўнасцю ачышчаны ад акупантаў. Як успамінаў пазней камандуючы 11-й гвардзейскай арміяй генерал К. М. Галіцкі, « у раёне Бабра 83-я гвардзейская стралковая дывізія генерала А. Г. Маслава разграміла атрад праціўніка колькасцю да 600 чалавек. Сярод узятых у палон немцаў быў і камандзір 95-й пяхотнай дывізіі генерал-маёр Міхаэліс».

З баявога распараджэння № 41: «5-й стралковай дывізіі з 202-м артылерыйскім палком з раніцы 28 чэрвеня працягваць энергічнае праследаванне праціўніка з задачай: авалодаць рубяжом Шарпілаўка—Смародзінка—Ламское і да заканчэння дня 28 чэрвеня выйсці на рубеж Студзёнка—Навінкі—Дудзінка.

Камандзір 5-й гвардзейскай стралковай дывізіі палкоўнік Волкаў».

Выконваючы загад камандавання, 12-ы гвардзейскі стралковы полк пачаў рух на Шарпілаўку, Лютыя і Смародзінку, 21-ы гвардзейскі стралковы полк — па маршруце Куты—Стаі—Худаўцы. Аднак непрыяцель, сабраўшы разрозненыя часці сваіх разбітых 299-й і 195-й дывізій, да 16 гадзін змог замацавацца на рубяжы Шарпілаўка—Луцішча—Калыбанава—Ламское. Агнём кулямётаў і лёгкай артылерыі гітлераўцы спрабавалі затрымаць прасоўванне часцей Чырвонай Арміі.

Рашучай франтальнай атакай з адначасовым ударам у фланг у напрамку в. Смародзінка праціўнік быў выбіты з займаемага рубяжа і ў беспарадку адступіў у бок лесу на поўначы ад в. Лецішча. Да вечара бой перамясціўся ў раён в. Шкорнеўка, дзе гітлераўцы зноў арганізавалі ачаг супраціўлення. У ходзе бою аднымі з першых у траншэі фа-

Сувязісты на шашы Орша—Барысаў. 1944 г.

шыстаў уварваліся старшына 7-й стралковай роты сібірак Васіль Ягоравіч Качанаў і баец 9-й стралковай роты беларус Максімаў Пётр Пятровіч з Віцебска. Апошні ў рукапашнай схватцы знішчыў 3 гітлераўцаў. Узвод пад камандаваннем старшыны сібірака Якава Міхайлавіча Аўчыннікава, адбіўшы 2 контратакі, на плячах фашыстаў уварваўся ў траншэі і замацаваўся ў іх да падыходу падмацавання... Бой пад Шкорнеўкай працягваўся да глыбокай ночы.

У той жа час пятля акружэння паступова зацягвалася каля пас. Крупкі. Да 15 гадзін 1-ы танкавы батальён 18-й гвардзейскай танкавай брыгады дасягнуў в. Шэйка, дзе сустрэў моцнае супраціўленне гітлераўцаў, што замацаваліся каля в. Лебедзева і ў лесе на поўдзень ад яе.

З журнала баявых дзеянняў 18-й гвардзейскай танкавай брыгады: «У выніку бою праціўнік быў выбіты з займаемых рубяжоў і, страціўшы 1 танк, 2 батарэі супрацьтанкавых гармат, 15 аўтамашын, звыш 50 салдат і афіцэраў, адышоў у раён Крупак, пакінуўшы заслон з 10 танкаў і самаходных гармат на поўдзень ад в. Новая Крупка».

Камандзір брыгады вырашыў абысці гэты заслон і атакай з поўначы авалодаць Крупкамі. Праціўнік зрабіў спробу затрымаць рух нашых часцей, імкнучыся вывесці з акружэння свае войскі, якія займалі абарону каля р. Бобр. Таму ён абараняў Крупкі значнымі сіламі, падцягнуўшы да чыгуначнай станцыі шмат танкаў, самаходных гармат і супрацьтанкавай артылерыі. Адначасова гітлераўцы часта контратакавалі. Адбіўшы контратакі праціўніка, 1-ы і 2-і танкавыя батальёны выйшлі на аўтамагістраль Масква—Мінск. У баявы парадак разгарнуўся і 3-і танкавы батальён.

Аднымі з першых уступілі ў схватку з ворагам за г. Крупкі разведчыкі і галаўны атрад танкістаў. Разведчыкі з групы сяржанта рускага Міхаіла Максімавіча Бажкова з тылу праніклі ў в. Лебедзева, знішчылі кулямётны разлік, 17 гітлераўцаў, гармату, захапілі 3 міны. Разведчык Аляксей Андрэевіч Кузьмін заўважыў кулямёт, які затым адкрыў агонь па групе. Ён скрытна падабраўся да агнявой кропкі і закідаў яе гранатамі.

У авангардзе наступлення ішла рота 1-га танкавага батальёна 18-й гвардзейскай танкавай брыгады пад камандаваннем Віктара Раманавіча Анішына, ураджэнца г. Пенза. Танкісты падпалілі 5 аўтамашын, падбілі 2 варожыя танкі, знішчылі 3 супрацьтанкавыя гарматы і каля 70 гітлераўцаў. Фарсіраваўшы балоцістую рачулку паблізу в. Майскае, рота выйшла да в. Новая Крупка, у тыл абароны немцаў. Абыходны манеўр 18-й танкавай брыгады і авалоданне населенымі пунктамі Шэйка, Лебедзева і Новая Крупка аблегчылі выкананне задачы 3-й танкавай брыгадзе і 83-й стралковай дывізіі, якія наступалі ўздоўж аўтамагістралі Масква—Мінск.

Да 17 гадзін на шашу Бобр—Крупкі высунуліся таксама 2-і і 3-і батальёны 2-й гвардзейскай мотастралковай брыгады. 1-ы мотастралковы і мінамётны батальёны і 260-ы механізаваны полк абыходзілі Крупкі злева, з боку чыгункі. У ходзе наступлення воіны 2-й мотастралковай брыгады вызвалілі тэрыторыю канцлагера. Аднак адступаўшыя фашысты паспелі расстраляць вязняў. Пры падыходзе да Крупак 3-я танкавая брыгада была спынена заслонам з пяхоты і артылерыі. Брыгада стала абыходзіць непрыяцеля справа. Адчуўшы пагрозу захопу з флангаў, гітлераўцы падарвалі мост на аўтамагістралі і адышлі.

На зыходзе дня да вёсак Худаўцы і Шэйка наблізіліся 148-ы стралковы полк 83-й стралковай дывізіі, да в. Лебедзева — 250-ы стралковы полк, да в. Зароўе — 252-і стралковы полк. Пачаўся штурм Крупак. У баях за райцэнтр старшы сяржант масквіч Павел Мікалаевіч Вараб'ёў замяніў забітага камандзіра ўзвода, падняў байцоў у атаку і першым са сваім узводам прарваўся да пераправы. У баі П. М. Вараб' ёў быў цяжка паранены. Камандзір узвода аўтаматчыкаў 18-й гвардзейскай танкавай брыгады малодшы лейтэнант Фёдар Фёдаравіч Кірылаў са сваімі байцамі знішчыў 2 дзоты, 4 мінамёты, некалькі дзесяткаў фашыстаў. Аўтаматчык Міхаіл Паўлавіч Смыгін у ліку першых пераадолеў балота, уварваўся ў пасёлак Крупкі і агнём з аўтамата знішчыў 6 нямецкіх салдат.

Мужна змагаліся ў вулічных баях за райцэнтр стралок ПТР Яўхім Піліпавіч Кітаеў з г. Казань і кулямётчык зенітнай батарэі Раман Аляксандравіч Аўдзееў з Алтайскага краю. Экіпаж Т-34, якім камандаваў лейтэнант украінец Рыгор Іванавіч Косараў, прыкрываючы разгортванне батальёна ў баявыя парадкі, уступіў у бой, падбіў варожы танк і знішчыў гармату. На падыходзе да Крупак машына Косарава была падбіта з засады, а сам ён паранены. Але танкіст працягваў весці бой. Экіпаж самаходнай установкі СУ-57 2-й мотастралковай брыгады пад камандаваннем лейтэнанта Сяргея Іванавіча Саўчанкі, ура-

джэнца Варонежскай вобласці, агнём з гарматы і гусеніцамі знішчыў 15 аўтамашын з боепрыпасамі, каля 30 салдат і афіцэраў праціўніка.

Да вечара райцэнтр Крупкі быў вызвалены. Бой перамясціўся ў раён чыгуначнай станцыі. У ліку першых да яе прарваўся камандзір бронетранспарцёра разведроты 2-й мотастралковай дывізіі масквіч Фёдар Андрэевіч Буркін. Яго экіпаж з кулямёта знішчыў да 10 гітлераўцаў, падавіў кулямётную кропку і падпаліў аўтамашыну. Таксама адным з першых на станцыю ўварваўся танк Т-34 з 1-га танкавага батальёна 18-й гвардзейскай танкавай брыгады, камандзірам вежы якога быў Андрэй Гаўрылавіч Глазуноў з г. Разань. Танкісты падбілі нямецкі танк Т-IV, знішчылі 2 гарматы, падавілі больш за 10 агнявых кропак. Экіпаж самаходнай установкі СУ-57 разведроты 2-й гвардзейскай мотастралковай брыгады, дзе вадзіцелем быў малодшы сяржант Іван Сямёнавіч Кузьмін, ураджэнец г. Тула, стральбой прамой наводкай вывеў са строю паравозы двух бронепаяздоў. У баі быў падбіты Т-34, якім камандаваў лейтэнант чуваш Васіль Сцяпанавіч Бурнаеў. Экіпаж пачаў на хаду ліквідаваць пашкоджанні. У гэты час група фашыстаў колькасцю 80 чалавек пайшла ў атаку. Ацаніўшы абстаноўку, камандзір загадаў экіпажу зняць танкавы кулямёт і залегчы ў жыце, а сам з зараджальшчыкам застаўся ў танку. Падпусціўшы праціўніка на 60 м, танкісты адкрылі шквальны гарматны і кулямётны агонь. Да 50 гітлераўцаў назаўсёды засталіся ляжаць на жытнім полі.

У час баёў за станцыю Крупкі група разведчыкаў на чале з малодшым сяржантам Іванам Якаўлевічам Гарловым з Варонежскай вобласці атрымала загад абысці праціўніка і атакаваць яго з тылу. Уварваўшыся ў траншэю, разведчыкі ў рукапашнай схватцы знішчылі 24 гітлераўцаў і 17 узялі ў палон, захапілі 4 кулямёты, 2 ротныя мінамёты. Разведчык Васіль Васілевіч Ушанаў закідаў гранатамі дзот, захапіў радыёстанцыю і ротны мінамёт.

Заканчваўся другі дзень вызвалення раёна. За 27 і 28 чэрвеня 3-я танкавая брыгада знішчыла 5 танкаў тыпу «Тыгр» і «Пантэра», 15 гармат, 11 мінамётаў, 31 кулямёт. Было забіта 870 салдат і афіцэраў праціўніка, 550 узята ў палон. Страты брыгады: спалена і падбіта 23 танкі, забіта і параненa 94 чалавекі. 5-я гвардзейская дывізія нанесла страты непрыяцелю забітымі і параненымі ў колькасці 4500 чалавек, узяла ў палон 1206 гітлераўцаў. Уласныя страты склалі 301 чалавек забітымі і 1149 параненымі. 18-я гвардзейская танкавая брыгада ў баі за райцэнтр Крупкі знішчыла 4 танкі, 16 супрацьтанкавых гармат, 5 мінамётаў, 3 склады з боепрыпасамі, 25 аўтамашын, 250 салдат і афіцэраў праціўніка. Страты брыгады склалі 8 спаленых і падбітых танкаў, 17 забітых і параненых.

Дзень трэці

Ноч з 28 на 29 чэрвеня выдалася неспакойная. Баявыя дзеянні не спыняліся. Працягваўся бой каля в. Шкорнеўка, дзе заканчвалася ліквідацыя акружанай групоўкі фашыстаў. У гэтай аперацыі асабліва вызначыўся 17-ы гвардзейскі стралковы полк, якім камандаваў капітан Праабражэнскі. Толькі да 3 гадзін ночы супраціўленне гітлераўцаў было зламана. Каля 700 акупантаў назаўсёды засталіся ляжаць у зямлі Беларусі, 250 чалавек было ўзята ў палон.

Адразу пасля ліквідацыі ачага супраціўлення часці 5-й стралковай дывізіі пачалі праследаванне. 17-ы гвардзейскі стралковы полк замацаваўся на рубяжы вёсак Колас—Шарпілаўка, 12-ы стралковы полк пасля фарсіраванага начнога марша да зыходу ночы выйшаў да в. Асінаўка, 21-ы — да в. Худаўцы. Днём, нягледзячы на стомленасць, пехацінцы дывізіі працягвалі праследаваць ворага. Да 18 гадзін 29 чэрвеня дывізія наблізілася да Барысаўскага раёна. 12-ы гвардзейскі полк выйшаў на рубеж Казлы—Вышні—Стан, 21 — Вішні—Стан—Лабачыха, 17-ы — Ранняе—Ратуцічы.

Зрабіўшы на працягу ночы дазапраўку і папоўніўшы боезапас, справа ад 5-й стралковай дывізіі працягвала наступленне 35-я гвардзейская танкавая брыгада. Ёй перашкаджала складаная перасечаная мясцовасць. На працягу 25 км танкісты пракладвалі сярод балот гаць. Але 35-я гвардзейская дывізія і 31-я танкавая брыгада 3-га гвардзейскага танкавага корпуса раней за іншых выйшлі на рубеж р. Бярэзіна.

У выніку хуткага і рашучага марш-кідка танкісты маглі своечасова прыйсці на дапамогу партызанам брыгад імя Кірава, Шчорса, 8-й Круглянскай і іншых, якія ўжо амаль месяц змагаліся ў акружэнні ў балотах воз. Палік. Калі даведзеныя да зморанасці няспыннымі абстрэламі і голадам партызаны вырашылі яшчэ раз паспрабаваць прарваць кальцо бла-

кады, па рацыі паступіла распараджэнне армейскага камандавання актыўных баявых дзеянняў не прадпрымаць і чакаць. І вось нарэшце вызваленне. Можна ўявіць радасць партызан, мірнага насельніцтва, якія знаходзіліся ў сямейных лагерах, калі яны сустрэлі і танкавы дэсант.

На працягу ночы сапёры 3-й гвардзейскай танкавай брыгады наладзілі пераправу на месцы разбуранага немцамі ў пасёлку Крупкі моста. Гэта дало магчымасць сілам брыгады з раніцы працягваць наступленне. Танкавыя калоны пачалі пераправу ў 4 гадзіны, і, рухаючыся па магістралі Масква—Мінск, да сярэдзіны дня падышлі да в. Мужанка Барысаўскага р-на. Адначасова разам з танкістамі з раніцы 29 чэрвеня пачалі праследаванне праціўніка і пехацінцы 2-й гвардзейскай мотастралковай брыгады. Яны таксама выйшлі да в. Мужанка. Паралельна шашы Масква—Мінск паміж 3-й гвардзейскай танкавай брыгадай і 5-й стралковай дывізіяй вяла баявыя дзеянні 83-я гвардзейская стралковая дывізія.

З журнала баявых дзеянняў 83-й гвардзейскай стралковай дывізіі за 29 чэрвеня 1944 г.: «Праціўнік рэшткамі разгромленых і разрозненых часцей працягвае адыходзіць у паўднёва-заходнім напрамку, аказваючы нязначнае супраціўленне на асобных рубяжах.

Дывізія з 29 чэрвеня працягвала энергічнае праследаванне праціўніка па маршрутах: 1) Панскае—Маслёнка—Баравыя—Радзіца—Шыялоўка—Млехава; 2) шаша Масква—Мінск. Справа наступалі часці 5-й гвардзейскай стралковай дывізіі, злева — 3-я гвардзейская танкавая і 2-я мотастралковая брыгады.

248-ы гвардзейскі стралковы полк выступіў у 6 гадзін раніцы з займаемага раёна і наступаў па маршруту Панскае—Маслёнка—Гапонавічы—Баравыя—Радзіца—Дакудава і да 21 гадзіны дасягнуў рубяжа паўночна-заходняй ускраіны Дакудава.

252-і гвардзейскі стралковы полк рухаўся па Мінскай шашы, авалодаў в. Сяліцкае, працягваючы выконваць пастаўленую задачу, да 21 гадзіны выйшаў да граніцы з Барысаўскім раёнам.

250-ы гвардзейскі стралковы полк рухаўся за 252-м палком, забяспечвае левы фланг дывізіі і да 21 гадзіны наблізіўся да в. Мужанка, замацаваўшыся там на вышыні 193,6.

Усяго за дзень баёў вызвалена тэрыторыя ў 160 км^2, 42 населеныя пункты, часці дывізіі прасунуліся на 33 км.

Страты асабовага складу за 28 і 29 чэрвеня: забітымі 16, параненымі 54 чалавекі».

На зыходзе трэцяга дня баёў тэрыторыя Крупскага раёна была ачышчана ад акупантаў. Яшчэ хадзілі па навакольных лясах недабітыя групы фашыстаў, яшчэ дагаралі пажары ў пасёлку Крупкі і вёсках, якія апынуліся ў зоне баявых дзеянняў, аднак людзі ўжо ведалі — яны вызвалены. Надышоў час пераходзіць да мірнага жыцця і стваральнай працы.

Дз. М. Хромчанка.

Баі на крупскай зямлі

Путь к Березине лежал по болотистой местности, без дорог, пригодных для движения моторизованных частей. К тому же параллельное движение с отступавшим на Борисов противником подвергало опасности фланг конников. Отдельные отряды гитлеровцев при этом вклинивались в наш маршрут, пытаясь отсекать выходящие на переправы наши части.

Утром 27 июня 32-я кавдивизия, идущая в авангарде, выступила из района Дубы за 26 часов, сметая заслоны противника, прошла 75 километров и 28 июня вышла к Березине, завязав бои за переправы. 121-й и 65-й кавполки стремительной атакой овладели мостами западнее совхоза Веселово под многослойным огнем противника с западного берега, с заранее подготовленного рубежа.

6-я дивизия генерала П. П. Брикеля достигла деревни Хотюхово.

Враг перебросил из Минска 12-й охранный полк, усиленный танками и штурмовыми орудиями «фердинанд». Немцам удалось овладеть районом Гута—Узнацк—Хотюхово. Часть 25-го гвардейского кавполка 6-й дивизии оказалась отрезанной от главных сил конников. Здесь проявил находчивость помощник начальника штаба полка младший лейтенант Николай Иванович Ковалевский. Он вместе с командиром эскадрона сумел организовать прорыв кольца противника и выйти на маршрут 5-й кавдивизии. Наша 5-я кавдивизия, подоспевшая к месту боя, повела наступление на Гуту и Узнацк.

2-й эскадрон 24-го полка под командованием старшего лейтенанта Леонида Олейни-

кова атаковал вражеские позиции. Фашисты даже не успели заправить горючим находившиеся поблизости танки и вынуждены были взорвать их.

Пулеметчик рядовой Давыденко, ведя огонь с тачанки, уничтожил более 30 гитлеровцев. В один из моментов схватки, когда конники уже ворвались на позицию врага, Давыденко увидел, что фашист целится из пистолета в командира взвода. Меткой очередью пулеметчик скосил гитлеровца.

Пулей пробило кожух пулемета рядового Куклянского. Боец достал из вещмешка кусок мыла, замазал пробоину, затем оторвал кусок гимнастерки, перебинтовал кожух «максима» и тут же вновь повел огонь по фашистам. Рядовай Окуньков поддержал атаку конников из ручного пулемета. Расстреляв все диски, он вскочил на коня и бросился в самую гущу схватки.

135 уничтоженных солдат и офицеров, 15 захваченных ручных пулеметов, 50 винтовок, 2 орудия, 15 автомашин — таковы итоги боя под деревней Гута.

Танк командира взвода 104-го полка нашей дивизии лейтенанта Андрея Волкова первым ворвался в деревню Яново — опорный пункт обороны гитлеровцев. Меткими выстрелами Волков поджег штурмовое орудие, танк раздавил гусеницами тяжелый миномет и два станковых пулемета вместе с расчетами.

Когда мы находились на территории Минской области, Волков повел в рейд по тылам фашистов 5 танков. На одной из проселочных дорог танкисты атаковали вражескую колонну. Машина, которой командовал Волков, расстреляла два транспортера, под ее гусеницами погибло более трех десятков гитлеровцев. И что самое важное — этот смелый рейд танкистов дал возможность двум нашим полкам, отрезанным противником, соединиться с дивизией.

Чтобы полнее охарактеризовать подвиги отважного танкиста, сошлюсь на следующий документ.

Командир 104-го танкового полка об этих боях докладывал в штаб 5-й гвардейской кавдивизии: «...28 июня 1944 года в районе села Гуты Минской области при атаке высоты 134,6 прямым попаданием танк командира роты был подожжен. Лейтенант Волков, презирая смерть, вместе с членами экипажа погасил пламя и продолжал вести бой. Он лично уничтожил две противотанковые пушки, два тягача, один миномет и до 30 гитлеровцев.

30 июня в районе Ляховка рота лейтенанта

А.А.Волкаў.

Волкова в составе четырех танков проникла глубоко в тыл противника и внезапно обрушилась на вражескую автоколонну. Огнем и гусеницами танкисты уничтожили десятки автомашин и сотни гитлеровцев.

6 июля в бою за населенный пункт Лоск танковая рота лейтенанта Волкова, скрытно приблизившись к расположению противника, внезапно атаковала его во фланг и в тыл. В этом бою лейтенант Волков лично уничтожил восемь пулеметов, одно орудие, расстрелял из пулемета и раздавил гусеницами около 60 гитлеровцев...

За образцовое выполнение боевых заданий командования и проявленные при этом мужество и геройство лейтенант Волков Андрей Алексеевич вполне достоен присвоения ему звания Героя Советского Союза».

Друкуецца па кн.: Водинский Д. И. Испытание мужеством. Мн., 1996. Т. 2. С. 110—113.

З успамінаў ст. лейтэнанта С. М. Бажкова

У складзе 3-га гвардзейскага танкавага корпуса наш полк вызваляў родную Беларусь, у тым ліку і Крупскі раён, у прыватнасці г. п. Бобр. 27 або 28 чэрвеня 1944 г. полк перарэзаў шашу Орша—Барысаў з боку Віцебска. У той час немцы яшчэ ўтрымлівалі ў сваіх руках Оршу і не ведалі, што нашы танкавыя часці апынуліся ў іх тыле. Асвоіўшы перакрыжаванне магістралі каля станцыі Крупкі, частка тэхнікі і жывой сілы была пакінута ў гэтым раёне з мэтай нанясення ўдару па немцах, якія адступалі з Оршы.

У той самы вечар (танкі выйшлі на магістраль у 16—17 гадзін) нашы часці праследавалі адступаючага праціўніка, занялі раённы цэнтр Крупкі і працягвалі наступленне на Барысаў. Многа было баёў і ў іншых населеных

пунктах, назвы якіх цяпер цяжка і ўспомніць.

Але з ліпеня пасля жорсткіх баёў полк адзін з першых уварваўся ў Мінск, які быў у руінах і гарэў.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

З успамінаў генерала арміі К. М. Галіцкага

В результате прорыва обороны противника к исходу 25 июня создались благоприятные условия для развития оперативного преследования противника с рубежа р. Оршица.

Правее нас успешно действовала 5-я армия, продолжала наступление уступом вперед и, продвинувшись в этот день на 20 км, правофланговыми частями освободила Алексиничи. Введенная в бой в полосе армии конно-механизированная группа в общем направлении на Холопеничи к исходу дня захватила Сенно...

Бои 27—28 июня не отличались особыми событиями. Все стало «обычным» — враг отступал, мы его били, иногда громили даже крупные группы, насчитывавшие 500—1000 человек. Но чаще всего добивали небольшие подразделения, имевшие незначительное количество артиллерии и минометов, а некоторые — танки и штурмовые орудия.

В облаках пыли, обливаясь потом в нестерпимой жаре, шагали форсированным маршем гвардейцы, преследуя врага. Впереди колонны каждой дивизии — стрелковый полк, имеющий передовой батальон пехоты с саперами на автомашинах, усиленный танками, самоходными орудиями и артиллерией на механической тяге.

К исходу дня 28 июня наступавшие дивизии 8-го и 16-го гвардейских стрелковых корпусов вышли на рубеж Обчуга, Бобр. В районе Бобра 83-я гвардейская дивизия генерала А. Г. Маслова разгромила отряд противника численностью до 600 человек. Среди взятых в плен немцев был командир 95-й пехотной дивизии генерал-майор Михаэлис. 2-й гвардейский танковый корпус в этот день, форсировав реку Друть, вел бой западнее Круглого в полосе 31-й армии, обеспечивая левый фланг армии. Крупная Могилевская группировка противника еще не была разгромлена.

Друкуецца па кн.: Освобождение Белоруссии. 1944. 2-е изд. М., 1974. С. 473—476.

З успамінаў Ф. Г. Капыціна, удзельніка вызвалення гарадскога пасёлка Бобр

Раніцай 23 чэрвеня быў вызвалены горад Талачын, на наступны дзень наша падраздзяленне падышло да станцыі Бобр. У той час я камандаваў кулямётным узводам...

На світанні 24 чэрвеня каля р. Бобр у баі загінулі 4 экіпажы нашых слаўных танкістаў. Танкі гарэлі перад самым мостам на працягу 2 дзён. На беразе ракі па-геройску загінулі лепшыя камандзіры ўзводаў 2-га батальёна 2-й мотастралковай брыгады лейтэнанты Зонаў, Кучкоўскі, сяржант Яшухін. Вядома, мы адпомсцілі ворагам за гібель сваіх баявых таварышаў. Перад станцыяй Бобр кулямётчык нашага ўзвода збіў нямецкі самалёт «Месершміт».

З успамінаў Надзеі Кузьмінічны Краўчанкі, жыхаркі в. Бобр

Вайна ніколі не забудзецца, асабліва той дзень, калі прыйшлі нашы салдаты. Памятаю, як людзі кідаліся да машыны з кветкамі. Большай радасці, як тады, я ніколі не адчувала.

Да вайны Бобр быў квітнеючым мястэчкам. Цэнтральную плошчу, нібы вянком, акружалі магазіны, усё было ў іх. Працавалі сталовая, аптэка, 3 клубы, бібліятэка, бандарны цэх, сярэдняя школа, царква, касцёл. І вось пачалася вайна. Уварваліся ў Бобр гітлераўцы праз некалькі дзён. Ехалі яны на машынах, іншыя ішлі пяшком з закасанымі рукавамі, як гаспадары. Вось тут і пачаліся для нас чорныя дні — грабяжы, расстрэлы... Але надышоў і светлы дзень, хаця было і жахліва тады. Немцы, уцякаючы, палілі ўсё. Ішоў бой. Бобр стаяў у полымі і дыме: стагналі параненыя нашы салдаты, фашысты, валялася шмат трупаў. На Маскоўскай шашы каля моста цераз р. Бобр быў вырыты супрацьтанкавы роў даўжынёй каля 15 м, шырынёй і глыбінёй каля 4 м, вось тут і закопвалі мёртвых. Шмат іх было. І ўсё ж мы бачылі, што немцы, кідаючы зброю, уцякалі, хто пехатою, хто на машынах — і радаваліся гэтаму.

Пасля ўсяго перажытага людзі плакалі ад радасці, калі настаў час вызвалення.

З успамінаў падпалкоўніка А. З. Лазавенкі

Пасля разгрому варожага гарнізона ў Таачыне поспех трэба было замацаваць, і таму камандзір механізаванага корпуса генерал І. А. Воўчанка прыспешваў гвардзейцаў выйсці да р. Бобр. У сваю чаргу палкоўнік Г. А. Пахадзееў вырашыў увесці ў бой 2-і эшалон 3-й гвардзейскай танкавай брыгады. У напрамку г. п. Бобр ён паслаў невялікую групу танкаў 3-га батальёна з дэсантам мотапяхоты. Туды ж накіраваліся мотастралкі 2-й гвардзейскай мотастралковай брыгады корпуса і іншыя воінскія часці.

Рака Бобр хоць і невялікая, але магла на нейкі час стрымаць рух наперад, знізіць тэмп наступлення савецкіх войскаў. Перад групай танкаў, што была паслана наперад, стаяла неадкладная задача: захапіць Бобр і забяспечыць бесперашкодны рух цераз мост галоўных сіл брыгады і корпуса.

Але на шляху да Бярэзіны немцы пачалі ствараць моцныя апорныя пункты. У рукі танкістаў трапілі звесткі, што Гітлер загадаў умацаваць рубеж Бярэзіны і абараняць яго так, быццам ён з'яўляецца мяжою «Новай Германіі».

Група нашых танкаў рухалася да Бабра паспяхова. Удалечыні паказалася ўзвышша. Дарога разрэзала яго на дзве часткі, утвараючы дэфіле. За ўзвышшам можна было бачыць р. Бобр і мост. Гэта месца немцы ўмацавалі і ператварылі яго таксама ў апорны пункт. Камандзір групы лейтэнант Малкоў разлічваў праскочыць яго на вялікай хуткасці. Ён высунуўся да пояса з танка і праз бінокль разглядваў мясцовасць, складаў план дзеянняў. Камандзір роты аўтаматчыкаў Шутаў падміргнуў танкісту і, быццам адгадаўшы яго думкі, сказаў: «Давай, браток, уперад, усё будзе добра...»

Першы танк хутка набліжаўся да вышыні. Калі ён увайшоў у вузкі праход паміж узвышшамі, «ажылі» ўсе нямецкія агнявыя пункты. Танк загарэўся. Дэсант аўтаматычна развярнуўся ў ланцуг і пайшоў за танкамі. Сілы былі яўна няроўныя. Аднак адступаць нельга, трэба было збіць праціўніка і авалодаць вышынёй, якая ўзнімалася над р. Бобр. Танкі пачалі абыходзіць вышыню. Варожы снарад трапіў яшчэ ў адзін з танкаў, на ім пачаўся пажар, які хутка ўдалося ліквідаваць. Танк адышоў у бок і адкрыў агонь. Неўзабаве аўтаматчыкі дасягнулі вышыні. У ворага паляцелі гранаты. Аднак немцы не саступалі, яны сваім агнём стараліся адсекчы пяхоту ад

А.З.Лазавенка.

танкаў. Хутка вораг перайшоў у контратаку. Цяпер ужо адбіваліся гвардзейцы і не саступалі ворагу. Дайшло да рукапашнай.

У гэтым баі вызначыўся оперупаўнаважаны аддзела контрразведкі 19-й гвардзейскай танкавай брыгады лейтэнант Васіль Міхайлавіч Чабатароў. Ён разам з аўтаматчыкамі быў у складзе танкавага дэсанта. У рукапашным баі Чабатароў знішчыў 10 гітлераўцаў і захапіў у палон нямецкага оберлейтэнанта. Калі чэкіст канваіраваў нямецкага афіцэра, ён убачыў, як у рукі немцаў трапіла санінструктар. Немцы катавалі яе. Вочы оберлейтэнанта заблішчэлі ад радасці. Ён кінуўся да Чабатарова, каб авалодаць яго зброяй. Але Чабатароў не разгубіўся, адбіў спробу немца і забіў яго, а пасля рвануўся да групы немцаў, што катавала санінструктара. Ён забіў яшчэ двух немцаў, але жанчына па-ранейшаму заставалася ў руках цыбатага рыжага фашыста. Гэты фашыст параніў нажом у грудзі савецкага афіцэра. Немцы, якія падбеглі, нанеслі Чабатарову некалькі нажавых удараў у жывот і грудзі. Цыбаты «фрыц» нажом выкалаў вочы чэкісту, а потым ударыў ім акрываўленую жанчыну. У парваным адзенні яна ўпала на зямлю.

На месца бою ішлі перадавыя падраздзяленні брыгады. Танкавы батальён гвардыі маёра Шышова абыходзіў вышыню злева і справа, усёю сваёю сілай наваліўся на ворагаў. Апорны пункт быў узяты.

Героі-гвардзейцы, што загінулі ў баі за пераправу на Бабры, былі пахаваны недалёка ад месца змагання. Лейтэнанту Чабатарову было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

На чыгуначнай станцыі воіны захапілі эшалон, раздавілі 72 павозкі і шмат аўтамашын гітлераўцаў, над баявымі парадкамі брыгады збілі нямецкі самалёт. Колькасць палонных дасягнула 1100 чалавек.

Аднак г. п. Бобр усё яшчэ быў у руках ворага. Гэта стрымлівала наступленне танкістаў-«кацельнікаўцаў». Пасёлак утрымліваўся часцямі 5-й нямецкай танкавай дывізіі, якія прыйшлі з рэзерву. У адзінаборства з імі ўступілі галоўныя сілы корпуса.

2-і батальён 2-й гвардзейскай мотастралковай брыгады канчаткова выбіў гітлераўцаў са станцыі Бобр і замацаваўся на беразе ракі. Іншыя падраздзяленні мотастралкоў уступілі ў гарадскі пасёлак. Тыя з іх, што выйшлі на бераг ракі, завязалі бой за пераправу. Кулямётны ўзвод лейтэнанта Ф. Г. Капыціна трымаў пад агнём сваіх кулямётаў мост цераз р. Бобр і не даваў немцам яго ўзарваць.

Дзеянні перадавога атрада 10-й гвардзейскай танкавай брыгады каля вышыні дапамаглі развіць наступленне войск у паўднёвым напрамку. Гэта адразу выкарыстаў камандзір корпуса генерал Воўчанка. Ён паставіў задачу: разведбату гвардыі маёра І. А. Сарокіна рухацца ў паўднёвым напрамку, паспрабаваць прайсці праз моцную абарону ворага і выйсці да г. Барысаў. Сарокін са сваімі разведчыкамі накіраваўся ў складаны і небяспечны шлях. Адначасова з гэтым падраздзяленне 2-й гвардзейскай мотастралковай брыгады корпуса пачало фарсіраваць р. Бобр.

Падрыхтаваў да друку М. А. Баравуля.

З успамінаў В. А. Лугаўцова, афіцэра Савецкай Арміі

Тры гады вайны марыў я прыняць удзел у вызваленні роднай Беларусі, дзе засталася ў акупацыі мая сям'я (жонка і двое дзяцей). І гэты дзень нарэшце настаў.

На досвітку 23 чэрвеня 1944 г. пачалася магутная гадзінная авіяцыйна-артылерыйская падрыхтоўка. Нашы танкі з дэсантамі, мотапяхота і артылерыя, ламаючы абарону, знішчаючы жывую сілу і тэхніку, імкліва рухаліся наперад. Немцы кідалі тэхніку, адступалі, пакідаючы на полі бою масу забітых і параненых.

У канцы першага дня аперацыі абарона праціўніка была прарвана нашымі войскамі. На трэці дзень яна была канчаткова зломлена. Танкавыя злучэнні рушылі наперад на 100 і больш кіламетраў на захад ад Оршы, цяжкая артылерыя пайшла ўперад па аўтастрадзе Масква—Мінск. Мая вёска Калыбанава была якраз па шляху, у 10-і кіламетрах ад аўтастрады. Пасля доўгіх просьбаў камандзір артылерыйскай брыгады дазволіў мне

В.А.Лугаўцоў.

выехаць уперад на пошукі сям'і. Радасці маёй не было мяжы.

Мы выехалі на грузавой аўтамашыне разам з афіцэрам і невялікай групай салдат. Ад Оршы да ст. Слаўнае рухаліся каля трох гадзін. Аўтастрада ўяўляла сабой могілкі нямецкай ваеннай тэхнікі. Час, здавалася, цягнуўся марудна і быў вечнасцю. Нарэшце — паварот на поўнач, але тут нас затрымаў пікет. Па даных, якія ён меў, калоны немцаў па лясных і прасёлкавых дарогах рухаліся на захад. Інжынер сувязі, які падышоў да нас у гэты час, далажыў, што ў напрамку майго следавання праціўніка няма.

Але гэта было далёка не так. Немцы ў вёсцы яшчэ былі. Непадалёку ад яе, у драбналессі, знаходзілася бакавая баявая ахова: 4 танкі з дэсантам і супрацьтанкавая гармата на цягачы. Разведка нашых войск вяла за імі назіранне. Баявая ахова, каб сябе не выявіць, мабыць, наўмысна прапусціла маю машыну.

У сваю вёску я ўварваўся, як віхор. Яшчэ б! Першы афіцэр Савецкай Арміі, у пагонах (да вайны пагонаў у нашай артылерыі не было) — гэта было радасна для людзей, якія тры гады знаходзіліся ў акупацыі. Хутка сабраліся ўсе жыхары вёскі, пачаліся роспыты. Дзве гадзіны прайшлі незаўважна. І раптам... дакладваюць: танкі праціўніка рухаюцца ў вёску. Даю каманду легчы, паназіраць, правесці разведку. Аказалася, што нашы войскі рыхтаваліся правесці артылерыйскі налёт і атаку. Разведка нашых войск назірала за танкамі немцаў і высачыла, калі яны ўвайшлі ў вёску.

Я сустрэўся з камандзірам стралковага батальёна, прадставіўся і далажыў, пры якіх абставінах аказаўся тут. Ён быў здзіўлены. Дамовіліся артналёт і атаку часова адкласці, а я за гэты час са сваёй групай артылерыстаў буду высвятляць абстаноўку.

Каля вёскі мяне сустрэла жонка і паведаміла, што праз сяло праскочылі чатыры нямецкія танкі з дэсантам. Яны разбілі маю машыну і абстралялі з аўтаматаў дом бацькі. Паведаміўшы абстаноўку камандзіру батальёна, мы занялі вёску без бою, ахвяр не было.

Але трагедыя была наперадзе. Пры руху на поўнач за паўкіламетра ад вёскі нашы падраздзяленні сустрэлі танкі і дэсант немцаў. Завязаўся бой, у якім я са сваёй групай таксама прыняў удзел. У ходзе бою была падпалена вёска. У гэты час падышлі нашы танкі і вымусілі гітлераўцаў адступіць.

Яшчэ да пачатку бою я выставіў на ўскраіне вёскі назіральнікаў — двух байцоў. Калі нямецкія танкі ўвайшлі ў яе, у хвасце ішоў цягач з супрацьтанкавай гарматай. Мае назіральнікі з аўтаматаў адкрылі па іх агонь. Машына спынілася. Тры гітлераўцы былі забіты, астатнія з вадзіцелем, кінуўшы машыну, з маланкавай хуткасцю, не адкрываючы агню ў адказ, дагналі танк, узабраліся на яго на хаду і ўцяклі. Было бачна, што ахова была настроена панічна і не мела задачы ўвязвацца ў бой. У далейшым, калі пачаўся бой, мае байцы з афіцэрам завялі цягач, вывелі зброю на паўночную ўскраіну вёскі і адкрылі агонь.

Нашы войскі рушылі ўжо наперад, калі мяне выклікалі да камандзіра стралковага палка.

— Ведаеце, дзе вы былі дзве гадзіны? — спытаў ён мяне.

Я адказаў:

— Так. У нейтральнай паласе.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

На пярэднім краі

Летом 1944 г. командир роты танковой разведки лейтенант М.Ф.Левченко получил боевую задачу пробиться через передний край врага в районе деревни Соколовичи Минской области, разведать его силы, изучить коммуникации, захватить «языка».

С наступлением сумерек командир роты решил провести разведку боем. К удивлению Левченко фашисты особенно не сопротивлялись. Почему? Не ловушка ли это? Но время дорого, и разведчики устремились на Запад. Надо было пройти десятки километров в тыл врага, а как, где? По шоссе? Опасно. По проселкам? Кто знает, что там на проселочных дорогах делается.

Пока Левченко размышлял, на лесной дороге появился старичок. Остановили. Спросили, кто он?

— Степан Устинович Шарапов, местный я.

Осмотрев танки, глянув пытливо на танкистов, он с радостью воскликнул:

— Три года ждали, а увидал — глазам не поверил. Много ли вас, сынки мои?

— Вся Россия идет, — ответил Левченко.

— Коль вся Россия идет, я проведу солдат такими шляхами, на которых на десятки верст ни одного фашиста не встретишь, — сказал Степан Устинович.

Проселками разведчики продвинулись километров на двадцать, разгромили расположенное в лесу подразделение фашистов, взяли в плен майора и капитана и, выполнив боевую задачу, благополучно вернулись на свою базу. А по их следам на оперативный простор вышло танковое соединение.

Сельское строительство. 1975. № 5.
Т. Митряшкин.

М.Ф.Леўчанка.

С.У.Шарапаў.

З успамінаў Героя Савецкага Саюза лётчыка М. Р. Пінчука

Было гэта 28 чэрвеня 1944 г. Войскі 3-га Беларускага фронту імкліва рухаліся наперад. На шашы і чыгункі скапілася вялікая колькасць тэхнікі і адступаючых войск. Іх раз-пораз бамбіла савецкая авіяцыя. Мне і

Аляксею Калюжнаму загадалі разведаць праціўніка ў месцах яго скаплення, прасачыць за перамяшчэннем немцаў і неадкладна перадаваць усе даныя ў штаб. У раёне ст. Бобр нас атакавалі два нямецкія знішчальнікі. Мой вядомы своечасова заўважыў іх і разгадаў намер ворага.

— Ззаду, злева пара «фокераў», — перадаў ён мне па радыё.

На вялікай хуткасці, выканаўшы левы баявы разварот, мы аказаліся ў больш выгадным становішчы, чым немцы. Фашыстам нічога не заставалася, як стаць у віраж. А на віражы, ды яшчэ на вышыні 600—800 метраў, экіпажу самалёта «Як» з «фокерам» справіцца было няцяжка. На другім віражы я зайшоў у хвост сцярвятніку і адной чаргой прашыў яго. Ён нязграбна перавярнуўся на спіну і зваліўся на зямлю непадалёку ад ст. Бобр. Другі фашыст на брыючым палёце пусціўся да сваіх. А мы паспяхова выканалі заданне.

Залатыя зоркі крупчан

БЯЛЯЕЎ Якаў Дзмітрыевіч. Герой Савецкага Саюза (31.8.1941). Нарадзіўся 15.3.1918 г. ў в. Піхалёва Кінешамскага раёна Іванаўскай вобласці ў сям'і селяніна. Рускі. У Чырвонай Арміі з верасня 1938 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце, камандзір бронемашыны 68-га асобнага разведбатальёна 100-й стралковай дывізіі 20-й арміі. Сяржант Я. Дз. Бяляеў вызначыўся ў абарончых баях на Беларусі. 25.6.1941 г. каля в. Астрашыцкі Гарадок Мінскага раёна знішчыў варожы танк і 3 матацыклы, 6 ліпеня паблізу вёсак Гібайлавічы і Сомры Крупскага раёна, калі праціўнік спрабаваў перарэзаць шлях адыходу 100-й стралковай дывізіі, знішчыў 4 аўтамашыны з пяхотай. Загінуў у рукапашным баі. Пахаваны ў брацкай магіле на могілках у г. Крупкі. Яго імем названа вуліца ў горадзе.

АПОШНІ БОЙ ЯКАВА БЯЛЯЕВА

... Нясцерпна паліла сонца. Чырвонаармейцы, якія рухаліся ў пешым страі, сціралі са стомленых твараў пот. На падводах везлі раненых. Большую частку аўтамашын давялося знішчыць — для іх не было паліва. Дывізія з баямі адыходзіла на ўсход. Прыкрываючы галоўныя сілы, атрады вялі жорсткія баі з танкамі і мотапяхотай ворага, не раз падымаліся ў контратаку і ў рукапашнай адкідвалі фашыстаў назад.

У адзін з атрадаў прыкрыцця ўваходзілі 2-гі батальён пяхоты, разведвальны батальён і артдывізіён. Камандаваць гэтым атрадам было загадана камандзіру 2-га батальёна капітану Аляксееву.

На досвітку 6 ліпеня 1941 г. 15 «месершмітаў» наляцелі на калону палка, якая расцягнулася ўздоўж дарогі. На брыючым палёце яны ўдарылі па калоне з кулямётаў. Застагналі раненыя, на цёплую зямлю пачалі падаць забітыя, удалечыні загарэлася аўтамашына.

— На дарозе фашысты, — дакладваў па тэлефоне камандаванню палка капітан Аляксееў. Сем танкаў, дванаццать бронетранспарцёраў, каля 20 матацыклістаў і прыкладна 150 аўтаматчыкаў.

— Праціўніка трэба стрымаць.

— Ёсць!

Батальён разгарнуўся на ўскраіне в. Селішча. Занялі агнявыя пазіцыі 122-міліметровыя гаўбіцы, за ўкрыццямі заляглі знішчальнікі танкаў...

Менавіта браняроце было загадана прыкрываць паўднёва-ўсходнюю ўскраіну в. Сомры...

Вёска гарэла. Густы дым ахутаў яе з усіх бакоў. Байцы заляглі ў неглыбокіх акопчыках, якія тут жа зрабілі, браневікі схавалі за пабудовамі, каб потым з засады ўдарыць па фашыстах.

Камандзір разведвальнага батальёна маёр Барташ непадалёку заўважыў бранявік. Па нумары на яго борце пазнаў, што гэта машына сяржанта Бяляева.

— Выручай! — крыкнуў яму Барташ. — Вунь там (ён паказаў на процілеглы бок вёскі) ты павінен утрымаць дарогу. Усяго паўгадзіны, разумееш, паўгадзіны.

Ён, маёр Барташ, ведаў, на каго можна палажыцца. Якаў Бяляеў зробіць усё магчымае і нават немагчымае, але ворага не прапусціць. Дзве бронемашыны Бяляева і Пахомава, лавіруючы паміж узрывамі бомб, на скорасці

праскочылі Сомры і прытаіліся ў засадзе. Сяржант агледзеўся. Па дарозе ў тыл атрада прыкрыцця рухаліся бронетранспарцёры, за імі — пяхота.

— Ці не мнагавата, камандзір? — запытаў Бяляева вадзіцель бронемашыны.

— Ворага не лічаць, а б'юць, — сяржант апусціўся на сядзенне і звыкла сціснуў ручку кулямёта. — Вось толькі падпусцім бліжэй.

Гадзіннік паволі, нібы пад прымусам, адлічваў хвіліны. У распаленай сонцам машыне не было чым дыхаць. Салёны пот заліваў вочы, хацелася піць.

— Давай, камандзір, ужо блізка...

— Ну што ж, трымайцеся, гады! — Бяляеў са злосцю націснуў на гашэтку кулямёта. Доўгая чарга сцебанула па фашысцкіх аўтаматчыках, потым па бартах бронетранспарцёраў. Прайшлі лічаныя мінуты, а здавалася, бой ішоў больш чым гадзіну.

Нечакана з-за бліжэйшай хаты прама на бранявік Бяляева выскачыў нямецкі бронетранспарцёр. І Бяляеў, і фашыст адкрылі агонь адначасова... Бяляеў, перасільваючы страшэнны боль у перабітай назе, ледзь выбраўся з машыны. Ужо лежачы на зямлі, ён убачыў, як да яго ідуць фашысцкія аўтаматчыкі. Яны не стралялі, ён патрэбны быў жывы.

Сяржант, цяжка апіраючыся на борт браневіка, павольна падняўся з зямлі. Ён стаяў на адной назе, прыхінуўшыся спіной да машыны. У яго нагане было сем патронаў, усяго сем.

— Ну што ж, дарма жыццё я не аддам...

Сяржант Бяляеў паспеў зрабіць сем трапных выстралаў...

Ён пратрымаўся роўна столькі, колькі трэба было, каб перакінуць на гэты ўчастак артылерыйскі дывізіён палка. Але ён ужо не бачыў, як ад удараў артылерыстаў капітана Памельнікава запалалі фашысцкія машыны, не бачыў, як падняліся ў рукапашную байцы батальёна капітана Аляксеева.

Баявыя сябры знайшлі Якава Дзмітрыевіча каля знявечанага браневіка. На месцы подзвігу героя стаялі чатыры падбітыя фашысцкія бронетранспарцёры, вакол валяліся гітлераўскія аўтаматчыкі. Я. Дз. Бяляева разам з іншымі загінуўшымі пахавалі непадалёку ад месца бою. Праз 20 гадоў астанкі герояў-чырвонаармейцаў перанеслі на могілкі г. Крупкі. Памяць пра герояў жыве ў сэрцах нашчадкаў.

М. М. Навахрост.

Я. Дз. Бяляеў.

М. Я. Зайцаў.

ЖУНІН Сяргей Георгіевіч. Герой Савецкага Саюза (18.8.1944). Нарадзіўся 18.8.1906 г. ў с. Мядзведзіцкае Кімрскага раёна Калінінскай вобл. З сялян. Рускі. У Чырвонай Арміі з 1928 г.

Айчынную вайну С. Г. Жунін пачаў памочнікам камандзіра танкавага палка на заходняй граніцы СССР. З баямі адступаў праз Беласток, Гродна, Слонім. Аказаўшыся ў акружэнні, з ліпеня 1941 г. пачаў арганізоўваць партызанскую барацьбу ў Круглянскім і Шклоўскім раёнах. З красавіка 1942 г. камандзір партызанскага атрада «Сяргея», у кастрычніку 1942 г. — жніўні 1943 г.— 8-й Круглянскай партызанскай брыгады. Брыгада дзейнічала на тэрыторыі Круглянскага і Крупскага раёнаў. Партызаны Жуніна праводзілі дывэрсіі на чыгункі Мінск—Масква, разграмілі варожы гарнізон у в. Дзянісавічы. У снежні 1943 г. частка брыгады на чале з Жуніным зрабіла рэйд па Брэсцкай вобласці. У 1944—50 гг. на савецкай рабоце ў Брэсце і Мінску. Памёр 27.1.1977 г. Аўтар кнігі «От Днепра до Буга» (Мн., 1974).

ЗАЙЦАЎ Мікалай Якаўлевіч. Герой Савецкага Саюза (1945). Нарадзіўся 10.3.1923 г. на чыг. ст. Крупкі. У Чырвонай Арміі з 1941 г. Скончыў 3-ю Чкалаўскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў (1943), БДУ (1967). У Вялікую Айчынную вайну з лютага 1944 г. старшы лейтэнант М. Я. Зайцаў на 1-м і 4-м Украінскім франтах: лётчык, камандзір звяна, намеснік камандзіра эскадрыллі штурмавога авіяпалка. Удзельнік вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі. Зрабіў 185 баявых вылетаў, правёў 15 паветраных баёў, збіў 2 самалёты, знішчыў больш за 100 адзінак баявой тэхнікі ворага. Да 1960 г. ў Савецкай Арміі, палкоўнік. З 1967 г. выкладчык, з 1983 г. дацэнт БДУ. Узнагароджаны 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай

Зоркі, 2 ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені. Жыве ў Мінску.

З успамінаў М. Я. Зайцава

Дзесьці ў сярэдзіне красавіка 1945 г., калі вяртаўся з баявога задання, я заўважыў вялікае скапленне нямецкіх аўтамашын. Як потым высветлілася, гэта аказаліся машыны рухомага штаба нямецкай групоўкі войск генерала Шэрнера, якія адступалі ў бок амерыканскіх войск. Мы даўно шукалі гэты штаб. Калі прыляцеў на аэрадром, далажыў камандзіру палка, што нарэшце выявіў нешта падобнае на штаб і папрасіў дазволу атакаваць яго. Удар быў раптоўным і дакладным. 20 аўтафургонаў былі знішчаны. Такое не забываецца.

Баявая і штодзённая работа лётчыка заўсёды звязана з экстрэмальнымі сітуацыямі рознага характару. Напрыклад, калі я наносіў удар па рухомым штабе групоўкі генерала Шэрнера, то трапіў менавіта ў такую сітуацыю. І вось чаму. На самалёце знаходзіўся бомбавы груз каля адной тоны, каб яго скінуць, неабходна было мець так званую бяспечную вышыню. А якраз яе ў мяне на той момант не было. Калі бомбы былі скінуты, выбухам ад іх мой самалёт перавярнула ў паветры, і ён стаў некіруемы. Нейкім цудам ужо каля самай зямлі мне ўдалося вывесці яго ў нармальнае становішча і вярнуцца дадому.

КАЗЛОЎСКІ Мікалай Кузьміч. Герой Савецкага Саюза (3.6.1944). Нарадзіўся 15.12.1917 г. ў в. Гапонавічы Крупскага раёна ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння школы па пуцёўцы камсамола накіраваны на будоўлю ў г. Барнаул. У Чырвонай Арміі з 1939 г. Скончыў Сызранскае танкавае вучылішча ў 1942 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на Паўднёва-Заходнім і Варонежскім франтах. Камандзір танкавай роты лейтэнант М. К. Казлоўскі вызначыўся ў верасні 1943 г. пры вызваленні Кіеўскай вобласці. 26.9.1943 г. рота пад яго камандаваннем фарсіравала Дняпро каля в. Зарубінцы, 28—29.9.1943 г. каля в. Вялікі Букрын адбіла 6 контратак праціўніка, падбіла 6 танкаў і самаходных гармат, знішчыла 2 мінамётныя батарэі, 50 станковых кулямётаў і больш за 100 фашыстаў. Загінуў у баі 11.10.1943 г. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі. Яго імем названа вуліца ў г. Крупкі, на радзіме помнік.

У музеі баявой славы часці, дзе служыў

М.К.Казлоўскі.

В.А.Князеў.

М. К. Казлоўскі, ёсць стэнд, прысвечаны нашаму земляку.

АПОШНІ БОЙ

11 кастрычніка танкавы батальён, у складзе якога была і рота Казлоўскага, атрымаў загад увайсці ў прарыў і развіць поспех у напрамку Вялікі Букрын—Ходарава. Танк старшага лейтэнанта адным з першых праўараніў абарону фашыстаў і выраваўся на прастор. І раптам страшэнны ўдар страсянуў машыну. Мікалай Кузьміч зразумеў — прамое пападанне. З экіпажа засталіся жывымі М. К. Казлоўскі і цяжка паранены механік-вадзіцель.

Мікалай Кузьміч разумеў, што трэба хутчэй адбягацца ад танка, але пакінуць параненага байца не мог. Некалькі мінут ён стараўся выцягнуць таго з танка. Сцяўшы зубы, старшы лейтэнант з усёй сілы рвануў цела непрытомнага механіка-вадзіцеля. Яшчэ хвіліна — і той ляжаў на зямлі. У гэты момант побач раздаўся выбух. Узрыўной хваляй іх адкінула ад танка. Яны так і засталіся ляжаць побач — камандзір роты і механік-вадзіцель танка. *Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.*

КНЯЗЕЎ Васіль Аляксандравіч. Герой Савецкага Саюза (24.8.1943). Нарадзіўся 9.1.1920 г. ў г. п. Бобр Крупскага раёна ў сялянскай сям'і. Дзіцячыя гады прайшлі на чыгуначнай станцыі Княжыца, што на Віцебшчыне. Скончыў Віцебскі аэраклуб, Адэскую ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў (1940). У Чырвонай Арміі з 1938 г. Вялікая Айчынная вайна застала яго ў Вінніцы, быў ён тады камандзірам звяна, лейтэнантам. На другі дзень вайны збіў першы варожы самалёт. За гэта камандаванне палка ўзнагародзіла яго

ботамі і скураным паліто. Удзельнічаў у вызваленні Паўночнага Каўказа, Украіны, Беларусі. Камандзір эскадрыллі знішчальнага авіяпалка старшы лейтэнант В. А. Князеў зрабіў 1088 баявых вылетаў, правёў 139 паветраных баёў, збіў 20 самалётаў ворага. У складзе групы знішчыў 9 самалётаў, 22 варожыя эшалоны, 18 танкаў, 74 аўтамашыны, 28 зенітных установак ворага. Толькі адзін раз, на Кубані, яго самалёт быў збіты. Жанчына, у якой ён на агародзе прызямліўся, дала яму старэнькае адзенне, і ён накіраваўся ў бок фронту. Ішоў два месяцы. Лінію фронту пераходзіў цераз балота, пад абстрэлам «кацюш». Ён да такай ступені распух ад голаду, што боты і адзенне давялося разразаць. Пасля вайны служыў у Савецкай Арміі. З 1962 г. ў званні палкоўніка ў адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга. Памёр 22.7.1968 г. У г. п. Бобр у музеі школы, дзе вучыўся В. А. Князеў, адзін з раздзелаў экспазіцыі прысвечаны яго памяці. Яго імем названа вуліца ў Віцебску.

З адкрытага пісьма В. А. Князева, надрукаванага ў газеце 4-й паветранай арміі «Крылы Савецкай» ад 12 ліпеня 1944 г.

СЛУХАЙ МАЮ КЛЯТВУ, БЕЛАРУСЬ!

Тры гады знаходзілася пад фашысцкім гнётам мая Радзіма — Беларусь. Тры гады фашысцкія разбойнікі здзекаваліся над беларускім народам, спрабуючы пазбавіць яго чалавечых правоў, ператварыць у рабоў. Чужая мова гучала ў вёсках і гарадах, варожы бот таптаў родную зямлю. Але не скарыўся народ. Беларусь жыла і будзе жыць, беларускі народ чакаў і верыў: наступіць гадзіна вызвалення, гадзіна адплаты фашысцкім катам. І вось прыйшлі гэтыя радасныя, незабыўныя дні вялікага наступлення Чырвонай Арміі. Загнаны ў ціскі вораг у паніцы бяжыць, кідаючы гарматы, аўтаматы, танкі, машыны, тысячы трупаў. Мы ідзём наперад і наперад па беларускай зямлі. На сваім шляху ўсюды мы бачым злачынныя і жудасныя сляды гітлераўскіх акупантаў. Разваліны Мінска, Магілёва, іншых беларускіх гарадоў, спаленыя вёскі, кроў закатаваных у засценках гестапа братоў і сясцёр клічуць да помсты.

Асабіста мяне напаткала вялікае гора. Фашысты замучылі маіх родных. Да краёў перапоўнена сэрца пякучай нянавісцю да фашысцкіх разбойнікаў, якія разбурылі маё гняздо. Праклёны гітлераўскім забойцам, якія прынеслі разбурэнне і смерць на нашу зямлю. Ніякай ім літасці! Будзем гнаць іх да самай разбойнічай бярлогі, будзем знішчаць іх бязлітасна, пакуль не паставім на калені.

Слухай, мая родная Беларусь, слухай мой шматпакутны народ. Клянуся, што ніколі не дрогне мая рука ў баі. Пакуль б'ецца маё сэрца, я буду знішчаць ворага, змагацца за шчасце маёй Радзімы!

З успамінаў генерал-маёра авіяцыі ў адстаўцы Г. Пшаняніка

У час вызвалення Беларусі свой уклад у разгром магілёўскай групоўкі ворага ўнеслі і лётчыкі гвардзейскага Новарасійскага знішчальнага авіяцыйнага палка. Працуючы ў той час у аператыўным аддзеле штаба 4-й паветранай арміі, я асабліва ўважліва сачыў за ратнымі справамі маіх аднапалчан. Справа ў тым, што першыя паўтара гады вайны я быў начальнікам штаба гэтага палка і, натуральна, быў яго патрыётам. У адзін з тых чэрвеньскіх дзён мне давялося прачытаць баявое данясенне аб тым, што пара знішчальнікаў Ла-5 Новарасійскага палка, якую ўзначальваў яго штурман Герой Савецкага Саюза гвардыі капітан В. А. Князеў і якая суправаджала групу штурмавікоў Іл-2, атакавала разам з імі адыходзячыя варожыя калоны на шашы Магілёў—Мінск. На адным з яе ўчастку была выяўлена вялікая калона — да 200 аўтамашын, цягачоў і бронетранспарцёраў з пяхотай гітлераўцаў. Паралельна рухаўся вялікі конны абоз.

Са сваім вядомым, як указвалася ў баявым данясенні, ён, пасля таго як «ілы» скінулі бомбы і адштурмаваліся па цэлі, рынуўся на варожую калону, расстрэльваючы яе пушачным агнём. Сем заходаў зрабілі адважныя лётчыкі, нанёсшы вялікі ўрон гітлераўцам. Узнікла больш за 20 ачагоў пажараў, у кювет ляцелі палаючыя машыны і падводы. А Князеў працягваў паліваць свінцовым агнём фашыстаў да поўнага расходавання боекамплекта.

Я быў рады баявому поспеху майго сябра. Міжволі перада мной паўстаў яго вобраз. Кіпучы па натуры, часам нават залішне ўспыльчывы, блакітнавокі беларус заўсёды звяртаў на сябе ўвагу сваёй віртуознасцю ў тэхніцы пілатавання, хуткасцю рэакцыі ў нечаканых сітуацыях. У яго, бадай, было больш умення паветранага байца, чым у іншых лётчыкаў.

У гэтыя дні ўсім аднапалчанам пашчасціла перажыць хвалюючыя мінуты; звязаныя з узнагароджаннем палка 27 ліпеня 1944 г. ордэнам Чырвонага Сцяга за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання ў баях за авалоданне горадам Магілёвам і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць. Гэта была дастойная ўзнагарода гвардзейцам за іх уклад у вызваленне Беларусі.

Падрыхтаваў да друку Б.Дз. Даўгатовіч.

КОЛЕСАВА Алена Фёдараўна. Герой Савецкага Саюза (1944). Нарадзілася 8.6.1920 г. ў в. Колесава Яраслаўскага раёна. Жыла ў Маскве. З 1941 г. на фронце. Медсястра. Удзельніца абароны Масквы. З групай разведчыкаў неаднойчы пераходзіла лінію фронту для дыверсійнай работы ў варожым тыле. З мая 1942 г. камандзір дыверсійнай групы, якая дзейнічала ў Барысаўскім і Крупскім раёнах. Дэсантніцы Колесавай узарвалі 4 эшалоны ворага, 7— разам з іншымі групамі. Удзельнічалі таксама ў разгроме 6 гарнізонаў праціўніка, узарвалі 3 аўтамашыны. 11.9.1942 г. ў час бою каля в.Выдрыца Крупскага раёна А.Ф.Колесава загінула. Пахавана ў г. Крупкі. У Крупках у 1967 г. ўстаноўлены помнік А.Ф.Колесавай.

КОНАНАЎ Міхаіл Дзмітрыевіч. Герой Савецкага Саюза (27.2.1945). Нарадзіўся 23.1.1906 г. ў г. п. Бобр Крупскага раёна ў сялянскай сям'і. З 1931 г. працаваў на Ленінградскім суднабудаўнічым заводзе. Скончыў бранятанкавыя курсы ў Ленінградзе (1932), Ленінградскія хіміка-тэхналагічны інстытут (1937), Вышэйшую афіцэрскую бранятанкавую школу (1951). У 1937—41 гг. працаваў на заводзе ў Ленінградзе. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну на Ленінградскім і 1-м Беларускім франтах. Удзельнік абароны Ленінграда, вызвалення Эстоніі, Польшчы, баёў у Германіі. У студзені 1944 г. танкавы батальён пад яго камандаваннем прарваўся ў тыл праціўніка і дэзарганізаваў яго абарону. Паранены, узначаліў атаку. 17—25.1.1944 г. знішчыў 5 варожых танкаў, 29 гармат, 9 дзотаў, 18 кулямётных кропак і каля 300 гітлераўцаў. Вызначыўся ў баях за вызваленне Польшчы ў студзені 1945 г. Танкавы батальён пад камандаваннем маёра М. Дз. Конанава прарваў абарону праціўніка, авалодаў пераправай цераз р. Піліца, забяспечыў фарсіраванне ракі, замацаваўся на яе левым беразе. У складзе галоўнай баявой разведкі батальён першым уварваўся ў г. Скернявіцы, у выніку пяцігадзіннага бою разграміў полк пяхоты праціўніка і поўнасцю вызваліў горад. Да 1959 г. ў Савецкай Арміі, падпалкоўнік. У 1963—70 гг. працаваў старшым інжынерам на Адміралцейскім заводзе ў Ленінградзе. Памёр 9.5.1972 г. Яго імем названа вуліца ў г. п. Бобр.

З успамінаў М. Дз. Конанава

Добра запомніўся суровы студзень 1944 г. У тыя дні 2-я ўдарная і 42-я арміі Ленінградскага фронту збіраліся нанесці знішчальны ўдар па нямецка-фашысцкіх войсках, якія працягвалі блакіраваць Ленінград. Напярэдадні наступлення ў 51-м танкавым батальёне, якім я камандаваў, і ў іншых батальёнах адбыліся кароткія мітынгі.

19 студзеня 1944 г. нашы танкавыя падраздзяленні ўварваліся на ўскраіны Краснага Сяла. У баях за гэты населены пункт праявілі сябе танкавыя ўзводы, якімі камандаваў старшы лейтэнант Маліноўскі, лейтэнанты Паўлаў, Кандрацьеў і іншыя.

Наш батальён паспяхова авалодаў перакрыжаваннем шашы Краснае Сяло—Кіпень і глыбока ўклініўся ў варожую абарону. Каб не даць праціўніку апамятацца, я загадаў перастроіць баявы парадак батальёна ў паходную калону і працягваць выконваць баявую задачу. На вялікай хуткасці танкі з запаленымі фарамі імкліва прасоўваліся ўперад. Гітлераўцы прынялі нашы танкі за свае адыходзячыя войскі. Гэта была наша невялікая хітрасць. Вечарам 19 студзеня нашы танкі выйшлі на рубеж Кіпень—Ропша. Дзякуючы добра прадуманаму і імкліваму манеўру нашых войск праціўнік часткова быў разбіты. З кожным боем мужалі і загартоўваліся воіны, раслі іх майстэрства і ваенная кемлівасць. За паспяховыя баявыя дзеянні пры прарыве блакады Ленінграда многія танкісты 220-й танкавай брыгады былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Далейшы баявы шлях нашай танкавай брыгады праходзіў па дарогах Ленінградскай вобласці, ад Віслы да Одэра.

14 студзеня 1945 г. пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі 1-ы танкавы батальён 220-й танкавай брыгады разам з падраздзяленнямі 294-й стралковай дывізіі пасля прарыву абароны праціўніка і фарсіраванні р. Піліца выйшаў на дарогу Радам—Варшава.

Прыгадваю, як камандзір разведвальнага ўзвода старшы лейтэнант Маліноўскі пад агнём праціўніка адшукаў брод цераз р. Піліца.

М.Дз.Конанаў.

А.С.Лукашэвіч.

На нашым левым флангу камандзір танкавай роты капітан Галавач знайшоў уцалелы мост, па якім перапраўляліся фашысты.

29 студзеня мы з баямі выйшлі да р. Одэр. Да Берліна заставалася ўсяго 60 кіламетраў.

Ніколі не забудзецца грандыёзнасць маштабаў красавіцкага наступлення нашых войск на Берлін з кюстрынскага плацдарма ноччу 1 красавіка 1945 г. Нашы танкі і пяхота ішлі на абарончыя лініі праціўніка пры святле шматлікіх пражэктараў. Мы захоплівалі адзін за мацаваны рубеж за другім.

23 красавіка 1945 г. нашы перадавыя часці вышлі да Берліна, а ўжо 25 красавіка надвячоркам пачаўся жорсткі бой у Берліне.

2 мая 1945 г. нямецкае камандаванне аддало загад аб капітуляцыі нямецкіх войск. Гэта быў канец самай жорсткай і самай крывавай вайны, якую калі-небудзь ведала чалавецтва.

ЛУКАШЭВІЧ Аляксей Сцяпанавіч. Герой Савецкага Саюза (15.8.1944). Нарадзіўся 3.6.1924 г. ў в. Чарнавосава Крупскага раёна ў сям'і служачых. Вайна застала яго ў далёкім Крыме. Яму толькі што споўнілася 17 гадоў. Мары пра будучае перакрэсліла вайна. Калі фашысты занялі Крым, Аляксей вырашыў прабірацца ў родную Беларусь. Многа тыдняў давялося правесці ў дарозе, пакуль нарэшце ён не дабраўся да бацькоўскага парога. У той час у наваколлі Гумнаў, дзе жыў яго бацька, ужо дзейнічалі партызанскія групы. Аляксея залічылі ў групу разведкі. У хуткім часе разведгрупа стала асновай 28-га асобнага партызанскага атрада.

Доўга і старанна рыхтаваліся партызаны да першага выхаду на чыгунку. І вось майскай ноччу 1942 г. ў раёне Трацілава—Талочын прагрымеў выбух. Паравоз і некалькі вагонаў з прадуктамі паляцелі пад адхон. Пачатак знішчаным цягнікам паклалі камандзір групы падрыўнікоў Ігар Аляксандраў і Аляксей Лукашэвіч. З іх лёгкай рукі дывэрсіі на чыгункі сталі рэгулярнымі. За няпоўны год Аляксей узарваў 9 варожых эшалонаў.

Восенню 1943 г. супраць партызан былі кінуты вялікія сілы карнікаў. 8 дзён і начэй ішлі цяжкія баі. Партызаны вытрымалі шалёны націск праціўніка. Але, адыходзячы, вораг пакідаў засады, ствараў моцныя гарнізоны. Партызанскаму камандаванню патрэбны былі звесткі пра гэтыя «асіныя гнёзды», і яно накіравала туды групы разведчыкаў. 13 лістапада 1943 г. такую групу ўзначаліў А. Лукашэвіч. Каля в. Зелянкова Круглянскага раёна партызаны натрапілі на засаду. Першымі стрэламі былі забіты яго сябры. Аляксей застаўся адзін супраць некалькіх дзесяткаў азвярэлых фашыстаў. Амаль гадзіну працягваўся гэты няроўны паядынак. Скончыліся патроны, у ход пайшлі гранаты. І вось засталася апошняя...

Фашысты акружылі яго з усіх бакоў. Калі яны аказаліся зусім побач, раздаўся страшэнны выбух. Цяжка паранены, апошняй гранатай Аляксей падарваў сябе і гітлераўцаў. Пахаваны ў в. Глыбокае Круглянскага раёна, на магіле ўстаноўлены бюст. Яго імем названа вуліца ў г. п. Круглае. У 1974 г. ў в. Ухвала каля будынка сярэдняй школы, якая носіць імя А. С. Лукашэвіча, пастаўлены помнік — бюст героя. *Дз. М. Хромчанка.*

ЛЫЦІН Дзмітрый Канстанцінавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся ў 1920-я г. ў в. Малыя Жаберычы. У 1928 г. сям'я пераехала ў пас. Лебядзінка Іркуцкага раёна. Дзмітрый скончыў няпоўную сярэднюю школу, пасля працаваў у калгасе «Праца», нейкі час быў яго старшынёй. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, быў сувязістам, бранябойшчыкам, камандзірам аддзялення разведчыкаў. Вызначыўся пры фарсіраванні р. Дняпро, у баях за гарады Харкаў, Белгарад.

... 5 лістапада 1944 г. групе разведчыкаў 5-й гвардзейскай асобнай разведроты 1-й паветрана-дэсантнай дывізіі 53-й арміі на чале са старшым сяржантам Дз. Льціным было загадана непрыкметна фарсіраваць р. Ціса і захапіць плацдарм праціўніка каля г.Тысафюрэд (Венгрыя). Неўзабаве група была заўважана ворагам. Пад кулямётным і мінамётным агнём ўсе дабраліся да берага і ўступілі ў бой. Амаль 2 гадзіны невялікая група разведчыкаў трымалася на вузкай палосцы берага, пакуль не падышло падмацаванне. 9 разведчыкаў у гэтым баі знішчылі каля сотні гітлераўцаў, у

тым ліку асабіста Дз. Льщін — 20, адбілі 15 контратак.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя пры фарсіраванні р. Ціса, старшаму сяржанту Дз. К. Льщіну было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасля былі баі ў Чэхаславакіі, потым на Далёкім Усходзе. Пасля вайны 5 гадоў старшына заставаўся на звыштэрміновай службе, потым перайшоў на мірную працу. Памёр 11.11.1954 г. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, Славы 3-й ступені. Пахаваны ў Іркуцку. *Дз.М.Хромчанка.*

ЛЮТЫ Аляксандр Сяргеевіч. Герой Савецкага Саюза (20.4.1945). Нарадзіўся 1.1.1920 г. ў сям'і рабочага. Выхаванец Бобрскага дзіцячага дома. Скончыў сярэднюю школу. У Чырвонай Арміі з 1940 г. З чэрвеня 1941 г. на фронце. Радыст узвода сувязі 384-га асобнага батальёна марской пяхоты (Адэская ваенна-марская база). Вызначыўся ў дэсантнай аперацыі ў г. Мікалаеў. Старшы матрос А. С. Люты ў ноч на 26.3.1944 г. ў складзе групы маракоў і салдат (67 чал.) пад камандаваннем старшага лейтэнанта К. Альшанскага быў высаджаны ў тыл праціўніка. Двое сутак да падыходу сваіх войск яны падтрымлівалі бесперабойную сувязь атрада з камандаваннем, адбілі 18 атак праціўніка і знішчылі 700 гітлераўцаў. Загінуў у баі. Пахаваны ў брацкай магіле ў г. Мікалаеў.

ЛЕГЕНДАРНЫ ДЭСАНТ

... Сакавік 1944 г. Баі на подступах да Мікалаева прынялі зацяжны характар. Фашысты перад горадам загадзя пабудавалі некалькі паясоў умацаванняў, дзе мінныя палі чаргаваліся з сістэмай дотаў і дзотаў, павуцінай калючага дроту, сеткай траншэй. Паводле загаду Гітлера ад 8 сакавіка 1944 г. горад патрэбна ўтрымаць, нават у выпадку акружэння.

Наступленне на горад можна было весці толькі па вузкай трохкіламетровай палосцы, якая прастрэльвалася наскрозь. Гэта значыла смерць соцень і тысяч нашых салдат. Камандаванне на гэта ісці не захацела. Вось тады ў штабе і нарадзілася думка аб дэсанце. Для выканання гэтай задачы бралі толькі добраахвотнікаў, якія ўжо мелі вопыт падобных аперацый. З некалькіх соцень жадаючых узялі 67 (55 байцоў з 384-га асобнага батальёна марской пяхоты і 12 сапёраў). Сярод дэсантнікаў быў наш зямляк — старшы чырванафлоцец Аляксандр Люты.

... Парывісты вецер гнаў над Паўднёвым Бугам нізкія свінцовыя хмары. У начной цемры моўчкі рухаліся сем рыбацкіх чаўноў. Кожны метр ракі даваўся з вялікімі цяжкасцямі. Бесперапынна трэба было вычэрпваць ваду, якая павольна сачылася праз дзіравыя днішчы чаўноў. За тры гадзіны дэсантнікі прайшлі ўсяго палавіну шляху.

Нарэшце скрозь шараватую муць пачалі праяўляцца контуры партовых збудаванняў. Праз нейкі час галоўная лодка мякка прычаліла да берага, за ёй другая, трэцяя... Ззаду засталося каля 15 кіламетраў воднага шляху. Дэсантнікі хутка і моўчкі перадавалі з рук у рукі зброю, скрынкі з патронамі і гранатамі.

Асноўная група дэсантнікаў заняла канторы порта. Тут жа размясціўся штаб атрада, сувязь якому забяспечвалі радысты на чале са старшым матросам Аляксандрам Лютым.

Доўга чакаць не давялося. Як толькі пачало світаць, на дарозе паказалася фурманка з двума немцамі. Пад'ехаўшы да канторы, яны пачалі грузіць пустыя скрынкі. Па камандзе Альшанскага раздаліся стрэлы. Адзін фашыст рухнуў на зямлю, другі, кульгаючы, кінуўся за вугал.

— Ну, братва, цяпер чакай «гасцей», — прамовіў Аляксандр Люты.

— Што ж, — усміхнуўся камандзір, — я думаю, сустрэнем іх як след! — і папярэдзіў: — страляць толькі па маёй камандзе.

Не прайшло і паўгадзіны, як каля ўваходу ў порт з'явілася рота фашыстаў. У гэты час у эфір паляцела радыёграма. Аляксандр Люты перадаў: «Прыступаю да выканання задання, Альшанскі».

Фашысты ішлі моўчкі і ва ўвесь рост. Моўчкі чакалі іх і дэсантнікі. Калі паміж імі засталося некалькі дзесяткаў метраў, дэсантнікі адкрылі кулямётна-аўтаматны агонь. За 15—20 мінут уся плошча перад элеватарам была ўсеяна трупамі немцаў. Тыя, хто застаўся жывымі, кінуліся наўцёкі. Праз нейкі час зноў атакавалі праціўніка. Амаль батальён фашыстаў быў выведзены са строю.

Камендант горада генерал Борман асабіста заняўся ліквідацыяй дэсанта. Было загадана снарадаў і мін не шкадаваць. На смельчакоў кінулі яшчэ два батальёны. Цяпер ужо некалькі соцень фашыстаў рынуліся на будынкі, якія абаранялі 67 дэсантнікаў.

... Ішлі другія суткі гераічнай абароны порта. Ужо рухнулі міжпавярховыя перакрыцці, у сценах ззялі прабоіны. Усё менш заставалася дэсантнікаў. Ад снарада, які разарваўся на ніжнім паверсе канторы, загінулі два радысты, атрымаў кантузію « бог эфіра»

Аляксандр Люты. Ён з жалем паглядзеў на разбітую рацыю і адкінуў убок непатрэбны ўжо апарат.

— Ну, што, Аляксандр, — малодшы лейтэнант Чумачэнка паклаў яму руку на плячо, — давай да Скварцова, будзеш у яго другім нумарам...

Кулямётчык Скварцоў заняў пазіцыю ў самым небяспечным месцы. Пасля чарговага абстрэлу гітлераўцы прарваліся да канторы. Неўзабаве каля ног Скварцова разарвалася граната, ён страціў прытомнасць.

— Трымайся, Коля, я зараз, — Аляксандр Люты кінуў у бок фашыстаў адну за другой некалькі гранат, хуценька перавязаў сябра. Трэба было раздабыць для параненага вады. Але дзе? Крыху пачакаўшы, Люты падпоўз да фашыстаў, якія былі мёртвыя. Знайшоўшы флягу з вадой, падбег да Скварцова. Той ляжаў і ціхенька стагнаў. Аляксандр падняў яго галаву, уліў у рот крыху вады. Скварцоў адкрыў вочы і хацеў нешта сказаць. І ў той жа момант цела яго абмякла.

Падняўшы галаву, Люты ўбачыў, як прама на яго ішлі некалькі фашыстаў. Аляксандр націснуў на спускавы кручок, і аўтамат у яго руках зайшоўся доўгай чаргой. На гэты раз апошняй...

Другія суткі вялі дэсантнікі няроўны бой. Гітлераўцы некалькі разоў прапаноўвалі ім здацца...

Героі-дэсантнікі выканалі баявы загад. Раніцай 28 сакавіка, калі нашы войскі ўварваліся ў г. Мікалаеў, у жывых засталося 12 марскіх пехацінцаў.

Адразу пасля вызвалення горада была створана спецыяльная камісія для высвятлення ўсіх абставін бяспрыкладнага подзвігу дэсантнікаў. Члены камісіі склалі падрабязны акт расследавання, які захоўваецца ў Цэнтральным архіве Ваенна-Марскога Флоту СССР. Выяўлена, што супраць 67 дэсантнікаў атрада Альшанскага вораг кінуў тры батальёны — амаль цэлы пяхотны полк. Было знішчана больш за 700 салдат і афіцэраў. Колькасць параненых устанавіць было немагчыма, але па вопыту ваеннай статыстыкі можна было меркаваць, што яна пераўзыходзіць колькасць забітых. Такім чынам, 67 дэсантнікаў знішчылі больш за два батальёны фашыстаў. Гэта адзіны выпадак у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, калі ўсім удзельнікам баявой аперацыі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. *М. М. Навахрост.*

МАЗГАВОЙ Іван Астапавіч. Герой Савецкага Саюза (1945). Нарадзіўся 14.10.1923 г. ў с. Грабаў Рэпкінскага раёна Чарнігаўскай вобласці. Пасля заканчэння сямігодкі вучыўся ў Львоўскім аўтадарожным тэхнікуме, потым у Сталінградскім танкавым вучылішчы. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1943 г., лейтэнант, камандзір танка. У 1944 г. ў час аперацыі «Багратыён» часці 18-й механізаванай брыгады, куды ўваходзіў і ўзвод І. Мазгавога, прарвалі абарону праціўніка і пачалі наступленне на захад. Заняўшы Оршу і Талачын, 44-ы гвардзейскі танкавы полк 26 чэрвеня ўступіў на Крупскую зямлю. 27 чэрвеня ўзвод І. Мазгавога ў складзе 2 танкаў рухаўся па лясной дарозе ў напрамку в. Чырвоная Слабада. Раптам наперадзе танкісты ўбачылі варожую калону. Мясцовасць была зручнай, абапал дарогі — забалочаная нізіна, магчымасці для манеўраў праціўніка амаль не было. Іван Мазгавой вырашыў выкарыстаць фактар нечаканасці і атакаваць калону малымі сіламі. Першымі стрэламі былі падбіты варожы танк і 2 гарматы. На дарозе стварылася пробка. У гэты час 2 чырвоназорныя баявыя машыны, страляючы на хаду, урэзаліся ў калону. Дзясяткі аўтамашын і гітлераўцаў былі знішчаны. Гэты бой не абышоўся бясследна і для танка І. Мазгавога — у выніку няспраўнасці ён вымушаны быў спыніцца за в. Абчуга каля моста цераз р. Бобр. Пакуль танкісты рамантавалі машыну, да пераправы падышла яшчэ адна калона фашыстаў, у складзе якой былі 2 танкі, некалькі самаходак, чатыры гарматы і абоз. Лейтэнант прыняў рашэнне затрымаць калону, пакуль падыдзе падмацаванне. Першымі двума выстраламі 2 варожыя танкі былі падбіты. Каля трох гадзін цягнуўся няроўны бой, пакуль снарад на трапіў у машыннае аддзяленне. Танк загарэўся. Старшы механік-вадзіцель старшына Дзямідчык і

А.С.Люты.

І.А.Мазгавой.

яго памочнік радавы Вараб'ёў былі забіты. Мазгавой разам са стралком-радыстам кінуліся ў бок лесу, але дабегчы змог толькі адзін камандзір...

На месцы бою засталіся 2 падбітыя нямецкія танкі, 3 самаходкі, 2 процітанкавыя гарматы, больш за сотню знішчаных салдат і афіцэраў праціўніка.

За баі каля вёсак Чырвоная Слабада і Абчуга І. А. Мазгавому было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Потым былі баі ў Прыбалтыцы, мірная пасляваенная праца на Чарнігаўшчыне. Але Іван Астапавіч ніколі не забываў пра беларускія вёскі, з якімі яго парадніла кроў таварышаў па зброі, барацьба супраць агульнага ворага. Яго імем названа вуліца ў в. Абчуга. *Дз. М. Хромчанка.*

МАРЦІНКЕВІЧ Уладзімір Мікалаевіч. Герой Савецкага Саюза (6.4.1945), генерал-маёр (1941). Нарадзіўся 22.3.1896 г. ў Крупках у сям'і рабочага. У арміі з 1915 г. З лютага 1918 г. камандзір 1-га Маладзечанскага партызанскага атрада, потым у Чырвонай Арміі. У грамадзянскую вайну камандзір роты, батальёна, палка. У савецка-фінляндскую вайну 1939—40 гг. камандзір стралковай дывізіі. За ўмелае кіраўніцтва баявымі аперацыямі супраць белафінаў на Карэльскім перашыйку быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Вялікую Айчынную вайну У. М. Марцінкевіч сустрэў у Малдавіі. Выконваючы абавязкі камандуючага 24-й і 9-й арміямі, вёў баі на Паўднёвым, Закаўказскім, Волхаўскім, 1-м Беларускім франтах, быў камандзірам стралковай дывізіі. Вызначыўся ўмелым кіраўніцтвам баявымі дзеяннямі дывізіі пры фарсіраванні ў ліпені 1944 г. Заходняга Буга, Віслы, пры захопе і ўтрыманні плацдарма на левым беразе Віслы. Калі прасачыць увесь баявы шлях генерал-маёра Марцінкевіча, можна сказаць, што гэты шлях быў гераічным, хаця і нялёгкім. Былі і горыч адступлення, і цяжкія абарончыя баі, але перамог было больш. Аб гэтым сведчаць і шматлікія дакументы з асабістага архіва Уладзіміра Мікалаевіча, якія захоўваюцца ў яго сям'і. Сярод іх пажоўклая ад часу выразка з газеты, дзе надрукаваны загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, у якім гаварылася пра паспяховыя дзеянні часцей пад камандаваннем У. М. Марцінкевіча пры авалоданні горадам і чыгуначным вузлом Хэлм на Люблінскім напрамку. Камандуючы 134-й стралковай дывізіяй, якая ўваходзіла ў склад 1-га Беларускага фронту, У. М. Марцінкевіч па-майстэрску правёў Турыйскую аперацыю на Валыні, у выніку якой было знішчана каля 1000 фашыстаў.

Ёсць у гэтым архіве і пісьмо на імя жонкі генерал-маёра Соф'і Рыгораўны. Па-вайсковаму лаканічныя, скупыя радкі пісьма расказваюць пра гібель У. М. Марцінкевіча. А здарылася гэта так. У ноч з 28 на 29 ліпеня 1944 г. частка 134-й стралковай Вердэнскай дывізіі фарсіравала р. Вісла, адваявала плацдарм і вяла жорсткія баі. Стаяла задача: пераправіць астатнія часці і замацаваць поспех. Генерал Марцінкевіч асабіста кіраваў пераправай войск. Пад вечар над пераправай з'явілася 30 фашысцкіх бамбардзіроўшчыкаў.

Помнік У.М.Марцінкевічу.

У.М.Марцінкевіч.

Ад выбухаў і мора агню, здавалася, палала рака. Адна з варожых бомб разарвалася непадалёку ад генерала, ён быў цяжка паранены. 30.7.1944 г. па дарозе ў шпіталь памёр. Імем героя названа вуліца ў г. Крупкі. У 1967 г: каля сярэдняй школы № 1, якая носіць імя У. М. Марцінкевіча, устаноўлены яго паплечны бюст. *Дз. М. Хромчанка.*

НАЗАРЭНКА Пётр Данілавіч. Герой Савецкага Саюза (24.12.1943). Нарадзіўся ў 1909 г. ў г. Новачаркаск Растоўскай вобласці ў сям'і рабочага. У 1920-я г. працаваў у Халопенічах сакратаром райкома камсамола. У Чырвонай Арміі з 1929 г., быў карэспандэнтам газеты «Красная звезда». У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на фронце. Камандуючы артылерыяй 161-й стралковай дывізіі (40-я армія, Варонежскі фронт) падпалкоўнік П. Назарэнка пад агнём праціўніка 24.9.1943 г. фарсіраваў Дняпро ў раёне с. Зарубінцы Канеўскага раёна Чаркаскай вобласці. Умела кіраваў дзеяннямі часцей і падраздзяленняў у баях за плацдарм. Загінуў у баі 19.4.1944 г. Пахаваны на плошчы ў с. Чартавец Гарадзенкаўскага раёна Івана-Франкоўскай вобласці. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі. Сяло Чартавец перайменавана ў с. Назарэнкава. Яго імем названы вуліцы ў гарадах Гарадзенка і Тлумач Івана-Франкоўскай вобласці.

ПАРЦЯНКА Андрэй Антонавіч. Герой Савецкага Саюза (19.4.1945). Нарадзіўся 23.2.1906 г. ў в. Дуброўка Крупскага раёна ў сялянскай сям'і. Працаваў у калгасе. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце. У першыя дні вайны пад Смаленскам у час атакі фашысцкая куля ўдарыла ў грудзі радавому Андрэю Парцянку. Калі апрытомнеў і ўбачыў калючы дрот, зразумеў, што апынуўся ў палоне. Вырвацца з-за калючага дроту ўдалося з трэцяй спробы. Праз некалькі тыдняў ён дабраўся да роднай вёскі. Да жніўня 1944 г. быў у партызанах, потым — на 1-м Прыбалтыйскім фронце, у 113-м стралковым палку камандзірам кулямётнага разліку. У жніўні 1944 г. полк вёў цяжкія баі пад Шаўляем. Гітлераўцы пачалі контрнаступленне. Пры падтрымцы танкаў яны лезлі напралом. Калі танкі падышлі і вораг быў ужо на лініі прыцэльнага агню, ударыў кулямёт малодшага сяржанта А. Парцянкі. Каля 40 гітлераўцаў знішчыў яго разлік у гэтым баі. За рашучасць і адвагу А. А. Парцянка ўзнагароджаны медалём «За адвагу». Вызначыўся ў баях ва Усходняй Прусіі. 29.1.1945 г. з групай байцоў

П.Д.Назарэнка (ніжні рад, у цэнтры) з работнікамі Халопеніцкага райкома камсамола. 1929 г.

А.А.Парцянка.

С.А.Свідзерскі.

пераправіўся цераз заліў Курыш Хаф, на касе Курыш Нерунг з яго ўдзелам адбіта 6 контратак. Здарылася так, што падраздзяленне палка трапіла ў акружэнне. У час апошняй контратакі малодшы сяржант Андрэй Парцянка быў паранены. Усе яго баявыя сябры загінулі. Пад покрывам цемры Андрэй зайшоў з флангу і адкрыў па ворагу агонь з кулямёта. Загінуў у гэтым баі. Пасля бою аднапалчане адважнага кулямётчыка налічылі каля сотні фашыстаў, якія знайшлі смерць ад рукі воіна. Пахаваны на хутары Алексін (10 км ад Клайпеды). Яго імем названа Дубровенская школа, дзе ён вучыўся. У Клайпедскім порце 7 вялікіх рыбалоўных траўлераў носяць імёны Герояў Савецкага Саюза 113-га стралковага палка, што стаялі насмерць каля сцен горада ў студзені 1945 г. Сярод іх імя нашага земляка Андрэя Парцянкі.

СВІДЗЕРСКІ Савелій Аляксеевіч. Герой Савецкага Саюза (28.6.1945). Нарадзіўся 24.4.1905 г. ў в. Дзяньгубка Крупскага раёна ў сялянскай сям'і. Працаваў шахцёрам у Чэлябінскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1927 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце. Свой баявы шлях прайшоў ад радавога да камандзіра палка. Ваяваў на Паўночна-Заходнім, Калінінскім, Заходнім, Цэнтральным, Бранскім, 1-м і 2-м Беларускім франтах. Удзельнічаў у вызваленні гарадоў Крычаў, Чавусы, Магілёў і другіх населеных пунктаў Беларусі. Вызначыўся 20.4.1945 г. пры фарсіраванні р. Одэр. Полк пад яго камандаваннем пад варожым агнём пераправіўся цераз раку, на захопленым плацдарме адбіў некалькі контратак. У жорсткіх баях асабістым прыкладам натхняў воінаў на рукапашныя контратакі. Узнагароджаны 4 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Чырвонай Зоркі, Аляксандра Неўскага, Суворава 3-й ступені. З 1953 г. ў адстаўцы. Жыў у г. Краматорск. Памёр 13.5.1977 г. Яго імем названа вуліца ў в. Абчуга.

З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТАДДЗЕЛА 369-й КАРАЧАЕЎСКАЙ СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ ПАЛКОЎНІКА СЕРАБРЫЙСКАГА НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТАДДЗЕЛА 5-й АРМІІ

10 красавіка 1943 г.

Свидерский Савелий Алексеевич прибыл в дивизию в апреле 1942 г., по настоящее время работает на должности командира полка.



Карабель «Андрэй Парцянка».

Полк под его командованием одержал много славных побед над немецкими захватчиками.

Ведя беспрерывные бои по ликвидации ржевского плацдарма в 1942 г., полк первым ворвался на окраины г. Ржевска в августе 1942 г. В марте 1943 г., прорвав укрепленную оборону немцев на р. Волга (под Ржевом), полк, преследуя отступающего противника, вступил на смоленскую землю. Форсировал р. Днепр, Соля, Вязьма, вышел на реку Вол-Вержа, закончил ликвидацию ржевского плацдарма.

Наиболее характерной проведенной операцией под умелым командованием полковника Свидерского является взятие г. Карачев. В момент боев на подступах к г. Карачев в д. Одрино противник предпринял сильные контратаки, в результате которых ему удалось оттеснить наши подразделения на исходное положение. Полковник Свидерский обходным маневром юго-восточнее д. Одрино потеснил противника и не дал ему закрепиться на одной из командных высот. В результате населенный пункт Одрино был занят и наши части ворвались в г. Карачев.

В сентябре 1943 г. часть Свидерского в составе дивизии, прорвав укрепленную оборону противника в районе д. Березовка, продолжала преследовать отступающего противника. Наиболее характерным фактом умелого командира является то, что тов. Свидерский сумел во взаимодействии с соседями создать угрозу окружения населенного пункта Березовка, тем самым обеспечил успешное продвижение наших частей.

Офицерский состав полка, воспитанный его командиром, умело и уверенно ведет подразделения в бой, нанося противнику большие потери. Личный состав части в боях с немецкими захватчиками проявил смелость, храбрость и отвагу.

За образцовое выполнение боевого задания и проявленные при этом мужество и отвагу полковник Свидерский награжден орденом Красного Знамени, Александра Невского и орденом Суворова 3-й степени.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 50, арм. воп. 9783, спр. 138, л. 120—123.

Падрыхтаваў да друку Б. Дз. Даўгатовіч.

СУРЫН Марцін Акімавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 4.5.1908 г. ў в. Руднае Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Працаваў у калгасе. На фронце з ліпеня 1944 г. Вызначыўся ў баях пры вызваленні Літвы ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і пры разгроме войск праціўніка ва Усходняй Прусіі.

М.А.Сурын.

159-я стралковая дывізія вяла цяжкія баі на Нёмане. Полк, дзе служыў Марцін Акімавіч, першым фарсіраваў раку. У архівах часці захаваўся такі запіс: «Радавы М. Сурын першы пераправіўся цераз Нёман, устанавіў кулямёт і забяспечыў пераправу роце».

Потым быў бой каля в. Рудзэ Шакяйскага раёна. Фашысты распачалі контратаку супраць нашых пазіцый. На акоп, дзе знахо-

Помнік на магіле Героя Савецкага Саюза М.А.Сурына ў в. Каўпыніца.

дзіўся М. Сурын, ішоў варожы танк з дэсантам на брані. Трапнай чаргой Сурын знішчыў дэсантнікаў, а праз некалькі хвілін, калі танк аказаўся зусім блізка, кінуў пад гусеніцы супрацьтанкавую гранату. Другі танк М. Сурын чакаў больш спакойна. І яго напаткаў такі лёс, як і першы...

Назаўтра, 17.8.1944 г., узводу, дзе служыў Марцін Акімавіч, было загадана ноччу фарсіраваць р. Шашупе, захапіць там плацдарм і замацавацца на ім. Спачатку трэба было знайсці брод, па якім падраздзяленне пяхоты было перабрацца на другі бок ракі.

— Дазвольце мне, — падышоў да камандзіра Сурын.

— Ну што ж, дзейнічай...

... З супрацьлеглага берага ракі раз-пораз раздаваліся глухія кулямётныя чэргі. Хутчэй за усё, гэта білі з дзота. Асцярожна прабіраючыся, Марцін Акімавіч заўважыў на сярэдзіне ракі лодку. Павольна пагойдваючыся, яна стаяла на месцы. Сурын асцярожна ступіў у ваду. Штурхаючы перад сабой лодку, перабраўся на другі бераг ракі. Цяпер — да дзота. Ворагі былі ашаломлены, калі пачулі ўзрывы гранат, але было позна.

Калі байцы ўзвода пераправіліся цераз раку, было яшчэ цёмна. Два дні яны ўтрымлівалі плацдарм, пакуль сапёры не навялі пераправу для танкаў. У гэтым баі Марцін Акімавіч знішчыў яшчэ адзін танк і каля 20 фашыстаў. Пасля вайны працаваў у калгасе «Камунар» Крупскага раёна. Памёр 24.4.1963 г. Яго імем названа сярэдняя школа ў в. Латыголічы Чашніцкага раёна, вуліца ў в. Нача. *Дз. М. Хромчанка.*

ЧАБАТАРОЎ Васіль Міхайлавіч. Герой Савецкага Саюза (29.6.1945). Нарадзіўся 25.6.1918 г. ў в. Гаўрылаўка Рузаеўскага раёна Какчэтаўскай вобл. З сялян. Рускі. У Чырвонай Арміі з 1941 г. На фронце з 1942 г., снайпер, намеснік палітрука роты, сакратар бюро ВЛКСМ стралковага палка, з ліпеня 1943 г. — оперупаўнаважаны аддзела контрразведкі «Смерш» танкавай брыгады. 27.6.1944 г. з мэтай захопу пераправы цераз р. Бобр з батальёнам прарваўся ў тыл праціўніка, знішчыў 10 гітлераўцаў і ўзяў у палон фашысцкага афіцэра. Пры дастаўцы пленнага ў часць Чабатароў натрапіў на фашыстаў, якія яго цяжка паранілі і закатавалі. За подзвіг, здзейснены ў баях за вызваленне г.п. Бобр, В. М. Чабатарову прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імем названы вуліцы ў Мінску і г.п. Бобр. У в. Гаўрылаўка і г.п. Бобр установлены помнікі. *Б. Дз. Даўгатовіч.*

В.М.Чабатароў.

М.Дз.Шастакоў.

ШАСТАКОЎ Міхаіл Дзянісавіч. Герой Савецкага Саюза (15.11.1942). Нарадзіўся 3.11.1907 г. ў в. Нача Крупскага раёна ў сям'і селяніна. Скончыў сельскагаспадарчы тэхнікум, працаваў аграномам. У Чырвонай Арміі з 1928 г. Скончыў Аб'яднаную беларускую ваенную школу імя ЦВК БССР і камандныя курсы пры Ваеннай акадэміі механізацыі і матарызацыі РСЧА. З 1941 г. на Паўднёва-Заходнім фронце. Камандзір танкавага батальёна 36-й танкавай брыгады капітан М. Дз. Шастакоў вызначыўся ў баях 12.5.1942 г. пад Харкавам.

Напярэдадні камбрыг палкоўнік Таласчышын загадаў батальёну капітана М. Шастакова прарваць абарону праціўніка, забяспечыць выхад стралковых падраздзяленняў на рубеж с. Непакрытае і далей рухацца на Харкаў. Міхаіл Дзянісавіч данёс гэты загад да камандзіраў рот:

— Паводле даных разведкі на ўчастку, дзе мы забяспечваем прарыў, праціўнік сканцэнтраваў моцныя агнявыя пазіцыі. Да таго ж на нашым шляху р. Бабка. Ёсць меркаванні, што падходы да вышыні 199,0 замініраваны. Такім чынам, шлях да с. Непакрытае ляжыць праз гэтыя перашкоды. Памятайце, за намі ідзе пяхота. Я спадзяюся на вас, таварышы...

Камбат яшчэ раз акінуў позіркам воінаў. Ён верыў у сваіх танкістаў. Ужо амаль год ішлі яны плячо ў плячо дарогамі вайны. Танкісты Шастакова сталі ўдарнай сілай брыгады. Вось і сёння перад імі пастаўлена задача, ад выканання якой будзе залежыць поспех усёй аперацыі. Вечарэла... У трывожным чаканні застылі на ўзлеску стальныя волаты — «трыццацьчацвёркі». Каля іх моўчкі завіхаліся танкісты. Няспешна рыхтаваліся яны да заўтрашняга бою. Для многіх гэты вечар быў

апошнім у іх жыцці. Але для каго? Кожны спадзяваўся выйсці жывым з гэтага пекла, але ж вайна ёсць вайна, з яе адвечнымі законамі зла. І як бы не агрубела сэрца на вайне, усё ж капітан М. Шастакоў з болем пераносіў кожную страту батальёна. Вось чаму цяпер перад боем, абыходзячы пазіцыі батальёна, ён знаходзіў цёплае слова для кожнага байца. Вось старшы сяржант Перапяліца, механік-вадзіцель камандзірскага танка. У якіх толькі абставінах не даводзілася ім бываць! Іншы раз здавалася — усё, канец, а ён, старшы сяржант Перапяліца, тварыў цуды, паслухмяны яго рукам шматтонны танк прарываўся праз усе перашкоды.

Кароткая майская ноч. Здаецца, толькі-толькі зямлю ахутала начная цемень, а ўжо на ўсходзе першыя кволыя промні сонца абвяшчаюць нараджэнне новага дня. І раптам перадранішнюю цішыню разарвалі грамавыя раскаты. Гэта пачалася артпадрыхтоўка. Праз паўгадзіны, калі закончылі сваю работу артылерысты, раздалася каманда: «Наперад!» Батальён Шастакова рваўся да ракі. Прайшло нямнога часу, і «трыццацьчацвёркі», фарсіраваўшы раку, апынуліся на другім беразе перад вышынёй 199,0.

На нейкі момант танкі спыніліся, потым раздалася каманда:

— Рабі, як я...

Першым па мінным полі пайшоў танк камандзіра батальёна. Старшы сяржант Перапяліца асцярожна вёў баявую машыну толькі аднаму яму вядомым шляхам. Нарэшце ўсе з палёгкай уздыхнулі, за танкам Шастакова след услед рушыў батальён.

Прарыў савецкіх танкаў праз міннае поле быў поўнай нечаканасцю для фашыстаў. Атакай з ходу танкі ўварваліся на вышыню і разгромілі гітлераўскія падраздзяленні. Больш за 300 фашыстаў са стралковай зброяй і артылерыяй здаліся ў палон.

Бой разгараўся з новай сілай. Наперадзе было с. Непакрытае — галоўная мэта батальёна Шастакова. Не збаўляючы скорасці, танкі імчаліся наперад. Падпусціўшы бліжэй, па іх прамой наводкай ударыла цяжкая артылерыя фашыстаў. Больш за 30 гармат сталі на шляху батальёна. Загарэлася адна машына, потым другая, трэцяя... Але гэта не магло ўжо спыніць стальную армаду. Танк М. Шастакова першым уварваўся ў с. Непакрытае. Ён з ходу пратараніў варожую гармату, поўнасцю знішчыў яе разлік. Яшчэ тры гарматы з разлікамі ўтапталі ў зямлю экіпажы іншых «трыццацьчацвёрак».

Танкісты ўжо вялі бой на вуліцах сяла, калі раптам баявую машыну камбата страсянуў страшэнны ўдар. Фашысты стралялі амаль ва ўпор. Ахоплены полымем, танк застыў на месцы. Некалькі машын спыніліся каля камандзірскага танка. У гэты час адкрыўся верхні люк і з палаючай машыны вываліўся капітан М. Шастакоў. Камбінезон на ім гарэў. Не зважаючы на гэта, ён з пісталетам у руцэ кінуўся наперад:

— За мной, няма літасці ворагу...

Гэта былі апошнія словы адважнага камбата. Ахоплены полымем, з высока ўзнятай рукой, якая сціскала пісталет, — такім запомнілі танкісты свайго камандзіра ў тыя апошнія хвіліны яго гераічнага жыцця. Танкісты давялі бой да пераможнага канца ўжо без свайго камбата. Яны выбілі фашыстаў з с. Непакрытае, узяўшы ў палон батальён варожай пяхоты.

12 мая 1942 г. танкісты пахавалі капітана М. Дз. Шастакова і яго баявых таварышаў у с. Шастакова Валчанскага раёна Харкаўскай вобласці (былое с. Непакрытае). Над брацкай магілай прагучалі залпы развітальнага салюта, стройнымі шарэнгамі прайшлі воіны першага батальёна 36-й танкавай брыгады, аддаючы апошнія ўшанаванні загінуўшым аднапалчанам. На радзіме яго імя прысвоена сярэдняй школе, дзе ён вучыўся, у 1967 г. ў вёсцы ўстаноўлены бюст героя. Франтавыя паэты З. Кац і М. Талалаеўскі прысвяцілі яму верш «Баллада о комбате», які быў надрукаваны ў франтавой газеце.

БАЛЛАДА О КОМБАТЕ

Броней громыхая, в дыму и в пыли
Советские танки в атаку пошли.
По рвам и по травам весенних лугов
Ведет их бесстрашно комбат Шестаков.
Река. Переправа под вражьим огнем,
Но танки несутся вперед, напролом!
Хитро заминирован длинный бугор,
Но мины не сдержат танкистский напор!
На приступ одетых в броню смельчаков
Ведет непреклонно комбат Шестаков!
Глазам его зорким открылось с бугра
Большое селенье в сияньи утра.
Свирепым врагом второпях зажжено,
Огромной руиной дымится оно.
И мстительным гневом на бой вдохновлен,
Несется вперед броневой батальон.
Огнем орудийным бугор опален,
Но танки пройдут и сквозь этот заслон!
Как требует честь и как сердце велит, —
Комбат через пламя в атаку летит.

Средь свежего пепла, окутаны в дым,
Четыре орудия стоят перед ним.
Свернуть? Отступить? Капитан не таков!
«Огонь по фашистам!» — кричит Шестаков.
Огонь на огонь и металл на металл,
Но танк Шестакова рванулся и стал.
Ударил снаряд по тяжелой броне —
Машина комбата в дыму и огне.
Но храброе сердце не может сгореть!
Не может отвага в бою умереть!
Как требует честь и как сердце велит, —
Другая машина на пушки летит!
— За смерть командира — вражинам смерть!
Крошится литого орудия твердь.
Скрозь грохот орудий, сожженным селом
Идет броневой батальон напролом.
И крепнет победный танкистский удар,
Пусть нет командира, но есть комиссар!
Пусть нет Шестакова, но Юмин живет!
— Вперед, шестаковцы! — кричит он. — Вперед!
И имя комбата в сердцах пронеслось,
И кровью на знамени нашем зажглось.
И снова ударил металл о металл,
И ринулись танки — и враг отступал.
Как танки прорвались сквозь пламя в село,
Так имя комбата в бессмертье вошло.

М. М. Навахрост.

Цяжкія дарогі вайны

Вайна — найвялікшае выпрабаванне для ўсіх савецкіх людзей. Можна без перабольшання сказаць, што ў той час кожны дарослы, ды і не толькі дарослы грамадзянін Савецкага Саюза ўнёс свой пасільны ўклад у агульную справу перамогі. Значны яе цяжар лёг на салдат, якія са зброяй у руках ваявалі на пярэднім краі фронту і ў тыле ворага. Сярод іх былі і тысячы крупчан. Кожны трэці з жыхароў раёна загінуў, згубіўся ў вогненнай віхуры вайны. На іх месца станавіліся іншыя, якія выстаялі, дайшлі да Берліна і пераможцамі вярнуліся дадому.

Кожны з удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, безумоўна, варты пашаны і народнай памяці. Некаторыя з іх, перш за ўсё тыя, хто быў узнагароджаны ордэнамі, унесены ў кнігу «Памяць».

ПОЎНЫ КАВАЛЕР ОРДЭНА СЛАВЫ

АКАЛОВІЧ Іван Ільіч. Нарадзіўся 15.6.1922 г. ў в. Малыя Жаберычы Крупскага раёна ў сям'і Ільі Васілевіча Акаловіча. У 1929 г. бацькі перасяліліся ў Якуцію, у 1933 г. — у г. Турун, тут скончыў чатыры класы пачатковай школы, у 1938 г. вучыўся ў школе ФЗН у г. Ніжнеудзінск. Працоўны шлях пачаў у буравой разведцы. 23 сакавіка 1943 г. атрымаў павестку ў армію. 4 мая прыбыў у Падмаскоўе ў полк бранятанкавых войск. У складзе 36-га асобага танкавага палка трапіў на Курскую дугу. Першае баявое хрышчэнне атрымаў пад Болхавам, пасля яго ўзяцця полк прымаў удзел у штурме г. Рагачоў. За вызваленне г. Рагачова палку было прысвоена званне «Рагачоўскі». За ўмелыя дзеянні ў баі І. І. Акаловіч узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені. Так атрымалася, што гэтым ордэнам яго ўзнагародзілі двойчы.

Ва Усходняй Прусіі, дзе была сядзіба Герынга, камандзір уручыў І. Акаловічу ордэн Славы 2-й ступені. У баях за вызваленне г. Чарняхоўка І. Акаловіч быў паранены. Дзень Перамогі сустрэў у шпіталі г. Дзвінск. Да снежня 1946 г. служыў у арміі. Пасля вайны жыў у г. Тулун Іркуцкай вобл.

6.11.1949 г. ўзнагароджаны ордэнам Славы 1-й ступені.

З прадстаўлення на ўзнагароджанне ордэнам Славы 1-й ступені: «У баях па знішчэнні ўсходне-прускай групоўкі праціўніка ў перыяд з 13 па 18 сакавіка 1945 г. праявіў мужнасць і адвагу... Першым уварваўся ў пярэднія акопы ворага, агнём з аўтамата і гранатамі знішчыў некалькі чалавек. Суправаджаючы танкі, першы са сваім аддзяленнем уварваўся ў апорны пункт праціўніка Баўмгартэн і асабіста знішчыў 5 гітлераўцаў. У час бою 13 сакавіка даставіў на пункт медыцынскай дапамогі параненага афіцэра-танкіста.

У баі за апорны пункт праціўніка Бладаў ноччу выйшаў на разведку мясцовасці і, выявіўшы самаходныя гарматы гітлераўцаў, хутка паведаміў пра гэта камандаванню. Агнём падышоўшых танкаў былі знішчаны 3 самаходкі ворага. Пры сустрэчы з гітлераўскай пяхотай уступіў у няроўны бой, быў паране-

ны, усю ноч адбіваўся ад насядаўшых фашыстаў. Поле бою І. Акаловіч пакінуў толькі пасля таго, як падышлі нашы танкі».

Дз. М. Хромчанка.

СПІС ВОІНАЎ-АРДЭНАНОСЦАЎ

АНДРЭЙЧЫК Аляксей Дзянісавіч. Нарадзіўся ў 1916 г. ў в. Баркі Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце, радавы 472-га гаўбічнага артпалка. Ваяваў на 1-м і 2-м Беларускім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1998 г.

АТАМАНАЎ Васіль Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Восава Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, радавы 988-га асобнага батальёна сувязі. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі» і інш. Жыве ў г. Крупкі.

АЎЧЫННІКАЎ Аляксандр Пятровіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў в. Іванкаўшчына Барысаўскага раёна. Да вайны працаваў настаўнікам пачатковай школы. З мая 1941 г. курсант 2-га Ульянаўскага танкавага вучылішча, са студзеня 1942 г. камандзір танка 100-й танкавай брыгады, аддзялення разведвальнага дывізіёна 7-й гвардзейскай дывізіі. З мая 1944 г. камандзір танкавага ўзвода 175-й танкавай брыгады. Ваяваў на Заходнім, Украінскім франтах, капітан. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Прагі» і інш. Жыве ў г. п. Бобр.

БАГДАНАЎ Мікалай Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў Крупках. Працаваў на ваенным заводзе ў г. Залатавуст. У Чырвонай Арміі з 1942 г. Са жніўня 1942 г. курсант 1-га Цюменскага пяхотнага вучылішча, са студзеня 1943 г. камандзір аддзялення 66-й гвардзейскай стралковай дывізіі, потым 47-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Быў некалькі разоў паранены. Вызначыўся ў баях за вызваленне Харкава. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу». Жыве ў г. Крупкі.

БАРАВУЛЯ Рыгор Пракопавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Гумны Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на фронце, танкіст. Ваяваў пад Ленінградам, прымаў удзел у штурме Кёнігсберга, крэпасці Пілаў...

А. Дз. Андрэйчык.

М. М. Багданаў.

Р. П. Баравуля.

П. В. Барадач.

Франтавая газета Волхаўскага фронту ў ліпені 1942 г. пісала: «У жорсткіх баях танк, дзе знаходзіўся кулямётчык Р. Баравуля, быў падбіты. Але савецкія воіны працягвалі знішчаць фашысцкіх бандытаў. У першы дзень яны адбілі 5 машын праціўніка. Савецкі танк стаў крэпасцю на шляху захопнікаў. 22 дні ён не прапускаў фашыстаў, знішчаў іх сотнямі». За праяўлены гераізм экіпаж танка, у тым ліку і Р. Баравуля, быў прадстаўлены да вышэйшых урадавых узнагарод — звання Герояў Савецкага Саюза.

БАРАДАЧ Павел Васілевіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Бярозаўка Крупскага раёна. Да вайны працаваў слесарам у дэпо ў г. Жмерынка Вінніцкай вобласці. З кастрычніка 1940 г. ў Чырвонай Арміі. Служыў у г. Севастопаль. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, малодшы камандзір. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1998 г.

З успамінаў П. Б. Барысава пра Парад Перамогі ў Маскве

БАРЫСАЎ Панцялей Барысавіч. Нарадзіўся 8.8.1921 г. ў в. Убеева Краснаармейскага раёна Чаваш Рэспублікі ў сялянскай сям'і. У 1939 г. паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Казанскага універсітэта. З красавіка 1942 г. ў Чырвонай Арміі. Пасля скончэння Казанскага танкавага вучылішча камандзір танкавага ўзвода на 2-м Беларускім фронце. Удзельнік Парада Перамогі на Краснай плошчы ў Маскве. У 1959—81 гг. дырэктар Крупскай сярэдняй школы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Памёр 12.11.1991 г.

Чатыры суровыя і цяжкія гады працягвалася Вялікая Айчынная вайна. Сотні агнявых кіламетраў крочылі з баямі савецкія воіны, вызвалялі савецкую зямлю і краіны Заходняй Еўропы ад фашысцкіх захопнікаў. Нямала нягод і цяжкасцей давялося пераадолець ім на гэтым доўгім шляху.

Але вось прыйшоў Дзень Перамогі. Радзіма вырашыла ўрачыста адзначыць подзвіг сваіх сыноў і дачок у Вялікай Айчыннай вайне. 22 чэрвеня, у той самы дзень, калі гітлераўцы вераломна ўварваліся ў межы нашай краіны, быў аб'яўлены загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага: «У азнаменаванне перамогі над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне прызначаю 24 чэрвеня 1945 г. ў Маскве на Краснай плошчы парад войск дзеючай арміі, Ваенна-Марскога Флоту і Маскоўскага гарнізона — Парад Перамогі...»

Пра тое, што ў Маскве адбудзецца Парад Перамогі, у войсках стала вядома ў канцы мая.

Усіх, хто ўдастоіўся гонару ўдзельнічаць у ім, сабралі, і мы ў пачатку чэрвеня прыбылі ў Маскву. Пачалася падрыхтоўка да парада. Гэта была справа вельмі нялёгкая, займаліся па 8—9 гадзін у дзень.

Святочны разлік складаўся са зводных палкоў фронту. У страі кожнага з іх налічвалася 1000 чалавек. У зводны полк уваходзілі шэсць паходных рот па 100 чалавек, па адной роце артылерыстаў, танкістаў, лётчыкаў і зводная рота сапёраў, сувязістаў, кавалерыстаў. Наперадзе палка 30 або 36 (дакладна не памятаю) сцяганосцаў неслі баявыя сцягі тых часцей, злучэнняў фронту, якія найбольш вызначыліся. На кожным сцягу былі ордэны, якімі ўзнагароджваліся часці і злучэнні. На чале кожнай параднай калоны ішлі камандуючы фронтам і яго намеснікі.

Сярод удзельнікаў Парада Перамогі былі генералы, афіцэры, сяржанты і салдаты, якія былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Франтавыя калоны праходзілі ў наступным парадку: спачатку Карэльскі, потым Ленінградскі, 1-ы Прыбалтыйскі і г. д. Замыкаў шэсце зводны полк Ваенна-Марскога Флоту.

Праз некаторы час у ротах танкістаў адабралі 50 афіцэраў, у тым ліку і мяне, і сказалі, што нам належыць удзельнічаць у парадзе на танках, і павезлі на танкавы палігон пад Масквой. Там мы прынялі танкі з экіпажамі. Механікам-вадзіцелем нашага экіпажа быў старшы сяржант Мікалай Чарапкоў з Урала, камандзірам гарматы — старшы сяржант Люты з Украіны, зараджальшчыкам — сяржант Рыўгат Тухватулін з Татарыі, адным словам — інтэрнацыянальны экіпаж.

Трэніроўкі на танках былі больш цяжкімі і складанымі, чым у пешым страі. Пасля кожнай трэніроўкі ў канцы дня праводзілі тэхагляд, дазапраўлялі, чысцілі. Практычна ні адпачынку, ні выхадных дзён не было. Кожны член экіпажа адчуваў вялікую адказнасць за праходжанне свайго танка на Краснай плошчы ў час парада, асабліва механік-вадзіцель, ад якога залежала вельмі многае (раўненне ў страі, плаўны ход і рух, уменне весці танк у пэўным напрамку).

Напярэдадні парада мы вельмі старанна правяралі матэрыяльную частку (усе рэгуліроўкі механізмаў, тармазоў, сістэм сілкавання, запальвання, хадавую частку і г. д.), паліва прапускалі праз некалькі фільтраў, каб не трапіла нічога з прымесі.

20 чэрвеня ў Маскву даставілі Сцяг Перамогі. Гэта быў урачысты момант. Усе ўдзельнікі парада стаялі ў страі на аэрадроме, куды неўзабаве прызямліўся самалёт. Пад гукі аркестра сяржанты Ягораў і Кантарыя, якія ўзнялі сцяг над рэйхстагам, перадалі Сцяг Перамогі сцяганосцу, Герою Савецкага Саюза старшаму сяржанту (прозвішча не памятаю), і яго асістэнтам — Героям Савецкага Саюза (таксама сяржантам, прозвішчы не памятаю). Цяжка было стрымаць хваляванне, калі Сцяг Перамогі паплыў перад строем. І вось надышоў доўгачаканы дзень парада. Мы падняліся рана, у чатыры гадзіны раніцы. Да 8 гадзін танкі занялі зыходную пазіцыю для парада. Людзі запоўнілі ўсе вуліцы. Вакол усмешкі, шчаслівыя твары. Нас віталі кветкамі, махалі рукамі. Дзень быў пахмурны, імжыў дождж, але ніхто гэтага не заўважаў.

П. Б. Барысаў.

С. І. Барысаў.

Роўна ў 10 гадзін камандуючы парадам Маршал Савецкага Саюза К. І. Ракасоўскі аддаў рапарт намесніку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршалу Савецкага Саюза Г. К. Жукаву, які прымаў парад. Пасля каманды «Парад, смірна!» зводны аркестр з 1400 музыкантаў выканаў «Слаўся, рускі народ!».

Потым маршалы Жукаў і Ракасоўскі пачалі аб'езд войск. Пад'ехалі яны і да танкавай калоны. Абодва былі на конях: Ракасоўскі — на вараным, Жукаў — на светла-шэрым. Маршал Жукаў павіншаваў з вялікай перамогай і Парадам Перамогі. Адказам было магутнае «Ура!».

Пачалося праходжанне войскаў каля Маўзалея Леніна і трыбун. Ішлі зводныя палкі франтоў, за імі — зводны полк Ваенна-Марскога Флоту.

Неўзабаве настала цішыня. Воіны асобнага батальёна параўняліся з Маўзалеем Леніна, спыніліся, павярнуліся направа, зрабілі некалькі крокаў і пад дробат барабанаў пачалі кідаць на драўляны памост трафейныя сцягі гітлераўскай арміі. Усяго было 200 сцягоў. Не ўсе яны, вядома, былі захоплены ў баях. Я не магу дакладна сказаць, чаму ўзялі менавіта 200 сцягоў. Відаць, справа не ў колькасці, а важна было сімвалічна прадэманстраваць, што чакае на нашай зямлі любога захопніка. У гэты час па плошчы, як цяпер памятаю, з рэпрадуктараў разносіўся голас дыктара, які казаў, што гэта і ёсць палітычная смяротная кара фашызму. Сапраўды, уся цырымонія нагадвала смяротную кару: суха білі барабаны...

Пасля гэтага на Красную плошчу ўступілі войскі Маскоўскага гарнізона, ішлі слухачы ваенных акадэмій, курсанты ваенных вучылішчаў. Была таксама прадэманстравана зброя: на Красную плошчу выехалі славутыя «кацюшы», танкі, самаходныя гарматы. Гэта было лагічным завяршэннем парада.

Пачуццё хвалявання ахапіла і нас, калі мы ўступілі на Красную плошчу. Мой танк быў правафланговым, у першым радзе ад Маўзалея Леніна. Ад нашага танка залежала захаванне вызначанай дыстанцыі і раўненне ў шарэнзе. Люкі вежаў былі адчынены. Афіцэры стаялі на вежы з паваротам галавы ў бок Маўзалея і аддавалі чэсць. Я блізка бачыў Сталіна, астатніх членаў Палітбюро ЦК ВКП(б), а таксама маршалаў Савецкага Саюза, якія стаялі на Маўзалеі. На спецыяльнай пляцоўцы перад Маўзалеем Леніна занялі месцы праслаўленыя палкаводцы і генералы, а на драўляным памосце каля яго падножжа ляжалі трафейныя сцягі.

Калі я знаходзіўся ў парадным страі, мяне ахапіла пачуццё гонару за нашу вялікую Радзіму, за магутны савецкі народ і яго ўзброеныя сілы, пачуццё радасці, што мы перамаглі.

Увесь рытуал парада — гэта незвычайнае, вельмі прыгожае, запамінальнае відовішча.

Падрыхтаваў да друку Дз. М. Хромчанка.

БАРЫСАЎ Сцяпан Іванавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Восава Крупскага раёна. З першых дзён вайны на фронце. Прайшоў складаны шлях ад радавога да падпалкоўніка. Ваяваў ва Усходняй Прусіі, удзельнічаў у вызваленні Беларусі. Вайну скончыў камандзірам батарэі 2-га гвардзейскага знішчальна-супрацьтанкавага палка 16-й гвардзейскай знішчальна-супрацьтанкавай брыгады 5-й арміі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Вось некаторыя вытрымкі з яго ўзнагародных лістоў: «У баях за авалоданне шашы Віцебск—Орша ў раёне в. Мяхлава Віцебскага раёна 9 студзеня 1944 г. агнём сваіх гармат адбіў 2 контратакі праціўніка, пры гэтым знішчыў каля 70 салдат і афіцэраў, 3 кулямётныя кропкі праціўніка. 10 студзеня падавіў агонь мінамётнага ўзвода, знішчыў 3 кулямётныя кропкі і каля 50 салдат і афіцэраў праціўніка. 11.1.1944 г. адбіў 2 контратакі праціўніка, прычым падбіта 1 самаходка «фердынанд» і знішчана каля 40 салдат і афіцэраў праціўніка. З адной гарматай працягваў адбіваць контратакі, кіруючыся аўтаматным і кулямётным агнём з траншэй».

«Камандзір батарэі старшы лейтэнант С. І. Барысаў, кіруючы агнём батарэі пры

Ф.Ф.Борбат.

Дз.А.Бубеннікаў.

І.А.Букаткін.

Я.І.Букаткін.

прарыве абароны праціўніка ў раёне вёсак Буракі, Высачаны Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці, агнём гармат сваёй батарэі знішчыў восем кулямётных кропак, дзве артылерыйскія батарэі...»

БЕЛЯКОЎ Іван Яўгенавіч. Нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Камароўка Новаспаскага раёна Ульянаўскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1939 г., праходзіў службу камандзірам узвода сувязі, начальнікам сувязі батальёна. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Ваяваў на Заходнім, 1-м і 2-м Беларускіх франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Жыве ў г. Крупкі.

БОГДАН Іван Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Верацэя Крупскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1940 г., праходзіў службу камандзірам узвода, памочнікам начальніка аддзела. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Ваяваў на Ленінградскім, Сцяпным, 2-м Украінскім франтах, удзельнічаў у вайне з Японіяй. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі. Жыве ў в. Шыялоўка.

БОРБАТ Фёдар Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1926 г. ў в. Куты Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з 1944 г. на фронце, малодшы сяржант. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Вызначыўся пры фарсіраванні р. Нёман, быў цяжка паранены. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі. Жыве ў в. Куты.

БУБЕННІКАЎ Дзмітрый Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Дакучыно Крупскага раёна. Да вайны працаваў трактарыстам у Янаўшчынскай МТС. У Чырвонай Арміі з кастрычніка 1940 г. Ваяваў на Паўднёва-Заходнім, Ленінградскім, 3-м Беларускім франтах, на Далёкім Усходзе, абараняў Сталінград. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в Дакучыно.

БУКАТКІН Іван Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Лісічына Крупскага раёна. Да вайны працаваў рабочым. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1944 г. на фронце, камандзір кулямётнага разліку, сяржант. За подзвігі, здзейсненыя пры ўзяцці Кёнігсберга, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, за ўзяцце г. Пілаў — медалём «За адвагу» і інш. Жыве ў в. Лісічына.

БУКАТКІН Якаў Іванавіч. Нарадзіўся ў 1912 г. ў в. Лісічына Крупскага раёна. Да вайны працаваў бухгалтарам у Халопеніцкім раённым банку. У Чырвонай Арміі з 1939 г. З 1941 г. на фронце, артылерыст 7-га асобнага артдывізіёна. Вызначыўся ў баях пад г. Растоў-на-Доне, быў паранены. Пасля шпіталю зноў на фронце, ваяваў у складзе 1-га Украінскага фронту. У красавіку 1943 г. дывізіён быў перакінуты на «Малую зямлю» пад Новарасійскам. У верасні 1943 г. гармата сяржанта Я. Букаткіна сваім агнём дапамагала ўтрымліваць невялікі плацдарм. У 1944 г. зноў паранены, пасля выздараўлення дэмабілізаваны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені, медалём «За адвагу». Жыве ў г. п. Халопенічы.

БУЛЫГА Васіль Захаравіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Пышачы. На фронце з чэрвеня 1941 г., радавы 104-й гаўбічнай артылерыйскай брыгады. Вызначыўся ў баях пад Масквой. Ваяваў на Заходнім і 1-м Беларускім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Пышачы.

БУРАКОЎ Іван Алімшіевіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Буда Крупскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, камандзір танкавага ўзвода. Ваяваў на Цэнтральным, 1-м Беларускім і 2-м Прыбалтыйскім франтах. Узнагароджа-

В.З.Булыга.

І.М.Веялка.

А.М.Галак.

В.С.Гамульскі.

ны ордэнам Чырвонай Зоркі, 2 медалямі «За баявыя заслугі». Жыве ў г. Крупкі.

ВЕЯЛКА Іван Мікітавіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў пас. Язбы Крупскага раёна. Да вайны працаваў у калгасе. З 1944 г. на фронце, мінамётчык 69-га стралковага палка 97-й стралковай дывізіі, разведчык. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце, Далёкім Усходзе. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі. Жыве ў г. п. Халопенічы.

ВЕЯЛКА Пётр Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Высокае Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце. Ваяваў у складзе 63-й гвардзейскай стралковай брыгады. Вызначыўся пры абароне Ленінграда. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі. Жыве ў Мінску.

ВЫГЛАЗАЎ Уладзімір Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў г. Белгарад. На фронце з ліпеня 1944 да лістапада 1944 г. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Камандзір аддзялення. Быў паранены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў пас. Крупскі.

ВЯРШКОЎ Сцяпан Паўлавіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Новы Карачан Грыбанаўскага раёна Варонежскай вобласці. Да вайны працаваў загадчыкам млына, потым склада. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, памочнік камандзіра ўзвода, старшына роты, памочнік аператыўнага ўпаўнаважанага. Ваяваў на Паўночна-Усходнім і Бранскім франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Жыве ў г. Крупкі.

ГАЙДУК Іван Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1925 г. ў в. Вялікія Хальнявічы Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з 1944 г. на фронце. Вызначыўся пры вызваленні Польшчы, фарсіраванні р. Одэр, удзельнічаў у штурме Берліна. Узнагароджаны 4 медалямі. Жыве ў в. Янаўшчына.

ГАЛАК Аляксандр Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Максімаўка Гадзяцкага раёна Палтаўскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце, камандзір стралковага ўзвода, мінамётнай батарэі. Ваяваў на Паўднёвым, Сталінградскім, Арлоўскім франтах. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені. Жыве ў г. п. Халопенічы.

ГАМЕЗА Васіль Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Язоўка Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1939 г. На фронце з 1941 г., камандзір аддзялення сувязістаў 429-га гаўбічнага артылерыйскага палка рэзерву галоўнага камандавання, потым камандзір узвода 78-й гвардзейскай зенітнай дывізіі ў складзе 1-га Беларускага фронту. Удзельнічаў у абароне Ленінграда, вызваленні Украіны, баях за Варшаву, фарсіраванні рэк Одэр, Шпрэе. У час фарсіравання р. Шпрэе быў цяжка паранены. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга, медалямі. Жыве ў г. Крупкі.

ГАМУЛЬСКІ Віктар Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Лебедзева Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з 1944 г. на фронце, кулямётчык 21-га гвардзейскага стралковага палка 5-й стралковай дывізіі. Быў двойчы паранены. Вызначыўся ў баях пры вызваленні Беларусі, пры фарсіраванні р. Нёман, пры штурме гарадоў Пілаў, Кёнігсберг. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, 2 медалямі «За адвагу». Жыве ў г. Крупкі.

ГАНЧАРОЎ Васіль Ерамеевіч. Нарадзіўся ў 1914 г. ў в. Узнацк Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1942 г.

Р.Дз.Гула.

В.М.Даніловіч.

І.А.Драздоў.

С.І.Дудко.

на фронце, камандзір аддзялення 420-га асобнага дывізіёна 207-й стралковай дывізіі. Удзельнічаў у абароне Сталінграда, быў паранены. Вызваляў Украіну, камандзір аддзялення 122-га асобнага армейскага загараджальнага атрада. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Узнацк.

ГАРЛЕНКА Аляксандр Нічыпаравіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў г. Добруш Гомельскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, памочнік начальніка штаба палка, камандзір роты, камандзір стралковага батальёна. Ваяваў на Паўночна-Заходнім фронце. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені. Пасля вайны працаваў дырэктарам Ухвальскай СШ Крупскага раёна. Жыве ў в. Ухвала.

ГУЛА Рыгор Дзмітрыевіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Ігрушка Крупскага раёна. Да вайны працаваў у калгасе. На фронце з 1941 г., артылерыст 146-га асобнага зенітнага артылерыйскага дывізіёна. Удзельнічаў у вызваленні Беларусі. Вызначыўся пры ўзяцці Берліна. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Памёр у 1998 г.

ДАВЫДАЎ Віктар Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў г. Клімавічы Магілёўскай вобласці. На фронце з 1943 г. Радавы, памочнік камандзіра ўзвода 31-га асобнага чыгуначнага батальёна 4-й асобнай чыгуначнай брыгады. Пасля вайны працаваў галоўным эканамістам саўгаса «Грушаўскі» Крупскага раёна. Жыве ў в.Ігрушка. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі.

ДАНІЛАЎ Міхаіл Дзмітрыевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Вазьян Вадскага раёна Горкаўскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на фронце, камандзір узвода хімічнай аховы, начальнік хімічнай службы палка, камандзір асобнага хімічнага батальёна. Ваяваў на 1-м Прыбалтыйскім фронце. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені. Жыве ў г. Крупкі.

ДАНІЛОВІЧ Віктар Максімавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Абчуга Крупскага раёна. Да вайны працаваў агентам Крупскага райфінаддзела. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце, артылерыст. Ваяваў на Паўднёвым, Заходнім, 1-м Беларускім франтах. Удзельнічаў у абароне Масквы, вызваленні Варшавы, штурме Берліна. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў г. п. Бобр.

ДОМЕНІКАЎ Рыгор Васілевіч. Нарадзіўся ў 1910 г. ў в. Гурэц. Скончыў Кашчынскую царкоўнапрыходскую і Халопеніцкую сямігадовую школы. Працаваў загадчыкам аддзела прапаганды Крупскага райкома камсамола, загадчыкам сельгасаддзела, намеснікам рэдактара, рэдактарам раённай газеты «Камуністычны шлях». З першых дзён вайны на фронце. Удзельнічаў у абароне г. Смаленска, у баях пад Масквой, палітрук роты. Быў намеснікам камандзіра батальёна па палітчастцы, намеснікам рэдактара, рэдактарам дывізіённай газеты «Уперад». Пасля дэмабілізацыі з 1948 г. на савецкай і партыйнай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў г. Крупкі.

ДРАЗДОЎ Іван Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Худаўцы Крупскага раёна. З ліпеня 1944 г. на фронце, кулямётчык 171-га стралковага палка 1-й мотастралковай дывізіі. 30 студзеня 1945 г. ў баях быў паранены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Худаўцы.

ДРАНІЦА Павел Дзмітрыевіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Дакудава Крупскага раёна. Працаваў у калгасе. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на фронце, марскі пехацінец Чарнаморскага флоту. Удзельнічаў у абароне Сімферопаля, Севастопаля. 25 верасня 1941 г. быў цяжка паранены. Вызначыўся ў баях у Крыме. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі. Жыве ў в. Дакудава.

ДУДКО Сцяпан Іванавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Стары Сакол Крупскага раёна. На фронце з 1944 г., разведчык 1008-га стралковага палка. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Вызначыўся у баях пад Берлінам і Варшавай. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Стары Сакол.

ЖАЎНЯРОЎ Павел Савельевіч. Нарадзіўся ў 1906 г. ў Крупках. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце, камандзір аўтатранспартнага ўзвода. Ваяваў на Заходнім фронце. Пасля вайны працаваў у райпрамкамбінаце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Жыве ў г. Крупкі.

ЖУК Ілья Якаўлевіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Пасёмкавічы Крупскага раёна. Рос сіратой, працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі з 1940 г. З першых дзён вайны на фронце. Сяржант І. Жук зведаў увесь цяжар блакады Ленінграда. З 18 жніўня 1941 г. да 4 красавіка 1942 г. абараняў горад, камандзір аддзялення, быў цяжка паранены. Пасля шпіталю, скончыўшы камандзірскія курсы, камандзір мінамётнай роты 54-й механізаванай брыгады 6-га мехкорпуса лейтэнант І. Жук на Сталінградскім фронце. 24 снежня 1942 г. прыняў удзел у наступальнай аперацыі. Мінамётчыкі лейтэнанта ўдзельнічалі ў жорсткіх баях пад Кацельнікава, потым у ліпені 1943 г. на Курскай дузе пад Прохараўкай. У 1944 г. ваяваў у Польшчы, прымаў удзел у Верхне-Сілезскай аперацыі па ліквідацыі буйной групоўкі праціўніка. У 1945 г. мінамётчыкі І. Жука ў складзе 5-й танкавай арміі ўступілі на тэрыторыю Германіі. Фарсіраваў рэкі Нейсе і Шпрэе, вызваляў Прагу. Складаны ваенны шлях салдата, потым афіцэра І. Я. Жука адзначаны шматлікімі ўзнагародамі. Сярод іх ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, медалі «За баявыя заслугі», «За абарону Ленінграда», «За абарону Сталінграда», «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Прагі». Жыве ў г. Крупкі.

ЖЫЛІНСКІ Аляксей Дзям'янавіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Лісічына Крупскага раёна. На фронце з ліпеня 1944 г., камандзір аддзялення 73-га стралковага палка. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце, удзельнічаў у вызваленні Літвы. У сакавіку 1945 г. быў паранены, пасля выздараўлення мабілізаваны. Пасля вайны жыў і працаваў у в. Слабада. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі. Памёр у 1998 г.

П.С.Жаўняроў.

І.Я.Жук.

А.Р.Занямонец.

ЖЫЛІНСКІ Іосіф Мікітавіч. Нарадзіўся ў в. Нача Крупскага раёна. У 1942 г. яшчэ падлеткам стаў партызанам брыгады «Разгром». Пасля вызвалення Беларусі добраахвотна пайшоў на фронт. Удзельнічаў у баях пад Беластокам, у штурме Кёнігсберга, Берліна. Узнагароджаны ордэнамі Славы 3-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу». Юнаку ў той час было толькі 19 гадоў.

ЗАКІРВАШЭВІЧ Пётр Антонавіч. Нарадзіўся ў 1915 г. ў в. Лісічына Крупскага раёна. З мая 1943 г. ў партызанскім атрадзе. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Памёр у 1996 г.

ЗАНЯМОНЕЦ Аляксандр Рыгоравіч. Нарадзіўся ў 1920 г. Да вайны працаваў бух-

М.А.Ігнатовіч.

В.М.Каніўчанка.

галтарам у Крупскім райана. У Чырвонай Арміі з 1940 г. Вайна напаткала ў Кранштаце, мічман 21-га, потым 146-га асобнага артдывізіёна. Удзельнічаў у абароне Ленінграда. З лютага 1945 г. ў складзе аператыўнай групы Балтыйскага флоту, удзельнічаў у штурме г. Кёнігсберг, у красавіку 1945 г. ва ўзяцці Пілаў. Пасля вайны працаваў на мінных тральшчыках па размініраванні Балтыйскага мора. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Нача.

ІГНАТОВІЧ Марк Агеевіч. Нарадзіўся ў 1914 г. ў в. Буда Крупскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, мінамётчык 185-га стралковага палка. Удзельнічаў у абароне Ленінграда, вызначыўся пры прарыве блакады. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Жыве ў г. Крупкі.

ІСАЧАНКА Іван Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1907 г. ў в. Капец Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце, палітрук эскадрона. Ваяваў на Паўднёва-Заходнім фронце, удзельнічаў у партызанскім руху, камісар партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонага Сцяга. Пасля вайны на гаспадарчай, партыйнай і савецкай рабоце. Памёр у 1998 г.

КАВАЛЕНКА Сяргей Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Запруддзе Крупскага раёна. Да вайны працаваў шкловыдзімальшчыкам на шкляным заводзе ў Бабруйску. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У чэрвені 1941 г. пад Жытомірам паранены. У лютым 1942 г. трапіў у запасны артылерыйскі полк у г. Агачова. Са жніўня 1942 г. партызан, камандзір узвода брыгады імя С. М. Кірава. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені. Жыве ў в. Запруддзе.

КАВАЛЕЎСКІ Савелій Авакумавіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Узнацк Крупскага раёна. Працаваў рабочым у Ленінградзе. У Чырвонай Арміі з 1940 г. З ліпеня 1941 па снежань 1942 г. памочнік камандзіра ўзвода 3-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Пасля заканчэння курсаў камандзір узвода 35-га стралковага палка 30-й стралковай дывізіі, 365-га стралковага палка 115-й стралковай дывізіі, капітан. Ваяваў на 1-м Украінскім фронце. Узнагароджаны 2 ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1999 г.

КАЗЛОЎ Пётр Ануфрыевіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Ротань. У Чырвонай Арміі з 1940 г. Служыў радыстам у разведузводзе ў г. Выбарг Ленінградскай вобл. У Вялікую Айчынную вайну тут вытрымаў усе 900 дзён блакады. Удзельнік баёў ва Усходняй Прусіі і савецка-японскай вайны 1945 г. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі.

КАНІЎЧАНКА Віктар Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў в. Нова-Белая Новапскоўскага раёна Варашылаўградскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1941 г., механік-вадзіцель 31-га танкавага палка 16-й механізаванай дывізіі. З першых дзён вайны на фронце. 20 жніўня 1941 г. быў паранены. Пасля выздараўлення накіраваны ў Саратаўскае танкавае вучылішча, потым у складзе 1-й танкавай брыгады рэзерва галоўнага камандавання. Ваяваў на Волхаўскім, 1, 2, 3-м Прыбалтыйскім франтах, камандзір танкавага ўзвода, начальнік майстэрні. Вайну скончыў ва Усходняй Прусіі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1975 г. падпалкоўнік запасу. Жыве ў г. Крупкі.

КАРПЕКА Іосіф Пятровіч. Нарадзіўся ў в. Майск. Вайну Іосіф Пятровіч Карпека сустрэў салдатам — ён праходзіў абавязковую службу ў Чырвонай Арміі, быў у разведгрупе пры штабе Заходняга фронту.

Іосіф Пятровіч успамінае:

— Усяго давялося зведаць за 1418 дзён вайны. Іншы раз думаеш, як гэта ўсё чалавек змог перанесці, вытрымаць... Вядома, цяжка было, неймаверна цяжка. Асабліва, калі адступалі. Атрымалася так, што наша падраздзяленне адыходзіла на ўсход па дарогах Крупшчыны. Уявіце мой стан, калі мы прайшлі каля в. Ухвала. Было балюча і горка.

Але вера ў перамогу не пакідала нас. Мы ведалі, што вернемся.

Сапраўды, спраўдзіліся словы камандзіра, якія ён гаварыў у 1941 г. на Крупшчыне: «Не сумуй, салдат, ты вернешся сюды». І лёс распарадзіўся так, што ў чэрвені 1944 г. разам з часцямі Савецкай Арміі Іосіф Пятровіч адным з першых ступіў на родную зямлю.

«Падраздзяленне наша, — успамінае Іосіф Пятровіч, — спынілася ў в. Ігрушка. Камандзір, ведаючы, што я родам з гэтых месц, адпусціў мяне на некаторы час дадому, у Майск»...

Закончыў вайну І. П. Карпека ва Усходняй Прусіі, калі быў штурмам узяты горад-крэпасць Кёнігсберг. Дэмабілізаваўся ў 1946 г. Жыве на радзіме. Да баявых узнагарод дабавілася і мірная — ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі. *М. М. Навахрост.*

КАСЦЮКЕВІЧ Віктар Піліпавіч. Працаваў рабочым у Крупскім лясгасе. У час акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі з ліпеня 1942 г. разведчык партызанскага атрада, пасля вызвалення Беларусі на фронце, кулямётчык. Быў цяжка паранены. З мая 1946 г. працаваў у калгасе, пасля заканчэння вышэйшай партыйнай школы — інструктар РК КПБ, з 1960 г. старшыня калгаса «Бальшавік». Адным з прадстаўнікоў «залатога фонду кіраўнікоў» назваў яго П. М. Машэраў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны 2-й ступені, Чырвонай Зоркі, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр у 1992 г.

КАЦЯНЁЎ Панцялей Сідаравіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Кацянёўка Старажаскольскага раёна Белгарадскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1941 г., артылерыйскі тэхнік, начальнік артзабеспячэння, начальнік уліковааператыўнага аддзела армейскага саставу. Ваяваў на Бранскім, 1, 2, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны 3 ордэнамі Чырвонай Зоркі, 3 медалямі «За баявыя заслугі». Жыве ў г. Крупкі.

КЛАНЮК Леанід Сямёнавіч. Нарадзіўся 5.6.1918 г. ў в. Грыцкавічы Крупскага раёна. Вучыўся ў Хальнявіцкай сярэдняй школе. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну быў тройчы паранены. Меў чатыры ўдзячнасці галоўнакамандуючага. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Жыве ў в. Грыцкавічы.

КЛІШАНЕЦ Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Калодніца Крупскага раёна. З чэрвеня 1944 г. на фронце, стралок, камандзір гарматнага разліку. Ваяваў на 3-м

У. І. Клішанец.

А. М. Кляшчонак.

П. А. Костачка.

Беларускім фронце і Далёкім Усходзе. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Жыве ў в. Калодніца.

КЛЯШЧОНАК Адам Мікітавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Матошка Крупскага раёна. У час акупацыі раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі партызан 8-й Круглянскай брыгады, пасля вызвалення Беларусі на фронце, сувязіст 44-га стралковага палка 42-й стралковай дывізіі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Славы 3-й ступені, медалямі. Жыве ў в. Матошка.

КОСТАЧКА Павел Ананьевіч. Нарадзіўся ў 1917 г. ў в. Дакучына Крупскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1938 г. Служыў у Прыбалтыцы. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, лейтэнант 317-га стралковага палка 92-й стралковай дывізіі. Удзельнік блакады Ленінграда, потым вызваляў Заходнюю Украіну, быў паранены. Пасля шпіталю ўдзельнічаў у вызваленні Прагі, Вены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За адвагу», «За абарону Ленінграда», «За вызваленне Прагі».

С.С.Костачка.

Я.А.Косцеш.

Р.Ц.Кульгавы.

У.М.Кульгавы.

КОСТАЧКА Сяргей Спірыдонавіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Гузовіна Крупскага раёна. Працаваў трактарыстам у Янаўшчынскай МТС. У Чырвонай Арміі з 1939 г., служыў у Цярнопалі. У Вялікую Айчынную вайну на Паўднёва-Заходнім, Заходнім франтах, радавы 122-й стралковай дывізіі. У верасні 1943 г. пры вызваленні Смаленска быў цяжка паранены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Гузовіна.

КОСЦЕШ Ягор Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Касянічы Крупскага раёна. З 1944 г. на фронце, радавы. Удзельнічаў у вызваленні Беларусі, быў цяжка паранены. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі. Жыве ў в. Касянічы.

КУЛЬГАВЫ Рыгор Цімафеевіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Новая Крупка Крупскага раёна. Да вайны працаваў настаўнікам. З першых дзён вайны на фронце. Прайшоў цяжкі шлях ад радавога, разведчыка 185-й стралковай дывізіі да камандзіра ўзвода разведкі, лейтэнанта, потым маёра, палкоўніка, быў начальнікам штаба палка па разведцы, некалькі разоў паранены. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й ступені, 2 Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Пасля вайны працаваў у сістэме народнай адукацыі. Памёр у 1991 г.

КУЛЬГАВЫ Уладзімір Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Новая Крупка Крупскага раёна. Працаваў трактарыстам у Крупскай МТС. З чэрвеня 1941 г. на фронце. Ваяваў на 2-м Украінскім фронце, шафёр 146-га аддзялення артдывізіёна. Быў двойчы паранены. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Жыве ў в. Новая Крупка.

КУЛЬША Мсціслаў Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1916 г. ў в. Уюнішча Глускага раёна Магілёўскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1937 г. На фронце з 1941 г. Ваяваў на Паўднёва-Заходнім, 2-м Беларускім франтах, камандзір кулямётнага аддзялення, потым узвода. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу». Жыве ў г. Крупкі.

КУХТА Васіль Васілевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Шамкі Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на фронце, радавы 239-га асобнага лыжнага палка 339-й стралковай дывізіі. Ваяваў на Паўднёва-Заходнім, 2-м Прыбалтыйскім франтах, мінамётчык, потым камандзір аддзялення 1040-га знішчальнага палка. Быў тройчы паранены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Шамкі.

ЛІЦВІН Аляксей Захаравіч. Нарадзіўся ў 1916 г. ў в. Дроздзіна Барысаўскага раёна. Да вайны працаваў дырэктарам школы. З чэрвеня 1941 г. на фронце. Трапіў у акружэнне, быў у падполлі. З 1943 г. камандзір роты партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава брыгады імя Шчорса. Пасля вайны на гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны 1-й ступені, 2 ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Памёр у 1998 г.

ЛУГАЎЦОЎ Віктар Аляксандравіч. Нарадзіўся 15.1.1906 г. ў в. Калыбанава Крупскага раёна. Вучыўся ў Шкорнеўскай пачатковай, потым Бобрскай сярэдняй школе. З 1928 г. працаваў настаўнікам Чарэйскай школы ў Чашніцкім раёне, потым быў прызваны ў Чырвоную Армію. Пасля дэмабілізацыі вучыўся ў Мінскім педагагічным інстытуце. Працаваў выкладчыкам Аршанскага педагагічнага тэхнікума. З 1935 г. ў Чырвонай Арміі, у 1941 г. скончыў Ваенную акадэмію

А.З.Ліцвін.

М.Т.Ляйчонак.

У.І.Маласай.

Я.М.Мінкоў.

імя Фрунзе. З 23 чэрвеня 1941 г. на фронце, камандзір артдывізіёна. Удзельнічаў у баях пад Смаленскам, Масквой, пры вызваленні Беларусі, Варшавы, у Берлінскай аперацыі, быў начальнікам штаба артылерыйскай дывізіі. З 1947 г. старшы выкладчык Акадэміі бранятанкавых войск імя Маліноўскага. З 1956 г. палкоўнік запасу. Памёр у 1987 г. Узнагароджаны ордэнамі Кутузава 2-й ступені, Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. *Дз. М. Хромчанка.*

ЛУК'ЯНАЎ Васіль Данілавіч. Нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Дзедава Барысаўскага раёна Магілёўскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, камандзір стралковага ўзвода. Удзельнічаў у вайне з Японіяй. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За адвагу». Жыве ў г. Крупкі.

ЛЯЙЧОНАК Мікалай Тофелевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Асечана Крупскага раёна. У час акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі партызан атрада «За Радзіму» Сенненскай брыгады. З 1944 г. на фронце, камандзір аддзялення сувязі 334-га артылерыйскага гаўбічнага палка. Вызначыўся пры вызваленні Беларусі, Варшавы, штурме Кёнігсберга. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі. Жыве ў в. Асечана.

ЛЯХНОВІЧ Нічыпар Васілевіч. Нарадзіўся ў в. Халопенічы Крупскага раёна. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг., артылерыст гаўбічнай батарэі. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Удзельнічаў у штурме лініі Манергейма, вызваленні Варшавы, Берлінскай аперацыі. Узнагароджаны медалямі.

МАКОЎСКІ Васіль Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Лісічына Крупскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1938 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1944 г. на фронце. Ваяваў на Заходнім і Беларускім франтах. Вызначыўся ў баях у Прыбалтыцы, ва Усходняй Прусіі. Узнагароджаны 2 медалямі «За адвагу». Жыве ў в. Лісічына.

МАКОЎСКІ Міхаіл Якаўлевіч. Нарадзіўся ў 1926 г. ў в. Дубраўка Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну партызан 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце, сяржант 954-га стралковага палка 262-й стралковай дывізіі. У студзені 1945 г. быў паранены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Жыве ў в. Дубраўка.

МАЛАСАЙ Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў в. Нача Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Удзельнічаў у вызваленні Беларусі, абароне Сталінграда, баях на Курскай Дузе. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны». Жыве ў Мінскім раёне.

МАРОЗ Уладзімір Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1911 г. ў в. Колас Крупскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1938 г. У Вялікую Айчынную вайну партызан атрада імя К. Я. Варашылава брыгады імя Шчорса, потым камандзір узвода, начальнік фінансавага забеспячэння батальёна. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені. Жыве ў в. Колас.

МІНКОЎ Якаў Максімавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў гар. пас. Халопенічы Крупскага раёна. Вучыўся ў Маскоўскім педінстытуце. З красавіка 1943 г. на фронце, курсант 77-й гвардзейскай стралковай дывізіі. З кастрычніка 1944 г. да кастрычніка 1945 г. начальнік клуба эвакуацыйнага шпіталя ў г. Энгельс.

У.І.Нікіфарэнка.

П.Ц.Парутчык.

П.П.Паўлініч.

І.А.Прышчэпаў.

Вызначыўся ў баях пад г. Оўруч. З 1947 па 1991 г. працаваў настаўнікам, дырэктарам школы, інспектарам райана ў Крупскім раёне. Цяпер старшыня раённага аб'яднання інвалідаў вайны і працы. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, а таксама знакамі «Выдатнік народнай адукацыі БССР» (1967) і «Выдатнік народнай асветы СССР» (1975). Жыве ў Крупках.

НІКІФАРЭНКА Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Купленка Крупскага раёна. На фронце з 1941 г. Ваяваў на Прыбалтыйскім, 1-м Беларускім франтах. З сакавіка 1942 г. механік-вадзіцель танка 78-й асобнай танкавай роты. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Купленка.

НІШЧАНКА Іван Піліпавіч. Нарадзіўся ў 1927 г. ў в. Дубраўка Крупскага раёна. З 1944 г. на фронце, кулямётчык. Удзельнічаў у вайне з Японіяй у складзе 39-й арміі 5-га гвардзейскага корпуса 19-й гвардзейскай дывізіі 54-га палка. Пасля вайны служыў у органах МУС. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі. Памёр у 1984 г.

ПАРУТЧЫК Павел Цімафеевіч. Нарадзіўся ў 1916 г. ў в. Шэйка Крупскага раёна. З ліпеня 1944 г. да мая 1945 г. мінамётчык 43-га гвардзейскага стралковага палка 3-га Беларускага фронту. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Славы 3-й ступені, медалямі. Жыве ў в. Шэйка.

ПАРЦЯНКА Архіп Якаўлевіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Дакучыно Крупскага раёна. З 1938 г. ў Чырвонай Арміі, служыў на Украіне. Удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне 1939—40 гг. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на 2-м Украінскім фронце. Удзельнічаў у абароне Сталінграда, вызваленні Прагі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Дакучыно.

ПАЎЛІНІЧ Пётр Пятровіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Пышачы Крупскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1940 г. На фронце з чэрвеня 1941 г. Ваяваў на 3-м Украінскім фронце, радавы 8-га і 19-га асобных пантонна-маставых батальёнаў 63-й асобнай штурмавой роты. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Славы 3-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в Пышачы.

ПРЫСЬ Сяргей Сцяпанавіч. Скончыў артылерыйскую школу. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце. Удзельнічаў у баях пад Масквой. 7 лістапада 1941 г. прымаў удзел у парадзе, потым у баях на Валакаламскай шашы. У 1943 г. 100-я артылерыйская брыгада, дзе служыў С. Прысь, была накіравана пад Курск. Пасля Курскай бітвы ўдзельнічаў у баях за вызваленне Чарнігава, Лоева, Рэчыцы, Ковеля, Варшавы. У складзе 1-га Беларускага фронту дайшоў да Берліна. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

ПРЫШЧЭПАЎ Ісак Арсенцьевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Калодніца Крупскага раёна. З ліпеня 1943 г. да ліпеня 1944 г. партызан 5-га атрада брыгады М. П. Гудкова. Скончыў курсы сувязістаў, быў артылерыйскім разведчыкам, сувязістам у складзе 30-га гвардзейскага палка 2-й арміі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Калодніца.

З успамінаў І. А. Прышчэпава

У партызанскім атрадзе я быў мінёрам, хадзіў на заданні ў Талачынскі і Крупскі раёны.

І.І.Пулькін.

В.Я.Пыжык.

Р.С.Пятровіч.

П.А.Радзькоў.

У памяці засталося, як мы ўсёй брыгадай узарвалі каля 40 км чыгункі на ўчастку Талачын—Крупкі. Летам 1944 г. былі акружаны нямецка-фашысцкімі акупантамі, якія размясціліся ў раёне воз. Палік. У іх была тэхніка, самалёты, артылерыя. У партызан не хапала патронаў, прадуктаў, харчаваліся чым папала. Камандаванне брыгады прыняло рашэнне выходзіць з акружэння невялікімі групамі. У пачатку ліпеня нас вызваліла Чырвоная Армія. 12 ліпеня партызаны нашай брыгады былі накіраваны ў дзеючую армію.

ПУЛЬКІН Іван Ісакавіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Худаўцы Крупскага раёна. Працаваў бухгалтарам Крупскага сельпо. З 2.11.1939 г. ў Чырвонай Арміі. З чэрвеня 1941 г. на фронце, памочнік камандзіра ўзвода 429-га гаўбічнага артылерыйскага палка Паўночна-Заходняга і Калінінскага франтоў. З красавіка 1942 г. па май 1944 г. камандзір узвода 3-га вучэбнага палка рэзерву афіцыйнага складу артылерыі 1-га Украінскага фронту. З кастрычніка 1944 г. камандзір узвода разведкі 97-га гаўбічнага палка. Ваяваў на 1-м і 2-м Украінскім франтах. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1998 г.

ПУЛЬКІН Мікалай Анісімавіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Ротань Крупскага раёна. Працаваў у калгасе. З чэрвеня 1941 г. на фронце, памочнік старшыні 320-й зенітна-артылерыйскай батарэі Паўночна-Заходняга фронту, з сакавіка 1943 г. загадчык складу 1585-га зенітна-артылерыйскага палка Паўночна-Заходняга і 2-га Прыбалтыйскага франтоў. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені. Жыве ў Мінску.

ПЫЖЫК Васіль Ягоравіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Лужа Крупскага раёна. Са жніўня 1941 г. на фронце, шафёр 617-й рамонтнай базы. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Вызначыўся ў баях па ліквідацыі нямецкай групоўкі пад Кёнігсбергам. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За баявыя заслугі». Жыве ў г. Крупкі.

ПЯТРОВІЧ Рыгор Сяргеевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Касянічы Крупскага раёна. З лютага 1945 г. на фронце, стралок 2-га запаснога стралковага палка, потым 390-га запаснога стралковага палка. Ваяваў на 1-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Касянічы.

РАДЗЬКОЎ Парфен Аўравіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў в. Лютыя Крупскага раёна. З чэрвеня 1944 г. на фронце, стралок 171-га стралковага палка 2-й гвардзейскай арміі. Са студзеня 1945 г. камандзір мінамётнага разліку 1233-га стралковага палка. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Удзельнічаў у штурме Кёнігсберга, потым у разгроме квантунскай арміі ў Японіі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 3-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Лютыя.

РОГАЎ Сцяпан Пятровіч. Нарадзіўся ў 1914 г. ў в. Хацюхова Крупскага раёна. Да вайны працаваў слесарам у Халопеніцкай МТС. З 1944 г. на фронце, сяржант 167-га гвардзейскага стралковага палка. Вызначыўся пры фарсіраванні р. Нёман, штурме Кёнігсберга, Пілаў. У студзені 1945 г. быў паранены. Скончыў вайну ва Усходняй Прусіі. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалём «За адвагу». Жыве ў в. Хацюхова.

РУБАНАЎ Сцяпан Алімпіевіч. Нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Селівонаўка Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Гомельскі фінансава-эканамічны тэхнікум. З 1938 г. працаваў у Дубровенскім райфінаддзеле Ві-

С.П.Рогаў.

С.А.Рубанаў.

Г.Дз.Сакавец.

Н.А.Свідзерскі.

цебскай вобласці. З 1939 г. ў Чырвонаи Арміі. З 1941 г. пасля заканчэння курсаў сувязістаў на фронце, малодшы лейтэнант, камандзір узвода сувязі 33-й стралковай брыгады. Ваяваў пад Ленінградам, быў паранены. Пасля выздараўлення ў 265-й стралковай дывізіі, удзельнічаў у прарыве блакады Ленінграда. Вызначыўся ў баях у Прыбалтыцы, Польшчы, штурме Берліна. Пасля дэмабілізацыі скончыў фінансава-эканамічны інстытут. З 1952 г. працаваў у Мінску, з 1954 г. ў Крупскім раёне. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак пашаны», медалямі. Жыве ў г. Крупкі.

САКАВЕЦ Рыгор Дзянісавіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Вялікі Вязок Крупскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1940 г., танкіст. З чэрвеня 1941 г. да чэрвеня 1944 г. на фронце, камандзір танка 284-га танкавага палка, потым 227-га асобнага танкавага палка 65-й танкавай дывізіі. Ваяваў на Паўночна-Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Удзельнічаў у вызваленні Беларусі, баях ва Усходняй Прусіі. Вызначыўся ў баях пры ліквідацыі віцебскай групоўкі праціўніка. Быў тройчы паранены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў г. Крупкі.

САС Міхаіл Логвінавіч. Нарадзіўся ў 1914 г. ў в. Шарнева Крупскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1939 г. З чэрвеня 1941 г. на фронце, артылерыст. Ваяваў на Паўночна-Заходнім фронце. Удзельнічаў у вызваленні Беларусі, Крыма, Варшавы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Шарнева.

САСКАВЕЦ Васіль Савельевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Шавярнічы Бярэзінскага раёна. З чэрвеня 1941 г. на фронце, радавы 30-га стралковага палка 64-й стралковай дывізіі. Удзельнічаў у абарончых баях пад Мінскам, Смаленскам, Масквой, г. Старая Руса. З 1942 г. матарыст 514-га авіяпалка. Удзельнічаў у абароне Сталінграда, вызваленні Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі, у баях за Берлін. Узнагароджаны 2 медалямі «За баявыя заслугі». Жыве ў в. Ухвала.

СВІДЗЕРСКІ Аляксандр Іванавіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Дзяньгубка Крупскага раёна. У Чырвонай Арміі з верасня 1938 г. Скончыў палкавую школу. З першых дзён вайны на фронце, старшы сяржант, камандзір узвода. Ваяваў на Заходнім і 3-м Беларускім франтах. Удзельнічаў у абароне Масквы і вызваленні Мінска. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Дзяньгубка.

СВІДЗЕРСКІ Нестар Арсенцьевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Дзяньгубка Крупскага раёна. З чэрвеня 1944 г. на фронце, стралок 222-га армейскага запаснога стралковага палка. Са жніўня 1944 г. да чэрвеня 1945 г. наводчык 412-га стралковага палка. Ваяваў на 2-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Лагі.

СВІДЗЕРСКІ Харытон Іванавіч. Нарадзіўся ў 1913 г. ў в. Дзяньгубка Крупскага раёна. Працаваў у калгасе. З чэрвеня 1941 г. на фронце ў 21-м кавалерыйскім палку. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Вызначыўся пры вызваленні Беларусі. Узнагароджаны ордэнам Славы 1-й ступені, медалямі. Памёр у студзені 1998 г.

СІЎЦОЎ Віктар Гаўрылавіч. Нарадзіўся ў 1926 г. ў в. Шэйка Крупскага раёна. З ліпеня 1944 г. на фронце, мінамётчык 46-га стралковага палка 16-й дывізіі 2-й арміі. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ор-

Х.І.Свідзерскі.

В.Г.Сіўцоў.

І.М.Урбановіч.

А.С.Ф.Фатыхаў.

дэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу». Жыве ў г. п. Бобр.

УРБАНОВІЧ Іосіф Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1914 г. ў в. Вялікія Хальнявічы Крупскага раёна. З 1936 г. ў разведорганах на Далёкім Усходзе. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. ў 35-й арміі. Вызначыўся ў баях у Маньчжурыі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў в. Вялікія Хальнявічы.

ФАТЫХАЎ Ахмет Сафа Фатыхавіч. Нарадзіўся 15 жніўня 1915 г. ў в. Алагузава Кігінскага раёна Башкірыі. Працаваў у калгасе, слесарам на заводзе. Служыў у Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на 2-м Ленінградскім фронце ў 14-й паветранай арміі. Рамантаваў самалёты і танкі. Удзельнічаў у аперацыі па эвакуацыі жыхароў Волхава ў савецкі тыл. Ваяваў да мая 1945 г. Да 1953 г. служыў у Беларускай ваеннай акрузе. Затым жыў і працаваў у Крупскім раёне, у Крупках. Апошнія 25 гадоў жыцця даглядаў цяжка хворую жонку Вольгу Гвоздзік (н. ў в. Ігрушка Крупскага раёна), якая зведала нямецкі палон. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр 10 чэрвеня 1996 г.

ФЕДАРЦОЎ Фёдар Цімафеевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Трасцянка Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. З 1942 г. на фронце, малодшы сяржант. Ваяваў на Сталінградскім, 4-м і 1-м Украінскіх франтах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыве ў г. п. Бобр.

ХАРЫТАНОВІЧ Васіль Пятровіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў в. Вялікія Жаберычы Крупскага раёна. З ліпеня 1944 г. на фронце, радавы 24-га стралковага палка 86-й стралковай

Ф.Ц.Федарцоў.

У.А.Хрушчэўскі.

дывізіі, быў паранены. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі. Жыве ў в. Жаберычы.

ХАРЫТОНАЎ Васіль Васілевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Ігрушка Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі «За баявыя заслугі» і інш. Жыве ў в. Ігрушка.

ХРУШЧЭЎСКІ Уладзімір Антонавіч. Нарадзіўся ў в. Лісічына Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну на фронце ў складзе 186-га мінамётнага палка 7-й мінамётнай брыгады. Вызваляў Украіну, Чэхаславакію, удзельнічаў у баях у Германіі. Пасля вайны працаваў настаўнікам. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», знакам «Выдатнік народнай асветы БССР». Жыве ў в. Лісічына.

ЦАРЫК Васіль Майсеевіч. Нарадзіўся ў в. Лютыя Крупскага раёна. З 1941 г. на фронце, сяржант-санінструктар, удзельнічаў

С.П.Шайтанаў.

Р.П.Шпакоўскі.

у абароне Сталінграда. У лютым 1942 г. паранены. Вызваляў Прагу, удзельнічаў у Берлінскай аперацыі. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, медалямі.

ЦУХЛО Іван Трафімавіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Лісічына Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на фронце. Ваяваў на Чарнаморскім флоце. Удзельнічаў у абароне Адэсы, Севастопаля, у баях за вызваленне Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі, потым ваяваў на Далёкім Усходзе. Узнагароджаны 5 медалямі. Жыве ў в. Лісічына.

ЦЯЦЕРСКІ Мікалай. Нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Дакудава Крупскага раёна. З 1939 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. З чэрвеня 1944 г. ў 222-м стралковым палку 72-й стралковай дывізіі на 3-м Украінскім фронце. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі.

ЧАРТОВІЧ Іван Сідаравіч. Нарадзіўся ў 1912 г. ў в. Дубы Крупскага раёна. З 1940 г. ў Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Ваяваў на Заходнім і 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені. Жыве ў г. п. Халопенічы.

ШАЙТАНАЎ Сяргей Парфёнавіч. Нарадзіўся ў 1921 г. Працаваў трактарыстам у Янаўшчынскай МТС. З кастрычніка 1940 г. ў Чырвонай Арміі, служыў у Ленінградскай ваеннай акрузе. З лістапада 1941 г. на фронце, шафёр 541-га гаўбічнага артылерыйскага палка 987-га аўтамабільнага батальёна 18-й танкавай дывізіі. Ваяваў на Ленінградскім фронце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у лістападзе 1998 г.

ШАТАЎ Ілья Парфёнавіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў гар. пас. Халопенічы Крупскага раёна. З ліпеня 1941 г. на фронце, радавы. Ваяваў на Волхаўскім, Бранскім, Ленінградскім і 1-м Украінскім франтах. Узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі. Жыве ў Лепельскім раёне Віцебскай вобласці.

ШПАКОЎСКІ Рыгор Піліпавіч. Нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Чырвоная Слабада Крупскага раёна. Працаваў ветфельчарам. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, яфрэйтар, разведчык-назіральнік. Ваяваў на 3-м Беларускім фронце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

ЯРАШЭВІЧ Міхаіл Пятровіч. Нарадзіўся ў 1915 г. ў в. Лебедзева Крупскага раёна. З 1937 г. ў Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, старшына роты, камандзір аддзялення кулямётнага ўзвода. Ваяваў на Далёкім Усходзе. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». Жыве ў г. Крупкі.

Дакументы сведчаць

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА КРУПСКАГА РК КП(Б)Б МІНСКАМУ АБКОМУ КП(б)Б АБ ПРАВЯДЗЕННІ СВЯТА ПЕРАМОГІ НАД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ Ў КРУПСКІМ РАЁНЕ

З незвычайным уздымам і натхненнем працоўныя Крупскага раёна сустрэлі доўгачаканае новае свята — свята Перамогі савецкага народа над заклятым фашызмам.

Раніцай 9 мая абляцела вестка па ўсяму раёну аб пераможным завяршэнні Вялікай Айчыннай вайны. Не было мяжы радасці шчасця.

Ва ўсіх установах і дамах жыхароў раёна былі падняты чырвоныя сцягі, партрэты нашых правадыроў, хто прывёў наш народ да перамогі.

Па ўсіх сельсаветах і калгасах раёна было праведзена 105 мітынгаў, дзе прысутнічалі 20500 чалавек. Толькі ў адным мястэчку Крупкі ўдзельнічала на мітынгу 1800 чалавек. На мітынг прыйшлі арганізавана і асобнымі групамі з лозунгамі і партрэтамі правадыроў. Усюды святочны настрой, вясёлыя твары, нават у некаторых выступаюць на вачах слёзы шчасця

і радасці. На мітынгу выступіла 840 чалавек, прадстаўнікі ад рабочых, служачых, школьнікаў, Чырвонай Арміі, калгаснікаў, якія віншавалі працоўных раёна з вялікай урачыстасцю, са святам Перамогі. Ад прамкамбіната рабочы тав. Галубоўскі гаворыць: «Збыліся словы Вялікага Сталіна. Сёння на савецкай зямлі свята Перамогі. Кожны савецкі грамадзянін горача дзякуе нашу Чырвоную Армію, нашага Вялікага Сталіна за атрыманую перамогу савецкага народа над фашысцкай Германіяй і яшчэ з вялікай энергіяй і сілай будзем працаваць над выкананнем задач па ўзнаўленню разбуранай гаспадаркі».

Калгасніца Спашко гаворыць: «Мы рады, што наша самаадданая праца дапамагла нашай гераічнай Чырвонай Арміі. Мы разгромілі фашысцкую Германію і надалей будзем працаваць не пакладаючы рук ва ўмовах мірнага, свабоднага, радаснага жыцця па аднаўленні народнай гаспадаркі, на хутчэйшую ліквідацыю вынікаў фашысцкага гаспадарання.

Будзем сустракаць нашых воінаў-вызваліцеляў. Хутчэйшым ўзнаўленнем калгасаў, вырошчваннем высокага сталінскага ўраджаю — ураджаю перамогі!»

На мітынгу ва Ухвальскім сельсавеце выступіў свяшчэннік, які адзначыў, што рускі народ ніколі ніхто не перамагаў і дзякуючы гераічным намаганням Чырвонай Арміі і ўсяго савецкага народа, Вялікага Сталіна, фашысцкая Германія пастаўлена на калені. Заклікаў да паспяховага завяршэння пасеву і падпісцы на 4-ю дзяржаўную ваенную пазыку. Сам падпісаўся на 7 тысяч рублёў, дзве тысячы ўнёс адразу.

Усе выступаўшыя закончылі свае выступленні з пажаданнямі доўгіх гадоў жыцця Маршалу Савецкага Саюза, сябру працоўных тав. Сталіну пад бурную авацыю, доўга незмаўкальнаму «ура».

Вінтовачныя залпы і ўспышкі ракет.

Пасля мітынгу было арганізавана масавае гулянне.

Сакратар Крупскага РК КП(б)Б
(Шчарбакоў)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 243, воп. 1, спр. 14, л. 4, 5.

Падрыхтаваў да друку Г. І. Грыгор'еў.

Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад Вамі.
Вы не скарыліся лютым забойцам,
у чорныя дні фашысцкай навалы
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў Вашай любові
да Савецкай Радзімы
навек незгасальна.
Памяць пра Вас у нас заўсёды,
як неўміручая наша зямля
і як вечна яркае сонца над ёю!

Воіны Чырвонай Арміі і партызаны, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны пры абароне і вызваленні Крупскага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі

АБЧУГСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АБЧУГА

АБДУЛАЕЎ Талат Гайдаравіч, рад., загінуў 28.6.1944.

АКІНІН Віктар Сямёнавіч, жыў у Міласлаўскім р-не Разанскай вобл., загінуў 1.7.1944.

АСІПЮК Сцяпан Маркавіч, н. ў 1905, жыў у г. Омск, ст. лейт., загінуў 28.6.1944.

БАРНІСМАН Эўра Майсееўна, лейт., загінула 28.4.1944.

БЕРЦЫТ Цімафей Андрэевіч, н. ў 1918, жыў у в. Сірова Горкаўскай вобл., загінуў 9.6.1944.

БУРДУКОЎСКІ Уладзімір Паўлавіч, н. ў 1924, жыў у пас. Мальск Кіраўскай вобл., рад., загінуў 6.1.1944.

ВАРАБ'ЁЎ Міхаіл Цярэнцьевіч, жыў у в. Лашына Кіраўскай вобл., загінуў 28.6.1944.

БЕРАМЕЕНКА Фёдар Мацвеевіч, жыў на ст. Кузіна Свярдлоўскай вобл., лейт., загінуў 28.6.1944.

ДЗЯМІДЧЫК Андрэй Андрэевіч, рад., загінуў 18.6.1944.

ЖУРАЎЛЁЎ Фёдар Якімавіч, н. ў 1906, жыў у Данецкай вобл., лейт., загінуў 28.6.1944.

ЗАСЛУЖАНЫ Васіль Анісімавіч, радавы.

ЗАХАРАЎ Сяргей Ціханавіч, жыў у в. Чаксы, Татарыя, рад., загінуў 25.9.1941.

КАВАЛЕНКА Васіль Раманавіч, н. ў с. Хаціўля Чарнігаўскай вобл., ст. сярж., загінуў 28.6.1944.

КАЮК Міхаіл Емяльянавіч, жыў у с. Н.Дуванка Луганскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

КУРВАНКАЛАЎ Джака, н. ў 1899, радавы.

ЛІПАН Іван Міхайлавіч, яфр., загінуў 29.6.1944.

ЛУЗІН Максім Міхайлавіч, н. ў 1903, жыў у в. Вялікія Труханавічы Чашніцкага р-на, партызан, загінуў 22.7.1943.

ЛУК'ЯНАЎ Віктар Васілевіч, жыў у г. Тамбоў, рад., загінуў 27.6.1944.

ЛЯХАЎ Іван Мікалаевіч, н. ў 1917, жыў у с. Ніўнае Бранскай вобл., партызан, загінуў 20.3.1944.

ПАТАШОЎ Віктар Еўдакімавіч, кап., загінуў 25.6.1944.

ПАШКЕВІЧ Усцін, загінуў у 1944.

РЖАНІЦКІ Пётр Еўдакімавіч, жыў у в. Кашанды Кіраўскай вобл., сярж., загінуў 26.6.1944.

РУБЦЭВІЧ, партызан.

РЫБАЛКА Аляксей Фёдаравіч, жыў у Чарнабаеўскім р-не Чаркаскай вобл., рад., загінуў 26.6.1944.

САДАЎ, партызан.

СЕНЬКІН Лука Цімафеевіч, жыў у г. Севастопаль, ст. сярж., загінуў 28.6.1944.

СМІРНОЎ Барыс Аляксеевіч, ст. сяржант.

СЦЕРКІН Лаўрэнцій Максімавіч, лейтэнант.

ТУПАЦІЛАЎ Павел Іванавіч, жыў у в. Клінок Бранскай вобл., рад., загінуў 25.6.1944.

ЦІХАНАВЕЦКІ Аляксей Рыгоравіч, сярж., загінуў 29.6.1944.

ШАЦІЛАЎ, партызан.

ШУЛЬГА Іван Аляксеевіч, жыў у с. Зарэчнае Херсонскай вобл., ст. лейт., загінуў 28.6.1944.

ЯРАШ Уладзімір Іосіфавіч, жыў у Лагойскім р-не Мінскай вобл., рад., загінуў у ліпені 1943.

ВЁСКА АСЕЧАНА

БУРКО Леанід Аляксандравіч, н. ў 1925, жыў у Сенненскім р-не Віцебскай вобл., партызан Сенненскай брыгады, загінуў 27.6.1943.

ВЁСКА ЗАБОР'Е

ПРУТНІКАЎ Палікарп Емяльянавіч, н. ў 1923, жыў у в. Баяры Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., партызан Сенненскай брыгады, загінуў 23.3.1944.

ВЁСКА СМАРОДЗІНКА

ЯГАЎКІН Павел Іванавіч, жыў у в. Рахмангулава Свярдлоўскай вобл., рад., загінуў 26.6.1944.

ВЁСКА ШКОРНЕЎКА

РАХАЎ Мікалай Васілевіч, н. ў 1915 у Сталінградзе, партызан брыгады М. П. Гудкова, загінуў 2.12.1943.

БОБРСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК БОБР

АБРАМОВІЧ Васіль Сяргеевіч, рад., загінуў 19.9.1941.

АЛЕХІН Пётр Аляксеевіч, н. ў 1900, сярж., загінуў 28.6.1944.

АНОЙКА Іван Паўлавіч, жыў у Ленінградзе, лейт., загінуў 27.6.1944.

АНФІЛАЕЎ Еўдакім Назаравіч, н. ў 1900, жыў у с. Курата Алтайскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

АРКІС Барыс Якаўлевіч, яфр., загінуў 28.6.1944.

АРЭХАЎ Канстанцін Георгіевіч, жыў у Кастрычніцкім р-не Растоўскай вобл., мал. сярж., загінуў 28.6.1944.

АФАНАСЬЕЎ Фёдар Кірылавіч, н. ў 1894, яфр., загінуў 27.6.1944.

АШЧАКОЎ Ілья Мацвеевіч, рад., загінуў 28.6.1944.

БАЗЕНКА Нічыпар Акімавіч, н. ў 1919, жыў у в. Самахвалава Крымскай вобл., ст. лейт., загінуў 27.6.1944.

БАЙМАН Мікалай Іванавіч, лейт., загінуў 2.7.1944.

БАНДАРЭНКА Рыгор Назаравіч, н. ў 1915, жыў у с. Шабельнікі Чаркаскай вобл., рад., загінуў 27.6.1944.

БАНДУРКА Фёдар Трыфанавіч, н. ў 1901, жыў у с. Міхайлаўка Чаркаскай вобл., партызан, загінуў 19.3.1943.

БАНЕЕЎ І.І., н. ў 1920, ст. лейтэнант.

БАРАДЗЮЛЬКІН Сяргей Паўлавіч, жыў у г. Барнаул, сярж., загінуў 2.7.1944.

БАТЫГІН Пётр Андрэевіч, жыў у г. Вышні Валачок Цвярской вобл., рад., загінуў 5.7.1944.

БАЎЛІН Мікалай Паўлавіч, лейт., загінуў 3.7.1944.

БАЎМАН Мікалай Іванавіч, лейт., загінуў у 1944.

БАХВАЛАЎ Пётр Андрэевіч, жыў у г. Выбарг, загінуў 27.6.1944.

БЕРАЖНОЙ Аляксандр Сямёнавіч, жыў у Варонежскай вобл., сярж., загінуў 27.6.1944.

БЕРАЗОЎСКІ Аляксей Піліпавіч, жыў у Слуцкім р-не Мінскай вобл., сярж., загінуў 28.6.1944.

БЕРАЧОЎ Барыс Якаўлевіч, н. ў 1915, мал. сярж., загінуў 2.6.1944.

БІСЕРАЎ Мухаметжан, жыў у Балашыхінскім р-не Маскоўскай вобл., мал. сярж., загінуў у 1944.

БЯЛОВІЧ Міхаіл Іванавіч, рад., загінуў 28.6.1944.

БЯЛЯЕЎ Іван Васілевіч, н. ў 1925, жыў у с. Урыцкае Ліпецкай вобл., сярж., загінуў 28.6.1944.

ВАКУЛЕНКА Васіль Іванавіч, рад., загінуў 2.7.1944.

ВЕНДЗІК Д.І., старшына.

ВЯДЗЕШЧАНКА Васіль Іванавіч, ст. сярж., загінуў 27.6.1944.

ГАЙНУТДЗІНАЎ Нурдзін Ахметавіч, н. ў 1925, жыў у г. Казань, загінуў 27.6.1944.

ГАЙТОЦІН Васіль Акімавіч, рад., загінуў 27.6.1945..

ГАЛАВАЙЦЮКОВА Марыя Арсеньцеўна, жыла ў г. Нара-Фамінск Маскоўскай вобл., партызанка, загінула 17.5.1942.

ГАПОНАЎ Уладзімір Ігнацьевіч, жыў у с. Кутанскае Сумскай вобл., рад., загінуў 27.6.1944.

ГАРАДАВЫ Пётр Фёдаравіч, н. ў 1914, ст. лейт., загінуў 27.6.1944.

ГАРАСІН Кузьма Мікалаевіч, жыў у с. Нікіценка Калужскай вобл., рад., загінуў 4.7.1944.

ГАРАСЮТА Пётр Іванавіч, рад., загінуў 25.6.1944.

ГЛАЗКОЎ Фама Іванавіч, жыў у г. Магоча Чыцінскай вобл., сярж., загінуў 27.6.1944.

ГЛАЗУНОЎ Іван Абрамавіч, мал. сярж., загінуў 27.6.1944.

ГРЫНШТОП Майсей Мендэлевіч, ст. лейт., загінуў 27.6.1944.

ГУДАШНІКАЎ Рыгор Іванавіч, жыў у с. Нячушава, Мардовія, сярж., загінуў 12.6.1944.

ГУТАРЧЫК Міхаіл Сцяпанавіч, жыў у г. Адэса, сярж., загінуў 27.6.1944.

ГУТНІК Леанід Лазаравіч, н. ў 1918, жыў у Кіеве, ст. сяржант, загінуў 27.6.1944.

ДАНКАЎЦОЎ Мацвей Іосіфавіч, рад., загінуў 28.7.1944.

ДЗЕЕЎ Іван Андрэевіч, рад., загінуў 28.6.1944.

ДЗЕРКІНБАЕЎ Гусейн, жыў у с. Цеплаключынка, Кіргізія, сярж., загінуў 27.6.1944.

ДЗІНЗБУРГ Барыс Мендэлевіч, жыў у г. Кемерава, рад., загінуў 27.6.1944.

ДЗЯДУК Трыфан Паўлавіч, н. ў 1908, жыў у с. Гетманаўка Адэскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

ДЗЯНІСАЎ Васіль Іванавіч, жыў у в. Дубкі Горкаўскай вобл., рад., загінуў 20.8.1944.

ЕРАФЕЕЎ Уладзімір Яфрэмавіч, жыў у г. Вышні Валачок Цвярской вобл., рад., загінуў 6.7.1944.

ЕЎДАКІМАЎ Васіль Васілевіч, жыў на ст. Беламечацкая Стаўрапольскага краю, мал. лейт., загінуў 27.7.1944.

ЖАНЕНКА Аляксандр Аляксандравіч, рад., загінуў 5.7.1944.

ЖУРБА Міхаіл Антонавіч, н. ў 1912, жыў у с. Аляксандраўка Архангельскай вобл., старш., загінуў 28.6.1944.

ЗАХАРАЎ Мікалай Дзмітрыевіч, рад., загінуў 28.6.1944.

ЗЕЛЯНКОЎСКІ Уладзімір Фядосавіч, партызан, загінуў 3.9.1943.

ЗОНАЎ Т.М., лейтэнант.

ЗУЕЎ Мікалай Паўлавіч, яфр., загінуў 27.7.1944.

ЗЫБАРАЎ Дзмітрый Іванавіч, жыў у Беразоўскім сельсавеце Новасібірскай вобл., рад., загінуў 27.6.1944.

ІВАНОЎ Аляксей Сцяпанавіч, рад., загінуў 5.7.1944.

ІВАНЧАНКАЎ Міхаіл Дзянісавіч, сярж., загінуў 5.7.1944.

ІЛІМІСАЎ Кужан, жыў у пас. Карпаўка Арэнбургскай вобл., рад., загінуў 3.11.1944.

ІСЦІФІН Міхаіл Рыгоравіч, н. ў 1925, ст. сярж., загінуў 20.6.1944.

КАЗАНЦАЎ Пётр, мал. лейт., загінуў 28.6.1944.

КАЗІМІРАЎ Міхаіл Гаўрылавіч, жыў у г. Тула, кап., загінуў 2.7.1944.

КАЛЯЕЎ Пётр Трафімавіч, жыў у г. Тула, ст. сярж., загінуў 27.6.1944.

КАМАКАНАЎ Яўген Іванавіч, лейт., загінуў 27.6.1944.

КАНАВАЛАЎ Васіль Данілавіч, жыў у с. В. Рагазянка Харкаўскай вобл., старш., загінуў 27.6.1944.

КАНАТАПАЎ Ягор Іванавіч, рад., загінуў 27.6.1944.

КАНВІСАРАЎ Васіль Якаўлевіч, рад., загінуў 27.6.1944.

КАПЫТАЎ Аляксандр Міхайлавіч, рад., загінуў 28.6.1944.

КАРДАКОЎ Дзмітрый Міхайлавіч, н. ў 1915, жыў у в. Н. Карадовы Кіраўскай вобл., мал. сярж., загінуў 19.2.1944.

КАРМАЦКІ Уладзімір Саватлевіч, жыў у г. Омск, рад., загінуў 28.6.1944.

КАРНІЛАЎ Ягор Міхайлавіч, жыў у в. Снапучына Цвярской вобл., рад., загінуў 27.6.1944.

КАРПАЎ Карней Іванавіч, жыў у с. Кабанаўка Куйбышаўскай вобл., старш., загінуў 27.6.1944.

КАРПАЎ Серафім Цімафеевіч, н. ў 1912 у Хараўскім р-не Валагодскай вобл., яфр., загінуў 28.6.1944.

КАСІМАЎ Хасан, рад., загінуў 30.6.1944.

КАЎТУН Іларыён Навумавіч, н. ў 1903, жыў у в. Касоўка Кіраваградскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

КАЦЯНКО Мікалай Макаравіч, н. ў 1923, жыў у с. М. Істарон Сумскай вобл., рад., загінуў 27.6.1944.

КАЦЯНОЎ Дзмітрый Андрэевіч, рад., загінуў 28.6.1944.

КАШКАРАЎ Іван Якаўлевіч, н. ў 1906, жыў у с. Усць-Кемь Краснаярскага краю, рад., загінуў 29.6.1944.

КОНАНАЎ Барыс Аляксандравіч, жыў у г. Зяленадольск, Татарыя, рад., загінуў 27.6.1944.

КОСЦІН Аляксей Гаўрылавіч, жыў у г. Курск, рад., загінуў 28.6.1944.

КРЫВАШЭІН Аляксандр Іларыёнавіч, н. ў 1918, жыў у с. Крывашэнскае Томскай вобл., ст. сярж., загінуў 27.6.1944.

КУВАЛДЗІН Віктар Міхайлавіч, н. ў 1925, жыў у в. Катаева Чэлябінскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

КУГУМАЎ Міхаіл Кабулавіч, н. ў 1922, жыў у в. Кзык-Шарк, Узбекістан, рад., загінуў 27.6.1944.

КУЛЕШ Ілья Мацвеевіч, жыў у г. Луганск, рад., загінуў 27.6.1944.

КУНІН Міхаіл Іванавіч, жыў у в. Ілова Тамбоўскай вобл., мал. сярж., загінуў 27.6.1944.

КУРЭНКА Дзмітрый Ціханавіч, жыў у г. Бутурлінаўка Варонежскай вобл., рад., загінуў 29.6.1944.

КУЧКОЎСКІ П.Х., мал. лейт., загінуў 27.6.1944.

ЛАПКІН Ілья Сцяпанавіч, н. ў 1904, жыў у в. Ярцава Уладзімірскай вобл., рад., загінуў 1.7.1944.

ЛОСЕЎ Міхаіл Герасімавіч, жыў у в. Краснае Смаленскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

ЛЯШЧОЎ Іосіф Сямёнавіч, жыў у в. Саніна Ніжагародскай вобл., сярж., загінуў 27.6.1944.

МАЗУРЫН Васіль Анісімавіч, рад., загінуў 2.7.1944.

МАКЕЕЎ Аляксандр Рыгоравіч, яфр., загінуў 4.7.1944.

МАКРУШЫН Валянцін Андрэевіч, жыў у Алтайскім краі, яфр., загінуў 28.6.1944.

МАКСІМАЎ Е.Т., жыў у г. Нальчык Кабардзіна-Балкарыя, загінуў 28.6.1944.

МАРКАЎ Іван Васілевіч, жыў у в. Чусава Тульскай вобл., рад., загінуў 6.7.1944.

МАРКЕЛАЎ І.Г., лейтэнант.

МАРФЕНКАЎ Дзмітрый Кірылавіч, н. ў 1905, жыў на ст. Міхайлаўка Курскай вобл., рад., загінуў 5.7.1944.

МАРЧАНКА Фядосій Апанасавіч, рад., загінуў 28.6.1944.

МАСЛЕНІКАЎ Іван Барысавіч, жыў у г. Смаленск, партызан, загінуў 5.7.1944.

МАЦКЕВІЧ Зіновій Сцяпанавіч, сярж., загінуў 29.6.1944.

МАШЧЫЛЬ Міхаіл Захаравіч, жыў у с. Кірыяка Палтаўскай вобл., рад., загінуў 27.6.1944.

МЕЛЬНІКАЎ Іван Нічыпаравіч, жыў у в. Лабанава Смаленскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

МЕЛЬНІЧЭНКА Іван Мітрафанавіч, жыў у с. Байтапы Адэскай вобл., ст. лейт., загінуў 27.6.1944.

МІЛЬЦЫН Аляксей Фёдаравіч, ст. сярж., загінуў 28.6.1944.

МІНАКОЎ Іван Піліпавіч, жыў у Пачынкаўскім р-не Смаленскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

МІЦКЕВІЧ Міхаіл Іосіфавіч.

МУХАПАД Васіль Апанасавіч, н. ў 1920, жыў у в. Варажба Сумскай вобл., старш., загінуў 28.6.1944.

НАРЫЦЫН Пётр Паўлавіч, н. ў 1917, жыў у г. Дабранка Пермскай вобл., рад., загінуў 18.6.1944.

НАСКОЎ, мал. сярж., загінуў 28.6.1944.

НІКАЛАЕЎ Аляксей Іванавіч, рад., загінуў 16.2.1942.

НІКАЛАЕЎ Міхаіл Платонавіч, лейт., загінуў 30.6.1944.

ПАКУШКОЎ Анатоль Іванавіч, ст. сярж., загінуў 28.6.1944.

ПАХІЛЫ Мікалай Калінікавіч, рад., загінуў 27.6.1944.

ПАЎЛЕНКА Барыс Савельевіч, н. ў 1919, жыў у Кіеве, сярж., загінуў 28.6.1944.

ПАХОМАЎ Фёдар Сцяпанавіч, жыў у в. Навабранка Краснадарскага краю, рад., загінуў 28.6.1944.

ПРОХАРАЎ Васіль Іванавіч, жыў у г. Астрахань, рад., загінуў 29.6.1944.

ПУЛІН Мікалай Іванавіч, рад., загінуў 27.6.1944.

ПУХ Іван Пятровіч, жыў у пас. Варва Чарнігаўскай вобл., рад., загінуў 30.6.1944.

ПЯТРОЎ Васіль Аляксеевіч, жыў у г. Шадрынск Курганскай вобл., сярж., загінуў 28.6.1944.

РАВЯНЧУК Апанас Захаравіч, н. ў 1911, жыў у с. Нікаліна-Балка Стаўрапольскага краю, рад., загінуў 28.6.1944.

РАЖНОЎ Міхаіл Аляксандравіч, жыў у в. Раніна Тамбоўскай вобл., сярж., загінуў 2.7.1944.

РАЗІНКІН Дзмітрый Мікалаевіч, н. ў 1913, жыў у г. Новасібірск, рад., загінуў 3.7.1944.

РАПРАНЦОЎ Іван Аляксандравіч, жыў у Арзамаскім р-не Горкаўскай вобл., сярж., загінуў 28.6.1944.

САВЕЛЬЕЎ Рытор Іванавіч, н. ў 1920, жыў у с. Каравіна Тамбоўскай вобл., сярж., загінуў 5.7.1944.

САВІН Васіль Васілевіч, н. ў 1923, загінуў 28.6.1944.

САМАДУРАЎ Іван Андрэевіч, жыў у с. Гняздзінава Арлоўскай вобл., лейт., загінуў 28.6.1944.

САМІЧУЛІН Махмут Самучулавіч, н. ў 1906, ст. лейт., загінуў 28.6.1944.

СІЛАЕЎ Дзмітрый Андрэевіч, н. ў 1912, жыў у с. Шалепішна Разанскай вобл., лейт., загінуў 27.6.1944.

СІМАЕЎ Васіль Гардзеевіч, н. ў 1925, жыў у с. Старая Сеня Пензенскай вобл., рад., загінуў 8.7.1944.

СКРЫПНІК Сцяпан Сцяпанавіч, н. ў 1915, жыў у Светлаводскім р-не Кіраваградскай вобл., загінуў 27.6.1944.

СМІРНОЎ, ст. лейт., загінуў у 1944.

СМІРНОЎ Пётр Іванавіч, старш., загінуў 5.7.1944.

СМІРНОЎ Фёдар Аляксандравіч, жыў у в. Чарнякова Іванаўскай вобл., сярж., загінуў 27.6.1944.

СНІТКО Сяргей Цімафеевіч, жыў у с. Абаканава Валагодскай вобл., сярж., загінуў 29.6.1944.

СОКАЛАЎ Георгій Паўлавіч, жыў у Рыбінскім р-не Яраслаўскай вобл., мал. сярж., загінуў 28.6.1944.

СУМАРАЎ Уладзімір Георгіевіч, жыў у г. Кальчугіна Уладзімірскай вобл., сярж., загінуў 28.6.1944.

ТАРАСАЎ Васіль Васілевіч, жыў у с. Шапкіна Ніжагародскай вобл., старш., загінуў 28.6.1944.

ТАТАРЫНЦАЎ Мікалай Сцяпанавіч, жыў у с. Перлаўка Варонежскай вобл., ст. сярж., загінуў 27.6.1944.

ТАТУЛЬЯН Нерсес Мартырасавіч, н. ў 1925, жыў у с. Хндзорут, Арменія, радавы.

ТРАСКОЎ Іван Сяргеевіч, жыў у в. Федзікістава Кіраўскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

ТЫЧЫН Васіль Рыгоравіч, жыў у с. Зацэпіна Варонежскай вобл., рад., загінуў 27.6.1944.

УЛАСАЎ Віктар Паўлавіч, н. ў 1925, жыў у с. Лучынскае Маскоўскай вобл., сярж., загінуў 5.7.1944.

УТКІН, капітан.

ФАДЗЕЕЎ Аляксандр Фёдаравіч, мал. лейт., загінуў.

ФАЙЗУЛІН Васіль Галікбаравіч, н. ў 1910, жыў у Ніжнеудзінскім р-не Іркуцкай вобл., старш., загінуў 20.6.1944.

ФАМІН Васіль Сямёнавіч, ст. лейт., загінуў 5.7.1944.

ФЁДАРАЎ Мікалай Мікалаевіч, жыў у в. Феўраль, Татарыя, рад., загінуў 27.6.1944.

ХАМУЛІН Мінула Хабібулавіч, жыў у в. Чуюнты, Башкірыя, старш., загінуў 27.6.1944.

ЦЕМЧАНКА Рытор Дзямідавіч, жыў у с. Чарнабаева Чаркаскай вобл., мал. лейт., загінуў 28.6.1944.

ЦІКАЛАЎ Рытор Мацвеевіч, жыў у Ліпецкай вобл., рад., загінуў 25.6.1944.

ЦІМАФЕЕЎ Сямён Цімафеевіч, н. ў 1907, лейт., загінуў 28.6.1944.

ЦЫДЫЛАЎ Дундук, ст. сярж., загінуў 30.6.1944.

ЦЮБЕКАЎ Дзмітрый Аляксеевіч, рад., загінуў 30.6.1944.

ЦЮРЫН Васіль Васілевіч, жыў у г. Багамолаў Краснадарскага краю, сярж., загінуў 7.9.1944.

ЧАБАТАРОЎ Васіль Міхайлавіч, н. ў в. Гаўрылаўка Рузаеўскага р-на Какчэтаўскай вобл., загінуў у жніўні 1944, ГСС.

ЧАНЦОЎ Піліп Міхайлавіч, н. ў 1903, жыў у в. Зырылаўка Цюменскай вобл., рад., загінуў 29.6.1944.

ЧАПЧУГАЎ Павел Мацвеевіч, жыў у г. Бярозаўскі Свярдлоўскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

ЧАЧАВІЧКІН Пётр Мікалаевіч, жыў у г. Каршы, Узбекістан, рад., загінуў 28.6.1944.

ЧЭРНІКАЎ Іван Фёдаравіч, н. ў 1925, жыў у г. Тарэз Данецкай вобл., загінуў 28.6.1944.

ШАКАЛАЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1907, жыў у с. Азеркі Белгародскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

ШАПАВАЛАЎ Фёдар Міхайлавіч, н. ў 1903, жыў у с. Рапяхоўка Белгародскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

ШАПУЛА Пётр Феафанавіч, жыў у в. Сакалоўка Новасібірскай вобл., яфр., загінуў 28.6.1944.

ШАРЭР Навум Рыгоравіч, н. ў 1926, яфр., загінуў 30.6.1944.

ШВЕДАЎ Канстанцін Патапавіч, жыў у в. Чартоўшчына Смаленскай вобл., рад., загінуў 28.6.1944.

Помнік В.М.Чабатарову ў г.п. Бобр.

І.І.Шыцікаў.

М.М.Фацееў.

ШЧАРБЕНКА Ф.М., сярж., загінуў 27.6.1944.

ШЧУЦКАЯ М.М., партызанка, загінула 27.6.1944.

ШЫПІЦЫН Ягор Несцеравіч, рад., загінуў 5.6.1944.

ШЫЦІКАЎ Іван Іванавіч, ст. лейт., загінуў 27.6.1944.

ШЫШКАРОЎ Іван Васілевіч, жыў у пас. Арлоўка Сяміпалацінскай вобл., сярж., загінуў 29.7.1944.

ЯКАЎЛЕЎ Віталь Іванавіч, жыў у в. Кацельніцы Кастрамской вобл., загінуў 29.7.1944.

ЯРМОЛЬЧАНКА Васіль Самуілавіч, н. ў 1919, загінуў 7.7.1944.

ЯРОМІН Ягор Аляксеевіч, жыў у с. Падгорнае Арэнбургскай вобл., рад., загінуў 27.7.1944.

ЯШУХІН Міхаіл Якаўлевіч, жыў на ст. Салтыкова Маскоўскай вобл., сярж., загінуў 27.6.1944.

ВЫДРЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЫДРЫЦА

ІВАНОЎ Мікіта Захаравіч, мал. сярж., загінуў 23.2.1944.

КАЛПАКОЎ А., афіцэр.

ВЁСКА ПРУДОК

АЗОЛ Юрый, дэсантнік, загінуў 13.10.1942, пахаваны ў Маскве.

ДАКУДАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДАКУДАВА

ФАЦЕЕЎ Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1914, капітан, загінуў у 1941.

ІМЯ ЛЁТЧЫКА СТАЛА ВЯДОМА

зптд (иптд) — знішчальны процітанкавы дывізіён
зсп — запасны стралковы полк
ісб — інжынерна-сапёрны батальён
кбр — кавалерыйская брыгада
кд — кавалерыйская дывізія
кп — кавалерыйскі полк
мбр — механізаваная брыгада
медсб — медыка-санітарны батальён
мінб — мінамётная батарэя
мінбр — мінамётная брыгада
мінп — мінамётны полк
мк — механізаваны корпус
мсб — мотастралковы батальён
мсбр — мотастралковая брыгада
мсд — мотастралковая дывізія
мсп — мотастралковы полк
панбр — пантонная брыгада
ПВА — процівавіяцыйная абарона
рр — разведвальная рота
рсп — рэзервны стралковы полк
сап — самаходны артылерыйскі полк
сб — стралковы батальён
сбр — стралковая брыгада
сд — стралковая дывізія
ск — стралковы корпус
сп — стралковы полк
тб — танкавы батальён
тбр — танкавая брыгада
тп — танкавы полк
тпп — танкавы полк прарыву
тбап — транспартна-бамбардзіровачны авіяцыйны полк
чбр — чыгуначная брыгада

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

ПАСЛЯ ВЫЗВАЛЕННЯ АЙЧЫНЫ

За тры гады акупацыі ў раёне было спалена 27 вёсак, 1,6 тыс. дамоў калгаснікаў, больш за 1 тыс. грамадскіх будынкаў, школ, бальніц, разбураны будынкі машынна-трактарных станцый, знішчаны сельскагаспадарчы інвентар і машыны. Больш за 70% жывёлы было вывезена ў Германію. Напалову скараціліся пасевы збожжавых, удвая — бульбы, у 8 разоў — ільну, цалкам былі знішчаны пасевы кармавых траў, палі параслі хмызняком, знішчаны ўсе прадпрыемствы, а абсталяванне вывезена. Самыя цяжкія страты — людскія. Загінуў кожны трэці жыхар раёна, 2158 чалавек вывезена ў Германію, з іх вярнулася 1837.

Згодна са звесткамі камісіі па расследаванні злачынстваў фашысцкіх захопнікаў, якая працавала адразу пасля вайны, толькі ў Крупскім раёне, не лічачы сельсаветаў, якія ўваходзілі ў Халопеніцкі раён, былі расстраляны 3252 мірныя жыхары, у тым ліку 1243 жанчыны, 340 дзяцей, павешана 9 чалавек, спалена жывымі 270 чалавек, у тым ліку 82 жанчыны, 23 дзіцяці. Асабліва пацярпелі Абчугскі, Выдрыцкі, Сакаловіцкі, Стараславодскі, Ухвальскі, Шынкоўскі сельсаветы. Нягледзячы на цяжкасці і нягоды ваеннага часу ўжо ўвосень 1944 г. раён нядрэнна справіўся з уборкай ураджаю і здаў дзяржаве 561 т. збожжа, выканаў іншыя віды дзяржпаставак.

Да вясны 1945 г. былі адноўлены 113 калгасаў і 15 сельсаветаў, 2 МТС (Крупская і Ігрушаўская). У першы пасляваенны год 15 чалавек закончылі курсы падрыхтоўкі трактарыстаў, брыгадзіраў і камбайнераў пры МТС, бо ад працы механізатараў у многім залежала развіццё ўсіх галін вытворчасці. Веснавую сяўбу гаспадаркі імкнуліся правесці як мага лепш, але 23 трактары былі не ў стане абслужыць усе калгасы, таму аралі на конях, каровах і ўручную. Толькі 28 калгасаў раёна закончылі працу з добрымі паказчыкамі. Калгасы «Май», імя Стаханава, «Чырвоны Бобр», «Ленінец» і іншыя атрымалі сярэдні ўраджай па 8 ц збожжавых з гектара і выдалі сялянам па 2 кг збожжа і па 4 кг бульбы на працадзень. Большасць калгасаў атрымала нізкі ўраджай: ячменю і аўса 1,5 ц з гектара, бульбы — 1,5—3 т. Калгаснікам прыходзілася разлічваць толькі на ўраджай з прысядзібных участкаў. Неўраджаю спрыяла неўрадлівая глеба, значную плошчу якой займалі забалочаныя землі. Не хапала і працаздольных работнікаў: на вясну 1946 г. у раёне налічвалася 2761 працаздольны мужчына, 6602 жанчыны і 2685 падлеткаў.

Першыя пасляваенныя гады для працаўнікоў раёна былі вельмі цяжкімі. Абавязковымі былі пастаўкі дзяржаве збожжа, бульбы, мяса, малака. Акрамя таго, прыходзілася многа будаваць. У раёне на 1 жніўня 1946 г. 1582 сям'і не мелі жылля. Цяжка было з адзеннем і абуткам.

У 1947 г. 34 калгасы раёна лічыліся эканамічна слабымі, і, нягледзячы на тое, што яны атрымлівалі дапамогу дзяржавы жывёлай, насеннем і грашыма, іх становішча не паляпшалася. Многія спадзяваліся на тое, што напружанай працаї можна будзе ўсё аднавіць, і працавалі самаа дана. Хоць ураджаі былі вельмі нізкія, усё ж па абавязковых пастаўках збожжа і бульбы раён датэрмінова разлічыўся з дзяржавай.

Да 1948 г. жыхары змаглі пераехаць у новыя дамы. Для тых, хто жыў у зямлянках, было пабудавана 208 дамоў і 1330 для тых, хто жыў у часовых збудаваннях і на падсяленні.

Напружаная праца дапамагла ў кароткі час аднавіць усе 36 прадпрыемстваў мясцовай

прамысловасці. Адным з першых аднавіў работу скураны завод. За першыя 6 месяцаў работы было апрацавана 2 тысячы авечых скур, якія пайшлі на забеспячэнне зімовым адзеннем насельніцтва раёна. У 1946 г. завод выпрабляў падклейкі і скурамяць для патрэб мясцовай прамысловасці і калгасаў. Была таксама асвоена вытворчасць палувада і падэшваў. Толькі за 1-ы квартал 1946 г. завод даў мясцовай прамысловасці 950 высакаякасна апрацаваных скур замест планавых 860. Лепшымі рабочымі былі А. Кароткін і М. Бужынская.

У 1947 г. пачалі працаваць спіртзавод саюзнага значэння магутнасцю 30 тысяч дэкалітраў у год, лесазавод рэспубліканскага значэння магутнасцю 35 тыс. м^3 піламатэрыялаў (абодва ў г. п. Бобр), райпрамкамбінат. Апошні выпрабляў скабяныя вырабы, сякеры, цэглу, ганчарны посуд, будаўнічыя дэталі, сані, мэблю, безалкагольныя напоі і іншае. Усяго ў 1946 г. выраблена прадукцыі на 827 733 руб. Былі адноўлены арцелі: шавецкая ў г. п. Крупкі, дрэваапрацоўчая «Ударнік» у г. п. Бобр, інвалідная «14 Кастрычніка», «Чырвоная Зара» «Пішчавік» у в. Крупкі і іншыя. Яны выраблялі ганчарны посуд, швейныя вырабы, шкіпінар, бочкі, квас, варэнне, пячэнне і г. д. У 1948 г. аб'ём прамысловай вытворчасці ў раёне пераўзышоў даваенны ўзровень.

Гандлёвая сетка раёна складалася з 6 сельпо, 25 магазінаў, 2 камерцыйных чайных, 6 ларкоў па продажы напояў і г.д. Грашовае абарачэнне ўсіх гэтых кропак у раёне ў 1946 г. склала прыкладна 750 тыс. рублёў у месяц.

У 1946 быў адноўлены радыёвузел, тэлефонна-тэлеграфная станцыя на 120 тэлефонных нумароў. Былі таксама адноўлены электрастанцыі ў Крупках і Бабры, у в. Ухвала. Пачала выдавацца раённая газета «Голас калгасніка» тыражом 1000 экзэмпляраў.

Пасля вайны засталося шмат дзяцей без бацькоў. У Крупках і Бабры былі адчынены дзіцячыя дамы, дзе знайшлі прытулак 100 дзяцей ва ўзросце ад 2 да 14 гадоў. У сваіх дапаможных гаспадарках дзеці на чале з настаўнікамі вырошчвалі бульбу, агародніну, сеялі ячмень. Ім дапамагалі, як маглі, мясцовыя жыхары. Усяго на 27.9.1944 г. ў раёне налічвалася каля 350 дзяцей-сірот.

У цяжкім становішчы знаходзілася і народная адукацыя. Сіламі мясцовых жыхароў і настаўнікаў у вёсках ужо ў жніўні 1944 г. пад школы прыстасавалі 68 будынкаў і адрамантавалі 64 з іх. На 1944 г. у раёне было 6184 дзіцяці школьнага ўзросту (да вайны было 9148), 207 настаўнікаў (да вайны 323). Нягледзячы на недахоп школьнай мэблі, падручнікаў, паперы і ўсяго неабходнага для нармальнага навучальнага працэсу, восенню пачаліся заняткі. Але не ўсе змаглі іх наведваць з-за адсутнасці вопраткі і абутку, дзеці часта хварэлі. Па гэтых прычынах у 1945/46 навучальным годзе школу пакінулі 210 дзяцей. Такім дзецям выдаваліся абутак, адзенне, грашовая дапамога, але яна была вельмі нязначная. Школе часта дапамагалі самі вучні, асабліва старэйшых класаў: рабілі наглядны матэрыял для малодшых класаў, нарыхтоўвалі паліва для школ. У 1945/46 навучальным годзе ў раёне працавала 70 школ: 2 сярэднія, 11 няпоўных сярэдніх, 57 пачатковых. У іх навучалася каля 8500 чал. Заняткі праводзілі 314 настаўнікаў, многія з якіх вярнуліся з арміі або з эвакуацыі, самі жылі ў цяжкіх умовах, не мелі жылля, сродкаў для існавання. Для падтрымкі матэрыяльнага становішча школ, вучняў і настаўнікаў з нелімітных сродкаў раёна было выдзелена 50 тыс. руб.

Да 1947 г. былі ў асноўным адноўлены ўстановы сферы культурнага і гандлёвага абслугоўвання. У гэты час ужо працавалі 41 крама, 20 клубаў, хат-чытальняў, ва ўсіх калгасах былі невялікія бібліятэкі.

У 1946 г. Савет Міністраў СССР прыняў пастанову, паводле якой у мэтах прыцягнення сродкаў насельніцтва да выканання пяцігадовага плана аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі, павышэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа і далейшага ўмацавання ваенна-эканамічнай магут-

І.Р.Мікульчык на полі ў час вясенніх палявых работ. 1953 г.

насці краіны выпускалася пазыка на 200 млрд. рублёў тэрмінам на 20 гадоў. Запланаваная сума падпіскі па Крупскім раёне склала 165 000 рублёў. Яна была выканана на 103%. Праз год, 4.5.1947 г., была выпушчана другая пазыка аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР, а ў 1951 г. — дзяржпазыка развіцця народнай гаспадаркі СССР. Па раёне заданне складала 1 545 000 рублёў.

У 1947 г. раён займаў тэрыторыю 14 884 км^2. У ім налічвалася 168 населеных пунктаў з насельніцтвам 35 574 чал., шчыльнасць якога складала 24 чалавекі на 1 км^2.

Паступова аднаўлялася сістэма аховы здароўя. За час акупацыі былі знішчаны раённая аптэка з усім абсталяваннем, Абчугская бальніца і аптэка, Выдрыцкі фельчарска-акушэрскі пункт і інш. Большасць медработнікаў раёна была расстраляна або вывезена ў Германію. 22.1.1946 г. на пасяджэнні Крупскага РК КП(б)Б адзначалася, што «ўвесь раён уяўляў сабой інфекцыйнае вогнішча, асабліва шмат выпадкаў сыпнога тыфу было ў Стараслабодскім, Ухвальскім і Шынкоўскім сельсаветах». У 1945 г. былі адноўлена райбальніца ў Крупках на 60 ложкаў з інфекцыйным, тэрапеўтычным, хірургічным і акушэрска-гінекалагічным аддзяленнямі, санэпідэмстанцыя. Былі адноўлены сельскія бальніцы ў мяст. Абчуга, у вёсках Ухвала і Ігрушка, 12 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. У 1946 г. у раёне працавала 16 урачоў, 98 чалавек сярэдняга і 76 малодшага медперсаналу. Акрамя таго, у 1945 г. пачалі працаваць Крупская райамбулаторыя з прапускной здольнасцю 2,5 тыс. чал. за год, раённая дзіцячая кансультацыя, малочная кухня. Была арганізавана дапамога парадзіхам. У ліпені 1944 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР выдаў Указ «Пра павелічэнне дзяржаўнай дапамогі цяжарным жанчынам, шматдзетным і адзінокім маці, узмацненне аховы мацярынства і дзяцінства, пра ўстанаўленне ганаровага звання «Маці-гераіня» і заснаванне ордэна «Мацярынская слава» і медаля «Медаль мацярынства». Паводле Указа дзяржаўная дапамога выдавалася шматдзетнай маці пры нараджэнні трэцяга і кожнага наступнага дзіцяці, замест ранейшага парадку, калі дапамогу атрымлівалі маці пры нараджэнні сёмага і наступных дзяцей. Дапамога выплочвалася з пачатку другога году ад нараджэння дзіцяці і да дасягнення ім 5-гадовага ўзросту. З дня выхаду гэтага Указа да 1 ліпеня 1946 г. 714 шматдзетным і 1 адзінокай маці была выплачана дапамога на суму 1 407 066 руб. Напярэдадні 1946 былі ўзнагароджаны 32 жанчыны, з якіх ордэнам «Мацярынская слава» (маці, што нарадзілі 7, 8 і 9 дзяцей) I ступені — 3, II — 18 і III — 7, медалямі «Медаль мацярынства» (што нарадзілі і выхавалі 5 і 6 дзяцей) I ступені — 2, II — 1. Адной маці было прысвоена званне «Маці-гераіня» (за нараджэнне і выхаванне 10 дзяцей). Але работа па прадстаўленні да такіх узнагарод у раёне вялася дрэнна. У выніку з улічаных 543 многадзетных маці атрымалі адзнакі 32 і прадстаўлены былі 69 жанчын.

У жніўні 1944 г. пачаў працаваць аддзел па дзяржаўным забеспячэнні і бытавым уладкаванні сем'яў ваеннаслужачых і былых партызан. На ўліку было 4798 такіх сем'яў, 427 з іх атрымалі грашовую дапамогу ў памеры 1 741 961 руб., акрамя таго, 17 сем'ям выплачана 3,5 тыс. руб. з фонду пазабюджэтных сродкаў. У чэрвені 1945 г. быў праведзены месячнік па зборы сродкаў для аказання дапамогі такім сем'ям, у час якога было сабрана 7 551 руб. Акрамя грашовых дапамог сем'ям франтавікоў і партызан выдаваліся харчовыя пайкі і аказвалася іншая дапамога. Напрыклад, у 1945 г. 98 такім сем'ям было выдадзена 2 тыс. кг зерня, адрамантавана і прадастаўлена 242 кватэры, 260 сем'яў былі забяспечаны дровамі, многім бясплатна рамантаваўся абутак і інш. Пэўная дапамога жыхарам раёна была аказана з фонду Чырвонага Крыжа. Так, паводле некаторых звестак за 1945 г., з гэтага фонду было выдаткавана 5,5 т. зерня, 4,5 т. бульбы і іншых прадуктаў харчавання.

У 1945 г. пачаў работу аддзел сацыяльнага забеспячэння. Ён узяў на ўлік 316 інвалідаў вайны, з якіх 257 уладкаваў на работу. У 1945 г. інвалідам вайны і працы выплачана пенсій і дапамог на суму 974 276 руб.

Палявыя работы ў калгасе «Перамога». 1955 г.

Адначасова пасля Вялікай Айчыннай вайны разгарнулася ідэалагічная работа. У чэрвені 1945 г. працоўныя раёна напісалі пісьмо І.В. Сталіну з 10 200 подпісамі. На сходах калгаснікі ўзялі абавязацельствы хутчэй аднавіць разбураную гаспадарку, своечасова і якасна сабраць ураджай. Калгасніца з калгаса «Ударнік» Сакаловіцкага сельсавета Драздова ў сваім выступленні заявіла: «Я асабіста дзякую тав. Сталіну за тое, што пад яго мудрым кіраўніцтвам наша Чырвоная Армія вызваліла нас ад нямецка-фашысцкага рабства, што ён даў нам магчымасць шчасліва і радасна жыць». А калгасніца з калгаса імя Сталіна таго ж сельсавета М.І. Гармазінская на агульным сходзе ў сваім выступленні выказала падзяку Сталіну за тое, што ён даў свабоднае і шчаслівае жыццё, і заявіла: «... я буду яшчэ лепш працаваць у калгасе і ўсімі сіламі буду ўмацоўваць наш калгас».

Аднак былі і казусы. Некаторыя калгаснікі наогул адмаўляліся падпісваць пісьмо. Напрыклад, Наталля Горбель з калгаса «Новая Нача» заявіла, што «ў калгасе памруць ад голаду». І, вядома, гэтыя «варожыя выступленні» былі выяўлены на сходах і асуджаны.

Шырокая ідэалагічная работа разгарнулася ў 1946 г. і ў сувязі з выбарамі ў Вярхоўны Савет СССР. Гэта былі першыя пасляваенныя выбары. Паўнамоцтвы дэпутатаў Вярхоўнага Савета СССР, выбраных у 1937 г., у Вярхоўны Савет БССР у 1936 г., у мясцовыя Саветы БССР у 1939 г., паводле Канстытуцыі СССР 1946 г., даўно закончыліся. У іх складзе адбыліся істотныя змены: многія дэпутаты былі або рэпрэсіраваны, або загінулі ў час вайны, змянілі месца жыхарства і г. д. Так, напрыклад, у выканком Крупскага раённага Савета дэпутатаў працоўных у 1939 г. было выбрана 40 чалавек, у 1945 г. з іх засталося 6. З 400 дэпутатаў выканкомаў сельскіх і пасялковых Саветаў засталося толькі 99. Многія дэпутаты мясцовых Саветаў з'яўляліся актыўнымі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. Так, дэпутата райсавета Таццяну Славінскую некалькі разоў закідвалі ў тыл ворага, Ася Самуйлаўна Какіна была начальнікам санітарнай службы.

У студзені 1946 г. ў калгасах, на прадпрыемствах, ва ўстановах прайшлі агульныя сходы па вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты і дапамозе ў правядзенні выбарчай кампаніі. Так, 3.1.1946 г. адбыўся агульны сход рабочых і служачых Крупскага райспажыўсаюза. Яго дырэктар І.І. Пацына прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты тав. Сталіна і яго баявых саратнікаў. Кандыдатамі ў дэпутаты былі вылучаны таксама Герой Савецкага Саюза В.І. Казлоў, П.К. Панамарэнка. 4.1.1946 г. ў Барысаве была праведзена акруговая нарада па выбарах, дзе ад Крупскага раёна прысутнічалі 53 чалавекі. У дзень выбараў у раёне за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных прагаласавала 99,93% выбаршчыкаў.

Калгаснікі калгаса «Бальшавік». 1950-я гады.

З уздымам праходзілі ў 1947 г. выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы. Так, у аблсавет былі абраны Т.С. Радзюк — намеснік старшыні аблсавета дэпутатаў працоўных, Г.В. Пракашка — сакратар аблсавета дэпутатаў працоўных, В.К. Рабчынскі — старшыня Крупскага выканкома райсавета і З.Я. Шыран — хірург Крупскай райбальніцы. У райсавет дэпутатаў працоўных было выбрана 37 чалавек, з іх 11 жанчын.

У пачатку 1950-х гадоў гаспадарка раёна ў асноўным была адноўлена ў параўнанні з даваенным часам. Раён, як і ў перадваенныя гады, заставаўся сельскагаспадарчым з пераважным развіццём жывёлагадоўлі. Нягледзячы на тое, што ўзрасла ўраджайнасць збожжавых культур і бульбы і павялічылася колькасць буйной рагатай жывёлы, стан сельскай гаспадаркі да пачатку 1950-х г. быў яшчэ вельмі нізкім. Дробныя і маламоцныя калгасы прыносілі няшмат даходаў. У 1950 г. было праведзена ўзбуйненне калгасаў. У Крупскім раёне замест 116 засталося 3, у былым Халопеніцкім раёне з 130 — 38. У 1951 г. была ўтворана Залеская МТС, трэцяя па ліку ў раёне. Гэта крыху палепшыла матэрыяльна-тэхнічную аснову калгасаў, аднак стварыла новыя арганізацыйныя цяжкасці.

Нізкая аплата працадзён адмоўна адбілася на зацікаўленасці калгаснікаў у павышэнні прадукцыйнасці працы. У 1951 г. толькі нязначная частка калгасаў раёна на працадні акрамя хлеба выдавала грошы і іншыя прадукты. За 1951 дзяржаўны план абавязковых паставак калгасамі мяса быў выкананы на 73,7%, малака на 63,6%, з іх калгасамі — толькі на 52,7%, а індывідуальнымі гаспадаркамі — на 74,5%. Крыху вышэй былі паказчыкі па жывёлагадоўлі — выкананне плана па гэтай галіне склала 92%. У параўнанні з 1950 г. на 5,8% павялічылася пагалоўе буйной рагатай жывёлы, на 1,6% авечак і на 2,1% свіней. Лідэрамі-жывёлаводамі з'яўляліся А.П. Ляшкоў, Г. Шпакоўская, А. Кляшчонак, З. Кукіна, Н. Барысава і інш.

Некаторыя змены да лепшага ў эканамічным становішчы калгасаў прынёс вераснёўскі Пленум ЦК КПСС 1953 г., які прапанаваў скараціць падатковае абкладанне калгасаў, павысіць аплату працы калгаснікаў, шырэй ужываць у сельскай гаспадарцы прынцып матэрыяльнай зацікаўленасці. Гэтыя меры крыху ўзнялі здабыткі калгасаў, а павышэнне нарыхтоўчых цэн на лён выклікала пашырэнне плошчы яго пасеваў па гаспадарках. Лён стаў асноўнай культурай, якая ў гэтыя гады давала калгасам прыбытак. У 1953 г. даход калгаса імя Молатава Ігрушкаўскага сельсавета склаў 226 тыс. руб., у 1954 г. — больш за 1 млн. 300 тыс. руб., у тым ліку даход па лёну — 992 тыс. руб. У 1954 г. плошча пасеваў ільну па раёне павялічылася на 700 га, а ў 1955 г. даходы больш за 1 млн. руб. атрымалі калгасы імя Леніна, «Чырвоны Бобр», імя Молатава Ігрушкаўскага сельсавета, імя Молатава Ухвальскага сельсавета. Агульны даход калгасаў у параўнанні з 1954 г. павялічыўся ў 4,2 раза. У раёне з'явіліся свае майстры-льнаводы. У 1956 г. звяно Еўдакіі Бараноўскай атрымала больш за 7 ц ільнавалакна з гектара, а па выніках 1955 г. 8 лепшых ільнаводаў раёна з'яўляліся ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У іх ліку льноцерабільшчык Уладзімір Іосіфавіч Усошын, якому ў 1958 г. за выдатную працу было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Ён і ў далейшым не пакідаў цяжкую працу хлебароба. Праз 20 гадоў «Сельская газета» пісала пра яго: «Уладзімір Іосіфавіч Усошын — самы пажылы чалавек у Радзіцы, невялікай, але прыветлівай і светлай вёсачцы. Ён яшчэ ў раннім дзяцінстве зведаў смак і цану хлеба. Хлопчыкам пасвіў жывёлу. А калі ўпершыню пабачыў трактар, загарэўся вывучыцца на механізатара. І стаў ім».

Усошын адным з першых сеў за баранку

Падрыхтоўка глебы ў калгасе «Камінтэрн». 1955 г

універсала. Вясной і летам араў зямлю, а калі паспяваў лён, выводзіў у поле льноцерабілку, выбіраў да 6 га лёну. Акрамя У.І. Усошына ў гэты час за дасягнутыя поспехі ў працы 28 працаўнікоў сельскай гаспадаркі раёна былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

У сярэдзіне 50-х гадоў назіраўся некаторы рост вытворчасці сельскагаспадарчых культур, умацоўвалася матэрыяльная база калгасаў і саўгасаў. За тры гады (1953—56) іх грашовы даход павялічыўся ў 3 разы. Некалькі калгасаў раёна прынялі ўдзел ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве.

У 1957 г. МТС мелі 167 трактароў, або ў 2 разы болей, чым у 1940, 67 камбайнаў. Калі ў 1940 г. ў раёне налічвалася 19 аўтамашын, у тым ліку ў калгасах 7, то ў 1957 г. — 186, у тым ліку ў калгасах — 78. У 1958 была праведзена рэарганізацыя МТС. Яны былі ператвораны ў рамонтна-трактарныя станцыі, а тэхніка была перададзена ў калгасы.

Пэўных поспехаў у 1950-я гады дасягнула прамысловасць раёна, галоўным чынам за кошт экстэнсіўнага развіцця, гэта значыць, павелічэння колькасці прамысловых прадпрыемстваў. У 1950 г. было прынята рашэнне аб будаўніцтве льнозавода, у 1955 г. ён выдаў першую прадукцыю.

У 1950—55 гг. пачалі дзейнічаць таксама торфазавод у в. Ухвала, хлебазавод. Добрых паказчыкаў дасягнулі за гэтыя гады торфазавод «Плавучае Галое», Бобрскі спіртзавод, Бобрскі лесазавод, масласырзавод. Прамысловасць раёна датэрмінова выканала планы, намечаныя на 5-ю пяцігодку.

Дзяржава аказвала значную дапамогу школам. За 1948—50-я гады метадам народнай будоўлі ў раёне пабудавана 16 школ, зроблена 800 парт, 70 сталоў, 70 класных дошак, завезена звыш 4 тыс. м^3 паліва. У 1951 г. ў раёне працавалі 84 школы, у якіх навучалася 8276 дзяцей. Працавалі 440 настаўнікаў. Палепшылася забеспячэнне школ падручнікамі, якасць выкладання і паспяховасць вучняў. Працавалі таксама 3 дзіцячыя сады і 2 дзіцячыя дамы.

Развівалася сетка культурных устаноў. У 1952 г. працавалі 16 хат-чытальняў і клубаў, 5 сельскіх і 2 раённыя бібліятэкі. Шмат якія калгасы таксама мелі свае бібліятэкі. Нягледзячы на нялёгкае жыццё, у вольны час у гэтых установах збіраліся тыя, хто любіў песні, музыку, роднае беларускае слова. У аглядзе мастацкай самадзейнасці, які адбыўся ў маі 1953 г., прынялі ўдзел больш за 200 выканаўцаў розных жанраў. Багацце народных талентаў праявілася ў выступленнях самадзейных артыстаў. Газета «Голас калгасніка» 21 мая 1953 г. пісала пра выступленні Тэклі Грыгаровіч — рахункавода калгаса «Перамога» Пліскага сельсавета, Надзеі і Любы Сакавец, Марыі Прысь, Кацярыны Дударэнка з калгаса імя Кірава Выдрыцкага сельсавета і іншых маладых выканаўцаў.

Пашыраўся кніжны фонд бібліятэк, пачыналася радыёфікацыя вёскі. У лютым 1954 г. было радыёфікавана 5 калгасаў (1264 радыёкропкі), працавалі таксама 11 кінаперасовак. У 1955 быў уведзены ў эксплуатацыю кінатэатр у Крупках.

Паколькі яшчэ не кожная сям'я мела магчымасць выпісваць газеты, ды і слухаць радыё, сяляне ахвотна ішлі ў клуб ці ў хату-чытальню. Некаторыя з гэтых устаноў працавалі вельмі актыўна, у тым ліку Пліская і Стараслабодская хаты-чытальні, Бобрскі сельскі клуб, Крупская сельская бібліятэка.

У 2-й палове 50-х гадоў прадаўжалася актыўнае будаўніцтва аб'ектаў сацыяльна-бытавой сферы. Было закончана будаўніцтва двухпавярховага памяшкання сярэдняй школы на станцыі Крупкі, сямігадовай школы ў

Свінарка калгаса імя Леніна В. Драніца ў час працы на ферме. 1956 г.



Танцавальны калектыў калгаса імя Кірава.

в. Старая Слабада, сельскіх клубаў у в. Выдрыца, калгасе імя Леніна, пабудаваны магазіны на станцыі Бобр, у вёсках Мачулішча, Ламское, Асінаўка, адкрыты ФАПы ў вёсках Гумны, Кляновічы, Дзянісавічы, пры Крупскім ільнозаводзе.

У райцэнтры былі пабудаваны памяшканні раймага, культмага, кніжнага магазіна, раённая паліклініка. За гады 6-й пяцігодкі пабудавана таксама 500 жылых дамоў.

У 1957 г. раённыя фізкультурныя арганізацыі занялі першае месца ў вобласці, а фізкультурнікі калгаса «Май» сталі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

За 1950-я гады поспехі былі дасягнуты ў ахове здароўя. Пашырылася сетка медыцынскіх устаноў. Працавалі Крупская райбальніца на 100 ложкаў, Халопеніцкая бальніца на 100 ложкаў, а таксама Ухвальская, Бобрская, Абчугская, Дубаўская, Ігрушкаўская бальніцы, станцыя хуткай медыцынскай дапамогі, 19 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. У 1960 г. ў раёне працавалі 65 урачоў, 190 чал. сярэдняга медперсаналу, 130 чал. малодшага медперсаналу.

Такім чынам, у 1950-я гады ў жыцці раёна адбылося шмат розных падзей. Гэта быў у многім супярэчлівы, але і па-свойму цікавы час. Цікавы тым, што людзі ў большасці сваёй шчыра спадзяваліся, што наперадзе светлая будучыня, верылі Камуністычнай партыі, якая на XXI з'ездзе зрабіла выснову, што краіна ўступіла ў новы этап развіцця — этап разгорнутага будаўніцтва камунізму. І падставы для такой упэўненасці, здавалася, былі. У 2-й палове 1950-х гадоў адбыліся змены

На раённым свяце песні і танца. Крупкі. 1960-я гады.

ў лепшы бок ва ўсіх сферах жыцця савецкага грамадства. Менавіта ў гэты час дасягнуты поспехі ў навуцы: першы штучны спадарожнік Зямлі, першы атамны ледакол, развіццё атамнай энергетыкі. Пра гэта шмат пісалася і гаварылася, таму і лозунг «дагнаць і перагнаць ЗША па вытворчасці прадукцыі на душу насельніцтва» быў успрыняты працоўнымі як рэальная праграмная ўстаноўка. І не было, відаць, нічога дзіўнага ў тым, што ў такіх умовах нарадзіўся і шырока распаўсюдзіўся рух за камуністычную працу, які пазней сталі называць рухам за камуністычныя адносіны да працы. З'явіліся такія калектывы і ў Крупскім раёне. Напрыклад, у 1956 г. на льнозаводзе брыгада, якую ўзначальвала М.Г. Навахрост, атрымала званне калектыву камуністычнай працы. За такое званне змагаліся калектывы на Крупскім масласырзаводзе, Бобрскім лесазаводзе і інш. прадпрыемствах.

Але рух гэты, як і многае іншае, быў надуманым і не меў пад сабой аб'ектыўных падстаў, таму стаў выраджацца, набываў усё больш фармальны характар. Адначасова праводзіліся такія масавыя кампаніі, як паўсюдная сяўба кукурузы. З аднаго боку, гэта дазволіла ў некаторай ступені падняць кармавую базу, з другога — сяўба яе часта праводзілася за кошт скарачэння іншых, больш прыдатных для мясцовай глебы сельскагаспадарчых культур. *В.Г. Грыгор'ева.*

Дакументы сведчаць

ДАВЕДКА ПРА ДЗЕЙНАСЦЬ КРУПСКАГА РАЙВЫКАНКОМА ПА СТАНУ НА 1 КАСТРЫЧНІКА 1945 г.

С момента освобождения района от немецко-фашистских захватчиков проведена большая восстановительная работа. В районе восстановлено 15 сельсоветов, 117 колхозов, в колхозах восстановлено 97 ферм крупного рогатого скота с количеством 1580 голов, 100 ферм овец с количеством 1170 голов, 17 свиноферм с количеством 106 голов и 37 птицеферм, имеющих 1106 штук птицы.

Основное внимание в своей работе исполком уделял поднятию сельского хозяйства, в колхозах неплохо проведена уборка зерновых. Отстроено и восстановлено 755 домов.

В районе восстановлен райпромкомбинат, в составе которого работают 3 небольших электростанции, лесопильный завод, 6 мельниц, 6 разных цехов по выработке предметов ширпотреба для нужд населения, восстанавливают 2 кирпичных завода. Райпромкомбинат держит Республиканское переходящее Красное Знамя. Электроэнергией промкомбинат освещает дома колхозников колхоза им. Крупской, и ведутся подготовительные работы к освещению еще двух колхозов.

Кроме райпромкомбината в районе работают 2 лесопильные артели, швейная и сапожная артели и Бобрский лесозавод республиканского значения.

В район прибывают демобилизованные воины Красной Армии, из них 57 человек награждены орденами и медалями Союза ССР. По прибытии демобилизованных была организована встреча их, проведено ряд митингов и бесед.

10 октября будет проведено широкое районное совещание с участием председателей сельсоветов и колхозов, старших конюхов, животноводов по вопросу подготовки к зиме и сохранности скота.

Філіял Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў г. Барысаве, ф.6, воп.1, спр. 15, л.1.

ДАВЕДКА АБ ХОДЗЕ СЕЛЬСКАГА І КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА Ў КРУПСКІМ РАЁНЕ ЗА ЧАС З 1 ЖНІЎНЯ 1946 г. ДА 1 ЛЮТАГА 1948 г.

1. На 1 жніўня 1946 г. пражывала ў зямлянках — 208 сем'яў.
2. На 1 жніўня 1946 г. пражывала на падсяленні — 1031 сям'я.
3. На 1 жніўня 1946 г. пражывала ў часовым збудаванні — 343 сям'і.
4. Пабудавалі дамоў асобам, што пражывалі ў зямлянках — 208.
5. Пабудавалі дамоў асобам, што пражывалі на падсяленні — 1005.
6. Пабудавалі дамоў асобам, што пражывалі ў часовых збудаваннях — 325.
7. Пабудавана грамадскіх, культурна-бытавых і вытворчых будынкаў у калгасах за гэты час — 1780.
8. Выдадзена бясплатна лесаматэрыялу — 36 тыс. $м^3$.
9. Выдадзена шкла аконнага — 1780 $м^3$.

10. Выдадзена цвікоў розных — 4200 кг.
11. Выдадзена доўгатэрміновага крэдыту на будаўніцтва дамоў — 3,5 млн. рублёў.
12. Пабудавана сіламі будаўнічых брыгад раёна для Бягомля 100 дамоў асобам, што пражывалі ў зямлянках у парадку саццапамогі.

Заг. аддзела (подпіс неразборлівы)
Планавік Белякова

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 243, воп. 1, спр. 56, л. 5.

З МАТЭРЫЯЛАЎ 6-й СЕСІІ КРУПСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

4 ліпеня 1949 г.

Местная промышленность: гончарный цех промкомбината выпускает посуду, которая по качеству была одной из лучшей в области, часть ее отправлялась в магазины г. Москвы.

В районе работали артели: «3-я пятилетка» Обчугского сельсовета, «Ударник» Бобрского сельсовета, «Победа», «Красная Заря», «Крупки», «14 лет Октября», «Пищевик», кирпичная артель «Худовцы». Артель «Пищевик» такие продукты, как сухой кисель, мед, отправляла на 101 тыс. рублей в год в г. Златоуст, а также был заключен договор с Витебской областью.

Вынесено решение о строительстве в 1950 году Крупского льнозавода.

В области сельского хозяйства район является льноводческим, сеет 1700 га льна, это исключительно важная культура. Она обеспечивает промышленность волокном, поднимает экономику колхозов.

В колхозах района посевная площадь увеличилась на 2590 га, поголовье крупного рогатого скота увеличилось на 1612 голов, поголовье овец и коз на 1425 голов, поголовье свиней на 1096 голов, поголовье лошадей на 574 головы. В 1949 году был увеличен тракторный парк. Крупской МТС план тракторных работ в 1947 году был 6000 га, в 1949 году — 15 600 га.

Был утвержден план электрификации сельского хозяйства района, электрифицировать 11 колхозов, построить 3 электростанции.

В деле народного образования достигнуты значительные успехи. Восстановлена и функционирует довоенная сеть школ, работают 79, школ в том числе: 5 средних, 13 семилетних и 61 начальная, в которых обучалось 9500 учащихся. В 1949 году была дополнительно построена одна средняя школа.

В области здравоохранения полностью восстановлена районная больница на 75 коек, все отделения возглавляют врачи-специалисты, в г. п. Крупки начато строительство поликлиники, в районе 8 фельдшерско-акушерских пунктов.

Філіял Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў г. Барысаве, ф.6, воп.1, спр. 88, л. 7.

ПРАТАКОЛ № 6 ПАСЯДЖЭННЯ БЮРО КРУПСКАГА РК КП(б)Б

21 красавіка 1951 г.

Слухалі: Пра добраўпарадкаванасць гар. пас. Крупкі.

Заслухаўшы даклады заг. аддзела камунальнай гаспадаркі тав. Спічкова, заг. аддзела аховы здароўя т. Хоміча, дырэктара райпрамкамбіната т. Сікорскага і старшыні пасялковага Савета тав. Буткевіча, бюро РК КП(б)Б адзначыла, што работа па добраўпарадкаванні гар. пас. Крупкі аддзелам камунальнай гаспадаркі, раённым аддзелам аховы здароўя, райпрамкамбінатам і выканкомам гарпассавета не праводзілася.

Тав. Спічкоў, нягледзячы на наяўнасць сродкаў, добраўпарадкаваннем Крупак не займаўся. Тэрыторыя гарпасёлка знаходзіцца ў забруджаным стане, няма тратуараў і насаджэнняў, недастатковая колькасць калодзежаў, а тыя, што ёсць, не рамантуюцца. Няздавальняюча займаецца навядзеннем парадку ў санітарных адносінах і аддзел аховы здароўя. Дрэнна працуе санітарная інспекцыя. Будаўніцтва плацiны і гідраэлектрастанцыі ідзе недапушчальна марудна. Тав. Сікорскі не прымае тэрміновых мер для яго заканчэння. Выканком Крупскага гар. пассавета і яго старшыня тав. Буткевіч таксама не займаліся навядзеннем парадку ў Крупках, іх добраўпарадкаваннем. Так, пасадка дрэў, кустоў і кветкавай расліннасці не даведзена да кожных прадпрыемства, установы, арганізацыі і асобнага домаўладальніка.

У мэтах навядзення парадку па добраўпарадкаванні гар. пас. Крупкі бюро РК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Лічыць добраўпарадкаванне райцэнтра гар. пас. Крупкі важнейшай гаспадарчай і па-

літычнай задачай. Заг. аддзелам камунальнай гаспадаркі (тав. Спічкоў), старшыня гарадскога пасялковага Савета (тав. Буткевіч) абавязаны:

а) карэнным чынам палепшыць работу выканкома гарадскога пасялковага Савета і аддзела камунальнай гаспадаркі, прыняць меры па выкананні плана 1951 года па развіцці гарадской пасялковай гаспадаркі і добраўпарадкаванні райцэнтра, звярнуць асаблівую ўвагу на пракладку дарог, будаўніцтва і рамонт калодзежаў, азеляненне;

б) да 1 жніўня 1951 года пабудаваць 5 калодзежаў (па адным на Савецкай і Магістральнай вуліцах, 2 на Кіраўскай і 1 на Нова-Савецкай вуліцах). Да 15 мая поўнасцю адрамантаваць тратуары і пабудаваць новыя па Савецкай і Ленінскай вуліцах;

в) да 1 мая 1951 г. правесці пасадку дрэў па Савецкай і Ленінскай вуліцах і на плошчы каля райвыканкома;

г) да 15 жніўня закончыць будаўніцтва моста праз раку Бобр і дарогу маслапром — бальніца;

д) да 11 жніўня 1951 г. ажыццявіць рамонт у 4-х дамах (па 2 на Фабрычнай і Ленінскай вуліцах);

е) завяршыць будаўніцтва сярэдняй школы да новага навучальнага года.

2. Абавязаць раённы аддзел аховы здароўя (тав. Хоміч) палепшыць работу санітарнай інспекцыі, навесці парадак у гаспадарцы раённай бальніцы (наладзіць агароджу, пасадзіць дрэвы, адрамантаваць 2 калодзежы).

3. Абавязаць дырэктара райпрамкамбіната (тав. Сікорскага) да 1 мая 1951 года закончыць у першую чаргу будаўніцтва ГЭС і электрыфікаваць райцэнтр. Навесці парадак у гаспадарцы (выпраміць Фабрычную вуліцу), агарадзіць райпрамкамбінат па Савецкай вуліцы, зрабіць тратуары, правесці рамонт 2 жылых дамоў.

4. Абавязаць старшыню раённага камітэта фізкультуры і спорту (тав. Пацэева), старшыню гар. пас. Савета (тав. Буткевіча):

а) у маі 1951 г. пабудаваць стадыён;

б) пры кожным прадпрыемстве і арганізацыі пабудаваць валейбольную і гарадскую пляцоўкі.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 243, воп.1, спр. 115, л. 174.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ВЫКАНКОМА КРУПСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ ЗА ПЕРЫЯД З 1950 г. ПА СТУДЗЕНЬ 1953 г.

Промышленность района из года в год наращивает темпы производства. Промышленный план 1951 г. выполнен на 101%, план 1952 г. — на 103,7%. Местная и кооперативная промышленность значительно улучшила свою работу по производству товаров широкого потребления и предметов домашнего и хозяйственного обихода.

Серьезные успехи достигнуты в сельском хозяйстве за два года, вспахано и освоено колхозами 4778 га целинных земель, залежей и перелогов, осушено 1696 га болот и освоено 317 га заболоченных земель. Посевная площадь яровых зерновых культур в 1953 году достигла довоенного уровня и составляет 100% к 1940 году.

Повысился уровень механизации сельхозработ, что немного облегчило труд колхозников. В 1951 году была образована новая Залеская МТС, всего в районе действовали 3 МТС: Крупская, Игрушевская, Залеская МТС.

Возросла товарная продукция колхозов. В 1952 г. колхозы района сдали государству в 3,5 раза больше пшеницы чем в 1950 г., молока на 751 тонну, мяса на 61 тонну, шерсти на 180 пудов и яиц в 10 раз больше, чем в 1950 году.

В районе расширилась сеть лечебно-профилактических учреждений, открыт врачебный пункт на торфзаводе «Плавуще Галое», капитально отремонтированы все помещения больниц, открыт стационар в г. п. Бобр. Медицинская сеть пополнилась оборудованием и инвентарем, открыт рентгеновский кабинет. В 1951 году закончено строительство новой поликлиники на 11 кабинетов, районная больница получила машину скорой помощи.

Сеть школ всеобуча превысила довоенный уровень, работают 83 школы, из них: 9 средних, 16 семилетних и 58 начальных. За этот период построено в г. п. Крупки белорусская средняя школа, капитально отремонтирована и расширена русская средняя школа.

В результате неоднократного (5-го по счету) снижения розничных цен и роста благосостояния трудящихся значительно вырос товарооборот кооперативной торговли. Расширена сеть розничной торговли и общественного питания. В райцентре построен раймаг, заканчивается строительство и вводятся в эксплуатацию культмаг и книготорг. Большая работа проделана по восстановлению и строительству жилых домов в райцентре и сельской местности.

Філіял Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў г. Барысаве, ф.6, воп. 1, спр. 103, л. 138.

За газетным радком

ЯНА БЫЛА НА ФЕСТЫВАЛІ

Сваёй стараннай працай і вытворчым поспехам даярка калгаса «Шлях Сталіна» Ганна Сапрановіч заваявала права наведаць па турыстычнай пуцёўцы Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў у Маскве. За 7 месяцаў бягучага года яна ад кожнай фуражнай каровы надаіла па 2728 літраў малака, у тым ліку ў ліпені 698 літраў.

Голас калгасніка, 1957 г., 15 жніўня.

У мірнай працы

Пачатак 1960-х гадоў супаў з важнымі ў жыцці рэспублікі і раёна падзеямі. У гэты час праводзіўся шэраг адміністрацыйна-тэрытарыяльных і сацыяльна-эканамічных рэформ.

У 1960 г. паводле Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР былі ўзбуйнены раёны. 21 студзеня скасаваны Халопеніцкі раён і да Крупскага раёна далучаны Халопеніцкі, Вялікахальнявіцкі, Хацюхоўскі, былыя Дубаўскі, Заборскі сельскія Саветы. У выніку тэрыторыя раёна павялічылася на адну трэць, у яго склад увайшоў значны прамысловы і культурны цэнтр — г. п. Халопенічы. Адначасова было праведзена узбуйненне гаспадарак, на іх базе створаны саўгасы «Бобр», «Грушаўскі», «Абчуга», «Халопенічы», «40 год Кастрычніка», «Ухвала».

1960-я гады ўвайшлі ў гісторыю як час «хрушчоўскіх рэформ». Яны мелі як дадатныя, так і адмоўныя бакі. Да адмоўных можна аднесці іх палавінчатасць, недастатковую прадуманасць. Менавіта ў гэтыя гады пачалася перабудова кіраўніцтва эканомікі. Замест адзіных органаў кіравання ў снежні 1963 г. — студзені 1962 г. у сельскагаспадарчых раёнах, у тым ліку і ў Крупскім, былі створаны калгасна-саўгасныя ўпраўленні для кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, а для кіраўніцтва прамысловасцю — зональныя прамыслова-вытворчыя камітэты. Крупскі райком партыі быў пераўтвораны ў партком вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення. У выніку раён аказаўся разарваным па вытворчым прынцыпе, у работу кадраў унесена нервознасць і неразбярыха. Дарэчы, гэта рэформа была скасавана ў 1964 г.

У той жа час была значна ўмацавана матэрыяльная база гаспадарак, шырока вялося будаўніцтва новых аб'ектаў сацыяльнай і вытворчай сферы, прадпрыемствы і гаспадаркі атрымалі адносную эканамічную самастойнасць. У 1960 г. ў раёне была пабудавана высакавольтная падстанцыя магутнасцю 5 тыс. кілават-гадзін, што дазволіла электрыфікаваць амаль усе калгасы і саўгасы.

Менавіта ў 1960-я гады ў раёне былі ўведзены ў эксплуатацыю Халопеніцкі масласырзавод, торфабрыкетны завод «Туршоўка», у райцэнтры пабудаваны Дом культуры, Дом быту, Дом піянераў і школьнікаў, універмаг, Дом сувязі, гасцініца, школа, пачалося будаўніцтва жылых шматкватэрных дамоў. Актывізавалася будаўніцтва на сяле.

Сельская гаспадарка

Параўнальна добрыя вынікі дало ўвядзенне ў пачатку 1960-х гадоў гаспадарчага разліку. Праўда, ён марудна і непаслядоўна праводзіўся ў жыццё, асабліва ў эканамічна слабых калгасах. Больш моцныя гаспадаркі дабіваліся неблагіх вынікаў. Эканаміст калгаса «Бальшавік» Ф. Садоўскі пісаў у газеце «Зара камуны»: «... У 1961 г. у нашым калгасе быў уведзены ўнутрыгаспадарчы разлік. Як у цэлым па калгасе, так і ў паляводчых брыгадах павысілася ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур і збожжавых (з 7 ц з 1 гектара да 9,1 ц). Зменшыліся затраты на транспартныя расходы. Там, дзе вышэйшы ўраджай, больш высокая аплата на працадні». Гэтай гаспадаркай кіраваў Віктар Піліпавіч Касцюкевіч. Ён адносіўся да працы па-гаспадарску, не заўсёды аглядваўся, што кажуць кіруючыя органы. І праца ў яго ішла добра, калгас быў адным з перадавых у раёне.

Добрых вынікаў дабіліся пераведзеныя на дзяржразлік калгасы «Камунар», імя Каліні-на, саўгас «Бобр». Па дзяржразліку добра аплачвалася льнопрадукцыя, таму калгасы былі зацікаўлены хутчэй выбраць лён, здаць яго дзяржаве і атрымаць дадатковыя даходы.

Удзельнікі курсаў брыгадзіраў. Крупкі. 1961 г.

У 1962 г. план здачы льнопрадукцыі быў выкананы калгасамі на 141%, а саўгасамі ўсяго на 41%. Такі вялікі разбег атрымаўся таму, што калгасы па дзяржразліку прымянялі дадатковую аплату працы за лён, а ў саўгасах яна не была ўведзена.

Прымяненне дзяржразліку стымулявала і працу жывёлаводаў. Далёка за межамі раёна былі вядомы прозвішчы даярак саўгаса «Сялява» Веры Паўлаўны Валаховіч і Лідзіі Іпалітаўны Сазонавай, якія надаілі звыш 5 тыс. кг малака ад кожнай замацаванай за імі каровы, свінаркі Алены Фёдараўны Трыпуцень, якая адкарміла 1000 галоў свіней.

У 1964 г. раён датэрмінова выканаў планавыя заданні па здачы дзяржаве мяса, малака, яек, аднак па-ранейшаму лічыўся адстаючым па вобласці і рэспубліцы як па вытворчасці раслінаводства, так і ў жывёлагадоўлі. У гэтым годзе сярэдні ўраджай збожжавых па раёне склаў толькі 5,4 ц з 1 га.

У сярэдзіне 1960-х гадоў праводзілася яшчэ адна сельскагаспадарчая рэформа, якая таксама на некаторы час ажывіла сельскую гаспадарку. Саветам Міністраў СССР і ЦК КПСС 16 мая 1966 г. была прынята пастанова, якая ўзаконіла пераход на гарантаваную аплату працы ў калгасах грашыма і натурай. Гэта павінна было ісці за кошт павышэння якасці прадукцыі, зніжэння яе сабекошту. Заробак калгаснікаў залежаў ад таго, які ўраджай будзе вырашчаны і без страт убраны. Некаторыя калгасы раёна палепшылі сваё матэрыяльнае становішча, змаглі павысіць аплату працадзён. У калгасе «Праўда» месячны заробак калгаснікаў узрос на 50%. Знізіўся сабекошт сельскагаспадарчай прадукцыі. Так, сабекошт 1 ц зерня знізіўся з 10 руб. 55 кап. у 1965 г. да 7 руб. 41 кап. у 1970 г.

У цэлым за дзесяцігоддзе ў раёне была значна павялічана вытворчасць асноўных відаў сельскагаспадарчай і жывёлагадоўчай прадукцыі. Асноўныя заданні пяцігадовага плана былі выкананы, у тым ліку па вытворчасці збожжа на 104,9%, малака на 114,2%, мяса на 121,2%. У 1969 г. ў гаспадарках раёна сабралі нядрэнны для таго часу ўраджай збожжа — 25 ц з га. Сярод тых, хто вызначыўся працай, быў калгаснік калгаса імя Калініна Н.П.Барысаў. Дарэчы, ён быў выбраны дэлегатам на III Усесаюзны з'езд калгаснікаў, які адбыўся ў лістападзе 1969 г. Даярка калгаса «Камунар» К.П.Макарава стала дэлегаткай з'езда калгаснікаў Беларусі. Сярод лепшых камбайнераў вобласці значыўся механізатар калгаса імя Калініна П.І.Рэут.

У 1970-я — пачатку 1980-х гадоў у сельскай гаспадарцы раёна, як і па ўсёй краіне, быў узяты напрамак на канцэнтрацыю і спецыялізацыю вытворчасці, яе інтэнсіфікацыю і на гэтай аснове — павышэнне эфектыўнасці працы. Была праведзена значная работа па ўмацаванні матэрыяльнай базы калгасаў і саўгасаў, стварэнні сацыяльнай інфраструктуры на сяле.

Да 1986 г. ў раёне налічвалася каля 1000 трактароў, 500 аўтамашын, 300 збожжаўборачных і 100 бульбаўборачных камбайнаў, шмат іншай тэхнікі. Гэта дазволіла механізаваць вытворчы працэс, у тым ліку па ўборцы збожжавых да 100%, бульбы — 50%, ільну — 89%.

Паколькі раён спецыялізуецца на вытворчасці мяса-малочнай прадукцыі, ва ўсіх гаспадарках былі пабудаваны тыпавыя жывёлагадоўчыя памяшканні, у тым ліку буйныя, так званыя «тысячнікі». У 1985 г. быў уве-

дзены ў эксплуатацыю самы буйны сельскагаспадарчы аб'ект у раёне — свінагадоўчы комплекс на 12 тыс. галоў жывёлы ў калгасе «Чырвоны Кастрычнік». На фермах у большасці гаспадарак раёна былі абсталяваны пакоі адпачынку, а ў некаторых нават з саўнамі, медыцынскімі кабінетамі і пакоямі псіхалагічнай разгрузкі.

Некалькі палепшылася матэрыяльнае і маральнае стымуляванне, арганізацыя працы хлебаробаў і жывёлаводаў. Усё гэта ў сукупнасці з павелічэннем капіталаўкладанняў у сельскую гаспадарку, нарыхтовак мінеральных і арганічных угнаенняў, паляпшэннем агратэхнікі вырошчвання асноўных сельскагаспадарчых культур і племянной справы ў жывёлагадоўлі дало пэўныя вынікі. Ураджайнасць збожжавых узрасла за 15 гадоў у 1,5 раза і склала ў 1986 г. ў сярэднім па раёне 24 ц з 1 га, бульбы — у два разы і дасягнула 160 ц з 1 га, сярэдні надой малака на 1 карову таксама павялічыўся амаль у 2 разы і склаў у сярэднім 2264 кг на карову ў год, у 2 разы таксама павялічылася вытворчасць мяса. У 1980 г. раён выйшаў пераможцам у рэспубліканскім спаборніцтве за павелічэнне вытворчасці і продажу прадуктаў жывёлагадоўлі ў стойлавы перыяд 1979—80 гадоў, а калгас «Камунар» быў прызнаны пераможцам ва Усесаюзным спаборніцтве па вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі. Стабільных вынікаў у гэты час дабіваліся таксама працаўнікі калгасаў «Бальшавік», «Перамога», саўгасаў «Колас», «Халопенічы», «Бобр», эксперыментальнай базы «Эса» і іншых гаспадарак. У калгасе «Перамога», напрыклад, у 1980—83 гады ўраджаі збожжавых складалі 30—32 ц з 1 га. Даяркі гэтай гаспадаркі Ніна Драпкова і Ірына Белая надойвалі ў сярэднім да 4 тыс. кг малака ад каровы ў год. Больш чым па 800 г сярэднясутачнай прывагі дабіваліся цялятніцы саўгаса «Бобр» Марыя Невядомская і Любоў Мажэйка.

Але ў цэлым раён яшчэ адставаў ад іншых рэгіёнаў вобласці і рэспублікі па шэрагу паказчыкаў. Заставалася значная кантрастнасць у выніках работы асобных гаспадарак. Калі перадавыя гаспадаркі падыходзілі да ўраджайнасці 30 і нават больш цэнтнераў зерневых з 1 га, то ў значнай колькасці калгасаў яна не перавышала 12—14 ц з 1 га. У цэлым па раёне ўраджайнасць розных культур не была стабільнай. У 1970—75 гадах калгасы і саўгасы Крупскага раёна атрымлівалі ў сярэднім па 17,2 ц збожжавых з 1 га, 117 ц бульбы, 3,8 ц ільну; у 1976—80 гады адпаведна — 18,7 ц, 117 ц, 2,7 ц; у 1981—85 гады — 19,2 ц збожжавых, 3,22 ц ільну; у 1986—91 гадах 23,2 ц збожжавых, 145 ц бульбы, 4,38 ц ільну. Найбольш высокі ўраджай збожжавых быў атрыманы ў 1987 г. — 33,8 ц з га. На гэты год прыходзіцца і найлепшы ўраджай бульбы — 201 ц, ільну — 5,6 ц. Самым нізкім па ўраджайнасці для

На кукурузным полі ў саўгасе «Ухвала». 1962 г.

Сушка зерня ў саўгасе «Халопенічы». 1970-я гады.

збожжавых і лёну быў 1982 г., калі сабралі па 15 ц збожжавых і зернебабовых з 1 га і па 2,5 ц ільновалакна.

Штогод калгасы і саўгасы раёна мелі значныя страты пры ўборцы ўраджаю. У 1987 г. ўборачная плошча збожжавых і зернебабовых культур была менш пасяўной на 1150 га, у 1988 г. — на 1519 га, раён ад гэтага панёс страты зерня больш чым 10 тыс. т. Страты назіраліся і пры перавозцы і перапрацоўцы прадукцыі.

З пачатку 80-х гадоў пачала праяўляцца адмоўная тэндэнцыя да зніжэння эфектыўнасці вытворчасці асноўных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі. 4 калгасы і 12 саўгасаў з'яўляліся стратнымі.

З 1986 г., калі ў краіне быў узяты курс на перабудову, у раёне таксама пачаўся пошук новых, больш эфектыўных шляхоў гаспадарання. У шэрагу гаспадарак пачалі практыкаваць перадачу асобных вытворчых участкаў, ферм на брыгадны, сямейны падрад. У шэрагу выпадкаў гэта дало добрыя вынікі. Напрыклад, у саўгасе «Бобр» механізаванае звяно ў складзе Аркадзія Шынкарова і Яўгена Бараболі ўзяло на падрад землі ўсёй пальводчай брыгады і з году ў год дабівалася высокіх паказчыкаў. Штогод яны на 80 гектарах зямлі дабіваліся ўраджайнасці бульбы 200 ц з 1 га і вышэй. У 1988 г. 6 гаспадарак былі пераведзены на самафінансаванне і самаакупаемасць, у наступныя 2 гады — яшчэ 7 гаспадарак.

Узраслі капіталаўкладанні ў сельскую гаспадарку, больш увагі стала ўдзяляцца матэрыяльнаму заахвочванню працаўнікоў, умацаванню працоўнай і тэхналагічнай дысцыпліны. Усё гэта на першым этапе рэформ дало пэўныя вынікі. Валавы збор збожжа ў 1989 г. склаў 694,3 тыс. т супраць 572 у 1986 г., ураджайнасць збожжавых павысілася за гэты час з 24 да 29,9 ц з 1 га. Узрасло пагалоўе буйной рагатай жывёлы і свіней і адпаведна вытворчасць малака і мяса. Валавы надой малака ў 1989 г. склаў 391,9 тыс. т супраць 376,7 тыс. т у 1986, вытворчасць мяса — 78,6 тыс. т супраць 68,9 тыс. т. Сярэднегадавы надой малака ад каровы за 3 гады ўзрос з 2264 кг да 2420, а сярэднясутачныя прывагі свіней — з 277 г да 340 г. Прыклад у працы ў гэты час паказвалі лепшыя працаўнікі раёна, даяркі калгаса імя Леніна І.У.Белая, «Бальшавік» З.А.Хадасевіч, механізатар саўгаса «Ухвала» П.З.Сіняк, аператар па дарошчванні буйной рагатай жывёлы з саўгаса «Касянічы» В.С.Баравік, шафёр саўгаса «Сялява» І.А.Бачышча і інш.

У цэлым жа да 1990 г. вытворчасць валавай прадукцыі ў раёне ўзрасла ў параўнанні з 1970 г. у 5 разоў, ураджайнасць збожжавых культур і бульбы павялічылася больш чым у 2 разы. За гады 12-й пяцігодкі (з 1986 па 1990 г.) вытворчасць валавай прадукцыі ўзрасла на 28%, прадукцыйнасць працы — амаль на 40%.

Але непаслядоўнасць правядзення рэформ, пераход да радыкальных рыначных пераўтварэнняў, калі пачалася ломка старой гаспадарчай сістэмы, а ўзамен не быў створаны новы гаспадарчы механізм, адмоўна адбіліся на вытворчым працэсе. Становішча яшчэ больш пагоршылася пасля распаду Савецкага Саюза, калі былі разарваны эканамічныя сувязі і рэзка скарацілася фінансаванне сельс-

кай гаспадаркі. Пераход да рыначных адносін значна падарваў гаспадарку раёна з яе адносна слабай матэрыяльна-тэхнічнай базай. Калі раней гаспадаркі раёна на набыццё новай тэхнікі расходавалі за паўгоддзе каля 1,5 млн. рублёў, то за 1-е паўгоддзе 1990 г. гэты расход склаў звыш 4 млн. рублёў, працягваў расці і ў далейшым. Высокія цэны на тэхніку падарвалі даходы калгасаў і саўгасаў. Калі ў 1990 г. яны мелі прыбытак 17 млн. рублёў, то ў 1991 г. ён не перавышаў 6 млн. рублёў. Перад гаспадаркамі раёна паўсталі новыя праблемы, вырашэнне якіх зацягвалася на гады і залежала не толькі ад сялян, а галоўным чынам ад агульнага эканамічнага і палітычнага становішча ў рэспубліцы.

Ва ўмовах палітычнага і эканамічнага крызісу ў краіне з 1989 г. пачалося зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці. У выніку да 1998 г. пасяўныя плошчы збожжавых культур скараціліся ў параўнанні з 1989 г. на 25%, бульбы — амаль у 6 разоў, мінеральных угнаенняў сталі ўносіць у глебу ў 3 разы менш, арганічных — у 2,5 раза. Колькасць буйной рагатай жывёлы і свіней зменшылася за гэты час у 2 разы. Адпаведна валавы збор збожжа зменшыўся ў 1997 г. ў параўнанні з 1989 г. амаль у 2 разы, сярэдняя ўраджайнасць знізілася з 29,9 ц з 1 га ў 1989 г. да 20,1 ц з 1 га ў 1997 г., бульбы сабрана ў 7 разоў менш, ураджайнасць склала адпаведна 124 ц з 1 га і 90 ц з 1 га. Вытворчасць малака знізілася ў 2,5 раза, а сярэдні надой на карову зменшыўся з 2420 кг у год да 1537, вытворчасць мяса зменшылася ў 3 разы.

Спробы правесці радыкальную зямельную рэформу таксама не далі жадаемых вынікаў. Цяпер у раёне налічваецца толькі 16 фермерскіх гаспадарак, і вырабляюць яны не больш як 1,5% збожжа, менш за 1% малочнай прадукцыі, 2,5% мясной.

Але трэба адзначыць, што ў апошнія 2 гады ў раёне, як і ў цэлым па рэспубліцы, паступова пераадольваецца спад вытворчасці і назіраецца пэўная стабілізацыя эканомікі. З 1996 г. павялічваецца ўраджайнасць збожжавых. Стала ўносіцца больш мінеральных і арганічных угнаенняў, нарыхтоўваюцца кармы для жывёлы. Сярэдні надой малака ад каровы ў 1997 г. склаў 1537 кг супраць 1448 у 1996 г. Узраслі сярэднясутачныя прывагі буйной рагатай жывёлы і свіней.

Прамысловасць

Крупскі раён сельскагаспадарчы, таму прамысловасць у 1960—1980-я гады была ў асноўным прадстаўлена параўнальна невялікімі прадпрыемствамі па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны. Найбольш значнымі з іх з'яўляліся льнозавод, пабудаваныя ў гады 8-й пяцігодкі торфабрыкетны завод «Туршоўка», Халопеніцкі масласырзавод, а таксама пладова-агароднінны завод і інш. У 1960-я гады, дзякуючы ажыццяўленню эканамічнай рэформы, прамысловасць раёна паступова набірала тэмпы руху. Планавыя паказчыкі ў асноўным выконваліся, а па шэрагу накірункаў і перавыконваліся.

У 1970-я гады ўступілі ў строй Халопеніцкі філіял механічнага завода імя С.М.Кірава, асфальтавы завод пры ДРБУ-164, шэраг прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці.

У сярэдзіне 1980-х гадоў у складаных умовах перабудовы прадпрыемствы пачалі шукаць шляхі атрымання прыбытку. Напрыклад, ільнозавод пачаў перапрацоўваць не толькі трасту і льносаломку, але і льносемя; торфазавод, акрамя асноўнай прадукцыі, пачаў выпускаць і вырабы з пластмасы — дэталі для тэлефоннай апаратуры і інш., механічны завод — тавары шырокага ўжытку: вёдры, шклянкі і г. д. У 1993 г. на базе райаб'яднання «Сельгастэхніка» стварылася таварыства з абмежаванай адказнасцю «Ам-

Токар Крупскай РТС Л.Ігнатовіч. 1963 г.

На Халопеніцкім масласырзаводзе.

кадор-Можа», на якім быў асвоены выпуск каткоў і іншай будаўнічай тэхнікі. У гэты ж час былі ператвораны ў акцыянерныя таварыствы льнозавод, масласырзавод. Крупскі пладова-агароднінны завод стаў калектыўным прадпрыемствам.

Агульны эканамічны крызіс адбіўся і на рабоце прамысловых прадпрыемстваў раёна. У 1997 г. на торфабрыкетным заводзе «Туршоўка» выпрацавана толькі 63% прадукцыі ад узроўню 1990 г., у адкрытым акцыянерным таварыстве «Лянок» адпаведна 84,3%, лясгасе — 85%. У адкрытым акцыянерным таварыстве «Халопеніцкі масласырзавод», якое дае каля паловы аб'ёму вытворчасці ўсёй прамысловасці раёна, у 1997 г. ў параўнанні з 1990 г. узровень вытворчасці дасягнуў толькі 80%. А ўсяго па раёне за гэты час аб'ёмы вытворчасці прамысловай прадукцыі склалі толькі 64,5% у параўнанні з 1990 г.

Але ў апошні час назіраецца пэўнае ажыўленне ў прамысловасці раёна. У 1997 г. на ААТ «Лянок» рост вытворчасці да ўзроўню 1996 г. склаў 4%, на ААТ «Халопеніцкі масласырзавод» — 42%, у лясгасе — 12%, а ў цэлым па раёне — 4%.

Сацыяльная сфера і гандаль

Развіццё эканомікі самым непасрэдным чынам звязана са становішчам спраў у сацыяльнай сферы.

У 1960-я гады, калі праводзілася эканамічная рэформа і ў асноўным паспяхова выконваліся пяцігадовыя планы, дзяржава стала ўдзяляць больш увагі павышэнню матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва. І хаця сярэдняя заработная плата заставалася адносна нізкай, пасля грашовай рэформы яна складала каля 80 рублёў, тым не менш матэрыяльнае становішча людзей палепшылася перш за ўсё за кошт зніжэння рознічных цэн і сацыяльных выплат і дапамогі.

25 красавіка 1965 г. былі адменены надбаўкі да цэн на шэраг прамысловых тавараў, якія прадаваліся ў сельскай мясцовасці. Так, напрыклад, толькі ў сельмагах станцыйнага селіпо за першы дзень гандлю па новых цэнах было прададзена насельніцтву тавараў у 1,5 раза больш, чым дагэтуль у звычайныя дні. 31.1.1965 г. знізіліся да ўзроўню гарадскіх дзяржаўныя рознічныя цэны ў сельскай мясцовасці на цукар, кандытарскія вырабы, баваўняныя тканіны і іншыя вырабы.

Паступова павялічвалася заработная плата. У 1987 г. ў Крупскім раёне яна складала ў сярэднім каля 187 руб. у месяц.

З павелічэннем пакупной здольнасці насельніцтва назіраўся рост аб'ёмаў рознічнага тавараабароту, узрасла колькасць магазінаў на сяле: у 1988 г. іх налічвалася 143. Але ў гэты час востра стаў адчувацца недахоп тавараў, з'явіліся чэргі. У 1988 г. да 40% магазінаў Крупскай спажывецкай кааперацыі не выконвалі план з-за недахопу тавараў народнага спажывання.

У далейшым колькасць магазінаў некалькі зменшылася, у 1998 г. іх налічвалася 129. Прычынай з'явілася перш за ўсё змяншэнне колькасці сельскіх жыхароў, у выніку чаго трымаць стацыянарныя гандлёвыя кропкі ў асобных вёсках стала эканамічна нявыгадным. Узамен адкрыта 14 лавак на даму, працуюць 3 аўтакрамы.

З развіццём рыначных адносін спажывецкая кааперацыя страціла сваю манаполію ў гандлі. Цяпер у раёне таксама дзейнічаюць 49 прыватных камерцыйных крам і кіёскаў. У апошняе дзесяцігоддзе недахопы ў арганізацыі гандлёвага абслугоўвання людзей з'явіліся прычынамі зніжэння тэмпаў росту рознічнага тавараабароту. У 1998 г. ў спажывецкай кааперацыі аб'ёмы рэалізацыі насельніцтву тавараў масавага ўжытку склалі 62,1% да ўзроўню 1990 г. і 76% да ўзроўню 1995 г.

У гэтых умовах асабліва востра стаіць праблема сацыяльнай дапамогі старым людзям, інвалідам, сем'ям, якія маюць нізкі матэрыяльны дастатак. Сістэма сацыяльнага дзяржаўнага забеспячэння састарэлых людзей, якія жылі ў вёсцы (а яны складалі асноўную масу насельніцтва раёна), пачала складвацца ў 1964 г. У гэтым годзе выйшаў закон «Аб пенсіях і дапамогах членам калгасаў». Да гэтага сацыяльнае забеспячэнне састарэлых калгаснікаў ажыццяўлялася праз касы ўзаемадапамогі калгасаў. Але дапамога залежала ад эканамічнага стану калгасаў і была неаднолькавай. Адным налічвалі працадні, другім — грошы і г. д. Напрыклад, у сельгасарцелі імя Леніна Крупскага сельсавета састарэлым Т.Н.Камарову і яго жонцы Н.Г.Камаровай штомесячна налічвалася 23 працадні, А.І.Драздовічу — 15 працадзён, а Я.Ф.Аўцюшкову штомесячна выплачвалася 50 рублёў.

Пасля 1964 г. становішча некалькі змянілася. Людзі, якія працавалі ў калгасах многія гады і амаль нічога не атрымлівалі за цяжкую працу, нарэшце атрымалі гарантаваную дзяржавай дапамогу: права на пенсію па старасці, па інваліднасці, члены сем'яў калгаснікаў — у выпадку страты карміцеля, жанчыны — дапамогу па цяжарнасці і родах. Першымі ў Крупскім раёне атрымалі пенсійныя кніжкі І.М.Гілевіч, А.М.Сіўцова, Г.М.Барадач і іншыя. Закон не да канца быў паслядоўным, сяляне згодна з ім усё ж аказваліся ў горшым стане ў параўнанні з рабочымі і служачымі. Большая частка калгаснікаў у Крупскім раёне, як і наогул у Беларусі, атрымала мінімальную пенсію — 12 руб. у месяц. Нават па тым часе сума гэта была мізэрная. Таму калгаснікі вымушаны былі працаваць і пасля выхаду на пенсію. Працавалі яны ў 1970-я і 1980-я, працуюць і зараз. Напрыклад, у 1965 г. дзейсную дапамогу ў час веснавой сяўбы аказалі пенсіянеры, якія жылі ў в. Пліса. Кожны дзень на палеткі выходзілі звыш 15 пенсіянераў. Яны дапамагалі падрыхтоўваць бульбу для сяўбы.

Трэба адзначыць, што некаторыя калгасы дапамагалі пенсіянерам. Згодна з палажэннем аб унутрыкалгасным забеспячэнні калгаснікаў, якое прымалася на агульным сходзе, ветэранам працы, якім было прысвоена званне «Заслужаны калгаснік» ці «Ганаровы калгаснік», калгасы дадавалі да пенсіі грошы. Устанаўліваліся і персанальныя калгасныя пенсіі. Даваліся льготы за карыстанне электраэнергіяй, газам, радыё, выдзяляліся пуцёўкі для адпачынку, афармлялася за кошт калгасаў падпіска на газеты і часопісы і г. д. Напрыклад, у 1988 г. 21 калгас рабіў даплаты да пенсіі 165 пенсіянерам. Так, калгас імя Леніна дадаваў да пенсіі грошы 20 чалавекам, імя Кірава — 14, «Праўда» — 37 і г. д. У 1990 г. ўжо толькі 7 калгасаў рабілі даплату да пенсіі 185 пенсіянерам. Расходы на гэтыя мэты склалі ў 1990 г. 24,2 тыс. рублёў. Пасля 1991 г. калгасы і саўгасы спынілі даплаты да пенсіі.

У 1995 г. аддзел сацыяльнага забеспячэння райвыканкома быў пераўтвораны ў аддзел сацыяльнай абароны насельніцтва. Пачалі праводзіцца пералік пенсій, назначаных па закону 1964 г., а таксама карэкціроўка пенсій з улікам інфляцыі і росту цэн. 31 кастрычніка 1990 г. былі павялічаны пенсіі інвалідам Вялікай Айчыннай вайны, удзельнікам вайны і сем'ям загінуўшых воінаў. Але тым не менш у гэты год каля 70% пенсіянераў працягвалі атрымліваць пенсіі менш за 125 рублёў, што было ніжэй пражытачнага мінімуму.

У 1989 г. ў раёне было створана таварыства інвалідаў, якое аб'ядноўвае каля 800 чалавек. У гэты ж час пры аддзеле сацыяльнага забеспячэння было адкрыта аддзяленне сацы-

яльнай дапамогі. У 1989 г. яно абслугоўвала каля 150 адзінокіх людзей. Акрамя таго, аказвала дапамогу мнагадзетным сем'ям. Усімі відамі сацыяльнай дапамогі ў раёне ахоплена 13 тыс. чалавек, што складае каля паловы насельніцтва. Трэба адзначыць, што хаця мінімальныя памеры пенсіі ўзраслі, але яны адстаюць ад росту цэн, таму многія пенсіянеры вымушаны працаваць пасля дасягнення пенсійнага ўзросту.

Ахова здароўя

Пагаршэнне эканамічнага становішча, радыяцыйнае забруджванне, зніжэнне якасці прадуктаў харчавання, рост сацыяльнай напружанасці — усё гэта неспрыяльна адбівалася на здароўі людзей. У гэтым сэнсе асобае значэнне набывае медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. Пасля аб'яднання ў 1960 г. Халопеніцкага і Крупскага раёнаў Халопеніцкая бальніца была пашырана да 100 ложкаў. Але ў цэлым матэрыяльная база сістэмы аховы здароўя ў раёне была яшчэ даволі слабай. Напрыклад, аддзяленні хуткай дапамогі ў Крупках і Халопенічах мелі толькі па адной аўтамашыне. Значная частка фельчарска-акушэрскіх пунктаў знаходзілася ў наёмных памяшканнях. Таму раённы аддзел аховы здароўя і, у прыватнасці, галоўны ўрач раёна Іван Нічыпаравіч Хоміч у якасці адной з галоўных задач паставілі ўмацаванне матэрыяльнай базы сістэмы аховы здароўя і на аснове гэтага ўдасканаленне медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Крупская раённая бальніца была пашырана да 125 ложкаў, зроблены прыбудовы ў Ігрушкаўскай і Бобрскай бальніцах. Былі пабудаваны памяшканні таксама для Дубаўскай, Ухвальскай і Абчугскай бальніц. Больш шырокая работа ў гэтым напрамку разгарнулася ў 1970—80-я гады. У гэты час, з 1972 па 1996 г., галоўным урачом раённай бальніцы працаваў Міхаіл Паўлавіч Вайцяховіч. Быў закончаны вывад фельчарска-акушэрскіх пунктаў з наёмных памяшканняў, пабудаваны будынкі 13 ФАПаў. Адкрыліся 6 новых фельчарска-акушэрскіх пунктаў у вёсках Ротань, Стараселле, Калодніца, Каменка, Замкі, Матошка. Умацавана служба хуткай дапамогі, павялічана колькасць аўтамашын, усе яны былі абсталяваны неабходнай медыцынскай апаратурай. Адначасова пашыраны вытворчыя плошчы раённай бальніцы, адкрыты фізіятэрапеўтычны і іншыя кабінеты, набыта медыцынская апаратура, у мясцовых бальніцах былі адкрыты клінічныя лабараторыі.

З 1982 г. ў Крупках пачалося будаўніцтва новага бальнічнага комплексу. Праз 2 гады новая 4-павярховая паліклініка была ўведзена ў дзеянне, а ў 1985—86 гадах здадзены ў эксплуатацыю галоўны 5-павярховы корпус стацыянара. Гэта дало магчымасць ў 2 разы павялічыць прыём хворых. Новая бальніца была аснашчана сучасным медыцынскім абсталяваннем. Пачалі працаваць рэанімацый-

Фельчарска-акушэрскі пункт у в. Гапонавічы.

нае аддзяленне, кабінеты рэфлексатэрапіі, кісларoду і фітатэрапіі, лазератэрапіі, магнітатэрапіі, электрасну, масажу, мануальнай і псіхатэрапіі і інш.

Да сярэдзіны 1990-х гадоў сістэма медыцынскага абслугоўвання раёна склалася з раённай бальніцы на 255 ложкаў, 3 участковых бальніц і 1 гарадской бальніцы на 95 ложкаў, 2 урачэбных амбулаторый, 28 ФАПаў, 3 аддзяленняў хуткай медыцынскай дапамогі, дзе працуе 21 фельчарская брыгада. Зараз вядзецца будаўніцтва новых будынкаў для Бобрскай урачэбнай амбулаторыі, Халопеніцкай гарадской бальніцы.

Аднак, нягледзячы на значную работу, праведзеную раённым аддзелам аховы здароўя, колькасць захворванняў павялічвалася, асабліва сярод дзяцей. Гэтаму нямала паспрыяла чарнобыльская катастрофа, якая закранула і Крупскі раён. Амаль палова яго тэрыторыі аказалася, хоць і ў параўнальна невялікіх дозах, забруджанай радыеактыўнымі выкідамі. Менавіта ў 1988 г. ў раёне назіралася самая высокая смяротнасць сярод насельніцтва. Амаль кожны чацвёрты памірaў у працаздольным узросце. Рэзка ўзрасла дзіцячая смяротнасць. У 1988 г. яна склала 19,3% пры абласным паказчыку 16,0%. На якасці медыцынскага абслугоўвання насельніцтва адмоўна адбілася і цякучасць кадраў. Напрыклад, у 1987—88 гадах у раён прыбыло 27 урачоў, 85 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу, а пакінула адпаведна 17 і 54 чалавекі. Усе гэтыя і іншыя праблемы знайшлі адлюстраванне ў праграме «Здароўе», якая пачала праводзіцца ў раёне ў 1980-я гады. У ходзе яе медыцынскія ўстановы былі забяспечаны неабходным абсталяваннем. Да 1990 г. ва ўсіх ФАПах і бальніцах адкрыты фізіятэрапеўтычныя кабінеты, а для абслугоўвання дзяцей — педыятрычныя ўчасткі.

Усе медыцынскія работнікі, якія працуюць на сяле, атрымалі жыллё. Адначасова вялася работа па падрыхтоўцы і замацаванні медыцынскіх кадраў. На працягу некалькіх гадоў у раёне склаўся высокакваліфікаваны, вопытны, аддадзены сваёй справе калектыў медработнікаў, якія шмат зрабілі для таго, каб палепшыць узровень медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Сярод іх урачы Міхаіл Паўлавіч Вайцяховіч, Міхаіл Ігнатавіч Хмяльніцкі, якія адпрацавалі ў раёне не адзін дзесятак гадоў. Высокім прафесіяналізмам адзначаюцца тэрапеўт Галіна Аляксееўна Галубенка, педыятр Раіса Паўлаўна Лазарэвіч, хірург Уладзімір Андрэевіч Баярынцаў, урач Ухвальскай бальніцы Іван Рыгоравіч Іваноў, урач раённай Халопеніцкай бальніцы Еўдакім Іванавіч Віталёў, урачы раённай бальніцы Ядвіга Міхайлаўна Мельнік, Галіна Паўлаўна Жук, Антаніна Уладзіміраўна Казырыцкая, Эма Аляксееўна Бомберава, фельчары, загадчыкі ФАПаў Марыя Сцяпанаўна Таланкова, Аляксандр Рыгоравіч Гамарнікаў, Уладзімір Іванавіч Дрозд, Ганна Сцяпанаўна Арлоўская, Галіна Сяргееўна Кахновіч, Валянціна Аляксееўна Крывіцкая, Валянціна Кузьмінічна Беспаяська, Лідзія Дзмітрыеўна Вінцарэвіч, Антаніна Дзмітрыеўна Хадасевіч, Валянціна Савельеўна Тарасевіч, Лілія Лявонаўна Гарбачова, Ірына Пятроўна Макарэвіч, Марыя Канстанцінаўна Гліннік, Ягор Захаравіч Мікульскі, Клаўдзія Піліпаўна Мікульская і інш.

На 1998 г. у раёне працавала 90 урачоў і 340 сярэдніх медыцынскіх работнікаў. Дзякуючы іх самаадданай працы значна палепшылася справа з медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва, і ў першую чаргу дзяцей. У апошнія гады намецілася ўстойлівая тэндэнцыя да скарачэння дзіцячай смяротнасці. Калі ў 1990 г. яна складала 16,4%, то ў 1992 — 10,3, 1994 — 9,9%. Але, з другога боку, агульнае пагаршэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва, уплыў Чарнобыльскай катастрофы, недахоп і высокі кошт лекаў прывялі да таго, што з 1990 г. смяротнасць сярод насельніцтва стала перавышаць нараджальнасць.

Адукацыя

Да станоўчых змен, якія адбыліся ў пасляваенныя гады і ў сучасны момант, можна аднесці рост адукацыйнага ўзроўню насельніцтва. У 1960 г., пасля далучэння Халопеніцкага раёна, у раёне працавала 126 школ, у іх займалася 12 270 навучэнцаў. У далейшым развіццё школьнай сеткі вялося ў напрамку ператварэння асобных пачатковых школ у сямігадовыя, а затым ў васьмігадовыя, а васьмігадовых — у сярэднія. У сувязі з закрыццём пачатковых школ узнікла неабходнасць арганізацыі пры сярэдніх і васьмігадовых школах



Выступленне аркестра народных інструментаў Крупскага гарадскога Дома культуры.

інтэрнатаў і груп падоўжанага дня. Гэта было выклікана як агульным змяншэннем колькасці насельніцтва, так і геаграфічным становішчам Крупскага раёна. Ён знаходзіцца непадалёку ад буйных індустрыяльных цэнтраў, і туды ідзе адток моладзі. Да 1970 г. колькасць школ, напрыклад, скарацілася да 115, а да 1975 г. — да 79. Адпаведна скарацілася колькасць навучэнцаў. У ходзе рэформы агульнаадукацыйнай школы ў сярэдзіне 1960-х гадоў пачаўся перавод 10-годак у 11-гадовыя політэхнічныя школы, дзе выпускнікі адначасова атрымлівалі навыкі па пэўнай прафесіі. Праўда, гэта рэформа праводзілася нядоўга, і ўжо з 1964 г. пачаўся зварот назад да дзесяцігадовай формы навучання. Але дадатным было тое, што ў ходзе політэхнізацыі школ ва ўсіх іх былі абсталяваны майстэрні.

Адначасова з удасканаленнем структуры навучальных устаноў у пасляваенныя гады праводзілася значная работа па ўмацаванні матэрыяльнай базы школ, будаўніцтве тыпавых школьных будынкаў. Менавіта ў 1970—1980-я гады былі пабудаваны Крупская школа № 2, Халопеніцкая, Ухвальская, Бобрская, Язбоўская, Янаўшчынская, Хацюхоўская, Худавецкая, Абчугская, Слабадская, Ігрушкаўская, Нацкая сярэднія школы, Шчаўроўская і Гапонавіцкая васьмігадовыя. З 1962 г. ў раёне працуе дзіцячая юнацкаспартыўная школа. У 1965 г. адкрыўся раённы Дом піянераў і школьнікаў. З мэтай удасканалення працоўнага выхавання і прафесійнай арыентацыі навучэнцаў з 1969 г. было ўведзена вывучэнне ў школах аўтасправы і трактара. У 1976 г. былі адкрыты Ухвальскі, у 1986 г. — Крупскі вучэбна-вытворчыя камбінаты.

Дзіцячая пляцоўка ў в. Гапонавічы. 1990 г.

Да 1988 г. ў раёне дзейнічалі 19 сярэдніх, 11 васьмігадовых і 10 пачатковых школ, дзе навучалася 5228 дзяцей. Вучэбна-выхаваўчую работу ў гэты час вялі 634 педагогі, пераважная большасць якіх мела вышэйшую і няпоўную вышэйшую адукацыю. У іх ліку 32 чал. ўзнагароджаны значком «Выдатнік асветы БССР», 2 — «Выдатнік асветы СССР», 4 настаўнікі былі ўзнагароджаны ордэнамі, 86 — граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Міністэрства асветы БССР. Заслужанай павагай навучэнцаў, іх бацькоў карысталіся дырэктар Дакудаўскай школы Соф'я Емяльянаўна Лапарэвіч, завуч Крупскай школы № 2 Аляксандра Нічыпараўна Мінкова і інш. У 1990-я гады былі ўзведзены будынкі 2 новых школ: СШ № 3 у Крупках і Коласаўскай СШ, рэарганізаваны з няпоўных сярэдніх у сярэднія Дакудаўская, Ротаньская, Старослабадская школы, на базе Халопеніцкай школы-інтэрната створаны сіроцкі дзіцячы дом. На 1998 г. у раёне дзейнічаюць 25 сярэдніх, 6 базавых, 6 пачатковых школ, 27 дзіцячых

дашкольных устаноў, вячэрняя агульнаадукацыйная школа, дзіцячая юнацка-спартыўная школа, на базе Дома піянераў і школьнікаў адкрыўся цэнтр дзіцячай творчасці, ёсць турбаза. У школах і дашкольных дзіцячых установах займаюцца 6256 дзяцей. Вучэбна-выхаваўчы працэс ажыццяўляюць 782 педагогі, з іх 646 — з вышэйшай адукацыяй. Яны перыядычна праходзяць пераатэстацыю. На яе аснове 159 чалавекам была прысвоена ў 1998 г. другая катэгорыя, 462 — першая і 646 — вышэйшая.

У апошнія гады ў адукацыйны працэс былі ўведзены новыя прагрэсіўныя метады выкладання. Ва ўсіх сярэдніх школах абсталяваны класы інфарматыкі, вялікая ўвага стала адводзіцца дыферэнцыяцыі навучальнага працэсу. У 8 школах замежную мову пачалі вывучаць з 1-га класа, на базе СШ № 3 і № 1 у Крупках, Коласаўскай СШ працуюць класы развіваючага абучэння. 262 школьнікі ахоплены профільнай вучобай, 227 — паглыбленым вывучэннем прадметаў, працуюць 8 спецыялізаваных класаў. Рэалізуецца праграма «Таленавітыя дзеці».

З 1996 г. ў раёне працуюць 4 школы з ухіламі: СШ № 3 у Крупках — з эстэтычным, Коласаўская СШ — са спартыўным, Стараслабадская СШ — з краязнаўчым, Слабадская СШ — з экалагічным.

Дзеці, якія цікавяцца спортам, маюць магчымасць займацца ў ДЮСШ, удзельнічаць у спартакіядзе школьнікаў. Добрых вынікаў дабіваюцца спартсмены-гімнасты, якія ў 1996 г. і 1997 г. занялі 1-е месца ў Рэспубліканскай спартакіядзе. Неаднаразова прызёрамі абласных спаборніцтваў станавіліся выхаванцы секцый лёгкай атлетыкі, боксу. Магчымасці займацца спортам пашырыліся з пабудовай у Крупках новага стадыёна і фізкультурна-аздараўленчага комплексу.

Культура

У раёне налічваецца 150 работнікаў культурных устаноў. Сярод іх нямала высококваліфікаваных спецыялістаў, энтузіястаў сваёй справы. Гэта загадчыкі бібліятэк: Ротанскай — С.І.Шрэрбак, Баркоўскай — В.А.Асташка, Нацкай — Р.С.Марцынкевіч і інш.

Добра працавалі Крупскі раённы Дом культуры, Камяніцкі сельскі Дом культуры, Баркоўскі і Лісічанскі клубы, установы Худавецкай цэнтралізаванай клубнай сістэмы, у якую ўваходзілі 2 дамы культуры, 2 сельскія клубы, 3 дамы агітатара.

Шмат гадоў лепшым Домам культуры з'яўляўся Крупскі сельскі Дом культуры. Яго дырэктар і кіраўнік мастацкай самадзейнасці Алена Іванаўна Сманцар не адзін дзесятак гадоў аддала культрабоце. Калектывы Дома культуры неаднаразова займалі першыя месцы ў аглядах мастацкай самадзейнасці, прымалі ўдзел ва ўсесаюзных фестывалях самадзейнай творчасці.

У 1987 г. 80% клубных устаноў размяшчаліся ў прыстасаваных памяшканнях, а 50% не мелі пакояў для гурткovай работы.

У 1988 г. 2661 чал. удзельнічалі ў розных гуртках мастацкай і творчай самадзейнасці. Аднак пагаршэнне матэрыяльнага становішча насельніцтва ў гады перабудовы, маральная прыгнечанасць перад будучыняй амаль удвая скарацілі колькасць мастацкіх калектываў і іх удзельнікаў.

Вялікую ролю ў павышэнні культуры чалавека мае кніга, таму дзейнасць бібліятэк з'яўляецца важным момантам у гэтым напрамку. Метадычна дапамагае іх працы Крупская раённая бібліятэка. Яна мае вялікі кніжны фонд, у якім захоўваюцца унікальныя выданні.

У 1991 г. ў раёне налічвалася 47 бібліятэк, у іх было 521,6 тыс. экзэмпляраў кніг. У іх памяшканнях праходзяць выстаўкі твораў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, гучаць іх творы на роднай мове, праходзяць прэзентацыі іх кніг, адзначаюцца юбілеі.

В.Г.Грыгор'ева, Дз.М.Хромчанка.

ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ПРАЦАЙ

ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

ПЯТРУШЫНА Вера Андрэеўна, нарадзілася 5.11.1939 г. ў в. Кутавец Крупскага раёна. З 1954 г. працавала свінаркай племзавода «Рэканструктар» Талачынскага раёна. Званне Героя прысвоена ў 1973 г. за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі. Узнагароджана 2 ордэнамі Леніна, медалямі. Жыве ў в. Райцы Талачынскага раёна.

УСОШЫН Уладзімір Іосіфавіч, нарадзіўся 1.2.1911 г. ў в. Радзіца Крупскага раёна. У 1929 г. ў вёсцы быў створаны калгас, бацька Уладзіміра ўступіў у яго адзін з першых. Разам з бацькам у калгасе працаваў і Уладзімір, марыў стаць трактарыстам. У 1935 г. паступіў на курсы. Пасля вучобы атрымаў новы трактар, на якім і шчыраваў шмат гадоў. Як толькі надыходзіў час уборкі лёну, Уладзімір Іосіфавіч перасаджваўся на льноцерабілку. У 1939 г. за дасягнутыя поспехі па ўборцы лёну ўдастоены права ўдзельнічаць ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Быў узнагароджаны залатым, сярэбраным і бронзавым медалямі ВДНГ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З сярэдзіны 1950-х гадоў 3 гады разам з трактарыстам Мікалаем Куляшом перавыконвалі заданне: пры норме 40 церабілі па 160 га лёну, у 1958 г. — 200. Званне Героя прысвоена ў 1958 г. Жыве ў в. Радзіца. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

ЯКІМАЎ Пётр Іванавіч, нарадзіўся 25.9.1915 г. ў Крупках. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Заслужаны работнік прафтэхадукацыі БССР. Званне Героя прысвоена ў 1971 г. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 іншымі ордэнамі, медалямі.

АРДЭНАНОСЦЫ

Узнагароджаныя ордэнам Леніна

(у дужках прыведзены даты ўзнагароджання)

БАГАДЗЯЖ Леанід Рыгоравіч, нарадзіўся 2.5.1932 г. ў в. Казубец Крупскага раёна. З 1948 г. працаваў рабочым, потым трактарыстам калгаса «Сцяг камунізму», з 1953 г. трактарыст, брыгадзір трактарнай брыгады калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1973). Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1976). Жыве ў в. Казубец.

БАРАБАНАВА Марыя Прохараўна, нарадзілася ў 1934 г. ў в. Дакудава Крупскага раёна. Працавала даяркай, памочнікам брыгадзіра ў калгасе «Бальшавік» (1984). Узнагароджана таксама медалямі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1971—75 гг. З 1992 г. на пенсіі. Жыве ў в. Дакудава.

БАРАБОЛЯ Яўген Лявонцьевіч, нарадзіўся 25.4.1931 г. ў в. Навесы Крупскага раёна. З 1964 г. працаваў трактарыстам ў саўгасе «Бобр» (1975). Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1982). Жыве ў в. Навесы.

БАРАДАЧ Сцяпан Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Майск Крупскага раёна. З 1953 г. працаваў трактарыстам у Крупскай МТС, з 1961 г. — шафёрам аўтабазы № 16, з

У.І.Усошын (верхні рад, шосты злева) сярод узнагароджаных у Крамлі. 1985 г. Мінск.

В.А.Пятрушына.

М.П.Барабанава.

Я.Л.Бараболя.

В.П.Валаховіч.

1964 г. — шафёрам «Сельсгастэхнікі» (1972). Узнагароджаны таксама ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1976), Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За доблесную працу» (1987). Жыве ў г. Крупкі.

БУРАЯ Ніна Фёдараўна, нарадзілася 18.2.1924 г. ў в. Восава Крупскага раёна. З 1931 па 1980 г. калгасніца, звеннявая па льну ў калгасе «Бальшавік». Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Жыве ў в. Восава.

ВАЛАХОВІЧ Вера Паўлаўна, нарадзілася ў 1923 г. ў в. Клішана Крупскага раёна. У 1940 г. скончыла курсы шафёраў, працавала ў Янаўшчынскай МТС. Пасля вайны доўгі час працавала ў калгасе «Янаўшчына», потым даяркай на ферме ў в. Клішана (1960). Узнагароджана таксама сярэбраным медалём ВДНГ СССР (1961). Жыве ў в. Клішана.

ГАРА Уладзімір Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1938 г. ў в. Шэйка Крупскага раёна. З 1954 г. трактарыст калгаса імя Калініна (1977). Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1982). Жыве ў в. Шэйка.

КЛЯШЧОНАК Мікалай Давыдавіч, нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Вялікі Вязок Крупскага раёна. З 1945 г. працаваў рабочым, потым брыгадзірам у калгасе «Дзянісавічы» (1986). Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак пашаны». Жыве ў в. Вялікі Вязок.

ЛІЦВІН Аляксей Захаравіч. Працаваў старшынёй калгаса «Перамога» (1971). Узнагароджаны таксама ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1973), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1976).

ПЯТРУШЫНА Вера Андрэеўна, гл. ў арт. Героі Сацыялістычнай Працы.

РЭУТ Пётр Ігнатавіч, нарадзіўся 1.7.1932 г. Працаваў механізатарам у калгасе імя Калініна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна

А.І.Шынкароў.

(1973), Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўную адзнаку». Жыве ў в. Худаўцы.

СТАЛЬМАХОВІЧ Ефрасіння Макараўна. Працавала цялятніцай на эксперыментальнай базе «Эса» (1971).

ШЫНКАРОЎ Аркадзь Ільіч, нарадзіўся ў 1934 г. ў в. Навесы Крупскага раёна. З 1955 г. працаваў трактарыстам у Залескай МТС, калгасе «Чырвоны сцяг», саўгасе «Бобр». Узнагароджаны таксама ордэнамі Дружбы народаў (1981), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1982). Жыве ў в. Навесы.

ЯКІМАЎ Пётр Іванавіч, гл. ў арт. Героі Сацыялістычнай Працы.

Узнагароджаныя ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі

АСІНСКАЯ Надзея Пятроўна, нарадзілася 1.1.1939 г. ў в. Слабада Крупскага раёна. З 1955 г. рабочая саўгаса «Сялява», з 1965 г. даяркa на эксперыментальнай базе «Эса» (1976). Узнагароджана таксама ордэ-

Ф.І.Гілевіч.

П.П.Карповіч.

В.П.Касцюкевіч.

П.М.Кульгавы.

С.Р.Яічкін.

нам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973). Жыве ў в. Слабада.

БАРАДАЧ Іван Аляксандравіч, нарадзіўся 21.3.1931 г. ў в. Бярозаўка Крупскага раёна. Працаваў трактарыстам ПМК-67 (1971). Жыве ў в. Бярозаўка.

БЕСПАЯСЬКА Міхаіл Барысавіч. Працаваў брыгадзірам у калгасе імя Кірава (1971).

БУЙВІДОВІЧ Цімафей Сяргеевіч, нарадзіўся 1.1.1912 г. ў в. Версанка Крупскага раёна. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Якімаўка» (1971). Жыве ў в. Версанка.

ГІЛЕВІЧ Фёдар Іванавіч, нарадзіўся 14.1.1930 г. У 1954 г. скончыў курсы механізатараў, працаваў трактарыстам у Ігрушкаўскай МТС, потым у калгасе «Чырвоны сцяг», саўгасе «Бобр» (1973). Жыве ў в. Мачулішча.

ЖЫЛІНСКІ Аляксей Дзям'янавіч. Працаваў тэхнікам-асеменатарам на эксперыментальнай базе «Эса» (1973).

КАРПЕКА Іосіф Пятровіч. Працаваў жывёлаводам у калгасе імя Калініна (1971).

КАРПОВІЧ Павел Пятровіч, нарадзіўся 2.10.1935 г. ў в. Новая Крупка Крупскага раёна. З 1957 г. працаваў рабочым, потым трактарыстам у калгасе «Майскі», з 1970 па 1995 г. трактарыст калгаса імя Леніна. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1972). Жыве ў в. Новая Крупка.

КАСЦЮКЕВІЧ Віктар Піліпавіч. Працаваў старшынёй калгаса «Бальшавік» (1971).

КУЛЬГАВЫ Пётр Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1929 г. Працаваў брыгадзірам у калгасе імя Леніна (1975). Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, сярэбраным медалём ВДНГ СССР (1980). Жыве ў в. Новая Крупка.

НЕСЦЕРАЎ Дзмітрый Іванавіч. Працаваў трактарыстам у калгасе імя Леніна (1971).

ПАЦЭЎ Уладзімір Пятровіч, нарадзіўся ў 1929 г. З 1949 г. працаваў механізатарам у Крупскай МТС, потым у калгасе імя Радзішчава, Крупскім райаб'яднанні «Сельгастэхніка» (1973). Жыве ў г. Крупкі.

РУБАНАЎ Сцяпан Алімпавіч, нарадзіўся ў 1919 г. ў Жлобінскім раёне. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Прайшоў з баямі ад Ленінграда да Берліна. З 1959 г. старшыня калгаса «Камунар» (1971). Калгас неаднаразова быў пераможцам рэспубліканскага і ўсесаюзнага спаборніцтваў, удзельнікам ВДНГ. Узнагароджаны таксама 2 ордэнамі Айчыннай вайны, ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі. Жыве ў г. Крупкі.

СМАРГОВІЧ Іван Міхайлавіч (1971).

ФРАЛОЎ Мікалай Аляксеевіч, нарадзіўся 1.12.1934 г. ў в. Навесы. З 1952 па 1958 г. працаваў на Бобрскім лесазаводзе, з 1965 па 1991 г. — механізатарам саўгаса «Бобр». Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэва-

люцыі (1976), «Знак Пашаны» (1973). Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Мачулішча.

ЯЧКІН Сцяпан Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Маслёнка. Працаваў трактарыстам у Ігрушкаўскай МТС. З 1940 г. у Чырвонай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946—1981 гг. трактарыст, брыгадзір паляводчай брыгады, намеснік старшыні калгаса імя Леніна. Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971). Жыве ў в. Маслёнка.

Н.Я.Астравумава.

Узнагароджаныя ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

АКСЁНАВА Галіна Мікалаеўна, нарадзілася 19.11.1937 г. ў г. Барысаў. З 1960 г. працавала жывёлаводам у саўгасе «Халопенічы», потым у саўгасах «Грушаўскі», «Прыазёрны». Жыве ў в. Ваўкавыск.

АЛЕКСІЕВІЧ Ігар Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1925 г. ў в. Сомры Крупскага раёна. Скончыў педагагічны тэхнікум. З 1944 г. працаваў настаўнікам. З 1953 па 1985 г. загадчык раённай бібліятэкі (1982). Узнагароджаны таксама Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1973), бронзавым медалём ВДНГ СССР. Заслужаны работнік культуры БССР (1976). Жыве ў г. Крупкі.

АЛІСІЕВІЧ Міхаіл Мікалаевіч. Працаваў брыгадзірам у калгасе «Камунар» (1973).

АЛІСІЕВІЧ Соф'я Андрэеўна, нарадзілася 17.5.1938 г. ў в. Каўпыніца Крупскага раёна. Працавала звеннявой у калгасе «Камунар» (1973). Жыве ў в. Колас.

АСІНСКІ Васіль Нічыпаравіч, нарадзіўся 3.5.1938 г. ў в. Слабада. З 1952 г. па 1957 г. працаваў у калгасе «Пралетарская перамога», пасля службы ў радах Савецкай Арміі працаваў шафёрам у райспажыўсаюзе, на Бобрскім лесазаводзе, аўтабазе № 16, з 1968 г. на эксперыментальнай базе «Эса» (1973).

АСІПОВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, нарадзіўся 19.1.1937 г. ў в. Радзіца Крупскага раёна. З 1960 па 1997 г. працаваў брыгадзірам у саўгасе «Халопенічы», упраўляючым вытворчага ўчастка ў саўгасе «Грушаўскі», старшынёй калгаса «Праўда», старшынёй Хацюхоўскага сельсавета (1976). Жыве ў в. Асавец.

АСТРАВУМАВА Ніна Ягораўна, нарадзілася 30.7.1930 г. ў в. Бярозаўка Крупскага раёна. Працавала даяркай у калгасе імя Леніна (1973). Жыве ў в. Бярозаўка.

І.А.Алексіевіч (у цэнтры).

АФАНАСЬЕЎ Іван Афанасьевіч, нарадзіўся 20.10.1920 г. ў в. Прудзіны Крупскага раёна. Працаваў шафёрам аўтабазы № 16 (1977). Жыў у пас. Лянок. Памёр у 1997 г.

БАРАВІК Віктар Андрэевіч, нарадзіўся ў 1932 г. ў в. Касянічы Крупскага раёна. Працаваў трактарыстам у Янаўскай МТС. З 1957 па 1992 г. трактарыст, потым брыгадзір трактарнай брыгады саўгаса «Касянічы» (1973). Жыве ў в. Касянічы.

БУЙВІДОВІЧ Аляксей Васілевіч, нарадзіўся ў 1940 г. З 1956 г. працаваў у калгасе «Шлях Сталіна», потым трактарыстам у Крупскай МТС. З 1960 па 1995 г. трактарыст райаб'яднання «Сельгастэхніка» (1972). Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976), ордэнам Дружбы народаў (1988). Жыве ў в. Куты.

БУЙВІДОВІЧ Іван Васілевіч, нарадзіўся 2.8.1935 г. ў в. Самаседаўка Крупскага раёна (1972). Жыве ў в. Самаседаўка.

БУЛАТ Мар'ян Аляксандравіч, нарадзіўся 1.1.1930 г. ў в. Кухчыцы Круглянскага раёна. З 1960 г. працаваў упраўляючым аддзялення саўгаса «Халопенічы». З 1962 па 1978 г. старшыня калгаса імя Кірава, потым дырэктар райаб'яднання «Сельгасхімія», галоўны аграном калгаса імя Леніна (1971). Узнагароджаны таксама медалём «За працоўную доблесць» (1966). З 1990 г. на пенсіі. Жыў у г. Крупкі. Памёр у 1998 г.

ВАЛАДЗЬКО Сяргей Ягоравіч. Працаваў рабочым, потым звеннявым у саўгасе «Колас» (1973). Памёр у 1982 г.

ВАЛАСАЧ Аляксандр Міхеевіч, нарадзіўся ў 1938 г. З 1962 г. працаваў трактарыстам, потым у саўгасе «Староселле», райаб'яднанні «Сельгастэхніка», цяпер у калгасе «Чырвоны Кастрычнік» (1976). Жыве ў в. Актавія.

ВАРАНОВІЧ Міхаіл Васілевіч, нарадзіўся 1.4.1927 г. З 1954 па 1989 г. працаваў камбайнерам, потым трактарыстам у Залескай МТС, саўгасе «Новая ніва» (1966). Жыве ў в. Ухвала.

ВУСІК Соф'я Цімафееўна, нарадзілася ў 1940 г. ў в. Журавы Крупскага раёна. З 1960 па 1993 г. даярка, цялятніца саўгаса «Слабада» (1971). Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны». Жыве ў в. Слабада.

ГАЙДУК Міхаіл Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Нача Крупскага раёна. З 1948 г. працаваў рабочым на торфапрадпрыемстве. З 1960 па 1991 г. жывёлавод саўгасаў «Бобр», «Колас» (1976). Жыве ў в. Кляновічы.

М.А.Булат.

ГАЛАВАЧ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1928 г. ў в. Язбы Крупскага раёна. З 1944 па 1949 г. працаваў у калгасе імя Леніна. З 1954 па 1989 г. трактарыст Янаўскай МТС, саўгасаў «Сялява», «Дуброўка», «40 год Кастрычніка» (1973). Жыве ў в. Язбы.

ГАНЧАРЭНКА Уладзімір Іванавіч (1972).

ГАРА Кірыл Антонавіч (1973).

ГАРБАЧОЎ Іосіф Іосіфавіч, нарадзіўся 9.3.1932 г. ў в. Старыя Шчаўры Крупскага раёна. З 1947 па 1990 г. працаваў калгаснікам, трактарыстам у калгасе «Сцяг камунізму», потым «Чырвоны Кастрычнік» (1977). Памёр у 1995 г.

ГАРОШКА Ганна Паўлаўна, нарадзілася 27.8.1924 г. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. працавала выхавальніцай, з 1951 г. — выхавальніцай у Крупскім дзіцячым доме, з 1960 г. і да выхаду на пенсію працавала ў групе падоўжанага дня Крупскай сярэдняй школы (1966). Жыве ў г. Крупкі.

ГВОЗДЗІК Ніна Якаўлеўна, нарадзілася 1.7.1937 г. З 1953 па 1992 г. даярка саўгаса «Грушаўскі». Жыве ў в. Ігрушка.

ГУКАВА Іраіда Міхайлаўна, нарадзілася ў 1928 г. Скончыла Ленінградскі сельскагаспадарчы інстытут. З 1953 па 1989 г. працавала аграномам у Грушаўскай МТС, аграномам, галоўным аграномам райупраўлення сельскай гаспадаркі, начальнікам Крупскай дзяржаўнасенінспекцыі (1973). Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1986), медалём «За працоўную доблесць». Жыве ў г. Крупкі.

ДЗЕРАВЯНКА Васіль Антонавіч, нарадзіўся 1.7.1927 г. ў в. Старыя Пышачы Крупскага раёна. З 1951 г. працаваў у калгасе «Чырвоная Слабада», з 1957 па 1987 г. трактарыст саўгаса «Новая ніва», «Ухвала» (1973). Жыве ў в. Старыя Пышачы.

ДРАНІЦА Ганна Паўлаўна, нарадзілася 14.6.1926 г. З 1944 па 1985 г. жывёлавод кал-

гаса «Бальшавік» (1975). Жыве ў в. Дакудава.

ДУБМАН Лешгард Ісакавіч, нарадзіўся 23.2.1936 г. ў Крупках. Скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі. З 1964 г. працаваў інжынерам, потым упраўляючым райаб'яднання «Сельгастэхніка». З 1984 па 1989 г. намеснік старшыні калгаса імя Калініна (1975). Жыве ў г. Крупкі.

ЖЫЛІНСКІ Генадзь Васілевіч. Працаваў у сістэме адукацыі раёна, быў загадчыкам раённага аддзела народнай адукацыі. Працуе ў Мінскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М.Танка. Жыве ў Мінску.

ЗАГАЛАВЕЦ Марыя Макараўна, нарадзілася 3.7.1929 г. ў в. Слабада Крупскага раёна. З 1959 па 1984 г. рабочая, потым цялятніца саўгаса «Сялява» (1982). Жыве ў в. Слабада.

ЗАГАЛАВЕЦ Пётр Яфімавіч, нарадзіўся 10.6.1928 г. ў в. Слабада Крупскага раёна. Працаваў трактарыстам на эксперыментальнай базе «Эса» (1966). Жыве ў в. Слабада.

ЗІНКЕВІЧ Аркадзь Андрэевіч, нарадзіўся 7.1.1933 г. ў в. Казубец Крупскага раёна. Працаваў трактарыстам у калгасе «Сцяг камунізму» (1973). Памёр у 1993.

ЗУЁНАК Зінаіда Рыгораўна, нарадзілася ў 1936 г. ў в. Зачысце Барысаўскага раёна. З 1951 па 1990 г. калгасніца, потым даярка калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1972). Жыве ў в. Белае.

ІВАНОВА Ганна Арсенцьеўна, нарадзілася 1.7.1928 г. ў в. Запуткі Крупскага раёна. З 1957 па 1991 г. палявод, потым даярка саўгаса «40 год Кастрычніка» (1972). Жыве ў в. Запуткі.

В.А.Дзеравянка ў час працы. 1962 г.

В.А.Каліноўская.

Р.І.Камароў.

ІВАНОЎ Пётр Кірылавіч, нарадзіўся ў 1940 г. З 1955 па 1995 г. рабочы, трактарыст калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1973). Узнагароджаны таксама ордэнам Дружбы народаў.

КАЖАМЯКІНА Марыя Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1929 г. ў в. Хальнявічы Крупскага раёна. Завочна скончыла Лепельскае педвучылішча, потым БДУ. Працавала настаўніцай пачатковых класаў, потым у Сялецкай няпоўнай сярэдняй школе. Узнагароджана таксама знакам «Выдатнік народнай асветы БССР».

КАЗАК Сцяпан Мікалаевіч, нарадзіўся 10.1.1932 г. ў в. Слабада Крупскага раёна. З 1946 г. працаваў рабочым у калгасе «Пралетарская перамога», потым трактарыстам у саўгасе «Сялява», з 1961 г. — трактарыстам на эксперыментальнай базе «Эса» (1972). Жыве ў в. Слабада.

КАЛІНОЎСКАЯ Валянціна Арсенцьеўна, нарадзілася 28.12.1938 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. З 1955 г. працавала ў калгасе «Чырвоны сцяг», з 1960 па 1993 г. рабочая, брыгадзір паляводчай брыгады саўгаса «Бобр» (1976). Жыве ў г.п. Бобр.

КАМАРОЎ Рыгор Іванавіч, нарадзіўся 22.12.1934 г. ў в. Маслёнка Крупскага раёна. З 1951 па 1993 г. трактарыст калгаса імя Леніна (1981). Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1972), медалём «За доблесную працу». Жыве ў в. Маслёнка.

КАРАКА Мікалай Сямёнавіч. Працаваў дырэктарам эксперыментальнай базы «Эса» (1973).

КАРПОВІЧ Надзея Аляксандраўна, нарадзілася 20.2.1929 г. З 1944 па 1984 г. аператар Крупскай канторы сувязі (1972). Жыве ў г. Крупкі.

КАЧАН Ганна Цярэнцьеўна, нарадзілася ў 1926 г. ў в. Слабада Крупскага раёна. З 1961 па 1985 г. працавала рабочай, даяркай у саўгасе «Якімаўка» (1973). Жыве ў в. Хацепцава Рузскага раёна Маскоўскай вобл. Расія.

КЛЯШЧОНАК Іван Аляксеевіч. Працаваў шафёрам у саўгасе «Дзянісавічы» (1975).

КОРЗАН Васіль Сяргеевіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Сялява» (1973).

КОСТАЧКА Сяргей Спірыдонавіч, нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Гузовіна Крупскага раёна. З 1939 г. працаваў у калгасе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў у саўгасе «40 год Кастрычніка» (1966). Жыве ў в. Гузовіна.

КРАСОЎСКАЯ Ніна Мацвееўна, нарадзілася 1.4.1934 г. ў в. Ляды Крупскага раёна. З 1949 па 1990 г. працавала ў калгасе імя Колесавай (1973). Узнагароджана таксама медалём «За працоўную доблесць» (1982). Жыве ў в. Ляды.

КРУЦЬКО Мікалай Паўлавіч, нарадзіўся 10.1.1928 г. ў в. Стары Бобр Крупскага раёна. З 1946 па 1990 г. палявод, брыгадзір паляводчай брыгады саўгаса «Бобр» (1973). Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны». Жыве ў в. Стары Бобр.

КРЫШКАВЕЦ Ганна Аляксееўна. Працавала даяркай у калгасе імя Калініна (1975).

КСЯНДЗОЎ Віктар Ігнацьевіч, нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Ротань Крупскага раёна. З 1946 па 1991 г. жывёлавод калгаса імя Колесавай (1986). Жыве ў в. Ротань.

КУЛЬГАВЫ Пётр Фёдаравіч, нарадзіўся 4.1.1923 г. З 1947 па 1986 г. манцёр раённага вузла сувязі (1974). Жыве ў в. Новая Крупка.

КУНІЧКІН Пётр Емяльянавіч, нарадзіўся 6.3.1935 г. ў в. Смародзінка Крупскага раёна. З 1953 г. працаваў рабочым, з 1958 па 1992 г. трактарыст саўгаса «Слабада» (1973). Жыве ў в. Смародзінка.

КУТОЎСКІ Васіль Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1930 г. З 1945 г. працаваў рабочым у саўгасе «Халопенічы», з 1965 па 1990 г. палявод, потым трактарыст эксперыментальнай базы «Эса» (1986).

КУХТА Дзмітрый Нічыпаравіч, нарадзіўся 2.9.1937 г. ў в. Маслёнка Крупскага раёна. З 1953 па 1982 г. трактарыст калгаса імя Леніна (1973). Жыве ў в. Гапонавічы.

КУХТА Яўген Нічыпаравіч, працуе трактарыстам у калгасе імя Леніна (1978). Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1973).

Дз. Н. Кухта.

Я. Н. Кухта.

ЛАПАРЭВІЧ Марыя Пятроўна. Працавала даяркай у калгасе «За мір» (1973).

ЛЕБЕДЗЕЎ Віктар Леанідавіч, нарадзіўся 10.1.1945 г. ў в. Прудзіны Крупскага раёна. З 1962 г. працаваў рабочым, потым трактарыстам у саўгасе «40 год Кастрычніка». З 1995 г. трактарыст саўгаса «Слабада» (1984). Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Прудзіны.

ЛЫТНЯ Надзея Якаўлеўна, нарадзілася 8.3.1929 г. З 1946 г. працавала ў калгасе імя Леніна, з 1957 па 1987 г. даярка саўгасаў «Сялява», «40 год Кастрычніка», «Дуброўка» (1971). Жыве ў в. Вялікі Камянец.

ЛЯСУН Сяргей Арцёмавіч, нарадзіўся 28.2.1932 г. ў в. Дакудава Крупскага раёна. З 1955 г. працаваў трактарыстам у Прыямінскай МТС, з 1962 па 1992 г. трактарыст калгаса «Бальшавік» (1973). Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1984). Жыве ў в. Дакудава.

ЛЯЎША Іван Нічыпаравіч, нарадзіўся 5.1.1930 г. ў в. Ігрушка Крупскага раёна. Працаваў рабочым у калгасе «Шлях Сталіна», з 1950 па 1991 г. трактарыст Грушаўскай МТС (1966). Жыве ў в. Ігрушка.

ЛЯШКОЎ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1927 г. ў в. Новая Крупка Крупскага раёна. З 1953 па 1987 г. шафёр Крупскага райспажыўсаюза (1977). Жыве ў в. Новая Крупка.

МАКАРЭВІЧ Іосіф Лукіч, нарадзіўся 19.8.1928 г. ў в. Шынкі Крупскага раёна. З 1944 г. працаваў рабочым у саўгасе «Чырвоны колас», з 1955 па 1989 г. загадчык магазіна Ухвальскага сельпо (1974). Жыве ў в. Шынкі.

МАКАЎКА Любоў Сцяпанаўна. З 1953 па 1982 г. палявод, звеннявая калгаса імя Колесавай (1973). Жыве ў в. Скарадзіца.

МАРЦЫНКЕВІЧ Антаніна Пятроўна. Працавала жывёлаводам у калгасе «Перамога» (1973).

МІКАЛАЕНКА Пётр Купрыянавіч. Працаваў шафёрам у калгасе «Якімаўка» (1973).

МІКУЛЬЧЫК Аляксей Рыгоравіч, нарадзіўся 15.3.1932 г. ў в. Кутавец Крупскага раёна. З 1953 па 1991 г. настаўнік Смародзінскай няпоўнай сярэдняй школы (1979). Жыве ў в. Кутавец.

МІКУЛЬЧЫК Валянціна Іосіфаўна, нарадзілася ў 1942 г. ў в. Покрашава Слуцкага раёна. З 1963 г. працавала ў Крупскім раёне. Скончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. З 1975 г. працавала эканамістам у саўгасе «Касянічы», потым у калгасе імя Леніна (1986). Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1981). Жыве ў г. Крупкі.

МІРОНАВА Вольга Арцёмаўна, нарадзілася ў 1944 г. ў в. Выдрыца Крупскага раёна. З 1959 г. працавала рабочай у саўгасе «Дзмітрыевічы», з 1969 г. — цялятніцай, потым даяркай у калгасе імя Кірава (1983). Узнагароджана таксама ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Выдрыца.

МІРОНАЎ Уладзімір Аркадзевіч. Працаваў трактарыстам у калгасе імя Кірава (1973).

НІШЧАНКА Ганна Пятроўна. Працавала свінаркай у калгасе «Сцяг камунізму» (1976).

ПРАТАСЕВІЧ Васіль Ларыёнавіч. Працаваў брыгадзірам у саўгасе «Ухвала» (1973).

РАБЕЦ Валянціна Радзівонаўна, нарадзілася ў 1928 г. ў в. Гарадзішча Крупскага раёна. З 1945 г. працавала рабочай, з 1970 па 1984 г. даярка калгаса «Халопенічы» (1975). Жыве ў в. Гарадзішча.

РАДУШКЕВІЧ Міхаіл Ягоравіч. Працаваў у райаб'яднанні «Сельгастэхніка», потым кіраўнік ПМК-195 (1973).

РАЗУМОВІЧ Марыя Лявонцьеўна, нарадзілася 25.6.1924 г. ў в. Вялікія Жаберычы Крупскага раёна. З 1957 па 1987 г. палявод, жывёлавод калгаса «Камунар». Жыве ў в. Колас.

РАМАНАВА Зоя Васілеўна, нарадзілася ў 1938 г. З 1952 па 1992 г. даярка калгаса імя Леніна (1981). Узнагароджана таксама медалём «За працоўную адзнаку» (1985). Жыве ў в. Вялікая Слабада.

РАПІЦКІ Уладзімір Міхайлавіч. Працаваў жывёлаводам у калгасе імя Колесавай (1976).

З.В.Раманава.

Л.І.Сазонава.

РУБІН Васіль Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1941 г. З 1955 г. рабочы, з 1964 па 1996 г. трактарыст саўгаса «Халопенічы» (1973).

САЗОНАВА Лідзія Іпалітаўна. З 1957 г. і да выхаду на пенсію працавала даяркай у саўгасе «Сялява» (1960). Узнагароджана таксама бронзавым медалём ВДНГ СССР.

САКАВЕЦ Уладзімір Еўдакімавіч, нарадзіўся 1.5.1937 г. ў в. Малы Вязок Крупскага раёна. З 1961 па 1992 г. трактарыст саўгаса «Дзянісавічы» (1976). Жыве ў в. Малы Вязок.

САЛАЎЁВА Надзея Іпалітаўна, нарадзілася ў 1932 г. З 1957 па 1987 г. цялятніца калгаса імя Леніна (1973). Жыве ў в. Вялікая Слабада.

САМСОНАЎ Васіль Іванавіч. Працаваў трактарыстам на эксперыментальнай базе «Эса» (1976). Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1973).

СВІДЗЕРСКІ Несцер Арсенцьевіч, нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Лагі Крупскага раёна.З 1960 па 1986 г. рабочы саўгаса «Абчуга» (1973). Жыве ў в. Лагі.

СІДЛЯРОНАК Уладзімір Канстанцінавіч. З 1945 па 1987 г. трактарыст калгасаў «За мір», «Бальшавік» (1973). Жыве ў в. Малыя Жаберычы.

СІНЕВІЧ Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся 16.7.1931 г. ў в. Лешня Капыльскага раёна. З 1948 г. працаваў у калгасе імя Ульянава. У 1958 г. скончыў сельскагаспадарчы тэхнікум. Працаваў галоўным заатэхнікам у саўгасе «Абчуга». З 1965 г. дырэктар саўгаса «Касянічы», з 1972 па 1991 г. дзяржінспектар па закупках, галоўны заатэхнік, начальнік аддзела ўпраўлення сельскай гаспадаркі (1971). Жыве ў г. Крупкі.

СІНЯК Пётр Захаравіч, нарадзіўся ў 1932 г. З 1960 па 1991 г. трактарыст саўгасаў

«Дзянісавічы», «Ухвала» (1988). Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1973), медалём «За працоўную доблесць» (1986).

СТАРАВОЙТАЎ Мікалай Дзям'янавіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Халопенічы» (1976).

СТРАШКО Рыгор Максімавіч, нарадзіўся 27.2.1930 г. ў г.п. Бобр. З 1947 па 1990 г. тэхнолаг, брыгадзір дрэваапрацоўчага камбіната (1978). Жыве ў г.п. Бобр.

СУМАН Настасся Цімафееўна, нарадзілася ў 1929 г. ў в. Слабада Крупскага раёна. З 1959 па 1984 г. даярка эксперыментальнай базы «Эса» (1976). Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1981).

СУХАДОЛАВА Ганна Прохараўна. Працавала цялятніцай у саўгасе «Бобр» (1982).

СЯЛІЦКАЯ Эмілія Трыфанаўна, нарадзілася ў в. Смародзінка Крупскага раёна. З 1951 па 1988 г. палявод, даярка калгаса «Слабада» (1986). Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1981).

СЯЛІЦКІ Станіслаў Іванавіч, нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Шкорнеўка Крупскага раёна. З 1960 г. працаваў у саўгасе «40 год Кастрычніка», з 1965 г. рабочы саўгаса «Слабада» (1976). Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Шкорнеўка.

СЯРГЕЕВА Лідзія Іванаўна, нарадзілася 22.2.1929 г. З 1948 г. працавала майстрам на Лёзненскім, Ушацкім, Гарадоцкім, Бешанковіцкім ільнозаводах. З 1961 па 1984 г. — майстар, потым намеснік дырэктара Крупскага ільнозавода (1973). Зараз на пенсіі, жыве ў пас. Лянок.

ТРУС Аляксей Іванавіч, нарадзіўся ў 1938 г. З 1954 па 1998 г. брыгадзір паляводчай брыгады саўгаса «Дзянісавічы» (1981). Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнай славы III ступені (1975). Жыве ў в. Папарнае.

ФАМІН Уладзімір Мікалаевіч, нарадзіўся 5.9.1927 г. ў в. Куты Крупскага раёна. З 1960 па 1989 г. трактарыст саўгаса «Бобр». Жыве ў в. Замкі.

ФІЛІППОВІЧ Вольга Пятроўна, нарадзілася 9.6.1927 г. З 1944 г. калгасніца калгаса «Усход», з 1960 па 1991 г. рабочая саўгаса «Старасселле» (1971). Жыве ў в. Старасселле.

ХАДАСЕВІЧ Галіна Васілеўна, нарадзілася ў 1935 г. ў в. Нача Крупскага раёна. З 1954 па 1986 г. палявод, даярка калгасаў «Камунар», «Бальшавік» (1973). Жыве ў в. Дакудава.

Е.П.Хадасевіч.

У.Дз.Арлоўскі.

ХАДАСЕВІЧ Ефрасіння Пятроўна, нарадзілася ў 1930 г. ў в. Гапонавічы Крупскага раёна. З 1949 па 1988 г. цялятніца калгаса імя Леніна (1976). Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1971). Жыве ў в. Гапонавічы.

ХАДАСЕВІЧ Зінаіда Аляксееўна, нарадзілася ў 1933 г. З 1950 па 1989 г. працавала ў калгасе «Бальшавік» (1976). Жыве ў в. Дакудава.

ХАРЛАМАЎ Міхаіл Рыгоравіч. Працаваў трактарыстам у калгасе імя Калініна (1973).

ХУРС Уладзімір Віктаравіч. Працаваў галоўным аграномам калгаса «Бальшавік» (1973).

ЦЕРАШКОЎ Іван Іванавіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Сялява» (1976).

ЦІШКАВЕЦ Вольга Мікалаеўна, нарадзілася ў 1913 г. Працавала трактарысткай, звеннявой па льну ў калгасе «Камунар» (1966). Памерла ў студзені 1998 г.

ЧЫБІРАК Віктар Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1924 г. З 1954 па 1993 г. трактарыст Залескай МТС (1975). Узнагароджаны таксама медалём «За доблесную працу». Жыве ў г. Крупкі.

ШАПЛОЎ Леанід Пятровіч. Працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады ў саўгасе «Грушаўскі» (1973).

ШЧУРКО Віктар Іванавіч, нарадзіўся 29.10.1929 г. Скончыў Смілавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. Працаваў аграномам у Уздзенскай МТС, потым інструктарам РК КПБ. З 1963 г. старшыня калгаса імя Леніна, з 1974 па 1991 г. інструктар Крупскага РК КПБ (1971). Жыве ў г. Крупкі.

ЮРКЕВІЧ Мікалай Паўлавіч, нарадзіўся ў 1931 г. ў в. Вязок Крупскага раёна. З 1956

па 1991 г. трактарыст калгаса «Дзянісавічы» (1973). Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны» (1986). Жыве ў в. Вялікі Вязок.

ЮШКО Мікалай Мікітавіч, нарадзіўся 5.10.1928 г. ў в. Новыя Шчаўры Крупскага раёна. З 1953 па 1990 г. палявод, трактарыст, жывёлавод калгасаў «Сцяг камунізму», «Чырвоны Кастрычнік» (1976). Жыве ў в. Новыя Шчаўры.

ЯЦЭВІЧ Соф'я Аляксандраўна, нарадзілася 19.8.1923 г. ў в. Ярцава Яраслаўскага раёна. З 1959 па 1974 г. даярка саўгаса «Дзянісавічы» (1971). Жыве ў в. Шынкі.

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў

БАГАМОЛАЎ Аляксандр Аляксандравіч, нарадзіўся 25.3.1934 г. ў в. Вялікая Слабада Крупскага раёна. З 1952 г. працаваў шафёрам калгаса імя Леніна (1986). Узнагароджаны таксама ордэнам Чырвонага Сцяга (1973). Жыве ў в. Вялікая Слабада.

ГАНЧАРОВА Надзея Сямёнаўна, нарадзілася 1.9.1938 г. ў в. Узнацк Крупскага раёна. З 1955 па 1991 г. калгасніца, даярка, механізатар калгаса «Новы шлях», потым саўгаса «Прызыў» (1988). Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Кругліца.

ПЯТРУШЫН Васіль Іванавіч, нарадзіўся 20.2.1940 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. З 1961 г. працаваў трактарыстам у калгасе «Бобр» (1986). Узнагароджаны таксама ордэнамі Працоўнай славы III, II ступеняў (1975, 1976). Жыве ў г.п. Бобр.

ШАРАПАВА Марыя Дзмітрыеўна, нарадзілася ў в. Сакалавічы Крупскага раёна. З 1949 г. працавала ў калгасе «Перамога», потым жывёлаводам у калгасе «Бобр» (1985). Жыве ў в. Сакалавічы.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны»

АКУЛЬЧЫК Галіна Аляксандраўна, нарадзілася 10.5.1944 г. ў в. Вараб'ёўка Арлоўскай вобласці. З 1962 г. працавала галоўным аграномам калгаса «Камунар», з 1975 г. працуе старшынёй Нацкага сельсавета (1983). Узнагароджана таксама медалём «За працоўную доблесць». Жыве ў в. Нача.

АКУНЕВІЧ Зінаіда Іларыёнаўна, нарадзілася 5.1.1929 г. ў в. Малыя Жаберычы Крупскага раёна. З 1950 г. калгасніца калгаса «За мір», з 1969 г. працавала жывёлаводам (1973). Жыве ў в. Малыя Жаберычы.

АЛЕКСІЕВІЧ Адам Фёдаравіч, нарадзіўся 27.2.1934 г. ў в. Сомры Крупскага раёна. З 1951 г. працаваў рабочым, потым трактарыстам у саўгасе «Новая ніва» (1976). Жыве ў в. Сомры.

АЛЕКСІЁНАК Вера Рыгораўна, нарадзілася 6.1.1928 г. ў в. Хацюхова Крупскага раёна. З 1946 г. калгасніца, потым жывёлавод калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1973). Жыве ў в. Хацюхова.

АЛЯКСЕЕЎ Пётр Сцяпанавіч, нарадзіўся 10.3.1932 г. ў в. Гапонавічы Крупскага раёна. З 1950 г. рабочы Барысаўскага аўтарэмзавода. Пасля службы ў Савецкай Арміі з 1955 г. працаваў токарам на Крупскім ільнозаводзе (1971). Жыве ў пас. Лянок.

АНТАНЕВІЧ Ева Ціханаўна, нарадзілася 1.1.1933 г. ў в. Лужа Крупскага раёна. З 1960 г. працавала рабочай у саўгасе «Халопенічы», потым у саўгасе «Стараселле» (1986). Узнагароджана таксама медалём «За працоўную адзнаку». Жыве ў в. Лужа.

АПАЛІНСКАЯ Ніна Мікалаеўна, нарадзілася 4.1.1918 г. ў г. Апочка Пскоўскай вобласці. Працавала цырульнікам РКБА (1982). Жыве ў г. Крупкі.

АРЛОЎСКАЯ Ганна Сцяпанаўна, нарадзілася 12.1.1932 г. Скончыла Магілёўскую фельчарска-акушэрскую школу. З 1952 г. акушэрка, з 1960 па 1993 г. загадчыца Шынкаўскага фельчарска-акушэрскага пункта (1971). Узнагароджана таксама медалём «За працоўную доблесць» (1983). Жыве ў в. Шынкі.

АРЛОЎСКІ Уладзімір Дзянісавіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Стараселле» (1976). Памёр у 1993.

АРЛОЎСКІ Фёдар Яфімавіч, працаваў у калгасе «Бальшавік» (1986).

БАРАБАНАВА Аляксандра Андрэеўна, нарадзілася 25.4.1924 г. ў в. Малыя Жаберычы. З 1950 г. працавала ў калгасе «Бальшавік», з 1972 па 1990 г. цялятніца калгаса «Бальшавік» (1976). Жыве ў в. Дакудава.

БАРАВІК Вольга Пятроўна, нарадзілася ў 1931 г. ў в. Касянічы Крупскага раёна. З 1950 па 1987 г. рабочая саўгаса «Касянічы» (1973). Жыве ў в. Касянічы.

БАРАВІК Ніна Іванаўна, нарадзілася ў 1932 г. ў в. Касянічы Крупскага раёна. З 1951 па 1988 г. даярка, потым цялятніца саўгаса «Касянічы» (1986). Жыве ў в. Касянічы.

БАРАВУЛЯ Валянціна Захараўна, нарадзілася ў 1937 г. ў в. Гумны Крупскага раёна. З 1960 па 1993 г. жывёлавод саўгаса «Ухвала» (1973). Жыве ў в. Гумны.

БАРАНОЎСКІ Пётр Іванавіч, нарадзіўся 1.7.1934 г. ў в. Ротань Крупскага раёна. З 1949 г. працаваў трактарыстам Грушаўскай, потым Крупскай МТС, з 1958 па 1992 г. — трактарыст калгаса імя Колесавай. Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Ротань.

БАРОЎСКІ Браніслаў Антонавіч, нарадзіўся ў 1932 г. ў в. Шарнёва Крупскага раёна. З 1961 па 1991 г. брыгадзір, старшыня прафкома саўгаса «Слабада» (1973). Жыве ў в. Шарнёва.

БАРОЎСКІ Леанід Дарафеевіч. Працаваў машыністам торфабрыкетнага завода «Туршоўка» (1971).

БЕЛЫ Мікалай Міхеевіч. Працаваў рабочым у саўгасе «Новая ніва» (1973).

БЛІЗНЕЦ Іван Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1933 г. ў в. Баркі Крупскага раёна. З 1949 па 1952 г. калгаснік калгаса імя Леніна. Пасля службы ў Савецкай Арміі працаваў рабочым у саўгасе «Сялява» (1973). Жыве ў в. Баркі.

БРУСОЧКІН Мікалай Захаравіч, нарадзіўся 12.2.1926 г. ў в. Калодніца Крупскага раёна. З 1948 па 1986 г. трактарыст Янаўшчынскай МТС, потым саўгаса «Авангард» (1966). Жыве ў в. Калодніца.

БУРАЯ Надзея Пятроўна, нарадзілася ў 1922 г. ў в. Восава Крупскага раёна. З 1944 па 1989 г. калгасніца калгаса «Бальшавік» (1973).

БУТРЫНАЎ Пётр Іванавіч, нарадзіўся ў 1931 г. ў в. Забор'е Крупскага раёна. З 1957 па 1991 г. рабочы саўгаса «Абчуга» (1975). Жыве ў в. Забор'е.

БЫКАВА Варвара Сцяпанаўна, нарадзілася ў 1925 г. ў в. Запруддзе Крупскага раёна. З 1945 па 1995 г. калгасніца калгаса «Сцяг камунізму» (1978). Жыве ў в. Запруддзе.

БЫКАВА Марыя Пятроўна, нарадзілася ў 1937 г. Працавала ў калгасе імя Леніна (1956). Узнагароджана таксама медалём «За працоўную доблесць» (1971). Зараз на пенсіі, жыве ў в. Гапонавічы.

БЫКАЎ Анатоль Леанідавіч, нарадзіўся 16.9.1939 г. ў в. Тарнякі Маладзечанскага раёна. Працаваў трактарыстам у калгасе «За мір» (1982). Жыве ў в. Прошыка.

ВАЛАХОВІЧ Настасся Кірылаўна, нарадзілася 20.2.1933 г. ў в. Струга Крупскага раёна. З 1960 па 1988 г. рабочая, даярка саўгаса «Сялява», потым даярка эксперыментальнай базы «Эса» (1987). Жыве ў в. Слабада.

ВУСІК Ліна Васілеўна. У 1975 г. завочна скончыла БДУ. З 1972 г. працуе настаўніцай ва Ухвальскай сярэдняй школе (1986).

М.П.Быкава.

К.П.Зайцаў.

ВЫЧАНКОЎ Аляксандр Свірыдавіч, нарадзіўся 10.7.1942 г. ў в. Мялоўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. З 1969 па 1977 г. заатэхнік калгаса «Бальшавік», потым дырэктар саўгаса «Слабада», з 1985 г. працуе дырэктарам Халопеніцкага масласырзавода (1973). Жыве ў г.п. Халопенічы.

ГАРА Ганна Сцяпанаўна, нарадзілася ў 1922 г. ў в. Выдрыца Крупскага раёна. З 1938 па 1977 г. калгасніца калгаса імя Кірава (1973). Жыве ў в. Выдрыца.

ГАРА Пётр Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1934 г. ў в. Малое Горадна Крупскага раёна. З 1956 г. працаваў трактарыстам у саўгасе «Энтузіяст», з 1960 па 1993 г. — у калгасе імя Кірава (1973). Жыве ў в. Малое Горадна.

ГАРБАЧОЎ Іосіф Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1932 г. ў в. Старыя Шчаўры Крупскага раёна. Працаваў у калгасе «Сцяг камунізму» (1972). Жыве ў в. Старыя Шчаўры.

ГАРМІНОВІЧ Аляксей Міхайлавіч, нарадзіўся 20.6.1948 г. ў в. Луцішча Крупскага раёна. З 1965 г. працаваў шафёрам, з 1994 г. — трактарыстам у калгасе «Слабада» (1988). Жыве ў в. Чырвоная Слабада.

ГЛІННІК Марыя Якаўлеўна, нарадзілася ў 1934 г. ў в. Малінаўка Крупскага раёна. З 1960 па 1991 г. рабочая, потым цялятніца саўгаса «Халопенічы» (1973). Жыве ў в. Узнацк.

ГЛІНЧЫК Мікалай Мікалаевіч, нарадзіўся 11.7.1942 г. ў в. Баркі Крупскага раёна. З 1962 г. працуе трактарыстам саўгаса «Халопенічы» (1973). Жыве ў в. Баркі.

ГОЛУБ Ганна Аўрамаўна, нарадзілася 1.7.1927 г. ў в. Абольцы Талачынскага раёна Віцебскай вобл. З 1956 па 1988 г. працавала ў калгасе «Бальшавік» Крупскага раёна. Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Дакудава.

ГУДЗІЛІН Іван Мікітавіч. Працаваў трактарыстам (1973).

ДЗЯНІСАЎ Анатоль Васілевіч, нарадзіўся 7.8.1932 г. ў в. Самаседаўка Крупскага раёна. З 1962 па 1989 г. шафёр, потым слесар саўгаса «Грушаўскі» (1975). Жыве ў в. Самаседаўка.

ДОЎГІ Леанід Харытонавіч, нарадзіўся 3.1.1939 г. ў в. Вялікі Камянец Крупскага раёна. З 1957 г. працаваў учотчыкам, потым брыгадзірам у саўгасе «40 год Кастрычніка», з 1968 г. працуе брыгадзірам у калгасе «Дуброўка» (1973). Жыве ў в. Камянец.

ЕПІФАНАЎ Яўген Васілевіч. З 1951 г. працаваў трактарыстам у Грушаўскай МТС, з 1958 па 1982 г. трактарыст калгаса імя Леніна (1975).

ЖУРКО Нічыпар Сільвестравіч, нарадзіўся ў 1920 г. на Віцебшчыне. Працаваў трактарыстам у МТС. З чэрвеня 1941 г. на фронце. Удзельнік баёў на Беларусі. У баі танк, механікам якога быў Н.Журко, падбілі фашысты. Ранены, ён трапіў у палон, адкуль потым уцёк. Вярнуўся ў родныя мясціны, быў разведчыкам, камісарам партызанскага атрада. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працаваў дырэктарам ільнозавода ў г. Чашнікі. У 1951 г. быў накіраваны ў Крупскі раён, дзе кіраваў будоўляй ільнозавода, а потым працаваў яго дырэктарам (1971). Памёр у 1973 г. Узнагароджаны таксама ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

ЗАЙЦАВА Надзея Сямёнаўна. Працавала даяркай у саўгасе «Сялява» (1973).

ЗАЙЦАЎ Канстанцін Паўлавіч. Працоўную дзейнасць пачаў з 1939 г. ў калгасе «Шлях Леніна». З 1957 г. рабочы саўгаса «Сялява».

ЗАЛЯШЧОНАК Міхаіл Васілевіч. Працаваў у калгасе «Чырвоны Кастрычнік» (1973).

ЗГУРОЎСКІ Пётр Емяльянавіч. Працаваў галоўным бухгалтарам Бобрскага лесазавода (1971).

ЗЕЛЯНКОВА Ева Іванаўна. Працавала даяркай у калгасе імя Колесавай (1976).

ЗУЁНАК Аляксандр Васілевіч, нарадзіўся 7.1.1940 г. ў в. Хацюхова Крупскага раёна. З 1963 па 1995 г. трактарыст калгаса «Праўда» (1973). Узнагароджаны таксама ордэнам Славы III ступені (1976). Жыве ў в. Асавец.

ЗУЁНАК Павел Іванавіч, нарадзіўся ў 1937 г. ў в. Мачулішча Крупскага раёна. З 1956 па 1991 г. працаваў трактарыстам у саўгасах «Халопенічы», «Прызыў», «Якімаўка» (1973). Жыве ў в. Мачулішча.

ЗЯБКО Аляксей Яўменавіч. Працаваў галоўным заатэхнікм на эксперыментальнай базе «Эса» (1975).

ІГНАТОВІЧ Аляксандра Іванаўна, нарадзілася ў 1930 г. ў в. Вялікая Слабада Крупскага раёна. З 1946 па 1984 г. калгасніца, жывёлавод калгаса імя Леніна. Жыве ў в. Вялікая Слабада.

ІЗМАЙЛОВІЧ Людвіг Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1934 г. З 1950 г. працаваў у калгасе імя Малянкова. З 1957 па 1994 г. рабочы, трактарыст саўгасаў «Сялява», «Авангард» (1973). Жыве ў в. Высокае.

КАВЕЦКІ Іван Вікенцьевіч, нарадзіўся 20.6.1949 г. ў в. Навасёлкі Валожынскага раёна. У 1971 г. скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. З 1971 г. заатэхнік, галоўны заатэхнік калгаса імя Калініна. У 1977—78 гг. працаваў інструктарам Крупскага РК КПБ, у 1978—96 гг. — старшынёй калгаса «Перамога», потым калгаса імя Леніна. З 1996 г. старшыня Крупскага савета дэпутатаў (1981). Жыве ў Крупках.

КАЖАМЯКА Людміла Пракопаўна, нарадзілася ў 1937 г. ў в. Новая Крупка Крупскага раёна. З 1955 г. працавала загадчыцай магазіна станцыйнага сельпо, з 1984 па 1992 г. рабочая Крупскага хлебазавода (1981). Узнагароджана таксама медалём «За доблесную працу» (1985). Жыве ў в. Новая Крупка.

КАЗЛОВА Вольга Сцяпанаўна, нарадзілася ў 1935 г. ў в. Пярэсіка Крупскага раёна. З 1957 г. працавала загадчыцай магазіна, з 1975 па 1990 г. начальнік вытворчага ўчастка, брыгадзір паляводчай брыгады саўгаса «Прызыў». Жыве ў в. Пярэсіка.

КАЗЛОЎСКІ Анатоль Мікалаевіч, нарадзіўся 5.3.1936 г. ў в. Дзянісавічы Крупскага раёна. З 1963 па 1994 г. працаваў трактарыстам у саўгасе «Дзянісавічы» (1978). Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Дзянісавічы.

КАМІНСКІ Яўген Фадзеевіч, нарадзіўся ў 1936 г. ў в. Клубынічы Крупскага раёна. З 1959 па 1995 г. рабочы, потым трактарыст саўгаса «Касянічы» (1976). Жыве ў в. Клубынічы.

КАМОСКА Мікалай Васілевіч, нарадзіўся 25.5.1939 г. ў в. Вялікае Восава Крупскага раёна. З 1952 г. працаваў паляводам, брыгадзірам паляводчай брыгады калгаса «Праўда». У цяперашні час галоўны аграном калгаса «Праўда» (1973). Жыве ў в. Восава.

КАНДРАТОВІЧ Ганна Пятроўна, нарадзілася ў 1934 г. ў г.п. Халопенічы Крупскага

раёна. З 1954 г. рабочая, свінарка, загадчыца фермы саўгаса «Халопенічы» (1973). Жыве ў г.п. Халопенічы.

КАРАЛЕНЯ Таццяна Мікалаеўна, нарадзілася 7.3.1947 г. ў в. Асавец Крупскага раёна. З 1965 г. настаўніца, з 1975 г. загадчыца метадычнага кабінета райана, з 1991 г. старшыня прафсаюзаў работнікаў адукацыі (1986). Жыве ў г. Крупкі.

КАРПАВА Любоў Антонаўна, нарадзілася ў 1933 г. З 1955 па 1988 г. працавала рабочай на Крупскім ільнозаводзе. Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Вострава.

КАТОЎСКАЯ Галіна Іванаўна, нарадзілася ў 1947 г. ў в. Майск Крупскага раёна. З 1962 г. калгасніца, з 1965 г. па 1997 г. даярка калгаса імя Калініна (1982). Жыве ў в. Майск.

КАХНОЎСКАЯ Галіна Сяргееўна, нарадзілася 22.6.1954 г. ў в. Канатоп Пінскага раёна Брэсцкай вобл. З 1978 па 1995 г. працавала загадчыцай Дзянісавіцкага фельчарска-акушэрскага пункта. Памерла ў 1996 г.

КАЧАН Мікалай Мартынавіч. Працаваў трактарыстам саўгаса «Сялява» (1982).

КЛІЦУК Анатоль Аляксандравіч, нарадзіўся 18.3.1940 г. ў пас. Карма Гомельскай вобласці. У 1965 г. скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. У 1965—69 гг. працаваў інжынерам Крупскай райсельгастэхнікі, галоўным інжынерам раённага ўпраўлення сельскай гаспа·аркі. З 1969 г. першы сакратар Крупскага РК ЛКСМБ, з 1972 г. намеснік старшыні Крупскага райвыканкома, з 1974 г. другі сакратар райкома партыі, з 1977 старшыня Крупскага райвыканкома, з 1979 г. першы сакратар Крупскага РК КПБ. У 1985—97 гг. старшыня раённага камітэта прафсаюзаў работнікаў сельскай гаспадаркі, у 1997—98 гг. начальнік упраўлення рынкавай эканомікі Крупскага райвыканкома (1976). Узнагароджаны таксама медалём «За працоўную доблесць». Жыве ў Крупках.

КЛЯШЧОНАК Юзэфа Восіпаўна, нарадзілася 1.7.1921 г. ў в. Вострава Крупскага раёна. З 1950 па 1975 г. калгасніца, звеняявая па льну ў калгасе «Камунар» (1973). Жыве ў в. Дубешня.

КОХАН Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся ў 1936 г. Скончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут. Працаваў аграномам, з 1967 па 1990 г. дырэктар саўгаса «Колас», начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі, дырэктар эксперыментальнай базы «Эса» (1973). Жыве ў г. Крупкі.

КРАСОЎСКАЯ Валянціна Апанасаўна. Працавала цялятніцай у калгасе імя Колесавай (1981).

КРУЦЬКО Мікалай Паўлавіч. Працаваў брыгадзірам у саўгасе «Колас» (1976). Жыве ў в. Стары Бобр.

КРЫВАРОТАЎ Леанід Мікалаевіч, нарадзіўся 1.4.1930 г. З 1951 г. трактарыст Крупскай МТС, з 1958 па 1990 г. трактарыст саўгаса «Грушаўскі» (1973). Жыве ў в. Ігрушка.

КУР'ЯН Арсен Фёдаравіч, працаваў дырэктарам Малажаберыцкай сярэдняй школы (1965).

КУШНЕР Алена Сцяпанаўна, нарадзілася 5.7.1926 г. ў в. Аляксандраўка Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобл. З 1949 па 1957 г. працавала рабочай на торфазаводах «Туршоўка», «Беліцкае». З 1957 па 1986 г. палявод, звеннявая па льну ў калгасе «Камунар» (1972). Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Колас.

ЛАЗАРЭВІЧ Цімафей Андрэевіч, нарадзіўся 25.9.1947 г. ў в. Гапонавічы Крупскага раёна. Скончыў Смілавіцкі саўгас-тэхнікум. З 1970 г. заатэхнік, з 1977 г. галоўны заатэхнік калгаса імя Леніна (1986). Жыве ў в. Вялікая Слабада.

ЛІКАЙ Уладзімір Георгіевіч, нарадзіўся 1.6.1938 г. ў в. Гук Чырвонаармейскага раёна Саратаўскай вобл. Пасля заканчэння Краснаярскага сельскагаспадарчага інстытута з 1971 г. працаваў у калгасе «Перамога» Крупскага раёна інжынерам, потым намеснікам старшыні, з 1986 г. — майстрам у калгасе імя Колесавай, потым інжынерам у райаб'яднанні «Сельгасхімія» (1978). З 1998 г. на пенсіі. Жыве ў в. Новая Крупка.

ЛУЧЫНА Ія Міхайлаўна, нарадзілася 14.6.1937 г. ў г. Гарадок Віцебскай вобласці. Скончыла Мінскі педінстытут. З 1959 г. настаўніца Выдрыцкай сярэдняй школы, потым Майскай пачатковай школы. З 1969 г. настаўніца Крупскай станцыйнай школы, потым Крупскай сярэдняй школы № 2 (1976). Жыве ў г. Крупкі.

ЛУЧЫНА Тамара Рыгораўна, нарадзілася ў 1940 г. ў в. Вялікае Горадна Крупскага раёна. З 1960 па 1995 г. аграном калгаса імя Кірава, потым галоўны эканаміст, тэхнік-нарміроўшчык (1973). Жыве ў в. Вялікае Горадна.

ЛЫТНЯ Васіль Нічыпаравіч, нарадзіўся 18.1.1944 г. ў в. Вялікі Камянец Крупскага раёна. З 1958 г. рабочы саўгаса «Дуброўка», з 1967 г. трактарыст (1973). Узнагароджаны

І.М.Лучына.

В.М.Мурашка.

таксама ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Вялікі Камянец.

ЛЯШКОВА Галіна Фёдараўна. Працавала свінаркай саўгаса «Колас» (1973).

ЛЯШКОВА Надзея Іванаўна, нарадзілася ў 1924 г. ў в. Стары Бобр Крупскага раёна. З 1961 па 1984 г. рабочая саўгаса (1973).

МАЕЎСКІ Іван Іванавіч. Працаваў старшынёй калгаса імя Калініна. У цяперашні час старшыня райкома прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі (1982). Узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку» (1973). Жыве ў г. Крупкі.

МАЗНЁЎ Пётр Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1933 г. ў в. Узнацк Крупскага раёна. З 1947 г. калгаснік, з 1970 па 1993 г. трактарыст саўгаса «Прыгыў» (1973). Жыве ў в. Узнацк.

МАЙСЕЕЎ Павел Андрэевіч, нарадзіўся 15.2.1927 г. З 1951 г. працаваў шафёрам у саўгасе «40 год Кастрычніка» (1975). Жыве ў в. Прошыка.

МАКОЎСКІ Еўдакім Трыфанавіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Дуброўка» (1976).

МАКРЫЦКІ Васіль Міхайлавіч, нарадзіўся 15.5.1930 г. ў в. Казубец Крупскага раёна. З 1957 па 1989 г. трактарыст калгасаў «Сцяг камунізму», потым «Чырвоны Кастрычнік» (1975). Жыве ў в. Казубец.

МАКСІМАЎ Сцяпан Андрэевіч. Працаваў шафёрам калгаса імя Колесавай (1973). Узнагароджаны таксама медалём «За доблесную працу».

МАЛАСАЙ Вера Нічыпараўна, нарадзілася ў 1935 г. ў в. Востава Крупскага раёна. З 1962 па 1990 г. рабочая льнозавода (1976). Жыве ў в. Востава.

МАЛАСАЙ Уладзімір Фёдаравіч. Працаваў рабочым на Крупскім ільнозаводзе.

МАЛАШЧАНКА Віктар Канстанцінавіч, нарадзіўся 15.3.1930 г. З 1951 г. настаўнік Халопеніцкай школы, з 1956 па 1994 г. дырэктар Язбыўскай сярэдняй школы (1976). Жыве ў в. Язбы.

МАРОЗ Ілья Рыгоравіч. Працаваў жывёлаводам у саўгасе «Стараселле» (1976).

МАРОЗАВА Настасся Савельеўна, нарадзілася ў 1937 г. ў в. Усцінаўка Крупскага раёна. Працавала ў калгасе імя Леніна. Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Усцінаўка.

МАРОЗАЎ Анатоль Аляксандравіч (1973).

МАРЧАНКА Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1942 г. ў в. Якімаўка Крупскага раёна. З 1955 па 1995 г. рабочы, потым шафёр саўгасаў «Халопенічы», «Прыгыў», «Якімаўка» (1975). Жыве ў в. Якімаўка.

МАЦУРА Віктар Сяргеевіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Дзянісавічы» (1973).

МІГАЛЬ Мікалай Уладзіміравіч. Працаваў трактарыстам у калгасе імя Кірава (1975).

МОНІЧ Міхаіл Мікалаевіч, нарадзіўся 17.1.1940 г. ў в. Галькі Крупскага раёна. З 1962 г. працуе трактарыстам у саўгасе «Халопенічы» (1975). Жыве ў в. Мхерына.

МУРАШКА Вера Мікалаеўна, нарадзілася 15.2.1926 г. ў в. Дзеруцкая Чэрвеньскага раёна. З 1947 па 1986 г. аграном, галоўны аграном калгаса імя Калініна (1973). Узнагароджана таксама медалём «За працоўную адзнаку». Жыве ў в. Майск.

НАВАХРОСТ Галіна Іванаўна, нарадзілася 21.9.1938 г. ў в. Навахросты Крупскага раёна. З 1957 па 1993 г. калгасніца калгаса імя Леніна (1984). Жыве ў в. Навахросты.

НАВАХРОСТ Леанід Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1937 г. Працаваў трактарыстам у калгасе «Перамога» (1973). Узнагароджаны таксама бронзавым медалём ВДНГ СССР.

ПАНКАВЕЦ Леанід Сямёнавіч. Працаваў трактарыстам у райаб'яднанні «Сельгасхімія» (1984).

ПІСКУНОВІЧ Алена Яфрэмаўна, нарадзілася ў 1931 г. З 1970 па 1986 г. майстар, потым старшы майстар на Крупскім ільнозаводзе (1977). Жыве ў пас. Лянок.

ПРАХАРЭНКА Ганна Іванаўна, нарадзілася ў 1940 г. ў в. Худаўцы Крупскага раёна. Скончыла Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. З 1958 па 1990 г. галоўны заатэхнік калгаса імя Калініна (1971). Узнагароджана таксама медалём «За працоўную адзнаку» (1981). Жыве ў в. Худаўцы.

Г.І.Прахарэнка.

М.Т.Усошын.

ПРОТКІНА Зінаіда Прохараўна, нарадзілася ў 1931 г. ў в. Кіявец Крупскага раёна. З 1957 па 1988 г. даярка саўгаса «Абчуга» (1973). Жыве ў в. Кіявец.

ПЫЖЫК Васіль Іванавіч. Працаваў трактарыстам у калгасе «Бальшавік» (1973).

РАБЕЦ Соф'я Пятроўна, нарадзілася ў 1933 г. З 1955 па 1980 г. даярка калгаса «Новае жыццё», потым саўгаса «Халопенічы».

РАКАВЕЦ Восіп Сцяпанавіч, нарадзіўся 28.2.1929 г. ў в. Скакоўка Крупскага раёна. З 1948 г. працаваў у калгасе «Перамога», з 1960 па 1989 г. жывёлаводам саўгаса «Бобр» (1986). Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Скакоўка.

РОГАВА Аляксандра Андрэеўна, нарадзілася 20.1.1933 г. ў в. Хацюхова Крупскага раёна. З 1949 г. калгасніца, з 1977 па 1987 г. даглядчыца цялят калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1985). Жыве ў в. Хацюхова.

РОГАВА Вера Іванаўна, нарадзілася ў 1936 г. З 1956 па 1988 г. палявод, потым загадчыца фермы калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1986). Жыве ў в. Хацюхова.

РОГАВА Кацярына Васілеўна, нарадзілася ў 1931 г. ў в. Хацюхова Крупскага раёна. З 1948 па 1985 г. калгасніца, потым даярка калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1976). Жыве ў в. Хацюхова.

РЫБАЧОНАК Пелагея Майсееўна. Працавала настаўніцай ва Ухвальскай сярэдняй школе (1966).

РЭУЦКІ Іван Арсенцьевіч, нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Прудзіны Крупскага раёна. З 1947 па 1988 г. трактарыст саўгаса «Слабада» (1975). Жыве ў в. Прудзіны.

САЛАЎЁЎ Васіль Ягоравіч. З 1955 па 1990 г. працаваў на Бобрскім заводзе музычных дэталей (1971). Жыве ў г.п. Бобр.

САС Яўгенія Еўдакімаўна, нарадзілася ў 1929 г. З 1960 па 1986 г. даярка саўгаса «Слабада» (1976). Жыве ў в. Слабада.

СВІДЗЕРСКАЯ Таццяна Сямёнаўна. Працавала ў саўгасе «Абчуга» (1976).

СІДЛЯРОНАК Аляксандр Мартынавіч. Працаваў трактарыстам у калгасе «За мір» (1972).

СЛАВІНСКАЯ Еўдакія Васілеўна, нарадзілася ў 1928 г. ў в. Шацькі Крупскага раёна. З 1945 па 1988 г. цялятніца калгаса імя Колесавай (1982). Жыве ў в. Ротань.

СЛАВІНСКАЯ Соф'я Аляксандраўна. Працавала жывёлаводам у калгасе імя Колесавай (1976).

СЛІБОРСКІ Мікалай Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1932 г. на хут. Драгавіжы Крупскага раёна. З 1957 па 1981 г. трактарыст саўгаса «40 год Кастрычніка» (1986). Узнагароджаны таксама медалём «За працоўную доблесць» (1966). Жыве ў в. Тапарышча.

СТАРАДУБЕЦ Пётр Валянцінавіч. Працаваў шафёрам у саўгасе «Стараселле», потым на партыйнай, прафсаюзнай рабоце (1975).

СТАСЕВІЧ Надзея Кірылаўна, нарадзілася 1.1.1930 г. ў в. Нача Крупскага раёна. З 1946 па 1953 г. працавала рабочай на торфазаводзе «Туршоўка», з 1964 па 1989 г. — паляводам, жывёлаводам, у калгасе «Камунар» (1973). Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Нача.

СЯДОВА Таццяна Раманаўна. Працавала даяркай у калгасе «Бальшавік» (1981).

ТОЛКАЧ Іван Міхайлавіч, нарадзіўся 28.1.1928 г. ў в. Дудзінка Крупскага раёна. З 1945 па 1988 г. працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады, трактарыстам, майстрам-наладчыкам, брыгадзірам жывёлагадоўчай фермы ў саўгасе «Халопенічы». Жыве ў в. Дудзінка.

УСОШЫН Міхаіл Трафімавіч, нарадзіўся 3.1.1935 г. у в. Радзіца Крупскага раёна. Скончыў сельскагаспадарчы тэхнікум у в. Чырвоны Бераг Гомельскай вобл. З 1960 г. па 1995 г. працаваў у саўгасе «Халопенічы», затым «Грушаўскі» брыгадзірам трактарнай брыгады, інжынерам, галоўным інжынерам (1971). Жыве ў в. Ігрушка.

ФЕДАРЦОЎ Васіль Кірылавіч, нарадзіўся 7.3.1933 г. З 1949 г. працаваў у калгасе «Чырвоны сцяг», з 1958 па 1993 г. станочнік Бобрскага завода музычных дэталей (1974). Жыве ў г.п. Бобр.

ФІЛІМОНАЎ Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся ў 1928 г. З 1958 па 1990 г. трактарыст саў-

гаса «40 год Кастрычніка» (1976). Жыве ў в. Язбы.

ФРАНЦУЗЁНАК Галіна Васілеўна. З 1956 па 1994 г. даярка калгаса «Новая ніва» (1975). Жыве ў в. Трудавік.

ФРАНЧЫКАВА Марыя Макараўна, нарадзілася ў 1930 г. З 1948 па 1994 г. тэлеграфістка, брыгадзір Крупскага РВС (1981). Жыве ў г. Крупкі.

ХАДАСЕВІЧ Барыс Іванавіч, нарадзіўся ў 1925 г. З 1951 г. працаваў у Крупскай «Сельгастэхніцы», з 1971 па 1985 г. галоўны інжынер калгаса «Камунар» (1976). Жыве ў г. Крупкі.

ХВАШЧЭЎСКІ Васіль Уладзіміравіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Стараселле» (1973).

ХРУЦКІ Валянцін Міхайлавіч, нарадзіўся 7.1.1922 г. Працаваў у будаўнічых арганізацыях, з 1961 па 1988 г. рабочы Крупскай «Сельгастэхнікі» (1979). Жыве ў пас. Крупскі.

ХАЛЕЦКІ Васіль Навумавіч, нарадзіўся 18.5.1930 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. З 1960 па 1990 г. працаваў шафёрам у саўгасе «Бобр» (1977). Цяпер на пенсіі, жыве ў г.п. Бобр.

ЦІТАВЕЦ Савелій Аляксеевіч, нарадзіўся 1.7.1920 г. ў в. Навесы Крупскага раёна. З 1945 па 1985 г. рабочы, потым брыгадзір саўгаса «Бобр» (1973). Жыве ў в. Навесы.

ЦІХАНАВЕЦКАЯ Марыя Пятроўна (1965).

ЦЭХАВЫ Рыгор Васілевіч, нарадзіўся 18.2.1951 г. ў в. Худаўцы Крупскага раёна. Скончыў Ільянскі сельскагаспадарчы тэхнікум. З 1973 г. заатэхнік, галоўны заатэхнік калгаса «Бальшавік». З 1995 г. старшыня калгаса «Камунар» (1988). Жыве ў в. Хацюхова.

ЧАПЯНЕЦ Клаўдзія Фёдараўна, нарадзілася ў 1930 г. Працавала жывёлаводам у калгасе «Перамога» (1976). Узнагароджана таксама медалём «За працоўную доблесць» (1973).

ЧУБІС Аляксандр Мікітавіч, нарадзіўся 1.11.1939 г. ў в. Кругліца Крупскага раёна. Працаваў слесарам, потым шафёрам у саўгасе «Грушаўскі», з 1966 па 1995 г. трактарыст-машыніст, шафёр саўгаса «Прыязьў». Жыве ў в. Кругліца.

ШАПЛОЎ Пётр Рыгоравіч, нарадзіўся 1.7.1940 г. ў в. Вострава Крупскага раёна. З 1960 г. рабочы, з 1975 г. працуе жывёлаводам у саўгасе «Грушаўскі». Жыве ў в. Вострава.

ШКУПІЛА Віктар Дзмітрыевіч, нарадзіўся 23.2.1926 г. З 1948 па 1955 г. калгаснік калгаса імя Малянкова. З 1960 па 1992 г. трактарыст саўгаса «40 год Кастрычніка» (1973). Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнай славы III ступені (1988). Жыве ў в. Тапарышча.

В.Н.Халецкі.

ШПАКОЎСКАЯ Надзея Трафімаўна, нарадзілася 14.10.1927 г. ў в. Барсукі Крупскага раёна. З 1946 г. працавала рабочай у саўгасе «Слабада», з 1954 па 1986 г. загадчык магазіна ў в. Чырвоная Слабада (1971). Узнагароджана таксама «Медаль мацярынства» 2-й ступені (1966). Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Чырвоная Слабада.

ШЫЛА Галіна Іванаўна, нарадзілася ў 1941 г. Працавала ў калгасе імя Колесавай.

ЯКУШАЎ Іван Кірылавіч, нарадзіўся 1.7.1927 г. З 1951 г. працаваў слесарам на Мінскім трактарным заводзе, з 1953 г. — слесарам у Халопеніцкай МТС, з 1960 — слесарам у саўгасе «Халопенічы» (1986). Жыве ў в. Галькі.

ЯРМОЛКА Аляксандр Міхайлавіч. З 1963 па 1980 г. працаваў у саўгасе «Бобр» трактарыстам, з 1980 па 1994 г. трактарыстам Бобрскага лясніцтва (1976). Узнагароджаны таксама медалём «За працоўную доблесць» (1973). Цяпер на пенсіі, жыве ў г.п. Бобр.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы

АВЯР'ЯНАЎ Мікалай Герасімавіч, нарадзіўся ў 1942 г. З 1960 г. рабочы, потым трактарыст у саўгасах «Бобр», «Слабада». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1982). Жыве ў в. Ламское.

АНТАНЕВІЧ Сяргей Леанідавіч, нарадзіўся 11.3.1957 г. ў в. Стараселле Крупскага раёна. Працаваў шафёрам у саўгасе «Стараселле». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1986). Жыве ў в. Лужа.

АРЛОЎСКАЯ Галіна Уладзіміраўна, нарадзілася ў 1949 г. ў в. Новая Ніва Крупскага раёна. Працавала даяркай у саўгасе «Новая ніва». Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1988). Жыве ў в. Новая Ніва.

АСТАШКА Рыгор Якаўлевіч, нарадзіўся 2.5.1950 г. ў в. Калінаўка Крупскага раёна. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Халопенічы». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў г.п. Халопенічы.

АЎХІМОВІЧ Любоў Сцяпанаўна, нарадзілася 9.1.1948 г. ў в. Лебедзева Крупскага раёна. Працавала швачкай, потым закройшчыцай РКБА. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1989). Жыве ў г. Крупкі.

БАТРАКОЎ Іван Арцёмавіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Якімаўка». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1983).

БЕЛАЯ Ірына Уладзіміраўна, нарадзілася 2.10.1948 г. ў в. Вялікая Слабада Крупскага раёна. З 1972 г. працуе даяркай у калгасе імя Леніна. Узнагароджана ордэнамі Працоўнай славы III, II ступеняў (1980, 1988), «Знак Пашаны». Жыве ў в. Вялікая Слабада.

БУРЫ Віктар Уладзіміравіч, нарадзіўся 1.1.1940 г. ў в. Малыя Жаберычы Крупскага раёна. З 1965 г. працаваў шафёрам, трактарыстам у калгасах «За мір», «Бальшавік» (1977). Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені. Жыве ў в. Дакудава.

БУРЫ Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся 28.11.1944 г. ў в. Восава Крупскага раёна. З 1969 калгаснік, загадчык фермы, намеснік брыгадзіра калгаса «Бальшавік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені. Жыве ў в. Дакудава.

ВАСІЛЕЎСКІ Анатоль Яфімавіч, нарадзіўся ў 1942 г. ў в. Лісічына Крупскага раёна. З 1961 г. працаваў трактарыстам у саўгасе «Сялява». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Лісічына.

ВАСІЛЕЎСКІ Уладзімір Яфімавіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Сялява». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені.

ВОРАНАЎ Віктар Андрэевіч, нарадзіўся 4.1.1936 г. ў в. Красніца Глускага раёна Магілёўскай вобласці. З 1962 г. рабочы Бобрскага завода музычных дэталей, дрэваапрацоўчага камбіната. Узнагароджаны ордэнам

І.У.Белая.

З.Дз.Кухта.

Працоўнай славы III ступені (1975). Жыве ў г.п. Бобр.

ГАРА Тамара Міхайлаўна, нарадзілася ў 1955 г. ў в. Ваўкоўшчына Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці. З 1976 г. працуе даяркай у калгасе імя Калініна. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1986). Жыве ў в. Майскае.

ГАРБАЧОЎ Адам Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1937 г. ў в. Лужа Крупскага раёна. Працаваў жывёлаводам у саўгасе «Старасселле», потым трактарыстам у калгасе імя Калініна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Старыя Шчаўры.

ГАРБАЧОЎ Валерый Іванавіч, нарадзіўся 2.1.1949 г. ў в. Востава Крупскага раёна. З 1967 г. трактарыст саўгаса «Грушаўскі», потым калгаса «Старасселле». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1986). Жыве ў в. Старасселле.

ГІРО Віктар Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1942 г. ў в. Зароўе Крупскага раёна. З 1958 г. калгаснік, потым трактарыст калгаса імя Калініна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III, II ступеняў (1975, 1976). Жыве ў в. Зароўе.

ГОЛУБ Міхаіл Сямёнавіч, нарадзіўся 25.6.1930 г. ў в. Клён Крупскага раёна. Працоўную дзейнасць пачаў з 1955 г. З 1965 па 1991 г. працаваў кузняцом на льнозаводзе. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1975). Цяпер на пенсіі, жыве ў в. Лянок.

ДЗІРКО Надзея Раманаўна, нарадзілася 24.11.1955 г. ў в. Дудзінка Крупскага раёна. З 1976 г. рабочая, з 1978 г. брыгадзір жывёлагадоўчай фермы. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1986). Жыве ў в. Дудзінка.

ДРАБКОВА Ніна Яўгенаўна, нарадзілася 25.1.1952 г. ў в. Малая Слабада Крупскага раёна. З 1971 г. даярка калгаса імя Леніна. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1986). Жыве ў в. Малая Слабада.

ДРАЗДОЎ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1934 г. ў в. Вялікае Горадна Крупскага раёна. З 1972 па 1994 г. шафёр аўтабазы № 16. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1982). Жыве ў г. Крупкі.

ДУДКО Тамара Паўлаўна, нарадзілася 20.9.1955 г. ў в. Прудзец Крупскага раёна. З 1975 г. рабочая, з 1980 г. жывёлавод калгаса «Прызыў» (1986). Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені. Жыве ў в. Узнацк.

КАВАЛЁЎ Мікалай Іванавіч. Працаваў шафёрам у калгасе імя Колесавай. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1975).

КАЗАК Міхаіл Сцяпанавіч. Працаваў трактарыстам па эксперыментальнай базе «Эса». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1984).

КАМАР Фёдар Андрэевіч, нарадзіўся ў 1936 г. ў в. Нача Крупскага раёна. З 1960 па 1992 г трактарыст калгаса «Камунар». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1975), медалём «За працоўную адзнаку» (1985). Жыве ў в. Нача.

КАНДРАЦЕНКА Віктар Ягоравіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Грушаўскі». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976).

КАЧАН Валянціна Фёдараўна, нарадзілася ў 1937 г. ў в. Якімаўка Крупскага раёна. З 1950 г. працавала рабочай у саўгасе «Прызыў», з 1966 г. — даяркай у саўгасе «Якімаўка». Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1975). Жыве ў в. Якімаўка.

КАЧАН Зоя Міхайлаўна, нарадзілася ў 1954 г. ў в. Якімаўка Крупскага раёна. Скончыла Смілавіцкі сельгастэхнікум. З 1975 па 1996 г. брыгадзір саўгаса «Якімаўка». Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1986). Жыве ў в. Якімаўка.

КОШАЛЁЎ СяргейАнуфрыевіч, нарадзіўся ў 1947 г. ў в. Новыя Шчаўры Крупскага раёна. Працаваў шафёрам у калгасе «Сцяг камунізму». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976).

КРЫШАНЬ Аляксандр Данілавіч, нарадзіўся ў 1938 г. ў в. Лютыя Крупскага раёна. З 1960 па 1992 г. трактарыст саўгаса «40 год Кастрычніка». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Лютыя.

КРЭНЦІК Анатоль Васілевіч, нарадзіўся 1.7.1955 г. ў в. Ігрушка Крупскага раёна. З 1974 г. працуе трактарыстам у саўгасе «Грушаўскі». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1984). Жыве ў в. Ігрушка.

КСЯНДЗОВА Ніна Пятроўна, нарадзілася ў 1941 г. ў в. Шэйка Крупскага раёна. З 1957 г. працавала ў калгасе, з 1960 г. — даяркай у калгасе імя Калініна. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1983). Жыве ў в. Шэйка.

КУЛЬГАВЫ Уладзімір Цімафеевіч, нарадзіўся 23.3.1939 г. ў в. Новая Крупка Крупскага раёна. З 1968 г. працуе ў калгасе імя Леніна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Новая Крупка.

КУРАДЫМ Іван Іванавіч, нарадзіўся 25.9.1949 г. З 1975 г. працаваў брыгадзірам у калгасе «Ухвала», з 1977 г. — у калгасе «Бобр». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1986). Жыве ў г.п. Бобр.

КУР'ЯН Ганна Рыгораўна, нарадзілася ў 1942 г. Працавала даяркай у саўгасе «Бальшавік». Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976).

КУХТА Зінаіда Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1936 г. ў в. Падбярэззе Крупскага раёна. З 1952 г. працавала ў калгасе, з 1958 г. цялятніца калгаса «Бальшавік». Узнагароджана ордэнамі Працоўнай славы III, II ступеняў (1975, 1976). Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Жыве ў в. Дакудава.

ЛАДОЎСКІ Антон Феліксавіч. Працаваў шафёрам у калгасе імя Колесавай. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай славы III, II ступеняў (1975, 1976).

ЛАДОЎСКІ Браніслаў Феліксавіч. З 1957 па 1995 г. трактарыст калгаса імя Колесавай. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Асінаўка.

ЛУНІН Мікалай Пілішавіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Грушаўскі». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1978).

ЛЯСУН Аляксей Пятровіч, нарадзіўся 23.10.1936 г. ў в. Старая Слабада Крупскага раёна. З 1959 па 1988 г. трактарыст саўгаса «Новая ніва». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1975). З 1966 г. на пенсіі. Жыве ў в. Старая Слабада.

ЛЯШКОЎ Уладзімір Клімавіч, нарадзіўся 1.1.1938 г. ў в. Колас Крупскага раёна. З 1961 г. працаваў трактарыстам у саўгасе

«Бобр», потым у саўгасе «Колас». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Колас.

МАЖЭЙКА Любоў Сяргееўна, нарадзілася 2.5.1948 г. ў в. Казачок Старажаскольскага раёна Белгарадскай вобласці. З 1966 г. працавала рабочай, з 1972 г. — у будаўнічай брыгадзе саўгаса «Бобр», з 1976 г. — жывёлавод саўгаса «Бобр». Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1982). Жыве ў г.п. Бобр.

МАЗАНІК Вера Васілеўна. Працавала даяркай на эксперыментальнай базе «Эса». Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Грыцкавічы.

МАЗГОВА Ніна Цімафееўна, нарадзілася 17.9.1941 г. ў в. Гапонавічы Крупскага раёна. З 1957 г. працавала даяркай калгаса імя Леніна. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1986). Жыве ў в. Гапонавічы.

МАЗНЁВА Таццяна Мікалаеўна. Працавала даяркай у саўгасе «Грушаўскі». Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1983).

МАКАРАЎ Цімафей Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1935 г. ў в. Ваўкавыск Крупскага раёна. З 1953 г. працаваў трактарыстам. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1978). Жыве ў в. Ваўкавыск.

МАКРЫЦКІ Генадзь Піліпавіч, нарадзіўся 1.10.1936 г. ў в. Падбярэззе Крупскага раёна. З 1952 па 1994 г. палявод, потым слесар, трактарыст калгаса «Чырвоны Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Падбярэззе.

МАКРЫЦКІ Дзмітрый Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1938 г. ў в. Новыя Шчаўры Крупскага раёна. Працаваў шафёрам у калгасе «Сцяг камунізму», цяпер у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1978). Жыве ў в. Новыя Шчаўры.

МАЛАШЧАНКА Васіль Іванавіч, нарадзіўся 11.6.1951 г. ў в. Навахросты Крупскага раёна. З 1978 г. працаваў трактарыстам у калгасе «Перамога», потым імя Леніна. У цяперашні час трактарыст ДЭУ-164. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Вялікая Слабада.

МІКАЛАЁНАК Марыя Ільінічна, нарадзілася 25.8.1939 г. З 1954 г. працавала ў калгасе «Пралетарская перамога», з 1959 г. — даяркa саўгаса «Сялява», з 1962 г. — рабочая саўгаса «Халопенічы», з 1966 па

Н.Ц.Мазгова.

І.І.Церашкоў.

1992 г. даяркa саўгаса «Якімаўка». Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Якімаўка.

НОВІК Мікалай Навумавіч, нарадзіўся ў 1950 г. З 1968 г. працаваў у калгасе. З 1969 г. трактарыст калгаса «Чырвоны Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1986). Жыве ў в. Хацюхова.

ПАЛЯКОЎ Леанід Фёдаравіч. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1978).

ПАНКАВЕЦ Міхаіл Аляксандравіч, нарадзіўся 10.4.1935 г. ў в. Заполле Крупскага раёна. З 1950 г. працаваў у калгасе «Камунар» паляводам, брыгадзірам, начальнікам вытворчага ўчастка, загадчыкам жывёлагадоўчай фермы. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976).

РОГАЎ Мікалай Сцяпанавіч. Працаваў трактарыстам калгаса «Чырвоны Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1978).

САКАЛОЎ Рыгор Фёдаравіч. Працаваў шафёрам на эксперыментальнай базе «Эса». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1978).

САРОКА Святлана Антонаўна. Працавала рабочай на Крупскім ільнозаводзе. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1980). Цяпер на пенсіі, жыве ў пас. Лянок.

СУРМА Марыя Іванаўна, нарадзілася 20.1.1951 г. ў в. Трыгузі Вілейскага раёна Мінскай вобл. Пасля заканчэння Слуцкага тэхнічнага вучылішча ў 1970 г. працавала майстрам, з 1994 г. старшым майстрам на Халопеніцкім масласырзаводзе. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1977). Жыве ў г.п. Халопенічы.

СЯРГЕЕЎ Васіль Іванавіч. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Колас». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1981).

ХАДАСЕВІЧ Фёдар Аляксандравіч, нарадзіўся 5.1.1949 г. ў в. Шыялоўка Крупскага раёна. З 1965 г. працаваў у калгасе «Бальшавік», з 1967 г. — механізатарам, з 1989 г. — начальнікам пажарнай аховы. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1975). Жыве ў в. Няверaўшчына.

ХАРЛАМАВА Людміла Аляксандраўна, нарадзілася 17.5.1957 г. ў в. Барцянка Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыла сельскагаспадарчы тэхнікум. З 1976 г. працавала брыгадзірам, у цяперашні час памочнік начальніка ўчастка калгаса імя Калініна. Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1988). Жыве ў в. Майскае.

ЦЕРАШКОЎ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1947 г. Працуе трактарыстам у саўгасе «Сялява». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1975). Жыве ў в. Янаўшчына.

ЦЯГЛІК Уладзімір Ягоравіч, нарадзіўся ў 1947 г. ў в. Шчаўры Крупскага раёна. Працуе шафёрам у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1978).

ШАЛАК Іван Аляксандравіч. Працаваў трактарыстам у калгасе «Камунар». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III, II ступеняў.

ШКЛЯР Іван Емяльянавіч. З 1968 па 1997 г. жывёлавод калгаса «Бальшавік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976), медалём «За працоўную доблесць». Жыве ў в. Жаберычы.

ШНІТКОЎ Рыгор Міхайлавіч, нарадзіўся 16.6.1957 г. ў в. Чараёўка Крупскага раёна. З 1974 г. працаваў трактарыстам, шафёрам, брыгадзірам паляводчай брыгады ў саўгасе «Слабада», з 1997 г. — шафёрам, потым лесніком у Абчугскім лясніцтве. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені. Жыве ў в. Кіявец.

ШУЛЬГА Валянціна Міхайлаўна, нарадзілася ў 1941 г. З 1957 г. працавала ў калгасе «Праўда», з 1962 г. — рабочая, потым даярка ў саўгасе «Прызыў». Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976). Жыве ў в. Узнацк.

ШЭЛЕПЕНЬ Марыя Васілеўна, нарадзілася ў 1944 г. З 1959 г. працавала паляводам, з 1976 г. — трактарысткай у саўгасе «Прызыў». Узнагароджана ордэнам Працоўнай

М.А.Сцяпанаў.

В.С.Былюк.

славы III, II ступеняў (1981, 1986). Жыве ў в. Кругліца.

ЮШКО Надзея Платонаўна, нарадзілася 18.4.1935 г. ў в. Шчаўры Крупскага раёна. З 1950 г. працавала паляводам, потым жывёлаводам у калгасах імя Калініна, «Чырвоны Кастрычнік». Узнагароджана ордэнам Працоўнай славы III ступені (1976).

ЛАЎРЭАТ ПРЭМІІ

СЦЯПАНАЎ Мікалай Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1939 г. ў в. Скарадзіца Крупскага раёна. Пасля сканчэння Барысаўскага палітэхнікума (1969) працаваў слесарам, брыгадзірам наладчыкаў Барысаўскага завода «Аўтагідраўзмацняльнік». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1983).

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ БЕЛАРУСІ

АЛЕКСІЕВІЧ Ігар Аляксеевіч, заслужаны работнік культуры БССР (1976).

БЫЛЮК Валянціна Сямёнаўна, нарадзілася 22.11.1931 г. ў в. Балгавічы Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Заслужаная настаўніца БССР (1977). У 1954 г. скончыла Мінскі інстытут замежных моў. З 1954 г. і да выхаду на пенсію працавала настаўніцай Нацкай сярэдняй школы. Узнагароджана медалём «За працоўную адзнаку» (1971). Жыве ў в. Нача.

БЯЗМОЗГАЯ Вера Рыгораўна, нарадзілася ў 1916 г. ў в. Красноўка Крупскага раёна. Заслужаная настаўніца БССР (1965). У 1939 г. скончыла Навагрудскае педагагічнае вучылішча. Да вайны працавала піянерважатай у г. Крупкі. У час акупацыі была сувяз-

В.Р.Бязмозгая.

М.В.Вяршкова.

С.С.Дзіковіч.

В.С.Іванова.

ной 8-й Круглянскай партызанскай брыгады. Пасля вайны да выхаду на пенсію загадчыца Красноўскай пачатковай школы. Памерла ў 1981 г.

ВЯРШКОВА Марыя Васілеўна, нарадзілася 21.8.1921 г. ў в. Ніжні Карачан Варонежскай вобласці. Заслужаная настаўніца БССР (1967). Скончыла завочна Барысаглебскі педагагічны інстытут. Са жніўня 1949 г. і да выхаду на пенсію працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры Крупскай сярэдняй школы № 1. На працягу многіх гадоў узначальвала раённае метадычнае аб'яднанне настаўнікаў рускай мовы і літаратуры. Узнагароджана знакам «Выдатнік народнай асветы БССР» (1966). Жыве ў Крупках.

ВІТАЛЁЎ Еўдакім Іванавіч, нарадзіўся 18.8.1916 г. ў в. Бярозаўка Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны ўрач БССР (1961). Пасля сканчэння 6 класаў Гіжэнкаўскай школы і настаўніцкіх курсаў працаваў настаўнікам у в. Ляцягі. У 1935—37 гг. вучыўся на рабочым факультэце, потым у Мінскім медыцынскім інстытуце. З 1941 г. ў Чырвонай Арміі, скончыў паскораныя курсы Свярдлоўскага медыцынскага інстытута. З 1943 па 1945 г. быў на фронце, удзельнік баёў за вызваленне Чэхаславакіі. Пасля вайны працягваў вучобу ў Мінскім медыцынскім інстытуце. З 1947 па 1990 г. працаваў у Крупскім раёне: загадчыкам раённага аддзела аховы здароўя, галоўным урачом Халопеніцкай бальніцы, урачом-рэнтгенолагам Крупскай раённай бальніцы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

ДЗІКОВІЧ Софія Станіславаўна, нарадзілася ў 1895 г. ў мяст. Парычы Гомельскай вобласці. Заслужаная настаўніца БССР (1947). Скончыла Бобрскую школу, потым Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут. З 1935 па 1958 г., за выключэннем гадоў нямецкай акупацыі, працавала настаўніцай, завучам сямігадовай школы на ст. Крупкі. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памерла 1.6.1961 г.

З газеты «Голас калгасніка» ад 14 снежня 1950 г.

ЗАСЛУЖАНАЯ НАСТАЎНІЦА

Завучам Крупскай станцыйнай чыгуначнай школы працуе Софія Станіславаўна Дзіковіч. Больш 30-ці гадоў педагагічнай працы за яе плячамі. Дзесяткі вучняў атрымалі ад яе трывалыя веды па рускай мове і літаратуры. Таму яны з удзячнасцю ўспамінаюць яе і выносяць ёй шчырую падзяку за адданую працу па выхаванні пакалення будаўнікоў камунізму.

Многа ўвагі ўдзяляе Софія Станіславаўна сваёй любімай працы — навучанню дзяцей. Веданне сваёй справы і псіхалогіі дзяцей, асобы падыход да кожнага з іх далі станоўчыя вынікі. 96 працэнтаў паспяховасці дабілася яна ў мінулым навучальным годзе. У першай чвэрці бягучага года атрымала 99 працэнтаў агульнай паспяховасці ад вучняў 5—7 класаў, дзе яна выкладае. За шматгадовую педагагічную работу тав. Дзіковіч узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Ёй прысвоена ганаровае званне — заслужаная настаўніца БССР.

Тав. Дзіковіч добра разумее, што поспехі вучняў залежаць і ад выхавання, якое яны атрымоўваюць дома. Таму яна часта наведвае сваіх вучняў у часы іх самастойнай працы па-за школай. У практыцы яе работы бацькоўскія сходы занялі цвёрдае месца. Яны право-

З.А.Краўчанка.

І.Г.Краўчанка.

Я.В.Купрыянава.

А.Ф.Марозава.

дзяцца рэгулярна, на іх заўсёды абмяркоўваюцца мерапрыемствы па далейшым павышэнні работы школы.

Софія Станіславаўна — прадстаўнік новай савецкай народнай інтэлігенцыі. Яна актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця пасёлка станцыі Крупкі, жыхары якога ў мінулыя выбары абралі яе дэпутатам сельскага Савета. Зараз яны вылучылі тав. Дзіковіч кандыдатам у дэпутаты раённага Савета.

С.Друшчыц, В.Будзько, М.Беспаяська, П.Старавойтаў.

ІВАНОВА Валянціна Сцяпанаўна, нарадзілася 19.2.1931 г. ў в. Лютыя Крупскага раёна. Заслужаная настаўніца БССР (1978). Пасля сканчэння Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага (1954) і да выхаду на пенсію працавала настаўніцай Крупскай сярэдняй школы № 1. Узнагароджана знакам «Выдатнік народнай асветы БССР» (1966). Памерла ў 1989 г.

КРАЎЧАНКА Зінаіда Адольфаўна, з 1944 па 1947 гг. працавала настаўніцай Бобрскай СШ, затым пераехала ў Літву. Заслужаная настаўніца Літоўскай ССР (1974). Памерла ў 1989 г.

КРАЎЧАНКА Іван Гаўрылавіч, нарадзіўся 5.5.1909 г. ў в. Грыбіна Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1968). У 1930 г. скончыў Лепельскі педагагічны тэхнікум. Працаваў у школах Ушацкага раёна, з 1958 г. — у Язбоўскай сярэдняй школе Крупскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Памёр.

КУПРЫЯНАВА Яўгенія Вікенцьеўна, нарадзілася 9.7.1922 г. ў в. Краснаполле Расонскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаная настаўніца БССР (1968). У 1941 г. скончыла Полацкае педагагічнае вучылішча. Пасля вайны працавала настаўніцай у Віцебскай вобласці, з 1951 па 1959 г. — дырэктарам Крупскага дзіцячага дома. З 1959 г. і да выхаду на пенсію настаўніца, выхавальніца групы падоўжанага дня Крупскай сярэдняй школы № 2. Узнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга. Жыве ў Крупках.

ЛАПУНОВА Ганна Мікалаеўна, нарадзілася 24.12.1925 г. ў в. Ког Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Пасля сканчэння Віцебскага педагагічнага інстытута з 1946 г. працавала настаўніцай у г. Свіслач Гродзенскай вобласці, з 1955 г. — у Крупскім раёне завучам, потым дырэктарам Ігрушкаўскай сярэдняй школы, з 1960 па 1980 г. завуч Крупскай пасялковай школы. Жыве ў пас. Крупскі.

МАЙСЕЕНКА Дар'я Сямёнаўна, нарадзілася 15.3.1912 г. ў в. Бяседавічы Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1931 г. скончыла Магілёўскі педтэхнікум. Да вайны працавала настаўніцай у Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці. У часы нямецкай акупацыі ўдзельнічала ў падпольным руху, была вывезена ў Германію. З 1945 г. працавала настаўніцай Язбоўскай сярэдняй школы Крупскага раёна. Узнагароджана медалём «За адвагу». Жыве ў в. Язбы.

МАРОЗАВА Аляксандра Фамінічна, нарадзілася 15.1.1926 г. ў в. Смілава Краснінскага раёна Смаленскай вобласці. Заслужаная настаўніца БССР (1970). У 1940 г. скончыла сямігадовую школу і 1 курс Смаленскага педагагічнага вучылішча. У гады Вялікай Айчыннай вайны партызанка атрада «За Савецкую Беларусь» брыгады імя М.В.Фрунзе. З 1946 г. і да выхаду на пенсію працавала настаўніцай, завучам Бобрскай сярэдняй школы. Завочна скончыла Смаленскі педагагічны інстытут. Неаднаразова ўзнага-

А.Н.Мінкова.

Н.С.Цвяткова.

роджвалася граматамі Міністэрства асветы, Вярхоўнага Савета БССР. Жыве ў г.п. Бобр.

МІНКОВА Аляксандра Нічыпараўна, нарадзілася 1.5.1922 г. на ст. Паворная Варонежскай вобласці. Заслужаная настаўніца БССР (1963). Скончыла Маскоўскі педагагічны інстытут імя К.Лібкнехта. З 1947 па 1990 г. працавала настаўніцай гісторыі, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Крупскай сярэдняй школы № 2. Аўтар друкаваных прац, з 1958 па 1974 г. была членам рэдакцыйнага савета часопіса «Преподавание истории в школе». Узнагароджана дзвюма граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Цяпер на пенсіі жыве ў Крупках.

МУРАШКА Вера Мікалаеўна, нарадзілася ў 1925 г. ў в. Дзеруцкая Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. Заслужаны аграном БССР (1968). У 1947 г. скончыла Смілавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. Працавала аграномам у калгасе «Май» Крупскага раёна, потым галоўным аграномам калгаса імя Калініна. Узнагароджана 2 ордэнамі «Знак Пашаны», медалём «За працоўную доблесць». Жыве ў в. Майск.

РЖЭЎСКІ Бернард Віктаравіч, нарадзіўся 9.8.1930 г. ў г. Барысаў Мінскай вобласці. Заслужаны лесавод БССР (1982). У 1954 г. скончыў Мінскі лесатэхнічны інстытут. Працаваў ляснічым у Неманіцкім лясніцтве Барысаўскага лясгаса. З 1960 па 1991 г. дырэктар Крупскага лясгаса. Жыве ў пас. Крупскі.

САМЦЭВІЧ Васіль Андрэевіч, нарадзіўся 19.3.1889 г. ў в. Дакудава Крупскага раёна. Заслужаны настаўнік БССР (1954). У 1904—06 гг. вучыўся ў Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі, у 1915 г. скончыў Віцебскі настаўніцкі інстытут, пасля працягваў вучобу на вячэрнім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута. Завочна скончыў Мінскі педагагічны інстытут. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, а таксама грамадзянскай і Айчыннай войнаў. З 1918 па 1920 г. загадчык Лагойскага вышэйшага пачатковага вучылішча, з 1920 па 1928 г. настаўнік Лагойскай сямігадовай школы, інспектар Барысаўскага павятовага, акруговага аддзела народнай адукацыі. У 1928—33 гг. навуковы сакратар Цэнтральнага бюро краязнаўства Інстытута беларускай культуры (з 1929 г. ў АН БССР). З 1932 па 1941 г. зноў настаўнічаў. Пасля вайны з 1944 па 1957 г. загадчык гарана г. Барысаў, завуч, дырэктар школы. Аўтар трох падручнікаў па беларускай мове і метадычных дапаможнікаў для пачатковай школы. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалямі. Памёр у 1973 г.

СТАРЫЧОНАК Марыя Іванаўна, нарадзілася ў 1920 г. ў в. Луцішча Крупскага раёна. Заслужаная настаўніца БССР (1969). У 1936 г. скончыла Барысаўскае педвучылішча, завочна ў 1956 г. — Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. З 1939 г. і да выхаду на пенсію працавала настаўніцай Смародзінскай няпоўнай сярэдняй школы. Памерла ў 1985 г.

ЦВЯТКОВА Надзея Сямёнаўна, нарадзілася 4.12.1931 г. ў в. Баравіна Багушэўскага р-на Віцебскай вобласці. Заслужаная настаўніца БССР (1972). Скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт. З 1955 па 1985 г. працавала настаўніцай, намеснікам дырэктара Бобрскай сярэдняй школы. Пасля выхаду на пенсію жыве ў Мінску.

ЯНУШКЕВІЧ Ефрасіння Іванаўна, нарадзілася 6.10.1916 г. ў в. Забор'е Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаная настаўніца БССР (1967). У 1936 г. скончыла Лепельскі педагагічны тэхнікум. Да вайны працавала настаўніцай у Вялікахальнявіцкай школе. Пасля вяртання з эвакуацыі (1945) і да выхаду на пенсію настаўніца Хальнявіцкай школы. Узнагароджана медалём «За працоўную доблесць». Памерла ў 1998 г.

ЯФРЭМЕНКА Раман Мікалаевіч, нарадзіўся 15.1.1923 г. ў в. Белая Дуброва Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1961). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 па 1957 г. настаўнік, потым на партыйнай рабоце. З 1960 па 1983 г. дырэктар Крупскай сярэдняй школы № 2. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі,

Р.М.Яфрэменка.

Л.А.Ліхалап.

Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За баявыя заслугі». Жыве ў г. Жодзіна Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці.

Узнагароджаны знакам «Выдатнік аховы здароўя БССР»

БОМБЕРАВА Эма Аляксееўна, нарадзілася 1.3.1938 г. ў в. Чапаеўск Куйбышаўскай вобласці. Скончыла Мінскі медыцынскі інстытут. З 1961 працуе ўрачом Крупскай раённай бальніцы (1977). Жыве ў Крупках.

ВАЙЦЯХОВІЧ Міхаіл Паўлавіч, нарадзіўся 10.6.1938 г. ў в. Глівін Барысаўскага раёна. Скончыў Гродзенскі медыцынскі інстытут. З 1966 па 1972 г. працаваў у Барысаўскім раёне, з 1972 па 1996 г. галоўны ўрач Крупскай раённай бальніцы. Цяпер загадчык фізіятэрапеўтычнага аддзялення той жа бальніцы (1988). Жыве ў Крупках.

КАЗІНЕЦ Ала Канстанцінаўна, нарадзілася 16.4.1939 г. ў в. Гойліва Глыбоцкага раёна. Скончыла Мінскі медыцынскі інстытут. З 1968 г. працуе ўрачом Крупскай раённай бальніцы (1978). Жыве ў Крупках.

МЕЛЬНІК Ядвіга Міхайлаўна, нарадзілася 1.1.1946 г. ў в. Курпяшы Дзятлаўскага раёна. Скончыла Віленскі медыцынскі інстытут. З 1968 г. працуе ўрачом Крупскай раённай бальніцы (1980). Жыве ў Крупках.

Узнагароджаны знакам «Выдатнік народнай адукацыі БССР»

ЗАЙЦАЎ Анатоль Афанасьевіч, нарадзіўся 29.7.1947 г. ў г.п. Халопенічы Крупскага раёна. Скончыў Смаленскі педагагічны інстытут. З 1969 г. працаваў настаўнікам, дырэктарам Хацюхоўскай сярэдняй школы. З 1988 г. загадчык Крупскага райана. Жыве ў Крупках.

КАШЫЦКІ Адам Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Ламское Крупскага раёна. З 1939 па 1941 г. і з 1948 па 1983 г. працаваў настаўнікам, дырэктарам школы ў Крупскім раёне (1978). Узнагароджаны таксама знакам «Выдатнік народнай асветы СССР» (1981). Памёр у 1999 г.

ЛАЙКОЎ Уладзімір Піліпавіч, нарадзіўся 4.5.1953 г. ў в. Астроўкі Крупскага раёна. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. З 1975 па 1979 г. працаваў настаўнікам, дырэктарам Капачоўскай васьмігадовай школы Барысаўскага раёна. З 1979 г. дырэктар Мётчанскай сярэдняй школы Барысаўскага раёна. Выдатнік народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь (1993). Складальнік і адзін з аўтараў кнігі «Мядоцкі край і яго таленты» (1996), а таксама шэрагу публікацый пра творчасць народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна. Жыве ў в. Мётча Барысаўскага раёна.

ЛІХАЛАП Леанід Аляксандравіч, нарадзіўся 14.7.1926 г. ў в. Забалаць Любанскага раёна Мінскай вобласці. Са жніўня 1943 па чэрвень 1944 г. партызан атрада імя Громава брыгады імя Чкалава, потым у Чырвонай Арміі. З 1951 г. працаваў у Крупскім раёне: першы сакратар Крупскага РК ЛКСМБ, занальны сакратар РК КПБ, старшыня калгаса імя Ільіча. Завочна скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. З 1963 г. дырэктар Крупскай завочнай сярэдняй школы, старшыня раённага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Узнагароджаны таксама ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За адвагу». Памёр у 1998 г.

МІНКОЎ Якаў Максімавіч. Гл. ў арт. Воіны-ардэнаносцы.

ПЕТРАЧУК Людміла Валянцінаўна, нарадзілася 27.6.1950 г. ў в. Малыя Хальнявічы Крупскага раёна. З 1967 г. працавала настаўніцай, дырэктарам школы ў Крупскім раёне, з 1991 г. загадчык, намеснік загадчыка райана (1984). Узнагароджана таксама знакам «Выдатнік народнай асветы СССР» (1988). Жыве ў Крупках.

ШЧУРКО Марыя Аляксандраўна, нарадзілася 19.10.1937 г. ў в. Чурылы Дзяржынскага раёна. З 1964 па 1995 г. працавала настаўніцай, з 1968 г. — дырэктарам школы ў Крупскім раёне (1977). Узнагароджана таксама знакам «Выдатнік народнай асветы СССР» (1984). Жыве ў Крупках.

Імі ганарыцца Крупшчына

АДАМОВІЧ Іван (Язэп) Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1897 г. ў г. Барысаў Мінскай вобласці. З 1906 г. працаваў на фабрыках у Барысаве, Мінску, Крупках і Тыфлісе. Удзельнік рэвалюцыйнага руху. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады член Мінскага губернскага рэўкома, народны камісар БССР па ваенных справах, адначасова з 1921 г. народны камісар унутраных спраў і намеснік старшыні ЦВК і СНК БССР. У 1924—27 гг. старшыня Саўнаркома БССР. З 1927 г. на кіруючай рабоце. Памёр у 1937 г.

БАБРОВІЧ Міхаіл Прохаравіч, нарадзіўся ў 1939 г. ў в. Журавы Крупскага раёна. У 1961 г. скончыў Рыжскае вышэйшае ваенна-марское артылерыйскае вучылішча. За час службы ў арміі атрымаў званне палкоўніка. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі і інш. Памёр у 1996 г.

БАГДАНОВІЧ Адам Ягоравіч. Беларускі этнограф, фалькларыст, мемуарыст Адам Ягоравіч (Адольф Георгіевіч) Багдановіч нарадзіўся 20 сакавіка (паводле аўтабіяграфіі 25 сакавіка) 1862 г. ў мяст. Халопенічы Бабруйскага павета (цяпер Крупскі раён). Ён бацька паэта Максіма Багдановіча. Паходзіў з сялянскай сям'і. Працаваць пачаў у 12-гадовым узросце ў мінскіх чыгуначных майстэрнях. Цяжкая фізічная праца, знаёмства з творамі А.І.Герцэна, М.А.Някрасава, уражанні ад тэарыстычных актаў рэвалюцыянераў спрыялі фарміраванню ў яго народніцкіх поглядаў. Падчас навучання ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, якую ён скончыў у 1882 г., арганізаваў гурток «самаразвіцця і самаадукацыі» (у яго ўваходзілі І.С.Гапановіч, А.І.Каранько, Матусевіч і інш.). У жніўні 1882 г. ўступіў у «семінарскую» групу нарадавольцаў Мінска (А.Міцкевіч, І.М.Акаловіч і інш.), на працягу трох гадоў вёў прапагандысцкую работу ў вёсках Ігуменскага павета. У 1885—91 гг. Адам Ягоравіч узначальваў 1-е гарадское пачатковае вучылішча ў Мінску. Уваходзіў у кіруючы склад мінскай арганізацыі «Народная воля». Пасля рэзкага пагаршэння здароўя адышоў ад рэвалюцыйнай дзейнасці, змяніў прафесію і пераехаў у Гродна (1892). З гэтага часу працоўнае жыццё Багдановіча звязана са службай у Сялянскім пазямельным банку, дзе ён займаў пасады ад памочніка бухгалтара да ўпраўляючага. Адначасова працаваў дырэктарам Гродзенскай публічнай бібліятэкі. З 1896 г. жыў у Ніжнім Ноўгарадзе, з 1907 г. — у Яраслаўлі. У 1920—31 гг. працаваў загадчыкам навуковай бібліятэкі Яраслаўскага дзяржаўнага музея. Адначасова выкладаў гісторыю культуры ў мастацкім, музычным і тэатральным тэхнікумах. Памёр у Яраслаўлі 16 кастрычніка 1940 г.

У час навучання ў Нясвіжскай семінарыі А.Я.Багдановіч пачаў збіраць фальклорна-этнаграфічны матэрыял, частка якога пазней увайшла ў кнігу П.В.Шэйна «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (т. 1—3, 1887—1902). Выступаў з навуковымі артыкуламі ў газетах «Минские губернские ведомости», «Минский листок», «Гродненские губернские ведомости» і іншых. У 1894 г. ў Гродне апублікаваў гістарычны нарыс «Пра паншчыну», у якім паказаў цяжкі сацыяльны і духоўны прыгнёт беларускага селяніна ў часы прыгону, а ў 1895 г. — даследаванне «Пережыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў», дзе змясціў багаты фактычны матэрыял і правёў яго сістэмны аналіз (даследаваў пережыткі фетышызму, анімізму, культаў сонца, нячыстай сілы і інш.). Асноўнай навуковай працай А.Я.Багдановіча з'яўляецца двухтомная манаграфія «Этнічны склад народаў славянскіх і рускіх» (1935), якой спадарожнічалі даследаванні «Этнічны склад беларускага народа» і «Этнічны склад насельніцтва Верхняга Паволжа, Акі і Камы» (усе ў рукапісах). У іх на аснове даных археалогіі, антрапалогіі, палеанталогіі, геаграфічнай наменклатуры разглядаюцца народаўтваральныя працэсы ва Усходняй Еўропе. Выкарыстанне старажытнай тапанімікі ў якасці этналагічнага і культурна-гістарычнага матэрыялу тэарэтычна абгрунтавана ў працы «Мова зямлі. Утварэнне водарачных імёнаў і што ад іх паходзяць» (том 1—2; друкаваліся фрагментарна). Багдановіч — аўтар артыкулаў па аграрным пытанні, праблемах народнай адукацыі, літаратуразнаўства, тэатральнага мастацтва і іншых, якія друкаваліся ў перыёдыцы Беларусі і Расіі. Займаўся таксама мастацкім перакладам з французскай і польскай моў на рускую.

Асобнае месца ў спадчыне А.Я.Багдановіча займае мемуарыстыка. Найбольш каштоўнае ў ёй — аўтабіяграфічныя ўспаміны, над якімі ён працаваў у апошнія гады свайго жыцця (няскончаныя; друкаваліся фрагментарна). Мастацкія вартасці ў іх спалучаны з глыбокімі ведамі аўтара па этнаграфіі,

М.П.Бабровіч.

М.А.Багушэвіч.

фальклоры, народнай адукацыі, гісторыі, культуры і сацыялогіі Беларусі 2-й паловы 19 ст. Псіхалагічнай назіральнасцю і шырокімі абагульненнямі вызначаюцца ўспаміны пра сына Максіма, М.Горкага, Ф.Шаляпіна. Каштоўныя звесткі пра рэвалюцыйны рух на Беларусі А.Я.Багдановіч прывёў у працах «Да гісторыі партыі «Народная воля» ў Мінску і Беларусі, 1880—1892», «Рэвалюцыйны рух у г. Мінску і губерні ў 80-х і пачатку 90-х гадоў» (у рукапісах).

На працягу жыцця А.Я.Багдановіч вёў

А.Я.Багдановіч.

шырокую перапіску. Яго адрасатамі былі М.Горкі, К.Пешкава, Я.Колас, З.Бядуля, В.Ластоўскі, А.Луцкевіч, Я.Дыла, І.Замоцін, В.Мачульскі і іншыя. Яго архіў зберагаецца ў Інстытуце літаратуры НАН Беларусі, а бібліятэка — у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я.Коласа НАН Беларусі і Цэнтральнай бібліятэцы Літоўскай АН.

БАГУШЭВІЧ Мікалай Андрэевіч, нарадзіўся ў 1927 г. ў Салігорскім раёне Мінскай вобласці. У 1956 г. скончыў БДУ. Працаваў настаўнікам, дырэктарам школы ў в. Ухвала Крупскага раёна, выкладчыкам Мінскага электратэхнікума сувязі, старшым навуковым супрацоўнікам НДІ педагогікі. Кандыдат гістарычных навук (1977). З 1977 г. і да выхаду на пенсію выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі. Жыве ў Мінску.

БАРАДАЧ Уладзімір Віктаравіч, нарадзіўся 22.11.1951 г. ў в. Нача Крупскага раёна. У 1972 г. скончыў Разанскае ваеннае вучылішча, у 1980 г. — ваенную акадэмію імя Фрунзе. Удзельнік вайны ў Афганістане. Двойчы паранены. Потым служыў у Пухавічах. Палкоўнік запасу. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі. Жыве ў Мінску.

БАРОЎСКІ Яўген Уласавіч, нарадзіўся ў 1925 г. ў в. Шарнева Крупскага раёна. Заслужаны дзеяч медыцынскіх навук РСФСР (1980). Вучоны ў галіне стаматалогіі, прафесар. У 1943 г. скончыў артылерыйскае вучылішча і быў накіраваны ў дзеючую армію. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, двойчы паранены. З 1946 па 1950 г. вучыўся ў Маскоўскім стаматалагічным інстытуце, потым у аспірантуры на кафедры тэрапеўтычнай стаматалогіі. У 1954 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Абмен фосфару і кальцыю ў цвёрдых тканках зуба пры авітамінозе ў сабак», а ў 1967 г. — доктарскую «Эксперыментальнае даследаванне цвёрдых тканак зуба і бялковага саставу эмалі».

З 1953 г. асістэнт, з 1959 г. дацэнт, з 1968 г. загадчык кафедры тэрапеўтычнай стаматалогіі Маскоўскага медыцынскага стаматалагічнага інстытута імя М.А.Сямашкі. Цяпер працуе загадчыкам аддзела тэрапеўтычнай стаматалогіі Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута стаматалогіі.

Асноўныя навуковыя даследаванні прысвечаны праблеме карыёзу зубоў. Вялікі ўклад ён унёс у вывучэнне фізіялогіі эмалі зуба. Упершыню ў стаматалогіі прымяніў ме-

Я.У.Бароўскі (у цэнтры) з групай японскіх вучоных.

тодыку аўтарадыёграфіі, якая дазволіла атрымаць новыя даныя аб пранікальнасці цвёрдых тканак і ролі пульсу ў яе рэгуляцыі. Гэтыя даследаванні з'явіліся важным этапам у вывучэнні патагенезу карыёзу зубоў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі. Жыве ў Маскве.

БЕЛАКУРСКІ Валерый Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1950 г. ў в. Малыя Жаберычы Крупскага раёна. Скончыў Ленінградскае мараходнае вучылішча. З 1969 па 1971 г. служыў у арміі. У 1971—76 гг. вучыўся на аддзяленні філасофіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З 1976 па 1979 г. асістэнт Гомельскага інстытута чыгункі, з 1979 па 1987 г. асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт Беларускага інстытута народнай гаспадаркі (цяпер Беларускі эканамічны універсітэт). Кандыдат філасофскіх навук. З 1987 г. дацэнт, загадчык кафедры філасофіі. Жыве ў Мінску.

БЕРМАН Віктар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1897 г. ў мяст. Халопенічы Крупскага раёна. У 1918 г. скончыў Петраградскі універсітэт. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Доўгі час загадваў кафедрай мікрабіялогіі Ленінградскага медыцынскага інстытута і кафедрай эпідэміялогіі Ваенна-медыцынскай акадэміі. Яму належаць цікавыя і глыбокія даследаванні ў галіне бар'ернай функцыі лімфатычнай сістэмы пры туберкулёзе і бруцэлёзе, механізмаў фатацытозу, паталогіі і эпідэміялогіі страўнікавых інфекцый, а таксама імуналогіі туберкулёзу. Аўтар падручніка «Прыватная эпідэміялогія».

БОКУЦЬ Леанід Аркадзевіч, нарадзіўся ў 1937 г. ў Крупках. У 1958 г. скончыў Маскоўскі дзяржаўны універсітэт. З 1960 г. працуе ў Новасібірскім універсітэце. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац, у тым ліку на замежнай мове. Удзельнік навуковых сімпозіумаў у многіх замежных краінах. Жыве ў г. Новасібірск.

БУЦЯНОЎСКІ Мікалай Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1955 г. ў в. Нача Крупскага раёна. У 1980 г. скончыў Ульянаўскае вышэйшае ваенна-тэхнічнае вучылішча імя Б.Хмяльніцкага. Служыў камандзірам роты, батальёна ў г. Пачынак Смаленскай вобласці, з 1982 па 1984 г. — у Афганістане. У 1984—94 гг. яго лёс таксама звязаны з арміяй. У 1985 г. скончыў Ленінградскую ваенную акадэмію. Цяпер працуе выкладчыкам у Беларускай ваеннай акадэміі. Палкоўнік. Узнагароджаны ордэнам «За службу Айчыне». Жыве ў Мінску.

ВАЙЦ Валерый Феліксавіч, нарадзіўся ў 1950 г. ў Крупках. У 1968 г. скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў настаўнікам гісторыі ў школах Крупскага раёна, дырэктарам Халопеніцкай школы-інтэрната, інспектарам райана. Кандыдат гістарычных навук (1982). З 1985 г. выкладчык Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. У 1987—91 гг. загадчык кафедры абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў, з 1992 г. дацэнт Брэсцкага педагагічнага універсітэта.

ГАМІН Аляксей Іванавіч, нарадзіўся ў 1927 г. ў в. Балахава Саратаўскай вобласці. З

1956 г. працуе ў Крупскім раёне. Самадзейны мастак. Тэматыка яго твораў вельмі разнастайная. Увагу мастака прыцягваюць і тэмы Вялікай Айчыннай вайны, і краявіды роднай прыроды. Яго малюнкі неаднаразова экспанаваліся на выстаўках у абласным цэнтры народнай творчасці, а таксама на персанальнай выстаўцы твораў у Мінску. Значная колькасць твораў знаходзіцца ў дзіцячым доме г.п. Халопенічы, раённым музеі Ігрушкаўскай сярэдняй школы, прыватных калекцыях у ЗША, Канадзе, Германіі. Жыве ў в. Радзіца Крупскага раёна.

ГАНЧАРЭНКА Андрэй Маркавіч, нарадзіўся 2.1.1933 г. ў в. Версанка Крупскага раёна. Акадэмік Нацыянальнай АН Беларусі (1984, член-карэспандэнт 1972), доктар фізіка-матэматычных навук (1972), прафесар (1974). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1978). У 1956 г. скончыў БДУ, потым аспірантуру Акадэміі навук БССР. З 1959 г. ў Інстытуце фізікі АН БССР. У 1960 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму тэарэтычнай крышталяоптыкі, у 1971 г. — доктарскую. З 1970 г. намеснік дырэктара інстытута і кіраўнік Магілёўскага аддзялення Інстытута фізікі, у 1987—97 гг. галоўны вучоны сакратар Прэзідыума, адначасова з 1991 г. дырэктар Аддзела аптычных праблем інфарматыкі Нацыянальнай АН Беларусі. Аўтар шматлікіх навуковых прац у галіне фізічнай і інтэгральнай оптыкі, квантавай і аптычнай электронікі. Распрацаваў тэорыю дыэлектрычных

А.М.Ганчарэнка.

Л.М.Гаркун.

хваляводаў і святлаводаў, тэорыю анізатропных рэзанатараў аптычных квантавых генератараў. Дзяржаўная прэмія Беларусі 1984. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў Мінску.

ГАРКУН Леанід Міхайлавіч, нарадзіўся 1.4.1940 г. ў в. Абчуга Крупскага раёна. У 1962 г. скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Працаваў на будаўніцтве Краснаярскай ГЭС і адначасова вучыўся ў аспірантуры. Кандыдат тэхнічных навук (1973). З 1979 г. старшы навуковы супрацоўнік, намеснік дырэктара па навуцы Сібірскага філіяла навукова-даследчага інстытута імя Б.Я.Ведзянеева. Прымаў удзел у будаўніцтве Усць-Ілімскай і Саяна-Шушанскай ГЭС, гідравуз-



А.І.Гамін. «Дарога ў лесе». Малюнак.

М.С.Еўдакімаў.

Н.С.Еўчык.

А.Г.Зайцаў.

П.К.Зайцаў.

Васіль Зуёнак.

ла ў Іраку, Сірыі. Працуе на будаўніцтве метрапалітэна ў г. Краснаярск. Аўтар многіх навуковых прац. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», знакам «Выдатнік энергетыкі і электрыфікацыі СССР». Жыве ў г. Краснаярск.

ДАРОЖКІН Мікалай Мікалаевіч, нарадзіўся 12.3.1958 г. ў в. Пасёмкавічы Крупскага раёна. У 1980 г. скончыў фізічны факультэт БДУ, потым аспірантуру. З 1983 г. працаваў асістэнтам, з 1992 г. — дацэнт БДУ. Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1990), дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела БДУ (1998). Аўтар 29 навуковых прац у галіне фізікі. Жыве ў Мінску.

ЕЎДАКІМАЎ Мікалай Сямёнавіч, нарадзіўся 26.11.1922 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. У 1943 г. скончыў Літаратурны інстытут імя М.Горкага. Працаваў карэспандэнтам радыё, цэнтральных газет, літаратурным кансультантам. Друкавацца пачаў з 1946 г. У 1948 г. выйшла яго першая кніжка апавяданняў і нарысаў «Рыбакі», потым былі выдадзены яшчэ 13 зборнікаў аповесцей і раманаў, многія з якіх перакладзены на іншыя мовы. Паводле яго твораў зняты некалькі кінафільмаў.

ЕЎЧЫК (Шэўка) Надзея Сямёнаўна, нарадзілася 6.12.1949 г. ў г.п. Халопенічы Крупскага раёна. У 1971 г. скончыла Мінскі дзяржаўны інстытут замежных моў, потым аспірантуру. Кандыдат філалагічных навук (1979). Працавала выкладчыкам, дацэнтам. З 1994 па 1997 г. загадчыца кафедры Мінскага лінгвістычнага універсітэта. Цяпер вучыцца ў дактарантуры. Аўтар многіх навуковых прац.

ЗАЙЦАЎ Аркадзь Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1939 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. У 1962 г. скончыў Бранскі інстытут транспартнага машынабудавання. Працаваў на прадпрыемствах г. Варонеж. У 1968 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю ў галіне тэхнікі. Доўгі час выкладаў у Варонежскім політэхнічным інстытуце. Памёр у 1992 г.

ЗАЙЦАЎ Павел Карпавіч, нарадзіўся ў 1936 г. ў в. Чарэя Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці. У 1960 г. скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі. Працаваў інструктарам Халопеніцкага райвыканкома, навуковым супрацоўнікам навукова-даследчага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі Нечарназёмнай зоны СССР. З 1961 г. старшы эканаміст, начальнік аддзела Міністэрства фінансаў БССР, загадчык аддзела, з 1988 г. начальнік фінансавага ўпраўлення Мінскага аблвыканкома. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.

ЗУЁНАК Васіль Васілевіч, нарадзіўся 3.6.1935 г. ў в. Мачулішча Крупскага раёна ў сялянскай сям'і. Беларускі паэт. У 1954 г. скончыў Барысаўскае педагагічнае вучылі-

Васіль Зуёнак (трэці злева) сярод дэлегатаў на сесіі ААН.

шча і паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Пасля скончэння універсітэта (1959) працаваў у рэдакцыі газеты «Рабочае юнацтва» (Мінск), з 1960 па 1966 г. — у газеце «Піянер Беларусі». Завочна скончыў аспірантуру пры БДУ (1970). У 1972—78 гг. галоўны рэдактар часопіса «Бярозка», у 1966—72 гг. намеснік і з 1978 г. галоўны рэдактар часопіса «Маладосць». Кандыдат філалагічных навук (1973). У 1982—89 гг. сакратар, першы сакратар, з 1990 па 1998 г. старшыня Праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Першыя вершы з'явіліся ў друку ў 1954 г. Аўтар кніжак паэзіі «Крэсіва» (1966), «Крутаяр» (1969), «Сяліба» (1973), «Нача» (1975), зборніка гумарыстычных вершаў «Качан на п'едэстале» (1973). Выдаў кніжкі нарысаў і замалёвак для дзяцей «Любіць прыроду — любіць Радзіму» (1963), паэтычныя зборнікі «Вясёлы калаўрот» (1965), «Жылі-былі пад вадой» (1969), «Сонечны клубочак» (1972), «Будзем сілы набірацца» (1974), «Маўчанне травы» (1980), «Час вяртання» (1981), «Світальныя птушкі» (1982), «Лукам'е» (1984), «Лета трывожных даждоў» (1990), «Чорная лесвіца» (1992), «Пісьмо з таго свету» (1995) і інш. У многіх творах роздум пра ўзаемасувязь асобы, прыроды і грамадства, мараль і этыка нашага сучасніка асэнсоўваюцца ў суаднесенасці з гераічным мінулым роднага краю, зваротам да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Творы паэта выдаюцца ў перакладах, і ён сам пераклa-

К.Крапіва і Васіль Зуёнак.

дае на беларускую мову паэзію з балгарскай, польскай, рускай, украінскай і іншых моў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я.Купалы 1982. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, медалём. Жыве ў Мінску.

УСПАМІН

Мачулішча...
Відаць, і пры Ярыле
Ільны ў нас сеялі,
Вымочвалі ў мачыле.
Бель-кужаль пралі, ткалі, вышывалі,
Кашулі ў кастры
Напамінкамі клалі.
...Спадаюць ручаінкі —
Дзве дарожкі:
Блакітны лён і васількі-валошкі —
Узор няхітры,
Вышыты табою,
Што дзень і ноч не ведала спакою...
Завіхалася, шчыравала,
Абдымала ды мілавала...
О рукі,
Рукі ў ільняной старонцы...
Духмянасць поля і гарачнасць сонца.
Мачулішча —
блакіт палёў.
Нябёс,
Блакіт вачэй,
блакіт туманны
Слёз.

***

Ніхто не пачуў:
Яблык упаў дасвеццем —
Ля Халопеніч,
на Беларусі.
Ніхто не пачуў —
Ні людзі,
ні травы,
ні вецер...
Ніхто.
А шар зямны
Здрыгануўся...
1963 г.

***

— На Начы?
— На Начы.
— З паўпуда?
— Няйначай!..
...Сяджу
і рыбачу...
То клюне,
То плюне
Ды ўглыб
Нырне
І плёткі
між рыб
Пляце пра мяне...
Над Начай,
над Начай
Гайдаецца кладка.
— Дзень добры!
— Дзень добры...
— Не ловіцца?
— Гладка...
А слова
да слова —
Гатова
размова
Гуляе ўлоў мой,
Цікуе і судзіць...
І клёву сягоння
Няма.
І не будзе.
Вісяць над вадою,
Сумуюць вудоўлі...
1964 г.

Зуёнак Васіль.

КАВАЛЁНАК Уладзімір Васілевіч, нарадзіўся 3.3.1942 г. ў в. Белае Крупскага раёна. Лётчык-касманаўт СССР (1977), двойчы Герой Савецкага Саюза (1978, 1981), генерал-палкоўнік авіяцыі (1993), акадэмік Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі (1993), член-карэспандэнт Міжнароднай інжынернай акадэміі (1994). Кандыдат ваенных навук (1980), прафесар (1991). У 1959 г. скончыў сярэднюю школу з сярэбраным медалём, у 1963 г. — Балашоўскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў. Потым служба ў воінскай часці. У службовай характарыстыцы адзначана: «Лятае ўпэўнена, любіць лятаць... Вынослівы, фізічна развіты,

У.В.Кавалёнак.

У.В.Кавалёнак сярод землякоў.

мэтанакіраваны, займаецца самаадукацыяй...» Таму невыпадкова ў 1967 г. яго накіроўваюць у атрад касманаўтаў. Уладзімір настойліва вывучаў касмічныя караблі і арбітальныя станцыі, займаўся трэніроўкамі на трэнажорах. Паступіў завочна вучыцца ў Ваенна-паветраную акадэмію імя Гагарына, якую скончыў у 1976 г. Ажыццявіў палёты ў космас: 9—11.10.1977 г. як камандзір карабля «Саюз-25» (палёт адбыўся, але няўдала; як адзначалася ў паведамленні ТАСС, «...из-за отклонения от предусмотренного режима причаливания стыковка была отменена»); 15.6—2.11.1978 г. як камандзір пілатаванага

У.В.Кавалёнак (злева) на арбіце.

навукова-даследчага касмічнага комплексу «Саюз-29» — «Салют-6» — «Саюз-31» (разам з А.С.Іванчэнкавым ажыццявіў выхад у адкрыты космас, упершыню была выканана перастыкоўка касмічнага карабля); 12.3—26.5.1981 г. як камандзір касмічнага навукова-даследчага комплексу «Саюз-Т-4»—«Салют-6»—«Саюз». З паведамлення ТАСС: «В соответствии с программой исследования космического пространства 12 марта 1981 г. в 22 часа московского времени в Советском Союзе осуществлен запуск космического корабля «Союз-Т-4», пилотируемого экипажем в составе командира корабля Героя Советского Союза, лётчика-космонавта СССР полковника Коваленка Владимира Васильевича и бортинженера Савиных Виктора Петровича». З 1984 г. У.В.Кавалёнак на кіруючых пасадах у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына, Ваеннай акадэміі Генштаба, НДІ Міністэрства абароны. У 1991—92 гг. прэзідэнт Беларускай рэспубліканскай федэрацыі аэранаўтыкі. З 1992 г. начальнік Ваенна-паветранай інжынернай акадэміі імя Жукоўскага, прэзідэнт асацыяцыі касмічных палётаў Расіі. Дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі 1980—92 гг. Узнагароджаны 3 ордэнамі Леніна, а таксама іншымі ўзнагародамі Германіі, Польшчы, Манголіі, Румыніі. У г. Крупкі ўстаноўлены яго бронзавы бюст.

КАВАЛЕЎСКІ Фёдар Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1905 г. ў мяст. Бобр Крупскага раёна. Заслужаны лесавод Беларускай ССР (1965). Да вайны вучыўся на лесатэхнічным факультэце Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, потым працаваў дырэктарам лясгаса ў Баранавічах. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў у саўнаргасе, да выхаду на пенсію — намеснікам міністра лясной прамысловасці БССР. Памёр у 1976 г.

КАЗЛОЎ Міхаіл Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1897 г. ў в. Нача Крупскага раёна. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, пасля працаваў у органах Надзвычайнай камісіі. У 1934 г. скончыў ваенную акадэмію. Служыў у Варонежскай ваеннай акрузе, потым у Маскве памочнікам каменданта Крамля. Генерал-лейтэнант. Рэпрэсіраваны ў 1937 г. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1940 г.

КАЗЛОЎ Уладзімір Аляксандравіч. Заслужаны рацыяналізатар БССР (1964). Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут. Працаваў у медыцынскіх установах.

КАЛАЧЫНСКІ Міхась (Міхаіл) Іванавіч, нарадзіўся 1.1.1917 г. ў Крупках у сялянскай сям'і. Беларускі паэт. У 1936 г. скончыў курсы пры Камуністычным інстытуце журналістыкі. З 1934 па 1935 г. быў старшым піянерважатым у Бобрскай сярэдняй школе, у 1936—37 гг. — літсупрацоўнікам крупскай раённай газеты «Камуністычны шлях». У 1937—38 гг. працаваў адказным сакратаром газеты «Літаратура і мастацтва». У Чырвонай Арміі з 1938 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны. У гады Айчыннай вайны супрацоўнік армейскай газеты «Герой Родины» 46-й дзеючай арміі. У пасляваенны перыяд карэспандэнт адэскай акруговай ваеннай газеты «Защитник Родины». З 1947 па 1953 г. літаратурны сакратар газеты «Во славу Родины». Пасля дэмабілізацыі з арміі галоўны рэдактар альманаха «Советская Отчизна» (1953—54), потым адказны сакратар, нам. старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, галоўны рэдактар часопіса «Беларусь». Друкуецца з 1932 г. Яшчэ ў даваенны час асобнымі выданнямі выйшлі яго паэмы для дзяцей «Косця-чэкіст» (1938), «Пакет» (1940). Пасля вайны былі выдадзены кнігі паэзіі: «Сонца ў блакіце» (1949), «Прыпар» (1956), «Сосны і дзюны» (1960), «Докшыцкі каравай» (1974) і іншыя. У сваіх творах пісьменнік усхвалявана расказвае пра жыццё, будні і святы людзей свайго роднага краю, імкненне іх жыць у міры і дружбе з усімі народамі свету. Шмат кніг яго адрасавана дзецям: «Прыгоды Патапкі» (1958), «Лясныя казкі» (1967), «Мая мазаіка» (1971), «Рэха зямлі» (1978) і іншыя. Узнагароджаны ордэ-

М.Р.Казлоў.



Міхась Калачынскі (першы справа) з М.Лыньковым, П.М. Машэравым і І.Мележам на адпачынку.

намі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, двойчы «Знакам Пашаны», медалямі. Памёр 10.8.1990 г.

***

Але я не ведаў адчаю:
Гарэлі і біліся ў скронь
Віроў тваіх сіла крутая,
Лясоў вераснёвы агонь.

Мо лёгкай таму і ў паходзе
Мне справа любая была,
Што ты ў семнаццатым годзе
Зарніцай мяне спавіла,

А зараз я сталы,
І трэба
Сказаць на сваім мне вяку:
Хвала твайму жытняму хлебу,
З чарніцамі малаку!

Хвала той дарозе ў полі,
Дзе тлее дзіцячы мой след,
Юнацтву вясёламу, волі,
Што насцеж адкрыла мне свет!

1948 г.

КАМЯНЕЦКІ Гірш Мордухавіч, нарадзіўся 15.12.1895 г. ў в. Чарняўка Крупскага раёна. Паэт. Да 1916 г. вучыўся ў яўрэйскіх рэлігійных школах. З 1916 па 1919 г. працаваў цырульнікам у Барысаве. У 1919—24 гг. у Чырвонай Арміі, удзельнік грамадзянскай вайны. Пасля дэмабілізацыі зноў працаваў у цырульні. У 1928—30 гг. вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педфака БДУ. З 1930 г. на творчай рабоце. У 1937—41 гг. адказны сакратар яўрэйскай секцыі Саюза пісьменнікаў БССР. У час Вялікай Айчыннай вайны працаваў цырульнікам у г. Бугуруслан Чкалаўскай вобласці. Пасля вяртання на Беларусь працаваў рэдактарам мастацкай літаратуры ў Дзяржаўным выдавецтве БССР (1948—49). У 1950 г. рэпрэсіраваны, у 1956 г. рэабілітаваны.

Друкавацца пачаў з 1924 г. Пісаў на яўрэйскай мове. Аўтар зборнікаў вершаў «Простай дарогай» (1933), «Заказ на маладосць» (1940), «Мацней за жалеза» (1948), «Вершы» (1948). У 1960 г. выйшла кніга яго выбраных вершаў у перакладзе на беларускую мову. Памёр 25.4.1957 г.

КАРАЛЁЎ Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў 1958 г. ў Крупках. У 1983 г. скончыў Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя Ламаносава, потым аспірантуру. Працаваў загадчыкам лабараторыі Маскоўскага НДІ пратэзавання. Цяпер у Швецыі ў Стакгольмскім універсітэце.

КАСЕНКА Вадзім Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1967 г. ў в. Ухвала Крупскага раёна ў сям'і настаўнікаў. Скончыў музычна-педагагічны факультэт Мінскага пединстытута. У час службы ў арміі быў салістам ваеннага ансамбля песні і танца «Тачанка». Беларускі эстрадны спявак. З 1989 па 1998 г. саліст Беларускага дзяржаўнага аркестра пад кіраўніцтвам М.Фінберга. З 1998 г. саліст ансамбля «Песняры». Жыве ў Мінску.

КЛІМКОВІЧ Міхась (Міхаіл Мікалаевіч), нарадзіўся 20.11.1899 г. ў в. Сялітранікі былога Барысаўскага павета. Беларускі пісь-

Міхась Клімковіч.

П.П.Кошалеў.

меннік. У 1915 г. скончыў Барысаўскае вышэйшае чатырохкласнае вучылішча і здаў экстэрнам экзамен на званне народнага настаўніка. У 1915—21 гг. настаўнічаў на Барысаўшчыне, у тым ліку ў Хацюхоўскай школе. З 1921 па 1923 г. служыў у Чырвонай Арміі, потым зноў працаваў настаўнікам. Некаторы час быў на партыйнай і прафсаюзнай рабоце. У 1932—39 гг. старшыня аргкамітэта, старшыня Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У першыя месяцы фашысцкай акупацыі цяжка захварэў, займаўся сельскай гаспадаркай. У 1943 г. наладзіў сувязь з партызанамі атрада «За Радзіму», адкуль неўзабаве быў перапраўлены ў Маскву. З 1943 па 1947 г. галоўны рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР у Маскве. У 1947—54 гг. літкансультант, адначасова ўзначальваў камісію па рабоце з маладымі аўтарамі ў СП БССР.

Свае першыя вершы змясціў у рукапісным літаратурным часопісе «Проблескі». У 1929 г. ў альманаху «Ранне» былі надрукаваны яго першая паэма «Чатырнаццаць слуцкіх» і шэраг вершаў. Ён аўтар тэксту Дзяржаўнага гімна БССР (1944), драматычных паэм на гістарычную тэму: «Кацярына Жарнасек» (1937), «Адплата» (1945), трылогіі «Георгій Скарына» (1946—47, 1955) і інш.

М.Клімковіч з'яўляецца аўтарам лібрэта оперы «Кастусь Каліноўскі», балета «Князь-возера». Значны ўклад унёс у даследаванне беларускай літаратуры. Выйшлі ў друку такія яго працы, як «Літаратура Савецкай Беларусі за 15 год» (1934), «Аб жыватворчым уплыве рускай літаратуры на беларускую літаратуру» (1955), «Літаратурна-крытычныя артыкулы» (1962). Перакладаў на беларускую мову творы Л.Талстога, А.Чэхава, І.Крылова, Т.Шаўчэнкі, П.Тычыны, літоўскіх і польскіх пісьменнікаў. Узнагароджаны медалём. Памёр 5.11.1954 г.

КЛЯШЧОНАК Аляксей Піліпавіч, нарадзіўся 5.1.1940 г. ў в. Дзянісавічы Крупскага раёна. Заслужаны работнік МУС СССР. Скончыў Дзянісавіцкую васьмігадовую школу, у 1957 г. — Барысаўскае вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі. Працаваў у саўгасе «Ухвала», з 1962 па 1965 г. — слесарам на Мінскім аўтамабільным заводзе. Адначасова вучыўся ў школе працоўнай моладзі пры заводзе. У 1965—84 гг. працаваў у органах унутраных спраў г. Мінск. У 1965—70 гг. працягваў вучобу на вячэрнім аддзяленні юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З 1984 па 1985 г. начальнік аддзела БХСС Беларускага ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце, з 1985 па 1994 г. намеснік, начальнік упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкома, у 1994—95 гг. начальнік вучэбнага цэнтра МУС Рэспублікі Беларусь, у 1996—97 гг. галоўны спецыяліст Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь, загадчык аддзела апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Генерал-маёр (1991). Узнагароджаны медалямі. Жыве ў Мінску.

КЛЯШЧОНАК Емяльян Іванавіч, нарадзіўся ў 1933 г. ў Крупках. У 1953 г. скончыў Полацкі лесатэхнікум, потым працягваў вучобу ў Беларускім політэхнічным інстытуце. Кандыдат тэхнічных навук (1978). Жыве ў Мінску.

КЛЯШЧОНАК Леанід Піліпавіч, нарадзіўся ў 1938 г. ў в. Дзянісавічы Крупскага раёна. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. З 1965 г. суддзя, старшыня суда Смалявіцкага раёна, з 1979 г. ў Вярхоўным судзе, з 1993 г. ў Мінскім абласным гаспадарчым судзе. Жыве ў Мінску.

КОШАЛЕЎ Піліп Пятровіч, нарадзіўся ў 1897 г. ў в. Майск Крупскага раёна. Заслужаны дзеяч навук РСФСР (1924). У 1928 г. скончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут журналістыкі, у 1936 г. — Інстытут краснай прафесуры. Доктар эканамічных навук, прафесар. З 1921 г. быў на савецкай, прафсаюзнай рабоце, працаваў журналістам. З 1928 г. выкладчык, у 1953—83 гг. прафесар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Памёр у 1987 г.

КРУЧОК Іван Мікітавіч, нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Клён Крупскага раёна. У 1949 г. скончыў Малажаберыцкую школу, потым Ленінградскае ваеннае вучылішча. З 1954 г. служыў у Беларускай ваеннай акрузе. Пал-

коўнік. Цяпер выкладчык ваеннай кафедры Мінскага радыётэхнічнага інстытута. Жыве ў Мінску.

КРУЧОК Пётр Пятровіч, нарадзіўся ў 1934 г. ў в. Клён Крупскага раёна. Скончыў Ленінградскае ваенна-марское вучылішча і Ваенна-палітычную акадэмію імя У.І.Леніна ў Маскве. Служыў на Балтыйскім, Чарнаморскім, Далёкаўсходнім флатах. З 1980 г. працаваў у палітупраўленні флота (Масква). З 1994 г. капітан I рангу ў запасе. Жыве ў г. Санкт-Пецярбург.

ЛАЖЭЧНІКАЎ Яўген Барысавіч, нарадзіўся 9.7.1932 г. ў г. Барысаў Мінскай вобласці. З 1941 па 1950 г. жыў у Крупках. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. З 1955 па 1959 г. старшы інжынер у аб'яднанні «Дармаш» у Мінску. У 1959—62 гг. вучыўся ў аспірантуры, потым працаваў загадчыкам аддзела Міністэрства адукацыі БССР, намеснікам галоўнага рэдактара «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». Кандыдат тэхнічных навук (1963), дацэнт (1965), доктар тэхнічных навук (1968). З 1969 г. старшы навуковы супрацоўнік, дацэнт, прафесар Беларускай політэхнічнай акадэміі. Жыве ў Мінску.

ЛАЙКОЎ Рыгор Кліменцьевіч, нарадзіўся 21.3.1937 г. ў в. Харытанцы Крупскага раёна. Завочна скончыў Мінскі інстытут народнай гаспадаркі. Працаваў рабочым, брыгадзірам калгаса «Абчуга», з 1962 г. — выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, дэканам факультэта эканомікі сельскай гаспадаркі Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імя Куйбышава. Кандыдат эканамічных навук. Памёр 16.10.1982 г.

ЛІПЕЦКІ Эдуард Антонавіч, нарадзіўся 28.10.1938 г. ў Крупках. У 1961 г. скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў выкладчыкам гісторыі Халопеніцкай сярэдняй школы Крупскага раёна. Пасля сканчэння аспірантуры (1967) выкладчык Мінскага лінгвістычнага універсітэта. Кандыдат гістарычных навук (1973), дацэнт (1980). Тэмай яго гістарычных даследаванняў з'яўляюцца палітычныя партыі ў Беларусі 1917—18 гг.

ЛІС Аляксей Георгіевіч, нарадзіўся ў 1929 г. ў Нараўлянскім раёне Гомельскай вобласці. У 1951 г. працаваў рахункаводам у Крупскай сярэдняй школе № 1. Скончыў Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя Ламаносава (з 1956). З 1957 г. ў Дзяржплане БССР, адначасова вучыўся ў аспірантуры НДІ пры Дзяржплане СССР. Кандыдат эканамічных навук. Доўгі час быў загадчыкам

Р.К.Лайкоў.

Васіль Макарэвіч.

аддзела Дзяржплана СССР па рэспубліках Беларусі і Прыбалтыкі, выкладаў у розных вышэйшых навучальных установах Масквы. Аўтар многіх навуковых прац па эканоміцы. Доктар эканамічных навук, прафесар. Працуе ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя Ламаносава.

ЛЫЦІН Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся 2.1.1949 г. ў в. Малыя Жаберычы Крупскага раёна. У 1971 г. скончыў Мінскі інстытут замежных моў. Працаваў настаўнікам у школе № 104 г. Мінск. З 1974 г. асістэнт, выкладчык, намеснік дэкана, з 1989 г. загадчык кафедры Мінскага лінгвістычнага універсітэта. Кандыдат філалагічных навук (1986), дацэнт. Віцэ-прэзідэнт таварыства «Беларусь—Іспанія». Аўтар двух падручнікаў для вышэйшай школы, многіх навуковых артыкулаў. Жыве ў Мінску.

МАКАРЭВІЧ Васіль Сцяпанавіч, нарадзіўся 15.7.1939 г. ў в. Купленка Крупскага раёна. Беларускі паэт, журналіст. Пасля школы працаваў на лесараспрацоўках Поўначы, з 1958 г. — у калгасе. У 1964 г. скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Чатыры гады працаваў літаратурным кансультантам у газеце «Чырвоная змена». З 1979 г. спецкарэспандэнт Беларускага радыё.

Першы верш надрукаваны ў 1956 г. ў газ. «Чырвоная змена». Аўтар зборнікаў паэзіі «Вогненная камета» (1963), «Мерыдыяны і паралелі» (1966), «Ліставей» (1971), «Вечнае дрэва» (1974), «Радоўка» (1977), «Відушчы посах» (1987), «Сумежжа» (1989). Уражанні пра сустрэчы з землякамі, простымі сціплымі людзьмі леглі ў аснову яго цікавай кнігі нарысаў «Палын і медуніца» (1976). У форме дарожнага дзённіка напісана

кніга нарысаў «Зямное сузор'е» (1980). Жыве ў Мінску.

КРУПКА

Ты сэрцы не многіх кранала,
Ім сны не снавала свае.
І чыстай крупінкай апала
У думы і песні мае.

Загрукала градам агрэсту
Пад хатай — дары аддала.
Маё залатое маленства
Дажджом, як з вядра, абдала.

Згадаў я
І школьныя ліпы,
І шлях ад бацькоўскіх дзвярэй...
Ліпнёўскім лістком ты прыліпла
Ка мне да грудзей.

І грудзі напоўніла горам,
Ледзь грымнула громам вайна.
І ў стэпе далёкім і ў горах
Я часта тады ўспамінаў
Віры акунёвыя,
Крыгі,
Пад хлебным закальцам аер,
І родныя песні,
І кнігі,
Узятыя напавер.
Васіль Макарэвіч.

МАЛАСАЙ Іван Пятровіч, нарадзіўся ў пас. Крупскі Крупскага раёна. Працаваў дацэнтам Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі. Памёр у 1997 г.

МАРОЗАЎ Дзмітрый Дзмітрыевіч, нарадзіўся 30.9.1954 г. ў пас. Язбы Крупскага раёна. Беларускі паэт. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў аграномам на Магілёўшчыне, быў на камсамольскай рабоце. Цяпер памочнік міністра Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Выдаў некалькі паэтычных зборнікаў: «Пад небам буслiным», «Хлебны верасень», «Апакаліпсіс душы», «Ачышчэнне сяўбой» і інш.

МАЦКЕВІЧ Мікіта Сямёнавіч, нарадзіўся ў в. Лісічына ў сям'і селяніна-батрака. Да прызыву ў царскую армію (1915) таксама батрачыў у пана. З верасня 1917 г. працаваў старшынёй Лісічынскага валаснога выканкома, інструктарам, загадчыкам пададдзела Сенненскага павятовага выканкома. З 1920 г. сакратар Сенненскага павятовага камітэта КП(б)Б, з 1925 г. першы сакратар Коханаўскага, потым Дубровенскага райкома партыі. Дэлегат XI з'езда КП(б)Б, многіх усебеларускіх з'ездаў Саветаў. Выбіраўся членам ЦВК БССР.

МЕЛЬНІК Фёдар Іванавіч, нарадзіўся ў 1938 г. ў в. Буда Крупскага раёна. Скончыў Хацюхоўскую сярэднюю школу, потым Беларускі дзяржаўны універсітэт. Кандыдат гістарычных навук. Працаваў выкладчыкам, дацэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Памёр у 1986 г.

НАВАХРОСТ Аляксандр Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1951 г. ў в. Навахросты Крупскага раёна. Кампазітар. Выхоўваўся ў дзіцячым доме. Скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя М.І.Глінкі і Беларускую дзяржаўную кансерваторыю (клас кампазіцыі). Вучань вядомага кампазітара прафесара Я.А.Глебава. Сакратар Саюза кампазітараў Рэспублікі Беларусь. Аўтар музыкі да спектакляў «Я.Арлоўскі», «Дарога ў рай», кантаты на вершы Я.Коласа «Усход сонца», сімфанічнай паэмы, араторыі паводле паэмы Р.Раждественскага «210 крокаў», канцэрта для флейты і аргана, сімфоніі паводле паэмы Ю.Марцінкявічуса «Сцяна» і іншых твораў. Жыве ў Мінску.

НОВІКАЎ Пётр Герасімавіч, нарадзіўся ў 1946 г. ў в. Лютыя Крупскага раёна. Прафесар Мінскага педагагічнага інстытута.

НОВІКАЎ Пётр Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1946 г. ў в. Лютыя Крупскага раёна. У 1970 г. скончыў Мінскі медыцынскі інстытут. З 1971 г. працуе выкладчыкам Мінскага медыцынскага інстытута. Кандыдат медыцынскіх навук.

НУЖДЗІНА Тамара Сяргееўна, нарадзілася ў 1946 г. У 1969 г. скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працуе выкладчыкам у Мазырскім педагагічным інстытуце. Кандыдат філалагічных навук.

ПЁТУХ Пётр Пятровіч, нарадзіўся 3.11.1950 г. ў в. Вялікія Жаберычы Крупскага раёна. Працаваў майстрам, намеснікам начальніка цэха, начальнікам аддзела кадраў Барысаўскага завода электратрактарнага абсталявання. У 1978 г. скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. З 1978 г. на партыйнай і дзяржаўнай рабоце. У 1989—91 гг. старшыня Барысаўскага гарвыканкома, потым намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта БССР па прамысловасці і міжгаліновай вытворчасці, прэзідэнт Беларускага дзяржаўнага канцэрна «Белмясцпрам». З 1994 па 1998 г. працаваў

старшынёй Мінскага аблвыканкома. Жыве ў Мінску.

ПРЫШЧЭПАЎ Дзмітрый Філімонавіч, нарадзіўся ў 1896 г. ў в. Малінаўка Крупскага раёна ў сям'і батрака. Вучыўся ў царкоўнаприходскай школе, экстэрнам здаў экзамены на званне народнага настаўніка, потым скончыў паскораны курс Віленскага ваеннага вучылішча. Быў камандзірам роты запаснога палка. У час Кастрычніцкай рэвалюцыі камандзір 698-га палка. Пасля рэвалюцыі на дзяржаўнай і гаспадарчай рабоце ў Віцебскай губерні. З 1924 па 1929 г. народны камісар земляробства Беларусі. У 1929 г. прызначаны намеснікам старшыні Дзяржплана БССР. Двойчы (у 1930 і 1937 гадах) быў арыштаваны і асуджаны. У 1937 г. прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Памёр 31.1.1940 г. ў турэмнай бальніцы. Рэабілітаваны.

КАМІСАР ЗЕМЛЯРОБСТВА

Дэмабілізаваўшыся са службы ў самым канцы 1917 года, падпаручнік Дзмітрый Прышчэпаў хутка з'явіўся ў родных мясцінах — у вёсцы Калодніца. Ужо ў пачатку 1918 года былога камандзіра 698 палка Дзмітрыя Філімонавіча выклікалі ў павятовы Савет і прызначылі камандзірам атрада Чырвонай гвардыі. Неўзабаве з некалькіх такіх атрадаў утварыліся 1-ы і 2-і Смаленскія палкі Чырвонай Арміі, а 22-гадовага Прышчэпава выбралі камандзірам аднаго з іх і прызначылі павятовым камісарам па зямельных справах. Яшчэ праз невялікі прамежак часу ён стаў старшынёй Сенненскага павятовага выканкома і рэўкома і адначасова павятовага камітэта партыі бальшавікоў.

... Летам таго ж 1918 года ў Сянно, як і ў шэрагу іншых месц на тэрыторыі Беларусі, эсэры паднялі паўстанне. Вядомы даследчык Н.Каменская разам з адным са сваіх сааўтараў С.Азаравым пісала ў часопісе «Полымя»: «У Сенненскім павеце... (паўстанцы) на чале з Закрэўскім і Прышчэпавым часова захапілі ўладу. На падаўленне паўстання, галоўнай сілай якога быў другі полк 2-й Смаленскай дывізіі, былі кінуты атрады Віцебскага губЧК і Латышскага палка...»

Як, якім чынам вёў сябе ў гэтых умовах Змітрок Прышчэпаў? Пазнаёміўшыся з мноствам архіўных дакументаў, я асабіста схіляюся да думкі, што Змітрок свядома прыняў удзел у паўстанні. Нездарма ж сам Прышчэпаў у асабістай рэгістрацыйнай картцы члена РКП(б) напіша: «Прымыкаў да эсэраў».

Яго ж у самым пачатку 1920-х гадоў накіроўваюць на розныя ўчасткі мірнага будаўніцтва: старшынёй рэвалюцыйнага камітэта ў Веліжы, павятовага выканаўчага камітэта ў Оршы, загадчыкам губернскага зямельнага аддзела ў Віцебску.

У сакавіку 1924 года Дз.Ф.Прышчэпава прызначылі намеснікам народнага камісара земляробства Беларусі, а ў снежні таго ж года яму прапанавалі пасаду наркома земляробства БССР. Народным камісарам ён працаваў чатыры гады і дзевяць месяцаў.

Занесеныя ў разрад правых ухілістаў, аднадумцаў Бухарына, Рыкава і Томскага, і надзеленыя сваёй, мясцовай назвай «прышчэпаўшчына», Змітрок Філімонавіч і яго аднадумцы трапілі, натуральна, пад агонь рэзкай і неабгрунтаванай партыйнай крытыкі. 14 верасня 1929 года Прышчэпава здымаюць з паста наркома земляробства. А ў 1930 годзе разам з групай беларускіх нацыянальных дзеячаў органы ДПУ арыштоўваюць і яго. Дарэчы, з членаў першага ўрада рэспублікі сярод арыштаваных былі трое: Дз.Прышчэпаў, Язэп Дыла і Антон Баліцкі. Яны абвінавачваліся ў прыналежнасці да неіснуючай контррэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ).

Сакратар ЦК КП(б)Б Канстанцін Гей на XIII з'ездзе Кампартыі Беларусі прысвяціў «канчатковаму разгрому «прышчэпаўшчыны» цэлы раздзел сваёй палітычнай справаздачы. «Калі Сталыпіну ўдалося перавесці на хутары да рэвалюцыі 22 працэнты сялянскіх гаспадарак, дык Прышчэпаў за час сваёй дзейнасці перавёў амаль 18 працэнтаў», — адзначаў ён.

Разам з іншымі членамі міфалагічнага «СВБ» вясной 1931 года былым народным камісарам Беларусі быў вынесены прысуд. Змітрок Прышчэпаў атрымаў 10 гадоў канцлагера, такі ж лёс чакаў Антона Баліцкага, а Язэпу Дылу далі 5 гадоў ссылкі ў аддаленыя раёны Расіі. Адтуль былы нарком земляробства не вярнуўся.

Беларусь, 1992, № 3.

РАМАНОЎСКІ Аляксандр Міхайлавіч, нарадзіўся 30.5.1953 г. ў Крупках. Скончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітна-ракетнае вучылішча. З 1975 па 1978 г. інжынер палка ў Калінінградскай вобласці. У 1978—81 гг. працягваў вучобу ў Харкаўскай ваеннай акадэміі, потым ад'юнктуры. Кандыдат тэхнічных навук (1981). З 1981 па 1992 г.

Г.Я.Раўнаполец.

В.М.Стасевіч.

выкладчык, дацэнт, намеснік начальніка па вучэбнай рабоце Днепрапятроўскага вышэйшага ракетнага вучылішча. З 1992 па 1994 г. начальнік ваеннай кафедры, з 1994 г. начальнік вучэбнай часці па ваеннай падрыхтоўцы Днепрапятроўскага дзяржаўнага універсітэта. Аўтар 60 навуковых прац. Палкоўнік. Жыве ў г. Днепрапятроўск.

РАЎНАПОЛЕЦ Генадзь Яўсеевіч, нарадзіўся ў 1938 г. на Крупшчыне. У 1961 г. скончыў Ульянаўскае танкавае вучылішча, у 1972 г. — акадэмію бранятанкавых войск імя маршала Маліноўскага. Прайшоў шлях ад камандзіра ўзвода да камандзіра палка. Палкоўнік. Узнагароджаны 2 ордэнамі, 8 медалямі. З 1982 г. і да выхаду на пенсію загадваў кафедрай Літоўскага дзяржаўнага інстытута фізічнай культуры.

РУСЕЦКАЯ Валянціна Гаўрылаўна, нарадзілася ў 1941 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. Скончыла Мінскі медыцынскі інстытут, аспірантуру, у 1964 г. — ардынатуру. Кандыдат медыцынскіх навук. З 1964 г. ўрач-тэрапеўт 4-й клінічнай бальніцы ў Мінску, потым працавала ў Беларускім НДІ кардыялогіі. Цяпер намеснік дырэктара гэтага інстытута. Аўтар 82 навуковых прац.

САМЦЭВІЧ Пётр Андрэевіч, нарадзіўся 6.3.1899 г. ў в. Дакудава Крупскага раёна. Беларускі лінгвіст, краязнавец, фалькларыст і этнограф. У 1922 г. скончыў Горацкі сельскагаспадарчы інстытут. У 1937—41 гг. вучыўся ў Мінскім педінстытуце. Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1923 г. на педагагічнай рабоце. Заснавальнік Барысаўскага краязнаўчага музея. Займаўся зборам матэрыялаў па гісторыі, геаграфіі, геалогіі Барысаўшчыны. Сабраў таксама каля 1000 фальклорных запісаў. У 1924 г. перадаў Інбелкульту больш як 300 тэкстаў замоў, казак, песень, прыпевак. Зрабіў шмат апрацовак лінгвістычнага матэрыялу. Друкаваўся ў часопісе «Наш край». Памёр у жніўні 1941 г.

САМЦЭВІЧ Сямён Андрэевіч, нарадзіўся 27.7.1902 г. ў в. Дакудава Крупскага раёна. Беларускі вучоны-мікрабіёлаг. Член-карэспандэнт АН БССР (1967). Доктар біялагічных навук (1954), прафесар (1956). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1977). У 1924 г. скончыў Горацкі сельскагаспадарчы інстытут, у 1930 г. — Валагодскі малочнагаспадарчы інстытут. У 1934—38 гг. у Інстытуце біялагічных навук АН БССР. Удзельнік Айчыннай вайны. Да вайны і ў 1947—63 гг. працаваў на Украіне. У 1964—73 гг. загадчык лабараторыі мікрабіялогіі Інстытута эксперыментальнай батанікі і мікрабіялогіі, загадчык Аддзела мікрабіялогіі АН БССР. З 1973 г. загадчык лабараторыі, з 1977 г. навуковы кансультант Інстытута мікрабіялогіі АН БССР. Асноўная тэма яго даследаванняў — узаемаадносіны паміж мікраарганізмамі глебы і вышэйшымі раслінамі і магчымасці кіравання імі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

СІНІЦЫН Мікалай Васілевіч, нарадзіўся 5.8.1938 г. ў в. Заполле Крупскага раёна. У 1955 г. з сярэбраным медалём скончыў сярэднюю школу ў в. Нача, у 1960 г. — гідратэхнічны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута. Працаваў у навукова-даследчым інстытуце энергетычнай прамысловасці, працягваў вучобу ў аспірантуры. У 1967 г. абараніў дысертацыю. Працаваў на кафедры гідратэхнічнага будаўніцтва Мінскага політэхнічнага інстытута. Дацэнт. З 1978 г. дэкан гэтага факультэта. Аўтар многіх артыкулаў і каля 50 навуковых прац у галіне інжынернай гідраўлікі і гідраэнергіі. Узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства народнай адукацыі. Памёр у 1998 г.

СТАСЕВІЧ Валерый Мікалаевіч, нарадзіўся 24.4.1949 г. ў в. Вялікі Бор Хойніцкага раёна. У 1972 г. скончыў Мінскі медыцынскі інстытут. З 1972 па 1977 г. урач Крупскай цэнтральнай бальніцы. У 1979 г. скончыў ардынатуру пры Беларускім інстытуце ўдасканалення ўрачоў. У 1979—89 гг. працаваў у Мінскай абласной бальніцы. З 1989 г. асістэнт, дацэнт (1996) кафедры хірургіі Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў. Кандыдат медыцынскіх навук (1990). Хірург вышэйшай катэгорыі (1991).

СТАШОНАК Вілорый Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1931 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. У 1956 г. скончыў Беларускі дзяржаўны

універсітэт, у 1957 г. — аспірантуру пры універсітэце. Кандыдат хімічных навук. Працуе старшым навуковым супрацоўнікам навукова-даследчай лабараторыі пры БДУ. Узнагароджаны залатым медалём ВДНГ.

СТРАШКО Анатоль Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1946 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. У 1966 г. скончыў суднабудаўнічае аддзяленне Калінінградскага мараходнага вучылішча, у 1973 г. — суднаводчы факультэт Калінінградскага вышэйшага інжынернага марскога вучылішча, у 1975 г. — аспірантуру. Кандыдат тэхнічных навук (1980). Дацэнт Дзяржаўнай марской акадэміі імя адмірала С.В.Макарава.

СУША Тамара Мікалаеўна. Выпускніца Бобрскай сярэдняй школы. У 1963 г. скончыла інстытут замежных моў. Кандыдат філалагічных навук (1964). Дацэнт Мінскага лінгвістычнага універсітэта.

ТРУХНОЎ Рыгор Маркавіч, нарадзіўся 15.10.1908 г. ў в. Шамкі Крупскага раёна. Доктар гістарычных навук (1966), прафесар (1967). У 1934 г. скончыў Беларускі дзяржаўны вышэйшы пединстытут, у 1939 г. паступіў у аспірантуру пры БДУ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Аўтар прац па гісторыі Германіі. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў, медалямі. Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР (1982).

ТРЫПУЦЕНЬ Пётр Мікалаевіч. Выпускнік Хацюхоўскай сярэдняй школы Крупскага раёна. Палкоўнік. Жыве ў Маскве.

УСОШЫН Мікалай Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Радзіца Крупскага раёна. Генерал-маёр. Да выхаду на пенсію працаваў у Ваеннай Акадэміі імя Фрунзе. Жыве ў Маскве.

ФАМІН Васіль Пятровіч, нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Стары Бобр. У 1957 г. скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў інжынерам па воднай гаспадарцы ў г. Кустанай, потым у г. Чэлябінск. У 1969—76 гг. дырэктар навукова-даследчага інстытута воднай гаспадаркі і меліярацыі БССР. З 1976 г. начальнік управлення па меліярацыі (г. Масква), працаваў на Кубе. З 1989 г. на пенсіі. Жыве ў Маскве.

ФАТЫХАВА Галіна Ахметаўна, нарадзілася ў 1946 г. ў в. Ігрушка Крупскага раёна. У 1964 г. скончыла Крупскую сярэднюю школу. У 1965—68 працавала старшай табельшчыцай, загадчыцай сектара ўліку камітэта камсамола на заводзе імя Дзяржынскага ў Мінску. У 1972 г. скончыла БДУ. З 1969 г. рэдактар, з 1997 г. намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя». Член Саюза журналістаў Беларусі і Беларускага Саюза мастакоў. Аўтар артыкулаў пра беларускіх мастакоў для айчынных і замежных энцыклапедычных выданняў. Жыве ў Мінску.

А.М.Страшко.

Р.М.Трухноў.

В.П.Філонаў.

ФІЛОНАЎ Валерый Пятровіч, нарадзіўся 7.11.1949 г. ў в. Кіявец Крупскага раёна. У 1973 г. скончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут. У 1973—77 гг. санітарны ўрач, галоўны санітарны ўрач Лепельскага раёна, у 1977—85 гг. галоўны санітарны ўрач Цэнтральнага раёна Мінска. Кандыдат медыцынскіх навук (1985). Пасля абароны дысертацыі працаваў выкладчыкам Мінскага медыцынскага інстытута. З 1986 па 1989 г. галоўны ўрач Рэспубліканскай санітарна-эпідэміялагічнай станцыі, намеснік галоўнага дзяржаўнага ўрача СССР. З верасня 1989 г. намеснік міністра аховы здароўя Беларусі, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач рэспублікі. Доктар медыцынскіх навук (1996).

З інтэрв'ю карэспандэнта з В.П.Філонавым

— Валерый Пятровіч, Вы сталі галоўным дзяржаўным санітарным урачом БССР. Перад Вамі, безумоўна, паўстаў шэраг складаных і немінучых пытанняў, звязаных з пагаршэннем экалагічнай абстаноўкі. Якія з іх можна выдзеліць як першаступенныя?

— Перад намі стаіць галоўная задача — дабіцца рэальнага забеспячэння на дзяржаўным узроўні права кожнага чалавека на спрыяльнае навакольнае асяроддзе. Востра стаіць пытанне аб рацыянальным прымяненні ядахімікатаў, мінеральных угнаенняў. У рэспубліцы ў лістападзе 1988 г. прынята на перыяд да 2000 года праграма «Здароўе», у якой прадугледжаны канкрэтныя тэрміны вырашэння многіх экалагічных праблем.

— Ці ёсць у нас дакладная праграма дзеянняў?

— Так, ёсць. Яе мэта — забеспячэнне радыяцыйнай бяспекі і абмежаванне ўздзеяння прамянёвых доз на насельніцтва. Асноўныя напрамкі работы: забеспячэнне радыяцыйнага кантролю за прадуктамі харчавання і пітной вадой, ажыццяўленне дзяржаўнага санітарнага нагляду за аздараўленнем умоў працы, быту і харчавання насельніцтва, удасканаленне эпіднагляду ў пацярпелых раёнах, правядзенне індывідуальнага дазіметрычнага кантролю.

— Валерый Пятровіч, санітарны ўрач надзелены вялікімі паўнамоцтвамі, якія ён часта не ў поўнай меры выкарыстоўвае. Якім павінен быць у Вашым уяўленні сучасны санітарны ўрач, якім патрабаванням дня ён адказваў бы і якім павінен быць узровень яго тэхнічнага аснашчэння?

— У маім уяўленні сучасны санітарны ўрач, акрамя агульных ведаў асноў заканадаўства аб ахове здароўя, прававых пытанняў, дырэктыўных і заканадаўчых дакументаў, якія вызначаюць мэты, задачы санэпідэмслужбы, правы і абавязкі санітарнага ўрача, павінен умець ацэньваць стан здароўя насельніцтва, фактары неспрыяльнага ўздзеяння, эфектыўнасць запланаваных мерапрыемстваў і ажыццяўляць кантроль за іх своечасовай рэалізацыяй. Ён павінен не толькі арганізаваць лабараторна-інструментальны кантроль, але і аналізаваць вынікі даследаванняў, прымаць дзейсныя меры. Санітарны ўрач павінен быць не толькі высокаадукаваным спецыялістам, але і ўрачом, якому ўласціва міласэрнасць, які ўмее адстойваць інтарэсы людзей і свае перакананні, браць ініцыятыву і адказнасць на сябе, бачыць усю глыбіню праблемы і знаходзіць яе вырашэнне. Важным з'яўляецца ўменне санітарнага ўрача працаваць з людзьмі.

Здравоохранение Белоруссии. 1990, № 1.

Г.А.Харытановіч.

Ф.М.Харытановіч.

ХАДАСЕВІЧ Сцяпан Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1891 г. ў в. Дакудава Крупскага раёна. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. У 1920—21 гг. народны камісар земляробства Беларусі. Пасля жыў у Маскве. Скончыў інстытут народнай гаспадаркі. Працаваў бухгалтарам, галоўным бухгалтарам. Памёр у 1968 г.

ХАМЯКОЎ Георгій Антонавіч. Выпускнік Малажаберыцкай сярэдняй школы Крупскага раёна. Служыў на Паўночным, Ціхаакіянскім флатах, у штабе БВА. Капітан I рангу ў запасе.

ХАМЯКОЎ Канстанцін Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1945 г. ў Крупках. Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў. Працуе выкладчыкам Мінскага лінгвістычнага універсітэта.

ХАРЫТАНОВІЧ Генадзь Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1935 г. ў в. Нача Крупскага раёна. У 1968 г. скончыў Ленінградскую ваенную акадэмію. Працаваў начальнікам штаба Мурманскай флатыліі. Капітан I рангу ў запасе. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў г. Мурманск.

ХАРЫТАНОВІЧ Фёдар Мікалаевіч, нарадзіўся 6.9.1905 г. ў в. Нача Крупскага раёна. Беларускі вучоны ў галіне лесаводства. Доктар сельскагаспадарчых навук (1954), прафесар (1957). У 1926 г. скончыў Харкаўскі сельскагаспадарчы інстытут. У 1937—41 гг. дырэктар Украінскага НДІ агралесамеліярацыі ў Харкаве, у 1948—49 гг. ва Усесаюзным НДІ лесаводства і механізацыі лясной

гаспадаркі. З 1959 па 1964 г. дырэктар Беларускага НДІ лясной гаспадаркі. Аўтар навуковых прац па біялагічных і экалагічных асаблівасцях дрэвавых і кустовых парод, заканамернасцях іх росту і развіцця, полеахоўных лясных палосах. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1983 г.

ХАЦКЕВІЧ Рыгор Мікітавіч, нарадзіўся 27.2.1911 г. ў в. Ратуцічы Барысаўскага раёна. Беларускі пісьменнік. У 1930 г. скончыў Барысаўскі педагагічны інстытут, завочна — Мінскі педагагічны інстытут. З 1930 г. настаўнік, супрацоўнік Чэрвеньскай раённай газеты. У 1933—36 гг. настаўнічаў у Крупках. У лістападзе 1936 г. быў арыштаваны за прыналежнасць да так званых «нацдэмаў». З 1938 па 1946 г. знаходзіўся ў папраўча-працоўным лагеры. У 1947—50 гг. зноў настаўнічаў у Негнавіцкай, Крупскай школах. У 1957 г. быў рэабілітаваны. Пасля рэабілітацыі працаваў у Барысаўскім раёне, займаўся літаратурнай творчасцю. Былі апублікаваны зборнікі яго вершаў «Наш пяты клас» (1962), «Бяроза на ўзлеску» (1977), аповесці «На золку» (1972), «Хмара над лесам» (1980). Памёр у 1979 г.

ХРАМЧАНКА Рыгор Міхайлавіч, нарадзіўся 2.6.1939 г. ў в. Глінаўка Крупскага раёна. Пасля сканчэння Хальнявіцкай сярэдняй школы (1957) працаваў жывёлаводам-пастухом у саўгасе «Сялява», потым быў на камсамольскай, партыйнай рабоце. Завочна скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, партыйную школу (1976). З 1974 г. ў ЦК КПБ, сакратар Сенненскага райкома партыі. З 1992 г. на адказных пасадах у апараце Вярхоўнага Савета РБ, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

ХРЫПАЧ Віктар Якаўлевіч, нарадзіўся 1.1.1936 г. ў в. Асечана Крупскага раёна. У 1955 г. скончыў Чарэйскую сярэднюю школу. Працаваў рабочым, эканамістам, начальнікам лабараторыі Мінскага завода аўтаматычных ліній. У 1964 г. скончыў вячэрні факультэт Інстытута народнай гаспадаркі. Кандыдат эканамічных навук (1973), доктар эканамічных навук (1989), прафесар (1990). З 1970 па 1976 г. старшы навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі, потым старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры Інстытута народнай гаспадаркі. З 1991 г. працуе загадчыкам кафедры эканомікі і арганізацыі вытворчасці Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Рыгор Хацкевіч.

ЦІТАВЕЦ Аляксандр Віктаравіч, нарадзіўся 25.2.1958 г. ў в. Селішча Крупскага раёна. У 1973 г. скончыў Стараславодскую васьмігадовую школу, у 1975 г. — Ухвальскую сярэднюю школу. З 1975 па 1976 г. працаваў у саўгасе «Новая ніва». У 1977—82 гг. вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта, пасля сканчэння якога настаўнічаў у Стараславодскай васьмігадовай школе і адначасова займаўся ў аспірантуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Кандыдат філалагічных навук (1986). Цяпер працуе старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Адзін з аўтараў калектыўнай манаграфіі «Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян» (1993), кніг «Восточнославянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии» (1993), «Магія слова чароўнага» (1995), а таксама многіх навуковых артыкулаў па тэорыі вуснай народнай творчасці і традыцыйнай духоўнай культуры. Жыве ў Мінску.

ЦІТАВЕЦ Анатоль Віктаравіч, нарадзіўся 13.6.1951 г. ў в. Селішча Крупскага раёна Мінскай вобласці. У 1976 г. скончыў Стараславодскую васьмігадовую школу, у 1978 — Ухвальскую сярэднюю школу, у 1982 — Саратаўскае вышэйшае ваенна-камандное вучылішча. Служыў камандзірам узвода ў Комі АССР. З кастрычніка 1982 г. намеснік камандзіра, камандзір роты, з 1992 г. начальнік штаба батальёна, з 1993 г. камандзір батальёна. У 1996 г. пераведзены ў штаб Паўночна-Заходняй акругі (г. Санкт-Пецярбург) на пасаду афіцэра службы войск і бяспекі ваеннай службы. З 1997 г. старшы афіцэр аператыўнага аддзела штаба. Падпалкоўнік. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Жыве ў Мінску.

А.А.Чайкін.

П.А.Чайкін.

С.П.Шупеня.

І.Ц.Шуцько.

ЦІТАВЕЦ Іван, нарадзіўся ў 1936 г. ў в. Вялікі Вязок Крупскага раёна. Пасля сканчэння Дзянісавіцкай сярэдняй школы доўгі час настаўнічаў. Завочна скончыў Маскоўскі індустрыяльна-педагагічны тэхнікум, Беларускі тэхналагічны інстытут імя Кірава, пасля працаваў у рэдакцыі газеты «Вячэрні Мінск». Яго творы друкаваліся ў газетах і часопісах. У 1995 г. выйшла кніга «Сполахі».

ЦІХАНАВЕЦКІ Васіль Васілевіч, нарадзіўся ў 1912 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. У 1930 г. скончыў Ленінградскі хіміка-тэхналагічны інстытут, потым Вышэйшае ваенна-марское вучылішча імя Фрунзе. Служыў на флоце. Капітан І рангу ў запасе. Мае ўрадавыя ўзнагароды. Памёр у 1998 г.

ЦЭНЦЫБЕР Абель Ісакавіч, нарадзіўся ў г.п. Халопенічы Крупскага раёна. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Быў членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР.

ЧАЙКІН Аляксандр Анісімавіч, нарадзіўся ў 1931 г. ў в. Абчуга Крупскага раёна. У 1958 г. скончыў Вышэйшае ваенна-марское вучылішча. Служыў на караблях і падводных лодках Ціхаакіянскага флоту. Працаваў дэканам штурманскага факультэта Вышэйшага ваенна-марскога вучылішча імя С.В.Макарава ў г. Уладзівасток. Капітан І рангу ў запасе. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі.

ЧАЙКІН Пётр Анісімавіч, нарадзіўся 12.7.1943 г. ў в. Абчуга Крупскага раёна. Палкоўнік (1995). У 1971 г. скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. З 1977 па 1992 г. выкладчык, з 1992 г. намеснік начальніка юрыдычнага аддзела Камітэта дзяржбяспекі РБ. Мае 6 урадавых узнагарод.

ШАРАПАЎ Васіль Іванавіч, нарадзіўся 12.8.1916 г. ў в. Красноўка Крупскага раёна. У 1934—37 гг. працаваў на чыгунцы ў Оршы. З 1937 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 па 1954 г. на партыйнай рабоце ў Мінску. У 1952 г. скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК ВКП(б). З 1954 г. старшыня Мінскага гарвыканкома, з 1967 г. першы сакратар Мінскага гаркома КПБ. У 1972—73 гг. начальнік Галоўнага ўпраўлення шашэйных дарог пры СМ БССР. З 1973 г. міністр будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог БССР. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 6 іншымі ордэнамі.

ШПЛЕЎСКІ Васіль Паўлавіч, нарадзіўся ў 1920 г. Пасля сканчэння Крупскай сярэдняй школы свой лёс звязаў з вайсковай службай. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны І ступені, Аляксандра Неўскага, шматлікімі медалямі. У 1971 г. яму прысвоена званне генерал-маёра.

ШУПЕНЯ Сцяпан Пятровіч, нарадзіўся 10.11.1896 г. ў в. Нача Крупскага раёна. З 1915 г. ў арміі, з 1918 г. — у Чырвонай Арміі. Удзельнік грамадзянскай і Айчыннай войнаў. У 1935 г. скончыў Камуністычны універсітэт нацыянальных меншасцей Захаду імя Мархлеўскага. З 1935 г. на партыйнай рабоце. У 1940—41 гг. першы сакратар Шчучынскага РК КП(б)Б. З ліпеня 1941 г. ў варожым тыле. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Баранавіцкай вобласці. З красавіка 1943 г. камандзір Шчучынскага партызанскага злучэння, член бюро Баранавіцкага падпольнага абкома КП(б)Б. У 1944—57 гг. на партыйнай і дзяржаўнай рабоце. У 1950—54 гг. дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, у 1947—59 гг. — Вярхоўнага

Савета БССР. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Памёр у 1979 г.

ШУЦЬКО Іван Цітавіч, нарадзіўся 25.12.1925 г. ў в. Гаць Крупскага раёна. Беларускі пісьменнік. Да вайны скончыў 8 класаў Крупскай сярэдняй школы. У 1944—46 гг. у Чырвонай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у калгасе. З 1958 па 1961 г. літсупрацоўнік Крупскай раённай газеты. У 1963 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Аўтар кніжак вершаў для дзяцей «Мой мяч» (1953), «Лепшая сяброўка» (1959), «Першае слова» (1964), зборніка баек і вершаваных мініяцюр «Са свайго пункту гледжання» (1966). Асобныя яго творы перакладзены на рускую, літоўскую, марыйскую і калмыцкую мовы. Памёр 31.8.1984 г.

ШЫБЕКА Вера Аляксееўна, нарадзілася ў 1937 г. ў в. Смародзінка Крупскага раёна. Заслужаная артыстка СССР. Працавала дыктарам Цэнтральнага радыё і тэлебачання. Памерла.

ШЫБЕКА Рыгор Аляксеевіч, нарадзіўся 2.1.1929 у в. Смародзінка Крупскага раёна. Скончыў Барысаўскае педагагічнае вучылішча. У 1955—62 г. працаваў настаўнікам у Смародзінскай, потым Пліскай школах. У 1962 г. скончыў завочна БДУ. У 1962—65 гг. працягваў вучобу ў аспірантуры, з 1965 г. працаваў асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам БДУ. Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1970). З 1965 па 1982 г. выкладчык, дацэнт, намеснік дэкана Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З 1982 г. і да выхаду на пенсію галоўны інспектар Міністэрства адукацыі. Жыве ў Мінску.

ЯКІМОВІЧ Канстанцін Іванавіч, нарадзіўся ў 1930 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. Скончыў Вышэйшае тэхнічнае вучылішча імя Баўмана ў Маскве, працуе там выкладчыкам. Кандыдат тэхнічных навук.

Крупшчына спартыўная

КАВЕЦКІ Аляксандр Іванавіч, нарадзіўся 9.12.1972 г. ў в. Лебедзева Крупскага раёна. Скончыў Акадэмію фізічнага выхавання і спорту. З 1993 па 1997 г. спартсмен-інструктар пры Міністэрстве спорту і турызму, член нацыянальнай зборнай Беларусі па веласпорту. Сярэбраны прызёр міжнародных спаборніцтваў у Будапешце (1995), майстар спорту міжнароднага класа (1995). З 1997 г. выкладчык Беларускай акадэміі. Жыве ў Мінску.

КАВЕЦКІ Павел Іванавіч, нарадзіўся 15.1.1975 г. ў в. Лебедзева. Скончыў Акадэмію фізічнага выхавання і спорту. З 1996 г. спартсмен-інструктар пры Міністэрстве спорту і турызму, член нацыянальнай зборнай Беларусі па веласпорту. Пераможца міжнародных спаборніцтваў у Бельгіі (1994), Сербіі (1995). Чэмпіён Беларусі па веласпорту (1996, 1998), майстар спорту міжнароднага класа (1996).

МАКАРЭВІЧ Анатоль Васілевіч, нарадзіўся 19.5.1970 г. ў Крупках. Чэмпіён Беларусі 1983 г. сярод юнакоў у спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы. Сярэбраны прызёр першынства СССР 1987 г., чэмпіён краін СНД па бегу на 800 м.

ПЫЖЫК (ОРГІШ) Галіна Васілеўна, нарадзілася 6.6.1954 г. ў в. Ігрушка Крупскага раёна. У 1976 г. скончыла Мінскі політэхнічны інстытут. Працавала інжынерам на Мінскім трактарным заводзе. Майстар спорту

Г.В.Пыжык.

па лёгкай атлетыцы (1977), чэмпіёнка Спартакіяды сярод ВНУ СССР (1977), першынства сярод працаўнікоў ВЦСПС (1978), 12-разовая чэмпіёнка БССР. Рэкардсменка Беларусі па бегу на 800 м. Працуе інжынерам у вытворчым аб'яднанні «Мантажнік». Жыве ў Мінску.

РЭДКУНОВА Марыя Сяргееўна, нарадзілася ў 1943 г. ў в. Смародзінка Крупскага раёна. Неаднаразовая чэмпіёнка і рэкардсменка чэмпіянатаў свету па парашутнаму спорту. Жыве ў Польшчы.

СІНЯК Віктар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1970 г. ў в. Забянькова Крупскага раёна. Пасля сканчэння Ухвальскай сярэдняй школы вучыўся ў Магілёўскай спартыўнай шко-

К.А.Хадатовіч.

А.М.Яфімаў.

ле-інтэрнаце. Спартсмен-штангіст. Майстар спорту міжнароднага класа (1987). Уладальнік Кубка СССР 1990 г. ў вагавой катэгорыі да 56 кілаграмаў, чэмпіён Еўропы, прызёр першынства свету, пераможца міжнародных спаборніцтваў на Кубак Дружбы.

ТАЙНІКАЎ Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся ў 1959 г. ў в. Худава Крупскага раёна. Чэмпіён Еўропы 1977 г. ў спаборніцтвах па грэблі на байдарках і каноэ, чэмпіён свету 1987 г., сярэбраны і бронзавы прызёр чэмпіянату свету 1979 г., чэмпіён Алімпійскіх гульняў 1980 г. ў Маскве. Заслужаны майстар спорту. Цяпер дырэктар дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы алімпійскага рэзерву. Жыве ў Мінску.

ХАДАТОВІЧ Кацярына Антонаўна, нарадзілася 2.6.1972 г. ў в. Асечана Крупскага раёна. Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь (1995). Пасля сканчэння Абчугскай сярэдняй школы працягвала вучобу ў вучылішчы алімпійскага рэзерву № 1 г. Мінска і Акадэміі фізічнага выхавання і спорту (1987—94). Чэмпіёнка краін СНД 1992 г. па акадэмічнай грэблі, заняла першае месца ў Гульнях Добрай Волі ў Санкт-Пецярбургу (1994). У 1996 г. заваявала залаты медаль на Алімпійскіх гульнях у Атланце (ЗША), выйшла пераможцам чэмпіянату свету 1997 г. (Францыя). Неаднаразова перамагала ў спаборніцтвах на Кубак свету. Узнагароджана ордэнам.

ЯФІМАЎ Аляксандр Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1955 г. ў Крупках. Чэмпіён Спартакіяды школьнікаў БССР і прызёр Спартакіяды школьнікаў СССР 1967 г. У 1971 г. атрымаў званне майстра спорту. Сяміразовы чэмпіён БССР, пяціразовы чэмпіён Узброеных Сіл СССР, бронзавы прызёр першынства Еўропы 1975 г., фіналіст трох Спартакіяд народаў СССР. Цяпер заслужаны трэнер Беларускай нацыянальнай зборнай па цяжкай атлетыцы.

Яны пакінулі свой след на Крупшчыне

РАДЗІВІЛ Мікалай Крыштоф Сіротка, нарадзіўся 2.8.1549 г. Прадстаўнік роду князёў Радзівілаў. Маршалак надворны літоўскі з 1569 г., маршалак вялікі літоўскі з 1579 г., кашталян трокскі з 1586 г., ваявода трокскі з 1590 г., віленскі з 1604 г. Быў уладальнікам Барысаўскага староства, у склад якога ўваходзілі і землі Крупшчыны. Адпаведна дазволу караля Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя 30.4.1586 г. заснаваў мястэчка, якое называлася ў той час Радзівілаўскай Воляй (цяпер в. Нача). Жыхары яго былі вызвалены на 20 гадоў ад уплаты падаткаў і воінскай павіннасці. Паводле ініцыятывы Мікалая Крыштофа і за яго кошт у 1613 г. была зроблена карта Вялікага княства Літоўскага, дзе ўпершыню ўпамінаюцца населеныя пункты Крупшчыны, у тым ліку і мяст. Крупка. Памёр М.К.Радзівіл 28.2.1616 г.

РАМАНАЎ Еўдакім Раманавіч, нарадзіўся 30.8.1855 г. ў в. Беліца Гомельскага пав. Беларускі этнограф, фальклярыст, краязнаўца. Правадзейны член Рускага геаграфічнага таварыства (1886), Маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі (1888), Маскоўскага археалагічнага таварыства (1890, член-карэспандэнт 1886). Пасля сканчэння Герасімаўскага народнага вучылішча ў Хлыстоўскай воласці Аршанскага павета з верасня 1873 па верасень 1874 г. працаваў настаўнікам Бобрскага народнага вучылішча, потым быў пераведзены настаўнікам павятовага вучылішча ў г. Сянно. У 1886—1906 гг. інспектар народных вучылішчаў Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў, у 1906—16 гг. член Часовай камісіі па ўладкаванні Віленскай публічнай бібліятэкі і музея. З 1897 па 1903 г. рэдактар неафіцыйнай часткі газ. «Могилевские губернские ведомости». З 1910 г. загадчык секцыі этнаграфіі і археалогіі Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства. Вы-

вучаў побыт, культуру і гісторыю Беларусі. За час знаходжання ў мяст. Бобр зрабіў вялікую работу па зборы народных песень, паданняў у навакольных вёсках, якія змясціў у шматтомным выданні «Беларускі зборнік» (вып. 1—9, 1886—1912).

НАРОДНЫЯ ПЕСНІ СЕННЕНСКАГА УЕЗДА

Смерць мая коханая, то ад Бога прысланная!
Пошлі мае леты усе кругом свету;
Як вецер гарою, так смерць за табою.
Ні свяціла, ні пасціла і да цэркві не хадзіла,
толькі Богу награшыла.
Туды, сюды абманула —
смерць касой усекнула.
Ён плачэць, чалавек, што кароткі яго век,
Плачэць і рыдаець, што за грахамі паміраець.
Усі святыя з неба, вазьміце грахі к сабе,
Няхай цела у зямлі,
а душа у небі радасць маець.

в. Хальнявічы

НАРОДНЫЯ ПЕСНІ СЕННЕНСКАГА УЕЗДА

Ёлушка, ёлушка, што не зялёна стаіш,
што не зялёна стаіш?
Як жа мне ёлачцы малюсенькай быць —
у корань мне ёлачцы быстра рэчанька цячэць
Сярод мяне ёлушкі жарко саўнушка пячэць,
зверху мяне ёлушкі дробны дожджык сячэць.
Дзевіца, красная, што не весела жывеш?
Як жа мне дзевачцы весялюсенькай быць,
Калі мой бацюшка не па праўдзе жывець,
меньшую сястрыцу ўперад замуж аддаець.
Меньшая сястрыца чым жа лучшэ мяне?
Меньшая сястрыца а ні прасць, а ні ткаць,
а ні шоўкам вышываць.
Толькі па ваду ходзіць, з гары вядзеркі коціць,
што за пад гору ўсё к баярскаму двору.
А ў баярскім дварэ жывець барын маладой,
нежанатый,
халастой.

мяст. Бобр, 1887 г.

Чаго, рэчка, мутна стала,
ці не рыбка цябе змуціла?
Мяне рыбка не змуціла, — валной воду узбіла.
Чаго, дзеўка, сільна плачэш, ці не маці пабіла?
Мяне маці не пабіла, самі слёзы льюцца:
Да мяне тры-чатыры кавалеры шлюцца.
А я туды не хачу, дзе тры залованькі.
Люблю загадзіцца, сама лепш поле жаці.

Бобрская воласць, 1887 г.

Е.Романов.

САПЕГА Леў, нарадзіўся 4.4.1557 г. ў в. Астроўна Бешанковіцкага раёна. Дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Пісар вялікі з 1581 г., падканцлер з 1585 г., канцлер вялікі ВКЛ з 1589 г., ваявода віленскі з 1623 г., гетман вялікі ВКЛ з 1625 г. Вучыўся ў пратэстанцкай школе ў Нясвіжы, Лейпцыгскім універсітэце. Пасля 1576 г. на службе ў караля Стафана Баторыя, удзельнік стварэння Вялікага княства Літоўскага. Узначальваў сеймавую камісію па стварэнні Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Каралеўскі пасол на царкоўным саборы ў Брэсце, садзейнічаў заключэнню Брэсцкай уніі 1596 г. Падтрымліваў вайну Рэчы Паспалітай з Расіяй у 1609—18 гг., садзейнічаў абвяшчэнню Уладзіслава IV Вазы рускім царом. У 1617—18 гг. арганізаваў ваенны паход на Маскву. Адстойваў суверэнітэт ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Уладальнік значнай колькасці вёсак на тэрыторыі сучаснага Крупскага раёна, а таксама мяст. Бобр. Пры ім у бобрскім маёнтку ўпершыню ва Усходняй Беларусі паводле «Устава на валокі» 1557 г. ажыццяўлялася эканамічная рэформа, якая ўстанаўлівала сістэму відаў і норм павіннасцей з валокі, частку натуральных павіннасцей сяляне маглі плаціць грашыма. Памёр Л.Сапега 7.7.1633 г.

ХРАПТОВІЧ Іахім, нарадзіўся 4.1.1729 г. Вучыўся ў Віленскай акадэміі. Маршалак Галоўнага Трыбунала Вялікага княства Літоўскага (1765), падканцлер Літоўскі (1773), дыпламат у Парыжы і Вене. У 1773—94 гг. адзін са стваральнікаў і членаў Адукацыйнай камісіі, узначальваў дэпартамент акадэміі і школ ВКЛ. З 1780 г. кіраўнік каралеўскай групоўкі магнатаў і шляхты ў ВКЛ, з 1791 г. міністр замежных спраў, з 1793 г. канцлер ВКЛ. Уладальнік мяст. Халопенічы на Крупшчыне, даў яму шэраг эканамічных ільгот. Паводле яго ініцыятывы ў мястэчку ў канцы 18 ст. была адкрыта адна з першых на Беларусі свецкая школа. З 1773 г., пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, Халопенічы сталі цэнтрам павета.

ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ Вінцэнт (Вікенцій Іванавіч), нарадзіўся 4.2.1808 г. ў былым фальварку Панюшкавічы Бабруйскага раёна. Беларускі паэт, драматург, тэатральны дзеяч. У 1824 г. скончыў павятовае вучылішча ў Бабруйску, потым вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце. З 1828 г. працаваў каморнікам Мінскага павятовага межавога суда, у 1830—40 гг. у Мінскай крымінальнай палаце, перакладчыкам каталіцкай духоўнай кансісторыі. У 1856 г. неаднаразова быў на Крупшчыне, у тым ліку ў мяст. Халопенічы. Сябраваў з уладальнікам маёнтка Шчаўры Ю.Рашкоўскім. Другая жонка Дуніна-Мар-

В. Дунін-Марцінкевіч.

цінкевіча Марыя Паўлаўна Грушэўская, з якой ён пазнаёміўся ў 1856 г. на дажынках у в. Шчаўры, была уладальніцай суседняга маёнтка Хацюхова.

Пад уплывам уражанняў, набытых у час паездак па Крупшчыне, Дунін-Марцінкевіч напісаў дзве паэмы — «Шчароўскія дажынкі» і «Літаратурныя клопаты», а таксама верш «Да пачцівых беларусаў», у якім вельмі цёпла выказваецца пра мясцовых жыхароў.

З паэмы «Шчароўскія дажынкі»

Вось за Барысавам, ды на Русі Белай
У сяле Шчароўскім, заўтра баш, дажынкі.
Разгуляліс дзеўкі — грамадою цэлай
З песенькай вясёлай бягуць да Грыпінкі...
А соненька за бор галоўку хавае,
А месячка з-за туч лоб свой выхіляе.
У дварэ Шчароўскім, сэрцам залаценькі,
Стаіць на ганачку паніч маладзенькі,
На ім світка чорна, шапачка рагата;
Рада гасцям яго прыгожанька хата;
Дый гасцей нямала — па дварэ гуляюць,
З панам весяленькім жнеек спатыкаюць.
А ў полі грамадка голасам заводзіць, —
К панкам вось якая песенька даходзіць:
«У нас сягоння вайна была,
Усё поле зваявалі,
У копачкі паскладалі;
Гдзе горачка,
Там копачка,
Гдзе лужочак,
Там стажочак».
Якое ж там войска, маўляў, туча чорна,
З сяла проста суне ў двор шырокім шлякам?
Рассыпалась па ўсёй дарозе прасторна,
Наперадзе старшы, дый з бліскучым знакам.
Не войта то, дзеткі, не туча нябесна, —
Паніч сяло цэла спрасіў на дажынкі,
То ж свая сямейка, то ж грамадка чэсна,
Стары гаспадары, стары гаспадынкі...
Тут Астап музыка ўцяў, баш, з-за вуха,
Пайшла ладам, дзеткі, вясёла крутуха:
Карагодам правіць з панічом Тадорка,
Пасля гульнуў з ёю Навум Прыгаворка,
Панок весяленькі, разумны, крый божа!
Яго у розуме і пісар не зможа,
А пісар наш, браткі, — нечага казаць!
У Халопенічах вучыўся чытаць!
Вяліка галоўка! Маўляў сена стог,
Да пан загнаў яго ў казіны рог.
Ён і кніжкі піша, песенькі спявае,
Так вумны, што ўсякі мужык панімае.

Да пачцівых беларусаў!

Вас, браты, я помніць буду,
Я не сніў такога цуду,
Каб, вырасшы між літвінаў,
Палюбіў беларусінаў!
Рады я, што воляй лёсу
Завітаць к вам давялося,
Пакідаць жа — божа мілы! —
Не хапае ў мяне сілы.
Край наш цнотаю багаты,
І гасціннасць старой даты,
Старапольская зычлівасць
У вясёласць, і пачцівасць
З вамі час праводзіць слаўна, —
Песняру тут рай сапраўдны...
І туды яшчэ сэрца рвецца,
Дзе з Алесяй змог сустрэцца,
Да вас, пані з Хацюхова!
Хоць кабета, а талкова
Гаспадаркай там кіруе,
А гасціннасцю чаруе:
Я ахвочы ў вашым доме
Адпачыць ад тлуму, стомы.

В. Дунін-Марцінкевіч.

З ліста В.Дуніна-Марцінкевіча Уладзіславу Сыракомлю

Добры народ на гэтай Беларусі! З гарачым у сэрцы замілаваннем захоўвае ён далейшыя свае простыя звычкі, даўнюю дабрачыннасць дзядоў і бацькоў сваіх!

Там амаль кожны гаспадар з ахвотаю і энтузіязмам паўтарае перад грамадою сваіх сялян тое, што толькі на іх мове надрукавана, таму што ён сваіх сялян дзецьмі сваімі называе...

Гэта адбылося перад маімі вачыма, якія заплылі слязою радасці і ўзрушэння, калі ў маёнтку Шчарове (маёнтак Шчаўры. — Д.Х.) ахвотна прыглядаўся, як паважаныя паны Юлі і Артур Р. (Рачкоўскія. — Д.Х.) на дажынках, сабраўшы сабе грамаду народу, чыталі ім урыўкі з «Гапона», «Купалы» і «Вечарніц», а люд гэты з узрушэннем успрымаў малюнкі, нібы выхапленыя з яго штодзённага жыцця, са слязьмі ў вачах цалаваў рукі чытаючых.

Нічога б не жадаў, каб гэтай уразлівай сцэны быў сведкай паважаны пан, які пад псеўданімам «У» ў «Газеце варшаўскай» папракаў мяне, што пішу на мове беларускага люду.

... Паны Юлі і Артур Р., якія з гонарам, мушу прызнацца, ведаючы мяне з друку толькі на іх роднай мове, асабіста стараліся пазнаёміцца са мною. Адсюль узнікла паміж намі шчырая дружба, адсюль я абяцаў ім быць 19 кастрычніка ў Шчарове, маёнтку паважанага Юлія, каб апісаць дажынкі, якія добры гаспадар запазніў да майго прыезду...

Друкуецца паводле кн.: Бел. літаратура XIX — пач. XX стагоддзя. Мн., 1978, с. 75—77.

КОЛАС Якуб (Мицкевіч Канстанцін Міхайлавіч), нарадзіўся 3.11.1882 г. ў в. Акінчыцы Стаўбцоўскага раёна. Класік беларускай літаратуры. Народны паэт Беларусі (1926). Акадэмік АН Беларусі (1928). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1944). У 1902 г. скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. З 1902 г. працаваў настаўнікам, у 1908 г. — у школе в. Сані, якая ўваходзіла ў склад Абчугскай воласці. У 1915 г. мабілізаваны ў армію, удзельнічаў у баях на Румынскім фронце. Пасля дэмабілізацыі ў 1918 г. настаўнік у Абаянскім раёне Курскай вобласці. У 1921 г. па выкліку ўрада Беларусі пераехаў у Мінск. Выкладаў у Беларускім педагагічным тэхнікуме, БДУ, працаваў у Інбелкульце. З 1929 г. віцэ-прэзідэнт АН Беларусі. У Вялікую Айчынную вайну жыў у Ташкенце. На Беларусь вярнуўся ў 1944 г.

Выдаў падручнік «Методыка роднае мовы» (1926), зборнікі вершаў «Водгулле» (1922), «Нашы дні» (1937), апавяданняў «Казкі жыцця» (1921), «На рубяжы» (1925) і інш. Яго пяру належаць паэмы «Новая зямля» (1923), «Сымон-музыка» (1925), аповесці «У Палескай глушы» (1923), «У глыбі Палесся» (1927), «На прасторах жыцця» (1926), «Адшчапенец» (1932), «Дрыгва» (1934). Барацьбе беларускіх партызан з фашыстамі прысвечана яго паэма «Суд у лесе» (1943). За вершы ваенных гадоў (зб. «Голас зямлі», 1943, і інш.) Дзяржаўная прэмія СССР 1945, за паэмы «Адплата» (1946) і «Рыбакова хата» (1939—47) Дзяржаўная прэмія СССР 1948. У больш позні час напісаў трэцюю кнігу палескіх аповесцей «На ростанях» (1949—54). Памёр 13.8.1956 г.

З успамінаў былога вучня Яуба Коласа Ф.Л.Жураўлёва

Была справа так. У 1908 годзе я вучыўся ў царкоўнапрыходскай школе ў вёсцы Плоскае. Разам са мной у чацвёртым класе вучылася 10—11 хлопцаў. Клас рыхтавалі да экзаменаў. Галоўным кіраўніком гэтай школы быў поп. У маёнтку Папоўка жыў памешчык Канстанцін Гардзялкоўскі, дэмакрат. Ён прыехаў у вёску Сані да майго бацькі і дамовіўся, каб той адпусціў свой дом пад школу. Бацька згадзіўся: няхай дзеці вучацца! Гардзялкоўскі зараз жа прыводзіць да нас настаўніка, якога звалі Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. Хлопец быў дужа стройны, добры і вучыў нас без ніякіх пакаранняў. Ён вырваў нас з рук папа, і мы з палёгкай уздыхнулі. Вучням стала лягчэй: не вучылі закону божаму і не хадзілі пець у царкву. Настаўнік прывозіў нам беларускія кнігі і газету «Наша ніва». Мы развучвалі вершы, чыталі па-беларуску. Правучыў ён да Вялікадня і паехаў, больш не вярнуўся. Потым прыязджаў ураднік і распытваў майго бацьку аб тым, які ў яго быў настаўнік. «А я не ведаю: пан прывёз, зіму правучыў і паехаў. Вось і ўсё», — адказаў бацька. Пасля Вялікадня поп сабраў нас і павёў у мястэчка Абчуга на экзамен. За мостам стаяла старая вялікая школа. Там праводзіліся экзамены, якія мы ўсе здалі і атрымалі пасведчанні за подпісамі шматлікіх папоў.

Ленінскім курсам, 1967, 12 кастрычніка.

Загінулі ў Афганістане

На вялікі жаль, страты родных і блізкіх здараюцца не толькі ў перыяды сусветных войнаў, але і ў мірны час, пры нясенні ваеннай службы. Трагедыяй стаў удзел нашых землякоў у ваенных дзеяннях у Афганістане. Салдаты да канца выканалі свой воінскі абавязак і загінулі як героі. Усе, хто адзначаны ў мемарыяльным спісе, пасмяротна ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

КРЫШТАПЕНКА Уладзімір Алегавіч, нарадзіўся 5.6.1969 г. ў пас. Лянок Крупскага раёна. У 1986 г. Уладзімір скончыў Крупскую сярэднюю школу, у 1987 г. — Маскоўскае ПТВ № 163 і атрымаў спецыяльнасць муляра-мантажніка. У Афганістане з 1987 г. Камандзір аддзялення, малодшы сяржант. Загінуў 8.1.1988 г. Пахаваны ў Крупках. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісьма камандавання часці бацькам У.А.Крыштапенкі

Володя погиб в бою, о котором очень коротко написано в газете «Известия» от 17.1.1988 г. Погиб он в ночь с 7 на 8 января. Это был очень тяжелый бой, начался он в 16.30 (7.1.1988 г.) и кончился в 4.30 (8.1.1988 г.). Бой за высоту 3234. Рота, в которой находился Ваш сын, держала оборону на этой высоте, а душманы получили задачу выбить роту с этой высоты во что бы то ни стало. Ночью, во время одной из атак, Володя получил тяжелое ранение от разорвавшейся гранаты, ему сразу же была оказана помощь, перебинтовали его. Он был в сознании и говорил, что видел, как граната упала к его ногам, но из-за темноты промахнулся, не попал ногой по гранате для того, чтобы отбросить ее от себя. Она разорвалась прямо под ним.

Врач сделал все возможное, но во время эвакуации Володя скончался. Мы его запомнили как скромного и добросовестного солдата, добрая память о нем осталась в наших сердцах.

Уважаемая Тамара Никифоровна. Мы благодарны Вам за воспитание такого сына. И склоняем перед Вами голову, перед матерью нашего солдата, который до конца выполнил свой солдатский долг. Мы понимаем, как велико горе матери, потерявшей сына, но поверьте, нам не легче терять своих боевых товарищей, и мы сделаем все от нас зависящее, чтобы память о нем сохранилась в сердцах не только воинов нашего полка, но и всех советских людей.

С глубоким уважением к Вам

Командир полка Герой Советского Союза гвардии подполковник В.Вострогин.

Начальник политического отдела полка гвардии подполковник А.Греблюк.

КУЛЕШ Анатоль Іванавіч, нарадзіўся 13.2.1968 г. ў в. Самаседаўка Крупскага раёна. У 1985 г. Анатоль скончыў Ігрушкаўскую сярэднюю школу Крупскага раёна. Працаваў механізатарам у саўгасе «Грушаўскі». У Афганістане з 1986 г. Быў начальнікам радыёпрыборнага коплексу зенітнай ракетна-артылерыйскай батарэі. Малодшы сяржант. Загінуў 18.3.1987 г. Пахаваны ў в. Самаседаўка. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісьма капітана У.І.Просіна ў выдавецтва

Я проходил службу в республике Афганистан с мая 1985 по май 1987 г. в должности командира зенитно-артиллерийской батареи в районе города Файзабад. Мое подразделение находилось в боевом охранении и представляло собой сторожевую заставу... На вооружении были зенитные самоходные установки. Застава находилась на высоте и была огорожена минным полем. В начале осени 1986 года с молодым пополнением на заставу прибыл младший сержант А.Кулеш. К этому времени он окончил учебное подразделение, и я его назначил старшим оператором-наводчиком на одну из самоходок. Личный состав заставы круглосуточно дежурил на боевых постах. 17 февраля заступил на боевое дежурство и А.Кулеш. Примерно в 17.00 я услышал характерный взрыв. Через минуту ко мне подбежал напарник Кулеша (посты были двойные) и доложил, что тот подорвался на минном поле. Оно находилось на склоне горы, а за ним был обрыв. Кулеш лежал на внешней границе минного поля, а недалеко бродили овцы и стояли два афганских малыша (они потом убежали). Кулеш был жив, лежал на животе. Вызывать саперов из полка не было времени, да и начинало уже темнеть. Я принимаю решение спуститься к нему на самоходке. Сажусь сам за рычаги, в башню сели старший лейтенант Евсеев — мой заместитель и сержант Карпышев. Закрыли люки и поехали по минному

У.А.Крыштапенка.

А.І.Кулеш.

М.М.Лобач.

М.М.Ляшкоў.

полю к Кулешу. Мины были противопехотные, поэтому мы были в безопасности за броней. Подъехав к Кулешу, я определил, что он еще жив, а на теле имеется множество осколочных ранений. Мы его быстро загрузили в башню, и я начал движение обратно. В этот день шел дождь, и самоходка подняться наверх не смогла, гусеницы срывали мох с камней, и машина съезжала обратно. Тогда мы выходим из нее, кладем Кулеша на плащ-палатку и несем через минное поле по старому следу от одной из гусениц. Наверху уже была готова машина, и Кулеша увезли вниз в полк. Примерно через час я по радиостанции узнал, что Кулеш, не приходя в сознание, скончался.

После этого офицеры и солдаты обсуждали случившееся и пришли к следующему выводу: считалось не редкостью, когда на минное поле забредали отдельные животные и подрывались. Видимо, в этот раз несколько овец отбилось от стада, и пастухи (мальчишки по 10—12 лет) хотели спасти их. Кулеш как раз стоял на посту в том месте и увидел детей. Скорее всего, он как-то пытался предупредить маленьких афганцев об опасности, но их это не остановило. В тех местах живут крайне бедно, и потеря даже одного животного — беда. Кулеш принимает решение спасти малышей и, переступая через растяжки от мин, приближается к краю минного поля (дело в том, что растяжки-проволоки в дневное время видны, и Кулеш идет на риск). Ему удается остановить детей, но сам подрывается. Вот так он и погиб.

ЛОБАЧ Міхаіл Міхайлавіч, нарадзіўся 10.10.1966 г. ў в. Грыцкавічы Крупскага раёна. У 1982 г. скончыў Грыцкавіцкую васьмігадовую школу. Да мая 1985 г. працаваў на эксперыментальнай базе «Эса» і адначасова вучыўся ў філіяле Барысаўскага ПТВ № 205 у г.п. Халопенічы. У Афганістане з 1985 г. Быў санітарным інструктарам дэсантна-штурмавой роты. Малодшы сяржант. Загінуў 24.11.1986 г. Пахаваны ў в. Грыцкавічы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалем «За адвагу».

... Дзве БМП вярталіся з задання і трапілі ў засаду. Адна з машын узарвалася на міне. Пачаўся жорсткі бой. Паранены М.М.Лобач аказваў дапамогу таварышам да самай эвакуацыі з поля бою. Раны ж яго самога аказаліся смяротнымі...

ЛЯШКОЎ Мікалай Міхайлавіч, нарадзіўся 24.10.1959 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна. У 1975 г. Мікалай скончыў 8 класаў Бобрскай сярэдняй школы Крупскага раёна, у 1978 г. — Пухавіцкае ГПТВ № 111. Працаваў у саўгасе «Бобр». У Афганістане з 1979 г. Радавы. Загінуў 27.12.1980 г. Пахаваны ў г.п. Бобр. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

... рота была паднята па трывозе — падраздзяленню, што вяло бой, патрэбна была дапамога. Бронетранспарцёр, на якім механікам-вадзіцелем быў Мікалай, трапіў на міну. Увесь экіпаж загінуў.

ПЧОЛКА Аляксандр Мікалаевіч, нарадзіўся 4.6.1963 г. ў в. Лашанцы Крупскага раёна. У 1978 г. Аляксандр скончыў Старасельскую васьмігадовую школу, у 1982 г. — Мар'інагорскі саўгас-тэхнікум. З ліпеня 1982 г. працаваў брыгадзірам трактарнай брыгады ў саўгасе «Стараселле». У Афганістане з 1982 г. Намеснік камандзіра ўзвода, сяржант. Загінуў 28.4.1984 г. Пахаваны ў в. Лашанцы.

Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісьма Ю.Грыніна, баявога сябра А.М.Пчолкі, у выдавецтва

24 апреля 1983 г. мы прибыли в Афганистан, город Гызна. В роту попали втроем: Саша, я и Зиновкин Юрий (погиб 25 марта 1984 г.). Естественно, что в роте сразу мы никого не знали, а служба тяжелая, и поэтому дружба стала еще крепче. Полк вел много боевых действий. Александр был всегда впереди, он отличался храбростью, трезвым здравым умом и трудолюбием, все что поручали, он выполнял, не боялся трудностей. По прибытии в полк он командовал отделением, а потом стал заместителем командира 1-го взвода. В это время он стал кандидатом в члены КПСС. Пользовался большим доверием и уважением у солдат и офицеров. 12 апреля 1984 года полк вышел на операцию в Панджшер. С 1982 по апрель 1984 года с «комендантом» Панджшера было заключено перемирие, за это время душманы приготовились к боевым действиям, были там также и наемники. 28 апреля в Панджшере, район Анава, рота выдвигалась в горы. Саша в это время командовал взводом, а его командир ст. лейтенант Копаев командовал ротой. Мы шли по сухому руслу речки, Александр вел головную походную заставу (ГПЗ), впереди русло делало изгиб, вокруг были сады, они находились на террасах (горная местность). Как только ГПЗ скрылась за изгибом, так сразу начался свинцовый ливень. Продвигаться вперед было невозможно, рота залегла, нас стали забрасывать гранатами. Бой длился несколько часов. На помощь пришла авиация, рота двинулась дальше. Но все, кто находился в головной походной заставе, погибли. Они приняли на себя первый удар засады.

Помнік на магіле воіна-інтэрнацыяналіста А.М.Пчолкі.

Ю.А.Радкевіч.

С.С.Садоўскі.

РАДКЕВІЧ Юрый Аркадзевіч, нарадзіўся 15.3.1966 г. ў в. Замашанскі Мох Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. У 1983 г. Юрый скончыў Ухвальскую сярэднюю школу Крупскага раёна, у 1984 г. — Мінскае ПТВ № 31. У Афганістане з 1984 г. Радавы. Загінуў 5.10.1984 г. ў баі з душманамі. Пахаваны ў в. Ухвала. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

САДОЎСКІ Сяргей Сяргеевіч, нарадзіўся 6.1.1958 г. ў в. Лагі Крупскага раёна. Скончыў Абчугскую сярэднюю школу, Барысаўскую школу ДСААФ. У маі 1976 г. прызваны ў Савецкую Армію Крупскім райваенкаматам. Служыў у ЧССР, у Беларускай ваеннай акрузе. Прапаршчык. Загінуў у Афганістане 20.3.1985 г., калі вяртаўся з баявога задання (разам з таварышамі падарваўся на міне). Пахаваны ў в. Лагі.

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Архітэктурная даўніна

(Гісторыка-архітэктурны нарыс)

Ніхто і нішто не здольна паведаміць нам пра нашых продкаў і лёс народа больш яскрава, чым вынікі яго натхнёнай архітэктурнай творчасці — крышталізацыя напружанага духоўнага пошуку, мастацкага майстэрства, тэхнічнай і вынаходлівай кемлівасці. У наш турботны час востра адчуваецца патрэба людзей у культурна-гістарычнай спадчыне, у надзейным духоўна-эстэтычным падмурку, у аснову якога нашы продкі заклалі камень архітэктурнай творчасці. Мы і нашы нашчадкі ніколі не перастанем захапляцца, інтэлектуальна і духоўна абагачацца яе архітэктурна-мастацкімі здабыткамі.

Цудоўным помнікам багатай і разнастайнай палацава-сядзібнай спадчыны Беларусі з'яўляецца **палац у Крупках** (вул. Савецкая, райвыканком). Пабудаваны ў пачатку 20 ст. ў неабарочным кірунку стылю мадэрн. Калісьці быў акружаны пейзажным паркам, ад якога захаваліся фрагменты. У стылявых адносінах будынак палаца набыў асіметрычную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю. Да тарцовага левага фасада двухпавярховага прамавугольнага ў плане будынка далучана цыліндрычная 2-ярусная вежа, якая ўзвышаецца над яго вальмавым дахам. Яе верхні васьмігранны ярус накрыты самкнутым гранёным паўсферычным купалам, які завершаны нізкім ліхтаром такой жа формы; грані яруса аформлены круглымі люкарнамі, размежаванымі лапаткамі. Супрацьлеглы тарцовы фасад атрымаў асіметрычную крапоўку — бакавы ўваходны рызаліт фланкіраваны невысокімі чацверыковымі вежачкамі з машыкулямі — рамантычны матыў сярэдневяковай замкавай архітэктуры; цэнтральны рызаліт завершаны фігурным франтонам з бакавымі барочнымі валютамі і авальнай люкарнай па цэнтры. Стылізаваныя валюты выкарыстаны і ў афармленні вокнаў рызаліту. Архітэктурна-пластычны эфект плоскасных фасадаў ствараецца вылучэннем на іх жоўтым фоне пабеленых элементаў дэкору — вуглавой рустоўкі, «замковых» камянёў і геаметрызаваных ліштваў прамавугольных вокнаў і ламбрэкенаў у іх прасценках. У афармленні фасадаў выкарыстана характэрнае для мадэрна супастаўленне гладкай муроўкі сцен з фактурнай апрацоўкай панеляў, ніш, філенгаў, ліштваў вокнаў, франтонаў. Дынамічную арытмію фасадам надае выкарыстанне аконных праёмаў разнастайнай канфігурацыі і спалучэння — адзінарных, падвоеных, патроеных, прамавугольных, круглых, квадратных, авальных, лучковых. Цэнтральны ўваход з боку галоўнага фасада вылучаны неглыбокім рызалітам, які завершаны атыкам. Уваходная частка бакавога правага фасада будынка фланкіравана 2 невялічкімі вежамі. Планіроўка мяшаная. Паверхні калідорна-анфіладнай планіроўкі злучаюць тры лесвіцы, цэнтральная з якіх упрыгожана поручнямі з балясін і поясам геаметрычнага арнаменту (чыгуннае ліццё).

Помнікам грамадзянскай архітэктуры канца 19 ст. з'яўляецца таксама былы панскі палац у пас. Язбы. Пабудаваны ў стылі позняга класіцызму. Цэнтральны ўваход вылучаны мансардавым порцікам з 4 калонамі і 3-вугольнымі франтонамі. Фасады рытмічна расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Цяпер перабудаваны, узведзены другі паверх. У ім знаходзіцца прафілакторый Мінскага педагагічнага універсітэта.

Крупскі раён найбольш багаты праваслаўна-царкоўнай гісторыка-архітэктурнай спад-



Былы панскі палац у пас. Язбы. Здымак 1970-х гадоў.

чынай, у якой адлюстраваны лепшыя ідэалы і эстэтычныя пачуцці народа, мастацка-творчы патэнцыял і майстэрства дойлідаў. Каменна-драўляны летапіс народа — яго храмы і святыя прыстанкі — пранікнуты высокай народнай культурай, невычарпальным мастацкім багаццем. У храмах увасоблены арганічны сінтэз архітэктуры, жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Надзвычай шырокія маштабы праваслаўнае царкоўнае будаўніцтва набыло ў 2-й палове 19 — пач. 20 ст., асабліва пасля падаўлення паўстання 1863—64 гг., якое спрыяла абуджэнню нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Храмабудаўніцтва закранула і Сенненскі павет, у які ўваходзілі Крупкі. Цэрквы, якія былі ўзведзены ў той час, можна лічыць сапраўднымі народнымі помнікамі, бо будаваліся яны на народныя сродкі і паводле «прыгавораў» сельскіх сходаў (з кожнага гаспадара бралі 3 рублі, з батракоў і салдат — 1 рубель).

Адразу пасля паўстання ў 1863 г. на ўрадавыя сродкі пабудавана прыходская **Свята-Успенская царква ў Халопенічах** (да 1990 г. храм знаходзіўся ў руінах, цяпер адноўлены). Яго архітэктура вырашана ў афіцыйна зацверджаным святым Сінодам рэтраспектыўна-рускім стылі. Гэты нацыянальна-рамантычны мастацка-стылёвы кірунак быў арыентаваны на аднаўленне традыцый і форм старажытнарускага царкоўнага дойлідства, спрадвеку рускай праваслаўнай мінуўшчыны. У гістарычнай старажытнарускай архітэктурнай рэтраспекцыі дойліды, заказчыкі і верую-

чыя бачылі асновы нацыянальнага ў культуры, яе глыбінныя вытокі, увасабленне вобраза Расіі, уяўленні аб яе нацыянальным лёсе, характары. Усеагульнае звяртанне да рускага гістарызму адлюстроўвала дух пакланення перад нацыянальнай гісторыяй, героікай мінулага, вялікімі продкамі — абаронцамі Радзімы. Шырокая рэалізацыя «рускага» стылю ў царкоўным будаўніцтве з яго цыбулепадобнымі галоўкамі і макаўкамі, востраканцовымі шатрамі званіц, закамарамі і какошнікамі, дэкаратыўнай узорыстасцю была прадвызначана ў той час агульнарасійскім будаўнічым уставам, які прымушаў пры складанні праектаў будаўніцтва праваслаўных цэркваў прытрымлівацца густу старажытнавізантыйскага дойлідства.

Мураваны будынак царквы ў плане набыў форму працяглага крыжа з купалам на светлавым барабане ў сяродкрыжжы і званіцай у франтоннай частцы (7 званоў). Фасады расчлянёны 2 ярусамі вокнаў, трыма дзвярыма. Зала храма была перакрыта плоскай атынкаванай столлю, якая разам з барабанам падтрымлівалася чатырма мураванымі слупамі. Апсіду вылучаў светла-блакітны з залачэннем 3-ярусны іканастас на 10 абразоў.

Манументальныя мураваныя храмы будаваліся ў асноўным у гарадах. Аднак у багатай лясамі Беларусі ў царкоўнай архітэктуры пераважала драўлянае дойлідства. Дрэва (у асноўным хваёвы кругляк) было найбольш даступным і простым у апрацоўцы будаўнічым матэрыялам. Таму большасць храмаў на Бе-

Царква Успення ў Халопенічах. Здымак пачатку 20 стагоддзя.

ларусі былі драўлянымі. Святы Сінод і Міністэрства ўнутраных спраў разумелі прыхільнасць беларускага насельніцтва да драўлянага архітэктурнага асяроддзя. Спецыяльным цыркулярам яны прапанавалі для задавальнення патрэб праваслаўных прыхаджан будаваць невялікія, але прыстойныя цэрквы, дзе можна было б адпраўляць богаслужэнне, і адпаведна быту і ўяўленням прыхаджан у пабудовах належыць пазбаўляцца залішніх упрыгожанняў, спрасціць канструкцыі, каб мясцовыя майстры і сяляне маглі ў далейшым самі зрабіць рамонт. Менавіта ў гэтай галіне царкоўнага дойлідства народныя майстры ўвасобілі архітэктурна-мастацкія традыцыі і эстэтыку народа, адлюстравалі яго дэмакратычную будаўнічую культуру, вызначылі шляхі яе развіцця. У драўляным храмавым будаўніцтве народныя цесляры і разьбяры-дэкаратары абмежаванымі мастацкімі сродкамі стваралі ўражлівыя архітэктурныя манументы, рэалізоўвалі мастацка-эстэтычнае пачуццё і патэнцыял, якія не заўсёды маглі ўвасобіць у сціплым народным жыллі.

Царква ў в. Калодніца — помнік манументальнага драўлянага дойлідства. Размешчана на паўночна-заходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў сярэдзіне 19 ст. Складаная паводле будовы, шматпланавая аб'ёмна-прасторавая падоўжна-восевая кампазіцыя будынка складаецца з прытвора-званіцы над бабінцам, малітоўнай залы і 5-граннай апсіды з бакавымі рызніцамі. У сілуэце храма дамінуе чацверыковая шатровая званіца і 2-ярусны кубападобны аб'ём малітоўнай залы, завершаны нізкім 8-гранным барабанам з макаўкай у завяршэнні, дэкарыраваны трохвугольнымі франтонамі з люкарнамі па гранях. Памяшканні царквы асветлены прамавугольнымі вокнамі ў простых ліштвах з трохвугольнымі сандрыкамі. Уваход у храм афармлены 2-схільным казырком, над ім прарэзана акно ў выглядзе крыжа. Фасады гарызантальна ашаляваны, цокальная частка вылучана поясам вертыкальнай шалёўкі; апяразаны карнізам з дэкаратыўным фасадам.

Творам народна-этнаграфічнага драўлянага дойлідства з'яўляецца **Свята-Спаса-Праабражэнская царква ў в. Грыцкавічы**. Размешчана на высокім пагорку паўднёва-заходняй ускраіны вёскі. Пабудавана каля 1850 г., была прыпісана да Халопеніцкай Свята-Успенскай царквы. Царква ўяўляе сабой кампактны чатырохсценны зруб на бутавым падмурку пад вальмавым дахам (гонтавы перакрыты бляхай у 1979 г.), які пераходзіць у гранёнае пакрыццё над 5-граннай апсідай з нізкімі бакавымі рызніцамі. Вільчык даху па цэнтры завершаны 8-гранным шатровым барабанам з партатыўнай макаўкай на вузкай шыі і крыжам мастацкай коўкі. Уваход афармлены 2-слуповым ганкам пад 2-схільнай на-

Царква ў в. Калодніца.

Царква ў в. Грыцкавічы.

віссю. Вертыкальна выцягнутыя прапорцыі будынка падкрэслены вертыкальнай шалёўкай сцен, брусамі-сцяжкамі ў прасценках абапал прамавугольных вокнаў. Адзіным элементам дэкору з'яўляецца падкарнізны аркатурны пояс. Малітоўная зала асвятляецца двума бакавымі вокнамі, лучковым акном апсіды і акном хораў. Слупавая званіца пастаўлена асобна ад царквы. Каля царквы захаваўся старажытны каменны крыж.

Царква ў в. Выдрыца. 1914 г.

Прыхільнасць да так званага «руска-візантыйскага» стылю ў праваслаўным царкоўным будаўніцтве адбілася на архітэктуры **Свята-Раства-Багародзіцкай царквы ў в. Худаўцы**. Размешчана на невялікім пагорку паўднёва-заходняй ускраіны вёскі. Пабудавана ў 1894 г. з дрэва. Дзейнічае, прастольнае свята 21 кастрычніка. Трохзрубны аднаапсідны храм з развітай, выцягнутай па падоўжнай восі шматпланавай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй, якую фарміруюць прытвор са званіцай, бабінец, кубападобная малітоўная зала, 5-гранная апсіда з бакавымі рызніцамі. У маляўнічым сілуэце збудавання пануюць 2 вертыкальныя дамінанты — шатры шмат'яруснай чацверыковай званіцы і магутнага 2-яруснага 8-граннага светлавога барабана над цэнтральным аб'ёмам. Архітэктурны эфект храму надае маляўнічае шматкупалле; цыбулепадобныя галоўкі завяршаюць абодва шатры, вуглы асноўнага аб'ёму і вільчык даху апсіды. Прыкметна выкарыстанне архітэктурнай формы са старажытнарускага мураванага царкоўнага дойлідства — купал на каскадзе кілепадобных какошнікаў (вуглавыя купалы асноўнага аб'ёму). Плоскасці фасадаў гарызантальна ашаляваны, вертыкальнай шалёўкай тэктанічна «адбіта» цокальная час-

Царква ў в. Ігрушка. Здымак 1960-х гадоў.

тка будынка. На фоне шалёўкі вылучаюцца простыя ліштвы прамавугольных вокнаў. Уваход у храм падкрэслены 2-схільнай навіссю ганка на ажурных арнаментальных кранштэйнах чыгуннага ліцця. Апафеозам развіцця ўнутранай прасторы з'яўляецца складаная форма адкрытага ў інтэр'ер купала на ветразях. Прастора апсіды адмежавана ад малітоўнай залы багата ўпрыгожаным іканастасам з пазалочанай разьбой.

Царкоўна-архітэктурную спадчыну раёна збядніла страта шэрагу храмаў 2-й пал. 19 ст. У народна-этнаграфічным выглядзе, напрыклад, была вырашана ў 1870 г. могілкавая драўляная капліца ў в. Ігрышча (была прыпісана да царквы в. Зачысце Барысаўскага раёна). Просты зруб без званіцы (6 × 5,5 аршына), без падмурка, вокнаў і столі, былі толькі ўваходныя дзверы. У 1910 г. яна адзначалася ў струхлелым стане.

Да Халопеніцкай Свята-Успенскай царквы была прыпісана Свята-Духаўская могілкавая царква ў в. Хацюхова. Была пабудавана ў традыцыях народнага драўлянага дойлідства 19 ст. (да 1864 г.). Прамавугольны зруб (12 × 7,5 × 4 арш.) з 2-яруснай званіцай; асвятлялася 2 бакавымі вокнамі і адным маленькім у алтары. У 1886 г. сяляне в. Вялікая Слабада ахвяравалі 175 руб. на рамонт могілкавай царквы в. Бярозаўка. У 1885 г. ўпамінаецца царква ў в. Выдрыца (улетку 1922 г. канфіскаваны сярэбраныя літургічныя прылады), у 1869 г. — Свята-Троіцкая царква ў в. Нача і Свята-Ільінская капліца ў в. Радзіца. Не за-

Царква ў в. Восава. 1914 г.

Царква ў г.п. Бобр. Пачатак 20 ст.

Царква ў Халопенічах. 1914 г.

Дом культуры ў Халопенічах (былы кляштар дамініканцаў).

хаваліся таксама цэрквы ў вёсках Восава, Ігрушка.

Цікавасць да культавай архітэктурнай спадчыны расце. Знаёмства з помнікамі сакральнага дойлідства і мастацтва не толькі пашыраюць нашы веды па гісторыі, але і выклікаюць пачуццё глыбокага эстэтычнага задавальнення. Мы бачым, з якой любоўю і шчодрасцю на народныя ахвяраванні адраджаюцца старажытныя і будуюцца новыя праваслаўныя храмы. У 1992—95 гг. з цэглы на сродкі прыхаджан і калгаса «Бобр» у г.п. Бобр узведзена **Свята-Мікалаеўская царква**. Інтэр'ер невялікага храма і яго драўляны іканастас распісаны мясцовым мастаком Аляксандрам Пушкіным. Папярэдняя царква была пабудавана ў 1842 г., у 1885 г. існавалі два праваслаўныя храмы і касцёл (не захаваліся).

Каталіцкая канфесія ў гэтым краі не мела пашырэння, буйнейшым яе асяродкам былі Халопенічы. Уладальнік Халопеніч Марцыян Дамінік Халецкі ў 1703 г. заснаваў тут дамініканскі кляштар з драўляным касцёлам і мураваным жылым корпусам; на ўтрыманне брацыі ахвяраваў два фальваркі. Пры наступным уладальніку Храптовічу тут акрамя кляштара існавалі дзве праваслаўныя царквы і капліца. У 1832 г. па скасаванні ордэна дамініканцаў кляштар з касцёлам перададзены праваслаўнаму духавенству, касцёл стаў прыходскай царквой. Драўляны касцёл згарэў у 1840 г., манахам было дазволена ўладкаваць бажніцу ў кляштарным корпусе — двухпавярховым мураваным будынку пад гонтавым дахам (меў 10 келляў, сутарэнні). У 1885 г. епіскап Мінскі і Тураўскі Варлаам хадайнічаў перад мінскім губернатарам А.І.Пятровым аб хутчэйшым закрыцці касцёла. У 1883 г. кляштар знаходзіўся на вул. Барысаўскай, непадалёку ад базарнай плошчы.

Касцёл у Халопенічах быў зачынены ў 1883 г., і частка яго прыхаджан была вымушана хадзіць за 31 вярсту ў мяст. Бобр у Марыінскі касцёл, які ўяўляў сабой невялікі мураваны храм, фундаваны ў 1760 г. князямі Агінскімі. У пачатку 20 ст. быў пабудаваны новы храм у стылі неаготыкі. Прамавугольны выцягнуты зруб пад 2-схільным дахам, на галоўным фасадзе былі дзве 2-яруснyя чацверыковыя вежы з макаўкамі на 4-схільных дахах. Стылёвую афарбоўку будынку надавалі стральчатыя арачныя прасветы і нішы званіцы, такой жа формы ўваходны партал з круглым акном-ружай над ім, 2-гранныя шчыпцы цэнтральнага рызаліту і даху. *А.М.Кулагін.*

Залатыя рукі крупчан

Багатая сваёй гісторыяй і шчодрая на таленты Крупская зямля. Больш як 100 народных майстроў і ўмельцаў працягваюць тут традыцыі мясцовых рамёстваў у галіне мастацтва, ткацтва, вышыўкі, разьбы па дрэве і інш. З пакалення ў пакаленне перадаюцца навыкі, веды, здабыткі, спадчына народных майстроў. З кожным годам развіваецца, выпрацоўваецца іх самабытны, індывідуальны стыль, які спалучае шматвяковыя мастацкія традыцыі з новымі павевамі часу, палётам фантазіі. Самабытныя творы народных майстроў дораць людзям радасць і эстэтычную асалоду, вучаць любіць свой край, прыроду, беражліва адносіцца да духоўнай і матэрыяльнай спадчыны. Самым распаўсюджаным відам народнай творчасці ў Беларусі з даўніх часоў лічылася ткацтва. Прыгажосцю колеравых спалучэняў, высокім майстэрствам выканання адметныя вырабы і крупскіх ткачых. Найбольш вядомай ткачыхай на Крупшчыне з'яўляецца Надзея Сямёнаўна Крыварот, якая жыве ў г. Крупкі. Пераняўшы майстэрства ад сваёй маці і бабулі, больш за 60 гадоў займаецца яна вырабам рознакаляровых посцілак, дываноў, абрусаў, ручнікоў. Яе хату ўпрыгожваюць саматканыя дываны, якія расквечаны раслінными ўзорамі, ружамі, васількамі, каласкамі жыта ці пшаніцы. Вырабы Надзеі Сямёнаўны неаднаразова экспанаваліся на шматлікіх выстаўках, у тым ліку ў Маскве.

Таленавітымі ткачыхамі зарэкамендавалі сябе таксама Марыя Васілеўна Яфімава з Крупак, Марыя Пятроўна Кандратовіч з в. Касянічы, Наталля Фядосаўна Дамаронак з в. Новы Сакол, Вера Ільінічна Пыжык з в. Шчаўры.

Бадай, няма ніводнай жанчыны, якая б не спрабавала свае здольнасці ў вышыўцы, толькі няшмат сярод іх такіх, як Таццяна Якаўлеўна Белая з г. Крупак. Яна займаецца і вязаннем, і выцінаннем, і саломапляценнем, але асаблівага майстэрства дасягнула ў вышыўцы, перш за ўсё ручнікоў. У сваёй большасці яе вышыўка вызначаецца спалучэннем чырвона-чорнага колеру з арнаментальнымі і выяўленчымі матывамі нацыянальнага стылю. Таццяна Якаўлеўна з'яўляецца членам Саюза майстроў народнай творчасці Рэспублікі Беларусь.

Славіцца сваімі залатымі рукамі ў Крупках і майстар па вязанні Лідзія Фёдараўна Кузняцова. Яе вырабы адметныя высокімі мастацкімі якасцямі. Звычайны клубок нітак у яе руках ператвараецца ў павуціну найтанчэйшага ўзору. З вялікім мастацкім густам робіць ручнікі, сурвэткі, абрусы і крупчанка Кацярына Андрэеўна Фаміна, лепшыя ўзоры вырабаў якой экспанаваліся на абласных і раённых выстаўках народных умельцаў. Вельмі цікавыя таксама вышыўкі Зінаіды Іванаўны Пранішнікавай, Таццяны Аляксееўны Лебедзевай, Лідзіі Апанасаўны Варановіч з Крупак і інш.

Народны ўмелец Н.С.Крыварот.

Сапраўды казачны лялечны свет можна ўбачыць у хаце маладых майстроў па вырабе мяккай лялькі Веранікі Аляксандраўны Атаманавай, Алены Генадзеўны з в. Замкі і іншых. Гарэзлівыя, сімпатычныя мішкі, зайцы і іншыя звяркі выходзяць з-пад іх рук, нясуць радасць дзецям.

Вельмі рэдкім відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — вырабам рэчаў з абрэзкаў — займаецца Марыя Мікалаеўна Шосцік з Крупак. Сваім майстэрствам яна шчодра дзеліцца з дзецьмі, доўгі час кіруе гуртком, які створаны пры раённым Доме дзіцячай творчасці. Яе паслядоўнікамі ўжо з'яўляюцца 7 чалавек. Сярод іх Лідзія Апанасаўна Варановіч, Ала Анатолеўна Белая і інш.

Не страчаны на Крупшчыне і традыцыі такога старадаўняга віду народнага промыслу на Беларусі, як разьба па дрэве. Напрыклад, хата разьбяра Пятра Аляксеевіча Сініцына з в. Колас нагадвае казачны церам, вылучаецца сваім незвычайным мастацкім аздабленнем сярод іншых у вёсцы. А ўнутры яе — цэлы музей з рэчаў, якія выразаны з дрэва. Быццам жывыя, у імклівым руху выходзяць з-пад рук майстра пасля апрацоўкі статуэткі жывёл, птушак. Падобныя рэчы робяць і іншыя таленавітыя майстры: жыхары Крупак І.Я. Скокаў, М.Б. Кузняцоў і А.Л. Прускоўскі, С.Р. Бараноўскі з в. Замкі, І.Н. Барысаў з в. Востава і інш. Менавіта праз іх рукі, сэрцы, душу працягваецца нітачка, якая звязвае пакаленні. Дзякуючы такім таленавітым, захопленым сваёй справай людзям узбагачаецца матэрыяльная і духоўная спадчына беларускага народа. *Т.Я.Белая.*



Ручнікі, вырабленыя Т.Я.Белай.

У пошуках песні

Крупшчына цэніцца фальклярыстамі рэспублікі за багатую народную паэтычную творчасць, якая добра зберагласа да нашага часу. І асабліва багата тут песень. Як дасціпна жартуюць вяскоўцы, калі б іх складваць адну за адной у мех, то і не панесці было б. Амаль усе песні пра долю жанчыны, пачынаючы ад заручын і да скону жыцця, а таксама абрадавыя.

Ніжэй даецца песня, запісаная ад Емяльянавай Ульяны Ціханаўны (1920 г. н.) у в. Селішча.

Пойдзем мы,
Пойдзем мы, дзевачкі,
На мора ў красачкі.
Паглядзім мы,
Паглядзім мы, дзевачкі,
Хто за намі гоніцца.
Гоніцца,
Гоніцца за намі
Стары дзед з барадою,
Пойдзем мы,
Пойдзем мы, дзевачкі,
На мора ў красачкі.
Зірнём мы,
Зірнём мы, дзевачкі,
Хто за намі гоніцца.
Гоніцца,
Гоніцца за намі
Малады малойчык.
Возьмем мы,
Возьмем мы, дзевачкі,
Старога за бараду.
Кінем мы,

Кінем мы, дзевачкі,
Старога ў крапіву.
Калодай,
Калодай закоцім,
Мятлою зямяцём.
Возьмем мы,
Возьмем мы, дзевачкі,
Маладога за падпашкі.
Пакладзём мы,
Пакладзём мы, дзевачкі,
Маладога ў падушкі.
Пярсцёнкам,
Пярсцёнкам закоцім,
Вяночкам замяцём.

Шмат цікавых і змястоўных песень захоўваецца ў памяці жыхароў гэтай вёскі. Ёсць і рэкруцкія. Вось рэкруцкая песня, якую пераняла ад сваёй маці У.Ц. Емяльянава.

А на той бок ракі
Сабраліся старыкі,
А-а-а-а-ей,
Сабраліся старыкі.
Сталі думаць-гаварыць,
Каго ў рэкруты улавіць,
А-а-а-а-ей,
Каго ў рэкруты улавіць.
А дзе пяць, там няма,
Дзе чатыры — ні віляць,
А-а-а-а-ей,
Дзе чатыры — ні віляць.
А дзе тры, там пашлі,
А дзе два, там няма,
А-а-а-а-ей,
А дзе два, там няма.
Дасталі яго на палку,
А ён ні даўся нікаму,
А-а-а-а-ей,
А ён ні даўся нікаму.
А ён з полу пад лаву,
Там здзелалі аблаву,
А-а-а-а-ей,
Там здзелалі аблаву.
А з-пад лавы ў сені,
На яго там усселі,
А-а-а-а-ей,
На яго там усселі.
А ён з сяней на поле,
А за ім на конях,
А-а-а-а-ей,
А за ім на конях.
Быў у ўдоўкі адзін сын,
Ён падышоў пад аршын.
А-а-а-а-ей,
Ён падышоў пад аршын.
А аршыну не дарос,
Шапачкай не данёс,
А-а-а-а-ей,
Шапачкай не данёс.
Сястра тое дачула,
Дала брату гэта знаць,
А-а-а-а-ей,
Дала брату гэта знаць.
А брат тое пазабыў.
З дзеўкай ночку пірабыў,
А-а-а-а-ей,
З дзеўкай ночку пірабыў.
А ён з поля ды ў лясок
І на жоўценькі пясок,
А-а-а-а-ей,
І на жоўценькі пясок.
Там яго спаймалі,
Ручкі яго звязалі,
А-а-а-а-ей,
Ручкі яго звязалі.
Ручкі яго звязалі
І ножачкі скувалі,
А-а-а-а-ей,
І ножачкі скувалі.
Сталі галовачку брыць,
Маё сардэчка баліць,
А-а-а-а-ей,
Маё сардэчка баліць.
Вязуць мяне ў Гарадзен,
Быў я слаўны маладзец,
А-а-а-а-ей,
Быў я слаўны маладзец.

А вось радкі з вясельнай песні, якая запісана ад Г.С. Цітавец (1916 г. н.) у в. Селішча.

А сваточак, ты ж галубочак,
Просім вас,
Каб не было нашай дзевачцы
Ганьбы ў вас.
А паветачка — хатачка
Каб не была,
А суседачка — мамачка
Каб не стаяла
Усю ночачку пад акном,
Каб не уціралa
Дробны злёзачкі рукаўком.
Паветачка —
Ды не цёплая хат чка,
Суседачка —
Ды не родная мамачка,
Ды не будзе рана будзіці,
Выйдзе на вулку
Ды будзе дзяўчыну судзіці.
А няўдала нявехна, няўдала,
Раннюю зару праспала,
А вячэрнюю драмала.

Спявалася песня пры ад'ездзе маладой да маладога.

Багата фальклорных твораў было запісана ў в. Новая Слабада. Выдатнай па сваім змесце, мастацкіх асаблівасцях, выкананні з'яўляецца песня «Цякла рэчка з-пад мястэчка», якая запісана ад Н.Н. Цітавец (1917 г. н.). Гэта была адна з тых песень, слухаючы якую, забываешся на ўсё. З першага да апошняга слова яна трымае ў напружанні.

Цякла рэчка,
Цякла рэчка з-пад мястэчка,
А другая з-пад Дунаю.
Там удоўка,
Там удоўка бель бяліла,
Бель бяліла й гаварыла:
— А усе ж паны,
А усе паны едуць з вайны,
Майго пана з вайны нясуць,
Майго пана,
Майго пана каня вядуць,
Каня вядуць, збрую нясуць.
А усе ж вербы
А усе вербы зашумелі,
Адна верба не шумела.
Адна ж верба,
Адна верба не шумела,
Пад сабою журбу мела.
Зашум-зашум,
Зашум-зашум дубровачка,
А ужо ж я ай удовачка.
А ужо ж бо я,
А ужо ж бо я ай удовачка,
Дзеткі ж мае ўсё сіроткі,
Я ж маладзенька,
Я ж маладзенька ай удавенька,
Я ж маладзенька ай удавенька.

Песня ўражвае сваёй меладычнасцю, эмацыянальнай напоўненасцю. Слухаеш яе — міжволі ўяўляецца постаць маладой жанчыны, якая, каб адпачыць хвілінку ад нялёгкай працы, стомлена выпрамляецца і ўглядаецца ў далячынь. А там яна бачыць, як вяртаюцца з паходу... І не так вострым зрокам, як чуйным сэрцам яна адчувае, што яе пана, надзеі і радасці яе, апоры і шчасця, няма ўжо ў жывых. Вязуць яго з паходу, каб пахаваць на радзімай зямлі. Гэтай песні, напэўна, не менш, як паўтысячы гадоў, а яе актуальнасць, яе ўздзеянне на слухачоў не страчана.

Пра адданасць бацькоў дзецям, бязмежную любоў і павагу дзяцей да бацькоў спявецца ў жніўнай песні спявачкі А.М. Белай (1916 г. н.) з в. Селішча. Большасць песень апавядаюць пра нялёгкую долю жанчыны. Асабліва цяжка даводзілася ёй, калі наступала пара жніва. Аб гэтым песня «Сонца маё вячэрняе...», якая запісана ад А.М. Белай. І вельмі нялёгка было той дзяўчыне, якую аддалі замуж у чужую старонку.

Сонца маё вячэрняе
Каля лесу блізка ходзіць.
Каля лесу блізка ходзіць,
Чаму й за лес на заходзіш?
Татулечка мой родненькі,
Каля майго двара едзеш,
Чаму й ка мне ні заедзеш?
Як заеду й — дачка й рада,
Як паеду — дачка й плача.
Як за горы — дачцэ й гора,
Як за лясы — дачка ў галасы.
Не аддай, не аддай мяне, мамулька, у чужыну,
Я ў чужыне работачкі не знаю.
А я ж цябе, маё дзіцятка, навучаю:
Як пойдзеш ты а на ціхі Дунай па ваду,
Як пойдзеш ты а на ціхі Дунай па ваду,
А ўстрэніш ты,
А ўстрэніш ты а старых мужоў на браду.

У в. Папарнае ад А.Г. Трус (1915 г. н.) запісана песня, якая прыведзена ніжэй.

Аддаў мяне татулька замуж далёка,
Ой аддаў мяне татулька замуж далёка.
Прыказаў мне татулька не плакаць, не тужыць,
А не плакаці, ні тужыць, у госці ні хадзіць.
Аджыла я гадочак, жыла я другі,
А на трэці гадочак заташнілася.
А к татульку ў госцейкі захацелася,
А к татульку ў госцейкі захацелася.
А скінулася ба я шэрай зязюляй,
А паляцела ж ба я з тугі на лугі.
А і з тугі на лугі, таткавы сады,
А і з тугі на лугі, таткавы сады,
А села ж ба я, пала на сухой сасне,
Ой села ж ба я, пала на сухой сасне.
Й а ня скрып ты, сосенка, мне й так тошненька,
А ня скрып ты, сосенка, мне й так тошненька.
Ажну мой татулечка па двару ходзя,
Ён жа да па двару ходзя, нявестак будзя.
А ўстаньце, нявестачкі, устаньце, ластачкі,
А ўстаньце, нявестачкі, устаньце, ластачкі.
А што ж гэта за пташка ў садзіку пяе,
Ці ні наша дзіцяце песенькі пяе.
Пасцяліце, нявехны, сіняё сукно,
Й а пасыпце, нявехны, белае пшано.
Пакладзіце, нявехны, залаты персцень,
Калі шэра зязюля — пшано паклюе,
Калі наша сястрыца — персцень забярэ,
Калі наша сястрыца — персцень забярэ.
А большы братулечка па саду ходзя,
Ён па садзіку ходзя, стралу наводзя.

А меншы братулечка ўсё разважае —
А ні біці, ні лавіць — жывую пусціць.
Калі шэра зязюля — ляці ў шчыры бор,
Калі наша сястрыца — хадзі к нам у двор.
А каб табе, мой братка, бог долі не даў,
Як ты мяне з таткава садзіку прагнаў.

Я й барамі ляцела — бары глушыла,
Я й палямі ляцела — палі тапіла.

Дзякуй табе, мой народ, за сваю шматаблічнасць, за захаваную спадчыну.

А.В. Цітавец.

Мова і адзенне жыхароў Сенненскага павета

Язык Сенненских белорусов сохранил много славянских речений и особенностей. В юго-западной части уезда заметно аканье, сильнейшее дзеканье и твердое *р*, в северо-восточной дзеканье менее заметно и *р* произносится мягко.

Костюм подвергся сильному изменению. Оригинального кроя белого армяка, обшитого красными и синими снурочками — «ирхами», уже нет в уезде, даже в Мощеном, где он дольше всего сохранялся; его заменил армяк из своего же сукна, но уже серого цвета, с большими висячими воротниками в восточной части уезда, где преобладают рубашки-косоворотки. Кожух теперь повсеместно желтого цвета, вместо бывшего белого. К верхней мужской одежде надо еще причислить суконный «кулек» и полушубок, а также пояс или ремень. Ремень «с калитою» сохранился в Бобрской волости. Белье из самодельного холста. Головной убор — картуз и теплая суконная или ватная шапка. Войлочные «магерки» и «брыли» редки. Женская одежда состоит из длинной сорочки, «спадницы» или «андырака» домашней шерстяной материи, которую часто заменяет лавочный ситец, из «шнуровки» или куртки и фартуха. Поверх головы замужние женщины носят чепцы, а потом повязывают платок в виде «Хайлука» или подвязывают под подбородок. Девушки

Сяляне Сенненскага павета ў асеннім адзенні. Фота Веляжыцкага. Пачатак 20 стагоддзя.

Сяляне Сенненскага павета. Фота Веляжынскага. Пачатак 20 стагоддзя.

одеваются наряднее, применяясь к городским, часто уродливым, костюмам. Верхняя одежда женщин почти та же, что и у мужчин. Обувью в будни служат лапти, в праздники сапоги, постепенно вытесняющие лыковую или лозовую обувь.

Друкуецца па кн.: Анікіевіч К.Т. Сенненский уезд Могилевской губернии, Магілёў, 1907. С. 106—107.

Музеі

Фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў, беражлівым адносінам да помнікаў гісторыі, культуры, прыроды садзейнічаюць гісторыка-краязнаўчыя музеі Крупшчыны. У раёне працуюць 20 музеяў, у тым ліку 8 баявой і працоўнай славы, 5 краязнаўчых, 4 этнаграфічныя, а таксама мемарыяльны, аховы прыроды і гісторыі школы.

Крупскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

Створаны ў красавіку 1995 г. У тым жа годзе яму было прысвоена званне «народны». У музеі сабрана шмат матэрыялаў, гістарычных дакументаў, якія адлюстроўваюць гісторыю Крупшчыны, асноўныя падзеі, што адбыліся на гэтай зямлі, а таксама побыт і культуру яе жыхароў. Сярод экспанатаў найбольшую цікавасць уяўляюць калекцыі ручнікоў, прадметаў побыту, вырабаў з дрэва і саломкі, якія зроблены мясцовымі майстрамі.

Музей Абчугскай сярэдняй школы

Адкрыты ў 1990 г. У ім сабраны змястоўны матэрыял пра Героя Савецкага Саюза І.А.Мазгавога, які 27.6.1944 г. здзейсніў свой подзвіг каля в. Абчуга. У вёсцы яго імем названа адна з вуліц.

У музеі захоўваюцца таксама асабістыя рэчы воіна-інтэрнацыяналіста С.С.Садоўскага, які загінуў у Афганістане.

Краязнаўчы музей Бобрскай сярэдняй школы

Працуе з 1968 г. У ім 1100 экспанатаў, якія расказваюць пра гістарычнае мінулае пасёлка канца 19 — пач. 20 ст., стварэнне Бобрскай школы. Багаты матэрыял сабраны пра жыццёвы і баявы шлях Герояў Савецкага Саюза М.Дз.Конанава (Бобр — радзіма Конанава), В.А.Князева, В.М.Чабатарова, імем якіх названы вуліцы ў Бабры. Захоўваюцца асабістыя рэчы герояў, матэрыялы перапіскі, фотаздымкі, успаміны. Асобная частка экспазіцыі прысвечана жыццю і творчасці пісьменніка-земляка М.Калачынскага.

Краязнаўчы музей Гапонавіцкай школы-сада

Заснаваны ў 1983 г. У музеі шмат матэрыялаў пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, запісаў іх успамінаў, дакументаў, фотаздымкаў. Працягваецца пошук звестак, збор экспанатаў пра земляка Героя Савецкага Саюза М.К.Казлоўскага, які ў гады вайны камандаваў танкавай ротай 59-й гвардзейскай танкавай брыгады.

Музей Дакудаўскай сярэдняй школы

Працуе з 1995 г. Кіраўнік музея — дырэктар школы Т.Ф.Канавалава. Асноўная экспазіцыя прысвечана льну. Яна пачынаецца з яго батанічнай характарыстыкі і далей дае ўяўленні пра тэхніку апрацоўкі, віды кудзелі, прылады прадзення і гатункі палатна. Сярод гатовых вырабаў ручнікі. Гонарам музея з'яўляецца раздзел, прысвечаны сімволіцы беларускага ручніка. Тут сабраны розныя па сваім прызначэнні і функцыях ручнікі: ручнікі-набожнікі (абразнікі) і ручнікі, якія ўжываюцца ў паўсядзённым побыце, а таксама вясельныя (для свата), ахвярныя (для абвязвання крыжоў).

Музей Дубраўскай сярэдняй школы

Адкрыты ў 1992 г. Кіруе ім А.П.Касцючэнка. Асноўнае месца тут займае экспазіцыя пра Героя Савецкага Саюза А.А.Парцянку, кулямётчыка 3-га стралковага палка 32-й стралковай дывізіі, які нарадзіўся ў в. Дубраўка. Яго імя носіць Дубраўская сярэдняя школа. Сярод экспанатаў захоўваецца баявая карта 1945 г., якой карысталіся А.А.Парцянка і яго баявыя сябры.

Музей Жаберыцкай сярэдняй школы

Заснаваны ў 1995 г. Этнаграфічнага накірунку. У музеі сабраны прадметы сялянскага побыту: вырабы ткацтва, вышывання, пляцення. У гістарычным раздзеле матэрыялы

У музеі Ігрушкаўскай СШ. На пярэднім плане кіраўнік музея Б.А.Красько.

пра мясцовых жыхароў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Гісторыка-краязнаўчы музей Ігрушкаўскай сярэдняй школы

Створаны ў 1987 г. Цяпер гэта адзін з лепшых музеяў раёна. Кіраўнік яго — настаўнік Б.А.Красько. Вялікае месца ў музеі займаюць раздзелы археалогіі, этнаграфічны (прадметы працы і побыту сялян), гісторыі школы, вёскі, калгаса, краю. Галоўны раздзел — гісторыя Вялікай Айчыннай вайны. У ім значнае месца адведзена матэрыялам пра 3-і гвардзейскі кавалерыйскі корпус, які ў 1944 г. вызваляў Крупскі раён. Экспануюцца таксама матэрыялы пра воінаў-афганцаў — выпускнікоў школы, у тым ліку пра Анатоля Кулеша, які загінуў у Афганістане. У карціннай галерэі музея дэманструюцца карціны мясцовага мастака Аляксея Гаміна. Паводле вынікаў раённага конкурсу-агляду Ігрушкаўскі гісторыка-краязнаўчы музей у 1997 г. заняў першае месца. Яму ўручаны дыплом і грашовая прэмія.

Музей баявой і працоўнай славы Крупскай пасялковай сярэдняй школы

Працуе з 1987 г. Налічвае амаль 500 экспанатаў, з іх каля 40 асноўнага фонду. Шмат матэрыялаў пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, арганізацыю партызанскага руху. Сярод іх дакументы, запісы, успаміны ўдзельнікаў падзей таго часу. Асобнае месца займае экспазіцыя пра выпускніка гэтай школы, воіна-афганца У.А.Крыштапенку, які пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Музей этнаграфіі Нацкай сярэдняй школы

Працуе з 1995 г. Адрозніваецца ад іншых тым, што ў ім сабрана багатая калекцыя крамянёвых прылад працы перыяду каменнага веку, рэчы хатняга ўжытку, якімі карысталіся продкі ў пачатку стагоддзя. Гонарам музея з'яўляецца экспазіцыя пра земляка Героя Савецкага Саюза М.Дз.Шастакова, імем якога названа школа. Вядзецца збор летапісу гісторыі в. Нача, пра землякоў.

Музей аховы прыроды Слабодскай сярэдняй школы

Працуе з 1985 г. Ён унікальны па сваім змесце і адзіны ў раёне. У музеі ёсць раздзелы: «Пароды драўніны», «Шкоднікі палёў», «Гняздоўе птушак», «Рэдкія птушкі Крупшчыны». Арганічна дапаўняюць экспазіцыю чучалы жывёл і птушак.

Музей «Савецкая гвардыя» Стараслабодскай сярэдняй школы

Існуе з 1990 г. У высокім узроўні дзейнасці музея немалая заслуга дырэктара той жа школы М.А.Баравулі. Школа носіць імя 100-й стралковай ордэна Леніна дывізіі, якая ў пачатку ліпеня 1941 г. зламала баявыя парадкі нямецкіх войск на стыку Крупскага, Бярэзінскага і Круглянскага раёнаў і злучылася пасля з асноўнымі сіламі Чырвонай Арміі. Пра гісторыю гэтай дывізіі, яе баявы шлях і расказваюць матэрыялы экспазіцыі.

Вядзецца актыўная пошукавая работа па вывучэнні гераікі партызанскага руху Крупскага раёна.

Музей Узнацкай сярэдняй школы

Заснаваны ў 1995 г. Сабрана 70 экспанатаў. Асноўнае месца займаюць стэнды з матэрыяламі пра стварэнне калгаса «Прызыў», Узнацкай сярэдняй школы, землякоў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Асобны раздзел прысвечаны земляробчым прыладам працы, рэчам хатняга ўжытку, убранства пач. 20 ст.

Музей Ухвальскай сярэдняй школы

Працуе з 1985 г. Этнаграфічнага накірунку. У ім сабраны прылады працы 16—19 стст. Частка экспазіцыі музея прысвечана гісторыі партызанскага руху на Крупскай зямлі. Сярод экспанатаў асаблівую каштоўнасць маюць асабістыя рэчы і дакументы Героя Савецкага Саюза А.С.Лукашэвіча, ураджэнца Крупскага раёна, а таксама кіраўніка партызанскага руху на Крупшчыне Героя Савецкага Саюза С.Г.Жуніна.

Музей «Гісторыі школы»

Створаны ў 1983 г. ў Халопеніцкай сярэдняй школе, якая носіць імя М.Багдановіча. Паводле сабраных у ім экспанатаў адзіны ў раёне. У Халопенічах існавала народнае вучылішча. Матэрыялы музея адлюстроўваюць лёс настаўнікаў, выпускнікоў.

Краязнаўчы музей дзіцячага дома

Існуе ў г.п. Халопенічы з 1995 г. Кіраўнік яго А.Г.Кляшчонак. Асобнае месца ў экспазіцыі займае гісторыя г.п. Халопенічы, быт жыхароў пасёлка.

Музей-мемарыял лётчыка-касманаўта двойчы Героя Савецкага Саюза У.В.Кавалёнка

Створаны ў 1982 г. ў Хацюхоўскай сярэдняй школе. Сярод шматлікіх унікальных экспанатаў — трэніровачны касцюм, скафандр лётчыка-касманаўта, прыборы, дакументы і г.д.

Музей Худаўской сярэдняй школы

Працуе з 1984 г. і прысвечаны лётчыкам 6-й гвардзейскай Таганрогскай ордэнаў Суворава і Кутузава бамбардзіровачнай авіяцыйнай дывізіі, якая вызваляла Крупскі раён у 1944 г. Гэта дывізія базіравалася на аэрадроме каля в. Пліса.

Музеі Янаўшчынскай (з 1986 г.), **Язбоўскай** (з 1990 г.), **Дзянісавіцкай** (з 1990 г.) сярэдніх школ маюць наступныя раздзелы экспазіцыі: «Нашы землякі ў баях за Радзіму», «Крупшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Партызанская вайна на тэрыторыі Крупскага раёна», «Землякі — воіны-інтэрнацыяналісты», «Наша гаспадарка», «Знакамітыя землякі». У іх сабраны запісы ўспамінаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, фотаздымкі, матэрыялы па гісторыі вёсак, школ, гаспадарак. *К.І.Куніцына.*

Народны ансамбль «Крупчанка»

Створаны ў 1970 г. Заснавальніцай яго была дырэктар Крупскага сельскага Дома культуры А.І.Сманцар. Цяпер кіруе ансамблем Н.Ф.Дзенісенка. У рэпертуары ансамбля ў асноўным лірычныя беларускія народныя песні, але ёсць шмат твораў на патрыятычную тэматыку, а таксама твораў рускіх і зарубежных кампазітараў. На працягу многіх гадоў удзельнікі творчага калектыву (25 чалавек рознага ўзросту) рэгулярна выступаюць перад насельніцтвам, праводзяць значную работу па эстэтычным выхаванні, прапагандзе музычнага мастацтва. За апошнія 3 гады ансамбль народнай песні акрамя выступленняў у раёне і пасёлку Крупскі даў 100 выязных канцэртаў. Калектыў неаднаразова ўдзельнічаў у фальклорных святах у Мінску, Смалявічах, Раўбічах і інш. За высокае выканаўчае майстэрства, ідэйна-мастацкі ўзровень рэпертуару ў кастрычніку 1994 г. калектыву было прысвоена званне народнага.

З ГІСТОРЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ

АБЧУГА (Красны Стаў), вёска, цэнтр сельсавета. Упамінаецца ў інвентарах 17 ст. як вёска каля мястэчка Красны Стаў маёнтка Чарэя, які належаў Сапегам. У вёсцы было 46 пляцоў і 30 валок зямлі, млын на двух колах. Абазначана на карце Т.Макоўскага, выдадзенай у Амстэрдаме ў 1613 г. У 1713 г. ў ёй былі вуліцы Лукомская, Віцеб-

ская і Славеньская, 83 двары, 24 валокі (уласнасць канцлера Аляксандра Сапегі), у 1775 г. — 37 двароў, з іх 3 належалі мясцовай царкве, у закладзе ў князя Ігнація Агінскага, з 1790 г. — у віленскага кляштара піяраў. З 1793 г. ў складзе Расійскай імперыі, цэнтр воласці, уладанне памешчыка Нітаслаўскага, злілася з мястэчкам пад агульнай назвай Абчуга. У Айчынную вайну 1812 г. разбурана французамі. У 1847—52 гг. пабудавана Праабражэнская царква (ёй належала 66 дзесяцін і 1193 сажні зямлі) на сродкі памешчыка А.М.Нітаслаўскага. У мястэчку было 22 двары, 210 жыхароў (107 мужчын і 103 жанчыны). У 1863 г. 18 двароў. У 1869 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1880 г. 77 двароў, 678 жыхароў (319 мужчын, 359 жанчын). У 1897 г. 112 двароў, 861 жыхар, дзейнічалі гарбарны завод, народнае вучылішча (адкрыта ў 1896), хлебазапасная крама, лячэбніца, пастаялы двор, яўрэйскі малітоўны дом, праваслаўная царква, 2 вінныя лаўкі. У аднайменным фальварку — 46 жыхароў, вінакурны завод, вадзяны млын, капліца. У пачатку 20 ст. цэнтр воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, у ім размяшчалася валасное праўленне, праваслаўная царква, малітоўная школа, народнае вучылішча, два вадзяныя млыны. Мястэчка — уласнасць памешчыцы Эльвіры Аляксандраўны Ястрамбіцкай. У 1917 г. 125 двароў, 783 жыхары. З 1924 г. цэнтр сельсавета ў Чарэйскім, з 1931 г. — у Крупскім раёнах. Быў пабудаваны льнозавод. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «6-ы з'езд Саветаў». У гады першай пяцігодкі дзейнічаў завод па вырабе драўляных цвікоў (завод Гальперына), які ў час вайны быў спалены. У савецка-фінляндскую вайну 1939—40 гг. і на франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 55 вяскоўцаў, у партызанскай і падпольнай барацьбе 19, знішчана 28 мірных жыхароў. Акрамя таго, фашысты расстралялі 150 чалавек яўрэйскай нацыянальнасці. Вёска была часткова спалена. Каля вёскі здзейсніў свой подзвіг Герой Савецкага Саюза І.А.Мазгавой. З 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Барэц», з 1960 г. — саўгаса «40 год Кастрычніка», з 1961 г. цэнтр саўгаса, потым калгаса «Абчуга». На 1.1.1998 г. 138 гаспадарак, 323 жыхары. У вёсцы размешчаны сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, бальніца, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, крама, майстэрня калгаса, будынак абшчыны «Крышна». У цэнтры вёскі брацкая магіла, пахаваны 43 воіны і 5 партызан. У 1961 г. на магіле пастаўлены абеліск. Каля вёскі магіла ахвяр фашызму, пахаваны 440 чалавек, закатаваных 5.5.1942 г. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

АКТАВІЯ, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Вядома з 1858 г., уладанне Юлія Серафімавіча Рашкоўскага. У 1897 г. засценак Барысаўскага павета Мінскай губерні, 9 двароў, 68 жыхароў. З 1924 г. ў Крупскім раёне, спачатку Мінскай, потым Аршанскай акруг, з 1938 г. ў Мінскай вобласці. У 1930-я гады створаны калгас «Шлях сацыялізму». Пасля Вялікай Айчыннай вайны калгас адноўлены, вёска ў складзе саўгаса, цяпер калгаса «Старасселле». На 1.1.1998 г. 8 гаспадарак, 11 жыхароў.

АЛЬШАНІКІ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Былая ўласнасць сям'і Сапегаў. Да 1649 г. фальварак і сяло Хрысціны Сапегі, потым — яе мужа Самуэля Паца. У Айчынную вайну 1812 г. вёска разбурана французамі. У 1863—67 гг. уладанне Д.Ф.Дашкевіча, уваходзіла ў склад Сенненскага павета, налічвала 40 мужчын. У 1897 г. 23 двары, 150 жыхароў, у 1909 г. 32 двары, 187 жыхароў. З 1917 г. ў складзе Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «3-ці з'езд Саветаў». На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінуў 21 чалавек. З 1950 г. ў складзе калгаса «Перамога» (з 1957 г. імя У.І.Леніна), з 1960 г. — калгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 8 гаспадарак, 12 жыхароў.

АСАВЕЦ, вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з канца 19 ст. З 1858 г. ўласнасць Франца Пятровіча Каржанеўскага, уваходзіла ў Халопеніцкую воласць Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1897 г. 10 двароў, 68 жыхароў. З 1924 г. ў Хацюхоўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 1931 г. Крупскага, з 1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў Мінскай вобласці. У 1930 г. створаны калгас «Пралетарская перамога». На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 7 жыхароў. З 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Бальшавік», з 1959 г. — калгаса «Чырвоны Кастрычнік», з 1963 г. — калгаса «Праўда». На 1.1.1998 г. 20 гаспадарак, 37 жыхароў. Размешчана малочнатаварная ферма.

АСЕЧАНА (А с е ч н а), вёска ў Абчугскім сельсавеце. Вядома з 1524 г., запісана баярынам Васілём Сенкавічам. Належала князю Багдану Фёдаравічу Адзінцэвічу. У 1790 г. фальварак Чарэйскага графства. У 1880 г. дзейнічаў вінакурны завод. У пачатку 20 ст. ў складзе Чарэйскай воласці Сеннен-

скага павета Магілёўскай губерні. З 1924 г. ў Заборскім сельсавеце Чарэйскага раёна Барысаўскай акругі, потым Крупскага, Халопеніцкага, зноў Крупскага раёнаў. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Пуцілавец». На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 28 чалавек, у партызанскай барацьбе 7, знішчана 15 мірных жыхароў. Вёска была часткова спалена. Пасля вайны вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Бальшавік», з 1960 г. — саўгаса «40 год Кастрычніка», з 1961 г. ў складзе саўгаса, потым калгаса «Касяніčы». На 1.1.1998 г. 33 гаспадаркі, 47 жыхароў. Крама.

АСІНАЎКА, вёска ў Крупскім сельсавеце. За 3 км на паўночны ўсход ад вёскі, абапал старой дарогі з в. Асінаўка ў в. Прошыка, размешчаны курганны могільнік (6 насыпаў). Гэты археалагічны помнік сведчыць аб засяленні тутэйшых месцаў у старажытнасці. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1713 г. як вёска ў Худавецкім войтаўстве маёнтка Чарэя, у ёй адна валока зямлі, 6 двароў. У 1887 г. пераважна літоўскае насельніцтва, уласнасць Эрыка Юльянавіча Шаўкоўскага, 11 двароў, 67 жыхароў. У 1904 г. ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 11 двароў, 127 жыхароў, была карчма. У 1912 г. адкрыта земская школа, працаваў вадзяны млын. З 1925 г. вёска Крупскага раёна, спачатку ў Ігрушкаўскім, потым Крупскім сельсаветах. У 1926 г. адкрыта літоўская пачатковая школа, у 1930 г. пераўтворана ў беларускую. У 1929 г. 29 двароў, 129 жыхароў. У 1930-я гады створаны калгас імя Домбаля. У 1941 г. ў вёсцы 118 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 19 чалавек. З 1950 г. вёска ў складзе калгаса імя Молатава, з 1958 г. — калгаса імя Колесавай. На 1.1.1998 г. 33 гаспадаркі, 47 жыхароў. Працуе крама. Каля вёскі брацкая магіла, пахаваны 7 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

АСТРОЎКІ, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Паводле мясцовага падання першымі жыхарамі былі браты Хрыпачы. Зямлі не хапала, вось яны і знайшлі ўзгорак — аставок лесу. Пабудавалі тры хаты і адну для сваёй маці, гэта месца завецца «бабін» хутар. У канцы 19 ст. сяло ў складзе Абчугскай воласці Сенненскага павета, 13 двароў, 84 жыхары. У 1930 г. вяскоўцы стварылі калгас «Чырвоная Зорка». У 1941 г. ў вёсцы 40 дамоў, 170 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 17 чалавек, спалена 5 дамоў, знішчана 15 мірных жыхароў. Пасля вайны вёска ў складзе саўгаса, потым калгаса «Абчуга». На 1.1.1998 г. 19 гаспадарак, 24 жыхары.

БАБАРЫКА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Паводле падання паселішча заснавалі стараверы, выхадцы з Расіі. Першапачатковая назва «Адамаўка», размяшчалася каля мяст. Халопенічы. Але калі Халопеніцкі маёнтак выкупіў пан Халецкі, стараверы перасяліліся на новае месца. Паводле пісьмовых звестак вядома з канца 19 ст. У 1909 г. вёска Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 20 двароў, 117 жыхароў. У 1917 г. 40 двароў, 206 жыхароў. З 1924 г. ў складзе Халопеніцкага, з 1931 г. — Крупскага, з 1935 г. — Халопеніцкага, з 1960 г. — Крупскага раёнаў Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы стварылі калгас «Шлях сацыялізму». У 1941 г. ў вёсцы 32 двары, 120 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 6 чалавек. Пасля вайны адноўлена, у складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Халопенічы». На 1.1.1998 г. 18 гаспадарак, 33 жыхары.

БАРАВЕЦ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Вядома з пачатку 20 ст. З 1924 г. ў складзе Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Перамога». На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 8 чалавек. З 1967 г. ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 10 гаспадарак, 18 жыхароў.

БАРАВЫЯ, вёска ў Крупскім сельсавеце. У 1873 г. вёска Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 31 двор, 199 жыхароў, у тым ліку 38 мужчын. З 20.8.1924 г. вёска ў Крупскім раёне Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 26.7.1930 г. Крупскага раёна, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Новы лад». У 1941 г. ў вёсцы 44 двары, 147 жыхароў. У маі 1944 г. ў час карнай аперацыі пад назвай «Стракаты дзяцел», якая была праведзена падраздзяленнямі вермахта ў Крупскім раёне, гітлераўцы прымусілі жыхароў вёскі рухацца спераду карнікаў і разміnіраваць цаной свайго жыцця дарогі. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 24 чалавекі. У чэрвені 1944 г. калгас адноўлены. З 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Кірава, з 1951 г. — калгаса імя Леніна. На 1.1.1998 г. 26 гаспадарак, 53 жыхары.

БАРКІ, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома як

вёска маёнтка Халопенічы, уласнасць Іахіма Храптовіча, 8 «дымоў», потым графіні Цітовай. У 1856 г. ва ўладанні Аляксандра Дзяменцьевіча Лапко, з'яўлялася часткай маёнтка Халопенічы Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1870 г. ў вёсцы 103 мужчыны. У 1917 г. належала пану Яноўскаму і ўваходзіла ў склад Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета, 70 двароў, 420 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоныя Баркі». Пасля 1924 г. ў складзе Грыцкавіцкага сельсавета Халопеніцкага раёна, з 1931 г. ў Крупскім раёне. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Варашылава, пасля вайны да яго далучаны калгас імя Ільіча. У 1941 г. ў вёсцы 90 двароў, 320 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 28 чалавек, у партызанскай барацьбе 7. У 1958 г. перайменаваны ў калгас імя Фрунзе, з 1960 г. ў складзе саўгаса «Халопенічы». На 1.1.1998 г. 53 гаспадаркі, 110 жыхароў. У вёсцы размешчаны крама, клуб з бібліятэкай, пачатковая школа, малочнатаварная ферма.

БАРКІ (Белыя Баркі, Белаборкі), вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Непадалёку ад вёскі знаходзіцца група курганоў, якія ў народзе называюць французскімі магіламі. У 1678 г. вёска маёнтка Чарэя, уласнасць падскарбія Бенедыкта Паўла Сапегі ў Вялікім княстве Літоўскім. У 1713 г. было 5 валок зямлі, 16 двароў. У 1760 г. в. Белаборкі ў Чарэйскім графстве ў закладзе ў віцебскага ваяводы Юзафа Давойна Салагуба, 17 «дымоў». У 1847 г. в. Белыя Баркі ў Сенненскім павеце, адносілася да маёнтка Старожышча, уласнасць паноў Рашкоўскіх, 149 жыхароў. Было 38 коней, 8 валоў, 32 каровы, 92 авечкі. У пачатку 20 ст. вёска ў Лісічанскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 33 двары, 227 жыхароў, хлебазапасная крама, належала пану Яноўскаму. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Чарэйскім, потым у Крупскім раёнах Мінскай вобласці. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоныя Баркі». У 1941 г. ў вёсцы 42 двары, 180 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 11 чалавек, знішчаны 17 мірных жыхароў. Пасля вайны вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 34 гаспадаркі, 61 жыхар.

БАРОК, вёска ў Нацкім сельсавеце. Вядома з 1835 г., уласнасць Міхаіла Міхайлавіча Каралько. У канцы 19 ст. дзейнічала карчма, сукнавальня, 2 вадзяныя млыны. З 1924 г. вёска Нацкага сельсавета Крупскага р-на Аршанскай акругі, з 1928 г. — Мінскай вобласці. У 1929 г. жыхары вёсак Баркі, Кладзі і Нача аб'ядналіся ў калгас «Новая нача». У 1941 г. ў вёсцы 13 двароў, 66 жыхароў. На франтах Айчыннай вайны загінулі 4 чалавекі. З 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Камунар». На 1.1.1998 г. 9 гаспадарак, 18 жыхароў.

БАРСУКІ, вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Вядома з 1625 г. як вёска Слабада, уваходзіла ў Чарэйскі маёнтак, 3 двары. З 1667 г. ў маёнтку Лісічына, належала князю Самуэлю Лукамскаму, потым яго сыну князю Тэадору Лукамскаму. У 1703 г. вёска ў складзе аднаго «дыма» перададзена ў заклад Генрыху Яну Лямбоўскаму. У 1722—43 гг. вёска ва ўладанні Міхала Тамкевіча, потым князя Лукамскага. У 1772 г. вёска ва ўладанні Кістаржэцкага, 5 двароў, з 1775 г. ва ўласнасці Тадэвуша Пшысецкага, 17 «дымоў», потым ў закладзе ў Кастранецкага. У 1860 г. яе купіў Іван Фадзеевіч Вільчынскі, у 1880 г. 21 двор, 100 жыхароў, карчма, ветраны млын. У 1909 г. ў Лісічынскай воласці Сенненскага павета, 34 двары, 230 жыхароў. У гады 1-й сусветнай вайны акупіравана немцамі. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Чарэйскім, з 1931 г. ў Крупскім, потым у Халопеніцкім раёнах Мінскай вобласці. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны сцяг», пабудавана пачатковая школа. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы налічвалася 60 двароў, 227 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 17 чалавек, у партызанскай барацьбе 9, знішчана 6 мірных жыхароў. З 1960 г. ў Вялікахальнявіцкім сельсавеце Крупскага раёна, у складзе саўгаса «Сялява». Дзейнічала васьмігадовая школа, пасля закрыцця ў яе памяшканні доўгі час знаходзілася турбаза. На 1.1.1998 г. 38 гаспадарак, 66 жыхароў.

БАРСУЧЫНА, вёска ў Крупскім сельсавеце (цяпер не існуе). Паводле пісьмовых звестак вядома з 1792 г., засценак належаў Тадэвушу Шукевічу. У 1897 г. ў Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 2 двары, 22 жыхары. У 1913 г. ў вёсцы земскае вучылішча, 10 дамоў, 71 жыхар, належала памешчыку Станіславу Міхайлавічу Пароту. У 1930-я гады 7 двароў, 35 жыхароў.

БАТУРЫ, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Заснавана каля 1770 г. як засценак Чарэйскага маёнтка Сапегаў. У 1772—75 гг. у закладзе ў Ю.Салагуба, 5 «дымоў». У Айчынную вайну 1812 г. каля вёскі руская армія разграміла французскую дывізію. Пры адступленні французы спалілі амаль усю вёску. У канцы 19 ст. ўласнасць Юлія Серафімавіча Рашкоўскага, 60 жыхароў, 2 карчмы. Пасля

ўстанаўлення Савецкай улады ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна, у складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Прызыў». У 1941 г. ў вёсцы 16 двароў, 112 жыхароў. На франтах Вялікай Айчынай вайны загінулі 29 чалавек. Вёска была часткова спалена. На 1.1.1998 г. 3 гаспадаркі, 5 жыхароў.

БЕЛАЕ, вёска ў Хацюхоўскім пасялковым Савеце. Заснавана ў 1777 г. як частка маёнтка Халопенічы, уласнасць Храптовіча, 1 двор. У 1795 г. 7 двароў, 50 жыхароў. У 1897 г. ўласнасць У.А.Безмена, 26 двароў, 190 жыхароў, у Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. З 1924 г. ў Хацюхоўскім сельсавеце Халопеніцкага раёна, з 1931 г. Крупскага, з 1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў Мінскай вобласці. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Новае жыццё». У 1941 г. ў вёсцы 76 двароў, 216 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну на фронце загінулі 15 чалавек. Пасля вайны адноўлена, з 1960 г. ў складзе калгаса «Чырвоны Кастрычнік». На 1.1.1998 г. 21 гаспадарка, 40 жыхароў. У вёсцы размешчана малочнатаварная ферма. Радзіма двойчы Героя Савецкага Саюза, касманаўта У.В.Кавалёнка.

БОБР, гарадскі пасёлак, цэнтр сельсавета. Назва пайшла ад т.зв. «бабровых гоняў», якіх было шмат каля р. Бобр. Упершыню ўпамінаецца ў 1516 г. ў сувязі з перадачай князем Іванам Васілевічам Друцкім-Красным у карыстанне жонцы, княгіні Марыне Іванаўне. З 1559 г. маёнтак пана Ераніма Аляксандравіча Хадкевіча. У прывілеі Вялікага князя Жыгімонта Аўгуста адзначалася, што яго можна засяляць толькі «людьми вольными, похожими, а не отчичами нашими господарскими, ани тож князскими и панскими». У 1573 г. мястэчка Аршанскага павета. Абазначана на карце Т.Макоўскага, выдадзенай у Амстэрдаме ў 1613 г., 49 «дымоў». Пазней у Віцебскім ваяводстве, у закладзе Станіслава Паца, 67 двароў, гасціны дом, млын з двух колаў. Для мястэчка была характэрна мядовая даніна, калі на карысць феадала здавалася пэўная колькасць мёду. У 1614 г. 35 вуліц, 172 двары, рынак, царква, гасціны дом, 1 млын, прададзена Аляксандрам Хадкевічам Крыштафу Камару. Вядома, напрыклад, што ў 1624 г. падданыя Крыштафа Камара збілі магілёўскага купца-яўрэя, за што маёнтак павінен быў выплаціць штраф у памеры 300 кап. і 10 грошаў, у 1636 г. ва ўладаннях К.Камара быў забіты падданы суседняга сяла Шырневічы. Да Бобра належалі сёлы Стары

Герб г.п. Бобр.

Бобр, Манастыры, Панькавічы, Сакаловічы. Пасля смерці Крыштафа Камара ў 1636 г. Бобр пераходзіць да Ераніма Камара. У 1667 г. карчма, млын, 94 «дымы». У канцы 17 ст.

Гарадская пячатка г.п. Бобр.

мястэчка, якое належала Казіміру Камару і яго брату, перайшло ва ўласнасць паноў Сапегаў. У 1697 г. рускі стольнік, потым паплечнік Пятра I граф П.А.Талстой у нататках пад назвай «Падарожжа» пісаў, што Бобр — мястэчка вялікае і дамоў яўрэйскіх у ім багатых шмат, месца люднае, у самога падскарбія Сапегі ў тым мястэчку двор невялікі, пабудова драўляная, нізкая. У гэты ж час у вёсцы дзейнічала уніяцкая царква. У 1700 г. маёнтак Бенядыкта Сапегі ў закладзе ў Яна Казіміра Лендорфа і яго жонкі Хрысціны Абрамовіч. Маёнтак часова страчаны Сапегамі ў выніку пераходу на бок шведаў у час Паўночнай вайны. Пасля смерці Лендорфа ў 1733 г. маёнтак з прычыны шлюбу Хрысціны Абрамовіч з князем Марцыянам Мікалаем Агінскім адышоў да Агінскага.

1.1.1762 г. мястэчка, уласнасць князя Ігнація Агінскага, атрымала магдэбургскае права і герб. Бобр стаў цэнтрам маёнтка князёў Агінскіх і каталіцкай епархіі, меў 54 «дымы», шэсць двароў, належаў плябану Бобрскага каталіцкага касцёла. На наступны год Алена Агінская, удава Ігнація Агінскага, перадала маёнтак Бобр князю Міхалу Агінскаму, потым ён перайшоў да князя Ксаверына Агінскага. Нейкі час маёнтак, абцяжараны даўгамі гетмана Міхала Казіміра Агінскага, знаходзіўся ў арэндзе ў князя Францішка Друцкага-Любецкага. З 1793 г. ў Расійскай імперыі, цэнтр воласці. У 1803 г. ўласнасць князя Міхала Клеафаса Агінскага. У Айчынную вайну 1812 г. ў Бобры стаяў французскі гарнізон, дзейнічала падпрэфектура. Пры іх адступленні пасяленне часткова спалена. «Поелику местечко Бобр и селение на самой большой дороге, то крестьяне в оных некоторые совсем разорены, ... многие перемерли, а другие скрылись в неизвестные места, оставя дома», — пісаў смаленскі губернскі пракурор у ведамасці ад 2 мая 1813 г. аб спаленых і разбураных пасяленнях у Копыскім павеце Магілёўскай губерні. З 1842 г. мястэчка Копыскага павета Магілёўскай губерні, ва ўладанні графа Іосіфа Міхала Тышкевіча, у гэтым годзе пабудавана новая Мікалаеўская царква. У 1859 г. мястэчка і маёнтак, уласнасць стацкага саветніка Іосіфа Ванковіча, у закладзе ў графа Тышкевіча, 67 жылых і 29 пустых двароў, 400 жыхароў (182 мужчыны і 218 жанчын). Раз у год праходзіў кірмаш. У 1862 г. пабудаваны каменны касцёл замест драўлянага, які існаваў з 1760 г. У 1862 г. адкрыта народнае вучылішча, у 1863 г. 1113 жыхароў. У 1877 г. мястэчка купіў сапраўдны стацкі саветнік А.Ф.Барталамей. Да 1880 г. колькасць жыхароў у мястэчку павялічылася да 2239 (1103 мужчыны, 1136 жанчын), 320 двароў. Развівалася кустарная прамысловасць: 1 чалавек займаўся кушнерскім промыслам, 2— рымарскім, 2 — валютным, 19 — кравецкім, 14 — пашывам адзення, 2 — такарнай справай, 5 — кавальскай. Дзейнічалі 2 вадзяныя млыны, скураны завод, крупадзёрка, якія належалі Аляксандру Фёдаравічу Барталамею. У 1881 г. валасное праўленне, камора судовага следчага, народнае вучылішча (адкрыта ў 1869 г.), двухкласная настаўніцкая, царкоўнапрыходская школы, сельская лячэбніца, драўляная царква, каменны касцёл, 2 яўрэйскія малітоўныя школы. 9 мая, 14 верасня і 6 снежня праводзіліся кірмашы. У 1885 г. адкрыта паштовае аддзяленне. У пачатку 20 ст. ў мястэчку 440 двароў, 2401 жыхар (1223 мужчыны, 1178 жанчын), 3 вадзяныя млыны, лячэбніца, аптэка купца Лейбы, гарбарны завод, валасное праўленне, паштова-тэлеграфнае аддзяленне, платформа «Бобр» Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, народнае вучылішча, двухкласная царкоўнапрыходская школа, 35 гандлёвых лавак, хлебазапасны магазін, царква, касцёл, 3 яўрэйскія малітоўныя дамы, пастаялы двор, тракцір, 2 вінныя лаўкі, спіртзавод (належаў адстаўному генералу Барталамею), прадпрыемства па вытворчасці піва і фруктовых сокаў Брэйгера. У 1904 г. працавалі цагляны завод братоў Лазінскіх (62 рабочыя) і цагляны завод братоў Пружыніных (53 рабочыя). 27.11.1905 г. ў мястэчку прайшла нелегальная сходка, дзе сялянам раздавалі лістоўкі «Да ўсіх» Талачынскага камітэта РСДРП. 27 снежня сяляне выступілі супраць уладальніка маёнтка Барталамея, самавольна высякалі лес. У 1910 г. 430 двароў, 2340 жыхароў. З 1919 г. ў РСФСР. 7.12.1920 г. валасны з'езд Бобрскай воласці падаў заяву ўраду ССРБ з просьбай уключыць воласць у склад Беларусі. З 1924 г. цэнтр сельскага Савета Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 1938 г. вёска ў Мінскай вобласці. У 1930-я гады дзейнічала слясарная майстэрня «Ударнік», кавальская арцель «Металіст», школа, клуб, пошта. У 1928 г. створаны калгас «Красная ніва». 17.2.1941 г. гарадскі пасёлак, 530 двароў, 2400 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, спалена 390 двароў, загінулі 1237 чалавек, у тым ліку 178 чалавек на фронце, 13 у партызанскай барацьбе. Вызвалена 28.6.1944 г. войскамі

28-га, 3-га гвардзейскіх танкавых брыгад. Тут здзейсніў свой подзвіг Герой Савецкага Саюза В.М.Чабатароў. У 1944 г. працаваў лесазавод, дзе спачатку пілавалі лес, з 1959 г. перайшлі на выраб дэталяў для піяніна, створаны цэх райпрамкамбіната. Пасёлак у складзе ўзбуйненага саўгаса «Бобр», цяпер калгаса «Бобр». У 1969 г. 3 тысячы жыхароў. На 1.1.1998 г. 204 гаспадаркі, 483 жыхары. Сярэдняя школа, Дом культуры, 2 бібліятэкі, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, амбулаторыя, 4 магазіны, бар, дзіцячы сад, ляснічтва, піянерскі лагер, лесазавод, цэнтральная сядзіба калгаса, майстэрні, спіртзавод, жывёлагадоўчая ферма. Каля пасёлка брацкая магіла, пахаваны 140 воінаў, якія загінулі ў чэрвені—ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск; магіла ахвяр фашызму, пахаваны 961 мірны жыхар, якіх расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі 10.10.1941 г. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск. У цэнтры пасёлка, у скверы, на ўшанаванне памяці 199 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну на франтах і ў партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1966 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя: воін і партызанка. Каля будынка сярэдняй школы помнік Герою Савецкага Саюза В.М.Чабатарову. У 1973 г. ўстаноўлены паплечны бюст героя. Радзіма Герояў Савецкага Саюза В.А.Князева і М.Дз.Кононава.

БОБРЫК, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Вядома з 1775 г. як вёска маёнтка Чарэя, у закладзе Ю.Салагуба, 12 «дымоў». Пасля 1790 г. яе набыў пан Мілаш. У 1873 г. ў вёсцы 33 мужчыны, у 1909 г. ў Чарэйскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 40 двароў, 275 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Заборскім сельсавеце Чарэйскага, з 8.7.1931 г. Крупскага раёнаў. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Бальшавік». Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны 55 двароў, 195 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 7 чалавек, у партызанскай барацьбе 3. Вёска была часткова спалена. Пасля вайны адбудавана. У 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка», з 1965 г. — саўгаса, потым — калгаса «Касянічы». На 1.1.1998 г. 33 гаспадаркі, 65 жыхароў. У вёсцы размешчаны крама, жывёлагадоўчая ферма.

БРЫШЧА, вёска ў Дакудаўскім сельсавеце. Паводле пісьмовых звестак вядома з канца 19 ст. У 1897 г. хутар, двор, 29 жыхароў. У 1909 г. 2 двары, 13 жыхароў. У 1917 г. хутар Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 4 двары, 18 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Малажаберыцкім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай акругі. З 1.6.1927 г. ў Крупскім раёне Аршанскай акругі, з 20.2.1938 г. — Мінскай вобласці. Вёска ў складзе калгаса «Бальшавік». На 1.1.1998 г. 2 гаспадаркі, 3 жыхары.

БУДА, вёска ў Крупскім сельсавеце. Вядома з 1713 г., вёска Худавецкага войтаўства маёнтка Чарэя, 5 валок зямлі, 17 двароў. У 1775 г. ў закладзе ў князя І.Агінскага, у вёсцы 11 «дымоў». У 1859 г. вёска маёнтка Юзэфава, уласнасць дзяцей Яўстафія, Івана і Ганны Юзафа Дышлеўскага, у закладзе Фартунаты Кастаўны Дышлеўскай, 19 двароў, 129 жыхароў. У канцы 19 ст. 17 гаспадарак, 152 жыхары. У 1909 г. ў Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 33 двары, 225 жыхароў. У 1913 г. адкрыта земскае вучылішча. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады вёска ў Крупскім раёне. У 1931 г. жыхары вёсак Буда, Ротань, Скардзіца аб'ядналіся ў калгас імя Молатава. У 1941 г. ў вёсцы 34 двары, 190 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 11 чалавек, у партызанскай барацьбе 2. З 1958 г. ў складзе калгаса імя Колесавай. На 1.1.1998 г. 16 гаспадарак, 23 жыхары.

БУДА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Вядома з пачатку 20 ст., вёска Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 13 двароў, 162 жыхары. У 1917 г. 20 двароў, 140 жыхароў. З 1924 г. ў Хацюхоўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 1930 г. — Крупскага, з 1935 г. — Халопеніцкага раёнаў. У 1930-я гады створаны калгас імя Будзённага. У 1941 г. ў вёсцы 35 двароў, 115 чалавек. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 19 чалавек. Пасля вайны вёска адноўлена, у складзе калгаса імя Кірава. З 1960 г. ў Халопеніцкім сельсавеце Крупскага раёна, з 1966 г. ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Якімаўка». На 1.1.1998 г. 28 жыхароў.

БЯЛЯНЫ, вёска ў Абчугскім сельсавеце (цяпер не існуе). Вядома з 19 ст. ў 1880 г. ў вёсцы 14 двароў, 94 жыхары. У пачатку 20 ст. У складзе Чарэйскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 17 двароў, 114 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Заборскім сельсавеце Чарэйскага, з 1931 г. — Крупскага раёнаў. Разам з жыхарамі в. Бобрык у 1930 г. створаны калгас «Бальшавік». У 1941

г. ў вёсцы 29 двароў, 92 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінуў 21 чалавек. Пасля вайны вёска ў складзе ўзбуйненага саўгаса «40 год Кастрычніка», з 1965 г. — саўгаса, потым — калгаса «Касянічы».

БЯРОЗАЎКА, вёска ў Крупскім сельсавеце. У 1909 г. вёска Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 26 двароў, 178 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Крупскім раёне Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 26.7.1930 г. ў Крупскім раёне, з 20.2.1938 г. ў Мінскай вобласці. У 1929 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Полымя». У 1941 г. ў вёсцы 69 двароў, 203 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 35 чалавек, нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі 5 мірных жыхароў. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса імя Кірава, з 1951 г. — імя Леніна. На 1.1.1998 г. 43 гаспадаркі, 7 жыхароў.

БЯРОЗКА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з пачатку 20 ст. У 1909 г. ва Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 11 двароў, 76 жыхароў. У пачатку ўстанаўлення Савецкай улады 10 двароў, 71 жыхар. З 20.8.1924 г. вёска ў складзе Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. — Мінскай вобласці. У 1941 г. ў вёсцы 19 двароў, 102 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну вёска знаходзілася ў партызанскай зоне, каля яе размяшчаўся Крупскі падпольны райком партыі. У 1944 г. партызаны пабудавалі тут мост цераз р. Можа для часцей наступаючай Чырвонай Арміі. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 10 чалавек. Пасля вайны вёска ў складзе саўгаса «Новая ніва», потым — аб'яднанага калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 12 гаспадарак, 21 жыхар. Каля вёскі у 1965 г. пастаўлены помнік у гонар Крупскага падпольнага райкома КП(б)Б у Вялікую Айчынную вайну.

ВАЛОБА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце (цяпер не існуе). Вядома з 1844 г., маёнтак Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, належаў пані Цітовай, 5 двароў, у 1855 г. 11 двароў, 64 жыхары. У 1917 г. 14 двароў, 80 жыхароў, у складзе Халопеніцкага сельсавета Халопеніцкага раёна.

ВАЎКАВЫСК, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1-й паловы 19 ст. У Айчынную вайну 1812 г. непадалёку ад вёскі войска генерала Властава і Гарне атакавалі французскае войска, было ўзята ў палон 1500 французаў. Вёска часткова разбурана і спалена французамі. У 1884 г. слабада Ваўкавыск у Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, у 1909 г. вёска, землеўладанне мяшчан, 18 двароў, 112 жыхароў, стараверская царква, царкоўнапрыходская школа. З 20.8.1924 г. ў складзе Ігрушкаўскага сельсавета Крупскага раёна Барысаўскай, з 9.6.1927 г. Мінскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 26.7.1930 г. Крупскага раёна, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1941 г. ў вёсцы 26 двароў, 125 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 10 чалавек, знішчаны 8 мірных жыхароў. Цяпер у складзе калгаса «Прыязьў». На 1.1.1998 г. 40 гаспадарак, 109 жыхароў.

ВЕРСАНКА (Падузнацк), вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. З 1885 г. вёска Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 17 двароў, 129 жыхароў. У 1908 г. 19 двароў, 171 жыхар. У 1917 г. 24 двары, 177 жыхароў. З 1924 г. ў Халопеніцкім сельсавеце Халопеніцкага раёна Барысаўскай акругі, з 1931 г. Крупскага, з 1935 г. Халопеніцкага, з 1960 г. Крупскага раёнаў Мінскай вобласці. У 1941 г. ў вёсцы 37 двароў, 118 жыхароў. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы дзейнічала падпольная маладзёжная група, загінулі 13 жыхароў. Пасля вайны ў складзе саўгаса, потым — калгаса «Якімаўка». На 1.1.1998 г. 31 гаспадарка, 57 жыхароў.

ВЕРШАЎКА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Вядома з 1882 г., фальварак, дзейнічаў лесапільны завод. У 1909 г. вёска Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 15 двароў, 297 жыхароў. У 1917 г. 33 двары, 188 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Хацюхоўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў Мінскай вобласці, з 9.8.1960 г. ў Халопеніцкім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Кагановіча. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 2 чалавекі. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса імя Кірава, з 1960 г. — калгаса «Хальнявічы», з 1964 г. — калгаса «Прыязьў», потым — «Якімаўка». На 1.1.1998 г. 3 гаспадаркі, 4 жыхары.

ВЕСЯЛОВА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Вядома з канца 19 ст. Увахоздзіла ў Халопеніцкі маёнтак Халопеніцкай воласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Будаўнік культуры». У 1941 г. 25

двароў, 80 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінуў 1 жыхар. Пасля вайны калгас адноўлены, вёска ў складзе саўгаса, потым калгаса «Халопенічы». На 1.1.1998 г. 14 гаспадарак, 32 жыхары.

ВІКТОЛІНА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Вядома з 1860 г., засценак Бобрскай воласці, 1 двор, 6 мужчын. У 1909 г. 4 двары, 30 жыхароў. У 1924 г. ў складзе Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Дзяржынскага. У гады Вялікай Айчыннай вайны загінулі 6 чалавек. З 1967 г. вёска ў складзе калгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 31 гаспадарка, 3 жыхары.

ВОСАВА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Вядома з канца 19 ст. У 1897 г. 18 двароў, 119 жыхароў, у 1909 г. 17 двароў, 158 жыхароў, працавала школа. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Сакалавіцкага, потым Бобрскага сельсаветаў Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас імя Варашылава, пасля вайны ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Сталіна (у 1959 г. перайменаваны ў калгас імя Свярдлова). На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 28 чалавек: фашысты знішчылі 10 мірных жыхароў. З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 10 гаспадарак, 14 жыхароў. Каля вёскі помнік на ўшанаванне памяці 77 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1980 г. пастаўлены помнік-абеліск, камень з рэльефнай выявай воіна; 3 стэлы з мармуровымі дошкамі, на якіх імёны загінуўшых.

ВОСТРАВА, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Вядома з 1745 г., сяло маёнтка Шыйка князёў Сангушкаў, 20 двароў, дзейнічала царква. У сярэдзіне 19 ст. вёска маёнтка Страселле Копыскага павета Магілёўскай губерні, належала Льву Стахоўскаму, 160 жыхароў. У 2-й палове 19 ст. у Сенненскім павеце, уладанне Стахоўскіх. У 1909 г. 32 двары, 362 жыхары. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Ігрушкаўскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны Востраў». У 1941 г. ў вёсцы 43 двары, 147 жыхароў. На франтах Вялікай Айчынай вайны загінулі 17 чалавек. З 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Шлях Сталіна», з 1961 г. — саўгаса «Грушаўскі». На 1.1.1998 г. 22 гаспадаркі, 36 жыхароў.

ВОСТРАВА, вёска ў Нацкім сельсавеце. У 1909 г. маёнтак Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 1 двор, 7 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Нацкім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1929 г. жыхары вёскі разам з жыхарамі в. Вейніца аб'ядналіся ў калгас імя Молатава. У 1940 г. 42 двары, 191 жыхар. З чэрвеня 1941 г. па чэрвень 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Вызвалена воінамі 11-й гвардзейскай арміі 3-га Беларускага фронту. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 25 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Камунар» (цэнтр — в. Нача). На 1.1.1998 г. 47 гаспадарак, 77 жыхароў.

ВЫДРЫЦА, вёска, цэнтр сельсавета. Аб засяленні гэтых месц людзьмі ў глыбокай старажытнасці сведчыць помнік археалогіі — курганны могільнік (6 насыпаў), які знаходзіцца за 1 км на паўднёвы захад ад вёскі. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1670 г. як сяло Забаброўскай воласці Барысаўскага староства, 17 двароў. У 1774 г. сяло, належала княгіні Алене Агінскай, 16 «дымоў». У 1866 г. 34 двары, пабудавана царква. У 1885 г. сяло Вяляцицкай воласці Барысаўскага павета, 478 жыхароў. З 1875 г. дзейнічала царкоўнапрыходская школа. У 1917 г. 98 двароў, 601 жыхар. У пачатку ўзнікнення Крупскага раёна сяло было цэнтрам Выдрыцкага сельсавета. У 1929 г. створаны калгас «Трактар», 114 двароў, 586 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы размяшчаўся фашысцкі гарнізон, у верасні 1942 г. быў разгромлены партызанамі 128-га, 227-га атрадаў, атрада імя К.Я.Варашылава, дыверсійнымі групамі падпалкоўніка Л.І.Спрогіса, А.Колесавай. У чэрвені 1944 г. вёска амаль поўнасцю спалена фашысцкімі карнікамі. На франтах вайны і ў партызанскай барацьбе загінуў 71 чалавек, фашысты знішчылі 35 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. У 1950 г. ў Выдрыцу пераселены жыхары вёсак Гаць, Маладзілава, з суседніх калгасаў «Зорка», імя Калініна, «Трактар». Вёска ў складзе калгаса імя Кірава. На 1.1.1998 г. 102 гаспадаркі, 228 жыхароў. Майстэрні па рамонце сельгастэхнікі, сярэдняя школа, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, крама, жывёлагадоўчая ферма. У цэнтры вёскі брацкая магіла, пахаваны 6 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск. Каля вёскі помнік на ўшанаванне памяці 22 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Помнік — скульптура воіна і парты-

занкі пастаўлены ў 1965 г. У цэнтры вёскі помнік на месцы гібелі Героя Савецкага Саюза А.Ф.Колесавай. У 1983 г. ўстаноўлены камень з надпісам.

ВЫСОКАЕ, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. У 1772 г. вёска, належала Салагубу, 9 двароў, потым фальварак, 4 двары. У пачатку 20 ст. 27 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Халопеніцкага, з 1944 г. — Крупскага раёнаў. У 1930-я гады жыхары вёсак Высокае, Малінаўка аб'ядналіся ў калгас «Іскра». У 1941 г. ў вёсцы 20 двароў, 102 жыхары. У гады Вялікай Айчыннай вайны загінулі 4 вяскоўцы. Пасля вайны адноўлена, у складзе саўгаса «Авангард». На 1.1.1998 г. 5 гаспадарак, 7 жыхароў.

ВЯЛІКАЕ ВОСАВА (В о с а ў), вёска ў Дакудаўскім сельсавеце. Паводле пісьмовых звестак вядома з 1670 г., засценак Замкавай воласці Барысаўскага староства. У 1765 г. засценак сяла Дакудава Барысаўскага староства. У 1897 г. ў вёсцы 34 двары, 198 жыхароў. У 1909 г. на аднайменным хутары 3 двары, 13 жыхароў. У 1917 г. вёска Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 46 двароў, 303 жыхары, на аднайменным хутары 3 двары, 20 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Малажаберыцкім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1932 г. Мінскай вобласці. У 1929 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Новы шлях». У 1941 г. ў вёсцы 50 двароў, 287 жыхароў. З чэрвеня 1941 г. па чэрвень 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, загублена 6 мірных жыхароў вёскі. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 22 вяскоўцы. Пасля вайны адноўлена, з 1950 г. ў складзе калгаса «Бальшавік». Уваходзіла спачатку ў Нацкі, потым у Жаберыцкі, з 13.9.1982 г. ў Дакудаўскі сельсаветы. На 1.1.1998 г. 46 гаспадарак, 89 жыхароў. Жывёлагадоўчая ферма.

ВЯЛІКАЕ ВОСАВА (Н о в а е С я л о), вёска ў Хацюхоўскм сельсавеце. Заснавана каля 1775 г., належала плябаніі Барысаўскага касцёла, 2 двары. У 1795 г. 7 двароў, 62 жыхары. У 1897 г. вёска Халопеніцкай вобласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 28 двароў, 181 жыхар, дзейнічаў касцёл. З 20.8.1924 г. вёска Хацюхоўскага сельсавета Халопеніцкага раёна Барысаўскай акругі, з 1931 г. Крупскага, з 1935 г. Халопеніцкага раёнаў Мінскай вобласці, з 20.1.1960 г. Крупскага раёна Мінскай вобласці. У 1930 г. створаны калгас «Бальшавік». У 1939 г. да вёскі далучаны хутары Паўтарашчына, Ганчароў, Скалубовічаў, Свірыдаўка, Петрыкаў, Вавільсон. У Вялікую Айчынную вайну ў час бамбёжкі (24 чэрвеня 1941 г.) загінулі 5 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 45 чалавек, у партызанскай барацьбе 9, знішчаны 14 мірных жыхароў. 24 чэрвеня 1944 г. вёска спалена фашыстамі. У гады акупацыі дзейнічала падпольная група. Пасля вайны адбудавана. Да калгаса далучыліся яшчэ 2 калгасы. З 1963 г. — цэнтр калгаса «Праўда». На 1.1.1998 г. 96 гаспадарак, 195 жыхароў. Няпоўная сярэдняя школа, сельскі клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад, крама.

ВЯЛІКАЕ ГОРАДНА, вёска ў Выдрыцкім сельсавеце. Аб засяленні мясцовасці ў старажытныя часы сведчаць помнікі археалогіі, знойдзеныя ў 1883 г. Ф.В.Пакроўскім (курганы, могільнік, гарадзішча). Вядома з 1517 г. У 1526 г. Сігізмунд Герберштэйн упамінаў аб Горадне ў сваіх «Запісках аб Маскавіі». Звесткі аб Горадне маюцца таксама на картах В.Градзецкага, А.Паграбіўса. У 1670 г. Горадна Вышняе, сяло Барысаўскага староства, 6 двароў, Горадна, 6 сялянскіх і 2 зямянскія двары. У 1773 г. Горадна Верхняе, 18 «кунічных дымоў», Горадна Ніжняе, 5 «дымоў». У 1775 г. Горадна Вялікае і Малое, сяло ў Барысаўскім старостве, 24 «дымы». У 1897 г. ў складзе Вялікага Горадна (Вышняга Горадна), 46 двароў, 582 жыхары, хлебазапасны магазін, а таксама хутарскі двор, 6 жыхароў. У 1917 г. ў складзе Вяляцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. З 1924 г. ў Крупскім раёне. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Зорка». У 1941 г. ў вёсцы 79 двароў, 437 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 62 чалавекі, фашысты знішчылі 17 мірных жыхароў. Вёска была амаль поўнасцю спалена. Пасля вайны адбудавана. Вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Пралетарская перамога», зараз калгаса імя Кірава. На 1.1.1998 г. 82 гаспадаркі, 210 жыхароў.

ВЯЛІКАЯ СЛАБАДА, вёска ў Крупскім сельсавеце. Вядома з 2-й паловы 18 ст. У 1775 г. ўласнасць шляхціца пана Тарнаўскага, 10 двароў. У 1873 г. ў вёсцы 32 мужчыны. У 1909 г. ў Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 17 двароў, 142 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 1938 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады жыхары вёсак Вялікая Слабада, Малая Слабада, Усохі аб'ядналіся ў калгас імя Варашыла-

ва. У 1941 г. ў вёсцы 54 двары, 201 жыхар. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 19 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены. У 1962 г. перайменаваны ў калгас «Перамога». З 1985 г. вёска ў складзе калгаса імя Леніна (цэнтр калгаса). На 1.1.1998 г. 119 гаспадарак, 253 жыхары.

ВЯЛІКІ ВЯЗОК, вёска ў Дзянісавіцкім сельсавеце. Заснавана ў 1772 г., засценак, 3 двары, належала да Барысаўскага маёнтка князёў Радзівілаў. Пасля Айчыннай вайны 1812 г. маёнтак належаў магнату Міхалу Радзівілу, 12 двароў. У канцы 19 ст. в. Вязок у складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета, 30 двароў, смалакурны завод. На перыяд станаўлення Савецкай улады 60 двароў, 379 жыхароў. У 1930-я гады створаны калгас «7-мы з'езд Саветаў». У 1941 г. ў вёсцы 53 двары, 285 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 20 чалавек. У 1950 г. ў складзе калгаса імя Молатава, потым «Іскра», з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», з 1963 г. — калгаса «Дзянісавічы». На 1.1.1998 г. 44 гаспадаркі, 80 жыхароў.

ВЯЛІКІ КАМЯНЕЦ (Камень, Каменка, Камёнка Старая, Камянец Стары), вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Паводле пісьмовых звестак вядома з 1604 г. Маёнтак Камянец належаў князю Івану Барысавічу Лукамльскаму, з 1604 г. ўласнасць канцлера Вялікага княства Літоўскага Льва Сапегі. У 1678 г. сяло Камянец маёнтка Чарэя, належала Дамініку Паўлу Сапегу. У 1713 г. вёска Камянец Стары Худавецкага войтаўства маёнтка Чарэя, 10 валок зямлі, 35 двароў. У 1745—75 гг. Камёнка, потым Камёнка Старая, фальварак маёнтка Чарэя ў закладзе ў жамойцкага кашталяна Юзафа Давойна Салагуба. У 1847 г. в. Вялікі Камянец у Сенненскім павеце Магілёўскай губерні, маёнтак Старажышча паноў Рачкоўскіх. У вёсцы 22 двары, 149 жыхароў, было 36 коней, 24 валы, 37 кароў, 105 авечак, каза. У 1897 г. вёска ў складзе Лісічанскай воласці Сенненскага павета, 53 двары, 296 жыхароў, дзейнічала школа пісьменнасці. З 1924 г. Халопеніцкага, потым Дубаўскага сельсавета Халопеніцкага раёна, з 1959 г. ў Вялікахальнявіцкім, Кастрычніцкім сельсаветах Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас імя Леніна. У 1941 г. ў вёсцы 41 двор, 206 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 12 чалавек. Пасля вайны ў складзе саўгаса, зараз калгаса «Дуброўка». На 1.1.1998 г. 47 гаспадарак, 87 жыхароў. Працуе крама.

ВЯЛІКІ ЛЕС, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. У 1897 г. хутар, двор, 13 жыхароў. Да 1909 г. засценак, 8 двароў, 25 жыхароў. З 1924 г. ў складзе Сакалавіцкага, потым Бобрскага сельсаветаў Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Прагрэс», пасля вайны калгас імя Сталіна, потым перайменаваны ў калгас імя Свярдлова. З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 1 гаспадарка, 3 жыхары.

ВЯЛІКІЯ ЖАБЕРЫЧЫ (Жаберычы), вёска ў Дакудаўскім сельсавеце. Вядома з 1641 г., сяло Замкавай воласці Барысаўскага староства, 8 двароў. У 1764 г. сяло Барысаўскага староства, 11 двароў. У 1795 г. 18 двароў, 176 жыхароў. У час Айчыннай вайны 1812 г. знішчана. У 1897 г. вёска Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні ў складзе маёнтка Старабарысаў вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, 50 двароў, 327 жыхароў, часоўня. У 1907 г. 57 дамоў, 372 жыхары. У 1917 г. 66 двароў, 436 жыхароў, на хутары 10 двароў, 71 жыхар. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Малажаберыцкага сельсавета Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 1938 г. — Мінскай вобласці. У 1930-я гады створаны калгас імя Урыцкага. У 1941 г. ў вёсцы 96 двароў, 390 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 35 чалавек. Пасля вайны калгас і два суседнія аб'ядналіся ў калгас імя Панамарэнкі, з 1958 г. — калгас «За мір», цяпер вёска ў складзе калгаса «Бальшавік». На 1.1.1998 г. 43 гаспадаркі, 92 жыхары. Жывёлагадоўчая ферма.

ВЯЛІКІЯ ХАЛЬНЯВІЧЫ, вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 19 ст. У 1880 г. вёска, 49 двароў, 294 жыхары. У пачатку 20 ст. вёска ў Чарэйскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 75 двароў, 245 жыхароў мужчынскага і 233 жаночага полу. З 20.8.1924 г. вёска — цэнтр Вялікахальнявіцкага сельсавета Чарэйскага раёна Барысаўскай акругі, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў Мінскай вобласці, з 1.10.1973 г. ў Янаўшчынскім сельсавеце. У 1929 г. 30 жыхароў вёскі аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны Кастрычнік». У 1941 г. 70 двароў, 324 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 84 чалавекі, знішчаны 23 мірныя жыхары. Вызвалена ў чэрвені 1944 г. во-

інамі 3-га Беларускага фронту. Цяпер у складзе калгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 48 гаспадарак, 91 жыхар. Каля вёскі брацкая магіла, пахаваны 93 воіны і партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, у 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск. Помнік на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, пастаўлены ў 1964 г.

ВЯРШОЎКА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з канца 19 ст., у Халопеніцкай воласці. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Халопеніцкім, потым Крупскім раёнах. У 1930-я гады створаны калгас імя Кагановіча. У 1941 г. 25 двароў, 80 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 2 жыхары. Пасля вайны калгас адноўлены, вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Кірава, з 1960 г. — саўгаса «Халопенічы», з 1964 г. — саўгаса «Прызыў», з 1966 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Якімаўка». На 1.1.1991 г. 3 гаспадаркі, 5 жыхароў.

ГАЛЬКІ (О л ь к і), вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. У 1578 г. сяло, прададзена Станіславам Станіслававічам Шэметам князю Андрэю Іванавічу Вішнявецкаму, потым дочкі А.І.Вішнявецкага прадалі яго назад. У 1594 г. перададзена Мальхерам Войцахавічам Шэметам у пажыццёвае валоданне жонцы, Ганне Янушэвіч. У 1620 г. сяло маёнтка Халопенічы, 27 двароў, з іх 13 належала пану Валатковічу, 14 пану Нонгарту, пазней уласнасць Міхала Млечкі. У 1775 г. ўласнасць Іахіма Храптовіча, 15 двароў. З 1795 г. ўваходзіла ў землі Халопеніцкага дамініканскага кляштара. У 1890 г. адкрыта школа пісьменнасці. У 1897 г. 73 двары, 454 жыхары. У 1909 г. ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 43 двары, 618 жыхароў. У 1917 г. 83 двары, 548 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Халопеніцкім сельсавеце Халопеніцкага раёна Барысаўскай акругі. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Будаўнік культуры». З 1931 г. ў складзе Крупскага, потым Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў. У 1950 г. далучаны калгас імя Будзённага (в. Буда). З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Халопенічы». Да 1993 г. дзейнічаў філіял Крупскага плодаагароднінага завода. На 1.1.1998 г. 75 гаспадарак, 269 жыхароў. Школа, жывёлагадоўчая ферма.

ГАНКАЎКА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Вядома з сярэдзіны 19 ст. У 1844 г. ў складзе Халопеніцкага маёнтка пані Цітовай, 5 двароў. У 1909 г. вёска ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 4 двары, 61 жыхар. У 1917 г. 10 двароў, 62 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Халопеніцкім сельсавеце Халопеніцкага раёна Барысаўскай акругі, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас. У 1941 г. ў вёсцы 25 двароў, 131 жыхар. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 5 жыхароў. З 1966 г. вёска ў складзе калгаса «Якімаўка». На 1.1.1998 г. 27 гаспадарак, 61 жыхар. Жывёлагадоўчая ферма.

ГАПОНАВІЧЫ, вёска ў Крупскім сельсавеце. Упершыню згадваецца ў 1650 г., уладанне паноў Падбярэзскіх. У 1775 г. 18 двароў. У 1873 г. атрымаў у спадчыну Людвіг Станіслававіч Мілеўскі, у 1880 г. — Вітольд Мацвеевіч Рогаўскі. У 1884 г. ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 19 двароў, 105 жыхароў, царква, карчма, хлебазапасны магазін. У 1892 г. фальварак Гапонавічы, дзейнічаў мукамольны млын. У 1909 г. 19 двароў, 88 жыхароў, у маёнтку 1 двор, 27 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Крупскім сельсавеце Крупскага р-на Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 26.7 1930 г. Крупскага р-на, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Ленінец». У 1941 г. ў вёсцы 56 двароў, 183 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 24 чалавекі. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Ленінец», у 1951 г. перайменаваны ў калгас імя Леніна, з 1986 г. вёска ў складзе калгаса «Перамога». На 1.1.1998 г. 126 гаспадарак, 348 жыхароў. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, сад-яслі, сельскі клуб, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, вытворчыя будынкі, жывёлагадоўчая ферма. У скверы помнік на ўшанаванне памяці 74 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну на франтах і ў партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Помнік пастаўлены ў 1965 г., уяўляе сабой кампазіцыю: воін са сцягам і партызанка з аўтаматам. Каля будынка школы помнік герою Савецкага Саюза М.К.Казлоўскаму.

ГАРАДЗІШЧА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Заснавана ў канцы 18 ст. У 1775 г. вёска, 1 двор, 13 жыхароў, належала Храптовічу; 2 двары, 88 жыхароў — дамініканскаму манастыру; 2 двары, 12 жыха-

роў — уладанне царквы. У 1844 г. уласнасць пані Цітовай, 8 двароў, 82 жыхары. У 1909 г. вёска ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні: Гарадзішча 1-е — 9 двароў, 82 жыхары; Гарадзішча 2-е — 2 двары, 44 жыхары; Гарадзішча 3-е — 7 двароў, 57 жыхароў; Гарадзішча 4-е — 4 двары, 39 жыхароў. У 1917 г.: Гарадзішча 1-е — 12 двароў, 60 жыхароў; Гарадзішча 2-е — 9 двароў, 65 жыхароў; Гарадзішча 3-е — 8 двароў, 57 жыхароў; Гарадзішча 4-е — 8 двароў, 69 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ва Узнацкім сельсавеце Халопеніцкага раёна Барысаўскай акругі, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 16.7.1954 г. ў Халопеніцкім сельсавеце. У 1930-я г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Звязда». У 1941 г. ў вёсцы 60 двароў, 212 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 22 чалавекі. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Новае жыццё», з 1960 г. — саўгаса, цяпер калгаса «Халопенічы». На 1.1.1998 г. 42 гаспадаркі, 104 жыхары. Жывёлагадоўчая ферма.

ГЛІНАЎКА, вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Заснавана ў 1772 г., у закладзе ў пана Салагуба, 2 двары. У 1880 г. ў складзе Лісічанскай воласці Сенненскага павета, 16 двароў, 60 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі вёска ў Крупскім раёне. У 1929 г. створаны калгас «Вольная праца». У 1941 г. 20 двароў, 85 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну поўнасцю спалена. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 3 чалавекі. Пасля вайны адбудавана, у складзе саўгаса «Сялява». З 1973 г. ў Янаўшчынскім сельсавеце. На 1.1.1998 г. 8 гаспадарак, 17 жыхароў.

ГОЛЬЗБЕРГ, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. У 1897 г. фальварак, 1 двор, 12 жыхароў. У 1909 г. ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 14 двароў, 163 жыхары. У 1917 г. вёска, 22 двары, 143 жыхары. З 20.8.1924 г. ў Халопеніцкім сельсавеце Халопеніцкага раёна Барысаўскай акругі, з 26.7.1930 г. Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага раёнаў, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 20.1.1960 г. Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас. У 1941 г. ў вёсцы 25 двароў, 85 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 10 вяскоўцаў, фашысты знішчылі 8 мірных жыхароў. З 1960 г. ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Халопенічы». На 1.1.1998 г. 22 гаспадаркі, 63 жыхары.

ГРЫЦКАВІЧЫ, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1772 г., 22 двары, дзейнічала царква. З 1795 г. вёска ў Халопеніцкім маёнтку Храптовічаў, 16 двароў, 176 жыхароў. У 2-й палове 18 ст. пабудавана царква. У 1844 г. 20 двароў, 195 жыхароў, належала маёнтку Халопенічы пані Цітовай. У канцы 19 ст. адкрыта царкоўнапрыходская школа. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Халопеніцкага, потым Крупскага раёнаў. У 1930-я гады створаны калгас «Чырвоны барацьбіт». У 1941 г. 111 двароў, 463 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 75 чалавек, знішчаны 8 мірных жыхароў. Да 1959 г. цэнтр сельсавета. З 1960 г. ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Халопенічы». На 1.1.1998 г. 113 гаспадарак, 250 жыхароў. У вёсцы размешчаны школа, магазін. Праабражэнская царква.

ГУЗОВІНА, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Заснавана ў канцы 19 ст. У 1909 г. ў складзе Лісічанскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 8 двароў, 32 мужчыны. З 1924 г. ў складзе Чарэйскага, потым Халопеніцкага, з 1960 г. Крупскага раёнаў. У 1930-я гады жыхары вёсак Гузовіна і Прошыка аб'ядналіся ў калгас «Сацыялізм». У пачатку 1941 г. ў вёсцы 18 гаспадарак, 86 жыхароў, 12 гаспадарак перасяляліся з в. Другавік Дубаўскага сельсавета, было 126 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 20 чалавек. Пасля вайны ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка». На 1.1.1998 г. 36 гаспадарак, 81 жыхар.

ГУМНЫ, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Заснавана каля 1764 г., 13 двароў. У 1795 г. 25 двароў, 304 жыхары. У 1818 — 38 гг. адносілася да Барысаўскага маёнтка, 95 гаспадарак, 299 жыхароў. У 1845 г. 34 двары, 328 жыхароў. У 1909 г. ў складзе Дзмітрыеўскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 62 двары, 445 жыхароў, у 1917 г. 78 двароў, 504 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска Выдрыцкага сельсавета Крупскага раёна Барысаўскай акругі, з 18.7.1927 г. Крупскага раёна Аршанскай акругі, з 26.7.1930 г. Крупскага раёна, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з сакавіка 1973 г. ва Ухвальскім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Пралетарская перамога». У 1941 г. ў вёсцы 86 двароў, 452 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 27 чалавек, знішчана фашыстамі 125

мірных жыхароў. У 1944 г. вёска адноўлена, у 1950 г. ў складзе калгаса імя Молатава, потым — саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 65 гаспадарак, 197 жыхароў. Крама, фельчарска-акушэрскі пункт, жывёлагадоўчая ферма. Каля вёскі магіла ахвяр фашызму, пахаваны 125 мірных жыхароў вёскі. У 1985 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ГУТА, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Вядома з канца 19 ст. У 1897 г. 28 двароў, 121 жыхар. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. З 20.8.1927 г. ў складзе Узнацкага сельсавета Халопеніцкага раёна Барысаўскай акругі, потым у Крупскім раёне Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоная зорка». У 1941 г. ў вёсцы 34 двары, 139 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 14 чалавек, фашыстамі знішчана 7 мірных жыхароў. Вёска была часткова спалена. Пасля вайны жыхары вёсак Кругліца і Гута аб'ядналіся ў калгас «Новы шлях», з 1964 г. вёска ў складзе калгаса «Прызыў». На 1.1.1998 г. 28 гаспадарак, 54 жыхары. Жывёлагадоўчая ферма.

ДАКУДАВА, вёска, цэнтр сельсавета. Вядома з пачатку 18 ст., у складзе Барысаўскага староства. У 1818 г. 22 двары, 185 жыхароў, маёнтак князя Радзівіла. У сярэдзіне 19 ст. уласнасць вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, у 1845 г. 20 двароў, 145 жыхароў. У 1882 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. ў складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай вобласці, 69 двароў, 426 жыхароў, побач аднайменны хутар, 4 двары, 15 жыхароў. У 1917 г. 50 двароў, 298 жыхароў, хутар — 29 двароў, 200 жыхароў. З 1924 г. вёска ў складзе Малажаберыцкага сельсавета Крупскага раёна, з 1938 г. — у Нацкім сельсавеце, з 1973 г. ў Жаберыцкім, 13.9.1982 г. перайменаваны ў Дакудаўскі сельсавет. У 1929 г. створаны калгас «Новы быт». У 1931 г. адкрыты пачатковая школа, клуб, крама, дзіцячыя яслі. У 1941 г. 84 двары, 452 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У вёсцы знаходзіўся фашысцкі гарнізон, побач з вёскай — аэрадром, у 1943 г. партызаны атрада імя Кірава напалі на аэрадром. У чэрвені 1944 г. фашысты часткова спалілі вёску. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 57 чалавек, знішчана 27 мірных жыхароў. Пасля вайны вёска адбудавана. У 1950 г. калгасы «Новы быт» і «Новы шлях» аб'ядналіся ў калгас «Бальшавік». У 1952 г. на базе пачатковай школы адкрыта сямігадовая школа. На 1.1.1998 г. 152 двары, 433 жыхары. Адміністрацыйныя будынкі, майстэрні, Дом культуры, бібліятэка, крама, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, жывёлагадоўчая ферма. У цэнтры вёскі помнік на ўшанаванне памяці 45 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1965 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна з вянком.

З артыкула В.Самцэвіча, надрукаванага ў часопісе «Наш край». 1928 г., № 8—9.

Вёска Дакудава да Кастрычніцкай рэвалюцыі падзялілася на дзве часткі: «мужыкоў» і «шляхтаў». «Шляхта» была эканамічна больш моцнай групай, але і кожная з гэтых груп была неаднолькавай па сваім сацыяльным складзе: некаторыя «мужыкі» былі багацей за сярэдняга «шляхціца» і некаторая частка «шляхты» не мела хлеба на цэлы год. У часы паншчыны мужыкі належалі спачатку да Радзівіла, а потым (з 40-х гадоў XIX ст.) да б.в.кн. Мікалая Мікалаевіча. Адбываць паншчыну хадзілі вярсты за $4\ ^1/_2$ у фальв. Валянцінава (цяпер «Галубы»). Пры вызваленні ад прыгону сяляне в. Дакудава атрымалі зямлю ў розных кавалках.

«Шляхта» — ранейшыя арандатары зямлі ў таго ж Мікалая Мікалаевіча. Мясцовыя старажылы апавядаюць: пры царыцы Ганне (якой не ведаюць) быў нейкі прыдворны дваранін Ходасаў, які з цягам часу абяднеў і распрадаў сваю маёмасць. Патомкі яго, не маючы сродкаў на пражыццё, сталі арандаваць у памешчыкаў фальваркі і сваімі ўласнымі рукамі апрацоўвалі зямлю. Адзін з іх зааранда-ваў зямлю ў Радзівіла па суседству з вёскай Дакудава. Вёска ў той час знаходзілася ў іншым месцы (цяпер уроч. «Старае Сяло»). Патомства разрасталася, зямля драбілася. З цягам часу патомкі Ходаса згубілі сваё дваранства і «хутар Дакудава». Замест грашовай платы за арэнду яны хадзілі адбываць некалькі дзён у месяц паншчыну у той жа самы фальв. Валянцінава. Але неяк, прыблізна каля 1855 г., яны сталі дамагацца, каб вярнуць сабе зноў дваранства, і ў 1861—62 гг. ім удалося гэтага дабіцца. Але з боку эканамічнага становішча жыццё іх не змянілася: яны засталіся арандатарамі ў Мік. Мік. да самай Лютаўскай рэвалюцыі.

У свой час насельніцтва вёскі складалася з некалькіх «прозвішч», з якіх першае месца

займалі Хадасевічы і Бараны. З цягам часу насельніцтва павялічвалася, наязджалі новыя гаспадары.

Насельніцтва вёскі займалася і займаецца пераважна сельскай гаспадаркай і мае ў сваім карыстанні 300 дзесяцін пахаці, 88 дз. сенажаці (на 60% балотнай) і 50 дз. выгану. Рэвалюцыя зямлі сялянам не дала з той прычыны, што паблізу не было ні зямель памешчыкаў, ні запасных. Зямля размяркоўвалася і размяркоўваецца наступным чынам:

Катэгорыі сялян	Лік кароў	Лік едакоў	Зямлі ўсіх відаў	Прыходзіцца ўсяго дз. на 1 душу	Коней	Кароў
Беззямельных	2	5	—	—	—	—
Ад 1 да 2 дз.	19	84	36	0,43	17	24
Ад 2 да 3 дз.	12	41	28	0,68	13	18
Ад 3 да 5 дз.	43	196	199	1,00	48	96
Ад 5 да 8 дз.	19	91	137	1,50	41	41
Ад 8 да 16 дз.	3	19	38	2,00	8	11
Усяго	98	436	438		127	190

Калі мы паглядзім, як размяркоўваецца зямля паміж асобнымі групамі насельніцтва, дык убачым наступную карціну:

Насельніцтва	Душ	Дз. пах. зямлі	Сенажаці	Выгану	Усяго дз. на адну душу
«Шляхта»	208	160	36	40	1,13
Сяляне	228	140	52	10	0,9
Усяго	436	300	88	50	

Пасля рэвалюцыі частка зямлі ад найбольш заможных перайшла да малазямельных. Эканамічная няроўнасць паступова знішчаецца, але «шляхта» яшчэ не пазбавілася сваіх «шляхецкіх» поглядаў і не зусім зліваецца з «мужыкамі» ў агульна-грамадскіх справах.

Землекарыстанне як у «шляхты», так і ў «мужыкоў» цераспалоснае. Але «шляхта» перад вайной 1914 г. правяла нейкае землебудаўніцтва: усё поле разбілі на чатыры змены, паменшыўшы лік і павялічыўшы велічыню палос. Тут на аднаго гаспадара прыходзіцца ад 6 да 8 кавалкаў пахаты і 3—4 кавалкі сенажаці. Велічыня розная: нарэзы («разы») ад $^1/_2$ да 3 дз. і «наддаткі» — ад $^1/_{10}$ да $^1/_2$ дз.

Другі выгляд у «мужыкоў»: тут пануе трохпалёўка. Некаторыя гаспадары, маючы 4 $^1/_2$ дз. зямлі, маюць да 20 кавалкаў пахаты і 12 кавалкаў сенажаці. Велічыня таксама ад $^1/_{40}$ да 1 дз.

Першы плуг з'явіўся на сяле прыблізна гадоў трыццаць—трыццаць пяць таму назад у досыць багатага селяніна з «шляхты». Гэтая «машына» адразу зацікавіла ўсю вёску, і калі запрэглі каня ў плуг, збеглася паўвёскі глядзець, як урачыста гаспадар гэтай «машыны» прагнаў баразну на гары ў самым сяле. На працягу 10—15 год саха ўжо скарыстоўвалася толькі ў асобных гаспадароў. На ўсё сяло ёсць 9 сох, якія скарыстоўваюцца толькі для абкапвання бульбы, дый то саха пачынае замяняцца асыпнікам.

Бароны ўжываюцца свайго вырабу: рамы драўляныя, а зуб'і жалезныя. Дзе-нідзе сустракаюцца бароны з драўлянымі зуб'ямі, якія скарыстоўваюцца для скараджэння бульбы.

Больш багатыя гаспадары маюць веялкі, саломарэзкі, малацілкі з прыводамі. Іншых машын, дзякуючы малазямеллю і вузкапалосіцы, — няма.

Усяго ёсць: веялак — 3, саломарэзак — 5, малацілак — 2, прыводаў — 2. Усе іншыя сельскагаспадарчыя прыводы, як косы, сярпы — усё гэта здабываецца ў сельскагаспадарчым складзе НКЗБ у Барысаве.

У гэтым годзе арганізавалася меліярацыйнае таварыства, якое задалася мэтай асушыць каля сотні дзесяцін балота пры самай вёсцы.

Аб кааперацыі насельніцтва мала чаго ведае. Ніякіх кааперацыйных устаноў не было і няма. У спажывецкіх таварыствах няма ніводнага члена з сялян. Такім чынам, з вёскі запісаліся толькі сябрамі с.-г. т-ва ў м. Крупкі 8 сялян вёскі. Усе тавары, патрэбныя для сваёй гаспадаркі, купляюць на рынку ў прыватных гандляроў. Часта прыходзіцца чуць скаргі на кааператывы за іх высокую цану на тавары.

Памяшканні трымаюцца брудна. Падлогу звычайна мыюць да такіх рэлігійных свят, як Каляды, Вялікдзень, Тройца, Пакроў. Праўда, у апошнія часы сяляне свае хаты будуюць на дзве паловы, з якіх першая з'яўляецца «чорнай», дзе спяць, працуюць, кормяць свіней і інш. жывёліну, а другую палову трымаюць больш чыста.

Лекавай дапамогі на месцы няма.

Да 90-х гадоў мінулага стагоддзя граматныя людзі ў вёсцы былі выключэннем. У па-

чатку 90-х гадоў у вёсцы адчынілася школа граматы.

К сучаснаму моманту мы маем наступную граматнасць у вёсцы 40 працэнтаў.

Якасць гэтай граматнасці вельмі нізкая, бо пераважная большасць граматных не скончыла нават школы граматы ці сучаснае аднакамплектнае школы.

Школа знаходзілася і знаходзіцца ў наёмных будынках, пераносіцца кожны год з адной хаты ў другую. Абсталяванне школы надзвычайна дрэннае, дзецям няма на чым сядзець.

Ні нардому, ні хаты-чытальні, ні бібліятэкі, ніякіх гурткоў у вёсцы няма.

Вясна, лета і восень праходзяць у напружанай працы на агародзе, полі, сенажаці. Працуюць ад усходу і да захаду сонца мужчыны, жанчыны і дзеці. Нядзеля — дзень адпачынку. Зрэдку хто наведваў царкву (за 7 вёрст), дзе можна было сустрэць знаёмых, пагаварыць. Маліцца мала хто маліўся, нават не ўсе і ў споведзь хадзілі. Мужчыны лічылі за лепшае сабрацца ды выпіць па паўбутэльцы. Зараз ужо і ў нядзелю працуюць, калі ёсць спешная работа.

Узімку калядамі моладзь збіраецца на вечарынкі, наладжвае ігрышчы. Вечарынкі з танцамі з'яўляюцца адзінай забавай для вясковай моладзі. Ніякіх іншых забаў няма. Ні спектакляў, ні хору, ні літаратурных ці палітычных вечароў вёска амаль што і не бачыла.

«Шляхоцкія» хлапцы, часамі не меўшыя ў гаспадарцы хлеба да новага ўраджаю, але ніколі на «мужыцкіх» не жаніліся. Лепш жаніўся які-небудзь захудалы «шляхцюк» на зусім няўдалай «шляхцянцы», чым на адной з лепшых «мужыцкіх» дзяўчат. Так і мяняліся дзве суседнія вёскі і паасобныя сем'і «шляхты» жанчынамі, з прычыны чаго амаль усе сем'і «шляхты» знаходзіліся паміж сабой у свяцтве. Гэтай замкнутасці ў «мужыкоў» зусім не было. Гэтыя перажыткі мінулага, выкліканыя ўсё ж нейкімі саслоўнымі прывілеямі «шляхты» (дваран), засталіся ў значнай меры і цяпер.

Рэлігійныя забабоны ў вёсцы глыбокіх каранёў не мелі. Насельніцтва к часам рэвалюцыі да царквы і папоў адносіліся больш фармальна. Моладзь яшчэ і раней досыць крытычна глядзела на ўсе абрады і падсмейвалася над старымі, якія слепа верылі папам.

Падрыхтаваў да друку Дз.М.Хромчанка.

ДАКУЧЫНО (Дакучын), вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Па паданні вёска размяшчалася на тракце, быў заезджы двор. Жыхары надакучліва прапаноўвалі свае паслугі, таму іх назвалі дакучынцамі, а вёску Дакучыно. Вядома з 1624 г., сяло Худаўскай воласці маёнтка Чарэя, уласнасць канцлера Льва Сапегі. У 1633 г. атрымаў у спадчыну яго сын Казімір Леў Сапега. У 1772 г. ў закладзе ў Салагуба, 28 двароў, 95 мужчын. У 1880 г. 66 двароў, 303 жыхары, у 1897 г. 384 двары, 440 жыхароў, школа пісьменнасці, хлебазапасны магазін, пастаялы двор. У 1917 г. вёска ў Лісічанскай воласці Сенненскага павета, 556 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Дакудаўскім сельсавеце Халопеніцкага раёна, з 1930 г. Чарэйскага, з 1931 г. Крупскага раёнаў, спачатку Вялікахальнявіцкага, потым Кастрычніцкага сельсаветаў. У 1929 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Прамень Леніна». У 1941 г. ў вёсцы 64 гаспадаркі, 321 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцамі спалена 25 гаспадарак, 34 жыхары забіты, 28 чалавек загінулі на фронце. Пасля вайны ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Дуброўка». На 1.1.1998 г. 47 гаспадарак, 99 жыхароў. Жывёлагадоўчая ферма.

ДВОР-ПЯРЭСІКА, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Вядома з 1546 г. ў выніку судовай справы аб валоданні ёю паміж нашчадкамі Івана Сямёнавіча Друцкага, Дзмітрыем і Андрэем. У пачатку 16 ст. Худаўскі маёнтак і вёску Двор-Пярэсіка выкупіў канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега, потым далучыў Худаўскую воласць да Чарэйскага маёнтка. У 1772 г. 25 двароў, уладанне Агінскага. У 1897 г. фальварак Пярэсіка ў складзе Лісічанскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 6 двароў, 51 жыхар. З 1924 г. ў складзе Узнацкага сельсавета Халопеніцкага раёна, з 1931 г. Крупскага, з 1935 г. Халопеніцкага, з 1960 г. Крупскага раёнаў. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны сцяг». У 1941 г. ў вёсцы 30 двароў, 163 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы размяшчаўся нямецкі гарнізон. На франтах вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 22 жыхары. У 1944 г. адноўлены калгас, у 1950 г. далучылася суседняя гаспадарка, створаны калгас «Шлях Леніна». З 1964 г. вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Прызыў». На 1.1.1998 г. 16 гаспадарак, 26 жыхароў.

ДВОРЫШЧА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Вядома з 18 ст. У 1772 г. 3 двары, належалі Агінскім. У Айчынную вайну 1812 г. вёска разбурана французамі. У 1873 г. 36 мужчын. у 1909 г. вёска ў складзе Бобр-

скай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 28 двароў, 169 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў складзе Бобрскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Зорка». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 16 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Чырвоны Бобр», з 1960 г. — саўгаса «Бобр», з 1967 г. — саўгаса «Колас», цяпер — калгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 29 гаспадарак, 66 жыхароў. Малочнатаварная ферма.

ДЗЯНЬГУБКА, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Вядома з канца 19 ст. У 1880 г. 16 двароў, 134 жыхары, у 1909 г. 27 двароў, 171 жыхар, у складзе Абчугскай воласці Сенненскага павета. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады — у Чарэйскім, потым у Крупскім раёнах. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Крупскай. У 1941 г. 14 двароў, 47 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 11 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Прагрэс», з 1960 г. — саўгаса «40 год Кастрычніка», з 1961 г. — саўгаса, потым — калгаса «Абчуга». На 1.1.1998 г. 4 гаспадаркі, 7 жыхароў.

ДОЎГАЕ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. З 20.8.1924 г. ў складзе Бобрскага сельсавета Крупскага раёна Барысаўскай акругі, з 9.6.1927 г. Крупскага раёна Мінскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 9 чалавек. З 1967 г. вёска ў складзе саўгаса «Колас», цяпер — калгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 8 гаспадарак, 16 жыхароў.

ДУБАВОЕ, вёска ў Дзянісавіцкім сельсавеце. Заснавана ў 2-й палове 18 ст. У 1772 г. засценак Барысаўскага маёнтка князя Радзівіла, 7 двароў. У пачатку 19 ст. 12 двароў, 106 жыхароў. У 1845 г. 12 двароў, 140 жыхароў, у 1897 г. 31 двор, 224 жыхары, млын. У 1909 г. ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 27 двароў, 259 жыхароў. У 1917 г. вёска, 47 двароў, 304 жыхары, побач аднайменны хутар, 1 двор, 5 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Шынкаўскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, потым Мінскай акруг. З 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 1954 г. ў Стараслабодскім, з 1964 г. ў Дзянісавіцкім сельсаветах. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «17-ы партз'езд». У 1941 г. ў вёсцы 40 двароў, 199 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 12 чалавек, знішчаны 1 мірны жыхар. Вёска амаль поўнасцю спалена. У 1944 г. адбудавана, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Чырвоны колас», з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», з 1963 г. — саўгаса, цяпер калгаса «Дзянісавічы». На 1.1.1998 г. 14 гаспадарак, 24 жыхары.

ДУБЕШНЯ, вёска ў Нацкім сельсавеце. У 1887 г. хутар, 2 двары, 7 жыхароў. У 1897 г. працаваў смалакурны завод. У 1908 г. ў складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 2 двары, 7 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Нацкім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 26.7.1930 г. Крупскага раёна, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1941 г. 14 двароў, 51 жыхар. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 2 чалавекі, 5 вяскоўцаў закатаваны фашысцкімі карнікамі. На 1.1.1998 г. 18 гаспадарак, 39 жыхароў.

ДУБРАЎКА, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў 1713 г., сяло Чарэйскага маёнтка Сапегаў, 25 двароў, 10 валок зямлі. У 1772 г. Дубраўка ў закладзе ў пана Салагуба, 20 двароў. У 1880 г. 40 два-



Помнік А.А.Парцянку і землякам у в. Дубраўка.

роў, 169 жыхароў. У 1897 г. адкрыта школа пісьменнасці. Да 1917 г. вёска ў складзе Лісічанскай воласці Сенненскага павета, 49 двароў, 276 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Халопеніцкім раёне Барысаўскай акругі, з 1931 г. ў Крупскім раёне, спачатку ў Дубаўскім, Вялікахальнявіцкім, потым у Кастрычніцкім сельсаветах. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны земляроб». У 1941 г. ў вёсцы 60 двароў, 271 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы фашысты спалілі 34 дамы, расстралялі 9 мірных жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 46 чалавек. Пасля вайны адбудавана, у складзе саўгаса, цяпер калгаса «Дубраўка». На 1.1.1998 г. 127 гаспадарак, 340 жыхароў. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, клуб, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, аддзяленне сувязі, крама, майстэрні, жывёлагадоўчая ферма. У цэнтры вёскі помнік земляку, Герою Савецкага Саюза А.А.Парцянку; помнік на ўшанаванне памяці 124 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1982 г. ўстаноўлены абеліск з барэльефамі героя і 4 нахіленыя стэлы.

ДУБЫ, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Каля вёскі захаваўся курганны могільнік (9 насыпаў), які сведчыць аб засяленні гэтай мясцовасці ў далёкай старажытнасці. Упершыню ўпамінаецца ў пісьмовых крыніцах у 1772 г., вёска, 7 двароў. У канцы 19 ст. 20 двароў, 141 жыхар. З 20.8.1924 г. цэнтр Чарэйскага сельсавета, потым Халопеніцкага раёна. З 1959 г. Дубаўскі сельсавет ліквідаваны, вёска ў складзе Кастрычніцкага сельсавета Крупскага раёна. У 1929 г. разам з жыхарамі в. Запуткі створаны калгас «Чырвоны шлях». У 1941 г. ў вёсцы 22 двары, 97 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска часткова спалена, загінулі 23 чалавекі. Пасля вайны адбудавана. З 1957 г. ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка». На 1.1.1998 г. 36 гаспадарак, 70 жыхароў. Бальніца, лясніцтва, бібліятэка, крама.

ДУДАРЫ, вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Вядома з 19 ст. У 1909 г. 8 двароў, 273 жыхары, школа пісьменнасці. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў складзе Чарэйскага, потым Крупскага раёнаў. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоныя Дудары». У 1941 г. ў вёсцы 34 двары, 148 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 8 чалавек. У 1942 г. фашысты спалілі 31 двор, знішчылі 5 жыхароў. Пасля вайны вёска адбудавана, створаны калгас «Шлях Леніна», вёска ў складзе саўгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 15 гаспадарак, 26 жыхароў.

ДУДЗІНКА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Аб засяленні гэтых месц у старажытнасці сведчыць курганны могільнік (11 насыпаў). Вядома з канца 19 ст. У 1897 г. вёска ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 18 двароў, 119 жыхароў. У 1917 г. вёска, 20 двароў, 146 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў складзе Грыцкавіцкага сельсавета Халопеніцкага раёна Барысаўскай, з 9.6.1927 г. Мінскай акруг, з 8.7.1931 г. Крупскага раёна, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага раёна, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 16.7.1954 г. у Слабодскім, з 26.8.1959 г. Халопеніцкім сельсаветах. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Леніна. У 1941 г. ў вёсцы 47 двароў, 183 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 5 чалавек. Пасля вайны адноўлена, у 1950 г. ў складзе калгаса «Чырвоны барацьбіт», з 1960 г. — саўгаса «Халопенічы», з 1965 г. — эксперыментальнай базы «Эса». На 1.1.1998 г. 33 гаспадаркі, 69 жыхароў. Крама.

ЕЛЕНКА (Я л е н к а), вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Заснавана ў 16 ст., належала маёнтку Падбярэззе. Каля 1590 г. вёску атрымаў у спадчыну Мікалай Падбярэзскі, потым Рафал Падбярэзскі, 9 двароў, 5 валок зямлі. У 1641 г. пасля смерці Р.Падбярэзскага ў закладзе ў Рыгора Абрамавіча Падбярэзскага. Да 1722 г. вёска, уласнасць пана Барташэвіча. Да канца 19 ст. 10 двароў, 67 жыхароў. З 1924 г. ў складзе Сакалавіцкага сельсавета, потым Бобрскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Ленінец», 17 двароў, 70 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 7 чалавек, вёска амаль поўнасцю спалена фашыстамі. Пасля вайны адбудавана, з 1950 г. ў складзе ўзбуйненага калгаса «Перамога», з 1960 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 5 гаспадарак, 7 жыхароў.

ЖУРАВЫ, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Па паданні назва яе звязана з суседнім возерам, якое з часам ператварылася ў балота, дзе жыло шмат жураўлёў. Заснавана ў 1772 г., 2 двары, уласнасць дробнага шляхціца Сідароўскага. У 1775 г. 8 двароў. У пачатку 20 ст. 34 двары, 223 жыхары. З 1924 г. ў складзе Чарэйскага, потым Крупскага раёнаў. У 1930-я гады жыхары вёсак Журавы, Слабада стварылі калгас «Светлая зара». У 1941 г. ў

вёсцы 36 двароў, 231 жыхар. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 10 чалавек. Пасля вайны ў складзе саўгаса, потым — калгаса «Слабада». На 1.1.1998 г. 41 гаспадарка, 142 жыхары.

ЗАБАЛОЦКАЕ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. З 20.8.1924 г. вёска ў складзе Бобрскага сельсавета Крупскага раёна Барысаўскай, з 9.6.1927 г. Аршанскай акругі, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 31.3.1977 г. Бобрскага пасялковага Савета. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 10 чалавек. З 1967 г. ў складзе саўгаса, потым — калгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 7 гаспадарак, 7 жыхароў.

ЗАБАЛОЦЦЕ, вёска ў Дзянісавіцкім сельсавеце. Заснавана ў 1670 г., засценак, 2 двары. У 1770 г. вёска, 20 двароў, больш за 150 жыхароў, 27 валок зямлі, за што плацілі магнатам Радзівілам. Паводле інвентару 1818 г. вяскоўцы мелі 25 коней, 45 кароў, свіней, авечак. У канцы 19 ст. ў вёсцы 47 двароў, 324 жыхары, у складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. З 1924 г. ў складзе Шынкаўскага, потым Дзянісавіцкага сельсаветаў Крупскага раёна. У час калектывізацыі створаны калгас імя Молатава. У 1941 г. ў вёсцы 61 двор, 302 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 18 чалавек. Пасля вайны ў складзе калгаса «Чырвоны колас», з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», з 1963 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Дзянісавічы». На 1.1.1998 г. 41 гаспадарка, 74 жыхары. Жывёлагадоўчая ферма.

ЗАБАРОЧЧА, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Заснавана каля 1750 г., у 1775 г. 13 двароў, у 1897 г. 24 двары, 212 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Чарэйскага, Халопеніцкага, з 1960 г. Крупскага раёнаў. У 1930-я гады створаны калгас імя К.Маркса. У 1941 г. ў вёсцы 42 двары, 215 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў 1942 г. спалена 37 двароў, загінулі 18 чалавек. Пасля вайны ў складзе саўгаса «Авангард». На 1.1.1998 г. 7 гаспадарак, 8 жыхароў.

ЗАБОР'Е, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў 1554 г., вёска Чарэйскага маёнтка, у 1624 г. уладанне канцлера Льва Сапегі ў Вялікім княстве Літоўскім, 23 валокі. Ва ўласнасці Сапегаў знаходзілася да канца 18 ст. У 1772 г. вёска, 19 двароў, у закладзе ў пана Салагуба. У 1880 г. 61 двор, 338 жыхароў, у 1909 г. 88 двароў, 608 жыхароў. Дзейнічалі народнае вучылішча, царква. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Чарэйскага, потым Крупскага раёнаў. У 1930 г. створаны калгас «Краіна Саветаў». У 1941 г. 72 двары, 310 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы быў размешчаны фашысцкі гарнізон, разгромлены партызанамі. Фашысты спалілі 29 двароў, загінулі 47 чалавек. Пасля вайны адбудавана, у складзе саўгаса, потым — калгаса «Абчуга». На 1.1.1998 г. 9 гаспадарак, 13 жыхароў. Крама.

ЗАБЯНЬКОВА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Вядома з пачатку 20 ст. У 1909 г. ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 30 двароў, 229 жыхароў. У 1917 г. 36 двароў, 241 жыхар. З 20.8.1924 г. вёска ва Ухвальскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Варашылава. У 1941 г. ў вёсцы 47 двароў, 189 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 30 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены. У 1950 г. да яго далучаны 4 калгасы, з 1959 г. вёска ў складзе саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 38 гаспадарак, 62 жыхары. Крама, жывёлагадоўчая ферма.

ЗАМКІ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Заснавана ў канцы 19 ст. З 1924 г. ў складзе Бобрскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны Бобр». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 20 чалавек. Цяпер цэнтр саўгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 135 гаспадарак, 443 жыхары. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, гандлёвы цэнтр, аддзяленне сувязі, комплекс сацыяльна-культурных пабудоў.

ЗАПОЛЛЕ, вёска ў Нацкім сельсавеце. Вядома з 2-й паловы 19 ст. У 1870 г. ў вёсцы 48 мужчын, у 1897 г. 20 двароў, 167 жыхароў, у 1917 г. ў складзе Вяляціцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 35 двароў, 227 жыхароў. У 1929 г. жыхары Заполля і суседніх вёсак Язвіны і Ніва аб'ядналіся ў калгас «Чырвоная ніва». У 1941 г. ў вёсцы 55 двароў, 289 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 26 чалавек, 9 мірных жыхароў расстраляны фашыстамі. Вызвалена 29 чэрвеня 1944 г. У 1944 г. адноўлена, з 1950 г. ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Молатава, з 1951 г. — «Камунар». 12.11.1966 г. далучаны вёскі Язвіны і Чырвоная Ніва. На 1.1.1998 г. 26

гаспадарак, 52 жыхары. Жывёлагадоўчая ферма. У цэнтры вёскі ў 1967 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці 31 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЗАПРУДДЗЕ, вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце. Заснавана ў 2-й пал. 19 ст. У 1870 г. ў вёсцы 5 мужчын, у 1897 г. 18 двароў, 120 жыхароў. У 1917 г. вёска ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 36 двароў, 171 жыхар. З 20.8.1924 г. вёска ў Бараньскім сельсавеце Халопеніцкага раёна Барысаўскай, з 9.6.1927 г. Мінскай акруг, з 26.7.1930 г. Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Барысаўскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага раёнаў, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 26.8.1959 г. ў складзе Траянаўскага сельсавета (Маісеяўшчынскага), з 20.1.1960 г. — Хацюхоўскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвонае запруддзе». У 1941 г. ў вёсцы 55 двароў, 289 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы дзейнічала падпольная група. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 26 чалавек, фашысты знішчылі 9 мірных жыхароў. Пасля вайны адноўлена, з 1963 г. ў складзе калгаса «Знамя камунізму», цяпер — калгаса «Чырвоны Кастрычнік». На 1.1.1998 г. 26 гаспадарак, 67 жыхароў.

ЗАПУТКІ, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў 1713 г., 17 гаспадарак, 8 валок зямлі. З 1772 г. ў закладзе ў пана Салагуба, у 1775 г. 10 двароў. У пачатку 20 ст. 34 двары, 225 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Чарэйскага, Халопеніцкага, Крупскага раёнаў. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны май», пасля вайны ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка». У 1941 г. ў вёсцы 40 двароў, 158 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 27 чалавек. На 1.1.1998 г. 30 гаспадарак, 55 жыхароў. Крама.

ЗАРАСЛІ, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Вядома з канца 19 ст. У 1897 г. 7 двароў, 53 жыхары. У 1917 г. вёска ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 24 двары, 139 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Халопеніцкім сельсавеце Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў. У 1930-я гады жыхары вёскі аб'ядналіся ў калгас. У 1941 г. ў вёсцы 7 двароў, 20 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінуў 1 чалавек. Зараз вёска ў складзе калгаса «Якімаўка». На 1.1.1998 г. 4 гаспадаркі, 7 жыхароў.

ЗАРОЎЕ, вёска ў Крупскім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў пачатку 19 ст. У Айчынную вайну 1812 г. спалена французамі. Уласнасць Лявона Вікенцьевіча Галузы. У 1909 г. ў Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 25 двароў, 205 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Шэйкаўскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 26.7.1930 г. Крупскага раёна, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 5.5.1962 г. ў Крупскім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Новы мір». У 1941 г. ў вёсцы 44 двары, 127 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы быў размешчаны фашысцкі гарнізон. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 26 чалавек, фашысты знішчылі 5 мірных жыхароў. Пасля вайны адноўлена, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Калініна. На 1.1.1998 г. 46 гаспадарак, 99 жыхароў. Крама. Каля вёскі садова-агароднае таварыства.

ЗАХАРАЎКА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Вядома з 1870 г. У 1897 г. 33 двары, 283 жыхары, у 1917 г. ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 48 двароў, 335 жыхароў. З 9.8.1924 г. вёска ва Ухвальскім сельсавеце Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 4.1.1964 г. Дзянісавіцкага, з 13.7.1972 г. Ухвальскага сельсаветаў. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоная зорка». На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінуў 31 чалавек. У 1944 г. адноўлена, з 1950 г. ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Варашылава, з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 36 гаспадарак, 56 жыхароў. Крама.

ЗНАМЕНСКАЯ (да 1964 г. Гібайлавічы, Агібайлавічы), вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў 1-й палове 17 ст. ва ўладанні барысаўскага старасты Адама Казаноўскага ў Барысаўскім старостве. У 1639 г. перайшла да Марціміль-яна Крахоўскага, потым да Ераніма Ліпскага, 16 двароў. У 1764 г. 7 двароў, цэнтр Гібайлавіцкага староства, уладанне Ю.Храптовіча. У 1795 г. 13 двароў, 89 жыхароў, уладанне В.Беліковіч. У 1870 г. ў вёсцы 110 мужчын, у 1904 г. ў складзе Дзмітрыевіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 38 двароў, 301 жыхар. У 1917 г. 60 двароў, 360 жыхароў. У 1912 г. адкрыта народнае вучылі-

шча. З 20.8.1924 г. вёска ва Ухвальскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Куйбышава. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 23 чалавекі, фашысты знішчылі 21 мірнага жыхара. Вёска была часткова спалена. У 1944 г. адбудавана. З 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Кірава, з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 50 гаспадарак, 95 жыхароў. Крама. Каля будынка школы брацкая магіла, пахаваны 28 воінаў, якія памерлі ад ран у медсанбаце летам 1944 г. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ІГРУШКА, вёска, цэнтр сельсавета. Упершыню ўпамінаецца ў 1528 г., маёнтак ва ўладанні Івана Друцкага-Сакалінскага, які ў той час ахвяраваў частку даходаў Кіева-Пячэрскаму манастыру. У 1557 г. маёнтак атрымалі па завяшчанні сыны князя Андрэя Друцкага-Азярэцкага. З 1560 г. ў дзяржаўнай воласці Аршанскага замка. У 1627 г. маёнтак, вылучаны князем Сымонам Самуэлем Сангушкам на забеспячэнне сваёй жонкі Алены Корвін-Гасеўскай, потым сяло князёў Сангушкаў. У 1775 г. ўваходзіла ў маёнтак «Шыйка» князёў Сангушкаў, 72 «дымы», адзін належаў мясцовай праваслаўнай царкве, якая была пабудавана ў 1650 г. У 1885 г. сяло ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 93 двары, 622 жыхары. Дзейнічалі праваслаўная царква, народнае вучылішча (1869), пастаялы двор, вінная лаўка. Жыхары займаліся ганчарным, кавальскім, кравецкім і калёсным промысламі. У 1909 г. 182 двары, 1093 жыхары. З 20.8.1924 г. ў складзе Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Шлях Сталіна». У 1941 г. ў вёсцы 180 двароў, 712 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы размяшчаўся фашысцкі гарнізон. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 96 вяскоўцаў. У час акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі вёска часткова спалена, знішчана 48 мірных жыхароў. У 1950 г. далучаны суседнія вёскі, у снежні 1960 г. ў калгасе «Шлях Сталіна», потым у складзе калгаса «Гігант», з сакавіка 1960 г. — саўгаса «Халопенічы», з 1961 г. вёска, цэнтр саўгаса «Грушаўскі». На 1.1.1998 г. 186 гаспадарак, 438 жыхароў. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, бальніца, крама, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, дзіцячыя сад-яслі, 3 вытворчыя будынкі, майстэрні, жывёлагадоўчая ферма. Каля вёскі ў 1967 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ІГРЫШЧА, вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце. Заснавана ў 2-й палове 17 ст. У 1670 г. ў складзе Барысаўскага староства, 2 двары. У 1764 г. 13 двароў, у 1795 г. 25 двароў, 195 жыхароў. У 1845 г. ў складзе маёнтка «Барысаўшчына» князёў Радзівілаў, 27 двароў, 141 жыхар. У 1897 г. ў складзе Зачысцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 52 двары, 347 жыхароў, карчма. У 1917 г. ў вёсцы 60 двароў, 394 жыхары, на хутары 1 двор, 5 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Бальшавік». У 1941 г. ў вёсцы 54 двары, 293 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 42 чалавекі, знішчана 18 мірных жыхароў. У 1944 г. адноўлена, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Бальшавік», з 1959 г. — калгаса «Чырвоны Кастрычнік», з 1963 г. — «Праўда». На 1.1.1998 г. 24 гаспадаркі, 80 жыхароў. Фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая.

КАЗУБЕЦ, вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце. Заснавана ў 1670 г., 1 двор. У 1764 г. ў Барысаўскім старостве, 9 двароў. У 1795 г. 14 двароў, 97 жыхароў, з іх палову складала шляхта. У 1805 г. ў складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 15 двароў. У 1818 г. 8 двароў, 39 жыхароў, маёнтак князя Радзівіла. У 1897 г. 15 двароў, 96 жыхароў, на хутары 4 двары, 60 жыхароў. У 1917 г. ў вёсцы 21 двор, 140 жыхароў, на хутары 5 двароў, 49 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў Мінскай вобласці. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Сталіна. У 1941 г. ў вёсцы 30 двароў, 170 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 6 чалавек, знішчаны 4 мірныя жыхары. У 1944 г. адноўлена, з 1950 г. ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Сталіна, у 1957 г. перайменаваны ў калгас «Сцяг камунізму», цяпер вёска ў складзе калгаса «Чырвоны Кастрычнік». На 1.1.1998 г. 36 жыхароў. Жывёлагадоўчая ферма.

КАЛІНАЎКА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Вядома з пачатку 20 ст., у Халопеніцкай воласці. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Халопеніцкім, потым Крупскім раёнах. У 1941 г. 7 двароў, 37 жыхароў, у складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Халопенічы». На 1.1.1998 г. 2 гаспадаркі, 5 жыхароў.

КАЛОДНІЦА, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў 1562 г., вёска, уладанне князя Друцкага-Азярэцкага, які перадаў яе ў валоданне пасынкам князя Рыгора Сенскага. У 1775 г. ў вёсцы 31 «дым», каля 200 жыхароў. У 1897 г. 109 двароў, 800 жыхароў. У 1880 г. 73 двары, 567 жыхароў, праваслаўная царква, ветраны млын, хлебазапасны магазін, пастаялы двор, вінная лаўка. Пасля 1924 г. ў складзе Чарэйскага, Халопеніцкага, потым Крупскага раёнаў. У 1930-я гады створаны калгас «Правднік». У 1941 г. ў вёсцы 103 гаспадаркі, 512 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну спалены 12 дамоў, знішчана 20 мірных жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 46 чалавек. Вёска — цэнтр саўгаса «Авангард». На 1.1.1998 г. 117 гаспадарак, 318 жыхароў. Пачатковая школа, бібліятэка, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, крама, царква.

КАЛЫБАНАВА, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Заснавана каля 1750 г. У 1775 г. 20 «дымоў». У пачатку 20 ст. 27 двароў, 225 жыхароў. Пасля 1917 г. ў Чарэйскім, з 1931 г. ў Крупскім раёнах. У час калектывізацыі створаны калгас «Камуністычны шлях». У 1941 г. ў вёсцы 38 двароў, 149 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 19 чалавек. У час акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі вёска была часткова спалена, знішчаны 4 мірныя жыхары. Пасля вайны адбудавана, з 1950 г. ў складзе калгаса «Чырвоны Кастрычнік», з 1965 г. — саўгаса «Слабада». На 1.1.1998 г. 3 гаспадаркі, 4 жыхары.

КАМЕНКА, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Вядома з канца 19 ст. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Ігрушкаўскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930-я гады на тэрыторыі вёскі была створана машынна-трактарная станцыя, якая пазней была пераўтворана ў рамонтна-трактарную, а потым — у ПМК-67. У 1941 г. 20 двароў, 80 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 15 чалавек, знішчаны 4 мірныя жыхары, спалены 1 дом. На 1.1.1998 г. 209 гаспадарак, 650 жыхароў. Пачатковая школа, крама.

КАРАЛЁВА, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з канца 19 ст. У 1897 г. вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 23 двары, 146 жыхароў. У 1909 г. 24 гаспадаркі, 149 жыхароў, стараверская царква. З 20.8.1927 г. вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Сталіна. У 1941 г. ў вёсцы 28 двароў, 94 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 5 чалавек. Пасля вайны адноўлена, з 1950 г. ў складзе калгаса «Шлях Сталіна», са студзеня 1960 г. — калгаса «Гігант» Халопеніцкага раёна, з сакавіка 1960 г. — саўгаса «Халопенічы», з 1961 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Грушаўскі». На 1.1.1998 г. 17 гаспадарак, 42 жыхары.

КАРПАЎКА, (да 1978 г. Асінаўка), вёска ў Крупскім сельсавеце. З 24.5.1878 г. засценак Асінаўка (Карпавічы). У 1894 г. 3 двары, 17 жыхароў, у 1909 г. 4 двары, 25 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Крупскага раёна. У 1930-я г. жыхары вёсак Карпаўка, Майск і Лебедзева стварылі калгас «Май». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 6 чалавек. Пасля вайны ў складзе ўзбуйненага калгаса «Бальшавік», з 1960 г. — калгаса імя Калініна. На 1.1.1998 г. 24 гаспадаркі, 47 жыхароў.

КАРПУШОЎКА, вёска ў Крупскім сельсавеце. У 1897 г. хутар, 1 двор, 24 жыхары. У 1909 г. засценак у складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, прыватная ўласнасць, 22 двары, 24 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг. З 2.7.1930 г. ў Крупскім раёне, з 20.2.1938 г. ў Мінскай вобласці, з 28.7.1954 г. ў Крупскім сельсавеце. У 1929 г. жыхары вёсак Карпушоўка і Усцінаўка аб'ядналіся ў калгас «Новы лад». У час Вялікай Айчыннай вайны загінулі 6 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Ленінец», у 1951 г. перайменаваны ў калгас імя Леніна. На 1.1.1998 г. 2 гаспадаркі, 3 жыхары.

КАСТРЫЧНІК (да 1918 г. Ламское), вёска ў Абчугскім сельсавеце. З 1924 г. ў складзе Барысаўскай акругі, З 1927 г. — ў Чарэйскім, з 8.7.1931 г. — ў Крупскім раёнах. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны Кастрычнік». У 1941 г. ў

вёсцы 28 двароў, 145 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 10 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены. З 1960 г. ў складзе саўгаса «Бобр». Цяпер вёска ў складзе калгаса «Слабада». На 1.1.1998 г. 6 гаспадарак, 9 жыхароў.

КАСЯНІЧЫ (Касінічы), вёска ў Абчугскім сельсавеце. Упамінаецца ў пачатку 16 ст., уваходзіла ў Чарэйскі маёнтак, уладанне князя Фёдара Фёдаравіча Сахалінскага-Каноплі. У 1554 г. ўласнасць Фёдара Уладыкі (у пасаг даў князь сваёй дачцэ Альжбеце Касініч). Уладыкі валодалі сялом на працягу 16 ст. У 1880 г. ў сяле 63 двары, 452 жыхары, праваслаўная царква, пабудаваная ў 1669 г. У 1897 г. ў Высокагарадзецкай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 110 двароў, 730 жыхароў, дзейнічалі кузня, царква, пастаялы двор, царкоўнапрыходская школа. У пачатку 20 ст. вёска, 124 двары, 785 жыхароў належала памешчыку Галаўдзевічу. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады — у складзе Чарэйскага раёна, потым Крупскага. У гэты час у Касянічы ўваходзілі 23 пасёлкі і хутары. Сярод іх: Гавары, Горкі, Майскі, Жданоўка, Малыя Касянічы, Вялікія Касянічы, Васелькава, Гарадок, Красная Дубрава, Барысаўка, Марозаўка, Іскра, Дон, Рабіннікі, Кіслая Гара, Краснае, Блындаўка, Пятроўка, Байкал. У 1939—40 гг. хутары былі сселены ў цэнтр. У 1941 г. ў вёсцы 243 двары, 894 жыхары. У 1930-я гады створаны калгас «Новы буд» (старшыня Нічыпар Баравік). У Вялікую Айчынную вайну вёска часткова спалена. На франтах і ў партызанскай барацьбе загінулі 106 чалавек, знішчана 25 мірных жыхароў. Пасля вайны вёска адбудавана, з 1957 г. ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка», з 1965 г. — цэнтр саўгаса, потым — калгаса «Касянічы». На 1.1.1998 г. 184 гаспадаркі, 342 жыхары. Пачатковая школа, клуб, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, аддзяленне сувязі, крама. Каля вёскі ў 1968 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці 44 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

КІРАВА (да 1918 г. Рыкаўка), пасёлак у Абчугскім сельсавеце. У 1888 г. сюды пераехалі жыць некалькі сем'яў з Літвы. Яны купілі зямлю ў памешчыка са Слабадскога маёнтка, грошы ўзялі з банка, потым доўга выплочвалі доўг. Літоўцы пабудавалі на купленай зямлі хаты, вёску назвалі Рыкаўка, таму што, як кажуць старажылы, непадалёку знаходзіўся вялікі лес, адкуль часам было чуваць рыканне мядзведзяў. У гады калектывізацыі вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Светлая зара». На 1.1.1998 г. 2 гаспадаркі, 2 жыхары.

КІЯВЕЦ, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Размешчана на месцы старажытнага гарадзішча. Першыя звесткі адносяцца да 1562 г. Уладанне князя Друцкага-Талачынскага. У 1950 г. маёнтак Коханава, у які ўваходзіла вёска, купіў Леў Сапега. Вёска стала цэнтрам Кіявецкага войтаўства. У пачатку 18 ст. 27 двароў. У гады Паўночнай вайны мясцовасць была знішчана войскамі, засталося 17 двароў. Кіявецкае войтаўства ў закладзе ў Ігнація Агінскага, у 1700 г. яго выкупіў Сапега. У 1909 г. ў Абчугскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 45 двароў, 309 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Чарэйскага, з 1931 г. — Крупскага раёнаў. У час калектывізацыі створаны калгас «10 год КІМа». У 1941 г. 59 двароў, 292 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 24 чалавекі. У час акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі вёска была часткова спалена, знішчана 25 мірных жыхароў. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Барэц», потым — саўгаса, цяпер — калгаса «Абчуга». На 1.1.1998 г. 87 гаспадарак, 184 жыхары. Крама, жывёлагадоўчая ферма.

КЛАДЗІ, вёска ў Нацкім сельсавеце. З 20.8.1924 г. вёска ў Нацкім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай акругі, з 20.2.1938 г. ў Мінскай вобласці. У 1929 г. жыхары вёсак Кладзі, Нача, Барок аб'ядналіся ў калгас «Новая Нача». У 1940 г. 18 двароў, 86 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 7 чалавек, 15 мірных жыхароў расстралялі фашысты. З 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Камунар». На 1.1.1998 г. 10 гаспадарак, 18 жыхароў.

КЛЁН, вёска ў Дакудаўскім сельсавеце. Упершыню згадваецца ў 1641 г., у Барысаўскім старостве. У 1643 г. пабудаваны касцёл. У 1775 г. належала плябаніі Барысаўскага касцёла, 15 двароў. У 1795 г. 17 двароў, 205 жыхароў. У 1897 г. ў складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 46 двароў, 310 жыхароў. У 1909 г. 59 двароў, у 1912 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1917 г. вёска, 57 двароў, 373 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Малажаберыцкім сельсавеце Крупскага раёна, з 13.9.1982 г. ў Дакудаўскім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас. У 1941 г. ў вёсцы 56 двароў, 210 жыхароў. На франтах Вялікай

Айчыннай вайны загінулі 24 вяскоўцы, знішчана 6 мірных жыхароў. Цяпер вёска ў складзе калгаса «Бальшавік». На 1.1.1998 г. 22 гаспадаркі, 50 жыхароў. Крама, жывёлагадоўчая ферма.

КЛІШАНА, вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Заснавана каля 1770 г. на месцы старадаўняга гарадзішча, 6 двароў. У пачатку 20 ст. засценак Лісічанскай воласці Сенненскага павета, 12 двароў, 100 жыхароў. Пасля 1924 г. ў Чарэйскім, Халопеніцкім, з 1960 г. ў Крупскім раёнах. У 1930 г. створаны калгас «Шлях Леніна». У 1941 г. 26 двароў, 122 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну знішчана 13 чалавек, спалена 1 пабудова. Цяпер вёска ў складзе саўгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 30 гаспадарак, 71 жыхар.

КЛУБЫНІЧЫ, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Вядома з 1561 г., сяло, належала Чарэйскаму манастыру. Доўгі час было пад апекай нашчадкаў Сапегаў. У 1775 г. 9 «дымоў». У 1880 г. 28 двароў, 188 жыхароў. У пачатку 20 ст. ў складзе Высокагарадзецкай воласці Сенненскага павета, 49 двароў, 314 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Чарэйскім, з 1931 г. ў Крупскім раёнах. У 1941 г. ў вёсцы 50 двароў, 250 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінуў 31 чалавек. З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка», з 1965 г. — саўгаса, потым — калгаса «Касянічы». На 1.1.1998 г. 34 гаспадаркі, 51 жыхар. Крама.

КЛЯНОВІЧЫ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 19 ст. У 1917 г. 18 двароў, 141 жыхар. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Шэйкаўскага, потым Бобрскага сельсаветаў Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Дзяржынскага, да яго далучыліся 5 суседніх вёсак. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 16 чалавек. З 1960 г. ў складзе саўгаса «Бобр», з 1967 г. — саўгаса «Колас», цяпер — калгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 22 гаспадаркі, 39 жыхароў. Крама.

КОЛАС (да 1962 г. К а ў п ы н і ц а), вёска ў Нацкім сельсавеце. Заснавана каля 1670 г., вёска Барысаўскага староства, 2 дварэ. У 1781 г. 3 дварэ, у 1795 г. 5 двароў, 25 жыхароў, з іх 18 шляхта. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ў складзе Вяляціцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1870 г. маёнтак, з 1897 г. в. Каўпыніца, 31 двор, 240 жыхароў, у 1917 г. ў в. Каўпыніца 1-я 24 дварэ, 163 жыхары, у в. Каўпыніца 2-я 16 двароў, 110 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Нацкім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. ў Мінскай вобласці. У 1929 г. жыхары вёсак Колас і Малое Восава аб'ядналіся ў калгас «1-я Пяцігодка». У 1940 г. ў вёсцы 51 двор. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 11 чалавек, аднаго мірнага жыхара расстралялі фашысты. Цяпер вёска ў складзе калгаса «Камунар». На 1.1.1998 г. 58 двароў, 149 жыхароў. Крама, комплексны прыёмны пункт, жывёлагадоўчая ферма. У цэнтры вёскі ў 1967 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

КРАСНАВІНКА, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Заснавана каля 1775 г., 6 двароў. У 1880 г. 11 двароў, 101 жыхар. У 1909 г. 23 дварэ, 249 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Заборскім сельсавеце Чарэйскага, з 8.7.1931 г. Крупскага раёнаў. У 1930-я гады створаны калгас «Новы шлях». У 1941 г. 30 двароў, 100 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 43 чалавекі. Пасля вайны калгас адноўлены. З 1965 г. вёска ў складзе саўгаса «Касянічы». На 1.1.1998 г. 12 гаспадарак, 14 жыхароў.

КРАСНОЎКА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Вядома з 19 ст. У 1908 г. 24 дварэ, 175 жыхароў, у складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета. З 1924 г. ў Сакалавіцкім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Ударнік». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 25 чалавек. Пасля вайны вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Чырвоны сцяг», з 1958 г. — калгаса імя Леніна, з 1960 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 18 гаспадарак, 27 жыхароў.

КРАСНОЎКА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. У 1897 г. ў вёсцы 14 двароў, 115 жыхароў, у 1909 г. ў складзе Красналуцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 24 дварэ, 175 жыхароў, у 1917 г. 35 двароў, 188 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Грыцкавіцкім сельсавеце Халопеніцкага раёна. 16.7.1954 г. Грыцкавіцкі сельсавет перайменаваны ў Слабодскі (26.8.1959 г. ліквідаваны). У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Ільіча». У 1941 г. ў вёсцы 29 двароў, 112 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 8 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. далучаны да калгаса імя Варашылава (в. Баркі), у 1958 г. перайменаваны ў калгас імя Фрунзе, з 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Халопенічы», з 1965 г. —

эксперыментальнай базы «Эса». На 1.1.1998 г. 23 гаспадаркі, 48 жыхароў.

КРУГЛІЦА, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Вядома з пачатку 20 ст. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Узнацкага сельсавета Халопеніцкага, з 1931 г. Крупскага, з 1935 г. Халопеніцкага раёнаў, з 16.7.1954 г. ў складзе Ігрушкаўскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас «Шлях Леніна». У 1941 г. ў вёсцы 25 двароў, 206 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 27 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. аб'яднаўся з суседнім калгасам, з 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Халопенічы», з 1964 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Прызыў». На 1.1.1998 г. 14 гаспадарак, 21 жыхар.

КРУПКІ (Крупка, Сангушкаў), горад, цэнтр раёна. Назва паходзіць ад р. Крупка (правы прыток р. Бобр). З сярэдзіны 16 ст. мястэчка ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага, уласнасць Сангушкаў. Згадваецца як мястэчка на карце Т.Макоўскага, выдадзенай у Амстэрдаме ў 1613 г. У 1627 г. адзін з маёнткаў у Аршанскім павеце быў вылучаны князем Сангушкам Сымонам Самуэлем сваёй жонцы Алене Корвін-Гасеўскай. У 1667 г. Крупкі ў закладзе ў Шваба Шванскага, 60 «дымоў», млын. Пасля мястэчка маёнтка Шыйка, князёў Сангушкаў, у 1790 г. ў закладзе ў Крыштафа Мяскоўскага, 82 «дымы». З 1793 г. ў складзе Расійскай імперыі, у Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У Айчынную вайну 1812 г. часткова спалена французамі. У 1859 г. пабудаваны млын з сукнавальняй (у 1861 г. — 17 рабочых, выраблена каля 30 тысяч пудоў мукі ў год). У 1861 г. мястэчка, 701 жыхар. У 1865 г. пабудавана царква. У лістападзе 1871 г. каля мястэчка прайшла лінія Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, была паштовая станцыя. У 1885 г. мястэчка Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, піваварны завод, 2 млыны, 24 лаўкі, карчма, царква, 3 яўрэйскія малітоўныя школы, сінагога, уладанне К.Свяцкага. У 1896 г. пабудавана запалкавая фабрыка, у 1900 г. працавалі 52 рабочыя, у 1900 г. — лесапільны завод (16 рабочых). У 1897 г. ў мястэчку 186 двароў, 1523 жыхары, вадзяны млын, сукнавальня, 7 кузняў, скураны, маслабойны заводы, паштова-тэлеграфнае аддзяленне, царкоўнапрыходская школа, царква, сінагога, 4 яўрэйскія малітоўныя дамы, 24 лаўкі, карчма, пастаялы двор, аптовавінны склад, кірмашы 29 жніўня і 9 снежня. У 1905—07 гг. баставалі рабочыя запалкавай фабрыкі і лесапільнага завода. У 1910 г. ў мястэчку 190 дамоў, 1809 жыхароў. У 1917 г. дзейнічаў местачковы Савет. З 26.2 да 21.11.1918 г. акупіраваны германскімі войскамі. З 1919 г. ў Віцебскай губерні, з 1923 г. ў Аршанскім павеце. З 1924 г. цэнтр Крупскага раёна, Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 1938 г. Мінскай вобласці. У 1926 г. ў мястэчку 2097 жыхароў. Дзейнічалі пасуднаганчарны завод, лесапільны, запалкавы, шкіпінарна-смалакурны, маслабойны заводы, швейная арцель «Перамога». У 1930-я гады створаны саўгас «Крупкі» (103 рабочыя, 1680 га зямлі), у 1933 г. заснаваны дрэваапрацоўчая арцель «Ударнік», ільнозавод, кузнечная арцель «Чырвоны молат», хлебапякарня, кравецкая арцель «14 год Кастрычніцкай рэвалюцыі», машынна-трактарная станцыя (у 1935 г. — 39 трактароў), агульнаадукацыйная школа, ветэрынарны тэхнікум (у 1933 г. — 115 навучэнцаў і 9 выкладчыкаў). З 1938 г. ў Мінскай вобл., з 27.9.1938 г. — гарадскі пасёлак. У 1939 г. 3455 жыхароў. З 1.7.1941 г. да 28.6.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія загубілі тут 1800 грамадзян. У час акупацыі ў Крупках знаходзіліся ўправа, нямецкі гарнізон, канцэнтрацыйны лагер. У 1942 г. на тэрыторыі Крупак расстраляна 100 заложнікаў са ст. Слаўнае. У Крупках дзейнічала патрыятычнае падполле. 28.6.1944 г. воіны 18-й, 3-й гвардзейскіх танкавых брыгад, 2-й гвардзейскай мотастралковай, 83-й стралковай брыгад вызвалілі гарадскі пасёлак ад акупантаў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 340 чалавек. Увосень 1944 г. пачалі працаваць прамысловы камбінат, скураны, цагельны заводы, крыху пазней шавецкая арцель, МТС, радыёвузел, тэлефонна-тэлеграфная станцыя, раённая бальніца, дзіцячы дом і інш. У перыяд 5-й пяцігодкі (1951—55) пабудаваны універмаг, культмаг, кніжны магазін, хлебазавод, кінатэатр. У перыяд 7—8-й пяцігодак (1961—65, 1966—70) пабудаваны жылыя кварталы, вытворчыя майстэрні райсельгастэхнікі, плодаагароднінны завод, школы і інш. У 1980-я гады пабудавана новая бальніца. З 1991 г. гарадскі пасёлак атрымаў статус горада. На 1.1.1998 г. 10 223 жыхары. Дрэваапрацоўчы камбінат, ільнозавод, ляс̀гас, плодаагароднінны завод, 3 сярэднія музычныя школы, 2 дамы культуры, 2 бібліятэкі, бальніца, раённы вузел сувязі, 4 банкаўскія ўстановы, раённыя службы кіравання, райспа-

жыўсаюз, 8 устаноў грамадскага харчавання, кінатэатр, Дом дзіцячай творчасці, фізкультурна-аздараўленчы комплекс, 3 дзіцячыя сады, народны музей, Дом быту, аптэка, крамы і інш. На могілках брацкая магіла партызан, савецкіх воінаў. Каля вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму. Пахаваны 119 воінаў і партызан, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і мірныя жыхары пасёлка, расстраляныя гітлераўцамі ў 1942 г. Сярод пахаваных — воіны 5-й гвардзейскай танкавай арміі і 10-га гвардзейскага Кіеўскага бамбардзіровачнага авіяпалка, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні пасёлка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск. Радзіма Героя Савецкага Саюза У.М.Марцінкевіча.

КРУПСКІ, пасёлак, цэнтр сельсавета. Паводле пісьмовых крыніц вядомы ў канцы 19 ст. У 1885 г. чыгуначная станцыя, 9 двароў, 90 жыхароў, побач хутар, двор, 10 жыхароў, уладанне К.Свяцкага. У 1906 г. чыгуначная станцыя Крупка Бобрскай воласці, 55 двароў, 322 жыхары, а таксама хутар, двор, 7 жыхароў, карчма. У 1917 г. пасёлак і чыгуначная станцыя, 35 двароў, 344 жыхары. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Крупскага сельсавета Крупскага раёна, працавала сярэдняя школа. У 1941 г. ў пасёлку 140 двароў, 684 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну ў пасёлку размяшчаўся нямецкі гарнізон, дзейнічала падпольная патрыятычная група. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 96 чалавек. У час акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі знішчаны 54 мірныя жыхары, партызаны і падпольшчыкі. Пасёлак быў часткова спалены. Пасля вайны адбудаваны. На 1.1.1998 г. 1058 жыхароў. Сярэдняя школа, лясніцтва, лясгас, аддзяленне сувязі, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, кафэ, бар, 4 крамы і інш. Радзіма Героя Савецкага Саюза М.Я.Зайцава.

КРЫШТОПАЎШЧЫНА, вёска ў Дакудаўскім сельсавеце. Заснавана каля 1775 г. ў Барысаўскім старостве. У 1795 г. 3 двары, 21 жыхар. У 1818 г. 4 двары, маёнтак князёў Радзівілаў, у 1845 г. 5 двароў, 34 жыхары. У 1909 г. вёска ў складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 19 двароў, 132 жыхары. У 1917 г. 14 двароў, 106 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска Малажаберыцкага сельсавета Крупскага раёна, з 13.9.1982 г. Дакудаўскага сельсавета. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Сталіна. У 1941 г. ў вёсцы 26 двароў, 76 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 13 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Панамарэнкі (цэнтр в. Жаберычы), з 1958 г. — «За мір», цяпер — калгаса «Бальшавік». На 1.1.1998 г. 11 гаспадарак, 23 жыхары.

КУПЛЕНКА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Упершыню згадваецца ў 2-й палове 18 ст. У 1764 г. ў Гібайлаўскім старостве, уладанне Ю.Храптовіча, 5 двароў. У 1795 г. ўладанне В.Беліковіча, 9 двароў, 55 жыхароў. У 1909 г. ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. З 20.8.1924 г. вёска ва Ухвальскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Кірава. У 1941 г. ў вёсцы 50 двароў, 187 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў кастрычніку 1942 г. карнікі спалілі вёску і знішчылі 68 мірных жыхароў, 23 вяскоўцы загінулі на франтах вайны. Пасля вайны адбудавана. У 1950 г. ў складзе калгаса імя Кірава, з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 37 гаспадарак, 61 жыхар. Каля вёскі магіла ахвяр фашызму. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

КУТАВЕЦ, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1909 г., засценак Кутавец (Пералессе), 5 двароў, 45 жыхароў. Вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. З 1924 г. ў складзе Чарэйскага, з 1931 г. — Крупскага раёнаў. У 1930-я гады жыхары вёсак Смародзінка, Луцішча, Кутавец і Шкорнеўка аб'ядналіся ў калгас імя Сталіна. У 1941 г. ў вёсцы 14 двароў, 90 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 6 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1958 г. вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Слабада». На 1.1.1998 г. 4 гаспадаркі, 7 жыхароў.

КУТЫ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Вядома з 1772 г. як уласнасць пана Агінскага, 12 двароў. У Айчынную вайну 1812 г. разбурана французамі, але хутка адрадзілася. У 1909 г. 47 двароў, 257 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Бобрскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас «Перамога». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 25 чалавек. Пасля вайны ў складзе калгаса «Чырвоны Бобр», з 1927 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 19 гаспадарак, 25 жыхароў. Крама.

ЛАГІ, вёска ў Абчугскім сельсавеце. У аснове назвы вёскі корань «лог» — паніжэнне рэльефа, лагчына. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1624 г. як частка Чарэйскага маёнтка канцлера Льва Сапегі ў Вялікім княстве Літоўскім, потым вёска ва ўласнасці нашчадкаў Льва Сапегі. У 1713 г. 28 двароў, да канца 19 ст. 44 двары, 360 жыхароў. З 1924 г. ў складзе Чарэйскага, з 1931 г. — Крупскага раёнаў. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоныя лагі». У 1941 г. ў вёсцы 72 двары, 228 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 26 чалавек, знішчана 11 мірных жыхароў. Пасля вайны калгас адноўлены, аб'яднаўся з калгасам «Прагрэс», з 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка», з 1965 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Абчуга». На 1.1.1998 г. 27 гаспадарак, 53 жыхары. Крама.

ЛАЖКІ, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Упершыню згадваецца ў 2-й палове 19 ст., у складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у 1897 г. 12 двароў, 97 жыхароў. У 1909 г. вёска, 118 жыхароў, 17 двароў, у 1917 г. 18 двароў, 136 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ва Ухвальскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Калініна. У 1941 г. ў вёсцы 28 двароў, 132 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў часы акупацыі загінулі 25 вяскоўцаў. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Варашылава, з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», потым — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 14 гаспадарак, 29 жыхароў.

ЛАЗОЎКА, вёска ў Крупскім сельсавеце. Вядома з пачатку 20 ст. У 1909 г. вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 27 двароў, 154 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 28.7.1954 г. ў Крупскім сельсавеце. У чэрвені 1928 г. ў вёсцы створана камуна пад назвай «Іскра», у сакавіку 1929 г. да яе далучыліся жыхары в. Леванова, калгас атрымаў назву «Праўда». На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 17 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Ленінец», з 1951 г. — калгаса імя Леніна. На 1.1.1998 г. 6 гаспадарак, 24 жыхары.

ЛАМСКОЕ, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Вядома з канца 17 ст., уласнасць падскарбія Бенедыкта Сапегі, адносілася да Баброўскага маёнтка, з 1639 г. да Чарэйскага. У пачатку 18 ст. 54 двары, у 1772 г. 26 двароў. З 1793 г. ў складзе Расійскай імперыі, вёска Абчугскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 73 двары, 483 жыхары. З 1924 г. Чарэйскага раёна Барысаўскай акругі, з 1931 г. Абчугскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Светлая зара». У 1941 г. ў вёсцы 65 двароў, 290 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 38 чалавек, частку жыхароў вывезлі на прымусовыя работы ў Германію. Да 1965 г. вёска ў складзе калгаса «Чырвоны Кастрычнік», потым — саўгаса, цяпер — калгаса «Абчуга». На 1.1.1998 г. 32 гаспадаркі, 50 жыхароў. Бібліятэка, крама.

ЛАШАНЦЫ, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Вядома з 1772 г. як частка Чарэйскага маёнтка паноў Сапегаў, 5 двароў, 30 мужчын. У 1778 г. прададзена Ануфрыю Рашкоўскаму. У Айчынную вайну 1812 г. разбурана французамі. У 1885 г. вёска Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 44 двары, 271 жыхар. З 20.8.1924 г. ў складзе Малажаберыцкага сельсавета Крупскага раёна Барысаўскай, з 9.6.1927 г. Мінскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 1973 г. вёска ў складзе Ігрушкаўскага сельсавета. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя С.Родзіна. У 1941 г. ў вёсцы 58 двароў, 158 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 11 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Усход», з 1969 г. — калгаса «Гігант», з 1961 г. — саўгаса «Грушаўскі», з 1966 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Стараселле». На 1.1.1998 г. 32 гаспадаркі, 57 жыхароў. Жывёлагадоўчая ферма.

ЛЕБЕДЗЕВА, вёска ў Крупскім сельсавеце. Вядома з пачатку 19 ст. У Айчынную вайну 1812 г. спалена французамі. З 1874 г. уласнасць стацкага саветніка Аляксандра Максімавіча Семянтоўскага-Курылы, 20 мужчын. Паводле падання населены пункт меў прыгожы парк і сажалку, дзе плавалі лебедзі, побач жылі дваровыя людзі. Магчыма, яны і далі яму назву «Лебедзева». У 1909 г. ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 5 двароў, 36 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска Крупскага сельсавета Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады жыхары вёсак Лебедзе-

ва, Майск і Карпаўка арганізавалі калгас «Май». У 1941 г. ў вёсцы 27 двароў, 103 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 12 чалавек, знішчана 6 мірных жыхароў. У чэрвені 1944 г. вёска вызвалена воінамі 5-й танкавай арміі 3-га Беларускага фронту. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. далучаны суседнія калгасы, з 1959 г. вёска ў складзе калгаса імя Калініна. На 1.1.1998 г. 35 гаспадарак, 78 жыхароў. Каля вёскі магіла ахвяр фашызму. Пахаваны 1975 мірных жыхароў, якіх 18.9.1944 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1969 г. на магіле пастаўлена стэла з барэльефнай выявай жанчыны ў жалобе і надпісам-прысвячэннем.

ЛЕВАНОВА, вёска ў Крупскім сельсавеце. Заснавана ў гады Савецкай улады. З 20.8.1924 г. вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 28.7.1954 г. Крупскага сельсавета. У сакавіку 1929 г. жыхары вёскі разам з жыхарамі в. Лазоўка арганізавалі калгас «Праўда». У 1941 г. ў вёсцы 17 двароў, 103 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 8 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса імя Леніна. На 1.1.1998 г. 17 гаспадарак, 41 жыхар.

ЛІПАВЕЦ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Вядома з 19 ст. У 1897 г. ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета, 12 двароў. З 1924 г. ў складзе Шэйкаўскага, потым Бобрскага сельсавета Крупскага раёна. Перад вайной створаны калгас імя А.М.Горкага, які пасля далучыўся да калгаса імя Ф.Э.Дзяржынскага. З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Бобр», з 1967 г. саўгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 14 гаспадарак, 14 жыхароў.

ЛІСІЧЫНА (Л і с і ч ы н), вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Вядома з 1772 г., уласнасць пана Кішаржэцкага, 17 двароў. У 1790 г. ў вёсцы 26 двароў, у 1897 г. 39 двароў, 268 жыхароў, валасное праўленне, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, вінная лаўка, царква, пастаялы двор, у фальварку Лісічына 2 двары, 24 жыхары. У пачатку 20 ст. цэнтр Лісічынскай воласці Сенненскага павета. З 1924 г. ў Халопеніцкім, потым у Крупскім раёнах. У 1929 г. створаны калгас «Энергія». У 1941 г. 71 двор, 425 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, спалены 2 двары, расстраляна 39 жыхароў, на франтах Айчыннай вайны загінулі 25 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса імя Малянкова, з 1957 г. — саўгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 84 гаспадаркі, 152 жыхары. Клуб, бібліятэка.

ЛІЦВІНКА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце (цяпер не існуе). Заснавана ў 1884 г., 15 двароў, 121 жыхар, пераважна літоўскага паходжання. У 1909 г. 121 жыхар, 15 двароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Сакалавіцкага, з 1954 г. — Бобрскага сельсавета ў Крупскім р-не. У 1930-я гады створаны калгас «Чырвоная зорка». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 18 чалавек. Пасля вайны вёска ў складзе калгаса імя Сталіна, потым імя Свярдлова, з 1960 г. — саўгаса «Бобр».

ЛУЖА, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Паводле пісьмовых звестак вядома з 1772 г., уласнасць паноў Сапегаў, 13 двароў, у 1778 г. належала маёнтку Шаўры Ануфрыя Рашкоўскага, 24 «дымы». Пра назву вёскі існуе паданне: настаяцеля царквы жыхары папрасілі асвяціць вёску, але нечым не ўгадзілі яму, тады святар быццам бы сказаў ім: «Быць вам пры лужы». У Айчынную вайну 1812 г. вёска разбурана французамі. У 1885 г. ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 47 двароў, 158 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Малажаберыцкага сельсавета Крупскага раёна, з 1973 г. вёска ў складзе Ігрушкаўскага сельсавета Крупскага раёна Мінскай вобласці. У 1930-я гады жыхары вёсак Лужа і Актавія аб'ядналіся ў калгас «Шлях сацыялізму». У 1941 г. ў вёсцы 40 двароў, 130 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 18 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Усход», са студзеня 1960 г. — калгаса «Гігант», з 1961 г. — саўгаса «Грушаўскі», з 1966 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Стараселле». На 1.1.1998 г. 4 гаспадаркі, 7 жыхароў. Жывёлагадоўчая ферма.

ЛУЦІШЧА, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Назва паходзіць ад тэрміна лут, лута — лыка маладой ліпы. Паводле пісьмовых крыніц вядома з пачатку 18 ст. У 1713 г. належала Чарэйскаму маёнтку паноў Сапегаў, 20 двароў. У 1772 г. ў складзе ў Агінскага, 11 двароў, 43 мужчыны, у 1778 г. прададзена Ераніму Пшасмыцкаму. У 1873 г. 38 жыхароў, у 1909 г. вёска ў складзе Абчугскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 33 двары, 184 жыхары. З 20.8.1924 г. ў Заборскім сельсавеце Чарэйскага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў Мінскай вобласці, з 5.5.1962 г. ў Кастрычніцкім, з 28.7.1966 г.

Бобрскім, з сакавіка 1973 г. Абчугскім сельсаветах. У 1930-я гады жыхары вёсак Смародзінка, Луцішча, Кутавец і Шкорнеўка аб'ядналіся ў калгас імя Сталіна. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 32 чалавекі. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1958 г. вёска ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка», з 1965 г. — саўгаса «Слабада», цяпер — калгаса «Слабада». На 1.1.1998 г. 14 гаспадарак, 24 жыхары.

ЛЮТЫЯ, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Вядома з 1624 г., вёска ў Чарэйскім маёнтку канцлера Льва Сапегі Вялікага княства Літоўскага. У 1633 г. Сапега перадаў сяло свайму сыну Казіміру Леану. У 1713 г. 33 двары, 20 валок зямлі. У пачатку 20 ст. ў складзе Абчугскай воласці Сенненскага павета, 37 двароў, 252 жыхары. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады вёска ў Смародзінскім сельсавеце Чарэйскага раёна, потым Абчугскім сельсавеце Крупскага раёна, з 1962 да 1966 г. — цэнтр Кастрычніцкага сельсавета. У 1930-я гады створаны калгас «Ударнік», у вёсцы 96 двароў, 402 жыхары. У 1941 г. ў вёсцы 96 двароў, 402 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы дзейнічала падпольная група. На франтах вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 38 чалавек, спалена 14 двароў, знішчаны 41 мірны жыхар. З 1957 г. ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка». На 1.1.1998 г. 52 гаспадаркі, 110 жыхароў. Клуб, бібліятэка, крама.

ЛЯДЫ, вёска ў Крупскім сельсавеце. Вядома з 2-й паловы 18 ст., уласнасць Аляксандра Сапегі. У 1778 г. прададзена Томашу Гзоўскаму, 7 двароў. У 1873 г. 53 мужчыны, у 1909 г. вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 35 двароў, 209 жыхароў, хлебазапасны магазін. З 20.8.1924 г. вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 26.7.1930 г. Крупскага раёна, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з сакавіка 1973 г. Крупскага сельсавета. У 1930-я гады створаны калгас «Прамень свабоды». У 1941 г. ў вёсцы 47 двароў, 218 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы размяшчаўся нямецкі гарнізон. На франтах вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 14 чалавек, знішчана 5 мірных жыхароў. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1958 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя А.Колесавай. На 1.1.1998 г. 23 гаспадаркі, 31 жыхар. Жывёлагадоўчая ферма.

ЛЯНОК, пасёлак у Нацкім сельсавеце. Гісторыя вёскі пачынаецца з 1952 г., калі пачалося будаўніцтва льнозавода. Першую прадукцыю завод выпусціў у 1955 г., у 1964 г. была ўведзена другая паточная лінія, у 1968 г. — трэцяя. Магутнасць завода ўзрасла ў 2 разы. Адначасова з заводам расла і вёска. На 1.1.1998 г. 297 гаспадарак, 569 жыхароў. Ільнозавод, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад-яслі, базавая школа, крама.

МАЖАНЫ (М а р а н ы), вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Упершыню згадваецца ў 1639 г. як вёска Барысаўскага староства, уласнаць Адама Казаноўскага. У 1764 г. вёска — цэнтр Мажанскага староства, 8 двароў, уладанне Ю.Храптовіча. З 1795 г. 8 двароў, 52 жыхары, уласнасць М.Агінскага. У 1870 г. вёска Эсьмонскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 38 мужчын. У 1897 г. 24 двары, 181 жыхар. У 1917 г. 26 двароў, 185 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў складзе Ухвальскага сельсавета Крупскага раёна. У 1941 г. ў вёсцы 26 двароў, 42 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 14 чалавек, 7 мірных жыхароў расстраляны фашыстамі. Пасля вайны ў складзе саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 8 гаспадарак, 11 жыхароў.

МАЙСК (да 1964 г. П а н с к а е), вёска ў Крупскім сельсавеце. Вядома з 1667 г., 21 двор, у маёнтку Гапонавічы паноў Падбярэзскіх. У 1775 г. 24 двары, уладанне пана Замбржыцкага. У Айчынную вайну 1812 г. вёска спалена французамі. У пачатку 20 ст. маёнтак Панскае ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 1 двор, 37 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Шэйкаўскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, потым Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 5.5.1962 г. Крупскага сельсавета. У 1930-я гады жыхары вёсак Майск, Карпаўка і Лебедзева аб'ядналіся ў калгас «Май». У 1941 г. ў вёсцы 103 двары, 308 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 62 чалавекі. Вызвалена 28.6.1944 г. 18-й танкавай брыгадай. У 1944 г. калгас адноўлены, у 1950 г. да яго далучыліся 5 калгасаў, з 1959 г. вёска ў складзе калгаса імя Калініна. 12.11.1966 г. да вёскі далучана в. Красная Ніва. На 1.1.1998 г. 149 гаспадарак, 298 жыхароў. Жывёлагадоўчая ферма, крама.

МАЛАДЗІЛАВА, вёска ў Выдрыцкім сельсавеце (цяпер не існуе). Да Вялікай Айчыннай вайны 6 двароў, 35 жыхароў. У 1941 г. спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі разам з жыхарамі (10 чалавек, 6 двароў). Пасля вайны не адноўлена.

МАЛАЯ СЛАБАДА, вёска ў Крупскім сельсавеце. Заснавана ў 2-й палове 18 ст. У 1775 г. 4 двары, уласнаць пана Тарнаўскага. У 1873 г. ў вёсцы 24 мужчыны. З 20.8.1924 г. вёска ў Крупскім сельсавеце Крупскага раёна. У 1930-я гады жыхары вёсак Малая Слабада, Вялікая Слабада і Усохі аб'ядналіся ў калгас імя Варашылава. У 1941 г. ў вёсцы 22 двары, 93 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 12 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. да яго далучыліся 5 калгасаў. У 1960 г. перайменаваны ў калгас «Перамога», з 1986 г. вёска ў складзе калгаса імя Леніна. На 1.1.1998 г. 36 двароў, 84 жыхары. На тэрыторыі вёскі размешчаны бібліятэка, жывёлагадоўчая ферма. Каля будынка клуба помнік на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя: воін са сцягам і партызанка з аўтаматам.

МАЛІНАЎКА, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Заснавана ў 1909 г., у складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета, 3 двары, 23 жыхары. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Вялікахальнявіцкім сельсавеце Чарэйскага раёна, з 1935 г. ў Халопеніцкім, з 1960 г. ў Кастрычніцкім сельсаветах Крупскага раёна. У 1930-я гады жыхары вёсак Высокае, Малінаўка арганізавалі калгас «Іскра». У 1941 г. 20 двароў, 102 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 2 чалавекі. Цяпер вёска ў складзе саўгаса «Авангард». На 1.1.1998 г. 6 гаспадарак, 6 жыхароў.

МАЛОЕ ВОСАВА, вёска ў Нацкім сельсавеце. Упершыню згадваецца ў 1897 г., хутар у складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1917 г. 3 двары, 20 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Жаберыцкім сельсавеце Крупскага раёна, з 1951 г. ў Нацкім сельсавеце. У 1929 г. жыхары вёсак Малое Восава і Колас аб'ядналіся ў калгас «1-я Пяцігодка». У 1940 г. 9 двароў, 37 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 2 чалавекі. Цяпер вёска ў складзе калгаса «Камунар». На 1.1.1998 г. 4 гаспадаркі, 4 жыхары.

МАЛОЕ ВОСАВА, вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце (цяпер не існуе). Паводле пісьмовых звестак вядома з канца 19 ст. У 1897 г. пасёлак Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 6 двароў, 33 жыхары. У 1908 г. засценак Малы Восаў, 7 двароў, 53 жыхары. З 1917 г. в. Малое Восава, 8 двароў, 71 жыхар. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Хацюхоўскага сельсавета Халопеніцкага раёна. У 1930-я гады створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік».

МАЛОЕ ГОРАДНА, вёска ў Выдрыцкім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1670 г., вёска Барысаўскага староства, 6 двароў. Столькі ж двароў захавалася да канца 18 ст. У 1804 г. тут жыло 15 сямей, было 340 гектараў зямлі. У 1897 г. ў вёсцы 21 двор, 267 жыхароў, у 1890 г. адкрыта школа пісьменнасці. З 20.8.1924 г. ў складзе Крупскага раёна. У гады калектывізацыі створаны калгас «Трактар». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 15 жыхароў. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. ў складзе калгаса імя Кірава. На 1.1.1998 г. 80 гаспадарак, 198 жыхароў.

МАЛОЕ ХАЦЮХОВА, вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з канца 19 ст. У 1870 г. ў вёсцы 24 мужчыны. У 1909 г. ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 11 двароў, 108 жыхароў, у 1917 г. 19 двароў, 131 жыхар. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады вёска ў складзе Хацюхоўскага сельсавета. У 1930 г. жыхары вёскі разам з жыхарамі в. Асавец аб'ядналіся ў калгас «Пралетарская перамога». У 1941 г. ў вёсцы 27 двароў, 122 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 10 чалавек. Пасля вайны вёска ў складзе калгаса «Бальшавік», з 1959 г. — «Чырвоны Кастрычнік», з 1963 г. — калгаса «Праўда». На 1.1.1998 г. 15 гаспадарак, 25 жыхароў.

МАЛЫ ВЯЗОК, вёска ў Дзянісавіцкім сельсавеце. У 1921 г. хутар, 8 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў складзе Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік». У 1941 г. ў вёсцы 28 двароў, 158 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінуў 21 чалавек. У 1950 г. вёска ў складзе калгаса імя Молатава, потым «Іскра», з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», з 1963 г. — калгаса «Дзянісавічы». На 1.1.1998 г. 25 гаспадарак, 41 жыхар. Жывёлагадоўчая ферма.

МАЛЫ КАМЯНЕЦ, вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Заснавана каля 1890 г. У 1897 г. засценак, 5 двароў, 23 жыхары, у 1907 г. 12 двароў, 31 жыхар. Спачатку ўваходзіла ў Сенненскі павет, потым у Халопеніцкі, з 1931 г. ў Крупскім раёне. У 1935 г. створаны калгас «Пралетарская перамога». У 1941 г. 21 двор, 92 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 13 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, вёска ў скла-

дзе саўгаса, цяпер — калгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 7 гаспадарак, 11 жыхароў.

МАЛЫЯ ЖАБЕРЫЧЫ (Жаберычы), вёска ў Дакудаўскім сельсавеце. Упершыню згадваецца ў 1670 г., вёска, частка Барысаўскага староства, 5 двароў. У 1795 г. 12 двароў, 115 жыхароў. У 1805 г. 15 гаспадарак. У Айчынную вайну 1812 г. знішчана французамі. У 1870 г. вёска ў складзе маёнтка Стара-Барысаў вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, 91 жыхар. У 1897 г. 57 двароў, 418 жыхароў, 2 хлебазапасныя магазіны, карчма. У 1909 г. вёска, 63 двары, 447 жыхароў, побач аднайменны хутар у складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 3 двары, 19 жыхароў, у 1919 г. 78 двароў, 531 жыхар. З 20.8.1924 г. цэнтр Дакудаўскага сельсавета Крупскага раёна, з 13.9.1982 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Перамога». У 1941 г. ў вёсцы 112 двароў, 402 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінуў 51 чалавек, знішчана 8 мірных жыхароў. У 1944 г. калгас адноўлены, у 1946 г. адкрыты хата-чытальня, бібліятэка, клуб. У 1950 г. вёска — цэнтр узбуйненага калгаса імя Панамарэнкі, у 1958 г. перайменаваны ў калгас «За мір», цяпер вёска ў складзе калгаса «Балышавік». У 1952 г. ў вёску перасяленыжыхары Жаберыцкага сельсавета пасёлкаў Горашава (25 чалавек) і Граніт (31 чалавек). На 1.1.1998 г. 82 гаспадаркі, 169 жыхароў. Клуб, бібліятэка, сярэдняя школа, аддзяленне сувязі, крама, фельчарска-акушэрскі пункт, жывёлагадоўчая ферма. Каля будынка школы ў 1965 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці 68 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

МАЛЫЯ ХАЛЬНЯВІЧЫ, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Вядома з 19 ст. У 1880 г. ў вёсцы 35 двароў, 252 жыхары, у 1909 г. 377 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў складзе Чарэйскага, потым Крупскага раёнаў. У 1929 г. створаны калгас «Пасёлак Хальнявічы». У 1941 г. 29 двароў, 147 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска часткова спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі, знішчана 9 мірных жыхароў. На франтах вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 46 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. аб'яднаўся з калгасам імя Маліноўскага. Вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 34 гаспадаркі, 53 жыхары. Жывёлагадоўчая ферма.

МАЛЬЦЫ, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце (цяпер не існуе). Вядома з пачатку 18 ст. як частка Чарэйскага маёнтка паноў Сапегаў, у 1713 г. 2 двары. У 1897 г. фальварак Абчугскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 6 двароў, 46 жыхароў. У 1909 г. засценак, 6 двароў, 44 жыхары (22 мужчыны, 22 жанчыны). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў складзе Чарэйскага, потым Крупскага раёнаў. У 1941 г. ў вёсцы 23 двары, 86 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 6 чалавек.

МАСЛЁНКА, вёска ў Крупскім сельсавеце. Вядома з 2-й паловы 18 ст. У 1775 г. 7 двароў, уласнасць пана Замбржыцкага. У 1873 г. ў вёсцы 27 мужчын, у 1897 г. 25 двароў, 135 жыхароў, у 1909 г. ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 12 двароў, 97 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска Крупскага раёна Барысаўскай акругі, потым Мінскага раёна Аршанскай акругі, з 18.6.1927 г. Крупскага раёна, з 1938 г. ў Мінскай вобласці. У 1928 г. ў вёсцы створана таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі пад назвай «Атраднае». У 1931 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны герой». У 1941 г. ў вёсцы 77 двароў, 304 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 25 чалавек, знішчана 5 мірных жыхароў. Вёска вызвалена 28.6.1944 г. 18-й танкавай брыгадай. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Ленінец», з 1951 г. —калгаса імя Леніна, 12.11.1966 г. да вёскі далучаны хутар Гапонавічы. На 1.1.1998 г. 69 гаспадарак, 122 жыхары. Крама, ферма буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая.

МАТОШКА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. У 1887 г. засценак у складзе Эсьмонскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 20 двароў, 85 жыхароў. У 1916 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1917 г. 18 двароў, 128 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Стараслабодскім сельсавеце Крупскага раёна, з 4.1.1964 г. ва Ухвальскім сельсавеце. У 1929 г. ў вёсцы створана камуна. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Савецкая Беларусь». У 1941 г. ў вёсцы 20 двароў, 72 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 10 чалавек. У час акупацыі 2 жыхары забіты. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. далучаны 2 калгасы пад назвай «Чырвоны сцяг», з 1968 г. вёска ў складзе саўгаса «Новая ніва», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 26 гаспадарак, 68 жыхароў. Фельчарска-акушэрскі пункт, крама.

МАЧУЛІШЧА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Вядома з 1636 г., належала да

маёнтка Варанцэвічы, уласнасць старасты Аляксандра Багдана Сапегі. У 1772 г. вёска, 8 двароў, набыў шляхціц Замбржыцкі. У Айчынную вайну 1812 г. фальварак у складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета, разбураны французамі. У пачатку 20 ст. вёска, 70 жыхароў, карчма. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады вёска ў складзе Сакалавіцкага, потым Бобрскага сельсаветаў Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас «Новы быт», пасля аб'яднання з дзвюма гаспадаркамі атрымаў назву «Чырвоны сцяг». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 25 чалавек. У 1958 г. ў складзе калгаса «Перамога», з 1965 г. — саўгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 22 гаспадаркі, 34 жыхары. Крама.

МАЧУЛІШЧА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Заснавана паміж 1775—77 гг., 6 двароў. У 1795 г. 18 двароў, 94 жыхары, уладанне Храптовіча. У 1870 г. ў вёсцы 29 мужчын, у 1897 г. ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 41 двор, 287 жыхароў. У 1917 г. 57 двароў, 371 жыхар. З 20.8.1924 г. ва Узнацкім сельсавеце Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага раёнаў, з 21.5.1951 г. ў Халопеніцкім сельсавеце, з 20.1.1960 г. ў Крупскім раёне Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «1-е Мая». У 1941 г. ў вёсцы 59 двароў, 209 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 25 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Гігант», з 1966 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Якімаўка». На 1.1.1998 г. 45 гаспадарак, 102 жыхары. Пачатковая школа, крама, жывёлагадоўчая ферма.

МАШЧАНІЦА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. У 1897 г. ў Эсьмонскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 1 двор, 12 жыхароў. Належала аднадворцу Цімафею Проперу. У 1908 г. засценак, 9 двароў, 62 жыхары. У 1917 г. вёска, 10 двароў, 91 жыхар. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў складзе Крупскага раёна. У 1941 г. ў вёсцы 22 двары, 127 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 5 чалавек, 4 жыхары расстраляны карнікамі за сувязь з партызанамі. Пасля вайны ў складзе саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 22 гаспадаркі, 35 жыхароў. Крама.

МІГАЎШЧЫНА, вёска ў Выдрыцкім сельсавеце (цяпер не існуе). У 1870 г. вёска Вяляціцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1897 г. засценак, 5 двароў, 39 жыхароў (22 мужчыны, 17 жанчын). У 1908 г. ў вёсцы 7 двароў, 71 жыхар, у 1917 г. 8 двароў, 67 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў складзе Крупскага раёна. У 1941 г. ў вёсцы 17 двароў, 80 жыхароў. У ліпені 1942 г. фашысты спалілі вёску, загубілі 8 жыхароў. Пасля вайны не адбудавана.

МІКАЛАЕЎКА (Галяшычы), вёска ва Ухвальскім сельсавеце. У 1897 г. засценак, 12 двароў, 87 жыхароў, капліца. У 1909 г. ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 81 жыхар, 11 двароў, у 1917 г. 13 двароў, 101 жыхар. З 20.8.1924 г. вёска ва Ухвальскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай акругі, потым Мінскага раёна Аршанскай акругі, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Новае жыццё». У 1941 г. ў вёсцы 20 двароў, 98 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы загубілі 18 жыхароў. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Кірава, з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 40 гаспадарак, 75 жыхароў.

МІРЭЦКІ ДВОР, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Заснавана ў 19 ст. Назва паходзіць ад імя памешчыка Мірэцкага. У 1930-я гады створаны калгас. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 3 жыхары. З 1967 г. ў складзе саўгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 4 гаспадаркі, 6 жыхароў.

МХЕРЫНА 1-я, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 2-й паловы 18 ст. У 1772 г. 21 двор, належала дамініканскаму манастыру. У 1795 г. 20 двароў, 156 жыхароў, частка была ва ўладанні царквы, частка — прыватная ўласнасць. У 1885 г. сяло Халопеніцкай воласці, прыватная ўласнасць, 12 двароў, 80 жыхароў, царкоўны прыход, штогод 20 ліпеня праводзіўся кірмаш. У 1897 г. 27 двароў, 107 жыхароў, карчма. З 1890 г. дзейнічала льнотрапальнае прадпрыемства (уладальнік А.Шпунт). У 1900 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1917 г. сяло ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 27 двароў, 159 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Траянаўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага раёнаў, з 28.7.1954 г. ў Слабодскім, з 26.8.1959 г. ў Халопеніцкім сельсаветах, з 1960 г. ў Крупскім раёне. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Будзённага. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 19 чалавек. З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса

«Халопенічы». На 1.1.1998 г. 34 гаспадаркі, 75 жыхароў. Крама.

МХЕРЫНА 2-я, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Вядома з канца 18 ст. У 1795 г. 3 двары, 12 жыхароў, належала Храптовічу. У 1870 г. засценак, 3 мужчыны, у 1908 г. 2 двары, 13 жыхароў. У 1917 г. засценак Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 5 двароў, 31 жыхар. З 20.8.1924 г. вёска ў Траянаўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага раёнаў, з 21.5.1951 г. ў Грыцкавіцкім, з 26.8.1959 г. ў Халопеніцкім сельсаветах, з 1960 г. ў Крупскім раёне. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Будзённага. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 10 чалавек. З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Халопенічы». На 1.1.1998 г. 11 гаспадарак, 19 жыхароў.

МЯЛЕШКАВІЧЫ, вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Назва паходзіць ад імя. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 19 ст., у 1880 г. 24 дамы, 104 жыхары. З 1924 г. ў Чарэйскім, Халопеніцкім, Крупскім раёнах. У 1929 г. створаны калгас «Трэці рашаючы». Напярэдадні вайны 29 двароў, 165 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы спалілі 18 двароў. На франтах вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 19 чалавек, знішчаны 3 мірныя жыхары. З 1950 г. ў складзе ўзбуйненага калгаса «Шлях Леніна», з 1957 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 14 гаспадарак, 18 жыхароў.

НАВАСЁЛКІ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Былы засценак. У 1847 г. 1 двор, 7 жыхароў, у 1909 г. 3 двары, 21 жыхар. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады вёска ў складзе Бобрскага сельсавета Крупскага раёна, з 1967 г. — саўгаса «Колас». У Вялікую Айчынную вайну загінуў 1 чалавек. На 1.1.1998 г. 2 гаспадаркі, 3 жыхары.

НАВАХРОСТЫ (Паўлаў Барок), вёска ў Крупскім сельсавеце. Заснавана каля 1670 г., 1 двор, у 1775 г. 3 двары. У 1795 г. 8 двароў, 45 жыхароў, у складзе Барысаўскага маёнтка. У Айчынную вайну 1812 г. часткова разбурана французамі, у 1818 г. 5 двароў, 40 жыхароў, вёска належала князям Радзівілам. У 1845 г. 8 двароў, 58 жыхароў. У 1930-я гады створаны калгас імя Кірава. У 1941 г. ў вёсцы 66 двароў, 207 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 30 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, у складзе калгаса імя Варашылава, з 1962 г. — калгас «Перамога», цяпер — калгас імя Леніна. На 1.1.1998 г. 58 двароў, 128 жыхароў.

НАВЕСЫ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Вядома з канца 18 ст. У 1790 г. 19 двароў. З 19 ст. ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Бобрскім сельсавеце Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Ленінскі шлях». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 23 чалавекі. Пасля вайны вёска ў складзе калгаса «Чырвоны сцяг», потым — саўгаса, цяпер — калгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 21 гаспадарка, 39 жыхароў.

НАЧА (Радзівілаўская Воля), вёска, цэнтр сельсавета. Назва паходзіць ад р. Нача. Мястэчка заснавана ў 1586 г. на тэрыторыі Барысаўскага староства каля р. Нача, віленскім ваяводам Крыштофам Радзівілам. У 1593 г. рускі дзяк Трыфан Карабейнікаў наведаў кірмаш ў вёсках Бобр, Барысаў, Нача. У 1667 г. ваяводства, мястэчка ў Барысаўскім старостве ў пажыццёвым уладанні ўдавы пана Казаноўскага. У ім Святатроіцкая царква, 27 цяглых і 5 слабодскіх двароў. У 1765 г. мястэчка ў Барысаўскім старостве, 3 «дымы». У 1784 г. англійскі гісторык Уільям Корб у сваёй кнізе «Падарожжа праз Польшчу, Расію, Швецыю і Данію» пісаў пра быт беларускай вёскі. За Барысавам у нейкай Наіцы яму давялося спыніцца ў самай беднай халупе, якія сустракаліся ў Літве. «Адзінай мэбляй у ёй быў невялікі стол, а адзіным посудам — разбіты гліняны гаршчок, у якім нам падрыхтавалі яду і які замяніў нам талеркі. Мы ўселіся за нашу нішчымную страву пры святле доўгай смалістай лучыны, якая была ўваткнута ў сцяну, звешвалася над сталом, яна ж служыла нам свечкай, бо сапраўднай свечкі нельга было дастаць у вёсцы ні за якія грошы». У Айчынную вайну 1812 г. вёска часткова спалена. У 1813 г. царква была адбудавана. У 1885 г. — цэнтр воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, валасное праўленне, млын, царква, школа, 54 двары, 480 жыхароў. У 1875 г. 112 двароў, 721 жыхар, народнае вучылішча, царква, хлебазапасны магазін, лаўка, карчма, на хутары 3 двары, 10 жыхароў, вадзяны млын. У 1909 г. сяло ў складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета, 120 двароў, 799 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў складзе Крупскага раёна. У вёсках Нача, Вострава створана камуна «Зара свабоды» (старшыня Дзяніс Іванавіч Шастакоў). У 1931 г. камуна раздзялілася на 2 калгасы: «Новая Нача» (старшыня Васіль

Сцяпанавіч Шкробат), «Зара свабоды» (С.С.Гроздзеў). У 1937 г. гэтыя два калгасы зноў аб'ядналіся ў адну гаспадарку пад назвай «Новая Нача» (старшыня В.Ф.Комель). У 1941 г. ў вёсцы 118 двароў, 564 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы размяшчаўся нямецкі гарнізон. 10.9.1942 г. партызаны атрада № 277 узарвалі мост цераз р. Нача і разгромілі гарнізон. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 92 вяскоўцы, знішчаны 31 мірны жыхар. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. перайменаваны ў калгас «Камунар». Вёска — цэнтр калгаса. На 1.1.1998 г. 200 гаспадарак, 644 жыхары. Сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, крама, аддзяленне сувязі, 3 вытворчыя аб'екты, майстэрня калгаса, жывёлагадоўчая ферма, турбаза. Брацкая магіла 29 воінаў, якія загінулі ўлетку 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — воіны 2-й мотастралковай брыгады, 18-й гвардзейскай танкавай брыгады, 3-га танкавага корпуса 5-й гвардзейскай танкавай арміі, 5-й стралковай дывізіі, 8-га стралковага корпуса 11-й гвардзейскай арміі і 3-га Беларускага фронту. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск. Каля будынка бібліятэкі помнік на ўшанаванне памяці 51 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. пастаўлены абеліск. Магіла Героя Савецкага Саюза М.А.Сурына. Радзіма Героя Савецкага Саюза М.Дз.Шастакова.

Дакументы сведчаць

26 [августа 1593, Д.Х.] кормили в Наче (Netschau).

Этот городок лежит на реке, называемой тоже Нача и в совершенной пустыне... Город выстроен только 9 лет назад и получил название от реки. Так как, к несчастью, кругом всё разорено, то, чтобы люди имели причину селиться там, король Стефан дал этому месту льготу на 20 лет, и именно такую, чтобы поселившиеся там жили свободно от всякой подати и службы. После того, как дана была такая льгота, тотчас же нашлось много, которые настроили тут всего: с полной готовностью отправлялись туда купцы и ремесленники, зведена была там таможня и в продолжение девяти лет выстроился и городок...

Так и приехали мы в тот день на двух телегах и сделали до Бобра (Bober) 4 мили. Этот городок лежит на реке того же названия: в нем много домов, в которых курят водку. Ночевали в дрянном местечке Дрешанке (Dreschanki), проехав 2 мили.

Друкуецца па кн.: Описание путешествия в Москву посла Римского императора Николая Варкоча с 22 июля 1593 г. М., 1875. С. 8.

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ, пасёлак у Крупскім сельсавеце. Вядомы з пачатку 19 ст. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Стаханава. У Вялікую Айчынную вайну вёска часткова спалена. У 1944 г. ў вёсцы былі жывымі спалены вязні крупскай турмы, іх астанкі потым перапахаваны на могілках у Крупках. Пасля вайны вёска ў складзе Крупскага сельсавета, потым гарадскога Савета. На 1.1.1998 г. 8 гаспадарак, 13 жыхароў.

НОВАЯ КРУПКА, вёска ў Крупскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1909 г., вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 13 двароў, 72 жыхары, уладанне К.О.Свяцкага. З 20.8.1924 г. ў Крупскім сельсавеце Крупскага раёна. У 1930-я гады ў вёсцы створаны калгас імя Крупскай. У 1941 г. ў вёсцы 49 двароў, 119 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 14 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Перамога», з 1986 г. — імя Леніна, цяпер — у складзе г. Крупкі.

НОВАЯ НІВА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Створана ў гады Савецкай улады. З 20.8.1924 г. ва Ухвальскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 26.7.1930 г. Крупскага раёна, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады жыхары вёсак Новая Ніва і Свірыдаўка аб'ядналіся ў калгас імя Леніна. У 1941 г. ў вёсцы 28 двароў, 141 жыхар. У час акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі вёска была часткова спалена. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 5 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены, у 1950 г. да яго далучаны 3 калгасы. З 1968 г. вёска ў складзе саўгаса «Новая ніва», цяпер — калгас «Ніва». На 1.1.1998 г. 19 гаспадарак, 25 жыхароў.

НОВАЯ СЛАБАДА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Заснавана паміж 1772—75 гг., 2 двары, уладанне Ю.Храптовіча. У 1870 г. ў

вёсцы 53 мужчыны, у 1909 г. ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 29 двароў, 207 жыхароў. У 1917 г. 31 двор, 242 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Стараслабодскім сельсавеце Крупскага р-на, з 4.1.1964 г. ва Ухвальскім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Пралетарская перамога». У 1941 г. ў вёсцы 45 двароў, 233 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 9 чалавек, 89 расстраляны фашыстамі ў час акупацыі. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Чырвоная Слабада», з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», з 1968 г. — «Новая ніва», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 15 гаспадарак, 25 жыхароў. У цэнтры вёскі магіла ахвяр фашызму. Пахаваны 89 мірных жыхароў, якіх 14.10.1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1985 г. на магіле пастаўлены абеліск.

НОВЫ ЗАСЦЕНАК (да 1956 г. Мархлеўская), вёска ў Крупскім сельсавеце (цяпер не існуе). З 1897 г. ў Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. ў вёсцы 3 двары, 34 жыхары. З 1924 г. ў складзе Крупскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас імя Мархлеўскага, вёска перайменавана ў Мархлеўскую. У 1932 г. створаны калгас імя Калініна. У 1941 г. ў вёсцы 14 двароў, 42 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну загінула 5 чалавек.

НОВЫ САКОЛ, вёска ў Дзянісавіцкім сельсавеце. У сярэдзіне 19 ст. 19 двароў, 220 жыхароў, у складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады вёска ў складзе Ухвальскага, потым Дзянісавіцкага сельсаветаў Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы арганізавалі калгас імя Молатава, потым аб'ядналіся ў калгас «Іскра». У 1941 г. ў вёсцы 61 двор, 307 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 20 чалавек. З 1963 г. вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Дзянісавічы». На 1.1.1998 г. 44 гаспадаркі, 78 жыхароў. Крама.

НОВЫ ШЛЯХ, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Заснавана ў пачатку 20 ст. З 1924 г. ў складзе Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 3 чалавекі. Пасля вайны ў складзе саўгаса, потым — калгаса «Ухвала». На 1.1.1998 г. 3 гаспадаркі, 4 жыхары.

НОВЫЯ ДЗЯНІСАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета. З 1921 г. хутар Дзянісавічы, ва Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 1 двор, 7 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Шэйкаўскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай акругі, з 9.6.1927 г. ў Крупскім раёне, з 16.7.1954 г. ў Стараслабодскім, з 28.7.1954 г. ва Ухвальскім сельсаветах, з 4.1.1964 г. — цэнтр Дзянісавіцкага сельсавета. У 1930-я гады створаны калгас «Маяк сацыялізму». У 1941 г. 129 двароў, 698 жыхароў. З чэрвеня 1941 па чэрвень 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 20 чалавек, вёска часткова спалена. У 1944 г. адбудавана, з 1959 г. ў складзе саўгаса «Ухвала», з 1963 г. — цэнтр саўгаса «Дзянісавічы». На 1.1.1998 г. 179 гаспадарак, 416 жыхароў. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, лясніцтва, аддзяленне сувязі, крама, майстэрні, жывёлагадоўчая ферма. Каля будынка школы брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 8 лётчыкаў, якія загінулі ў 1944 г., і 13 партызан 8-й Круглянскай брыгады, што загінулі 28.8.1942 г. пры разгроме ворага на чыгуначнай станцыі Слаўнае, 21.9.1942 г. пры ліквідацыі варожага гарнізона ў в. Новыя Дзянісавічы і 31.7.1943 г. ў баі каля в. Дубавое. У 1964 г. на магіле пастаўлены 2 абеліскі.

НОВЫЯ ПЫШАЧЫ (Пышацкая Слабодка), вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Вядома з 2-й паловы 18 ст. У 1772 г. 11 двароў, уладанне Беліковічаў. У 1775 г. 21 двор, 130 жыхароў. У 1909 г. сяло ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 61 двор, 443 жыхары. У 1917 г. 76 двароў, 471 жыхар. З 20.8.1924 г. вёска ў Стараслабодскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, потым Мінскай, Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 4.1.1964 г. ва Ухвальскім сельсавеце. У 1930-я гады створаны калгас «XVII партз'езд». На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 19 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса імя Леніна, з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», з 1968 г.— «Новая ніва», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 17 двароў, 41 жыхар.

НОВЫЯ ШЧАЎРЫ, вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з канца 19 ст. У 1897 г. фальварак у складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 1 двор, 21 жыхар. У 1909 г. ў маёнтку 4 двары, 21 жыхар. З 20.8.1924 г. вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 1931 г. Крупскага, з 1.2.1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Варашылава. У 1941 г. ў

вёсцы 30 двароў, 117 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 22 вяскоўцы. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Сталіна, які ў 1957 г. перайменаваны ў калгас «Знамя камунізму», з 1986 г. — калгаса «Чырвоны Кастрычнік». Жывёлагадоўчая ферма.

НЯВЕРАЎШЧЫНА, вёска ў Дакудаўскім сельсавеце. Вядома з канца 19 ст. У 1897 г. хутар у складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 4 двары, 40 жыхароў, у 1917 г. 4 двары, 32 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Нацкім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 9.6.1927 г. Мінскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 31.3.1977 г. ў Жаберыцкім, з 1.2.1982 г. Дакудаўскім сельсаветах. У 1929 г. жыхары вёсак Няверашчына, Шыялоўка і Брышча аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны ручай», потым у складзе ўзбуйненага калгаса «Новы быт». У Вялікую Айчынную вайну акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На франтах вайны загінулі 3 чалавекі. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. далучаны да калгаса «Бальшавік». На 1.1.1998 г. 7 гаспадарак, 17 жыхароў.

ПАДАЛЕЦ, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Вядома з 2-й паловы 19 ст. У 1772 11 двароў, адносілася да дамініканскага манастыра. У 1775 г. 4 двары, 21 жыхар, належала Храптовічу. З 1793 г. ў складзе Расійскай імперыі ў Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. З 20.8.1924 г. ў Траянаўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага раёнаў, з 21.5.1951 г. ў Грыцкавіцкім сельсавеце, з 1960 г. ў Халопеніцкім пасялковым Савеце Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас. У 1941 г. ў вёсцы 21 двор, 73 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 7 чалавек. З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Халопенічы». На 1.1.1998 г. 11 гаспадарак, 18 жыхароў. Жывёлагадоўчая ферма.

ПАДБЯРЭЗЗЕ, вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце. Заснавана ў 1-й палове 19 ст. У 1884 г. 3 двары, належала Цітовай, потым Храптовічам. У 1870 г. ў вёсцы 29 мужчын, у 1897 г. 13 двароў, 103 жыхары. У 1909 г. ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 6 двароў, 136 жыхароў, у 1917 г. 21 двор, 162 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 8.1.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны сцяг». У 1939 г. ў вёску перасяліліся жыхары в. Чавінка (7 двароў, 3 жыхары). У 1941 г. ў вёсцы 36 двароў, 216 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 38, у партызанскай барацьбе 3 чалавекі. Цяпер вёска ў складзе калгаса «Чырвоны Кастрычнік». На 1.1.1998 г. 38 гаспадарак, 71 жыхар.

ПАДБЯРЭЗЗЕ, вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Заснавана ў 1772 г., вёска ў закладзе ў пана Амульскага, 6 двароў. У 1897 г. 3 двары, 13 жыхароў. У пачатку 20 ст. фальварак у Лісічанскай воласці Сенненскага павета, уладанне А.О.Шашалевіча, 1 двор, 13 жыхароў. З 1924 г. ў складзе Чарэйскага, Халопеніцкага, Крупскага раёнаў. У 1929 г. створаны калгас «Чырвонае падбярэззе». У 1941 г. ў вёсцы 24 двары, 86 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 2 чалавекі. У 1950 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Маліноўскага. Цяпер вёска ў складзе калгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 17 гаспадарак, 29 жыхароў.

ПАДСОСЕНКА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 19 ст. У 1897 г. 11 двароў, 27 жыхароў. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета, 12 двароў, 74 жыхары, землеўладанне сялян. З 1924 г. ў Бобрскім сельсавеце Крупскага раёна. У 1930-я гады жыхары вёсак Падсосенка і Пліса арганізавалі калгас «Перамога», з 1960 г. вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Бобр». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 5 чалавек. На 1.1.1998 г. 7 гаспадарак, 8 жыхароў.

ПАПАРНАЕ, вёска ў Дзянісавіцкім сельсавеце. Вядома з 1772 г., 12 двароў. У 1775 г. 117 жыхароў, частка маёнтка належала Беліковічам. На 1.1.1897 г. 29 гаспадарак, 43 жыхары. У 1909 г. вёска ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 28 двароў, 220 жыхароў, у 1917 г. 31 двор, 225 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Шынкаўскім сельсавеце Крупскага раёна, з 16.7.1954 г. вёска ў Стараслабодскім, з 4.1.1964 г. ў Дзянісавіцкім сельсаветах. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Ударнік». У 1941 г. ў вёсцы 49 двароў, 255 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 18 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Чырвоны колас», з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», з 1963 г. — «Дзянісавічы», цяпер — калгаса

«Дзянісавічы». На 1.1.1998 г. 20 гаспадарак, 32 жыхары.

ПАСЁМКАВІЧЫ (да 1958 г. Гавенавічы), вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце. Вядома з сярэдзіны 18 ст. У 1772 г. маёнтак пана Кістаржэцкага, 12 двароў, у 1880 г. 24 двары, 132 жыхары. На 1.1.1897 г. вёска ў складзе Лісічанскай воласці Сенненскага павета, 29 двароў, 205 жыхароў, дзейнічалі школа пісьменнасці, хлебазапасны магазін. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Чарэйскім, Халопеніцкім, Крупскім раёнах. У 1929 г. створаны калгас «Трэці рашаючы». У 1941 г. 34 двары, 188 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 16 чалавек, у час акупацыі спалена 27 двароў, знішчаны 3 мірныя жыхары. З 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Шлях Леніна», з 1957 г. саўгаса, цяпер — калгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 19 гаспадарак, 27 жыхароў.

ПЛАВУЧАЕ ГАЛАЕ, пасёлак у Нацкім сельсавеце. Заснаваны ў 1950-я гады ў час торфараспрацовак пад назвай «Плавучае Галае» (ад назвы балота). У 1960-я гады вытворчы ўчастак пераведзены ў в. Ухвала. У вёсцы размяшчалася аддзяленне раённага аб'яднання «Сельгасхімія». Цяпер вёска ў складзе калгаса «Камунар». На 1.1.1998 г. 19 гаспадарак, 30 жыхароў. Крама.

ПЛІСА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Старадаўняе паселішча, на правым беразе р. Пліса знаходзіцца гарадзішча. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1772 г. як уласнасць Агінскіх, 29 двароў, 102 жыхары. Пазней сяло ў Бобрскай воласці Сенненскага павета. У Айчынную вайну 1812 г. часткова разбурана і спалена французамі. На 1.1.1897 г. 60 двароў, 357 жыхароў, царква, народнае вучылішча, царкоўнапрыходская школа. З 1924 г. ў складзе Бобрскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас «Перамога». У 1941 г. ў вёсцы 78 двароў, 256 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 57 чалавек, спалены 2 пабудовы. У 1950 г. калгас адноўлены, потым далучаны да калгаса «3-ці з'езд Саветаў». З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 53 гаспадаркі, 114 жыхароў. Крама.

ПРОШЫКА, вёска, цэнтр сельсавета. Вядома з сярэдзіны 18 ст. як уласнасць паноў Сапегаў. У 1772 г. 12 двароў, царква, вёска ў закладзе ў Салагуба. У 1778 г. 6 двароў, А.Сапега прадаў яе Томашу Гзоўскаму. З 1875 г. дзейнічала сукнавальня дваранiна Э.Шалкоўскага, здавалася ў арэнду. У 1881 г. на прадпрыемстве працаваў 1 чалавек, валавы даход складаў 140 руб. З 1892 г. працаваў мукамольны млын М.Трафімава, у 1895 г. працавалі 2 чалавекі. У 1897 г. засценак Лісічанскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 14 двароў, 86 жыхароў, паравы млын, царква. У 1909 г. ў вёсцы 20 двароў, 119 жыхароў. З 1924 г. ў Чарэйскім, Халопеніцкім, з 1931 г. Крупскім раёнах. У 1930-я гады створаны калгас. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 7 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1957 г. вёска ў складзе ўзбуйненага саўгаса «40 год Кастрычніка». Цяпер — цэнтр сельсавета. На 1.1.1998 г. 68 гаспадарак, 182 жыхары. Клуб, бібліятэка, сталовая, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, крама. Помнік на ўшанаванне памяці 95 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1963 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна з аўтаматам.

ПРУДЗЕЦ, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Заснавана ў пачатку 18 ст., належала панам Халецкім, потым уласнасць Храптовічаў, 9,9 валокі зямлі. У 1884 г. ў маёнтку пані Цітовай, 27 двароў, 111 мужчын, 130 жанчын, было 13 коней, 7 валоў, 20 кароў, 42 авечкі, 25 свіней, 14 калод пчол, 5,5 валокі зямлі. У пачатку 20 ст. 55 двароў, 365 жыхароў, у складзе Халопеніцкай воласці. У 1930 г. створаны калгас «Шлях сацыялізму». У 1941 г. ў вёсцы 52 двары, 213 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінуў 21 чалавек, знішчана 5 мірных жыхароў. Пасля вайны калгас аб'яднаўся з двума суседнімі, атрымаў назву імя Кірава. З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Халопенічы», з 1966 г. — саўгаса «Якімаўка», цяпер — калгаса «Якімаўка». На 1.1.1998 г. 44 гаспадаркі, 95 жыхароў. Крама.

ПРУДЗІНЫ (Прудзенская Слабада), вёска ў Абчугскім сельсавеце. Заснавана ў пачатку 17 ст., належала Станіславу Галінскаму. Упамінаецца ў інвентары Бобрскага маёнтка 1614 г. У 1667 г. 11 двароў, уласнасць аршанскага земскага суддзі Ераніма Камара, потым у закладзе ў Антонія Сіпайлы. У 1743 г. маёнтак, 7 «дымоў», уладанне Багдановіча. У 1909 г. вёска ў складзе Абчугскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 68 двароў, 443 жыхары. З 20.8.1924 г. ў Абчугскім сельсавеце Чарэйскага, з 8.7.1931 г. Крупскага раёнаў. У 1930 г. створаны калгас «Перамога». У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. па чэрвень 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі за-

хопнікамі. У ліпені 1943 г. гітлераўцы расстралялі 18 жыхароў за дапамогу партызанам. На франтах вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 27 чалавек. Цяпер вёска ў складзе калгаса «Слабада». На 1.1.1998 г. 32 гаспадаркі, 63 жыхары. Крама, жывёлагадоўчая ферма. Магіла ахвяр фашызму, пахаваны 18 мірных жыхароў, якіх у ліпені 1943 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПРУДОК, вёска ў Выдрыцкім сельсавеце. Вядома з канца 19 ст. З 1924 г. ў складзе Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Зорка». На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 14 чалавек, у партызанскай барацьбе — 6, знішчана 18 мірных жыхароў, дзейнічала падпольная група. Пасля вайны ў складзе калгаса імя Кірава. На 1.1.1998 г. 15 гаспадарак, 25 жыхароў.

ПРУСАЎШЧЫНА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Магчыма, назва вёскі паходзіць ад імя балцкай народнасці — прусаў. У 1897 г. 11 двароў, 73 жыхары, у 1909 г. вёска ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 8 двароў, 68 жыхароў. У 1917 г. 13 двароў, 85 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ва Ухвальскім сельсавеце Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «1-е Мая». У 1941 г. ў вёсцы 22 двары, 114 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 12 чалавек, знішчана 6 мірных жыхароў. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Варашылава, з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 11 гаспадарак, 14 жыхароў.

ПРЫКЛЁНАК, вёска ў Дакудаўскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 2-й паловы 19 ст. У 1897 г. 11 двароў, 71 жыхар, карчма. У 1909 г. засценак у складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 16 двароў, 101 жыхар, у 1917 г. 21 двор, 132 жыхары. З 20.8.1924 г. ў Малажаберыцкім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1941 г. ў вёсцы 13 двароў, 38 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 5 чалавек, знішчана 7 мірных жыхароў. Цяпер вёска ў складзе калгаса «Бальшавік». На 1.1.1998 г. 14 гаспадарак, 35 жыхароў.

ПРЫЯМІНА, вёска ў Нацкім сельсавеце. Паводле пісьмовых звестак вядома з канца 19 ст. У 1870 г. ў вёсцы 52 мужчыны. У 1908 г. вёска ў складзе Вяляціцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 15 двароў, 146 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Нацкім сельсавеце Крупскага раёна. У 1929 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны Кастрычнік». У 1940 г. ў вёсцы 34 двары, 159 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы размяшчаўся нямецкі гарнізон. У раёне чыгуначнай станцыі Прыяміна і в. Нача партызаны ўзарвалі больш за 20 эшалонаў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 20 чалавек, 3 чалавек загубілі гітлераўцы ў час акупацыі. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Молатава. У 1951 г. калгас далучыўся да калгаса «Камунар». На 1.1.1998 г. 19 гаспадарак, 30 жыхароў.

РАДЗІЦА, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Паводле пісьмовых звестак вядома з 1670 г., 5 двароў, паселішча Барысаўскага маёнтка. У 1775 г. 10 двароў, у 1795 г. 17 двароў, 168 жыхароў. У 1885 г. сяло на р. Блудына ў складзе Нацкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, былое ўладанне Радзівілаў, 22 двары, 190 жыхароў, царкоўны прыход. У 1909 г. вёска ў складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 73 двары, 476 жыхароў. У 1917 г. 79 двароў, 512 жыхароў, вадзяны млын, побач аднайменны хутар, 6 двароў, 53 жыхары. З 20.8.1927 г. ў Малажаберыцкім сельсавеце Крупскага раёна, з 1973 г. — у Ігрушкаўскім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны барацьбіт». На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 46 чалавек, 23 жыхары расстраляны фашыстамі ў час акупацыі. Пасля вайны калгас адноўлены. У 1950 г. калгас «Чырвоны барацьбіт» аб'яднаўся з трыма суседнімі калгасамі пад назвай «Усход» (цэнтр — в. Стараселле), у снежні 1960 г. вёска ў складзе калгаса «Гігант», у сакавіку 1960 г. — саўгаса «Халопенічы», з 1961 г. — саўгаса «Грушаўскі», з 1966 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Стараселле». На 1.1.1998 г. 56 двароў, 103 жыхары. Крама, ферма буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая.

РОТАНЬ, вёска ў Крупскім сельсавеце. У пачатку 18 ст. ў Худавецкім войтаўстве Чарэйскага маёнтка паноў Сапегаў, у 1713 г. 20 двароў. У 1775 г. 14 двароў. У 1884 г. вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 23 двары, 183 жыхары. У 1909 г. 32 двары, 232 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна, з сакавіка 1973 г. ў Круп-

скім сельсавеце. У 1931 г. жыхары вёсак Ротань, Буда і Скарадзіца аб'ядналіся ў калгас імя Молатава. У 1941 г. ў вёсцы 49 двароў, 250 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 30 чалавек, знішчана 18 мірных жыхароў. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Молатава, з 1958 г. — калгаса імя Колесавай. На 1.1.1998 г. 93 гаспадаркі, 233 жыхары. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі. Каля будынка праўлення калгаса помнік на ўшанаванне памяці 48 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1968 г. пастаўлена стэла.

САКАЛАВІЧЫ, веска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Упершыню ўпамінаецца ў 1516 г., належала маёнтку князёў Друцкіх. Атрымаў яе ў спадчыну Іван Красны, які завяшчаў сяло сваёй жонцы — Марыне Іванаўне з роду князёў Заслаўскіх. У 1559 г. належала графу Хадкевічу, 9 двароў. Пазней вёска належала Станіславу Пацу, потым Льву Сапегу, Станіславу Галінскаму, Крыштафу Камару. У 1772 г. вёска, 15 двароў, уласнасць Агінскіх. У Айчынную вайну 1812 г. вёска разбурана французамі. Пасля вайны ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У 1897 г. 25 двароў, 179 жыхароў, народнае вучылішча, вадзяны млын. Пасля 1917 г. цэнтр аднайменнага сельсавета Крупскага раёна, з 1954 г. далучана да Бобрскага сельсавета. У 1930-я гады створаны калгас «Шлях сацыялізму». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 54 вяскоўцы. Пасля вайны калгас аб'яднаны з трыма суседнімі, з 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 49 гаспадарак, 124 жыхары. Лясніцтва, аддзяленне сувязі, крама, клуб.

САМАСЕДАЎКА, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Вядома з канца 19 ст. У 1897 г. 20 двароў, 170 жыхароў. У 1909 г. вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 34 двары, 233 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Новы шлях». У 1941 г. ў вёсцы 51 двор, 168 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 14 чалавек, вёска амаль поўнасцю спалена. У 1944 г. адбудавана, з 1950 г. ў складзе ўзбуйненага калгаса «Гігант», з сакавіка 1960 г. — саўгаса «Халопенічы», з 1961 г. саўгаса, цяпер — калгаса «Грушаўскі». На 1.1.1998 г. 39 гаспадарак, 76 жыхароў. На тэрыторыі вёскі размешчана жывёлагадоўчая ферма. Брацкая магіла 20 савецкіх воінаў, якія загінулі летам 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

СВІРЫДАЎКА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Заснавана ў пачатку 18 ст. У 1764 г. цэнтр Свірыдаўскага староства, 15 двароў, уладанне Станкевічаў. У 1795 г. 19 двароў, 165 жыхароў. У 1897 г. 65 двароў, 422 жыхары, у 1909 г. вёска ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 75 двароў, 457 жыхароў. У 1917 г. 73 двары, 489 жыхароў, побач аднайменны хутар, 1 двор, 4 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Стараслабодскім сельсавеце Крупскага раёна, з 4.1.1967 г. ва Ухвальскім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Леніна. У 1941 г. ў вёсцы 33 двары, 150 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 15 чалавек, знішчана 5 мірных жыхароў. Вёска часткова была спалена. Пасля вайны адбудавана, з 1950 г. да калгаса далучаны 2 суседнія калгасы, з 1959 г. вёска ў складзе саўгаса «Ухвала», з 1968 г. — саўгаса «Новая ніва», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 19 гаспадарак, 31 жыхар.

СЕЛІШЧА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Каля вёскі захаваліся курганныя могільнікі, што сведчаць аб засяленні гэтай мясцовасці ў далёкай старажытнасці. Вядома з пачатку 19 ст. У 1818 г. 4 двары, 33 жыхары, уласнасць князя Радзівіла. У 1845 г. 44 жыхары, належала князям Радзівілам. У 1909 г. ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 18 двароў, 116 жыхароў. У 1917 г. 22 двары, 133 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Стараслабодскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, потым Мінскай, Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 4.1.1964 г. ва Ухвальскім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Камунар». У 1941 г. ў вёсцы 31 двор, 153 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну вёска была часткова спалена, загінулі 14 чалавек. У 1944 г. адбудавана, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Чырвоная Слабада», з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», з 1968 г. — «Новая ніва», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 20 гаспадарак, 39 жыхароў.

СІНІЧАНКА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Вядома з 1772 г. як уласнасць князёў Сангушкаў. У 1883 г. вёска ў складзе

Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 7 двароў, 54 жыхары. Асноўны занятак насельніцтва — абутковы і колавы промыслы. У пачатку 20 ст. 14 двароў, 133 жыхары. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады вёска ў Шэйкаўскім, потым Бобрскім сельсавеце Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас «Новае жыццё». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 9 чалавек. Пасля вайны ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Дзяржынскага, потым — калгаса «Чырвоны Бобр», з 1967 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 19 гаспадарак, 27 жыхароў.

СКАКОЎКА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Заснавана ў 1670 г. У той час паселішча складалася з аднаго двара, адносілася да Барысаўскага староства, Сакольскага царкоўнага прыходу. У 1764 г. 5 двароў, у 1781 г. 6 двароў, у 1795 г. 5 двароў, 32 жыхары. Вёска перайшла ва ўласнасць вядомага магната Міхала Радзівілы. У 1818 г. 10 двароў, 60 жыхароў, было 17 коней, 17 кароў, авечкі, свінні, 8 валок ворыўнай зямлі і 1,6 валокі сенакосу. У 1909 г. вёска ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета, 182 жыхары. Да 1917 г. налічвалася 29 двароў, 206 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Сакалавіцкага, потым Бобрскага сельсаветаў Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас імя Будзённага. У 1941 г. ў вёсцы 43 двары, 202 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 32 чалавекі, вёска была часткова спалена. Пасля вайны вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Перамога», з 1960 г. — саўгаса, цяпер калгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 26 гаспадарак, 49 жыхароў.

СКАРАДЗІЦА, вёска ў Крупскім сельсавеце. Заснавана ў 1-й палове 18 ст., уваходзіла ў Худавецкае войтаўства. У 1713 г. 9 двароў, уладанне паноў Сапегаў. У 1778 г. прададзена Томашу Гзоўскаму, 2 двары. У 1909 г. вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 12 двароў, 95 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна, з сакавіка 1973 г. ў Крупскім сельсавеце. У 1930-я гады жыхары вёсак Скарадзіца, Ротань і Буда аб'ядналіся ў калгас імя Молатава. У 1941 г. ў вёсцы 14 двароў, 67 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 4 чалавекі, у 1944 г. калгас адноўлены, з 1958 г. вёска ў складзе калгаса імя Колесавай. На 1.1.1998 г. 1 гаспадарка, 1 жыхар.

СЛАБАДА, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Назва паходзіць ад пасялення, якое часова было вызвалена ад уплаты павіннасцей. Вядома з 1699 г. як «Чырвоная Слабада». Адносілася да Баброўскага маёнтка, уладанне Бенедыкта Сапегі. У 1772 г. ў вёсцы 4 двары, належала шляхціцу Рашкоўскаму. З 1793 г. ў складзе Абчугскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У пачатку 20 ст. 36 двароў, 215 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Чарэйскага, з 1931 г. — Крупскага раёнаў. У 1930-я гады створаны калгас «Светлая зара». У 1941 г. ў вёсцы 54 двары, 286 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 16 чалавек, вёска была часткова спалена, знішчаны 3 мірныя жыхары. Пасля вайны вёска — цэнтр саўгаса, потым — калгаса «Слабада». На 1.1.1998 г. 75 двароў, 190 жыхароў.

СЛАБАДА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Заснавана ў 1775 г., уласнасць Іахіма Храптовіча, 9 двароў, у 1777 г. 36 двароў, 146 жыхароў, 10,7 валокі зямлі. У 1909 г. 81 двор, 510 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Халопеніцкага, потым Крупскага раёнаў. У 1931 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Пралетарская перамога». У 1941 г. ў вёсцы 126 двароў, 513 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы размяшчаўся нямецкі гарнізон. У 1944 г. партызаны ўзарвалі мост цераз р. Эса і напалі на гарнізон. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 67 чалавек. Пасля вайны калгас далучаны да калгаса «Энергія». З 20.1.1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Эса», з 1965 г. — цэнтр эксперыментальнай базы «Эса». На 1.1.1998 г. 22 гаспадаркі, 643 жыхары. Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, крама, майстэрні саўгаса, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая. Каля канторы саўгаса помнік на ўшанаванне аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1978 г. пастаўлены 3 мармуровыя стэлы, на цэнтральнай — выява ордэна Айчыннай вайны, на бакавых — імёны загінуўшых.

СМАРОДЗІНКА (Смардзянка), вёска ў Абчугскім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў пачатку 18 ст., уласнасць паноў Сапегаў. У 1713 г. 29 дамоў, у 1775 г. 11 двароў, у 1778 г. вёска прададзена Ераніму Гшасныцкаму. У Айчынную вайну 1812 г. спалена французамі. У 1909 г. сяло, 24 двары, 196 жыхароў, царква, у 1909 г. ў складзе Абчугскай воласці Сенненскага павета, адкрыта народнае вучылішча. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Чарэйскага раёна Барысаў-

скай, потым Аршанскай акруг, з 8.7.1931 г. Крупскага раёна, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 16.7.1954 г. ў Абчугскім сельсавеце. У 1930-я гады жыхары вёсак Смародзінка, Луцішча, Кутавец і Шкорнеўка аб'ядналіся ў калгас імя Сталіна. У 1941 г. ў вёсцы 53 двары, 308 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 28 чалавек, вёска была часткова спалена, знішчана 25 мірных жыхароў. Вызвалена 28 чэрвеня 1944 г. воінамі 5-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Зараз вёска ў складзе калгаса «Слабада». На 1.1.1998 г. 33 гаспадаркі, 77 жыхароў. Няпоўная сярэдняя школа, аддзяленне сувязі, крама, жывёлагадоўчая ферма. У скверы, каля будынка школы, брацкая магіла 67 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1965 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптуры воіна са сцягам і партызанкі з аўтаматам.

СОМРЫ, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Вядома з 1639 г. як вёска Барысаўскага староства, уласнасць Адама Казаноўскага. У 1670 г. 5 двароў, у 1781 г. 8, у 1795 г. 10 двароў, 87 жыхароў. Пасля далучэння да Расійскай імперыі ўласнасць князёў Радзівілаў. У 1818 г. 13 двароў, 104 жыхары, у 1845 г. 17 двароў, 142 жыхары, у 1897 г. ў складзе Эсьмонскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 34 двары, 401 жыхар, царква. У 1917 г. ў вёсцы 42 двары, 330 жыхароў, на смалакурным заводзе 1 двор, 9 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Старасланодскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай акругі, потым Мінскага раёна Аршанскай акругі, з 26.7.1930 г. Крупскага раёна, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 4.1.1964 г. ва Ухвальскім сельсавеце. У 1930-я гады створаны калгас «Чырвоная зорка». У 1941 г. 65 двароў, 322 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну ў 1941 г. каля вёскі вялі баі воіны 100-й дывізіі. Тут здзейсніў свой подзвіг і загінуў Герой Савецкага Саюза Я.Дз.Бяляеў. У гады акупацыі ў лістападзе 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 132 жыхары. На франтах вайны і ў партызанскай барацьбе загінуў 31 чалавек. Пасля вайны вёска адбудавана. У 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя У.І.Леніна, з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», з 1968 г. — саўгаса «Новая ніва», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 24 гаспадаркі, 41 жыхар. Пачатковая школа. У вёсцы магіла ахвяр фашызму, пахаваны 180 жыхароў вёскі, якіх у кастрычніку 1942 г. загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПАДАННЕ ПРА НАЗВУ ВЁСКІ

У далёкім мінулым жыў у гэтай мясцовасці прыгожы і смелы юнак. Звалі яго Самрак. Вёска знаходзілася сярод дрымучых лясоў і балот. Ніводная душа не ведала да яе сцяжынкі. Аднойчы ўдзень, калі мужчыны былі на сенажаці, напалі на вёску чужынцы. Яны зняславілі маладых дзяўчат, забілі ўсіх, хто знаходзіўся ў хатах, абрабавалі вёску. У вёсцы жыла прыгожая дзяўчына, якую Самрак моцна кахаў. Калі вярнуўся ён вечарам з сенажаці, то не знайшоў у жывых каханку. Помстай загарэлася яго сэрца за зняважанае каханне, за слёзы і кроў аднавяскоўцаў. Сабраў Самрак мужчын, узялі яны ў рукі зброю, селі на коней і кінуліся ў пагоню за ворагам. Дагналі, калі тыя на ўскрайку стромкага бору спакойна балявалі ля вогнішчаў, і ўсіх перабілі. Асабліва вызначыўся смеласцю і спрытам Самрак, таму аднавяскоўцы аднадушна выбралі яго сваім важаком. Праз нейкі час чужынцы зноў рушылі на вёску. Непадалёку ад невялічкай рэчкі атрад Самрака сустрэў ворагаў. Сілы карнікаў былі значна большыя, у баі вяскоўцы і Самрак загінулі. Уцалелыя жыхары потым перасяліліся на той бераг рэчкі, дзе загінулі іх абаронцы. У гонар свайго важака яны назвалі рэчку Самранкай, а новую вёску Сомры.

СТАІ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1772 г. як уласнасць князёў Сангушкаў. У 1775 г. 4 гаспадаркі. У канцы 19 ст. 19 двароў, 44 жыхары. У 1909 г. ў вёсцы 20 двароў, 150 жыхароў. Вёска была вядома майстрамі колавага промыслу. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Шэйкаўскага, потым Бобрскага сельсаветаў Крупскага раёна. У 1930-я гады створаны калгас «Прасвет». У Вялікую Айчынную вайну загінулі 18 чалавек. Пасля вайны вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Дзяржынскага, з 1960 г. — калгаса «Чырвоны Бобр», цяпер — саўгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 11 гаспадарак, 15 жыхароў.

СТАРАСЕЛЛЕ, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Вядома з 2-й паловы 18 ст. У 1772 г. 9 двароў, у складзе маёнтка князёў Сангушкаў. У 1775 г. 8 двароў, у 1897 г. 28 двароў, 181 жыхар. У 1909 г. 35 двароў, 243 жыхары, у складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У вёсцы ў 1912 г. адкрыта народнае вучылішча. З

20.8.1924 г. ў складзе Малажаберыцкага сельсавета Крупскага раёна, з сакавіка 1973 г. — Ігрушкаўскага сельсавета Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Усход». У 1941 г. ў вёсцы 47 двароў, 195 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 12 чалавек, вёска была часткова спалена. Пасля вайны калгас адноўлены, з 1950 г. да яго далучаны 3 суседнія калгасы. Са снежня 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Гігант», з сакавіка 1960 г. — саўгаса «Халопенічы», з 4.2.1966 г. цэнтр саўгаса, цяпер — калгаса «Староселле». На 1.1.1998 г. 90 гаспадарак, 243 жыхары. Аддзяленне сувязі, крама, бібліятэка, базавая школа, дзіцячы сад, майстэрні, жывёлагадоўчая ферма. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

СТАРАЯ ПЯРЭСІКА (Перасецкая зямля), вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце, уладанне князя Андрэя Іванавіча Друцкага-Азярэцкага, атрыманае ім у спадчыну ад дзеда князя Івана Бабы. У 1562 г. сяло маёнтка Худава, сумеснае ўладанне князёў Друцкіх-Азярэцкіх і нашчадкаў княжны Сенскай — паноў Корсакаў. У 1624 г. ў маёнтку Чарэя, уласнасць Льва Сапегі, 16 валок зямлі. У 1775 г. вёска маёнтка Бобр, уласнасць князя Агінскага, 32 «дымы». У 1873 г. 158 мужчын, у 1897 г. 86 двароў, 586 жыхароў, у 1909 г. 94 двары, 516 жыхароў, хлебазапасны магазін, вінная лаўка, царква. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Узнацкага сельсавета Халопеніцкага, потым Крупскага раёнаў. У 1931 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Новы шлях». У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы размяшчаўся нямецкі гарнізон, у 1943 г. на яго напалі партызаны. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 27 чалавек, 17 мірных жыхароў расстралялі гітлераўцы. У 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса «Прызыў». На 1.1.1998 г. 27 гаспадарак, 48 жыхароў. Жывёлагадоўчая ферма.

СТАРАЯ СЛАБАДА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 2-й паловы 19 ст. У 1897 г. 47 двароў, 310 жыхароў, у 1909 г. ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 58 двароў, 449 жыхароў. У 1917 г. 70 двароў, 462 жыхары, побач аднайменны хутар, 1 двор, 6 жыхароў. У 1912 г. адкрыта народнае вучылішча. З 20.8.1924 г. цэнтр Стараслабодскага сельсавета Крупскага раёна, з 4.1.1964 г. вёска ў складзе Ухвальскага сельсавета. У 1930-я гады створаны калгас «Чырвоная Слабада». У 1941 г. ў вёсцы 77 двароў, 321 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну дзейнічала падпольная група. На франтах Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 53 чалавекі, гітлераўцы расстралялі больш за 100 чалавек у час акупацыі, спалена большасць пабудоў. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. да яго далучаны 3 суседнія калгасы, з 1959 г. вёска ў складзе саўгаса «Ухвала», з 1968 г. — цэнтр саўгаса «Новая ніва». Цяпер у складзе калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 90 гаспадарак, 242 жыхары. Аддзяленне сувязі, лясніцтва, крама, сярэдняя школа, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт, жывёлагадоўчая ферма. У цэнтры вёскі, каля будынка школы, у 1979 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці 104 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.

СТАРОЖЫШЧА, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1772 г. як уласнасць пана Салагуба, 14 двароў. У 1897 г. фальварак, 1 двор, 11 жыхароў, у 1909 г. маёнтак, 2 жыхары, уладанне пана Багушэўскага. З 1924 г. ў Чарэйскім, Крупскім раёнах, створана дзіцячая камуна, у 1925 г. закрыта. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны барэц». У 1941 г. 32 гаспадаркі, 135 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 20 чалавек. У час акупацыі гітлераўцы загубілі 12 жыхароў. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса імя Леніна, з 1968 г. — саўгаса, цяпер — калгаса «Дуброўка». На 1.1.1998 г. 8 гаспадарак, 12 жыхароў.

СТАРЫ БОБР (Забабруе), вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Каля вёскі захаваліся курганныя могільнікі, якія сведчаць аб засяленні гэтай мясцовасці ў далёкай старажытнасці. Вядома з 16 ст., сяло, уласнасць Хадкевічаў. Пасля ў закладзе ў магната Станіслава Паца, 20 двароў. Пасля смерці Паца належала канцлеру Вялікага княства Літоўскага Льву Сапегу, які перазаклаў яго свайму слузе Станіславу, а той — Крыштафу Камару. У 1772 г. 23 двары, уласнасць Агінскіх. У 1883 г. ў складзе Бобрскай воласці, 49 двароў, 262 жыхары. У 1917 г. 71 двор, 495 жыхароў. Асноўны занятак насельніцтва — коларавы промысел. З 1924 г. ў складзе Бобрскага сельсавета. У 1930-я гады вяскоўцы арганізавалі калгас «Чырвоны Бобр». На

франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 44 чалавекі. З 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Колас». На 1.1.1998 г. 28 гаспадарак, 47 жыхароў. Каля будынка клуба брацкая магіла 7 савецкіх воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск.

СТАРЫ САКОЛ, вёска ў Дзянісавіцкім сельсавеце. Заснавана ў сярэдзіне 17 ст. У 1670 г. 8 двароў, у 1772 г. 70 мужчын, дзейнічала царква. У канцы 18 ст. ў вёсцы 24 двары, 235 жыхароў, уваходзіла ў Барысаўскі маёнтак. У сярэдзіне 19 ст. ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 6 двароў, 50 чалавек, 19 валок зямлі (каля 80 га). Пасля ўстанаўлення Савецкай улады вёска ў складзе Ухвальскага, потым Дзянісавіцкага сельсаветаў Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы арганізавалі калгас «Іскра». У 1941 г. ў вёсцы 34 двары, 194 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 15 чалавек. З 1963 г. вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Дзянісавічы». На 1.1.1998 г. 29 гаспадарак, 64 жыхары.

СТАРЫЯ ДЗЯНІСАВІЧЫ, вёска ў Дзянісавіцкім сельсавеце. Упершыню згадваецца ў 1670 г. Існуе паданне, што заснавальнікамі паселішча былі 2 былыя селяніны, магчыма, з ліку паўстанцаў Б. Хмяльніцкага, Кляшчонка і Макарэвіч. Назва вёскі паходзіць ад імя аднаго з іх — Дзяніса, які вызначыўся ў час барацьбы супраць польскіх улад. У 1792 г. 17 двароў, каля 150 жыхароў. Вёска ў складзе Барысаўскага маёнтка Радзівілаў і Сакальскага царкоўнага прыходу. У Айчынную вайну 1812 г. каля вёскі дыслацыраваліся асноўныя сілы расійскай арміі Кутузава, пражывала больш за 200 чалавек. У сярэдзіне 19 ст. было каля 300 жыхароў, у канцы 19 ст. 89 двароў, 594 жыхары, млын, часоўня, хлебазапасны магазін. У 1917 г. ў вёсцы 162 двары, 1083 жыхары. 20.8.1924 г. ў складзе Крупскага раёна. У 1920-я гады частка жыхароў адсялілася. У 1930-я гады створаны калгас «Трактар». У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы размяшчаўся варожы гарнізон, 28.9.1942 г. быў знішчаны партызанамі 8-й брыгады. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 42 жыхары, 5 у партызанскай барацьбе. Вёска была часткова спалена. Пасля вайны створаны калгас «Маяк сацыялізму». З 1959 г. ў складзе саўгаса «Ухвала», з 1963 г. створаны асобны саўгас, зараз калгас «Дзянісавічы». На 1.1.1998 г. ў в. Старыя Дзянісавічы 36 двароў, 56 жыхароў.

СТАРЫЯ ПЫШАЧЫ, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Вядома з 1841 г. У 1886 г. сяло, 32 двары, царква, у 1897 г. 68 двароў, 426 жыхароў, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, лаўка, карчма, царква. У 1909 г. 61 двор, 443 жыхары, у складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1917 г. 76 двароў, 471 жыхар. З 20.8.1924 г. вёска ў Стараслабодскім сельсавеце Крупскага раёна Барысаўскай, з 9.6.1927 г. Мінскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці, з 4.1.1964 г. ва Ухвальскім сельсавеце. У 1930 г. створаны калгас «Новы шлях». У 1941 г. ў вёсцы 54 двары, 186 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На франтах вайны загінулі 18 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены, у 1950 г. аб'яднаўся з калгасам «Чырвоная Слабада», з 1959 г. вёска ў складзе саўгаса «Ухвала», з 1968 г. — «Новая ніва» (цэнтр в. Старая Слабада), цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 35 гаспадарак, 56 жыхароў. Магазін, малочнатаварная ферма.

СТАРЫЯ ШЧАЎРЫ, вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце. Вядома з 2-й паловы 18 ст., адносілася да Чарэйскага маёнтка паноў Сапегаў. У 1772 г. 8 двароў, у закладзе ў Салагуба, царква. У Айчынную вайну 1812 г. разбурана французамі. У 1958 г. ўладанне Ю.С.Раткоўскага, карчма, у 1873 г. ў сяле 105 мужчын, у 1897 г. ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 61 двор, 418 жыхароў, царква, царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. ў сяле 58 двароў, 344 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў. У 1931 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «1-е Мая». У 1941 г. ў вёсцы 74 двары, 304 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. па чэрвень 1944 г. акупіравана. У вёсцы дзейнічала падпольная група. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 33, у партызанскай барацьбе 3 вяскоўцы. У час акупацыі расстраляны 3 жыхары. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. да яго далучаны калгасы суседніх вёсак, быў створаны калгас імя Сталіна. У 1957 г. перайменаваны ў калгас «Знамя камунізму». З 1986 г. вёска ў складзе калгаса «Чырвоны Кастрычнік». На 1.1.1998 г. 83 гаспадаркі, 216 жыхароў. Крама, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, базавая школа, клуб, жывёлагадоўчая ферма.

СТРАЛЬЦЫ, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце (цяпер не існуе). У пачатку 20 ст. 29 двароў. У 1931 г. вяскоўцы арганізавалі калгас «Чырвоны будаўнік». У 1941 г. ў вёсцы 22 двары, 72 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 17 чалавек, 5 жыхароў у час акупацыі. У 1965 г. ў складзе калгаса «40 год Кастрычніка».

СТРУГА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Заснавана ў 1-й палове 18 ст. У 1770-я гады належала ордэну езуітаў, 14 двароў, 13 жыхароў, 6,2 валокі зямлі. У 1795 г. вёска, уласнасць Іахіма Храптовіча, потым пані Цітовай. У 1884 г. 96 жыхароў, 5,2 валокі зямлі, у 1897 г. 20 двароў, 135 жыхароў. З 1924 г. вёска ў складзе Халопеніцкага, потым Крупскага раёнаў. У 1930-я гады створаны калгас. У 1941 г. ў вёсцы 21 двор, 87 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 14 чалавек. Пасля вайны вёска ў складзе эксперыментальнай базы «Эса». На 1.1.1998 г. 11 гаспадарак, 19 жыхароў.

СТУДЗЁНКА, вёска ў Крупскім сельсавеце. Заснавана ў пачатку 18 ст., уваходзіла ў Худавецкае войтаўства. У 1713 г. 17 двароў, у 1775 г. ўладанне Агінскіх, 8 гаспадарак. У 1713 г. 17 двароў, у 1775 г. ўладанне Агінскіх, 8 гаспадарак. У 1873 г. 12 мужчын. У 1909 г. вёска ў Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 14 двароў, 47 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна, з сакавіка 1973 г. ў Крупскім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны май». У 1941 г. ў вёсцы 18 двароў, 65 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 12 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Молатава, з 1958 г. — калгаса імя Колесавай. На 1.1.1998 г. 2 гаспадаркі, 5 жыхароў.

СЯЛІЦКАЕ, вёска ў Крупскім сельсавеце. У 1897 г. хутар, 6 двароў, 71 жыхар. У 1909 г. хутар у Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 10 двароў, 72 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Крупскім раёне Барысаўскай, з 9.6.1927 г. Мінскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас. У 1941 г. ў вёсцы 23 двары, 107 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. па чэрвень 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, загінулі 20 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1960 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Варашылава, з 1962 г. — калгаса «Перамога», з 1986 г. — калгаса імя Леніна. На 1.1.1998 г. 24 гаспадаркі, 48 жыхароў. Ферма па вырошчванні буйной рагатай жывёлы.

ТАПАРЫШЧА, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1713 г. як уласнасць пана Салагуба, 26 двароў, 10 валок зямлі. У 1909 г. 32 двары, 258 жыхароў, у складзе Абчугскай воласці Сенненскага павета, з 1924 г. — Дубаўскага сельсавета Чарэйскага, з 1931 г. — Крупскага раёнаў. У 1929 г. створаны калгас «Полымя рэвалюцыі». У пачатку вайны 53 гаспадаркі, 165 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 23 чалавекі, знішчана 8 мірных жыхароў. З 1957 г. вёска ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка». На 1.1.1998 г. 24 гаспадаркі, 43 жыхары. Крама, жывёлагадоўчая ферма.

ТРУДАВІК, пасёлак ва Ухвальскім сельсавеце. Створаны ў гады Савецкай улады. З 20.8.1924 г. ў складзе Стараслабодскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Трудавік». У 1941 г. ў вёсцы 13 двароў, 73 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 4 чалавекі. Пасля вайны вёска ў складзе саўгаса «Новая ніва», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 9 гаспадарак, 16 жыхароў.

ТУМАНАВА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце (цяпер не існуе). У 1873 г. вёска ў Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 14 мужчын. У 1897 г. 7 двароў, 43 жыхары, у 1909 г. 7 двароў, 53 жыхары. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Бобрскага сельсавета Крупскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 2 чалавекі.

УЗНАЖ, вёска ва Ухвальскім сельсавеце. Заснавана ў сярэдзіне 17 ст. У 1670 г. 2 двары, уваходзіла ў Барысаўскі маёнтак, у 1781 г. 8 двароў, у 1795 г. 12 двароў, 131 жыхар. У 1909 г. вёска ў складзе Дзмітрыеўскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 26 двароў, 241 жыхар. У 1912 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1917 г. 42 двары, 247 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Выдрыцкім сельсавеце Крупскага раёна, з сакавіка 1973 г. ва Ухвальскім сельсавеце. У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас імя Молатава. У 1940 г. 68 двароў, 378 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у кастрычніку 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 361 жыхара. Пасля вайны вёска адбудавана. У 1950 г. калгас аб'яднаўся з калгасам «Пралетарская перамога». З 1959 г. вёска ў скла-

дзе саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». На 1.1.1998 г. 1 гаспадарка, 2 жыхары. У цэнтры вёскі магіла ахвяр фашызму, пахаваны 360 мірных жыхароў, якіх 14.10.1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1961 г. на магіле пастаўлены абеліск.

УЗНАЦК, вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце. Вядома з 2-й паловы 18 ст. У 1772 г. 29 двароў, у 1795 г. 40 двароў, 146 жыхароў, уласнасць Іахіма Храптовіча. У 1870 г. ў вёсцы 74 мужчыны. У 1909 г. ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 68 двароў, 649 жыхароў. У 1917 г. 83 двары, 607 жыхароў. У 1912 г. адкрыта народнае вучылішча. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Магілёўскай губерні. З 20.8.1924 г. цэнтр Узнацкага сельсавета Халопеніцкага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага раёнаў, 16.7.1954 г. сельсавет ліквідаваны, тэрыторыя далучана да Халопеніцкага сельсавета Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў, з 1973 г. ў складзе Ігрушкаўскага сельсавета. У 1931 г. жыхары вёсак Узнацк і Старая Пярэсіка аб'ядналіся ў калгас «Новы шлях». У 1941 г. ў вёсцы 90 двароў, 510 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну цэнтр воласці, у вёсцы размяшчаўся нямецкі гарнізон. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 35 чалавек, знішчана 20 мірных жыхароў. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1950 г. да яго далучаны калгас «Чырвоная зорка», з 1960 г. вёска ў складзе саўгаса «Халопенічы», цяпер — цэнтр калгаса «Прыдыў». На 1.1.1998 г. 135 гаспадарак, 368 жыхароў. Аддзяленне сувязі, крама, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, майстэрні, жывёлагадоўчая ферма. Брацкая магіла 3 савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, каля 30 ваеннапалонных і мірных жыхароў, закатаваных акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск. Каля канторы калгаса помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.



Помнік землякам у в. Узнацк.

УСОХІ, вёска ў Крупскім сельсавеце. Заснавана ў пачатку 19 ст. У 1818 г. 5 двароў, 32 жыхары, уваходзіла ў Барысаўскі маёнтак князя Міхаіла Радзівіла. У 1845 г. ўласнасць Льва Радзівіла, 5 двароў, 45 жыхароў, 7 коней, 10 кароў, 80 га зямлі. У 1907 г. ў складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 7 двароў, 53 жыхары. У 1917 г. вёска, 7 двароў, 52 жыхары, побач аднайменны хутар, 3 двары, 29 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Крупскім раёне. У 1930-я гады жыхары вёсак Усохі, Вялікая і Малая Слабада аб'ядналіся ў калгас імя Варашылава. У 1941 г. ў вёсцы 21 двор, 68 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 10 чалавек. Пасля вайны калгас адноўлены, у 1962 г. перайменаваны ў калгас «Перамога». Цяпер вёска ў складзе калгаса імя Леніна. На 1.1.1998 г. 8 гаспадарак, 12 жыхароў.

УСЦІНАЎКА, вёска ў Крупскім сельсавеце. У 1897 г. пасёлак у складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 5 двароў, 28 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска ў Ігрушкаўскім сельсавеце Крупскага раёна, з 28.7.1954 г. ў Крупскім сельсавеце. У 1929 г. жыхары вёсак Усцінаўка і Карпушоўка аб'ядналіся ў калгас «Новы лад». На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 4 чалавекі. Пасля вайны адноўлены калгас, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса «Ленінец», з 1951 г. — калгаса імя Леніна. На 1.1.1998 г. 6 гаспадарак, 9 жыхароў.

УХВАЛА, вёска, цэнтр сельсавета. Назву вёскі па паданні далі першыя пасяленцы. Вядома з 1670 г., сяло Барысаўскага маёнтка, 5 двароў. У 1772 г. 30 двароў, царква. У 1795 г. 33 двары, 205 жыхароў. У 1818 г. 44 двары, больш за 240 жыхароў, уласнасць князёў Радзівілаў. У 1825 г. пабудавана царква. У сярэдзіне 19 ст. 38 двароў, 170 жыхароў. У 1866 г. ў сяле 50 двароў, 2 царквы, у 1885 г. 55 двароў, 402 жыхары, цэнтр Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1897 г. 79 двароў, 517 жыхароў, народнае вучылішча, валасное праўленне, царква, вадзяны млын, кузня, 3 лаўкі, карчма, хлеба-

запасны магазін. У 1909 г. 110 двароў, 587 жыхароў, у 1917 г. 137 двароў, 810 жыхароў, паштова-тэлеграфнае аддзяленне. З 29.8.1919 г. па 10.8.1920 г. цэнтр Ухвальскай воласці Гомельскай губерні, з 17.7.1924 г. Барысаўскай, з 18.6.1927 г. Крупскага раёна Аршанскай акруг, з 20.2.1938 г. Мінскай вобласці. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Прасвет». У 1931 г. пабудавана сямігадовая школа, навучалася каля 100 школьнікаў. У 1934 г. пабудаваны млын, электрастанцыя на р. Можа. У 1940 г. ў вёсцы створана вучылішча па падрыхтоўцы трактарыстаў, работнікаў лесу, працаваў механізаваны пункт па вывазцы лесу, дзейнічала бальніца. У 1941 г. ў вёсцы 154 двары, 762 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, у вёсцы размяшчаўся нямецкі гарнізон. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 65 чалавек. Вёска часткова спалена, знішчаны 144 мірныя жыхары. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе ўзбуйненага калгаса імя Кірава, з 1959 г. — саўгаса «Ухвала», цяпер — калгаса «Ніва». У 1954 г. пабудавана новая школа, з 1959 г. дзейнічае торфабрыкетны завод. У 1983 г. пабудаваны Дом культуры. На 1.1.1998 г. 370 гаспадарак, 1035 жыхароў. У вёсцы размешчаны школа, Дом культуры, торфабрыкетны завод, аддзяленне сувязі, 3 крамы, бібліятэка, бальніца, дзіцячы сад, лясніцтва, 3 вытворчыя пабудовы, майстэрні калгаса, жывёлагадоўчая ферма. Каля вёскі брацкая магіла, пахаваны 38 воінаў, якія загінулі ўлетку 1944 г. ў баях пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — воіны 174-й стралковай дывізіі 113-га стралковага корпуса 31-й арміі 3-га Беларускага фронту і воіны 23-й гвардзейскай асобнай танкавай брыгады 2-га Беларускага фронту. У 1961 г. на магіле пастаўлены абеліск. Магіла ахвяр фашызму, пахаваны 150 мірных жыхароў, закатаваных нямецка-фашысцкімі карнікамі 14.10.1942 г. У 1963 г. на магіле ўстаноўлены абеліск. У 1966 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці 126 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ХАЛОПЕНІЧЫ (Халопенавічы, Халопічыцы, Хлопавічы), гарадскі пасёлак, цэнтр пасялковага Савета. Вядомы з 1451 г., уласнасць князя Фёдара Даўгоўдавіча, пажалаваная Міхаілу Кезгайлу. З 1954 г. ўласнасць Мальхера Войцахавіча Шэмета, з 1610 г. маёнтак Войцаха Манівіда Даргастайскага, з 1620 г. — паноў Нонгартаў (37 двароў). У 1621—35 гг. цэнтр маёнтка ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства, уласнасць пана Міхала Млечкі, дзейнічала праваслаўная царква. У 1667 г. уладанне Мікалая Цеханавецкага, у 1669 г. пабудаваны мураваны кляштар дамініканцаў, 260 «дымоў». У 1690 г. належаў Гадэону Аляксандру Халецкаму, у 1703 г. ім быў пабудаваны драўляны касцёл, у 1712 г. — царква. У 1748 г. Антоній Халецкі частку маёнтка перадаў Антонію Астрэйку Арэшку, засталося 116 двароў. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) Халопенічы — цэнтр Аршанскага павета (той яго часткі, якая засталася ў складзе Вялікага княства Літоўскага), мелі правы горада, былі месцам правядзення павятовых сеймікаў, перайшлі да Марыіна Храптовіча. У 1775 г. маёнтак Іахіма Храптовіча, называўся Халопеніцкім графствам, 127 двароў, касцёл, кляштар дамініканцаў, царква. У 1775—93 гг. Халопенічы належалі да ліку так званых юрыдычных пасяленняў. Пры Іахіму Храптовічу была адкрыта адна з першых у Беларусі свецкая школа, падпарадкоўвалася Адукацыйнай камісіі. У 1777 г. граматай кароля Станіслава Панятоўскага дазволена заснаванне ў Халопенічах кірмаша. У 1783 г. мястэчка атрымала шэраг эканамічных ільгот. Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Расіі, мястэчка, цэнтр Мінскай губерні. У Айчынную вайну 1812 г. маёнтак графа Храптовіча быў разбураны. У 1828 г. пабудавана драўляная Успенская царква, у 1840 г. — вінакурны завод. У 1844 г. ў мястэчку 586 прыгонных сялян, 5 сямей дваран, 6 мяшчан, 105 сямей яўрэяў, цэнтр воласці, існавалі 2 яўрэйскія школы, касцёл, сінагога, царква, заезны дом, цагляны завод. У 1863—64 г. адкрыта народнае вучылішча, пабудавана каменная царква, маёнтак належаў Аляксандру і Лапу Гаркоўскім, у 1867 г. перайшоў да Рудольфа Вількена. У мястэчку пражывала 1500 чалавек. У 1874 г. Халопенічы спасцігла эпідэмія воспы, што прывяло да значнай смяротнасці жыхароў. Магчыма, з нагоды пазбаўлення ад гэтай хваробы ў 1882 г. ў мястэчку пабудавана драўляная царква. У 1884 г. ўстаноўлена паравая машына (7 рабочых), у 1865 г. — ільнотрапалка (17 рабочых у 1895), у 1898 г. — паравы млын (3 рабочыя). З ваколіц мястэчка пастаўляўся мачтавы лес для флоту. Паводле перапісу 1897 г. 2254 жыхары, царква, касцёл, аднакласнае народнае вучылішча, бальніца, паштова-тэлеграфнае аддзяленне, 15 крам, адбываліся 2 кірмашы ў год. У 1900

г. 255 двароў, 2196 жыхароў, у 1913 г. адкрыта земская бальніца. У лютым—лістападзе 1918 г. мястэчка акупіравана войскамі Германіі. З 29.8.1919 г. цэнтр Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Магілёўскай губерні РСФСР, з 10.8.1920 г. Мінскай губерні БССР. 8.8.1920 г. ў Халопенічах адбыўся сход прадстаўнікоў Халопеніцкай воласці, прысутнічала больш за 200 сялян, якія прынялі рэзалюцыю ў падтрымку Савецкай улады. У 1921 г. адкрыта школа, у 1923 г. 413 двароў, 1923 жыхары. З 17.7.1924 г. цэнтр Халопеніцкага раёна Барысаўскай акругі. У 1925 г. пабудаваны сямігадовая і яўрэйская школы, з 8.7.1931 г. ў Крупскім, з 12.2.1935 г. ў Халопеніцкім раёнах. У 1929 г. створаны калгас «Новае жыццё» (старшыня І.Д. Бандарэнка), шавецкая арцель «Свая праца». У 1931 г. — кравецкая арцель «Новы шлях», працавалі паравы млын і цыркулярка. У былым маёнтку арганізаваны саўгас, у 1933 г. 77 рабочых, 1254 га зямлі, у 1937 г. скасаваны як нерэнтабельны. У 1938 г. створана Халопеніцкая машынна-трактарная станцыя. З 27.9.1938 г. Халопенічы — гарадскі пасёлак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.6.1944 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Фашысты ў верасні 1941 г. расстралялі 800 жыхароў пасёлка. У лагеры смерці, які быў створаны фашыстамі ў Халопенічах, было знішчана 1600 чалавек. Дзейнічала падпольная арганізацыя. На франтах вайны загінулі 137 чалавек, у партызанскай барацьбе — 24 чалавекі. З 1960 г. пасёлак у складзе Крупскага раёна, цэнтр саўгаса, цяпер — калгаса «Халопенічы». На 1.1.1998 г. 728 гаспадарак, 1891 жыхар. На тэрыторыі гарадскога пасёлка працуюць масласырзавод, механічны завод, хлебакамбінат, філіял Крупскага камбіната бытавога абслугоўвання насельніцтва, аддзяленні сувязі, ашчадбанка, сярэдняя школа, бальніца, Дом культуры, лясніцтва, аптэка, участак электрасеткі, музычная школа, дзіцячы дом, дзіцячы сад, 2 бібліятэкі, гасцініца, 4 крамы, сталовая, універмаг, праваслаўная царква, царква хрысціян веры евангелісцкай. Каля пасёлка брацкая магіла, пахаваны 66 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Каля дарогі Халопенічы—Слабада магіла ахвяр фашызму, пахаваны 2700 чалавек, загубленых нямецка-фашысцкімі карнікамі 20.9.1941 г. У цэнтры пасёлка ў 1980 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці 65 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Магіла 54 савецкіх ваеннапалонных, якіх у 1941 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1962 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ХАЛЬНЯВІЧЫ (Вялікія Хальнявічы), вёска ў Янаўшчынскім сельсавеце у калгасе «Сялява». Упершыню ўпамінаецца ў 1534 г., маёнтак князя Андрэя Андрэевіча Лукамскага-Меляшкоўскага, потым перайшоў у спадчыну да князя Івана Барысавіча Лукамскага. У 1604 г. сяло маёнтка Чарэя належала канцлеру Льву Сапегу, цэнтр войтаўства. У 1678 г. перайшло ў спадчыну да Бенядыкта Паўла Сапегі. У 1772 г. вёска Чарэйскага графства Аляксандра Сапегі ў закладзе ў Віцебскага ваяводы Юзафа Салагуба, 36 двароў, 170 мужчын, млын, карчма. У пачатку 20 ст. 478 двароў, вёска належала пану Шпінгеру, дзейнічалі народнае вучылішча, млын. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў складзе Чарэйскага, з 1931 г. Крупскага раёнаў. У 1929 г. 30 жыхароў аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны Кастрычнік». У 1941 г. 70 двароў, 324 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 24 чалавекі, знішчаны 23 мірныя жыхары. На 1.1.1998 г. 49 гаспадарак, 89 жыхароў. Крама.

ХАРЫТАНЦЫ, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Заснавана каля 1620 г., 3 двары, належала да Чарэйскага маёнтка. У 1889 г. 24 двары, 150 жыхароў, у 1909 г. 249 жыхароў. З 1924 г. ў Чарэйскім, з 1931 г. ў Крупскім раёнах. У 1941 г. 57 двароў, 288 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 18 чалавек, вёска была часткова спалена. Пасля вайны адбудавана, з 1957 г. ў складзе саўгаса «Абчуга», потым — «Авангард». На 1.1.1998 г. 32 гаспадаркі, 50 жыхароў. Брацкая магіла 4 партызан, якія загінулі ў 1942 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ХАЦЮХОВА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны Кастрычнік». У 1572 г. Хацюхова (Хотавае) — сяло, якое Мальхер Войцахавіч Шэмет атрымаў ад свайго бацькі Янавіча Шэмета Войцаха і якое аспрэчваў у Яфіміі Вяржбіцкай і яе мужа князя Андрэя Іванавіча Вішнявецкага. Потым яно было прададзена князю А.І. Вішнявецкаму, але яго дочкі прадалі яго назад. У 1594 г. Мальхер Шэмет перадаў сяло ў пажыццёвае валоданне сваёй жонцы Ганне Янушкевіч. У 1620 г. Хацюхова — сяло маёнтка Халопенічы, 22 двары, з іх 16 належалі пану Валашковічу, 6 — пану Нонгарту. У 1667 г. маёнтак Аршанскага павета, у закладзе ў Станіслава Богуша, 65 «дымоў». У 1722 г. ўласнасць паноў Халец-

кіх. У 1775 г. сяло маёнтка Халопенічы Іахіма Храптовіча, 20 двароў. Пазней у складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета, маёнтак Гарноўскага. У 1866 г. пабудавана царква. У 1885 г. ў вёсцы 21 двор, 196 жыхароў, пастаялы двор, царква, часоўня, працаваў вадзяны млын, кірмаш у дзень Святога Духа. У 1888 г. ўласнасць Брадоўскага, дзейнічала запалкавая фабрыка (20 рабочых), 51 двор, 302 жыхары, у маёнтку Хацюхова 7 двароў, 25 жыхароў. У 1912 г. ў вёсцы адкрыта народнае вучылішча, у 1917 г. 54 двары, 387 жыхароў. З 20.4.1924 г. вёска ў Хацюхоўскім сельсавеце Халопеніцкага раёна Барысаўскай акругі, потым у Крупскім, з 1935 г. ў Халопеніцкім раёнах, з 1960 г. ў Мінскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы размяшчаўся нямецкі гарнізон, які быў знішчаны партызанамі, дзейнічала падпольная група. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 42 чалавекі, 15 жыхароў расстраляны, вёска спалена гітлераўцамі. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, крама. Брацкая магіла 33 савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў летам 1944 г.

ХВАТЫНКА, вёска ў Абчугскім сельсавеце, у калгасе «Абчуга». Вядома з 19 ст. У 1909 г. вёска ў складзе Абчугскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 123 двары, 275 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Абчугскім сельсавеце Чарэйскага, з 8.7.1931 г. Крупскага раёнаў. У 1941 г. 33 двары, 132 жыхары. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 15 чалавек, вёска была часткова спалена. На 1.1.1998 г. 12 гаспадарак, 22 жыхары.

ХУДАВА, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1-й паловы 19 ст., уладанне князя Васіля Міхайлавіча Друцкага, потым сяло пераходзіць ва ўласнасць князёў Івана, Януша, Дзмітрыя і Багдана Раманавічаў Друцкіх-Любецкіх. У 1546 г. ўладанне князя Андрэя Іванавіча Друцкага-Азярэцкага, спадчына дзеда князя Івана Бабы, сумесныя ўладанні князя Дзмітрыя Раманавіча Друцкага-Любецкага і інш. князёў. У наступным годзе сяло пераходзіць у сумесную ўласнасць удавы князя Васіля Юр'евіча Друцкага-Талачынскага Марыі і князя Івана Раманавіча Відуніцкага (Друцкага-Любецкага). У 1551—59 гг. маёнтак па спадчыне пераходзіць спачатку да князя Васіля Талачынскага, князя Андрэя Іванавіча Бабіча (Друцкага-Азярэцкага), князя Міхаіла Андрэевіча Друцкага-Азярэцкага. У 1562 г. сумесная ўласнасць князёў Васіля і Багдана Андрэевічаў Друцкіх-Азярэцкіх, а таксама спадчына сястры князя Грыгорыя Сенскага Багдана, жонкі Васіля Міхайлавіча Корсака і яе дзяцей. У наступным годзе пасля падзелу з братамі і сёстрамі маёнтак, атрыманы Пятрухнай Карсакаўнай, пераходзіць да яе мужа Дзмітрыя Фёдаравіча Сапегі. У 1595 г. маёнтак ва ўладанні Марціна Курчы. З 1602 г. цэнтр Худаўскай воласці, у складзе маёнтка Чарэя, уладанне Льва Сапегі, 30 валок зямлі і 88 «дымоў». У 1761 г. адно з войтаўстваў маёнтка Чарэя, аддадзена Міхаілам Сапегам у заклад князю Ігнацію Агінскаму, дзейнічала уніяцкая царква Чарэйскага дэканата, потым у Чарэйскім графстве, уласнасць канцлера Аляксандра Сапегі, у закладзе ў пана Салагуба, 14 «дымоў» (2 належалі царкве). У 1873 г. ў сяле 59 мужчын, праваслаўная царква, у 1899 г. адкрыты дзёгцевы завод. У 1909 г. 30 двароў, 251 жыхар, дзейнічала царкоўнапрыходская школа. Вёска ўваходзіла ў Лісічанскую воласць Сенненскага павета Магілёўскай губерні, належала І.А. Нітаслаўскай. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Дубаўскага сельсавета Чарэйскага, з 1931 г. Крупскага, потым Халопеніцкага і Крупскага раёнаў. У 1929 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны пуцілавец». У 1941 г. ў вёсцы 45 двароў, 175 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы спалілі 4 гаспадаркі, загінулі 33 жыхары. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1950 г. вёска ў складзе калгаса імя Леніна, потым — саўгаса, цяпер — калгаса «Дубраўка». На 1.1.1998 г. 19 гаспадарак, 32 жыхары. Брацкая магіла партызан брыгады М.П. Гудкова, якія загінулі ў 1944 г. ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1984 г. ўстаноўлена надмагілле.

ХУДАЎЦЫ, вёска, цэнтр Крупскага сельсавета, цэнтр калгаса імя Калініна. Вядома з 1614 г. У пачатку 18 ст. ў Чарэйскім маёнтку паноў Сапегаў, цэнтр войтаўства. У 1713 г. 45 двароў, у 1775 г. 28 двароў, царква. У 1873 г. сяло Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 123 мужчыны, уласнасць пана Газдзіцкага. У 1897 г. 67 двароў, 443 жыхары, царква, царкоўнапрыходская школа, крама, вінакурны завод. З 1924 г. ў складзе Крупскага сельсавета Крупскага раёна. У 1930-я гады вяскоўцы стварылі калгас «Бальшавік». У 1941 г. ў вёсцы 149 двароў, 499 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 78 чалавек. На 1.1.1998 г. 188 гаспадарак, 434 жыхары. Дом культуры, ся-

рэдняя школа, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, аддзяленне сувязі, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, крама, майстэрні, жывёлагадоўчая ферма. Багародзіцкая царква. Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Каля будынка клуба абеліск і 6 стэл з імёнамі воінаў-землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЧАРАЁЎКА, вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Створана ў 1772 г., уласнасць пана Агінскага, 5 двароў, 28 мужчын. У 1897 г. фальварак, 1 двор, 3 жыхары. У 1930-я гады створаны калгас «Чараёўка». У Вялікую Айчынную вайну вёска амаль поўнасцю спалена (28 двароў), загінулі 3 жыхары. Пасля вайны адбудавана. Цяпер у складзе саўгаса «Авангард». На 1.1.1998 г. 1 гаспадарка, 2 жыхары.

ЧАРНАВОСАВА, вёска ва Ухвальскім сельсавеце, у калгасе «Ніва». Заснавана каля 1775 г., 4 двары, 29 жыхароў. У 1818 г. ўваходзіла ў Барысаўскі маёнтак князёў Радзівілаў, 5 двароў, з іх 4 — шляхты. У 1897 г. на хутары Чорны Восаў (Чарнушын) 18 двароў, 138 жыхароў, у 1909 г. ў засценку Восаў Чорны 15 двароў, 115 жыхароў, у складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1917 г. 20 двароў, 129 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска Крупскага раёна Барысаўскай, з 9.6.1927 г. Мінскай, з 18.6.1927 г. Аршанскай акруг, з 20.2.1928 г. Мінскай вобласці. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 15 чалавек, знішчана 20 мірных жыхароў. На 1.1.1998 г. 12 гаспадарак, 18 жыхароў. Радзіма Героя Савецкага Саюза А.С.Лукашэвіча.

ЧАРНЯЎКА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце. Паводле перапісу 1897 г. 6 гаспадарак, 34 жыхары. З 20.8.1924 г. ў Сакалавіцкім сельсавеце Крупскага раёна, з 1954 г. ў Бобрскім сельсавеце. Цяпер вёска ў складзе калгаса «Бобр». На 1.1.1998 г. 1 гаспадарка, 1 жыхар.

ЧЫРВОНЫ ПАХАР, вёска ва Ухвальскім сельсавеце, у калгасе «Ніва». Вядома з пачатку 20 ст. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў складзе Стараслабодскага, потым Ухвальскага сельсаветаў Крупскага раёна. У 1930-я гады вёска ў складзе калгаса «Камінтэрн». У 1941 г. 18 двароў, 94 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 9 чалавек. На 1.1.1998 г. 6 гаспадарак, 9 жыхароў.

ШАМКІ (Шымкі), вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце. Паводле пісьмовых звестак вядома з 1648 г., калі Еранім Друцкі-Сакалінскі набыў сяло ў папярэдняга ўладальніка дробнага шляхціца Мікалая Вадашынскага. Пазней вёска належала місіянерам езуітам-дамініканцам, 8 двароў, 33 мужчыны. У 1795 г. 12 двароў, 65 жыхароў, уласнасць пана Багушэвіча. У 1909 г. засценак Шымкі ў складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета, 31 двор, 274 жыхары, у 1917 г. — 29 двароў, 208 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі вёска ў складзе Халопеніцкага раёна. У час акупацыі гітлераўцы расстралялі 309 жыхароў вёскі ва ўрочышчы «Каменны лог». На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 3 чалавекі. Пасля вайны вёска ў складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Халопеніцы». На 1.1.1998 г. 7 гаспадарак, 9 жыхароў.

ШАРНЕВА, пасёлак у Абчугскім сельсавеце, у калгасе «Слабада». Вядомы з 2-й паловы 18 ст., уласнасць пана Сідароўскага. У 1772 г. 20 двароў. У 19 ст. ў складзе Абчугскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 26 двароў, 76 жыхароў. З 20.8.1924 г. па 26.2.1930 г. ў складзе Чарэйскага, потым Крупскага раёнаў. У 1930-я гады створаны калгас «Парыжская камуна». У 1941 г. 25 двароў, 123 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 10 чалавек, спалены 3 пабудовы. На 1.1.1998 г. 11 гаспадарак, 18 жыхароў.

ШАРПІЛАЎКА, вёска ў Абчугскім сельсавеце, у калгасе «Абчуга». Заснавана ў 2-й палове 17 ст. ў Кіявецкім войтаўстве Чарэйскага маёнтка, належаў Сапегам. У 1713 г. 9 двароў, 7 з іх пуставала. У 1778 г. вёска была прададзена шляхціцу Ераніму Пшаемыцкаму, 1 двор. У 1873 г. 50 жыхароў, у 1909 г. 24 двары, 151 чалавек. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Чарэйскім, з 1931 г. ў Крупскім раёнах. У 1932 г. створаны калгас «15 год Кастрычніка». У 1941 г. 33 двары, 136 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 20 чалавек. На 1.1.1998 г. 14 гаспадарак, 19 жыхароў.

ШАЦЬКІ, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце, у калгасе «Колас». Вядома з 1713 г., уваходзіла ў Чарэйскі маёнтак магнатаў Сапегаў, 20 двароў, 5 валок зямлі. У 1772 г. вёска ў закладзе ў пана Салагуба, 6 двароў. У канцы 19 ст. вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, у 1909 г. 22 двары, 146 жыхароў. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Шэйкаўскім, потым Бобрскім сельсаветах Крупскага раёна.

У 1930-я гады вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоная змена». У Вялікую Айчынную вайну загінула 14 чалавек. На 1.1.1998 г. 9 гаспадарак, 17 жыхароў.

ШКОРНЕЎКА, вёска ў Абчугскім сельсавеце. Заснавана ў канцы 17 ст., уласнасць Сапегаў. У пачатку 18 ст. 15 двароў, у 1713 г. 2 двары, у 1778 г. ўласнасць Ераніма Пшаемыцкага, 5 двароў. У 1909 г. вёска ў Абчугскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні, 20 двароў, 130 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў Заборскім сельсавеце Чарэйскага, з 1931 г. Крупскага, з 1935 г. Халопеніцкага, з 20.1.1960 г. Крупскага раёнаў, спачатку ў Кастрычніцкім, Бобрскім, з 1973 г. ў Абчугскім сельсаветах. У 1941 г. 27 двароў, 209 жыхароў. У красавіку 1944 г. фашысты спалілі вёску, знішчылі 43 мірных жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 27 чалавек. Пасля вайны вёска адбудавана, у складзе саўгаса, цяпер — калгаса «Слабада». На 1.1.1998 г. 11 гаспадарак, 17 жыхароў.

ШЫНКІ, вёска ў Дзянісавіцкім сельсавеце, у калгасе «Дзянісавічы». Вядома з 1772 г., 7 двароў. У канцы 18 ст. 100 жыхароў, адносілася да Барысаўскага маёнтка князя Радзівіла. У пачатку 19 ст. 14 двароў, 120 жыхароў, у 1845 г. 6 двароў, каля 40 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г. 25 двароў, 192 жыхары. У 1909 г. засценак у складзе Ухвальскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 31 двор, 274 жыхары. У 1917 г. вёска, 29 двароў, 208 жыхароў. З 20.8.1924 г. вёска, цэнтр сельсавета Крупскага раёна Барысаўскай акругі, з 16.7.1954 г. ў Старасланодскім, з 1964 г. ў Дзянісавіцкім сельсаветах. У 1941 г. ў вёсцы 57 двароў, 288 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну дзейнічала падпольная патрыятычная група. На франтах вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 40 чалавек, гітлераўцы расстралялі 8 жыхароў. На 1.1.1998 г. 42 гаспадаркі, 70 жыхароў. Аддзяленне сувязі, крама, фельчарска-акушэрскі пункт.

ШЫРНЕВІЧЫ, вёска ў Выдрыцкім сельсавеце (цяпер не існуе). Паводле пісьмовых крыніц вядома з 2-й паловы 18 ст. У 1775 г. вёска, 26 двароў. З 1795 г. ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета. З 1924 г. ў Крупскім раёне. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 2 чалавекі, вёска часткова спалена. Пасля вайны не адбудавана.

ШЫЯЛОЎКА, вёска ў Дакудаўскім сельсавеце. У 1897 г. на хутары 2 двары, 14 жыхароў. У 1909 г. ў складзе Лошніцкай воласці Барысаўскага павета, 4 двары, 30 жыхароў, у 1917 г. 4 двары, 33 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Нацкім сельсавеце Крупскага раёна, з 31.3.1937 г. ў складзе Жаберыцкага, з 13.2.1982 г. — Дакудаўскага сельсаветаў. У 1941 г. 15 двароў, 90 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 4 чалавекі. Пасля вайны вёска ў складзе калгаса «Бальшавік». На 1.1.1998 г. 12 гаспадарак, 25 жыхароў.

ШЭЙКА, вёска ў Крупскім сельсавеце. У 1510 г. маёнтак, пасля смерці князя Дзмітрыя Фёдаравіча Гальцоўскага быў перададзены яго родзічам Грыгорыю і Васілю Іванавічам, Сямёну Багданавічу Адзінцэвічам. Пазней яго адсудзіла дачка князя Гальцоўскага Ганна. Але маёнткам працягвалі валодаць да 1527 г. князі Адзінцэвічы. З 1775 г. цэнтр маёнтка княгіні Сангушкавай у Аршанскім павеце, 24 «дымы». У 1884 г. вёска ў складзе Бобрскай воласці Сенненскага павета, 36 двароў, 291 жыхар, уладанне М.Д. Свяцкага. У 1909 г. сяло, 57 двароў, 303 жыхары, праваслаўная царква, царкоўнапрыходская школа, побач аднайменны маёнтак, 34 жыхары. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады вёска, цэнтр Шэйкаўскага сельсавета Крупскага раёна. У 1941 г. ў вёсцы 23 двары, 229 жыхароў. На франтах Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 27 чалавек, знішчаны 36 мірных жыхароў. З 1950 г. ў складзе калгаса імя Калініна. На 1.1.1998 г. 59 гаспадарак, 127 жыхароў. Крама, жывёлагадоўчая ферма.

ЮЗУФОВА, вёска ў Крупскім сельсавеце (цяпер не існуе). Паводле ўспамінаў старажылаў вёска Юзафова размяшчалася на землях пана Юзафа Дьшлеўскага, выхадца з Польшчы. Вёска атрымала назву ад яго імя, потым стала называцца Юзуфова. У 1917 г. памешчыца збегла за мяжу, зямля была падзелена паміж сялянамі вёсак Юзуфова, Буда, Сінічанка, Худаўцы. У 1930 г. вяскоўцы арганізавалі калгас «Вольная праца» (старшыня Мацвей Градусенка). У 1941 г. ў вёсцы 7 двароў, 24 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 12 жыхароў. У 1950-я гады далучана да калгаса «Бальшавік» (цэнтр — в. Худаўцы). Жыхары Юзуфова перасяліліся ў в. Худаўцы і Шэйка.

ЯДЖАР, вёска ў Дзянісавіцкім сельсавеце, у калгасе «Дзянісавічы». Вядома з 1870 г., каля 30 жыхароў. У пачатку 20 ст. ва Ухвальскай воласці Барысаўскага павета, 19 двароў, 135 жыхароў. У 1917 г. 26 двароў, 169 жыхароў. З 20.8.1924 г. ў складзе Шэйкаўскага сельсавета Крупскага раёна. У 1941

г. ў вёсцы 26 двароў, 139 жыхароў. На франтах Вялікай Айчыннай вайны загінулі 7 чалавек. На 1.1.1998 г. 16 гаспадарак, 33 жыхары.

ЯЗБЫ (Я з в ы), вёска ў Кастрычніцкім сельсавеце. Вядома з 1772 г., 8 двароў, уласнасць пана Агінскага. У 1897 г. 36 двароў, 255 жыхароў, у 1917 г. 37 двароў, 292 жыхары, маёнтак графа Красніцкага. З 20.8.1924 г. вёска ў Дубаўскім сельсавеце Чарэйскага, Халопеніцкага, Крупскага раёнаў. У 1941 г. ў вёсцы 41 двор, 161 жыхар. На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 16 чалавек. Пасля вайны вёска ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка». На 1.1.1998 г. 24 гаспадаркі, 37 жыхароў.

ЯЗБЫ, пасёлак у Кастрычніцкім сельсавеце. З 20.8.1924 г. ў складзе Дубаўскага сельсавета Чарэйскага, з 8.7.1931 г. Крупскага, з 12.2.1935 г. Халопеніцкага раёнаў, з 20.2.1938 г. да 26.8.1959 г. ў Заборскім сельсавеце Халопеніцкага раёна Мінскай вобласці, з 20.1.1960 г. ў Крупскім раёне. З 3.5.1962 г. ў Кастрычніцкім сельсавеце. У 1941 г. 23 двары, 126 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 9 чалавек. У 1944 г. калгас адноўлены, з 1957 г. вёска ў складзе саўгаса «40 год Кастрычніка». На 1.1.1998 г. 29 гаспадарак, 55 жыхароў. Сярэдняя школа, магазін, дом адпачынку. Брацкая магіла 36 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну.

ЯКІМАЎКА, вёска ў Халопеніцкім пасялковым Савеце, цэнтр калгаса «Якімаўка». Заснавана каля 1870 г. Назва ад імя ўладальніка Іахіма Храптовіча. У 1897 г. вёска ў складзе Халопеніцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, 57 двароў, 319 жыхароў. У 1917 г. 382 жыхары. З 1924 г. Халопеніцкага, з 1960 г. Крупскага раёнаў Мінскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы дзейнічала падпольная група. На франтах вайны і ў партызанскай барацьбе загінулі 44 чалавекі, знішчаны 5 мірных жыхароў. На 1.1.1998 г. 90 гаспадарак, 251 жыхар. Аддзяленне сувязі, базавая школа, крама, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, майстэрні, жывёлагадоўчая ферма. Помнік на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЯНАЎШЧЫНА, вёска, цэнтр сельсавета. Вядома з 19 ст. У 1880 г. ў складзе Замоцкай воласці Сенненскага павета, уладанне А.А. Валовіч, 8 двароў, 49 жыхароў, млын, карчма. З 1924 г. ў Чарэйскім, Халопеніцкім, з 1960 г. ў Крупскім раёнах. У 1930-я гады створаны калгас, працавалі хата-чытальня, школа. У 1941 г. 13 двароў, 47 жыхароў, дзейнічала МТС. Цяпер вёска — цэнтр калгаса «Сялява». На 1.1.1998 г. 54 гаспадаркі, 167 жыхароў. Аддзяленне сувязі, крама, сталовая, сярэдняя школа, клуб, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, фельчарска-акушэрскі пункт.

ЯРАШОЎКА, вёска ў Бобрскім пасялковым Савеце, у калгасе «Колас». Вядома з 18 ст. У 1772 г. 8 двароў, 42 жыхары, уласнасць Агінскіх. У пачатку 19 ст. вёска Бобрскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У 1897 г. фальварак, 4 двары, 51 жыхар. У 1909 г. засценак, 5 двароў, 51 жыхар. З 20.8.1924 г. ў складзе Бобрскага сельсавета Крупскага раёна. На 1.1.1998 г. 12 гаспадарак, 17 жыхароў.

Дз.М. Хромчанка, Т.Р. Чуракова.
Пры падрыхтоўцы выкарыстаны матэрыялы В.Л. Насевіча.

Змест

Да чытача 17

Населеныя пункты Крупскага раёна 19

Населеныя пункты Крупскага раёна, якія не існуюць 20

Зямля нашых продкаў 21

У складзе Полацкага княства 37

У складзе Вялікага княства Літоўскага 40

У складзе Рэчы Паспалітай 47

У складзе Расійскай імперыі 70

На крутым павароце гісторыі 109

Ішла вайна народная 165

Воіны Чырвонай Арміі і партызаны, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны пры абароне і вызваленні Крупскага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі 313

Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны 325

Партызаны, падпольшчыкі, асобы, якія садзейнічалі падпольнаму і партызанскаму руху, — ахвяры фашысцкага тэрору 447

Мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору 463

Пасля вызвалення Айчыны 503

З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны 575

З гісторыі населеных пунктаў 588

СУПРАЦОЎНІКІ РЭДАКЦЫЙ І СЛУЖБАЎ ВЫДАВЕЦТВА, ЯКІЯ ПРАЦАВАЛІ НАД КНІГАЙ

Група картаграфіі: Г.Р. Шыкунова, В.Ф. Надзененка.

Рэдакцыя мастацка-тэхнічнага афармлення выданняў:

У.М. Жук (заг. рэдакцыі), Л.С. Шафрановіч.

Рэдакцыя навуковага і літаратурнага кантролю:

І.П.Хаўратовіч (заг. рэдакцыі), А.А.Федасеева.

Бібліёграф М.А.Маўзон.

Рэдакцыя фотаздымак і фотаілюстрацый:

Г.М. Бажанкоў (загадчык рэдакцыі), фотакарэспандэнты: А.П. Дрыбас, С.А. Жукавень, І.У. Каваленка, В.У. Харчанка.

У кнізе выкарыстаны таксама здымкі з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, музеяў Бобрскай, Выдрыцкай, Абчугскай, Гапонавіцкай, Нацкай, Крупскай пасялковай, Халопеніцкай, Ігрушкаўскай, Старасляbодскай, Янаўшчынскай школ Крупскага раёна, асабістых архіваў, а таксама з архіва БелЭн.

Прадстаўнікі грамадскасці, якія дапамагалі ў стварэнні кнігі «Памяць»:

У.І. Адамушка, М.А. Багушэвіч, М.М. Гаеўскі, Л.П. Граховіч, В.В. Грыгор'ева, Г.І. Грыгор'еў, Н.В. Гульцяева, Б.Дз. Даўгатовіч, П.К. Зайцаў, У.К. Канапліцкі, М.М. Каравацкі, Б.А. Красько, А.М. Кулагін, М.С. Куляй, С.М. Лапановіч, А.М. Літвін, В.В. Макарэвіч, В.Л. Насевіч, Н.Ц. Паддубская, Е.У. Пахомава, Л.Д. Побаль, С.Я. Рассадзін, В.А. Саніковіч, А.В. Цітавец.